СЕРЫЯ «АДКРЫТАЕ ГРАМАДСТВА»

АДКРЫТАЕ ГРАМАДСТВА

Анры Дэні

ГІСТОРЫЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ



ТЭХНАЛОГІЯ

БФС



Серыя Беларускага Фонду Сораса. Заснавана ў 1995 г.

Henri Denis

HISTOIRE DE LA PENSÉE ÉCONOMIQUE

10e édition

Presses
Universitaires
de France
1993

Анры Дэні

ГІСТОРЫЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ

Дапаможнік для студэнтаў

Мінск
Незалежная выдавецкая кампанія «Тэхналогія»
Беларускі Фонд Сораса
1996

ББК 65.02
Д 94
УДК 330.8

Каардынатар серыі
Алесь Анціпенка

Кніга выдадзена паводле дамовы
з Presses Universitaires de France,
108, boulevard Sain-Germain, 75006 Paris

Навуковы рэдактар
Тацяна Паваліхіна

Пераклалі з французскай мовы
Алесь Лагвінец, Карэн Акопаў

Пераклад зроблены з выдання:
Denis, Henri
Histoire de la pensée économique. — 10e éd. — Paris: Presses Universitaires de France, 1993. — 739 pp.

© Presses Universitaires de France, 1966
© Пераклад. Беларускі Фонд Сораса, 1996
© Знак серыі. Ю. Герасіменка-Жызнеўскі, 1995
© Вокладка. В. Масцераў, 1996

ISBN 985-6022-18-5

ПРАДМОВА

Палітычная эканомія нарадзілася ў XVIII ст. у выніку шматлікіх спробаў тлумачэння пэўных сацыяльных з'яваў з дапамогаю прыкладна тых жа метадаў, якімі карыстаюцца і ў прыродазнаўчых навуках. На сённяшні дзень гэтая навука шырока распаўсюдзілася і знаходзіць сваё практычнае дастасаванне ў шматлікіх краінах, у тым ліку і ў краінах Усходняй Эўропы, дзе апаратам вытворчасці і размеркавання матэрыяльных сродкаў цалкам кіруюць дзяржаўныя органы[1].

Аднак, як нам здаецца, нельга сцвярджаць, што палітэканомія — "такая ж навука, як і ўсе астатнія". Яна займаецца аналізам фактаў чалавечай дзейнасці і не можа прэтэндаваць на тую поўную незалежнасць ад філасофскіх вучэнняў, на якую (зрэшты, магчыма, празмерна) прэтэндуюць "дакладныя навукі". Тлумачэнне сацыяльнай арганізацыі вытворчасці і яе эвалюцыі на працягу гісторыі — гэта задача, якая абавязкова павінна быць звязаная з палітычнай філасофіяй.

Менавіта таму мы адвялі пэўнае (досыць сціплае, на нашу думку) месца разгляду асобных аспектаў значных філасофскіх вучэнняў Захаду. Хоць некаторыя з гэтых вучэнняў ужо састарэлі (перш за ўсё вучэнні Плятона і Арыстотэля), аднак яны настолькі паўплывалі на эвалюцыю заходняй думкі ва ўсіх яе аспектах, што без ведання зместу гэтых вучэнняў нельга зразумець навачасных навуковых спрэчак эканамістаў. Пададзім толькі адзін прыклад. Нагадаем, што Жан Жак Русо, на вучэнні якога шмат у чым грунтуецца сучасны сацыялізм, многія свае ідэі чэрпаў у "Законах" Плятона.

Больш за тое, філосафы старажытнасці задоўга да з'яў-

[1] *Кніга рыхтавалася да выдання, калі яшчэ існавалі краіны так званага сацыялістычнага лагера. — Заўвага перакладніка.*

лення палітэканоміі апісалі тагачаснае эканамічнае жыццё і суаднеслі яго з уяўленнямі аб прыродзе і мэтах грамадскага жыцця. Такім чынам, мы мусім разгледзець першы этап гісторыі эканамічнай думкі, калі яна была данавуковай у тым сэнсе, што не існавала навукі, якую мы сёння называем палітэканоміяй. На гэтым першым этапе дамінавалі канцэпцыі, што бяруць пачатак у грэцкім ідэалізме.

У эпоху Адраджэння на Захадзе сцвердзілася натуралістычная канцэпцыя чалавека, згодна з якой чалавек — жывёла, але толькі больш высокага кшталту. Гэтую канцэпцыю ў значнай ступені перанялі навукоўцы XVIII—XIX стст., якія заклалі асновы палітэканоміі.

Вучэнням гэтых мысляроў супрацьстаяла пазіцыя Карла Маркса, якая насуперак свайму дэкларованаму матэрыялізму шмат узяла ад ідэалізму Канта, Фіхтэ і Гегеля. Гісторыя эканамічнай думкі другой паловы XIX ст. сцісла зводзіцца да разнастайных спрэчак паміж ліберaламі, якія працягвалі адстойваць канцэпцыю натуральнага парадку фізіякратаў, і марксістамі, якія лічылі, што чалавецтва знаходзіцца на шляху да дасканалага грамадства.

Цікавасць да тэарэтычных спрэчак не перашкаджае нам аддаць найбольшую ўвагу ў нашым даследванні эвалюцыі ўласна палітэканоміі. Перадусім нас будуць цікавіць аўтары, якія зрабілі сапраўды арыгінальныя адкрыцці ў гэтай галіне; мы будзем старацца як мага ясней выкласці гэтыя адкрыцці, разглядаючы іх у гістарычным кантэксце.

Зразумела, што сёння навуковыя ідэі, выказаныя стагоддзе ці два таму, часта могуць нам здацца досыць банальнымі, аднак праца гісторыка якраз і палягае ў тым, каб паказаць, як выпрацоўваліся гэтыя ідэі, бо найчасцей ім папярэднічалі вострыя навуковыя спрэчкі. Праз гэта, безумоўна, мы здолеем лепей зразумець сучасны стан эканамічнай навукі.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ



ПАЛІТЫЧНЫ І ЭКАНАМІЧНЫ ІДЭАЛІЗМ У ГРЭЦКАЙ ФІЛАСОФІІ І ЯГО ЗАНЯПАД

У грэкаў палітэканоміі не існавала, бо для грэцкіх філосафаў эканамічнае жыццё было толькі элементам сямейнага, паліснага або палітычнага жыцця. Мы ж мусім паказаць, як з разрыву з грэцкай канцэпцыяй чалавека нарадзілася палітэканомія. Тым не менш, даследуючы палітычнае жыццё, грэцкія філосафы разглядалі эканамічную арганізацыю ў тым сэнсе, які ў гэты тэрмін укладаем сёння мы; яны вялі гутарку пра ўласнасць, грошы, гандаль і г.д. Мы павінны ўважліва прасачыць за іхнымі меркаваннямі, гэта дапаможа нам лепей зразумець эканамічную думку, якая дамінуе сёння ў заходніх краінах і якая ў значнай ступені сфармавалася праз крытыку поглядаў старажытных грэкаў.

Мы разгледзім вучэнні двух вялікіх грэкаў — Плятона і Арыстотэля. Менавіта гэтыя філосафы, якія прысвяцілі сваё жыццё пошуку стройнай тэорыі Сусвету і чалавека, займаліся вывучэннем "поліса", уважаючы яго за адзіную вартую, найвышэйшую форму палітычнага жыцця.

Плятон — вялікі папярэднік і адзін з галоўных натхняльнікаў хрысціянскай канцэпцыі чалавека — бачыў у полісе сродак выратавання чалавечых душаў. Гэтая канцэпцыя поліса прывяла яго да прапановы забараніць уласнасць для вышэйшых класаў грамадства.

Арыстотэль, наадварот, абараняў уласнасць, і ўжо тады ўпершыню паўстае праблема камунізму. Супярэчнасці паміж дактрынамі гэтых філосафаў усё ж вельмі адрозніваюцца ад навачасных спрэчак паміж ліберaламі і марксістамі, бо Плятон і Арыстотэль — ідэалісты, тым часам як сучасная заходнеэўрапейская дыскусія пра камунізм адбываецца ў грамадствах, якія ў значнай ступені засвоілі натуралістычную канцэпцыю чалавека.

Раздзел I

ПЛЯТОН: ЭКАНАМІЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ — СРОДАК ВЫРАТАВАННЯ ЧАЛАВЕЧЫХ ДУШАЎ

§ 1. Сацыяльны і інтэлектуальны крызіс у Афінах у IV ст. да н. э.

Афінская дзяржава была ўтвораная ў выніку задзіночання чатырох плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Атыкі. Старая арганізацыя, у аснове якой ляжала сістэма родаў (γένοξ) і плямёнаў, паступова знікла з развіццём прыватнай уласнасці на зямлю, гандлю, ужываннем грошай[1].

У першую эпоху афінскай дзяржавы грамадзяне падзяляліся на тры класы: эўпатрыды, ці родавая арыстакратыя, геаморы, ці сяляне, і дэміургі, ці рамеснікі. Палітычная ўлада належала арыстакратыі — нашчадкам правадыроў родаў. І менавіта з іх ліку выбіралі архонтаў — кіраўнікоў поліса. (Дарэчы, поліс быў яшчэ вельмі маленькі, ён складаўся з некалькіх сотняў тысяч чалавек). Арыстакратыя завалодала большай часткай найлепшых земляў, а простыя сяляне бяднелі, вымушаныя пазычаць, а ў выпадку нясплочвання доўгу станавіліся рабамі.

Між імі і арыстакратыяй разгарнулася барацьба. Паўстанне збяднелых сялянаў прывяло ў VI ст. да н. э. да скасавання запазычанасці Салёнам (архонт пры канцы VI ст.). У 594 г. Салён даў дзяржаве новую канстытуцыю. Полісам з гэтага часу кіраваў арэапаг з 400 чалавек. Грамадзяне былі падзеленыя на чатыры класы ў залежнасці ад памераў прыбытку, які яны мелі з зямлі. Па-ранейшаму найважнейшая роля належала вышэйшым класам.

Пасля Салёна збяднелыя сяляне далучыліся да рамеснікаў і гандляроў, роля якіх няўхільна расла. Гэтая кааліцыя забрала ўладу ў арыстакратыі, і перамога народа была замацаваная рэформамі Клісфэна (508 г. да н. э.).

З гэтага часу дзяржаваю кіравалі народны сход і выбарная рада з 500 чалавек. Грамадзяне падзяляліся на 100 "дэмаў" у залежнасці ад месца жыхарства.

Ужо тады ў афінскім полісе налічвалася 120 000 грамадзян пры насельніцтве 400 000 чалавек, куды таксама ўваходзілі рабы і іншаземцы (метэкі). Самай шматлікай катэгорыяй грамадзян былі дробныя сяляне, якія апрацоўвалі сваю зямлю, часам з дапамогай аднаго ці двух рабоў. Іх становішча часта было незайздроснае, і вялікія групы грэкаў пакідалі бацькаўшчыну, засноўваючы калоніі на іншых марскіх узбярэжжах. Адначасова адбываўся няспынны рост гандлю з замежжам. Каб падтрымліваць гэтую палітыку экспансіі, афінскі поліс прыкладаў вялікія

---

[1] *Безумоўна, тут, як і паўсюль, паступова перайшлі ад плямёнавай уласнасці (супольныя паляўнічыя абшары і палеткі) да родавай уласнасці (частку варнае зямлі дзялілі на ўчасткі, якія на пэўны час аддавалі супольнікам роду). Потым ажыццяўляўся пераход да прыватнай уласнасці, калі старшыны сем'яў атрымалі магчымасць распараджацца сваімі ўчасткамі, гэта значыць прадаваць ці здаваць іх у арэнду.*

вайсковыя намаганні, уступаючы ў хаўрусы з іншымі полісамі. У IV ст. да н.э. разгарнулася зацятае супернiцтва паміж Афінамі і Спартай, і ў выніку Пэляпанэскай вайны (431—404) Афіны канчаткова пацярпелі паразу.

З тае пары эканамічная і сацыяльная раўнавага ў полісе ўсё больш і больш парушалася. Гандаль нараджаў нуварышаў, адбываўся працэс канцэнтрацыі зямельнай уласнасці, многія збяднелыя сяляне мусілі пакідаць зямлю. Яны не знаходзілі сабе занятку, бо наёмнай працай займаліся рабы, колькасць якіх няспынна расла. Адначасова з фармаваннем беспрацоўнага плебсу ішоў працэс канцэнтрацыі вялікіх багацяў у руках вельмі абмежаванага кола асобаў. Паміж багатымі і беднымі ўвесь час была варожасць, якая выклікала глыбокі разлад у дзейнасці дэмакратычных інстытуцый; поліс слабеў і ўваходзіў у стадыю агульнага заняпаду.

Адной з прычын заняпаду Афінаў быў ніжэйшы параўнальна з Спартай ровень яе вайсковых магчымасцяў. А магутнасць Спарты абапіралася на своеасаблівую сацыяльную арганізацыю.

Блізу 550 г. да н. э. разам з 25 000 грамадзян у Спарце налічвалася 100 000 ілотаў, запрыгоненых сялян, і 250 000 перыэкаў, вольных людзей, пазбаўленых палітычных правоў, якія займаліся гандлёвай або рамесніцкай дзейнасцю. Каб захаваць панаванне меншыні, Хілон пераўтварыў яе ў вайсковую супольнасць: кожны грамадзянін валодаў неадчужальнай зямельнаю ўласнасцю, якую апрацоўвалі ілоты, прысвячаў сябе службе на карысць дзяржавы. Ад 7 да 20 гадоў грамадзянін праходзіў навучанне ў вайсковых лагерах, ад 20 да 60 гадоў нёс службу ў вайсковым аддзеле.

Шлюб таксама быў абавязкам кожнага грамадзяніна. Жывымі пакідалі толькі фізічна паўнавартасных дзяцей, сямейная спадчына перадавалася старэйшаму з іх. Дзеці, што не мелі сродкаў дзеля існавання, выкрэсліваліся з ліку грамадзян і пераходзілі ў клас перыэкаў.

Грамадзяне не маглі ні займацца гандлёвай дзейнасцю, ані валодаць каштоўнымі металамі. Фармальна найвышэйшым органам улады быў сход усіх грамадзян, але фактычна ўлада належала радзе старшын — герусіі, якая складалася з 28 чалавек, што мяняліся праз пэўны час, і двух цароў-военачальнікаў. Кожны год герусія прапаноўвала народнаму сходу кандыдатуры пяці эфораў на кіраванне дзяржавай.

Падобна, што ў Спарце правы мужчын і жанчын былі больш-менш роўныя. Можна было заўважыць таксама існаванне характэрных першабытнаабшчынных звычаяў, у прыватнасці супольнага сталавання.

Аднак на той час гэтыя звычаі знаходзіліся на стадыі выраджэння, і ў III і II стст. да н.э. пачалася напружаная барацьба за аднаўленне старажытнае спартанскае "роўнасці".

Каб мець дастаткова поўнае ўяўленне пра падзеі, якія маглі паўплываць на грэцкіх філосафаў, не трэба, між іншым, забываць пра выбухі буйных паўстанняў найбольш бяздольных сацыяльных слаёў, якія здараліся нават у перыяд росквіту грэцкае цывілізацыі.

У 640 г. да н. э. у Мегарах збяднелыя сяляне пад кіраўніцтвам Тэагена бяруць уладу і завалодваюць маёмасцю багатых уласнікаў.

Прыкладна ў 421 г. да н.э. насельніцтва востраваў Самас паўстала супраць геамораў; у тую ж эпоху таксама адбылося паўстанне на востраве Хіас. Галоўную ролю ў паўстанні адыгралі рабы, якія пад кіраўніцтвам Дрымаха змагаліся на працягу доўгіх гадоў.

Выступленні найніжэйшых слаёў грамадства працягваліся. Агульная рыса гэтых выступленняў у тым, што літаральна ўсе яны былі проста рабаванні, паўстанцы былі няздольныя стварыць трывалую сацыяльную арганізацыю.

V ст. да н. э. — сама велічны перыяд для Афінаў і Грэцыі, бо менавіта тады была створаная вялікая колькасць бессмяротных твораў мастацтва. Але гэта таксама час разбурэння традыцыйных асноваў грамадскага жыцця.

Грэцкая цывілізацыя адыграла вызначальную ролю ў асэнсаванні чалавекам яго ўласнай годнасці.

У больш старажытных дзяржавах людзі былі слугамі кіраўніка дзяржавы і ўсведамлялі сваю годнасць як далучанасць да прэстыжу мажнаўладцы.

Грамадзянін жа грэцкіх полісаў усведамляў, што ён як супольнік арганізаванай групы, якая кіруецца пэўнымі законамі, абавязковымі для ўсіх "вольных людзей" (з выняткам рабоў), мае ўласную годнасць і не ёсць болей слугою чалавека, але падпарадкоўваецца закону.

Грэцкі грамадзянін лічыў законы абсалютнымі, нават сакральнымі і разглядаў іх не як творы чалавека, а як выяўленне боскай волі ці як імператывы прыроды.

Пакуль эканамічнае і сацыяльнае жыццё развівалася ў традыцыйных формах, грамадзянін мог адчуваць сябе вольным, падтрымліваючы сваю веру ў абсалютную вартасць законаў, яму здавалася, што патрабаванні законаў супадалі з жаданнямі свабоднага чалавека; а дабрабыт поліса быў непарыўна звязаны з дабрабытам яго грамадзян. Менавіта гэта меў на ўвазе Гегель, калі пісаў: "Калі грэкі жылі ў стане першаснай і сапраўднай свабоды, сведамасці яны не мелі[1]; яны кіраваліся звычкай жыць на карысць радзімы і не надта аб гэтым разважалі. Яны, адрозна ад нас, не ўяўлялі дзяржаву як нешта абстрактнае; яны ведалі жывую, увасобленую бацькаўшчыну — Афіны, Спарту, храмы, алтары, звычку жыць грамадою, асяроддзе суграмадзян, свае норавы і звычаі. Для грэка бацькаўшчына была неабходнасцю, па-за межамі якой ён не мог жыць"[2].

Аднак прыкладна ў сярэдзіне VII ст. у Грэцыі пачынаюць ужываць грошы. У выніку гандлёвай дзейнасці ствараюцца новыя багацці і разбураюцца асновы старога грамадскага ладу. З гэтае пары ў індывіда ўзнікаюць сумневы наконт вартасці закону.

Вялікія драматургі V ст. да н.э. у якасці тэмаў выбіралі жыццё старажытных герояў, якія трапляюць у жудаснае становішча, калі законы

[1] *Тут размова ідзе пра ўсведамленне сацыяльнай салідарнасці.*

[2] *G.W.F. Hegel, Leçons sur la philosophie de l'histoire, trad. franç., Paris, 1946, p.231.*

патрабуюць ад іх супрацьлеглага. У Эсхіла, напрыклад, Арэст павінны забіць маці, каб адпомсціць за бацьку. У Сафокла Антыгона вымушана не паслухацца цара, каб выканаць свой абавязак у дачыненні да брата, якому, шануючы бацькоў, мусіць дапамагаць. Гэтыя супярэчнасці нельга абысці, бо розныя багі даюць розныя загады. І ў гэтым крыецца глыбіня трагедый. Сваю трылогію "Агамэмнан", "Хаэфоры" і "Эўмэніды" Эсхіл прысвяціў гісторыі Арэста. У аснове сюжэта — канфлікт паміж Апалёнам, які загадаў герою адпомсціць за бацьку, і Эўмэнідамі, божышчамі, якія павінны былі пераследваць тых, хто праліў кроў уласнае сям'і. Урэшце Афіна, багіня-заступніца Афінаў, ладзіць суд Арэста. На судзе Арэст апраўданы, але супраць героя было пададзена столькі ж галасоў, як і за яго. Цяжка лепей перадаць невырашальную драму індывіда, які жыве ў свеце, дзе законы больш не могуць бясспрэчна вызначаць, што ёсць дабро.

Дылему, з якой сутыкнуўся старажытны грэк, трагікі трактуюць як узвышаную. У класічнай жа камедыі яна набыла сатырычныя формы, у якіх найлепш адлюстроўваюцца абставіны, што яе спараджаюць. Так, напрыклад, Арыстафан у "Плютасе" выводзіць на сцэну бога багацця, які, аслеплены Зэўсам, раздае шчодрыя падарункі махлярам, а не сумленным людзям. Сумленныя вядуць бога ў храм, дзе Зэўс вяртае няшчаснаму зрок. Гэта выклікае вялікія змены ў паводзінах людзей: сікафант (чалавек, які ўзбагаціўся за кошт народа) лямантуе, што ён даведзены да галечы; старая кабета страчвае каханка, свайго ўтрыманца; Гермэс, бог гандлю, пазбаўлены дароў ад сваіх адданых прыхільнікаў і вымушаны зарабляць грошы як падкухцік; у святароў забралі іхны кавалак хлеба, бо ахвяраў багам болей не складаюць... Гэтая камедыя, пастаўленая ў Афінах на пачатку IV ст. да н. э., — адлюстраванне адвечнай супярэчнасці між дабром і багаццем.

Традыцыйна багатым чалавекам лічыўся землеўласнік, натуральны кіраўнік групы сялянаў, якія таксама мелі права на валоданне зямлёй. Багацце дазваляла ўласніку лепш выконваць сваю сацыяльную функцыю. "Нуварыш" збіраў грошы, каб задавольваць уласныя патрэбы і пазбегнуць сацыяльнай жорсткасці. Грошы і закон, багацце і справядлівасць з гэтых часоў рабіліся ворагамі.

Аднак старажытныя грэкі здолелі выказаць праблемы чалавека не толькі праз выдатныя літаратурныя творы, яны сталі таксама стваральнікамі філасофіі. Агульная і папулярная форма чалавечага мыслення — мысленне рэлігійнае. Праз рэлігію чалавек вызначае свой светапогляд, далучаецца да пэўнай сістэмы ўяўленняў пра абсалют.

Рэлігія старажытных грэкаў параўнальна з усходнімі рэлігіямі адлюстроўвала вышэйшую ступень развіцця мыслення: яна ўжо атаясамлівала абсалют, боскую сілу не з прыродаю, раслінамі, жывёламі, зоркамі, а з істотамі, якія маюць выгляд людзей, надзеленых выключнымі здольнасцямі, — багамі. Гэта крок у кірунку прызнання сведамасці абсалютам, бо ў чалавеку жыве сведамасць.

Аднак грэкі яшчэ не ўспрымалі чалавека ў якасці носьбіта сведамас-

ці, як мы ўспрымаем яго сёння і што складае аснову нашай канцэпцыі існаснай еднасці чалавечага роду. Грэкі ставілі сябе вышэй за іншыя, барбарскія, народы і лічылі гэтую зверхнасць прыроднай, натуральнай. Грэк усведамляў сябе вышэйшым за барбара, гэтак жа як і сярод птушак грыф ёсць і заўсёды будзе большы і мацнейшы за калібры. Грэкі жылі асобнымі полісамі, якія так і не здолелі задзіночыцца. Таму грэцкія багі адрозніваюцца ад барбарскіх: яны шматлікія і разнастайныя, бо кожны поліс меў сваіх багоў.

Шматлікасць багоў — слабасць грэцкае рэлігіі, і можна сказаць, што менавіта дзеля пераадолення гэтай слабасці і выпрацоўкі больш прымальнай канцэпцыі свету грэкі стварылі філасофію.

Часам філосафы адкрыта супрацьстаялі рэлігіі, аднак сама вядомыя мысляры рэлігію паважалі і крытыкавалі толькі асобныя яе аспекты[1]. Сапраўды, іх вучэнні адрозніваліся ад рэлігійных дактрын — яны былі арыентаваныя на людзей, згодных разважаць, прыкладаць цяжкія намаганні дзеля развіцця і максімальнага выкарыстання сваіх інтэлектуальных здольнасцяў.

Для грэкаў гэтыя намаганні перш за ўсё палягалі ў пошуках прыродных аб'ектаў, даступных нашым органам пачуццяў. Такі падыход падобны да падыходу навачасных фізікаў, якія спрабуюць адказаць на пытанне: з чаго складаецца матэрыя?

Згодна з Талесам з Мілета (першая палова VI ст. да н. э.), усё існае паходзіць з вады, а паводле яго вучня, Анаксімэна, усё стварылася з паветра.

Побач з матэрыялістычнай школай паўстала школа Пітагора, які развіваў тэзіс пра адрознасць між душой і целам. Душа — гэта несмяротны пачатак, уласцівы кожнай жывой істоце, які пераходзіць з цела ў цела (жывёл ці людзей), аж пакуль не атрымае ачышчэння і вызвалення, і тады трапляе ў нематэрыяльны свет багоў.

Пры канцы VI ст. да н. э. гэтыя дзве філасофскія плыні моцна крытыкавалі спачатку Геракліт, для якога змяненне — гэта аснова рэчаў ("нельга двойчы ўвайсці ў тую сама раку"), а потым элеаты, якія сцвярджалі, што змены, рух розумам спасцігнуць нельга: немагчыма зразумець, якім чынам Ахіл пераганяе чарапаху, бо за час, неабходны Ахілу, каб дагнаць яе, чарапаха сама праходзіць пэўны шлях.

Мы ўжо бачылі, што ў V ст. да н. э. паглыбляўся сацыяльны крызіс, выкліканы развіццём гандлю. І не трэба здзіўляцца, што філасофія ў той час паварочвалася да палітычных праблемаў. Узнікла новая школа, школа сафістаў, заснавальнік і галоўны прадстаўнік якой — Пратагор.

Ён абвясціў: "чалавек — мера ўсіх рэчаў", падкрэсліваючы тым

---

[1] *Напрыклад, Ксэнафан (VI ст. да н. э.) піша: "Усё, што Гамэр і Гесіёд прыдумалі пра багоў, варта асуджэння ўсімі і лічыцца прыкрым: крадзеж, бязладдзе, узаемны падман". (Пераклад з артыкула M.P.N. NILSSON, La Grèce, la mythologie, у кнізе Histoire générale des religions, Paris, Quillet, 1948, t.II, p.151.) На самой справе тое, што філосаф прыпісвае фантазіі паэтаў, паходзіць з народнай традыцыі.*

самым, што перадусім варта вывучыць чалавека, а не нежывы свет. А чалавек жыве ў грамадстве, значыць, трэба задацца пытаннем, што такое грамадства. Пратагор вучыў, што грамадства вынікае з патрэбы людзей абараніць сябе ад небяспекі, якая падсцерагае чалавека на кожным кроку, і грунтуецца на дамове, заключанай паміж людзьмі дзеля арганізацыі супольнай абароны. Людзі не здолелі б дасягнуць сваёй мэты, калі б Зэўс не надзяліў іх выключнымі між жывых істотаў якасцямі: павагай ці цнатлівасцю (αιδως), правам ці справядлівасцю (διχη)[1].

З гэтай канцэпцыі чалавечага грамадства вынікае, што законы, паводле якіх жывуць грамадзяне, могуць быць розныя, могуць змяняцца. І насуперак пашыранай думцы нельга прыпісваць ім боскае паходжанне (дарэчы, Пратагор вучыць, што нічога нельга даведацца пра багоў). Закон, які вынікае з дамовы, не ёсць закон прыроды.

А паколькі ў палітыцы няма нічога абсалютнага, кожны, хто хоча дасягнуць поспеху ў гэтай галіне, найперш павінны навучыцца перамагаць у дыскусіях і публічных спрэчках. Сафісты — гэта настаўнікі, якія вучылі, як "пакласці на лапаткі" апанента ў палітычнай дыскусіі[2].

Сацыяльны крызіс у грэцкіх полісах суправаджаўся глыбокім інтэлектуальным і маральным крызісам, самі філосафы ставілі пад сумнеў вартасць законаў поліса. Можна сказаць, што палітычная філасофія Платона і Арыстотэля, на эканамічным аспекце якой мы засяродзім асаблівую ўвагу, уяўляе спробу пераадолець інтэлектуальны крызіс, зняпраўдзіўшы вучэнне сафістаў, і адначасова спробу пераадолець сацыяльны крызіс праз рэарганізацыю поліса.

Ля вытокаў палітычнай філасофіі стаяў Сакрат, які не пакінуў пасля сябе пісьмовых твораў. Усё жыццё ён змагаўся з вучэннем сафістаў, сцвярджаючы, што грамадскае жыццё павінна падпарадкоўвацца правілам справядлівасці, якія маюць абсалютную вартасць. Плятон быў яго наўпроставым паслядоўнікам.

§ 2. Эканамічная дактрына Плятона

Плятон нарадзіўся ў 427 г. да н. э. у арыстакратычнай афінскай сям'і. Сталага ўзросту ён дасягнуў пад час разгару барацьбы за ўладу паміж багатымі сем'ямі. У 411 г. да н. э. на змену дэмакратычнаму праўленню прыйшла дыктатура рады 400, потым 5000, пакуль Спарта не навязала рэжым 30 тыранаў (404 г.), які, абапіраючыся на падтрымку

[1] *J.- A. Sinclair, Histoire de la pensée politique grecque, traduction française, Paris, 1953, p.65.*

[2] *Дактрына Пратагора прыраўноўваецца Арыстотэлем да поглядаў тых філосафаў, якія не прызнаюць "прынцыпу супярэчнасці". Арыстотэль піша, што, згодна з імі, абедзве супрацьлеглыя думкі могуць быць правільнымі адначасова, бо тое, што здаецца правільным нейкаму чалавеку, сапраўды правільнае. (Métaphysique, liv.IV, chap.V; cf. éd. Tricot, I, p.217, n.1).*

300 самых багатых сем'яў, пратрымаўся адзін год. Блізкія сваякі Плятона, яго стрыечны брат Крыт і яго дзядзька Хармід, узначальвалі алігархічную партыю; Плятону таксама, здавалася б, наканавана было пайсці па іх шляху.

Але ва ўзросце прыкладна 20 гадоў Плятон сустрэў Сакрата і перажыў глыбокі нутраны крызіс; з гэтага часу ён пачаў служыць толькі праўдзе і справядлівасці і тады пастанавіў (пра гэта напісаў у адным з лістоў)[1], што больш не лічыць для сябе магчымым браць беспасярэдні ўдзел у палітычнай барацьбе, гэтым прыкрым і брудным спаборніцтве. Дзеля плённасці мыслення трэба перш за ўсё абстрагавацца ад штодзённых падзеяў, каб адкрыць theoria, ці ісціну ў сузіранні.

Такім чынам Плятон увайшоў у перыяд развагаў, вынікам якіх сталіся яго першыя дыялогі: "Апалогія Сакрата", "Крытон", "Эўтыфрон", прысвечаныя памяці настаўніка; у "Пратагоры", "Іоне", "Гіпіі Меншым", "Гіпіі Большым", "Ляхесе", "Хармідзе" Плятон ужываў дыялектычна-іранічны метад Сакрата, каб паказаць людзям іх дрымучае невуцтва; нарэшце, "Горгій" і першая кніга "Рэспублікі"[2] закранаюць ужо праблему палітыкі. У прыватнасці, у "Горгіі" Плятон даводзіў, што прамовы рытараў не даюць падставы лічыць рытараў вышэйшымі за невукаў-кухараў. Той, хто сапраўды хоча быць карысны полісу, павінны натхняцца велічнай канцэпцыяй чалавечага шчасця, якое тоіцца не ў фізічным задавальненні, а ў дабрадзейным жыцці і ў асвеце бессмяротнае душы; ён, спазнаўшы парадак Сусвету — узор парадку для поліса, мусіць зразумець, што́ ёсць лад і справядлівасць.

Потым Плятон адправіўся ў вандроўкі: ён наведаў Егіпет, горад Кірэну, Італію і нарэшце, прыкладна ў 388 г. да н. э., Сіцылію. Ён імкнуўся даведацца пра норавы і грамадскае жыццё іншых краёў, а таксама спадзяваўся знайсці кіраўнікоў, здольных успрымаць мудрыя парады. У Сіракузах філосафа чакалі вялікія спадзяванні і вялікія расчараван-

[1] *Гл: Lettre VII, 324, c, d, e, і 325 a-e.*

[2] *Назоў гэтае кнігі ў расейскамоўнай традыцыі перакладаюць як "Дзяржава" (заўвага перакладніка).*

ні. Тут ён знайшоў сабе адданага вучня ў асобе Дыёна, зяця Дыяніса I тырана, але сяброўства Дыёна і філосафа дыскрэдытавала абодвух. Плятона выдалі спартанцам, і ён змог вярнуцца ў Афіны толькі пасля выплаты адкупнога.

Падобна, што няўдалы эксперымент не прывёў Плятона ў роспач, а, наадварот, пераканаў у неабходнасці таго, каб дзяржаўныя дзеячы спазнавалі навуковую мудрасць. У 387 г. да н. э. ён стварыў сваю "Акадэмію", у якой маладыя людзі, што абралі для сябе ніву грамадскай дзейнасці, вывучалі, што ёсць лад, займаючыся ў асноўным матэматычнымі прадметамі. Потым, у дзевяці апошніх кнігах "Рэспублікі", Плятон выклаў сутнасць сваіх палітычнай і грамадскай дактрынаў, што не перашкодзіла яму шырэй раскрыць сваю маральную дактрыну ў працах "Мэнон", "Федон" і "Бяседа" і развіць тэорыю існасці ў "Тээтэце" і "Парменідзе".

Вось жа, у 367 г. да н. э. сябар Плятона Дыён зноў звярнуўся да яго: Дыяніс Стары памёр, Дыяніс Малады прыйшоў да ўлады; жаданне стаць царом-філосафам яму быццам бы не бракуе, і Плятон пагадзіўся зноў наведаць Сіцылію.

Але другі эксперымент стаўся гэтакім жа няўдалым, як і першы: Дыёна выслалі ў Афіны, куды неўзабаве прыехаў і Плятон. У 361 г. да н. э. Дыяніс зноў пагадзіўся прыняць абодвух сяброў, нарэшце яны мусілі прызнаць сваю канчатковую паразу, зноў Плятон з вялікімі цяжкасцямі вярнуўся на радзіму.

Тады Дыён стаў падбухторваць Плятона выкарыстаць іншыя сродкі і далучыцца да збройнай экспедыцыі, якую ён арганізаваў супраць Дыяніса, але філосаф сурова асудзіў звяртанне да гвалту і парваў стасункі з вучнем. Праз чатыры гады таго забілі.

Перад смерцю, якая надышла ў 348 ці ў 347 г. да н. э., Плятон паспеў скончыць шматлікія творы: "Сафіст", "Палітык", "Крыт", "Тымэй", "Філеб" і ажно 12 кніг "Законаў", куды ўклаў усе здольнасці свайго розуму з мэтаю зноў адшукаць развязак сацыяльнай праблемы. І ў гэтым творы

можна прасачыць, наколькі шчыльна яго палітычная і эканамічная дактрына спалучаная з яго філасофскімі поглядамі.

Філасофія Плятона ўяўляе спробу выпрацаваць сінтэтычную канцэпцыю свету з пераадоленнем у ёй супярэчнасцяў папярэднікаў.

Перш за ўсё Плятон аспрэчвае і зняпраўджвае матэрыялізм "фізікаў", для каго існавала толькі тое, што можна ўспрымаць праз пачуцці, і якія шукалі тлумачэнне матэрыі ў самой матэрыі.

"Адны, — пісаў ён, — імкнуцца звесці да зямнога ўсё, што звязана з небам і з нябачным, г. зн. спалучаюць неспалучальнае. Абапіраючыся на спалучанае, яны сцвярджаюць, што існуе толькі тое, да чаго можна дакрануцца, што можна памацаць. Для іх цела і быццё — адно і тое ж, а калі нехта спрабуе суаднесці быццё з нечым іншым, чым з целам, яны адказваюць толькі знявагай і пасля гэтага нічога не хочуць чуць"[1].

Гэтым "фізікам", падкрэсліваў Плятон, варта адказаць так: калі яны вядуць гаворку пра чалавека, дык кажуць, што ён можа быць справядлівы або несправядлівы. Значыць, яны прызнаюць, што справядлівасць можа быць, а можа і не быць уласцівай чалавеку. Але ў такім выпадку нельга сцвярджаць, што справядлівасць — гэта нешта цялеснае[2].

Зняпраўдзіўшы матэрыялістычныя канцэпцыі свету, Плятон разгледзеў супрацьлеглыя погляды Пармэніда[3] і Геракліта. Для першага чалавечая думка можа спасцігнуць быццё, але толькі як адзіную абсалютную і нязменную рэальнасць. Другі, наадварот, даводзіў, што ў рэальнасці немагчыма знайсці ніякай устойлівасці, ніякай нязменнасці.

Плятон імкнуўся пераадолець гэтую супярэчнасць праз сцверджанне, што зменлівыя істоты бачнага свету — гэта адлюстраванне, імітацыя нязменных ідэяў, якія ўтвараюць свет вышэйшага кшталту.

Адначасова Плятон спрабаваў абысці дылему, створаную супярэчнасцю між вучэннем сафістаў і вучэннем яго настаўніка Сакрата.

Сафісты казалі, што маральныя правілы і законы поліса па сваёй сутнасці рэлятыўныя і зменлівыя. Сакрат жа аддаў

[1] *Le Sophiste, 246 a.*

[2] *Ibid, 247 a.*

[3] *Адзін з прадстаўнікоў школы элеатаў.*

сваё жыццё дзеля ідэі пра існаванне абсалютнай справядлівасці, вышэйшай, чым законы поліса.

Паводле Платона, гэтая супярэчнасць здымаецца, калі разглядаць чалавечыя законы толькі як больш-менш дакладную імітацыю ідэальнай справядлівасці, якая належыць да звышнатуральнага свету.

Платон не крытыкаваў рэлігійных веранняў, ён няспынна вёў гаворку пра свет багоў, аднак відавочна, што для яго народныя веранні ўяўляюць сабою досыць недасканалае выражэнне вышэйшай ісціны. Філасофія мусіць даць лепшае ўяўленне пра ісціну, меркаваў ён.

Філосаф называў светам ідэяў свет, які знаходзіцца над прыродай. Трэба, на яго думку, прызнаць існаванне гэтага свету. Калі мы вядзем гаворку пра пару пэўных прадметаў, то выкарыстоўваем ідэю дваістасці, ці "дыяды", якая ўласна гэтым прадметам не належыць. Гэтаксама ўласна прыгажосць не існуе ні ў адным адасобленым прадмеце, пра які мы кажам, што ён прыгожы. Трэба, каб ідэя прыгажосці існавала ў свеце, адрозным ад свету прыроды.

Дзякуючы існаванню чалавека, які належыць да свету матэрыяльных целаў і свету нематэрыяльных ідэяў, паміж абодвума гэтымі сусветамі існуе сувязь. Чалавек складаецца са смяротнага цела і з нематэрыяльнай і вечнай душы, якая паходзіць са звышнатуральнага свету і трапляе ў цела. Калі ўтвораная такім чынам чалавечая істота жыве дабрадзейна, дык пасля распаду цела душа вызваляецца і знаходзіць сваё месца ў сусвеце шчасця. Калі ж чалавек жыў недабрадзейна, дык пасля пакарання душа павінна зноў увасобіцца ў якое-небудзь цела.

Платон не пагарджаў целам і не асуджаў яго, як гэта часам здаралася пасля, ён толькі сцвярджаў, што цела — часовы прыпынак, а сапраўдная мэта чалавека — іншы свет.

У прынцыпе сёння пад уплывам хрысціянства гэта прызнаюць многія, але хрысціяне не заўсёды робяць такія ж строгія высновы, як Платон, бо для Платона *"грамадскае жыццё чалавека павінна быць арганізавана дзеля і з улікам яго будучага жыцця "пасля смерці"*.

Каб падрыхтаваць вызваленне сваёй душы, чалавек мусіць весці правільны лад жыцця, але правільнае жыццё — гэта жыццё, якое адпавядае "справядлівасці". Справядлівасць — адна з тых абсалютных ідэяў, якія ўтвараюць вышэйшы свет, пра якую чалавек захоўвае ўспамін у сваім зямным жыцці і якой яму трэба імкнуцца адпавядаць. Менавіта каб растлумачыць, што такое справядлівасць і як ёй можна адпавядаць, Плятон у "Рэспубліцы" падышоў да размовы пра арганізацыю грамадскага жыцця і ў першую чаргу пра арганізацыю эканомікі. Ён перакананы, што гэтая арганізацыя не самамэта і не мае ўласнай каштоўнасці. Зямное жыццё — гэта выпрабаванне для чалавека, падрыхтоўка да вечнага жыцця, вось чаму ён вядзе гаворку пра тое, як павінна быць арганізаванае жыццё ў грамадстве, каб душы змаглі ачысціцца.

Насуперак даволі распаўсюджанаму меркаванню Плятонава тэорыя грамадства развіта надзіва цэласна і лагічна: у "Рэспубліцы" ён акрэслівае рысы ідэальнай дзяржавы; потым, галоўным чынам у "Палітыцы" і "Тымэі", ён намагаецца растлумачыць, чаму рэальныя полісы настолькі далёкія ад дасканаласці; і, нарэшце, у "Законах" ён займаецца пошукам сродкаў, якія хоць трошкі наблізілі б рэчаіснасць да ідэалу.

А) Ідэальны поліс

Увесь дыялог "Рэспублікі" прысвечаны пошуку азначэння справядлівасці як у грамадстве, так і ў чалавеку. Паводле Плятона, ідэальны поліс — гэта выключна справядлівы поліс; тым самым вылучана галоўнае патрабаванне большыні будучых сацыяльных рэфарматараў.

1. ПАМЫЛКОВЫЯ ПАНЯЦЦІ СПРАВЯДЛІВАСЦІ. Заявіць, што філосаф у сваім дыялозе проста ўздымае праблему справядлівасці, — значыць не дамовіць да канца, бо дыялог пачынаецца дыскусіяй, настолькі багатай на варыянты развязанняў, што ніхто пасля Плятона, закранаючы гэтае пытанне, не здолеў сказаць нічога прынцыпова новага.

Спачатку сама банальную дэфініцыю нам прапануе стары Кефал, дабрадзейны і мудры грамадзянін: справядлі-

васць — гэта якасць, якая прымушае аддзячваць кожнаму тым, што ён зрабіў для цябе, якасць усіх, хто не хоча ведаць нічога, апроч дамоўленасцяў і іх бездакорнага выканання.

Філосафу лёгка даказаць, што сутнасць гэткай справядлівасці нічога не вартая: яна ніякім чынам не ўлічвае індывідуальнасці тых, хто заключае дамову, бо прыраўноўвае вар'ята да псіхічна здаровага, а ліхога — да добрага (тут мы ўжо маем крытыку ўсіх механістычных канцэпцый грамадскага жыцця), і, галоўнае, у выніку яе здольнасць зберагаць ды памнажаць маёмасць робіцца найважнейшай між якасцяў чалавека, а ад яе недалёка да ўмення жыць за чужы кошт[1].

Вось ланцужок так званага філосафа-сафіста Трасімаха. "Справядлівае, — абвяшчае ён, — гэта не што іншае, як выгаднае мацнейшаму"[2]. І сапраўды, тыя, хто кіруе, прымаюць выключна карысныя сабе законы, і справядлівасць зводзіцца да паслухмянства гэтым законам. Самі ж кіраўнікі ў такім разе не падпарадкоўваюцца справядлівасці; яны, наадварот, маюць усе выгоды, каб чыніць несправядлівасць.

У гэтым меркаванні ўжо праглядаюцца ўсе будучыя дактрыны зверхнасці сілы над мараллю. У адказ Платон абмяжоўваецца спакойнай заўвагай: "Добрыя грамадзяне згаджаюцца на ажыццяўленне ўладных функцый не таму, што гэта вельмі прыемна, а з-за таго, што саступаюць неабходнасці, бо не могуць перакласці гэта на лепшых людзей або на роўных сабе"[3].

Больш за тое, Платон дэманструе, што ўжыванне несправядлівасці — справа нявыгадная. Крыўда не забяспечвае поспеху ў дзеяннях, бо яна адзін з фактараў падзелу людзей, яна не прыносіць шчасця, бо супярэчыць самой прыродзе мудрасці; мудрасць патрабуе пашаны таго, што прызнаецца вышэйшым за цябе, тым часам як несправядлівае хоча перамагаць усіх і ва ўсіх выпадках[4].

---

[1] *République, liv.I, 334 a, b.*
[2] *Ibid., 338 c.*
[3] *Ibid., 347 c.*
[4] *Ibid., 348-352.*

Затым аўтар прапанаваў тэзіс, які, бясспрэчна, здаецца яму больш моцным і небяспечным, бо ў дыялозе гэты тэзіс палымяна адстойваюць два ягоныя браты — Гляўкон і Адымант. Яны таксама адмаўляюцца прызнаць, што ў аснове справядлівасці ляжыць нейкая трансцэндэнтная ідэя. Яны бяруць пад увагу толькі ўласцівасць чалавека заўжды шукаць асабістую выгаду. Калі законы існуюць, кажуць браты Плятона, і людзі іх трымаюцца, дык толькі таму, што палічылі больш выгадным прыняць законы, чым абыходзіцца без іх, і мяркуюць за лепшае падпарадкоўвацца гэтым законам. Сапраўды, відавочна, кожны, каму несправядлівы ўчынак абяцае выгаду і хто можа зрабіць яго ўпотай, абавязкова пойдзе на гэты ўчынак, як пастух Гігес, што меў здольнасць рабіцца нябачным. Між іншага, у штодзённым жыцці часцей за ўсё, нягледзячы на законы, несправядлівасць перамагае, асабліва калі яна спраўна выдае сябе за справядлівасць, сама ж справядлівасць асуджаецца.

Успамін пра Сакрата прысутнічае ў развагах усіх удзельнікаў дыялогу і нават не вымагае спецыяльных спасылак. Здаецца, адзін гэты ўспамін зводзіць на нішто ўсе канцэпцыі, якія падаюць справядлівасць вынікам эгаістычных інтарэсаў: калі справядлівасць прыводзіць да асуджэння наймудрэйшага з людзей, яна не вартая свайго найменння. Напрыканцы сваёй прамовы Адымант нават не просіць, каб выказалі аргументы супраць ягонай канцэпцыі, нікчэмнасць якой усведамляюць усе. Трэба, кажа ён, перайсці нарэшце ад вонкавага да глыбіннага, да самога жыцця душы; трэба ўважліва вывучыць неўтаймаваныя патрэбы душы, і, калі сярод гэтых патрэбаў знойдзецца тая, што адпавядае справядлівасці, дыскусійнае пытанне будзе развязанае.

2. УДАСКАНАЛЕННЕ САЦЫЯЛЬНАЙ СПРАВЯДЛІВАСЦІ. На першы погляд другая кніга “Рэспублікі”, створаная шмат пазней за першую, не паўстае як цалкам лагічны працяг вучэння яе аўтара, бо насуперак намерам, выказаным Адымантам, Плятон запрашае нас да роздуму аб грамадскім жыцці. Аднак, як стане бачна далей, думкі, выказаныя аб патрэбах душы, ні ў якім разе не будуць забытыя.

Плятон не баяўся падкрэсліць важкасць асабістага інтарэсу ў стварэнні полісаў, а таксама вызначальную ролю падзелу працы. Ён адзначаў, што грамадства — гэта аб'яднанне індывідаў, якія знаходзяць у супольным жыцці выгаду, бо яно дазваляе ім дзяліць паміж сабой абавязкі і ўсё болей і болей спецыялізавацца ў той ці іншай сферы дзейнасці. Гэтак нараджаюцца разнастайныя рамёствы, потым нутраны і замежны гандаль; з'яўляецца смак да раскошы, гэтаксама як і сродкі яго задавальнення, што выклікае вайну супраць суседніх полісаў. Тым часам у полісе ўжо існуюць два класы людзей: клас сялянаў, рамеснікаў і гандляроў, якія забяспечваюць матэрыяльны дабрабыт поліса, і клас ваяроў, ці ахоўнікаў, якія забяспечваюць абарону ад вонкавага ворага і адначасова нутраны парадак. Да іх трэба дадаць яшчэ клас кіраўнікоў, місія якіх — кіраванне сацыяльнай групаю.

Здольнасці людзей неаднолькавыя, таму розныя і іх прызначэнні. Вайсковая справа патрабуе якасцяў, якія маюць далёка не ўсе, — фізічнай сілы ў спалучэнні з "натураю філосафа", што дазваляе ваярам мужна змагацца з ворагам і адначасова праяўляць спагаду да суайчыннікаў. А што да кіраўніка дзяржавы, тут неабходная яшчэ больш рэдкая якасць — мудрасць, якая набываецца толькі праз сузіранне і пераадоленне спакусаў.

Трэба зрабіць так, каб людзі ўсведамілі, што іх здольнасці няроўныя; дзеля гэтага пераканаць, што яны належаць да трох розных расаў: залатой, сярэбранай і бронзавай[1].

Зразумела, сам філосаф вельмі добра ведаў, што байка аб трох расах не мае пад сабой аніякага грунту. Выпадак, а не спадчыннасць вызначае якасці людзей, а значыць, трэба арганізаваць сярод іх вельмі старанны адбор, пачынаючы з самага маладога ўзросту, каб вылучыць тых, хто сапраўды варты належаць да вышэйшых класаў.

Напачатку ўсім трэба даваць аднолькавую ў інтэлектуальным, маральным і фізічным плане адукацыю. Потым на

[1] *République, liv.III, 415 a.*

пэўным этапе найлепшых адбяруць у клас ваяроў. Каб падрыхтаваць іх да ажыццяўлення гэтай функцыі, ім дадуць больш глыбокую адукацыю. І зноў будуць адабраныя самыя вартыя, хто, дасягнуўшы пэўнага ўзросту, зможа стаць кіраўніком. Гэты другі этап адбору галоўным чынам будзе заснаваны на выпрабаваннях духу, мэта — выявіць здольных не паддацца спакусе асабістай выгады і прыцягальнай сіле задавальнення.

Арганізаваны такім чынам поліс дакладна адпавядаў бы лагічным патрэбам жыцця ў грамадстве, значыць, ён быў бы дасканалы. Але дасканалы поліс мусіць быць надзелены ўсімі станоўчымі якасцямі і насамперш чатырма асноўнымі: мудрасцю, мужнасцю, памяркоўнасцю і справядлівасцю.

З чаго складаюцца тры першыя якасці, вызначыць няцяжка: поліс мудры — калі добрыя кіраўнікі разумна ім кіруюць, мужны — калі ён ахоўваецца бясстрашнымі ваярамі, і памяркоўны — калі ў ім ніжэйшыя падпарадкоўваюцца вышэйшым[1].

Але з чаго складаецца справядлівасць, якая і ёсць мэтаю Плятонавага даследвання? Такое ўражанне, што яна ўвесь час, як хітрая дзічына, унікае нашага зроку. Але ўзапраўды мы ўжо трымаем яе ў руках, бо вядзем гаворку толькі пра яе. Насамрэч, ці не праява гэта несправядлівасці, калі індывід займае ў грамадстве не тое месца, на якое ён можа прэтэндаваць паводле сваіх прыродных якасцяў? Такім чынам, калі мы непакоімся пра рацыянальны падзел на сацыяльныя катэгорыі і пра арганізацыю адбору сярод маладых грамадзян з мэтай іх размеркавання на класы, якім яны адпавядаюць па сваіх здольнасцях, мы ажыццяўляем прынцып сацыяльнай справядлівасці, умовы і адначасова вяршыні ўсіх іншых якасцяў.

Кожнаму — сацыяльную функцыю, якой ён заслугоўвае, зыходзячы з яго фізічных, інтэлектуальных і маральных якасцяў, — такая, можна сказаць, была для Плятона дэфініцыя сацыяльнай справядлівасці. Гэткае азначэнне адрозніваецца ад навачасных малой увагаю да праблемы размеркавання багацця паміж людзьмі, аднак ідэя падзелу людзей у

[1] *Ibid., liv.IV, 432 a.*

залежнасці ад іх асабістых якасцяў усё яшчэ знаходзіцца ў цэнтры нашых клопатаў.

3. ВАЛОДАННЕ ЎЛАСНАСЦЮ. Для Плятона, аўтара "Рэспублікі", пытанне атрымання багацця тым ці іншым індывідам ні ў якім разе не паўстае як пытанне справядлівасці. Паводле Плятона, індывід не мае ніякага права на грамадскі набытак, а мае толькі абавязак жыць у адпаведнасці з сваёй грамадскай функцыяй.

Зыходзячы з гэтага гледзішча, неабходна, каб ваяры і кіраўнікі мелі досыць часу на ажыццяўленне сваіх функцый, з аднаго боку, і каб яны не псавалі сабе душаў справамі, якія маюць дачыненне да грошай і гандлю, з другога. Менавіта з гэтае прычыны трэба ўзяць за абсалютны прынцып, што ваяры і кіраўнікі не мусяць працаваць, а павінны ўтрымлівацца за кошт ніжэйшага класа і жыць супольна, як войска ў паходзе, не маючы ва ўласнасці нічога і нават не карыстаючыся грашыма[1].

Пра эканамічную сістэму, у якой працуе ніжэйшы клас, Плятон наагул нічога не пісаў, але ён дапускаў існаванне тых, хто можа валодаць уласнасцю і займацца абменам. Аднак у іншым месцы філосаф зазначыў, што нельга, каб рамеснікі былі занадта багатыя ці занадта бедныя, бо "ганчар, які ўзбагачаецца, робіцца дрэнным ганчаром"[2].

І наадварот, агульнаведамае жаданне Плятона знішчыць усялякае пачуццё ўласнасці ў прадстаўнікоў вышэйшых класаў. Нягледзячы на пратэсты сваіх прыхільнікаў і насуперак уласнаму сумленню — згрызотаў сумлення ён не хавае — Плятон адстойваў прынцып агульнасці жонак і дзяцей. Па дасягненні пэўнага ўзросту мужчыны і жанчыны пераходзяць у катэгорыю прадаўжальнікаў роду, і працэс узнаўлення роду мусіць быць арганізаваны такім чынам, каб нельга было даведацца, ад каго нарадзілася дзіця: усіх дзяцей будуць называць братамі і сёстрамі, а дзеці будуць называць бацькамі і маткамі ўсіх грамадзян, што маглі даць ім жыццё.

Было б абсурдна падазраваць Плятона ў патуранні сек-

[1] *République, liv.III, 415 d.*
[2] *Ibid., liv.IV, 421 d.*

суальнай разбэшчанасці. На яго думку, ёсць сур'ёзныя падставы ў абарону гэткае сістэмы: ён хацеў надаць вышэйшым класам шчыльнае адзінства, стварыць з іх адну вялікую сям'ю; а з другога боку, як перакананы феміністка спадзяваўся дзякуючы ажыццяўленню такога праекта скасаваць інстытуцыю сям'і і даць жанчынам магчымасць атрымліваць аднолькавую з мужчынамі адукацыю, а пасля й надзяліць жанчын такімі ж функцыямі ў полісе, што мае падвоіць сілы апошняга.

* * *

Для дэфініцыі справядлівасці давялося ў значнай ступені абапірацца на утылітарныя разважанні, але гэта не азначае, што утылітарны аспект складае аснову справядлівасці, наадварот, трэба прызнаць, што якасці грамадзян вызначаюць якасці грамадства[1].

Грамадства не можа быць справядлівае само па сабе, калі справядлівасці няма ў грамадзянах. Такім чынам, існуе таямнічая адпаведнасць паміж структурай душы і структурай грамадства: душа, гэтаксама як і поліс, складаецца з трох частак, а менавіта з жадання, гневу і розуму, і яна справядлівая, калі кожная з трох частак займае належнае ёй месца. Але ж несумненна таксама, што, згодна з вучэннем Платона, сацыяльная справядлівасць — гэта ўмова дасягнення справядлівасці ў душах: вартасці індывідаў і грамадства стаяць на супольным падмурку і ўзаемна падтрымліваюцца.

Зразумела, што пры такім падыходзе няма месца праблеме, якая пазней стала класічнай, — праблеме зверхнасці дзяржавы над індывідам ці індывіда над дзяржавай. Для Платона як дзяржава, так і індывід падпарадкоўваюцца прынцыпу здзяйснення аб'ектыўнага Дабра, да якога індывід мусіць няспынна імкнуцца.

Толькі аднаго разу філосаф закрануў праблему дачынненняў між індывідам і грамадствам, задаючы сабе пытанне, а ці не прыносіцца ў ахвяру асабістае шчасце ваяроў, калі яны змушаныя весці гэтакі суровы лад жыцця. І адказвае, што варта клапаціцца не пра шчасце той ці іншай групы, а

[1] *République, liv.IV, 435 e.*

пра шчасце грамадства ў цэлым, бо калі поліс шчаслівы, дык немагчыма, каб ваяры не былі шчаслівыя агульным шчасцем, у дасягенне якога яны робяць свой уклад[1].

Б) Рэальныя полісы

Карціна, якую мы дагэтуль малявалі, чыста ідэальная, і на гэты конт у філосафа ніякіх ілюзій няма, бо апошнюю частку дыялогу "Рэспублікі" ён прысвячае апісанню несправядлівасці, якая ў разнастайных формах пануе ў рэальным свеце.

Чатыры вельмі недасканалыя рэжымы змяняюць адзін другога ў вядомых нам полісах: хібы старога рэжыму спараджаюць прыход новага, і ўсялякая стабільнасць робіцца немагчымай.

Ідэальнай формай кіравання была б арыстакратыя ва ўласным сэнсе гэтага слова, г. зн. улада лепшых, сістэма, разгледжаная на папярэдніх старонках. Замест гэтага мы найчасцей сустракаем выродлівую форму арыстакратыі — тымакратыю, або ўладу вайскоўцаў, пры якой іншыя грамадзяне зведзеныя да прыгоннага стану.

Але неўзабаве ў вайскоўцаў прачынаецца смак да багацця, і адбываецца пераход да алігархіі, або ўлады багатых. Ніякі палітычны лад Плятон не крытыкуе так сурова, як алігархію, нельга забыць выразы, у якіх ён выказвае сваю пагарду да алігархічнага чалавека, "бруднай істоты, што з усяго прыбытак вытрасе"[2].

Пры такой форме кіравання, аднак, няроўнасць размеркавання багацця няспынна павялічваецца, і ўсё глыбейшай робіцца бездань паміж "небаракам-бедняком, высахлым ды асмаленым на сонцы" і "ўкормленым багатыром, што распаўнеў, седзячы ў халадку"[3]. Такое становішча непазбежна прыводзіць да паўстання беднякоў і ўвядзення дэмакратыі.

Звонку здаецца, што дэмакратыя — сама прывабны з усіх рэжымаў, бо яна нібыта надзяляе кожнага індывіда свабодай. Аднак у аснову дэмакратыі закладзеная фунда-

[1] *Ibid, 420 b.*
[2] *Ibid., VIII, 554 a.*
[3] *Ibid., VIII, 556 d.*

ментальная памылка: яна дае роўныя правы людзям, хоць людзі па сваёй прыродзе няроўныя[1].

Таму дэмакратыя непазбежна перастае дбаць пра галоўнае — выхаванне людзей, тыя трапляюць у палон да ўласных памкненняў, п'янеюць ад свабоды, трацяць здольнасць цвяроза меркаваць аб вартасці чалавека. Усё канчаецца тым, што ўладу давяраюць чалавеку, абранаму няўдала, і ён неўзабаве робіцца тыранам.

Нарэшце Плятон стварае маляўнічую і вечна актуальную карціну тыранічнай улады: сцісла пераказаць такія старонкі немагчыма[2].

* * *

"Рэспубліка" завяршаецца на такім вось песімістычным малюнку, аднак філосаф не можа спыніцца на гэтым. Спачатку яму трэба паспрабаваць растлумачыць, чаму існуе, як ён гэта паказаў, такі велізарны разрыў паміж ідэалам і рэчаіснасцю.

Тыя ж асобы, што бралі ўдзел у дыялозе *"Рэспубліка"*, фігуруюць і напачатку новага дыялогу *"Тымей"*, просячы Сакрата растлумачыць прычыну недасканаласці свету.

Мудрэц бярэцца адказаць ім, выкарыстоўваючы прыклады з антычных традыцый і рэлігійных міфаў. Ён доўга тлумачыць, якім чынам з душы і цела ўтварыўся чалавек, ды так, што часам цела можа дамінаваць над душой, што прыводзіць да безразважнасці.

Ідэя знаходзіць працяг у наступным дыялозе "Крыт": нам паказваецца, што ў дагістарычныя часы Афінамі кіраваліся інстытуцыі, цалкам падобныя на інстытуцыі, апісаныя ў "Рэспубліцы"[3]. Іншыя полісы таксама кіраваліся беззаганна, аднак адзін з іх, слынная Атлантыда, знаходзіўся пад уладаю надта аўтарытарных правадыроў, якія, аслепленыя ўладай, дэградавалі. Гэта паклікала да вайны з Афінамі, якую спыніла знікненне Атлантыды пад вадой у выніку жудаснага прыроднага катаклізму. Але вайна доўжылася дастаткова,

[1] *République, VIII, 558 c.*
[2] *Ibid., 562-571.*
[3] *Critias, 110.*

каб Афіны таксама заразіліся хваробай Атлантыды: пачаўся заняпад Афінаў.

Нарэшце гэтая праблема ва ўсім сваім комплексе разглядаецца ў трэцім дыялозе, які мае назоў "Палітык". Аўтар падкрэслівае, што кіраванне людзьмі карэнным чынам адрозніваецца ад пасьбы статка, бо пастух — гэта істота вышэйшага за жывёлу роўню, а вось кіраўнік поліса такі ж чалавек, як і іншыя. Гэтае парадаксальнае становішча можа тлумачыцца толькі радыкальнымі зменамі ў першапачатковым светаўладкаванні.

Напачатку светам кіраваў сам Бог, і пра шчасце клапаціўся нябесны пастыр: тады сям'і не існавала, не трэба было працаваць, не было й палітычных утварэнняў, людзі выходзілі з зямлі, як расліны, і адразу ж знаходзілі даволі ўсяго, што ім патрэбна. Гэта век Хронаса, ці залаты век.

Цяпер, піша Плятон, эпоха Зэўса, і Бог пакінуў свет на волю лёсу. Спачатку гэткая свабода бянтэжыла людзей, але калі ж яны ўзяліся весці рэй свайго жыцця самі, дык перш ім гэта ўдавалася больш-менш няблага, бо яны абапіраліся на ўспаміны пра свой даўнейшы стан. Аднак з часам гэтыя згадкі пасціраліся з памяці і пачаўся заняпад. Цяпер мы знаходзімся на стадыі заняпаду і няма ніякіх падставаў спадзявацца, што на змену гэтай стадыі прыйдзе эра дасканаласці, перш чым новае божышча не возьме ў свае рукі стырно ўлады[1].

Аднак гэта не азначае, што кіраўнікі полісаў не ў стане зрабіць нічога карыснага. Іх можна параўнаць з ткачамі, якія павінны з нітак рознай якасці саткаць як мага больш трывалую матэрыю. Сёння ў кожным чалавеку прысутнічае ў той ці іншай прапорцыі боскае і жывёльнае; трэба забяспечыць перавагу боскага над жывёльным, і тады, магчыма, часткова вернецца страчаная гармонія.

В) Магчымы поліс

Яшчэ ў дыялозе "Рэспубліка" выразна пастаўлена пытанне: ці можна ажыццявіць ідэю дасканалага поліса? Сакрат у дыялозе адказвае на яго з мноствам "але". Перш за

[1] *Politique, 272 b.*

ўсё, кажа ён, малюнак не стане горшым ад таго, што яго нельга давесці да канца: важна нават паказаць, што да ідэалу можна наблізіцца[1]. Відавочна, найбольш цяжка ажыццявіць умову, каб царамі рабіліся сапраўдныя філосафы, тыя, хто можа скласці дасканалую канстытуцыю, якую б добраахвотна ўхвалілі грамадзяне. Гэта, аднак, магчыма і, зрэшты, верагодна, што дасканалы поліс ужо існуе ў нейкай невядомай нам краіне[2].

Плятон сапраўды ніколі не адмаўляўся ад ажыццяўлення сваіх праектаў сацыяльных пераўтварэнняў, і напрыканцы жыцця, калі пасля шматлікіх паразаў ён пісаў сама значны з сваіх дыялогаў — "Законы", яго турбавала менавіта гэта.

У "Законах" мы маем шэраг прававых тэкстаў, што датычаць асноўных момантаў палітычнага і сацыяльнага ладу поліса. Кожнаму з гэтых тэкстаў папярэднічае прэамбула (можна сказаць, тлумачэнне матываў). Але перад тым, як выкласці свае погляды, філосаф хоча ўдакладніць, якое значэнне ён надае праграме, г. зн. паказаць умовы, неабходныя для яе ажыццяўлення. Пра гэта ідзе гаворка ў чатырох першых кнігах.

Нагадаўшы, што мэта палітыкі — перамога дабра над ліхам, і падкрэсліўшы важнасць выхавання моладзі, Плятон яшчэ раз вяртаецца да прычынаў заняпаду полісаў, на гэты раз крыху падрабязней аналізуючы ўласна гістарычную перспектыву.

Ён дапускае, што ля вытокаў нашай цывілізацыі стаялі некалькі горных пастухоў, якія адны толькі і выратаваліся ад страшэннага патопу, калі загінула ўсё жывое. Гэтыя людзі былі простыя і добрыя, знаходзячыся большую частку часу ў ізаляцыі, яны вельмі радаваліся сустрэчам; між сабою яны не сварыліся, бо не былі ні багатымі, ні беднымі.

Паступова ўтвараліся супольнасці. Відавочна, што першай з іх была сям'я, і з гэтага вынікае, што з усіх формаў улады найсправядлівейшая — улада галавы сям'і.

Потым з практычных меркаванняў супольнасці буйнелі: узніклі царствы, звязы, імперыі. Першапачаткова грамадскі

[1] *République, 472, 473.*
[2] *République, 499 d.*

лад гэтых утварэнняў быў справядлівы, бо яны складаліся з людзей аднолькавага роўню багацця. Перад імі не паўставала неразвязальнай праблемы выраўноўвання багацця, якая сёння паўстае на шляху кожнага рэфарматара[1].

Ды чалавек можа памыляцца, і мноства недасканаласцяў пранікла ў грамадскі лад: улада саслабла, пашырыўся дух недысцыплінаванасці, і, галоўнае, з прычыны згубнай блізкасці мора ўзнік гандаль, які "спарадзіў у душах людзей схільнасць ніколі не стрымліваць абяцанняў і несумленнасць"[2].

З гэтых часоў, каб увесці ў полісе лепшы лад, патрэбны быў добры тыран, які б дазвання знішчыў былыя інстытуцыі, увёў новыя і пераканаў бы народ у іх карыснасці. Плятон асабліва падкрэсліваў неабходнасць выраўноўвання багацця, бо, пакуль існуе клас жабракоў, не вычарпаецца крыніца рэвалюцый.

Але як усталяваць роўнасць? Сілаю пераразмеркаваць багацце? Але гэтым будуць створаныя падставы для крыўды і варожасці паміж грамадзянамі, што супярэчыць вызначанай мэце — усталяванню сацыяльнага міру. Ці можна разлічваць на тое, што з часам удасца пераканаць багатых падзяліцца з беднякамі часткаю багацця? Было б вялікай ілюзіяй спадзявацца на іхную добразычлівасць, зазначаў Плятон[3].

Значыць, трэба адмовіцца ад спадзяванняў рэфармаваць поліс, дзе ў размеркаванні багацця пануе няроўнасць. Але ўявім, што размова ідзе аб заснаванні калоніі эмігрантаў. Праблема эканамічнай няроўнасці адпадзе (за тымі часамі галоўным багаццем была зямля, якую нельга забраць з сабой). Такім чынам, ёсць надзея стварыць гарманічныя грамадскія інстытуцыі ў зусім новым полісе.

Фактычна ў дыялозе "Законы" гутарку вядуць грамадзяне, кожны з якіх прадстаўляе свой поліс — адпаведна Афіны, Лакедэмон і Крыт; амаль адразу крыцянін паведамляе, што ён упаўнаважаны сваім полісам заснаваць новую калонію.

Значыць, будзе прапанавана праграма надзвычай свое-

[1] *Lois, 684 d.*
[2] *Lois, 705 a.*
[3] *Ibid., 736 d.*

асаблівая. Размова тут ідзе зусім не аб нейкай рэвалюцыйнай праграме і нават праграме рэформаў, а аб распрацоўцы законаў для новага поліса, які ствараецца ў сама спрыяльных умовах.

Які ж павінны быць лад гэтага новага поліса? Уражвае тое, што гэтым разам філосаф перадусім спыняецца на праблеме арганізацыі эканамічнага жыцця: гаворка фактычна ідзе ўжо не аб ідэальнай карціне, а пра будову поліса для рэальных, са сваімі заганамі, людзей, нягледзячы на наяўнасць найспрыяльнейшых умоваў. Такім чынам, Плятон адкрыў, што адзіную вялікую перашкоду для сацыяльных рэфарматараў складаюць эканамічныя праблемы.

Наша галоўная мэта — усталяваць сяброўскія дачыненні паміж усімі грамадзянамі поліса[1]. Які ж эканамічны і сацыяльны лад найлепей адпавядае гэтай мэце?

Адзіны сродак, паводле Плятона, — гэта абсалютна супольнае валоданне маёмасцю, жанчынамі і дзецьмі, бо "ў сяброў усё супольнае".

Плятонаў камунізм паўстае як ідэал, даступны разуменню кожнага, але філосаф тут жа дадае, што не трэба здзіўляцца, калі заканадаўца палічыць гэтую камуністычную праграму занадта амбітнай; у такім выпадку трэба прапанаваць яму іншыя варыянты, безумоўна, меней дасканалыя, але лягчэй здзяйсняльныя. Менавіта пра гэта пойдзе гаворка далей.

Найбольш просты сродак усталявання сяброўскіх дачыненняў паміж грамадзянамі — надзяліць усіх аднолькавай уласнасцю і прымусіць весці аднолькава сціплы лад жыцця[2]. Адсюль вынікае, што ўсе будуць мець аднолькавыя правы на пашану і на ажыццяўленне функцый у полісе.

Асновай сацыяльнай арганізацыі будзе сям'я манагамная, але пад пільным кантролем дзяржавы нявернасць будзе караца, а правы жанчын — абараняцца[3]. Кожная сям'я будзе мець асобнае жытло. У выпадку несумяшчальнасці сужэнцаў яны могуць развесціся, але пасля разводу кожны

[1] *Lois, 738 d.*
[2] *Lois, 741.*
[3] *Ibid., 841, 873.*

з іх павінны пабрацца шлюбам з тым, каго яму прызначыць дзяржава (меркавалася, што такім чынам удасца пазбегнуць шматлікіх разводаў).

Кожная сям'я атрымае аднолькавы надзел зямлі, якія не можа быць адчужаны і мае быць перададзены аднаму спадкаемцу; валодаць золатам і серабром будзе забаронена, каштоўныя металы будуць назапашвацца для замежнага абмену (гэта правобраз сучаснага кантролю за валютнымі аперацыямі); будзе забаронена таксама перадаваць у заклад, даваць пасаг дачцэ, пазычаць пад высокі працэнт. З мэтаю стрымаць прагу нажывы ўводзяцца абмежаванні на выдаткі для сямейных святаў[1].

Паколькі, нягледзячы на ўсе перасцярогі, няроўнасць можа ўзнікнуць, трэба будзе арганізаваць сістэму падаткаў, якая б аднаўляла роўнасць матэрыяльнага становішча ўсіх грамадзян (вельмі сучасны погляд). Кожны раз, як толькі багацце якой-небудзь сям'і перавысіць кошт чатырох сямейных надзелаў, лішак будзе канфіскоўвацца[2].

Відавочна, такая сістэма прадугледжвае, каб усе грамадзяне займаліся сельскагаспадарчай дзейнасцю і каб, з другога боку, іх колькасць заставалася строга нязменнай; згодна з Плятонам, поліс заўсёды мусіць налічваць дакладна 5040 грамадзян. Гэтая лічба была выбраная таму, што яна кратная ўсім лічбам ад 1 да 12, з выняткам 11, што мае палегчыць працу адміністрацыйных органаў. Лішнія будуць абавязаны пакідаць поліс і засноўваць новыя калоніі. Дарэчы, усе рамёствы будуць даручаныя неграмадзянам поліса[3]. Гэты крок, гэтаксама як і дапушчэнне рабства, значна спрашчае працу заканадаўцы.

Але функцыяй дзяржавы павінна быць не толькі падтрыманне роўнасці. Апрача гэтага, дзяржава мусіць кіраваць вытворчасцю і размеркаваннем прадукцыі: правілы збору ўраджаю будуць падрабязна зафіксаваныя[4], іншаземцам забаранялася займацца больш чым адным рамяством[5]. Эк-

[1] *Ibid., 740-742.*
[2] *Ibid., 744 b, c.*
[3] *Lois, 846 d.*
[4] *Ibid., 844 c.*
[5] *Ibid., 846 d.*

спарт ды імпарт планавалася ажыццяўляць толькі з дазволу уладаў[1].

Увесь ураджай будзе падлічвацца і размяркоўвацца на 12 частак, па адной на кожны месяц. Кожная дванаццатая частка ў сваю чаргу будзе размеркавана на тры часткі — долі адпаведна грамадзян, іх рабоў і іншаземцаў. Такім чынам, дзве траціны ўраджаю грамадзяне пакідалі б сабе і сваім рабам[2] і толькі адна траціна прызначалася б для строга рэгламентаванага продажу на рынках пад пільным наглядам уладаў. Гэтая частка будзе прадавацца неграмадзянам поліса, якія наўзамен прапануюць вырабы сваіх рамёстваў[3].

Такі эканамічны лад прадугледжвае развітую палітычную і адміністрацыйную арганізацыю грамадства. Плятон настойвае, што ў прынцыпе ўлада мусіць належаць толькі мудрацам, мудрасць павінна быць адзінаю крыніцаю іх улады. Аднак гісторыя сведчыць: калі не спалучаць разнастайных дапушчальных механізмаў прызначэння кіраўнікоў, поліс коціцца да тыраніі[4], а з другога боку, трэба ўлічваць волю грамадзян да свабоды, неабходнай для развіцця сяброўскіх дачыненняў паміж імі[5]. З гэтых дзвюх прычынаў філосаф схіляецца да дэмакратычнай сістэмы прызначэння кіраўнікоў і чыноўнікаў. Аднак тут паўстае сур'ёзная праблема: ці не будзе пры гэтым парушаная сацыяльная справядлівасць, якая патрабуе, каб кожны займаў месца, адпаведнае яго асабістай вартасці? Плятон кажа, што праз сістэму выбараў на дзяржаўныя пасады сапраўднай справядлівасці ці сапраўднай роўнасці дасягнуць, вядома, нельга[6], і давядзецца спадзявацца на ўсталяванне прыблізнай справядлівасці.

Пры кожнай магчымасці будуць улічвацца асабістыя якасці індывідаў. Вартавыя законаў і суддзі будуць выбірацца,

[1] *Ibid., 847 c.*
[2] *Ibid., 846.*
[3] *Ibid., 849.*
[4] *Ibid., 689.*
[5] *Ibid., 693 d.*
[6] *Ibid., 757.*

але яны павінны таксама вытрымаць экзамен[1]. Апрача таго, прадугледжваецца вельмі складаная сістэма выбараў з мэтаю пазбегнуць паспешлівых прызначэнняў і перадвыбарнай дэмагагічнай агітацыі, такая ж працэдура будзе выконвацца і ў прызначэнні сяброў рады[2]. У цэлым можна сказаць, што філосаф імкнецца стварыць нешта сярэдняе паміж манархіяй і дэмакратыяй. Трэба адзначыць, што суддзі, згодна з праектам, працавалі б бясплатна[3], што павінна было адахвоціць сквапных.

Нарэшце, дзесяць вартавых законаў, найстарэйшыя плюс грамадзяне, якія атрымалі статус "самых заслужаных", плюс некалькі маладых, абраных вышэйпамянёнымі грамадзянамі, складаюць начную раду, названую гэтак таму, што яна будзе збірацца заўсёды на досвітку, бо менавіта ў гэтым часе наш розум найменш затлумлены асабістымі справамі. Функцыя гэтай рады — сачыць за захаваннем першапачатковых законаў поліса.

Плятон прадугледзеў і шмат іншых заканадаўчых актаў для самых розных сфераў жыцця (ад пытанняў культу да парадку правядзення хаўтураў). Напрыканцы велізарнага твора, найбольшага з усіх, напісаных у гэтай галіне, філосаф не выказаў празмернага аптымізму. Нават калі дадзеныя законы ўвядуць, заявіў Плятон, будучыня поліса будзе залежаць ад таго, каго абяруць на пасады суддзяў і кіраўнікоў. І толькі ў тым разе, калі гэтыя людзі надзеленыя "філасофскаю натурай" і валодаюць дастатковай філасофскай культурай, поліс будзе працягваць жыць у гармоніі. А гармонія можа і знікнуць, нават калі будуць выпрацаваныя працэдуры прызначэння ўлады. Заснавальнік поліса — гэта, так бы мовіць, ігрок у косці: ён можа выйграць, а можа і прайграць[4].

[1] *Ibid., 753-754.*
[2] *Ibid., 756.*
[3] *Ibid., 921 c.*
[4] *Ibid., 968.*

§ 3. Значэнне Плятонава ідэалізму

Плятон прагна шукаў развязання праблемы, узнятай для грэцкай цывілізацыі імклівым назапашваннем багацця́ў у выніку гандлёвай дзейнасці.

Вучань Сакрата, які "вынайшаў маральнасць" (Гегель), Плятон стаяў на пазіцыях маралізму, калі казаў, што трэба, каб у грамадстве не было ніякай магчымасці рабіць учынкі, якія псуюць чалавечую душу, перадусім займацца гандлёвай дзейнасцю.

На гэтай падставе Плятон прыйшоў нават да адмаўлення патрэбы гандлю, які ў тую эпоху быў рухавіком эвалюцыі свету, і намагаўся вярнуць грамадства ў яго першабытны стан. Ён у захапленні ад Спарты, якая ў значна большай ступені параўнальна з Афінамі захавала традыцыі, і запазычваў адтуль шмат якія рысы ідэальнага поліса, апісанага ў "Рэспубліцы".

Разам з гэтым Плятон хацеў захаваць усё тое станоўчае, што было ў тагачасных інстытуцыях, а менавіта роўнасць грамадзян перад законам незалежна ад іх паходжання. Паколькі філосаф не верыў у дэмакратыю, у сэнсе прызначэння кіраўнікоў натоўпам, ён адстойваў сістэму адбору кіраўнікоў шляхам інтэлектуальных і маральных выпрабаванняў.

Вывучэнне твораў Плятона пакідае ўражанне, што, нягледзячы на кампрамісы, на якія ён быў вымушаны ісці, каб лепей прыстасаваць сваю тэорыю да канкрэтных умоваў сацыяльных рэформаў, ён не змог стварыць вучэнне, прыдатнае для ажыццяўлення на практыцы, перадусім таму, што не здолеў развязаць праблемы амаральнасці, гвалту і прымусу.

І ў гэтым найбольш яскрава праяўляецца маралістычная аснова Плятонава падыходу. На яго думку, кожны ўчынак маральны або амаральны сам па сабе незалежна ад акалічнасцяў; напрыклад, выкарыстанне сілы *заўсёды* амаральнае. Філосаф не дапускае, што адказ гвалтам на гвалт у інтарэсах агульнага дабра можа быць законны. Відавочна, што такая філасофія забараняе ўсялякія палітычныя акцыі, а значыць, яе наканаванне — утопія.

Але відавочна і тое, што дзякуючы глыбіні і красамоўнасці, з якой Плятон уздымаў палітычныя пытанні, ягоная творчасць — сапраўдны пункт адліку для эканамічнай і сацыяльнай філасофіі нашай цывілізацыі. Праўда, і Плятонава перакананасць у першачарговай значнасці філасофіі і палітычных навук таксама вартая асэнсавання.

У цэнтры філасофіі Плятона знаходзіцца рэфлексія пра справядлівасць у душы і ў палітычным жыцці. На яго думку, філасофія ні ў якім разе не ёсць чыста абстрактная спекуляцыя, адарваная ад жыцця. Сапраўдная задача філосафа — гэта выпрацоўка законаў, якія зробяць поліс (грамадства) адпаведным прынцыпу справядлівасці і ператвораць яго ў дзейны сродак выратавання душаў.

Спазнанне таго, што ёсць дабро і справядлівасць для індывіда і для поліса, — гэта найважнейшыя і адзіна сапраўдныя веды. Веды, здабытыя непасрэдным, пачуццёвым успрыманнем, з'яўляюцца павярхоўнымі меркаваннямі (δόξα) пра рэчы. Матэматычныя веды (διανοια) — гэта ўжо веды вышэйшага роўню, але яны грунтуюцца на недаказальных пастулатах і не могуць цалкам вытлумачыць бачны свет, у якім нішто не вечнае. Геаметрыя — гэта хутчэй выдатны сродак падрыхтоўкі душы да рэалізацыі яе самай галоўнай здольнасці — мыслення, ці розуму (νοῦς). Розум шляхам дыскусіі або дыялектыкі (διαλεκτικη) дасягае спазнання дабра, у прыватнасці палітычнага дабра, якое і ёсць справядлівасць.

Канцэпцыя палітычных навук як найвышэйшага і дасканалага сродку спазнання і адначасова як адзінай сапраўды важнай галіны навукі сёння можа здзівіць нас, бо шмат хто, наадварот, прапануе прызнаць, што палітычныя навукі (іх спецыфічнае адгалінаванне — палітычная эканомія) павінны імкнуцца да падабенства з значна дасканалейшымі "дакладнымі" навукамі, але ім рэдка шанцуе дасягнуць такога падабенства. Тым не менш падыход Плятона варты ўсебаковага разгляду. Плятон лічыў, што чалавеку асабліва важна спазнаць самога сябе. І веданне асноваў справядлівага грамадскага ладу намнога важнейшае за адкрыццё законаў прыроды. Калі адхіліць гэтую канцэпцыю ерархіі чалавечых

ведаў, наступствы могуць быць надта сур'ёзныя. Хоць веданне законаў прыроды, безумоўна, дазваляе стварыць сродкі, неабходныя для паляпшэння ўмоваў чалавечага жыцця, але, каб гэтыя сродкі сапраўды накіроўваліся на дасягненне гэтай мэты, патрэбна правільная арганізацыя палітычнага жыцця. У адваротным выпадку навуковыя адкрыцці могуць мець сваім асноўным вынікам павелічэнне маштабу разбурэнняў, выкліканых канфліктамі паміж народамі.

Раздзел II

АРЫСТОТЭЛЬ: ЭКАНАМІЧНЫ ЛАД МЭТАНАКІРАВАНЫ І ПРЫСТАСАВАНЫ ДА ПАТРЭБАЎ ЛЮДЗЕЙ

Пра асобу Арыстотэля, параўнальна з Плятонам, мы ведаем значна меней. Вядома, што ён нарадзіўся ў 384 годзе да н. э. у грэцкім горадзе Стагіра, які ўваходзіў у склад Македонскай імперыі. Бацька Арыстотэля быў лекарам. У 18-гадовым узросце Арыстотэль паступіў у Плятонаву Акадэмію, дзе і правёў 19 гадоў свайго жыцця (ажно да смерці настаўніка) і ў якасці вучня, і, магчыма, у якасці выкладчыка. З моманту паступлення ў Акадэмію ён з асаблівым захапленнем займаўся вывучэннем прыродазнаўчых навук, што і абумовіла зусім іншую, чым у Плятона, арыентацыю розуму.

У 342 г. да н. э. Філіп Македонскі запрасіў Арыстотэля кіраваць адукацыяй свайго сына Аляксандра. Па сканчэнні гэтай місіі філосаф у 335 г. да н. э. вярнуўся ў Афіны і заснаваў школу пад назовам "Лікей", ці "Ліцэй", якая стала канкурэнтам Плятонавай Акадэміі.

Аднак у 323 г. да н. э. Арыстотэля пачалі цкаваць за тое, што ягоныя тэорыі нібыта блюзнерскія; Арыстотэль пакінуў горад, а праз год памёр.

Шмат працаў Арыстотэля да нас не дайшло, а характар тых, што захаваліся, вызначыць досыць цяжка: лекцыі, нататкі ці сапраўдныя трактаты.

Ягоныя творы прысвечаны логіцы ("Арганон"), фізіцы (што ўлучае таксама філасофію прыроды, трактаты пра цела, душу, рух), псіхалогіі, натуральнай гісторыі і, нарэшце, "метафізіцы". Пад апошнім разумеецца сукупнасць пытанняў, якія займаюць месца "пасля фізікі", г. зн. дыскусіі пра быццё (першая філасофія), затым пытанні маралі і палітыкі, асабліва цікавыя для нас, і, нарэшце, праблемы рыторыкі і паэтыкі. Дзве асноўныя працы, прысвечаныя эканамічным праблемам, — гэта "Нікамахава этыка" і "Палітыка".

§ 1. Насуперак Плятону

Арыстотэль — супраціўнік Плятонава камунізму і нават эгалітарызму, які той адстойваў у "Законах".

Закранаючы праблему ўласнасці, ён рэзка крытыкуе ідэю Плятона, паводле якой лад, заснаваны на супольнай уласнасці, быў бы ідэальным.

Перш за ўсё, на думку Арыстотэля, калі нават дапусціць, што грамадзяне павінны самі апрацоўваць зямлю, дык сістэма супольнай уласнасці на зямлю і ўраджай была б няўдалая, бо вельмі цяжка зрабіць, каб здабытак кожнага адпавядаў яго працоўнаму ўкладу; адкуль глеба для няспынных спрэчак[1].

Аднак Арыстотэль асабліва не спыняецца на гэтым пытанні, бо хоча вызваліць грамадзян нават ад працы ў полі. Тады паўстае іншае пытанне: ці можна пазбавіць гэтых грамадзян усялякай уласнасці, чаго хацеў Плятон? Арыстотэль кажа, што нельга.

"Наагул, — пісаў ён, — жыць адным жыццём з іншымі, перадаць усё ў супольнае ўладанне — сама цяжкая справа для чалавека"[2], і далей удакладняе: "Супольныя ўладальнікі маёмасці канфліктуюць паміж сабой значна часцей, чым грамадзяне, маёмасць якіх адасобленая"[3].

Такім чынам, супольнае валоданне ўласнасцю не прынясе спакою ў поліс, затое пазбавіць грамадзян цалкам натуральнага задавальнення асабістага валодання маёмасцю, бо гэтае валоданне нават само па сабе вельмі прыемнае, а ўжо як прыемна, калі твая ўласнасць прынясе карысць тваім сябрам: "Быць прыемным чалавекам і прыходзіць на дапамогу сябрам, гасцям і кампаньёнам ёсць сама вялікае з усіх задавальненняў, і адчуць яго можна толькі тады, калі маеш прыватную ўласнасць"[4].

Не менш варожа ставіўся Арыстотэль і да агульнасці жонак і дзяцей, супраць чаго ён знаходзіць цэлы букет аргументаў.

Ён пісаў, што пры сістэме, прапанаванай Плятонам, адукацыя дзяцей ажыццяўлялася б дрэнна, бо "кожны найлепей клапоціцца пра тое, што належыць яму асабіста, а

[1] *Politique, liv.II, chap.5, 1263 a, 10.*
[2] *Ibid., 15.*
[3] *Ibid., 1263 b, 23-24.*
[4] *Politique, 1263 b, 5.*

тое, што належыць усім, выклікае значна меншую цікавасць"[1].

Апрача таго, Платон хацеў забяспечыць узаемную любоў усіх грамадзян, але такая любоў прывяла б да працілеглага выніку, бо пры сістэме Платона сяброўскія дачыненні непазбежна паслабнуць, "гэтаксама як малая колькасць салодкага віна, змяшаная з вялікай колькасцю вады, губляецца ў выніку змешвання", і направер ніхто нікога не будзе любіць: "Бо ў чалавеку ёсць два найважнейшыя рухавікі старанні і любові — пачуццё ўласнасці і селектыўная сімпатыя"[2]. Памылка Платона ў яго жаданні дасягнуць абсалютнай еднасці поліса, што таксама немагчыма, як "перарабіць сімфонію на ўнісон", бо поліс — гэта "мноства, якое шляхам выхавання трэба прывесці да адзінства, да супольнасці"[3].

З гэтай нагоды трэба заўважыць, што ў Платона ідэя ліквідацыі інстытуцыі сям'і была цесна спалучаная з ідэяй абсалютнай роўнасці жанчын і мужчын. І гэтая дактрына ўяўляецца Арыстотэлю цалкам памылковай. У адпаведнасці з сваім звычайным метадам ён канстатуе, што прырода надала мужчыну і жанчыне розныя фізічныя і маральныя ўласцівасці і варта трымацца гэтай істотнай дыферэнцыяцыі.

Паводле Арыстотэля, жанчыне наканавана падпарадкоўвацца мужчыну. "Смеласць мужчын — гэта ўменне загадваць, смеласць жанчын — уменне падпарадкоўвацца", — пісаў ён[4] і ў дадатак цытаваў словы Сафокла: "Маўчанне жанчыны — гэта адзін з элементаў яе прыгажосці"[5]. Відавочна, у такіх акалічнасцях канец падпарадкавання жанчын мужчынам выклікаў бы ўсеагульны разлад.

Адмаўляючы супольнае валоданне маёмасцю і агульнасць жонак, Арыстотэль выступае і супраць роўнасці матэрыяльнага становішча ўсіх грамадзян, прапанаванай Платонам у яго *"Законах"* і Талесам Халкедонскім, яшчэ адным рэфарматарам, творы якога да нас не дайшлі.

[1] *Ibid., liv.II, chap. 3, 1261 b, 34.*
[2] *Ibid., 1262 b, 10-25.*
[3] *Ibid., 1263 b, 30-40.*
[4] *Ibid., 1260 a, 22.*
[5] *Ibid., 30.*

Арыстотэль прызнаваў, што "роўнасць маёмасці грамадзян — адзін з фактараў, якія спрыяюць папярэджанню нутраных канфліктаў"[1]. Але ён неўзабаве дадаў, што "гэты фактар зусім не вызначальны"[2], бо існуюць іншыя, больш важкія падставы, каб адкінуць эгалітарысцкія праграмы.

Калі ж прыняць гэтыя праграмы, дык павелічэнне колькасці грамадзян прывядзе да бясконцага драбнення маёмасці, і ўрэшце ўсе стануць жабракамі, што будзе згубна як для нутранога спакою, так і для абароны ад вонкавых ворагаў, якая вымагае наяўнасці ў грамадстве людзей заможных[3]. Тут Арыстотэль мае на ўвазе, што грамадзяне павінны быць у стане або плаціць дзяржаве падаткі на арганізацыю абароны поліса, або купляць сабе зброю і рыштунак за свой кошт.

Вядома, што Плятон разлічваў падтрымліваць колькасць грамадзян нязменнай. Арыстотэль жа не верыць, што прадугледжаны Плятонам спосаб падтрымання колькасці насельніцтва на адным роўні (экспатрыяцыя лішніх грамадзян) дзейсны ці, прынамсі, прымальны. Значыць, на думку Арыстотэля, трэба было б строга рэгуляваць нараджальнасць, а гэта немагчыма.

Наконт гэтага варта адзначыць, што Арыстотэль усё ж прыхільнік пэўнага кантролю нараджальнасці. Як і Плятон, ён адстойваў прынцып знішчэння дзяцей з фізічнымі хібамі і прапаноўваў у выпадку празмернага росту нараджальнасці легалізаваць аборты[4]. У кожным разе строгае абмежаванне колькасці грамадзян пэўнай лічбай уяўляецца Арыстотэлю немагчымым — і менавіта таму ён адмоўна ставіцца да роўнасці матэрыяльнага становішча.

Такім чынам, Арыстотэль ні "камуніст", ні прыхільнік строгага эгалітарызму. Тым не менш у ягоных працах мы знаходзім сцверджанне, што, калі ўласнасць у прынцыпе мусіць быць прыватнай, *карыстанне* ўласнасцю, наадварот, павінна быць супольным.

---

[1] *Politique, liv.II chap. 7, 1267 a, 37.*
[2] *Ibid.*
[3] *Ibid., 1267 a, 20-30.*
[4] *Ibid., liv.VIII, chap. 16, 1335 b, 20-25.*

"Пачуццё чуласці, — пісаў ён, — будзе задаволена, калі карыстанне вынікамі працы будзе супольным згодна з прымаўкаю, што "між сябрамі ўсё супольнае"[1]. Арыстотэль ухваляў лад Спарты, падкрэсліваючы, што ў гэтым полісе "грамадзяне выкарыстоўваюць працу чужых рабоў, быццам гэтыя рабы іх уласнасць, выкарыстоўваюць таксама чужых коней ды сабак, а калі пад час падарожжаў маюць патрэбу ў харчы, дык могуць браць усё, што знаходзяць на прыдарожных палях"[2].

Між іншым, грамадзяне ў шматлікіх выпадках дзейнічаюць супольна: яны аб'ядноўваюцца дзеля забеспячэння абароны поліса, дзеля выканання грамадскіх функцый. Пры гэтым, на думку Арыстотэля, трэба арганізоўваць супольнае сталаванне. "Падтрыманне такой традыцыі выгадна добра арганізаваным дзяржавам"[3]. Але менш заможныя грамадзяне не ў стане выплочваць патрэбную для арганізацыі сталавання суму, таму неабходна, каб дзяржава валодала часткаю земляў, прадукцыя з якіх будзе скарыстоўвацца для бясплатных супольных абедаў. Грамадскі сектар павінны таксама пакрываць выдаткі, звязаныя з выкананнем абрадаў рэлігійнага культу. Існаванне грамадскага сектара ў эканоміцы будзе ў значнай ступені процівагай прынцыпу прыватнай уласнасці.

Урэшце, згодна з Арыстотэлем, здаровае грамадства, г. зн. грамадства, якое адпавядае патрабаванням прыроды, павінна складацца з багатых землеўласнікаў, якія валодаюць грашовымі рэзервамі, адкуль дзяржава можа чэрпаць сродкі на ваенныя патрэбы. З ліку гэтых уласнікаў набіраецца войска; ваяры складаюць асобны клас людзей. Па дасягненні больш сталага ўзросту яны стануць суддзямі, а яшчэ пазней будуць пераходзіць у клас жрацоў[4].

Арыстотэлева крытыка Платона цесна перагукваецца з сучаснай крытыкай камунізму. Аднак не трэба забываць, што філосаф не дапускаў адрозна ад навачасных ліберала ў, што імкненне да неабмежаванага ўзбагачэння законнае і

[1] *Politique, liv.II, chap.5, 1263 a, 29.*
[2] *Ibid., 1263 a, 35.*
[3] *Ibid., liv.VII, chap.10, 1330 a, 3.*
[4] *Ibid., liv.I, chap.9.*

станоўчае. Наадварот, ён вучыў, паўтараючы Плятона, што няспынныя пошукі багацця — загана, якая перашкаджае дасягненню чалавекам сваёй сапраўднай мэты, а значыць, і свайго шчасця. Менавіта таму Арыстотэль адназначна асуджаў, як мы ўбачым далей, гандаль і фінансавую дзейнасць і патрабаваў, каб гэтыя заняткі былі забароненыя.

§ 2. Арыстотэлева канцэпцыя навукі пра чалавека

Каб зразумець, чаму Арыстотэль (які, падобна Плятону, з пагардай ставіцца да пагоні за багаццямі) супраціўнік камунізму і эгалітарызму, трэба разгледзець усю яго філасофію ў комплексе.

Арыстотэль адкідваў спробу сінтэтычнага вытлумачэння рэчаіснасці, заснаванага на ідэі, што чалавек належыць адразу двум адрозным сусветам: бачнаму і нябачнаму. Ён разглядаў чалавека як частку рэальнага свету. Паводле Арыстотэля, чалавечая душа знікае адначасова з целам, толькі чалавечы род, як і астатнія віды жывога на зямлі, несмяротны. Арыстотэль дапускаў існаванне аднаго ці шматлікіх багоў (яго погляд тут не да канца акрэслены), якія ўяўляюць сабой абсалютна нематэрыяльныя "чыстыя дзеі". Гэты бог ці гэтыя багі з'яўляюцца "канчатковай мэтай", мадэллю рэальнага свету (які, дарэчы, падзяляецца на нябесны, зямны ці падмесяцавы сусветы), але не існуе ніякай сувязі, ніякага пераходу ад боскага да зямнога.

Гэты фундаментальны падыход Арыстотэля грунтуецца на канцэпцыі "*ідэі*", цалкам адрознай ад Плятонавай.

Паводле Арыстотэля, ідэя знаходзіцца не па-за межамі аб'ектаў, даступных нашаму ўспрыманню. Сама іх рэальнасць ёсць ідэя. Фактычна мы ўспрымаем толькі ідэі, а не матэрыю. Напрыклад, матэрыя гэтага стала — драўніна, ён драўляны, але пры тым, што я ўспрымаю драўляны стол і разумею, што́ ёсць стол, я ніяк не магу ўспрыняць і зразумець драўніну ў стане чыстай матэрыі. Сапраўды, драўніна заўсёды мае нейкую форму — ці то стала, ці то крэсла, ці то міскі. А перш чым зрабіцца сталом, крэслам або міскаю, яна была дрэвам. Спазнанне — гэта заўсёды спазнанне формаў ці ідэяў. Чыстая матэрыя неспазнавальная. Значыць, трэба прызнаць, што любая рэч мае патрэбу ў матэрыі і паўстае як матэрыя, "увасобленая ў форму", але сама матэрыя — гэта проста віртуальнасць, ці патэнцыйнасць, бо як дзейная рэальнасць яна не існуе.

Такім чынам, Арыстотэль не супрацьпастаўляе Плятонавай філасофіі матэрыялістычную філасофію. Дакладней будзе сказаць, што філасофія Арыстотэля адмаўляе незалежнае існаванне матэрыі[1]. Тым не менш яна самым акрэсленым чынам адхіляе Плятонаў тэзіс пра "звышнатуральнае" жыццё чалавечай душы.

[1] *Гл. E.BRÉHIER, Histoire de la philosophie, t.I, vol, p.200.*

Адсюль зразумела, чаму Арыстотэль адмаўляецца грунтаваць усю навуку пра чалавека на дыялектычным метадзе, які дазваляе дасягнуць ідэальнага ведання. На яго думку, навука грунтуецца не на дыялектыцы, а на нашай здольнасці вызначаць прыроду рэчаў, выказваць словамі, што такое чалавек ці сабака, а таксама на спазнанні праз назіранне, індукцыю сутнасці рэчаў.

Зрэшты, не варта шукаць у працах Арыстотэля тлумачэння сацыяльных з'яваў, якое б зыходзіла з прычынаў, што спарадзілі гэтыя сацыяльныя з'явы, бо для яго фундаментальным тэзісам ёсць тое, што сутнасць рэчаў нічым не спараджаецца і не мяняецца, а вечна застаецца адной і той жа.

Формы прыродных істотаў, паводле ягоных словаў, "не зазнаюць станаўлення"[1] і "якасных зменаў субстанцыі не адбываецца"[2]. У прыродзе адбываюцца наступныя змены: з аднаго боку, нараджэнне і знікненне *індывідаў*, якія належаць да аднаго і таго ж нязменнага віду, а з другога — развіццё, г. зн. павелічэнне ці памяншэнне колькасці, змена месца пражывання і чаргаванне нясутнасных якасцяў істотаў[3]. Але гэтыя змены не закранаюць ні формы, ні сутнасці.

Паколькі сутнасць рэчаў не мяняецца, нельга растлумачыць свет з дапамогаю "дзейных прычынаў". Механічныя сутыкненні не могуць спарадзіць сутнасных зменаў. Тлумачэнне свету трэба шукаць у сферы мэтаў ці "канчатковых прычынаў" жывога[4], і менавіта такі спосаб тлумачэння ўжываў Арыстотэль у "Палітыцы".

Ён пісаў, што чалавек адрозніваецца ад усіх іншых істотаў, бо надзелены розумам. Гэтаксама як і іншыя істоты, ён імкнецца да лепшага жыцця ці шчасця, прычым дасягнуць шчасця можна праз разумную дзейнасць.

"Відавочна, што крыніца жыцця аднолькавая як для чалавека, так і для раслінаў; мы ж шукаем, што ёсць характарыстыка жыцця чалавека. Значыць, не трэба браць пад увагу харчаванне і рост, можна было б узгадаць жыццё з гледзішча пачуццяў, але ж яно ўласцівае і каню, і быку, і любой жывой істоце. Застаецца толькі актыўнае жыццё, уласцівае істоце, надзеленай розумам...; калі гэта так, то мы лічым, што чалавеку адпавядае пэўны лад жыцця, а гэтае жыццё ўяўляе сабою дзейнасць душы, узгодненую з асэнсаванымі дзеяннямі, і што дасканалы чалавек мусіць рабіць гэта ў адпаведнасці з Дабром і Прыгажосцю, бо кожнае з гэтых дзеянняў робіцца належным чынам, калі робіцца ў адпаведнасці з уласцівай яму дабрадзейнасцю"[5].

Гэткая дэфініцыя чалавека няпоўная; трэба дадаць, што чалавек у сваёй аснове — "грамадская жывёла", а дакладней, паколькі яго прызначэнне — жыццё ў полісе, "палітычная жывёла".

---

[1] *Métaphysique, liv.VII, chap.8, 1033 b, 5.*
[2] *Physique, liv.V, chap.2, 225 b, 10.*
[3] *Métaphysique, éd. Tricot, 19627 p.378, n.4.*
[4] *Physique, liv.II, chap.8.*
[5] *Ethique à Nicomaque, liv.I, chap. 7, 1097 b - 1098 a.*

"Відавочна, чалавек — гэта палітычная жывёла ў значна большай ступені, чым якая-небудзь пчала або іншая статкавая жывая істота. Сапраўды, на нашу думку, прырода нічога не робіць дарма, а адзіная з усіх жывёлаў істота, здольная размаўляць, — гэта чалавек. Тым часам як голас служыць для выказвання радасці і гора, і таму ім надзеленыя таксама іншыя жывёлы (бо паводле сваёй прыроды яны могуць адчуваць задавальненне ці боль і паведамляць пра гэта падобным да сябе), мова служыць для выказвання паняццяў карыснага і шкоднага, а адпаведна справядлівага і несправядлівага, бо разуменне таго, што ёсць дабро і ліха, справядлівае і несправядлівае побач з разуменнем іншых маральных паняццяў — гэта выключная ўласцівасць чалавека адрозна ад іншых жывёлаў, і менавіта ўсеагульнасць гэтага разумення спараджае сям'ю і поліс"[1].

Такім чынам, навука пра чалавека павінна вывучаць індывіда, сям'ю і поліс адначасова. Дзейнасць індывідаў вывучае этыка. Навука пра сямейнае жыццё — эканоміка (ад "oïkos", што значыць дом). Навука ж, якая вывучае жыццё грамадства, поліса, называецца палітыкай[2]. А паколькі цэлае стаіць вышэй за частку, дык, паводле Арыстотэля, палітыка — гэта, безумоўна, вышэйшая навука[3].

Аднак грамадства не мае іншай мэты, апрача той, каб весці да шчасця індывідаў, з якіх яно складаецца, таму ў ім дамінуюць тыя ўсеагульныя прынцыпы, якія вызначаюць своеасаблівы характар чалавечай дзейнасці.

Што ж наагул можа зрабіць чалавека шчаслівым? Арыстотэль меркаваў, што такіх шляхоў тры: у адпаведнасці з агульнапрынятым меркаваннем шчасця можна дасягнуць праз фізічную асалоду, праз славу і "сузіранне" (theoria), г. зн. праз разумовую дзейнасць. Той, хто шукае сваё шчасце ў фізічнай асалодзе, "нічым не адрозніваецца ад рабоў" і "вядзе жывёльнае жыццё". З іншага боку, да славы, да пашаны імкнуцца толькі дзеля таго, каб пераканацца ў сваёй уласнай вартасці, прычым вартасць гэтая не мае сувязі з славаю, ушанаваннем. Сапраўднае шчасце, несумнеўна, дасягаецца праз інтэлектуальную дзейнасць або ў яе чыстым выглядзе, г. зн. праз сузіранне, або матэрыялізавана, на практыцы, калі думка належыць чалавеку, які кіруе іншымі людзьмі, у прыватнасці, у грамадскім жыцці[4].

---

[1] *Politique, liv.I, chap. 2, 1253 a, 6-18.*

[2] *Варта заўважыць, што ў Старажытнай Грэцыі вытворчасць часцей за ўсё ажыццяўлялася ў рамках сям'і, таму "эканоміка" грэкаў улучае пытанні, якімі сёння займаецца палітэканомія: у прыватнасці, пытанні, што датычаць эканомікі прадпрыемства. Наконт гэтага варта паглядзець "Эканоміку" Ксэнафона (напісаную прыкладна ў 380 г. да н. э.). Адзін тэкст, аўтарства якога памылкова прыпісвалася Арыстотэлю, але які насамрэч напісаны ў III ст. да н. э., супрацьстаўляе эканоміку поліса прыватнай эканоміцы. Першая з іх названа палітычнай эканоміяй (oïkonomia politikè), але гэты тэрмін не абазначаў асобнай* навукі. *(Гл. Aristote, Economique, liv.II, chap.1.*

[3] *Ethique à Nicomaque, liv.I, chap.II, 1095b - 1096 a.*

[4] *Politique, liv.VII, chap. 3.*

Безумоўна, гэта вельмі ўзнёслая канцэпцыя чалавечага шчасця, далёкая ад сама распаўсюджаных сучасных канцэпцый. Тым не менш самім сцверджаннем, што шчасце, пра якое ідзе гаворка, павінна здзяйсняцца пад час жыцця індывіда на гэтым, а не на тым свеце, Арыстотэль рашуча адмяжоўваўся ад Плятона.

Для апошняга натуральныя мэты грамадства — задавальненне патрэбаў і абарона ад пагрозы вонкавага ворага (ці, у выпадку неабходнасці, заваёва) — не ёсць яго сапраўднымі мэтамі. Плятон лічыў, што грамадства — гэта сродак забеспячэння выратавання душаў, і душы (ці, прынамсі, некаторыя з іх) могуць стаць дасканалымі ў дасканалым полісе, які адпавядае адзінаму і непаўторнаму ідэальнаму ўзору.

Паводле ж Арыстотэля, наадварот, мэта чалавека — зямное шчасце, якое мусіць быць нечым рэлятыўным, няўстойлівым. У кожным разе індывід можа дасягаць толькі нейкага часовага, няпоўнага шчасця праз інтэлектуальную дзейнасць і палітычную актыўнасць, і, такім чынам, абсурдным было б жаданне зрабіць грамадства дасканалым, адпаведным адзінаму ідэалу. Чалавек не належыць да нязменнага боскага Сусвету. Ён не належыць нават да свету "нерухомых зорак", які адвечна нязменным рухам па вызначаным коле чымсьці нагадвае непарушнасць боскага Сусвету. Чалавек належыць да "падмесяцовага свету", дзе важную ролю адыгрываюць змены і выпадковасць.

Арыстотэль, напрыклад, дапускаў, што тры палітычныя рэжымы — манархія, арыстакратыя і рэспубліка (улада бальшыні) — могуць забяспечыць належнае кіраванне полісам. І толькі калі гэтыя рэжымы выраджаюцца, г. зн. калі інтарэсы часткі грамадзян бяруць перавагу над агульнымі інтарэсамі, яны пераўтвараюцца ў кепскія рэжымы, якія адпаведна называюцца тыранія, алігархія і дэмакратыя.

Нягледзячы на магчымую разнастайнасць інстытуцый, поліс, як усялякая іншая рэальная з'ява, мае сваю ўласцівую прыроду, бо мае сваеродную мэту — шчасце чалавека. Вылучыўшы асноўныя рысы прыроды поліса, можна будзе вызначыць пэўныя прынцыпы палітычнай навукі, якімі б мог кіравацца заканадаўца.

Трэба зыходзіць з тэзіса, што задавальненне матэрыяльных патрэбаў не галоўная мэта поліса, грамадства. Супольнасць людзей скіравана на тое, каб забяспечыць шчасце праз практыку дабрадзейнасці і развіццё духоўнага жыцця. "Дзяржава, — пісаў Арыстотэль, — гэта супольнасць дабрадзейнасцяў"[1]. Дзяржава існуе таму, што духоўнае жыццё не можа адбывацца па-за межамі супольнасці людзей. Чалавек, якому наканавана духоўнае (хаця і зямное) шчасце, — гэта "палітычная жывёла". Поліс як сукупнасць розумаў на шляху пошукаў шчасця — прыродная рэальнасць, першапачатковая форма, матэрыю якой складаюць індывіды. Такім чынам, адмаўленне ад ідэі аб незямной мэце, якую адстойваў Плятон, ні ў якім разе не прыводзіць Арыстотэля да сацыяльнага матэрыялізму. Наадварот, ён у значна большай ступені, чым Плятон, адстойвае ідэю існавання дзяржавы ў якасці духоўнай рэальнасці.

[1] *Politique, III, 9, 1280 b, 34.*

Маючы такое вызначэнне дзяржавы, можна сфармуляваць галоўныя прынцыпы яе арганізацыі. Гаворка ідзе пра тое, каб вылучыць сярод разнастайных аспектаў грамадскага жыцця ўсё, што сапраўды адпавядае прыродзе ці мэце грамадства.

§ 3. Арганізацыя эканамічнага жыцця

Аднак умовы шчасця не ёсць выключнай кампетэнцыяй душы. Чалавек валодае целам, і Арыстотэль меркаваў, што "пакрыўджаны прыродай не можа быць надта шчаслівы"[1]. Каб быць шчаслівым, трэба мець добрых сяброў і высакароднае паходжанне. Нарэшце (і гэта не менш важна), шчасце прадугледжвае магчымасць распараджацца матэрыяльнымі сродкамі, неабходнымі для задавальнення патрэбаў цела і забеспячэння чалавечай дзейнасці. Паводле Арыстотэля, "шчасце не можа абысціся без знешняга матэрыяльнага багацця. Сапраўды, немагчыма ці, прынамсі, вельмі цяжка рабіць добрыя справы, калі ты пазбаўлены неабходных сродкаў"[2].

Дарэчы, у іншай працы філосаф удакладняў, што чым лепшы чалавек, тым *менш* матэрыяльных дабротаў патрабуецца яму для шчасця. "Шчаслівае жыццё, — пісаў ён, — вымагае пэўных матэрыяльных сродкаў, меншых для індывідаў, надзеленых лепшымі якасцямі, і большых для індывідаў, станоўчыя якасці якіх не такія моцныя"[3]. Аднак у кожным разе матэрыяльныя даброты неабходныя.

Але стварэнне матэрыяльных каштоўнасцяў, неабходных для існавання і дзейнасці людзей, вымагае цяжкай, часам нечалавечай працы, якая сама па сабе, на думку і Арыстотэля, і Плятона, несумяшчальная з сапраўднай мэтай чалавека. Плятон шукаў развязанне праблемы ў падзеле грамадства на некалькі класаў, дзе адны будуць жыць за кошт іншых, Арыстотэль жа меркаваў, што фізічную працу павінны выконваць рабы.

Паколькі кросны самі не ткуцца[4], людзі пастаўлены перад неабходнасцю працаваць, хоць іх сапраўдная мэта —

[1] *Ethique à Niconaque, liv.I, chap. 8, 1099 b.*
[2] *Ibid., 1099 a - b.*
[3] *Politique, liv.VII, chap. 13, 1332 a, 1 - 2.*
[4] *Ibid., liv.I, chap.4, 1253 b, 37.*

разумовая дзейнасць. Здаецца, тут хаваецца супярэчнасць. Аднак Арыстотэль лічыў: калі ва ўсіх сферах жыцця існуе дасканалая ерархія, такая супярэчнасць не можа быць закладзеная ў арганізацыю свету. Гэта ўяўная супярэчнасць. Яе заўважаеш, калі канстатуецца, што людзі вельмі розняцца адзін ад аднаго. Ёсць такія, што, бадай, не адрозніваюцца ад жывёлы і здольныя толькі на крыху разумнейшую ад іх пакору і рахманасць; Арыстотэль нават сцвярджаў, што яны створаны "нязграбнымі" (гэтае сцверджанне выклікае пэўнае здзіўленне)[1]. Прырода патрабуе, каб гэтыя недачалавекі былі рабамі ў больш адораных людзей і каб узялі на сябе працу па вытворчасці матэрыяльных дабротаў.

"Тыя, хто адрозніваецца ад іншых людзей таксама моцна, як душа адрозніваецца ад цела, а чалавек ад жывёліны (быць ніжэйшымі накананавана тым, хто займаецца фізічнай працай, і, зрэшты, гэта самае лепшае, на што яны здольныя); яны па сваёй прыродзе ёсць рабы, іх доля — падпарадкоўвацца ўладзе гаспадара"[2].

Прычынаю рабства, удакладняў Арыстотэль, не можа быць улада, якую займеў пераможца вайны над пераможаным, бо "ні ў якім разе нельга апраўдаць тое, каб чалавека, які не варты быць рабом, рабілі рабом"[3]. Рабства можа быць апраўдана толькі недасканаласцю чалавека ад прыроды. Гэтая тэорыя сёння можа выдаваць на досыць спрэчную, тым не менш яна змяшчае спробу апраўдаць інстытуцыю рабства з маральнага боку.

Арыстотэль дадаваў, што часта факты супярэчаць прынцыпу, згодна з якім толькі непаўнавартасны чалавек можа быць рабом: "Безумоўна, прырода імкнецца зрабіць целы рабоў адрознымі ад целаў вольных людзей... аднак даволі часта здараецца наадварот: рабы надзеленыя целам вольных людзей, а вольныя людзі маюць душу рабоў"[4].

Як філосаф можа дапускаць, што рабства прымальнае і рацыянальнае? Каб зразумець гэта, трэба зазначыць, што ў сваёй працы, прысвечанай "эканоміцы", г. зн. хатняй гас-

[1] *Politique, I, chap.5, 1254 b, 28.*
[2] *Ibid., 16-20.*
[3] *Ibid., I, 6, 1255 a, 25.*
[4] *Ibid., I, 5, 1254 b, 25-35.*

падарцы, Арыстотэль падкрэсліваў, што гаспадар можа, а ў пэўных выпадках і павінны вызваліць раба.

"Трэба заўсёды прызначаць тэрмін працы рабоў, — пісаў ён. — Сапраўды, справядліва і карысна, каб яны ведалі, што ўзнагарода за іх працу — воля, рабы ахвотна згаджаюцца працаваць цяжка, калі іх чакае ўзнагарода і тэрмін рабства невялікі"[1].

Такім чынам, вызваленне рабоў іхнымі гаспадарамі можа выправіць памылкі грамадскага жыцця, якое робіць рабамі індывідаў, здольных жыць, як вольныя людзі. Цікава, аднак, ці лічыць філосаф, што добрай волі і пачуцця справядлівасці гаспадароў дастаткова дзеля таго, каб гэты сродак выпраўлення памылак ужываўся ў належнай ступені? Такое малаверагодна. Значыць, трэба думаць, што для Арыстотэля ўтрыманне ў рабстве індывідаў, надзеленых якасцямі вольных людзей, ёсць адна з тых шматлікіх "з'яваў", якія існуюць на свеце і не маюць сапраўднага тлумачэння і апраўдання. Нягледзячы на існаванне гэтых "з'яваў", філосаф лічыў, што свет у сваёй аснове падпарадкоўваецца пэўнаму ладу, які трэба паважаць.

Прырода дае чалавеку першы запавет, сутнасць якога: вытворчая праца павінна быць даручана рабам. Але другі, не менш важны запавет прыроды — тое, што ў полісе трэба забараніць гандлёвую і фінансавую дзейнасць. Арыстотэль, лаяльны ў пытаннях рабства, да гандлю ставіўся куды радыкальней, чым бальшыня навачасных мысляроў.

Згодна з Арыстотэлем, натуральныя спосабы назапашвання багацця — праца на зямлі, жывёлагадоўля, рыбалоўства, паляванне і нават рабунак як разнавіднасць паляванння. Ва ўсіх гэтых выпадках дзейнасці чалавек уступае ў валоданне жывымі істотамі, бо "менавіта з разлікам на патрэбы чалавека прырода стварыла ўсе астатнія жывыя істоты"[2].

Гандаль жа, наадварот, ненатуральны і, значыць, варты асуджэння сродак зарабляць грошы і памнажаць багацце.

Зразумела, сам па сабе абмен нельга асуджаць. Ён натуральным чынам вынікае з факта разнастайнасці патрэ-

[1] *Economique, liv.I, chap.5, 1344 b.*
[2] *Politique, liv.I, chap.8, 1256b, 22.*

баў і спецыялізацыі вытворцаў. Кожная рэч можа быць скарыстана двума шляхамі: або наўпростава, адпаведна з уласцівымі ёй якасцямі, або як сродак абмену[1]. Можа адбывацца натуральны абмен, г. зн. абмен без выкарыстання грошай, але развіццё гандлю паміж далёкімі краінамі непазбежна прывяло да пачатку грашовых стасункаў, металічныя ж манеты перавозіць значна лягчэй, чым усялякія грувасткія ці крохкія рэчы[2].

Грошы забяспечылі развіццё гандлю, г. зн. дзейнасці, сутнасць якой — выкарыстанне грошай для абмену і атрымання максімальнага прыбытку.

Пры такой дзейнасці "грошы робяцца прынцыпам і мэтай абмену", такая дзейнасць не ведае ніякіх межаў. Найбагацейшы гандляр можа пагатоў павялічыць сваё багацце (а мы можам дадаць: чым ён багацейшы, тым лягчэй яму гэта зрабіць).

У гандлёвай дзейнасці індывід губляе пачуццё меры, а значыць, і станоўчыя якасці, бо дабрадзейнае жыццё — гэта ўпарадкаванае і ўмеркаванае жыццё. Так гандляр робіцца няздольным жыць адпаведна з прынцыпам дабра, як павінен жыць чалавек, і калі дух камерцыі трапляе ў поліс, яго шкодны ўплыў распаўсюджваецца на ўсе галіны чалавечай дзейнасці.

Арыстотэль развіваў фундаментальныя ідэі, называючы словам "хрэматыстыка" ўсялякую дзейнасць па набыцці багацця. Філосаф сцвярджаў, што існуюць дзве формы хрэматыстыкі: першая грунтуецца на дасягненні дабрабыту з мэтай задавальнення патрэбаў, яна натуральная, законная і лагічна ўваходзіць у "эканоміку", што, паводле Арыстотэля, азначае навуку пра сямейнае жыццё; другая зводзіцца да гандлёвай дзейнасці. Другая форма, якую філосаф таксама называе "хрэматыстыкай у спрадвечным сэнсе гэтага слова, ці чыстай хрэматыстыкай", асуджаецца з прычынаў, растлумачаных вышэй.

"Хатняя форма хрэматыстыкі, — пісаў ён, — не мае на мэце назапашванне грошай, тым часам як другая форма скіравана менавіта на

[1] *Ibid., liv.I, chap.9, 1257 a, 5-15.*
[2] *Ibid., 30-35.*

гэта. Хто-кольвечы лічыць, што назапашванне грошай — таксама мэта хатняй гаспадаркі, і ўвесь час жыве з думкай, што трэба або захоўваць свае запасы грошай, або бясконца іх павялічваць. Такое разуменне грунтуецца на тым, што пэўныя індывіды імкнуцца жыць, а не жыць дабрадзейна, і паколькі гэтая прага жыцця бязмежная, яны патрабуюць усё большых сродкаў дзеля яе спаталення. І нават тыя, хто намагаецца жыць дабрадзейна, шукаюць сродкаў дзеля фізічных задавальненняў, а паколькі, на іх думку, гэтыя сродкі забяспечвае валоданне багаццем, дык усё іх жыццё праходзіць у назапашванні грошай. Менавіта так нараджалася другая форма хрэматыстыкі. Паколькі ўцехаў[1] на свеце шмат, людзі кідаюцца на пошукі сродкаў, якія прыносілі б ім разнастайныя задавальненні. Калі яны ўсё ж не ў стане дасягнуць сваёй мэты праз звычайную хрэматыстыку, яны спрабуюць дасягнуць яе іншым чынам, марнуючы на гэта ўсе свае здольнасці, нават насуперак голасу прыроды. Мужнасць не ў здабыванні грошай, а ў смеласці, і мэтамі вайсковага і медыцынскага майстэрстваў павінны быць не ўзбагачэнне, а перамогі і здароўе. Аднак усе гэтыя віды дзейнасці робяцца сродкам зарабляць грошы, калі людзі лічаць, што грошы — мэта жыцця і што свет ідзе толькі да таго, каб дасягалася гэтая мэта"[2].

Арыстотэль казаў, што існуюць тры формы хрэматыстыкі, вартыя асуджэння, — замежны гандаль, ліхвярства і "наёмная праца" (факт продажу сваёй працы за грошы)[3]. Філосаф удакладняў:

"Нездарма сама брыдкая рэч — ліхвярства, бо прыбытак, які яно прыносіць, вынікае з саміх грошай. Грашовыя знакі больш не адпавядаюць мэце, да якой імкнуліся, уводзячы іх, бо грошы былі ўведзеныя, каб паспрыяць менаваму гандлю, тым часам як працэнт ліхвяру павялічвае колькасць саміх грошай. Адсюль паходзіць слова "працэнт"[4]: бо як народжаныя істоты падобныя на сваіх бацькоў, працэнт ліхвяру — гэта грошы, што вынікаюць з грошай. З усіх сродкаў здабывання грошай менавіта гэты найбольш супярэчыць прыродзе"[5].

Іншы сродак узбагачэння, пра які вядзе гутарку Арыстотэль, — завалоданне ўсёй колькасцю нейкага тавару з тым, каб вельмі дорага яго перапрадаць, утварыць манаполію[6].

Кожны чалавек, абраўшы за прафесію гандаль, добраахвотна выключае сябе з ліку сапраўдных людзей, і яму болей не месца ў полісе. Вось як казаў пра гэта Арыстотэль у "Нікамахавай этыцы" пасля разгляду разнастайных кан-

[1] *Слова "ўцеха" выкарыстана тут у значэнні разбэшчанай, незаконнай уцехі.*

[2] *Politique, liv.I, chap.9, 1257 b, 36 a 1258 a, 14.*

[3] *Ibid., liv.I, chap.11, 1258 b, 23.*

[4] *Tokos на грэцкай мове адначасова азначае дзіця, нашчадак і працэнт ад грошай.*

[5] *Politique, liv.I, chap.10, 1258 b, 1-8.*

[6] *Politique, liv.I, chap.11.*

цэпцый таго, як зрабіць шчаслівым жыццё: "Што да справавога чалавека, ён ненатуральная істота, і відавочна, што багацце не галоўнае, да чаго мы імкнемся"[1].

Зразумела, падкрэсліваў філосаф, гандаль, і ў прыватнасці марскі гандаль з далёкімі краінамі, карысны і нават неабходны дзеля жыццядзейнасці поліса: "Для краіны неабходна ўвозіць тавары, якіх на яе тэрыторыі няма, і вывозіць лішкі ўласнае вытворчасці"[2]. Але гэта не азначае, што грамадзянам дазволена рабіцца гандлярамі. Наадварот, трэба забараніць ім гэта і пакінуць права займацца гандлем толькі іншаземцам.

Дыскусія на тэму працы ў вытворчасці і на тэму гандлю падвяла філосафа да выразнае высновы: "Грамадзяне павінны весці такі лад жыцця, дзе яны не займаліся б ні фізічнай працай, ні спекуляцыяй (бо ў такім жыцці няма высакароднасці і яно супярэчыць дабрадзейнасці),... грамадзяне дзяржавы, якую мы задумалі, таксама не павінны быць земляробамі" (ім патрэбны вольны час не толькі дзеля развіцця сваёй дабрадзейнасці, але і для палітычнай дзейнасці)[3].

Праца земляроба не ставіцца на адзін ровень з працай "ручнога вытворцы" (маецца на ўвазе рамеснік). У "Эканоміцы" Арыстотэль сцвярджаў, што праца на зямлі не перашкаджае дабрадзейнасці, як гэта назіраецца ў "рамёствах".

"Сельская гаспадарка, — пісаў ён, — у значнай ступені спрыяе ўмацаванню характару, бо адрозна ад рамёстваў яна не робіць цела няздольным да працы, надае яму моцы, неабходнае, каб весці жыццё на вольным паветры і вытрымліваць вялікую напругу; больш за тое, яна гартуе цела да небяспекаў вайны, — земляробы, бадай, адзіныя, чыя маёмасць размешчаная па-за гарадскімі ўмацаваннямі"[4].

Сцвярджаючы, што праца рамесніка "робіць цела няздольным да працы", Арыстотэль хацеў сказаць, што іхная праца хутка псуе цела[5]. Тут даволі яскрава адлюстраваная

[1] *Liv.I, chap.5, 7.*
[2] *Politique, liv.VII, chap.6, 1327 a, 26.*
[3] *Politique, liv.VII, chap.9, 1328 b, 39.*
[4] *Economique, liv.I, chap.2, 1343 b.*
[5] *Гл. таксама Politique, liv.I, chap.11, 1258 b, 35-40.*

складанасць погляду антычнай філасофіі на фізічную працу. З аднаго боку, пэўныя тыпы ручной працы разбураюць цела, чаго не можа дапусціць чалавек, варты называцца чалавекам. Здаровы дух можа быць толькі ў здаровым целе. З другога боку (гэта датычыць сялянаў), фізічная праца не разбурае цела, а, наадварот, умацоўвае яго, але яна пазбаўляе вольнага часу, неабходнага для ажыццяўлення ўласна чалавечай дзейнасці; вось чаму грамадзянін не можа займацца фізічнай працай нават у сельскай гаспадарцы[1].

§ 4. Справядлівасць у грамадстве

Здаровы поліс павінны прызнаць прыватную ўласнасць і інстытуцыю рабства, але забараніць гандаль і ліхвярства — вось выснова. Наступнае пытанне — пра сацыяльную справядлівасць. Што разумець пад гэтым паняццем? Пры якіх умовах яна будзе рэалізаваная?

Арыстотэль надаваў гэтаму пытанню прыярытэтнае значэнне і цвердзіў, што "існаванне ў мінулым вялікай колькасці розных грамадскіх ладаў было магчымае дзякуючы ўсеагульнай згодзе грамадзян у пытанні справядлівасці"[2], знікненне гэтай згоды прывяло да сацыяльных узрушэнняў. Апрача старонак "Палітыкі", прысвечаных справядлівасці, развагі на гэтую тэму змяшчае "Нікамахава этыка"[3], якая, паводле аўтара, таксама ёсць "палітычным трактатам"[4].

Справядлівае — гэта тое, што адпавядае законам, але насампраўдзе справядлівасць сягае за межы "юрыдычнае справядлівасці". Існуе справядлівасць, вызначэнне якой за-

---

[1] *Такі ж падыход абараняў Ксэнафон у сваёй працы "Эканоміка". Ён дапускаў, што праца ў полі можа быць прымальнай і нават карыснай, але, з другога боку, пісаў: "Праца, якой займаюцца рамеснікі, брудная, і цалкам натуральна, што ў полісах да яе ставяцца з пагардай, бо падобны занятак разбурае цела работніка і цела таго, хто кіруе ім, змушае весці хатні лад жыцця, гібець у цемры майстэрні, а часам нават цэлы дзень мардавацца каля агню. Пры такой працы цела робіцца кволым, а душа марнее" (chap.4, 2).*

[2] *Politique, V,1, 1301 a, 26. Гл. таксама Politique, liv.I, chap.2, 1253 a, 38: "Справядлівасць — гэта тая станоўчая якасць, якая складае сутнасць грамадзянскае супольнасці, бо кіраванне справядлівасцю нават ёсць імператыў палітычнай супольнасці, і такое кіраванне — гэта дыскрымінацыя таго, што ёсць справядлівым".*

[3] *Ethique à Nicomaque, liv.I, chap.3, 1095 a.*

[4] *Liv.V.*

лежыць ад прыроды грамадскага жыцця[1]. Такая справядлівасць называецца роўнасцю[2].

Арыстотэль казаў, што ёсць дзве вялікія галіны, дзе павінна праяўляцца справядлівасць: з аднаго боку — "размеркаванне ўзнагародаў, багаццяў і ўсіх іншых выгодаў, прызначаных грамадзянам поліса"[3]; з другога — сфера дамоўленасцяў.

У чым палягае прынцып "размеркавальнай" справядлівасці?

У пошуках адказу на гэтае пытанне Арыстотэль зноў адышоў ад Платона. Ён сцвярджаў, што роўнасці нельга дасягнуць праз надзел усіх індывідаў аднолькавай уласнасцю, як прапаноўваў у "Законах" Платон, бо індывіды няроўныя паміж сабою. Сапраўдная роўнасць — у надзяленні большым таго, хто варты большага. Гэта "прапарцыйная роўнасць".

У гэтым зноў выявілася Арыстотэлева разуменне рэлятыўнасці грамадскіх інстытуцыяў. У залежнасці ад грамадскага ладу, падкрэсліваў ён, мяняецца вызначэнне годнасці індывіда. Пры дэмакратыі крытэр вызначэння годнасці — свабода, пры алігархіі — багацце і паходжанне, пры арыстакратыі — дабрадзейнасць[4]. У "Нікамахавай этыцы" Арыстотэль сурова асуджаў алігархічны лад і аднолькава добра выказваўся як пра дэмакратыю, так і пра арыстакратыю. Ён дапускаў разнастайнасць прынцыпаў размеркавання сацыяльных перавагаў. На яго думку, *абсалютнай* размеркавальнай справядлівасці не існуе, як не існуе і дасканалага ладу[5].

Што да справядлівасці ў дамовах ці пры абмене, так званай "камутацыйнай справядлівасці", дык Арыстотэль найперш сцвярджаў, што ад усялякае дамовы бакі павінны мець аднолькавую выгоду, гэта прывяло філосафа да яго славутых развагаў пра вартасць рэчаў.

Калі, напрыклад, архітэктар абменьвае збудаваны ім

[1] *Ethique à Nicomaque, liv.5, chap.7.*
[2] *Ibid., chap.2 - Politique, liv.V, chap.1, 1301 a, 27.*
[3] *Ethique à Nicomaque, V, 2, 12.*
[4] *Ethique à Nicomaque, V, 3, 7.*
[5] *Politique, 1281, a, b.*

дом на зроблены шаўцом абутак, дык "трэба, — казаў Арыстотэль, — каб архітэктар атрымаў ад шаўца вынік працы шаўца і каб архітэктар замест гэтага аддаў шаўцу вынік сваёй працы"[1]. Канцэпцыя абмену таварамі як абмену вынікамі працы прадугледзела ідэю працоўнай вартасці, якая адыграе вялікую ролю ў вучэннях заснавальнікаў палітэканоміі ў XVIII—XIX стст. Аднак Арыстотэль сваім сцверджаннем не меў на ўвазе, што прынцып справядлівага абмену — гэта прынцып роўнасці колькасці працы, укладзенай у рэчы. Ён падкрэсліваў: трэба ўлічваць якасць, а не толькі колькасць працы. Арыстотэль шукаў іншы прынцып, які мог бы кіраваць абменам, прапанаваў знайсці "агульны крытэр вымярэння" рэчаў, што ідуць на абмен. "Гэты крытэр, — пісаў філосаф, — ёсць тая патрэба, якую мы маем ад адных рэчаў суадносна да другіх і якая забяспечвае грамадскае жыццё". З сённяшняга гледзішча здаецца, што гэты тэкст запачаткоўвае зробленыя пазней спробы растлумачыць вартасць рэчаў зыходзячы з іх карыснасці. Але ў сваім аналізе Арыстотэль далей не ідзе, абмяжоўваецца дэманстрацыяй таго, што на практыцы менавіта грошы паўстаюць агульным крытэрам вымярэння пры абменах[2].

У сваім даследванні, прысвечаным прыроднай справядлівасці, Арыстотэль наблізіўся да падыходаў навачасных эканамістаў. Варта нагадаць, што філосаф доўга тлумачыць, як адрозніць наўмысны несправядлівы ўчынак і ўчынак, зроблены несправядліва незнарок, незалежна ад намераў таго, хто яго здзейсніў[3]. Такім чынам, Арыстотэль адрозніваў, прынамсі, у пэўнай ступені права ад маралі[4]. Сцвярджаючы, што ёсць учынкі справядлівыя і несправядлівыя самі па сабе, незалежна ад маральнасці індывідаў, ён вылу-

---

[1] *Ethique à Nicomaque, 1133 a.*

[2] *У "Палітыцы" Арыстотэль, здаецца, абумоўлівае вартасць карыснасцю, аднак у іншых працах ён тлумачыць вартасць праз выдаткі працы. Так, напрыклад, у "Рыторыцы" (1364 a, 25-26) філосаф пісаў: "Такім чынам, золата — гэта лепшая рэч, чым жалеза, хоць яно і менш карыснае: здабыць золата значна цяжэй, і, значыць, яно каштуе болей". (Цытавана па B.S. Gordon, Aristotle and the development of value theory, Quarlerly Journal of Economics, février 1964, p.114-129.)*

[3] *Ethique à Nicomaque, liv.V, chap.8 et 9.*

[4] *На гэты конт гл. Michel Villey, Cours d'histoire de la philosophie du droit, 1961-1962, Les Cours de Droit, p.43.*

чае тэзіс аб існаванні таго, што Гегель пазней назаве аб'ектыўнай маральнасцю.

Мы бачым, наколькі плённыя Арыстотэлевы прынцыпы. Аднак прайшлі доўгія стагоддзі, перш чым гэтыя зародкі эканамічнай навукі і права змаглі як мае быць развіцца.

§ 5. Выснова: Межы Арыстотэлева падыходу. Адмаўленне гісторыі

Фундаментальная праблема, якую ўздымае грэцкая філасофія, — гэта праблема станаўлення ці зменаў. Чаму ўсё мяняецца? У чым палягае трансфармацыя рэчаў? Гэракліт адказваў: усё змяняецца без прычыны, значыць, ніякага тлумачэння не патрабуе. Паводле "фізікаў", свет можна вытлумачыць праз трансфармацыі першапачатковай матэрыі (вады ці паветра) і праз уздзеянне адной матэрыі на другую, або праз, як мы сказалі б сёння, "трансфармісцкую" і "механістычную" канцэпцыю свету.

Каб пазбегнуць скептыцызму прыхільнікаў Гэракліта, а разам і матэрыялізму "фізікаў", Платон пабудаваў сваю сістэму двух сусветаў: нязменнага свету ідэяў і зменлівага свету прыродных істотаў, які імітуе першы сусвет.

Арыстотэль адпрэчыў сістэму настаўніка, і як жа яму ўдалося пазбегнуць пераходу на пазіцыі матэрыялізму? Праз адмову ад механістычнага тлумачэння прыроды і адмаўленне "трансфармісцкай" канцэпцыі рэчаіснасці.

Строгая Арыстотэлева канцэпцыя стабільнасці сутнасцяў формаў як у чалавечым сусвеце, так і ў прыродзе ўвогуле спалучаецца з прыняццем за аснову ведаў "прынцыпу супярэчнасці". Пра істоту нельга казаць, што яна ўяўляе адно і ў той жа час яна ёсць супрацьлеглае. Калі б сутнасць істоты мянялася, гэтая істота ў момант зменаў была б супрацьлеглая сама сабе. Але гэтага не адбываецца. Кожная істота паўстае тым, чым яна ёсць, і нічым іншым. Такім чынам, сутнасць істоты не змяняецца.

Вельмі важна для нас тое, што Арыстотэль у значна большай ступені, чым Платон, адыходзіць ад канцэпцыі гістарычнасці чалавецтва.

Для Плятона чалавецтва, пачынаючы ад залатога веку, увайшло ў стадыю заняпаду, аддалілася ад боскага ўзору і магло б калісьці зноў наблізіцца да гэтага ўзору, калі б у полісах былі ўведзеныя добрыя законы.

Безумоўна, гаворка тут не пра канцэпцыю гістарычнай *неабходнасці*. На думку Плятона, заняпад грамадства — гэта феномен, які тлумачыцца выключна праз існаванне ў целе адмоўнага пачатку. Што да вяртання чалавецтва ў дасканалы стан, мы ведаем: Плятон не ўпэўнены, што такое вяртанне абавязкова адбудзецца.

Хоць Плятон і не ўздымаецца да ідэі гісторыі як навукі, тым не менш можна казаць, што яго бачанне свету адкрывае шлях для гісторыі.

Арыстотэль жа, здаецца, наадварот, перагароджвае гэты шлях. На яго думку, прыродная неабходнасць кіруе чалавекам, як кіруе жывёльным і раслінным або неадушаўлёным светам, і гэтак жа, як іншыя нязменныя прыродныя істоты, не змяняецца ў сваёй сутнасці і чалавек, а значыць, у прыватнасці, не трансфармуецца сутнасць грамадства.

Безумоўна, Арыстотэль не сцвярджае, што ўсё, што існуе ў грамадскім жыцці, яго задавальняе. Ён прапануе рэформы, але ягоныя рэформы — гэта проста лекі ад асобных хваробаў грамадскага ладу. Сутнасць жа звычайнага, натуральнага, здаровага грамадства не змяняецца.

Няцяжка зразумець, што менавіта супрацьлегласць Арыстотэлевай ды Плятонавай канцэпцый свету прыводзіць да супрацьлегласці рэлятыўнага кансерватызму Арыстотэля і сацыяльнага ідэалізму Плятона. Камунізм Плятона — гэта насампраўдзе вынік яго веры ў будучыню (якім бы дзіўным нам сёння гэта ні здавалася), а крытыка камунізму, таксама як і эгалітарызму, зробленая Арыстотэлем, вынікае з яго бачання чалавецтва, якое заўсёды адпавядае сваёй нязменнай прыродзе, нягледзячы на бег часу.

Раздзел III

ЗАНЯПАД ПАЛІТЫЧНАЙ І ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ Ў РЫМСКУЮ ЭПОХУ І Ў СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

§ 1. Панаванне Рыма і яго інтэлектуальны след

А) Утварэнне і падзенне Рымскай імперыі

Насуперак папярэджанням філосафаў заняпад грэцкай цывілізацыі паскорыўся пачынаючы з IV ст. да н. э.

Грэцкія полісы ўсё больш і больш клапаціліся пра заваёвы новых тэрыторыяў, каб накіроўваць туды лішак свайго насельніцтва. Яны ўсё больш і больш прагнулі багацця; а каб здабываць іх, трэба было панаваць над цэнтрамі гандлю, партамі і марскімі шляхамі. Таму барацьба паміж полісамі рабілася ўсё больш зацятая. Адначасова ўнутры кожнага поліса паглыбілася эканамічная няроўнасць: незлічоныя грамадзянскія войны і рэвалюцыі змянялі адна другую. Часам гэтыя ўзрушэнні прыводзілі да пераразмеркавання земляў адпаведна з прынцыпам эгалітарнасці, як, у прыватнасці, гэта здарылася ў Спарце пад канец III ст. да н. э. па волі цароў Агіса IV і Клеамэна III. Аднак суняць супрацьстаянне паміж багатымі і беднымі не патрапілі ні ў адным з полісаў[1].

Паслабленыя ў выніку нутраной нестабільнасці і канфліктаў, грэцкія полісы спачатку падпалі пад уладу македонскіх цароў, а пазней, калі Рым перамог Македонскае царства, яны былі ўключаныя ў склад Рымскай імперыі. У 146 г. да н. э. Рым распускае Ахейскі звяз, у які ўваходзіла вялікая колькасць грэцкіх гарадоў. Горад Карынф быў захоплены і разбураны. Свабодзе грэцкіх полісаў надышоў канец.

Пачынаючы з V ст. да н. э. Рым уяўляў "рэспубліканскі" гараджаржаву, арганізацыя якога характарызавалася, з аднаго боку, былым падзелам на знаць (патрыцыяў) і людзей невысакароднага паходжання (плебеяў) і, з другога боку, падзелам грамадства на класы ў залежнасці ад памераў багацця.

Усе грамадзяне ўваходзілі ў "цэнтурыі", адкуль паходзіў назоў цэнтурыяльных каміцыяў, сапраўднага парламента Рымскай рэспублікі. Галасаванне ў каміцыях ішло па цэнтурыях, таму ўплыў кожнага класа залежаў ад колькасці ўтвораных ім цэнтурыяў. Фактычна пасля рэформы 312 г. да н. э. вершнікі, гэта значыць грамадзяне, якія выконвалі свой вайсковы абавязак у кавалерыі, утваралі 18 цэнтурыяў[2]. Астатнія багатыя ўласнікі ўтваралі 80 цэнтурыяў, сярэднія і дробныя ўласнікі — 90, рамеснікі — 4, а "пралетарыі", г. зн. безмаёмасныя грамадзяне, утваралі адну цэнтурыю. Такім чынам, улада належала буйным уласнікам.

Рымская арыстакратыя, маючы ўладу, не задавальнялася прыбытка-

---

[1] *Гл. на гэты конт Margaret O.Watson, Class Struggles in Ancient Greece, London, 1947.*

[2] *Гл. Henri Pirenne, Les grands courants de l'histoire universelle, Paris, 1944-1957, t.I, p.185.*

мі, якія яна атрымлівала ад сваіх маёнткаў, але таксама хацела ўзбагаціцца ад гандлёвай дзейнасці.

Рым пачаў заваёву Італіі, потым узбярэжжаў Міжземнамор'я, дзе на глебе эліністычнай культуры расквітнелі шматлікія цэнтры цывілізацыі. Рымляне бязлітасна знішчалі грамадскія інстытуцыі заваяваных полісаў, вывозілі ў Італію вялікія гурты арыстакратаў і адукаваных людзей, потым пачалі сістэматычна рабаваць каштоўнасці на землях, далучаных да імперыі: забіралі карысныя выкапні, сельскагаспадарчыя прадукты, творы мастацтва, створаныя на працягу стагоддзяў. Менавіта так Грэцыя, калыска антычнай цывілізацыі, разам з палітычнай свабодай страціла асноўную частку свайго творчага патэнцыялу ў галіне культуры[1].

Але ваенныя перамогі выклікалі ў Рыме магутныя сацыяльныя выбухі, бо ўзбагацілася толькі пэўная частка грамадства і згалелі іншыя грамадзяне; прычына — змены, што адбыліся ў сістэме фармавання войска: пачынаючы з 107 г. да н. э. для пралетараў адкрываецца доступ у легіёны.

Плебеі выкарысталі ўступкі дзеля ўзмацнення ціску на найбагацейшыя класы. "Рэспубліканская" палітычная сістэма пачала распадацца.

Адначасова з пашырэннем рымскага панавання рабства набывала ўсё буйнейшыя памеры, што выклікала вялікія паўстанні рабоў.

Каля 135 г. да н. э. раб з Сіцыліі Эўн ("Добразычлівы") узняў паўстанне і ўтварыў з рабоў шасцітысячную армію. Рымскія легіёны здолелі задушыць яго толькі праз 9 гадоў.

Блізу 105 г. да н. э. пад кіраўніцтвам Сальвія сіцылійскія рабы зноў узбунтаваліся, а Сальвія абвясцілі царом. Сальвій перамог некалькі рымскіх палкаводцаў і завалодаў горадам Трыякала, аднак неўзабаве памёр, а яго наступніка Атэніёна ў 101 г. да н. э. перамагло новае рымскае войска. На Сіцыліі для рабоў усталяваўся рэжым тэрору: кожнага раба, у якога знаходзілі нейкую зброю, забівалі.

Самае буйное паўстанне рабоў адбылося ў 73—71 гг. да н. э. пад кіраўніцтвам Спартака. Фракіец па паходжанні, Спартак быў прададзены арганізатару гладыятарскіх баёў у Капуі, але ўцёк з сябрамі-паплечнікамі і аб'яднаў вакол сябе вялікую колькасць рабоў. Паўстанцы здабылі зброю і атрымалі значныя перамогі, аднак не здолелі вызначыць дакладную праграму дзеянняў. Яны прайшлі праз усю Італію з поўдня на поўнач, потым зноў вярнуліся на поўдзень, так і не заатакаваўшы Рыма. Нарэшце паспрабавалі дасягнуць Сіцыліі, але ім не пашанцавала дамовіцца з піратамі, уладальнікамі караблёў. У выніку рымскае войска разбіла паўстанцаў, а Спартака забілі ў баі. 6000 рабоў, якія здаліся ў палон, былі павешаныя ўздоўж дарогі Капуя — Рым.

Пасля паразы Спартака больш буйныя паўстанні не выбухалі. Тым часам Рымская рэспубліка саступіла месца імперыі, якую ў 27 г. да н. э. абвесціў Аўгуст.

---

[1] *Гл. L.Petit de Julleville, Histoire de la Grèce sous la domination romaine, Paris, 1875; G.F.Hertzberg, Histoire de la Grèce sous la domination des Romains, trad. franç., Paris, 1887.*

З гэтага часу былі адмененыя ўсе палітычныя свабоды, імперыяй кіраваў адзін усемагутны валадар, які часцей за ўсё атрымліваў уладу з дапамогаю сілы. Захоўваўся падзел грамадства на класы. Да першага належалі сенатары, якія павінны былі валодаць сама меней мільёнам сэстэрцыяў. Сенат больш не меў ніякай рэальнай улады і мусіў задавальняцца толькі зацверджаннем пастановаў імператара, аднак толькі сенатары маглі прызначацца намеснікамі правінцыяў і военачальнікамі. Потым ішлі вершнікі, багацце якіх складала суму ў 400000 сэстэрцыяў. Толькі іх прызначалі на пасады вышэйшых афіцэраў. Усе астатнія рымскія грамадзяне ўтваралі плебс, актыўнасць якога ўтаймоўвалі раздача хлеба і відовішчы. Іншаземцы залежна ад свайго паходжання карысталіся больш-менш шырокімі правамі. У самым цяжкім становішчы знаходзіліся рабы: напрыклад, калі раб забіваў гаспадара, тады вынішчалі ўсіх рабоў гэтага гаспадара.

Пачынаючы асабліва з II ст. н. э. з меркаванняў выгады пры зборы падаткаў дзяржава спрыяла ўтварэнню буйных латыфундыяў на сваіх землях. Такім чынам, дзяржава спрыяла канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і развіццю эканомікі, заснаванай на рабаўладальніцкай гаспадарцы. Сярэдні клас быў у заняпадзе; шматлікія яго прадстаўнікі павялічвалі шэрагі беспрацоўнага пралетарыяту гарадоў, у прыватнасці Рыма. Рабаўладальніцкая сістэма перашкаджала развіццю тэхнікі вытворчасці і прадукцыйнасці працы — рамёствы не пашыраліся і не развіваліся.

Грашовыя і падатковыя крызісы ўзрушалі рымскае грамадства. Бракавала золата, бо сальда гандлёвага балансу Італіі было адмоўнае. Манеты абясцэньваліся. Кошты раслі, і ў выніку адбываліся буйныя сацыяльныя выбухі.

На пачатку III ст. н. э. імператар Каракала (211 — 217 гг.) знішчыў арыстакратыю, якая паўстала супраць улады імператара. З гэтага часу ва ўсёй імперыі кіруючым класам зрабіліся курыялы, збіральнікі падаткаў, адказныя перад імператарам. Іх багацце павінна было перавышаць 100000 сэстэрцыяў. Курыі перадаваліся ў спадчыну.

Адначасова імператары аб'ядноўвалі рамеснікаў у абавязковыя карпарацыі і розным чынам умешваліся ў эканамічнае жыццё.

Пасля перыяду крайняй анархіі (235 — 268 гг.) сістэма адміністрацыі зноў трансфармуецца, імператары ўсё настойлівей імкнуцца развязваць эканамічныя праблемы шляхам умяшання ў эканоміку.

Дыяклетыян увёў сістэму натуральнай аплаты працы вытворцаў. Такім чынам дзяржава падышла да непасрэднага выкарыстання прадукцыі сваіх уладанняў, да ўтварэння рамесных прадпрыемстваў, але зачыніла ім шлях на рынак.

Значэнне рынку памяншалася. Землеўладальнікі пачалі пераходзіць да натуральнай гаспадаркі.

Дзяржава збірала падаткі з буйных землеўласнікаў ці з вёсак з вольнымі сялянамі. Каб спрасціць збор падаткаў, дзяржава імкнулася замацаваць селяніна на зямлі, якую ён апрацоўваў. Селянін зрабіўся

"калонам": ён не мог ні пакінуць зямлю, ні пабрацца шлюбам па-за межамі зямельнага ўладання дамена ці вёскі, ні адчужаць сваю маёмасць без дазволу зямельнага ўласніка.

Буйныя землеўладальнікі значна менш цярпелі ад падатковага прэса імперыі. Ішоў няспынны працэс канцэнтрацыі ўласнасці, дробныя ўласнікі шукалі аховы ў буйных, губляючы праз гэта сваю незалежнасць. Сістэма буйной уласнасці існавала, але не было тэхнічных сродкаў, якія забяспечылі б развіццё сельскай гаспадаркі. Канцэнтрацыя вытворчасці, наадварот, прыводзіла да паніжэння прадукцыйнасці працы адтаго, што гаспадары былі няўмелыя, а працаўнікі — нядбайныя.

Паступовы заняпад Рымскай імперыі тлумачыцца выкараненнем ва ўмовах імператарскага абсалютызму і росту эканамічных цяжкасцяў усялякага пачуцця грамадзянскай лучнасці.

У 395 г. памёр Фядос I, абодва яго сыны сталі імператарамі, адзін — заходняй часткі імперыі, а другі — усходняй. Аднак у Заходняй Рымскай імперыі ўлада фактычна належала галоўнакамандуючаму легіёнаў, а доля барбараў у шэрагах легіянераў няспынна расла. Гэтак барбары траплялі ў імперыю.

У 410 г. Аларых, які адначасова быў валадаром вестготаў і рымскім военачальнікам, захапіў і разрабаваў Рым. Затое ў 451 г. франкі выратавалі Італію сваёй перамогай над Атылам на Каталаунскіх Палях, што каля горада Труа.

У 476 г. паўстала размешчанае ў Італіі войска барбараў і пасадзіла на трон свайго правадыра Адаакра. Адаакр адмовіўся ад імператарскага тытулу, прыняў тытул караля і прызнаў сваім сюзэрэнам імператара Усходняй Рымскай імперыі, але бальшыня барбарскіх каралёў Захаду не прызнавала ніякага сюзэрэнітэту. Заходняя Рымская імперыя згасала. Візантыйскі імператар Юстыніян яшчэ патрапіў адваяваць у остготаў Італію ў 535 — 540 гг., але праз 40 гадоў Італіяй завалодалі лангабарды. Рымская дзяржава канчаткова распалася.

Пасля страты свабоды грэцкімі полісамі адбываўся няспынны заняпад палітычнага жыцця. На працягу ўсяго гэтага перыяду ўмовы для развіцця арыгінальных ідэяў у палітычнай філасофіі былі маласпрыяльныя, можна казаць, што назіралася доўгае зацьменне палітычнай думкі. Філосафы і блізка не падыходзілі да развагаў пра дзяржаву і грамадскае жыццё.

Б) Новыя філасофскія плыні і іх стаўленне да грамадскага жыцця

Апошнія стагоддзі існавання грэцкай цывілізацыі спарадзілі колькі філасофскіх дактрынаў. Найбольш значнымі сярод іх былі вучэнні эпікурэйцаў і стоікаў.

Эпікур (341 — 270 гг. да н. э., выкладаў у Афінах на пачатку III ст. да н. э.) абвяшчаў: можна самому, без дапамогі поліса, дасягнуць мудрасці, што супярэчыла дактрынальным поглядам Платона і Арыста-

тэля. Распаўсюджванне эпікурэізму адлюстроўвала паступовае знікненне былога палітычнага ідэалу грэкаў[1].

Пагарда да палітычнай філасофіі спалучалася з перакананым матэрыялізмам і атэістычнымі поглядамі. Паводле Эпікура, свет складаецца з матэрыяльных атамаў, а іх разнастайныя спалукі ўтвараюць бачныя целы. Целы — адзіная рэчаіснасць (самі богі — матэрыяльныя, да таго ж адасобленыя ад усяго астатняга свету). Чалавек, як і іншыя жывёлы, знаходзіць шчасце ў асалодзе, і найперш — у фізічнай асалодзе. Аднак механізм задавальнення ў чалавеку вельмі складаны. Той, хто хоча дапяць шчасця, ні ў якім разе не павінны хапацца за першую спрыяльную магчымасць атрымаць асалоду, але мусіць няспынна трымацца лініі паводзінаў, якая забяспечыць яму максімум шчасця на ўсё жыццё. Ён павінны засцерагацца запалу кахання[2], адмовіцца ад палітычнае дзейнасці, гэтаксама як і ад веры ў багоў і ў будучае жыццё, якія сеюць жах у душах; наадварот, варта прысвяціць сябе радасцям сяброўства і наагул ва ўсім выказваць памяркоўнасць.

Такі матэрыялізм прыводзіць Эпікура да звужэння мэтаў свайго філасофскага пошуку — толькі да вывучэння паводзінаў індывіда. Поліснай арганізацыя, у якой старажытныя грэкі бачылі дзейсны сродак самарэалізацыі, асабліва сваёй духоўнай самарэалізацыі, імкліва разбурылася. Гэтаму гістарычнаму працэсу адпавядала развіццё глыбока матэрыялістычнай і індывідуалістычнай філасофіі.

Матэрыялізм і індывідуалізм былі таксама галоўнымі рысамі стаіцызму, самай распаўсюджанай філасофіі ў Рыме ажно да пераходу імператараў у хрысціянства.

Стаіцызм заснаваны Зянонам (нарадзіўся ў 336 г. да н. э. у горадзе Кітыёне, што на Кіпры, памёр блізу 264 г. да н. э. у Афінах). Ягоныя творы да нас не дайшлі, але погляды Зянона развівалі і распаўсюджвалі яго шматлікія вучні.

Стаіцызм — гэта матэрыялістычнае вучэнне. Стоікі лічылі, што чалавек складаецца з дзвюх частак, кожная ўяўляе сабою цела. Душа — гэта цела больш жарснае: гарачы подых, сумесь паветра і агню, "пнеўма".

Стаіцызм — таксама індывідуалістычнае вучэнне, якое сцвярджае, што роды і віды ўзапраўды не існуюць[3].

Аднак на глебе гэтых сцверджанняў, на першы погляд вельмі падобных на палажэнні эпікурэізму, паўстае зусім іншая маральная канцэпцыя. Эпікурэйцы імкнуліся растлумачыць свет, звяртаючыся да прычынаў[4], стоікі, наадварот, застаюцца вернымі Арыстотэлевай канцэпцыі тлумачэння свету праз разгляд мэтаў. Паводле іх меркавання, усё на свеце строга падуладнае непарушнаму парадку. Гэты парадак святы і ўяўляе сабою нешта накшталт усеагульнага Бога, што пануе над іншымі

[1] *Гл. Roger Labrousse, Introduction à la philosophie politique, Paris, 1959, p.80.*

[2] *Гл. Lucrèce, De natura rerum, liv.IV.*

[3] *Гл. Albert Rivaud, Les grands courants de la pensée antique, Armand Colin, 1929, pp.162-179.*

[4] *Гл. Lucrèce, De natura rerum, liv.IV.*

багамі, рассыпанымі па зорах. Чалавек, надзелены здольнасцю бачыць гэты парадак, ставіць перад сабою мэту з дапамогаю волі падысці да яго як мага шчыльней, і менавіта праз далучэнне ўласнага розуму да розуму вышэйшага, які ляжыць на пачатку сусветнага парадку, ён знойдзе шчасце.

Мудрасць у раннім стаіцызме проста і сцісла стасуецца з "намерам" адпавядаць сусветнаму парадку. З гэтай канцэпцыі, калі браць яе ў вузкім сэнсе, нельга выснаваць правілаў, якія маглі б кіраваць учынкамі. Усякі ўчынак можа быць добры, калі ён робіцца з добрым намерам.

Аднак стаіцызм адрозна ад эпікурэйства не адмаўляе ўдзелу ў палітычнай дзейнасці і ўвагі да грамадскіх інстытуцый. Зянон у "Рэспубліцы" намаляваў карціну свету, дзе не існуе болей падзелу на асобныя дзяржавы і людзей яднае адно — каханне[1]. Стоік Ямбул апісвае ўяўную выспу, дзе грамадства не падзяляецца на класы і няма прыватнай уласнасці[2]. У II ст. да н. э. стоікі Грэцыі вярнуліся да тэзіса Плятона, згодна з якім можна вызначыць і нават трэба шукаць, што ёсць дабро для іншых людзей[3].

Спроба ўзняцца вышэй за спрошчаны падыход пра добры намер і дасягненне аб'ектыўнага грамадскага дабра стаіць ля вытокаў канцэпцыі "натуральнага права", распрацаванай Цыцэронам у I ст. да н. э. У аснове канцэпцыі — імкненне дасягнуць кампрамісу паміж сацыяльнай філасофіяй Арыстотэля і ідэальнай філасофіяй Плятона.

З аднаго боку, сцвярджаецца, што існуюць спрадвечныя нормы грамадскага жыцця, якія — дзеля людзей — павінны мець абсалютную вартасць. Але, з другога боку, адзначаецца, што нормы наўпрост вынікаюць са сведамасці ці, так бы мовіць, з "розуму" індывідаў. І гэты розум не ёсць, як у Арыстотэля, розумам філосафа, які асэнсоўвае свет, прыняўшы за аснову наяўныя тыпы грамадства; гэта — здольнасць, закладзеная ў кожным індывідзе, а значыць, вельмі блізкая да пачуцця справядлівасці ў Плятона.

"Закон, — пісаў Цыцэрон, — гэта розум, закладзены ў прыроду, якая загадвае нам рабіць тое, што мы павінны рабіць, і забараняе рабіць тое, чаго рабіць нявартa"[4].

У іншай працы ён пісаў: "Толькі з дапамогай прыроды мы можам адрозніць добры закон ад кепскага, прырода дазваляе нам не толькі адрозніваць праўду ад несправядлівасці, але і маральна прыгожыя рэчы ад непрыгожых, нешта кшталту ўсюдыіснага розуму дазваляе нам тое спазнаць і схіляе нашы сэрцы да таго, каб атаясамліваць прыгожае з дабрадзейнасцю, а благое — з заганамі"[5].

Цыцэрон шукаў у грэцкай філасофскай традыцыі ідэі, якія б дапамаглі вызначыць абсалютную норму грамадскага жыцця, але знаёмства

[1] *Гл. W.W. Tarn, La civilisation hellénistique, traduit de l'anglais, Paris, 1936, p.78.*
[2] *Ibid., p.120.*
[3] *Гл. Emile Bréhier, Histoire de la philosophie, t.I, vol.II, p.306.*
[4] *Des lois, I, 6, 18.*
[5] *Ibid., I, 16, 44-45.*

з творамі Цыцэрона паказвае, што гэтая спроба не мела поспеху. Сцвярджаючы, што існуе натуральнае права, аднолькавае для ўсіх, Цыцэрон не напаўняў гэтае цверджанне аргументамі.

Згодна з вучэннем стоікаў, людзі роўныя паміж сабою, аднак Цыцэрон дапускае, што ёсць людзі "рабскае натуры", і даводзіць, што індывіды, занятыя фізічнай працай, стаяць на ніжэйшай ступені развіцця[1].

Апрача таго, Цыцэрон асуджае ўсялякую "хрэматыстычную" дзейнасць, якая, на яго думку, не мае іншае мэты, акрамя грашова-здабывальнай, але робіць выключэнне для буйных гандляроў і банкіраў...

Цыцэрон не бярэцца фармуляваць агульны прынцып, каб вызначыць, якое грамадскае жыццё дабрадзейнае і адпаведнае розуму. Сярод станоўчых якасцяў ён асабліва ўхваляе асцярожнасць (prudentia), якая ў розных абставінах дыктуе чалавеку, як трэба ставіцца да тых ці іншых грамадскіх праблемаў[2]. Вось да чаго прыводзіць філасофія, якая з самага пачатку абвяшчае зверхнасць *індывідуальнага* розуму!

Паняцце "натуральнага права" засталося ў рымскую эпоху адно толькі формулай, а грэцкая канцэпцыя перавагі поліса над індывідам перажывала поўны заняпад. Рымская рэспубліка знікае ў 48 г. да н. э., на змену ёй прыходзіць спачатку дыктатура Юлія Цэзара, а потым дэспатызм імператараў. Рымская імперыя, пад абсалютнай уладай якой сабралася велізарная колькасць сама розных народаў (прычым гэтая ўлада была навязаная ім сілаю), ніколі не была адзінаю палітычнаю супольнасцю ў тым сэнсе, у якім яе разумелі грэкі, той лучнасцю, што падпарадкоўваецца законам.

Рымскія заваёвы — гэта бясконцая кампанія рабаўніцкіх паходаў дзеля асабістага ўзбагачэння рымскіх сенатараў[3]. Галоўны сацыяльны матыў — зацікаўленасць рымскіх уласнікаў у эксплуатацыі пераможаных і прыгнечаных народаў.

Найвялікшым інтэлектуальным дасягненнем дзяржавы была выпрацоўка сістэмы правоў індывіда ў сямейным жыцці, дачыненні да ўласнасці і кантрактаў. Сістэма атрымала найменне рымскага права.

Да былой канцэпцыі "квірытарнай" (ад лац. "quiritis", квірыты — старажытны назоў рымскіх грамадзян, ужываўся на народных сходах і яднаў у адным слове абагуленае найменне "рымскі народ". — *Заўвага перакладніка*) уласнасці, якая залежала ад грамадзянскага і сямейнага статусу чалавека, дадаецца яшчэ паняцце ўласнасці, заснаванай на валоданні нейкай рэччу, а значыць, даступнай кожнаму індывіду[4]. З таго часу нават філосафы прызнаюць, што ўсякая ўласнасць законная незалежна ад яе памераў, калі яна здабытая адпаведна з правам.

"Няма горшае бяды, — пісаў Цыцэрон, — чым злачынныя патраба-

[1] *Гл. Labrousee, op. cit., p.89.*
[2] *Ibid.*
[3] *Гл. Lucien Jansse, La propriété, le régime des biens dans les civilisations occidentales, Les Editions ouvrières, 1953, p.49.*
[4] *Ibid., p.56-58.*

ванні роўнасці матэрыяльнага становішча"[1]. У I ст. н. э. у Сэнэкі знаходзім характэрнае выказванне пра новае стаўленне да багацця. Каб абгрунтаваць ідэал мудраца, абыякавага да жыццёвых выпадковасцяў, што здараюцца на свеце, ён тым не менш сцвярджае, што мудрэц не павінны адмаўляцца ад багацця.

Філосаф пісаў: "Мудрэц не лічыць сябе не вартым падарункаў фартуны; ён не любіць багацце, але аддае яму перавагу (перад жабрацтвам); мудрэц пускае гэтае багацце ў свой дом, а не ў сваё сэрца; ён не адмаўляецца ад таго, што мае, ён знаходзіцца над усім гэтым і хоча, каб багацце спрыяла дабрадзейнасці.

Хіба можна сумнявацца, што мудрэц мае большыя магчымасці для развіцця сваіх здольнасцяў, калі ён багаты, а не калі ён бедны? У нястачы адна вартасць: будзеш нязломны, непрыгнечаны. Сярод жа багацця памяркоўнасць, шчодрасць, разважлівасць, ашчаднасць, веліч маюць вольны прастор на развіццё... Багацце дае мудрацу тое радаснае пачуццё, якое дае мараку спадарожны вецер ці цудоўны сонечны дзень у разгар зімовых халадоў...

Такім чынам, трэба зняць забарону на валоданне грашыма для філосафаў; ніхто не выракаў мудрасць на галечу. Філосаф можа валодаць вялікім багаццем, але нельга, каб гэтае багацце было ў некага адабранае ці заплямленае крывёю іншага чалавека, яно набываецца без нанясення шкоды хоць каму, сумленна і прыстойна. Гэтае багацце павінна растрачвацца такім жа пачэсным шляхам, якім здабывалася, яно можа выклікаць нараканні толькі з боку нядобразычлівых людзей. Можна назапасіць багацця столькі, колькі захочаш: такім багаццем трэба ганарыцца, калі яно складзена з рэчаў, якія кожны хацеў бы назваць сваімі, аднак не мае нічога, што нехта мог бы назваць сваім..."[2]

Ва ўсім Міжземнамор'і Рым усталяваў панаванне неабмежаванага і бескантрольнага ўласніцтва. У прыватнасці ў Грэцыі жорстка спыніў намаганні, скіраваныя на паслабленне сацыяльнай барацьбы за памяншэнне няроўнасці. Спартанскі цар Набіс выгнаў багатых і размеркаваў іх багацці паміж ілотамі і рабамі (II ст. да н. э.). Тады рымляне аб'явілі яму вайну і пасля перамогі запатрабавалі, каб былым уласнікам вярнулі багацці. Апошнімі спробамі грэкаў вярнуць незалежнасць кіравалі народныя правадыры, якія абапіраліся на падтрымку найгаротных катэгорыяў насельніцтва. Буйныя ўласнікі без ваганняў задзіночваліся з рымскімі заваёўнікамі дзеля перамогі над ніжэйшымі класамі. Менавіта з гэтае нагоды, паведамляў гісторык Паліб, грэцкія арыстакраты віншавалі адзін аднаго з перамогай рымскіх легіёнаў над грэцкімі патрыётамі ў 146 г. да н. э. Яны казалі: "Трэба, каб гэта зрабілі мы, а мы скарыліся"[3].

---

[1] *Traité des devoirs, II, 21, 73.*

[2] *Sénèque, De la vie heureuse, chap.XXI, XXII, XXIII, Paris, édition Les Belles-Lettres, 1923, pp.26-29. Аўтар сабраў велізарнае багацце з дапамогай сродкаў, якія крытыкавалі ягоныя апаненты, у прыватнасці праз паляванне на тэстаменты. Гл. Op. cit., p.28, n.1.*

[3] *Polybe, Histoires, XL, 5, Cité par Paul Guiraud, La propriété foncière dans l'ancienne Grèce, Paris, 1893, p.632.*

Матэрыялізм і індывідуалізм рымскай эпохі паказваюць на глыбокі адыход ад канцэпцыі дзяржавы як праявы духоўнага жыцця чалавека.

Але менавіта ў рымскую эпоху праз хрысціянства замацоўваецца разуменне каштоўнасці чалавечай асобы.

§ 2. Першапачатковае хрысціянства і эканамічныя інстытуцыі

А) Новы Запавет

Велізарнае значэнне хрысціянства ў сцверджанні ім бязмежнай каштоўнасці кожнага чалавека. Бог атаясняецца з канкрэтнай асобай — Ісусам Хрыстом, і кожны чалавек, у аснове сваёй падобны на Хрыста, здольны на Боскае жыццё.

Гэтая вера нарадзілася сярод габраяў, калі з далучэннем да Рымскай імперыі грэцкая рэлігія пачала пранікаць у Юдэю. Адрозна ад грэкаў габраі не вызнавалі шматлікіх увасабленняў Абсалюту. Галоўным пастулатам іх веры было перакананне, што Абсалют Адзіны ці, па-іншаму, для габраяў існаваў толькі адзін Бог.

Але габраі, як і грэкі, не мелі канцэпцыі еднасці чалавечага роду. Яны адрознівалі сябе ад усіх іншых, бо іхны Бог быў адзіным сапраўдным Богам. Габрайскую рэлігію характарызуе поўны падзел, неадольная бездань паміж чалавекам і Богам, згодна з хрысціянствам, вера ў Бога стварае чалавека, і, такім чынам, сцвярджаецца адзінства чалавечага роду.

"Няма ні грэка, ні юдэя, — піша Святы Паўла. — Няма ўжо ні раба, ні свабоднага. Больш няма ні мужчыны, ні жанчыны. Вы ўсе адно ва Ісусе Хрысце"[1].

Дактрына будзе мець значны ўплыў, аднак трэба падкрэсліць, што хрысціянства не робіць з яе ніякае палітычнае высновы, бо заклікае людзей абстрагавацца ад клопатаў зямнога жыцця дзеля таго, каб падрыхтавацца да вечнага шчасця. Хрыстос кажа: "Не хвалюйцеся пра тое, што вы будзеце есці і піць". І яшчэ ён кажа: "Аддайце Кесару кесарава, а Богу — Богава"[2].

Заклік да любові паміж усімі людзьмі зусім не рэвалюцыйны. Аднак водгук на яго быў вялікі. Распад антычнага поліса пакідаў вольную прастору для самага цынічнага эгаізму. Магчымасцяў для ўзнаўлення палітычнага жыцця, вартага ідэалаў старажытных грэкаў, не было. Рым імкнуўся навязаць культ імператара — пакланенне матэрыяльнай сіле. Прыняцце хрысціянскай дактрыны ўзаемнай любові паўставала перад усімі, хто хацеў захаваць сваю чалавечую годнасць як адзіны шлях выратавання.

Дактрына ўсеагульнага братэрства, нават калі яна і не цягне за сабою адпаведных палітычных высноваў, закладвае падмурак шматлікіх аспектаў навачаснай палітычнай думкі.

[1] *Пасланне Галатам, 3, 28.*

[2] *Лука, XII, 29.*

Хрыстос на працягу многіх гадоў займаўся фізічнай працай. З гэтага простага прыкладу вынікала зусім новае стаўленне да працы. Святы Паўла абвясціў прынцып яе неабходнасці: "хто не працуе, той не есць".

У Новым Запавеце ёсць суровыя словы, скіраваныя ў бок тых, хто валодае багаццямі. Паводле евангелля ад Святога Лукі, Хрыстос кажа: "Гора ж вам, тым багатым, бо ўцеху сваю вы ўжо маеце"[1].

Асуджэнне багацця і ўслаўленне працы не вядуць наўпрост да роздуму пра арганізацыю грамадства — гэта супярэчыла б канцэпцыі падзелу паміж зямным і духоўным.

Аднак відавочна, што ў рэальным жыцці хрысціяне вымушаны прытрымлівацца пэўных падыходаў, звязаных з іх рэлігійнымі перакананнямі і стаўленнем да грамадскіх інстытуцый. Дарэчы, у "Дзеях Святых Апосталаў" паведамляецца, што ў Ерусаліме першыя хрысціяне абагульнілі ўсю сваю маёмасць[2]. Гэтым актам па сутнасці сцвярджалася, што сістэма супольнага валодання маёмасцю лепей адпавядае хрысціянству, чым сістэма прыватнай уласнасці. Практыка, пра якую ідзе гаворка, неўзабаве знікла, але сам факт яе існавання пазней будзе разглядацца як аргумент на карысць камунізму.

Б) Ідэі камунізму і "другога прышэсця" ў айцоў царквы

Рэлігія, якая нарадзілася ў асяроддзі бедных і непісьменных людзей, — хрысціянства, хутка была ўспрынятая часткаю панавальнага класа і адукаваных людзей рымскай эпохі. Неўзабаве з'яўляюцца апалагеты і тэолагі, якія вызначаюць змест новай рэлігіі. З II да VI стст. "айцы царквы" пры шырокім выкарыстанні твораў грэцкіх філосафаў стварылі велізарны інтэлектуальны помнік — хрысціянскую тэалогію.

Гэтая тэалогія мае тую ж дваістасць, што і евангельскія тэксты. У ёй таксама знаходзіцца месца для сцверджання пра фундаментальную абыякавасць да грамадскіх інстытуцый, але не робіцца выгляду, што гэтыя інстытуцыі не існуюць, бо такое было б немагчыма.

Да выразу "Кесару кесарава" Святы Паўла дадае: "Няхай кожная душа падпарадкоўваецца вышэйшым уладам, бо не існуе ўлады, якая б не паходзіла ад Бога"[3].

Айцы царквы не заўсёды маглі заставацца глухімі да нарастальных пратэстаў супраць сацыяльнай несправядлівасці. З II па IV ст. многія абапіраліся на Евангелле, каб заклеймаваць эгаізм багатых, асуджэнне па сутнасці ўтрымлівала ў сабе агульную канцэпцыю крытыкі грамадскіх інстытуцый.

Святы Кіпрыян, картагенскі епіскап сярэдзіны III ст., нахвальвае часы, калі вернікі прадавалі свае хаты і спадчыну, а грошы добраахвотна аддавалі апосталам, каб тыя размеркавалі іх сярод бедных. "Ты вязень і раб твайго ж багацця", — кажа Кіпрыян багацею і падсумоўвае: "Кожны,

[1] *Лука, VI, 24.*
[2] *Дзеі, гл.II, 44-45; гл.IV, 34-35.*
[3] *Пасланне Рымлянам, XIII, 1.*

хто валодае багаццямі, абавязаны падзяліцца імі з усімі іншымі супольнікамі"[1].

Святы Васіль, епіскап кесарыйскі 2-й паловы IV ст., не задавальняецца перадзелам маёмасці, — ён патрабуе супольнага жыцця. "Пакінем прыклады паганцаў, — пісаў ён, — і пагаворым пра тыя 3000 чалавек, якія ад самага пачатку перайшлі ў веру Ісуса Хрыста. Паўторым вартую захаплення лучнасць першых хрысціянаў, у якіх усё было супольным, якія жылі адным жыццём, душа ў душу, мелі агульны стол, з'ядналіся ў повязі непарушнага братэрства, шчырай міласэрнасці, якая многія целы лучыла ў адно і многія душы зліла ў адзіную волю"[2].

Нарэшце, Святы Ян Хрызастом, архіепіскап канстантынопальскі канца IV ст., у дадатак да маральных аргументаў на карысць камунізму вылучае і актыўна развівае ўласна эканамічны аргумент: ён лічыць, што багацце грамадства будзе множыцца хутчэй пры камуністычным ладзе, бо "падзел — прычына збяднення; згода ж і еднасць волі — прычына багацця"[3].

Сцверджанні, як бачым, вельмі блізкія да апраўдання камунізму, аднак гэта ўсяго толькі тэарэтычныя падыходы. У айцоў царквы прысутнічаюць тэзісы, якія ў пэўнай ступені маюць практычную скіраванасць: гэта іх прароцтвы аб надыходзе часу, калі ўся маёмасць будзе абагулена. Гаворка — пра ідэі "міленарыстаў"[4].

Хрысціянская тэалогія пераняла сюжэт, першапачаткова распрацаваны габрайскімі прарокамі (VIII-VI стст. да н. э.). Гэтыя прарокі і прадказальнікі падышлі да ідэі, што Бог — добры і ён хоча дабра чалавеку; але, паколькі габрайская рэлігія не ведала несмяротнасці душы ні нават падзелу паміж душой і целам, гаворка ішла пра шчасце чалавека ў яго зямным жыцці.

Прарокі канстатавалі, што габрайскі народ ступіў на шлях рэлігійнага і маральнага заняпаду і крытыкавалі эгаізм багатых, адступленне ад веры продкаў. Яны заклікалі людзей да маральнага і рэлігійнага адраджэння і дэкларавалі, што вынікам такога адраджэння стануць матэрыяльны росквіт і моц народа.

Ёль (IX ст. да н. э.) гаварыў пра будучую эру шчасця, калі "зямля пакрыецца кветкамі і садамі".

Амос (прыкладна каля 790 г. да н. э.) жорстка асуджаў паводзіны багатых і казаў: Бог хоча бачыць людзей роўнымі; Амос таксама лічыў, што ахвяры не могуць быць прыемныя Богу, калі сярод людзей пануе несправядлівасць, і выказваў спадзяванне, што надыдзе эра спакою і шчасця, калі зло будзе выкараненае з грамадства.

Ісая прарочыў, што адным разам у Ізраіль прыйдзе цар, які зробіць, каб запанавала справядлівасць, і тады "Бог дасць дождж для насення і

[1] *Cité par Gerard Walter, Les origines du communisme, Payot, 1931, pp.120-121.*

[2] *Гл.Gerard Walter. Les origines du communisme, p.126.*

[3] *Ibid., p.163.*

[4] *Ад лац. "mille" — тысяча. Ідэі міленарыстаў палягалі ў тым, што пасля другога прышэсця Хрыста надыдзе тысячагадовае Царства Божае. — Заўвага перакладніка.*

... статак будзе пасвіцца на прасторным папасе". Мір запануе паміж народамі, і нават жывёлы не будуць знішчаць адна адну. "Воўк будзе жыць разам з авечкаю..."

Аднак у 586 г. да н. э. халдэі захапілі Ерусалім. Юдэйскае царства, апошняе з габрайскіх, знікла. (З гэтага часу габраі больш не мелі самастойнае дзяржаўнасці ажно да самага XX ст., толькі пасля Другой сусветнай вайны будзе створаная дзяржава Ізраіль.) Частка насельніцтва з Юдэйскага царства была пераведзеная ў Бабілён. У гэтыя крытычныя часы Ярэмі і Езэкііль з меншым аптымізмам, чым іх папярэднікі, але ўсё ж працягвалі развіваць ідэю пра лепшую будучынь.

Пэрсідскі цар Кір, пераможца халдэяў, дазволіў у 538 г. да н. э. дэпартаваным габраям вярнуцца ў Ерусалім. Габраі заставаліся падданымі пэрсаў, пакуль іх не скарыў Аляксандр Вялікі, а пазней — рымляне. Невядомыя прарокі, якія пішуць пасля 538 г. да н. э., зноў малююць будучы шчаслівы лад, дзе людзі будуць лічыць, што яны ўсе маюць адно і тое ж паходжанне, і пры якім "больш не трэба будзе працаваць дарма".

Тыя ж ідэі можна знайсці і ў Псалтыры (аўтары невядомыя). У наступныя стагоддзі паўстае ідэя аб Месіі, які павінен адрадзіць чалавецтва.

Такім чынам, у габрайскім народзе сцвярджаецца ідэя, невядомая грэцкаму народу і яго філосафам, — ідэя, адпаведна з якой мы з цягам часу набліжаемся да эры спакою і шчасця. Безумоўна, гэта адна з крыніц навачаснай ідэі аб сацыяльным прагрэсе[1].

Ідэя прысутнічае ў "Апакаліпсісе" Святога Яна. Апостал вучыў, што Рым (Бабілён) будзе зруйнаваны, потым надыдзе тысячагадовы перыяд, на працягу якога чалавецтва зведае мір і шчасце.

Гэтая ж "міленарысцкая" канцэпцыя выкладаецца на пачатку II ст. невядомым аўтарам "Барнабейскага ліста". Аналагічныя ідэі шмат дзе прысутнічаюць у творах Святога Юстына і Святога Ірэнея[2].

У III ст. адбываюцца шматлікія дыскусіі. У Рыме Святы Іпаліт абараняе міленарысцкія ідэі ў палеміцы з святаром Каюсам, які адмаўляў аўтэнтычнасць "Апакаліпсіса" Святога Яна. Пазней, у Егіпце, Арыген моцна крытыкаваў міленарызм, ягоны вучань Святы Дыяніс, епіскап александрыйскі, напісаў супраць гэтага вучэння трактат, дзе таксама аспрэчваў аўтэнтычнасць "Апакаліпсіса"[3].

Такім чынам, бачна, што хрысціянская дактрына шукала развязанне праблемаў сацыяльнага жыцця ў шчыльнай блізіні да шляху, па якім крочыў Плятон. Але яна яшчэ больш, чым сам Плятон, аддаляецца ад разгляду канкрэтных умоваў грамадскага жыцця на пэўным адрэзку часу, адыходзіць ад штодзённасці і губляецца ва утапічных марах. На пачатку IV ст. рымскі свет не ішоў да міру, братэрства і ўсеагульнага

[1] *Гл. Jules Delvaille, Essai sur l'histoire de l'idée de progrès jusqu'à la fin du XVIII siècle, Paris, 1910, chap.ler.*

[2] *Гл. l'article "Millénarisme" du Dictionnaire de théologie catholique de Vacanti et Mangenot, t.X, Paris, 1929.*

[3] *Ibid.*

шчасця, наадварот, усё больш і больш цынічнымі сродкамі сцвярджалася ўлада грошай. Распад дзяржавы працягваўся да часу, пакуль Заходняя Рымская імперыя не знікла пад ціскам барбараў.

Хрысціянства больш не магло мець на мэце паляпшэнне рымскіх нораваў, ад гэтае пары яно мусіла "заваёўваць" барбарскія народы. Ацэньваць грамадскія інстытуцыі барбараў было цяжка і досыць рызыкоўна. У такіх умовах дзякуючы творам і чыну Святога Аўгустына перамагла дактрына абыякавасці хрысціянства ў дачыненні да грамадскіх інстытуцый.

В) Святы Аўгустын

У 312 г. імператар Канстанцін завалодаў Італіяй дзякуючы легіёнам, утвораным з германцаў, гуртам далучаных да хрысціянства. Адпаведна з Міланскім эдыктам (313 г.) новы імператар прызнаў за хрысціянамі свабоду веравызнання, а потым і сам перайшоў у хрысціянства. З гэтага часу ўсе імператары Заходняй Рымскай імперыі з выняткам Юліяна, названага Адступнікам, абаранялі хрысціянства і пераследвалі адэптаў былой веры.

Аднак гэта не запаволіла імклівага заняпаду імперыі. У 410 г. кароль готаў Аларых, хрысціянін, захапіў Рым. У перыяд з 425 да 430 г. кароль вандалаў Гейзерых, таксама хрысціянін, падпарадкоўвае ўсю Паўночную Афрыку. Менавіта ў гэты момант, а дакладней у 426 г., Святы Аўгустын, біскуп гіпонскі, што ля Картагена, скончвае працу над сваім творам "Боскі горад", які зробіць велізарны ўплыў на сучаснікаў.

Кніга Святога Аўгустына ставіць крыж, у прыватнасці, на міленарысцкім вучэнні, якое з IV ст. знаходзіла ўжо меней прыхільнікаў, чым раней.

Святы Аўгустын сцвярджаў, што "Апакаліпсіс" Святога Яна інтэрпрэтуецца недакладна: насамрэч Рым атаясняецца апосталам з Бабілёнам, асуджаным Богам і які мусіў быць зруйнаваны. Рымам кіравалі імператары хрысціянскай веры: Канстантын, шчодра ўзнагароджаны Богам, бо ён прыняў хрысціянства[1], і Фядос, вельмі набожны чалавек[2]. Тысячагадовы перыяд, пра які апавядаў Святы Ян, — гэта прамежак часу, які цягнецца ад прышэсця Хрыста да сканчэння веку. Перыяд пазначаны духоўным аднаўленнем і датычыць выключна душаў, а не матэрыяльных рэчаў[3].

Відавочна, што тлумачэнне недакладнае. Тым не менш ідэі Святога Аўгустына пазней перамогуць, а міленарызм афіцыйная дактрына царквы не прыме. Параза міленарызму азначала, што ў хрысціянскай царкве канчаткова перамагла канцэпцыя абыякавасці ў дачыненні да палітычных пытанняў.

Святы Аўгустын сцвярджаў, што грэх першага чалавека вельмі істотна папсаваў чалавечую прыроду[4]. Ён з горыччу апавядаў пра заганы

[1] *La Cité de Dieu, liv.V., chap.25.*

[2] *Ibid., chap.26.*

[3] *Ibid., liv. XX, chap.6-11.*

[4] *"Па сутнасці, Бог, стваральнік натураў, а не заганаў, стварыў чалавека чыстым; але*

грамадскага жыцця[1], заганнасць чалавечага мыслення[2]. Лічыў, што шматмоўе падзяляе людское грамадства, а войны, нават справядлівыя, спараджаюць незлічоныя беды[3]. І далей: нельга давярацца нават сябрам, бо яны ў кожную хвіліну могуць зрабіцца здраднікамі і зламыснікамі[4].

У сваім жаданні паказаць неабходнасць ненавідзець зямное жыццё Святы Аўгустын імкнуўся знайсці супярэчнасці ў творах паганскіх аўтараў, у прыватнасці Цыцэрона[5]. Цыцэрон вызначаў рэспубліку як рэч паспалітую, г. зн. "як грамадства, заснаванае на прызнаных правах і на супольнасці інтарэсаў". Ён сцвярджаў, што "Рэспубліка, ці рэч паспалітая, сапраўды існуе толькі тады, калі ёю кіруюць з разуменнем дабра і справядлівасці". Калі прыняць гэтае вызначэнне, трэба прызнаць, удакладняе Святы Аўгустын, што "ў Рыме рэспублікі ніколі не існавала, бо ў ім ніколі не існавала сапраўднай справядлівасці". "Калі чалавек не служыць Богу, якая ж справядлівасць можа быць у гэтым чалавеку?"[6]. "Адзіным месцазнаходжаннем сапраўднай справядлівасці ёсць горад, пра які апавядаецца ў Святым Пісьме: "Слаўна пра цябе пісалі, Боскі градзе"[7].

Святы Аўгустын ні ў якім разе не лічыў, што ўсе грамадскія інстытуцыі, якія існуюць, цалкам справядлівыя і добрыя. Аднак у дачыненні да іх ён патрабаваў поўнага паслухмянства. Нябесны горад (г. зн. супольнасць хрысціянаў) не супраць законапаслушэнства — яны ж дапамагаюць упарадкаваць смяротнае жыццё"[8]. Раз законы ніколі не бываюць дасканалыя, каб усталяваліся сапраўдны парадак і сапраўдная справядлівасць, дык лепей выконваць тыя, што ўжо існуюць, чым намагацца іх змяніць. Па асабліва важным пытанні — пра рабства — Святы Аўгустын развіваў дактрыну *неабходнай згоды з сацыяльным ліхам як пакараннем за грахі*[9].

Ён казаў, што рабства не ёсць натуральная інстытуцыя. "Стварыўшы чалавека разумнага й па свайму падабенству, (Бог) не пажадаў, каб чалавек панаваў над іншымі, сабе роўнымі людзьмі, але толькі над жывёламі".

Тым не менш "на грэшніка ярмо рабства лягло справядліва". Рабы — гэта людзі, пераможаныя на вайне. "Усялякая перамога, нават перамога, атрыманая ліхімі людзьмі, ёсць вынік справядлівага Боскага суда. Значыць, Бог хоча пакараць пераможаных або палепшыць іх". Нават

чалавек, сапсаваны па сваёй уласнай волі і справядліва за гэта пакараны, нарадзіў дзяцей, сапсаваных і пакараных, гэткіх, як і ён сам" (ibid., liv.XIII. chap.14).

[1] *Ibid., liv.XIX, chap.5.*

[2] *Ibid., chap.6.*

[3] *Ibid., chap.7.*

[4] *Ibid., chap.8.*

[5] *Ibid., liv.II, chap.21; liv.XIX, chap.21 et 24.*

[6] *Ibid., liv.XIX, chap.21. Паводле Святога Аўгустына, Богу можна служыць толькі пасля прыняцця хрысціянскай веры.*

[7] *Ibid., liv.II, chap.21.*

[8] *Ibid., liv.XIX, chap.17.*

[9] *Ibid., liv.XIX, chap.15.*

рабства, калі яно вынік пажаданай Богам паразы, само па сабе справядлівае. Адсюль выснова: "Рабства, такім чынам, ёсць кара, вынесеная адпаведна з законам, які загадвае захоўваць натуральны парадак і забараняе парушаць яго, бо, калі б гэты парадак не парушаўся, дык не было б за што караць рабствам. Вось чаму Апостал загадвае рабам (Пасланне Ефесянам) слухацца гаспадароў і служыць ім ад чыстага сэрца і добраахвотна, нават калі яны не могуць вызваліцца з рабства, яны павінны знаходзіць у ім свабоду, служыць не ад страху, а па любові аж да таго часу, пакуль не знікне несправядлівасць, усякае чалавечае панаванне, пакуль не прыйдзе дзень, калі Бог будзе ўсё ва ўсім".

"Боскі горад" Святога Аўгустына — найвышэйшая кропка абыякавасці афіцыйнай хрысціянскай дактрыны ў дачыненні да эканамічнага і палітычнага жыцця. Аднак распаўсюджанне хрысціянства вельмі істотна ўплывала на свецкае жыццё. Ад гаспадароў і ўладароў-хрысціянаў патрабавалася разглядаць сваіх падданых як роўных сабе, як братоў. Часам гэтае правіла давала плён. У прыватнасці, можна лічыць, што яно адыграла пэўную ролю ў паступовым знікненні рабства ў Заходняй Эўропе[1].

Застаецца відавочным факт, што трыумф хрысціянства напрыканцы існавання Рымскай імперыі быў момантам найглыбейшага заняпаду палітычнай філасофіі, пра што мы ўжо вялі гаворку. Дакладней, імперыя, якая паступова прыходзіць да заняпаду, аддалялася ад сапраўднага палітычнага парадку. Хрысціяне ўсё болей звязвалі надзеі з небам і займаліся ўладкаваннем сваёй царквы, якая ўяўляла арганізацыю па-за межамі дзяржавы. Яны страцілі спадзеў на тое, што дзяржава можа стаць інструментам развіцця агульначалавечых каштоўнасцяў.

§ 3. Сярэднявечча

А) Усталяванне феадалізму

Барбарскія народы, заваёўнікі Заходняй Рымскай імперыі, знаходзіліся на больш нізкай стадыі эканамічнага і сацыяльнага развіцця. У эпоху Цэзара германцы, што жылі ўздоўж Рэйна, яшчэ не ведалі прыватнай уласнасці на зямлю. Зямля, якую займала кожнае племя, была ўласнасцю племя і час ад часу пераразмяркоўвалася паміж сем'ямі. Гэтая сістэма пераразмеркавання зямлі, нягледзячы на глыбокія сацыяльныя змены, пратрымаецца ў розных частках Эўропы даволі доўга.

У межы імперыі прасочваюцца барбары. У рэгіёнах, дзе яны складаюць бальшыню насельнікаў, утвараюцца "*сельскія грамады*". Занядбаныя землі робяцца ўласнасцю вёскі і праз пэўны час пераразмяркоўваюцца паміж яе жыхарамі. Адначасова правадыры плямёнаў захопліваюць вялікія маёнткі, рымскія вілы і ператвараюцца ў "зямельную арыстакратыю".

[1] *Гл. Paul Allard, Les esclaves chrétiens depuis les premiers temps de l'Eglise jusqu'à la fin de la domination romaine en Occident, 2e éd., Paris, 1876.*

У V—IX стст. з ростам небяспекі свабодныя сяляне сельскіх грамадаў вымушаныя шукаць абароны ў знаці. Так засноўваліся сярэднявечныя дамены, ці маноры. Сяляне страчвалі свабоду і рабіліся прыгоннымі. Свае палеткі, гэта значыць землі сваёй вёскі, яны апрацоўвалі пад аховай сеньёра. Больш за тое, праз паншчыну яны мусілі апрацоўваць і землі сеньёра.

У рэгіёнах, дзе доля барбарскага насельніцтва была меншая (поўдзень Галіі, напрыклад), брала пачатак эвалюцыя ў рымскай латыфундыі, землі якой апрацоўваліся калонамі і рабамі. З распадам барбарскіх каралеўстваў (у прыватнасці, Франкскай манархіі, а пазней і імперыі Карла Вялікага) гаспадары латыфундыяў ператвараліся і ў палітычных кіраўнікоў — сеньёраў. Сістэма эксплуатацыі калонаў і рабоў паступова перараджалася тут, як і ў іншых рэгіёнах, у прыгонніцтва.

Разам з разбурэннем гарадоў і заняпадам гандлю ўсюды назіраўся заняпад прамысловасці. Гэта яшчэ адна прычына знікнення рабства — грунту антычнай прамысловасці.

На змену плямёнавым інстытуцыям барбараў, як і рымскім інстытуцыям, прыйшла сістэма прыгоннага права і даменіяльная сістэма, якія адпавядалі блізкаму да антычнага роўню тэхнічнаму развіццю; безумоўна, барбары збольшага перанялі тэхнічныя дасягненні Рымскай імперыі, у прыватнасці тэхніку вядзення сельскай гаспадаркі.

Пачынаючы з V ст. палітычная ўлада на ўсёй прасторы былой заходняй Рымскай імперыі належала барбарскім правадырам, якія набывалі тытулы каралёў, але кіравалі тэрыторыямі, што належалі ім, быццам бы гэта былі прыватныя дамены. Карл Вялікі займеў імператарскі тытул, але яго сістэма кіравання не адрозніваласа ад сістэмы кіравання яго папярэднікаў з дынастыі Мэравінгаў. У IX ст. нарманскія набегі змушаюць насельнікаў шукаць імгненныя сродкі абароны, таму прадстаўнікі каралеўскай адміністрацыі на месцах сталі будаваць умацаваныя замкі і паціху вызваляцца з-пад улады караля. Яны лічылі сябе васаламі, якім кароль аддаў у карыстанне частку свайго дамена на правах бэнефіцыя ці феода. У сваю чаргу яны давалі такія ж правы сваім падначаленым. Так складвалася феадальная ерархія, якая вяла да распаду дзяржавы. Вонкава каралеўства па-ранейшаму існавала, але фактычна кароль ад гэтага часу меў тыя ж прэрагатывы ў дачыненні да сваіх падданых, якія мае ўсялякі сюзэрэн да сваіх васалаў.

Мы прасачылі, якім чынам за апошнія стагоддзі існавання антычнай цывілізацыі палітычная думка запыніла свой натуральны развой. Важныя тэмы, закранутыя Плятонам і Арыстотэлем, больш не выносіліся на шырокае абмеркаванне, а галоўнае, яны больш не выклікалі нараджэння новых арыгінальных ідэяў. Са знікненнем Рымскай імперыі гэты заняпад пагатоў акрэсліўся з прычыны агульнага спынення інтэлектуальнага жыцця.

Гарады, заснаваныя Рымам у Заходняй Эўропе, ляжалі разрабаваныя і занядбаныя, — ішло вяртанне да вясковага жыцця. Разам з гарадамі знікалі інтэлектуальныя цэнтры. Найперш бібліятэкі: іх разбуралі, рабавалі, вывозілі. Назаўсёды была страчана велізарная колькасць цудоў-

ных антычных твораў, іншыя трапілі ў нябыт і былі адкрытыя наноў толькі праз 8—10 стагоддзяў.

З твораў Плятона ў Сярэднявеччы быў вядомы толькі адзін дыялог "Тымэй", з твораў Арыстотэля да сярэдзіны XIII ст. — толькі частка трактатаў аб "Логіцы" і дзве кнігі з "Нікамахавай этыкі"[1].

Інтэлектуальнае жыццё падтрымлівалася выключна святарамі, адзінымі, хто ўмеў чытаць, і знаходзіла прытулак толькі за мурамі кляштараў, але й там галоўным чынам абмяжоўвалася вывучэннем рэлігійных твораў.

Паступова ўсе барбарскія народы перайшлі ў хрысціянства, якое, апрача сваёй нутраной перавагі над паганскімі рэлігіямі, выгодна атаясамлівалася з прэстыжам рымскае цывілізацыі.

Адпаведна з вучэннем Святога Аўгустына развівалася вучэнне, якое разглядала каралеўскую ўладу як натуральны інструмент на службе ў царквы. Падыход атрымаў назоў "канцэпцыі адміністрацыйных функцыяў каралеўскай улады". Яна была па сутнасці складовай часткай "палітычнага аўгустыянства"[2]. На працягу многіх стагоддзяў прызнавалася, што ў дзяржавы няма ніякай іншай мэты, апрача дапамогі царкве ў справе выратавання душаў (найперш выкараненне ерасі). Калі дзяржава не мае сваёй уласнай мэты, значыць, няма і навукі пра дзяржаву, не існуе палітычнае навукі ў тым сэнсе, як разумеў яе Арыстотэль. Адзіныя палітычныя пытанні, што абмяркоўваліся (і нямала) — пытанні ўлады духоўных і свецкіх валадароў.

Святы Аўгустын даводзіў: нельга шукаць справядлівасці ў дзяржаве, калі падданыя гэтай дзяржавы не далучыліся да хрысціянскай веры. У Сярэднявеччы спрабавалі рэалізаваць гэтую дактрыну праз зверхнасць царквы над дзяржавай, праз падпарадкаванне індывідаў дзяржаве, якая ў сваю чаргу кантралюецца царквой. Гэта была спроба стварэння хрысціянскага гаспадарства, "супольнасці хрысціянаў", дзе зноў, як у старажытных цывілізацыях, людзей у грамадстве ядналі б рэлігійныя погляды і яны, згодна з рэлігіяй, аддана выконвалі б патрабаванні і загады кіраўнікоў.

Але ці магчыма такое суладдзе? Хрысціянства заклікае індывіда ўсведаміць сваю бязмежную асабістую вартасць. Нельга было вярнуцца да грамадскага ладу, заснаванага на спантанным, неасэнсаваным далучэнні індывіда да дзяржавы, бо тады ідэя хрысціянскай еднасці была б асуджаная на няўдачу. Пазней палітычная думка паўстане супраць царквы і, прынамсі, вонкава супраць хрысціянства, дзеля таго, каб замацаваць свабоду індывіда ў грамадстве.

Узапраўды каралі часцей за ўсё займаліся ажыццяўленнем уласных

[1] *Гл. George de Lagarde, La naissance de l'esprit laïque au declin du Moyen Age, Paris, 1934-1946, t.III, p.22. Гл. таксама Albert Dufourcq, Histoire moderne de l'Eglise, t.VI: Le christiamisme et l'organisation féodale, nouv. éd., Paris, 1932.*

[2] *Гл. H-X. Arquillière, L'augustinisme politique. Essai sur la formation des théories politiques du Moyen Age, Paris, 1934, і таго ж аўтара: Saint Grégoire VII. Essai sur la conception du pouvoir pontifical, Paris, 1934.*

мэтаў: пашыралі свае дамены, павялічвалі багацці і войска... І кожны раз, дамагаючыся гэтага, не зважалі на царкоўную ўладу, ужываючы яе ў якасці інструмента сваёй палітыкі. Тым не менш афіцыйна каралі прызнавалі канцэпцыю "адміністрацыйных функцыяў" свецкай улады. Факт, што сведчыць пра надзвычайны заняпад палітычнай думкі ў феадальную эпоху.

Б) Эканамічная філасофія Святога Тамаша Аквінскага

1. ЭКАНАМІЧНЫ І ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ЎЗДЫМ У XII—XIII стст. ДРУГОЕ АДКРЫЦЦЁ АРЫСТОТЭЛЯ. З VII да X ст., пад час станаўлення феадальнай сістэмы на Захадзе, міжземнаморскі гандаль быў пад кантролем буйных дзяржаваў (Багдадскі, Кардоўскі халіфаты), створаных мажнаўладцамі мусульманскай веры, нашчадкамі Мухамеда (570—632). Гэтыя дзяржавы атрымалі інтэлектуальную спадчыну антычнасці і захавалі яе лепей, чым барбары Захаду, але турэцкія заваёвы ў Малой Азіі паклалі канец уздыму мусульманскае цывілізацыі.

Адраджаўся гандаль у такіх італьянскіх гарадах, як Венецыя і Генуя, а пазней уздоўж галоўных шляхоў зносінаў і рэкаў па ўсёй Заходняй Эўропе. Гарады зноў набылі сілу, рамеснікі гуртаваліся ў цэхі дзеля абароны сваіх правоў і дзеля забеспячэння росквіту рамёстваў. Пачала развівацца прамысловасць, але ўжо на новай аснове (прыкладам развіццё суконнай прамысловасці ў Фландрыі).

Хуткімі тэмпамі развівалася сістэма гандлю грашыма. У IX—X стст. гандлем каштоўнымі металамі займаліся толькі габраі, але з часам ва ўсіх буйных гарадах з'явіліся мянялы — папярэднікі банкіраў.

Нягледзячы на забароны царквы, пашыралася ліхвярства. Свае незлічоныя багацці для ліхвярскіх аперацый выкарыстоўвалі тампліеры па вяртанні з Святое зямлі пасля падзення ў 1187 г. Ерусаліма.

Росквіт гандлю і гарадоў спрыяў адраджэнню і вясковай гаспадаркі. Узнікаюць рынкі сельскагаспадарчых прадуктаў. Сеньёры, зацікаўленыя ў павелічэнні вытворчасці, ажыццяўлялі гэта або праз асвойванне новых земляў, або праз павелічэнне прадукцыйнасці працы. Як толькі сеньёр адчуў карысць ад надання свабоды сялянам і ад замены паншчыны грашовым чыншам, то і патрэба ў прыгонным праве паступова знікла.

У 2-й палове XII ст. папа Грыгорый VII энергічна ўзяўся за рэформу царквы, дамогся трыумфу канцэпцыі адміністрацыйных функцыяў каралеўскай улады і зрабіў з царквы гаранта парадку і сацыяльнага спакою. Менавіта ў гэты час, як было адзначана, на Захадзе адраджаецца гандаль, а разам з ім і гарады. Будаўніцтва царкоўных святыняў у раманскім стылі (якое шырока вялося асабліва пачынаючы з 1150 г.) засведчыла пра гэтыя новыя прагрэсіўныя здабыткі ў галіне тэхнікі і мастацтва.

Запульсавала інтэлектуальнае жыццё. Абмеркаванне палітычных праблемаў набыло новы ўздым, праўда, у межах, вызначаных царквою, гэта значыць у межах тэалагічных даследванняў. Вырашальны штуршок руху ідэяў быў дадзены ў XIII ст., калі еўрапейцы праз арабаў змаглі пазнаёміцца з усімі творамі Арыстотэля і ў прыватнасці з "Палітыкаю".

Палітычныя нататкі Арыстотэля выклікалі сапраўдны інтэлектуальны стрэс у хрысціянскім свеце, бо Арыстотэль і яго арабскія каментатары — Авіцэна і Авероэс — трактавалі палітычныя праблемы з грунтаваннем на рацыянальную і навуковую глебу (размова ідзе пра вызначэнне "прыроды" дзяржавы і таго, што вынікае з гэтай прыроды).

Царква ж, наадварот, хоць і не абыходзіла палітычныя пытанні, але разглядала іх з гледзішча выратавання душаў. Такім чынам, канфлікт паміж двума гэтымі падыходамі быў непазбежны.

Хутка вучэнне Арыстотэля пачало здавацца вельмі небяспечным, бо выкладчыкі "факультэтаў мастацтваў"[1], якія не абавязкова былі святарамі, узялі на ўзбраенне Арыстотэлеву думку і прыйшлі да высноваў, якія царкве падаваліся недапушчальнымі. Выкладчыкі Парыжскага універсітэта Сыгер Брабанцкі і Баэцы Дакійскі адмаўлялі несмяротнасць душы і сцвярджалі вечнасць свету. Да таго ж Баэцы Дакійскі заяўляў, што "найвялікшае дабро, якога можа дасягнуць чалавек дзякуючы маральным учынкам, — гэта грамадскае шчасце (felicitas politica)"[2].

Небяспека здалася асабліва вялікаю, бо адначасова шырока распаўсюдзіліся "натуралістычныя" ідэі, выкладзеныя ў "Рамане пра ружу" Жана з Мэна (другая частка складзена ў 1277 г.). У гэтым славутым творы, у прыватнасці, крытыкаваліся пакора і цнатлівасць як не адпаведныя прыродзе і давалася парада "весці добры лад жыцця", прычым з частымі спасылкамі на аўтарытэт Арыстотэля.

Доўгі перыяд заняпаду цывілізацыі канчаецца ў XIII ст. Зніклі ўмовы, калі ў аслабелым грамадстве панавала царква. Царква больш не магла трымацца на асуджэнні зямнога грамадства і чаканні з'яўлення Боскага горада. Зямны горад даказаў сваю жыццёвую моц, сваю здольнасць ствараць незалежна ад царквы прагрэсіўныя грамадскія інстытуцыі. Менавіта ў гэтую эпоху нарадзіўся "свецкі дух". Роджар Бэкан услаўляў сілу навуковага розуму. Усё гэта вяло да глыбокага перагляду хрысціянскай дактрыны ў дачыненнях да прыроднага свету, і ў прыватнасці да грамадства.

2. ГАЛОЎНЫЯ ТЭЗІСЫ ВУЧЭННЯ СВЯТОГА ТАМАША. Святы Тамаш Аквінскі (1235—1274) належаў да ордэна дамініканцаў, быў выкладчыкам у Парыжы і Рыме. На загад папы напісаў сваю "Суму тэалогіі". Твор у 1277 г. асуджаны біскупам парыжскім, але, нягледзячы на гэта, у хуткім часе праца займела велізарны поспех.

На падставе поглядаў, якія раней, да Святога Аўгустына, адстойвалі многія айцы царквы, Святы Тамаш Аквінскі даў новае тлумачэнне вучэнню пра першародны грэх[3].

Ён тлумачыў, што грэхападзенне Адама не змяніла прыроду чалаве-

---

[1] *Сярэднявечныя універсітэты складаліся з факультэтаў тэалогіі, права, медыцыны і "мастацтваў", г. зн. усіх іншых, свецкіх навук з выняткам права і медыцыны.*

[2] *Cité par G.Lagarde, op.cit., p.45.*

[3] *Гэтым ён уваходзіць у супярэчнасць з славутым тэолагам ордэна францысканцаў — Святым Банавентурам. Апошні падтрымліваў усе палажэнні Святога Аўгустына, апрача аднаго: ён быў прыхільнікам міленарызму. Вучэнне цесна звязанае з поглядамі*

ка. Адам быў адно пазбаўлены "звышнатуральных дароў", якімі надзяліў яго Бог.

Такі падыход ставіў пад сумнеў канцэпцыі Святога Аўгустына аб маральным жыцці індывіда і аб палітычным жыцці.

Чалавек мусіць дзейнічаць згодна з сваёю прыродай, казаў Арыстотэль. У сваіх прыватных учынках ён павінны кіравацца тымі добрымі якасцямі, якія даравала яму прырода і якія спазнаюцца розумам. Чалавек мусіць браць удзел у грамадскім жыцці, бо грамадскае жыццё — гэта прыродная з'ява. Арыстотэль меў рацыю: грамадства вышэй, чым індывід, гэтаксама як адзінае цэлае вышэй за часткі. На гэтым грунце Святы Тамаш распрацаваў вядомую тэорыю "агульнага дабра". "Дабрабыт мноства людзей большы і больш разнастайны, чым дабрабыт асобнага індывіда, — пісаў ён. — Менавіта таму часам можна пагадзіцца на ліха ў дачыненні да асобнага індывіда, калі яно неабходнае дзеля агульнага дабрабыту: злодзея забіваюць, каб вялікая колькасць людзей жыла ў спакоі"[1].

Ягоны заклік да рацыянальнага аналізу маральнага і грамадскага жыцця мае велізарнае значэнне, аднак гаворка не можа ісці пра сапраўднае вяртанне да поглядаў Арыстотэля. Паводле Святога Тамаша, над прыродай існуе звышнатуральны свет, якому прырода падпарадкоўваецца. Мэта чалавека не на гэтым свеце, а на іншым, нябесным. З гэтага вынікае, што грамадства ніяк не можа прывесці чалавека да шчасця, бо мэта чалавека не ёсць зямное, прыроднае шчасце, сапраўдная мэта чалавека — сузіранне Бога ў наступным жыцці. І нельга нават думаць, як гэта рабіў Платон, што грамадства стане сродкам выратавання людзей, падрыхтоўкі іх да будучага жыцця, — выратаванне магчымае толькі ва ўмовах рэлігійнага жыцця, якое арганізуецца царквою. З аднаго боку, літасць Боская і хвала Боская сыходзяць на чалавека праз таемствы царквы, з іншага — праз цярплівае трыванне заганаў зямнога жыцця. Безумоўна, чалавек мусіць паважаць законы прыроды, гэта простая "негатыўная" ўмова выратавання, Бог — творца прыроды, і нельга ісці супраць яго волі. Каб уратавацца дзеля вечнага жыцця, трэба спазнаць Хрыста і выконваць усё, што ад яго імя загадвае царква.

Між тым прыроднае жыццё чалавека і яго рэлігійнае жыццё шчыльна спалучаныя, іх немагчыма адасобіць. Святы Тамаш не мог задаволіцца простым цверджаннем пра існаванне прыроднага жыцця, якое развіваецца паводле ўласных законаў, ён павінны вывучыць судачыненні звычайнага жыцця з рэлігійным, са звышнатуральным светам. Ідэі Святога Аўгустына аб інтэграцыі звычайнага свету ў царкоўнае ўлонне, прыроды ў звышнатуральны свет Святы Тамаш супрацьстаўляў ідэю "падпарадкавання" прыроднага жыцця звышнатуральнаму.

Пра палітычнае жыццё казаў: "Чалавек не прысвечаны для палітычнай супольнасці згодна з тым, які ён ёсць і што ён мае... Але ўсё, што

рэлігійных сектаў, якія ў XI-XII стст. прадказвалі набліжэнне эры рэлігійнага аднаўлення. У 1255 г. царква асудзіла міленарызм.

[1] *De Regimine Principum, livre I, chap.IX.*

сам па сабе ўяўляе, усё, чым ён валодае, усё, што ён можа, — павінна прысвячацца Богу"[1]. "Не сукупнасць тварэнняў, складнікам якое чалавек, ёсць яго найвышэйшая мэта, але сам Бог"[2].

Перавага дактрыны ў тым, што пры сцверджанні зверхнасці духу не адмаўляецца бачны свет, але яна яшчэ не здольная растлумачыць нам узаемадачыненні бачнага і духоўнага сусветаў. Другі толькі знаходзіцца над першым, але незразумела, якія сувязі існуюць паміж імі.

Крыху пазней нямецкі дамініканец айцец Экхарт замацаваў адпаведна з хрысціянскай догмай увасаблення фундаментальную еднасць Боскага пачатку і прыроднага сусвету, еднасць, якая не ёсць іх сінтэз, бо бачнае разглядаецца як "момант" Боскага. Вучэнне будзе асуджана царквой, але мецьме значны ўплыў аж да нашых дзён, бо Экхарт быў папярэднікам Гегеля, для якога рацыянальная думка — гэта пераадоленне супярэчнасцяў, што ўзнікаюць пры першым успрыманні.

А Святы Тамаш? Ён далёкі ад гэтай дыялектычнай канцэпцыі. Ён абапіраўся на логіку Арыстотэля, якая грунтуецца на адпрэчванні супярэчнасцяў. У дадзеным пытанні Святы Тамаш не ідзе далей канцэпцыі абсалютнай супярэчнасці прыроды і звышнатуральнага свету. Яго творы нясуць на сабе адбітак пазіцыі пра немагчымасць развіць сапраўды рацыянальную тэорыю палітычнага і эканамічнага ладу. Нягледзячы на некалькі дужа цікавых для тае эпохі спробаў, скіраваных на стварэнне палітычнай і эканамічнай філасофіі, Святы Тамаш амаль цалкам падпарадкоўвае розум веры. У палітыцы ён абараняе дактрыну ўсеўладдзя царквы, у пытаннях эканомікі абмяжоўваецца выкарыстаннем пэўнай колькасці Арыстотэлевых тэзісаў дзеля таго, каб знайсці ў іх аргументы ў падтрымку дактрыны, скіраванай на маральнасць дачыненняў паміж людзьмі.

Творам Святога Тамаша Аквінскага, які найбольш падобны на трактат палітычнае навукі, была невялічкая праца "Пра каралеўскае кіраванне" ("De Regimine Principum")[3].

Гэты твор — перш за ўсё палітыказнаўчы трактат, аргументы цалкам запазычаныя з Арыстотэля (хоць высновы й розняцца).

Святы Тамаш сцвярджаў, што манархія — найлепшы палітычны лад, бо "тое, што ёсць адно, больш спрыяе адзінству, чым тое, што ёсць шматлікае"[4]. Ён дае каралям некалькі практычных парадаў: для заснавання гарадоў варта выбіраць мясціны з памяркоўным, здаровым і прыемным кліматам і размешчаныя такім чынам, каб было як мага менш патрэбы ў гандлярах.

Але калі ў раздзеле XIV першай кнігі аўтар падыходзіць да разгляду цэнтральнага пытання пра ролі, адпаведныя царкоўнай і каралеўскай уладам, неабходна заўважыць, што ён катэгарычна адмаўляецца прызнаць за дзяржаваю мэты, уласцівыя толькі ёй.

---

[1] *Somme théologique, I-II, question 21, article 4.*
[2] *Ibid., question A, article 8.*
[3] *Trad. française, Du gouvernement royal, Paris, 1931.*
[4] *Op. cit., p.16.*

"Паколькі чалавек, які жыве адпаведна з прынцыпамі дабрадзейнасці, прысвечаны наступнай за зямное жыццё мэце, якая ёсць далучэнне да Бога, дык трэба, каб мэта чалавечага грамадства была такая ж, як і асабістая мэта чалавека. Такім чынам, канчатковай мэтай грамадства павінна стаць не дабрадзейнае жыццё, а далучэнне да Бога праз дабрадзейнае жыццё"[1].

І адразу ж робіцца выснова (якая нам сёння здаецца вельмі дзіўнай): "Паколькі чалавек можа дасягнуць сваёй мэты, якая ёсць спазнанне Бога, не праз сваю дабрадзейнасць, а праз дабрадзейнасць Боскую... дык весці чалавека да яго мэты належыць Боскаму ўраду, а не чалавечаму..."[2] "Менавіта таму па Хрыстовым законе каралі павінны падпарадкоўвацца святарам"[3].

З падпарадкавання каралёў святарам натуральна вынікае зверхнасць тэалогіі над эканамічнай і палітычнай філасофіяй. Такі падыход не пакідае ніякага спадзявання на развіццё палітычнай навукі. Менавіта ў гэтым — асноўная супярэчнасць паміж Арыстотэлем і Святым Тамашом Аквінскім.

3. ЭКАНАМІЧНАЯ ДАКТРЫНА СВЯТОГА ТАМАША АКВІНСКАГА: УЛАСНАСЦЬ. Пры разглядзе галоўнага твора Тамаша Аквінскага "Сумы тэалогіі" можна канстатаваць, што эканамічныя праблемы закранутыя тут у кантэксце дабрадзейнасцяў і заганаў, г. зн. у межах тэорыі маральных паводзінаў індывіда[4].

Другі раздзел другой часткі "Сумы тэалогіі" ўтрымлівае пытанне 58 пра станоўчую якасць, справядлівасць і пытанне 61 "Складнікі справядлівасці". Паўтараючы Арыстотэлеву "Этыку", Святы Тамаш Аквінскі адрозніваe размеркавальную і камутацыйную справядлівасці. Першая — гэта дабрадзейнасць кіраўніка, які мусіць размяркоўваць даброты паміж сваімі падначаленымі[5]. Другая справядлівасць — якасць

[1] *Du gouvernement royal, op.cit., p.112.*

[2] *Ibid., p.113.*

[3] *Ibid., p.115.*

[4] *Баэцы (470-525), галоўны твор якога "Аб філасофскім суцяшэнні" карыстаўся велізарнай папулярнасцю ў Сярэднявеччы, вылучаў тры часткі "практычнай філасофіі": "філасофія, якая вучыць, як паводзіць сябе, набываючы станоўчыя якасці; філасофія, якая палягае ў забеспячэнні панавання ў дзяржаве вышэйпазначаных якасцяў, а менавіта сілы, асцярожнасці, справядлівасці і памяркоўнасці; і, нарэшце, філасофія, якая вызначае, як кіраваць хатняй гаспадаркай". Здаецца, Святы Тамаш застаецца прыхільнікам гэткага падыходу, у той час як іншыя аўтары XIII ст. больш схільныя надаваць пэўную зверхнасць сярод навук "аб маралі" палітычнай навуцы. Гл. G. de Lagarde, op. cit., II, pp.9-11.*

[5] *Сучасныя аўтары таксама вылучаюць легальную, ці сацыяльную, справядлівасць, якая ўжо не проста дабрадзейнасць, але аб'ектыўнае правіла грамадскага жыцця. (Cf. Somme théologique, trad. française, Paris, Desclée, La justice, t.I, p.204 (13).*

індывіда, які бярэ ўдзел у працэсе абмену. Зазначым, аднак, калі камутацыйная справядлівасць скіраваная да забеспячэння сапраўднай эквівалентнасці (названай арытметычным раўнаннем) паміж узаемнымі абавязкамі, дык размеркавальная справядлівасць патрабуе падзелу маёмасці не па роўных частках паміж усімі, а па частках, прапарцыйных годнасці тытулаў, якія мае індывід. А вось якім чынам павінна вызначацца значнасць тытулаў, Святы Тамаш нічога пра гэта не кажа. Ён абмяжоўваецца пераказам радкоў "Нікамахавай этыкі":

"Пры размеркавальнай справядлівасці чалавек павінны атрымаць такую колькасць дабротаў, якая адпавядае ягонай вартасці сярод супольнікаў. У супольнасцях з арыстакратычным ладам вартасць вызначаецца дабрадзейнасцю, з алігархічным — багаццем, з дэмакратычным — свабодай, а пры іншых рэжымах — іншым чынам"[1].

Гэты рэлятывізм даволі красамоўна сведчыць пра арыентацыю аўтара. Святы Тамаш Аквінскі не спрабаваў сфармуляваць сапраўды палітычных крытэраў выбару паміж магчымымі сістэмамі размеркавання дабротаў.

Аднак асноўныя элементы эканамічнай філасофіі Святога Тамаша робяцца зразумелымі далей, калі аўтар падыходзіць да разгляду грахоў супраць справядлівасці. І тут мы знаходзім 3 асноўныя "пытанні", менавіта пытанне 66 аб крадзяжы і рабунку, пытанне 77 аб ашуканстве ў гандлі і 78 — аб ліхвярстве. Кожнае "пытанне", дарэчы, падзяляецца на шэраг "артыкулаў", што ўяўляюць пэўную колькасць канкрэтных пытанняў ці сітуацый, з якімі можа сутыкнуцца прапаведнік. І менавіта гэтыя раздзелы "Сумы тэалогіі" найбольш нам цікавыя.

У пытанні 66, артыкул 2, разглядаецца прыватная ўласнасць: "Ці дазваляецца чалавеку мець нейкую рэч у сваёй уласнасці?" Святы Тамаш у абарону прынцыпу прыватнай уласнасці звяртаецца да аргументаў Арыстотэля:

"1. Кожны больш рупліва клапоціцца пра тое, што належыць яму на правах уласнасці...; 2. Больш ладу ў кіраванні маёнткам, калі клопат пра

[1] *Somme théologique, II, II, question 61, art.2, trad. française, op. cit., p.135.*

кожную рэч даручаецца адной асобе...; 3. Мір паміж людзьмі больш гарантаваны, калі кожны задаволены тым, што яму належыць"[1].

Святы Тамаш Аквінскі ні ў якім разе не адмаўляе факта, што ў Арыстотэля абарона прыватнай уласнасці ідзе поруч з ідэяй супольнага карыстання маёмасцю, і надае пэўную ўвагу гэтаму падыходу:

"Чалавек, — пісаў ён, — не павінны карыстацца сваёй маёмасцю так, быццам яна належыць толькі яму, але трэба, каб ён разглядаў гэтую маёмасць як уласнасць усіх у тым сэнсе, што ён заўсёды мусіць быць гатовы падзяліцца ёю з тымі, хто жыве ў нястачы"[2].

Дарэчы, крыху далей знаходзіцца славутае "развязанне", адпаведна з якім "карыстанне рэччу іншага, адабранаю ў выпадку надзвычайнай неабходнасці, не ёсць, уласна кажучы, крадзеж"[3].

Ідэі, якія мы толькі што коратка пераказалі, маюць пэўную вагу і цяпер, бо ляжаць у аснове таго, што сёння называецца "сацыяльнай дактрынай царквы", выкладзенай галоўным чынам у папскіх сацыяльных энцыкліках: "Rerum Novarum" (Леў XIII, 1891), "Quadragesimo Anno" (Пій XI, 1931), "Mater et Magistra" (Ян XXIII, 1961).

Відавочна, што гэтыя дакументы грунтуюцца на ідэях Святога Тамаша Аквінскага, які ў сваю чаргу натхняўся творамі Арыстотэля. Аднак было б памылкаю лічыць, што сацыяльны каталіцызм — гэта простае скарыстанне ідэяў Арыстотэля на практыцы: Святы Тамаш трансфармаваў гэтыя ідэі. Нагадаем, што Арыстотэля хвалявала, якім чынам можна *арганізаваць* у грамадстве агульнае карыстанне ўласнасцю. Так, ён выступаў за шырокае выкарыстанне інстытуцыі супольнага сталавання і гэтым абгрунтоўваў перадачу дзяржаве часткі палеткаў. Карацей — ён прапаноўваў паслабіць рэжым прыватнай уласнасці і прыватнай вытворчасці з дапамогай сацыялістычных, як мы назвалі б іх сёння, захадаў.

Нічога падобнага ў поглядах Святога Тамаша Аквінскага няма; ён толькі просіць уласнікаў быць шчодрымі ў дачы-

[1] *Op. cit., pp.96-97.*
[2] *Op. cit., p.97.*
[3] *Op. cit., p.118.*

неннях з беднякамі. Бясспрэчна, у разуменні тэолага тэзіс паўстае як абавязак, але маральны абавязак не ёсць эквівалент грамадскіх інстытуцый, якія ўхваляў Арыстотэль. Святы Тамаш ігнаруе гэтыя інстытуцыі. Зрэшты, відаць, немагчыма было весці гаворку пра гэта ў творы тэалагічнага і маральнага зместу.

Таксама вышэйзгаданыя папскія дакументы XIX—XX стст. не спяшаюцца займаць пэўную пазіцыю да правамоцнасці і законнасці той ці іншай канкрэтнай грамадскай інстытуцыі.

Энцыкліка "Rerum Novarum" удакладняе, што абавязак уласнікаў абагульняць даходы з карыстання іх уласнасцю — не юрыдычны абавязак, за невыкананне якога іх каралі б законы, а толькі абавязак міласэрнасці:

"Як толькі патрэбы ці належнае задаволеныя ў дастатковай ступені, трэба аддаць рэшту бедным (Лука, XI, 41). Гэты абавязак не юрыдычны, апрача асаблівых выпадкаў, ён вынікае з хрысціянскай міласэрнасці, таму немагчыма прасачыць за яго выкананнем з дапамогай зямной юстыцыі"[1] .

Праўда, далей у тым жа дакуменце ўхваляецца прынцып умяшання дзяржавы ў выпадку, калі закранаюцца інтарэсы цэлай сацыяльнай групы:

"Такім чынам, калі закранаюцца інтарэсы ўсіх або інтарэсы якога-небудзь класа ці проста паўстае пагроза гэтым інтарэсам і калі немагчыма вырашыць ці прадухіліць праблему іншым чынам, дык дзяржаўная ўлада павінна абавязкова ўмяшацца"[2].

Сэнс тэксту робіцца больш зразумелы, калі чытаем, што законы "не павінны рызыкаваць і рабіць больш за тое, што неабходна для спынення злоўжыванняў і прадухілення пагрозаў"[3].

На думку папы Льва XIII, натуральнай асновай грамадскага ладу ёсць уласнасць і ўмяшанне дзяржавы павінна быць *выключэннем*. Дарэчы, у гэтым і палягае непарушная дактрына сацыяльнага каталіцызму, паводле якой дзяржава

[1] *Léon XIII, La condition des ouvriers, Ed. Bonne Presse, 1960, p.21.*
[2] *Ibid., p.29.*
[3] *Ibid., p.30.*

павінна проста служыць апірышчам для прыватных ініцыятываў[1].

У сваёй энцыкліцы 1961 г. папа Ян XIII падтрымлівае гэты пункт погляду:

"Прысутнасць дзяржавы ў эканамічнай галіне, — піша ён, — якой бы вялікай і значнай ні была, не мае на мэце звужэнне сферы свабоды асабістай ініцыятывы"[2].

І далей:

"Права на ўласнасць, нават на сродкі вытворчасці, мае нязменную вартасць менавіта таму, што яно — натуральнае права"[3].

Апошняя думка асабліва відавочна падкрэслівае тамісцкі дух гэтага дакумента. Яна красамоўна паказвае, якім чынам вучэнне Святога Тамаша пра ўласнасць, якое лічылася адно маральнаю дактрынаю, набывае сёння палітычны змест. На падставе таго, што права прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці — "натуральнае права", энцыкліка акрэслена выступае супраць партыяў і разнастайных груповак, якія адстойваюць прынцып сацыялізацыі сродкаў вытворчасці.

4. ГАНДАЛЬ І ЛІХВЯРСТВА. Такім чынам, маральны аспект Святога Тамаша ў пытанні пра ўласнасць вядзе да відавочнай трансфармацыі (з пэўнымі высновамі) пазіцыі Арыстотэля. Пры разглядзе грахоў датычна справядлівасці тэолаг падыходзіць да ацэнкі гандлёвых аперацыяў і ліхвярства. Тут ён зноў звяртаецца да Арыстотэля, але не прымае цалкам яго высноваў.

Артыкул 1 пытання 77 уздымае важкую праблему: "Ці дазволена прадаваць рэч даражэй, чым яна сапраўды каштуе?"

Тэолаг адказвае адмоўна і фармулюе сваю славутую тэорыю "справядлівага кошту". Гэта складаная тэорыя. Перадусім Святы Тамаш заяўляе:

"Выкарыстоўваць ашуканства дзеля таго, каб прадаць якую-небудзь рэч даражэй за яе сапраўдны кошт, — гэта, безумоўна, грэх, бо ідзе падман блізкага, усё робіцца яму на шкоду".

[1] *Гл. A.Valensin, Traité de Droit naturel, Paris, 1925, t.II, p.436.*

[2] *Jean XIII, Les récents développements de la question sociale à la lumière de la doctrine chrétienne, Paris, Ed. Bonne Presse, 1961, p.20.*

[3] *Ibid., p.35.*

Зараз трэба разгледзець выпадак, калі махлярства няма і калі адбываецца продаж за кошт, які адрозніваецца ад сапраўднага, пры гэтым абодва бакі ведаюць пра тое і пагаджаюцца. Сцвярджаецца, што прадаваць тавар больш дорага ці набываць танней за яго сапраўдны кошт — сам па сабе ўчынак несправядлівы і незаконны"[1]. Але далей прызнаецца: калі пакупнік мае вялікую патрэбу ў рэчы, дык гандляр можа без сумневу прадаць гэтую рэч коштам, большым за яе вартасць пры ўмове, што прадавец церпіць страту, калі збывае тавар з рук. Карацей кажучы, патрабаванні мараліста: гандляр не павінны мець прыбытку з асаблівае патрэбы, якую мае пакупнік. Але аўтар не лічыць, што "ў цэлым" можна патрабаваць ад дзяржаўнай улады фіксавання коштаў, каб яны адпавядалі справядлівасці. Зразумела, што "дактрына справядлівага кошту", якую пэўныя аўтары XIX ст. спрабавалі папулярызаваць, застаецца невыразнаю.

Вось мы і падышлі да вельмі важнага артыкула 4. Пытанне наступнае: "Ці дазваляецца ў гандлёвай дзейнасці прадаваць па большым кошце, чым сам набыў?" Такім чынам, ставіцца пытанне пра легітымнасць гандлю. Здавалася б, сама канцэпцыя справядлівага кошту павінна была прывесці да такога ж суровага асуджэння гандлю, якое мы знаходзім у Арыстотэля. Але, нягледзячы на ўсю павагу да "філосафа", Святы Тамаш не лічыць магчымым падзяляць ягоную пазіцыю, бо вельмі добра адчувае, у якой ступені ўздым цывілізацыі звязаны з росквітам гандлю.

Філосаф удала скарыстоўвае з аргументацыі самога Арыстотэля дзеля ўласных высноваў.

Як і Арыстотэль, Святы Тамаш паказвае, што гандаль небяспечны[2]. Для Арыстотэля гэта маральная небяспека, бо, кажа ён, чалавек можа імкнуцца да бязмежнага ўзбагачэння, толькі каб дасягнуць цялесных уцехаў[3]. Відаць, Арыс-

[1] *Somme théologique, trad. française, op. cit., La Justice, t.III, p.183.*

[2] *"І, больш таго, калі грамадзяне прысвячаюць сябе гандлёвай дзейнасці, яны адчыняюць дзверы яшчэ адной загане: сапраўды, купцы накіроўваюць усе свае высілкі на прыбытак, і ў выніку практыка гандлю сее сквапнасць у сэрцы грамадзянаў. І спрычыняецца да таго, што ў грамадстве ўсё робіцца прадажным..." Du gouvernement royal, op. cit., p.145.*

[3] *Гл. с. 52.*

тотэль заблытаўся паміж этычнымі і палітычнымі з'явамі. У дачыненнях да пытанняў маралі Святы Тамаш лічыць Арыстотэля надта суровым. Сам ён мяркуе, што гандаль можа быць прызнаны законным, калі мае маральную, годную мэту, а не мэту ўзбагачэння.

"Нават калі прыбытак — галоўная мэта гандлю — не дае сам па сабе нічога высакароднага ці карыснага, ён таксама не мае нічога дрэннага ці супраціўнага дабрадзейнасці. Такім чынам, нішто не перашкодзіць накіроўваць гандаль на карысныя ці нават высакародныя мэты, і тады гандаль робіцца законнаю справай. Менавіта такое назіраецца, калі чалавек выкарыстоўвае сярэдні прыбытак, які ён зарабляе праз гандаль, для забеспячэння жыццёвых патрэбаў сваёй сям'і ці на дапамогу беднякам; або калі індывід займаецца гандлёвай дзейнасцю дзеля грамадскай карысці, г. зн. з мэтай забеспячэння росквіту і моцы сваёй бацькаўшчыны. Безумоўна, ён шукае прыбытку, але толькі ў якасці аплаты за сваю працу, а не ў якасці канчатковай мэты"[1].

Ход думкі, сапраўды, здаецца правільны. Гэтая заўвага разбурае аснову палітычнай тэорыі Арыстотэля, але трэба адзначыць, што Святы Тамаш Аквінскі нічога не прапануе замест таго, што разбурыў, ніякім чынам не надае гандлю ні *аб'ектыўнай* сферы дзеяння, ні *аб'ектыўнай* ролі, адно абмяжоўваецца прызнаннем гандлю законным кожны раз, калі *памкненні* гандляра добрыя з гледзішча маральнасці. Натуральна, такі падыход не можа ўяўляць сабою прынцып палітычнай навукі.

Такі ж самы пераход ад палітычнага да маральнага можна назіраць і пры разглядзе прынцыповага пытання аб *ліхвярстве*.

З развіццём абмену і адраджэннем дзяржавы ліхвярства набывала ўсё большую вагу. На практыцы атрымоўвалася, што царква, якая сама мела вялікую патрэбу ў грошах, часта звярталася да ліхвяроў ды брала іх пад сваю пратэкцыю[2]. Тым не менш асуджэнне ліхвярскай дзейнасці з боку царквы ўсё расло.

У першыя стагоддзі існавання хрысціянскай царквы саборы ганілі дзейнасць свецкіх асобаў, якія займаліся ліхвярствам, а святарам пагатоў строга забаранялася займац-

[1] *Somme théologique, trad. française, op. cit. La Justice, t.III, p.205.*

[2] *Гл. прыведзеныя прыклады ў R.H.Tawney, La religion et l'essor du capitalisme, trad. française, Paris, 1951, p.36.*

ца гэтай справай. У Сярэднявеччы забарона набывае абсалютны і ўсеагульны характар. У прыватнасці, яна прысутнічае ў пасланнях папаў Аляксандра III і Урбана III (канец XII ст.). Лятранскі (1179 г.) і Ліёнскі (1274 г.) сусветныя саборы накладаюць асуджэнне на ліхвяроў[1]. Такое ж асуджэнне знаходзім у дэкрэце Грацыяна, галоўным зборніку сярэднявечнага кананічнага права.

Гэтыя асуджэнні рабілі ліхвяроў падсуднымі царкоўным, а пад час і свецкім судам. Праўда, пакаранні заўсёды былі лёгкія параўнальна з буйнымі памерамі фінансавай дзейнасці. Тым не менш мелі месца і пераслед, і прысуды[2].

На першы погляд пазіцыя Святога Тамаша можа здацца простай і катэгарычнай. Ён асуджае пазыку пад працэнт на падставе аргументаў Арыстотэля: па сваёй прыродзе грошы не могуць спараджаць грошай. У "*Суме тэалогіі*" да гэтай аргументацыі дадаецца яшчэ адзін аргумент, выснаваны з палажэння рымскага права, якое дзяліла рэчы на рэчы "аднаразовага спажывання" і на рэчы, што выкарыстоўваюцца на працягу доўгага часу: хата, поле, і таму зразумела, што за карыстанне імі можна браць грошы. Што да рэчаў, якія знікаюць пры іх выкарыстанні, у тым ліку й грошы, — гэта ненатуральна.

У творы, які папярэднічаў "Суме тэалогіі", — "*Каментар сентэнцыяў*"[3] Святы Тамаш браў іншы доказ. Ён сцвярджаў, што, калі крэдытор прэтэндуе на частку прыбытку, атрыманага тым, хто браў пазыку, ён беспадстаўна прысвойвае вынікі дзейнасці іншага чалавека, бо "ўсялякая карысць, якую маюць з пазыкі, паходзіць ад мудрасці таго, хто з розумам здолеў ужыць грошы"[4]. Хто-ніхто разглядаў гэтую аргументацыю як пачатак крытыкі, якую скіроўвалі ў бок прыбытку без працы сацыялісты Новага часу. Цікавае параўнанне, але варта зацеміць, што ў іншых месцах Святы Тамаш Аквінскі прызнаваў, што не толькі праца, але і ўлас-

[1] *Гл. Dictionnaire apologétique de la Foi catholique, de Jaugey, article "Intérêt". Гл. таксама Tawney, op. cit., pp. 50-51; Ashley, Histoire des doctrines économiques de l'Angleterre, I, Le Moyen Age, traduction française, Paris, 1900, pp.186-192.*

[2] *Tawney, op. cit., pp.54-56.*

[3] *Размова ідзе пра "Сентэнцыі" Пятра Ламбардскага.*

[4] *Commentaire, livre III, 37, 1-6.*

насць можа быць абгрунтаваннем права на прыбытак. Аднак пра аргумент, які вылучаўся ў "Каментары сентэнцыяў", у "Суме тэалогіі" не згадваецца.

Такім чынам, пазыка пад працэнт недвухсэнсоўна забаранялася. Але пры ўважлівым разглядзе тэкстаў бачна, што Святы Тамаш быў вымушаны зрабіць пэўныя саступкі патрабаванням часу. Яны суправаджаюцца вялікімі засцярогамі мараліста, заклапочанага тым, каб перашкодзіць распаўсюджанню практыкі, у вышэйшай ступені небяспечнай для чалавечых душаў. Узапраўды пасля гэтых саступак забарона ліхвярства як палітычны тэзіс страчвала свой сэнс. Гэта быў першы крок на шляху, што прывядзе да фактычна поўнай згоды з практыкай, якая асуджалася з гледзішча маралі.

Так, напрыклад, у "Суме тэалогіі" Святы Тамаш дапускае сітуацыю, калі ў кантракце аб пазыцы можа быць пазначана пэўная кампенсацыя крэдытору з прычыны шкоды, якую ён можа мець у выніку гэтае аперацыі.

"У сваім кантракце з тым, хто бярэ пазыку, крэдытор можа без усялякага граху абумовіць пэўнае пакрыццё сваіх стратаў, бо ён часова застаецца без таго, што было ў яго валоданні: гэта не азначае продаж права на выкарыстанне грошай, а атрыманне кампенсацыі"[1].

Такім чынам, адкрываецца зеўра, якая ў хуткім часе звядзе на нішто практычную вартасць асуджэння ліхвярства[2]. Безумоўна, прызнанне кампенсацыі як "damnum emergens"[3] не прыводзіць Святога Тамаша да прызнання кампенсацыі за страту магчымага прыбытку ("lucrum cessans").

"Ніхто не мае права, — пісаў ён, — абумоўліваць у кантракце кампенсацыю з абгрунтаваннем, што немагчыма атрымаць прыбытак з пазычаных грошай, бо не існуе права

---

[1] *Somme théologique, II, II, question 78, art.2, op. cit., p.222.*

[2] *У XIII ст. юрысконсульты цывільнага права мусілі прытрымлівацца прынцыпаў, вызначаных тэалогіяй. Яны патрабавалі, каб працэнт за пазыку быў платай за страты, панесеныя крэдыторам, дапускаючы, што ў момант пазыкі можна абумовіць пэўную кампенсацыю, якая аўтаматычна ўзнікала б пры любой затрымцы вярнуць пазычаную суму. З гэтага вынікае, што на тэрмін, абумоўлены кантрактам, пазыка ёсць беспрацэнтнай, затым яна робіцца звычайнаю, пад працэнт. Гл. на гэты конт W.J.Ashley, Histoire des doctrines économiques de l'Angleterre, op. cit.,I, p.222.*

[3] *Пакрыццё непрадбачаных стратаў. — Заўвага перакладніка.*

прадаваць тое, чым яшчэ не валодаеш і што магло б прапасці"[1].

Аднак сёння тэолагі заўважаюць, што грошы звычайна і рэгулярна прыносяць прыбытак. Такім чынам, кажуць яны, "lucrum cessans" павінны кампенсавацца праз працэнт.

Менавіта таму царква можа, не мяняючы сваіх традыцыйных прынцыпаў маралі, дапусціць існаванне шматлікіх формаў фінансавай дзейнасці, якія прадугледжваюць спагнанне працэнтаў з капіталу[2].

5. ВЫСНОВЫ. Вывучэнне тамісцкіх поглядаў на эканоміку паказвае, што рэальна філасофія Святога Тамаша Аквінскага не здолела спалучыць вучэнне Арыстотэля і хрысціянскую мараль.

Як і Арыстотэль, Святы Тамаш таксама намагаўся вызначыць пэўныя натуральныя межы дзейнасці людзей у галіне эканомікі, але тым жа часам падпарадкоўвае гэтыя межы маральнай ацэнцы, якая, згодна з сярэднявечнай канцэпцыяй, паўстала ў сувязі са звышнатуральнымі паўнамоцтвамі царквы і звышнатуральнай мэтай чалавека.

У такім разе рушацца Арыстотэлевы аргументы, бо, калі ў канчатковым выніку эканамічныя паводзіны будуць апраўдвацца прынцыпамі маральнасці звышнатуральнага паходжання, дык сапраўды немагчыма будзе ўтрымаць іх у натуральных межах. У святле аргументаў Арыстотэля гандаль *падаецца* натуральна ганебнай рэччу, але, на думку царквы, калі *памкненні* гандляра добрыя, то і ягоная дзейнасць законная. Пазыка пад працэнт таксама здаецца ганебнай з'явай, але Святы Тамаш дапускае, што крэдытор не ўчыніць граху эгаізму, калі задаволіцца патрабаваннем кампен-

[1] *Somme théologique, question 78, article 2, op. cit., p.222.*

[2] *Гл. Le Dictionnaire apologétique de la Foi catholique, article "Intérêt", et le commentaire du R.P.Spicq, O.P., dans la traduction de la Somme que nous utilisons: La Justice, t.III., p.484. У "Суме тэалогіі" Святы Тамаш закранае шмат іншых сацыяльных праблемаў, у прыватнасці пытанне рабства. Тут ягоны пункт погляду заблытаны і дваісты. Згодна з некаторымі каментатарамі, тэолаг лічыў, што рабства не ёсць натуральная з'ява, але яно неабходна на практыцы (гл. J.Haessle, Le travail, traduction française, Paris, 1932, pp.99-101). Згодна з іншымі, Святы Тамаш прызнаваў, што рабства — з'ява натуральная, але ён, "аднак, не ахвяруе правамі чалавечай асобы" (гл. заўвагу R.P.Delos, in Somme théologique, op. cit., La Justice, t.I, p.190). У гэтым выпадку мы зноў бачым цяжкасці, з якімі сутыкаецца сістэма грамадскае маралі, калі яна не ўлічвае факта гістарычнай эвалюцыі.*

сацыі за страты, якія ён рэальна адчуў у выніку пазыкі. Не вінаваты перад царквою, ліхвяр не можа быць асуджаны й свецкай уладай.

Святы Тамаш хоча адначасова застацца верны вучэнню Арыстотэля, якое дазваляе ці забараняе з апораю на розум, што вызначае натуральны грамадскі лад, і хрысціянскай рэлігіі, якая дазваляе ці забараняе ў залежнасці ад таго, ці дзейнічае сведамасць індывіда згодна ці нязгодна з узорам, на які кожны павінны імкнуцца быць падобным, — Ісусам Хрыстом. У выніку менавіта сведамасць, г. зн. суб'ектыўны погляд, заўсёды пераважае над аб'ектыўным успрыманнем рэчаў.

Ці такая ўжо моцная хрысціянская мараль, ці надзейна абароненая яна ад любой брыды? Хто яго ведае. Зеўра, пакінутая Святым Тамашом у справе асуджэння царквою гандлю і ліхвярства, будзе ўсё больш пашырацца, бо гандаль і пазыка пад працэнт будуць рабіцца ўсё важнейшымі відамі дзейнасці. Паколькі прызнаецца, што добры намер засцерагае гандляра і ліхваяра ад грэшнага ўчынку, дык неўзабаве, калі гандаль і пазыка стануць вельмі распаўсюджанаю з'яваю, будзе вырашана *папярэдне лічыць*, што добры намер прысутнічае.

Святы Тамаш Аквінскі ў пэўнай ступені перарывае традыцыю абыякавасці царквы да эканамічных пытанняў, сфармаваную ў Сярэднявеччы пад уплывам Святога Аўгустына, але тамісцкая канцэпцыя палітычнай і эканамічнай філасофіі, якая імкнулася да кампрамісу паміж рацыянальным спазнаннем і верай, у хуткім часе патрапіць пад атаку тых, хто будзе змагацца за поўнае вызваленне разумовай дзейнасці. У эпоху Адраджэння эканамічная філасофія вырвецца за межы хрысціянства і часта будзе выступаць супраць яго.

Бібліяграфія

R. DE ROOVER, *La pensée économique des scolastiques*, Montréal, 1971.
H.R. SEWALL, *The theory of value before Adam Smith*, New Jork, 1968.

ЧАСТКА ДРУГАЯ



НАРАДЖЭННЕ ПАЛІТЫЧНАЙ ЭКАНОМІІ І СЦВЕРДЖАННЕ ЛІБЕРАЛЬНАЙ ДАКТРЫНЫ

Раздзел I

МЕРКАНТЫЛІЗМ І УТАПІЗМ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

§ 1. Развіццё капіталізму. Сацыяльны крызіс XV—XVI стст.

У XIV—XV стст. працягвалася развіццё гандлю. З ростам патрэбаў развівалася таксама прамысловасць (горнарудная, металургічная, тэкстыльная). Утварыўся клас капіталістаў, які складаўся з прамыслоўцаў, што выкарыстоўвалі працу найманых рабочых (яны былі сканцэнтраваныя ці часцей працавалі на даму), з буйных купцоў і банкіраў. Гэты клас не падпарадкоўваўся цэхавым рэгламентацыям і гарадскім уладам. Часта ён быў вельмі шчыльна звязаны з каралеўскай уладаю, якой ягоныя прадстаўнікі пазычалі грошы. Дзейнасць новага класа скіроўвалася адно да пошукаў прыбытку. Да капіталістаў, прыкладам, належала сям'я Фугераў у Аўстрыі XV—XVI стст. ці Жак Кёр у Францыі XV ст.

Жак Кёр здзяйсняў прыбытковыя аперацыі, калі займаўся экспартам серабра з багемскіх руднікоў у краіны Усходу, а ўзамен імпартаваў золата. Ён купіў канцэсію на каралеўскія руднікі ў Ліёнскім рэгіёне і ў Бажале. На пасадзе скарбніка двара Жак Кёр пазычаў каралю Карлу VII значныя сумы пад 12—50%. Ён валодаў сямю караблямі далёкага плавання, 300 факторыямі ў Фамагусце, Бруге і Англельшчыне, палацам у Бургу, дамамі ў Парыжы, Туры і Манпэлье. Кароль надаў яму тытул шляхціца. Калі ў 1451 г. Жак Кёр трапіў у няласку, ён валодаў значнымі багаццямі.

Упоравень з ліберальнаю палітыкай у дачыненні да іншаземных купцоў развіваліся новыя гарады (такія, як Антвэрпэн). Галяндскі флот ствараецца пры адсутнасці манапольнай сістэмы. У Францыі расквітнеў горад Ліён, які парваў з палітыкаю карпаратывізму.

Напрыканцы XV ст. быў дасягнуты вялікі прагрэс у майстэрстве навігацыі. Мараплаўцы пачалі скарыстоўваць з астралагічных адкрыццяў. Вынаходка тэлескопа дазволіла вымяраць шырату (што да вызначэння даўгаты, то трэба будзе пачакаць да XVIII ст.).

У 1487 г. Дыас абгінае мыс Добрай Надзеі, а праз адзінаццаць гадоў (1498 г.) Васка да Гама, абагнуўшы Афрыку, дасягае Індыі. Так быў адкрыты новы марскі шлях для гандлю з Усходам. У 1492 г. Хрыстафор Калюмб адкрывае Амэрыку. Гішпанія імкліва заваявала Мэксіку і Пэру: золата і серабро ў выглядзе мастацкіх скарбаў і прадукцыі руднікоў забяспечылі дамінаванне Гішпаніі ў Эўропе на цэлае стагоддзе. Напачатку толькі Гішпанія мела калоніі за акіянам. Праз стагоддзе англельскія, галяндскія і французскія эмігранты ўсталяваліся далей на поўнач, заклалі плантацыі тытуню, заняліся рыбалоўствам і адчынілі факторыі для куплі пушніны.

Эўропа пазнаёмілася з невядомымі ёй новымі прадуктамі: гарбатай, завезенай галяндцамі ў 1606 г.; кавай (прыкладна ў тыя ж часы); індыга, што прыйшло з Усходу; какавай з Цэнтральнай Амэрыкі; тытунём, завезеным у Гішпанію ў 1558 г.; памідорамі, кукурузаю, бульбай, ваніллю.

Значна павялічыўся гандаль іншымі таварамі. Цукар, патака, ром — асноўныя тавары гандлю з Вэст-Індыяй. Да гэтага трэба дадаць імклівы рост гандлю чорнымі рабамі, распачатага ў 1510 г.

Развіццё капіталізму непазбежна спараджала ў самых развітых рэгіёнах Эўропы чарговы сацыяльны крызіс.

Золата і серабро, якое ў вялікай колькасці вывозілася з Амэрыкі, выклікала павелічэнне колькасці грошай у абарачэнні. У выніку знізілася вартасць каштоўных металаў, а гэта — шлях да росту коштаў. Так, у Францыі за перыяд з 1462 да 1602 г. пакупная здольнасць грошай скарацілася на 80%.

Рост коштаў значна змяніў становішча розных сацыяльных класаў.

Што да рамеснікаў у гарадах, дык цэхавыя кампаньёны былі зведзеныя цяпер да стану найманых рабочых, іхная пакупная здольнасць зніжалася. Прадстаўнікі сельскай прамысловасці працавалі на "мануфактуршчыкаў", апынуліся ў ізаляцыі і былі вымушаныя згаджацца з гаротнымі ўмовамі жыцця. Выбухалі страйкі і народныя абурэнні. У 1539 г. эдыктам Вілер-Катрэ ў Францыі забараняецца стварэнне рабочых таварыстваў.

Аднак самыя значныя змены адбываліся на вёсцы, прынамсі ў асобных рэгіёнах. Высокія кошты на ўсё даводзілі да галечы былую феадальную арыстакратыю, што жыла галоўным чынам за кошт грашовага чыншу, памеры якога вызначаліся на доўгі перыяд, а часам нават навечна (як у Францыі). Буржуазія скупляла зямлю або з мэтаю памножыць свае багацці, або дзеля спекулятыўных меркаванняў (кошт зямлі ўвесь час павялічваўся). Праз гэта буржуазія атаяснялася са шляхтаю, бо валоданне пэўнымі маёнткамі давала магчымасць набыць шляхотны тытул.

Прыток капіталаў у вёску даваў новыя прагрэсіўныя змены ў спосабах вядзення гаспадаркі. У Фляндрыі знік звычай пакідаць зямлю на папар. Папар быў заменены на штучныя лугі. У Францыі распаўсюдзілася культура шаўкоўнічнага дрэва; разводзіцца шаўкавічны чарвяк. Але самыя яскравыя змены адбыліся ў Ангельшчыне. Капіталісты, якія ўзбагаціліся за кошт экспарту воўны, захоплівалі землі. З мэтаю павелічэння авечкагадоўлі яны ператваралі ворную зямлю ў пасасы і атрымлівалі ад парламента права займець землі сялянскіх грамадаў, якімі дагэтуль карысталіся сяляне, а таксама права агароджваць набытыя землі. Дзве гэтыя акалічнасці вымушалі значную частку сялянаў пакінуць вёску. Адначасова адбывалася павелічэнне агульнай колькасці насельніцтва. У XVI ст. у Ангельшчыне налічвалася каля 4 200 000 жыхароў, у Францыі — 18 мільёнаў. Узнік пэўны лішак рабочай сілы. Сярод простага народа пашыралася галеча.

На пачатку XVI ст. гішпанскі прафесар Вівэс утварыў у Фляндрыі ўстанову грамадскай дапамогі дзецям. Пачынаючы з 1551 г. у Ангельшчыне выйшлі законы, якія прымушалі беднякоў працаваць у "працоўных дамах", дзе яны гублялі свабоду. Бязлітасна выкараняліся бадзяжніцтва і жабрацтва.

У перыяд чорнай галечы народа адначасова закладвалася магутнасць навачасных дзяржаваў Заходняй Эўропы.

Вынаходка гарматы ў XIV ст. адыграла вялікую ролю ў гэтым працэсе, бо з ёю каралі маглі адолець абарончыя ўмацаванні феадальных замкаў. Развіццё гандлю таксама дужа паспрыяла стварэнню нацыянальных дзяржаваў.

Сапраўдная еднасць Ангельшчыны была дасягнутая толькі пад час праўлення Генры (Генрыха) VII (1485—1509). Ангельская манархія абапіралася на парламент, які складаўся са шматлікіх прадстаўнікоў сярэдняга класа, і ў прыватнасці з вытворцаў сукна.

У Францыі працэс нацыянальнага задзіночання стаў шпарчэйшы пачынаючы з Люі (Людовіка) XI (1461—1483). У Гішпаніі аб'яднанне адбылося ў 1469 г. праз шлюб Фердынанда Арагонскага і Ізабэлы Кастыльскай. Пратэстанцкія Злучаныя Правінцыі Нідэрляндаў у 1609 г. заваявалі незалежнасць ад гішпанскае кароны.

Багацце сыравіны і развіццё сістэмы вэксаляў, а пазней і банкаўскіх білетаў у якасці плацежных сродкаў дазваляюць манархам браць падаткі грашыма, вызначаць кошт грошай і ўтрымліваць войска. Каралі пазычаюць у банкаў значныя грашовыя сумы.

Войны паміж нацыянальнымі дзяржавамі — звычайная з'ява. З 1494 да 1559 г. у Эўропе амаль штогод ідзе вайна; у XVII ст. было толькі сем гадоў поўнага міру: паміж 1656 і 1815 гг. Ангельшчына жыла ў стане вайны 84 гады.

Усё часцей прычынамі войнаў былі барацьба супраць манаполіі ў гандлі, жаданне прымусіць іншую дзяржаву да змены гандлёвай палітыкі ці захоп чужых каланіяльных уладанняў.

§ 2. Агульны рух ідэяў. Адраджэнне і Рэфармацыя

У шчыльным звязку з развіццём гандлю і эканамічным уздымам у Эўропе развіваецца моцны інтэлектуальны рух.

Ізноў вырашальную ролю ў гэтым адыгрывае паўторнае адкрыццё ў XIV ст. антычных твораў, якое стала заслугай вялікіх італьянскіх пісьменнікаў, заахвочаных і матэрыяльна падтрыманых купцамі і прынцамі.

Пэтрарка (1304—1374) знаходзіць у бібліятэцы Вэронскага сабора рукапіс "Лістоў" Цыцэрона, а потым і ягоныя "Прамовы". Пэтрарка вывучае грэцкую мову, але так і не авалодае ёю настолькі, каб прачытаць асобнік Гамэра, які быў яму падараваны ў Авіньёне адным бізантыйскім арыстакратам[1].

Сын купца Бакача (1313—1375) запрасіў да сябе ў дом грэка і неўзабаве змог прачытаць Гамэра ў арыгінале.

У 1396 г. бізантыец Мануіл Хрысалорас усталяваўся ў Флярэнцыі ў якасці выкладчыка грэцкай мовы. Наладжваюцца рэгулярныя кантакты паміж Італіяй і Грэцыяй, і ў Італію прывозяць вялікую колькасць стара-

[1] *Гл. Schnürer, L'Eglise et la civilisation au Moyen Age, Paris, 1938, t.III, pp.441-442.*

жытнагрэцкіх рукапісаў. Так, у 1423 г. у Вэнэцыю прывезлі 238 кніг. І слушна зрабілі, бо неўзабаве туркі знішчаць усе старажытныя рукапісы, што заставаліся ў Грэцыі. Менавіта гэтай эпохай (пачатак XV ст.) датуецца адкрыццё Захадам твораў Плятона. З вялікім натхненнем вывучаліся таксама творы эпікурэйцаў і стоікаў.

У 1453 г. туркі захопліваюць Канстантынопаль. Гіне Усходняя Рымская імперыя. Вялікая колькасць адукаваных грэкаў знайшла прытулак у Італіі, і яны далі новы штуршок руху за вяртанне да антычных узораў у літаратуры і мастацтве, вядомаму пад назвай Адраджэнне.

Гэты рух спалучаўся з уздымам цікаўнасці да навуковае сферы: Леанарда да Вінчы (1452—1519) быў адначасова геніяльным мастаком і наватарам ва ўсіх галінах навукі.

Пасля Паўночнай Італіі Адраджэнне дасягнула другога магутнага гандлёвага цэнтра — Галяндыі. Дзве вельмі важныя вынаходкі паспрыялі паскарэнню гэтага руху: вынаходка ў 1440 г. друкарскага варштата і выкарыстанне, па прыкладу кітайцаў, паперы замест пергамену. Галоўным прадстаўніком новай школы пачатку XVI ст. быў гуманіст Эразм Ратэрдамскі (1467—1536).

У Францыю Адраджэнне прыйшло са спазненнем. Яно, у прыватнасці, прадстаўлена творамі Рабле (памёр у 1555 г.) і Мантэня (памёр у 1592 г.).

У Ангельшчыне Томас Мор (1478—1535) пад уздзеяннем Плятонавай "Рэспублікі" выдаў сваю славутую "Утопію".

З Адраджэннем у Эўропе пачаўся перыяд інтэлектуальнага крызісу, бо новыя філосафы мелі перад вачыма далёкія ад хрысціянства і непадобныя да Арыстотэлевых вялікія антычныя творы. Мысляры адыходзілі ад сістэмы Святога Тамаша Аквінскага, якую ўзяла на ўзбраенне царква, сістэмы, што была адначасова Арыстотэлевай і хрысціянскай.

У навуковай галіне Арыстотэль таксама быў не ў модзе, усе схіляліся да ідэяў, знойдзеных у Плятона і яго вучняў. Арыстотэль вучыў, што свет складаецца з нерухомых рэчываў і істотаў, паміж якімі не існуе ніякіх узаемадачыненняў. Цяпер жа, наадварот, навукоўцы намагаліся ператвараць рэчы, у прыватнасці з мэтаю атрымаць золата. Наступіў час шырокага распаўсюджання алхіміі, а таксама астралогіі і магіі.

Рабіліся спробы стварыць новую канцэпцыю Сусвету. Часам гэтыя спробы прыводзілі да адкрытага адмаўлення хрысціянскіх вераванняў. У 1516 г. Пампанацы публікуе "Трактат аб несмяротнасці душы", дзе імкнецца даказаць, што кара і пашана, якія нібыта чакаюць людзей на тым свеце, — гэта выдумка.

Такім чынам, ва ўсіх галінах сярэднявечныя канцэпцыі трапілі пад бязлітасную крытыку, аднак, калі той кажа "гуманісты", трэба мець на ўвазе, што гутарка ідзе пра адукаваных людзей, навукоўцаў, якія не мелі магчымасці ўплываць на шырокую публіку, і менавіта таму ім пакідалася свабода творчасці. Многія з іх нават працавалі пад крылам папаў, якім карцела надаць рымскаму двару болей бляску.

І наадварот, паралельна з гуманізмам распаўсюджваўся рух, які ставіў зусім іншыя праблемы, бо ён авалодваў масамі, — рух за рэлігійную рэформу.

У XIV ст. у Ангельшчыне ўздымаецца антыклерыкальны рэвалюцыйны рух. У сваёй паэме, напісанай у 1362 г., Уільям Лэнглэнд скардзіўся на прагнасць царквы і нагадваў хрысціянскі прынцып, згодна з якім той, хто працуе, павінны мець сродкі на жыццё. Уікліф (1320—1384) стварыў рух за рэформу рэлігійнага жыцця на грунце новага прачытання Бібліі. У 1381 г. яго вучань, святар Джон Бол, падняў сялянаў на паўстанне. Гэта быў рух лалардаў, дэвізам якога было:

Калі Адам араў,
а Ева прала,
дзе ж быў шляхцюк?

Паўстанне лалардаў было патопленае ў крыві. Але ягоныя ідэі праз студэнтаў, што прыязджалі вучыцца ў Оксфард, былі перанесеныя ў Багемію. На чале руху стаў пражскі выкладчык і прапаведнік Ян Гус, спалены на агні як ерэтык у 1415 г. Але з гусіцкага руху паўсталі розныя секты. Адна з іх, секта "Багемскіх братоў", вылучыла перадавую сацыяльную праграму, якая, у прыватнасці, адстойвала поўную маёмасную роўнасць.

У 1517 г. нямецкі манах Лютэр пачаў барацьбу супраць прадажнасці царквы і найперш супраць продажу "індульгенцыяў". Ён хацеў зліквідаваць крыніцы прадажнасці і сцвярджаў, што толькі вера можа выратаваць ці "апраўдаць", а ахвяраванні (у прыватнасці, дары царкве) не маюць аніякай эфектыўнасці. У хуткім часе Лютэр знаходзіць падтрымку і нават дапамогу з боку вялікай колькасці нямецкіх феадалаў, варожа настроеных супраць царквы, землі якой няспынна раслі. У 1520 г. папа выносіць асуджэнне Лютэру, той у адказ патрабуе скасаваць інстытуцыю папства.

Паўстанне супраць Рыма набыло рэвалюцыйны характар. У 1520 г. Томас Мюнцэр пачаў прапаведваць хуткі надыход сацыяльнага ладу, пры якім не будзе прыгнёту беднякоў і запануе рэлігія без святароў.

У 1524 г. у многіх рэгіёнах Нямеччыны сяляне падымаюцца на барацьбу. Лютэр асудзіў паўстанне; ён казаў, што "раб Хрыстоў мае свабоду, дадзеную Хрыстом", і нельга імкнуцца ператварыць "духоўнае царства Хрыстова ў зямное і бачнае царства"[1]. І каталіцкія, і лютэранскія сеньёры аб'ядналіся дзеля перамогі над паўстанцамі. У 1525 г. удзельнікі паўстання былі жорстка пакараныя.

Тым не менш у Нямеччыне, Галяндыі і на балтыцкім узбярэжжы працягваўся рост ерэтыка-рэвалюцыйных сектаў. Прыхільнікі сектаў атрымалі назоў "анабаптыстаў", бо сцвярджалі, што хрысціяне па дасягненні сталага ўзросту павінны праходзіць другое хрышчэнне ("баптэму").

[1] *Cité par. H.Sée, A.Rebillon et E.Préclin, Le XVI siècle, collection "Clio", Paris, 1950., p.140.*

У 1534 г. Ян Ляйдэнскі ўсталяваў у горадзе Мюнстэры хрысціянска-камуністычны лад, але неўзабаве эксперымент прывёў да бязладдзя. У 1535 г. біскуп адваёўвае горад.

Рух у падтрымку рэлігійнае рэформы распаўсюдзіўся на Швайцарыю і Францыю. Ён знайшоў новага правадыра ў асобе Жана Кальвіна (нарадзіўся ў 1509 г. у горадзе Нуаёне). У 1536 г. ён выдаў у Базэлі кнігу "Павучанні ў хрысціянскай веры". Дактрына Кальвіна была прынятая найперш у горадзе Жэнэва.

Як і Лютэр, Кальвін вучыў, што толькі вера апраўдвае і што людзям з самага нараджэння ўжо наканаванае ці выратаванне, ці пакуты, і яны ніякім чынам не могуць змяніць свайго лёсу. Але кальвінізм па многіх пытаннях розніцца ад лютэранства. Вучэнне мела асаблівы поспех у гандлёвых гарадах. Кальвінісцкае бачанне эканамічных праблемаў адметнае ад лютэранскага. Падагулена можна казаць, што стаўленне Кальвіна да грамадскай дзейнасці вылучаецца сваёй арыгінальнасцю і яскрава сведчыць пра нараджэнне і развіццё ў Эўропе новага менталітэту.

Лютэр сурова асуджаў гандаль і ліхвярства, новы рэфарматар заняў іншую пазіцыю.

Кальвін заакцэнтаваў праблему, якую мы ўжо сустракалі ў Святога Тамаша: калі характар учынку вызначаецца па намеры чалавека, дык хіба нельга, каб пры пэўных умовах гандаль і фінансавая дзейнасць былі прымальныя?

Кальвін адказвае на пытанне станоўча, ён тут значна больш талерантны, чым Святы Тамаш Аквінскі. Працэнт ад капіталу заўсёды будзе законны, калі ён будзе памяркоўны і "пачэсны". З другога боку, гандаль стане законнай дзейнасцю тады, калі гандляр не будзе мець празмерных прыбыткаў, якія супярэчылі б міласэрнасці і вялі б да грахоўнага ладу жыцця.

Такім чынам, эканамічная філасофія кальвінізму была перадусім развіццём тамісцкай філасофіі. Хаця тэалогія Кальвіна і не давярае людской прыродзе адрозна ад вучэння Святога Тамаша, на практыцы яна прыходзіць да большых саступак гэтай прыродзе, што яскрава пацвярджаецца ходам тагачаснае гісторыі — сведкі поўнага трыумфу гандлю. Уплыў гістарычных падзеяў быў настолькі магутны, што кальвінізм не абмяжоўваецца фактам талерантнага стаўлення да гандлёвай дзейнасці, ён ухваляе гандаль і нават лічыць поспех у гандлі сваеродным знакам Боскае ласкі.

Абапіраючыся на асобныя пункты пратэстанцкага вучэння, нямецкі сацыёлаг Макс Вэбэр даказваў, што Рэфармацыя стала вызначальным чыннікам у працэсе пераходу да капіталістычнага спосабу вытворчасці. У прыватнасці, ён цытуе ўрывак тэксту пурытанскага прапаведніка Рычарда Бакстэра (1615—1691), які выступіў супраць тагачасных традыцыяў: "Калі Бог дае вам магчымасць ісці па такім шляху, дзе вы можаце законна зарабіць болей, чым на іншых шляхах (і гэта без шкоды для вашае душы, вашага блізкага), і калі вы адмаўляецеся ад самага пры-

бытковага шляху, абраўшы замест яго меней прыбытковы, вы супярэчыце адной з мэтаў вашага прызвання, вы адмаўляецеся стаць цівуном Божым, вы адмаўляецеся прыняць дар і скарыстаць з яго дзеля Бога, калі Ён гэтага запатрабуе. Такім чынам, працуйце, каб быць багатымі дзеля Бога, а не дзеля плоці і граху"[1].

Заклік яскрава сведчыць пра дзіўную пераарыентацыю стаўлення хрысціянскай царквы да багацця. Іншыя даследнікі паказалі, што тое сама вельмі хутка адбываецца і сярод каталікоў[2].

§ 3. Меркантылісцкая дактрына

Адметнасцю эпохі Адраджэння і Рэфармацыі быў моцны рух за вызваленне ад уплыву царквы і сярэднявечных канцэпцыяў зверхнасці звышнатуральнага пачатку. У процівагу гэтым канцэпцыям фармуецца бачанне чалавека, пры якім, з аднаго боку, прызнаецца абсалютная каштоўнасць дзяржавы, а з другога — багацця.

У канцы Сярэднявечча на Захадзе з'яўляюцца творы, аўтары якіх выступаюць за незалежнасць дзяржавы ад царквы. Дантэ Аліг'еры быў аўтарам не толькі "Боскае камедыі", але і трактата "Аб манархіі", дзе разглядае палітыку як самую вялікую з навукаў і мяркуе, што яна павінна грунтавацца на назіранні за фактамі. Ён патрабуе пазбавіць папу свецкай улады, каб паўната ўлады ва ўсёй Эўропе перайшла да імператара[3]. Гэтым жа "свецкім духам" у дачыненні да палітыкі прасякнуты й твор ангельскага францысканца "Лязо" Ўільяма Окама, напісаны паміж 1339 і 1341 гг.

У сферы палітыкі на ідэі эпохі Адраджэння галоўным чынам паўплывалі эпікурызм і стаіцызм. Арыстотэлева тэорыя дзяржавы як "прыроднай" з'явы ўсё часцей і часцей адхілялася, папулярнай рабілася Эпікурава тэорыя грамадскай дамовы. У прыватнасці, гэтую пазіцыю адстойваў флярэнтыец Нікола Мак'явэлі (1469—1527), аўтар славутай працы "Валадар" (1516). Зрэшты, такі падыход прывёў яго да ўхвалы моцнага рэжыму кіравання без аніякіх маральных

[1] *Cité par Max Weber dans son ouvrage L'éthique protestante et l'esprit du capitalisme, trad.franç., Paris, 1964, p.215.*

[2] *Менавіта гэты тэзіс абараняе R.H.Tawney у сваёй працы La religion et l'essor du capitalisme, trad.franç., Paris, 1951.*

[3] *Да Дантэ падобныя ідэі выказваліся Брунэта Латыні (1230-1291).*

забаронаў, бо згода паміж людзьмі не можа быць устойлівая, і яны няспынна імкнуцца парушыць яе.

Безумоўна, "свабодная форма кіравання" лепшая за падпарадкаванне ўладару-суверэну. Але свабода, якую мелі рымляне ў часы рэспублікі, патрабуе ад грамадзян дабрадзейнасці. Калі ж людзі разбэшчаныя (а паводле Мак'явэлі, яны часцей менавіта такія), тады немагчыма падтрымліваць ці ўсталяваць "рэспубліканскую" форму кіравання. Дарэчы, нават у "рэспубліцы" кіраўнікі не павінны быць далікатнымі ў выбары сродкаў падтрымання парадку.

На золку новага часу Мак'явэлі заставаўся перакананым прыхільнікам палітычнага рэалізму. Гэты рэалізм пакліканы галоўным чынам захапленнем ад магутнасці Рыма, прыхільнасцю да матэрыялістычнай філасофіі Эпікура і Лукрэцыя, а таксама падкрэслена варожым стаўленнем да хрысціянскай царквы. Мак'явэлі казаў, што антычныя рэлігіі намнога лепшыя, бо "шанавалі па-боску толькі тых людзей, якія дасягнулі славы, напрыклад славутых палкаводцаў і кіраўнікоў рэспублікі; наша ж рэлігія, наадварот, узводзіць у ранг святых выключна людзей пакорлівых ды яшчэ тых, хто прысвяціў сябе галоўным чынам сузіранню, а не актыўнаму жыццю"[1].

Новая палітычная філасофія была дыяметральна супрацьлеглая каталіцкай канцэпцыі дзяржавы, якую адстойвалі ў Сярэднявеччы, бо разглядала дзяржаву як аўтаномную сілу, а не як нейкую падпарадкаваную царкве рэальнасць.

Аднак адмаўленне падпарадкавання дзяржавы царкве таксама прысутнічае і ў вучэнні Лютэра, прычым лютэранскае хрысціянства спрыяла, і гэта даволі парадаксальна, развіццю новай філасофіі дзяржавы.

Лютэр не хацеў, каб царква займалася ўладкаваннем грамадскага жыцця, і ўхваляў ролю дзяржавы як сродку выкаранення людской злосці, а гэта, нягледзячы ні на што, своеасаблівае прызнанне каштоўнасці палітычных інстытуцый. Лютэр заклікаў уладароў-суверэнаў бязлітасна душыць

[1] *Discours sur Tite-Live, liv.II, chap.II, cité par P.Mesnard dans son ouvrage L'essor de la philosophie politique du XVIe siècle, Paris, 1936, p.74. Sur Machiavel, voir aussi P.Janet, Histoire de la philosophie morale et politique, Paris, 1858, liv.III, chap.Ier.*

сялянскія паўстанні, бо, хоць духоўнае жыццё — нутраны феномен, усё ж трэба, каб людзі ў сваім грамадскім жыцці *абавязкова* прытрымліваліся *вонкавых формаў* жыцця, адпаведнага хрысціянскаму ідэалу. Лютэранская канцэпцыя спрыяла развіццю дактрыны пра абсалютную ўладу манархаў.

Аднак тэарэтыкі абсалютызму сустракалі моцнае супрацьдзеянне. Яны больш не маглі, як у часы Арыстотэля, абапірацца на тэзіс пра натуральны характар грамадства. Антычны поліс, у які індывід інтэграваўся спантанна, застаўся фактам далёкага мінулага. Мы ўжо бачылі: за прынцып свайго вучэння Мак'явэлі бярэ Эпікураў тэзіс грамадскай дамовы, індывідуалісцкі па сваёй сутнасці. У XVI ст. такія мысляры, як Ля Баэсі ("Аб добраахвотным рабстве", 1552) і Тэадор дэ Бэз ("Аб праве кіраўнікоў на сваіх падданых", 1575), палымяна адстойваюць правы індывіда перад суверэнам.

Ад гэтага моманту абсалютысцкая канцэпцыя дзяржавы не дае рады перамагчы нават у галіне палітычнай філасофіі. Але адначасова з разгортваннем спрэчкі вакол паняцця палітычнай улады неўзабаве набыла вагу ўласна эканамічная дактрына. Размова ідзе пра меркантылісцкае вучэнне, якое грунтавалася на своеасаблівай канцэпцыі мэтаў грамадства.

А) Новая канцэпцыя мэтаў грамадскага жыцця

Мак'явэлі пісаў, што "пры добра арганізаваным ладзе кіравання дзяржава павінна быць багатая, а грамадзяне — бедныя"[1]. Гэты тэзіс быў адкінуты самім жыццём, бо ў эпоху Адраджэння назіралася паралельнае развіццё як багацця гандлёвай буржуазіі, так і магутнасці эўрапейскіх дзяржаваў. Насуперак поглядам Мак'явэлі меркантылісцкае вучэнне адстойвала тэзіс, згодна з якім дзяржава пры спрыянні ўзбагачэнню сваіх грамадзянаў сама мацнее.

Аўтары, якія абаранялі такі падыход, часта самі былі купцамі, банкірамі ці ўладальнікамі мануфактураў. На першы погляд іх найвялікшым клопатам была магутнасць дзяр-

[1] *Discours sur Tite-Live, in Machiavel, Le Prince et autres textes, Paris, Union générale d'Editions, 1962, p.151.*

жавы. Але бальшыня іх абараняла дзяржаву толькі з-за пераканання, што росквіт нацыянальнага гандлю шчыльна звязаны з пашырэннем палітычнай улады манарха, а таксама з поспехам яго вайсковай чыннасці на зямлі і асабліва на моры. Такім чынам адбываўся пераход ад канцэпцыі дзяржавы як найвышэйшай мэты чалавека да канцэпцыі багацця як найвялікшай каштоўнасці.

Меркантылісты ў прынцыпе не лічылі, што можна ўзбагаціць усю супольнасць індывідаў, якая складае нацыю. Яны найперш верылі ў магчымасць узбагачэння класа купцоў і прапанавалі малюнак грамадства, які паказваў бы, як гэтай мэты дасягнуць.

Дзякуючы такім падыходам упершыню з'явілася тэорыя грамадства, пабудаваная галоўным чынам на грунце эканомікі, бо пад мэтай грамадскага жыцця разумелася эканамічная мэта і, як мы гэта прасочым, сродкі дзеля яе дасягнення таксама прапаноўваліся чыста эканамічныя.

Каб стварыць уяўленне пра меркантылісцкую канцэпцыю грамадскага жыцця, можна ўзяць адзін з ранніх твораў ангельскага меркантылізму, напісаны Джонам Гэйлзам (XVI ст.), а яшчэ — твор французскага аўтара, які першы ўжыў назоў "Трактат пра палітычную эканомію", напісаны Антўанам дэ Манкрэцьенам (1615). Ідэі, з якімі мы сустрэнемся ў гэтых дзвюх працах, у тым ці іншым выглядзе можна знайсці ў шматлікіх іншых творах.

Сярод гішпанскіх меркантылістаў можна вылучыць Ортыса , які ў 1588 г. апублікаваў "Памятку каралю пра тое, як перашкодзіць вывазу золата".

З італьянскіх меркантылістаў сама вядомыя Батэра (1540—1617), які быў сакратаром прынца Карла Барамеяга, і Сэра , лекар з Калабрыі, які ў 1641 г. выдаў працу "Кароткі трактат пра фактары, якія забяспечваюць наяўнасць шчодрай колькасці золата і серабра ў краіне, дзе няма капальняў".

У Францыі Бартэлемі Лафма, які займаў высокія пасады пры каралі Анры (Генрыху) IV, выдае ў 1597 г. "Правілы стварэння мануфактураў у каралеўстве" і ў 1602 г. невялічкую працу пад назовам "Як трэба дазваляць свабоду пра-

возу золата і серабра праз межы каралеўства і з дапамогай такога сродку захаваць сваё золата і серабро і прыцягваць іншаземнае".

У Англельшчыне XVII ст. самы вядомы прадстаўнік меркантылісцкага вучэння — Томас Ман, аўтар "Разважанняў пра ангельскі гандаль у Ост-Індыі" (1621)[1].

1. ДЖОН ГЭЙЛЗ. Адзін з першых твораў, якія раскрываюць эканамічную філасофію меркантылізму, — гэта праца ангельскага шляхціча, сябра парламента Джона Гэйлза, названая "Разважанні аб усеагульным росквіце нашага каралеўства ангельскага"[2]. Твор напісаны, мусіць, у 1549 г.; напачатку ён распаўсюджваўся ў рукапісным выглядзе і быў надрукаваны толькі пасля смерці аўтара ў 1581 г.[3]

Гэйлз працаваў у тыя часы, калі "агароджванні" (Enclosures) і развіццё жывёлагадоўлі замест раслінаводства ў Англельшчыне прывялі да значнага зыходу насельнікаў з вёсак і росту галечы. Зразумела, аўтар не адмаўляе, што гэтыя драматычныя з'явы былі вынікам захопу земляў "нуварышамі" (галоўным чынам гандлярамі), якія хацелі выкарыстаць свае грошы з максімальным прыбыткам. Сам Гэйлз не быў купцом. Ён уваходзіў у "Камісію па агароджваннях", створаную ў 1548 г., і наяве бачыў памеры разбурэнняў, выкліканых пераўтварэннем сельскагаспадарчага ладу. Тым не менш Гэйлз не лічыў магчымым яго спыніць. Ён уважаў за неабходнае развіваць нацыянальную прамысловасць, бо гэта спрыяла б захаванню ці нават павелічэнню колькасці насельніцтва ў каралеўстве, нягледзячы на памяншэнне жыхароў у вёсках[4]. Гэйлз казаў: інтарэсы караля патрабуюць, каб насельніцтва было шматлікім дзеля таго, каб дзяржава

---

[1] *Творы асноўных ангельскіх аўтараў меркантылісцкай школы бліскуча прааналізаваны ў працы E.A.J.Johnson Predecessors of Adam Smith, the growth of British Economic Thought, New Jork, 1937, réimpression 1965. Можна знайсці шматлікія спасылкі на іншых прадстаўнікоў меркантылісцкай дактрыны ў Luigi Cossa, Histoire des Doctrines économique, trad. franç., Paris, 1899.*

[2] *A Discourse of the common weal of this realm of England, ангельскі тэкст і пераклад, дапасаваныя да твора A.C.Tersen, John Hales, sa doctrine et son temps, Avallon, 1907 (Дысертацыя, абароненая пры Дыжонскім факультэце права).*

[3] *Гл. Tersen, op. cit., Introduction.*

[4] *Такім чынам, Гэйлз лічыць, што колькасць насельніцтва залежыць ад колькасці вакантных рабочых месцаў (як мы сказалі б сёння). Іншае думкі італьянец Джанні Батэра, які сцвярджае, што колькасць жыхароў краіны залежыць ад сукупнасці сва-*

магла мець значныя вайсковыя рэзервы. З іншага боку, трэба, каб насельніцтва мела працу і захоўваўся сацыяльны спакой.

"Вы ведаеце, — пісаў ён, — ужо некалькіх жывёлаводаў досыць, каб заняць цэлае графства; у выніку вялікая колькасць падданых караля была б даведзеная да галечы, і больш не засталося б людзей, апрача нешматлікіх гаспадароў статкаў і пастухоў, а іх бракавала б для службы каралю ў выпадку патрэбы і для абароны каралеўства ад ворагаў"[1].

Гэйлз перадусім аддаваў перавагу інтарэсам дзяржавы. У ягоным творы таксама вельмі акрэслена выказваецца новая ідэя, паводле якой узбагачэнне ёсць сапраўдная мэта чалавечага жыцця.

Ён казаў, што жыхары адной краіны ўтвараюць "рэспубліку" (common weal), падмурак якой — эканамічны інтарэс. Пошук жа багацця кожным будзе спрыяльны для ўзбагачэння ўсіх астатніх:

"Кожны індывід — супольнік "рэспублікі", — пісаў Гэйлз, — і ўсялякае прыбытковае рамяство для аднаго можа быць такім жа і для іншага, які таксама захоча займацца ім; што ёсць прыбытковым для аднаго, у выніку будзе такім жа і для ягонага суседа, а значыць, і для ўсіх"[2].

Безумоўна, гэтая ідэя салідарнасці эканамічных інтарэсаў выказана даволі прымітыўна. Гэйлз не ідзе далей наступнага сцверджання: калі нейкі супольнік знаходзіць новы сродак узбагачэння, ён міжволі дазваляе ўзбагачацца ўсім іншым, бо яны могуць паўтарыць яго дзеянні. Але што найбольш важна, дык гэта само паняцце "рэспубліка", у якім сувязь паміж індывідамі мае не палітычнае, не рэлігійнае, а эканамічнае паходжанне[3].

Навіну гэтай канцэпцыі (безумоўна, не ў практычным значэнні, а ў якасці філасофскай канцэпцыі) можна зразумець і са сцверджання Гэйлза, што да пэўнай мяжы экана-

---

бодных сродкаў існавання. (Гл. Delle cause della grandezza e magnificenza delle citta (1558), твор, працытаваны Luigi Cossa, Histoire des Doctrines économiques, op. cit., pp.180-181). Думка Батэра, якую напрыканцы XVIII ст. распрацуе Мальтус, зойме важкае месца ў гісторыі эканамічнае думкі.

[1] *Op. cit., p.137.*

[2] *Op. cit., p.71.*

[3] *Хоць Гэйлз і прызнае эканамічную салідарнасць усіх супольнікаў нацыі, ён лічыць, што галоўным чынам купецкі клас мае магчымасць узбагачацца.*

мічная супольнасць вышэй за маральныя правілы, усталяваныя для індывідаў.

"Калі б мы адмовіліся ад золата і срэбра, што маем, з прычыны таго ліха, якое яны выклікаюць, не таму, што такая іх прырода, а таму, што мы дрэнна выкарыстоўваем іх, дык мы паслабілі б магутнасць сваёй дзяржавы і значна павялічылі б магутнасць іншых. Калі нават з гледзішча маральнага асобнаму чалавеку рэкамендуецца пазбягаць, наколькі магчыма, выкарыстання грошай, дык рэспубліка не мае неабходнасці ў тым, каб усе дзейнічалі аднолькава, і тым больш не абавязкова, каб заставаліся цнатлівымі ўсе, але гэта пажадана на індывідуальным роўні"[1].

"Доктар", які выказвае гэтыя думкі ў дыялозе Гэйлза (а гэта пастар англіканскае царквы), папярэджвае, што "нельга злоўжываць сваёй рэччу, каб не зашкодзіць супольнасці"[2], але праз колькі радкоў той жа самы "доктар" дэкляруе: чалавек "глядзіць у той бок, дзе бачыць найбольшы прыбытак для сябе", і законы супраць ператварэння ворнае зямлі ў выганы не будуць мець моцы да тае пары, пакуль гэтае ператварэнне не стане прыбытковым для ўласнікаў зямлі. Такім чынам, "доктар", а разам з ім і аўтар, дапускае, што пошук асабістай выгады мусіць быць прызнаны ў якасці самае асновы эканамічнай супольнасці, якую ўтвараюць супольнікі нацыі.

2. АНТЎАН ДЭ МАНКРЭЦЬЕН. Ён быў сынам аптэкара, сапраўднае яго прозвішча — Мокрэцьен[3]. Пазней прыняў тытул сеньёра дэ Вастві ля. Манкрэцьен нарадзіўся ў 1576 г. у горадзе Фалэз. Набыў вядомасць галоўным чынам як аўтар трагедыяў, што дазваляла яму наведваць арыстакратычныя салоны. Забіўшы свайго праціўніка пад час дуэлі ў 1605 г., Манкрэцьен мусіў ратавацца ў Ангельшчыне. Ён наведвае таксама Галяндыю. Па вяртанні ў Францыю ажаніўся з багатай удавой арыстакратычнага паходжання. Дзякуючы багаццю жонкі Манкрэцьен заснаваў інструментальную фабрыку. У 1616 г. ён даслаў міністру юстыцыі свой *"Трактат пра палітычную эканомію"*. Крыху пазней атрымаў баронскі тытул, але неўзабаве сапсаваў сабе рэпутацыю: яго лічылі падробшчыкам грошай. Тады Манкрэцьен далучыўся да гугенотаў, якія паўсталі супраць караля, але ніякіх дак-

[1] *Ibid., p.179.* [2] *Ibid., p.75.*

[3] *Mauchrestien у літаральным перакладзе — благі хрысціянін.*

ладных пацверджанняў таго, што ён перайшоў у пратэстанцкую веру, няма. Праз колькі месяцаў яго заспелі ў адным гатэлі, і ён быў забіты са зброяй у руках (1621).

Манкрэцьен падзяляў палітычныя ідэі Жана Бадэна, які, нягледзячы на сваё жаданне супрацьстаяць амаральнасці Мак'явэлі, лічыў, як і італьянец, што грамадскі парадак вымагае падпарадкоўвацца мацнейшым. Аўтар жа "Трактата пра палітычную эканомію", у прыватнасці, пераймае для сваёй кнігі ідэю, падрабязна распрацаваную ў "Рэспубліцы" Бадэна, згодна з якой вайна супраць вонкавага ворага карысная дзеля нутранога спакою.

Ён пісаў: "Зараз, калі Францыя ўсведаміла сваю памылку і, дзякуй Богу, больш не гартуе зброі ва ўласнай крыві... трэба падумаць пра тое, каб прапанаваць ёй якое-колечы добрае і пачэснае практыкаванне... бо пакінуць яе марнець у млявасці спачынку было б блага... трэба не даць згаснуць прыроднай высакароднасці вашых народаў, для якой цяжкасці — толькі прынада, а небяспекі — спакусы"[1].

Адрозна ад Жана Бадэна Манкрэцьен ведае яшчэ адзін спосаб, праз які можна трымаць падданых у падпарадкаванні: дазволіць ім жыць лепей.

"Безумоўна, гэта вялікае шчасце, калі ўсе падданыя маюць досыць сродкаў для задавальнення сваіх патрэбаў, ці, не маючы, маюць магчымасць набыць іх. Каб зацугляць шматгаловую ды шматрукую гідру (народ), лепшага й не трэба; калі ж гідра нічога не зарабляе, яна злуецца, нудзіцца, варушыцца і пры варушэннях часам выклікае землятрусы"[2].

Манкрэцьен услаўляе працу. Дзеля гэтага ён гатовы нават паспрабаваць (што ўжо занадта) абаперціся на аўтарытэт Арыстотэля.

"Сапраўды, — пісаў ён, — сузіральнае жыццё першаснае і сама набліжанае да Бога; але без учынкаў яно застаецца недасканалым і можа быць для рэспублік больш шкодным, чым карысным... Арыстотэль правільна сцвярджаў: той, хто аддзяляецца ад людзей, ёсць ці больш чым чалавек... ці менш чым чалавек... З гэтага вынікае, што галоўны прынцып, які павінны выконвацца ў дзяржаве, — не дапусціць гультайства часткі насельніцтва"[3].

---

[1] *Traité de l'économie politique, nouv.éd., Paris, 1889, pp.298-300. Можна параўнаць з Жанам Бадэнам, La République, édition de 1599, t.II, pp.760-763.*

[2] *Traité, op. cit., pp.99-100.*

[3] *Ibid., pp.21-22.*

"Чалавек, — пісаў далей Манкрэцьен, — народжаны дзеля таго, каб жыць у няспынным практыкаванні і працы"[1].

Навошта працаваць? Няйначай дзеля вытворчасці багацця́ў, мяркуе Манкрэцьен. Дзейнасць і стварэнне матэрыяльных каштоўнасцяў уяўляюцца яму адным і тым жа, бо ён адрозна ад старажытных філосафаў *супрацьпастаўляе* "дзейнасць" "сузіранню". Аўтар вельмі натуральна і выразна прыходзіць да недвухсэнсоўнае высновы:

"Шчасце людзей, калі пра гэта казаць з нашага гледзішча, галоўным чынам палягае ў багацці, а багацце — у працы"[2].

Ад гэтае высновы аўтар ідзе далей і далей у разбурэнні традыцыйных поглядаў.

Перадусім Манкрэцьен не забывае аддаць належнае сельскагаспадарчай працы, надзвычай захоплена ўслаўляе прамысловасць, "мануфактуры", што гучыць незвычайна для яго часу, а галоўнае, ён не баіцца найпачэснае месца ў грамадстве аддаць купцу. Ён даводзіў, што роля гандляра ў сацыяльным арганізме падобная да ролі мозгу ў целе чалавека[3]. Сцвярджаў, што гандаль — найвышэйшая форма дзейнасці, бо нават прамысловасць працуе дзеля яго.

"Як філосафы кажуць, што канчатак ёсць прычына прычынаў, так гандаль у пэўнай ступені паўстае галоўнаю мэтаю разнастайных рамёстваў, бальшыня іх служыць дзеля іншых рамёстваў, а гандаль паміж імі пасярэднік; з гэтага вынікае, што гандаль нешта больш высокае, чым самі гэтыя рамёствы, рамёствы існуюць дзеля гандлю, і гэтая мэта не толькі апошняя, але й найлепшая рыса рэчы"[4].

Калі дзейнасць гандляра сама высокая, дык вынікае, што вартая ўхвалы таксама і прага прыбытку.

"З гэтага можна зрабіць выснову, што купцы больш чым проста карысныя для дзяржавы і што іх клопат аб дасягненні прыбытку ў працы і ў рамястве забяспечвае значную частку грамадскага дабрабыту. З гэтае прычыны трэба дазволіць, каб гандляры мелі любоў да прыбытку і шукалі яго; і я спадзяюся, усе пагодзяцца з гэтым..."[5]

Аднак мы яшчэ недалёка адышлі ад часоў, калі кожны мусіў лічыць, што пошук прыбытку — ганебная рэч, і Манкрэцьен таксама імкнецца даць адказ на пярэчанні людзей, якія прытрымліваліся традыцыйных падыходаў:

---

[1] *Ibid., p.21.*

[2] *Ibid., p.99.* [3] *Ibid., p.32.* [4] *Ibid., p.137.* [5] *Ibid., pp.137-138.*

"Памыляюцца тыя, хто вымярае шчасце дзяржавы толькі з дапамогаю спрошчана зразуметай дабрадзейнасці і хто лічыць, што наша жыццё, занятае прагай нажывы, не ідзе на карысць дзяржаве. Мы жывём не ў часы, калі людзі харчаваліся жалудамі, што падалі з дубоў, калі плён зямлі ды крынічная вада здаваліся чалавеку прысмакамі... Менавіта таму ўсялякія там пекныя сузіранні філосафаў — усё гэта толькі мары, якія маюць сэнс для такой рэспублікі, дзе няма цікавасці ні да працы, ні да дзейнасці"[1].

Усё, што сцвярджалася вышэй, — ні больш ні менш як першая спроба замацаваць навачасны тэзіс пра першачарговую важкасць дзейнасці, скіраванай на вытворчасць і размеркаванне дабротаў. Манкрэцьен лагічна выводзіў з гэтага тэзіс, характэрны і для сучаснасці, згодна з якім дзяржава павінна перш за ўсё спрыяць развіццю вытворчасці і абмену. Ён сведама пераварочваў дагары нагамі Арыстотэлеў тэзіс пра незалежнасць і першасць уласна палітычнага жыцця над той часткаю жыцця, якая прысвячаецца вытворчасці і якую вывучае эканоміка, ці, іначай, навука аб сям'і. Аўтар настойваў на тэрміне "палітычная эканомія", які захаваўся і ў французскай мове, і за межамі Францыі як вызначэнне навукі пра вытворчасць і размеркаванне дабротаў.

Ён пісаў: "Можна насуперак думцы Арыстотэля і Ксэнафона з упэўненасцю сцвярджаць, што нельга адасобіць эканоміку ад палітыкі без адрыву асноўнае часткі ад адзінага цэлага і што навука аб назапашванні багацця, як яны яе называюць, аднолькавая як для дзяржаваў, так і для сямейных гаспадарак"[2].

Б) Умовы павелічэння багацця

На падставе думкі, што для чалавека багацце ёсць найвялікшая каштоўнасць, меркантылісты заняліся аналізам умоваў яго росту.

Яны жылі ў эпоху ўсталявання капіталістычнага ладу ў Заходняй Эўропе, які дазволіў некалькім краінам зрабіць рашучы крок наперад на шляху "эканамічнага развіцця".

Перад тым як разгледзець погляды меркантылістаў на праблему развіцця, варта нагадаць, што эканамічны аналіз і гістарычныя веды даюць нам сёння магчымасць даследваць

[1] *Ibid., p.138.*
[2] *Ibid., p.31.*

сапраўдную прыроду працэсаў, якія мелі вынікам узбагачэнне Заходняй Эўропы.

Пры капіталізме багацце расце на базе прыватнага прадпрымальніцтва ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці ці гандлі. Багатыя ўдасканальваюць карыстанне зямельнай уласнасцю з мэтаю палепшыць яе рэнтабельнасць, уладкоўваюць прамысловую гаспадарчую адзінку (на тыя часы — "мануфактуру") ці, нарэшце, займаюцца гандлёвай дзейнасцю, якая пры гандлі з далёкімі краінамі патрабуе значных капіталаў. Інвестыцыйныя аперацыі ажыццяўляюцца з мэтай атрымання як мага большага прыбытку.

У гандлі прыбытак залежыць ад розніцы паміж сумай, якую трэба плаціць за набыццё тавару, і коштам, па якім можна перапрадаць гэты тавар у іншым месцы. Прыбытковы гандаль палягае ў набыцці тавару ў рэгіёне, дзе ён вырабляецца без вялікіх выдаткаў і дзе дзякуючы гэтаму кошт на яго нізкі. Потым можна перапрадаць гэты тавар у рэгіёне, дзе кошт на яго высокі, бо вырабляць яго ў гэтых месцах цяжка ці наагул немагчыма.

У сельскай гаспадарцы і ў прамысловасці прыбытак капіталістычнага прадпрыемства залежыць ад здольнасці прадпрыемства прадаць сукупнасць прадуктаў, якія яно рэгулярна вырабляе. Для гэтага прадпрыемства мае патрэбу ў *рынках збыту*. Часткова яно знаходзіць іх паблізу, бо зніжэнне выдаткаў вытворчасці дзякуючы выкарыстанню новых тэхналогіяў дазваляе яму прадаваць сваю прадукцыю танней, чым традыцыйным сельскагаспадарчым вытворцам ці рамеснікам, і, такім чынам, выцясняць іх. Але рытм пашырэння "блізкага рынку" недастаткова хуткі, і капіталістычныя прадпрыемствы (асабліва прамысловыя прадпрыемствы ў Эўропе таго перыяду) знаходзяць рынкі збыту ў далёкіх краінах, дзе ёсць попыт на прадукцыю: яе выраб у тых краінах каштуе даражэй. Каб заваяваць рынкі, патрабуецца дзяржаўная падтрымка. Гэтая патрэба найбольш паспяхова рэалізуецца праз заваёву каланіяльных рынкаў.

Менавіта гандаль з аддаленымі краінамі запачаткоўвае рынкі збыту для капіталістычнае вытворчасці і забяспечвае яе развіццё. Але з развіццём капіталістычнай вытворчасці

памеры выплатаў, якія робіць прадпрыемства (заробкі, зямельная рэнта, прыбыткі), усё павялічваюцца, узрастае попыт на прадукцыю на блізкім (нацыянальным) рынку. Аднак у гэтым складаным працэсе гандаль з далёкімі краінамі першапачаткова адыграў сваю незамяняльную ролю. Цягам часу ўсё большая колькасць прадукцыі будзе паглынацца блізкім рынкам.

Такім, на нашу думку, быў працэс, які пачынаючы асабліва з XVI ст. прывёў колькі краінаў Заходняй Эўропы на шлях імклівага эканамічнага развіцця; ва ўсім астатнім свеце эканоміка заставалася ў стане заняпаду. Меркантылісты наяве назіралі разгортванне гэтага працэсу і здолелі даволі дакладна вызначыць пэўныя ланцужкі эканамічнага развою, аднак не змаглі падысці да яго аналізу ў комплексе. Таму не дзіўна, што іх аналізы часта былі дваістыя і супярэчлівыя, а практычныя высновы падаюцца часам спрэчнымі.

Паводле меркантылістаў, мэта грамадскага жыцця — багацце, але яны не меліся актыўна выступаць супраць ідэі першасці дзяржавы, а, наадварот, імкнуліся паказаць, што іхнае вучэнне суладна гарманує з канцэпцыяй, якая бачыла найвышэйшую мэту чалавечай дзейнасці ў магутнасці дзяржавы.

Багацце для меркантылістаў — гэта перадусім прыбытак купцоў і ўладальнікаў мануфактураў, які назапашваецца і стварае новыя прыбыткі. Памеры прыбыткаў залежаць ад развіцця экспарту і галінаў прамысловасці, накіраваных на экспарт.

Умоваю развіцця экспарту ёсць наяўнасць вялікай колькасці людзей на рынку працы і значнай колькасці грошай у абарачэнні, каб аблегчыць іх пазыку з мэтай фінансавання прамысловых і гандлёвых аперацыяў.

Менавіта наяўнасць вялікай колькасці людзей і грошай дакладна паўстае галоўнай мэтай дзяржавы, бо яе магутнасць залежыць ад здольнасці сабраць вялікае войска і назапасіць дастатковы на выпадак вайны скарб.

Багацце гандляроў дасягаецца з дапамогай тых жа сродкаў, якія забяспечваюць магутнасць дзяржавы. Хаця мэты гандляроў і дзяржавы не аднолькавыя, але яны ўзаемазвя-

заныя ў межах механізму грамадскага развіцця. Грамадства такое, якое яно ёсць, г. зн. цалкам зарыентаванае на дасягненне неабмежаванага росту багацця класа купцоў, не ўтрымлівае ў сабе фундаментальных супярэчнасцяў.

Гэтую першую тэорыю "эканамічных адпаведнасцяў" можна падсумаваць наступным чынам: развіццё прамысловасці і экспарту, што паўстае *мэтай* гандляроў (бо менавіта гэта прыносіць ім прыбытак), ёсць *сродак* для дзяржавы на шляху дасягнення сваёй уласнай мэты — росту насельніцтва і багацця; адпаведна рост насельніцтва і багацця, што паўстае *мэтай* дзяржавы, ёсць *сродак*, з дапамогаю якога забяспечваецца развіццё прамысловасці і гандлю, г. зн. сродак, які дазваляе купцам дасягнуць іх уласных мэтаў.

Гэткіх меркаванняў у дакладнай форме ні ў адным творы меркантылістаў няма, аднак, на нашую думку, яны добра перадаюць змест іхнага вучэння.

Спачатку разгледзім тыя палажэнні іхнага вучэння, якія датычаць наяўнасці шматлікага насельніцтва, што адначасова разумеецца як сродак і як мэта, а потым — тэзісы, звязаныя з праблемай наяўнасці вялікай колькасці грошай.

1. ПАПУЛЯЦЫЯНІЗМ МЕРКАНТЫЛІСТАЎ. Меркантылісты былі папуляцыяністамі, г. зн. выступалі за павелічэнне колькасці насельніцтва краіны. Яны лічылі, што рост насельніцтва забяспечыць пошук працоўнае сілы і паспрыяе развіццю прамысловасці і гандлю з замежжам, а значыць, і росту прыбыткаў. Адначасова росквіт гандлю і прамысловасці дазволіць даць працу большай колькасці людзей, іх лік узрасце і будзе на карысць дзяржаве.

Кіраўнікі новаўтвораных нацыянальных дзяржаваў неўзабаве пачалі клапаціцца пра павелічэнне колькасці індывідаў, занятых у сферы вытворчасці дабротаў. Дзеля гэтага выдаваліся каралеўскія рэгламентацыі, самыя вядомыя з іх — ангельскія рэгламентацыі.

Статут рамеснікаў (artificers) 1563 г., які дзейнічаў да 1813 г., змяшчаў абавязак працаваць, рэгламентаваў вучнёўства і ўмовы працы і зацвярджаў прынцып, адпаведна з якім заробкі павінны былі стасавацца з коштам жыцця.

Славуты закон аб бедняках (1601 г.) жорстка караў за бадзяжніцтва і патрабаваў ад царкоўных парафіяў дапамагаць беднякам.

З'яўленне законаў было абумоўлена працаю пяра аўтараў-меркантылістаў.

Галоўнае, трэба атрымаць хоць якімі сродкамі шмат таннай працы. Якім чынам? Прымусіць народ працаваць! Менавіта такія погляды выслаўляў Манкрэцьен[1]. Таксама лічылася пажаданым, каб насельнікаў было шмат дзеля таго, каб не раслі заробкі. Гэтую прычынна-выніковую сувязь усебакова абгрунтавалі Джошуа Чайльд[2] і Бэрнард дэ Мандэвіль[3].

Дарэчы, нізкія заробкі і беднасць рабочых не толькі сродак паніжэння выдаткаў вытворчасці і павелічэння прыбыткаў. Паводле меркантылістаў, гэта таксама сродак прымусіць народ працаваць больш. Сэр Ўільям Пэты прапанаваў падтрымліваць высокія кошты на хлеб нават у гады добрых ураджаяў, каб, маўляў, рабочыя не адчулі палёгкі ў забеспячэнні сябе харчам і не ўнікалі працы[4]. Меркантылісты часам выказваліся супраць адукацыі народа, бо ў гэтым бачылі рызыку сапсаваць паслухмяную працоўную сілу.

Таксама вельмі характэрнае стаўленне меркантылістаў да дзіцячае працы. Кальбэр заяўляў, што "гультайства з першых гадоў — крыніца шахрайства на ўсю рэшту жыцця", і прымушаў шасцігадовых дзетак працаваць на сваіх мануфактурах. Такія ж "вынаходкі" на скарыстанне дзіцячае працы ўхваляў у адным з твораў Бартэлемі Лафма[5].

І калі рост насельніцтва безумоўна спрыяе развіццю справаў, дык адначасова і развіццё справаў станоўча ўплывае на населенасць дзяржавы, а значыць, на яе росквіт і магутнасць.

Гэты тэзіс прысутнічаў у самым пачатку даследванняў Гэйлза. Пазней гэтая выснова рэдка дзе будзе выказвацца

[1] *Op. cit., p.104.*

[2] *Observations upon the United Provinces of Netherlands, 1672.*

[3] *Fable of the bees, 1705.*

[4] *Traité des taxes et contributions, 1662, trad. franç., in OEuvres économiques, Paris, 1905.*

[5] *Спасылкі пра стаўленне меркантылістаў да працы ўзятыя з твора Eli F.Heckscher, Mercantilism, Stockholm, 1931, trad. angl., London, 1935, 2e partie, chap.II, § IV.*

так выразна і шчыра, аднак гэта не азначае, што з ёю не пагаджаюцца іншыя аўтары: у бальшыні выпадкаў меркантылісты вітаюць павелічэнне колькасці насельніцтва, нягледзячы на вельмі гаротны стан вялікай яго часткі.

2. МАНЕТАРНЫЯ ІДЭІ МЕРКАНТЫЛІСТАЎ. Развіццё гандлю патрабавала павелічэння колькасці грошай у абарачэнні. Прынцып, які ўвесь час прызнаваўся аўтарамі-меркантылістамі.

Аднак недастаткова, каб грошай было шмат, трэба, каб грошы добра функцыянавалі, г. зн. каб іх пакупная здольнасць у абарачэнні не змянялася як даўжэй. Гэта азначала, што металічныя манеты павінны захоўваць нязменную вагу.

Пачынаючы з канца сярэдніх вякоў можна было назіраць шматлікія дыскусіі аб наступствах альтэрацыі — памяншэння колькасці металу ў грашовых знаках, якая адбывалася па распараджэнні дзяржаўнай улады. У шмат якіх ананімных творах XIV ст. фармулюецца закон, згодна з якім "дрэнныя грошы выцясняюць добрыя". Пра гэты ж закон вёў гаворку Нікаля Арэм (епіскап горада Ліз'ё, памёр у 1382 г.) у сваім творы "Трактат пра першую вынаходку грошай"[1]. У XVI ст. ангелец Томас Грэшэм (1519—1579)[2] таксама паўтарае гэты закон, які мы сёння ведаем пад назвай "закон Грэшэма".

Пасля адкрыцця Новага свету эўрапейцы сутыкнуліся з новым эканамічным феноменам — ростам коштаў. Многія тагачасныя спецыялісты звязвалі яго з трансфармацыямі грошай, што былі выкліканыя шматлікімі спробамі памяншэння ўтрымання металу ў манетах. Але ў 1568 г. славуты юрыст з Анжэ Жан Бадэн ушчэнт разбіў такую думку ў працы, названай "Адказы на парадоксы месье дэ Малетрўа наконт падаражання ўсіх рэчаў"[3]. Ён галоўным чынам звязвае рост коштаў з прытокам з Новага свету каштоўных металаў і спрабуе сфармуляваць закон, згодна з якім пакупная здольнасць залатых і сярэбраных грошай адваротна

[1] *Гл. на гэты конт A.Dubois, Précis de l'histoire des doctrines économiques, t.I, Paris, 1903, pp.93-94.*

[2] *Information touching the fall of exchange, 1558.*

[3] *Новае выданне, Paris, 1932.*

прапарцыйная колькасці золата і серабра, што ёсць у наяўнасці ў краіне.

Так пачалася доўгая спрэчка, якая ў XIX ст. спарадзіла так званую "колькасную тэорыю грошай", паводле якой вартасць грошай, з чаго б яны ні рабіліся, будзе адваротна прапарцыйная іх колькасці.

Сапраўды, Бадэн меў рацыю, калі тлумачыў рост коштаў у XVI ст. з прытокам у Эўропу каштоўных металаў; але памыляўся, калі не заўважаў, што менавы стасунак кошту металаў і іншых тавараў можа быць звязаны з выдаткамі на іх вытворчасць і што калі ў той ці іншы перыяд часу адбываецца павелічэнне колькасці каштоўных металаў, дык гэта абумоўлена зніжэннем іх сабекошту, выкліканым такімі падзеямі, як адкрыццё новых капальняў, лягчэйшых у эксплуатацыі. Гэтую прапорцыю паміж вартасцю каштоўных металаў і іх сабекоштам усталяваў толькі ў 1662 г. ангелец Уільям Пэты[1].

Тэзіс, выказаны Бадэнам, стане ў XVII ст. бадай што агульнапрызнаным[2], але гэта не перашкодзіць распаўсюджванню фундаментальнай для ўсіх меркантылістаў ідэі, згодна з якой багацце дзяржавы звязана з фактам валодання вялікай колькасцю грошай.

Напачатку знайшліся пэўныя аўтары (праўда, іх было небагата), якія лічылі рост коштаў за прыбытковую рэч.

Меркантыліст Джэрард Мэлін сцвярджаў, што варта было б дорага плаціць за прадукты першай неабходнасці, калі адначасова дорага прадаваць прадукты за мяжу, бо ў такім выпадку прыбыткі купцоў таксама павялічацца[3]. Яшчэ адзін аўтар XVII ст., Фортры, заяўляў: нішто не павінна быць таннае, апрача грошай. Чайльд у 1668 г. пісаў: "Калі прадукты харчавання каштуюць дорага, значыць, людзі багатыя, калі ж яны танныя, то і людзі бедныя". І нарэшце,

[1] *"Няхай нейкі індывід паехаў вандраваць па краіне, у якой ёсць срэбра, і няхай ён здабыў яго, ачысціў і прывёз гэтае срэбра ў месца, дзе іншы вырошчвае збожжа, няхай тое срэбра было абменена на грошы і г.д. Я маю на ўвазе, што срэбра першага павінна ацэньвацца як вартасць, роўная вартасці збожжа другога" (Traité des taxes et contributions, 1662, in Les oeuvres économique de Sir William Petty, Paris, 1905, t.I, pp.41-42).*

[2] *Гл. Eli F.Heckscher, Mercantilism, op. cit., IVe partie, chap.III.*

[3] *Lex Mercatoria, 1622.*

невядомы аўтар невялічкага твора "Ужыванне і злоўжыванне грашыма" імкнуўся паказаць, што высокія кошты — гэта выгадна, бо яны зніжаюць жыццёвы ровень рабочых і робяць іх больш спрытнымі"[1].

Але, з другога боку, каб зразумець, чаму, нягледзячы на прызнанне колькаснай тэорыі грошай, меркантылісты вітаюць факт дастатковай наяўнасці грошай, трэба ведаць, што яны праводзяць сувязь паміж дастаткам грошай і ўмовамі фінансавання гандлёвых аперацыяў. На іх думку, наяўнасць вялікай колькасці грошай у абарачэнні дазваляе значна лягчэй пазычаць, а значыць, і ажыццяўляць плённыя аперацыі.

Томас Калпэпэр-бацька выдаў у 1621 г. "Маніфест супраць ліхвярства"[2], які на працягу XVII ст. быў некалькі разоў перавыдадзены. У сваім творы аўтар сцвярджаў, што калі пазыка даецца пад 10%, дык варта адмовіцца ад дзейнасці, якая прыносіць менеў 10% прыбытку. Больш таго, высокая норма працэнта не спрыяе прагрэсу сельскай гаспадаркі, замінае працы па ахове лясоў, тармозіць заморскія адкрыцці і стварэнне плантацыяў. І наадварот, зніжэнне нормы працэнта павялічвае вартасць зямлі[3]. Такім чынам, аўтар выказваецца на карысць зніжэння ўзаконенай нормы працэнта.

Сапраўды, такое зніжэнне адбылося. Прыкладна каля 1650 г. устаноўленая законам норма працэнта ў Ангельшчыне знізілася да 6%.

Сэр Джошуа Чайльд ухваляе гэта ў сваёй кнізе, выдадзенай у 1668 г., і сцвярджае, што гэтая падзея ёсць адзін з фактараў росквіту Ангельшчыны. Ён запэўніваў: такое стала магчымым дзякуючы вялікай колькасці грошай у абарачэнні — прырода, маўляў, падрыхтавала глебу для ўмяшання заканадаўцы. У адказ сваім апанентам ён паўтарае гэтыя тэзісы ў 1690 г. у "Разважаннях пра гандаль".

---

[1] *Спасылкі, прыведзеныя ў гэтым абзацы, узятыя з кн.Heckscher, op. cit., 4e partie, chap.III, § III.*

[2] *Tract upon Usurie.*

[3] *Ужо тады было заўважана, што вартасць зямлі вызначаецца праз "капіталізацыю" даходу, г. зн. праз вылічэнне сумы, пазычанай пад наяўны працэнт, можна атрымліваць аналагічны даход (ён атрымліваецца праз дзяленне даходу на норму працэнта).*

У тым жа годзе друкуецца пасмяротны твор сэра Ўільяма Пэты "Палітычная арытметыка". У сваіх разважаннях ён ідзе далей, чым Чайльд, і сцвярджае, што зніжэнне нормы працэнта вынікае выключна ад павелічэння колькасці грошай, пазітыўныя ж законы — гэта нішто ў параўнанні з законамі прыроды[1].

У выніку вялікая колькасць грошай усебакова спрыяе развіццю гандлю з далёкімі краінамі і рэалізацыі прыватных прыбыткаў. Але для дзяржавы наяўнасць вялікай колькасці грошай — гэта абсалютная мэта, бо яна надае дзяржаве моцы. Дзяржава дасягае яе менавіта шляхам павелічэння экспарту, ад якога ўзбагачаюцца купцы. Такім чынам, на думку меркантылістаў, у гэтай галіне гармонія інтарэсаў купцоў і дзяржавы цалкам гарантаваная.

Магутнасць дзяржавы залежыць ад яе здольнасці ствараць свае грашовыя запасы, каб, галоўнае, праводзіць уласную знешнюю палітыку. А гэтая здольнасць залежыць ад наяўнасці грошай у краіне. Ужо Гэйлз зацвердзіў гэты тэзіс.

Ён пісаў: "Калі ў часы вайны Ваша Вялікасць мела б патрэбу ў скарбе, каб аплочваць рыштунак, зброю, карабельныя прылады і ліны, гарматы і артылерыю — усё, што патрэбна пад час ваенных дзеяў, дык яна ніяк не дасць рады спагнаць са сваіх падданых сродкі, каб набыць усё гэта. У якім становішчы тады апынулася б каралеўства? Зразумела, у небяспечным. Менавіта таму мудрыя людзі называюць грошы і скарб nervi bellorum, гэта значыць нервам вайны"[2].

Пасля сцверджання ліберальнай дактрыны часта пісалася, што жаданне меркантылістаў прыцягваць каштоўныя металы грунтавалася на памылковай канцэпцыі паходжання нацыянальнага багацця і даходаў дзяржавы. Гэта слушна толькі часткова, бо ў XVI ст., дзеля таго каб забяспечыць вялізныя выдаткі ў выпадку вайны, дзяржава павінна была разлічваць галоўным чынам на тыя запасы каштоўных мета-

---

[1] *Звесткі, якія характарызуюць погляды ангельскіх меркантылістаў наконт нормы працэнта, узятыя з кнігі G.S.L.Tucker, Progress and Profits in British Economic thought, Cambridge, 1960, chap.II. Гл. таксама тэксты Мэліна і Місэльдэна ў кн.Heckscher, якія таксама прывёў Кейнс у сваёй "Агульнай тэорыі занятасці", trad. franç., Paris, 1939, p.355.*

[2] *Op. cit., p.131.*

лаў, якія знаходзіліся ў яе распараджэнні[1]. Такім чынам, меркантылісты не памыляліся, калі настойвалі на неабходнасці прыцягвання каштоўных металаў як сродку павелічэння магутнасці дзяржавы.

За што варта папракнуць некаторых меркантылістаў, дык за тое, што яны не бачылі розніцы паміж грашыма, ці каштоўнымі металамі, і самім багаццем, забываючы легенду пра цара Мідаса, які ледзьве не памёр з голаду, бо меў здольнасць ператвараць у золата ўсё, да чаго дакранаўся.

Гэтая блытаніна ёсць у Гэйлза, але далей бальшыня меркантылістаў будзе старанна пазбягаць такое памылкі. Напрыклад, Манкрэцьен пісаў: "Зусім не вялікая колькасць золата і срэбра, дыямантаў і перлаў забяспечвае багацце і магутнасць дзяржавы, а ўсе рэчы, неабходныя для жыцця, а таксама прыдатныя да вопраткі"[2].

Галоўны клопат аўтара першага "Трактата пра палітычную эканомію" ўсё яшчэ вынаходка "сродкаў, якія прыцягнулі б каштоўныя металы ў краіну". Ён піша: "Сёння можна сказаць, што мы жывем не з гандлю, а з золата і серабра. Гэта два вялікія і верныя сябры, якія задавальняюць патрэбы кожнага"[3].

І крыху далей Манкрэцьен робіць выснову: "Трэба мець грошы: калі нашых няма, трэба мець замежныя грошы"[4].

А каб мець грошы, трэба развіваць экспарт; Гэйлз даводзіць гэта вельмі выразна:

"Паколькі цяпер мы займаемся рамеснікамі, зраблю іх класіфікацыю. Ёсць сярод іх такія, з-за якіх атрымоўваецца, што грошы пакідаюць краіну[5], іншыя растрачваюць у сваёй старонцы ўсё, што зарабляюць, трэцяя ж катэгорыя складаецца з тых, хто прывозіць грошы ў каралеўства... Мы павінны аддаваць перавагу трэцяму класу, які складаецца з ткачоў, гарбароў, трыкатажнікаў, пральшчыкаў воўны — адзіных, каго я ведаю, хто сваім рамяством і сваёй працай забяспечваюць нас грашыма... Буйныя і дробныя гарады павінны напоўніцца рамеснікамі ўсіх

[1] *Яшчэ ў сярэдзіне XVIII ст. такое думкі прытрымліваўся Кенэ (гл.OEuvres de Quesnay, édition Oncken, Paris, 1888, p.247). Неабходнасць трымаць у распараджэнні дзяржавы запас плацежных сродкаў дзеля дачыненняў з замежжам (у золаце ці валюце) застаецца і да нашых дзён на першым плане клопатаў урадаў усіх краінаў.*

[2] *Traité, p.241.*

[3] *Ibid., p.141.*

[4] *Ibid., p.246.*

[5] *Гэта тыя, хто набывае тавары за мяжой, каб перапрадаць іх на бацькаўшчыне.*

прафесіяў... так, каб іх вытворчасць забяспечвала патрэбы каралеўства і за мяжу не вывозіліся значныя сумы грошай, што мае месца сёння; а яшчэ мы павінны мець неабходны рэзерв для продажу за мяжу і такім чынам забяспечваць магчымасць набыць іншыя тавары і скарб"[1].

У XVI ст. манархі імкнуліся захаваць і павялічыць запасы каштоўных металаў з дапамогаю такіх захадаў, як забарона вывазу золата і срэбра, "нацэньванне грошай" (палягала ў наданні замежным манетам у сваёй краіне большай пакупной здольнасці, чым сапраўды каштаваў метал, з якога былі зробленыя тыя грошы), загад вытворцам плаціць за тавары, якія набываліся за мяжой, сваімі таварамі, а таксама абавязак вяртаць у краіну замежныя грошы, атрыманыя ў выніку продажу ўласнай прадукцыі за мяжою. Гэйлз адным з першых зразумеў, што гэткія захады не могуць быць эфектыўныя і што каштоўныя металы абавязкова будуць пакідаць межы каралеўства, калі яго падданыя будуць набываць за мяжою больш, чым прадаваць туды. Пазней аўтары-меркантылісты дакладна прааналізуюць механізм, калі дэфіцыт гандлёвага балансу з замежжам непазбежна паніжае курс вэксаляў, складзеных у нацыянальнай валюце, і вываз каштоўных металаў[2].

Але дзеля развіцця экспарту краіне трэба знайсці рынкі збыту, і вельмі лагічна, што меркантылісты выказваюцца на карысць каланіяльных заваёваў. У прыватнасці, гэта робіць Манкрэцьен. Вядома, ён не абмінае выпадку, каб падкрэсліць, што мэта каланізацыі — гэта "данесці імя Бога, Творцы нашага, да шматлікіх барбарскіх народаў, пазбаўленых усялякай цывілізаванасці, якія заклікаюць нас, цягнуць да нас свае рукі, гатовыя скарыцца нам, каб з дапамогаю святых вучэнняў і добрым прыкладам мы наставілі іх на шлях выратавання"[3]. Аднак ён не забывае, што калоніі ёсць крыніцаю развіцця гандлю, а значыць, багацця дзяржавы і яе грамадзянаў:

"Як Бог сам абяцае тым, хто шукае яго царства, абсыпаць іх усімі дабротамі, так і тут можна не сумнявацца ні хвілі, што звыш Боскага бласлаўлення, якое будзе паслана той вялікай і магутнай дзяржаве для

[1] *Op. cit., pp.139 et 141.*

[2] *Гл., у прыватнасці, працу Томаса Мана: Thomas Mun, England Treasure by Foreign Trade (1664).*

[3] *Traité, p.320.*

такіх пабожных, такіх справядлівых і такіх міласэрных прадпрыемстваў... адчыняцца яшчэ як на гэтым, так і на тым свеце вялікія і невычэрпныя крыніцы багацця"[1].

Такім чынам, кола меркантылісцкага падыходу замкнулася вакол тэорыі грошай. Аўтары высноўваюць са сваёй канцэпцыі цэлы шэраг рэкамендацыяў для манархаў, якія зрабілі б эканамічную палітыку паслядоўнай і якія, дарэчы, у значнай ступені адпавядаюць тагачаснай рэчаіснасці.

А перадусім раіцца праводзіць палітыку, скіраваную на забеспячэнне лішку ў гандлёвым балансе краіны.

"Я лічу, — пісаў Гэйлз, — што больш чым 100 тысяч фунтаў штогод пакідаюць нашы скарбонкі і марнуюцца на набыццё рэчаў, якія не маюць ніякай нутраной вартасці, а іхныя вытворцы за наш кошт забяспечваюць сябе працай. Наколькі бязглузда з нашага боку трываць такі стан рэчаў, дазваляць сябе абдзіраць, марнаваць свае даброты і грошы і, галоўнае, дазваляць вывозіць з нашай краіны сыравіну і ствараць рабочыя месцы для іншаземцаў, якія яе апрацоўваюць, каб пасля перакупаць тую ж самую, але ўжо апрацаваную сыравіну"[2].

У Францыі Жан Бадэн у сваёй "Рэспубліцы" стаіць за прыняцце захадаў, якія ўяўляюць класічны арсенал часоў трыумфу меркантылісцкіх ідэяў: забарона вывазу сыравіны, патрэбнай для нацыянальнай прамысловасці, абмежаванне імпарту тавараў, выпрацаваных за мяжой, з выняткам пэўных катэгорыяў, патрэбных для нацыянальнай прамысловасці[3].

Манкрэцьен асабліва настойвае на неабходнасці перадаць гандлёвую дзейнасць у рукі мясцовых купцоў і не дазваляць іншаземным купцам вывозіць з каралеўства золата і серабро[4]. Ён таксама выказваецца на карысць розных крокаў, што спрыялі б развіццю прамысловасці.

Манкрэцьен прыхільна ставіцца да рэгламентацыяў, якія

---

[1] *Ibid., p.322.*

[2] *Ibid., p.95.*

[3] *Праўда і тое, што гэты самы аўтар услаўляе выгады гандлю паміж народамі. Але найперш такі "лібералізм" накіраваны супраць распаўсюджанай у Сярэднявеччы практыкі, згодна з якой забаранялася экспартаваць тавары за межы якога-кольвечы горада ці рэгіёна з боязі крызісу забеспячэння тавармі першай неабходнасці (гл. на гэты конт Heckscher, Mercantilism, op. cit., I[re] Partie, chap.IV).*

[4] *З гэтае прычыны англійскія меркантылісты адстойваюць палажэнне, згодна з якім англійскія ці прызначаныя для Англійшчыны тавары маглі перавозіць толькі англійскія караблі. Жыццёва важныя ваенныя інтарэсы таксама абумоўліваюць гэтую манаполію, устаноўленую ў Англійшчыне Навігацыйнымі актамі 1651 і 1660 гг.*

гарантуюць прафесійную прыдатнасць рамеснікаў: "Я не магу не здзіўляцца памылцы, па якой у гэтым каралеўстве выдаюцца падробныя лісты, што дазваляюць за пэўную суму грошай займацца якім захочаш рамяством... не зрабіўшы пры гэтым шэдэўра[1] ці нават часта не прайшоўшы праз вучнёўства"[2].

З другога боку, Манкрэцьен патрабуе стварэння дзяржаўных мануфактураў. Ён пісаў:

"Іх Вялікасці могуць сваёй ласкай дазволіць стварэнне ў розных правінцыях Францыі шматлікіх рамесных аб'яднанняў, якія, агульна кажучы, ёсць самыя неабходныя. Рабіць гэта трэба, надаючы права кантролю і кіравання гэтымі аб'яднаннямі, а гэтаксама карысныя і ганаровыя прывілеі людзям здольным і поўным розуму і майстэрства, кожнаму ў яго галіне. Няхай яны размяркуюць на аснове здаровага сэнсу абавязкі і працу паміж рамеснікамі адпаведна са схільнасцямі і прыроднымі ці здабытымі здольнасцямі апошніх"[3].

Аўтар удакладняе, што "праца дзяржаўных прадпрыемстваў ні ў якім разе не будзе шкодзіць прыватным прадпрымальнікам, дзяржаўныя будуць стварацца толькі ў тых галінах, дзе прыватнікі не працуюць, і яны будуць вырабляць тавары, якія цяпер прывозяцца з-за мяжы з вялікай шкодай для краіны"[4].

§ 4. Камунізм Мора і Кампанэлы

Меркантылісты часта ставілі сабе на мэце падкрэсліць еднасць інтарэсаў, што вынікаюць з гандлю: салідарнасць індывідаў паміж сабой, салідарнасць індывідаў і дзяржавы. Але ад пачатку эпохі Адраджэння развіццё гандлю насамрэч прывяло да глыбокіх супярэчнасцяў паміж індывідамі і паміж дзяржавамі.

У новым, капіталістычным, грамадстве выгаду ад эканамічнага развіцця мела вузкае кола асобаў, тым часам як становішча ніжэйшых слаёў грамадства пагаршалася.

Адначасова паўстае антаганізм паміж найбуйнейшымі гандлёвымі манархіямі, якія каланізуюць частку свету і ім-

[1] *У Сярэднія вякі — узорны выраб, які мусіў прадставіць рамеснік, каб атрымаць званне майстра. — Заўвага перакладніка.*
[2] *Traité, p.109.*
[3] *Ibid., p.38.*
[4] *Ibid., pp.107-108.*

кнуцца захаваць манаполію на гандаль з захопленымі тэрыторыямі.

Пад уплывам "Рэспублікі" Плятона, тэкст якое зноў стаў даступны, самыя лепшыя розумы засяроджвалі ўвагу на ідэі вяртання да залатога веку, ці да стану чыстай прыроды, дзе магла б ажыццявіцца поўная інтэграцыя індывідаў у грамадства, бо там — і гэта галоўнае, не было б вядома, што такое ўласнасць[1].

У сваім зборніку "Славутых выказванняў" Эразм Ратэрдамскі каментуе прымаўку, якую прыводзіць Плятон: "У сяброў усё супольнае", і здзіўляецца, чаму хрысціяне з такім недаверам ставяцца да абагульнення маёмасці, бо, як кажа ён, "ніякі іншы паганскі філосаф нідзе не наблізіўся бліжэй да думкі Хрыста"[2]. Яшчэ адзін вялікі гуманіст, Джардана Бруна, спалены ў 1600 г. як ерэтык, гэтаксама выказваўся ў падтрымку камунізму.

Двума вялікімі паслядоўнікамі Плятона на пачатку Новага часу былі Томас Мор і Тамаза Кампанэла. Аднак, запазычыўшы ў Плятона цэнтральную ідэю сваіх грамадска-палітычных поглядаў, яны натхняюцца не толькі Плятонавай філасофіяй.

1. КАМУНІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА ТОМАСА МОРА. Сын лонданскага суддзі Томас Мор нарадзіўся ў Лондане ў 1478 г. Ён вывучаў грэцкую мову ў Оксфардзе, а потым права ў Лондане. Мор быў глыбока веруючым хрысціянінам, надта пабожным чалавекам. Ён ледзьве не стаў пастарам, але не зрабіў гэтага, бо баяўся парушыць прынцып цэлібату; нарэшце ён ажаніўся, і за два шлюбы меў шмат дзяцей. Мор быў лепшы лонданскі адвакат; пасля ён становіцца членам парламента, а потым — віцэ-шэрыфам сталіцы. На гора, у 1518 г. трапляе ў поле зроку караля, які ўвёў Мора ў сваю вузкую раду. У 1529 г. Мор пагаджаецца заняць самую высокую дзяржаўную пасаду — ён становіцца канцлерам

[1] *У сваёй кнізе пра Мора Рэймон Эркур адзначае, што Платын спрабаваў стварыць у Кампані горад паводле ўзору "Рэспублікі" Плятона. Ён таксама кажа, што ў 1507 г. быў знойдзены дзённік падарожжаў Амэрыга Вэспучы, у якім даецца апісанне грамадства без уласнасці (гл. L'utopie de Thomas More, Poitiers, 1911).*

[2] *Cité par Emile Dermenghem, in Thomas Morus et les utopistes de la Renaissance, Paris, 1927, p.149.*

ангельскага каралеўства. Між тым пачалося супрацьстаянне паміж каралём Генры VIII і папам, які адмовіўся скасаваць шлюб караля, каб той меў магчымасць ажаніцца са сваёй фаварыткай Ганнай Балейн. Тады кароль зрабіў рашучы крок і абвясціў сябе найвышэйшым кіраўніком ангельскае царквы. Мор яшчэ й раней сувора асуджаў рэфарматарскую дзейнасць Лютэра; ён ні кроплі не вагаўся, нават калі справа датычыла ягонага ўласнага суверэна, і ў 1532 г. Мор адмовіўся ад пасады канцлера. Праз два гады парламент фармальна замацаваў скасаванне ўлады папы і абвясціў усіх, хто адмаўляўся прызнаць гэты акт, вінаватымі ў дзяржаўнай здрадзе. Ад Мора патрабавалі даць клятву вернасці, але былы канцлер адмаўляўся з цвёрдасцю, вартай захаплення. Ён быў кінуты ў астрог, асуджаны і, нарэшце, 6 ліпеня 1535 г. яму адсеклі галаву. Каталіцкая царква абвясціла яго "Блажэнным", а потым, зусім нядаўна, ён быў кананізаваны; такім чынам, цяпер, як ні дзіўна, у пантэоне святых поруч з апалагетам прыватнай уласнасці Святым Тамашом Аквінскім апалагет камунізму Святы Томас Мор. Апрача рэлігійных твораў, паэмаў і хронікаў Томас Мор напісаў невялічкую кніжку, у якой адстойваў камуністычны лад і якая мела значны рэзананс — усе сацыяльныя рэфарматары наступных стагоддзяў будуць вывучаць яе. Поўная назва гэтае кнігі, выдадзенай на лацінскай мове ў 1516 г. у горадзе Лувэне, гучыць наступным чынам: "Libellus vere aureus nec minus salutaris quam festivus de optimo reipublicae statu, deque nova insula Utopia" ("Залатая кніга гэтак жа карысная, як і забаўляльная, пра найлепшае дзяржаўнае ўладкаванне і пра новую выспу Утопія"). Коратка мы будзем называць яе "Утопія".

Твор падзяляецца на дзве розныя часткі: крытычную і канструктыўную.

У першай кнізе аўтар бязлітасна крытыкуе палітычны і сацыяльны лад свайго часу; ці, хутчэй, за яго гэта робяць розныя персанажы, бо Мор пазбягае мудрагелістых схаластычных канструкцыяў, а пераймае Плятонаў мэтад дыялогу.

Адзін хваліць суворасць ангельскага заканадаўства ў дачыненні да злодзеяў, а другі адказвае, што значна лепей

было б знішчыць прычыны бадзяжніцтва, якія паходзяць з эканамічнага ладу. Сапраўды, чаму гэтулькі бадзягаў няздольныя зарабіць сабе на жыццё? Перш за ўсё таму, што шляхта "не толькі праводзіць сваё жыццё ў бяздзеянні..., але і цягае за сабою натоўпы абібокаў", якім пасля смерці гаспадара застанецца адна крыніца існавання — ліхадзейства. І потым, таму, што зямельныя ўласнікі пачулі пах нажывы ("мала ім іх млявага заможнага жыцця, у якім яны нічога не робяць на карысць грамады") і спяшаюцца ператварыць свае палеткі ў папасы і прагнаць сялянаў, што сталі непатрэбныя. Прычына галечы і бадзяжніцтва ў авечках: "... вашыя авечкі, заўсёды такія рахманыя, такія неперабарлівыя ў ежы, зрабіліся, як мне паведамляюць, такімі прагнымі і неспатольнымі, што яны нават пажыраюць людзей". Да гэтага, нарэшце, трэба дадаць, і Мор не баіцца пра тое казаць, празмернае распаўсюджванне манахаў-вандроўнікаў.

Эканамічнае становішча робіцца яшчэ больш цяжкае, бо з прычыны махінацыяў абмежаванага кола ўладальнікаў тавараў штучна падтрымліваюцца высокія кошты. Што да продажу воўны, дык мае месца яшчэ не манаполія, але ўжо "алігаполія" (галіна знаходзіцца пад кантролем невялічкай групы людзей), якая і спараджае дарагоўлю. Замест таго каб вешаць жабракоў, трэба знішчыць галечу.

У наступным дыялозе з'яўляецца новы персанаж, які дадае фарбаў малюнку. Гэтым разам гутарка ідзе пра кіраўніцтва: уздымаецца пытанне, ці можна разлічваць на мудрасць каралёў, адукаваных філосафамі, у справе паляпшэння грамадства. Як вядома, менавіта на гэта спадзяваўся Платон. З самага пачатку меркаванні падзяліліся, але ўрэшце перамагае пазіцыя скептыкаў.

Справа ў тым, што адлегласць паміж імператывамі, якіх звычайна прытрымліваюцца суверэны, і сапраўднымі прынцыпамі добрага кіравання занадта вялікая. Аўтар "Утопіі" адзначае несупадзенні першых з другімі і выносіць абвінаваўчы прысуд палітыцы, якую на той час адстойваў Мак'явэлі. Найперш ён узняў голас супраць утрымання войска як сродку знізіць беспрацоўе і сцвярджаў, што "трэба думаць пра мір

болей, чым пра вайну". На гэты раз Мор паўстаў супраць ваенных звязаў і заваёваў, супраць змены ўтрымання металу ў грашах і, нарэшце, супраць прынцыпаў абсалютызму.

Ён імкнуўся зняпраўдзіць тэзіс, адпаведна з якім беднасць падданых — гэта гарантыя для манархаў. "Памыляюцца тыя, — пісаў Мор, — хто лічыць, што галеча народа — гарантыя спакою, бо дзе больш за ўсё сутычак, калі не ў асяроддзі жабракоў?"

Тады чаму ж мусіць існаваць гэткая адлегласць паміж ідэальнай і рэальнай палітыкай? Хітладэй, партугальскі мараплаўца, зараз нам гэта пакажа. Яго прамова, якою заканчваецца першая кніга "Утопіі", ёсць, магчыма, ці не самая важная частка твора.

"Мой дарагі Мор, — звяртаецца ён, — калі сказаць табе ўсю праўду, дык у тых краінах, дзе ўсё вымяраецца грашыма, бадай што немагчыма дасягнуць панавання справядлівасці і росквіту ў Паспольнай рэчы... Гэты вельмі мудры чалавек[1] казаў, што ў грамадстве існуе толькі адзін шлях да выратавання, а менавіта роўнасць, якой, мусіць, немагчыма дасягнуць, калі існуе прыватная ўласнасць... Такім чынам, я ўпэўнены, што даброты не могуць быць размеркаваныя справядліва і разумна і што людскімі справамі нельга кіраваць удала, калі цалкам не выкараніць ўласнасць".

Пасля гэтага пачынаецца другая кніга ці канструктыўная частка твора, — аповед мараплаўцы пра наведванне шчаслівай выспы Утопія, якое, пра што сведчыць сам назоў (u — topos = без месца), не існуе.

На выспе налічваецца 54 гарады, жыхары валодаюць тэрыторыяй, дастатковай, каб пракарміць сябе; па чарзе яны перабіраюцца на вёску, каб апрацоўваць землю, больш таго, у часе жніва на вёску накіроўваюць столькі працаўнікоў, колькі трэба.

У горадзе, як і ў вёсцы, усё супольнае; кожныя 10 гадоў жыхары праз поберць (жэрабя) мяняюць месца жыхарства; зрэшты, дзверы іх дамоў не маюць замкоў.

Кожны мужчына і кожная жанчына павінны навучыцца працаваць на зямлі і, апрача гэтага, на свой выбар нейкаму гарадскому рамяству. Гультайства забараняецца, агульны дабрабыт забяспечваецца 6-гадзінным рабочым днём; гэта

[1] *Маецца на ўвазе Плятон.*

атрымоўваецца натуральна, бо выключаецца магчымасць развіцця схільнасці да раскошы.

Фіксуецца час працы, сну і харчавання; кожны можа сталавацца дома, але ўсе аддаюць перавагу супольнаму харчаванню, бо там гатуюць смачныя стравы, грае музыка, пануе духмяны водар. У вольную часіну кожны займаецца чым хоча; бальшыня ж выкарыстоўвае вольны час для навучання.

Палітычны лад гарадоў Утопіі заснаваны на сям'і, якая заўсёды налічвае больш як 40 чалавек. Кожная група з 30 сем'яў абірае адказных асобаў, пэўная катэгорыя якіх абірае манарха з вылучаных народам чатырох кандыдатураў.

Самая вялікая задача ўрада — кіраванне вытворчасцю і размеркаванне дабротаў. Прадукты харчавання размяркоўваюцца па грамадскіх свірнах у належных прапорцыях, потым "галава кожнай сям'і прыходзіць і бярэ тое, у чым мае патрэбу, і нічога за гэта не плоціць. Навошта некаму ў нечым адмаўляць, калі нічога не бракуе і ніхто не баіцца, што сусед можа запатрабаваць больш, чым яму трэба? Навошта патрабаваць зашмат, калі добра вядома, што адмовы не будзе ні ў чым? Менавіта боязь таго, што нечага будзе неставаць, робіць людзей прагнымі і сквапнымі..."

Пасля разгляду асобных праблемаў рабства (трактуецца як сістэма прымусовай працы для злачынцаў), вайны, рэлігіі (усім ім прысвячаецца некалькі раздзелаў) аўтар падагульняе перавагі прыдуманага ім грамадства параўнальна з рэчаісным.

"Усюды, — пісаў ён, — тыя, хто кажа пра агульны інтарэс, мараць толькі пра свой асабісты інтарэс; тым часам як тут, дзе нічога нікому не належыць на правах уласнасці, усе сур'ёзным чынам клапоцяцца пра агульную справу, бо асабісты дабрабыт сапраўды супадае з агульным дабрабытам...

На выспе Утопія..., дзе ўсё супольнае, нікому нічога не бракуе, калі грамадскія свірны поўныя, бо багацце дзяржавы ніколі ў гэтай краіне несправядліва не размяркоўвалася; тут не ўбачыш ні беднякоў, ні жабракоў, і хоць ніхто нічым не валодае, аднак усе багатыя...

Ці не ёсць несправядлівым і няўдзячным грамадства, якое шчодра дае столькі багацця ў "людзям высакароднага паходжання", розным ювелірам, абібокам ці тым рамеснікам, што задавальняюць выдвары раскошы, што добра навучаныя распусце ды юру? Хоць, з другога боку, гэтае

грамадства не дбае пра земляроба, вугальшчыка, чорнаработніка, рамізніка, рабочага, без якіх яно не існавала б. У сваім бязлітасным эгаізме яно злоўжывае моцай іх маладосці, каб выціснуць з іх паболей працы і прыбытку; а як толькі яны пачынаюць слабець ад узросту і хваробаў, тады, калі ім усяго бракуе, грамадства забываецца на іх бяссонныя ночы, на іх доўгую і важкую працу; галодная смерць — вось падзяка гэтым гаротнікам".

Грамадства, пра якое марыць Мор, вельмі адрозніваецца ад "Рэспублікі" Плятона. Інстытуцыя сям'і захоўваецца, фізічная праца абавязковая для ўсіх, тут няма сацыяльных класаў, а агульнае валоданне маёмасцю датычыць усіх грамадзянаў. Гутарка больш не ідзе пра арыстакратычнае грамадства, як у Плятона, Мор плануе звышдэмакратычнае грамадства. Агульны абавязак працаваць і забарона прыватнай уласнасці шчыльна ўзаемазвязаныя і паўстаюць як неабходныя ўмовы забеспячэння роўнасці і грамадскіх свабодаў.

Гэты ідэал паходзіць не зусім з Плятонавай канцэпцыі свету, ён цесна звязаны з прынцыпамі хрысціянства і з маральнай дактрынай Эпікура.

Цалкам відавочна, што ўласцівы хрысціянству дух дабрачыннасці і бескарыслівасці — вялікая крыніца натхнення для Мора. Гэта бачна з ягонага "Ліста да манаха", апублікаванага ў 1520 г. Чытаем:

"Для бальшыні нічога няма святога, апрача зробленага імі самімі. Вышэйшая Боская сіла праявілася тады, калі яна заклікала мець супольнымі ўсе рэчы, а Хрыстос імкнуўся вярнуць людзей ад прыватнага да супольнага. Ён добра адчуваў, наколькі трэба нашай смяротнай і сапсаванай натуры падпарадкавацца імператывам супольнага жыцця дзеля таго, каб дасягнуць вызвалення: менавіта гэтаму нас вучыць у кожным разе рэчаіснасць. Сапраўды, чалавек не можа задаволіцца ні любоўю да сваёй уласнасці ці сваіх грошай, ні служэннем свайму роду, сваёй групе, але, паколькі ўсё гэта ў пэўным сэнсе можна назваць нашым, дык і задаволіць нас можа толькі супольнае"[1].

Хрысціянскія карані гэтых думак цалкам відавочныя, і можна цвёрда казаць, што на той жа глебе квітнее "Утопія". У творы разгортваецца таксама тэзіс аб прыроднай дабрыні чалавека, запазычаны ад Эпікура.

У раздзеле "Вандроўкі жыхароў Утопіі" Мор доўга вы-

[1] *Thomas More, OEuvres choisies, Paris, 1936, p.124.*

казваецца на гэты конт. "Хоць, — пісаў ён, — асалода не з'яўляецца, на іх думку, адзіным элементам шчасця, яна ёсць адзін з самых галоўных". Дарэчы, сцвярджаў філосаф, жыхары Утопіі аддаюць перавагу ўцехам душы перад уцехамі цела, але не пагарджаюць апошнімі. "Зрэшты, — дадаваў ён, — ва ўсялякіх пачуццёвых прыемнасцях жыхары Утопіі ніколі не забываюцца пра наступнае практычнае правіла: пазбягаць асалоды, якая замінае цешыцца з большай асалоды, ці якая суправаджаецца нейкім болем". І гэта, у прыватнасці, прычына, чаму "не трэба перабольшваць з цялеснымі ўцехамі, трэба ведаць неабходнасць і карысць".

Погляды даволі блізкія да поглядаў Эпікура, аднак Мор спрабуе пашырыць Эпікураву канцэпцыю шчасця з мэтаю прывесці яе да адпаведнасці з хрысціянствам. Ён заяўляў, што жыхары Утопіі маюць "натуральную рэлігію", якая вядзе іх да веры ў несмяротнасць душы і да адхілення "матэрыялізму". Такім чынам, чалавек можа без адмовы ад пошуку свайго шчасця пайсці на пэўныя жыццёвыя ахвяры. "Чалавек, які верыць у рэлігійныя пастулаты, павінны быць моцна перакананы, што Бог адплоціць яму незвычайнаю, вечнаю радасцю за сведамае адмаўленне ад эфемернай і пустой уцехі". І далей Мор кажа, што адмовіцца ад нечага ў спадзяванні на ўзнагароду ў будучыні — гэта акт "высакароднай веры", а вось марнаваць сябе дзеля "дарэмнага прывіду дабрадзейнасці" ёсць "акт бязглуздага вар'яцтва".

Спроба прымірыць мараль, якая грунтуецца на ідэі аб прыроднай дабрыні, з хрысціянскім вучэннем вельмі характэрная для гуманізму эпохі Адраджэння, але нельга сказаць, каб гэтая спроба мела вялікі поспех, бо ў наступныя стагоддзі прыхільнікі ідэяў прыроднай дабрыні і сацыяльнай рэформы будуць супрацьстаяць прадстаўнікам хрысціянскіх цэркваў.

2. ФІЛАСОФСКАЯ ГЛЕБА КАМУНІЗМУ ТАМАЗА КАМПАНЭЛЫ. Другі з вялікіх камуністычных аўтараў эпохі Адраджэння нарадзіўся ў 1568 г. у Калабрыі. У 14-гадовым узросце ўступіў у ордэн дамініканаў, вельмі рана пачаў пісаць і вызначаўся незалежнасцю сваіх поглядаў. З 1591

да 1598 г. яго шматкроць пераследвалі за ерась і нават саджалі ў астрог. У 1599 г. Кампанэла арганізаваў змову з мэтай вызвалення Калабрыі ад гішпанскага ярма з апораю на дапамогу туркаў, каб стварыць там квітнеючае грамадства. Змова была раскрытая, а Кампанэла кінуты ў вязніцу, дзе яго чатыры разы падвяргалі катаванню. Ажно 27 гадоў ён заставаўся вязнем. У турме Кампанэла напісаў каля 60 твораў, куды ўваходзяць не толькі філасофска-палітычныя працы, але і цудоўныя паэмы. У 1629 г. папа памілаваў яго. Неўзабаве пасля турмы Кампанэла выступіў у абарону Галілея, якога цкавалі за навуковыя погляды. Прыхільнасць папы была страчана. Кампанэла накіроўваецца ў Францыю, дзе карыстаецца ўвагаю караля Люі XIII і ўсіх высокаадукаваных людзей. Заўзяты прыхільнік астралогіі, ён склаў гараскоп дафіна паводле нараджэння. Памёр Кампанэла ў 1639 г. у Парыжы.

Яшчэ ў 1602 г., калі быў у турме, Кампанэла напісаў невялічкую працу, названую "Горад сонца", якая была выдадзена ў 1623 г. Гэта апісанне будучага камуністычнага грамадства, але менш дакладнае і менш цікавае, чым твор Томаса Мора. Адрозна ад свайго папярэдніка дамініканец выказваецца за ліквідацыю сям'і і ўмяшанне дзяржавы ў арганізацыю зносінаў паміж мужчынамі і жанчынамі. Паколькі мы маем справу з філосафам, дык асабліва важна прасачыць, якой магла быць у тыя часы філасофская глеба камуністычнае дактрыны.

Безумоўна, Кампанэла называў сябе вучнем Плятона, але ягоныя філасофскія канцэпцыі пераклікаюцца таксама з поглядамі самых вядомых філосафаў XVI ст. — Тэлезіа, Пампанацы, Джардана Бруна — поглядамі, якія былі далёка не чыста Плятонавымі і якія шмат у чым грунтаваліся на думцы Айца Экхарта, які яшчэ ў XIII ст. абвясціў прынцып еднасці Бога і свету, і Міколы Кузанскага (1401—1464), які адмаўляў "прынцып супярэчнасці", закладзены Арыстотэлем, і сцвярджаў прынцып "еднасці супрацьлегласцяў"[1].

[1] *Гэты тэзіс, падхоплены Гегелем на пачатку XIX ст., мае вялікае значэнне. Аднак у Міколы Кузанскага ён стаіць поруч з далучэннем да традыцыі хрысціянскага містыцызму. Згодна з гэтай традыцыяй, сапраўднае спазнанне ідзе ад любові, а не ад*

Першы філасофскі твор Кампанэлы скіраваны супраць Арыстотэля. Як вядома, для апошняга рэчаіснасць складалася з матэрыі і формы. Матэрыя пасіўная; актыўнай можа быць толькі форма, якая ёсць інтэлектуальны прынцып, ідэя. Стоікі хацелі зняпраўдзіць гэтае вучэнне праз сцверджанне, што рэчаіснасць — гэта толькі матэрыя, а матэрыяльны свет — жывая і ўпарадкаваная сістэма. Кампанэла, які пераняў погляды стоікаў, развітыя асобнымі філосафамі эпохі Адраджэння, бачыў: іхная канцэпцыя ігнаруе той прынцыповы факт, што сама па сабе сведамасць несумненна знаходзіцца ў чалавеку і што нельга атаясняць яе з матэрыяй. Кампанэла намагаецца спалучыць ідэю аб усюдыіснасці матэрыі са сцверджаннем пра універсальную прысутнасць сведамасці ці духу.

Такім чынам, кажа ён, усё прыродныя істоты надзеленыя сведамасцю, і паміж усім існуюць шматлікія сувязі, бо любая рэч ці істота — гэта часткі "сусветнае душы", толькі ў так званых неадушаўлёных рэчах сведамасць болей завуаліраваная. Але навуковец умее раскрыць узаемасувязі паміж рэчамі і істотамі. Напрыклад, ён ведае, якім чынам зоркі ўздзейнічаюць на людзей і нават кіруюць іх лёсам. Навуковец таксама маг, бо ён можа мець зносіны з усімі істотамі і накіроўваць іх дзеянні ў тым кірунку, у якім пажадае.

Лейтматывам дзейнасці ўсіх істотаў ёсць любоў, якая ёсць адначасова любоў да Бога і любоў да сябе, бо Бог не хоча нічога іншага, апрача здзяйснення магчымасцяў, закладзеных у прыродзе. Як і ўсе іншыя істоты, чалавек зменлівы з прычыны закладзенага ў яго фундаментальнага Боскага інстынкту. Інстынкт працягу роду, прага славы, схільнасць да жыцця ў калектыве — усё гэта толькі асобныя праявы галоўнага інстынкту[1], а значыць, дасканаласць чалавека дасягаецца не праз адмаўленне, а праз дакладнае развіццё прыродных здольнасцяў[2].

розуму. Гегелеўская філасофія, наадварот, будзе сцвярджаць, што менавіта праз розум можна спасцігнуць еднасць супрацьлегласцяў.

[1] *Гл. Léon Blanchet, Campanella, Paris, 1920, pp.398-399.*

[2] *Ibid., p.401.*

Што да рэлігіі, дык у людзей яна толькі вышэйшая форма прыроднае рэлігіі, агульнай для ўсяго існага, якая падштурхоўвае да згоды з прынцыпамі свайго існавання. Жывёлы, напрыклад, пакланяюцца зоркам — вышэйшым і бліжэйшым да Бога істотам. Напрыклад, сланы схіляюць калені перад месяцам[1]. Толькі чалавек пакланяецца Богу наўпрост.

Ад хрысціянства Кампанэла пераймае "міленарысцкую" канцэпцыю першых стагоддзяў існавання царквы[2] і ў адной са сваіх паэмаў патрабуе, каб Хрыста больш прадстаўлялі ў славе яго ўваскрэшання, чым у жалобе яго пакутаў[3].

Гэткія погляды далёкія ад традыцыйнага хрысціянства. Мор найхутчэй не пагадзіўся б з імі, аднак бясспрэчна, што ва "Утопіі" таксама прысутнічае вера ў прыродную дабрыню чалавека, як і прызнанне ідэі натуральнай рэлігіі.

Кампанэла кажа, калі ўсе істоты былі ўтвораны Боскай любоўю, якая і ёсць іх прынцыпам, дык рух гісторыі — гэта не што іншае, як вяртанне Сусвету да адзінства, страчанага на пачатку часоў. Любоў павінна пераадолець і знішчыць усе формы падзелаў, разыходжанняў і супрацьстаянняў. Разнастайнасць рэлігіяў, таксама як і шматлікасць народаў, павінна знікнуць. Чалавецтва мусіць утвараць сусветную манархію пад кіраваннем адзінага суверэна, які будзе адначасова ўвасабляць у сабе караля і святара. Так чалавецтва вернецца ў свой першапачатковы прыродны і Боскі стан.

Але ў гэтым прыродным стане не павінна існаваць нічога, што стварала б глебу для дзейнасці, скіраванай на пошук прыбытку ці асабістага дабрабыту. Толькі любоў павінна кіраваць кожным чалавекам. Тады знікнуць прыватная ўласнасць і грошы. Таму будзе забаронена і сям'я. "Калі знікне самалюбства, застанецца любоў да грамадства"[4].

Такім чынам, камуністычная ідэя Кампанэлы грунтуецца на філасофіі, якая не прызнае супрацьстаяння паміж матэрыяй і духам. Гэтая філасофія заснаваная на сапраўдным

[1] *Ibid., p.462.*

[2] *Гл. OEuvres, éditées par Louise Colet, Paris, 1847, p.99. Аб існаванні міленарысцкіх вераў гл. Norman Cohn, Les fanatiques de l'Apocalypse, trad. franç., Paris, 1962.*

[3] *OEuvres, op. cit., p.75; Blanchet, op. cit., p.417.*

[4] *Cité par Blanchet, op. cit., p.502.*

абагаўленні прыроды, яна поўная аптымізму наконт будучыні чалавецтва і прыводзіць да разгляду магчымасцяў усебаковай і дасканалай інтэграцыі індывіда ў грамадства, адкуль вынікае знікненне ўсялякай супярэчнасці паміж прыватнымі і грамадскімі інтарэсамі. Плятон прадугледжваў гэткую інтэграцыю толькі ў дачыненні да прадстаўнікоў эліты. Мор пра яе марыў, але не лічыў да канца рэальнай, бо падтрымліваў ідэю кампенсацыі ў іншым жыцці за ахвяры, на якія чалавек ідзе ў зямным жыцці. Кампанэла, мусіць, першым сцвердзіў неабходнасць дасягнення чалавецтвам дасканалага грамадскага ладу на глебе неабмежаванай веры ў прыродную дабрыню[1].

Ва ўсім гэтым зноў праяўляецца "натуралізм", характэрны для эпохі Адраджэння. Зразумела, размова больш не ідзе пра тое, каб сцвярджаць, што грамадскія дачыненні, *такія, якія ёсць узапраўды,* — гарманічныя, бо яны прыродныя; але дапускаецца, што гэтыя стасункі, калі яны прыродныя, *павінны зрабіцца гарманічнымі*.

Погляды вялікіх "утапістаў" эпохі Адраджэння былі перанятыя і развітыя ў наступныя стагоддзі; яны адыгрывалі вырашальную ролю пачынаючы з XVIII ст., і мы вернемся да іх, калі будзем вывучаць стварэнне навачасных сацыялістычных дактрынаў.

Самі аўтары ідэяў, пра якія мы вялі гаворку, засталіся

[1] *Філасофскія погляды, якія адстойваў Кампанэла, пазней былі запазычаныя многімі філосафамі. У значнай ступені сёння з імі можна сустрэцца ў Р.П.Тэяра дэ Шардэна, які піша:*

"Любоў — самая універсальная, самая моцная і самая патаемная з усіх касмічных энергіяў..." (L'énergie humaine, Paris, 1962, p.40).

"Відавочна, ніякае грунтоўнае адрозненне не падзяляе таго, што звычайна прынята супрацьстаўляць пад назовамі фізічнай энергіі і маральнай магутнасці" (Ibid., p.157).

"Не, нельга тлумачыць космас як віхуру нясведамых элементаў, на якіх недаступнае разуменню квітнее жыццё — як нейкае здарэнне ці цвіль. Космас, фундаментальна і першасна, існуе, і па сутнасці ўся яго гісторыя — гэта толькі велізарная псіхічная з'ява: павольнае, але няўхільнае збіранне распыленай сведамасці..." (Ibid., pp.29-30).

"Уявім сабе Зямлю, дзе чалавечыя істоты імкнуліся б (і нават у адным кірунку) здзейсніць глабальнае яднанне з найвышэйшай істотай, да якой бы ўсе захоплена цягнуліся, што яна далучаная да самага патаемнага ў кожным чалавеку, да неперадавальнага іншаму. У такім сусвеце дзеля падтрымання найбольш спрыяльнага для дзеяння парадку не трэба было б звяртацца да прымусу... У такіх абставінах Жыццё нарэшце ўнікла б (найвышэйшае вызваленне) тыраніі матэрыяльных імператываў і ўсё болей свабодная асоба нараджалася б без супярэчнасцяў унутры супольнасці" (Ibid., p.189).

адзінокімі постацямі ў тагачасным свеце, дзе панавалі культ багацця і сацыяльная няроўнасць.

Такім чынам, нам варта вярнуцца да аўтараў, якія жадалі заснаваць навуку пра эканамічныя дачыненні, каб канстатаваць, што гэтыя аўтары пачнуць крытыку пазіцыяў меркантылістаў.

Бібліяграфія

Каб мець уяўленне пра ўплыў Рэфармацыі на гісторыю эканамічнай думкі, апрача твораў Вэбэра і Тоўні, пра якія мы ўжо згадвалі, карыснай будзе кніга A.Rieler, La pensée économique et sociale de Calvin, Genève, 1959.

Грунтоўным даследваннем меркантылізму стала кніга шведскага эканаміста Элі Ф. Хекшэра (Eli F.Heckscher), даступная ў яе ангельскім перакладзе, Mercantilism, 2 vol., London, 1935. Вялікая каштоўнасць гэтай працы ў тым, што аўтар поруч з разглядам твораў уласна меркантылістаў таксама даследуе шматлікія тэксты, напісаныя палітычнымі дзеячамі і купцамі. Праз гэта ён дасягае надзвычай жывога малюнка тагачаснай думкі.

Да таго ж карысна будзе пачытаць наступныя творы, прысвечаныя асобным аспектам тэмы:

C. W. Cole, *Colbert and a century of French Mercantilism*, New York, 2 vol., 1938.

P. Harsin, *Les doctrines monétaires et financières en France du XVIe au XVIIIe siècle*, Paris, 1928 (твор, напісаны з надзвычайнай дакладнасцю).

E. Lipson, *The economic history of England, vol.II et III: The age of mercantilism*, London, 1931.

H. Baudrillart, *Bodin et son temps, tableau des théories politiques et des idées économiques au XVIe siècle*, Paris, 1853; réédition, Aalen, 1964.

E. A. Johnson, *Predecessors of Adam Smith*, New York, 1937.

J. Viner, *Studies in the theory of international trade*, New York, 1937.

Раздзел II

КРЫТЫКА МЕРКАНТЫЛІЗМУ

§ 1. Сацыяльны аспект: прагрэс капіталістычнай эканомікі

Падмурак буйнога сусветнага гандлю быў закладзены ў XV—XVI стст. дзякуючы мэтанакіраванай актыўнасці партугальскай і гішпанскай манархіяў. Гэтыя манархіі імкнуліся забяспечыць сабе манаполію на прыбытак з гандлю. Такім чынам, яны затрымалі працэс назапашвання прыватнага капіталу, пашырэнне дзейнасці ўладальнікаў капіталаў і гэтым падрыхтавалі глебу да эканамічнага заняпаду сваіх краінаў.

Каралі Гішпаніі, дзеля таго каб напоўніць каралеўскія скарбонкі, выгналі маўраў, а потым і габраяў, канфіскавалі іх маёмасць. Потым пачаўся пераслед вялікай колькасці хрысціянаў арабскага ці габрайскага паходжання, якіх палічылі за "дрэнных хрысціянаў". Гандлёвыя шляхі з Новым Светам былі цалкам манапалізаваныя дзяржавай, таму прыватная прамысловасць і прыватны гандаль паступова занепадаюць. Адукаваная частка насельніцтва накіроўваецца ў адміністрацыю ці паступае ў рэлігійныя ордэны. Зямля ўсё часцей пераходзіць у рукі шляхты і святароў, але яны не клапоцяцца пра паляпшэнне метадаў апрацоўкі.

У 1588 г. быў знішчаны гішпанскі флот, адпраўлены на заваёву Ангельшчыны ("Непераможная Армада"), і Гішпанія страціла сваё першынство на моры. У 1656 г. пасля паразы пры Дзюнах яна губляе ваенную перавагу на сушы, і мацнейшаю робіцца Францыя.

1. XVII СТАГОДДЗЕ. У XVII ст. прыватны капіталізм развіваецца галоўным чынам у Рэспубліцы Задзіночаных Правінцыяў (сучасныя Нідэрлянды), утворанай у выніку пераможнага паўстання гарадской буржуазіі супраць улады караля Гішпаніі.

У XVI ст. у Антвэрпэне практыкавалася сістэма поўнай роўнасці паміж іншаземнымі і мясцовымі купцамі. Горад становіцца цэнтрам развіцця капіталізму, а ў XVII ст. яго месца заступае Амстэрдам. Утвараюцца магутныя акцыянерныя таварыствы (акцыянерамі часткова былі іншаземцы), гэтыя таварыствы атрымліваюць ад дзяржавы прывілеі на гандаль з калоніямі і маюць велізарныя прыбыткі. Ад Пэрсідскага заліва да Японіі памнажаюцца галяндскія факторыі. Востраў Ява ператвараецца ў калонію, дзе вырошчваецца цукровы трыснёг.

Развіваецца прамысловасць, асабліва тэкстыльная. Але ва ўмовах замежнай канкурэнцыі Галяндыя не можа больш праводзіць ліберальную палітыку, бо ва ўсёй Заходняй Эўропе рост прамысловасці і гандлю абапіраецца на магутнасць дзяржаваў, якія абараняюць нацыянальную прамысловасць, забяспечваюць гандлю прывілеяваныя рынкі збыту праз заключэнне гандлёвых дамоваў у Эўропе ці праз каланіяльныя заваёвы па-за яе межамі. Эўрапейскі капіталізм развіваецца ва ўмовах бязлітаснай барацьбы паміж буйнымі дзяржавамі.

У выніку вайны Нідэрляндаў супраць Гішпаніі порт Антвэрпэна быў у 1647 г. зноў зачынены для іншаземцаў. Галяндская прамысловасць абараняецца ад імпарту французскіх тавараў, што прыводзіць у 1672 г. да вайны супраць Францыі.

Тым часам іншая гандлёвая краіна, Англельшчына, якая тады ўжо была значнай каланіяльнай імперыяй, пачынае апярэджваць Галяндыю. Англельскія каралі хацелі забяспечыць сабе абсалютную ўладу, але мусілі абапірацца на багаты клас (шляхту, буржуазію), каб фінансаваць свае вайсковыя экспедыцыі. Багатыя ж імкнуліся абмежаваць уладу караля. Вынікам гэтага супрацьстаяння сталася рэвалюцыя 1648 г., якая прывяла да пакарання смерцю караля і да дыктатуры Кромўэла. Рэвалюцыя 1688 г. прымусіла новага караля Вільгельма III Аранскага пагадзіцца з Білем аб правах, які надаваў парламенту выключнае права выпрацоўкі законаў і развязання фінансавых пытанняў.

Увесь гэты час працягвалася палітыка каланіяльнай экспансіі, пераважна ў Паўночнай Амэрыцы і на Антыльскіх астравах. Гандаль з калоніямі ажыццяўлялі прыватныя акцыянерныя кампаніі. Кароль валодаў часткай акцыяў, але не прэтэндаваў на кіраванне гандлёвымі аперацыямі.

У 1664 г. Англельшчына захапіла галяндскую калонію ў Паўночнай Амэрыцы — Нью-Амстэрдам. На моры цяпер запанавалі англельцы.

Францыя тым часам ішла па сярэднім, між гішпанскім ды англельскім, шляху.

На пачатку XVII ст. Рышэльё стварыў каланіяльныя таварыствы, якім надаваў хутчэй палітычнае, чым гандлёвае значэнне. Ён дасягнуў толькі частковага поспеху. Не дала прыбытку Марбіянская кампанія, арыентаваная на Поўнач і ў бок Амэрыкі, гэтаксама як і Ост-Індская кампанія, накіраваная на Далёкі Усход. Не лепшыя былі справы й Таварыства 100 акцыянераў, створанага з мэтай засялення Канады. Кампанія Амэрыканскіх астравоў (1635 г.) завалодала астравамі Мартынікай, Гвадэлупай і Дамінікай. Кампанія астравоў Зялёнага Мыса (1633 г.) стварыла першую факторыю ў Сэнэгале з мэтаю гандлю чорнымі рабамі. У 1642 г. французы высаджваюцца на Мадагаскары. У 1628 г. была створаная факторыя ў Алжыры, а ў 1631 г. першыя французскія консулы ўсталяваліся ў Марока, выцесніўшы адтуль партугальцаў.

Прамысловы заняпад Гішпаніі, а таксама Італіі і Бэльгіі спрыяў прамысловаму развіццю Францыі. У другой палове XVII ст. Кальбэр імкнуўся паскорыць яго шляхам стварэння *мануфактураў*. Развіваецца новы тып прамысловасці, галоўным чынам арыентаваны на экспарт. Кальбэр стварыў таксама два каланіяльныя таварыствы, але поспеху гэта не мела.

Рэсурсы краіны значна вычэрпваліся палітыкай Люі XIV, скіраванай на дасягненне французскай гегемоніі ў Эўропе, палітыкай, якая прывяла да шматлікіх войнаў. Абсалютысцкія памкненні караля і патрабаванне раскошаў ягонага двара не спрыялі развіццю гандлёвай і прамысловай буржуазіі.

У эпоху імклівага ўздыму капіталізму ў XVIII ст. першынство належыць Англельшчыне. Аднак у Францыі, Бэльгіі і Галяндыі таксама назіра-

лася значнае развіццё гандлю і прамысловасці. У іншых жа рэгіёнах Эўропы, наадварот, працягваўся эканамічны застой ці нават паглыбілася адсталасць: прыкладам, у Цэнтральнай Эўропе, Польшчы і Расеі пашыралася прыгонніцтва.

2. УЗДЫМ КАПІТАЛІЗМУ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. На пачатку XVIII ст. у Англельшчыне і Францыі назіраецца імклівае развіццё фінансавай дзейнасці і спекулятыўных аперацыяў. У 1711 г. у Англельшчыне было створанае Таварыства Паўднёвых Мораў. Яно хутка пачынае атрымліваць велізарныя прыбыткі і дамагаецца права на кіраванне дзяржаўным доўгам. Кошт акцыяў таварыства павялічваецца са 100 да 1000 фунтаў. Вялікая колькасць новых справаў пачынаецца са спекуляцыяў.

Шатляндзец Джон Ло прапанаваў герцагу Арлеанскаму, які быў рэгентам Французскага каралеўства, аздаравіць фінансы дзяржавы гэткім жа чынам. У 1716 г. ён стварыў банк, а праз тры гады (1719) — Ост-Індскую кампанію. Акцыі былі хутка прададзеныя і імклівa падняліся ў кошце (ад 500 да 20000 ліўраў). На іх можна было падпісацца часткова і праз каштоўныя паперы дзяржаўнай пазыкі, што паспрыяла б павелічэнню даверу да дзяржавы.

Аднак Ло не здолеў стварыць у Францыі плынь, скіраваную на каланіяльную экспансію. Неўзабаве кошт акцыяў панізіўся, што выклікала паніку (1720 г.). Адначасова ў Англельшчыне таксама адбываецца падзенне курсу каштоўных папераў Кампаніі Паўднёвых Мораў.

У выніку гэтага краху англельскія капіталы пачалі накіроўвацца *ў прамысловасць*. Дзякуючы жорсткай пратэкцыянісцкай палітыцы паводле французскага ўзору ствараецца вялікая колькасць *мануфактураў*, імкліва пашыраецца экспарт. Метуэнская дамова 1703 г. адкрыла для Англельшчыны рынак Бразыліі. Паводле Утрэхцкай дамовы 1713 г. яна атрымала доступ на рынкі ўсёй Гішпанскай каланіяльнай імперыі і забяспечыла сабе манаполію ў гандлі неграмі у межах гэтай імперыі.

У Францыі таксама назіраецца ўздым гандлю і прамысловасці.

Кардынал Флёры, які быў прэм'ер-міністрам ад 1726 да 1743 г., у дачыненні да купцоў праводзіў ліберальную палітыку, замест таго каб паспрабаваць прымусіць іх служыць дзяржаве. Квітнеюць французскія факторыі на Антыльскіх астравах, у Індыі і ў Люізіяне, толькі Канада застаецца занядбаная.

Адбываецца канцэнтрацыя французскай прамысловасці, якая набывае выразны капіталістычны характар. Пачынаючы з 1758 г. тэкстыльныя мануфактуры ў рэгіёне Абэвіля атрымліваюць значныя прывілеі пры ўмове, што яны аб'ядноўваюць больш чым 100 чалавек.

З прыходам да ўлады Люі XV Францыя вяртаецца да палітыкі абсалютызму і гегемоніі. Пад час вайны за аўстрыйскую спадчыну (1740—1748) французскі флот сутыкаецца з англельскім. Але пасля Аахенскага міру (1748) пачынаецца новы ўздым у гандлі і ў прамысловасці.

У Англельшчыне ў моду ўваходзяць баваўняныя (індыйскія) тканіны. У 1733 г. Джон Кей вынайшаў лёткі чаўнок, які даў магчымасць рабочаму-ткачу працаваць у два разы хутчэй. Механізаваная баваўняная прамыс-

ловасць спажывае вялікую колькасць імпартнай неапрацаванай бавоўны. Дэрбі адкрыў метад, які дазволіў выкарыстоўваць кокс замест драўніны ў працэсе вытворчасці жалеза. Адначасова з металургіяй імкліва развіваецца каменнавугальная прамысловасць: так, у 1710 г. у шахтах былі ўсталяваныя паравыя помпы.

У Францыі правал авантуры Ло замарудзіў развіццё банкаўскай справы, але ў прамысловасці адбываўся прагрэс. У 1756 г. на каменнавугальнай шахце Анзэнскай кампаніі працавала 1000 рабочых. Утварылася вялікая колькасць камандытных таварыстваў і таварыстваў з калектыўнай адказнасцю. У 1750 г. паўстае Карпарацыя інжынераў мастоў і дарог.

Тым часам Францыя ўвязалася ў новую вайну, на гэты раз з Аўстрыяй на баку Прусіі. Англельшчына скарыстала з гэтае магчымасці, каб захапіць французскія калоніі. Паводле Парыжскай дамовы (1763 г.) да яе адышла Канада, частка Антыльскіх астравоў, усе валоданні ў Індыі, апрача пяці гарадоў, і сэнэгальская факторыя. Францыя таксама саступіла Гішпаніі Люізіяну.

У выніку гэтае перамогі Англельшчына атрымала яшчэ адзін імпульс да індустрыялізацыі. Калі ў 1688 г. з 5,5 мільёна жыхароў краіны 4,5 мільёна займаліся сельскай гаспадаркай, дык у 1768 г. — толькі 3 мільёны з 8,5 мільёна. Краіна зрабілася імпарцёрам збожжа.

У сельскай гаспадарцы таксама адбыліся глыбокія пераўтварэнні.

XVIII стагоддзе ў Англельшчыне пазначана другой хваляй "enclosures" (агароджванняў), першая хваля прыпала на XVI ст. Развіццё гандлю, узбагачэнне буржуазіі выклікалі імкненне павялічыць даходы ад зямельнай уласнасці. Буйныя ўласнікі захоплівалі дзірван, палеткі грамадаў, а таксама "open fields", зямельныя ўчасткі "змешанага" карыстання, што ўзорваліся ўладальнікамі супольна. Ад 1730 г. парламент зноў дазволіў перадачу ў прыватнае валоданне земляў сялянскай грамады. Вольныя землі ператварыліся ў загароджаныя палі. Перанасяляліся вёскі, паскорыўся зыход вясковага насельніцтва ў гарады, вырасла агульная колькасць насельніцтва, і многія сяляне засталіся без сродкаў існавання.

У Францыі ў гэты перыяд адбывалася зусім іншая эвалюцыя. Традыцыйная шляхта і высокі клер у большай ступені, чым англельскія, захавалі сваё становішча прывілеяваных класаў. Хоць прыгонніцтва паступова знікала, сяляне па-ранейшаму мусілі плаціць царкоўную дзесяціну і несці феадальныя павіннасці (грашовы або натуральны чынш ці адбывалі паншчыну). Значная колькасць сялянаў зрабілася фактычнымі ўладальнікамі сваіх "трыманняў" (450 тысяч дробных уласнікаў напрыканцы XVIII ст.), астатнія былі арандатарамі ці здольнікамі. Буйныя ўладальнікі імкнуліся павялічыць свае даходы праз аднаўленне старых феадальных павіннасцяў ці патрабаванне выконваць іх больш старанна, але не рабілі гэтак, як англельцы, што пайшлі па шляху, бадай, капіталістычнага выкарыстання зямлі на базе буйной таварнай вытворчасці.

На вялікай частцы Заходняй Эўропы між тым адбываюцца пэўныя змены ў тэхніцы вядзення сельскай гаспадаркі: галоўным чынам гэта

замена папару кармавымі культурамі. Гэтая тэхналогія, уведзеная ў XVII ст. у Бэльгіі, у XVIII ст. распаўсюдзілася на Англельшчыну і Нямеччыну. Яна дазволіла разнастаіць корм жывёлы ўзімку, а худоба ў сваю чаргу забяспечвала гаспадарку большай колькасцю ўгнаенняў для земляробства. У Англельшчыне выкарыстанне новых метадаў, якія прыцягнулі капіталы ў сельскую гаспадарку, у значнай ступені паспрыяла канцэнтрацыі зямельнай уласнасці і стварэнню буйных гаспадарак.

§ 2. Інтэлектуальнае жыццё: трыумф картэзіянскага метаду

Класічная палітэканомія нарадзілася ў XVIII ст. у выніку карэнных зменаў у канцэпцыях навуковага спазнання, зменаў, якія адбываліся яшчэ ў XVII ст.

Каб зразумець прыроду гэтых зменаў, трэба яшчэ раз вярнуцца да Арыстотэля, бо новы метад грунтаваўся якраз на глебе крытыкі славутага грэка.

Арыстотэль як навуковец быў перадусім даследнікам жывых істотаў, "біёлагам" — паводле сучаснай тэрміналогіі. Ён намагаўся растлумачыць будову і развіццё жывых істотаў зыходзячы з мэты ці "канчатковай прычыны" кожнае з іх. Усё, што назіраецца ў нейкай жывёліне, — функцыянаванне розных органаў, яе развіццё — мае на мэце рэалізацыю таго тыпу субстанцыі, які ў гэтай жывёле ўвасоблены, і падтрыманне яе жыцця. Жывёліна расце, корміцца, прадаўжае род, больш-менш доўга захоўвае нармальны стан здароўя; усе з'явы, што вынікаюць з гэтага, спазнаюцца ў залежнасці ад прыроднае мэты: існаванне пэўнай колькасці экземпляраў дадзенага віду.

Упэўнены ў дасканаласці свайго метаду, Арыстотэль імкнуўся ўжываць яго пры аналізе ўсіх з'яваў. Безумоўна, ён адмовіўся ісці за Платонам, які надзяляў душамі любыя целы, каб растлумачыць іх развіццё. Арыстотэль сцвярджаў — развіццё істоты тлумачыцца прыродай ці мэтай гэтай істоты. Камень падае, казаў ён, бо належыць Зямлі, якая ёсць цэнтрам Сусвету. І ўсе часцінкі Зямлі, аддзеленыя ад яе, заўсёды імкнуцца вярнуцца да гэтага цэнтра. З іншага боку, зоркі перамяшчаюцца з тае прычыны, што належаць да разнастайных нябесных сфераў, якія па сваёй прыродзе рухаюцца колападобна.

Як і Платон, Арыстотэль выступаў супраць тых "грэцкіх фізікаў" (у прыватнасці, Дэмакрыта), што спрабавалі спалучыць прыроднае развіццё істотаў з "гвалтоўным", штучным рухам. Тым рухам, які чалавек можа перадаць нейкай рэчы, надаючы ёй імпульс, і які таксама называецца "механічным", бо вывучаецца на прыкладзе машынаў, створаных чалавекам для ўласнага карыстання (напрыклад, рух, нададзены целу з дапамогай вагара).

Арыстотэль успрымаў свет як строга ерархізаваную сукупнасць істотаў (ад мінерала да Бога), якая змяшчае раслінны і жывёльны свет,

чалавека і нябесныя сферы. Спазнаць свет — значыць класіфікаваць кожную істоту і прасачыць, якім чынам рэалізуюцца яе прыродныя ўласцівасці. Калі ж навука стане абапірацца на тэорыю механіцызму, дык яна знікне; свет з гледзішча сукупнасці целаў, якія ўвесь час сутыкаюцца паміж сабой і праз гэта надаюць адно другому рух, быў бы цалкам ірацыянальным светам, недаступным думцы.

Аднак Арыстотэль, хоць і да канца адстойваў сваю канцэпцыю свету, мусіў адмаўляць вялікую колькасць бачных з'яваў ці тлумачыць іх выключна ўласнымі меркаваннямі, без апоры на факты. Каб растлумачыць, чаму дым уздымаецца ўгару, а камень, наадварот, падае, ён падзяліў целы на дзве катэгорыі: "цяжкія", што імкнуцца рухацца ўніз, і "лёгкія", што імкнуцца ўздымацца. Асабліва надоўга Арыстотэль зацвердзіў (у прыватнасці, насуперак вучням Пітагора) тэорыю, паводле якой Зямля — гэта нерухомае цела, цэнтр Сусвету.

Пэўны час у Заходняй Эўропе назіраецца панаванне Арыстотэлевае думкі. Аднак ужо ў сярэдзіне XIV ст. шматлікія філосафы сталі аспрэчваць яго навуковую сістэму. Жан Бурыдан адхіліў Арыстотэлеў прынцып, згодна з якім усялякае цела ў стане руху імкнецца да вяртання ў стан спакою, як толькі рухач, што перадае яму рух, спыняе сваё дзеянне. Нікаля Арэм, пра якога мы ўжо згадвалі, адстойваў тэзіс пра нерухомасць неба і рухомасць Зямлі[1].

У наступныя стагоддзі наступ на тэорыю Арыстотэля ўзмацняецца дзякуючы значнаму развіццю ведаў аб прыродных з'явах.

У 1543 г. паляк Капернік заснаваў тэорыю аб тым, што Зямля — гэта планета, якая круціцца вакол Сонца. На пачатку XVII ст. Кэплер і Галілей шырока развіваюць астранамічныя веды. Галілей яшчэ й ажыццявіў доследы па вывучэнні падзення целаў, якія руйнавалі Арыстотэлеву фізіку доказам, што ўсе целы ў стане вакууму падаюць з аднолькавай хуткасцю. Такім чынам, зводзіўся на нішто прапанаваны Арыстотэлем падзел на цяжкія і лёгкія целы. З другога боку, на змену Арыстотэлевай ідэі пра імкненне целаў да нерухомасці прыйшла супрацьлеглая ідэя, паводле якой рух целаў у вакууме мае тэндэнцыю бясконца захоўвацца на ранейшым роўні (прынцып інерцыі).

Надышла эпоха трыумфу механістычных тлумачэнняў, якія Арыстотэль хацеў выключыць з навукі. З гэтага часу лічыцца, што рух тлумачыцца не прыродай ці ўласцівасцямі целаў, а ён ёсць вынікам пэўных штуршкоў, імпульсаў, нададзеных целу звонку. Перамога механіцызму прыпадае на тыя часы, калі з'явілася магчымасць звязаць матэматычнымі формуламі прычыны руху і яго вынікі, што дазволіла прадбачыць вялікую колькасць з'яваў. Механіка — навука, заснаваная на дасягненнях матэматыкі, — зрабілася асноўнаю галіною фізікі. Яна канчаткова сфармавалася з адкрыццём Галілеем закону свабоднага падзення целаў. Згодна з гэтым законам, адлегласць, якую пераадольвае цела пад час падзення ў вакууме, прапарцыйная часу падзення, узятаму ў квадраце,

[1] *Гл. Emile Bréhier, Histoire de la philosophie, t.I, vol.III, pp.726-727.*

што падаецца наступнай матэматычнай формулай: $e = 1/2gt^2$, дзе e — адлегласць, пройдзеная за адзінку часу, t — час і g — нязменны каэфіцыент, названы "паскарэннем свабоднага падзення".

Філосафам, які больш, чым хто іншы, зрабіў для распаўсюджвання механістычнае канцэпцыі навукі, быў француз Рэнэ Дэкарт (1596—1650).

Дэкарт, як і Арыстотэль, імкнуўся даказаць, што свет адзіны, а значыць, павінны існаваць адзіны навуковы метад, але за аснову гэтага метаду ён бярэ механістычны прынцып, адкінуты Арыстотэлем. Вельмі характэрным для сябе чынам Дэкарт спрабуе растлумачыць крыніцу жыцця: ён зводзіць целы жывых істотаў да машынаў і сцвярджае, што целы функцыянуюць пад уздзеяннем цеплыні, якая ствараецца ў сэрцы, і гэта, на яго думку, адзіная крыніца жыцця. З гэтага моманту сціхаюць усе размовы пра душы жывёлаў.

Але Дэкарт гэтым не абмяжоўваецца. Ён закладвае асновы навукі пра чалавека, названай мараллю, якая павінна быць часткаю фізікі.

"Уся Філасофія, — піша ён, — ёсць дрэва, карані якога — Метафізіка, тулава — Фізіка, а галінкі, што выходзяць з гэтага тулава, — усе іншыя навукі. Іх можна прыпадабніць да трох асноўных, а менавіта: Медыцыны, Механікі і Маралі; я ж паважаю самую высокую і самую дасканалую — Мараль, што прадугледжвае поўнае веданне іншых навук і паўстае найвышэйшым роўнем мудрасці"[1].

Ён сапраўды паспрабаваў ажыццявіць гэтую праграму і напісаў напрыканцы свайго жыцця "Трактат аб захапленнях душы". Высновы, якія робіць Дэкарт у гэтым трактаце, малапераканаўчыя[2], аднак твор мае выключнае значэнне, бо пракладае шлях навуковай псіхалогіі і сцвярджае магчымасць прымянення метадаў фізікі да аналізу чалавека.

Такое змяненне навуковых канцэпцыяў ставіць пад сумнеў маральныя і рэлігійныя традыцыі. Павялічваецца разрыў паміж навукай і біблейным тлумачэннем свету. Ідэя аб прымяненні навуковага метаду да чалавека прымушае задумацца, чаму можа навучыць чалавека рэлігія.

Сам Дэкарт хоча памірыць навуку і веру і сцвярджае, што чалавек, які матэрыяльны, таксама ёсць чыстая думка, цалкам чужая матэрыі. Ён лічыць, што кожны беспасярэдне ўпэўнены ў рэальнасці думкі ("Я мыслю, значыць, я існую"). Гэтае сцверджанне прыводзіць Дэкарта да сцвярджання існавання Бога і прызнання неабходнасці рэлігіі.

Іншыя мысляры, напрыклад Блез Паскаль (1623—1662), аднак, менеі верылі ў магчымасць спалучыць навуку і веру.

---

[1] *Cité par Pierre Mesnard, Essai sur la morale de Descartes, Paris, 1936, p.28.*

[2] *Вось, напрыклад, якое апісанне даецца страху: "Мы заўважаем, што да нас набліжаецца нейкая раз'юшаная жывёліна. Нашы вочы ўспрымаюць два вобразы жывёліны, аптычныя нервы даносяць іх да нутраных звілінаў нашага мозгу. Там гэты дваісты вобраз уздзейнічае на "жывёльныя пачуцці" (якія ёсць надзвычай разумныя целы). Апошнія перадаюць уяўленні ў эпіфіз, шышкападобную залозу, што знаходзіцца ў мозгу і ёсць месцазнаходжаннем чалавечай (нематэрыяльнай) душы, і калі гэткі вобраз у спалучэнні з непрыемнымі ўспамінамі паўстае ў галаве баязлівага чалавека, залоза накіроўвае частку пачуццяў у бок нерваў, што правакуюць уцёкі, а яшчэ частку — у нервы, што сціскаюць сэрца".*

Ён быў з шэрагу тых геніяльных людзей, якія стварылі навачасную навуку. Але сам Паскаль быў глыбока незадаволены і заклапочаны сваімі адкрыццямі, бо лічыў, што навука не прыносіць аніякай практычнай карысці чалавеку ў яго жыцці. Навука пра чалавека, мараль і палітыка вынікаюць з "духу выкшталцонасці", а не з "духу геаметрыі".

Раней матэрыяльны свет быў падуладны чалавеку, зараз жа ён робіцца нечым чужым ("Гэтае вечнае маўчанне бязмежных прасторaў прыводзіць мяне ў жах").

Паводле Паскаля, выйсце можа быць адно — каб навука адмовілася ад сваёй прагі растлумачыць свет і асабліва чалавека і каб думка скарылася Боскаму адкрыццю, якое вызначае, у што верыць і як дзейнічаць. Дарэчы, трэба адкінуць традыцыйную тэалогію, якая таксама шукае рацыянальнае тлумачэнне свету. Пачуццё, сэрца павінны ўзяць верх над розумам.

Але парадаў Паскаля не паслухаліся. Наадварот, найбольш смелыя філосафы вельмі хутка пайшлі па шляху, пракладзенаму Дэкартам. У прыватнасці, яны паспрабавалі растлумачыць грамадства, цалкам атаясамліваючы яго з машынай.

Па гэткім шляху пайшоў ангельскі філосаф Томас Гобс (1588—1679), які цалкам прымаў матэрыялістычную канцэпцыю, але сцвярджаў, што супярэчнасць паміж дабром і ліхам палягае ў супрацьлегласці паміж прыемным для індывіда і тым, што яму не падабаецца. У сваім творы *"Левіятан"* (1651) ён кажа, што грамадства — гэта проста "штучная жывёла", г. зн. (адпаведна з картэзіянскаю канцэпцыяй) машына, вінцікамі якой ёсць людзі. З гэтага Гобс робіць выснову, што свабода гандлю — гэта "прыродны закон", аднак дапускае, што суверэн павінны сачыць, каб ніхто не застаўся бяздзейным, і абмяжоўваць празмерныя выдаткі сваіх падданых.

Гобс быў прыхільнікам абсалютнай манархіі. Пасля яго Джон Лок (1632—1704), наадварот, у сваіх "Трактатах аб кіраванні" (1690) імкнуўся ўславіць перавагі парламенцкай манархіі, якая ўсталявалася ў Англіі шчыне пасля рэвалюцыі 1688 г. Ён сцвярджаў, што існуюць натуральныя правы індывіда, якія грамадства павінна паважаць, — права на недатыкальнасць асобы і права на ўласнасць.

Апошняе права, на думку аўтара, грунтуецца на абавязку працаваць і на неабходнасці падзелу зямлі паміж індывідамі дзеля таго, каб з зямлі быў плён. Першапачаткова, пісаў ён, індывід мог стаць уладальнікам толькі таго палетка, які ён быў здольны апрацаваць і ўраджай з якога мог спажыць. Аднак з вынаходкаю грошай людзі атрымалі магчымасць назапашваць багацці ў неабмежаванай колькасці; такім чынам, яны "згадзіліся на непрапарцыйнае і няроўнае валоданне зямлёй". У выніку насуперак сваёй "ідэалісцкай" канцэпцыі правоў чалавека Лок у канчатковым рахунку таксама развівае глыбока натуралістычную сацыяльную філасофію.

Сацыяльная філасофія Лока мае вялікую вагу, бо на ёй выхаваліся знаныя ангельскія эканамісты-класікі — Сміт, Мальтус, Рыкарда. Дарэчы,

у другім "Трактаце" Лока прысутнічаюць разважанні наконт вартасці рэчаў, якія падрыхтавалі глебу для даследванняў эканамістаў-класікаў.

У 1662 г. у сваім "Трактаце аб таксах і падатках" сэр Уільям Пэты вылучыў ідэю, паводле якой вартасць рэчаў залежыць ад колькасці працы, выдаткаванай на іх вытворчасць.

"Натуральныя дарагоўля і таннасць, — пісаў аўтар, — залежаць ад большай ці меншай колькасці працоўных рук, якія патрабуюцца для вытворчасці тавараў, неабходных для жыцця: хлеб, напрыклад, больш танны тавар там, дзе адзін чалавек можа забяспечыць ім дзесяцёх, чым там, дзе адзін можа вырошчваць яго толькі для пяцёх"[1].

Аднак Пэты таксама не заўсёды зусім дакладна фармуляваў закон працоўнае вартасці, бо крыху раней у тым самым творы мы чытаем:

"Усё павінна ацэньвацца на падставе двух натуральных чыннікаў: зямлі і працы. Напрыклад, мы павінны казаць, што карабель ці каптан каштуюць тую ці іншую меру зямлі або тую ці іншую меру працы, і мець на ўвазе, што караблі і вопратка — прадукты зямлі і затрачанай людское працы"[2].

Каб спалучыць гэтае сцверджанне з тым, што мы цытавалі папярэдне, аўтар намагаецца паказаць, што пэўная колькасць зямлі можа адпавядаць пэўнай колькасці працы на падставе звычайнага кошту зямлі[3], аднак гэтая спроба выглядае непераканаўча.

Калі праз некалькі гадоў Лок паспрабаваў апраўдаць прыватную ўласнасць, ён звярнуўся да тэзіса Пэты.

"Факт, што права ўласнасці, заснаванае на працы, — пісаў ён, — лепшае за сістэму супольнага валодання зямлёй, не такі ўжо і спрэчны, як здаецца на першы погляд, бо менавіта працаю вызначаецца розніца ў вартасці рэчаў"[4].

Тым не менш філосаф таксама лічыў неабходным вызначыць ролю зямлі ў працэсе стварэння вартасцяў. Узнятай Пэты праблеме (па сутнасці — надуманай) прапануецца развязанне, якое зводзіцца да сцверджання, што частка вартасці дабротаў, якая ствараецца зямлёй, — мізэрная. Ён піша:

"Калі параўнаць розніцу, якая існуе паміж акрам зямлі, засеянай тытунём ці цукрам, і акрам такой жа зямлі, якая засталася супольнай і нічым не засеянай, дык можна заўважыць, што ўдасканальванне вытворчасці стварае пераважную, найбольшую частку вартасці. Я лічу, што, па сціплых падліках, можна сказаць, што 9/10 з усіх карысных для чалаве-

[1] *Твор працытаваны ў OEuvres économiques de Sir William Petty, trad. franç., Paris, 1905, p.107. Вядома, што яшчэ Арыстотэль разглядаў магчымасць тлумачэння вартасці праз працу, але не здолеў дакладна абгрунтаваць гэтае палажэнне. У XIV ст. арабскі філосаф Ібн Халдун таксама вядзе гаворку пра працу як крыніцу вартасці рэчаў, але й яго аналізу бракуе дакладнасці: гл. Les textes économiques de la Mouqaddima, traduits par G.H.Bousquet, Paris, 1962.*

[2] *OEuvres économiques, op. cit., p.43.*

[3] *Ibid., p.44.*

[4] *Другі трактат аб кіраванні, in Two treatises of government, édition critique, Cambridge, 1960, p.314.*

чага жыцця тавараў — гэта вынікі працы. Больш таго, калі б мы захацелі дакладна ацаніць гатовыя вырабы і падлічыць выкліканыя іх вытворчасцю выдаткі, звязаныя з прыродай, і тыя, якія паходзяць ад працы, дык мы заўважылі б, што ў бальшыні з гэтых рэчаў 99/100 выдаткаў ідуць на рахунак працы"[1].

З гэтага вынікае, робіць выснову філосаф, што практычна вартасць тавараў спараджаецца працай, а *таксама* вартасцю зямлі.

"Менавіта праца, — даводзіў ён, — надае зямлі найбольшую частку яе вартасці, без працы зямля бадай што нічога не каштавала б"[2].

Лок зрабіў яшчэ адзін значны ўнёсак у стварэнне эканамічнае навукі дзякуючы даследванням, якія ён здзейсніў у 1691 г. у сваіх "Разважаннях аб змяншэнні нормы працэнта і павелічэнні вартасці грошай". З мэтай абароны ідэі пра існаванне ў крэдытных аперацыях "натуральнай нормы працэнта", якую немагчыма змяніць нават з дапамогаю закону, філосаф робіць вельмі дэталёвы аналіз рынкавага ўтварэння коштаў у залежнасці ад попыту і прапановы[3].

§ 3. Лібералізм Бўагійбэра

Каб запанавала ідэя пра тое, што эканамічным жыццём кіруюць натуральныя механізмы, трэба было адмовіцца ад меркантылісцкіх поглядаў, паводле якіх дзеля забеспячэння ўзбагачэння нацыі неабходна было няспыннае ўмяшанне дзяржавы; а яшчэ трэба было абгрунтаваць тэзіс, што свабода гандлю — неабходная і дастатковая ўмова эканамічнага ладу.

Адыход ад меркантылізму выразна акрэслены ў кнізе "*Разважанні пра гандаль*", выдадзенай у 1691 г. у Лондане ангельскім шляхцічам сэрам Дадлі Нортам, які спачатку займаўся гандлем з Турэччынай, а пасля займаў высокія дзяржаўныя пасады і быў мэрам Лондана.

У прадмове да гэтых "*Разважанняў*" ёсць радкі, дзе яскрава прасочваецца ўплыў картэзіянства на развіццё тагачаснае эканамічнае думкі.

"Я падкрэсліваю, — пісаў аўтар, — што ў гэтым творы гандаль трактуецца не такім чынам, як звычайна, а з філасофскага гледзішча... Гэты метад разважанняў нарадзіўся разам з новай філасофіяй. Ранейшая філасофія больш займалася абстракцыямі, чым рэчаіснасцю; ёю карысталіся для вылучэння гіпотэзаў, для вынаходніцтва няўстойлівых і

[1] *Ibid.*

[2] *Ibid., p.316.*

[3] *З гэтай нагоды, дарэчы, Лок, здаецца, руйнуе сваю ўласную тэорыю працоўнай вартасці, бо тут ён спалучае вартасць з карыснасцю і рэдкаснасцю рэчаў.*

пазбаўленых сэнсу прынцыпаў, такіх, як просты ці крывы ўздым атамаў у вакууме, форма і матэрыя, адсутнасць, устойлівыя арбіты, страх пустэчы і шмат іншых, якія нічога не прасвятляюць; але са з'яўленнем бліскучых разважанняў Дэкарта "*Пра метад*", настолькі хвалёных і прызнаных у нашыя дні, усе гэтыя хімеры хутка зніклі і быллём параслі.

І ў выніку адбылося так, што веды ў значнай ступені сталі механічнымі, — слова, якое мне не трэба тлумачыць па-іншаму, апрача як кажучы, што гэтыя веды заснаваныя на бясспрэчных ісцінах..."[1]

Крыху далей у той жа прадмове вылучаны шэраг тэзісаў, якія, на думку аўтара, уяўляюць нешта накшталт маніфеста новае дысцыпліны, што паўстае з дастасавання картэзіянскага метаду да пытання гандлю.

Многія з гэтых тэзісаў самым катэгарычным чынам супярэчаць меркантылісцкім падыходам. У прыватнасці, аўтар піша:

"З гледзішча гандлю ўвесь свет — адзіная нацыя, ці адзіны народ, унутры якога асобныя народы — гэта, сваім чынам, прыватныя асобы...

Грошы, экспартаваныя праз гандаль, забяспечваюць багацце нацыі[2].

Усялякі захад на карысць гандлю, дзе адзін інтарэс сутыкаецца з іншым, — гэта злоўжыванне, і ён таксама памяншае прыбыткі насельніцтва"[3].

Дарэчы, варта адзначыць наступную фразу, якая сцвярджае прынцып новай эканамічнай навукі:

"Фіксаванне коштаў у гандлі ніякім чынам не ўваходзіць у кампетэнцыю закону, бо ровень коштаў павінны фіксавацца і фіксуецца сам па сабе"[4].

"*Постскрыптум*" напрыканцы твора паўтарыў тыя сама антымеркантылісцкія і ліберальныя сцверджанні.

"Калі нейкая нацыя, — пісаў Норт, — зрабілася багатай, дык золата, срэбра, каштоўнасці і ўсялякая іншая карысная і пажаданая рэч... — усё прысутнічае ў вялікай колькасці"[5].

"Аніякі народ дагэтуль не зрабіўся багаты дзякуючы ўмяшанню дзяржавы, аднак менавіта мір, прамысловасць і свабода, і нішто іншае, забяспечваюць гандаль і багацце"[6].

[1] *Discourses upon trade, London, 1961, nouv, éd. in A select collection of early english tracts on commerce, édité par J.R.McCulloch, London, 1856; réimpressions 1952 et 1954, pp.510-511.*

[2] *Ibid., p.513.*

[3] *Ibid., p.514.*

[4] *Ibid., p.513.*

[5] *Ibid., p.537.*

[6] *Ibid., p.540.*

Больш яскравага фармулявання новай эканамічнай дактрыны не знойдзеш. Аднак самі па сабе "*Разважанні*" кароткія і не змяшчаюць дужа глыбокага аналізу. Ангельскі шляхціч, прадвеснік палітэканоміі, робіць вельмі абмежаваны ўнёсак у яе стварэнне. Крыху пазней у іншых аўтараў можна знайсці нашмат больш важкія даследванні.

Значны ўнёсак у стварэнне эканамічнае навукі быў зроблены напрыканцы XVII ст. творамі французскага суддзі П'ера Лё Пёзана дэ Бўагійбэра, які быў генеральным лейтэнантам[1] Руанскай акругі.

Рэформа надзвычай несправядлівай састарэлай падатковай сістэмы была на той час вельмі актуальнай у Францыі. Менавіта гэтае пытанне хацеў закрануць Бўагійбэр, які выдаў у 1697 г. сваю кнігу "*Інтэнданцкая служба Францыі*". Паколькі твор не меў вялікага поспеху, аўтар у 1707 г. апублікаваў новую кнігу на гэтую тэму "*Абвінавачванне і апраўданне Францыі*". Гэтым разам твор прыцягнуў больш увагі. Пастановай Каралеўскае рады кніга была забароненая[2], а яе аўтар сасланы ў Авернь. Іншыя свае працы Бўагійбэр выдаў у 1712 г. пад назваю "*Палітычны запавет маршала Вобана*"[3]. Сярод іх, у прыватнасці, два важныя для гісторыі эканамічнай думкі творы: "*Трактат аб збожжы*" і "*Дослед аб прыродзе багацця ў, грошай і чыншу*".

Падатковая рэформа, за якую змагаўся Бўагійбэр, у асноўным зводзілася да наступнага: мадыфікацыя здымання "талы" з мэтай адмовіцца ад вызвалення багатых ад падаткаў пры ўвядзенні падатку на даход з маёмасці; нарэшце, скасаванне "помачы" (ускоснага падатку на продаж віна) і мытняў унутры краіны і на яе межах. На што трэба звярнуць асаблівую ўвагу, дык на тое, што аўтар грунтуе ўсе свае доказы на наступных аргументах: спажыванне — гэта крыніца павелічэння багацця; значыць, трэба скасаваць падаткі, якія, паколькі іх плоціць вялікая частка спажыўцоў, абмяжоўваюць попыт на тавары.

---

[1] *У тыя часы лейтэнант — судовая адказная асоба ў Францыі. — Заўвага перакладніка.*

[2] *Месяцам раней таксама была забароненая кніга Вобана "Праект каралеўскае дзесяціны".*

[3] *Апошні памёр у 1707 г., колькі дзён пасля асуджэння яго "Каралеўскае дзесяціны".*

"Такім чынам, каб знайсці прычыны заняпаду Францыі, трэба толькі знайсці прычыну зніжэння спажывання; а такіх прычынаў дзве... спажыванне спынілася, бо яно стала абсалютна забароненае і абсалютна немагчымае. Яно забароненае, бо людзі няўпэўненыя наконт памераў талы... нарэшце, яно стала немагчымым з-за "помачы" і мытняў на межах і нават пасярод каралеўства..."[1]

Бўагійбэр не абмінуў увагаю вонкавы попыт[2], выступіў за свабодны экспарт збожжа, але асабліва падкрэсліў ролю *нутранога* попыту на тавары. З другога боку, адрозна ад меркантылістаў ён лічыў неабходным спачатку забяспечыць пашырэнне попыту на прадукцыю сельскай гаспадаркі, а не на прамысловыя вырабы.

Меркантылісты хацелі развіваць экспарт прамысловых тавараў з мэтай прыцягнення каштоўных металаў у краіну. У той жа час выказваліся за забарону на вываз прадуктаў харчавання першай неабходнасці. Такое стаўленне было прадыктаванае яшчэ й сярэднявечным клопатам аб захаванні ці прыцягненні ў краіну ўсяго неабходнага для існавання.

Бўагійбэр жа, наадварот, шукаў умовы, якія дазволілі б узняць да самага высокага роўню нутраную вытворчасць у каралеўстве, і найперш сельскагаспадарчую вытворчасць. Ён лічыў, што гэтыя ўмовы прывядуць да скасавання перашкодаў для гандлю і да свабоды рынкаў, бо калі рынкі свабодныя, усталёўваецца натуральная раўнавага коштаў, што дазваляе кожнаму вытворцу забяспечыць збыт свайго тавару, і менавіта праз гэта вытворчасць дасягае свайго максімальнага роўню.

У "*Доследзе аб прыродзе багацця*ў, *грошай і чыншу*" Бўагійбэр працягла абгрунтоўвае ідэю, паводле якой усе разнастайныя галіны гаспадаркі асобнай краіны ўзаемазабяспечваюць рынкі збыту сваёй прадукцыі.

"Трэба пагадзіцца з прынцыпам, калі ўсе прафесіі ў пэўнай краіне, якімі б яны ні былі, працуюць адны для другіх і ўзаемападтрымліваюцца не толькі для забеспячэння сваіх патрэбаў, але нават і для забеспячэння свайго існавання.

Кожны набывае ў суседа харч ці які іншы вынік яго працы пры

[1] *Le détail de la France, in Economistes financiers du XVII siècle, Paris, 1843, pp.180-181.*
[2] *Cf. Factum de la France, in Economistes financiers du XVII siècle, op. cit., p.284.*

абавязковай, хоць маўклівай і нявыказанай, умове, а менавіта што той, хто прадае, купіць аналагічную колькасць тавару, выраблена тым, хто купляе, і адбываецца гэта або беспасярэдне, што часам мае месца, або з дапамогаю колазвароту праз шматлікія рукі ці прафесіі; сэнс пры гэтым застаецца той самы"[1].

Гэткае няспыннае стварэнне ўзаемных рынкаў збыту — падмурак усеагульнага росквіту. Каб пачаўся росквіт, неабходна і досыць таго, каб кошты ўсталёўваліся адпаведна са справядлівасцю, г. зн. каб яны прыносілі дастатковы прыбытак усім прадаўцам. Значыць, адзіным сродкам дасягнуць такога выніку — *не замінаць прыродзе*. Калі ж адбываецца ўмяшанне ў рынкавую сістэму, у прыватнасці з мэтай зніжэння коштаў на збожжа замест грашовай дапамогі тым, хто жыве ў нястачы, жабракамі робяцца ўсе.

"Такім чынам, толькі прырода, ці вышэйшая сіла, можа забяспечыць гэтую справядлівасць, ніхто не мае права ўмешвацца ў гэты працэс. Вось як прырода дасягае справядлівасці. Спачатку яна ўводзіць роўную неабходнасць прадаваць і набываць пры любых гандлёвых стасунках, так што толькі імкненне да прыбытку робіцца асновай гандлю як для прадаўца, так і для пакупніка; і менавіта дзякуючы гэтай раўнавазе, ці балансу, і адзін, і другі мусяць прыслухоўвацца да голасу розуму і скарацца такому стану рэчаў...

Парушэнне гэтага закону, які павінен быць святым, — першая і галоўная прычына галечы ў грамадстве.

Раўнавага паміж усімі таварамі — адзіны чыннік усеагульнага дабрабыту — рэзка парушаецца ў выніку невыканання гэтага закону. Можна знайсці каралеўства, дзе поўна ўсялякіх тавараў, тым часам як людзям усяго бракуе, і прычына гэтаму адна: адзін гіне, бо яго лёхі поўныя віна, але яму бракуе рэшты; іншы знаходзіцца ў такім жа становішчы, але са збожжам; нарэшце, усе астатнія, якія жывуць з прамысловасці, таксама гібеюць, не могучы абмяняць вынікі сваёй працы на хлеб ды віно, недахоп якіх зноў жа выракае ўладальнікаў гэтых тавараў на тую самую галечу, бо яны не могуць памяняць частку сваіх тавараў на іншыя неабходныя рэчы, такія, як світка, чаравікі і рэшта.

Калі спытаць кожнага з асобных вытворцаў, якая прычына іх галечы, яны спакойна адкажуць, што не могуць нічога прадаць без стратаў, яны не разумеюць, што трапілі ў драматычнае становішча толькі таму, што яны патрабуюць, каб іншыя трымаліся правілаў, а самі іх не трымаюцца".

Тут ясна сцвярджаецца, што з'яўленне багацця грунтуецца на механізме *ўтварэння нармальных коштаў,* які даз-

[1] *Dissertation sur la nature des richesses, op. cit., p.404.*

валяе ўсім людзям дасягаць сваіх мэтаў незалежна адзін ад другога. Размова больш не ідзе аб адкрыцці таго ці іншага асобнага закону для пэўнай галіны эканомікі, грашовага абарачэння, замежнага гандлю. Размова ідзе пра адкрыццё натуральнага закону, які кіруе ўсёй сукупнасцю сферы вытворчасці і абмену, і калі Бўагійбэр сапраўды першы зразумеў, што такі закон існуе, дык можна з поўным правам лічыць яго заснавальнікам палітэканоміі.

Відавочна, што новая навука сцвярджаецца як адказ на палітыку, якую адстойвалі меркантылісты, і *супраць* іх тэзіса аб першаснай ролі замежнага гандлю як сродку прыцягнення золата і срэбра. Праўда, залішняя катэгарычнасць у крытыцы меркантылізму абмяжоўвае значэнне даследванняў Бўагійбэра.

Ніхто не спрачаецца з тым, што напрыканцы XVII ст. у Францыі вытворчасць магла развівацца пры ўмовах, калі б не было разнастайных перашкодаў для нутранога гандлю, але сцвярджаць, што свабода нутранога гандлю — *дастатковая* ўмова назапашвання багацця пры *капіталістычным ладзе*, азначала адмаўляць відавочны факт, што заваёва замежных рынкаў збыту для мануфактураў была, асабліва пачынаючы з XVI ст., чыннікам узбагачэння развітых краінаў Эўропы.

Не заўважаючы тае вядучае ролі, якую адыграў замежны гандаль ва ўздыме эўрапейскага капіталізму, Бўагійбэр дае вельмі няпоўны эканамічны аналіз крыніцаў росквіту дзяржаваў, але ягоны тэзіс пра ўзаемазалежнасць прафесіяў рыхтуе глебу (а мо й змяшчае) для славутага "закону рынкаў збыту", аўтарства якога прыпісваецца Жану Батысту Сэю, закону, згодна з якім у сістэме, заснаванай на свабодным абмене таварамі, *ніколі* не здарыцца вялікай перавытворчасці.

Бўагійбэр лічыў, што трэба забяспечыць свабоду рынку, каб дазволіць вытворцам цалкам карыстацца выгодамі існавання рынкаў збыту, створаных самімі вытворцамі аднымі для другіх. Гэтым ён раскрывае адзін з асноўных бакоў капіталістычнай эканомікі, у якой сапраўды кошты маюць тэндэнцыю стабілізавацца на роўнях, спрыяльных для ўза-

емных абменаў. Безумоўна, свабодныя кошты ды свабода нутранога гандлю — *адна* з умоваў функцыянавання капіталістычнае сістэмы, але Бўагійбэр памыляецца, калі лічыць, што гэтае ўмовы *дастаткова*, каб, па-першае, забяспечыць уздым капіталістычнае вытворчасці, а па-другое, пазбегнуць перавытворчасці.

§ 4. Межы ўзбагачэння праз гандаль. Рычард Кантыльён

Памылкі Бўагійбэра заўважаць пазней, у працэсе развіцця аналізу капіталістычнае сістэмы. Але на тыя часы ягоныя самыя радыкальныя тэзісы вабілі лепшыя розумы. Меркантылісцкая палітыка ўсё больш і больш рабілася перашкодай эканамічнаму развіццю, а да самое меркантылісцкае дактрыны ставіліся песімістычна, прыкладам творы такога аўтара, як ангельскі банкір Рычард Кантыльён.

Рычард Кантыльён напісаў на французскай мове "Нарыс аб прыродзе гандлю ўвогуле"[1], які быў выдадзены толькі ў 1755 г., тым часам як ягоны аўтар памёр у 1734 г.

Кантыльён пераняў ідэю Пэты, паводле якой вартасць рэчаў паходзіць ад зямлі і працы, аднак калі Пэты ў канчатковым рахунку хацеў вымяраць вартасць праз колькасць затрачанай на вытворчасць працы, дык Кантыльён намагаецца вымяраць вартасць на падставе колькасці выкарыстанай зямлі.

З другога боку, аўтар лічыў, што вартасць грошай і ровень коштаў павінны залежаць толькі ад наяўнасці каштоўных металаў у краіне. Адсюль ён робіць выснову: наяўнасць вялікай колькасці золата і срэбра выгадная для краіны, бо высокія кошты на зямлю і на працу (скарыстаем яго ўласныя словы) чыняць так, што ў міжнародным гандлі "пэўная дзяржава часам атрымлівае тавар коштам у адну дзесяціну зямлі наўзамен тавару, што каштуе паўдзесяціны, а замест выніку працы аднаго чалавека — вынік працы двух"[2].

---

[1] *Nouv. éd., Paris, 1952.*

[2] *Op. cit., p.104.*

Да гэтага аргумента на карысць вялікай колькасці каштоўных металаў дадаецца традыцыйная заўвага пра тое, што самы лёгкі спосаб павялічыць даходы дзяржавы і забяспечыць сябе ўсім неабходным на выпадак вайны — мець у краіне вялікую колькасць золата і срэбра.

Выкарыстанне гэткай аргументацыі на карысць меркантылісцкай палітыкі, дарэчы, не перашкаджае Кантыльёну стварыць надзвычай песімістычную тэорыю наконт будучыні народаў, якія ўзбагаціліся праз гандаль з замежжам.

"Паколькі развіццё гэтага гандлю, — пісаў ён, — паступова выклікае наяўнасць вялікай колькасці грошай і пакрыху павялічвае спажыванне, а таксама таму, што для задавальнення попыту належыць прывозіць шмат тавараў з-за мяжы, на іх набыццё расходуюць частку гадавога бюджэту. З другога боку, звычайнае спажыванне павялічвае кошт працы рабочых, таму няспынна растуць цэны на прамысловыя вырабы; іншыя замежныя краіны адначасова імкнуцца стварыць у сябе такія ж галіны вытворчасці і такія ж мануфактуры, і ў выніку яны перастаюць набываць тавары з дзяржавы, якую мы разглядаем. І хоць напачатку гэтыя новаўтвораныя прадпрыемствы і мануфактуры недасканалыя, яны, аднак, стрымліваюць і нават цалкам спыняюць экспарт з суседняй краіны, бо ўласныя вырабы больш танныя.

Менавіта такім чынам дзяржава пачынае страчваць некаторыя прыбытковыя галіны свайго гандлю.

Больш таго, калі якой дзяржаве ўдаецца захаваць раўнавагу гандлёвага балансу пры вельмі вялікай грашовай масе, можна з усёй верагоднасцю сцвярджаць, што пры наяўнасці вялікіх грашовых сродкаў існуюць таксама багатыры, якія купаюцца ў раскошы. Яны будуць набываць за мяжой карціны і каштоўнасці, хадзіць у заморскіх шаўках і глядзець на заморскія цуда-дзівы, а праз гэта яны настолькі прызвычайваюць дзяржаву да раскошы, што, нягледзячы на выгоды свайго гандлю, яна будзе штогод пераводзіць за мяжу шмат грошай, каб аплочваць гэтую самую раскошу: у выніку паступова будзе адбывацца збядненне дзяржавы і яна ператворыцца з магутнай у кволую.

Калі ж нейкая дзяржава дасягае найвышэйшага пункту свайго багацця (а я лічу, што параўнальнае багацце дзяржаваў у асноўным палягае ў пэўнай колькасці грошай, якімі яны валодаюць), дык яна абавязкова зноў збяднее, бо так свет ідзе. Занадта вялікая колькасць грошай забяспечвае, калі яна застаецца ў дзяржаве надоўга, магутнасць дзяржаваў, але яна ж можа непрыкметна, але натуральна адкінуць дзяржаву ў галечу"[1].

[1] *Ibid., pp.101 et 102. Гэткая ж аргументацыя будзе прысутнічаць у творы Джэймза Ст'юарта 1767 г. "An inguiry into the principles of Political Economy (французскі пераклад, Paris, 1789, пад назовам "Recherches des principes de l'économie politique"). "Чым больш багаты нейкі народ, чым больш ён схільны да раскошы, тым*

На прыкладзе гэтага аналізу відавочна, як быў страчаны давер да тэзіса меркантылісцкага вучэння аб магчымасці бясконцага ўзбагачэння дзяржавы праз замежны гандаль. З іншага боку, у творы Кантыльёна прысутнічае тэзіс аб важнай ролі зямельных уласнікаў і аналіз іх ролі ў эканамічным жыцці, што наўпрост паўплывае на творчасць Кенэ. Але, вядома, Кенэ, які ўзяў з твораў ангельскага банкіра тое, што яму здавалася слушным, будзе імкнуцца пазбегнуць песімізму высноваў Кантыльёна.

§ 5. Паміж меркантылізмам і лібералізмам: Тэзісы Дэйвіда Х'юма

У 1752 г. Дэйвід Х'юм, які сёння лічыцца самым вялікім ангельскім філосафам свайго часу, апублікаваў "Палітычныя разважанні", у якіх, у прыватнасці, змяшчаліся восем кароткіх нарысаў па эканамічных пытаннях[1]. Нарысы маюць велізарнае значэнне, бо надта паўплывалі на Эдама Сміта, сябра Х'юма, але таксама і з прычыны зместу. У іх развівалася сапраўдная крытыка меркантылізму, але ў той жа час аўтар здолеў вылучыць лепей, чым магчыма, хто іншы да нашых дзён, усё, што было слушнага ў меркантылісцкіх тэзісах.

У сваіх філасофскіх трактатах Х'юм закрануў пытанне ўласнасці. Вяртаючыся да поўнага эмпірызму Гобса, ён не згаджаўся разглядаць уласнасць як "натуральнае права". Тым не менш Х'юм не нашмат адышоў ад Лока, калі сцвярджаў, што ўласнасць замацавалася, бо яна натуральным чынам паходзіць ад асацыяцыі ідэяў.

больш дабрадзейным робіцца ягоны лад жыцця... непазбежным наступствам росту нутраных коштаў стане тое, што іншыя народы, якія да гэтага спажывалі нашы вырабы, будуць адчуваць імклівы рост коштаў на нашы тавары і пачнуць вырабляць самі тое, што імпартавалі... Так адбываецца новы паварот, гандаль спыняецца: што ж тады будзе з працоўнай сілай, занятай на задавальненні попыту замежжа?" (Op. cit., t.I, pp.389 et 391). "Такім чынам, гандаль прыйдзе да заняпаду там, дзе ён быў у самым росквіце, і будзе перанесены ў іншую краіну; менавіта гэта я называю канкурэнцыяй паміж нацыямі" (ibid., p.434). Дарэчы, Ст'юарт развівае аналіз утварэння коштаў у залежнасці ад выдаткаў працы і ад кошту ўтрымання працоўнае сілы (cf. même ouvrage, I, pp.334-336).

[1] Дзевятае эсэ, пра "Камерцыйную зайздрасць", было выдадзенае ў 1758 г. Гл. J.A.Schatz, L'oeuvre économique de David Hume, Paris, 1902, p.123, n.2.

"Калі пэўны чалавек, — пісаў ён, — з вялікай цяжкасцю апрацоўвае нейкую рэч, якая да гэтага нікому не належала... змены, якія ён ажыццяўляе, ствараюць сувязь паміж ім і гэтаю рэччу, а таксама натуральным чынам вядуць нас да спалучэння гэтае рэчы з чалавекам з дапамогаю новае сувязі, якая называецца ўласнасцю"[1].

Такім чынам, першы падмурак уласнасці (гэтаксама лічыў і Лок) — праца. Але якім чынам тады апраўдаць несправядлівасць сучаснага Х'юму падзелу ўласнасці? Дзеля развязання гэтае праблемы Х'юм больш не спрабаваў звяртацца да тэзіса пра ўзаемную згоду людзей, а абапіраўся на прынцып карыснасці.

Гэты прынцып, дарэчы, у Х'юма распрацаваны лепей, чым у Лока, бо ён прызнаваў, што нейкая рэч мае неаднолькавую карыснаць для розных індывідаў. Але тым не менш ён сцвярджаў, што эгалітарысцкія захады прывялі б да такога вялікага зніжэння вытворчасці (бо знік бы механізм асабістага стымулявання), што ад іх трэба зусім адмовіцца.

"Таксама трэба пагадзіцца з тым, — пісаў Х'юм, — што калі мы адмаўляемся ад гэткай роўнасці, дык мы яшчэ больш пазбаўляем беднага большае радасці, чым тая, што дастаецца багатаму, і часта здараецца, што шмат сем'яў ці нават цэлыя правінцыі церпяць, абы задаволілася дурная пыха аднаго чалавека..."

"Аднак, — працягваў Х'юм, — варта толькі ўвесці як мага болей роўнасці ў сістэму ўласнасці, рознасць паміж рамёствамі, навукамі і прамысловасцю шпарка зруйнуе гэтую роўнасць, калі ж вы спыніце актыўнасць людзей, дык хутка давядзеце грамадства да самай чорнай галечы, і, дзеля таго каб выцягнуць з галечы жменьку людзей, вы павесіце жабрацкую торбу на ўсё грамадства"[2].

Так Х'юм фармулюе дактрыну, якая стане *крэда* эканамістаў-лібералаў XIX і XX стст. Дзякуючы толькі гэтаму Х'юму належыць ганаровае месца ў гісторыі эканамічнае думкі. Усё ж, нам здаецца, праніклівасць яго розуму найбольш выяўляецца ў нарысах, якія ён прысвяціў выключна эканамічным пытанням.

У першым з іх, названым "*Аб гандлі*", змяшчаецца грун-

[1] *Даследванні прынцыпаў маралі, 1751, in OEuvres philosophiques, trad. franç., 1788, t.V, p.274, cité par A.Schatz, L'oeuvre économique de Dabid Hume, Paris, 1902, p.116.*
[2] *Ibid., t.V, pp.62-63, cité par Schatz, op. cit., pp.106-107.*

тоўны аналіз ролі замежнага гандлю ў эканамічным развіцці нацыяў.

Спачатку Х'юм крытыкуе цэнтральны тэзіс меркантылістаў аб спалучэнні прыватнага і дзяржаўнага капіталу і паказвае, што багаты клас купцоў і ўладальнікаў мануфактураў паглынае рэсурсы, якія маглі б быць выкарыстаныя для павелічэння магутнасці дзяржавы.

"Дзяржава, — піша ён, — будзе больш магутная тады, калі яна выкарыстае на сваёй службе ўвесь лішак працоўных рук. Выгады прыватных асобаў, наадварот, патрабуюць, каб гэтыя рукі выкарыстоўваліся на іх карысць. Такім чынам, дзяржава можа мацнець толькі за кошт прыватных асобаў"[1].

Але гэткі аналіз не прыводзіць Х'юма да пажадання, каб зніклі гандаль і мануфактуры, а прымушае аўтара даследваць, якой была сапраўдная роля вялікага гандлю ва ўзнікненні і развіцці заходнеэўрапейскіх нацыяў. Меркантылісты не аналізавалі ролю гандлю для нацыяў, ды й да нашых дзён нямногія эканамісты прызналі гэты бок значэння гандлю. Х'юм жа падкрэслівае гэтую ролю ў наступных радках:

"Гэткія ж разважанні пакажуць нам выгоднасць гандлю з замежжам як з гледзішча павелічэння магутнасці дзяржавы, так і з гледзішча багацця і дабрабыту падданых. Дзякуючы гандлю жыхары дзяржавы працуюць больш, і манарх можа накіроўваць частку іх, паводле неабходнасці, на службу дзяржаве. Праз імпарт гандаль з замежжам забяспечвае сыравінаю новастварэныя мануфактуры, а праз экспарт ён спрычыняецца да працы, што патрабуецца, каб зрабіць пэўныя тавары, якія не могуць быць спажытыя ў самой краіне. Карацей, каралеўства, якое шмат імпартуе і экспартуе, павінна мець больш галінаў прамысловасці, і асабліва прамысловасці па вытворчасці рэчаў далікатных і раскошных, чым у каралеўстве, якое спажывае толькі тавары ўласнае вытворчасці. А значыць, першае каралеўства будзе больш магутнае, а таксама багацейшае і шчаслівейшае. У той ступені, у якой тавары адпавядаюць густам і жаданням пакупнікоў, іх вытворцы атрымліваюць прыбытак. Дзяржава таксама мае свой інтарэс: бо вышэйапісаным чынам ствараецца рэзерв працы для дзяржаўных патрэбаў; або яшчэ й таму, што вялікая колькасць працаўнікоў, якія могуць быць выкарыстаныя на службе дзяржаве, маюць сродкі на існаванне, і дзяржава пры гэтым нічога не траціць.

Калі звернемся да гісторыі, мы ўбачым, што ў бальшыні дзяржаваў гандаль з замежжам папярэднічаў усялякаму развіццю мануфактураў і

[1] *David Hume, Writings on economics, nouv. éd. Madison (U.S.A.), 1955, pp.6-7.*

стварэнню нацыянальнага багацця. Вельмі спакусліва было б выкарыстоўваць іншаземныя гатовыя тавары, новыя для нас, і не паляпшаць пэўных нацыянальных тавараў, бо апошняе заўсёды вымагае часу і не дае пацешыцца з прывабнасці новага. Таксама ёсць магчымасць атрымаць вялікі прыбытак праз экспарт таго, чаго ў краіне больш чым дастаткова і што за мяжою, там, дзе зямля і клімат не спрыяюць атрыманню такой прадукцыі, каштуе шмат. А яшчэ людзі прызвычайваюцца да раскошы і да *прыбыткаў* ад гандлю, і калі іх *пачуцці* і іх *прадпрымальнасць* абудзяцца, яны будуць развіваць усе галіны нутранога і замежнага гандлю. Вось, магчыма, асноўная выгада ад гандлю з замежжам; ён пазбаўляе людзей абыякавасці, і, асыпаючы самую кемную і самую заможную частку грамадства раскошаю, пра якую яна ніколі раней і не марыла, гандаль з замежжам спараджае сярод гэтых людзей прагу да больш шыкоўнага ладу жыцця, чым той, якім жылі іхныя продкі. І ў той жа час гэтая жменька купцоў, якія валодаюць сакрэтам гэткага экспарту і імпарту, атрымліваюць вялікія прыбыткі; яны канкурыруюць у багацці са старой шляхтай і тым самым заахвочваюць іншых смельчакоў канкурыраваць з імі ў гандлі. Дзякуючы гэткаму перайманню гандлёвая дзейнасць хутка распаўсюджваецца, адначасова нацыянальныя мануфактуры імкнуцца зраўняцца з іншаземнымі ў якасці тавараў і даводзяць любы выраб да самага высокага роўню дасканаласці. Сталь і жалеза пад іх працавітымі рукамі робяцца роўнымі золату і рубінам Індыі"[1].

Безумоўна, гэта першы тэкст, дзе мы можам знайсці, прынамсі, першую спробу тлумачэння развіцця капіталістычнай эканомікі праз развіццё замежнага гандлю[2]. Сапраўды, аўтар яскрава паказвае, што замежны гандаль адыгрывае ролю зыходнага стымулятара прамысловай дзейнасці, і далей дадзены штуршок памнажаецца, бо рост прыбыткаў і павелічэнне колькасці працаўнікоў у прамысловасці спараджаюць новы попыт на тавары. Каб скончыць тлумачэнне ролі гандлю, дастаткова было б паказаць, што эканамічнага росту *не* назіраецца, калі адсутнічае гэты першапачатковы стымулятар, бо нутраны попыт не можа *спантанна* павялічвацца, апрача выпадкаў кшталту тых, якія апісаў Бўагійбэр: скарачэнне падаткаў на спажыванне ці скасаванне падаткаў наагул.

Такім чынам, тэкст Х'юма — выдатны ўнёсак у аналіз праблемы эканамічнага росту. Цікава, чаму пазней погляды аўтара не бралі пад увагу? Трэба прызнаць, што сам філо-

[1] *Ibid., pp. 13-14.*

[2] *Да Х'юма ўплыў гандлю на прамысловае развіццё толькі сцвярджаўся, напрыклад, Пэты ў яго Political Anatomy of Ireland (гл. E.A.Johnson, Predecessors of Adam Smith,*

саф даў падставы для крытыкі сваіх тэзісаў. Сапраўды, пасля паказу гістарычнае ролі гандлю аўтар сцвярджаў, што калі грамадства робіцца багатае, яно можа абыходзіцца без гандлю.

"Калі сітуацыя ў эканоміцы, — пісаў Х'юм, — палепшылася так значна, нацыя можа страціць вялікую частку свайго замежнага гандлю і пры гэтым застацца вялікай і магутнай нацыяй. Калі іншаземцы больш не будуць набываць нейкія нашы тавары, мы спынім іх вытворчасць. Замест гэтых тавараў працоўныя зоймуцца ўдасканальваннем іншых тавараў, на якія будзе попыт унутры краіны; ім не будзе бракаваць сыравіны. І гэта будзе да таго часу, пакуль кожны індывід дзяржавы, якая мае багацці, не атрымае столькі рэчаў, колькі пажадае, а самі рэчы не будуць удасканаленыя да такой ступені, якую ён можа пажадаць"[1].

У выніку Х'юм робіць выснову, што замежны гандаль, гэтак патрэбны дзеля стварэння багацця, для багатай нацыі не абавязковы. Бальшыня паслядоўнікаў Х'юма прыгадвала толькі другі тэзіс і забылася на першы. Між тым менавіта першае сцверджанне грунтуецца на важкіх аргументах, тады як другое — неабдуманае, слабасць яго добра бачная сёння. Х'юм кажа, што багатыя заўсёды імкнуцца задавольваць свае патрэбы; значыць, на яго думку, будзе мець месца неабмежаванае павелічэнне попыту ў межах багатае нацыі. Але аўтар не ўлічвае, што багатыя могуць ашчаджаць, што капіталістычная эканоміка развіваецца таму, што *папярэдне забяспечаныя* рынкі збыту выклікаюць укладванне гэтых ашчаджанняў і што тыя, хто ашчаджае, не павялічваюць попыту (яны, наадварот, скарачаюць сваё спажыванне).

Верагодна, другі тэзіс Х'юма накіраваны супраць поглядаў апошніх меркантылістаў, у прыватнасці Кантыльёна, паводле якіх краіна, якая дзякуючы гандлю дасягнула вяршыні сваёй магутнасці, абавязкова павінна скончыць заняпадам. Гэта паказвае, што Х'юм лепей, чым іншыя, разумее ролю замежных рынкаў збыту ў росце капіталістычнай эканомікі. Аднак ён быў яшчэ далёка ад таго, каб прапанаваць адпа-

New York, 1937) ці Кантыльёнам, які пісаў: "Такім чынам, для стварэння мануфактураў трэба не толькі шмат стымулаў і капіталаў, але яшчэ і падтрымка спажывання на пэўным стабільным роўні або ў самой сталіцы, або ў нейкіх замежных краінах..." (Essai sur le commerce, nouvelle édition, Paris, 1952, p.86). Гл. таксама p.93 таго ж твора.

[1] *Ibid., pp.64-65.*

ведны рэчаіснасці аналіз, бо без аніякіх доказаў сцвярджаў, што ад пэўнага моманту замежныя рынкі збыту губляюць сваю вагу. Такім чынам, Х'юм лічыў сябе крытыкам меркантылістаў, хоць здолеў лепей чым хто вылучыць усё, што было слушнага ў вучэнні яго папярэднікаў[1].

Але аналіз, з якім мы пазнаёміліся, не адзіны ўнёсак Х'юма ў стварэнне ліберальнай дактрыны. Адрозна ад Лока і меркантылістаў ён сцвярджаў, што наяўнасць вялікай грашовай масы не прычына зніжэння нормы працэнта. Яна, кажа Х'юм, залежыць ад роўню прыбытковасці гандлю і прамысловасці[2]. Гэты тэзіс у Х'юма запазычаць Сміт і Рыкарда; нам ён таксама здаецца справядлівым. А Кейнс глыбока памыляўся, калі спрабаваў адрадзіць меркантылісцкую тэорыю нормы працэнта.

Нарэшце, Х'юм развівае славутую тэорыю аўтаматычнае раўнавагі гандлёвага балансу, якая стане асноваю лібералізму Рыкарда. З дапамогаю старой ідэі аб тым, што пакупная здольнасць грошай зваротна прапарцыйная памеру грашовае масы, ён атакуе меркантылізм. Х'юм сцвярджаў: вялікая колькасць золата і серабра "абсалютна непатрэбная" дзяржаве, бо гэткая колькасць каштоўных металаў дае на доўгі тэрмін адзін эфект — рост коштаў. Дарэчы, аўтар падкрэсліваў, што калі памяншаецца колькасць наяўных у дзяржаве каштоўных металаў, дык цэны зніжаюцца, а гэта абавязкова павялічвае экспарт дзяржавы, аднаўляе раўнавагу гандлёвага балансу і спыняе вываз металаў[3].

Гэты аналіз меўся канчаткова дыскрэдытаваць меркантылізм, паказаць, што няма сэнсу спрыяць павелічэнню экспарту і стварэнню актыўнага гандлёвага балансу шляхам умяшання дзяржавы[4], але доказы, якія абапіраюцца толькі

---

[1] *Аднак Х'юм заставаўся пад уплывам меркантылізму, бо ў сваім "Нарысе пра падаткі" сцвярджаў, што падаткі да пэўнага роўню спрыяюць эканамічнаму развіццю, бо "абуджаюць прамысловасць".*

[2] *Гл. чацверты нарыс: Аб норме працэнта.*

[3] *Гл. трэці нарыс: Аб грошах. Х'юм прызнае, што прыток каштоўных металаў адразу ж станоўча ўздзейнічае на эканамічны рост, бо адбываецца павелічэнне даходаў асобных індывідаў. І з гэтага гледзішча яго тэорыя значна глыбейшая, чым тэорыя эканамістаў-лібералаў, якія прыйдуць пасля яго.*

[4] *Гл. сёмы нарыс: Аб гандлёвым балансе.*

на колькасную тэорыю грошай, сёння здаюцца неперакананучымі. Філосаф робіць уклад у стварэнне ліберальнага аптымізму, прычым найбольш абстрактнага і самага непрымальнага кірунку гэтага вучэння. Аднак гэты аспект эканамічнае творчасці Х'юма не павінны адахвочваць нас ад вывучэння іншых старонак яго працы.

Бібліяграфія

Існуюць старыя даследванні творчасці Бўагійбэра, якімі можна плённа карыстацца, у прыватнасці

F. Cadet, *Pierre de Boisguillebert*, Paris, 1870.

Аднак толькі нядаўна ягоныя працы атрымалі шырокую вядомасць. Рост цікавасці да аўтара "Падатковай сістэмы Францыі" адлюстраваў з'яўленне шэрагу публікацыяў, асноўныя з якіх:

Pierre de Boisguilbert ou la naissance de l'économie politique, Paris, I.N.E.D., 1966, 2 vol.

Boisguilbert parmi nous, Actes du Colloque international de Rouen (1975), Paris, I.N.E.D., 1989.

G.Faccarello, *Aux origines de l'économie politique libérale : Pierre de Boisguilbert*, Paris, 1986.

Погляды Кантыльёна даследаваныя значна лепей, пра іх шмат працаў:

R.Legrand, *Cantillon, un économiste précurseur des physiocrates*, Paris, 1900 (thèse de doctorat en droit).

W.S.Jevons, *Richard Cantillon and the Nationality of Political Economy*, Contemporary Review, 1881.

Hayek, *Richard Cantillon, sa vie, son oeuvre*, Revue des Sciences économiques, 1936.

H. Higgs, *Richard Cantillon*, Economic Journal, 1891.

— *Cantillon's place in economy*, Quarterly Journal of Economics, 1892.

— *A note on Cantillon*, Economic Journal, 1932.

G.Pirou, *La théorie de la valeur et des prix chez W. Petty et R. Cantillon*, Revue d'Histoire économique et sociale, 1911.

B.Nogaro, *Un grand précurseur, Richard Cantillon, in Mélanges Gonnard*, Paris, 1946.

J.J.Spengler, *Cantillon, First of the moderns*, Journal of Political Economy, 1954.

Пра Х'юма гл.:

D. Deleule, *Hume et la naissance du libéralisme économique*, Paris, 1979.

Нарэшце, карыснымі будуць:

W. Letwin, *The origins of Scientific Economics*. English Economic Thought, 1660—1776, London, 1963.

E. A. J. Johnson, *Predecessors of Adam Smith*, New York, 1937.

W. J. Barber, *British Economic Thought and India*, Oxford, 1975.

R. L. Meek (edit.), *Precursors of Adam Smith*, London, 1973.

H. R. Sewall, *The theory of value before Adam Smith*, New York, 1901, réédition, 1968.

Раздзел III

КЕНЭ І ФІЗІЯКРАТЫ

§ 1. Франсўа Кенэ

Франсўа Кенэ нарадзіўся ў 1694 годзе паблізу Вэрсаля ў сям'і "земляробаў" сярэдняга дастатку, уласнікаў невялікага памеру зямлі.

Здавалася, што яму таксама наканавана было стаць "земляробам", але блізкасць Парыжа дала яму магчымасць атрымаць адукацыю. З 12 да 16 гадоў ён вучыўся сам, хадзіў пешшу да самой сталіцы, каб набыць там творы Плятона, Арыстотэля і Мальбранша. Пасля адмовіўся працаваць на зямлі, вывучаў хірургію, наняў сабе настаўніка ў гэтай галіне, усталяваўся ў Манце, каб мець практыку. Напісаў шэраг медыцынскіх працаў, у прыватнасці аб кровапусканнях і ліхаманках.

Паступіў у 1748 г. на службу да мадам дэ Пампадур, атрымаў пасаду "асабістага лекара караля" і перабраўся ў Вэрсаль. У 1752 г. ён займеў шляхоцкі тытул. Назбіраў грошай і ў 1755 г. набыў маёнтачак у Нівэрнэ: клопат аб гэтай зямлі стаў пунктам адліку ягонае творчасці ў галіне эканомікі.

У 1756 г. пабачыла свет яго першае эканамічнае даследванне — артыкул "Фермеры" ў "*Энцыклапедыі*": артыкул уяўляў хутчэй практычныя нататкі, якія мелі на мэце паказаць перавагу фермерскай гаспадаркі над арандатарствам, а таксама перавагі каня над валом у справе апрацоўкі зямлі; кожнае сцверджанне Кенэ падмацоўвалася шматлікімі лічбамі.

Неўзабаве Кенэ пачаў займацца агульнаэканамічнымі пытаннямі. Пасля з'яўлення ў 1758 г. "*Эканамічнае табліцы*" ён стаў на чале школы "філосафаў-эканамістаў", ці "фізіякратаў". Памёр Кенэ ў 1774 г. у Вэрсалі.

§ 2. Натуральныя правы. Уласнасць

На старонках "*Нарыса пра жывёльную эканоміку*" (1747) Кенэ выклаў свае ідэі пра спазнанне наагул, аб прыродзе

чалавека і асабліва яго "натуральных правах". Яго тэорыя спазнання нагадвае спалучэнне ангельскага сэнсуалізму з дактрынаю Мальбранша.

З аднаго боку, Кенэ сцвярджаў, што ўсе нашыя думкі прыходзяць да нас звонку, праз органы пачуццяў.

"Рэчы, якія мы называем целамі ці матэрыяй, — пісаў ён, — самі натуральна паўстаюць фізічнымі прычынамі ўсіх разнастайных ідэяў, розных сімпатыяў, шчасця, няшчасця, волі, захапленняў, намераў нашай уразлівай істоты..."[1]

Перад намі пазіцыя Гобса. Але далей чытаем:

"Нашы адчуванні пераконваюць нас, што гэтыя самыя адчуванні, усе з'явы і змены, якія адбываюцца ў целе, вытворныя ад першаснае прычыны; менавіта ўплыў гэтае прычыны жывіць усё жывое і стварае ўсё актыўнае, пачуццёвае і інтэлектуальнае"[2].

Апошні тэзіс адпавядае вучэнню П.Мальбранша (1638—1715) аб "выпадковых прычынах", адпаведна з якім усё, што, на нашую думку, выкліканае натуральнымі прычынамі, узапраўды ёсць воля Бога, які скарыстоўвае з "выпадкаў", каб праявіць сваю ўсемагутнасць.

У Мальбранша гэтае вучэнне спалучаецца з пераканнем, што Бог заўсёды абірае самыя простыя шляхі, шляхі, якія чалавечы розум адкрывае, калі зводзіць дачыненні паміж індывідамі да матэматычных разлікаў. Паводле Мальбранша, уся прырода — гэта непарушная і спазнавальная сістэма, створаная Божай воляй. Гэтая канцэпцыя і ёсць асноваю вучэння фізіякратаў.

Здаецца, што гэткая філасофія дазваляе паяднаць навуку і веру. Паколькі Кенэ лічыў, што навука цалкам матэрыялістычная, бо аперыруе паняццямі, карані якіх ляжаць у матэрыі, дык погляды Кенэ — гэта дзіўнае спалучэнне матэрыялізму і спірытуалізму, што можна прасачыць у наступных радках таго ж твора:

"Без веры нашыя практычныя веды недастатковыя для спазнання саміх сябе, для разумення тых асаблівасцяў, што карэнным чынам адрозніваюць чалавека, ці разумную жывёліну, ад усяе іншае жывёлы. Калі аналізаваць толькі відавочнае, здасца, што розум, падпарадкаваны патрэбам цела, мае другарадную ролю ў чалавеку, бо сярод людзей ёсць

[1] *OEuvres, édition Oncken, Paris, 1888, pp.769-770.*
[2] *Ibid., p.789.*

такія, хто больш тупы, больш люты і больш шалёны, чым жывёла; а яшчэ таму, што жывёла праяўляе такую ж разважлівасць, якую мы заўважаем у саміх сябе, і найлепей гэта назіраецца ў паводзінах, звязаных з фізічнай асалодай ці фізічным болем. Вера вучыць нас, што найвышэйшая мудрасць сама ёсць святлом, якое асвятляе кожнага чалавека, хто жыве на гэтым свеце, што чалавек з прычыны сваёй сутнаснай сувязі з розумам узняты на больш высокі ровень спазнання. Гэта й адрознівае яго ад быдла. Чалавек здольны спазнаць, што ёсць дабро і што ёсць ліха, і праз спазнанне гэтага ён з розумам і справядлівасцю можа рэалізоўваць сваю волю"[1].

Можна было б падумаць, што такая прыхільнасць да вучэння аб маральных ідэях, якія можна спазнаць з дапамогаю веры, далёкая ад канцэпцыі палітыкі як "дакладнай" навукі, пабудаванай на матэматыцы і фізіцы. Аднак гэта не так, бо Кенэ дапускае, што існуе, прынамсі, адна галіна людской дзейнасці, якую нельга прылучаць да сферы маралі, — гэта сфера эканамічнае дзейнасці. І сапраўды, тут важныя лічбы, бо рэчы, што бяруць удзел у абмене, маюць кошт. Ужо й раней асобныя аўтары, такія, як ангелец Уільям Пэты, спрабавалі стварыць "*Палітычную арытметыку*"[2]. Здаецца, магчымасць выкарыстаць падлік мусіла схіліць Кенэ да разумення эканамічнае навукі як прыродазнаўчае дысцыпліны. З "Нарыса пра жывёльную эканоміку" відавочна, што ў ім глыбока ўкаранілася жаданне не звязваць мараль з навукаю пра чалавека. Гэта выяўляецца ў разважаннях, прысвечаных пытанню натуральных правоў.

Кенэ адрозна ад Гобса і Лока не вылучае канцэпцыяў наконт таго, у якім стане знаходзіўся чалавек да стварэння грамадства. Ён успрымае чалавека такім, якім бачыць, і канстатуе, што трэба, каб людзі шанавалі чужое жыццё і чужую маёмасць, калі мы хочам, каб рэалізоўваліся здольнасці, закладзеныя ў чалавека прыродаю. Гэта і ёсць падмурак натуральных правоў, якія не маюць нічога супольнага з мараллю.

"Я разумею, што натуральныя правы, — пісаў Кенэ, — гэта правы, якімі нас надзяліла прырода, напрыклад права на святло, якое маюць усе людзі, бо прырода надзяліла іх вачыма"[3].

[1] *Ibid., p.793.*

[2] *Гл. Les OEuvres économiques de Sir William Petty, trad. franç., Paris, 1905.*

[3] *OEuvres de Quesnay, op. cit., p.754.*

Такім чынам, натуральнае права — гэта права атрымліваць задавальненне ад жыцця і рэалізоўваць свае здольнасці, а таксама гэта права ўласнасці. У 1747 г. Кенэ абгрунтоўвае гэтае права ідэяй, што ўмова захавання чалавечага жыцця — гэта падзел уласнасці. Хоць слова "праца" не гучыць, аднак бачна, што аўтар пераймае ідэю Лока: без права ўласнасці зямля заставалася б неапрацаваная.

"Кожны чалавек мае правы на ўсё; але парадак вымагае, каб кожны індывід адмовіўся ад сваіх агульных і няпэўных правоў, бо ягоныя правы абмяжоўвае сама прырода тым, што чалавеку дзеля самазахавання неабходная пэўная колькасць дабротаў... Значыць, трэба, каб людзі або жылі накшталт жывёлы і штодзённа рвалі па шматку, неабходнаму для існавання, або ажыццявілі такі падзел, які забяспечыў бы кожнаму пэўную частку ўласнасці"[1].

Прыкладна праз 20 гадоў, у 1765 г., калі Кенэ апублікаваў у "*Часопісе сельскай гаспадаркі, гандлю і фінансаў*" сваё даследванне аб "Натуральным праве", ён паўтарыў гэткае апраўданне ўласнасці, па сутнасці развіў ідэю, што асновай права на ўласнасць ёсць праца.

"Натуральнае права кожнага чалавека ў сапраўднасці зводзіцца да той долі, якую ён можа забяспечыць сабе праз працу"[2].

Здаецца, такая логіка павінна прывесці нас да высновы пра абмежаванне права на ўласнасць, аднак Кенэ ў імя захавання натуральнага ладу рашуча выступае за беспярэчнае ўзаконьванне няроўнасці багаццяў.

"Тысячы натуральных прычынаў непазбежна і абавязкова выклікаюць такую няроўнасць; гэтыя прычыны ніяк не звязаныя з мараллю; яны належаць да значна больш абагульненай сістэмы... яны прычыняюцца да захавання адзінага цэлага, іхны ўплыў накіроўваецца вышэйшым розумам, які стварыў Сусвет... Людзі самі ў значнай ступені спрыяюць існаванню няроўнасці... людзі зусім не абавязаныя выпраўляць чужыя памылкі, асабліва тыя, якія мы робім, бо дрэнна карыстаемся сваёй свабодаю... Улада пераследуе тых, хто ўчыняе замах на нашу маёмасць, свабоду ці жыццё; але яна не можа, не парушаючы парадку ў грамадстве і не заахвочваючы бязладдзя сярод людзей, якія праз свае благія паводзіны трапляюць у галечу, выпраўляць недарэчнасці, што ўзнікаюць заўсёды пры размеркаванні дабротаў"[3].

Радкі датуюцца 1747 годам. Але ў 1765 г. Кенэ паўтарае

[1] *Ibid., p.755.*
[2] *Ibid., p.366.* [3] *Ibid., pp.757-758.*

тое самае сцверджанне, гэтым разам ён прапануе ідэю, што людзі мусілі пакінуць натуральны стан рэчаў, у якім уласнасць абмяжоўвалася вынікамі працы, каб перайсці да грамадскага стану без аніякіх абмежаванняў уласнасці.

"Але пры разглядзе фізічных і інтэлектуальных здольнасцяў кожнага асобнага чалавека мы таксама заўважым вялікую няроўнасць у тым, што датычыць надзеленасці натуральнымі правамі. Гэтая няроўнасць не грунтуецца ні на справядлівасці, ні на несправядлівасці; яна вынікае з законаў прыроды; людзі няздольныя спазнаць намеры Найвышэйшай істоты ў стварэнні Сусвету, яны не могуць узняцца да спасціжэння прызначэння непарушных правілаў, усталяваных Найвышэйшай істотай дзеля захавання свайго тварэння. Між тым, калі ўважліва вывучыць гэтыя правілы, дык можна заўважыць, што фізічныя прычыны фізічнага ліха таксама ёсць прычыны фізічнага дабра; напрыклад, дождж, нязручны для вандроўніка, жывіць зямлю; а калі бесстаронна падлічыць, дык атрымаецца, што гэтыя прычыны выклікаюць бясконца больш добрага, чым дрэннага, і што яны пасланыя толькі для дабра..."[1]

§ 3. Крытыка меркантылізму. Першыя эканамічныя адкрыцці

Мы бачылі, што Кенэ надта цікавіўся сельскагаспадарчымі праблемамі. Артыкул "Збожжа" ў "Энцыклапедыі" (1757) ужо прапанаваў нам "Правілы эканамічнага кіравання". Аўтар падзяляў погляды Бўагійбэра і, бясспрэчна, выкарыстоўваў ідэі Кантыльёна, але пратэстуе супраць недастатковай увагі да праблемаў сельскай гаспадаркі, засяроджвання на развіцці прамысловасці і гандлю з замежжам, палітыкі, якая, у прыватнасці, падрывала кошты на сельскагаспадарчую прадукцыю і забараняла свабоднае абарачэнне збожжа, што прыводзіла да галечы сялянаў і заняпаду вёскі. Ягоная крытыка меркантылізму суправаджалася выкладам дакладных і агульных прынцыпаў пра заканамернасці эканамічных з'яваў, інакш кажучы — навуковых эканамічных законаў.

Першым адкрыццём Кенэ было адкрыццё ролі капіталу ў павелічэнні нацыянальнага даходу. Адкрыццё зробленае ў падрабязным аналізе спосабаў апрацоўкі глебы (1757).

[1] *Ibid., p.368.*

"Як мы ўжо бачылі ў папярэдніх даследваннях, — пісаў вучоны, — выдаткі на 30 мільёнаў дзесяцін зямлі пры дробнатаварнай вытворчасці складаюць толькі 285 мільёнаў; а выдаткі на паспяховую апрацоўку 30 мільёнаў дзесяцін пры буйнатаварнай вытворчасці складуць 710 мільёнаў; але ў першым выпадку будзе атрымана прадукцыі толькі на 390 мільёнаў, а ў другім — на 1378 мільёнаў... Гаспадар малое сядзібы шмат працуе, але, паколькі ён не можа зрабіць неабходных грашовых укладанняў, ягоная праца не дае плёну: ён не ў стане такое здзейсніць, а бязглуздыя гараджане лічаць, што яму не шанцуе, бо ён — гультай"[1].

Тут Кенэ адкрыў каэфіцыент эфектыўнасці працэсу "абарачэння прадукцыі", які робіцца магчымым пры наяўнасці грашовых фондаў, прызначаных на набыццё сродкаў вытворчасці. Такімі сродкамі для яго найперш былі валы і коні, якіх запрагаюць у плуг і якія, апрача таго, забяспечваюць палеткі селяніна гноем. Што асабліва ўражвае Кенэ, дык тое, што зямля, якая лепей апрацоўваецца дзякуючы большаму ўкладанню капіталу, прыносіць свайму ўладальніку большы даход.

Такім чынам, ля вытокаў ягонага адкрыцця факт, што Кенэ сам быў зямельным уласнікам. Аднак гэтая акалічнасць і перашкаджала яму зразумець усю значнасць свайго адкрыцця. Задаволены вынаходкаю практычнага сродку для павелічэння даходаў землеўласнікаў, аўтар наважваецца сцвярджаць, што ў прамысловасці і гандлі не можа быць такіх даходаў, якія прыносіць зямельнае ўладанне:

"Праца ў сельскай гаспадарцы, — пісаў ён, — забяспечвае пакрыццё выдаткаў, аплату працоўнае сілы, прыносіць прыбыткі земляробам і, больш таго, яна стварае даход ад нерухомасці. Тыя, хто набывае прамысловыя вырабы, аплочваюць выдаткі вытворчасці, працоўную сілу і прыбыткі купцоў; але прамысловасць прыбытку не дае"[2].

Такім чынам, прамысловасць і гандаль, паводле Кенэ, "бясплённыя". З тае пары ўсялякае даследванне вучонага будзе сапсаванае гэтаю памылкай. Прычына памылкі ў тым, што ён не здолеў убачыць, што даход землеўладальніка — гэта адлічэнне з прыбытку фермера-арандатара і што ў прамысловасці, як і ў сельскай гаспадарцы, існуе прыбытак.

[1] *OEuvres, op. cit., p.243.*
[2] *Ibid., p.233.*

Трэба адзначыць, што ў часы Кенэ, калі прамысловасць мела пераважна рамесны характар, прыбытак ад прамысловай дзейнасці часта быў нязначны і яго блыталі з даходам ад працы рамесніка. Больш таго, можна зразумець, чаму ідэя пра бясплённасць прамысловасці і гандлю падабалася Кенэ: яна стала аргументам для крытыкі меркантылізму.

Пачынаючы з артыкула "Збожжа", аўтар сцвярджаў, што "багацце нацыі не вызначаецца масай грашовых багацця̆ў"[1] (г. зн. не залежыць ад памераў грашовае масы); што "па гандлёвым балансе нельга даведацца пра выгоднасць гандлю і багацце краіны"[2]; што "калі нейкая нацыя атрымлівае ад сваёй глебы, сваіх людзей і свайго суднаходства найлепшы магчымы прадукт, дык яна ніяк не павінна зайдросціць гандлю сваіх суседзяў"[3]; што, нарэшце, варта было б увесці свабодны гандаль збожжам дзеля таго, каб была магчымасць экспартаваць яго ў гады добрага ўраджаю і заўсёды прадаваць за "добры кошт". Добры кошт павінны забяспечыць фермерам высокі даход, яны змогуць плаціць высокую рэнту землеўладальнікам і самі мець прыбытак. Прыбытак і адлічэнні ў сваю чаргу дазволяць павялічыць памеры капіталу, што ўкладаецца ў сельскую гаспадарку, і тым самым забяспечыць усеагульны росквіт.

Тут таксама разважанні аўтара змяшчаюць як слушныя, так і памылковыя высновы. Кенэ мае рацыю, калі пратэстуе супраць недастатковай увагі да развіцця сельскай гаспадаркі, але Кенэ не бачыць, што неўзабаве менавіта прамысловасць забяспечыць багацце шматлікіх краінаў і што рост гэтага багацця будзе вынікаць з папярэдняга развіцця гандлёвых сувязяў з замежжам.

У артыкуле "Збожжа" значнае адкрыццё суседнічае з фундаментальнаю памылкай, якая пазней будзе прысутнічаць ва ўсіх працах Кенэ і фізіякратаў. Гэта памылка *канцэптуальнага* характару. Кенэ лічыць, што палітычная эканомія вывучае багацці, а багацці — гэта матэрыяльныя рэчы.

[1] *Ibid., p.238.*
[2] *Ibid., p.239.*
[3] *Ibid., p.239.*

Адсюль ідэя, што толькі сельская гаспадарка плённая, бо ў ёй можна прасачыць, як прырода павялічвае матэрыю (гэта значыць насенне, кінутае ў глебу), тым часам як прамысловасць — няплённая галіна. Зразумела, Кенэ не ігнаруе таго факта, што павінна існаваць адрознасць паміж карыснасцю рэчаў, звязанай з іх фізічнымі ўласцівасцямі, і іхнай менавай вартасцю, якая цалкам ствараецца грамадствам. Але ён не выказвае меркавання, што менавая вартасць сапраўды павінна вывучацца палітэканоміяй. Дарэчы, ён амаль не даследваў пытанне вартасці[1].

У тыя ж часы Цюрго, які не ўваходзіў у школу фізіякратаў, хоць і быў блізкі да іх поглядаў, грунтоўна аналізуе паняцце вартасці, па-першае, у сваіх "*Роздумах аб утварэнні і размеркаванні багацця*ў" (1766), а па-другое, у праекце артыкула "*Вартасць і грошы*", які быў напісаны ў 1769 г. Але Цюрго не ўдалося пабудаваць паслядоўную тэорыю па гэтым пытанні.

§ 4. "Эканамічная табліца"

Праз год пасля артыкула "Збожжа", г. зн. у 1758-м, у каралеўскай друкарні быў выдадзены другі нарыс, які ўяўляў сукупнасць лічбаў, спалучаных "зігзагападобнымі" лініямі. Побач, на палях, даваліся кароткія тлумачэнні. Гэта й ёсць "Эканамічная табліца" Кенэ, першая спроба стварыць лічбавы вобраз механізму эканамічнага жыцця пры капіталістычным ладзе.

У каментарах, якія з'явіліся пазней (у прыватнасці, у *"Філасофіі земляробства ці Агульнай і палітычнай эканоміі сельскай гаспадаркі*", напісанай у супрацоўніцтве з маркізам Мірабо і выдадзенай ў 1763 г.), Кенэ падкрэсліваў механістычны і матэматычны характар свайго даследвання эканамічнага жыцця.

---

[1] *Мы ведаем, што праблема вартасці ўздымалася яшчэ да Кенэ, у прыватнасці Пэты, Локам і Кантыльёнам; фізіякраты ж не зрабілі ніякага ўнёску ў вывучэнне гэтага пытання. З усіх фізіякратаў, безумоўна, сама значныя даследванні пытанню вартасці прысвяціў Лё Трон. Ён закрануў гэтую тэму ў 1-м раздзеле сваёй працы "Аб грамадскім інтарэсе" (1777 г.), але задаволіўся простым выкладам асобных, раней прапанаваных, тэорыяў і сваіх ідэяў не вылучаў: тлумачэнне праз карыснасць, выдаткі вытворчасці, рэдкаснасць, канкурэнцыю.*

"*Эканамічная табліца*, — чытаем мы ў прадмове да гэтага твора, — уяўляе сабою першае арытметычнае правіла, вынайдзенае дзеля таго, каб звесці да дакладнага і падрабязнага разліку асноватворную навуку і заўсёднае здзяйсненне словаў спаконвечнага пачатку: "У поце твару твайго будзеш ты есці твой хлеб"[1].

І далей, на пачатку IV раздзела:

"Акт руху заснаваны на дзвюх роўных па сіле і па ўздзеянню процівагах — на разбурэнні і аднаўленні. Такі ёсць механізм прыроды... І менавіта ў выкарыстанні і аднаўленні, г. зн. у спажыванні і вытворчасці, палягае рух, які кансалідуе грамадства і робіць яго жыццяздольным. Выдаткі выклікаюць вытворчасць, а вытворчасць пакрывае выдаткі. Гэткі кругабег мае, як і ў се іншыя, дакладныя правілы прыліву і адліву, якія не даюць каналам перасохнуць ці загаціцца. Вельмі важна ведаць гэтыя правілы, але ведаць не дзеля таго, каб безразважнай рукою ўмешвацца ў сістэму, развіццё якой залежыць выключна ад уласцівых ёй імпульсаў, якія не церпяць ніякага пабочнага ўмяшання, а дзеля таго, каб пазбегнуць парушэння гэтых правілаў; менавіта зараз мы будзем даследваць гэтыя правілы, якія, нягледзячы на сваю важкасць, амаль невядомыя"[2].

Не варта забываць, што Кенэ быў медыкам і картэзіянцам. Ён хоча паказаць, што эканамічнае жыццё функцыянуе, быццам машына ці, *што для яго аднолькава*, жывы арганізм. Менавіта гэтым можна растлумачыць тое, што аўтар ад самага пачатку дэманструе сваю павагу да спантаннага функцыянавання машыны і адмаўляецца ўмешвацца ў яе працу.

А зараз паглядзім саму "Табліцу". Папраўдзе, зразумець яе досыць цяжка, бо ў "Табліцы" разам з важнымі адкрыццямі можна знайсці й грубыя памылкі. Мы будзем разглядаць яе ў той форме, якую вызначыў Кенэ ў даследванні, апублікаваным у 1766 г. у "*Часопісе сельскай гаспадаркі, гандлю і фінансаў*" пад загалоўкам "Аналіз эканамічнае табліцы"[3].

Вялікай заслугай Кенэ было ўсведамленне таго, што каб спасцігнуць сэнс тагачасных эканамічных працэсаў, трэба

---

[1] *Philosophie rurale, Amsterdam, 1763, p.XIX.*

[2] *Ibid., p.36.*

[3] *OEuvres, op. cit., pp.305-329. Для вывучэння асаблівасцяў "Эканамічнае табліцы" можна звярнуцца да H.Woog, The Tableau économique of François Quesnay, Berne 1950, et Jean Molinier, Les métamorphoses d'une théorie économique, le revenu national chez Boisquillebert. et J.-B. Say, Paris, 1958.*

ЭКАНАМІЧНАЯ ТАБЛІЦА

Валавы прадукт: 5 мільярдаў



пачаць з аналізу капіталу, і галоўная праблема для вырашэння — праблема аднаўлення капіталу, які ўкладзены ці "авансаваны" на вытворчасць.

"Штогадовыя авансы" — гэта капітал, якім валодаюць фермеры і рамеснікі на пачатку перыяду і які накіроўваецца на аплату эксплуатацыйных выдаткаў на працягу года. Гэта, такім чынам, выключна абаротны капітал. Рамеснікам грашовы капітал дазваляе набываць сыравіну ў прадукцыйнага класа. У фермераў — гэта запас сродкаў існавання, які дазваляе жыць на працягу года ў чаканні наступнага ўраджаю. Фермеры, дарэчы, маюць і фіксаваны (сталы) капітал, складзены з "першапачатковых" авансаў. Увесь сталы капітал, які расходуецца на працягу пэўнага перыяду, можа дасягаць 10 мільярдаў, але гэтая лічба не фігуруе ў таблицы. Нарэшце, уласнікі таксама ўклалі пэўны капітал на ўладкаванне зямлі ("пазямельныя авансы"), але гэты капітал

разглядаецца як сталы, яго "зношванне" не бярэцца пад увагу і ў табліцы яго няма.

На першым радку стаіць таксама графа даходаў зямельных уласнікаў. Гэтыя грошы выплачаныя фермерам-арандатарам, і на пачатку перыяду яны рэзервовыя. Фізіякраты назвалі іх *чыстым прадуктам* (не блытаць з чыстай прадукцыяй, тэрмінам, які выкарыстоўваецца ў сучаснай дзяржаўнай статыстыцы).

Праз размяшчэнне паказніка чыстага прадукту Кенэ ў першым радку табліцы хоча паказаць, што функцыянаванне капіталістычнага механізму за пэўны перыяд залежыць ад вынікаў, атрыманых на працягу папярэдняга перыяду. Такі падыход да выкарыстання даходаў ад уласнасці надалей будзе адкінуты. Прадстаўнікі ўсіх эканамічных школаў, наадварот, будуць лічыць, што прыбыткі кожнага перыяду выкарыстоўваюцца пад час таго перыяду, калі яны былі атрыманыя. Нам здаецца, што канцэпцыя Кенэ, аднак, больш рэалістычная, бо яна брала пад ўвагу тое, што ад атрымання прыбыткаў да іх выкарыстання праходзіць пэўны час.

Дыяганальныя лініі сімвалізуюць рух тавараў, купленых на працягу года прадстаўнікамі адной сацыяльнай катэгорыі ў прадстаўнікоў іншай.

Пэўныя сумы перамяшчаюцца так, як паказваюць тры спалучаныя лініі на схеме. Пад канец кожнай з ліній абазначаныя сумы грошай.

Уласнікі набываюць сельскагаспадарчыя прадукты спажывання на 1 мільярд і вырабы рамеснікаў на тую ж суму.

Рамеснікі набываюць у сялянаў сыравіны на 1 мільярд і прадуктаў харчавання таксама на 1 мільярд.

Сяляне набываюць тавараў рамеснікаў на 1 мільярд.

Трэба адзначыць, што тут Кенэ робіць памылку, бо лічыць, што кошт тавараў, купленых земляробамі ў рамеснікаў, уваходзіць у выдаткі, якія Кенэ называе штогадовымі авансамі. Гэта немагчыма, бо гадавыя авансы расходуюцца не ў грашовай форме і цалкам у межах прадукцыйнага класа, пра што сведчыць сама табліца (выдаткі авансаў — 2 мільярды). Узапраўды пакупкі, пра якія ідзе гаворка, аплочваюцца адным з тых мільярдаў, якія земляробы атрымліва-

юць ад іншых класаў, мільярдам, які яны перадаюць рамеснікам. Такім чынам, трэба перасунуць лінію, што выходзіць з 2 мільярдаў штогадовых авансаў, і правесці яе, напрыклад, ад мільярда, атрыманага ад уласнікаў[1].

Сума "ўсяго" ў левай калонцы — гэта даход ад сельскагаспадарчай вытворчасці за год, які складаецца, па-першае, з 3 мільярдаў прададзенай прадукцыі і, па-другое, з сумы, роўнай суме "расходваных" авансаў.

Сума "ўсяго" ў правай калонцы — гандлёвы абарот рамеснікаў.

На падставе гэтых лічбаў можна прасачыць, якім чынам выкарыстоўваюцца даходы земляробаў і рамеснікаў і якім чынам яны знаходзяць магчымасць працягваць сваю дзейнасць налета (у наступным годзе).

Земляробы адлічваюць 2 мільярды ад сваіх даходаў на аплату даходу (рэнты) зямельных уласнікаў. Яшчэ адзін мільярд іх даходаў ідзе, як называе Кенэ, на "працэнты" за першапачатковыя авансы, гэта значыць на выдаткі, звязаныя з *амартызацыяй* сталага капіталу фермераў, як, дарэчы, гэта і пазначаецца. Гэта той мільярд, які ідзе ў даход рамеснікам.

Трэба меркаваць, што ў "працэнты" ўваходзяць таксама прыбыткі фермераў. Бо іначай чаго б фермеры ўкладалі свой капітал, калі ён не прыносіць прыбытку. Кенэ, аднак, упарта трымаецца памылковай ідэі, адпаведна з якою адзіным сапраўдным прыбыткам ёсць даход зямельных уласнікаў, вось чаму прыбытак фермераў не прысутнічае ў таблі-цы.

Пасля амартызацыі свайго сталага капіталу ў земляробаў застаецца 4 мільярды. З гэтых 4 мільярдаў 2 яны выплочваюць уласнікам зямлі. У выніку ім застаецца таксама 2 мільярды на аднаўленне "штогадовых авансаў".

Што ж да рамеснікаў, дык яны атрымалі 2 мільярды, а аддалі 1. Значыць, ім застаецца 1 мільярд, які таксама забяспечвае аднаўленне штогадовых авансаў.

Можна было б дапоўніць табліцу наступным чынам:

---

[1] *Гэтую папраўку, у прыватнасці, зрабіў вучань Кенэ маркіз дэ Мемон. Гл. Eloge de François Quesnay, par G.H. de Romance, marguis de Mesmon, London, 1775, reproduit in OEuvres de Quesnay, op. cit., pp.73-115.*

	Прадукцыйны клас		Бясплённы клас
Вытворчасць	5 мільярдаў	Агульная сума даходаў	2 мільярды
мінус амартызацыя	1 мільярд	мінус выдаткі на пакупку тавараў у прадукцыйнага класа	1 мільярд
Рэшта	4 мільярды	Рэшта	1 мільярд



Такім чынам, на пачатку наступнага перыяду адбываецца вяртанне да становішча, якое было на пачатку папярэдняга. Эканамічная дзейнасць можа працягвацца.

"Эканамічнай табліцы" моцна шкодзіць памылковае стаўленне да прамысловасці як да непрадукцыйнай (бясплённай) дзейнасці, апрача таго, вельмі цьмяна вызначаецца прыбытак ад капіталу. Нібыта зямельны капітал цалкам знаходзіцца ў руках уласнікаў, быццам бы не ўдзельнічае ў абарачэнні і не дае ніякага даходу. Табліца не ўлічвае прыбытку з сталага капіталу і прыбытку з абаротнага капіталу вытворцаў. І нарэшце, штогадовым авансам рамеснікаў, якія, безумоўна, ёсць капітал, не адпавядае ніякі прыбытак.

Але, нягледзячы на ўсе памылкі і хібы, "Эканамічная табліца" — навуковае даследванне велізарнага значэння. Яна яскрава паказвае, наколькі пры капіталістычным ладзе вытворчасці механізм эканамічнай дзейнасці залежыць ад ініцыятывы трымальнікаў капіталу, якія робяць укладанні і расходуюць прыбыткі.

Гэткае тлумачэнне капіталістычнага грамадства само па сабе безумоўны прагрэс параўнальна з канцэпцыямі Бўагійбэра, які абмяжоўваўся падкрэсліваннем узаемазалежнасці вытворцаў, абумоўленай тым, што спажывецкія выдаткі адных ствараюць даходы іншым. Гэткую ўзаемазалежнасць можна прасачыць і ў "Табліцы" Кенэ, але ў ёй вылучаецца *новая* ідэя: пакупная здольнасць спажыўцоў вынікае з укладання капіталу і атрымання прыбыткаў.

Заробак жа, на думку аўтара, заўсёды забяспечвае рабочага ўсім неабходным для існавання. Калі Маркс пісаў, што пры капіталістычным ладзе капіталіст аплочвае вартасць працоўнае сілы, ён толькі паўтараў ідэю Кенэ, бо апошні вызначыў вартасць працоўнае сілы як вартасць дабротаў, неабходных для аднаўлення гэтае сілы.

Кенэ лічыў цалкам "натуральным", што працаўнікам плоцяць столькі, колькі ім трэба, каб існаваць, і нават меркаваў, што гэта дазваляе пазбегнуць усялякіх праблемаў, звязаных са становішчам працоўных. У прыватнасці, у 1757 г. у артыкуле "Збожжа" Кенэ сцвярджаў, што павелічэнне коштаў на збожжа, да якога ён заклікае з мэтай дасягнення росту даходаў фермераў і землеўласнікаў, не закране дабрабыту рабочых, бо іх заробкі павялічацца прапарцыйна росту коштаў на прадукты першай неабходнасці.

"Заўсёды высокі кошт збожжа, — пісаў ён, — які прыносіць вельмі вялікія даходы дзяржаве, зусім не шкодзіць простым людзям. Чалавек спажывае 3 адзінкі хлеба; калі пры высокіх коштах ён плаціў бы за кожную адзінку хлеба на 4 ліўры даражэй, дык гэтае павелічэнне абышлося б яму штодзённа на 1 су болей; прапарцыйна росту коштаў павялічыўся б і яго заробак; рост кошту ніяк не паўплываў бы на становішча тых, хто набывае хлеб, прытым што высокія кошты на збожжа дазволілі б атрымаць вялікі даход"[1].

Клопат пра павелічэнне даходаў фермераў і землеўласнікаў пераважае ўсе іншыя меркаванні.

"Зрэшты, вельмі блага, — дадае Кенэ, — калі народ прызвычайваецца набываць хлеб за вельмі нізкі кошт; у такім разе народ робіцца менш працавіты, выдаткоўвае на хлеб мала грошай і становіцца лянівым і фанабэрыстым; земляробам[2] робіцца цяжка знайсці парабкаў, таму ўраджайнымі гадамі ім бракуе працаўнікоў"[3].

---

[1] *OEuvres, op. cit., p.248.*

[2] *Фермерам.*

[3] *Ibid., p.248. Трэба адзначыць, што ў іншым творы, "*Правілы эканамічнага кіравання сельскагаспадарчым каралеўствам*", выдадзеным у 1768 г., Кенэ займае дыяметральна процілеглую пазіцыю і крытыкуе "пыхлівых буржуа", якія сцвярджаюць, што сяляне, каб не гультайнічалі, павінны быць бедныя. "Сапраўднаю прычынаю ляноты прыгнечаных сялянаў, — пісаў ён, — ёсць занадта нізкі ровень заробкаў і недахоп працоўных месцаў у краінах, дзе пад націскам гандлю прамысловымі вырабамі знізілася вартасць прадуктаў харчавання і дзе іншыя прычыны зруйнавалі сельскую гаспадарку" (OEuvres, p.354). Гэтыя радкі паказваюць, што часам Кенэ мог узняцца над логікай, уласцівай класу, да якога ён належаў.*

У капіталістычнай эканоміцы ўся эканамічная дзейнасць грунтуецца на выкарыстанні капіталаў, на выдатках, якія робяцца магчымымі дзякуючы капіталам (авансам); усё таксама грунтуецца на тым, што атрымальнікі прыбыткаў (у дадзеным выпадку — зямельныя ўласнікі) выдаткоўваюць іх. З другога боку, дзеля забеспячэння функцыянавання сістэмы трэба, каб продаж прадуктаў дазваляў аднаўляць капіталы, а гэта магчыма толькі тады, калі даходы ад вытворчасці трацяцца належным чынам. Такім чынам, капіталізм грунтуецца на *няспынным абарачэнні капіталу*.

На думку Кенэ, лад эканамічнага жыцця, які цалкам залежыць ад ініцыятывы трымальнікаў капіталу, мае перавагу, бо спрыяе росту авансаў, а значыць, нацыянальнага даходу дзякуючы ашчаджанню часткі даходаў капіталістаў.

У самой "Табліцы" працэс павелічэння нацыянальнага даходу не апісваецца, але Кенэ адзначае, якім чынам можна было б даць гэткае апісанне, абапіраючыся на "Табліцу".

Калі ўласнікі ашчаджаюць частку сваіх даходаў, грошы, якія яны плоцяць рамеснікам, могуць уяўляць сабою не толькі эквівалент кошту спажывецкіх тавараў, але таксама і эквівалент працы па паляпшэнні глебы і сельскагаспадарчых прыладаў.

Фермеры ў сваю чаргу таксама павялічваюць капітал. Той мільярд, які яны плоцяць рамеснікам, можа не толькі пакрываць неабходныя эксплуатацыйныя выдаткі, але й выдаткі на новае абсталяванне. Такім чынам можна дамагацца штогадовага росту вытворчасці.

У выніку няспынны эканамічны прагрэс здаецца гарантаваным дзякуючы неабмежаванаму развіццю прыватнага капіталістычнага ашчаджання. На думку Кенэ, капіталістычны лад вытворчасці — цудоўная машына, якую прырода або Бог дорыць чалавеку дзеля аўтаматычнага дасягнення росквіту і шчасця без удзелу Найвышэйшае сілы.

Гэткая выснова сёння нам здаецца перабольшанаю. Нават калі не браць пад увагу велізарную няроўнасць, якую можа спарадзіць механічнае функцыянаванне эканомікі, трэба сказаць, што Кенэ нідзе не даказаў, што рынкавая стыхія абавязкова гарантуе аднаўленне капіталу. Ён вылучае пас-

тулат аб эканамічнай раўнавазе, тым часам як жыццё неўзабаве засведчыць, што свабоднае абарачэнне капіталу выклікае цяжкія крызісы перавытворчасці. Яшчэ адзін слабы пункт сістэмы Кенэ — няведанне аўтарам умоваў, пры якіх сапраўды адбываецца эканамічны рост. Недастаткова, каб грошы ашчаджаліся, трэба яшчэ, каб яны былі ўкладзеныя ў вытворчасць, рабіліся інвестыцыямі. Навошта капіталіст ажыццяўляе інвестыцыі? Бо ён разлічвае вырабляць больш. Перадусім капіталіст павінны быць упэўнены ў наяўнасці рынкаў збыту для дадатковай прадукцыі, якую ён разлічвае вырабіць.

Кенэ праблемы ў гэтым не бачыць, бо лічыць, што паколькі заўсёды будуць існаваць незадаволеныя патрэбы, дык заўсёды будуць і рынкі збыту. У прыватнасці, гэтую ідэю ён выказвае ў 1766 г. у артыкуле, надрукаваным у "*Часопісе сельскай гаспадаркі, гандлю і фінансаў*", пад назовам "Пра гандаль"[1].

"У дзяржаве, бальшыня грамадзянаў якой не спажываюць столькі, колькі хацелі б, праблемы збыту тавараў не існуе, існуе праблема добрага кошту, а дзеля яго ўтварэння неабходна, каб была свабодная канкурэнцыя ў гандлі"[2].

Гэта памылковае меркаванне. Сцвярджаецца, што тавары могуць быць прададзеныя, калі ёсць людзі, якія маюць у іх *патрэбу*. Але не бярэцца пад увагу, ці могуць гэтыя людзі за іх *заплаціць*[3]. Больш таго, Кенэ не разумее, што ў эканоміцы, заснаванай на свабоднай канкурэнцыі, спажыўцы павінны мець у руках дадатковыя плацежныя сродкі, *перш чым* вырасце вытворчасць, калі мы хочам, каб рост нутранога попыту спрыяў інвестыцыям і пашырэнню вытворчасці. Праз ігнараванне гэтага факта прыходзіцца не браць пад увагу і

[1] *OEuvres, pp.446-494.*

[2] *Ibid., p.485.*

[3] *Аднак яшчэ да Кенэ асобныя аўтары засяроджвалі ўвагу на гэтай праблеме. Ст'юарт, напрыклад, пісаў: "Пакупнік павінны мець менавы эквівалент; і менавіта гэты эквівалент — спружына ўсяго механізму... Беднякі, у якіх ёсць дзеці, маюць попыт, але не маюць грошай, каб яго задаволіць... Але, паколькі гэты попыт* эфектыўны, *бо менавіта ён прымушае земляроба працаваць, каб мець эквівалент сваёй працы, і паколькі попыт павялічваецца з ростам колькасці тых, хто імкнецца атрымаць гэты эквівалент, я лічу, што гэты рост ёсць прычынаю, а сельская гаспадарка — вынікам"... (An inquiry into the principles of political economy, trad. franç., Paris, 1789, t.I, pp.208-209).*

тое, што *папярэдняе* пашырэнне рынкаў збыту ёсць перадумова пашырэння капіталістычнай вытворчасці.

Гэтым тлумачыцца няўвага да замежных рынкаў збыту, якая прысутнічае ў Кенэ:

"Замежны гандаль — гэта *апошні сродак* для дзяржаваў, якім дзеля выгаднага збыту іхнай прадукцыі бракуе нутранога рынку"[1].

Гэтаксама як і Бўагійбэр, Кенэ выпраўляе пэўныя памылкі меркантылізму, але крытыка меркантылізму вядзе яго да большае памылкі, сутнасць якое — няўвага да праблемы рынкаў збыту.

§ 5. Канцэпцыя натуральнага грамадскага парадку

Кенэ не змог бы развіць свае грамадска-філасофскія погляды, калі б за ім стаяла цэлая школа, якая распаўсюджвала яго ідэі ў шэрагу перыядычных выданняў. Ягонае вучэнне выкладзенае ў 1765 г. у артыкуле аб "Натуральным праве" ў "*Часопісе сельскай гаспадаркі, гандлю і фінансаў*". У 1767 г. з'явіўся фундаментальны артыкул "Кітайскі дэспатызм" у часопісе "*Штодзённыя запісы грамадзяніна, ці Каталог разважанняў аб маральных і палітычных навуках*". Ягоныя вучні таксама паспрыялі наданню сінтэтычнага выгляду вучэнню фізіякратаў. У першую чаргу Лё Мерсье дэ Ля Рыўер у працы "*Сутнасны і натуральны парадак палітычных грамадстваў*" (1767) і Дзюпон дэ Нэмур у сваім творы, названым "*Аб з'яўленні і развіцці новае навукі*" (1768).

Нават у нататках самога Кенэ патрабаванне свабоды гандлю абумоўліваецца пэўнымі абмежаваннямі. Аўтар, у прыватнасці, быў прыхільнікам захавання фіксаванай нормы працэнта[2]. Таксама трэба адзначыць, што ў "*Кітайскім дэспатызме*" ёсць раздзел "Скасаванне выключнага права на атрыманне ўласнай выгады"[3], у якой аўтар рэзка крытыкуе манаполію ў гандлі. Трэба заўважыць, што ў тыя часы навукоўцы былі схільныя прызнаваць, што манаполіі — гэта

[1] *OEuvres, p.484.*

[2] *Гл. на гэты конт Henri Woog, The Tableau économique of Francois Ouesnay, Berne, 1950.*

[3] *Chap. VIII, § 2, OEuvres, op. cit., p.655.*

вынік рэгламентацыі і што павелічэнне свабоды прывядзе да іх ліквідацыі.

У творах вучняў Кенэ размова ідзе пра выгады свабоды, прычым не толькі свабоды гандлю, якую лічаць абавязковай умовай развіцця эканомікі, але і свабоды ў галіне сельскай гаспадаркі: калі хочаш атрымаць максімальную колькасць "чыстага прадукту", трэба скасаваць усе сеньёрыяльныя і ўрадавыя павіннасці, якія замінаюць селяніну дзейнічаць паводле ўласнага розуму; земляроб сам добры суддзя ў пытаннях, што болей падыходзіць яго гаспадарцы[1]. Не менш неабходная свабода ў галіне прамысловасці, бо яна забяспечвае зніжэнне кошту прамысловых вырабаў, патрэбных земляробам; нічога не павінна абмяжоўваць гэтую свабоду, нават захады супраць беспрацоўя[2].

Дарэчы, патрабаванне свабоды ўсё часцей набывае ў фізіякратаў выгляд догмы, не менш вартае за павагу да права ўласнасці, прычым першая ёсць вынікам другой. Свабоду абмену, кажа Лё Мерсье дэ Ля Рыўер, блытаюць з правам уласнасці[3]. А Дзюпон дэ Нэмур вядзе гаворку аб "свабодзе працы, непадзельнай ад асабістай уласнасці, складнікам якой гэтая свабода выступае"[4].

Школа фізіякратаў выказваецца супраць фіксавання максімальнай нормы працэнта, супраць усялякага мытнага пратэкцыянізму, нават калі ён спрыяе сельскай гаспадарцы[5], супраць законаў, скіраваных на тое, каб перашкодзіць багатым гнацца за раскошаю. Канешне, кажа Лё Трон, вартае жалю тое, што зямельныя ўласнікі марнуюць усе свае прыбыткі ў гарадах; аднак "усё законна, бо (гэта) вынікае з права ўласнасці, адзінага падмурка грамадстваў"[6]. Прынцып "Laissez-faire, laissez-passer" — "дазваляць, не перашкаджаць", які напачатку грунтаваўся на вывучэнні рэчаіснасці як фізіякратамі, так і яго вынаходнікам інтэндантам Вэн-

[1] *Cf. Weulersse, Le mouvement physiocratique en France, Paris, 1910, t.I, pp.423 et ss.*
[2] *Ibid., p.589.*
[3] *L'ordre naturel et essentiel des sociétés politiques, nouv. éd., Paris, 1910, p.32.*
[4] *Cité par Weulersse, op. cit., t.II, p.17.*
[5] *Ibid., p.24.*
[6] *Ibid., p.28.*

санам дэ Гурнэ, стаў асноўным прынцыпам, які больш не падлягаў дыскусіям.

У канчатковым рахунку ўсе часткі фізіякратычнай сістэмы грунтуюцца на канцэпцыі натуральнага парадку ў грамадстве, якую ідэалізавалі вядомыя вучні Кенэ.

Паслухаем Дзюпона дэ Нэмура:

"Дзеля свайго яднання людзі маюць адну мэту", "сутнасна вызначаную прыродай"; сродкі, неабходныя для дасягнення гэтае мэты, не могуць быць адвольныя, бо "нічога не можа быць адвольным у фізічных дзеяннях, скіраваных на прадвызначаную мэту". "Такім чынам, існуе ўсеагульны і сутнасны натуральны парадак, які закладвае фундаментальныя і асноватворныя законы ўсіх грамадстваў... Існавала натуральнае грамадства, якое папярэднічала ўсялякай дамове паміж людзьмі і якое грунтавалася на іх прыродных уласцівасцях, фізічных патрэбах і, відавочна, на іх агульным інтарэсе"[1].

Эканамічная навука паўстае як шырокая навука пра чалавека, якая, з аднаго боку, дазваляе вызначыць найлепшы палітычны лад, а з другога — гарантуе захаванне маральнасці ў грамадстве.

Аднойчы спадкаемца каралеўскага трона ў Францыі паскардзіўся лекару, што каралеўскія абавязкі выконваць вельмі цяжка. Кенэ ж адказаў, што ён так не лічыць. "А што б вы рабілі, калі былі б каралём?" — закінуў каралевіч. "Вашамосць, — адказаў Кенэ, — я б не рабіў нічога"[2].

Дзюпон дэ Нэмур развівае тую ж думку ў наступных радках:

"Вы ўбачыце, — звяртаецца ён да манархаў, — наколькі простым і лёгкім будзе ажыццяўленне вашых святых абавязкаў, сутнасць якіх — не перашкаджаць дабру, якое дзеецца само па сабе, і караць з дапамогаю судовых установаў невялічкую жменьку людзей, якія паквапяцца на чужую ўласнасць"[3].

На думку гэтых "эканамістаў", фінансавая сістэма павінна быць максімальна спрошчаная і павінны існаваць *толькі адзін падатак*: на даходы ўласнікаў[4]. Нацыянальная бяспека мусіць забяспечвацца выключна найманымі ахвотнікамі, а

---

[1] *De l'origine et des progrès d'une science nouvelle, nouv. éd., Paris, 1910, pp.7 et 11.*

[2] *Cité par Weulersse, op. cit., II, p.41.*

[3] *Ibid., p.41.*

[4] *У "Філасофіі земляробства" Мірабо і Кенэ намагаюцца з дапамогаю "Табліцы" даказаць, што падатак на чысты прадукт больш карысны за іншыя, але іх разважанні*

не праз сістэму паспалітага рушэння ці рэкрутамі, якая замахваецца на свабоду. Паліцыя нораваў і веры павінна быць скасаваная. Органы юстыцыі павінны ўмешвацца толькі на просьбу прыватнай асобы, бо "не варта, каб урад змагаўся з ліхам, на якое ніхто не скардзіцца"[1].

Паколькі ў сістэме фізіякратаў урад нічога не павінны рабіць, зразумела, чаму часта яны абыякава ставяцца да формы, якую мецьме сістэма кіравання. "Якой форме кіравання трэба аддаць перавагу?" — пытаецца Мірабо і адказвае: "Той, якая дазваляе дасягнуць высокага роўню магутнасці і росквіту"[2].

Аднак бальшыня прадстаўнікоў школы фізіякратаў аддае перавагу спадчыннай манархіі, якую не баяцца, нават не зважаючы на класіфікацыю Мантэск'ё, назваць "дэспатызмам" найперш таму, што гэта самая простая форма кіравання: вядома, фізіякраты не адмовіліся б пагадзіцца з наступным выказваннем іх сучасніка Лангэ: "Адзіны Бог, адзіны суверэн, адзіны закон, адзіны падатак, адзіныя захады"[3].

Да таго ж у грамадскім механізме, адзіным рухачом якога ёсць асабісты інтарэс індывідаў, ніякая іншая сістэма не зможа лепей забяспечыць гармонію, чым манархія. Сапраўды, суверэн — гэта суўладальнік усяго набытку сваіх падданых (менавіта таму ён мае права збіраць падаткі); яго асабісты інтарэс атаясамліваецца з інтарэсамі яго падданых; трэба, каб апошнія ўзбагачаліся дзеля багацця самога манарха: гэтую ідэю выказваў яшчэ Гобс. Больш таго, калі ўласнасць, згодна з фізіякратамі, не існуе без індывідуальнасці і спадчыннасці, дык улада павінна быць у руках адзінай асобы і перадавацца ў спадчыну.

Дарэчы, дэспатызм не азначае выдвараў: кароль мусіць дакладна прытрымлівацца патрабаванняў натуральных законаў, якія яму дыктуе "рэчаіснасць". Апрача таго, было б

не надта пераканаўчыя. Яны таксама прыхільнікі спрашчэння *падатковае сістэмы. Дзюпон дэ Нэмур, які быў сакратаром Сходу Натабляў у 1787 г., выступаў супраць Калёна, які хацеў* дадаць *да ўжо дзейных падаткаў яшчэ адзін — тэрытарыяльны.*

[1] *Cité par Weulersse, op. cit., II, p.42.*

[2] *Ibid., p.43.*

[3] *Ibid., p.51.*

карысна, калі б існавала незалежная судовая ўлада[1]; фізіякраты клапоцяцца, каб прынцыпы натуральнага парадку сталі агульнавядомыя; фізіякраты прапануюць шырока развіваць народную адукацыю[2] дзеля таго, каб стварыць "народную рэчаіснасць", здольную накіроўваць манарха.

Не трэба разглядаць манархізм як адыход ад лініі лібералізму, бо гаворка ідзе зусім не пра стварэнне моцнай дзяржавы, наадварот, трэба дазволіць "як мага большае вальнадумства і крытыку" і, галоўнае, забяспечыць поўную свабоду прэсы. "Жаданне даць дзяржаўнай уладзе паўнамоцтвы сачыць за грамадскай думкай азначала б, — пісаў Дзюпон дэ Нэмур, — зруйнаваць парадак і прыняць вынік за прычыну; тым часам як менавіта сутыкненне меркаванняў забяспечвае яе існаванне і паўнамоцтвы"[3]. Ці не казаў сам Кенэ, што "каб займець адну добрую кнігу, трэба, каб з'явілася шмат благіх?"[4]

Але амбіцыі эканамістаў сягаюць далей за фармулёўкі канстытуцыйных прынцыпаў, нават на галіну маралі. Менавіта таму Лё Мерсье дэ Ля Рыўер сцвярджае, што павага да натуральных эканамічных законаў забяспечыць панаванне дабра.

"Такім чынам, мы бачым, — пісаў вучоны, — што менавіта на глебе закону ўласнасці, і ніякага іншага, на глебе спазнання асновы і сутнасці ўсіх законаў, і ніякага іншага, на глебе філасофіі, якой прырода вучыць усіх людзей, і ніякай іншай, утвараецца грамадства, што вонкава вызначаецца максімальнай палітычнай трываласцю, а ўнутры — максімальным росквітам; мы бачым, што паміж намі замацоўваецца ўзаемнасць правоў і абавязкаў, *братэрства*, якое выклікае зацікаўленасць у абароне адных другімі і святая повязь якога ахоплівае і аб'ядноўвае з намі ўсе іншыя народы.

І не трэба клапаціцца ні пра мараль, ні пра норавы; сацыяльна немагчыма, каб яны супярэчылі сваім прынцыпам; сацыяльна немагчыма, каб людзі, якія жывуць па такіх простых законах і якія дасягнулі ведання абсалютнай справядлівасці, пакланяліся парадку, падмуркам якога галоўным чынам ёсць справядлівасць і бясконцыя перавагі якога ім відавочныя, не былі сапраўды самымі дабрадзейнымі людзьмі"[5].

[1] *Ibid., p.62.*
[2] *Ibid., p.65.*
[3] *Ibid., p.67.*
[4] *Ibid., p.67.*
[5] *L'ordre naturel et essentiel des sociétés politiques, op. cit., p.355.*

Аднак крышку далей той самы аўтар сцвярджае, што тое, *якім чынам улады размяркоўваюць грамадскія пашаны і пасады*, адыгрывае вялікую ролю ў выхаванні маралі індывідаў.

"Мы можам з усёй шчырасцю сказаць, — пісаў ён, — што сапраўдным творцам маральнага ў чалавеку на гэтым свеце ёсць грамадская сістэма кіравання... Якімі б ні былі шляхі, па якіх у пэўнай нацыі чалавек можа дасягнуць тытулаў, узнагародаў і грамадскае пашаны, можна быць упэўненым, што жаданне карыстацца імі будзе стымулам, каб займець іх... Паўсюль, дзе багацці зробяцца мераю грамадскае пашаны... трэба, каб людзі прагнулі золата, каб яны ахвяравалі ўсім дзеля золата, каб яны нават прадавалі саміх сябе за золата. Любоў да ўцехаў і імкненне пазбегнуць пакутаў — вось дзве галоўныя спружыны чалавецтва".

Слушныя разважанні, але незразумела, якім чынам прымірыць іх з папярэдняй ідэяй, якая выдавала павагу ўласнасці і прыватную ініцыятыву за абавязковую і *дастатковую* ўмову перамогі дабрадзейнасці. Патрабуючы ад улады даваць прыклад дабрадзейнасці, Лё Мерсье дэ Ля Рыўер сам жа зняпраўджвае сваё сцверджанне, паводле якога павагі да эканамічных законаў было б дастаткова, каб запанавала дабро.

§ 6. Сацыяльны натуралізм — асноўная загана фізіякратычнае сістэмы

Нават з гледзішча эканомікі мы сёння бачым усю слабасць тэорыі фізіякратаў.

Фізіякраты зыходзілі з ідэі, што можна адкрыць законы, падобныя да фізічных, якія кіруюць эканамічнай дзейнасцю, і яны сапраўды патрапілі адкрыць такія законы. Але пасля гэтага зрабілі з законаў наступныя высновы:

1. Уся эканамічная дзейнасць кіруецца законамі, падобнымі да фізічных.

2. Гэтыя законы універсальныя, значыць, яны адны нязменныя ва ўсе часы і ва ўсіх абставінах, бо грунтуюцца на фізічных патрэбах чалавека і, такім чынам, папярэднічаюць "грамадскім дамовам".

Канцэпцыя, што вынікае з гэткіх пазіцыяў, выглядае ненатуральна, бо яна, па-першае, зводзіць эканамічныя да-

чыненні да механічных, якія можна аналізаваць з дапамогаю матэматыкі, а па-другое, сцвярджае, што паводзіны тых, хто кіруе, павінны быць аднолькавыя ва ўсе часы і ва ўсіх умовах.

У 1767 г. Кенэ напісаў "*Аналіз сістэмы кіравання пэруанскіх інкаў*"[1] (меў на ўвазе сістэму кіравання, што існавала да гішпанскае заваёвы). У тым жа годзе выдаў доўгае даследванне, што мела назоў "*Кітайскі дэспатызм*"[2]. Ён спадзяваўся знайсці ў пэруанскім і кітайскім грамадствах, заснаваных на спрадвечных каштоўнасцях, пацверджанне сваёй палітычнай эканоміі. Гэты факт яскрава сведчыць пра тое, наколькі вучоны недаацэньваў залежнасць эканамічнага жыцця ад гісторыі.

Відавочна, прычына памылкі ў тым, што Кенэ цалкам атаясамліваў эканамічнае жыццё з прыродным. Безумоўна, тут паўплывала захапленне Кенэ прыродазнаўчымі навукамі, але ён таксама выказаў патрабаванні французскай буржуазіі, якія сфармаваліся пад канец XVIII ст.

Гандлёвая і прамысловая буржуазія ўжо ўважала сябе дастаткова магутнай, каб абысціся без дапамогі дзяржавы, і лічыла, што шматлікія эканамічныя і сацыяльныя рэгламентацыі, якія існавалі ў Францыі з часоў Ancien Régime, — перашкода яе дзейнасці. Робіцца зразумела, чаму фізіякраты абаранялі эканамічны лібералізм і чаму дзеля яго абароны вылучылі відавочна памылковую канцэпцыю натуральнага парадку ў грамадстве.

Дарэчы, фізіякраты паспрыялі таму, каб на справе французская палітыка павярнулася ў бок гандлёвага лібералізму. Лічыцца, што менавіта яны былі сапраўднымі аўтарамі эдыкта ад 18 ліпеня 1764 г., які дазволіў экспарт збожжа.

Спачатку гэтая палітыка не мела поспеху: кошты на хлеб падскочылі ўверх, у краіне ўсчалася вялікая незадаволенасць і пасля адстаўкі Шўазёля ў 1770 г. адбылося бадай што поўнае вяртанне да ранейшых рэгламентацыяў.

Тады ж пачаў імкліва змяншацца ўплыў фізіякратаў. Аднак ліберальныя ідэі па-ранейшаму пракладалі сабе шлях.

[1] *OEuvres, op. cit., pp.555-563.*
[2] *Ibid., pp.563-661.*

Цюрго (1727—1781) адмаўляў сваю прыналежнасць да "секты" фізіякратаў, аднак падзяляў бальшыню іх ідэяў. Ён быў бліскучым эканамістам, аўтарам славутай кнігі "*Роздумы пра стварэнне й размеркаванне багацця*ў" (1766). Прызначаны ў 1774—1776 гг. генеральным кантралёрам фінансаў, Цюрго аднавіў свабоду гандлю збожжам. Менавіта тады ж ён паспрабаваў скасаваць рамесныя цэхі. Пасля ягонай адстаўкі адбыўся адыход ад праведзеных рэформаў. Трыумф палітыкі лібералізму ў эканоміцы надышоў толькі пасля Рэвалюцыі 1789 г.

Бібліяграфія

Шматлікія даследванні былі прысвечаныя фізіякратам, але гэтыя даследванні маюць розную каштоўнасць. Каб пазнаёміцца са школай, напэўна, на сённяшні дзень няма лепшае працы, чым твор: Hector Denis, Histoire des systèmes économiques et socialistes, Paris, 1904. Твор адметны тым, што аўтар акрэсліў асноўную мэту палітычнай эканоміі фізіякратаў — жаданне стаць усеагульнай навукай аб грамадстве.

Зрэшты, існуе вялікая колькасць твораў пра школу фізіякратаў, якія ўжо сталі класічнымі, напрыклад:

G. Schelle, *Dupont de Nemours et l'école physiocratique*, Paris, 1888.

G. Weulersse, *Le mouvement physiocratique en France de 1756 à 1770*, Paris, 1910.

— *La physiocratie sous les ministères de Turgot et de Necker*, Paris, 1950.

— *La physiocratie à la fin du règne de Louis XV*, Paris, 1959.

— *Les physiocrates*, Paris, 1931 (résumé des travaux de l'auteur).

H. Higgs, *The physiocrats*, New York, 1897; nouv. éd., New York, 1952.

M. Beer, *An Inquiry into Physiocracy*, London, 1939.

L.P.May, *Le Mercier de la Rivière*, Paris, 1975.

Тлумачэнне "Эканамічнай табліцы" (у яе розных версіях) таксама стала тэмаю шматлікіх даследванняў. Тлумачыць "Табліцу" — цяжкая задача, і часам здараецца, што даследнікі замест тлумачэння, наадварот, заблытваюць праблему.

З гэтага гледзішча да асобных даследванняў, якія ўваходзяць у калектыўны твор François Quesnay et la physiocratie (Institut national l'Etudes démographiques, 1958), трэба ставіцца крытычна. Так, у адным з іх атаясамліваюцца "чысты прадукт" фізіякратаў і "чысты нацыянальны даход" у сучасным разуменні гэтага паняцця. У гэтым раздзеле мы ўжо цытавалі творы J.MOLINIER, Les métamorphoses d'une théorie économique, Paris, 1958, et de H.WOOG, The Tableau économique of François Quesnay, Berne, 1950. Таксама можна звярнуцца да твора R.SUAUDEAU,

Les représentations figurées des Physiocrates, Paris, 1947. Аднак, безумоўна, лепшым творам па дадзеным пытанні ёсць кніга R.L.MEEK, The economics of Physiocracy, London, 1962.

Зразумела, трэба вывучаць агульныя працы аб палітычнай думцы XVIII ст., каб разглядаць погляды фізіякратаў у гістарычным аспекце. Іх пералік дае Жан Тушар (Jean Touchard) у сваёй Histoire des idées politiques з калекцыі "Thémis". Трэба, аднак, папярэдзіць чытача, што ў асобных працах (зрэшты, грунтоўных і вельмі вядомых) погляды эканамістаў ці то цалкам застаюцца ўбаку, ці то вывучаюцца недастаткова. Напрыклад, у вядомым даследванні P.HAZARD, La pensée européenne au XVIIIe siècle, de Montesquieu a Lessing не знайсці аналізу вучэння фізіякратаў. Гэткі факт яскрава сведчыць, наколькі ў Францыі вывучэнне гісторыі эканамічнай думкі адасобленае ад вывучэння гісторыі філасофіі і гісторыі літаратуры. Такі варты жалю падзел вынікае з адсутнасці сувязяў паміж рознымі факультэтамі французскіх універсітэтаў, якая існуе да сёння. Аднак асобныя даследнікі спрабуюць выправіць становішча. Працытуем творы:

F. Faure-soulet, *Economie politique et progrès au siècle des Lumières*, Paris, 1964.

M. Bernard, *Introduction à une sociologie des doctrines économiques des Physiocrates à Stuart Mill*, Paris-La Haye, 1963.

C. Larrère, *L'invention de l'économie au XVIIIe siècle*, Paris, 1991.

Раздзел IV

ЭДАМ СМІТ

У другой палове XVIII ст. фізіякраты сфармулявалі тэорыю аграрнага капіталізму, які прыжываўся ў Францыі досыць марудна. У французскай вёсцы яшчэ панавалі сістэма "бясплатнага выпасу" на папары (што выключала агароджванні загонаў) і сістэма супольнага карыстання землямі сялянскай грамады.

У Англельшчыне ўжо квітнеў аграрны капіталізм і прыклад суседкі, асабліва пачынаючы з 1750 г., натхняў французскіх фізіякратаў, а таксама аграномаў[1]. Англельшчына знаходзілася на стадыі стварэння прамысловага капіталізму, і менавіта шляхам вывучэння развіцця прамысловасці Эдам Сміт, неўзабаве пасля Кенэ, распрацаваў уласную тэорыю капіталістычнага ладу вытворчасці.

§ 1. Біяграфічныя звесткі

Эдам Сміт нарадзіўся ў Шатляндыі ў 1723 г. у сям'і мытніка. Спачатку вучыўся ў Глазга, а потым накіраваўся ў Оксфард, каб падрыхтаваць сябе да царкоўнае кар'еры. Аднак яго больш цягнула да твораў "сучасных" філосафаў, чым тэолагаў. Пасля вымовы за чытанне кнігі Х'юма Сміт вырашыў вярнуцца ў Шатляндыю і дзякуючы пратэкцыі аднаго адукаванага арыстакрата атрымаў магчымасць выкладаць літаратуру ва універсітэце Эдынбурга, а пазней філасофію ва універсітэце Глазга. Яго лекцыі змяшчалі веды па натуральнай тэалогіі, этыцы, юрыспрудэнцыі і палітычнай эканоміі.

У 1759 г. Сміт выклаў сваё бачанне этыкі ў працы, названай "Тэорыя маральных пачуццяў". Поспех кнігі прынёс вядомасць яе аўтару, і адзін шляхціц запрасіў Сміта суправаджаць яго ў падарожжы па кантыненце. Сміт адмовіўся ад выкладчыцкай кафедры, атрымаў абяцанне на грамадскую пасаду па вяртанні і згадзіўся на падарожжа. З 1764 да 1766 г. наведаў Тулузу, Жэнэву і Парыж, сустрэў-

---

[1] *Гл. на гэты конт J-J.Bourde, The Influence of England on the French agronomes, 1750-1789. Cambridge, 1953.*

ся з Кенэ і яго вучнямі. Вярнуўшыся ў Шатляндыю, Сміт падрыхтаваў свой вялікі твор, які выйшаў у 1776 г. пад назвай *"Даследванне аб прыродзе і прычынах багацця народаў"*. Потым ён перабраўся ў Лондан, пазней згадзіўся заняць пасаду мытнага камісара ў Эдынбурзе. Там і памёр у 1790 г.

Эдам Сміт быў крыху дзіваком, вельмі кепска прыстасаваным да рэальнага жыцця, асабліва да фінансавых спраў[1]. Доўгі час ён меў вельмі сціплыя даходы, але нават калі пасля 1778 г. яго матэрыяльнае становішча палепшылася, ён тым не менш не змяніў свайго ладу жыцця.

§ 2. Тэорыя маральных пачуццяў

Пасля вялікіх твораў Гобса і Лока іншыя ангельскія аўтары працягвалі даследванні ў галіне навукі пра чалавека[2]. У гэтых даследваннях усё яскравей акрэсліваліся два прынцыпы. Найперш прынцып карыснасці: ці то чалавек заўсёды дзейнічае з мэтай дасягнуць задавальнення, ці пазбегнуць болю. А з другога боку — гэта прынцып асацыяцыі ідэяў: функцыянаванне чалавечага розуму тлумачыцца дзеяннем сілаў, што звязваюць адну думку з другою.

Гэтыя прынцыпы былі распрацаваныя ў першую чаргу Дэйвідам Х'юмам у ягоным *"Трактаце аб чалавечай прыродзе"* (1738).

Аднак у часе працы над тэорыяй Х'юм сутыкаецца з праблемай маральнага абавязку. Калі чалавек кіруецца выключна асабістым інтарэсам, дык як вытлумачыць існаванне пачуцця абавязку?

Маралісты, якія імкнуцца па-ранейшаму абапірацца на рэлігію, сцвярджаюць, што маральны абавязак — гэта проста праяўленне дзеяння Бога, які загадвае нам рабіць дабро і не рабіць кепскага.

Але найсмялейшыя розумы XVIII ст. хацелі абысціся без рэлігіі. Прафесар філасофіі ва універсітэце Глазга Гачысан

---

[1] *Albert Delatour, Adam Smith, sa vie, ses travaux, ses doctrines, Paris, 1886, pp.557-558.*

[2] *Гл. на гэты конт Elie Halévy. La formation du radicalisme philosophique, t.I: La jeunesse de Bentham, Paris, 1901, chap.Ier.*

выказваў меркаванне, што чалавек, апрача пачуццяў, з дапамогай якіх ён пазнае бачны свет, надзелены пачуццём маралі, якое прымушае нас цаніць дабрадзейныя ўчынкі.

На думку Х'юма, гэткае вучэнне ўсё ж занадта падобнае да рэлігійнае дактрыны. Што ж да самога Х'юма, дык ён сцвярджаў, што "дабрадзейнасцю ёсць усялякі ўчынак або якасць душы, якая выклікае пачуццё задавальнення ці ўхвалення сведкаў гэтага ўчынку"[1].

Аднак Х'юм не сцвярджае, што мы лічым дабрадзейнымі ўчынкі, ухваленыя нашым атачэннем, толькі з тае прычыны, што гэта адпавядае асабістаму інтарэсу. Такая тэорыя супярэчыць нашаму досведу, які кажа, што часам мы дзейнічаем шчыра, альтруістычна. Такім чынам, неразвязанай застаецца праблема суіснавання ў нас эгаістычных, з аднаго боку, і шчырых, альтруістычных, з другога боку, пачаткаў.

Сміт намагаўся вырашыць гэтыя пытанні ў сваёй "*Тэорыі маральных пачуццяў*". Ён сцвярджаў, што ў здзейсненых учынках мы кіруемся не толькі асабістым інтарэсам, але таксама і меркаваннем іншых пра нашыя дзеі, бо "сімпатыя", якую мы адчуваем да іншых людзей, вымушае нас пагадзіцца з іх меркаваннем.

Хісткасць тэорыі сведчыць пра ваганні аўтара наконт таго, ці можна цалкам прыняць механістычна-натуралістычную канцэпцыю грамадства. Гэтыя ваганні прысутнічаюць і ў іншых месцах "Тэорыі маральных пачуццяў". З аднаго боку, Сміт прызнае, што грамадства — гэта галоўным чынам абмен паслугамі паміж індывідамі, яго супольнікамі. Але, з другога боку, ён сцвярджае, што парадак у грамадстве грунтуецца на схільнасці захапляцца багатымі і моцнымі людзьмі, а значыць, і падпарадкавацца ім.

"Адрозненні ў рангах і парадак у грамадстве грунтуюцца на ўласцівай нам схільнасці мець сімпатыю і цягнуцца да заможных і моцных людзей. Наша павага да тых, хто вышэйшы за нас, часцей мае прычынаю захапленне іх становішчам, чым прыхаванае чаканне выгодаў ад добразычлівасці іх стаўлення да нас"[2].

---

[1] *Cité par Bréhier, Histoire de la philosophie, t.II, vol.II, Paris, 1950, p.421.*

[2] *Théorie des sentiments moraux, trad. franç., Paris, 1830, t.I, p.91.*

З гэтага вынікае, што грамадства яшчэ далёка не такое дасканалае, як гэтага можна было б пажадаць.

Безумоўна, "для сярэдніх і ніжэйшых класаў грамадства шлях да пашаны бадай што заўсёды шлях узбагачэння"[1], таму прадстаўнікі гэтых класаў зацікаўленыя ў тым, каб быць дабрадзейнымі, і часцей за ўсё яны дабрадзейныя, а вось "у вышэйшых станах становішча зусім іншае. Пры дварэ, у вітальнях палацаў ... бадай заўсёды спрыт і ліслівасць аказваюцца важней за годнасць і талент"[2]. Таму Сміт сцвярджае, што "ўлюбёнцы фартуны занадта часта збочваюць са шляху дабрадзейнасці дзеля дасягнення жаданых мэтаў; на жаль, шляхі фартуны і дабрадзейнасці часта разыходзяцца"[3].

Такім чынам, Сміт усведамляў, што эканамічны лад, які грунтуецца на механічным дзеянні асабістых інтарэсаў, можа ўвайсці ў супярэчнасць з сацыяльнай справядлівасцю. Сміт вельмі далёкі ад пазіцыі фізіякратаў, якія адмаўлялі існаванне праблемы сацыяльнай справядлівасці ці сцвярджалі, што гэтая праблема вырашыцца аўтаматычна адначасова з эканамічным прагрэсам. Тым не менш Сміт абараняе ліберальны падыход і сцвярджае, што, па-першае, свабода выбару шляхоў да ўзбагачэння — гэта адзіная ўмова ўсялякага прагрэсу, а, па-другое, несправядлівасці, выкліканыя эканамічнай свабодай, не такія ўжо жахлівыя і непрымальныя, як гэта можа здацца на першы погляд.

"Веліч і багацце — дзве прыемнасці, якія зачароўваюць нас, як нешта высакароднае, вялікае і прыгожае, дзеля чаго мы гатовыя на любыя пакуты і працу.

На шчасце, сама прырода настройвае нас так; уяўленні пра багацце, якім яна спрыяе, падштурхоўваюць людзей да дзеяння, трымаюць іх у несупынным руху. Менавіта гэтыя ўяўленні змушаюць нас разнастайнымі спосабамі апрацоўваць глебу, будаваць дамы замест халупаў, узводзіць вялікія і прыгожыя гарады, ствараць і ўдасканальваць навукі і мастацтвы..."[4]

Свабода — умова прагрэсу. Але праўда і тое, што яна таксама крыніца сацыяльнай няроўнасці. Аднак аўтар сцвярджае, што, нягледзячы на сацыяльную няроўнасць, індывіды

[1] *Ibid., p.108.*
[2] *Ibid., p.109.*
[3] *Ibid., p.112.*
[4] *Ibid., pp.338-339.*

атрымліваюць прыкладна аднолькавае задавальненне ад сваёй працы.

"Страўнік багатага, — пісаў Сміт, — непрапарцыйны яго жаданням, ён змяшчае столькі ж, колькі страўнік цёмнага вяскоўца. Багаты вымушаны аддаваць тое, што сам не спажывае, чалавеку, які далікатна гатуе тую кроплю страваў, у якіх гэты багаты мае патрэбу... Сярод усіх толькі багатыя маюць магчымасць выбіраць самае вытанчанае ды рэдкае. Але спажываюць яны не больш, чым бедныя, і, нягледзячы на іх прагнасць і эгаізм, ... дзеляць з апошнім парабкам вынік працы, якую скарыстоўваюць. Здаецца, нябачная рука прымушае іх пераразмяркоўваць неабходныя для жыцця рэчы так, што ў выніку кожны чалавек атрымлівае столькі, колькі атрымаў бы, калі б зямля была роўнымі дзялкамі падзеленая між яе насельнікамі; такім чынам, не імкнучыся да гэтага і нават не здаючы сабе з гэтага справы, багаты дзейнічае так, як таго патрабуе грамадскі інтарэс і дзеля памнажэння людскога роду. Вышэйшая сіла падзяліла зямлю паміж невялічкай колькасцю людзей і не пакінула тых, каму яна, здавалася б, забылася адрэзаць па кавалачку поля, гэтыя пакрыўджаныя маюць частку ўсяго, што дае зямля..."[1]

Спачатку Сміт трымаўся утылітарнага падыходу, і на фоне гэтага логіка дадзенае думкі здаецца малапераканаўчая: добра вядома, што сацыяльная няроўнасць, наадварот, спараджае велізарныя адрозненні ў матэрыяльным становішчы людзей.

Але ж Эдам Сміт не быў чыстым утылітарыстам, ён хутчэй стоік, чым эпікурэец. Для яго маральнае задавальненне больш важнае, чым матэрыяльнае. Менавіта таму праблема няроўнасці не бянтэжыць яго, але дазваляе паразважаць наконт незабяспечаных:

"... Сапраўдным шчасцем яны адораныя не меней, чым тыя, хто нібыта знаходзіцца над імі. Што да фізічных уцехаў і душэўнага спакою, тут усе роўныя. Жабрак, які грэецца на сонцы пад тынам, звычайна цешыцца з таго спакою і цішыні, якога заўсёды прагнуць каралі"[2].

Каго можа пераканаць гэткая сентэнцыя? Цікава, спытаецца кожны, чаму ж Сміт далей так падкрэслівае важнасць эканамічнага прагрэсу? Калі нам для шчасця дастаткова сонечнага цяпла, навошта навукі, прамысловасць, навошта няроўнасць? Сміт не здолеў бы адказаць на гэтае пытанне. У якасці мэты чалавечай дзейнасці ён вылучае

[1] *Ibid., pp.340-341.*
[2] *Ibid., p.341.*

дасягненне багацця і дасягненне мудрасці адначасова. Ён не хоча ахвяраваць ні адным, ні другім. Магчыма, Сміт мае рацыю, але ён не паказвае, якім чынам можна спалучаць дзве гэтыя мэты, без чаго ягоная сацыяльная філасофія мае незавершаны характар і адрозніваецца асаблівай пакорлівасцю сацыяльнай няроўнасці.

Эдам Сміт шкадуе, што найчасцей багацце ставяць вышэй за мудрасць.

"Філосафы ўсіх часоў, — пісаў ён, — слушна скардзіліся, што да багацця і велічы часта ставіліся з такою павагаю і захапленнем, якіх вартыя толькі мудрасць і дабрадзейнасць, і што часта да беднасці і слабасці ставяцца з пагардай... Па-сапраўднаму захапляецца мудрасцю і дабрадзейнасцю толькі абранае і вельмі вузкае кола мудрацоў. Большыня ж людзей захапляецца і бадай што абагаўляе багацце і магутнасць"[1].

Але разам з тым Сміт рашуча крытыкуе традыцыйнае хрысціянства, якое, паводле ягоных словаў, вучыць пагарджаць светам. Ён пратэстуе супраць такога вучэння, бо яно:

"... з аднаго боку, абяцае рай для манахаў і тых, чые норавы ды звычкі падобныя да манаскіх; і, з другога боку, выракае на пекла ўсіх герояў, дзяржаўных дзеячаў, заканадаўцаў, паэтаў і філосафаў — усіх тых, хто стварыў і ўдасканаліў мастацтвы, якія ёсць падтрымка, суцяшэнне і аздоба нашага жыцця"[2].

Сміт лічыць, каб пазбегнуць адарванасці ад рэчаіснасці, што прапануе хрысціянства, трэба прыняць свет такім, які ён ёсць.

Фізіякраты былі перадусім практыкамі, якія наіўна выкладалі сацыяльныя канцэпцыі буржуазіі XVIII ст., шчыра ўслаўлялі натуральны лад, заснаваны на пагоні за грашыма. Сміт адрозніваецца ад іх. Як філосаф, ён не можа пагадзіцца, што багацце — гэта найвышэйшая каштоўнасць, аднак цвёрды эмпірызм сфармуе з Сміта навукоўца, які зрабіў найбольшы ўнёсак у стварэнне такой канцэпцыі грамадскага жыцця, якая найвышэй ставіць клопат пра эканамічную эфектыўнасць.

[1] *Ibid., pp.106-107.*
[2] *Ibid., p.240.*

§ 3. Першыя эканамічныя развагі ў лекцыях у Глазга

Да нас дайшлі лекцыі, якія Эдам Сміт чытаў ва універсітэце Глазга у 1763 г., заканспектаваныя студэнтам[1]. З дапамогаю гэтых нататкаў мы можам прасачыць, якіх ідэяў трымаўся Сміт да таго, як пазнаёміўся з творчасцю фізіякратаў.

У лекцыях 1763 г. ужо прысутнічае ўсебакова распрацаваны самы вядомы тэзіс Сміта, які сцвярджае, што "багацце нараджаецца з падзелу працы"[2]. Аўтар прапануе свой славуты прыклад мануфактуры па вытворчасці шпілек. Калі б чалавек мусіў вырабляць шпільку з пачатку да канца адзін, шукаў сыравіну ў зямлі, яму спатрэбіўся б год на вытворчасць адной шпількі. Калі даць рамесніку масянжовы дрот, дык ён, магчыма, зможа вырабляць 20 шпілек удзень. Але на мануфактуры, дзе існуе падзел працы, адзін рабочы вырабляе 2000 шпілек на дзень[3]. Такое значнае павелічэнне вытворчасці прадукцыі, на думку Сміта, абумоўленае трыма чыннікамі: спрытам рабочых з прычыны іх спецыялізацыі; эканоміяй часу, якая забяспечваецца дзякуючы таму, што рабочы больш не пераходзіць ад аднаго тыпу працы да другога; выкарыстаннем машынаў. Трэба заўважыць, што Сміт лічыў машынамі нават простыя прылады працы, такія, як плуг[4]. Да распаўсюджання машынаў з аўтаматычным прынцыпам дзеяння, якія б выкарыстоўвалі не моц чалавека ці жывёлы, а іншыя крыніцы энергіі, было яшчэ далёка.

Стварэнне мануфактураў патрабавала значных капіталаў. Сміт падышоў да аналізу ролі капіталу ў вытворчасці, і гэты аналіз ён правёў больш паспяхова, чым яго сучаснікі-фізіякраты[5].

Сапраўды, ён трапна заўважае, што роля капіталу палягае ў павелічэнні прадукцыйнасці працы, якая забяспечва-

---

[1] *Lectures on Justice, Police, Revenue and Arms, édité par E.Cannan, Oxford, 1896.*
[2] *Op. cit., pp.163-164.*
[3] *Ibid., pp.163-164. Прыклад запазычаны ў "Энцыклапедыі" Дзідро, артыкул "Шпілька", выданне 1755 г. (cf. Lectures, note (1), p.164).*
[4] *Ibid., p.167.*
[5] *Ibid., pp. 222-223.*

ецца або праз глыбейшы падзел працы, або праз забеспячэнне рабочых лепшымі прыладамі працы. Такім чынам, Сміт пазбягае фундаментальнай памылкі фізіякратаў, якія, як вядома, лічылі, што капіталаўкладанні выгадныя толькі ў сельскай гаспадарцы.

Сміт не адмаўляе, што капітал патрэбны й для развіцця сельскай гаспадаркі, і бліскуча аналізуе тыя ўмовы, якія перашкаджалі ўкладу інвестыцыяў у аграрную эканоміку пры рабаўладальніцкай сістэме, феадальнам ладзе і пры здольшчыннай сістэме гаспадарання[1].

Такім чынам, ён не толькі не пагарджае сельскаю гаспадаркаю, але й, наадварот, заяўляе, што яна — "самы прыбытковы з усіх заняткаў"[2], бо, з ягоных словаў, кошт сельскагаспадарчай вытворчасці ў Англельшчыне складае 72 мільёны фунтаў, тым часам як сукупны прадукт — 100 мільёнаў фунтаў[3].

Сміт не робіць памылкі, адпаведна з якою прамысловая праца лічыцца бясплённай. Наадварот, яму здаецца, што трэба разглядаць як роўныя сельскагаспадарчую і прамысловую працу.

Гэта прыводзіць яго да сцверджання прынцыпу, паводле якога натуральны кошт рэчаў адпавядае колькасці грошай, якой вартая затрачаная на іх вытворчасць праца.

"Чалавек атрымлівае за сваю працу натуральную зарплату тады, калі гэтае зарплаты дастаткова, каб дазволіць яму існаваць пад час працы, каб аплаціць выдаткі на адукацыю і кампенсаваць рызыку, што ён не пражыве досыць доўга ці яшчэ й пацерпіць няўдачу ў сваёй дзейнасці. Такім чынам, калі чалавек атрымае такую аддзяку, тады заахвочванне для працаўніка будзе дастатковым і тавары будуць вырабляцца ў колькасці, неабходнай дзеля задавальнення попыту"[4].

Аўтар падводзіць нас да тлумачэння нармальнага кошту праз працоўны час, неабходны для вытворчасці пэўнай рэчы. Сміт ужо выкарыстоўваў такое тлумачэнне ў сваім аналізе вытворчасці шпілек[5].

---

[1] *Ibid., pp.224-229.*
[2] *Ibid., p.224.*
[3] *Ibid., p.224.*
[4] *Ibid., p.176.*
[5] *Ibid., p.163.*

Такім чынам, крыніца ўсялякага багацця — праца, але пры гэтым, і Сміт вымушаны гэта канстатаваць, памер багацця і даходаў зусім не адпавядае памеру працы кожнага.

"У цывілізаваным грамадстве, хоць падзел працы і існуе, але гэта — няроўны падзел, бо шмат хто зусім нічога не робіць. Размеркаванне багацця ў адбываецца не ў залежнасці ад працы. Набытак купца пераўзыходзіць набыткі ўсіх яго працаўнікоў, узятых разам, хоць купец і працуе менш; усё ж працаўнікі купца зарабляюць у 6 разоў больш, чым рамеснікі, якія ў сваю чаргу мусяць выконваць большую працу. Рамеснік, які спрытна працуе ва ўласным доме, атрымлівае значна больш, чым бедны парабак, што ўвесь час абівае парогі. У выніку той, хто, здаецца, нясе на сабе ўвесь цяжар грамадства, зарабляе меней за ўсіх"[1].

Сміт не хавае праўды, але рэалістычнае бачанне грамадства не вядзе яго да пошуку прычынаў несправядлівасці. Тут таксама назіраецца яго звычайная пакора. Аднак ён не зможа заўсёды абыходзіць праблему размеркавання даходаў, і калі ён у сваім галоўным творы паспрабуе больш дакладна сфармуляваць прычыны багацця народаў, дык будзе вымушаны закрануць і гэтае пытанне.

Усебакова крытыкаваць меркантылісцкую дактрыну і раскрываць перавагі эканамічнай свабоды Сміт пачынае яшчэ ў лекцыях, прачытаных у Глазга.

Яго аргументы мала чым адрозніваюцца ад аргументаў фізіякратаў. Ён кажа, што трэба ўвесці свабоду гандлю зямлёй і карыстання ёю па жаданні ўласніка: "Купец, які набывае маленькі лапік зямлі, клапоціцца пра яе ўрадлівасць і намагаецца атрымаць з яе як мага большы прыбытак"[2]. З другога боку, свабода гандлю — найлепшы шлях да ўзбагачэння купцоў і стварэння імі мануфактураў:

"Калі купцамі пагарджалі і абкладалі іх вялікім падаткам на права займацца гандлёвай дзейнасцю, яны не маглі сабраць капітал, неабходны для ажыццяўлення падзелу працы і для развіцця мануфактураў"[3].

Такім чынам, эканамічная свабода — неабходная і дастатковая ўмова эканамічнага прагрэсу ва ўсе часы. У цэлым слушная выснова Сміта зноў хібіць празмерным абагульненнем.

---

[1] *Ibid., pp.162-163.*
[2] *Ibid., p.228.*
[3] *Ibid., p.233.*

§ 4. "Багацце народаў". Тэорыя менавай вартасці

Брытанскія каментатары творчасці Сміта, далёкія ад захаплення фізіякратамі, погляды якіх яны лічылі "дзіцячымі", прызнаюць, што больш высокі ровень *"Багацця народаў"* параўнальна з першымі даследваннямі Сміта ў значнай ступені абумоўлены тым, што ён ідзе па шляху, працярэбленым Кенэ, і імкнецца растлумачыць эканамічнае жыццё як механізм, які прыводзіцца ў рух праз выдаткоўванне капіталу і які дазваляе ажыццявіць аднаўленне гэтага капіталу[1].

Разам з тым Сміт не паўтарае памылкі фізіякратаў наконт бясплённасці прамысловасці, і гэта дазваляе яму даць больш дакладную інтэрпрэтацыю функцыянавання капіталістычнай сістэмы. Ён спрабуе прааналізаваць вартасць тавараў; пазней гэта адыграе вялікую ролю.

У першай кнізе *"Багацця народаў"* пасля выкладу ўласнай тэорыі наконт ролі падзелу працы Сміт спрабуе асвятліць праблемы ўтварэння коштаў і паходжання даходаў прыватных асобаў.

З прынцыпу, што падзел працы — крыніца ўзбагачэння народаў, аўтар зноў развівае ідэю пра тое, што падзел працы тлумачыцца схільнасцю індывідаў да абмену. Гэта штурхае яго да разгляду праблемы менавай вартасці тавараў.

Менавіта тут мы сутыкаемся з ідэяй, якая адыграе велізарную ролю ў эвалюцыі эканамічнае думкі.

Да Эдама Сміта часцей за ўсё вартасць рэчаў звязвалі з іх карыснасцю. Тое самае рабіў і Гачысан, папярэднік Сміта ў Глазга.

Аднак ідэю працоўнай вартасці мы ўжо сустракалі ў Пэты і Лока. У невялічкім творы невядомага ангельскага аўтара, які выйшаў у свет у 1738 г. і ў якім разглядалася пытанне працэнта ад капіталу, недвухсэнсоўна сцвярджалася, што вартасць неабходных для жыцця рэчаў, "калі яны абменьваюцца адна на другую, абумоўліваецца колькасцю патрэбнай і звычайна затрачанай на іх вытворчасць працы";

[1] *Гл. Уводзіны de Cannan aux Lectures, op. cit., p.XXIX.*

аўтар дадаваў, што менавіта таму "ў пэўныя моманты і ў пэўных месцах тона вады можа каштаваць столькі ж, як тона віна"[1]. Іншыя аўтары, у прыватнасці Кантыльён і Ўільям Тэмпл[2], таксама схіляліся да гэткае канцэпцыі, аднак у іх паняцце вартасці выразна так і не акрэслілася. Сміт жа імкнуўся ўнікнуць усякае дваістасці, разабрацца ў праблеме праз адрознасць спажывецкае і менавае вартасці.

"Трэба заўважыць, што слова "вартасць" мае два розныя значэнні: часам яно азначае карыснасць нейкай рэчы, а часам яно азначае магчымасць, якую дае валоданне пэўнай рэччу, набыць іншыя тавары. Першую вартасць можна назваць *спажывецкай*, а другую — *менавай*. Рэчы, якія маюць найвялікшую *спажывецкую вартасць*, часта маюць малую або зусім не маюць *менавай вартасці*; і наадварот, рэчы, якія маюць найбольшую *менавую вартасць*, часта маюць невялікую або зусім не маюць *спажывецкае вартасці*.

Няма нічога больш карыснага, чым вада, але за яе практычна нічога нельга набыць. Дыямент, наадварот, не мае, бадай, аніякай вартасці ў сэнсе карыстання ім, але часта за яго можна атрымаць вялізную колькасць іншых тавараў"[3].

Тут важна падкрэсліць, што аўтар разглядаў *абодва тыпы* вартасці як *сацыяльныя з'явы*. На яго думку, спажывецкая вартасць уяўляе *грамадскую* карыснасць тавару. Менавіта таму Сміт сцвярджаў, што дыямент мае невялікую карыснасць. Сама спажывецкая вартасць, такая, якой яе бачыць аўтар, — гэта з'ява *аб'ектыўная, а не суб'ектыўная*. Сміт лічыў, што грамадскія дачыненні самі па сабе *асобны* аб'ект даследвання, таму ён імкнецца растлумачыць у першую чаргу менавую вартасць. Сміт пачынае свой аналіз вывучэннем колькасці працы, неабходнай для вытворчасці тавару:

"У першапачатковым стане грамадства, які папярэднічаў назапашванню капіталаў і з'яўленню ўласнасці на зямлю, адзінай падставай для ўстанаўлення нейкага прынцыпу ў менавых аперацыях магла быць, здаецца, колькасць працы, неабходная, каб набыць розныя прадукты абмену. Напрыклад, калі народу, які займаўся паляваннем, звычайна ўпаляваць бабра было ў два разы цяжэй, чым лань, дык, натуральна, што за аднаго бабра можна было атрымаць дзве лані. Натуральна, што тавар,

[1] *Some thoughts on the interest of money in general, cité par R.L.Meek, Studies in the Labour theory of value, London, 1956, p.43.*

[2] *Cf. R.L.Meek, op. cit., p.30.*

[3] *Recherches sur la nature et les causes de la richesse des nations, trad. franç., Paris, 1843, I, p.35.*

выраб якога патрабуе два дні ці дзве гадзіны працы, будзе каштаваць у два разы больш, чым тавар, на выраб якога патрабуецца адзін дзень ці адна гадзіна працы"[1].

Аўтар вядзе гаворку пра гіпатэтычнае грамадства, у якім усе працуюць і абменьваюцца вынікамі сваёй працы. Ён кажа, што ў такім грамадстве тавары павінны абменьвацца на падставе колькасці працы, неабходнай для іх вытворчасці. У адваротным выпадку сістэма абмену не магла б функцыянаваць, бо з яе выпадалі б некаторыя элементы.

Распрацоўваючы такую мадэль, Сміт грунтуецца на аналізе першапачатковага стану грамадства. Падкрэслівае, што яго тлумачэнне вартасці падыходзіць для эканомікі "цывілізаванага" перыяду.

Калі б, лічыць ён, натуральны кошт тавару раўняўся суме грошай, выплачаных за ягоную вытворчасць, усё было б проста. Калі б нейкая рэч каштавала ў два разы даражэй, значыць, каб зрабіць яе, затрачана ў два разы болей працы.

Але на цану тавару ўплываюць яшчэ прыбытак ад капіталу і зямельная рэнта.

Ці можна сказаць, што прыбытак ад капіталу ёсць у пэўным сэнсе аплатаю працы, працы кіраўніцтва прадпрыемствам. Не, бо прыбыткі "вызначаюцца на падставе прынцыпаў, якія цалкам адрозніваюцца" ад прынцыпаў вызначэння заробкаў; "яны цалкам залежаць ад вартасці выкарыстанага капіталу і з'яўляюцца большымі ці меншымі ў залежнасці ад памераў гэтага капіталу"[2].

Такім чынам, паводле Сміта, прыбытак не аплата працы. Тое сама і з зямельнай рэнтай, бо землеўладальнікі не працуюць, але "любяць жаць там, дзе не сеялі"[3].

Сміт зрабіў выснову, што сёння няма дакладных стасункаў паміж натуральнымі коштамі тавараў і выдаткамі працы, неабходнай для іх вытворчасці. Гэтыя стасункі існавалі на заранку грамадства, "які папярэднічаў назапашванню капіталаў і з'яўленню ўласнасці на зямлю"[4] і ў якім "вынік працы цалкам належаў працаўніку"[5]. Але гэткі лад даўно ўжо знік.

---

[1] *Ibid., p.65.*
[2] *Ibid., p.66.*
[3] *Ibid., p.67.*
[4] *Ibid., p.65.*
[5] *Ibid., p.66.*

Аўтар не лічыць магчымым сцвярджаць, што ў сучаснай яму эканоміцы менавая вартасць тавараў вызначаецца на падставе выдаткаў працы, патрэбнай для іх вытворчасці.

Сміт звычайна старанна трымаўся тых высноваў, якія падказваў яму ягоны досвед. Што да праблемы вартасці, тут вучоны не да канца паслядоўны. Сапраўды, ён заўзяты прыхільнік існавання "натуральных эканамічных законаў". Паўстае пытанне, ці верыць ён у існаванне аналагічнага закону ў галіне вартасці. Безумоўна, Сміт таксама задае сабе гэтае пытанне. І відавочна імкнецца ўстанавіць сувязь паміж менавай і працоўнай вартасцю, але прапанаваны ім аналіз не вытрымлівае крытыкі.

Сапраўды, ён заяўляе, што нармальны кошт кожнае рэчы адпавядае колькасці працы, якую можна набыць разам з гэтай рэччу.

Такое тлумачэнне — не больш чым агульная фраза, пазбаўленая ўсялякага сэнсу. Калі адна гадзіна працы каштуе 10 франкаў, дык з вырабам, які каштуе 100 франкаў, можна набыць 10 гадзінаў працы. Бясспрэчна, гэта так, але ніякай цікавасці гэта не ўяўляе. Як бы там ні было, але трэба сказаць: даследванні Сміта часта грунтаваліся на тлумачэнні менавай вартасці праз вартасць працы. Перакананне Сміта, што менавая вартасць павінна быць звязаная з працай, мае вызначальную ролю ва ўсёй яго тэорыі. Менавіта гэтае перакананне дапамагае яму адмовіцца ад ідэі фізіякратаў пра бясплённасць прамысловасці. У сельскай гаспадарцы вартасць тавараў абумоўлена працай. Значыць, нелагічна сцвярджаць, што прамысловасць бясплённая. Наадварот, трэба прызнаць, што прамысловая праца стварае вартасць гэтаксама, як і сельскагаспадарчая праца.

Як і фізіякраты, Сміт кладзе ў аснову свайго даследвання капітал, выкарыстанне якога дазваляе павялічыць прадукцыйнасць працы. Ён развівае аналіз укладання капіталу, грунтуючыся на падзеле на сталы капітал і абаротны капітал (тэрміны запазычыў з мовы кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў). Сталы капітал служыць для набыцця абсталявання доўгатэрміновага карыстання, а абаротны накіроўваецца на набыццё сыравіны і выплату заробкаў.

На гэтай аснове Сміт аналізуе працэс стварэння даходаў. Ягоны аналіз атрымаўся значна глыбейшы за аналіз фізіякратаў.

§ 5. Тэорыя даходаў

А) Заработная плата асобаў, занятых у працэсе вытворчасці

Сміт пагаджаецца з распаўсюджаным у тыя часы поглядам, паводле якога заработнай платы павінна ставаць на тое, каб працаўнік мог забяспечыць сабе існаванне.

Ён дапускае, што заробак мае тэндэнцыю да павелічэння з ростам нацыянальнага багацця, бо павялічваецца "попыт на працу". Аднак сцвярджае, што такое павелічэнне заробкаў не можа быць значным, бо "большая аплата працы... дапаможа бацькам лепей клапаціцца пра дзяцей, а значыць, з'явіцца жаданне выхаваць большую колькасць дзяцей"[1]. Сміт без ваганняў разглядае гэтую з'яву як натуральны закон. "Попыт на людзей, — піша ён, — кіруе з'яўленнем людзей на свет, гэтаксама як адбываецца з любым іншым таварам"[2]. Вось так ствараецца канцэпцыя, якая атаясамлівае працоўнага з таварам.

Б) Прыбытак з капіталу

Канцэпцыя, што разглядае працу як адзіную крыніцу менавай вартасці, адлюстраваннем якой ёсць кошт тавару, не можа не прывесці нас да высновы, што прыбытак з капіталу, які складае частку кошту тавару, ёсць адлічэнне ад вартасці, створанае працай.

Сміт прымае гэтую выснову і развівае яе з максімальнай дакладнасцю. Ён піша:

"Як толькі пэўныя прыватныя асобы будуць мець назапашаныя капіталы, сярод іх знойдуцца такія, якія, натуральна, аддадуць гэтыя капіталы спраўным людзям, забяспечаць іх сыравінай і сродкамі для жыцця з мэтай пасля атрымаць прыбытак ад продажу тавараў, зробленых іх рукамі, або, іншымі словамі, з мэтай атрымаць прыбытак з вартасці, якую дадае праца гэтых рабочых да вартасці сыравіны. Калі гатовы прадукт абменьваецца або на грошы, або на пэўную колькасць працы,

[1] *Ibid., p.110.*
[2] *Ibid., p.111.*

або на іншыя тавары, неабходна, каб звыш таго, чаго дастаткова для аплаты кошту сыравіны і выплаты заробку рабочых, пэўная сума ішла на прыбытак прадпрымальніка, які ўкладае свае капіталы ў гэтую справу. Такім чынам, вартасць, якую дадаюць да сыравіны рабочыя, складаецца з 2 частак, адна ідзе на выплату заробкаў, а другая — на атрыманне прыбытку прадпрымальнікам..."[1]

Аўтар *"Багацця народаў"* добра разумее, што ўкладзеныя капіталы павінны прыносіць прыбытак іх укладальніку і што норма прыбытку, г. зн. прапорцыя прыбытку да ўкладзенага капіталу, мае тэндэнцыю выроўнівацца ва ўсіх галінах, бо кожны капіталіст імкнецца ўкладаць свае капіталы ў тую галіну дзе з іх атрымліваецца найбольшы прыбытак. Дзве акалічнасці могуць абумоўліваць розніцу ў роўнях прыбытку: неаднолькавая "прыемнасць" ад укладання капіталу ў тую ці іншую галіну, і, з другога боку, "бяспека ці рызыкоўнасць тых ці іншых аперацыяў, дзе бярэ ўдзел капітал"[2].

Аўтар канстатуе, што працэнт з капіталу — гэта частка прыбытку. Той, хто бярэ пазыку, саступае гэтую частку прыбытку крэдытору за тое, што атрымаў у сваё распараджэнне капітал, якім сам не валодаў. Звычайна працэнт пад пазыку ніжэйшы, чым норма прыбытку, а розніца паміж імі ўяўляе сабою нешта накшталт страхавога ўнёску, які выплочвае крэдытор, бо ён атрымлівае гарантаваны даход, тады як той, хто працуе, безумоўна рызыкуе. "Рызыкуе той, хто бярэ пазыку, ён, так бы мовіць, страхуе крэдытора"[3].

В) Зямельная рэнта

У пытанні зямельнае рэнты даследванні Сміта таксама маюць вельмі важкае значэнне.

Ён сцвярджае, што рэнта — гэта розніца паміж коштам ураджаю і, з другога боку, сумай заробкаў і выплат за колькасць працы і капіталу, неабходных для атрымання гэтага ўраджаю. Сміт адзначае, што гэтая розніца выплочваецца землеўладальніку, бо ён аддае ў арэнду сваю зямлю. Зямлю бярэ ў арэнду той фермер, які прапанаваў самыя выгадныя ўмовы. Паколькі фермераў, якія хочуць аранда-

[1] *Ibid., p.66.*
[2] *Ibid., p.147.*
[3] *Ibid., p.130.*

ваць зямлю, шмат, а колькасць зямлі абмежаваная, дык землеўладальнік скарыстоўвае з гэтага манапольнага становішча.

"Арэндная плата, — пісаў Сміт, — г. зн. кошт карыстання зямлёй, звычайна ёсць максімальны кошт, які фермер можа заплаціць у тых абставінах, калі гэтая зямля здаецца ў арэнду. Пад час заключэння ўмоваў арэнды землеўласнік робіць усё магчымае, каб з канчатковага прадукту арандатару не засталося ні кропелькі болей за суму, неабходную для пакрыцця капіталу, выдаткаванага на куплю насення, аплату працы, набыццё і ўтрыманне жывёлы, а таксама пакупку прыладаў працы, патрэбных для апрацоўкі зямлі. Апрача таго, арандатар атрымлівае прыбытак, роўны таму, які ў сярэднім атрымліваюць тутэйшыя сяляне. Вядома, што прыбытак фермера — гэта мінімум, якім ён можа задаволіцца, і землеўладальнік рэдка пагаджаецца павялічыць яго"[1].

Крыху далей аўтар робіць выснову:

"Арэндная плата за зямлю, г. зн. кошт карыстання зямлёй, звычайна ёсць манапольным коштам"[2].

Відавочна, паўстае неабходнасць вызначыць, якім чынам вылічыць *ровень* арэнднай платы на пэўны момант і для пэўнай зямлі. У спробе растлумачыць гэта Сміт ідзе даволі памылковым шляхам і высоўвае блытаныя, непаслядоўныя тэзісы. Тым не менш разуменне манапольнасці арэнднае платы мае велізарнае значэнне, бо тым самым канчаткова руйнуецца дактрына фізіякратаў пра выключную прадукцыйнасць зямлі. Зямельная рэнта не дар прыроды, але паходзіць галоўным чынам з манапольнага становішча, у якім знаходзяцца зямельныя ўласнікі.

Г) Заробкі працаўнікоў непрадукцыйнага сектара

Здавалася б, праблема паходжання даходаў цалкам развязаная, бо ўжо вялася гаворка пра заработную плату, прыбыткі і рэнту. Але варта разглядзець яшчэ адну катэгорыю даходаў: даходы індывідаў, якія жывуць за кошт сваёй працы (адрозна ад капіталістаў і зямельных уласнікаў), але якія не належаць да прадукцыйнага сектара эканомікі.

У якасці прадукцыйных працаўнікоў Сміт разглядаў тых людзей, якія бяруць удзел у вытворчасці матэрыяльных рэчаў і іх размеркаванні сярод спажыўцоў. Усе іншыя асо-

[1] *Ibid., p. 187.*
[2] *Ibid., p. 187.*

бы, якія жывуць за кошт сваёй працы, займаюцца непрадукцыйнай дзейнасцю; да другой катэгорыі галоўным чынам належаць хатнія слугі, чынавенства, прадстаўнікі свабодных прафесіяў, а таксама вытворцы паслугаў наагул[1].

Прымем такое вызначэнне на пэўны час і прасочым, якія высновы робіць з яго Сміт.

Ён кажа, што вартасць нацыянальнага прадукту роўная суме заробкаў прадукцыйных працаўнікоў плюс прыбыткі і зямельныя рэнты. Атрымальнікі гэтых даходаў плоцяць падаткі дзяржаве, якая выкарыстоўвае іх на аплату працы сваіх чыноўнікаў. Такім чынам, заробкі чыноўнікаў (а гэта непрадукцыйныя працаўнікі) выплочваюцца за кошт даходаў, якія ствараюцца непасрэдна ў працэсе вытворчасці і пасля пераліваюцца ў дзяржаўную скарбонку.

У сваю чаргу капіталісты і землеўладальнікі наймаюць хатнюю прыслугу. Заробкі апошніх таксама "трансфертныя даходы", калі ўжыць сучасную тэрміналогію.

Нарэшце, усе людзі плоцяць за паслугі прадстаўнікоў свабодных прафесіяў (юрыстаў, напрыклад). Заробкі гэтых асобаў уяўляюць па сабе трансфертныя даходы першага ці другога роўню.

Такім чынам, мы маем акрэсленую мадэль утварэння даходаў, якая на працягу доўгага часу будзе служыць асновай для дыскусіяў ангельскіх эканамістаў і пэўныя аспекты якой выглядаюць досыць сучасна (у прыватнасці, розніца паміж першапачатковымі і трансфертнымі даходамі).

Дзякуючы наступнай табліцы можна надаць гэтай схеме больш абагульнены выгляд.

Аднак нельга не адзначыць, што Смітава азначэнне непрадукцыйнай працы даволі спрэчнае.

Ён кажа, што непрадукцыйнаю ёсць праца, якая ніякім чынам "не ўвасабляецца ні ў адной рэчы ці тавары, якія могуць быць прададзеныя"[2]. Ён прылічае да непрадукцыйных працаўнікоў не толькі хатніх слугаў і чыноўнікаў, але яшчэ й:

[1] *Ibid., pp.413-414.*
[2] *Ibid., p.414.*



"...святароў, юрыстаў, медыкаў і пісьменнікаў усіх гатункаў, а таксама камедыянтаў, блазнаў, музыкаў, оперных спевакоў, танцоўшчыкаў і г.д." Сапраўды, кажа Сміт, "праца ўсіх іх, напрыклад дэкламацыя камедыянта, красамоўства рытара або ігра музыкі, знікае ў той жа момант, калі вырабляецца"[1].

Гэта памылковае меркаванне, бо камедыянт, які заняты ў спектаклі, стварае тавар — спектакль, які прадаецца публіцы за пэўны кошт. Гэты кошт можа і павінны ўлічвацца пры падліку вартасці нацыянальнага прадукту.

І наадварот, Сміт мае рацыю, калі лічыць хатнюю прыслугу, чыноўнікаў і бальшыню прадстаўнікоў свабодных прафесіяў непрадукцыйнымі працаўнікамі. Слуга працуе па хатняй гаспадарцы, яго праца не стварае дабротаў, якія могуць прадавацца на рынку. Функцыянеры, якія забяспечваюць належную працу дзяржаўнай службы, не прадаюць свае паслугі. Нарэшце, відаць, нельга сцвярджаць, што прадстаўнікі свабодных прафесіяў ствараюць вартасці, якія прадаюцца на рынку. Даходы адваката ці пісьменніка занадта цесна спалучаныя з іх асобамі, што не дазваляе разглядаць гэтыя даходы як цану тавару, бо тавар па сваім вызначэнні ёсць стандартызаваная рэч, якая вырабляецца рэгулярна з мэтаю продажу.

[1] *Ibid., p.414.*

Варта зразумець, што капіталістычная сістэма стварае ўнутры грамадства асаблівую сферу актыўнасці і стасункаў, якую можна даследваць з дапамогаю колькасных метадаў палітычнай эканоміі, бо для гэтай сферы характэрная наяўнасць менавай вартасці. Зразумела, нельга сцвярджаць, што гэтая сфера поўнасцю ізаляваная ўнутры сукупнасці грамадскіх дачыненняў. Стварэнню вартасцяў, у прыватнасці, спрыяе дзейнасць дзяржавы, якая забяспечвае рух тавараў і асобаў. Але, безумоўна, трэба дакладна акрэсліць сферу стварэння і абарачэння вартасцяў, калі мы хочам зрабіць правільны аналіз капіталістычнага грамадства.

§ 6. Супярэчнасці інтарэсаў унутры грамадства

Нягледзячы на пэўныя хібы, Смітаў аналіз абарачэння капіталу і ўтварэння даходаў, як мы ўжо бачылі, намнога лепшы за вучэнне фізіякратаў. Можна было б спадзявацца, што, калі рухацца па ўжо працярэбленым шляху, неўзабаве можна было б прыйсці да тлумачэння прынцыпаў функцыянавання капіталістычнай сістэмы, з якімі пагодзяцца ўсе. Але на практыцы адбылося зусім не так. На думку іншых даследнікаў, працы Сміта мелі непажаданы ўплыў таму, што ён занадта падрабязна асвятляў супярэчнасці, якія існуюць у нетрах капіталістычнае эканомікі.

З аднаго боку, такое даследванне штурхае да высновы (папраўдзе, даволі дзіўнай), што інтарэсы гандляроў і прамыслоўцаў ідуць насуперак усеагульнаму інтарэсу грамадства. З другога боку, даследванне раскрывае супярэчнасць, якая існуе паміж інтарэсамі найманых працоўных і іх працадаўцаў.

У раздзеле пра зямельную рэнту Сміт прыходзіць да высновы, што вартасць сельскагаспадарчых прадуктаў павінна або заставацца нязменнаю, або павялічвацца, тым часам як кошт прамысловых тавараў мусіць памяншацца.

Перш за ўсё павінны заставацца нязменным кошт збожжа — асноўнага прадукту сельскай гаспадаркі.

"На ўсіх разнастайных роўнях развіцця краіны заўсёды будзе патрабавацца ў сярэднім прыкладна адна і тая ж колькасць працы дзеля таго,

каб павялічваць вытворчасць збожжа на той самай глебе і пры тым самым клімаце, паколькі няспынны рост прадукцыйнасці працы разам з удасканальваннем апрацоўкі глебы будзе ўраўнаважвацца няспынным ростам коштаў на жывёлу, якая ёсць асноўнаю прыладаю працы земляроба"[1].

Паводле Сміта, вартасць іншых сельскагаспадарчых тавараў (у прыватнасці, жывёлы) павінна таксама павялічвацца. У якасці абгрунтавання гэтага сцверджання ён высоўвае досыць сумнеўныя аргументы.

Затое:

"Натуральным памкненнем дзеля ўсеагульнага развіцця ёсць забеспячэнне паступовага зніжэння рэальнага кошту практычна ўсіх мануфактурных вырабаў. Лепшыя машыны, кваліфікаванасць і лепшыя падзел і размеркаванне працы — усё гэта натуральныя вынікі развіцця краіны, і дзякуючы ім дзеля вытворчасці той ці іншай рэчы патрабуецца ўсё меншая колькасць працы".

Такім чынам, вартасць прамысловых вырабаў будзе памяншацца.

Нам вядома таксама, што аўтар *"Багацця народаў"* лічыў, што рэальныя заробкі застаюцца нязменнымі, зямельная рэнта павінна павялічыцца разам з пашырэннем нацыянальнага багацця, а норма прыбытку павінна зменшыцца.

Памяншэнне нормы прыбытку тлумачыцца канкурэнцыяй, якая будзе ствараца з-за росту капіталу[2]. Пры гэтым Сміт выказваў думку, што існуе абавязковая сувязь паміж эвалюцыяй розных тыпаў даходаў. У прыватнасці, ён пісаў:

"Найвышэйшы ровень, якога могуць дасягнуць звычайныя прыбыткі, — ровень, які атрымліваецца, калі ў прыбытак ідзе тая частка, якая магла быць выдаткаваная на зямельную рэнту і, апрача таго, на аплату працы па вырабе тавару і вывядзенні яго на рынак, а выдаткоўваецца мінімальная сума, г. зн. сума, якая толькі-толькі дазваляе рабочаму існаваць"[3].

Выснова з усіх гэтых даследванняў, якія знаходзяцца напрыканцы раздзела аб зямельнай рэнце, робіцца наступная: інтарэсы зямельных уласнікаў і найманых рабочых супадаюць з агульным інтарэсам грамадства (бо адначасова з павелічэннем іх даходаў павялічваецца і нацыянальны даход), тым часам як інтарэсы купцоў і ўладальнікаў ману-

[1] *Ibid., p.238.*
[2] *Ibid., p.120.*
[3] *Ibid., p.130.*

фактураў супярэчаць агульнаму інтарэсу (бо ровень іх прыбыткаў памяншаецца, калі павялічваецца нацыянальнае багацце).

Гэткае сцверджанне прыводзіць аўтара *"Багацця народаў"* да канцэпцыі ролі розных класаў у грамадстве, якая сведчыць пра ягоную блізкасць да фізіякратаў.

Вучоны кажа, што трэба вельмі насцярожана ставіцца да патрабаванняў купцоў і ўладальнікаў мануфактураў:

"Прыватныя інтарэсы тых, хто працуе ў гандлі ці прамысловасці, заўсёды ў пэўнай ступені адрозніваюцца і нават супярэчаць дзяржаўнаму інтарэсу. Купец заўсёды мае на мэце павялічыць рынак і абмежаваць канкурэнцыю з боку гандляроў. Даволі часта ягоны інтарэс у справе павелічэння рынку можа стасавацца з агульным інтарэсам, але абмежаванне канкурэнцыі для гандляроў заўсёды супярэчыць агульнаму інтарэсу. Такія захады мелі б адзін плён: павелічэнне прыбыткаў купцоў звыш натуральнае мяжы, а таксама рост несправядлівых пабораў, якія яны спаганяюць на сваю карысць са сваіх жа суграмадзянаў. Такім чынам, усялякі законапраект або прапанова па рэгламентацыі гандлю, якія зыходзяць ад гэтай катэгорыі людзей, заўсёды павінны ўспрымацца з найвялікшаю перасцярогай"[1].

Што да найманых працоўных, дык Сміт сцвярджаў, што іх інтарэсы супадаюць з інтарэсамі грамадства, бо эканамічны прагрэс спрыяе павелічэнню рэальных заробкаў, ва ўсякім разе на кароткі тэрмін.

"Аднак, — дадаваў філосаф, — рабочы няздольны спазнаць агульны інтарэс ці адчуць сувязь апошняга з яго ўласным інтарэсам. Ягонае становішча не пакідае часу на неабходныя разважанні; але нават дапускаючы, што ён мог бы ўсвядоміць гэтыя інтарэсы, ягоная адукацыя і звычкі такія, што ён пры гэтым не здолеў бы зрабіць належных захадаў. Таму пры развязанні палітычных праблемаў ніхто не пытае меркавання працоўнага"[2].

Не будзем спрачацца, ці справядлівыя гэтыя развагі, звернем увагу на тую лёгкасць, з якою аўтар пагаджаецца са становішчам, што выключала з грамадскага жыцця вялікую колькасць людзей.

Што ж тады застаецца рабіць ураду? Абаперціся на клас зямельных уласнікаў.

"Калі нацыя, — пісаў Сміт, — вырашае пытанне пра ўладкаванне гандлю або сістэмы кіравання, зямельныя ўласнікі не будуць прапаноў-

[1] *Ibid., p.324.*
[2] *Ibid., p.322.*

ваць памылковага шляху, нават калі будуць прыслухоўвацца да голасу інтарэсу толькі свайго класа, прынамсі, пры ўмове, што ў іх ёсць якое-кольвечы ўяўленне, у чым палягае гэты інтарэс"[1].

Зрэшты, Сміт добра ведаў, што звычайна землеўласнікі кепска ўсведамляюць, у чым палягае іх інтарэс. Аднак найлепшы варыянт, лічыць ён, аддаць уладу ў рукі землеўладальнікаў.

Такім чынам, заснавальнік ангельскага эканамічнага лібералізму зусім не быў паслядоўным абаронцам патрабаванняў купцоў і прамыслоўцаў. Можна было б нават паспрабаваць зрабіць з яго супраціўніка гэтых класаў, калі не ведаць, што ў іншых месцах Сміт цалкам прызнаваў: дзейнасць гандлёвай буржуазіі неабходная для развіцця эканомікі. Як бы там ні было, можна зразумець, чаму потым паслядоўныя абаронцы інтарэсаў гандлю і прамысловасці імкнуліся перагледзець асобныя падыходы Сміта.

Яшчэ адна, сама важкая прычына, чаму гэтыя падыходы горача аспрэчваліся пазней, вось якая: Сміт непрыхавана апісваў прыгнёт найманых рабочых з боку іншых класаў грамадства, які сапраўды існаваў у тыя часы.

Перш-наперш у раздзеле пра заробкі Сміт раскрывае чытачу таямніцу, як гаспадары знаходзяць паразуменне з мэтаю навязаць рабочым, якім забаранялася ствараць звязы, найцяжэйшыя ўмовы працы і мінімальныя заробкі. Ён не без пэўнай сімпатыі апісваў паўстанні рабочых.

"Яны ў роспачы, — пісаў філосаф, — і дзейнічаюць з шаленствам і лютасцю людзей, што страцілі надзею. Іх паставілі перад выбарам: або памерці з голаду, або пагрозаю вырваць у сваіх гаспадароў нязначную саступку сваім патрабаванням"[2].

Праўда, потым аўтар сцвярджаў, што гэтыя паўстанні не дадуць ніякага іншага выніку, апрача "пакарання ці смерці завадатараў бунту"[3]. Але такі вынік абумоўлены сілаю гаспадароў, а зусім не справядлівасцю іхнае справы. Цяпер мы разумеем, чаму аналіз Сміта мог здацца небяспечным. Больш таго, уся тэорыя ўтварэння даходаў, распрацаваная

[1] *Ibid., p.321.*
[2] *Ibid., p.87.*
[3] *Ibid., p.87.*

ў *"Багацці народаў"*, падкрэслівала той факт, што чым меншую частку ад сукупнага даходу атрымліваюць найманыя рабочыя, тым большымі будуць даходы іншых катэгорыяў насельніцтва. Безумоўна, сам Сміт тлумачыў, што ў канчатковым рахунку размеркаванне даходаў ажыццяўляецца на падставе ненапісаных законаў, але, бясспрэчна, шматлікія радкі яго кнігі могуць даць аргументы абаронцам інтарэсаў працоўных.

Напрыклад, у раздзеле, прысвечаным калоніям, Сміт сцвярджаў, што ў Амэрыцы заробкі больш высокія, бо там зямлі больш, а працоўная сіла — нешматлікая. Пасля гэтага дадаваў:

"Ва ўсіх жа іншых краінах рэнта і прыбыткі павялічваюцца за кошт заробкаў, а апошнія зводзяцца практычна на нішто, прычым два вышэйшыя класы прыгнятаюць трэці"[1].

Гэтая кароткая фраза прапануе далёкае ад ліберальнага бачанне эканомікі. Сам Сміт лёгка прыміраецца з несправядлівасцю, выказваецца на карысць лібералізму, але іншыя на грунце гэтага самага аналізу могуць зрабіць зусім іншыя высновы.

Сміт зрабіў большы, чым хто, унёсак у стварэнне і распаўсюджванне ліберальнай дактрыны. Але мы ведаем, што ўзапраўды ён не быў перакананым прыхільнікам тэорыі, якая ўважала грамадства дасканала арганізаваным і зладжаным механізмам.

На думку Сміта, наадварот, сацыяльны механізм шмат у чым недасканалы. Безумоўна, гэтыя недасканаласці былі заўгодныя творцу прыроды, і, на думку Сміта, няма чаго вынаходзіць на іх нейкія лекі. Пры гэтым Сміт не баяўся пазнаёміць з імі свайго чытача, што сталася прычынаю крытыкі з боку многіх яго паслядоўнікаў, якія ў такой шчырасці ўбачылі небяспеку для грамадскага парадку.

[1] *Ibid., II, p.175.*

§ 7. Эканамічны прагрэс паводле тэорыі і паводле гісторыі

Увесь твор Сміта, пра што сведчыць і сам ягоны назоў, прысвечаны раскрыццю прычынаў эканамічнага росту.

У першым тэзісе, шырока распрацаваным аўтарам, сцвярджаецца, што ўзбагачэнне народаў ідзе праз назапашванне капіталу і што гэтае назапашванне ў сваю чаргу залежыць ад схільнасці багатых класаў да ашчаджання.

Капітал дазваляе павялічваць прадукцыйнасць працы, а таксама колькасць прадукцыйных працаўнікоў; тым самым ён дазваляе павялічыць нацыянальны прадукт.

У раздзеле "Багацце народаў", прысвечаным назапашванню капіталу, аўтар увогуле не ўздымае пытання пра рынкі збыту, неабходныя для пашырэння памераў вытворчасці. Ён не закранае гэтае праблемы, бо робіць значную памылку, сцвярджаючы, што ўся сукупнасць штогадовага *валавога* прадукту роўная суме заробкаў, прыбыткаў і рэнтаў[1].

З аднаго боку, Сміт сцвярджае, што сумы, якія на працягу года выдаткоўваюцца на падтрыманне і аднаўленне вытворчага абсталявання, гэта значыць на амартызацыю, не ўваходзяць асобнаю часткай у штогадовы валавы прадукт. Гэтыя сумы ўваходзяць у аплату заробкаў. Безумоўна, гэта так, але ўсё роўна апрача выплачаных на працягу года заробкаў, прыбыткаў і рэнтаў у вартасць штогадовага прадукту трэба таксама ўключаць вартасць выкарыстанага за год абсталявання, бо валавы нацыянальны прадукт падлічваецца *да таго*, як будзе адноўленае абсталяванне.

За першаю памылкай Сміт робіць і другую, а менавіта сцвярджае, што само па сабе ашчаджанне выклікае на працягу года попыт на спажывецкія тавары.

"Тое, што кожны год ашчаджаецца, — пісаў ён, — заўсёды ідзе на спажыванне, таксама як тое, што выдаткоўваецца, і гэта адбываецца практычна адначасова, але яно спажываецца іншаю катэгорыяй людзей. Тая частка даходу багатага чалавека, якую ён выдаткоўвае, часцей за ўсё спажываецца "непатрэбнымі ратамі" і слугамі, якія нічога не пакідаюць замест свайго спажывання. Тая ж частка, якую ён штогод ашчаджае

[1] *Ibid., liv.II, chap.III, op. cit.,I, p.345 et p.346.*

і якую выкарыстоўвае ў якасці капіталу з мэтай атрымання прыбытку, спажываецца адначасова з першай, але спажываецца іншай катэгорыяй людзей: рабочымі, фабрыкантамі і рамеснікамі, якія з прыбыткам аднаўляюць вартасць іхнага штогадовага спажывання"[1].

Сцверджанне Сміта памылковае, бо частка штогадовых даходаў, якая ашчаджаецца, не спажываецца на працягу года, яна ідзе на набыццё дадатковых сродкаў вытворчасці, якія ўваходзяць у чысты нацыянальны прадукт. Аўтар *"Багацця народаў"* робіць вялікую памылку, і асабліва шкада, што яна перашкаджае яму заўважыць, як ашчаджанне стварае дэфіцыт сукупнага попыту, які павінны ўраўнаважыцца ростам попыту на сродкі вытворчасці; дзеля гэтае памылкі ён таксама не падняў праблему рынкаў збыту.

Сапраўды, у тэорыі Сміта дамінуе тэзіс пра тое, што ашчаджанне і свабода гандлю — неабходныя і *дастатковыя* ўмовы эканамічнага росту.

У кнізе IV *"Багацця народаў"* Сміт накіроўвае знішчальную крытыку ў бок "меркантылісцкай сістэмы", прыхільнікі якой сцвярджалі, што павелічэнню багацця можна спрыяць праз рэгламентацыю гандлю з замежжам. Сміт жа імкнецца даказаць, што кожны з захадаў умяшання прыносіць больш шкоды, чым карысці. Асноўны аргумент: усялякае ўмяшанне ў эканоміку штучна стрымлівае капітал ад выкарыстання ў той галіне, куды ён спантанна накіроўваецца і дзе — гэта яшчэ адно пацверджанне таго, што аўтар мае рацыю, — ён выкарыстоўваўся б больш плённа.

Праілюструем думку Сміта адным з прыкладаў — пытаннем падаткаў на імпарт з мэтаю абараніць нацыянальную прамысловасць.

Сміт кажа, што калі нейкая краіна імкнецца набыць за мяжою пэўныя тавары, дык гэта азначае, што дадзеныя тавары за мяжою каштуюць танней. Калі чыніць перашкоды імпарту, айчынны капітал будзе разыходзіцца на вытворчасць тавараў, якія да гэтага набываліся за мяжою, хаця яго маглі б інвеставаць у вытворчасць тавараў, якія б ішлі на аплату імпарту. Але

[1] *Ibid., p.423.*

"...гэты тавар можна было б набыць за мяжою танней, чым каштуе яго выраб унутры краіны; такім чынам, можна было б набыць гэты тавар, калі прадаць толькі частку тавараў, якія вырабляюцца нацыянальнай прамысловасцю пры ўкладанні такой жа колькасці капіталу, калі б дзяржава не ўмешвалася ў пытанні выкарыстання капіталу. У выніку з прычыны абмежавання імпарту нацыянальная вытворчасць ад максімальна плённага функцыянавання пераходзіць да мінімальна плённага"[1].

Пры гэтым Сміт сам сабе робіць заўвагу, нібыта ўмяшанне можа быць апраўданае, калі, напрыклад, падвышэнне мытных пошлінаў спрыяе стварэнню мануфактураў, якія будуць займацца вытворчасцю тавараў; яны *спачатку* будуць каштаваць больш, чым іх замежныя аналагі, але праз пэўны прамежак часу патаннеюць. На заўвагу, якая стане класічнай, аўтар адказвае так: *неўзабаве* зменшыцца нацыянальны даход, а ў выніку затармозіцца назапашванне капіталу, запаволіцца развіццё краіны. Выгады ад *будучага* выпуску таннай прадукцыі, на думку Сміта, не пераважаць стратаў ад запавольвання тэмпаў развіцця.

Зразумела, сёння мы ведаем, што вучоны памыляўся і што краіне, каб правесці індустрыялізацыю, часта трэба адгароджвацца мытнымі бар'ерамі. Але асабліва трэба падкрэсліць, што на гэтых поглядах на гандаль з замежжам грунтуецца памылковы тэзіс, адпаведна з якім свабодны капітал заўсёды можна лёгка інвеставаць у сектары, якія працуюць на нутраны рынак.

Тэзіс настолькі відавочна памылковы, што сам Сміт адмаўляецца ад яго, калі ў раздзеле VII чацвертай кнігі закранае важнае пытанне гандлю з калоніямі. Гэтым разам яго рэалістычны розум на нейкі час перамагае выказаныя раней думкі. Ён бліскуча аналізуе ролю, якую адыгрываў і працягвае адыгрываць каланіяльны гандаль як асноўны стымулятар развіцця ангельскай прамысловасці.

"Эфект каланіяльнага гандлю, — пісаў Сміт, — гэта адкрыццё вялікага, хоць і далёкага рынку для тае часткі прадукцыі ангельскай прамысловасці, якой бракуе попыту больш блізкіх рынкаў... У сваім свабодным і натуральным стане каланіяльны гандаль не пазбаўляе прадукцыі блізкія рынкі (бо яна традыцыйна прадавалася на гэтых рынках) і заахвочвае Вялікабрытанію няспынна нарошчваць лішак прадукцыі, бо наўзамен

[1] *Ibid., II, p.37.*

сваёй прадукцыі краіна будзе атрымліваць новыя і новыя эквіваленты. Свабодны і натуральны каланіяльны гандаль спрыяе павелічэнню ў Вялікабрытаніі колькасці прадукцыйнай працы..."[1]

Далей Сміт удакладняе, што дзякуючы пашырэнню замежных рынкаў збыту нутраны ангельскі рынак таксама будзе павялічаны. Ён піша:

"Рабочыя эўрапейскіх мануфактураў, якіх гандаль з калоніямі забяспечвае працай, утвараюць новы рынак збыту для сельскагаспадарчых прадуктаў, напрыклад гандаль з Амэрыкай выклікае надзвычайнае пашырэнне самага выгоднага з усіх рынкаў у Эўропе, нутранога рынку збыту збожжа і жывёлы, хлеба і мяса"[2].

Відавочна, тут Сміт натхняецца ідэямі, якія мы ўжо сустракалі ў ягонага сябра Х'юма. Як і папярэднік, Сміт пераканаць ў тым, што свабода гандлю дазволіць заваяваць за мяжою, калі будзе патрэба і наколькі будзе патрэба, рынкі збыту, неабходныя прамысловасці. Вучоны тлумачыў:

"Калі прадукцыя пэўнай галіны прамысловасці пераўзыходзіць попыт у сваёй краіне, неабходна накіроўваць лішак вырабаў у замежжа дзеля таго, каб абмяняць яго на тое, што трэба ўнутры краіны. Без экспарту сталася б незапатрабаванаю частка прадукцыйнай працы дзяржавы і абавязкова паменшыўся б яе штогадовы нацыянальны прадукт"[3].

І далей дадаў:

"Калі маса капіталаў краіны дасягае такога роўню, што яна больш не можа цалкам выкарыстоўвацца на забеспячэнне спажывання ўнутры краіны і атрымліваць даход ад сваёй прадукцыйнае працы, тады лішак гэтых капіталаў натуральна накіроўваецца ў транспартны гандаль"[4].

Менавіта слова "натуральна" дае нам ключ да разумення сістэмы мыслення Сміта. З аднаго боку, ён лічыць, што часцей за ўсё пытанне рынкаў збыту не паўстае і што яго можна ігнараваць. Але калі яно ўсё ж паўстае, дык вырашаецца аўтаматычна, бо капіталы, якія зрабіліся лішнімі ўнутры краіны, "натуральна" накіроўваюцца ў замежны гандаль і суднаходства.

Гэтая ідэя знаходзіцца ў цэнтры ўвагі трэцяй кнігі *"Багацця народаў"*, у якой Сміт імкнецца зрабіць агляд "розных шляхоў да павелічэння багацця ў розных народаў".

---

[1] *Ibid., p.236.*
[2] *Ibid., p.238.*
[3] *Ibid., I, p.465.*
[4] *Ibid., I, p.466. (Гаворка ідзе аб марскім транспарце.)*

У трэцяй кнізе прысутнічаюць два розныя аналізы. З аднаго боку, *тэорыя* эканамічнага развіцця, якая прэтэндуе на адкрыццё ўсеагульнай мадэлі росту. А з другога боку — *гісторыя* эканамічнага развіцця Заходняй Эўропы. Але так сталася, што гісторыя ўваходзіць у відавочную супярэчнасць з тэорыяй. Заўсёды шчыры, Сміт нават не спрабуе хаваць гэтага і толькі заўважае, што гісторыя Заходняй Эўропы ўяўляе сама па сабе вынятак з "натуральнае хады працэсу павелічэння багацця" і што трэба вярнуцца да гэтае "натуральнае хады". Менавіта да такой дзіўнай памылкі прыводзіць яго не такая катэгарычная, як фізіякратаў, але тым не менш відавочная прыхільнасць да натуралістычнага бачання эканомікі.

Тэорыя эканамічнага росту, якую аўтар распрацоўвае ў трэцяй кнізе, уражвае сваёю прастатой. Капіталы, паводле Сміта, спачатку складваюцца ў сельскай гаспадарцы і інвестуюцца ў сельскую гаспадарку. Потым з прычыны памяншэння рэнтабельнасці ў гэтым сектары эканомікі іх укладаюць у мануфактуры. Нарэшце, калі прамысловасць перанасычваецца капіталам, яго інвестуюць у міжнародны гандаль.

Сміт лічыць, што ажыццяўленне гэтага "натуральнага плана" адбываецца на яго вачах у Новым Свеце, але не адмаўляе, што ў Старым Свеце эканамічныя працэсы развіваліся па-іншаму. Пасля падзення Рымскай імперыі прагрэс у сельскай гаспадарцы быў запаволены існаваннем феадальных традыцыяў і рэгламентацыяў, якія перашкаджалі свабоднаму руху капіталаў. Тады ўзнікла неабходнасць, каб развіццё міжнароднага гандлю і мануфактураў папярэднічала і дало імпульс развіццю сельскай гаспадаркі. Са з'яўленнем мануфактурнай вытворчасці зямельныя ўласнікі карэнным чынам змянілі свае паводзіны. Замест таго каб карміць натоўп слуг, яны набывалі прадметы раскошы, і гэта скараціла колькасць непрадукцыйных працаўнікоў. Адначасова з мэтаю павелічэння сваіх даходаў яны змянілі спосаб гаспадарання:

"Менавіта таму ў большай частцы Эўропы гандаль і гарадскія мануфактуры замест таго, каб быць вынікам сельскай гаспадаркі і ўзбагачэння вёскі, сталі прычынаю і шанцам для апошніх"[1].

[1] *Ibid., p.513.*

Такім чынам, Сміта нельга папракнуць, як можна было папракнуць Кенэ, у ігнараванні гісторыі. Тым не менш вывучэнне ягонае творчасці, як і творчасці фізіякратаў, дазваляе ўбачыць фундаментальную загану тагачаснай палітычнай эканоміі: для Эдама Сміта відавочна, што калі гісторыя супярэчыць эканамічнай тэорыі, дык памыляецца менавіта гісторыя.

Сміт сцвярджаў, што "хада" эканамічнага прагрэсу ў Еўропе ненатуральная; а значыць, гэтая хада "абавязкова запаволеная і няпэўная"[1]. Эканамічнае ж развіццё Амэрыкі "натуральнае" і непараўнальна больш хуткае. З другога боку, прыклад шматлікіх рэгіёнаў паказвае, што "капітал, створаны ў краіне дзякуючы гандлю і мануфактурам, заўсёды вельмі нетрывалы і няпэўны, бо ніякая яго частка не будзе забяспечвацца ўкладаннем у сельскую гаспадарку і ў паляпшэнне глебы"[2].

Пасля прачытання гэтых радкоў становіцца зразумелым, чаму Сміт, які ў пытанні калоніяў вельмі дакладна падкрэсліваў ролю замежных рынкаў збыту для прамысловага развіцця Ангельшчыны, мог пры гэтым бадай што цалкам ігнараваць праблему рынкаў збыту на ўсіх іншых старонках свайго твора. Атрымліваецца, што для яго магчымасць перавытворчасці і лішку капіталаў натуральна ўзнікае толькі на апошняй стадыі развіцця краіны. На працягу першых дзвюх стадыяў "натуральнае хады прагрэсу" — стадыі ўкладання грошай у сельскую гаспадарку, а потым стадыі ўкладання грошай у прамысловасць — не можа паўстаць ніякіх праблемаў. І толькі пасля першых дзвюх стадыяў настае момант, калі замежныя рынкі збыту робяцца карыснымі.

Больш таго, па дасягненні краінай гэтае стадыі, вонкавыя рынкі збыту могуць толькі адцягнуць надыход непазбежнага моманту, калі будзе дасягнуты "статычны стан", калі грамадства "ўздымецца да роўню максімальнага багацця, на якое яно здольнае"[3]. Такім чынам, замежныя рын-

[1] *Ibid., p.513.*
[2] *Ibid., p.517.*
[3] *Ibid., p.112.*

кі збыту толькі часовы дапаможны сродак у працэсе эканамічнага росту, а зусім не адзін з яго асноўных элементаў.

Сміт застаецца непахісным прыхільнікам эканамічнага лібералізму. Магчыма, нідзе лепей не выказвае ён сваіх думак, чым у наступных радках: "Нават нязначнае закрананне інтарэсаў аднаго класа грамадзянаў з мэтаю паспрыяць нейкаму іншаму класу, безумоўна, супярэчыла б прынцыпам справядлівасці і роўнасці ў абароне іхных інтарэсаў, якія манарх павінны гарантаваць у дачыненні да ўсіх класаў грамадства"[1].

Такім чынам, менавіта прынцыпы справядлівасці і роўнасці патрабуюць неўмяшання дзяржавы. І тым не менш пра колькі несправядлівасцяў, пра якую няроўнасць піша аўтар у *"Багацці народаў"*! Але Сміт не пратэстуе супраць таго, што лічыць найменшым ліхам, бо ён таксама, хоць і ў меншай ступені, чым фізіякраты, разглядае грамадства ў якасці механічнае сістэмы, якую лепей не чапаць, калі не хочаш яе разладзіць.

Абараняючы Сміта, можна спаслацца на той неаспрэчны факт, што эканамічная палітыка, якая праводзілася ад эпохі Адраджэння, спарадзіла шмат крыўды. А ліберады, прынамсі аднойчы, у пытанні калоніяў сталі абараняць справядлівасць. Сам Сміт рашуча асуджаў "дзікунства і несправядлівасць", якія мелі месца пры захопе калоніяў[2].

Часам ён, здаецца, зычыць калоніям вызвалення, калі абвяшчае:

"Магчыма, далей тубыльцы стануць мацнейшыя або эўрапейцы стануць слабейшыя, ды будзе так, што насельнікі ўсіх розных частак свету будуць роўнымі па сіле і смеласці, якая адна, выклікаючы страх, змагла б прадухіляць несправядлівасці ў дачыненнях паміж незалежнымі краінамі і прышчапіць краінам асаблівую ўзаемапавагу"[3].

Аднак у выніку Сміт абмяжоўваецца адно патрабаваннем скасавання манапольнага гандлю з калоніямі[4]. Безумоў-

[1] *Ibid., II, p.298.*

[2] *Ibid., p.209.*

[3] *Ibid., p.258.*

[4] *Адзін з яго аргументаў палягае ў тым, што ўкладзены ў заморскі гандаль капітал абарочваецца марудней, чым капітал, укладзены ў іншыя галіны эканомікі, і дае меншы даход.*

на, ён шчыра верыць, што свабода гандлю аўтаматычна прывядзе да вызвалення калоніяў і да іх эканамічнага ўздыму.

Бібліяграфія

Існуе старая, але вельмі поўная біяграфія Сміта: J.Rae, Life of Adam Smith, London, 1895. Дадатковыя звесткі можна знайсці ў кнізе W. R. Scott, Adam Smith as Student and Professor, London, 1937.

Каб прачытаць аб поглядах Сміта, глядзі:

A.Delatour, *Adam Smith*, Paris, 1886.

G. R. Morrow, *The Ethical and Economic Theories of Adam Smith*, 1923.

Твор E.Cannan, *History of the theories of Production and Distribution in English Political Economy from 1776 to 1848*, London, 1903 (trad. franç., Histoire des théories de la production et de la distribution dans l'économie politique anglaise de 1776 à 1848, Paris, 1910) — гэта традыцыйная спасылка ў пытанні вывучэння поглядаў ангельскіх эканамістаў — прадстаўнікоў класічнай палітычнай эканоміі. Напісаная, аднак, у тыя часы, калі ў Вялікабрытаніі класічныя ідэі лічыліся канчаткова састарэлымі, кніга далёкая ад таго, каб быць здавальняючай.

Што да асноўных падыходаў, у прыватнасці да пытання вартасці, можна аддаць перавагу бліскучым даследванням гісторыка Elie Halevy, *La formation du radicalisme philosophique*, Paris, 1901—1904.

Філасофскі клімат, у якім нарадзілася класічная ангельская палітэканомія, быў не так даўно прааналізаваны ў творы N.Waszek *Man's social nature: a topic of the Scottisch enlightenment in his historical setting*. Francfort, Berne, New York, 1986.

Пра асобныя праблемы, якія датычаць вызначэння нацыянальнага даходу, можна шмат прачытаць у творы P.Studenski, *The income of Nations*, New York, 1958, які галоўным чынам уяўляе сам па сабе вельмі падрабязны гістарычны нарыс эвалюцыі фундаментальных канцэпцыяў у гэтай галіне.

Па пытанні вартасці будуць карыснымі:

R. L. Meek, *Studies in the Labour Theory of value*, London, 1956. — Smith, Marx and after, London, 1977.

Арыгінальны і спрэчны падыход да пытанняў, якія мы закраналі ў гэтым раздзеле, разглядаецца ў кнізе J.Cartelier, *Surproduit et reproduction, La formation de l'économie politique classique*, Grenoble, 1976.

Раздзел V

ДЗВЕ СПРОБЫ СТВАРЭННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ НАВУКІ НА ПРЫНЦЫПЕ КАРЫСНАСЦІ. КАНДЫЛЬЯК І БЭНТАМ

§ 1. Кандыльяк

У тым жа годзе, калі выйшаў у свет вялікі твор Сміта (1776), вядомы французскі філосаф абат Кандыльяк выдаў кнігу па палітычнай эканоміі пад назовам "*Гандаль і кіраванне, разгледжаныя ва ўзаемадачыненні*".

Гэты твор, які, дарэчы, застаўся нясканчаны, не такі вядомы, як "*Эканамічная табліца*" і "*Багацце народаў*", аднак ён выклікае цікавасць у нашыя дні, бо ўжо тады французскі філосаф прапанаваў такую канцэпцыю палітычнай эканоміі, якая карэнным чынам супярэчыла поглядам Кенэ і Сміта і якая тым не менш пазней знайшла шматлікіх прыхільнікаў.

Кандыльяк — адзін з тых філосафаў, якія імкнуліся звесці чалавечае пазнанне да пачуццёвага. Тым самым назусім адхілялася картэзіянская тэорыя "прыроджаных ідэяў".

Картэзіянская філасофія спазнання паўплывала на тэорыю фізіякратаў, а таксама, праз Лока, на Эдама Сміта. У апошняга, гэтаксама як і ў Кенэ, мы заўважаем метад, адначасова эмпірычны і канцэптуальны. Гэта метад, як лічаць, дапамагае не толькі даследваць рэчаіснасць, але таксама спазнаць ісціну праз аналіз асобных фундаментальных паняццяў, такіх, як вытворчасць або вартасць. Інтэгральны эмпірызм Кандыльяка прынцыпова адрозніваецца ад канцэптуальнага аналізу.

Кандыльяк лічыць, што тэзіс фізіякратаў аб бясплённасці прамысловасці памылковы. Але, замест таго каб паказаць хібы іхнага аналізу паняцця вытворчасці, ён зрабіў акцэнт на агульным і наўпроставым значэнні словаў. З гэтае прычыны ён не ў стане быў растлумачыць рэчаіснасць.

Гэтая няздольнасць яскрава выявілася ў ягоных меркаваннях пра вартасць. Вучоны пісаў:

"Лічыцца, што нейкая рэч карысная, калі яна адпавядае нашым пэўным патрэбам; і яна непатрэбная, калі не адпавядае ніводнай патрэбе або мы ніяк не можам яе выкарыстаць. Такім чынам, яе карыснасць паходзіць з той патрэбы, якую мы ў ёй маем.

Менавіта на падставе карыснасці мы ацэньваем рэч; гэта значыць мы мяркуем, наколькі больш-менш яна карысная для выкарыстання намі. І мы называем гэта *вартасцю.* Сказаць, што нейкая рэч мае вартасць, — значыць сказаць, што яна ёсць ці мы лічым яе прыдатнаю для пэўнага выкарыстання.

Такім чынам, вартасць рэчаў вызначаецца іх карыснасцю, або, што

адно і тое ж, патрэбаю, якую мы маем у іх, або (што таксама адно і тое ж) магчымасцю яе выкарыстання"[1].

Аднак аўтар ведае і крытыку, пад якую здавён трапляла прапанаваная ім канцэпцыя: вада вельмі карысная, але мае малую вартасць. Тады ён пагаджаецца з канцэпцыяй, прапанаванай абатам Гальяні ў вядомай кнізе "*Грошы*"[2] і якая сцвярджае, што пры вызначэнні вартасці рэчы апрача карыснасці мае ролю і *рэдкаснасць*. Кандыльяк хоча даказаць, што вартасць — чыста псіхалагічная з'ява, хоць і мяняецца ў залежнасці ад большай ці меншай рэдкаснасці рэчаў; ён прыводзіць у доказ той факт, што большая ці меншая рэдкаснасць рэчаў мяняе сілу патрэбы, якую мы маем у іх.

"Калі рэчаў шмат, — пісаў ён, — патрэба адчуваецца меней, бо няма страху, што чагосьці можа бракаваць. І наадварот, патрэба ўзрастае, калі нечага бракуе, калі нястача.

Паколькі вартасць рэчаў паходзіць ад іх карыснасці, дык натуральна, што больш адчувальная патрэба надае рэчам большую вартасць, менш адчувальная патрэба надае ім меншую вартасць. Значыць, вартасць рэчаў павялічваецца, калі іх мала, а памяншаецца, калі іх шмат...

Калі вартасць рэчаў паходзіць ад іх карыснасці, значыць, іх большая ці меншая вартасць пры нязменнай карыснасці вынікае або з іх рэдкаснасці, або са шматлікасці, ці хутчэй з таго, што мы мяркуем пра іх рэдкаснасць або шматлікасць"[3].

Безумоўна, гэтыя доказы непераканальныя. Напрыклад, "страху, што чагосьці можа бракаваць", не існуе, калі на рынку ёсць рэгулярная прапанова. Псіхалагічнае ўздзеянне, пра якое піша Кандыльяк, магло мець месца толькі ў выключных выпадках, і немагчыма праз яго даць тлумачэнне розніцы паміж коштамі рэчаў, якая існуе *звычайна*, а ад палітычнай эканоміі патрабуецца растлумачыць прычыны менавіта гэтае з'явы.

Чаго сапраўды не стае нашаму аўтару, дык гэта ведання зробленага Смітам падзелу на спажывецкую вартасць, або карыснасць, і менавую вартасць.

Адсутнасць такога падзелу спараджае ў творы Кандыльяка поўную блытаніну. Напрыклад, калі ён піша: "Рэч мае вартасць не з прычыны таго, што яна мае пэўны кошт, але яна мае кошт, бо мае вартасць". Не трэба асаблівай мудрасці, каб зразумець, што выказаныя думкі супрацьлеглыя толькі на першы погляд, бо слова "вартасць" у іх бярэцца ў розных значэннях. Тыя, хто лічыць, што рэч мае вартасць, бо яна мае кошт, маюць на ўвазе менавую вартасць. А калі сцвярджаюць, што рэч мае кошт, бо мае вартасць, то гэта значыць, што слова "вартасць" мае на ўвазе спажывецкую вартасць, або карыснасць. Такім чынам, Кан-

[1] *Ouvrage cité, in Mélanges d'économie politique, Paris, 1847, pp.250 et 251.*

[2] *Della Moneta, 1751.*

[3] *Le commerce et le gouvernement... in Mélange d'économie politique, op. cit., pp.252 et 253.*

дыльяк не адкідае тэзіса, які і крытыкуе: ён абмяжоўваецца змяненнем значэння слова.

Нягледзячы на логіку доказаў, наш аўтар, дарэчы, сам не ўпэўнены ў слушнасці сваёй тэорыі вартасці. Сапраўды, крыху далей можна заўважыць новую спробу развязання парадокса, калі вельмі карысныя рэчы маюць меншую вартасць, чым меней карысныя рэчы.

Гэтым разам вучоны сцвярджае: калі прадметы раскошы набываюцца за "лішнія" грошы, дык пакупнік не звяртае ўвагі на кошт, хоць ён значна і завышаны. Кандыльяк піша:

"З гэтага вынікае, што вартасць неабходных рэчаў будзе заўсёды вымярацца дакладней, чым вартасць прадметаў раскошы; абедзве гэтыя вартасці ніколі не будуць прапарцыйныя адна другой. Кошт неабходных рэчаў будзе вельмі нізкі параўнальна з коштам прадметаў раскошы, бо ўсе зацікаўленыя ў тым, каб ацаніць неабходныя рэчы аб'ектыўна. І наадварот, кошт прадметаў раскошы будзе вельмі высокі параўнальна з коштам неабходных рэчаў, бо тым, хто будзе набываць прадметы раскошы, усё роўна, колькі плаціць"[1].

Кандыльяк хоча пераканаць нас, што кошты на менш карысныя рэчы павялічваюцца, бо пакупнікам усё адно, колькі плаціць. Той, хто хоць крыху назіраў за эканамічнымі працэсамі, разумее, гэткае тлумачэнне — проста несур'ёзнае: наадварот, добра вядома, што пакупнікі прадметаў раскошы больш клапоцяцца пра тое, як набыць рэчы па найменшым кошце, чым пакупнікі звычайных тавараў.

Значыць, развагі, якія Кандыльяк прысвяціў пытанню вартасці, не маюць ніякага сэнсу, і не было б прычыны весці пра іх гаворку, калі б напрыканцы XIX ст. не адрадзілася тая ж самая спроба растлумачыць вартасць праз карыснасць і рэдкаснасць. Праўду кажучы, "маржыналізм" развіў больш дакладную тэорыю, чым тэорыя Кандыльяка. Аднак істотная крытыка апошняга застаецца справядлівай і ў дачыненні да яго паслядоўнікаў.

Апрача таго, у творы Кандыльяка не даецца слушнага тлумачэння пра крыніцы розных даходаў і не прапануецца здавальняючай тэорыі эканамічнага росту.

Адмовіўшыся ад вучэння фізіякратаў і ідучы насуперак фундаментальным тэзісам Сміта, Кандыльяк не змог зразумець паходжання даходаў з зямельнай уласнасці і з капіталу.

Спачатку ён вылучае ідэю, што даход уласніка — гэта, прынамсі часткова, аплата своеасаблівай працы.

"Пры сумесным уладанні[2], — піша Кандыльяк, — землеўласнік атрымлівае большую частку, бо ён дае ў карыстанне зямлю, укладае капітал і таму, што сам працуе. Неабавязкова, каб ён уласнаручна апрацоўваў зямлю; дастаткова, каб ён назіраў за аратымі: нагляд — гэта яго асноўная праца"[3].

---

[1] *Ibid., p.294.*

[2] *Гаворка ідзе пра супольнае валоданне вынікамі працы на зямлі. Аўтар адвольна ўвёў гэтае паняцце і гэтым заблытаў сваю думку.*

[3] *Op. cit., p.281.*

Крыху далей аўтар ужо разглядае даход уласніка як розніцу паміж сукупным прадуктам і заробкам рабочых і сцвярджае, што прысваенне гэтай розніцы законнае з прычыны таго простага факта, што яно адпавядае звычаям:

"Заробак, які прынята даваць слугам ці парабкам і які вызначаецца згодна са звычаем, уяўляе сам па сабе частку прадукцыі, на якую яны маюць права як супольныя ўладальнікі; гэты заробак ёсць іхнаю ўласнасцю, і пасля таго, як ён выплачаны, рэштка прадукцыі належыць уласніку зямлі"[1].

Пасля такога ўдакладнення аўтар дадае, што менавіта гэткім чынам можна вызначыць прыбытак прадпрымальніка, які кіруе мануфактурай, і ўрачыста робіць выснову:

"Усе гэтыя віды ўласнасці святыя. Пазбавіць фабрыканта яго прыбытку, а рабочага — яго заробку значыла б учыніць несправядлівасць"[2].

Відавочна ўся адрознасць, якая аддзяляе гэтае даследванне ад поглядаў Сміта. Вялікі шатляндскі эканаміст сцвярджаў, што дзеля эканамічнага прагрэсу неабходна дазволіць капіталістам і зямельным уласнікам атрымліваць максімальны прыбытак з прадукцыі іх прадпрыемстваў ці ўраджаю. Што да часу, калі гэта пісалася, ён, безумоўна, меў рацыю. Але Сміт сцвярджаў, што сацыяльная няроўнасць, якая была вынікам прааналізаванай ім сістэмы, не заўсёды адпавядала справядлівасці. Кандыльяк жа, здаецца, наадварот, гэта сцвярджае. З ягоных працаў мы цудоўна бачым, да чаго можа прывесці эмпірычная філасофія, якая не хоча ісці далей за відавочныя факты.

Калі разгледзець зроблены Кандыльякам аналіз умоваў эканамічнага развіцця, можна яшчэ раз убачыць, наколькі недастатковы быў яго эмпірызм, бо гэты аналіз па сваёй глыбіні саступае нават аналізу фізіякратаў. На думку Кандыльяка, эканамічны прагрэс не ёсць вынікам падзелу працы і росту капіталаўкладанняў; ён бачыць прычыну прагрэсу толькі ў развіцці густаў зямельных уласнікаў.

"Дапусцім, — піша ён, — з пакалення ў пакаленне зямельныя ўласнікі прызвычайваліся да аднаго і таго ж тавару; з прычыны таго, што іх густы заставаліся нязменныя, вырошчваліся адны і тыя ж культуры, не мяняліся вырабы і гандаль.

Менавіта такі лад жыцця мусіў весці наш народ. Ён прызвычаіўся да простага жыцця, працяглы час задавальняўся прымітыўнымі таварамі, бо іншых не ведаў, ды яны і не прадаваліся.

Але народ паразумнеў, ён мяняе свае густы, аддае перавагу таму, чым раней не цікавіўся, і адмаўляецца ад таго, чаму раней аддаваў перавагу.

У такім выпадку колькасць рэчаў, якія ён больш за ўсё шукае, не адпавядала б яго патрэбам, калі б фермеры, рамеснікі і гандляры не імкнуліся навыперадкі знайсці сродкі павелічэння вытворчасці і продажу"[3].

[1] *Ibid., p.281.*
[2] *Ibid., p.282.*
[3] *Ibid., p.339.*

Нягледзячы на памылковы характар сваёй тэорыі аб прадукцыйнасці аднае толькі сельскай гаспадаркі, фізіякраты здолелі паказаць, чаму рост капіталаўкладанняў — гэта ўмова эканамічнага прагрэсу. Кандыльяк жа, праз дваццаць гадоў пасля з'яўлення "*Эканамічнае табліцы*", ігнаруе гэты фундаментальны закон і замяняе яго тэорыяй, адпаведна з якою эканамічны прагрэс залежыць ад спантаннай змены густаў спажыўцоў, прычыны якой ён так і не растлумачыў.

§ 2. Палітычная эканомія Бэнтама

Джэрэмі Бэнтам (1748—1832) быў пад канец XVIII — на пачатку XIX ст. лідэрам групы брытанскіх філосафаў і сацыяльных рэфарматараў, якія складалі так званую школу "філасофскага радыкалізму"[1].

Ён прысвяціў сябе і з вялікаю ўпартасцю змагаўся найперш за рэформу права, асабліва крымінальнага. Але ў пэўны момант звярнуўся таксама да палітэканоміі і паспрабаваў пабудаваць сваю тэорыю на разліку карыснасці рэчаў і формаў дзейнасці.

Вучань Гэльвэцыюса, Бэнтам лічыў, што чалавек — жывёла, якая парознаму рэагуе на тое, што ёй прыемна, і тое, што ёй непрыемна. З мэтаю падтрымання парадку грамадства можа таксама пакараць, але трэба, каб кара ці абмежаванне былі навукова абгрунтаваныя з улікам таго, каб сума задавальненняў была максімальная, а непрыемнасцяў — мінімальная.

Бэнтам палічыў, што на гэтым *прынцыпе карыснасці* можна пабудаваць агульную навуку пра чалавека. Карыснасць мусіць быць адзіным крытэрам чалавечых паводзінаў і заканадаўства, і гэты крытэр павінны цалкам замяніць паняцце дабра. У выніку навука абавязана замяніць мараль і рэлігію. На думку Бэнтама, карыснасць паддаецца *вымярэнню*. Значыць трэба заўсёды аб'ектыўна вырашаць, што належыць рабіць, а чаго не.

Відавочна, што вымяральнасць карыснасці — вызначальны момант тэорыі Бэнтама. У сваёй першай значнай працы "*Прынцыпы маралі і заканадаўства*" (1789 г.) Бэнтам робіць надзвычайныя намаганні, каб даказаць, што можна дасягнуць вымярэння карыснага.

Вартасць нечага прыемнага ці непрыемнага (карыснасць або адсутнасць карыснасці) залежыць ад наступных акалічнасцяў: яго інтэнсіўнасць, працягласць, пэўнасць, даступнасць, плённасць, чысціня, памеры.

Адзінка інтэнсіўнасці — гэта мінімальная адзінка прыемнасці ці непрыемнасці. Адзінка працягласці — мера часу. Такім чынам, інтэнсіўнасць і працягласць вымяраюцца ў цэлых лічбах.

Пэўнасць і даступнасць выражаюцца дробавымі лікамі, пры гэтым наўпроставае задавальненне або непрыемнасць прымаюцца за адзінку.

Такім чынам, прыемнае ці непрыемнае можна падлічыць, калі пам-

[1] *Гл. на гэты конт d'Elie Halévy, La formation du radicalisme philosophique, 3 vol., Paris, 1901-1904.*

ножыць лічбу, якая перадае яе інтэнсіўнасць, на лічбу працягласці, а потым памножыць атрыманую лічбу на 2 дробавыя лікі, якія выражаюць пэўнасць і даступнасць.

Трэба ўлічыць таксама плённасць задавальнення і, улічваючы чысціню задавальнення, трэба адняць лічбу, што адлюстроўвае непрыемнасць, якую можа спарадзіць гэтае задавальненне.

Нарэшце, трэба будзе зрабіць арытметычнае вымярэнне сумы ўсіх задавальненняў і непрыемнасцяў, якія прыносіць пэўны ўчынак усім людзям. Тады і будзем мець лічбу, якая вымярае агульную карыснасць гэтага ўчынку[1].

Мы ўжо бачым, наколькі складаным атрымліваецца падлік. Але іншыя прапанаваныя аўтарам ідэі пагатоў ускладняюць праблему.

Прыемнае і непрыемнае маюць простую ці складаную форму.

Простых задавальненняў 14: пачуццяў, багацця, спраўнасці, сяброўства, славутасці, магутнасці, пабожнасці, добразычлівасці, нядобразычлівасці, памяці, уяўлення, чакання, адпачынку, задавальненні, выкліканыя спалучэннем двух задавальненняў.

Простых жа непрыемнасцяў 12: пакута нястачы, пакуты пачуццяў (яны ў сваю чаргу падзяляюцца на 9 пакутаў), пакута няздольнасці (Awkwareness), варожасці, пабожнасці (страх перад Богам), добразычлівасці, нядобразычлівасці, памяці, уяўлення, чакання, пакуты, выкліканыя спалучэннем.

Аднак усе простыя задавальненні і непрыемнасці ў спалучэнні ўтвараюць складаныя задавальненні і непрыемнасці. Такім чынам, патрэбныя новыя арытметычныя дзеянні, каб улічыць усе камбінацыі.

Аднак самую фундаментальную праблему ставіць не складанасць падліку, а сама яго магчымасць. Сапраўды, ці паддаюцца ўліку разнастайныя задавальненні або пакуты, якія адчувае пэўны індывід? І асабліва, ці можна параўнаць іх з задавальненнямі ці пакутамі іншых людзей?

Ні ў воднай са сваіх надрукаваных працаў Бэнтам не адказаў на гэтыя пытанні, але ў адным з ягоных рукапісаў сцвярджаецца, што адзіным вымяральнікам задавальненняў і пакутаў ёсць грошы. Задавальненне або пакута вымяраюцца сумай грошай, якую выкарыстоўвае індывід, каб атрымаць гэтае задавальненне або каб унікнуць пакуты[2].

Бэнтам робіць сабе заўвагу, што вартасць атрыманых за грошы задавальненняў не павялічваецца прапарцыйна суме выдаткаваных грошай[3]. І тлумачыць гэта тым, што, "нягледзячы ні на што, фактычна здараецца так, што пры нязменнасці іншых умоваў прапорцыя застаец-

---

[1] *Можна знайсці рэзюме аналізу Бэнтама у Mitchell, The Backward art of spending money, chap.10: "Bentham's felicific calculus, pp.181-182.*

[2] *Гл. Elie Halévy,* La formation du radicalisme philosophique, *op. cit., I, pp.399-415.*

[3] *Мы сутыкнемся з гэтай ідэяй, якая пазней стане глебаю для шматлікіх развагаў аб "маржынальнай карыснасці". Дарэчы, у адным месцы Бэнтам сапраўды закладае падмурак тэорыі, якая атаясамлівала вартасць з маржынальнай карыснасцю. (Bentham,* Economic writings, *London, 1952, I, p.118.)*

ца аднолькавая як паміж двума задавальненнямі, так і паміж дзвюма сумамі (выдаткаванымі на іх)"[1].

Такім чынам, у першым значным творы Бэнтама даецца накід канцэпцыі навукі пра чалавека, заснаванай на падліку карыснасці, навукі, якая, відавочна, павінна была ахапіць вывучэнне эканамічных праблемаў. Роля гэтай навукі — паказаць, якім чынам дзяржава можа ўмешвацца ў эканоміку дзеля росту дабрабыту людзей. Тэорыя Бэнтама супрацьстаіць палітычнай эканоміі Сміта, але гэтая супярэчнасць не набывае развіцця ў творах самога Бэнтама. Наадварот, можна прасачыць, як ён пагатоў збліжаецца з эканамічным лібералізмам, напачатку пры разглядзе асобных пытанняў, а потым і ўвогуле. Такое збліжэнне з ліберальнай дактрынай таксама азначае збліжэнне з эканамічнай навукай, якая адстойвала гэтую дактрыну, і адмову Бэнтама ад стварэння чыста утылітарысцкай палітычнай эканоміі, пра якую ён марыў.

Як і эканамісты, Бэнтам — вораг старых абмежаванняў. У 1787 г. ён выдае кнігу, якая стала шырока вядомаю і якую ён назваў "*Абарона ліхвярства*". Ідучы далей, чым Кенэ і Сміт, аўтар намагаецца даказаць, што ўсякае заканадаўчае абмежаванне нормы працэнта шкоднае, у прыватнасці таму, што "ніякі заканадаўца не можа гэтак жа дакладна, як сам індывід, меркаваць, якую вартасць уяўляюць для яго грошы"[2].

Таксама Бэнтам імкнецца даказаць непатрэбнасць калоніяў і адкідвае думку Сміта аб ролі рынкаў збыту. "Адкрыйце нейкі новы рынак, — пісаў ён, — памеры гандлю ўсё роўна могуць павялічыцца хіба што выпадкова. Зачыніце дзейны рынак — памеры гандлю ўсё роўна не паменшацца, хіба што выпадкова, дый то не надоўга"[3].

Але з самага пачатку аўтар "*Абароны ліхвярства*" не меў намеру абмяжоўваць свае высілкі вывучэннем асобных пытанняў, ён хацеў стварыць палітычную эканомію цалкам. Мы маем перад вачыма тэкст "*Падручніка па палітычнай эканоміі*", напісанага ім у 1793—1795 гг., і тэкст "*Інстытуцыі палітычнай эканоміі*", напісанай у 1801—1804 гг.

У тэкстах, якія толькі зусім нядаўна былі апублікаваныя, аўтар сцвярджаў, што палітычная эканомія — гэта навука і мастацтва, а гэта азначае: дзяржава павінна ўмешвацца ў эканоміку з мэтаю забеспячэння найвялікшага шчасця як мага большай колькасці людзей. Адпаведна з прынцыпам карыснасці, пісаў ён, мэтаю заканадаўства ёсць дасягненне

---

[1] *Гэта яму не перашкаджае ў іншым месцы твора развіваць ідэю, паводле якой ураўноўванне багацця павялічыла б дабрабыт, калі б не "непрыемнасці" ад "агульнай занепакоенасці". (Economic writings, op. cit., I, pp.112-116.)*

[2] *Economic writings, op. cit., I, p.125.*

[3] *Cité par Halévy, La formation du radicalisme philosophique, I, p.210. Бэнтам упэўнены, што ў ангельскую сельскую гаспадарку заўсёды можна будзе ўкладаць неабмежаваную колькасць капіталу, бо, маўляў, калі дастатковай вытворчасці хлеба можна будзе дасягнуць, піва ж ніколі не будзе занадта. Гл. далей par T.W.HUTCHISON, Bentham as an Economist.* Economic Journal, *Juin 1956, p.294, n.1.*

максімальнага дабрабыту для дадзенай супольнасці на працягу дадзенага адрэзка часу[1].

Але хутка Бэнтам сутыкаецца з цяжкай праблемаю, бо мэта ягонае навукі — дваістая. Трэба дасягнуць "максімуму багацця і максімуму насельніцтва", бо чым больш людзей, тым больш шчасця на зямлі. Але павелічэнне колькасці насельніцтва, пазначае аўтар, вядзе да драбнення багацця, а значыць, да зніжэння "заможнасці", якая выступае "адносным багаццем". Такім чынам, аўтар, здаецца, лічыць, што 100 індывідаў, якія разам валодаюць 100 мільёнамі, маюць у канчатковым рахунку менш "шчасця", чым 10 індывідаў, якія валодаюць той жа сумай. Тым самым пагатоў ускладняецца праблема дасягнення максімальнага шчасця.

"Стасунак паміж багаццем і колькасцю насельніцтва, з яго простай і зваротнай прапарцыйнасцю, спараджае, — кажа ён, — значную праблему, якую належыць развязаць заканадаўцу"[2].

Але сам аўтар не прапануе ніякага развязання. Гэта першая хіба эканаміста. Потым Бэнтам пайшоў нашмат далей, бо ўрэшце заявіў, што ў эканоміцы ён прыхільнік поўнага неўмяшання ўрада, "квіетызму"[3].

Ён абгрунтоўвае гэта наступным чынам:

1. Усеагульнае багацце — гэта толькі сума індывідуальных багацяў. Ніхто лепей, чым сам індывід, не ведае, што трэба рабіць дзеля павелічэння свайго багацця.

2. Умяшанне ўрада абавязковым чынам нясе ў сабе элемент прымусу, а прымус выклікае пакуты індывідаў[4].

Такое самае абгрунтаванне выкарыстоўваецца, каб адхіліць ідэю раўнання багацяў захадамі дзяржаўнай палітыкі. Такі ўплыў павялічыў бы ўсеагульнае "шчасце", бо паменшыліся б задавальненні, дасягнутыя праз грошы. Але гэта таксама прывяло б да "агульнае занепакоенасці" — крыніцы шматлікіх пакутаў. Значыць, трэба адмовіцца ад гэтага[5].

Такім чынам, Бэнтам прапануе пакору (тэза, якую мы ўжо сустракалі ў Сміта). Ангельскія лібералы не лічылі, што эканамічная свабода вядзе да сацыяльнай дасканаласці. Яны сцвярджалі, што яна — найменшае ліха.

А паколькі сам пачынальнік школы утылітарызму пераканаўся ў слушнасці ліберальнага падыходу, робіцца зразумелым, чаму ён адмовіўся ад сваіх планаў выдаць новыя працы ў галіне палітычнай эканоміі.

У канчатковым рахунку "эканамічнае мастацтва" так і не было створанае. Палітэканомія засталася простай дэманстрацыяй перавагаў свабоды, яе асновы не змяніліся. У наступных творах Бэнтам проста паўтараў тэзісы Эдама Сміта, а пазней яшчэ й Рыкарда, засяродзіўшыся на юрыдычных і палітычных даследаваннях.

---

[1] Economic writings, *op. cit., t.III, p.318.*

[2] *Ibid.*

[3] *Вучэнне, якое прапаведуе пакору, пасіўна-сузіральнае стаўленне да жыцця. — Заўвага перакладніка.*

[4] *Ibid., pp.333-334.*

[5] *Ibid., t.I, pp.113-116.*

Такім чынам, першая спроба, скіраваная на стварэнне палітэканоміі на глебе *падліку задавальненняў*, не мела свайго беспасярэдняга працягу ў будучыні, але ў XX ст. сярод асобных абаронцаў таго, што называецца "эканомікай дабрабыту" (Welfare Economics), у Бэнтама знайшліся паслядоўнікі.

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ



ПЕРШЫЯ СТВАРАЛЬНІКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ДАКТРЫНЫ

Палітычная эканомія, якая нарадзілася ў XVIII ст. у Францыі і Ангельшчыне, вяла да ліберальных высноваў. Безумоўна, эканамісты не маглі не заўважаць галечы і несправядлівасці, але яны верылі ў магчымасць значнага павелічэння багацця і ўсеагульнага дабрабыту за кошт росту капіталаўкладанняў. Такі рост, меркавалася, развяжа ўсе грамадскія праблемы, і дзеля яго патрабуецца фундаментальная ўмова — свабода гандлю і прамысловасці. Усе заганы грамадства прыпісваліся ўмяшанню дзяржавы ў эканамічнае жыццё. Лічылася, што эканамічны лібералізм прывядзе да знішчэння галечы і забяспечыць панаванне маральнасці, прынамсі да максімальна магчымага роўню.

Аднак такое аптымістычнае бачанне грамадскага ладу падзялялі далёка не ўсе мысляры.

У XVII ст. такі мараліст, як Ля Бруер сувора асуджаў аматараў нажывы.

"Ёсць нячыстыя душы, — пісаў ён, — напоўненыя брудам і смеццем, якія забылі ўсё на свеце ў пагоні за прыбыткам, тым часам як светлыя душы напоўненыя імкненнем да славы і дабрадзейнасці. Адно такім прагным людзям наўме: зарабіць і нічога не страціць; яны зайздросныя і прагнуць атрымаць за пазыку 10%[1]; яны цікавяцца выключна тымі, хто ім вінны. І заўсёды клапоцяцца пра зніжэнне або ваганне курсу грошай[2]; іх паглынула бездань кантрактаў, каштоўных папераў і пазыковых абавязкаў. Для такіх людзей няма ні бацькоў, ні сяброў, ні суграмадзян, ні хрысціян, ні, магчыма, людзей: усё гэта ім замяняюць грошы"[3].

Гэтае асуджэнне духу нажывы было шырока распаўсюджанае ў XVIII ст. Напрыклад, Мантэск'ё пісаў:

"Усё страчана, калі прыбытковая прафесія збіральнікаў падаткаў пачынае быць ганаровай... Агіда тады ахоплівае ўсе іншыя станы, гонар перастае быць гонарам. Крокі, якія вылучаюцца сваёй паступовасцю і

---

[1] *Гэта значыць 10% ад пазычаных грошай, што пераўзыходзіла дазволеныя 5%.*

[2] *Гаворка ідзе пра разнастайныя аперацыі, якія прыводзілі да абясцэньвання грашовых адзінак.*

[3] *Les caractères ou les moeurs de ce siècle, 1688, chap.VI.*

натуральнасцю, болей не цэняцца, а кіраванне, па сутнасці, спыняецца..."[1]

Трэба сказаць, у Заходняй Эўропе ідэал супольнага валодання маёмасцю заўсёды знаходзіў прыхільнікаў. На золку новага часу за гэта выступалі ерэтычныя секты, часам нават спрабавалі ажыццявіць яго на практыцы. Самыя вядомыя мысляры спыняліся на гэтым ідэале.

У сваёй казані пра "Годнасць беднякоў у царкве" Басюэ нагадвае, што "ў былыя часы ў царкве ўсё было супольнае".

Паскаль пісаў:

"Гэта наш сабака, казалі бедныя дзеці; тут маё месца на сонцы: адсюль пачынаецца узурпацыя ўсёй зямлі"[2].

Хоць і шматлікія, пратэсты маралістаў мелі эпізадычны характар. Сістэматычная крытыка ліберальнай дактрыны назіраецца толькі ў творчасці мысляроў другой паловы XVIII ст., што далі развіццё асобным з ідэяў, якія потым лягуць у падмурак сацыялістычнага руху.

Калі Рабэсп'ер у 1793 г. стварыў "Камітэт грамадскага выратавання", калі Бабёф у 1796 г. паспрабаваў захапіць уладу, яны, што адзін, што другі, натхняліся ідэямі, распрацаванымі французскімі філосафамі ў другой палове XVIII ст. Сама вядомыя з гэтых філосафаў — Марэлі, Русо і Маблі. Гэтыя філосафы не былі людзьмі дзеяння, і нельга сказаць, што яны па-сапраўднаму заклікалі да дзеяння, аднак абставіны склаліся так, што неўзабаве народ паспрабаваў ажыццявіць на практыцы ідэі гэтых філосафаў. З апораю на першае спалучэнне тэорыі і практыкі можна смела сказаць, што ў гэты момант, а менавіта ў апошнія гады XVIII ст., у Францыі нарадзіўся навачасны сацыялізм.

Да французскіх філосафаў дарэвалюцыйнага перыяду можна далучыць ангельца Уільяма Годўіна і вялікага нямецкага філосафа Фіхтэ, якія таксама зрабілі важны ўнёсак у стварэнне сацыялістычнага вучэння і ідэі якіх былі выказаны адпаведна ў 1793 і ў 1800 гг.

---

[1] *L'esprit des lois, liv.XIII, chap.XX. Апрача таго, Мантэск'ё заяўляе, што, "як гэта казаў Платон", дэмакратычнай форме кіравання пасуе супольнае валоданне маёмасцю.*

[2] *Pensées, Ire Partie, chap.9, § 53.*

Раздзел I

ФРАНЦУЗСКІ НАТУРАЛІСТЫЧНЫ КАМУНІЗМ XVIII СТ.

Французскія філосафы XVIII ст., прыхільнікі прагрэсу і абаронцы "асветы", не задаволіліся развязаннем сацыяльнай праблемы, прапанаваным фізіякратамі.

Аднак бальшыня з іх з'яўлялася фанатычнымі прыхільнікамі канцэпцыі, паводле якой чалавечыя праблемы павінны аналізавацца метадамі "дакладных навук". У выніку яны прыйшлі да абсалютнага матэрыялізму, які ігнараваў адрозненне паміж чалавекам і іншымі прыроднымі целамі .

Гэльвэцыюс у сваім творы *"Аб розуме"* сцвярджаў, што тое ці іншае меркаванне нараджаецца ад пачуццёвых уражанняў. У *"Думках аб тлумачэнні прыроды"* Дзідро заявіў, што, вывучаючы псіхічныя ўзрушэнні, можна знайсці доказы тоеснасці фізічных і духоўных феноменаў. Ля Мэтры развіваў канцэпцыю "чалавека-машыны" і "чалавека-расліны".

У межах гэтага вузкаматэрыялістычнага светапогляду пратэст супраць сацыяльнай несправядлівасці часам набываў форму з патрабаваннем абагульнення ўсёй маёмасці як эканамічнага ладу, адпаведнага патрабаванням прыроды.

Такім чынам, адмаўленне ліберальнай канцэпцыі свабоды, якую адстойвалі палітэканомы, набывала перш за ўсё форму поўнага адмаўлення чалавечай свабоды.

Сцвярджалася, што чалавекам, як і жывёламі, кіруюць інстынкты, якія самі па сабе з'яўляюцца добрымі і якія абавязкова накіроўваюць яго да мэтаў, пажаданых прыродай. Дапускалася, што чалавек мае розум і мысліць. Але розум — гэта проста вышэйшы інстынкт, лічылі пэўныя філосафы. З дапамогаю належнай адукацыі індывіды павінны накіроўваць свае ўчынкі ў рэчышча дабра з тым, каб перш за ўсё скасаваць пагібельную інстытуцыю прыватнай уласнасці.

А паколькі пытанне, што за таямнічая катастрофа спарадзіла інстытуцыю прыватнай уласнасці і з той прычыны, што пра спосаб, якім можна будзе скасаваць прыватную ўласнасць, не гаворыцца, натуралістычны камунізм мае ў значнай ступені утапічны характар. Можна разглядаць яго

прыхільнікаў як прамых паслядоўнікаў Томаса Мора, хоць філасофскія канцэпцыі апошняга былі вельмі далёкія ад матэрыялізму.

Пасля рэвалюцыі 1648 г. у Англельшчыне ў шэрагах партыі левелераў развіўся рух, сябры якога варожа ставіліся да рэлігіі і станоўча да камунізму. У 1649 г. П. Чэмбэрлен у сваім творы *"Адвакат бедняка"* прапанаваў правесці нацыяналізацыю зямлі. У 1651—1652 гг. Джэрард Уінстэнлі ў сваёй кнізе *"Закон свабоды ў форме праграмы"* выклаў праграму камунізму, якая прадугледжвала абавязак працаваць для ўсіх з наступным бясплатным размеркаваннем дабротаў[1]. У 1656 г. высокая адказная асоба брытанскага суда Гэрынгтан прысвяціў Кромўэлу свой твор *"Акіян"*, у якім прапаноўваўся план рэарганізацыі грамадства[2].

Каланіяльная экспансія ў XVII—XVIII стст. забяспечвала пісьменнікаў багатым матэрыялам. Часта місіянеры з захапленнем успрымалі простыя і натуральныя норавы насельнікаў Новага Свету[3]. Менавіта ў гэтую эпоху з'явіўся шэраг фантастычных аповедаў з апісаннем беззаганных і справядлівых грамадстваў.

У *"Прыгодах Тэлемаха"* (1699) Фэнэлён намаляваў ідэальны горад Салянт, дзе ўсе павінны працаваць і мець у валоданні невялікія надзелы зямлі.

У 1704 г. выйшлі ў свет *"Дыялогі, або Сустрэчы паміж дзікуном і баронам дэ Ля Утанам"* Нікаля Годвіля. Аўтар сцвярджаў, што індзеец вышэйшы за эўрапейца, бо ён не ведае розніцы паміж маім і тваім.

---

[1] *Гл. твор d'Edouard Bernstein, Cromwell et le communisme, traduction en langue anglaise, New York, 1930, réimpression, 1963.*

[2] *Гл. G. I. Holyoake, the Histoiry of cooperation, 1875, nouv. éd., London, 1906, t.I, p.18.*

[3] *Нават езуіты спрабавалі арганізаваць эканамічнае жыццё сваіх парафіянаў у Парагваі такім чынам, каб павялічыць прадукцыйнасць працы без увядзення інстытуцыі прыватнай уласнасці. Вось апісанне місіі да племені гуарані, у якім налічвалася 138000 чалавек: "Нішто не здалося мне больш цудоўным, чым тое, якім чынам забяспечваюцца сродкамі існавання ўсе члены гэтага племені. Тыя, хто збірае ўраджай, абавязаны звозіць усё збожжа ў грамадскія свірны; ёсць людзі, якія ахоўваюць гэтыя свірны і якія складаюць спіс усяго таго, што атрымалі на захаванне. На пачатку кожнага месяца адказныя асобы, якія кіруюць размеркаваннем збожжа, аддаюць яго кіраўнікам кварталаў, у сваіх акругах кіраўнікі кварталаў адразу ж размяркоўваюць збожжа па сем'ях адпаведна з колькасцю едакоў" (Cité par Lichtenberger, La socialisme au XVIIIe siècle, Paris, 1895, p. 61).*

Галоўным прадстаўніком новага утапізму можна назваць чалавека, пра жыццёвы шлях якога нам нічога невядома, — Марэлі.

У 1751 г. ён выдаў працу пад назовам *"Караблекрушэнне плавальных астравоў, або Базыліяда слыннага Пільпая, паэма, перакладзеная з індзейскай мовы"*. Потым у 1755 г. Марэлі больш упарадкавана выклаў свае ідэі ў творы *"Кодэкс прыроды"*, які значна паўплываў на сучаснікаў.

У *"Кодэксе прыроды"* ёсць філасофская частка, дзе аўтар разгарнуў уласную канцэпцыю маралі. Ён раіць адмовіцца ад вульгарнай маралі, згодна з якой чалавек па сутнасці заганны і злы: гэта не адпавядае нашаму ўяўленню аб Найвышэйшай мудрасці, якая стварае толькі нешта гарманічнае і добрае.

У сапраўднасці чалавек, які высноўвае свае меркаванні з уласнага ўспрымання рэчаіснасці, найперш кіруецца думкаю пра самазахаванне. Дзеля захавання прырода дыктуе чалавеку неабходнасць збліжэння з сабе падобнымі, супрацоўніцтва з імі, але ніколі не павінна адбывацца прысваенне, не павінна нарадзіцца ўласнасць. У першабытным грамадстве, заснаваным на супольным карыстанні дабротамі, у сусветнай грамадзе няма месца варожасці паміж індывідамі, бо там усяго шмат, а таксама ёсць магчымасць задавольваць розныя жаданні: кожны знаходзіць, як задаволіць сваё жаданне, або без жалю ад яго адмаўляецца і шукае іншага задавальнення. Пры гэтым разнастайнасць здольнасцяў дазваляе людзям адчуць іх узаемную залежнасць.

Дык чаму ж грамадства такое далёкае ад гэткага ідылічнага стану? Таму, адказваў Марэлі, што ў чалавеку сядзіць адна загана — прагнасць або "жаданне мець". Усе іншыя заганы — "фанабэрыя, пыха, ганарыстасць, амбітнасць, хітрасць, крывадушнасць, зламыснасць" — толькі "пачварныя" адгалінаванні гэтай галоўнай заганы[1].

Але якім чынам магло ўзнікнуць жаданне мець, калі не таму, што аднойчы няўдалыя законы дазволілі ўласнасць? У выніку ўсё гора чалавецтва ад гэтых законаў; усё ліха ідзе

[1] *Code de la nature, nouv. éd avec une introduction de Gilbert Chinard, Paris, 1950, p.171.*

ад прыватнай уласнасці: "Скасуйце ўласнасць, — заклікаў Марэлі, — скасуйце сляпы і бязлітасны інтарэс, які ёй спадарожнічае, адкіньце ўсе забабоны і памылкі, дзякуючы якім яна трымаецца, і больш не будзе абарончай ці наступальнай упартасці ў людзях, больш не будзе ні шалёнага імпэту, ні раз'юшаных учынкаў, ні паняцця маральнага ліха"[1].

Такім чынам, калі мы хочам аднавіць гармонію ў грамадстве, нам варта вярнуцца да законаў, прадыктаваных прыродаю; у апошняй частцы свайго твора Марэлі распавядае пра *"Узор заканадаўства, якое адпавядае памкненням прыроды"*.

Прапануюцца тры асноўныя законы: нікому нішто не належыць на правах уласнасці; кожны грамадзянін павінен "жыць і надзяляцца працай з боку дзяржавы"; кожны грамадзянін павінен у залежнасці ад сваіх магчымасцяў займацца грамадска карыснай працай.

Затым "эканамічнымі законамі" прадугледжвалася, што ўся прадукцыя паступае ў грамадскія сховішчы і размяркоўваецца паміж людзьмі адпаведна з іх патрэбамі. "Паліцэйскімі законамі" прадпісвалася, каб у 10-гадовым узросце кожны грамадзянін пачаў вывучаць нейкае рамяство, якое яму даспадобы; каб паміж 15 і 18 гадамі ўзяў шлюб; каб у 20-гадовым узросце стаў земляробам; каб у 26 гадоў вярнуўся да абранай ім прафесіі; і нарэшце, каб з 40-гадовага ўзросту меў магчымасць займацца той працаю, якая яму па душы.

Законамі "раскошы" прадугледжвалася, што ад 10 да 30 гадоў людзі мусяць насіць вопратку адзінай формы; але потым можна будзе харчавацца і апранацца на свой густ, абы гэта было прыстойна.

"Законы аб форме кіравання" і "Законы аб кіраванні ўрадам" прадугледжвалі палітычны лад, змацаваны сям'ёю. Менавіта з кіраўнікоў сем'яў складаюцца заканадаўчыя сходы, а "шлюбныя законы" распрацаваны вельмі дакладна; згодна з імі, шлюб абавязковы, скасаванне яго дазваляецца толькі праз 10 гадоў, а паўторны шлюб — толькі аднойчы. Дзеці да 10-гадовага ўзросту выхоўваюцца супольна.

[1] *Ibid., p.247.*

Нарэшце, прадугледжваліся законы, якія забаранялі "памылковыя памкненні людскога розуму і ўсялякія трансцэндэнтныя мроі"; можна без аніякіх перашкодаў заняцца вывучэннем навукаў і мастацтваў; але афіцыйная метафізіка павінна стварыць агульнае і здаровае ўяўленне пра Бога і зрабіць так, каб людзі ведалі, што несмяротнасці душы можна дасягнуць.

Такім чынам, перад намі больш канкрэтызаваная, чым у Мора, спроба апісання мадэлі камуністычнага грамадства. Аднак, калі пачынаецца размова аб магчымасцях пабудовы такога грамадства, Марэлі не ідзе далей за сваіх папярэднікаў. "На жаль, — пісаў ён, — занадта справядліва тое, што ў нашы дні было б немагчыма стварыць падобную рэспубліку".

Нягледзячы на такую песімістычную выснову, *"Кодэкс прыроды"* меў вялікае ўздзеянне на сучаснікаў. Доўгі час яго аўтарства прыпісвалі Дзідро, які напісаў славуты *"Дадатак да Бугэнвільскай вандроўкі"*, дзе ўслаўляў сексуальную свабоду, якая панавала ў першабытным грамадстве.

Камунізм Марэлі натхніў, у прыватнасці, Гракхуса Бабёфа. У першай палове XIX ст. можна заўважыць, напрыклад, у Кабэ погляды, блізкія да тых, якія мы сустрэлі на старонках *"Кодэкса прыроды"*[1].

Калі крыху паразважаць, становіцца відавочным, што падобная камуністычная дактрына слабая з-за аднае сваёй фундаментальнай супярэчнасці. Сапраўды, Марэлі зыходзіць з натуралістычнай канцэпцыі чалавека; ён хоча бачыць у чалавеку добрую і бяскрыўдную істоту, як і ўсе астатнія прыродныя істоты, якая стала заганнай толькі з прычыны таемнай катастрофы, стварэння законаў, што дазволілі прыватную ўласнасць, але калі б гэта было толькі так, дык варта скасаваць такія законы, гэта значыць скасаваць усялякае права, усялякі закон, каб чалавек зноў мог вярнуцца да свайго натуральнага стану[2]. Замест гэтага Марэлі патра-

[1] *Гл. Voyage en Icarie, 1840; Le vrai christianisme selon Jésus - Christ, 1846.*

[2] *Марэлі, як і фізіякраты, адстойваў механістычную канцэпцыю грамадства. "Усё паддаецца вымярэнню, — пісаў ён, — усё ўзважана ў найдасканалейшым апараце грамадства... гэтая машына... хоць і складаецца з разумных часцінак, у асноўным функцыяную незалежна ад іхнага розуму" (Code de la nature, op. cit., p. 169).*

баваў прыняць іншыя законы, хацеў, каб нейкая вышэйшая за чалавека ўлада па-рознаму ўмешвалася ў яго жыццё. Навошта? На чым тады б грунтаваліся новыя законы? У творчасці Марэлі мы не знойдзем адказу на гэтыя пытанні.

А пытанні паўстаюць. Менавіта таму пачынаючы з XVIII ст. шматлікія філосафы імкнуліся пабудаваць вучэнне аб рэарганізацыі грамадства на зусім іншым падмурку. Парваўшы з усялякім матэрыялізмам ці натуралізмам, яны аднавілі ідэалістычную канцэпцыю чалавека і, зыходзячы з гэтае канцэпцыі, паспрабавалі апраўдаць сваё негатыўнае стаўленне да ладу, які існаваў, а таксама сваё жаданне стварыць лепшае грамадства.

Бібліяграфія

Асноўным творам застаецца кніга

A. Lichtenberger, *Le socialisme au XVIIIe siècle*, Paris, 1895.

Таксама можна звярнуцца да тых працаў, якія аддаюць асаблівую ўвагу літаратурным аспектам дактрыны, у прыватнасці

G. Chinard, *L'Amérique et le rêve exotique dans la littérature française aux XVIIe et XVIIIe siècles*.

G. Atkinson, *Les nouveaux horizons de la Renaissance française*, 1935.

R. Goussard, *La légende du bon sauvage*, Paris, 1948.

Можна знайсці карысныя звесткі і ў

R. Garaudy, *Les sources françaises du socialisme scientifique*, Paris, 1948.

M. Leroy, *Histoire des idées sociales en France, t. I : De Montesquieu à Robespierre*, Paris, 1946.

D. Mornet, *Les origines intellectuelles de la Révolution française*, Paris, 1933.

J. B. Bury, *The idea of Progress, An inquiry into its origin and growth*, London, 1920.

Раздзел II

АДНАЎЛЕННЕ САЦЫЯЛЬНАГА ІДЭАЛІЗМУ. ЖАН ЖАК РУСО

§ 1. Біяграфічныя звесткі

Жан Жак Русо (1712—1778) быў сынам жэнэўскага майстра гадзіннікаў. Сям'я належала да дробнай буржуазіі. Абставіны хутка вымусілі яго жыць жыццём простага народа. Яго маці памерла пры родах, бацька не дбаў пра сына. Русо аддалі ў вучні да гравёра, але ён уцёк у Францыю, жыў з авантурысткай мадам дэ Варан, потым кінуў яе і наняўся ў чалядзіны. Знайшоў сродкі, каб атрымаць адукацыю. Пачаў пісаць музыку, перабраўся ў Парыж. Доўгі час Русо жыў у галечы з непісьменнаю служанкаю гатэля. У яго было пяцёра дзяцей, якіх ён перадаў на выхаванне дзяржаве, бо сам не меў сродкаў, каб пракарміць іх.

Ад 1741 г. Русо стаў наведваць парыжскія гасцёўні і знаёміўся з філосафамі, але сваімі звычкамі і манерамі ён заўсёды вылучаўся з бліскучага літаратурнага асяроддзя, якое вабіла яго.

У 1749 г. ён паспрабаваў адказаць на конкурснае пытанне Дыжонскай акадэміі: *"Ці спрычыніўся прагрэс навукаў і мастацтваў да пагаршэння або паляпшэння нораваў?"* Адказ Русо ішоў насуперак ідэям іншых тагачасных філосафаў: ён сцвярджаў, што прагрэс навукаў і мастацтваў сапсаваў норавы. *"Разважанне аб навуках і мастацтвах"* адразу ж прынесла яму вядомасць, яно горача абмяркоўвалася. Русо ўзяў удзел у выданні *"Энцыклапедыі"* і, у прыватнасці, напісаў у 1755 г. артыкул "Палітычная эканомія". Ён зблізіўся з Дзідро, але заставаўся незалежны ў поглядах. Адначасова ён перастаў наведваць гасцёўні і жыў на ганарары ад напісанай музыкі.

У 1752 г. Русо стварыў камічную оперу і камедыю, і яны мелі поспех, але ад каралеўскай пенсіі ён адмовіўся. У 1755 г. пабачыла свет яго славутае *"Разважанне пра паходжанне і асновы няроўнасці паміж людзьмі"* — фундаментальны твор у гісторыі сацыялістычнай думкі.

Нейкі час Русо жыў у прапанаваным мадам д'Эпінэ доме садоўніка. Але ў 1758 г. ён парваў са сваёй заступніцай. У 1761 — 1762 гг. з'явіліся тры яго асноўныя творы: *"Новая Элаіза"*, *"Грамадская дамова"* і *"Эміль"*.

У гэтых творах ён закрануў праблемы пачуццяў, палітычнага жыцця, адукацыі і рабіў гэта з надзвычайнай смеласцю, якую давала яму яго незалежная пазіцыя.

За "Эміля" яго пачалі цкаваць, пераследваць з пастановы парыжскага парламента, а парыжскі арцыбіскуп асудзіў кнігу на спаленне. Русо накіраваўся ў Швайцарыю, але цкаванне працягвалася і там. Тады ён паехаў у Ангельшчыну, потым зноў вярнуўся ў Францыю. Пачынаючы з 1770 г. яму было дазволена жыць у Парыжы. Памёр Жан Жак Русо ў 1778 г. у адчаі, сярод агульнай варожасці, пасля таго як выдаў *"Споведзь"* і *"Мроі самотнага вандроўніка"*.

§ 2. Крытыка сацыяльнага натуралізму і лібералізму

"Развагі пра паходжанне і асновы няроўнасці паміж людзьмі" змяшчаюць адмаўленне грамадскага ладу, які існаваў, прычыну страшнай няроўнасці паміж людзьмі. Гэтае адмаўленне, нягледзячы на тое што аўтар асцярожны ў фармулёўках, выказвалася недвухсэнсоўна.

"Калі б быў час зрабіць дэталёвы разгляд, — пісаў Русо, — я б вам растлумачыў, якім чынам, нават без умяшання ўладаў, непазбежна паўстае няроўнасць у даверы і аўтарытэце, бо, як толькі людзі злучаюцца ў грамадства, яны мусяць параўноўваць сябе з іншымі... І я б падкрэсліў, наколькі гэтае ўсеагульнае жаданне мець добрую рэпутацыю, пашаны, прывілеі, якое згрызае нас усіх, вылучае і параўноўвае таленты і высілкі, наколькі яно ўзбуджае і павялічвае імпэт, наколькі яно, робячы ўсіх людзей канкурэнтамі, супернікамі і нават ворагамі, заўсёды выклікае розныя нягоды, поспехі і катастрофы, бо прымушае столькіх прэтэндэнтаў бегчы па адной і той жа сцежцы...

Нарэшце, я даказаў бы, што тады, калі жменька магутных і заможных улюбёнцаў лёсу знаходзіцца на вяршыні велічы і багацця, асноўная маса людзей пакутуе ў цемры і галечы; прычына гэтага ў тым, што багатыя не цэняць таго, што маюць і чаго пазбаўленыя іншыя. Я таксама даказаў бы, што багацеі перасталі б быць шчаслівымі, калі б народ выкараскаўся з галечы"[1].

[1] *Discours, nouv. éd., Paris, 1954 (Edit. Sociales), p.140.*

Русо пратэставаў супраць празмернай няроўнасці сярод людзей, якую назіраў у тагачаснай Францыі[1]. Але ён таксама вельмі добра ўсведамляў, што багацеі самі ёсць ахвярамі адчужэння ў багацці, якое панавала ў тагачасным свеце.

"Той, хто лічыць сябе гаспадаром іншых, — пісаў ён у *"Грамадскай дамове"*, — сам большы раб, чым іншыя"[2].

Гэткім рэзкім выкрыццём сацыяльнага прыгнёту і адчужэння аўтар, бясспрэчна, паказваў нам, што праблемы, уласцівыя дачыненням паміж людзьмі, не маюць нічога супольнага з праблемамі тлумачэння прыроды. Менавіта з гэтае прычыны Русо адкрыта выступаў супраць тых, хто разглядаў грамадства як прыродную рэальнасць.

У адным з раздзелаў свайго твора *"Палітычныя інстытуцыі"* (першая неапублікаваная рэдакцыя *"Грамадскай дамовы"*) Русо асабліва крытыкаваў Дзідро і ягоны артыкул "Натуральнае права" ў *"Энцыклапедыі"*, у якім апошні сцвярджаў пра існаванне ў чалавеку "інстынкту жыцця ў грамадстве" і тлумачыў грамадства як пакт, скіраваны на замацаванне натуральных законаў сацыяльнага жыцця. "Гэтая так званая грамадская дамова, прадыктаваная прыродай, ёсць, — пісаў Русо, — не больш чым хімера, бо яе ўмовы дагэтуль да канца не вядомыя і іх нельга ажыццявіць"[3]. Ён таксама сцвярджаў, што "не можа існаваць натуральнага і ўсеагульнага грамадства"[4].

Такім чынам, ён адхіляў сацыяльны натуралізм і гэтым супрацьпастаўляў сябе фізіякратам. На думку Русо, дачыненні паміж людзьмі ў грамадстве не маюць нічога суполь-

---

[1] *Нагадаем, што ў гады, якія папярэднічалі рэвалюцыі, 4000 сем'яў, "прадстаўленых пры дварэ", атрымлівалі ў форме пенсіяў і адлічэнняў за "выкананне абавязкаў пры каралеўскім дварэ" 61 мільён ліўраў, або 12 працэнтаў даходаў дзяржавы. Усе біскупствы і бальшыня абацтваў трымалі ў руках малодшыя дзеці з сем'яў багатае шляхты, якія, такім чынам, распараджаліся найбольшаю часткаю даходаў царквы (240 мільёнаў ліўраў). Апрача таго, шляхта атрымлівала прыкладна 100 мільёнаў ліўраў у форме феадальных павіннасцяў, якія плаціліся сяляне. Тым часам галеча народа расла, бо імкліва расла колькасць насельніцтва. Калі кошт хлеба дасягнуў 12 су за кілаграм, заробак працаўнікоў не падымаўся вышэй 30 су на дзень ў горадзе і 10 су — у вёсцы.*

[2] *Du contrat social, liv. I, chap. Ier.*

[3] *Cité par René Hubert, Rousseau et l'Encyclopédie, Paris, 1928, p.43.*

[4] *Id., ibid., p.37.*

нага з прыроднымі з'явамі, бо ўяўляюць сабою маральныя дачыненні, у якіх прысутнічае свядомасць людзей, а свядомасць не ёсць прыродная рэчаіснасць, але ёсць духоўная рэчаіснасць[1].

§ 3. Сцверджанне сацыялізму

Паколькі маральныя дачыненні паміж людзьмі ў межах пэўнага грамадства ў аснове сваёй дрэнныя, дык трэба іх змяніць. Але што павінна прыйсці ім наўзамен?

Русо адказваў: грамадства, у якім кожны чалавек захоўвае сваю свабоду. Але што ёсць свабода? Дзеля азначэння паняцця Русо з натхненнем ад Плятонавых *"Законаў"* вяртаецца да міфа аб першабытным чалавеку, які быў цалкам свабодны, бо жыў у поўнай ізаляцыі.

Згодна з Русо, чалавек адрозніваецца ад жывёлы сваёй здольнасцю выбіраць паміж рознымі варыянтамі дзеяння. І менавіта ў гэтым, на яго думку, палягае свабода.

"Спецыфічным адрозненнем чалавека ад жывёлы ёсць не столькі здольнасць да мыслення, колькі здольнасць свабодна дзейнічаць. Прырода кіруе жывёлаю, і тая мусіць падпарадкоўвацца. Чалавек адчувае такі сама ціск, але ён свабодны або пагадзіцца, або супраціўляцца; і асабліва ва ўсведамленні гэтае свабоды выяўляецца багацце ягонае душы. Бо прыродаю можна растлумачыць механізм пачуццяў і ўзнікнення думак, але ў здольнасці хацець ці, дакладней, выбіраць, а таксама ў адчуванні гэтай здольнасці ляжаць выключна духоўныя прычыны, якія ніяк не растлумачыш на падставе законаў механікі"[2].

Свабода самому выбіраць, што рабіць, працягваў філо-

---

[1] *Гэта добра асвятліў Ch. Bourthoumieux у творы "Essai sur le fondement philosophique des doctrines économiques. Rousseau contre Quesnary", Paris, 1936. Інтэрпрэтуючы погляды Русо на грамадства, вучоны пісаў: "Яно (грамадства) — гэта найперш усведамленне сукупнасцю грамадзян сваіх матэрыяльных і маральных інтарэсаў, якое прыводзіць да дзейнасці па стварэнні ладу і закону. Праз гэта забяспечваецца галоўная ўмова для няспыннага эканамічнага жыцця грамадства з боку дзяржавы, бо праблемы, што паўстаюць, развіваюцца ў інтарэсах усіх... да той ступені, пакуль гэты агульны інтарэс не вызваліцца ад супярэчнасці прыватных інтарэсаў, сацыяльныя праблемы не будуць развязаныя, бо існуюць шматлікія падыходы да іх развязання (op. cit., p. 130).*

[2] *Discours sur l'origine de l'inégalité, op. cit., pp. 79-80. Як бачна, Русо рабіў вялікія саступкі філасофскім поглядам таго часу, бо дапускаў існаванне механічнага паходжання думак. Але ён лічыў, што сцверджаннем вольнага выбару ў якасці спецыфічнай здольнасці чалавека можна выратаваць спірытуалісцкую канцэпцыю чалавека.*

саф, у поўнай ступені належыць першабытнаму чалавеку, бо ён жыве ізалявана і ніхто не можа прымусіць яго.

"Кожны павінен зразумець, — пісаў ён, — што ланцугі рабства нарадзіліся толькі з прычыны ўзаемазалежнасці людзей і ўзаемных патрэбаў, якія іх ядналі; немагчыма падпарадкаваць чалавека без таго, каб папярэдне не паставіць яго ў такое становішча, калі ён не можа абыходзіцца без іншага чалавека; у становішча, якога ў натуральным стане не было. У натуральных умовах кожны быў вольны ад ярма, а закон мацнейшага не існаваў"[1].

Але Русо не імкнуўся вярнуць чалавецтва назад да першабытнага ладу, ён добра ведаў, што гэты стан — міфічны. Цывілізаваны чалавек павінен жыць у грамадстве. Такім чынам, паўстае праблема: які цывілізаваны чалавек, калі ён жыве ў грамадстве, можа захаваць сваю свабоду?

У сваім галоўным творы *"Грамадская дамова"* філосаф паставіў гэтую праблему ў наступных радках:

"Варта знайсці такую форму супольнасці, якая абараняла б і ахоўвала б асобу ад усялякага грамадскага прымусу, а таксама абараняла маёмасць кожнага індывіда, які ўваходзіць у гэтую супольнасць, у якой кожны, паяднаўшыся з усімі, падпарадкоўваўся б, аднак, толькі самому сабе і заставаўся б такім жа свабодным, як і раней"[2].

Для развязання гэтае праблемы аўтар прапанаваў наступнае выйсце: трэба, каб індывіды заключылі дамову, але не дзеля таго, каб захоўваць так званыя натуральныя правы, як гэта сцвярджалася ў ранейшай канцэпцыі грамадскай дамовы, а дзеля таго, каб забяспечыць адчужэнне кожнага супольніка, з усімі ягонымі правамі, ад усяго грамадства"[3].

Пры гэтым першабытнай свабоды, вядома, не будзе, але на яе месца прыйдзе "грамадзянская свабода", магчыма, найлепшы адпаведнік першабытнай свабоды. Усе людзі выракуцца прыроднай свабоды — але ніводны чалавек не зможа прыгнятаць сабе падобнага. Не будзе падпарадкавання чалавека чалавеку, усе будуць падпарадкоўвацца толькі закону, у якім увасобіцца "агульная воля".

Мы не будзем разглядаць, якім чынам Русо дастасоўваў свой тэзіс да пытання аб палітычным ладзе. Нам важна тое,

[1] *Ibid.,p.105.*
[2] *Du Contrat social, liv. I, chap. VI.*
[3] *Ibid.*

як ён падыходзіў да ролі палітычнай улады ў эканоміцы, бо менавіта ў гэтым Русо нам здаецца адным з пачынальнікаў навачаснага сацыялізму.

Хоць цывілізацыя і была прычынаю ўсіх бедаў чалавецтва, — тлумачыў ён, — але, нягледзячы ні на што, становішча цывілізаванага чалавека *можа* быць лепшае за становішча першабытнага чалавека, бо закон можа і павінен забяспечыць *роўнасць* паміж людзьмі.

"Я скончу гэты раздзел і гэтую кнігу, — пісаў ён, — заўвагай, якая павінна быць асноваю ўсякае грамадскае сістэмы; а менавіта я скажу, што замест прыроднай роўнасці дамовай уводзіцца маральная і законная роўнасць. Калі прырода магла спарадзіць фізічную няроўнасць паміж людзьмі, калі людзі могуць быць няроўныя па сіле або па таленце, яны будуць роўныя па дамове і правах"[1].

Русо адрозніваў дзве формы роўнасці: роўнасць "магутнасці" і роўнасць "багацця ў"[2]. Першая забяспечваецца тады, калі "магутнасць... залежыць толькі ад рангу і законаў"[3]. Што да роўнасці багацця ў, дык яна не можа быць абсалютнаю, але яна патрэбная, "каб ніводны грамадзянін не быў настолькі заможны, каб мець магчымасць купіць іншага грамадзяніна, і каб ніхто не быў настолькі бедны, каб мусіў прадаць сябе"[4].

У цэнтры ўвагі Русо былі захады, скіраваныя на забеспячэнне роўнасці багацця ў. Найбольш поўна ён выклаў сваю праграму па гэтым пытанні ў артыкуле "Палітычная эканомія", напісаным для *"Энцыклапедыі"*.

"Такім чынам, адным з найгалоўнейшых абавязкаў урада, — пісаў Русо, — ёсць барацьба з празмернай няроўнасцю багацця ў, але рабіць гэта трэба не праз канфіскацыю ў заможных людзей іхных скарбаў, а праз забеспячэнне роўных для ўсіх умоваў узбагачэння; не праз будаўніцтва шпіталяў для беднякоў, а праз гарантаванне ўсім грамадзянам магчымасці зрабіцца заможнымі".

Русо не прапаноўваў скасаваць прыватную ўласнасць, але меркаваў, што з мэтаю абмежавання яе памераў можна пайсці на шэраг тыпова "сацыялістычных" крокаў. Ён сцвярджаў, што дзяржава мае права абмяжоўваць памеры спад-

[1] *Ibid., liv. Ier, chap. IX.*
[2] *Ibid., liv. II, chap. XI.*
[3] *Ibid.*
[4] *Ibid.*

чыны; казаў, што "права ўласнасці па сваёй прыродзе не выступае за межы жыцця ўласніка"[1].

Больш таго, дзяржава мае права абмежаваць адчужэнне маёмасці, каб яна не пакідала межаў сям'і[2].

Нарэшце, Русо разглядаў падатак як сродак забеспячэння роўнасці. Перадусім пры ўстанаўленні памераў падатку трэба ўлічваць колькасць багацця: "Той, хто мае толькі самае неабходнае, не павінен плаціць нічога, падатак жа з таго, у каго ёсць лішак, можа, калі трэба, забіраць усё, што звыш неабходнага"[3]. Падатак не павінны разглядацца як просты сродак забеспячэння дзяржавы грашыма; ён мусіць "не дапускаць няспыннага павелічэння няроўнасці", дапамагаць беднякам і абмяжоўваць багатых. Русо быў пераканаць прыхільнік падаткаў на раскошу[4].

Урэшце, Русо прыйшоў да разгляду дзяржавы як агульнага заступніка, супраць чаго так выступалі лібералы. "Няхай Бацькаўшчына, — пісаў Русо, — стане маці ўсіх грамадзян; няхай тыя перавагі, якімі яны карыстаюцца ў сваёй краіне, робяць яе яшчэ больш мілай для іх"[5].

Безумоўна, адукацыя — найпершае дабро, якое належыць распаўсюдзіць на ўсіх грамадзян. Але досыць важкі і матэрыяльны дабрабыт: "Недастаткова мець грамадзян і абараняць іх, варта яшчэ і падумаць пра сродкі існавання для іх, бо клопат пра грамадскія патрэбы — відавочны вынік агульнае волі". Сын Жэнэўскай рэспублікі ўслаўляў сістэму, функцыянаванне якое назіраў у сябе на радзіме: гэта грамадскія запасы, створаныя, каб не дапусціць голаду ў неўраджайныя гады[6].

Нягледзячы на вельмі сучасны характар заканадаўчых крокаў, якія адстойваў аўтар *"Грамадскай дамовы"* (напрыклад, прагрэсіўны падатак), відавочна, што ён не здагадваўся, з якімі праблемамі сутыкнуцца ў XX ст. ягоныя наступнікі пры спробе пабудаваць сацыялістычнае грамад-

[1] *Art. "Economie politique", OEuvres complètes, Paris, 1837, t. I, p.597.*
[2] *Ibid, p. 597.*
[3] *Ibid., p. 604.*
[4] *Ibid., pp. 603 et 604.*
[5] *Ibid., p. 594.*
[6] *Ibid., p. 599.*

ства. Калі Русо запрасілі скласці *"Праект карсіканскай канстытуцыі"*, ён абмежаваўся прынцыпам раўнання зямельных надзелаў паміж сем'ямі і прапановай зрабіць гэтыя надзелы неадчужальнымі. Гэта было кароткім пераказам праекта, сфармуляванага Плятонам у *"Законах"*. Блізіня да Плятона сведчыць пра тое, на якой яшчэ амаль зародкавай стадыі знаходзілася інтэлектуальная рэвалюцыя, што дала жыццё навачасным сацыяльным вучэнням.

У чым жа, з гледзішча сацыяльнай філасофіі, слабіна асноўных тэзісаў Русо?

§ 4. Супярэчлівы характар вучэння Русо

Велізарнае значэнне сацыяльнай філасофіі Русо ў тым, што ў ёй сцвярджаецца *духоўны характар грамадскага жыцця*. На думку філосафа, грамадства не машына, яно ўяўляе суб'ект, "адзінку", якая мае сваю волю. "Грамадская дамова, — пісаў Русо, — дае нараджэнне калектыўнаму і маральнаму арганізму, які складаецца з столькіх супольнікаў, колькі на сходзе ёсць удзельнікаў, і які з самога факта дамовы робіцца адзіным, атрымлівае сваё супольнае "я", сваё жыццё і сваю волю"[1].

Такім чынам, вельмі відавочная супярэчнасць паміж такой сацыяльнай філасофіяй і вучэннем лібералаў. Аднак гэтая супярэчнасць не настолькі поўная, як магло б здацца. Нягледзячы ні на што, аўтар бясспрэчна пагаджаўся з канцэпцыяй, якая разглядае індывіды як цэласнасць, як самадастатковую адзінку.

"Кожны індывід... сам па сабе — дасканалая і адасобленая адзінка"[2].

Русо прыйшоў якраз да такога, як і ў лібералаў, азначэння свабоды.

"Прыродная" свабода — гэта магчымасць ажыццяўляць сваю вольна выбраную дзейнасць без аніякага прымусу з боку іншага чалавека". Тое самае казаў Кенэ. Але Кенэ рабіў выснову, што свабоду будуць паважаць у тым грамад-

[1] *Du Contrat social, liv. I, chap. VI.*
[2] *Ibid., liv. II, chap. VII.*

стве, дзе дзяржава ўстрымліваецца ад умяшання ў дачыненні паміж прыватнымі асобамі.

Што да Русо, то ён меркаваў, што прыродная свабода ў грамадстве немагчымая. Замест прыроднай свабоды ён прапанаваў грамадзянскую свабоду, якая ёсць адпаведнікам натуральнай свабоды, бо падпарадкоўвацца ўладзе, якая дзейнічае ад імя закону, не азначае падпарадкоўвацца пэўнаму чалавеку. Той, хто аддае загады, выступае як прадстаўнік закону, а не як індывід.

"Пры дасканалым заканадаўстве, — пісаў Русо, — прыватная воля павінна быць роўная нулю"[1]. Відавочна, што падобныя заявы могуць выклікаць занепакоенасць, і яны тлумачаць, чаму асобныя аўтары мелі падставы разглядаць Русо як папярэдніка таталітарных дактрынаў XX ст.

Несумненна, Русо імкнуўся спрыяць вызваленню людзей, але відавочна таксама, што яго канцэпцыя адхілення ўсіх "прыродных свабодаў" ў *"Грамадскай дамове"* можа стацца вельмі небяспечнаю.

Калі ліберады лічылі, што эканамічныя законы могуць забяспечыць грамадскі парадак, Русо спадзяваўся на заканадаўцаў і ўрад. Але як у ліберальнай дактрыне ўсёй сукупнасцю грамадскіх дачыненняў павінны кіраваць эканамічныя законы, так у Русо заканадаўца і ўрад атрымліваюць неабмежаваныя *паўнамоцтвы*[2]. "Індывідуалістычная" канцэпцыя свабоды, якая раней вяла да падпарадкавання чалавека механізму рынку, паводле Русо, можа прывесці нас да падпарадкавання таталітарнай уладзе дзяржавы.

Бібліяграфія

Рознабаковых даследванняў, прысвечанных Жану Жаку Русо, вельмі шмат. Працытуем найноўшыя з іх:

R. Derathé, *Jean-Jacques Rousseau et la science politique de son temps*, Paris, 1950; P. Burgelin, *La philosophie de l'existence de Jean-Jacques Rousseau*, Paris, 1952; B. Groethuysen, *Jean-Jacques Rousseau*, Paris, 1949; J. Starobinski, *Jean-Jacques Rousseau, la transparence et l'obstacle*, Paris, 1958; H. Guillemin, *Cette affaire infernale (J.-J. Rousseau-*

[1] *Ibid., liv. III, chap. II.*

[2] *"Наш чалавечы род, — пісаў Русо ў "Эмілі", — не задавальняецца палавінчатасцю". (OEuvres, op. cit., t. I, p. 399).*

David Hume), Paris, 1942; J. Guehenno, *Jean-Jacques*, Paris, 1952; J. W. Chapman, *Rousseau, totalitarian or liberal*, New York, 1956; R. D. Masters, *The political philosophy of Rousseau*, Princeton, 1968; W. Durant, *Rousseau et la Révolution, traduit de l'anglais*, Lausanne, 1969; R. Polin, *La politique de la solitude*, Paris, 1971; D. Cameron. *The social thought of Rousseau and Burke*, London, 1973.

Раздзел III

КРЫТЫКА ФІЗІЯКРАТАЎ У ТВОРЧАСЦІ АБАТА МАБЛІ

Абат Маблі быў братам Кандыльяка. Як і брат, ён варожа ставіўся да поглядаў фізіякратаў, але з іншых прычынаў. Абата не вельмі турбавалі абстрактныя тэорыі фізіякратаў, якія, на думку Кандыльяка, былі "метафізічнымі"; Маблі абураўся іх сцверджаннямі, скіраванымі на тое, каб выкараніць усякую сувязь сацыяльных навукаў і маралі.

У 1768 г. выйшла ў свет ягоная кніга "Меркаванні наконт асноўнага і натуральнага парадку палітычных грамадстваў, выказаныя на адрас філосафаў-эканамістаў".

Немагчыма, сцвярджаў ён, каб цяперашнія грамадскія інстытуцыі, у прыватнасці зямельная ўласнасць, адпавядалі пажаданням прыроды, бо надта шмат ліха на гэтым свеце:

"Чаго я баюся, — засцерагаў ён, — дык гэта таго, каб ваш натуральны лад не супярэчыў прыродзе. Як толькі я гляджу на сістэму зямельных уладанняў, я бачу няроўнасць багацця; а ці не гэтыя непрапарцыйныя багацці ёсць прычынаю супрацьлегласці інтарэсаў у грамадстве, заганаў багацця і беднасці, атупення розумаў, разбэшчвання нораваў, а таксама ўсіх забабонаў і непатрэбных памкненняў, што пры кожным выпадку будуць душыць рэчаіснасць, на якой, аднак, нашы філосафы грунтуюць свае апошнія спадзяванні? Разгарніце кніжкі па гісторыі, і вы ўбачыце, што ўсе народы пакутавалі ад няроўнасці багацця. Частка грамадзян, узганарыўшыся багаццем, грэбавала глядзець як на роўных на людзей, вымушаных працаваць, каб забяспечыць сваё існаванне; вы адразу ўбачыце, як паўставалі несправядлівыя і тыранічныя ўрады, неаб'ектыўныя і жорсткія законы, адным словам, розныя няшчасці, ад якіх стогнуць народы"[1].

Паводле вучонага, крыніца памылкі эканамістаў у тым, што яны атаясамлівалі грамадскі лад з *прыродным* ладам.

"Грамадства складаецца з прыродных істотаў, але гэтыя прыродныя істоты надзеленыя маральнымі якасцямі... Колькі я не вывучаў чалавека, я бачыў толькі спалучэнне прыроднага і маральнага..."[2]

"Грамадскія інстытуцыі арганізаваліся не таму, што чалавек упадабляецца жывёліне, якую трэба карміць, а таму, што ён разумны і мае пачуцці. Сельская гаспадарка існуе дзеля таго, каб дапамагаць грамадству, а не грамадства існуе дзеля таго, каб забяспечыць росквіт сельскай гаспадаркі"[3].

А што з'яўляецца сапраўды натуральным для людзей, дык гэта роўнасць і супольнасць маёмасці. Каб падмацаваць свой тэзіс, Маблі

---

[1] *Ouvrage cité, in Collection complète des OEuvres de l'abbé de Mably, Paris, l'an III de la République (1794 et 1795), t. XI, pp. 10-11.*

[2] *Ibid., pp. 23-24.*

[3] *Ibid., p. 26.*

звярнуўся да высноваў Плятона, да прыкладу Спарты, а таксама досведу езуітаў у Парагваі.

Ці праўду кажуць фізіякраты, што прыватная ўласнасць на зямлю неабходная для развіцця вытворчасці і прагрэсу? Невядома, адказваў наш аўтар. Бо "ў такім разе вынікае, што толькі прагнасць і юр здольныя разварушыць чалавечае сэрца. Хіба імкненне да пашаны, славы і гонару не зрабіла б болей, чым уласнасць?"[1]

Нават калі дапусціць, што фізіякраты маюць рацыю, нельга пагаджацца з іхнімі высновамі, бо клопат аб справядлівасці і міры мусіць быць вышэй за клопат пра павелічэнне багаццяў.

"Нават калі б уласнасць на зямлю значна больш, чым супольнае валоданне зямлёю, спрыяла аднаўленню капіталу (узапраўды гэта не так), дык і тады варта было б аддаць перавагу супольнаму валоданню. Навошта вялікі дабрабыт, калі ён змушае людзей быць несправядлівымі, браць на ўзбраенне сілу і хітрыкі дзеля ўзбагачэння? Ці можна сумнявацца наконт таго, што ў грамадстве, якое не ведае прагнасці, фанабэрыі і амбітнасці, апошні з грамадзян быў бы шчаслівейшы, чым сённяшнія найбагацейшыя зямельныя ўласнікі? Панове, не будзем спыняцца на заганах, якія выклікала ў краіне прыватная ўласнасць на зямлю. Але, парваўшы сувязі, якія павінны яднаць усіх грамадзян дзяржавы, хіба не разбурыла яна сусветны парадак? Якім чынам вы хочаце зрабіць, каб людзі, звыклыя да ўласнасці, не разумелі, што іх багацце павялічыцца, калі рэспубліка пашырыць свае межы за кошт суседзяў? Адсюль войны паміж дзяржавамі... І наадварот, ці не было б у грамадзян, якія не маюць асабістай уласнасці, але багатыя дзякуючы ўсеагульнаму дабрабыту, менш падставаў парушаць спакой сваіх суседзяў?"[2]

Палымянасць у адстойванні сістэмы супольнага валодання маёмасцю прыводзіць аўтара ў іншым творы да папрокаў у бок Плятона, які не хацеў распаўсюджваць гэтую сістэму на ўсіх грамадзян[3]. Аднак наш добры абат зусім не рэвалюцыянер. Ён цудоўна бачыў, наколькі сацыяльная няроўнасць настройвае бедных супраць багатых, і лічыў, што ў будучыні гэтая акалічнасць можа спрычыніцца да буйных паўстанняў, асабліва ў Злучаных Штатах Амэрыкі[4]. На думку абата, паўстанні прывядуць толькі да анархіі, а потым да дэспатызму, бо народ — гэта натоўп неразумных, раз'юшаных і сляпых істотаў[5]. У практычным плане аўтар ідзе амаль упоравень з патрабаваннямі часу. У людзях занадта глыбока ўкараніліся "забабоны", каб можна было аднавіць "прыродную роўнасць" і супольнае валоданне маёмасцю. Як і Русо, Маблі сцвярджаў, што

[1] *Ibid., p. 9.*

[2] *Ibid., pp. 13-14. Такая ж самая аргументацыя і ў іншым творы Маблі — "Аб заканадаўстве, або Прынцыпы законаў". Ён пісаў: "Што да мяне, то я абмяжоўваюся патрабаваннямі маралі і беднасць мяне не пужае, я ведаю, бедныя лепей паважаюць закон і справядлівасць, чым багатыя (Collection complète des Oeuvres, Op. cit., t. IX, p. 19).*

[3] *Гл. яго твор "Думкі наконт кіравання і законаў у Злучаных Штатах Амэрыкі".*

[4] *Cité par A. Lichtenberger, Le socialisme au XVIIIe siècle, op. cit., p. 239.*

[5] *OEuvres, op. cit., t. IX, p. 109.*

павагу да ўласнасці варта разглядаць як абсалютны прынцып, каб не трапіць у анархію: "У кожным грамадстве, дзе ёсць уласнасць, трэба бачыць у ёй падмурак парадку, міру і грамадскай бяспекі"[1]. Бо калі мы не можам болей падпарадкоўвацца простым законам прыроды, дык, прынамсі, трэба вывучаць, як у такім стане выправіць тыя беды, што спарадзіла няроўнасць багацця ў"[2].

Дарэчы, Маблі вельмі намагаўся выснаваць прынцыпы добрага кіравання і не паглыбляўся ў дэталі палітычнай эканоміі. Ён надта вялікі праціўнік рэвалюцый, каб верыць у магчымасць дасягнення сацыяльнай справядлівасці. Усведамляючы цяжкасці, якія паўстаюць перад усімі, хто хоча знайсці эфектыўныя сродкі дзеля пабудовы больш справядлівага грамадства без гвалтоўнай рэвалюцыі, вучоны практычна адмаўляўся ад пошуку шляхоў да роўнасці, тым больш да сістэмы супольнага валодання маёмасцю.

[1] *Ibid., p. 145.*

[2] *Doutes proposés aux philosophes économistes, OEuvres, t. XI, p. 222.*

Раздзел IV

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ УТЫЛІТАРЫЗМ ЎІЛЬЯМА ГОДЎІНА

Мы бачылі, наколькі ў ангельскай сацыяльнай філасофіі XVIII ст. быў папулярны прынцып карыснасці. Гаворка ішла пра тое, каб забяспечыць "найвялікшае шчасце як мага большай колькасці індывідаў". Эканамісты-ліберальі лічылі, што дасягнуць гэтага можна з дапамогаю скасавання ўсіх абмежаванняў з боку дзяржавы, але перад фактам росту паўперызацыі грунтоўнасць іх высноваў часта аспрэчвалася. У прыватнасці, так рабіў Ўільям Годўін, былы пастар, які пад уплывам французскай філасофіі стаў атэістам[1].

Натхняючыся падзеямі Французскай рэвалюцыі 1789 г., якая, на яго думку, вяла да сацыяльнага прагрэсу, ён выдаў у 1793 г. свой славуты твор *"Нататкі аб палітычнай справядлівасці і аб яе ўплыве на маральнасць і шчасце"*.

Восьмая кніга гэтага твора па палітычнай філасофіі, названая *"Пра ўласнасць"*, мае велізарнае значэнне з гледзішча развіцця эканамічнай думкі.

Годўін зыходзіў з прынцыпу карыснасці, але ягоныя высновы супярэчаць Смітавым, бо ён спалучаў прынцып карыснасці з ідэяй, што грамадства таксама павінна адпавядаць прынцыпу *рацыянальнасці*.

Кожны чалавек, на думку аўтара, дбае пра свой асабісты інтарэс і шукае максімум задавальненняў, але ён — істота разумная і ўсведамляе, што прынцып карыснасці мусіць ужывацца "бесстароннім" чынам, гэта значыць ніхто не павінен прэтэндаваць на нейкае задавальненне, калі ён гэтым пазбаўляе іншага індывіда ад, магчыма, нават большага задавальнення. "Маральная арытметыка", пра якую вялі гаворку утылітарысты, павінна распаўсюджвацца на ўсіх супольнікаў грамадства, і ў сваёй кнізе Годўін сцвярджаў гэты прынцып — прадвеснік будучых дыскусіяў пра "максімум задавальненняў".

"Кожны чалавек мае права на большую карысць і задавальненне,

---

[1] *Пра Годўіна можна прачытаць у раздзеле, які прысвяціў яму Edouard Dolléans у творы Drames intérieurs, Paris, 1944.*

калі ён атрымлівае маёмасць па ўзаемнай згодзе, чым калі гэта будзе зроблена іншым чынам"[1].

Паводле Годўіна, дзейнічаць бесстароннім чынам — значыць дзейнічаць "адпаведна з справядлівасцю". А справядлівасць — гэта адзіны прынцып маралі.

Годўін бязлітасна крытыкаваў агульнапрынятае разуменне права ўласнасці. Ніякім прынцыпам карыснасці нельга апраўдаць звычайную, спадчынную, уласнасць. Адзіная законная ўласнасць — гэта "ўласнасць на рэчы, права карыстання якімі мне перададзенае, бо такім чынам яны прыносяць больш выгодаў і задавальненняў, чым тады, калі б яны былі прысвоеныя". Уласнасць законная толькі тады, калі ўсе рэчы размяркоўваюцца ў залежнасці ад патрэбаў кожнага супольніка грамадства.

Сама палітычная эканомія Сміта, адзначаў Годўін, дае доказ, што грамадская сістэма, заснаваная на спадчыннай, а значыць, няроўнай уласнасці, з'яўляецца несправядлівай. Сміт паказаў, што першапачаткова вынікі працы цалкам належалі працаўніку. Пазней уладальнікі капіталаў і зямлі пачалі забіраць частку выпрабленага працаўніком, а гэта супярэчыць справядлівасці.

Ліберальі лічылі няроўнасць багацця ў натуральным феноменам, што папярэднічаў умяшанню дзяржавы ў эканамічнае жыццё. Годўін жа, наадварот, сцвярджаў: вінаватае ў няроўнасці спадчыннае права, зацверджанае дзяржавай. "Уласнасць ва ўсіх формах, якія яна можа набываць, падтрымліваецца дзякуючы беспасярэдняму ўмяшанню пэўнай дзяржаўнай інстытуцыі"[2]. Каб вярнуцца да натуральнага стану рэчаў, трэба скасаваць уласнасць.

Годўін таксама запазычыў Смітаў аналіз утварэння заробкаў і супярэчнасці інтарэсаў наймальнікаў і найманых працаўнікоў.

Сміт паказаў, што ў спрэчцы наконт заробкаў перамагаюць наймальнікі, бо іх няшмат і ім прасцей знайсці паразуменне між сабою. З гэтага трэба зрабіць выснову, казаў Годўін, што пры сучасным ладзе працаўнікі ніколі не будуць

[1] *Cité par E.Halévy, La formation du radicalisme philosophique, op. cit., t.II, p.107 (Цытата ўзятая з другога выдання кнігі Годўіна).*

[2] *Ibid., p. 114.*

мець больш за тое, што неабходна ім для выжывання. Калі краіна робіцца багацейшая, дык менавіта багацеі манапалізуюць увесь плён прагрэсу. А працаўнікі... яны па сутнасці як былі рабамі, так імі засталіся.

"Па-ранейшаму працягвае існаваць дух феадалізму, пры якім дзеля дабротаў жменькі людзей бальшыня чалавецтва жыла як рабы, як быдла"[1].

Годўін марыў пра грамадства, у якім кожны мог бы карыстацца вынікамі супольнай працы адпаведна са сваімі патрэбамі.

Адначасова ён выступаў за безурадавае грамадства, бо лічыў, што немагчыма ўводзіць законы, забяспечваць іх выкананне і караць за невыкананне, караць і не парушаць незалежнасць асобы.

Паводле вучонага, трэба імкнуцца пабудаваць такую дзяржаву, якая будзе дзейнічаць толькі пры неабходнасці вырашэння спрэчак у выпадку несупадзення асабістых інтарэсаў грамадзян. Суддзі будуць прызначацца з ліку грамадзян пры ўсеагульнай згодзе. Крытэр выбару суддзяў — толькі іх здольнасці[2].

Такім чынам, узнятая Русо праблема кампрамісу паміж свабодай і ўладай вырашалася лёгка праз скасаваннне аднаго з двух паняццяў. Пры гэтым не гаварылася, якім чынам можна яго скасаваць. Перад намі штосьці кшталту "догмата веры" ў будучыню. Гэты самы "догмат" прыводзіць Годўіна, у прыватнасці, да сцверджання, што машыны, якія ў яго эпоху прынеслі людзям столькі ліха, дазволяць, бадай, цалкам знішчыць цяжкую працу. Ад людзей у будучым запатрабуецца паўгадзіны працы на дзень, каб забяспечыць задавальненне патрэбаў, якія, зрэшты, зменшацца, бо людзі адмовяцца ад раскошы.

Мэты азначаны, але як іх дасягнуць? Годўін не жадаў гвалтоўнай рэвалюцыі, не дапускаў нават, каб усталяванню большай роўнасці паспрыяў самы малы прымус. Прымус — гэта ліха, якое супярэчыць прынцыпу карыснасці. Значыцца, неабходна, каб норавы змяняліся паступова, каб, на-

[1] *Ibid., p. 120.*
[2] *Ibid., p. 86.*

прыклад, багацеі самі, добраахвотна адмовіліся ад таго, што маюць у залішняй колькасці.

Аднак Годўін прыгадваў заўвагу, якую аўтар таго ж кірунку, Ўолес, робіць самому сабе ў кнізе *"Разнастайныя погляды на чалавецтва, прыроду і Вышэйшую сілу"* (1761). Скасаванне ўласнасці прывядзе да бясконцага памнажэння колькасці насельніцтва, а грамадства — да галечы. Менавіта беднасць зніжае нараджальнасць. Калі ж нараджальнасць будзе расці, галеча стане ўсеагульнай.

На гэтую заўвагу Годўін спачатку адказаў, што небяспека не з'яўляецца непазбежнаю, бо існуе вялікі патэнцыял павелічэння вытворчасці харчавання. Потым узгадаў зверхнасць розуму над пачуццямі.

"Адукаваны і дабрадзейны розум звычайна робіць нас абыякавымі да пачуццёвых задавальненняў[1]. Людзі, якія будуць жыць у часы, калі зямля сама адмовіцца насіць велізарную колькасць насельнікаў, перастануць памнажацца, у іх не стане на тое падставаў, ні грахоўных, ні абавязковых"[2].

Аспрэчванне гэтага сцверджання стане пунктам адліку крытыкі Мальтуса, скіраванай супраць усёй сістэмы поглядаў Годўіна.

---

[1] *Political Justice, London, 1793, vol. II, p.870.*

[2] *Ibid., p.871. У 1793 г. Годўін быў халасцяком і вельмі варожа ставіўся да шлюбу. Але ў 40-гадовым узросце ён завязаў сяброўства з вядомай феміністкай Мэры Ўолстоўнкрафт. Калі яна зацяжарыла, Годўін у 1797 г. таемна пабраўся з ёю шлюбам. Мэры, аднак, памерла пры нараджэнні дачкі, якая стане жонкай паэта Шэлі. У 1801 г. Годўін другі раз узяў шлюб. У сталасці ён, бадай, цалкам адмовіўся ад ідэяў, якія спавядаў у маладосці.*

Раздзел V

САЦЫЯЛІЗМ ФІХТЭ

Твор *"Замкнёная гандлёвая дзяржава"*, напісаны ў 1800 г. вялікім нямецкім філосафам Ёганам Готлібам Фіхтэ, трэба лічыць першым тэкстам, які яскрава засведчыў існаванне фундаментальнай праблемы, што паўстала з прычыны грамадскага характару вытворчасці і размеркавання дабротаў, — праблемы планавання. Ставячы яе, Фіхтэ пастараўся паказаць сапраўдную вагу планавання. Ён належаў да інтэлектуальнага асяродку, вельмі адрознага ад французскага і брытанскага, творчасць прадстаўнікоў якіх мы разглядалі дагэтуль. Нагадаем, якім шляхам ішло развіццё нямецкай філасофскай думкі напрыканцы XVIII ст. Перш за ўсё мусім узяць пад увагу, што ў гэтую пару ў Германіі нарадзілася ідэя грамадскай эвалюцыі, якая не згубіла сваёй каштоўнасці да нашых дзён. Апрача таго, мы не можам не разгледзець падыходаў да развязання сацыяльнай праблемы філосафа, ідэі якога сталі апірышчам для ўсіх нямецкіх "класічных" філосафаў. Гаворка ідзе пра Іммануіла Канта.

§ 1. Ідэя грамадскай эвалюцыі

Дарэмна шукаць у працах аўтараў, творчасць якіх мы вывучалі ў папярэдніх раздзелах, ідэю, якая сёння нам здаецца настолькі звыклай і згодна з якою "натуральная эвалюцыя", або "спантанны прагрэс", дазваляе чалавецтву наблізіцца да сацыяльнай справядлівасці. Не трэба забываць, што, паводле Русо (а ён недалёка адышоў ад поглядаў Платона), чалавецтва няспынна *аддаляецца* ад роўнасці, а значыць, і ад справядлівасці.

Аўтар "Грамадскай дамовы" нічога не чакаў ад "натуральнай" эвалюцыі. Ён спадзяваўся на Заканадаўцу з вялікай літары, які прыйдзе, каб змяніць грамадства, і ўсталюе зусім новыя правілы жыцця.

Прагрэсам жа ў XVIII ст. галоўным чынам называлі развіццё чалавечае *свядомасці*, якая лічылася плёнам назапашаных ведаў.

У XVII ст. Паскаль, запазычыўшы ідэю, распрацаваную Эпікурам і Лукрэцыем, пісаў:

"Уся супольнасць людзей на працягу гэтулькіх стагоддзяў павінна разглядацца быццам адзін несмяротны чалавек, які няспынна спазнае свет"[1].

---

[1] *Фрагмент з Трактата аб вакууме.*

Гэтая ідэя прысутнічала ў *"Філасофіі Асветы"* XVIII ст. У прыватнасці, мы сустракаемся з ёю ў *"Нататках аб норавах і духу народаў"* Вальтэра, *"Разважаннях аб сусветнай гісторыі"* Цюрго (1750 г.), у *"Накідзе гістарычнага малюнка прагрэсу чалавечага розуму"* Кандарсэ (1794 г.).

Ідэя прагрэсу адыграла вялізную ролю ў падрыхтоўцы Французскай рэвалюцыі, яна натхніла розумы, якія прагнулі свабоды думкі, на паўстанне супраць інстытуцый манархіі і царквы, што адмаўлялі гэтую свабоду. Аднак сама па сабе ідэалогія Асветы зусім не была рэвалюцыйнаю. Філосафы XVIII ст. гэтаксама, як і фізіякраты, былі прыхільнікамі "асветнага дэспатызму". Яны не жадалі знішчэння грамадскіх інстытуцый, а імкнуліся адно накіраваць палітычную ўладу ў бок лібералізму. Філосафы Асветы лічылі, што ўсебаковае паляпшэнне чалавека пачне адбывацца з таго моманту, калі індывіды ўзбагацяцца новымі і разнастайнымі ведамі.

Гэтая ідэалогія створана буржуазіяй; сёння буржуазная ідэалогія ў сваёй аснове застаецца такою ж, якою была ў XVIII ст. Згодна з гэтай тэорыяй, *прагрэс чалавецтва вынікае з інтэлектуальнага прагрэсу індывідаў*. Чалавецтва робіцца лепшым, хоць інстытуцыйныя асновы грамадства (перадусім уласнасць) карэнным чынам не змяняюцца.

Гэткаму ўспрыманню прагрэсу з даўніх часоў супрацьстаўлялася іншае меркаванне, народжанае пад уплывам Біблii. Паводле гэтай канцэпцыі, чалавецтва праходзіць паслядоўныя стадыі, апошняю будзе *міленіум* — эпоха дасканаласці і шчасця, якую Бог абяцаў людзям. Мы ведаем, такія думкі натхнялі шматлікіх рэфарматараў грамадства, пачынаючы ад першых стагоддзяў існавання хрысціянскай веры і канчаючы эпохай Адраджэння. Але рэфарматары (напрыклад, Кампанэла) лічылі, што пераход ад аднае стадыі да другой ёсць вынік Боскага ўмяшання, значыць, гаворка ішла пра нейкі цуд.

У 1725 г. італьянскі мысляр Франчэска Віко выдаў працу *"Пачаткі новай навукі пра прыроду нацый"*. Яго можна лічыць папярэднікам сучаснай ідэі аб грамадскай звалюцыі.

У творы, глыбока прасякнутым рэлігійным духам, сцвярджалася: усё, што здараецца з чалавекам, адпавядае волі Вышэйшае сілы. Аднак падкрэслівалася таксама, што існуе сувязь паміж зменамі, якія адбываюцца ў прыродзе, і пераўтварэннямі ў чалавечых грамадствах. Такім чынам, аўтар вельмі блізка падыходзіў да эвалюцыянісцкай канцэпцыі грамадства.

Яшчэ адзін прыхільнік гэтае канцэпцыі — французскі пісьменнік Жан дэ Шастэлюкс, які ў 1772 г. апублікаваў твор, накіраваны супраць Маблі, пад назовам *"Пра грамадскае шчасце, або Роздумы пра лёсы людзей у розныя гістарычныя эпохі"*. У ім аўтар развіваў тэорыю, паводле якой чалавечая гісторыя складаецца з трох паслядоўных эпохаў: у першай пануе роўнасць, потым развіццё людскіх здольнасцяў прыводзіць да з'яўлення няроўнасці; але пад канец эпохі няроўнасці, калі чалавек дасягне найвялікшага роўню дасканаласці, зноў запануе роўнасць[1].

[1] *У гэтай жа працы ёсць цікавыя развагі наконт эксплуатацыі чалавека, якая вымяра-*

Аднак сапраўдным стваральнікам грамадскага эвалюцыянізму лічыцца нямецкі пастар Гэрдэр (1744—1803), аўтар шматлікіх твораў, у якіх ён намагаецца даць абагульнены погляд на чалавечую гісторыю.

У першым творы *"Іншая філасофія гісторыі"* (1774 г.) Гэрдэр жорстка крытыкаваў тагачасную цывілізацыю, якую назваў "механічнай"[1], і ўслаўляў Сярэднявечча. Такім чынам рыхтавалася глеба для будучай канцэпцыі, якая будзе разглядаць кожную цывілізацыю як асобны этап у эвалюцыі, які, аднак, змяняецца вышэйшым этапам.

Тыя ж думкі аўтар развіваў у кнізе *"Ідэі аб філасофіі гісторыі чалавецтва"* (1784—1791).

Прырода, паводле Гэрдэра, дае нам прыклад шэрагу ўсё больш дасканалых стварэнняў: расліны, жывёлы, чалавека. Але і сам чалавек прагрэсуе. Аднаму з раздзелаў кнігі філосаф даў назоў: "Наша чалавецтва — гэта толькі падрыхтоўчы стан, гэта бутон, які павінен распусціцца"[2]. Пасля доўгай распрацоўкі ідэі аўтар разглядаў усе цывілізацыі, якія гістарычна чаргаваліся: Кітай, Тыбет, Індыя, Халдэя, Пэрсія, Юдэйская цывілізацыя, Фінікійская, Картаген, Эгіпет, Грэцыя, Рым і, нарэшце, хрысціянская Эўропа. Ён паказаў, што кожная з гэтых цывілізацыяў успрымаецца залежна ад месца і часу, у якіх яны знаходзяцца. Дасканалы стан чалавечага роду яшчэ не дасягнуты. Аўтар сцвярджаў, што дасягнуць яго можна будзе толькі ў іншым жыцці. Аднак, пісаў ён, "верыць, што ў будучыні паўсюль на свеце будуць жыць чулыя, справядлівыя і шчаслівыя людзі, — гэта прыемнае спадзяванне, а не пустая хімера"[3].

Дарэчы, у біялогіі Гэрдэр не быў прыхільнікам ідэі "трансфармізму", якую ў 1800 г. у якасці тлумачэння чаргавання відаў жывых істотаў вылучыць Лямарк. Аднак наконт эвалюцыі чалавека Гэрдэр прапанаваў канцэпцыю, вельмі падобную на Лямаркаву.

Менавіта таму, што канцэпцыя Гэрдэра блізкая да трансфармізму, безумоўна, *яна не рэвалюцыйная*. Паводле аўтара, чаргаванне цывілізацыяў адбываецца ў выніку дзеяння натуральнага закону, які ёсць праяўленнем Боскае волі, перад якою чалавек мусіць схіліць галаву[4].

Згодна з Гэрдэрам, законы гісторыі цалкам супадаюць з законамі прыроды. Каб стварыць накід філасофіі гісторыі, Гэрдэр нават спрабаваў абапірацца на законы агульнай механікі, якія вывеў тагачасны астраном-матэматык[5].

Згодна з вучэннем Гэрдэра, свабода чалавека — гэта толькі свабо-

---

ецца гадзінамі працы. Гл. на гэты конт N.Stark, A Foreunner of marxism, F.J.de Chastellux, Economica, mai 1941.

[1] *Ouvr. cit., trad. franç.,Paris, 1942, p. 241.*

[2] *1re Partie, liv. V, chap. V.*

[3] *Cité par J. Delvaille, Essai sur l'histoire de l'idée de progrès jusgu'à la fin du XVIIIe siècle, Paris, 1910. Пра Гэрдэра можна прачытаць у бліскучым творы Max Rouché, La philosophie de l'histoire de Herder, Paris, 1940.*

[4] *Max Rouché, op. cit., p.544.*

[5] *Ibid., pp. 368-369.*

да часовага адхілення ад Боскай волі[1]. Фактычна Гэрдэр быў кансерватарам, праціўнікам Асветы. Грамадскі эвалюцыянізм прывёў яго да адкрыта варожага стаўлення не толькі да ідэі рэвалюцыі, але і да ідэі, што патрэбна дзейнічаць супольна і няспынна, каб развіццё грамадства не спынялася.

Далей з падобнымі падыходамі мы сустрэнемся ў нямецкага філосафа Шэлінга ў ягоным творы *"Узрост свету"* (1815).

§ 2. Крытыцызм Канта і сацыяльная праблема

Мы бачылі, як пачынаючы з XVII ст. развіццё дакладных навук прывяло французскую і ангельскую філасофію да матэрыялізму. Пасля таго як Дэкарт замацаваў прынцып, згодна з якім навукова можна спазнаць толькі рэчы, якія знаходзяцца ў прасторы, паступова навукоўцы прыйшлі да высновы, што ўся рэчаіснасць складаецца толькі з гэтых рэчаў.

Побач з матэрыялізмам Дэкарта развіўся ідэалізм Бэрклі. Паводле вучэння Бэрклі, мы здольныя спазнаць толькі пачуцці і ўспрыманні, гэта значыць працэсы, якія існуюць у нашай свядомасці. Значыць, мы не маем права сцвярджаць зыходзячы з нашага досведу, што навакольны свет існуе. Толькі вера ў Бога можа запэўніць нас у гэтым.

На практыцы такі падыход узмацняў пазіцыі матэрыялістаў. Бо, калі выбіраць паміж канцэпцыяй чалавека, цалкам засяроджанага на сваёй свядомасці, і канцэпцыяй чалавека, які спазнае рэальны свет і ўплывае на яго, безумоўна, выбар хутчэй за ўсё будзе на карысць апошняе, хай сабе і за кошт пераходу ў матэрыялізм.

Аднак напрыканцы XVIII ст. Іммануіл Кант (1724—1804) робіць спробу абысці гэтую дылему.

У *"Крытыцы чыстага розуму"* (1781 г.) ён прапанаваў наступнае яе тлумачэнне:

Вонкавы свет існуе, але навуковыя веды не дазваляюць нам спазнаць яго сапраўдную прыроду; з дапамогаю навуковых ведаў нельга спасцігнуць "рэчы ў сабе"; розум можа сягаць толькі тых "феноменаў", якія яны самі ствараюць дзякуючы паняццям прасторы, часу, колькасці, прычыннасці і г. д., якія існуюць у чалавечай свядомасці. Гэтага дастаткова, каб зразумець сувязі і выпрацаваць спосабы, якімі можна ўздзейнічаць на матэрыяльны свет.

Аднак побач са сферою, даступнаю для розуму і чалавечага ўмяшання, існуе і другая, цалкам адрозная ад першай. Гаворка ідзе пра сферу маральнага спазнання і валявых актаў. Матэрыялістам, казаў Кант, трэба запярэчыць, бо чалавек — свабодны і ён знаходзіць у сабе кіроўцу ўласных учынкаў — той маральны закон, прынцыпам якога ёсць "катэгарычны імператыў". Яго можна перадаць наступнымі словамі: "Дзейнічай такім чынам, каб максіма волі магла заўсёды служыць прынцыпам універсальнага заканадаўства".

[1] *Ibid., p.397.*

На падставе тэорыі маральных учынкаў Кант меркаваў унікнуць канфлікту паміж матэрыялізмам і ідэалізмам, адначасова адмовіцца ад хрысціянскай канцэпцыі маралі як створанае і загаданае самім Богам.

Сапраўды, паводле ягонае тэорыі, аб'ектыўна не можа існаваць маральнага ці немаральнага ўчынку ў сабе, бо маральны характар нейкага ўчынку толькі ад імкнення індывіда падпарадкоўвацца катэгарычнаму імператыву. Маральнага *кодэксу*, якога павінен прытрымлівацца кожны індывід, няма, існуе толькі маральнае *правіла*.

Мяркуючы, што ён гэткім чынам высветліў праблему Абавязку, Кант у творы *"Метафізічныя пачаткі вучэння аб праве"*, напісаным у 1797 г., скіроўвае свае высілкі на развязанне праблемы Права.

У філасофскіх сістэмах, якія мы разглядалі дагэтуль, паходжанне права заставалася такім жа цьмяным, як і паходжанне абавязку.

Гаворка ў іх ішла аб натуральных правах чалавека, якія ўяўляліся дарам, прывілеем, атрыманым ад Бога. Але калі чалавек у сваіх паводзінах у грамадстве задавальняецца падпарадкаваннем загадам Бога, то зноў парушаецца яго самастойнасць.

З другога боку, калі адкінуць паняцце натуральнага права, дык практычна немагчыма зразумець, якім чынам грамадства можа быць нечым іншым, як не безупыннай бойкай усіх супраць усіх, сапраўдным хаосам.

Кант таксама імкнуўся абысці гэтую дылему. "Праву або справядлівасці адпавядае ўсялякае дзеянне, якое дазваляе (ці максіма якога дазваляе) спалучыць свабодную волю кожнага са свабодай усіх, не парушаючы агульных законаў"[1].

Гэты прынцып вельмі блізкі да вызначэння катэгарычнага імператыву. Мы закранулі галіну, дзе немагчыма больш даваць апраўданне ўчынкам на падставе памкненняў, бо тут менавіта само дзеянне павінна разглядацца як справядлівае або несправядлівае. Значыць, трэба, каб філосаф даў апісанне такога грамадскага ладу, пры якім сапраўды магчыма на практыцы выкарыстоўваць дадзенае азначэнне права. Такое грамадства — гэта ліберальнае грамадства, якое ўжо апісалі фізіякраты і Эдам Сміт. Усё паўстае такім чынам, што Кантава дактрына права на самой справе ёсць спроба закласці грунт эканамічнаму лібералізму, які больш не меў бы матэрыялістычнай асновы, як у эканамістаў, але адпавядаў спірытуалізму крытычнай філасофіі.

Філосаф сцвярджаў, што менавіта ад формы ўчынку, а не ад зместу залежыць яго справядлівы або несправядлівы характар.

"Ва ўзаемадачыненнях аднае свабоднай волі з другою, — пісаў ён, — трэба абстрагавацца ад *матэрыі* волі, гэта значыць ад мэты, якую кожны індывід укладвае ў тое, чаго ён хоча; напрыклад, не ўздымаецца пытанне пра тое, здолее ці не атрымаць выгаду індывід, які набывае нейкі тавар дзеля яго наступнага перапродажу, бо трэба бачыць толькі *форму*

[1] *Eléments métaphysiques de la doctrine du droit, trad. franç., Paris, 1853, p. 44.*

ўзаемадачыненняў дзвюх воляў, якія разглядаюцца як *свабодныя*, а таксама вызначыць, ці можа воля аднаго чалавека адпаведна з усеагульным законам быць сумяшчальнай са свабодай іншага чалавека"[1].

Відавочна, тут Кант пераняў вучэнне эканамістаў, згодна з якім абмен таварамі, канкурэнцыя *аўтаматычна* ўзгадняюць адны прыватныя інтарэсы з другімі. На яго думку, справядлівым учынкам з'яўляецца дзеянне ўласніка тавару, які бярэ ўдзел у працэсе абмену і адмаўляецца ад усялякага прымусовага ўздзеяння на ўсіх іншых удзельнікаў абмену, гэта значыць "трымаецца правілаў гульні" канкурэнтнай барацьбы.

З Кантава азначэння права вынікала, што грамадства павінна грунтавацца на прыватнай уласнасці і на свабодзе ўласнікаў абменьвацца сваімі таварамі.

У адстойванні свайго тэзіса аўтар заходзіць надта далёка. Ён сцвярджаў, што ў добра ўладкаваным грамадстве толькі ўласнік можа быць грамадзянінам, а той, хто можа прадаваць толькі сваю працу, не павінны мець такіх правоў[2].

Але як толькі замацоўваецца прынцып уласнасці, абавязкова паўстае праблема роўнасці, і тут Кант, які надзвычай варожа ставіўся да утылітарнага натуралізму, не можа скарыстаць з аргументацыі ліберлаў, паводле якой трэба змірыцца з сацыяльнай няроўнасцю, бо эканамічная свабода забяспечвае эканамічны прагрэс, а значыць, "найвялікшае шчасце як мага большай колькасці людзей". Кант, зрэшты, не пазбягаў гэтай праблемы, але разглядаў яе ў *"Крытыцы здольнасці меркаваць"* (1790 г.) вельмі павярхоўна.

У гэтым творы Кант хацеў дапоўніць сваю філасофію тлумачэннем, што ёсць пачуццё прыгожага, "эстэтычнае меркаванне", якое, пісаў ён, не можа атаясамлівацца ні з навуковымі ведамі, ні з меркаваннямі пра мараль. Каб падмацаваць свае высновы, філосаф нечакана звяртаецца да ідэі мэтазгоднасці. Пачуццё прыгожага — гэта ўсведамленне гармоніі паміж разнастайнымі з'явамі рэчаіснасці, чым пацвярджаецца тое, што ідэя прызначэння — фундаментальная для нашага розуму.

Аднак гэта прыводзіць да меркавання, што ўся прырода цалкам кіруецца прынцыпам мэтазгоднасці (хоць адзінымі па-сапраўднаму навуковымі тлумачэннямі прыродных рэчаў ёсць каўзальныя, механічныя,

---

[1] *Ibid.*

[2] *"Той, хто мае права голасу пры такім заканадаўстве, з'яўляецца грамадзянінам... Дзеля гэтага неабходная толькі адзіная якасць... а менавіта быць самому сабе гаспадаром (sui juris) і, значыць, мець нейкую уласнасць..." "Той, хто выконвае нейкі opus (працу. — Заўвага перакладніка), можа шляхам абмену перадаць яго іншаму, як быццам бы гэта ягоная ўласнасць. Але Praestatio operae (выкананне працы. — Заўвага перакладніка) не ёсць абменам. Слуга, маклер, парабак і нават цырульнік з'яўляюцца простымі operarii (працаўнікамі. — Заўвага перакладніка), а не artifices (майстрамі. — Заўвага перакладніка) (у шырокім сэнсе гэтага слова), і яны не падыходзяць, каб быць супольнікамі дзяржавы, а значыць, і грамадзянамі". (Тэкст узяты з невялічкага твора, напісанага ў 1793 г., пад назовам "Аб прымаўцы: тэарэтычна — праўда, а практычна — карысці няма". Trad. franç., à la suite de la Doctrine du droit., op. cit., pp. 361—362, texte et note).*

тлумачэнні). Ужо ў 1784 г. у творы, названым *"Ідэя ўсеагульнай гісторыі ў сусветнаграмадзянскім плане"*[1] і напісаным пад уплывам вучэння Гэрдэра, Кант карыстаецца ідэяй мэтазгоднасці ў дачыненні да гісторыі чалавечага роду.

"У цэлым, — пісаў ён, — гісторыю чалавецтва можна разглядаць як ажыццяўленне патаемнага плана прыроды — забяспечыць нутрана, а дзеля гэтай мэты таксама і вонкава дасканалы грамадскі лад; менавіта пры такім стане рэчаў прырода можа цалкам развіць усе задаткі, якія яна заклала ў людзей"[2].

А ў *"Крытыцы здольнасці меркаваць"* ідэя мэтазгоднасці апраўдвала сацыяльную няроўнасць:

"Спраўнасць, умельства, — пісаў філосаф, — можа развівацца ў чалавечым родзе не інакш, як пад уплывам няроўнасці паміж людзьмі; бо найвялікшая іх частка задавальняе свае патрэбы быццам механічна, не маючы пры гэтым асаблівай патрэбы ў мастацтве, тым часам астатнія вядуць прыемны і лёгкі лад жыцця: яны прысвячаюць сябе менш неабходным галінам — навуцы і мастацтву; яны прыгнятаюць першую, нашмат большую катэгорыю людзей, пакідаюць на іх долю цяжкую працу і абмежаваную колькасць задавальненняў; аднак і на гэты ніжэйшы клас паступова распаўсюджваецца нешта з культуры вышэйшага класа. Але з пашырэннем культуры (яе поўнае развіццё — гэта раскоша, калі схільнасць да празмернасці пачынае шкодзіць задавальненню неабходнага) пакуты аднолькава моцна павялічваюцца з абодвух бакоў; па-першае, у выніку чужога прыгнёту, а па-другое, з прычыны нутраное незадаволенасці; але гэтыя пакуты прыкрытыя вонкавым бляскам, звязаныя з развіццём прыродных задаткаў у чалавечым родзе, і мэта самой прыроды пры гэтым дасягаецца, *хоць яна і не ёсць наша мэта*"[3].

Урывак уражвае, тым больш што аўтар відавочна пераймае вучэнне Русо пра рост "пакутаў" беднякоў і саміх багацеяў. Аднак ён безумоўна пагаджаецца з ідэяй, што падобная сітуацыя можа доўжыцца вечна, бо ўяўляецца яму адзінаю ўмовай развіцця чалавечых здольнасцяў.

Гаворка не пра тое, каб, як у працытаваным творы 1784 г., сцвярджаць, што чалавецтва шыбуе ў бок дасканалага грамадскага ўладкавання. Філосаф патрабуе простага і поўнага скарэння перад мэтаю прыроды, якая выкарыстоўвае чалавецтва ў якасці свайго інструмента ("мэта самой прыроды пры гэтым дасягаецца, хоць яна і не ёсць наша мэта").

Праблема добрага ўладкавання грамадства не датычыць маралі, ці, як казаў Кант, "практычнай філасофіі". Пра гэта гаварылася ва "Уводзінах" да *"Крытыкі здольнасці меркаваць"*, дзе знаходзім наступныя радкі:

"Усе тэхнічныя практычныя правілы (гэта значыць правілы мастацтва і ўмельства або правілы асцярожнасці як здольнасць уплываць на людзей і на іх волю) павінны быць аднесеныя да тэарэтычнай філасофіі,

[1] *Trad. franç. in Kant, La philosophie de l'histoire, Opuscules, Paris, 1947.*

[2] *Op. cit. p. 73.*

[3] *Critique du jugement, trad franç., Paris, 1979, p. 242.*

бо з'яўляюцца яе вынікамі. Яны датычаць толькі здольнасцяў рэчаў адпаведна задуме прыроды, з чаго вынікаюць не толькі сродкі, якія мы знаходзім у прыродзе, але і сама воля... паколькі паводле гэтых правілаў яна можа вызначацца на падставе прыродных імпульсаў".

Якое тады адрозненне паміж такім падыходам і падыходам эканамістаў-лібералаў? Паводле эканамістаў, прырода скіраваная на забеспячэнне шчасця чалавецтва, на думку Канта, яна зарыентаваная на развіццё інтэлектуальных і маральных здольнасцяў чалавечага роду, а сапраўднага шчасця можна дасягнуць толькі ў нябесным сусвеце. Аднак відавочна, што ў абодвух выпадках людзям адмаўляецца ў праве ўмешвацца ў іхныя грамадскія дачыненні. У абодвух выпадках ад людзей патрабуецца поўная капітуляцыя перад Вышэйшай сілаю.

Дарэчы, гэтая сіла ў абодвух выпадках мае адно і тое ж імя — прырода; гэта, безумоўна, дае магчымасць зрабіць выснову, што Кантава філасофія грамадства не ідзе далей, чым натуралізм XVIII ст.

§ 3. Тэорыя рацыянальнага грамадства ў Фіхтэ

А) Біяграфічныя звесткі

З вывучэннем думкі Фіхтэ (нарадзіўся ў 1762 г. на захадзе Нямеччыны, памёр у 1814 г. у Берліне) мы закранаем творчасць філосафа, які гэтаксама, як некалі Плятон і Арыстотэль, адводзіў адно з галоўных месцаў роздумам аб эканамічным жыцці. У філосафаў Новага часу, якія папярэднічалі яму, на гэты конт можна знайсці толькі заўвагі другараднага плана. У Фіхтэ, наадварот, мы знаходзім праграму ўладкавання эканамічнага жыцця, якая, на думку аўтара, непасрэдна вынікае з адказаў на фундаментальныя філасофскія пытанні. Ягоная сістэма — закончаная канструкцыя, якая мае самыя дакладныя практычныя высновы.

Фіхтэ, хоць і прысвяціў сваё жыццё галоўным чынам выкладанню філасофіі, быў перакананы (як Плятон і Арыстотэль), што філосаф павінен уплываць на грамадства, у якім жыве.

У 1794 г. Фіхтэ выдаў твор *"Навукавучэнне"*, у якім выклаў прынцыпы сваёй сістэмы. Пасля, у 1796 г., напісаў працу *"Асновы натуральнага права"*, дзе выказаў уласную пазіцыю па ўсіх асноватворных праблемах грамадства, і ў прыватнасці па эканамічных праблемах.

Фіхтэ быў прафесарам Йенскага універсітэта. Яго погляды выклікалі шалёную крытыку. Фіхтэ абвінавацілі ў атэіз-

ме, і ў 1799 г. ён мусіў шукаць прытулку ў Прусіі. Там стаў прафесарам Берлінскага універсітэта. І менавіта тады, у 1800 г., ён выпусціў *"Замкнёную гандлёвую дзяржаву"* — твор, у якім прапанаваў комплексную праграму перабудовы грамадства. Адначасова з мэтаю прапаганды сваіх філасофскіх поглядаў у шырокіх колах Фіхтэ прысвяціў жыццё напісанню больш даступных твораў, чым *"Навукавучэнне"*. Так, у 1800 г. выходзіць адзін з такіх твораў — *"Аб накананаванні чалавека"*.

Неўзабаве Нямеччына была захопленая войскам Напалеона, і Фіхтэ, раней палымяны абаронца Французскай рэвалюцыі, далучыўся да справы патрыятычнай прапаганды, накіраванай супраць захопнікаў. Ён шмат разоў прапаноўваў каралю Прусіі прыняць яго ў войска, каб словам падтрымліваць мужнасць салдатаў, але прапановы не знайшлі станоўчага водгуку. Аднак сваімі знакамітымі *"Прамовамі да нямецкай нацыі"*, з якімі ён выступіў у 1807 г., філосаф моцна паўплываў на тагачасныя розумы.

Б) Ідэалізм Фіхтэ

Сказаць, што ўяўляе сабою рэчаіснасць і што ўяўляе сабою свет, — значыць размясціць розныя рэчы адны адносна другіх і, у прыватнасці, размясціць чалавека суадносна ўсяму астатняму свету, які звычайна называецца прыродай.

Пачынаючы з Дэкарта, філосафы падкрэслівалі, што чалавек валодае *самасвядомасцю*. Чалавек — гэта *Я, суб'ект*, які мае перад сабою ўвесь астатні свет, *аб'екты*.

Але развіццё думкі не можа спыніцца на простым канстатаванні супрацьлегласці суб'екта і аб'екта (або розуму і матэрыі). Думка павінна яшчэ высветліць іх дачыненні. Ці незалежныя яны адзін ад другога? Ці існуюць унутры аднаго і таго самага свету два незалежныя сусветы? Або адзін з іх залежыць ад другога? І якім чынам?

Пытанні зусім не "чыста тэарэтычныя". Яны паўстаюць адразу, як толькі чалавек пачынае дастасоўваць сваю думку да практычнага жыцця. Ён выкарыстоўвае аб'екты (рэчы) і ўзаемадзейнічае з іншымі суб'ектамі. І калі ён хоча зразу-

мець тое, што робіць штодня, дык мусіць зразумець прыроду свайго ўздзеяння на рэчы, а таксама прыроду свайго ўздзеяння на іншых людзей. Для філасофіі не могуць быць чужымі ні праблемы маралі, ні палітычныя і эканамічныя праблемы.

Кант, каб знайсці кампраміс паміж матэрыялізмам і спірытуалізмам, прыйшоў да поглядаў, якія ўяўляюць сапраўдную здачу пазіцыяў філасофіі, бо сцвярджаў, што чалавек не можа ніякім чынам спазнаць ні "рэчы ў сабе", якія ўтвараюць аснову прыродных з'яваў, ні найвышэйшую духоўную субстанцыю, якой ёсць Бог.

Фіхтэ, які абвясціў сябе вучнем Канта і якога апошні неўзабаве раскрытыкаваў, не пагадзіўся на такое прыніжэнне ролі філасофіі. Ён адкінуў Кантавы неспазнавальныя "рэчы ў сабе" і сцвярджаў, што філасофія мусіць спазнаць, чым ёсць рэчаіснасць.

Паводле Фіхтэ, немагчыма лічыць, што свет складаецца з суб'ектыўнай (сукупнасці "Я" або суб'ектаў) і аб'ектыўнай частак, бо свет, складзены з супрацьлеглых частак (суб'ект супрацьстаўляецца аб'екту), ужо сам па сабе супярэчнасць, а з гэтым нельга пагадзіцца.

Фіхтэ прапанаваў наступнае сцверджанне: "Я" "стварае" "не-Я", якое ёсць вонкавым светам; усе характарыстыкі гэтага свету абумоўленыя "Я", і з дапамогай гэтага можна даказаць, што "Я" і свет утвараюць адзінае цэлае.

Аднак з той прычыны, што "Я" мае перад сабой вонкавы свет, яно абмежаванае. Каб зразумець абмежаванне "Я", трэба дапусціць, што яно ў сваім развіцці атрымлівае нейкі "штуршок", які стрымлівае "Я". Гегель неўзабаве зазначыць, што ідэя штуршка, які знаходзіцца па-за межамі "Я", уяўляе з сябе ў вышэйшай ступені штучную гіпотэзу. Здаецца, у канчатковым выніку Фіхтэ прызнаў гэта і сам, бо далей удасканаліць сваю думку, наблізіцца да сцверджання, што еднасць "Я" і свету ажыццяўляецца толькі на практычным роўні. Ён казаў: "Я" ўяўляе перш за ўсё "намаганне" дасягнуць панавання над вонкавым светам, які існуе побач. Філасофія Фіхтэ ставіла на першы план маральны абавязак,

што разглядаецца, як у Канта, у якасці вытворнага ад "катэгарычнага імператыву".

Кант сцвярджаў: дзейнічаць маральна можна толькі тады, калі чалавек верыць у будучае жыццё і ў асабістага Бога. Маралізм жа Фіхтэ прыводзіць яго да ўсё больш і больш відавочнага замацавання ў сваім вучэнні прынцыпу зверхнасці рэлігіі над філасофіяй, бо толькі рэлігія дазваляе "Я" злучыцца з бясконцасцю, з абсалютам.

Філосаф не здолеў цалкам абгрунтаваць вылучаны ім жа тэзіс аб еднасці чалавечага суб'екта і вонкавага свету. Такім, прынамсі, было меркаванне, якое неўзабаве выказаў Гегель:

"Фіхтэ, — пісаў Гегель, — не змог узняцца да ідэі розуму як рэальнай, закончанай адзінкі, да ідэі суб'екта і аб'екта, або да ідэі "Я" і "не-Я"; яна [гэтая адзінка] з'яўляецца [у яго], гэтаксама як і ў Канта, неабходным быццём, мэтай, верай, паводле якой сцвярджаецца, што два ўяўляюць адно, але дасягненне такой мэты прыводзіць да той самай супярэчнасці, што ў Канта, бо сапраўдная рэчаіснасць у мэце не існуе. Фіхтэ спыняецца на ідэі аб неабходным быцці; аднак, гэтаксама як і Кант, які вылучыў ідэю яднання ў веры, Фіхтэ канчае ідэяй аб веры... а паводле Фіхтэ, з'яднанне, у якое можна верыць, знаходзіцца ў *любові да Бога*. Але ў якасці аб'екта веры, прадчування гэтая форма паходзіць з рэлігіі, а не з філасофіі"[1].

Сапраўды, для Фіхтэ адрозненне паміж суб'ектам і аб'ектам — толькі прыкмета недасканаласці чалавечага розуму, які мусіць няспынна працаваць і рухацца ў бок дасканаласці, якой, зрэшты, не здолее дасягнуць, бо ў такім выпадку ён больш не існаваў бы як недасканалы. Такая выснова сведчыла аб паразе спробы пабудаваць свет, пазбаўлены ўсялякай супярэчнасці. Сказаць, што "Я" ёсць недасканалае — гэта сказаць, што яно не цалкам адпавядае сваёй прыродзе, а значыць, паўстае новая супярэчнасць. Мы прасочым, якую канцэпцыю свету пазней прапанаваў Гегель. Але найперш мусім разгледзець практычныя высновы Фіхтэ, асабліва ў дачыненні да палітыкі і эканомікі.

В) Асновы права

Перш за ўсё ўвагу ў гэтым пытанні трэба засяродзіць на

[1] *Leçons sur la Philosophie de l'Histoire, trad. franç., t. 7, Paris, 1991, pp. 1993 et 1994.*

працы Фіхтэ *"Асновы натуральнага права"*, выдадзенай у 1796 г.

Канцэпцыя права, якую развіваў аўтар, цесна спалучаецца з яго асноватворнымі падыходамі, з ягонай канцэпцыяй свету.

Рэчаіснасць, паводле Фіхтэ, цалкам спірытуальная або суб'ектыўная. Таксама можна было б сказаць, што ўся рэчаіснасць чалавечая (дарэчы, адначасова яна ёсць і праявай Бога, які сам па сабе застаецца неспазнавальным). Усё існае — гэта прадукт чалавечага розуму, свет аб'ектаў, якія гэты розум стварае для сябе, каб мець магчымасць здзейсніць сваё прызначэнне.

А чалавечы свет характарызуецца адным асноўным фактарам, а менавіта існаваннем мноства суб'ектаў або "Я". Няма *чалавека*, але ёсць *людзі*. Каб падкрэсліць выснову, Фіхтэ ў доўгім аналізе намагаўся даказаць, што шматлікасць суб'ектаў — галоўная ўмова існавання чалавечага роду[1]. Гэты аналіз, падсумаваны аўтарам формулай: "Чалавек робіцца чалавекам толькі ў асяроддзі людзей"[2] — мае велізарнае значэнне, бо, без усялякага сумневу, менавіта на яго будзе абапірацца Гегель, калі паспрабуе аднавіць канцэпцыю грамадскай сутнасці чалавека.

Што да Фіхтэ, дык ён застаецца прыхільнікам чыста індывідуалісцкай канцэпцыі чалавечай свабоды. Як Русо і Кант, ён вызначае свабоду як магчымасць асобнага індывіда *не быць вымушаным* выбіраць тую, а не іншую форму дзейнасці. Свабода тут проста і цалкам атаясамліваецца з тым, што звычайна называецца "свабоднай воляй".

Але калі трымацца гэтае канцэпцыі, дык стане немагчымым спалучыць існаванне грамадства і законаў, бо закон *прымушае* індывіда дзейнічаць тым ці іншым чынам.

Адзін з шляхоў развязання гэтай праблемы прапанавалі эканамісты, якія казалі: законы непатрэбныя, бо грамадства — гэта машына, якая дасканала функцыянуе без умяшання дзяржавы. Такая пазіцыя азначала далучэнне да матэрыялістычнай канцэпцыі грамадства.

---

[1] *Grundlage des naturrechts, Ire Partie, liv. I., § 3; Fichtes werke, Berlin, 1971, t. 3, p. 30; trad. française Fondement du droit naturel, Paris, 1984, p. 46.*

[2] *Op. cit., p. 39; trad. française, p. 54.*

Русо, які не пагаджаўся з гэткім падыходам, паспрабаваў прапанаваць іншае выйсце, сцвярджаючы, што *грамадская дамова*, нават калі яна і скасоўвае "прыродную свабоду", стварае іншы кшталт свабоды. Кант, які ў прынцыпе адхіляў сацыяльны натуралізм, узапраўды далучыўся да канцэпцыі эканамістаў. У сваю чаргу Фіхтэ паспрабаваў абысці цэнтральную дылему філасофіі грамадства. Прапанаванае ім развязанне істотна не адрозніваецца ад падыходаў Русо, аднак абапіраецца на больш дакладныя і глыбокія даследванні, чым тыя, якія здзейсніў Русо.

Кожны чалавек, казаў Фіхтэ, хоча быць свабодным, але сутыкаецца з іншымі людзьмі, якія таксама хочуць быць свабоднымі. Значыць, індывіды павінны пагадзіцца на ўзаемнае абмежаванне іхнай свабоды. Але, паводле Фіхтэ, яны праз гэта не губляюць свабоды, бо агульнапрызнана, што калі адзін з іх не прытрымліваецца пакта, які абмяжоўвае свабоды, дык усе астатнія адразу ж вызваляюцца ад усялякага абавязку ў дачыненні да яго. Карацей, кожны патэнцыйна захоўвае поўную свабоду.

Згодна з філосафам, забеспячэнне свабоды не адмаўляе закону, а, наадварот, вымагае яго. Пры адсутнасці абавязкаў, замацаваных законам, немагчыма, пісаў ён, разлічваць на нейкую гарантыю таго, што індывіды будуць узаемна паважаць свабоду іншага. Безумоўна, індывід — рацыянальная істота, яна можа зразумець неабходнасць таго, каб усе дзейнічалі рацыянальным чынам, гэта значыць паважалі свабоду другога. Але ў канцэпцыі Фіхтэ чалавек, рацыянальная істота, вольны паводзіць сябе ірацыянальным чынам.

"Але кожны, — даводзіў філосаф, — можа менавіта з той нагоды, што ён свабодны, гэта значыць таму, што ён можа ажыццяўляць сваю дзейнасць паўсюль, абмежаваць выкарыстанне сваёй сілы і надаць ёй сілу закону... Дзейснасць закону, зрэшты, залежыць ад таго, паслядоўны індывід ці не. Факт паслядоўнасці залежыць ад свабоды волі і няма падставаў лічыць, што нехта павінен быць паслядоўным, калі яго *не вымушаюць* быць такім..."[1]

Менавіта таму закон неабходны. Сцвердзіўшы гэтыя ас-

[1] *Ibid., p. 86; trad. française, p. 101.*

ноўныя прынцыпы, Фіхтэ намагаўся ўдакладніць змест рацыянальнага заканадаўства.

Г) Права на жыццё

На самым пачатку свайго аналізу Фіхтэ падкрэсліваў існаванне "першапачатковых правоў" індывіда — права на свабоднае распараджэнне сваім целам і права на валоданне пэўнымі рэчамі, бо дзейнасць індывіда ажыццяўляецца з дапамогай пэўных рэчаў і праз уздзеянне на пэўныя рэчы. Валоданне гэтымі рэчамі — адзіная ўмова свабоднай дзейнасці.

Да гэтага моманту мы не заўважалі нічога арыгінальнага. Але навіна тэорыі Фіхтэ ў тым, што ён, без сумневу, быў першы, хто сістэматычна падпарадкоўваў "першапачатковыя правы", у прыватнасці права ўласнасці, таму, што ён называў "найвышэйшым сінтэзам, які лучыць усе супярэчнасці"[1], "самай узнёслай і найбольш агульнай мэтай любой свабоднай дзейнасці"[2] і што ёсць *правам на жыццё*.

Але для жыцця, тлумачыў ён, неабходная ежа, а каб мець ежу, трэба працаваць. Такім чынам, фундаментальным прынцыпам усялякай рацыянальнай формы кіравання ёсць наступнае: кожны індывід павінен мець магчымасці жыць з вынікаў сваёй працы"[3].

Безумоўна, ідэі такога кшталту ўжо на працягу доўгага часу выказваліся ў літаратурных творах і рэлігійных тэкстах. Але ў Фіхтэ "права жыць са сваёй працы" інтэграванае ў філасофскую сістэму, накіраваную на тое, каб даць рацыянальнае тлумачэнне свету, тлумачэнне, якое павінна прывесці да практычных высноваў. Гаворка больш не ідзе пра тое, каб журыцца аб сённяшніх нягодах і меркаваць, што адплатаю за іх будзе шчасце на тым свеце. Гаворка пра тое, каб ажыццявіць усё, што падказвае розум.

Фіхтэ быў першым філосафам, які паставіў сабе на мэце з дакладнасцю паказаць, якім чынам павінна быць арганізаванае грамадства, каб усе, хто працуе, маглі нармальна жыць.

---

[1] *Ibid., p. 212; trad. française, p. 223.*
[2] *Ibid.*
[3] *Ibid.*

Перш за ўсё вельмі важна адзначыць, што ён прадугледжваў спецыяльны статус для ўласнасці на тое, што тым часам было асноўнымі сродкамі вытворчасці: зямлю і радовішчы карысных выкапняў. Хоць ён акрэслена і не казаў пра наяўнасць адрознення паміж сродкамі вытворчасці і таварамі спажывання, якое ў нашы дні стала асноватворным, з яго даследванняў такое адрозненне вынікае.

Ён сцвярджаў, што "субстанцыя" зямлі не можа быць аб'ектам прыватнай уласнасці, бо трэба заўсёды мець магчымасць надзяляць кожнага земляроба такой колькасцю зямлі, якая яму неабходна, каб жыць[1]. У іншым месцы пісаў: "зямельныя рэсурсы" ніколі не могуць быць прысвоеныя індывідамі[2].

Фіхтэ канкрэтна ўздымаў праблему эфектыўнай арганізацыі вытворчасці і абмену тавараў у грамадстве, якое вызначаецца пашыраным роўнем падзелу працы[3]. І ў гэтым ён ідзе далей, чым ягоныя папярэднікі, прыхільнікі ідэі рэфармавання грамадства. Яны (Мор або Марэлі) задавальняліся прапановамі скасаваць усякую ўласнасць, сцвярджалі, што ўся прадукцыя павінна канцэнтравацца ў грамадскіх сховішчах, а потым пераразмяркоўвацца. Але, здаецца, не бачылі ўсёй складанасці задачы. Іншыя ж, як Русо, пазбягалі гэтага пытання, падтрымлівалі інстытуцыю прыватнай уласнасці на зямлю і меркавалі, што кожная сям'я земляробаў здолее вырабіць і вырасціць столькі, колькі ёй неабходна для жыцця. Фіхтэ, наадварот, прызнаваў, што сацыялістычная арганізацыя грамадства стварае шматлікія праблемы. Безумоўна, ён разумеў, што складанасць праблемаў павялічваецца разам з развіццём падзелу працы і дыверсіфікацыі патрэбаў. Дзеля развязання гэтых праблемаў ён прапаноўваў, каб дзяржава давала людзям пэўныя заданні[4] і ажыццяўляла ўсеагульны кантроль за ўсімі формамі абмену

---

[1] *Ibid., pp. 217–218; trad. française, p. 228.*

[2] *Ibid., pp. 221–222; trad. française, p. 232.*

[3] *Ibid., pp. 231–237; trad. française, p. 242–247.*

[4] *"Такім чынам, пэўная колькасць асобаў павінна мець выключнае права на вытворчасць пэўным чынам пэўных рэчаў у прамысловасці..." (ibid., p. 232; trad. française, p. 245).*

паміж індывідамі[1]. Гэтым Фіхтэ закладваў падмурак тэорыі планавання.

Такія ж самыя ідэі аўтар высунуў у творы *"Замкнёная гандлёвая дзяржава"* (выдадзены ў 1800 г.). Зараз мы разгледзім, пра што гаворыцца ў гэтым творы.

Д) Замкнёная гандлёвая дзяржава: крытыка меркантылізму і лібералізму

Аўтар падае свой твор як першую спробу пабудовы палітычнай навукі не толькі на аснове досведу, але і на аснове аналізу канцэптуальных паняццяў[2]. Казаў, што хоча вывесці *універсальную* тэорыю рацыянальнага грамадства, а не даваць асобныя парады ў дачыненні да той ці іншай дзяржавы. Такім чынам вызначаны характар твора не перашкаджае філосафу заставацца пад моцным уплывам тагачасных падзеяў і, без усялякага сумневу, меркаваць, што яго тэзісы маюць практычнае значэнне.

Апошнія гады XVIII ст. былі адзначаныя як у Ангельшчыне, так і ў Францыі моцнымі спрэчкамі паміж абаронцамі былых эканамічных рэгламентацыяў і прыхільнікамі лібералізму. Двойчы, у 1786 і ў 1794 гг., у Францыі мелі месца спробы ўвесці свабодны гандаль збожжам паміж краінай і замежжам. Але кожны раз яны правальваліся[3]. У *"Замкнёнай гандлёвай дзяржаве"* аўтар рашуча выступаў адначасова супраць меркантылістаў, прыхільнікаў былых рэгламентацыяў, і супраць лібералаў.

Каб зразумець крытыку, скіраваную супраць меркантылізму, трэба нагадаць, што Фіхтэ належаў да нацыі, якая ў тую пару адставала ў развіцці ад суседзяў: Вялікабрытаніі, Францыі і Нідэрляндаў. Фіхтэ пераймаў, вельмі часта памылкова, пэўныя погляды меркантылістаў. У прыватнасці атаясамліваў узбагачэнне краіны з увозам грошай у гэтую

[1] *"Усе менавыя дамовы, заключаныя або непасрэдна з сельскагаспадарчымі і прамысловымі вытворцамі, або праз пасярэдніцтва купцоў, гарантаваныя з боку ўрада, і ўрад павінен быць ўпэўнены, што яны выконваюцца..." (ibid., p. 235; trad. française, p. 245).*

[2] *Гл. L'Etat commercial fermé, trad. franç., Paris, 1940, p. 28. У новым перакладзе твор апублікаваны ў Лазане ў 1980 г.*

[3] *Гл. на гэты конт: Xavier Léon, Fichte et son temps, t. II: Fichte à Berlin, Paris, 1923; nouv. éd., Paris, 1958, pp. 64—76.*

краіну. Але, паколькі ён належаў да беднай на той час нацыі, Фіхтэ робіць з меркантылісцкіх тэзісаў высновы, якія вельмі розніліся ад высноваў ангельскіх і французскіх аўтараў. Напрыклад, ён даў апісанне паступовага збяднення нямецкай нацыі як непасрэднае наступства ўзбагачэння іншых нацыяў.

"Усё памяншаецца колькасць людзей, паміж якімі падзяляецца нязначнае нацыянальнае багацце; краіна няспынна губляе сваё насельніцтва; ...людзі выязджаюць і пад іншым небам шукаюць паратунку ад галечы, якой не здолелі ўнікнуць на радзіме; або ўрад ператварае іх у тавар і атрымлівае за іх грошы з-за мяжы... Кошт на зямельную ўласнасць паніжаецца і яна застаецца неапрацаванаю ў апусцелай краіне. Пэўны час яе набываюць іншаземцы са спекулятыўнай мэтаю, знаходзячы гэткім чынам новую галіну ў гандлі. А потым узнікае яшчэ адзін тавар, які бадай, не трэба было чапаць: дзяржава прадае саму сябе, сваю самастойнасць. Яна бясконца атрымлівае субсідыі і ператвараецца ў правінцыю іншай дзяржавы, у сродак ажыццяўлення мэтаў апошняй. У такой прагрэсіі яна няспынна рухаецца далей і далей. На змену кожнай нягодзе прыходзіць іншая, яшчэ большая нягода"[1].

Не ўсе элементы гэтага апісання аднолькава слушныя. З другога боку, можна з пэўнасцю сказаць, што не спраўдзіліся прадказанні Фіхтэ наконт нямецкай нацыі. Аднак відавочна, што ў гэтых разважаннях аўтар прадбачыў асобныя даследванні "слабаразвітасці", якія прапаноўваюцца сёння.

Больш таго, варожасць аўтара да меркантылізму вынікае не толькі з трывогі за лёс нямецкай нацыі, якую ён адчувае. Яго пратэст таксама накіроўваецца супраць самой сістэмы, якая, на яго думку, забяспечвае эксплуатацыю астатняга свету Эўропай.

Папярэдне прааналізаваўшы матывы, якія могуць выклікаць ва ўрадаў непрыняцце ягоных прапановаў, Фіхтэ пісаў:

"Акрэслена або неакрэслена ўсвядомленым чыннікам такога непрымання з'яўляецца наступнае: Эўропа мае ў гандлі вялікую перавагу перад іншымі часткамі свету. Яна прысвойвае сабе іхныя рэсурсы і тавары, не вяртаючы ім за гэта дастатковага эквіваленту сваіх рэсурсаў і тавараў. І кожная асобная эўрапейская дзяржава, якім бы неспрыяльным для яе ні быў яе гандлёвы баланс стасоўна ўсіх астатніх эўрапейскіх дзяржаваў, атрымлівае тым не менш для сябе пэўную выгаду ад такога

[1] *L'Etat commercial fermé, op. cit., pp. 137–138.*

сумеснага рабавання ўсяго астатняга свету... Каб знішчыць гэты чыннік нежадання, трэба было б даказаць, што дачыненні, падобныя тым, якія існуюць паміж Эўропай і ўсім астатнім светам і грунтуюцца не на праве і справядлівасці, не могуць доўжыцца бясконца. Але нават калі б я зараз даказаў гэта, мне б запярэчылі: "Прынамсі дагэтуль доўжацца гэтыя дачыненні: па-ранейшаму калоніі падпарадкаваныя метраполіям, працягваецца гандаль рабамі. Мы не дажывем да таго часу, калі ўсё гэта спыніцца. Дык дай нам магчымасць атрымліваць выгаду ад такіх дачыненняў, пакуль яны трымаюцца. Хай пакаленні, пры жыцці якіх сістэма рухне, шукаюць шляхі развязання..." Прызнаюся, у мяне на гэты конт няма адказу"[1].

Аргументацыя філосафа не можа не ўразіць. Але ён выказаў не меншую варожасць у дачыненні да эканамічнага лібералізму, які яму здаецца абсалютна недапушчальнай аналогіяй сапраўднай вайны паміж індывідамі, "вайны пакупнікоў і гандляроў". Ён пісаў:

"Вайна робіцца ўсё больш гвалтоўнай, несправядлівай і небяспечнай па сваіх выніках, чым больш насяляецца свет, чым больш павялічваецца гандлёвая дзяржава дзякуючы новым набыткам, чым больш развіваюцца вытворчасць і мастацтвы і дзякуючы ім колькасць тавараў, якія паступаюць у абарачэнне. Гэта ў сваю чаргу павялічвае патрэбы людзей і робіць іх разнастайнымі. Пры простым ладзе жыцця нацыяў нягоды не ўспрымаліся як вялікая несправядлівасць і прыгнёт, але як толькі павялічваюцца патрэбы, нягоды ператвараюцца ў дзікую несправядлівасць і ў крыніцу велізарнай галечы. Пакупнік імкнецца выцягнуць з гандляра тавар і таму патрабуе свабоды рынку, гэта значыць свабоды для гандляра насычаць рынак таварамі, не знаходзіць збыту і вымушана прадаваць свой тавар ніжэй за ягоную вартасць. Вось чаму пакупнік патрабуе шырокай канкурэнцыі фабрыкантаў і купцоў, каб, карыстаючыся цяжкасцямі ў збыце і патрэбаю ў наяўных грашах, прымусіць іх саступіць тавар за тую цану, якую пакупнік шчодра ім прапануе. Калі яму гэта ўдасца, дык працаўнік бяднее, а працавітыя сем'і гінуць ад нягодаў і галечы або пакідаюць зямлю такога несправядлівага народа... Карацей, чалавек не мае ніякай гарантыі захавання свайго становішча, нават калі працуе як вол, бо людзі хочуць быць цалкам свабоднымі ў справе ўзаемнага знішчэння[2]".

Пасля таго як ён адкінуў абедзве панавальныя эканамічныя дактрыны, філосафу застаецца прапанаваць сваё, трэцяе развязанне. А гэта — сацыялістычная дзяржава, якой ён даў найменне "Замкнёнай гандлёвай дзяржавы".

[1] *Ibid., pp. 30–31.*
[2] *Ibid., pp. 127–129.*

Назоў паходзіць з таго, што для аўтара перадумовай усталявання рацыянальнага эканамічнага ладу ёсць скасаванне ўсялякага гандлю з замежжам. Сапраўды, пісаў ён, дзеля таго каб дзяржава магла цалкам кантраляваць нутраную вытворчасць і нутраны гандаль, не варта пакідаць прыватным асобам магчымасці прадаваць або набываць за мяжой.

"Дзяржава, — разважаў Фіхтэ, — абавязаная законам і прымусам забяспечыць усім сваім грамадзянам такое становішча, якое вынікае з падобнай раўнавагі ў гандлі, але яна не зможа гэтага зрабіць, калі на такую раўнавагу ўплывае пэўная асоба, якая не падпарадкоўваецца яе законам і ўладзе. Таму яна мусіць канчаткова пазбавіць магчымасці чыніць усялякі ўплыў такога кшталту. А ўсялякія стасункі грамадзян з замежжам павінны быць забароненыя і немагчымыя"[1].

З іншага боку, аўтар удакладняў, што "нават калі дзяржава мае патрэбу ў гандлёвых сувязях з замежжам, дык у кожным разе ажыццяўляць гэта мусіць урад"[2]. Між іншым, крыху далей Фіхтэ заяўляў, што "дзяржава кантралюе замежны гандаль з мэтай перыядычна скарачаць гэты гандаль, а пасля пэўнага прамежку часу цалкам яго спыніць"[3].

На гэты раз гаворка ідзе пра поўную замкнёнасць дзяржавы, аб мэтанакіраваным звядзенні яе да эканамічнай аўтаркіі. Фіхтэ лічыў, што нават дачыненні з замежжам, якія дзяржава кантралюе, маглі б прывесці новастворанае грамадства да залежнасці ад падзеяў, якія яно само не здолела б утаймаваць, бо гэтыя падзеі былі б па-за межамі яго ўздзеяння. А гэткага стану рэчаў трэба пазбягаць.

Е) Эканамічнае планаванне

Паводле Фіхтэ, для дзяржавы неабходна існаванне трох класаў: земляробаў, майстроў-рамеснікаў і купцоў. Кожны з гэтых класаў падзяляецца на падкласы ў залежнасці ад прыроды вытворчасці або гандлю. Усе грамадзяне (з выняткам дзяржаўных чыноўнікаў) павінны належаць да аднаго з падкласаў, а гэта будзе надаваць ім выключнае права ажыццяўляць пэўную эканамічную дзейнасць.

---

[1] *Ibid., p. 68.*
[2] *Ibid., p. 70.*
[3] *Ibid., p. 193.*

Філосаф зноў развіваў тэорыю ўласнасці, аднак дапускаў, што ў прамысловасці зусім не абавязковая прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці. На яго думку, трэба гарантаваць індывідам права ўласнасці не на рэчы, а на формы дзейнасці.

"Наша тэорыя, — пісаў ён, — бачыць першую і першапачатковую ўласнасць, якая ёсць падмуркам усялякай іншай, у выключным праве на пэўную свабодную дзейнасць"[1].

"Выключнае права ўласнасці на пэўны род заняткаў можа захоўвацца без усялякае ўласнасці на рэчы. Гаворка ідзе пра выключнае права займацца пэўнай дзейнасцю ў прамысловасці або рамястве, прычым не можа мець аніякага значэння выпадковая ўласнасць на інструменты або аб'екты гэтай прамысловасці, якія, зрэшты, могуць і не быць уласнасцю працаўніка, а быць проста пазычанымі або пастаўленымі"[2].

Дарэчы, наконт валодання зямлёй аўтар паўтарае тэзіс, які ўжо абараняў у сваім папярэднім творы. Такім чынам, можна сказаць (хоць гэтым разам ён не ўзгадвае пра капальні), што Фіхтэ робіць яшчэ адзін крок да ідэі, адпаведна якой сацыялізм павінен грунтавацца на калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Цьмянымі разважаннямі ён, без сумневу, меў намер замацаваць перавагу права на працу над правам на ўласнасць (у сённяшнім значэнні гэтага тэрміна).

Замацаваўшы гэты прынцып, філосаф найперш прыкладае высілкі на апісанне асноўных накірункаў *планавання размеркавання працоўных сілаў*. Дзякуючы сістэме прафесійных выпрабаванняў і матэрыяльных заахвочванняў індывіды будуць на падставе грамадскіх патрэбаў зарыентаваныя ў бок усёй сукупнасці разнастайных заняткаў:

"Каб заўсёды была пад рукамі дастатковая колькасць гатовых тавараў, яна (дзяржава) павінна клапаціцца, каб прызначаная колькасць працоўных у кожнай са створаных галінаў прамысловасці... не толькі не менела, але й не павялічвалася. Неабходна ўвесь час падтрымліваць раўнавагу. Калі б існавала небяспека, што ў пэўнай спецыяльнасці можа забракаваць работнікаў, дык нельга заахвочваць грамадзян прысвячаць сябе гэтай спецыяльнасці, напрыклад, дазваляць падвысіць кошт іхных вырабаў і гэтым ставіць іх у прывілеяванае становішча ў параўнанні з усімі іншымі класамі. Не трэба ўжываць ніякага іншага заахвочвання

[1] *Ibid., p. 101.*
[2] *Ibid., p. 105.*

апрача прэміяў з дзяржаўнай скарбніцы, аж пакуль неабходная колькасць грамадзян... не прысвяціць сябе гэтай новай галіне працы"[1].

У гэтым урыўку гаворка вялася аб прамысловай працы, але такое ж выйсце прапаноўваецца ў дачыненні да земляробаў і гандляроў. Дзеля вызначэння колькасці апошніх аўтар пісаў, што, каб зрабіць гэта,

"...урад павінен улічваць абмен, які адбываецца ўнутры нацыі, а таксама тую колькасць рук, якой ён дасць занятак як увогуле, так і ў асобных галінах..."[2]

Без гэтага можна было з агаворкамі сцвярджаць, што прапановы Фіхтэ галоўным чынам накіраваныя на тое, каб абагульніць карпаратыўную сістэму старога рэжыму. І сапраўды, філосаф, здаецца, не прадбачыў, што ў будучыні на змену рамеснай вытворчасці прыйдзе буйная прамысловасць. І не меней дзіўна заўважаць, як аўтар логікай сваіх развагаў падыходзіць да ідэі пра эканамічнае планаванне.

Пасля таго як здзейсненае размеркаванне працоўных сілаў, трэба, лічыў ён, прымусіць усіх вытворцаў і купцоў заключыць паміж сабой *кантракты*, якія вымушалі б іх рэгулярна ажыццяўляць іхную дзейнасць на вызначаных умовах:

"Вытворцы (сельскагаспадарчыя) абавязваюцца атрымліваць такую колькасць прадуктаў, якую маглі б спажываць не толькі яны самі, але каб хапала іх знаёмым рамеснікам, якія таксама складаюць частку насельніцтва. Больш таго, рамеснікі павінны мець сыравіну для апрацоўкі. Вытворцы абавязваюцца абменьваць свае тавары наўзамен вырабаў рамеснікаў, ды такім чынам, каб пад час працэсу вытворчасці апошнія маглі жыць з таго нагэтулькі ж прыемна, як і земляробы ад збору ўраджаю.

У сваю чаргу рамеснікі абавязваюцца пастаўляць вытворцам столькі тавараў, колькі апошнія прызвычаіліся мець па пэўных коштах, і такой якасці, якая толькі магчыма ў дадзенай форме дзейнасці гэтай дзяржавы...

Абодва (папярэднія) класы абяцаюць пастаўляць купцу залішнія для іх уласных патрэбаў прадукты і вырабы, атрымліваць ад апошняга тое, у чым яны маюць патрэбу...

Са свайго боку купец абяцае, што яны змогуць атрымліваць ад яго адпаведна вызначанаму правілу ў любы момант усе тыя рэчы, у якіх гэтыя людзі звычайна маюць патрэбу; ён таксама абавязваецца ў любы момант прымаць кожную звычайную рэч абмену па пэўнай базавай цане"[3].

---

[1] *Ibid., p. 54.*

[2] *Ibid., p. 56.*

[3] *Ibid., pp. 45–47.*

Аднак філосаф добра ўсведамляў, што нават калі замацуецца прынцып кантрактаў, сістэма зможа функцыянаваць толькі тады, калі кожны вытворца або купец на практыцы ў стане выконваць свой кантракт, гэта значыць калі ён рэальна валодае таварамі, якія абавязваецца пастаўляць, з аднаго боку, з другога — калі ён здолее выкарыстоўваць або перапрадаваць тавары, якія абавязаўся прымаць. Але дзеля такога стану рэчаў патрэбна, каб мелася сістэма нутраной каардынацыі кантрактаў, гэта значыць каб існаваў *план вытворчасці і размеркавання прадуктаў*. Сам Фіхтэ рэдка ўжываў слова "план"[1], але адпаведная ідэя, бясспрэчна, у ягоным вучэнні прысутнічае.

"Лёгка, — пісаў ён, — знайсці сродак, з дапамогай якога дзяржава магла б сачыць за выкананнем абавязкаў, пра якія толькі што ішла гаворка. Павінна быць усталявана пазітыўнае права, за невыкананне якога пагражала б кара: купец, які атрымаў дазвол на гандаль пэўнымі таварамі, павінен набываць іх у кожнага, хто іх яму прыносіць, і прадаваць іх кожнаму, хто іх у яго пытае. Грамадзянін, якому было ў нечым адмоўлена, падае скаргу, і купца караюць. Але, скажыце, як мог бы ён быць пакараны за тое, што не прадаў тавар, які ў яго запатрабавалі? Скарыстаю гэтую нагоду, каб паказаць, якім чынам урад можа назіраць за выкананнем абавязку, які маюць усе астатнія класы ў дачыненні да купца. Ніводзін купец не атрымае дазволу на дзейнасць, пакуль не паведаміць, адкуль ён мяркуе атрымліваць тавар. Купец можа прыкладна разлічыць, які запас выраблены прадуктаў маецца ў яго вытворцы або фабрыканта, і прадукцыйнасць працы апошніх у таварах за вызначаны прамежак часу, а таксама колькі яму з гэтых тавараў ужо было пастаўлена. Купец нават мае права запатрабаваць гэты запас, звяртаючыся да ўладаў, бо закон таксама прымушае гэтыя класы прадаваць...

Можна было б яшчэ спытаць, якім чынам будзе пакараны купец, які не ажыццяўляе аперацыяў абмену, калі яму выпадкова бракуе эквіваленту тавару[2]. Я адкажу наступнае: у заснаванай на гэтых прынцыпах дзяржаве не можа быць прапанаваны на продаж ні ў адзін гандлёвы дом такі тавар, на хуткі збыт якога гэты дом не мог бы з упэўненасцю разлічваць, бо дазволеныя вытворчасць і выраб, разлічаныя на базе магчымых патрэбаў, складаюць падмурак такой дзяржавы. Гандлёвы дом можа нават запатрабаваць, каб яго тавары былі купленыя. Як яму забяспечылі пэўных прадаўцоў, так яму вызначылі і пэўных пакупнікоў. Ён ведае патрэбы апошніх. Калі яны не набываюць у гэтым гандлёвым доме, то,

[1] *Гл., аднак, наступную фразу: "Лёгкасць кіравання дзяржавай, як і ўсялякай працы, залежыць ад таго, наколькі арганізавана бярэцца за справу, улічваючы ўсе фактары і адпаведна з вызначаным планам" (op. cit., p. 205).*

[2] *Гэта значыць грашовага эквіваленту.*

значыць, яны набываюць недзе ў іншым месцы, хутчэй за ўсё ў вытворцаў. Гэта супярэчыць абавязкам, прынятым як пакупнікамі, так і прадаўцамі; за гэта на іх трэба падаваць скаргу, і яны будуць пакараныя. У гэтай дзяржаве купец заўсёды... валодае... неабходным эквівалентам. У гэтай дзяржаве як прыход, так і разыходжанне тавараў можна дакладна падлічыць, бо ўсе яны праходзяць праз рукі купца"[1].

Апошні абзац працытаванага тэксту, відавочна, мае найбольшае значэнне, у ім відаць, як аўтар прыходзіць да ўсведамлення таго факта, што недастаткова надаць індывідам разнастайныя функцыі, але трэба яшчэ і колькасна вызначыць вынікі іхнае дзейнасці. Менавіта гэта мы сёння называем планаваннем у эканоміцы.

Але Фіхтэ ідзе яшчэ далей, лічыць, што трэба таксама папярэдне вызначыць сувязі, якія маюць усталявацца паміж *пайменна прызначанымі* вытворцамі і купцамі. Ён прапануе такі лад, які адпавядае плану па пастаўках прадпрыемствам, што існаваў у Савецкім Саюзе.

Калі да гэтага дадаць, што філосаф прадугледжваў — а гэта лагічна вынікае з яго разважанняў — *фіксаванне з боку дзяржавы ўсіх цэнаў*[2], дык можна заўважыць, што ён дае апісанне тыпу эканамічнага ладу, які ва ўсёй сваёй сукупнасці надзіва дакладна нагадвае савецкую сістэму планавання XX ст.

---

[1] *Ibid., pp. 58—60. Аўтар сам падкрэсліваў арыгінальнасць сваіх прапановаў у параўнанні з усімі папярэднімі праектамі арганізацыі вытворчасці і размеркавання ў грамадстве, якія абмяжоўваліся тым, што прадугледжвалі цыркуляцыю ўсёй прадукцыі праз грамадскія сховішчы. "Няварта пужацца, — пісаў ён, — тых велізарных складоў, неабходных пры такім стане гандлю: бо зусім не абавязкова, каб увесь тавар купца ляжаў у яго перад вачыма. Купцу дастаткова ведаць, дзе знаходзіцца ягоны тавар, і мець магчымасць атрымаць яго ў патрэбны момант.*
Напрыклад, пэўная колькасць збожжа, якую набыў гандляр у буйнога землеўладальніка, спакойна чакае на старым месцы, у свірнах апошняга. Калі ж да гандляра збожжам прыйдзе пекар, які жыве блізка ад гэтых свірнаў, купцу трэба будзе проста накіраваць пекара па патрэбную колькасць да тых самых свірнаў..."
Хоць тэрмін "купец" тут і захоўваецца, відавочна, што гэтая функцыя пасярэдніка, апісанне якой даў Фіхтэ, цалкам нагадвае ролю, якую мелі ў Савецкім Саюзе дзяржаўныя ўстановы, задачай якіх было наладжванне сувязяў паміж вытворцамі і спажыўцамі нейкага тавару.

[2] *Ibid., pp. 61—68. Тут Фіхтэ закрануў праблему вартасці, але не здолеў абгрунтаваць яе належным чынам.*

Ж) Праблема свабоды ў сацыялістычным грамадстве. Тэзіс аб адміранні дзяржавы

Нягледзячы на смеласць, з якой Фіхтэ пашырае эканамічныя функцыі дзяржавы, ён, здаецца, заклапочаны таксама захаваннем выразнай розніцы паміж задачамі ўрада, якія ўлучаюць эканамічнае планаванне, і дзейнасцю па вытворчасці і размеркаванні тавараў, што павінна быць даручана прыватным асобам[1].

А паколькі мае месца спалучэнне эканамічных і дзяржаўных функцыяў, дык аўтару ўяўлялася, што індывід пазбаўляецца толькі той часткі сваёй свабоды, якая неабходна, каб забяспечыць жыццё і свабоду ўсіх іншых, гэта значыць на практыцы ён не пазбаўляецца свабоды.

Філосаф ніколі не забываў, што чалавек — гэта свабодная істота і трэба захоўваць ягоную свабоду. Аднак ці застаюцца Фіхтавы земляробы, рамеснікі і купцы сапраўды індывідамі, якія ажыццяўляюць свабодную дзейнасць тады, калі дзяржава фіксуе цэны, колькасць тавараў, прызначаных на продаж, і нават вызначае стасункі, якія павінны ўсталявацца паміж пэўным пакупніком і гандляром? Ці не з'яўляецца чыста *фармальным* адрозненне паміж функцыямі вытворчасці і функцыямі кантролю, якое, на думку Фіхтэ, магчыма забяспечыць? І ці сапраўды захоўваецца свабода індывіда? Гэтыя пытанні трэба ставіць, тым больш што ў *"Асновах натуральнага права"* і ў шэрагу іншых, больш позніх твораў[2] філосаф не мае сумневу наконт больш шырокага ўмяшання дзяржавы ў жыццё індывідаў[3].

---

[1] *Безумоўна, з выняткам горназдабыўнай прамысловасці, бо ў "Асновах натуральнага права" прадугледжваецца, што ёю павінна займацца сама дзяржава.*

[2] *"Прававая дактрына" (1812); "Дактрына дзяржавы" (1813). Пра змест гэтых твораў гл. бліскучыя даследванні Georges Vlachos у кнізе "Dialectique de la liberté et dépérissement de la contrainte cherz Fichte", Archives de philosophie du droit, 1963, pp. 75—114.*

[3] *"Паліцэйскія законы", якія прадугледжваў Фіхтэ, выклікалі іранічную крытыку Гегеля. "Кожны грамадзянін, — пісаў апошні, — дасць занятак не толькі аднаму чыноўніку, як гэта мае месца ў прускай арміі, дзе за чужаком сочыць чалавек, які выклікае давер. Кожным грамадзянінам сама меней будзе займацца паўтузіна чыноўнікаў: нагляд, падлікі і г. д., а кожны з гэтых назіральнікаў будзе мець над сабой яшчэ сабе падобных і г. д., аж да бясконцасці, калі кожная з найпрасцейшых справаў будзе даваць месца безлічы справаў" (Différence des systèmes philosophiques de Fichte et de Schelling in Premières publications, trad. franç., Paris, 1952, p. 133, note). Сапраўды,*

Мы ўжо сустракаліся ў Русо з падобным парадоксам сістэмы, якая з мэтай прымірэння індывідуальных свабодаў рызыкавала іх увогуле скасаваць. Фіхтэ пагаджаўся з існаваннем такой рызыкі і імкнуўся ўнікнуць яе або праз сцвярджанне, што ўмяшанне дзяржавы павінна мець *абмежаваны* характар, або праз падкрэсліванне *часовага характару* такіх умяшанняў.

У *"Замкнёнай гандлёвай дзяржаве"* Фіхтэ не раз імкнуўся адзначыць, што эканамічнае планаванне не будзе цяжкай задачай для дзяржавы і адначасова яно не будзе празмерна абмяжоўваць свабоды індывідаў.

"Ураду апісанай дзяржавы, — пісаў ён, — рэдка прыходзіцца караць, рэдка чыніць агідныя вобыскі. Галоўная крыніца злачынстваў адных прыватных асобаў у дачыненні да іншых — ціск сапраўднай галечы або боязь, што яна напаткае іх у будучыні, — знішчана; значная колькасць правапарушэнняў сталася цалкам немагчымай дзякуючы суровасці ўсталяванага парадку. Злачынствы супраць дзяржавы — бунты і паўстанні — таксама выклікаюць нешматлікія перасцярогі. Падданыя задаволеныя і лічаць урад дабрадзеем"[1].

"Урад, — дадаваў Фіхтэ, — не можа... непасрэдна назіраць за непасрэдным вытворцам, селянінам або работнікам. За імі наглядае купец, якому гэта дазволена законам, а праз купца і ўрад. За купцом наглядаць ураду няма ніякай патрэбы, нават калі б была такая магчымасць. Толькі адбудзецца затрымка ў гандлі, дык грамадзянін, які пацярпеў ад гэтага, адразу ж паведаміць ураду. Пакуль ніхто не скардзіцца, можна лічыць, што ўсё ідзе належным чынам"[2].

Радкі сведчаць пра тое, што аўтар твора "Замкнёная гандлёвая дзяржава" марыў аб узаемным кантролі вытворцаў і гандляроў, а гэта, на яго думку, павінна ў значнай ступені паменшыць ролю дзяржавы.

Пераход да сацыялізму, лічыў аўтар, дазволіць *скараціць* колькасць чыноўнікаў і панізіць суму падаткаў, нягле-

---

асобныя праваахоўныя прапановы Фіхтэ здаюцца занадта перабольшанымі. Напрыклад, абавязак выходзіць ноччу на вуліцу толькі з ліхтаром, каб паліцыя магла "без цяжкасцяў распазнаць кожнага грамадзяніна" (Grundlage des Naturrechts, op. cit., p. 295, trad. franз., p. 304). Тым не менш трэба прызнаць, што бальшыня захадаў, якія прапаноўваў аўтар, увайшлі ў норавы нашага жыцця: у прыватнасці абавязак мець пашпарт і абавязак паведамляць у праваахоўныя органы аб змене месца жыхарства.

[1] *L'Etat commercial fermé, p. 207.*

[2] *Ibid., p. 59.*

дзячы на "мноства справаў, падлікаў і назіранняў", неабходных дзеля "падтрымання раўнавагі ў грамадскім гандлі"[1].

Гэта досыць аптымістычны падыход. У *"Прававой дактрыне"*, напісанай у 1812 г., Фіхтэ прапанаваў больш слушную ідэю. Згодна з гэтай ідэяй, рэгламентацыя эканамічнай дзейнасці, найлепшы чыннік забеспячэння дабрабыту індывідаў, павінна скараціць працоўны час і даць больш вольнага, што, безумоўна, паспрыяе росквіту іхнае свабоды[2].

Выснова Фіхтэ — яшчэ адзін аргумент, адказ на папрокі ў жаданні задушыць свабоду.

Сапраўды, ён заўсёды сцвярджаў, што строгі кантроль за індывідуальнай дзейнасцю мусіць мець толькі *часовы характар* і што гэты кантроль наяве прызначаны дзеля таго, каб падрыхтаваць будучую эпоху, у якой усялякі грамадскі прымус павінен знікнуць.

Перад намі тэзіс аб "адміранні дзяржавы", які стаў вядомым дзякуючы Марксу і Леніну і ўваходзіў у дактрыну савецкага рэжыму. Тэзіс яшчэ раней цягам вельмі доўгага часу прысутнічаў у разнастайных творах рэлігійнага або мастацкага характару. Мы сустракаліся з ім у Годўіна. Аднак менавіта ў Фіхтэ гэты тэзіс упершыню ўвасобіўся ў рацыянальны аналіз грамадскіх пераўтварэнняў.

У творы 1793 г. аб Французскай рэвалюцыі філосаф, пераймаючы выказванне Лесінга, параўнаў дзяржаву са "свечкай, што згарае"[3]. А ў 1794 г. у творы *"Прызначэнне навукоўца"* напісаў:

"Дзяржава, як і ўсе чалавечыя інстытуцыі, з'яўляючыся проста сродкам, рухаецца да самазнішчэння; мэта любога ўрада — зрабіць урад залішнім"[4].

Магчыма, на той час Фіхтэ яшчэ не выпрацаваў свайго вучэння аб сістэматычнай арганізацыі эканомікі. Але калі ў 1796 г. ён прапанаваў такое вучэнне, то захаваў свой ранейшы погляд наконт адмірання дзяржавы.

"Чым лепш уладкаваная дзяржава, — пісаў тады Фіхтэ, — тым менш

---

[1] *Ibid., p. 205.*

[2] *Гл. на гэты конт Xavier Léon, La philosophie de Fichte, op. cit., pp. 251–252.*

[3] *Cité par Georges Vlachos, op. cit., p. 78.*

[4] *Ibid.*

яна заўважная, бо ўжо з самага пачатку існавання з прычыны яе мірнай сілы і нутраной вагі выключаецца ўсялякая магчымасць яе дзеяння як вонкавай сілы. Дзеючы, дзяржава сама знікае"[1].

Нарэшце, у самым вядомым творы філосафа, *"Прамовах да нямецкай нацыі"*, зноў паўстае той самы тэзіс аб адміранні дзяржавы. Падкрэсліўшы, што дзеля забеспячэння выратавання бацькаўшчыны немцам неабходная моцная дысцыпліна, Фіхтэ сцвярджаў, што такая дысцыпліна патрабуецца толькі на часовы перыяд з мэтаю падрыхтоўкі панавання свабоды:

"Дазволім знікнуць свабодзе з бачнага свету на пэўны час, адвядзем ёй самы глыбокі куточак у нашых думках, аж пакуль не паўстане новы свет"[2].

Тэзіс аб адміранні дзяржавы мае зусім не другаснае значэнне ў сістэме, пабудаванай Фіхтэ. Гэта зусім не ідэя, выкліканая непаслядоўнасцю аўтара. Наадварот, яна ёсць адным з цэнтральных момантаў ягонага вучэння, бо Фіхтэ спалучаў яе нават з азначэннем, якое ён даваў праву, і з месцам, якое адводзіў праву ў дачыненні да маралі.

Мы бачылі, што, згодна з філосафам, праблема права паўстае таму, што духоўная рэчаіснасць, якой ёсць свет, "Я", падзеленая на мноства індывідуальных суб'ектаў. А права забяспечвае толькі *вонкавае* прымірэнне індывідуальных свабодаў. Падзеленая духоўная рэчаіснасць патрабуе таго, каб быць па-сапраўднаму задзіночанай з дапамогай таемнага звязу індывідуальных сведамасцяў. Менавіта гэта і адбываецца пры маральным учынку, калі індывід больш не дзейнічае сам па сабе, але добраахвотна і свабодна прысвячае сябе агульнаму інтарэсу, праз гэта робячы ўнёсак у забеспячэнне задзіночання сведамасцяў — вышэйшай мэце, якая павінна быць дасягнутая ў свеце.

Але як толькі індывід пачынае дзейнічаць маральна, права становіцца непатрэбным.

"Для расы дасканалых маральных істотаў, — пісаў Фіхтэ, — не існуе закону"[3].

---

[1] *Ibid., p. 90, n. 3.*

[2] *Ibid., p. 103.*

[3] *Grundlage des naturrechts, p. 148; trad. franç., pp. 162–163.*

Менавіта таму, што чалавек яшчэ не дасягнуў стану маральнай дасканаласці, існуе дзяржава, сродак, які дазваляе наблізіцца да высокай маральнасці. Гэта інструмент, які рыхтуе сваё ўласнае знікненне.

Перад намі вытокі ідэі, якую мы знойдзем у XX ст. у афіцыйнай ідэалогіі СССР, адпаведна якой дзяржаўны кантроль над эканамічнаю дзейнасцю стварае глебу для надыходу дасканалай свабоды, што адбудзецца дзякуючы адміранню дзяржавы. Нельга не прызнаць, не бачыць таго, што сацыяльнае вучэнне Фіхтэ ў значнай ступені мае утапічны характар[1].

Менавіта праз звяртанне да ідэі аб маральным прагрэсе Фіхтэ меркаваў адначасова запазбегчы памылкі Канта (а гэта пакора перад парадкам, што існуе) і пазіцыі Русо, адпаведна якой стварэнне рацыянальнай дзяржавы радыкальным і канчатковым чынам скасоўвае першапачатковыя свабоды чалавека.

3) Праблема пераходу да сацыялізму

Сацыяльная філасофія Фіхтэ непазбежна сутыкалася з праблемай, якая ўжо для Плятона ўяўляла галоўную цяжкасць. Як і яго знакаміты папярэднік, аўтар *"Навукавучэння"* дэкляраваў, што з мэтаю забеспячэння маральнага прагрэсу індывідаў трэба стварыць справядлівую дзяржаву. Але як

[1] *Утапізм Фіхтэ выказваецца асабліва яскрава ў вульгарызатарскім творы, які выйшаў у свет у 1800 г. пад назовам "Аб прызначэнні чалавека". "Чалавек, — пісаў аўтар, — дасягне самых таямніцаў Прыроды, каб узняцца над ёю і зрабіцца яе абсалютным гаспадаром... Яму, гаспадару, будзе дазволена ўладарыць над новай заваёвай, цараваць над ёю як абсалютнаму манарху, выдаткоўваючы на гэта менш сілы, чым трэба яму сёння дзеля падтрымання і захавання свайго фізічнага стану" (ouvr. cit., trad. franç., Paris, 1942, pp. 277—278). "Зло знікне з чалавечых супольнасцяў, — казаў ён, — у той жа час, калі адбудзецца іх вызваленне... Як толькі будзе пабудавана грамадства, заснаванае на розуме..., станецца так, што благі ўчынак будзе прыносіць чалавеку шкоду, а не выгады" (ibid., pp. 293—294). Філосаф, здаецца, настолькі перакананы ў неабходнасці дасягнення гэтай мэты, што выкарыстоўвае сваю ўпэўненасць у якасці аргумента на карысць існавання нябеснага прызначэння чалавека. "На зямлі ў нас існуе мэта, якую мы дасягнем... Дапусцім, што мы дасягнулі стварэння дасканалага грамадства, што ж тады застанецца рабіць чалавецтву на зямлі?" (Ibid., p. 298). Вера ў прагрэс прыводзіць аўтара да смяротных для свабоды высноваў. "Больш нельга, — пісаў ён, — выкарыстоўваць свабоду для чынення зла. Трэба, каб чалавек вырашыў: або цалкам адмовіцца ад сваёй свабоды і стаць пасіўнай спружынай усяго цэласнага механізму, або плённа скарыстоўваць з гэтае свабоды ў добрых мэтах" (Ibid., p. 170).*

маральна недасканалыя людзі, жывучы ў несправядлівых дзяржавах, маглі б стварыць справядлівую дзяржаву?

З самага пачатку сваёй кар'еры і нават у эпоху, калі ён горача вітаў дасягненні Французскай рэвалюцыі, Фіхтэ заўсёды заставаўся шчырым прыхільнікам таго, што ён называў "рэформай зверху", а не рэвалюцыі, якая зыходзіць знізу, з масы індывідаў. У гэтым яго вучэнне самым катэгарычным чынам супрацьстаіць, напрыклад, поглядам Бабёфа, які хацеў ператварыць грамадства праз сілай захопленую ўладу. Для нас гэта нагода заўважыць, што спалучэнне сацыялістычнай філасофіі з сацыялістычнай практыкай было яшчэ далёкае ад свайго ажыццяўлення. На працягу ўсёй першай паловы XIX ст. такі разрыў паміж мыслярамі і практыкамі будзе ў значнай ступені захоўвацца.

Аднак Фіхтэ зусім не ігнараваў таго, што ў працэсе пераўтварэння грамадства сіла, верагодна, можа адыгрываць нейкую ролю. У працы *"Аб прызначэнні чалавека"* ён паказваў, як вышэйшыя класы рыхтуюць глебу для паўстання ніжэйшых класаў:

"Паяднаныя сваёй ненажэрнай прагнасцю, яны будуць пашыраць з пакалення ў пакаленне свае незаконныя захопы і ніколі не скажуць: досыць! І так ажно пакуль урэшце прыгнёт не дасягне свайго апагею і стане абсалютна невыносны і калі роспач надасць прыгнечаным сілу, мужнасць, якіх раней бракавала, бо іх вынішчалі цягам стагоддзяў"[1].

Але гэта не азначала, што філосаф прапаноўваў далучыцца да такога паўстання або садзейнічаць яму. У тым жа творы ён сцвярджаў:

"Вельмі часта самыя ганебныя памкненні, заганы людзей і ліхія ўчынкі цягнуць па сабе лепшае больш пэўна, чым высілкі сумленнага чалавека"[2].

З гэтага аўтар вылучаў яшчэ адзін аргумент на карысць незямнога свету. Бо паколькі чалавек мусіць надаць свайму ўчынку мэту, слушнасць якой была б неаспрэчнай, і паколькі ён можа быць упэўнены, што яго добрыя ўчынкі дадуць на нашай зямлі добры плён, дык трэба, каб ён дзейнічаў з

[1] *Op. cit., p. 166.*
[2] *Ibid., p. 173.*

вераю, што ў кожным разе яго дабрадзейны ўчынак залічыцца на тым свеце[1].

Падыход Фіхтэ грунтаваўся на перакананні: нават калі паўстанне прыгнечаных непазбежнае, дасведчаны чалавек павінен асудзіць яго як амаральнае і спрыяць надыходу панавання справядлівасці негвалтоўным чынам.

Дарэчы, Фіхтэ яшчэ на раннім этапе стаў у цвёрдую апазіцыю да канцэпцыяў сацыяльнага эвалюцыянізму, якія адстойваў, у прыватнасці, Гэрдэр. Прагрэс чалавецтва, казаў Фіхтэ, не можа быць "натуральным" вынікам спантаннай эвалюцыі[2]. Гісторыя — гэта праява свабоды чалавека, намагання, якое ён зрабіў над самім сабой, каб ажыццявіць сваю мэту, гэта духоўная заваёва.

У творы *"Характэрныя рысы сённяшняга часу"*, напісаным у 1804 г., філосаф прапанаваў сваю інтэрпрэтацыю гісторыі чалавецтва. Гэтая інтэрпрэтацыя мае вялікае значэнне, бо яна ў значнай ступені натхніла іншых аўтараў.

Першапачаткова, пісаў Фіхтэ, чалавечы розум не ўсведамляў самога сябе. Безумоўна, чалавек разумная і свабодная істота, але некалі ён гэтага не ўсведамляў. Гэта перыяд "інстынктыўнага розуму"[3].

Пры такім становішчы ў кожным народзе асобныя індывіды, больш таленавітыя, чым астатнія, захопліваюць уладу, тады пэўныя народы пачынаюць панаваць над іншымі. Гэтыя індывіды і народы, якія займаюць прывілеяванае становішча, і з'яўляюцца носьбітамі чалавечага розуму. Але розум адных ёсць сродкам прыгнёту іншых.

Потым надыходзіць трэці перыяд, калі адбываецца паўстанне супраць улады. Безумоўна, паўстанне — гэта памылка, грэх, але памылка, з дапамогай якое простыя людзі ўсведамляюць сваю свабоду. Гэта стадыя, на якой зараз знаходзіцца свет і якая, згодна з філосафам, ёсць перыядам скептыцызму і эгаізму. Аднак гэта неабходны этап.

---

[1] *"Трэба, каб гэтая падпарадкаванасць (абавязку) мела нейкі вынік і нечаму служыла. Відавочна, што яна не адпавядае мэце зямнога свету; значыць, трэба, каб існаваў незямны свет, мэце якога яна адпавядала б" (ibid., p. 174).*

[2] *Гл. на гэты конт даследванне Georges Vlachos, op. cit., pp. 95–96.*

[3] *Мы выкарыстоўваем тут даследванне Xavier Léon dans La philosophie de Fichte, op. cit., pp. 310–314.*

І нарэшце, у чацвертым перыядзе людзі, якія ўсвядомілі саміх сябе, будуюць права рацыянальнай дзяржавы. Настае эпоха правасуддзя, якая ў сваю чаргу рыхтуе глебу эпосе, калі закон зробіцца непатрэбным дзякуючы прагрэсу маральнасці. Гэтаму апошняму перыяду будзе дадзены назоў "эры святасці".

Такім чынам, у Фіхтэ праблема стварэння сацыялізму — гэта перыяд ад стадыі анархічнай свабоды да эры правасуддзя.

Згодна з нашым аўтарам, дзеля пабудовы рацыянальнай дзяржавы неабходна наяўнасць класа навукоўцаў — "пастыраў навукі", якія з абсалютным аўтарытэтам вызначаць сацыяльную ісціну. Таксама трэба, каб суверэн быў надзелены самым дасканалым пачуццём справядлівасці.

Якім чынам могуць ажыццявіцца гэтыя ўмовы? Навукоўцы і суверэн не могуць быць абраныя бальшынёю, бо гэтая бальшыня, да запачаткавання рацыянальнай дзяржавы, складаецца з несправядлівых людзей. Значыць, пісаў Фіхтэ ў адным са сваіх апошніх твораў[1], трэба спадзявацца, што аднойчы з Боскага дазволу дзякуючы інтэлектуальнаму і маральнаму прагрэсу, які здзяйсняецца ў людскім асяроддзі, зможа сфармавацца справядлівы ўрад.

"Да таго дня, пакуль Бог гэтага не дазволіць, урады не змогуць палепшыцца. Адзіным пэўным сродкам, якім нацыя можа прымусіць урады прытрымлівацца паступовага руху наперад, ёсць інтэлектуальны і маральны прагрэс. Толькі ў такім гістарычным ракурсе паходжанне суверэнітэту вытрымлівае крытыку і мы мусім падпарадкоўвацца, але не безразважна... а таму, што можам прадбачыць, як супраціў парушае мірную эвалюцыю часу"[2].

Апошні зварот да Вышэйшай сілы не можа не расчараваць чытача Фіхтэ. Бо гэта выглядае маласпалучальным з асноватворнымі поглядамі філосафа, паводле якіх самой існасцю чалавека ёсць яго практычныя намаганні дзеля дасягнення дасканалай свабоды.

Але ці з'яўляецца здавальняльнай сама канцэпцыя свабоды, распрацаваная аўтарам *"Навукавучэння"*? Ці дапуш-

[1] *"Прававая дактрына"(1812 г.). На гэты конт мы выкарыстоўваем ужо цытаванае даследванне Georges Vlachos, pp. 105—106.*

[2] *Cité par g. Vlachos, cf. op. cit., p. 106.*

чальная ідэя аб пераадоленні супярэчнасці паміж свабодай і ўладай праз маральны прагрэс? Менавіта яе будзе аспрэчваць пачынаючы з 1801 г. Гегель у сваім першым друкаваным творы *"Адрозненне паміж філасофскімі сістэмамі Фіхтэ і Шэлінга"*. Грунтуючыся на крытыцы Фіхтэ, Гегель пабудаваў сваю ўласную сістэму.

Бібліяграфія

Эканамічная думка аўтараў, пра якія распавядалася ў гэтым раздзеле, была вельмі слабавывучаная да сённяшняга часу. Таму абмяжуемся пералікам толькі агульных твораў, якія мы выкарыстоўвалі.

Твор Max Rouche, *La philosophie de l'histoire de Herder*, (1940) — пасапраўднаму манументальны. Імкненне аўтара разгледзець усе аспекты азначанай тэмы настолькі вялікае, што часам трэба напружвацца, каб зразумець дакладнае значэнне самых вытанчаных момантаў, якія прысутнічаюць у ягоным творы. Але ў кожным разе месца Гэрдэра ў гісторыі ідэяў не апошняе.

Можна было б паспрабаваць зрабіць той жа папрок (калі ўвогуле магчыма ўжываць гэты тэрмін) на працу Georges Vlachos, *La pensée politique de Kant, métaphysique de l'ordre et dialectique du progrès*, Paris, 1962. Тут таксама гаворка ідзе пра вельмі падрабязнае даследванне, якое мае найвялікшую карысць. Аднак, наколькі нам вядома, даволі нешматлікія выказванні вялікага філосафа наконт эканамічнай дзейнасці і палітычнай эканоміі не былі да сёння прааналізаваныя і належным чынам ацэненыя.

Зусім іншая справа з Фіхтэ, бо ягоная *"Замкнёная гандлёвая дзяржава"* нядаўна перакладзеная на французскую мову і стала аб'ектам даследванняў у працах Xavier Léon і Georges Vlachos, якія мы часта цытавалі ў гэтым раздзеле. Таксама адзначым твор Alain Renaut, *Système du droit*, выдадзены ў 1986 г. У ім аўтар тлумачыць сукупнасць *"Практычнай філасофіі"* Фіхтэ.

ЧАСТКА ЧАЦВЕРТАЯ



ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ І НАСТУПСТВЫ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Раздзел I

УЗДЗЕЯННЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ НА СТАНОВІШЧА АНГЕЛЬСКІХ РАБОЧЫХ ПАД КАНЕЦ XVIII СТ.

Фізіякраты і Эдам Сміт сцвярджалі, што эканамічнай свабоды павінна быць дастаткова, каб забяспечыць дабрабыт усіх сацыяльных класаў грамадства ці, прынамсі, яна не можа шкодзіць аніводнаму з класаў. Падзеі, якія мелі месца ў Ангельшчыне цягам 30 апошніх гадоў XVIII ст., сведчылі аб глыбокай памылковасці такіх сцверджанняў, бо ў краіне адбывалася пагаршэнне становішча бедных класаў і прагрэс, здзейснены ў тэхніцы вытворчасці дзякуючы вынаходкам першых машынаў навачаснага тыпу, нават спрычыніўся да гэтага.

На гэты конт можна знайсці найдакладнейшыя звесткі ў вядомай кнізе Поля Манту *"Індустрыяльная рэвалюцыя ў XVIII ст."*[1] Мы нагадаем толькі асобныя моманты.

Перш за ўсё прымяненне новых машынаў пачалося ў галіне вытворчасці баваўняных валокнаў і тканіны. У 1765 г. Харгрыўз прыдумаў прадзільную машыну *"Джэні"*, якая ўяўляла нешта накшталт удасканаленай самапралкі, якая з самага пачатку дазваляла адначасова прасці 8 нітак. Машына прыводзілася ў рух з дапамогаю рукі і была папулярнаю сярод рабочых, якія працавалі дома. У 1771 г. Аркрайт прапанаваў прадзільную *ватэр-машыну* Water-Frame, якая прыводзілася ў рух сілаю воднай плыні. У 1779 г. Кромптан спалучыў перавагі абодвух папярэдніх вынаходніцтваў і стварыў прадзільную "мюль-машыну". А ў 1785 г. Картрайт вынайшаў механічны станок, прызначаны для ткацтва баваўняных матэрыялаў. Гэта было апошняй кропкай рэвалюцыйных пераменаў у прамысловасці. У тым жа годзе пачала працаваць ткацкая фабрыка, дзе выкарыстоўвалася энергія паравой машыны. Адкрыццё зроблена Ўатам.

Усе вынаходкі нашмат знізілі сабекошт тканінаў і прывялі да імклівага росту вытворчасці. У 1781 г. вага неапрацаванай бавоўны, імпартаванай у Ангельшчыну, складала 5,3 мільёна фунтаў; у 1789 г. яна ўжо складала 32,6 мільёна фунтаў, а ў 1802 г. — 60,5 мільёна. Трэба зазначыць, што сурова забараняўся імпарт баваўняных тканінаў, апрацаваных за мяжой. І наадварот, адбылося хуткае павелічэнне экспарту валокнаў і тканінаў. У 1780 г. яго кошт складаў 360 тысяч фунтаў стэрлінгаў. У 1802 г. ён дасягнуў 7,8 мільёна фунтаў стэрлінгаў[2]. Развіццю экспарту спрыяла тое, што да яго прамыславікоў заахвочвалі матэрыяльна[3].

Дарэчы, развіццё баваўнянай вытворчасці ішло вельмі няроўна. На працягу некалькіх гадоў была створаная вялікая колькасць фабрыкаў. Потым вытворчасць зрабілася большай за попыт; на пэўны час рост

---

[1] *Paris, 1906, nouv. éd., Paris, 1961.*

[2] *Paul Mantoux, op. cit., p. 249.*

[3] *Id., ibid., p. 254.*

вытворчасці спыніўся або нават паменшыўся, а потым ён зноўку паскорыўся.

У 1788 і ў 1789 гг. на многіх фабрыках была звольненая частка персаналу. У 1793 г. збанкрутавалі з тузін ткацкіх фабрыкаў, а імпарт неапрацаванай бавоўны панізіўся з 35 да 19 мільёнаў фунтаў.

Пад уплывам развіцця машыннай вытворчасці таксама пачынаюць трансфармавацца і іншыя галіны прамысловасці, у прыватнасці металургія.

Уздым прамысловасці новага ўзору суправаджаўся канцэнтрацыяй у індустрыяльных цэнтрах жабрацкага пралетарыяту. Праблема паўперызацыі набыла новыя, больш складаныя формы.

Рабочыя заўважалі, што прымяненне новых машынаў пагражае ім беспрацоўем, і імкнуліся перашкодзіць гэтаму.

Першыя *"Джэні"* Харгрыўза былі раструшчаныя рабочымі. У 1779 г. многія ткацкія фабрыкі ў графстве Ланкастэр былі ўзятыя штурмам і разбураныя. Рух 1811—1812 гг., які атрымаў назоў "лудыцкага", таксама характарызаваўся разбурэннем машынаў, але ён уяўляў паўстанне больш агульнай скіраванасці супраць тагачаснага грамадскага ладу.

Напачатку даходы рабочых у прамысловасці былі большымі, чым у сельскай гаспадарцы. У выніку стварэнне фабрыкаў прываблівала ў індустрыяльныя цэнтры масу людзей. Але, каб іх прыняць, нічога не было падрыхтавана. Асабліва цяжкімі былі ўмовы пражывання людзей.

Неўзабаве атрымаўся лішак працоўнае сілы, і пачало пашырацца, асабліва ў перыяды перавытворчасці, беспрацоўе. Пад час крызісаў перавытворчасці рэзка падалі заробкі ў прамысловасці і ўсё працоўнае насельніцтва трапляла ў галечу.

Нарэшце, трэба адзначыць, што ўмовы працы былі часцей за ўсё вельмі дрэнныя. Магчыма, менавіта ў гэтым і палягалі найбольш згубныя наступствы стварэння фабрыкаў. Прызвычаеныя працаваць у сваёй хаце, безумоўна, на працягу доўгіх гадзінаў, але даволі незалежна, рабочыя вельмі цяжка пераносілі строгую фабрычную дысцыпліну. Невыносныміі былі ўмовы працы жанчын і дзяцей, якім плацілі невялікія грошы. У прыватнасці, на фабрыках, часта ў жахлівых умовах, эксплуатавалі дзяцей з сірочых дамоў, якіх накіроўвалі на працу парафіі.

Раздзел II

МАЛЬТУСАВА АБГРУНТАВАННЕ КАРЫСНАСЦІ ГАЛЕЧЫ

З 1562 г. у Ангельшчыне існавала сістэма дапамогі беднякам. Парафіі размяркоўвалі дапамогу сярод тых, хто не мог працаваць або не меў працы. Сродкі для гэтага збіраліся праз спецыяльны падатак — падатак на бедных. У XVII ст. парафіям было дазволена ствараць працоўныя дамы (*Workhouses*), у якія запрашаліся беднякі.

Як першая, так і другая сістэмы дапамогі дорага каштавалі і кепска вырашалі праблему. *Працоўныя дамы* нагадвалі жудасныя астрогі, а дапамога на хату, прывязваючы беднякa да пэўнае парафіі, пазбаўляла яго элементарных свабодаў. З вучэння Годўіна вынікала патрабаванне пашырэння дапамогі беднякам. Гэта пад яго ўплывам у 1795 г. у Францыі была прынятая Дэкларацыя правоў, у якой, у прыватнасці, прысутнічаў і такі артыкул:

"Кожны грамадзянін, які не можа забяспечыць сваіх уласных патрэбаў, мае права на дапамогу ад іншых".

Замацаванне права на дапамогу падрывала асноўныя тэзісы Сміта. Для апошняга закон аб бедных здаваўся згубным, бо замінаў перамяшчэнню працоўнай сілы і спараджаў няроўнасць заробкаў, што супярэчыла інтарэсам саміх рабочых.

Мальтус імкнуўся, выкарыстоўваючы ідэі, што датычылі дэмаграфічнага росту, вылучаныя Ўолесам і іншымі аўтарамі, зняпраўдзіць сістэму, пабудаваную Годўінам, і замацаваць пазіцыі Сміта. Дзеля гэтага Мальтус паспрабаваў даказаць, што тэндэнцыя перанаселенасці, уласцівая чалавечаму роду, патрабуе няроўнасці і не дазваляе вызнаваць права на дапамогу.

Томас Робэрт Мальтус нарадзіўся ў 1766 г., памёр у 1834 г. Ён быў сынам вясковага шляхціча, палымянага прыхільніка новых ідэяў і, у прыватнасці, захопленага ідэямі Годўіна. Паступіўшы на царкоўную службу, малады Мальтус стаў пастарам у вёсцы і неўзабаве вельмі рашуча выступіў супраць ідэяў, вельмі дарагіх ягонаму бацьку.

У 1795 г. быў прыняты новы закон, які пашыраў сферу дапамогі беднякам і які, у прыватнасці, прадугледжваў, што калі індывід атрымліваў недастатковы для жыцця заробак, дык парафія мусіла даваць яму дапамогу.

Каб адначасова адпрэчыць ідэі Годўіна і выказаць пратэст супраць новага заканадаўства, Мальтус у 1798 г. ананімна выпусціў у свет першае выданне сваёй *"Спробы стварэння закону аб народанаселенасці"*.

У 1803 г. з'явілася другое выданне са шматлікімі зменамі; гэтым разам на ім стаяла імя аўтара.

§ 1. Асноўныя палажэнні "Спробы стварэння закону аб народанаселенасці"

Мэта, якую свядома вылучыў для сябе Мальтус, — даць апраўданне ліберальнаму ладу, заснаванаму на ўласнасці і сацыяльнай няроўнасці.

Сміт прадэманстраваў, што свабода — самы лепшы сродак павелічэння багацця нацыі. Ён, дарэчы, дапускаў, хутчэй падсвядома, што бальшыня індывідаў атрымлівае выгаду ад гэткага ўзбагачэння.

Мальтус жа заўважыў, што багацце можа расці і пры гэтым становішча *кожнага* індывіда не будзе паляпшацца. Менавіта тое і адбываецца, калі колькасць індывідаў павялічваецца гэтак жа хутка або нават хутчэй, чым колькасць тавараў для задавальнення іхных патрэбаў.

Зрабіўшы гэтую заўвагу, аўтар сцвярджаў, што ліберальны лад і яго вынік — няроўнасць — дазваляюць палепшыць лёс, прынамсі, часткі індывідаў, бо гэты лад забяспечвае абмежаванне дэмаграфічнага росту, тым часам як камунітарны або эгалітарны лад абавязкова давёў бы ўсіх да галечы.

Доказы Мальтуса простыя. Яны зводзяцца да супрацьпастаўлення таго, што ён лічыць "натуральным законам" павелічэння насельніцтва і ўмоваў максімальнага росту вытворчасці прадуктаў харчавання.

"Мы можам лічыць бясспрэчным тое, — пісаў ён, — што калі росту насельніцтва нічога не замінае, дык гэтае насельніцтва будзе падвой-

вацца праз кожныя 25 гадоў і будзе павялічвацца ў кожны наступны 25-гадовы перыяд у геаметрычнай прагрэсіі"[1].

Гэта азначае: калі ўлічваць ровень нараджальнасці ў сем'ях і звычайную смяротнасць, а таксама тое, што індывіды бяруць шлюб па сваёй волі і здольныя пракарміць сваіх дзяцей, дык іх колькасць падвойваецца кожныя 25 гадоў.

І наадварот, нельга лічыць, што павелічэнне вытворчасці неабходных прадуктаў харчавання таксама прытрымліваецца гэтага закону. Калі ў дадзеных умовах іх вытворчасць на даступных землях нейкае краіны таксама падвоілася на працягу першага 25-гадовага перыяду,

"дык няма падставаў спадзявацца, што ў наступнае дваццаціпяцігоддзе ўрадлівасць зямлі павялічылася б адпаведна з гэтым законам і што пад канец гэтага другога перыяду першапачатковы аб'ём прадукцыі земляробства павялічыўся б у 4 разы. Дапусціць гэта — азначала б адкінуць усе нашы веды і ўяўленні аб урадлівасці зямлі"[2].

Тут Мальтус фармулюе тэзу, якая далей атрымае назоў "закону спадальнай урадлівасці" зямлі. Ён яшчэ раз паўтарае яе ў радках:

"Мы тут сцвярджаем... што сродкі існавання пры самых спрыяльных умовах развіцця чалавечае працы не змогуць павялічвацца хутчэй, чым у арытметычнай прагрэсіі"[3].

Удакладняючы, ён зазначае, што "чалавечы род" мае тэндэнцыю павелічэння, "як лічбы 1, 2, 4, 8, 16...", тады як сродкі існавання могуць у лепшым разе павялічвацца як лічбы 1, 2, 3, 4, 5, 6... У першым выпадку гаворка ідзе аб геаметрычнай прагрэсіі з асновай 1 і прапорцыяй 2. У другім — арытметычнай прагрэсіі з асновай 1 і прапорцыяй 1. На думку Мальтуса, процілегласць гэтых дзвюх прагрэсіяў і ёсць кропкай адліку для ўсіх навукаў аб грамадстве.

Сапраўды, паводле Мальтуса, трэба прызнаць, што супольнасць, шлюбныя і сексуальныя паводзіны ў якой нічым не стрымліваюцца, не выходзіць з галечы, бо харчавання для ўсіх, хто нараджаецца, бракуе, і нэндза забівае ўсіх, хто не можа прахарчавацца.

---

[1] *Essai sur le principe de la population, trad. franç., sur la 5e éd. (1817), 1846, p. 8.*
[2] *Ibid., p. 10.*
[3] *Ibid., p. 10.*

Такім чынам, уздымаецца пытанне, ці існуюць больш прымальныя сродкі абмежавання росту насельніцтва.

Найперш варта было б падумаць пра заканадаўчыя крокі, якія б рэгламентавалі шлюбны ўзрост. Мальтус сцвярджаў, што падобнае заканадаўства само па сабе здаецца неверагодным.

"Хто б сачыў за яго ажыццяўленнем, — пытаўся ён, — і якім чынам можна даказаць яго парушэнне? Ганьбавалі б, паказвалі б пальцам на кожнага чалавека, які заўчасна пабраўся шлюбам? Ці каралі б яго бізуном? Або прысуджалі яму астрог? Выстаўлялі б на няславу яго дзяцей? Ці не з'яўляюцца ўсе пакаранні, якія можна было б прыдумаць за парушэнне гэтых правілаў, ганебнымі і супярэчнымі прыродзе?"[1]

Апрача гэтага сродку можна разгледзець два іншыя. Першы — тое, што Мальтус называе грахом і што мы сёння называем кантролем за нараджальнасцю, другі — *маральны бар'ер*, гэта значыць добраахвотнае адмаўленне ад шлюбу і ад нараджэння дзяцей з боку дастатковай колькасці людзей на працягу часткі іхнага жыцця або на працягу ўсяго іхнага існавання.

Мальтус катэгарычна выказваўся супраць кантролю за нараджальнасцю ва ўсіх яго формах. Яго аргументацыя была наступнаю: такі падыход супярэчыць законам прыроды і таму разбурае добрыя норавы і нават само грамадства. Аўтар робіць выснову: абмежаванне насельніцтва можа грунтавацца толькі на *маральным бар'еры*, але тым часам сцвярджаў, што гэты сродак датычыць толькі тых грамадстваў, асноваю якіх з'яўляецца спадчынная ўласнасць і якія прызнаюць няроўнасць багаццяў.

Сапраўды, у эгалітарным грамадстве незразумела, чаму адны павінны адмаўляцца ад шлюбу, а іншыя — не:

"Калі б усе былі роўнымі і знаходзіліся ў роўных умовах, дык было б немагчыма вызначыць, чаму нехта мусіць трымацца абавязку, а нехта — не"[2].

Разгледзім грамадства, у якім пануе няроўнасць. Толькі тыя, у каго дастаткова сродкаў, каб гадаваць усіх сваіх дзяцей, колькі яны змогуць нарадзіць на працягу свайго

[1] *Ibid., p. 344.*
[2] *Ibid., p. 344.*

жыцця, будуць мець права ў маладым узросце пабрацца шлюбам. Усе іншыя ў залежнасці ад памеру іхнага багацця і даходаў мусяць або на пэўны час адкласці свой шлюб, або зусім ад яго адмовіцца. Праблема будзе вырашаная пры ўмове ажыццяўлення на практыцы дадатковага палажэння — скасавання ўсялякіх мераў дапамогі беднякам. Мальтус доўга развіваў простую саму па сабе ідэю аб тым, што "законы аб бедных" самі супярэчаць сваёй жа мэце. Яны не толькі не знішчаюць галечу, але памнажаюць яе, дазваляючы нават тым, хто не мае на гэта сродкаў, браць шлюб, мець дзяцей і падтрымліваць жыццё, прынамсі, некалькім са сваіх дзяцей, якія ў сваю чаргу будуць ствараць жабрацкія сем'і.

Пачынаючы з 1803 г. у перавыданнях свайго твора Мальтус кожны раз падкрэсліваў, што ён не з'яўляецца ворагам беднякоў, ён — прыхільнік разумнага павелічэння насельніцтва. Аднак яго вучэнне захоўвала ранейшы змест, сэнс якога адлюстроўваюць, напрыклад, наступныя радкі:

"Як ні цяжка з гэтым пагадзіцца, бяскрайняя бедната павінна лічыцца ганебнай. Такі стымул падаецца абсалютна неабходным дзеля забеспячэння шчасця пераважнай большасці людзей; і ўсялякая спроба паслаблення гэтага стымулу, якім бы дабрачынным ні было памкненне, заўсёды будзе супярэчыць сваёй уласнай мэце"[1].

§ 2. Сацыяльны натуралізм Мальтуса

Ідэі Мальтуса аб народанаселенасці выклікалі шматлікія, але малапераканаўчыя пратэсты. У якасці аргумента супраць яго тэорыі прыводзілі той факт, што пачынаючы з канца XIX ст. у краінах Заходняй Эўропы была зліквідаваная праблема дэмаграфічнага ціску. Такі вынік быў дасягнуты, з аднаго боку, дзякуючы масавай эміграцыі эўрапейцаў і, з другога боку, дзякуючы распаўсюджванню супрацьзачаткавых сродкаў. Мальтус не адмаўляў, што з дапамогаю такіх крокаў грамадства зможа супрацьстаяць тэндэнцыі да перанаселенасці (напрыклад, ён доўга вывучаў прычыны скарачэння народанаселенасці ў рымскую эпоху). Трэба прызнаць, што сёння праблема перанаселенасці застаецца адкрытай

[1] *An Essay on the Principle of Population, 1re éd., réimpression, London, 1926, sous le titre First Essay on Population, p. 85. Тыя ж радкі прысутнічаюць і ў працытаваным французскім перакладзе, p. 366. Мальтус не выступае супраць прыватнай дапамогі беднякам пры ўмове, што дабрадзей павінен асабіста ўпэўніцца, што дапамога не выкліча згубных наступстваў з дэмаграфічнага гледзішча.*

у "трэцім свеце" і што там яна мае асабліва востры характар. Такім чынам, немагчыма сцвярджаць, што факты самі па сабе знішчаюць дактрыну Мальтуса.

У тэарэтычным плане гэтае вучэнне таксама больш істотнае, чым пра яго часам кажуць.

Нельга не пагадзіцца з Мальтусам, што людзі здольныя памнажацца нашмат хутчэй за магчымасці павелічэння вытворчасці прадуктаў харчавання.

Насельніцтва, якое жыве на дадзенай тэрыторыі і неабмежавана расце, можа сапраўды падвойвацца праз кожныя 25 гадоў і нават за меншы прамежак часу. І наадварот, нягледзячы на тэхнічны прагрэс, мы не можам спадзявацца, што праз кожныя 25 гадоў магчыма *бясконцае* падваенне аб'ёму вытворчасці прадуктаў, неабходных для існавання людзей. Значыць, супярэчнасць, якую акрэсліў Мальтус, вельмі рэальная, і дарэмна ягоныя крытыкі (лібералы і сацыялісты) спрабавалі адмаўляць існаванне такой супярэчнасці.

Але з прызнання гэтага не вынікае, што трэба пагадзіцца з усімі пунктамі тэорыі Мальтуса і ўслед за ім сцвярджаць, што сацыяльная няроўнасць і існаванне збяднелай катэгорыі працоўных ёсць адзінаю ўмоваю ўсялякага прагрэсу.

Мальтус шукаў дзейсныя сродкі забеспячэння прагрэсу чалавецтва, нягледзячы на схільнасць да тэорыі перанаселенасці. У мінулым з мэтай барацьбы з гэтай тэндэнцыяй выкарыстоўвалі розныя захады, якія зводзіліся або да ўмяшання грамадскіх уладаў, або да выкарыстання сродкаў, якія дазвалялі сямейным парам абмяжоўваць нараджальнасць. Мальтус жа лічыў, што такія крокі несумяшчальныя з прагрэсам чалавецтва з тае прычыны, што яны абмяжоўвалі або самастойнасць індывіда, або яго волю да дзеяння.

Вучоны не раз падкрэсліваў небяспеку ўмяшання дзяржавы для асабістай свабоды індывіда. Крыху раней мы цытавалі ўрывак, у якім аўтар абвяшчаў немагчымасць рэгламентацыі шлюбнага ўзросту. Гэтае выказванне яскрава сведчыць аб індывідуалізме аўтара.

Што да супрацьзачаткавых сродкаў, дык Мальтус часцей за ўсё асуджаў іх выкарыстанне, абапіраючыся на хрысціянскую мараль. Але апрача гэтага матыву існуе яшчэ адзін, больш важкі: Мальтус лічыў, што забарона пазбавіла б чалавека жадання дзейнічаць, якое з'яўляецца адзінаю крыніцаю ўсялякага прагрэсу.

У дадатку да пятага выдання *"Спробы стварэння закону..."* (1817 г.) Мальтус пісаў: "Я заўсёды асабліва крытыкаваў штучныя і ненатуральныя сродкі абмежавання росту насельніцтва з-за іхнае амаральнасці і з-за таго, што пры гэтым знікае неабходны стымул для эканамічнай дзейнасці *(industry)*. Калі б кожная сям'я магла па сваім жаданні абмяжоўваць колькасць дзяцей, дык, без сумневу, трэба было б чакаць, што моцна павялічылася б абыякавасць людзей; тады ні насельніцтва асоб-

ных краінаў, ні ўсё чалавецтва ніколі не дасягнулі б свайго нармальнага і натуральнага развіцця"[1].

З урыўка бачна, што Мальтус разглядаў "нармальнае" развіццё насельніцтва Зямлі ў якасці адной з мэтаў, якой павінна дасягнуць чалавецтва. Менавіта ў гэтым, на яго думку, палягае адна з умоваў росквіту цывілізацыі і дасягнення шчасця людзьмі. Амаль кур'ёзны тэзіс: нібыта кантрацэпцыя, пазбаўляючы індывіда неабходнасці прыкладаць максімум высілкаў, перашкаджае развіццю вытворчасці — першаснай умовы развіцця насельніцтва. Карацей кажучы, паводле Мальтуса, насельніцтва можа нармальна развівацца толькі тады, калі не знікае тэндэнцыя да перанаселенасці.

Гэтае палажэнне таксама вынік індывідуалісцкага *светапогляду*. Згодна з Мальтусам, індывід павінен быць свабодным у сваіх дзеяннях. Але да дзеяння яго мусяць падштурхоўваць сілы, над якімі ён не пануе.

Адстойваючы гэты тэзіс, Мальтус далучаецца да меркавання эканамістаў-класікаў. Аднак многія з эканамістаў (пачынаючы з Эдама Сміта) падкрэслівалі, што ў людзей таксама закладзеная прыродная схільнасць да паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча праз дзейнасць. У 1829 г. адзін з найбольш вядомых тагачасных ангельскіх эканамістаў Насаў Уільям Сэньёр у лісце да Мальтуса выказаў заўвагу наконт вучэння апошняга, якая грунтавалася менавіта на ацэнцы гэтае схільнасці.

"Я яшчэ дадаў бы, — пісаў Сэньёр, — што пры адсутнасці шкодных чыннікаў сродкі існавання маюць тэндэнцыю павялічвацца хутчэй, чым насельніцтва. Гэта даказвае гісторыя; на маю думку, наша жаданне паляпшаць умовы жыцця такое ж натуральнае, як і жаданне ўзяць шлюб"[2].

Адказваючы 23 сакавіка таго ж года на гэты ліст, Мальтус заяўляў:

"Мне здаецца, што жаданне паляпшаць умовы жыцця, калі яго разглядаць у кантэксце простага павелічэння сродкаў існавання, занадта слабое, каб ураўнаважваць схільнасць насельніцтва да росту. Самае палымянае жаданне палепшыць умовы жыцця не можа выклікаць няспыннага павелічэння багацця, калі параўноўваць яго з роўнем, якога можа дасягнуць насельніцтва; сапраўды, гэтае жаданне павялічыць сродкі існавання не вельмі моцнае ў працоўнага класа. Сюды не ўваходзяць людзі, якія назапашваюць сельскагаспадарчы капітал і выкарыстоўваюць яго дзеля паляпшэння тэхнікі вядзення гаспадаркі і павелічэння багацця. З гэтага гледзішча працоўныя бадай што цалкам пасіўныя, аднак яны маюць вялікія здольнасці ў іншым. Яны не могуць паскорыць павелічэнне багацця, затое выступаюць адзіным класам грамадства, які можа істотным чынам запаволіць рост насельніцтва"[3].

Дзеля абароны свайго вучэння Мальтус сцвярджаў неабходнасць падзелу грамадства на два класы: клас багатых, які ашчаджае і інвестуе, і клас бедных, які працуе. Тэмп росту насельніцтва асабліва залежыць,

[1] *Урывак, працытаваны G. F. McCleary, in The Malthusian theory of population, London, 1953, p. 88.*

[2] *Ліст ад 15 сакавіка 1829 года, працытаваны у G. F. McCleary, op. cit., pp. 114—115.*

[3] *Ibid., pp. 116—117.*

казаў ён, ад паводзінаў класа бедных (таму што ён — самы шматлікі). Тэмп жа павелічэння вытворчасці галоўным чынам залежыць ад багатага класа. Значыць, нельга сцвярджаць, як рабіў Сэньёр, што накіраванасць чалавека да паляпшэння ўмоваў жыцця ўраўнаважвае тэндэнцыю чалавечага роду да памнажэння. Сапраўды, першае цягне значныя наступствы толькі для меншыні, другое адбываецца ў межах шматлікага класа: наступствы другой тэндэнцыі абавязкова пераважаюць над плёнам першай.

Гэтая цікавая спрэчка паміж двума вядомымі эканамістамі сёння здаецца нам даволі бессэнсоўнай, бо сёння ўсімі прызнана, што неразумна адмаўляць у эфектыўнасці і станоўчым уплыве іншых, апрача *"маральнага бар'ера"*, сродкаў, якія добраахвотна ўжываюць індывіды з мэтай абмежавання нараджальнасці.

Зразумела, дэмаграфічная гісторыя Заходняй Эўропы XIX ст. не можа, як мы падкрэслілі, разглядацца ў якасці прынцыповага адхілення вучэння Мальтуса, бо гэтая гісторыя была ў значнай ступені гісторыяй замежнай экспансіі, што спыніла рост насельніцтва і адначасова забяспечыла надзвычай імклівае развіццё прадукцыйных сілаў. Тым не менш факты, пра якія ідзе гаворка, сведчаць, што сам працоўны клас можа знайсці сродкі "кантролю за нараджальнасцю", якія значна запавольваюць тэмпы росту насельніцтва і не ствараюць пры гэтым перашкодаў для эканамічнай дзейнасці.

Мальтус лічыў, што роля чалавечай волі надзвычай абмежаваная, ён меркаваў, што воля чалавека кіруецца толькі страхам. Варта паказаць, якім чынам яго канцэпцыя ролі волі стасуецца з вельмі распаўсюджаным на той час светапоглядам, у якім матэрыялізм або натуралізм (прыхільнікі абодвух кірункаў схіляліся да адмаўлення выключнасці чалавечага розуму і яго зверхнасці над прыродай) самым дзіўным чынам спалучаецца з той канцэпцыяй маральнасці, якая выкрышталізавалася ўнутры хрысціянства і знайшла сваё яскравае ўвасабленне ў ангельскім пурытанізме XVIII ст.[1]

Гэты светапогляд даволі поўна выказваецца ў двух апошніх раздзелах першага выдання *"Спробы стварэння закону аб народанаселенасці"*.

У гэтай частцы твора Мальтус паўстае як хрысціянін, які спрабуе спалучыць традыцыйнае вучэнне сваёй рэлігіі або яго асобныя часткі з новымі ідэямі.

Паводле ягоных слоў, гаворка не пра тое, каб патрабаваць ад людзей перанесці на будучае жыццё ўсе іхныя спадзяванні на шчасце. Наадварот, трэба шукаць дзейсныя ўмовы забеспячэння чалавечага шчасця на Зямлі, каб сталі рэчаіснасцю таемныя задумы Бога, творцы прыроды[2].

Каб зразумець, у чым палягаюць умовы шчасця, трэба разглядаць натуральны свет як працэс, пажаданы Богам з мэтай стварэння і развіц-

[1] *Аб эвалюцыі пурытанскай маралі ў XIX ст. гл.: Tawney, La religion et l'essor du capitalisme, trad. franç., Paris, 1951, pp. 234–252.*

[2] *First Essay on Population, op. cit., pp. 348–352.*

ця розуму. "Працэс, — пісаў Мальтус, — неабходны дзеля таго, каб абудзіць хаатычную і інертную матэрыю і ператварыць яе ў розум, перапрацаваць зямны бруд і зрабіць з яго душу"[1].

Але каб чалавек ажыццяўляў сваю разумовую дзейнасць, трэба, каб неабходнасць задавальняць разнастайныя патрэбы штурхала яго да працы. "Безумоўна, час адпачынку мае вялікую каштоўнасць для чалавека; але калі мы возьмем чалавека такім, які ён ёсць, верагодна, што часцей празмерны адпачынак прынясе больш ліха, чым дабра"[2].

Мальтус развіваў сваю думку далей:

"З усяго таго, чаму навучыў нас досвед наконт чалавечае прыроды, напрошваецца выснова: калі б гэтыя стымулы да дзеяння, якія ёсць патрэбамі цела, былі адкінутыя грамадствам, дык можна меркаваць, што людзі з-за адсутнасці пабуджальных чыннікаў хутчэй за ўсё падышлі б да роўню жывёлаў і не ўзняліся б да роўню філосафаў толькі дзякуючы факту наяўнасці вольнага часу"[3].

У развагах філосафа праглядаецца пурытанская канцэпцыя жыцця, процілеглая антычным канцэпцыям[4]. Але ў апошнім раздзеле "Спробы стварэння закону..." Мальтус ідзе далей і сцвярджае, што *няшчасце* (а не проста беднасць і праца) уяўляе з сябе неабходны для чалавека стымул.

"Смутак і нягоды жыцця, — пісаў ён, — складаюць яшчэ адну катэгорыю стымулаў, якія ўяўляюцца неабходнымі... дзеля чуласці і ачалавечвання сэрца, абуджэння сацыяльнай сімпатыі, спараджэння ўсіх хрысціянскіх дабрадзейнасцяў і развіцця шчодрасці"[5].

Гэта адзін аргумент, а вось і другі, яшчэ больш дзіўны: аўтар сцвярджаў, што ліха павінна існаваць, каб схіляць душы да дабрадзейнасці праз пачуццё заганнасці і агіды, якія гэтыя душы адчуваюць. "Вельмі верагодна, — пісаў Мальтус, — што маральнае ліха абсалютна неабходнае дзеля загартоўкі маралі найвышэйшай дасканаласці"[6].

Гэтым ён, магчыма, выказаў нутраную сутнасць уласнай думкі, думкі пастара, тэалогія якога прайшла суровае выпрабаванне філасофіяй Асветы і які не знайшоў аніякіх іншых сродкаў захавання свайго даверу да традыцыйнай маралі, апрача перабольшанага, даведзенага да абсурду песімізму.

Мальтус абвесціў, што не будзе выказвацца наконт таго, ці адрозніваецца розум ад матэрыі: "Пытанне, зрэшты, ёсць, магчыма, проста

---

[1] *Ibid., p. 353.*
[2] *Ibid., p. 370.*
[3] *Ibid., p. 358.*
[4] *Для Плятона грамадства мусіць быць гарманічным, каб забяспечыць узвышэнне душаў. Арыстотэль лічыў, што чалавек павінен вызваліцца ад матэрыяльных клопатаў з мэтай дасягнення ўзору жыцця філосафа. Паводле Мальтуса, жыццё ў грамадстве, наадварот, павінна быць цяжкім і невыносным, каб чалавек практыкаваў свой розум.*
[5] *Ibid., p. 372.*
[6] *Ibid., p. 375.*

гульня словаў. Розум у аснове сваёй ёсць розум, створаны ён з матэрыі ці з якой іншай субстанцыі"[1].

У гэтым выяўляецца памылка тэолага, але найбольш яна акрэсліваецца ў радках, дзе аўтар сцвярджаў, што не верыць у існаванне пекла. Гэты ўрывак асабліва важны дзеля разумення думкі Мальтуса, бо тут мы бачым, як філосаф звяртаецца да ідэі аб веры ў неабходнасць галечы ў грамадстве замест веры ў пекла.

"Немагчыма дапусціць, — пісаў Мальтус, — каб нейкае стварэнне, якое выйшла з Божых рук, магло быць асуджанае на вечныя пакуты. Калі мы нават дапусцім падобную ідэю, дык усе нашыя канцэпцыі наконт дабрыні і справядлівасці будуць ушчэнт зруйнаваныя і мы не зможам больш разглядаць Бога як міласэрную і поўную справядлівасці істоту. Тым не менш вучэнне аб жыцці і несмяротнасці, выкладзенае ў Эвангеллі, адпаведна з якім мэтай справядлівасці ёсць вечнае жыццё, а карай за грахі будзе смерць, — у кожным разе дакладнае, міласэрнае і вартае вялікага Творцы. Нішто не адпавядае нашаму розуму болей, чым ідэя, паводле якой тыя істоты, якія нараджаюцца ў выніку стваральнага сусветнага працэсу з прыгожымі і вартымі любові формамі, павінны быць узнагароджаныя несмяротнасцю, а тыя, хто нараджаецца небаракам, чый розум не здольны дасягнуць чысцейшага і шчаслівейшага стану, павінны згінуць і быць асуджанымі да новага перамешвання ў першароднай гліне. Вечны прысуд такога кшталту можа разглядацца як вечная кара, і таму не дзіўна, што ён уяўляецца ў вобразе пакутаў. Жыццё і смерць, выратаванне і разбурэнне часцей, чым шчасце і галеча, супрацьстаўляюцца адно аднаму ў Новым Запавеце.

У выніку пэўныя пакуты, пасланыя Творцам, калі ён стварае столькі здольных на спазнанне найвялікшых радасцяў істотаў, — гэта проста дробязь у параўнанні са створаным шчасцем, і ў нас няма падставаў лічыць, што на свеце існуе больш ліха, чым неабходна дзеля спрыяння працэсу стварэння"[2].

Калі паспрабаваць іншымі словамі выкласці гэты ўрывак, дык у ім гаворыцца, што пекла не існуе, неба застаецца вечным прытулкам істотаў, якім наканаванае шчасце, і, нарэшце, малаталенавітыя істоты, пазбаўленыя магчымасці будучага жыцця, справядліва церпяць галечу і нэндзу пад час іхнага кароткага зямнога існавання. Зразумела, што вучэнне Мальтуса ў асноўным набліжаецца да спробы пераносу на палітычную глебу рэлігійнай канцэпцыі, канцэпцыі збавення чалавецтва праз пакуты.

§ 3. Тэорыя зямельнай рэнты

Твор Мальтуса меў значны поспех. У ім бачылі канчатковае адпрэчванне крытыкі супраць уласнасці, г. зн. перш за ўсё абарону прыватнай уласнасці на зямлю.

[1] *Ibid., p. 354.*
[2] *Ibid., pp. 389 à 391.*

Неўзабаве Мальтус меў магчымасць даказаць, што ён сапраўды ёсць абаронцам інтарэсаў зямельных уласнікаў. Пасля таго як у 1804 г. яго прызначылі прафесарам гісторыі і палітэканоміі ў коледжы Вэст-Індскай кампаніі, ён прысвяціў сябе эканамічным даследванням. Пытанне, якім займаўся перш за ўсё, — гэта рост кошту на збожжа, што назіраўся ў тыя часы ў Ангельшчыне.

З мэтай тлумачэння гэтае з'явы Мальтус у дзвюх невялічкіх працах, якія пабачылі свет у 1815 г.[1], звярнуўся да сюжэта, які пасля атрымаў назоў *"Тэорыі дыферэнцаванай рэнты"*.

"Кошт тавару ў кожнай краіне на стадыі прагрэсу, — пісаў ён, — павінен быць прыкладна роўны выдаткам яго вытворчасці на найменш урадлівай, але эфектыўна выкарыстанай зямлі або павінен раўняцца выдаткам атрымання дадатковага прадукту на раней апрацаванай зямлі, якая прыносіць сярэднія даходы сельскагаспадарчаму капіталу пры нізкай рэнце або без рэнты...

З гэтага вынікае, што сума валавога даходу ад усёй колькасці прадукту фіксуецца роўнем нармальнай, або неабходнай, цаны, г. зн. цаны, неабходнай для пакрыцця максімальна магчымых выдаткаў, хоць найбольшая частка тавару будзе прададзена па кошце, нашмат вышэйшым за той, які неабходны для вытворчасці, бо частка тавару вырабляецца пры мінімальных выдатках, а яе менавая вартасць не памяншаецца"[2].

Аўтар упершыню звяртаецца да таго, што мы сёння называем фіксаваннем кошту на аснове максімальных выдаткаў. Гэтая важкая выснова ёсць доказам тэзіса Сміта, згодна з якім зямельная рэнта з'яўляецца адлічэннем з выніку працы, абумоўленым манаполіяй, якую мае зямельны ўласнік. Зараз жа мы бачым, што існуе шэраг манапо-

---

[1] *"Асновы меркавання аб палітыцы абмежаванняў на імпарт замежнага збожжа...", 1815 г., "Даследванне аб прыродзе і павелічэнні рэнты", 1815 г. Асноўная ідэя яго тэорыі — земляробства развіваецца адпаведна з законам спадальнай урадлівасці глебы — ужо была выказаная ў 1777 г. Джэймзам Андэрсанам у творы "Даследванне аб прыродзе законаў аб збожжы". Гл. на гэты конт W. S. Jevons, The Theory of Political Economy, London, 1871, p. 199.*

У 1815 г. выйшла невялічкая праца сэра Эдўарда Ўэста "Выкарыстанне капіталу на зямлі", у якой змяшчаецца такі варыянт тэорыі дыферэнцаванай рэнты, які асобнымі даследнікамі лічыцца больш поўным, чым Мальтусаў. Гл. на гэты конт G. J. Stigler, Essays in the History of Economics, Chicago, 1965, pp. 175 et s.

[2] *On the Nature and Progress of Rent, nouv. éd., Baltimore, 1903, pp. 32—33. Тут Мальтус атаясамлівае менавую вартасць і нармальны кошт.*

ліяў, якімі карыстаюцца ўласнікі розных катэгорыяў зямлі, што падраздзяляецца адпаведна роўням урадлівасці, і такія манаполіі дазваляюць спаганяць са створанай вартасці тым большае адлічэнне, чым больш урадлівая зямля.

Аднак Мальтус не засяроджваў увагі на гэтых высновах. На яго думку, тэорыя дыферэнцаванай рэнты прызначаная апраўдаць высокі кошт на збожжа.

Казаў, што высокая цана на збожжа ёсць вынікам нашага багацця, якое дазваляе развіваць сельскагаспадарчую вытворчасць: "Грашовы эквівалент кошту збожжа вышэйшы ў заможных краінах"[1]. Такім чынам, не трэба выказваць на гэты конт вялікай незадаволенасці. Зрэшты, рост кошту збожжа не зашкодзіць найманым працаўнікам, даходы якіх таксама ўздымаюцца адпаведна[2]. Зразумела, імпарт збожжа мог бы спыніць рост коштаў, аднак існуе больш пэўны сродак перашкодзіць гэтаму: зменшыць падаткі, якімі абкладаецца сельская гаспадарка[3].

Усё гэта выразна сведчыць пра жаданне аўтара абараніць інтарэсы зямельных уласнікаў і тлумачыць тую сімпатыю, з якою былі сустрэтыя ягоныя ідэі.

Тым не менш тэорыя "дыферэнцаванай рэнты" таксама можа займець форму сур'ёзнага пярэчання ліберальнай сістэме. У адным месцы свайго твора, напісанага ў 1815 г., Мальтус заяўляў, што павелічэнне рэнты мае адваротным бокам зніжэнне прыбыткаў і заробкаў.

"Можна замацаваць як абсалютную ісціну, — пісаў ён, — што кожны раз, як толькі нацыя дасягае высокага роўню развіцця і населенасці, гэта не можа не выклікаць адначасовага вялікага падзення прыбыткаў з капіталу і заробкаў; дыферэнцыяцыя рэнтаў, якія адпавядаюць землям пэўнай якасці, настолькі ж нязменная, як і дзеянне закону сілы цяжару"[4].

Такі аналіз, вядома, ствараў цяжкія праблемы для абаронцаў эканамічнага лібералізму. Неўзабаве з тымі ж праблемамі сутыкнуўся Рыкарда, але, перш чым разглядаць пог-

---

[1] *Ibid., p. 38.*

[2] *Ibid., p. 40.*

[3] *Ibid., p. 44.*

[4] *Ibid., pp. 22–23. Крыху далей у тым жа творы аўтар адмовіўся ад ідэі пра тое, што рост рэнты павінен знізіць заробкі.*

ляды гэтага аўтара, варта звярнуцца да ідэяў Жана Батыста Сэя, у якога Рыкарда запазычыў асобныя палажэнні.

Бібліяграфія

Існуе ўжо даволі старая біяграфія Т. Р. Мальтуса на ангельскай мове: L. Bonar. *Malthus and his work*, London, 1885; 2e éd., 1924. Дзіўна, але на працягу апошніх трох чвэрцяў стагоддзя не выдадзена ніводнага новага абагульняючага даследвання пра аўтара, які займае значнае месца ў гісторыі развіцця эканамічных ідэяў і постаць якога надзвычай цікавая...

Таксама вельмі шкада, што нядаўняе французскае выданне "Спробы стварэння закону аб народанаселенасці" (Paris, 1964) няпоўнае.

Зразумела, існуюць шматлікія старыя і навейшыя працы аб поглядах Мальтуса на праблемы народанаселенасці, у прыватнасці:

F. Passy, *Le principe de la population. Malthus et sa doctrine*, Paris, 1868.

E. Cossa, *Il principio di populazione di Tomaso Rob. Malthus*, Bologne, 1825.

J. Stassart, *Malthus et la population*, Liège, 1957.

J. Fréville, *L'épouvantail malthusien*, Paris, 1956.

J. Oser, *Must men starve? The malthusian controversy*, London, 1956.

K. Smith, *The malthusian controversy*, London, 1951.

L. Epsztein, *L'économie et la morale aux débuts du capitalisme industriel*, Paris, 1966.

Раздзел III

АПТЫМІЗМ ЖАНА БАТЫСТА СЭЯ

У 1789 г. Ж. Б. Сэй (1767—1832) быў службоўцам адной страхавой кампаніі ў Парыжы. Ён быў прыхільнікам новых ідэяў і ў 1792 г. добраахвотна запісаўся ў войска. У 1794 г. браў удзел у падрыхтоўцы выпуску выдання "Філасофская, літаратурная і палітычная дэкада". Стаўшы галоўным рэдактарам гэтага выдання, ён заслужыў вядомасць асабліва пасля з'яўлення ў 1803 г. ягонага *"Трактата па палітычнай эканоміі"*. Банапарт вымагаў ад Сэя падтрымкі сваёй эканамічнай палітыкі, якая цалкам супярэчыла лібералізму. Сэй адмовіўся, і на працягу ўсяго існавання Кансулату і імперыі яго творы не друкавалі. У гэты перыяд ён зацікавіўся прамысловасцю і заснаваў механічную прадзільную фабрыку. Неўзабаве ён ужо кіраваў буйной справай. Пасля падзення ўлады Напалеона Сэй зноў апынуўся у цэнтры увагі як эканаміст. Ён выкладаў ў Кансерваторыі мастацтваў і рамёстваў, а потым у Калеж дэ Франс.

§ 1. Тэорыя размеркавання

Сэй сам сябе ўважаў за паслядоўніка Эдама Сміта, але на практыцы адышоў ад тэорыі апошняга.

Сэй зыходзіў з ідэі, што вытворчасць ажыццяўляецца дзякуючы спалучэнню трох элементаў (трох чыннікаў вытворчасці, як прынята казаць), якімі ёсць праца, капітал і прыродныя рэсурсы. Сярод прыродных рэсурсаў толькі адзін, які з'яўляецца аб'ектам прыватнай уласнасці, г. зн. зямля, павінен прыцягваць увагу эканаміста, бо ўсе астатнія можна атрымаць бясплатна. Кожны з гэтых неабходных элементаў выступае прадукцыйнай паслугай уладальніку прадпрыемства, і той, хто робіць паслугі, атрымлівае ў аплату даход.

З гэтага часу аналіз стварэння даходаў набыў зусім новы змест. Стала лічыцца, што заробкі, працэнты па ўкладаннях і зямельная рэнта з'яўляюцца коштамі паслугаў і гэтыя кошты вызначаюцца на падставе попыту і прапановы на паслугі.

"Тыя, хто валодае адной з гэтых трох крыніцаў вытворчасці, ёсць прадаўцамі гэтага тавару, які мы назавем прадукцыйнымі паслугамі; спажыўцы гэтых паслугаў з'яўляюцца пакупнікамі, прадпрымальнікі вытворчай сферы з'яўляюцца, так бы мовіць, пасярэднікамі, якія аб'яўляюць пра неабходнасць прадукцыйных паслугаў для пэўнага тавару ў залежнасці ад попыту на яго. Земляроб, мануфактуршчык і купец увесь час параўноўваюць цану, якую спажывец хоча і можа заплаціць за нейкі тавар, з выдаткамі, неабходнымі для вытворчасці гэтага тавару; калі яны вырашаюць вырабляць гэты тавар, узнікае попыт на ўсе прадукцыйныя паслугі, якія трэба спалучыць, і гэтым яны ствараюць адну з асноваў вартасці гэтых паслугаў.

Апрача гэтага, суб'екты вытворчасці — людзі і рэчы, зямля, капітал і прадпрымальнікі — у большай ці меншай ступені прапаноўваюць сябе, і матывы, чаму яны гэта робяць, мы разгледзім у наступных раздзелах. Так ствараецца другі чыннік вартасці паслугі"[1].

Гэты аналіз мае на мэце паказаць, што ў ліберальным грамадстве кожны атрымлівае дакладную плату за ўнёсак у агульную справу. Такім чынам, лібералізм Сэя, як і Смітаў, знаходзіць тлумачэнне не толькі ў клопаце пра эфектыўнасць. Сэй грунтуе свой лібералізм на доказе супадзення натуральнага размеркавання рэсурсаў і сацыяльнай справядлівасці.

Напрыклад, рынкавыя заробкі ўяўляюць справядлівую аплату за паслугі працаўнікоў. Работнікам няма на што скардзіцца, тым больш што, паводле Сэя, няспынны рост беспрацоўя немагчымы згодна з законам народанаселенасці, сфармуляваным Мальтусам.

"Калі попыт на рабочых, — пісаў ён, — адстае ад прапановы паслугаў на рынку працы, дык заробкі апошніх падаюць ніжэй таго неабходнага роўню, дзякуючы якому клас беднякоў колькасна можа не змяншацца. Знікаюць сем'і, найбольш абцяжараныя колькасцю дзяцей і хваробамі: прапанова працы памяншаецца, а паколькі працы прапаноўваецца менш, яе кошт уздымаецца"[2].

Зразумела, сёння гэткі аналіз вызначэння заробку не паўтарыў бы ніводны ліберальны эканаміст. Тым не менш пераважна ў другой палове XIX ст. сістэма поглядаў Сэя была настолькі папулярная, што заслугоўвае абмеркавання.

Каб зразумець яе лепей, трэба ўлічваць, што Сэй вылучыў таксама тэорыю, згодна з якой вартасць тавараў скла-

[1] *Traité d'économie politique, nouv. éd., Paris, 1972, p. 354.*

[2] *Cours complet d'économie politique pratique, 2e éd., Paris, 1840, t. II, p. 47.*

даецца з сумы прыбыткаў і заробкаў, выдаткаваных у працэсе вытворчасці гэтых тавараў. У першым выданні свайго *"Трактата"* аўтар вылучыў гэтую тэорыю ў якасці фундаментальнага адказу на пытанне аб чынніках вартасці[1]. У наступных выданнях значнае месца адводзіцца тэзісу, што вартасць вызначаецца на падставе карыснасці тавараў. Аднак ад першапачатковай тэорыі аўтар не адмаўляўся, ён сцвярджаў, што канкурэнцыя вытворцаў паміж сабою выклікае зніжэнне кошту тавараў да роўню выдаткаў на іх вытворчасць, якія складаюцца з кошту ўсіх прадукцыйных паслугаў, патрэбных для стварэння гэтага тавару[2].

Згодна з канцэпцыяй Сэя, заробак, прыбытак з капіталу, плата за арэнду зямлі фіксуюцца *незалежна адно ад другога*, а кошты тавараў утвараюцца праз складанне ўсіх трох тыпаў выдаткаў у працэсе вытворчасці гэтых тавараў.

Падобная канцэпцыя надзвычай наіўная, бо яна проста не бярэ пад увагу тое, што зямельныя ўласнікі, капіталісты і найманыя рабочыя мусяць *дзяліць* паміж сабой сукупны прадукт, ды такім чынам, што даход адной з гэтых катэгорыяў не можа вызначацца незалежна ад даходаў дзвюх астатніх.

Дапусцім, што прыбыткі з капіталу і зямельная рэнта *дадзеныя загадзя*. Тады заробкі найманых рабочых вызначаюцца *ipso facto* (у сілу самога факта. — *Заўвага перакладніка*), бо ўяўляюць па сабе ўсё, што застаецца ад сукупнага даходу або ад чыстага сукупнага прадукту грамадства. Але немагчыма *ізалявана* разглядаць кожны "рынак" пэўнай катэгорыі "паслугаў", а таксама ўявіць, што на кожным рынку факт існавання раўнавагі паміж попытам і прапановаю фіксуе кошт, незалежны ад коштаў іншых "паслугаў".

Пад канец XIX ст. неакласічная тэорыя паспрабуе, пераймаючы погляды, блізкія Сэю, зрабіць іх больш прымальнымі праз вылучэнне ідэі пра *адначасовае* вызначэнне коштаў усіх разнастайных паслугаў і аб узаемадачыненнях гэ-

[1] *Traité, 1re éd., t. II, pp. 53–54.*
[2] *Traité, 3e éd., 1817, t. II, p. 8.*

тых коштаў. Дзякуючы гэтаму неакласікі ўнікнуць пярэчання, якое мы толькі што зрабілі Жану Батысту Сэю. Аднак тэорыя апошняга сутыкаецца з яшчэ адной нераадольнай для яго праблемай. Сапраўды, відавочна, што сістэма Сэя тлумачыць даходы толькі пры дапушчэнні, што дасягаецца поўнае выкарыстанне ўсіх чыннікаў вытворчасці, бо збалансаваны кошт кожнай паслугі — гэта кошт, пры якім прапанова паслугі роўная попыту на яе. Гэтае палажэнне руйнуе ўсю тэорыю, паколькі сёння нам дакладна вядома, што свабодны рынак не ліквідуе беспрацоўе аўтаматычна і зусім не гарантуе поўнага выкарыстання вытворчага абсталявання. Тэорыя размеркавання, якая замацоўвае ў якасці пастулата стопрацэнтнае выкарыстанне прадукцыйных сілаў, на практыцы памылковая.

Зрэшты, нельга сцвярджаць, што прыбытак — гэта кошт "прадукцыйных паслугаў капіталу", які вызначаецца на падставе закону попыту і прапановы, і з гэтае простае прычыны на найбольшую частку капіталу зусім "няма попыту". Капітал трапляе ў валоданне ўласнікаў прадпрыемстваў (кіраўнікоў прыватных прадпрыемстваў, акцыянераў, таварыстваў з абмежаванай адказнасцю) дзякуючы ашчаджанню, або ў спадчыну, або з дапамогаю таго, што мы сёння называем самафінансаваннем. "Рынак капіталу" закранае толькі пазыковыя аперацыі. Цэны, якія вызначаюцца на рынку, адлюстроўвае працэнтная стаўка, а не ровень прыбытку.

Пазней вучні Сэя вылучаць гіпотэзу, што ўвесь укладзены ў прадпрыемствы капітал узяты ў пазыку, блытаючы прыбытак з працэнтам ад капіталу, што ёсць памылкаю. Сам Сэй такой памылкі не рабіў. Ён прызнаваў, што "бадай заўсёды" прадпрымальнік валодае пэўным капіталам і скарыстоўвае з яго[1]. Каб быць больш блізкім да праўды, скажам, што пераважная частка капіталаў, інвеставаных у прадпрыемствы, заўсёды была ўласнасцю кіраўнікоў прадпрыемстваў.

[1] *Traité, 6e éd., 1841, t. I., p. 368.*

§ 2. Адмаўленне ад паняцця прадукцыйнай працы

Яшчэ ў адным пытанні Сэй заняў процілеглую ангельскай класічнай палітэканоміі пазіцыю. Ён адхіліў азначэнне прадукцыйнай працы, якая разглядалася Смітам у якасці працы, што ажыццяўляецца з мэтай вытворчасці матэрыяльных каштоўнасцяў.

Сэй сцвярджаў, што існуюць прадукты нематэрыяльнай сферы дзейнасці, якія бяруць удзел у абмене, напрыклад "дзейнасць доктара"[1]. І іх трэба паставіць на адзін ровень з матэрыяльнымі каштоўнасцямі.

Безумоўна, заўвага сама па сабе справядлівая. На жаль, Сэй робіць з гэтага выснову, што павінна знікнуць усялякае адрозненне паміж прадукцыйнай і непрадукцыйнай працай.

З дзейнасцю доктара, якая сапраўды ўдзельнічае ў абмене, ён атаясамліваў "дзейнасць адміністратара грамадскіх справаў"[2] і ў выніку спарадзіў страшэнную блытаніну, бо відавочна, што "дзейнасць чыноўніка" не ёсць аб'ектам абмену і што яна, безумоўна, не належыць да сферы вытворчасці нават у капіталістычнай эканоміцы.

Сэй падкрэсліваў: усе, хто "задавальняе сапраўдныя патрэбы наўзамен свайго заробку"[3], працуюць у прадукцыйнай сферы.

І ўдакладняў, што ў прадукцыйнай сферы працуюць

"вайсковец, які трымае сябе гатовым сустрэцца з ворагам у выпадку іншаземнай агрэсіі; чыноўнік, які прысвячае свой час і веды захаванню дзяржаўнай уласнасці, і г. д."[4]

Да якой блытаніны гэта прывяло, робіцца зразумела, калі аўтар закрануў пытанне аб "дзяржаўных выдатках"[5].

Філосаф заўважыў, што на падставе ягонае тэорыі можна прыйсці да высновы, што для насельніцтва не важна, колькі чыноўнікаў маецца, многа ці мала. Але ліберал не можа пагадзіцца з гэтым, таму Сэй мусіў звярнуцца да дзіўнае логікі:

---

[1] *Traité, nouv. éd., Paris, 1972, p. 122.*
[2] *Ibid.*
[3] *Cours complet d'économie politique, 2e éd., Paris, 1840, t. I, p. 91.*
[4] *Ibid., p. 91.*
[5] *Ibid., VIIe Partie, chap. XII.*

"На працягу доўгага часу існавала ўпэўненасць, — пісаў ён, — ды і зараз многія па-ранейшаму вераць у тое, што выдаткі дзяржавы нічога не каштуюць для грамадства, бо, калі яны каштуюць шмат, яны руйнуюць грамадства... Праўда, забеспячэнне бяспекі, якое ажыццяўляецца службай войска, — добрая рэч; гэтая добрая рэч вынікае са службы, якую войска здзяйсняе для грамадства, але не з выдаткаў, зробленых на гэтае войска..."[1]

Аўтар пісаў, што *выдаткі* на вайскоўцаў непрадукцыйныя, але не прыводзіў ніякіх доказаў, бо праца вайскоўцаў разглядалася ім у якасці прадукцыйнай.

Крыху далей Сэй заяўляў: "...калі ў дзень памятнай урачыстасці народу паказваюць спектаклі..., дык гэтыя выдаткі непрадукцыйныя. Калі ж, наадварот, такая сума выдаткаваная на будаўніцтва канала..., дык мелі месца прадукцыйныя выдаткі", бо "выдаткі, накіраваныя на будаўніцтва прыгожага гасцінца ці моста, прадукцыйныя з тае прычыны, што іхная вартасць не спажываецца ў той жа момант"[2].

Такім чынам, калі вырабляецца прадукт *доўгатэрміновага карыстання*, адбываецца сапраўдная вытворчасць, але яна не адбываецца, калі вырабляецца прадукт імгненнага спажывання, напрыклад (паводле Сэя) публічны спектакль. Але ў такім разе руйнуецца тэзіс аб прадуктах нематэрыяльнай вытворчасці. Відавочна, аўтар уваходзіць у супярэчнасць з самім сабой.

На самой справе Сэй знішчаў усялякія крытэры, якія дазвалялі б адрозніць сферу вытворчасці ад сферы агульнага кіравання грамадствам, чым пазбаўляў сябе магчымасці даць дакладны малюнак эканамічнага жыцця.

§ 3. Закон рынкаў збыту

Жан Батыст Сэй практычна ва ўсіх пытаннях стаў у апазіцыю ангельскім эканамістам, аднак па пытанні рынкаў збыту паразумеўся з асобнымі з іх, хоць і тут ягоныя погляды таксама вельмі спрэчныя.

"Трэба заўважыць, — пісаў Сэй, — што, як толькі завяршаецца вытворчасць нейкага тавару, ён адразу ж стварае рынак збыту для іншых тавараў на ўсю суму свайго кошту. Сапраўды, калі на апошняй стадыі вытворчасці вытворца стварыў тавар, дык яго найвялікшае жаданне —

[1] *Ibid., t. II, p. 250.*
[2] *Ibid., p. 252.*

прадаць гэты тавар, каб ягоная вартасць не марнавалася. Але ён не ў меншай ступені імкнецца пазбавіцца грошай, якія яму прынёс продаж гэтага тавару, каб грошы таксама не заставаліся ў бяздзеянні ў ягоных руках. А пазбаўляючыся сваіх грошай, ён абавязкова стварае попыт на нейкі іншы тавар. Такім чынам, відавочна, што сам факт вытворчасці нейкага тавару ў той жа самы момант адкрывае рынак збыту для іншых тавараў"[1].

Сэй ігнараваў існаванне тэндэнцыі да назапашвання скарбаў (тэзаўрацыі), значнасць якой мы зразумеем дзякуючы Кейнсу. Людзі не заўсёды імкнуцца *як мага хутчэй* пазбавіцца сваіх грошай. Наадварот, часам існуе імкненне да захавання, людзі чакаюць лепшых магчымасцяў для ўкладання, асабліва калі гаворка ідзе аб ашчаджаных сумах, прызначаных для інвестыцый. Але калі многія людзі хочуць прадаць, нічога адразу не набываючы, дык відавочна, што вынікне перавытворчасць.

Сэй не бачыў, што нават у тым выпадку, калі б не існавала тэндэнцыі да тэзаўрацыі, паўстане праблема, хто з вытворцаў *першы* возьме ініцыятыву развіцця вытворчасці.

Калі асобныя вытворцы намерваюцца прыцягнуць інвестыцыі і развіваць вытворчасць, дык гэта, без сумневу, павінна будзе стварыць даходы і рынкі збыту для іншых вытворцаў. Але хто першы наважыцца на павелічэнне сваёй вытворчасці, калі ў яго яшчэ не будзе ўпэўненасці ў рынках збыту? Тут паўстае асноватворная праблема *пачатку* росту і падтрымання пэўнага рытму росту, якую Сэй цалкам ігнараваў.

Ухіліўшыся ад разгляду дзвюх фундаментальных праблемаў — тэндэнцыі да тэзаўрацыі і пачатку росту, Сэй смела атакуе ідэю, вылучаную Смітам, пра тое, што замежны гандаль (у прыватнасці, гандаль з калоніямі) спрыяе індустрыяльнаму развіццю. На гэты конт ён пісаў:

"Лічыцца, што гандаль з замежжам станоўча ўплывае на развіццё нутраной вытворчасці, якая без гэтага не развівалася б. Але мы не павінны пераацэньваць гэтую перавагу.

Паводле афіцыйных дадзеных, сума нашага экспарту ніколі не падымалася вышэй за 400 мільёнаў... Наколькі ж маленькая гэтая сума, калі параўноўваць яе з агульнай сумай нашай вытворчасці...

[1] *Traité, nouv. éd., Paris, 1972, p. 145.*

Я ведаю, што замежны гандаль спрыяльны для асобных галінаў вытворчасці і што сярод апошніх ёсць нават такія, якія знаходзяць рынкі збыту толькі праз экспарт; але я не хачу, каб роля гэтага гандлю лічылася больш значнай, чым яна ёсць насамрэч. Хутчэй нутраная вытворчасць спрыяе замежнаму гандлю, чым наадварот, бо менавіта тады, калі мануфактуршчыкі здольныя вырабляць карысныя тавары, якія каштуюць досыць танна, гандаль з лёгкасцю знаходзіць рынкі для іх продажу... І менавіта прадзільшчыкі і фабрыкі Манчэстэра найбольш паспрыялі развіццю ангельскага гандлю, чым ангельскі гандаль дапамог манчэстэрскім вытворчасцям"[1].

Такім чынам, Сэй аспрэчваў слушныя ідэі, выказаныя Смітам. Затое сістэматычна выкарыстоўваў дзеля абгрунтавання сваіх памылковых меркаванняў усё, што мог знайсці ў ангельскай палітэканоміі.

Тэорыя Мальтуса аб народанаселенасці служыла, як мы бачылі, доказам, што беспрацоўе не можа доўжыцца бясконца.

Ангельскія ж тэорыі аб наступствах зніжэння роўню прыбытку выкарыстоўваліся Сэем, каб засведчыць, што ніколі капіталу не можа быць занадта.

"Па меры таго, — пісаў ён, — як павялічваюцца капіталы, іхныя ўладальнікі атрымліваюць з іх усё меншы працэнт, у выніку ўсё слабее стымул, які вядзе ўладальнікаў да ўкладання капіталаў у эканоміку дзеля памнажэння іх"[2].

Такім чынам, новая палітычная эканомія мела на мэце прапанаваць гарманічнае бачанне грамадскага ладу, што існаваў. Таму погляды Сэя знайшлі паслядоўнікаў, з якіх найбольш вядомымі сталі ў ЗША Кэры (*"Гармонія інтарэсаў"*, 1850) і ў Францыі Фрэдэрык Баст'я (*"Эканамічныя гармоніі"*, 1850).

Бібліяграфія

Пытаннем, якое займала найгалоўнае месца ў творчасці Жана Батыста Сэя, ёсць славуты "закон рынкаў збыту". На гэты конт можна перш за ўсё прачытаць доктарскую дысертацыю па праву C. E. Meunier, *Essai sur la loi des débouchés de Jean-Baptiste Say*, Toulouse, 1942. Але больш дакладныя і пранікнёныя (хоць часам і спрэчныя) думкі прапануе

[1] *Cours complet, 1, pp. 327–328.*

[2] *Ibid., II, p. 86.*

бліскучая дысертацыя A. Paquet, *Le conflit historique entre la loi des débouchés et le principe de la demande effective*, Paris, 1952. Па праблеме паходжання "закону" варта прачытаць надзвычай глыбокі артыкул P. Lambert, La loi des débouchés avant J.-B. Say et la controverse Say-Malthus, *Revue d'Economie politique*, 1952.

Раздзел IV

ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ РЫКАРДА

Дэйвід Рыкарда (1772—1823) быў сынам габрайскага банкіра, які эміграваў з Галяндыі ў Ангельшчыну. З чатырнаццацігадовага ўзросту Дэйвід рабіў у банку свайго бацькі, а потым у 22 гады пачаў працаваць самастойна ў якасці маклера. Пасля вяселля Рыкарда парваў з сям'ёй і ўвайшоў у грамаду квакераў. Смела і ўдала спекулюючы, ён здолеў сабраць немалое багацце і ў 1814 г. пакінуў бізнес. Рыкарда быў вялікі аматар прыродазнаўчых навукаў, у прыватнасці геалогіі. Каб стаць членам парламента, набыў неабходны маёнтак (1819). У парламенце ён да самай смерці карыстаўся вялікай павагай.

Галоўны яго твор быў напісаны ў 1817 г. і меў назоў *"Прынцыпы палітычнай эканоміі і падаткаабкладання"*.

§ 1. Першыя эканамічныя працы

Рыкарда стаў эканамістам праз пошукі развязання практычных пытанняў.

Адной з найвялікшых эканамічных праблемаў у Ангельшчыне пад час вайны супраць Францыі была *інфляцыя* — абясцэньванне банкаўскіх білетаў і рост кошту золата.

У верасні 1809 г. Рыкарда накіраваў у газету "Морнінг кронікл" тры лісты наконт кошту золата, рост якога тлумачыў празмернай эмісіяй банкаўскіх білетаў. Афіцыйны Камітэт па справах грашовага абарачэння (Bullion Committee) пагадзіўся з яго поглядамі, але, нягледзячы на гэта, Рыкарда апынуўся пад агнём крытыкі. У 1811 г. ён апублікаваў свой першы твор *"Адказ на практычныя заўвагі пана Басанкета пра даклад Bullion Committee"*. Менавіта дыскусія пра кошты прывяла яго да паглыблення даследванняў вартасці прадуктаў.

Крыху пазней Рыкарда ўзяў удзел у дыскусіі аб гандлі збожжам — апублікаваў *"Нарыс пра ўплыў нізкага кошту збожжа"* (1815). Ён пагадзіўся з поглядамі Мальтуса аб рэнце, але зрабіў з іх супрацьлеглыя высновы. Рыкарда казаў: калі рост багацця выклікае тэндэнцыю да ўздыму

цаны на збожжа і павелічэння рэнты, дык трэба супрацьстаяць гэтай тэндэнцыі праз дазвол на імпарт замежнага збожжа.

Відавочна, што Рыкарда абараняў інтарэсы не зямельных уласнікаў, як гэта рабіў Мальтус, а прамыславікоў, зацікаўленых у паніжэнні цаны на збожжа, бо гэта дазваляла знізіць заробкі рабочых. Значная тэма, якая ад гэтага часу будзе цікавіць Рыкарда, — паказаць процілегласць інтарэсаў капіталістаў і зямельных уласнікаў з мэтай абароны перад грамадскай думкай і парламентам зверхнасці інтарэсаў капіталістаў.

У прадмове да першага выдання *"Прынцыпаў"* Рыкарда заяўляў, што ягоная галоўная мэта — тлумачэнне, якім чынам нацыянальны прадукт падзяляецца паміж трыма класамі грамадства: зямельнымі ўласнікамі, уладальнікамі капіталаў і працоўнымі[1].

"Вызначыць законы, якія кіруюць гэтым размеркаваннем, — пісаў ён, — вось галоўная праблема палітычнай эканоміі"[2].

Карацей, Рыкарда ставіў за мэту вызначыць, на якую частку нацыянальнага прадукту можа законна прэтэндаваць той ці іншы клас, а таксама паказаць складаную барацьбу інтарэсаў у грамадстве. Параўнальна з намерамі фізіякратаў і Эдама Сміта, якія імкнуліся найперш вызначыць умовы ўзбагачэння нацыі, можа падацца, што ў дадзеным выпадку мы маем справу з выразнай зменай накіраванасці, аднак мы ўбачым, што Рыкарда зусім не пазбягае праблемы, узнятай папярэднікамі. Ён адразу скарыстоўвае з свайго аналізу размеркавання даходаў пры фармуляванні тэорыі эканамічнага росту, і трэба сказаць, што аналіз размеркавання даходаў быў найбольш прыдатны дзеля пабудовы гэтае тэорыі.

---

[1] *Варта сказаць, што аўтар усё яшчэ вызначаў нацыянальны прадукт праз дэфініцыю "прадукты зямлі" (Principes, trad. franç., Paris, 1970, p. 9) і выказваў намер разглядаць даходы ўладальнікаў фондаў або "капіталаў, неабходных для апрацоўкі зямлі", а таксама даходы "працоўных, якія яе апрацоўваюць". Гэткія тэрміны, на яго думку, добра падкрэслівалі тое асноватворнае значэнне, якое мае сельскагаспадарчая вытворчасць. Аднак на старонках твора аўтар у асноўным разглядаў прыбыткі і заробкі ў прамысловасці.*

[2] *Op. cit., p. 9.*

§ 2. Тэорыя вартасці і размеркавання

Выхад *"Прынцыпаў палітычнай эканоміі і падаткаабкладання"* — важны этап у гісторыі развіцця эканамічнай навукі. Надзелены магутнай здольнасцю да сінтэзу, Рыкарда імкнуўся на глебе даследванняў Сміта дакладна сфармуляваць натуральныя законы, якія кіруюць эканамічнымі дачыненнямі паміж людзьмі. І сапраўды, шмат у якіх пунктах погляды Рыкарда глыбейшыя за Смітавы. На працягу пяцідзесяці гадоў Рыкарда, прынамсі ў Англельшчыне, карыстаўся вялікай пашанай, і пад час гэтага перыяду не было зробленае ніводнае значнае адкрыццё, якое ўзбагаціла б эканамічную навуку.

Як і Сміт, Рыкарда ставіў на мэце ўдакладніць умовы эканамічнага росту нацыяў, але лічыў, што дзеля гэтага трэба спачатку прааналізаваць працэс цэнаўтварэння.

Каб патлумачыць умовы развіцця эканомікі, аўтар найперш звярнуўся да пытання назапашвання капіталу, а яно залежыць ад роўню прыбыткаў з капіталу. Калі не браць пад увагу зямельную рэнту, дык прыбытак — гэта розніца паміж цаной продажу і сабекоштам. На нацыянальным роўні сабекошт *чыстага* прадукту — гэта сума заробкаў. Такім чынам, дзеля тлумачэння прыбытку неабходна ведаць:

1) законы, якія вызначаюць ровень заробкаў;

2) законы, якія вызначаюць цану продажу тавараў.

Але адрозна ад Сэя Рыкарда тлумачыць цэны не толькі праз закон попыту і прапановы, бо "рынкавыя цэны", вызначаныя пры ўмове роўнасці попыту і прапановы, вельмі зменлівыя. Як і Сміт, Рыкарда зыходзіў з нармальнай, або натуральнай, цаны на тавары, вакол якой вагаецца рынкавая цана.

Рыкарда лічыў, што пры тлумачэнні нармальнай цаны не існуе іншага сродку, чым паспрабаваць выказаць яе праз колькасць працы, што змяшчаецца ў тавары[1].

---

[1] *Можна было б нават сказаць, што нармальная цана — гэта тая, якая прадугледжвае нармальны памер прыбытку. У выніку атрымліваецца, што нармальная цана залежыць ад размеркавання нацыянальнага даходу. Але Рыкарда лічыў, што гэта немагчыма, паколькі гаворка ідзе пра тое, каб тлумачыць размеркаванне, абапіраючыся на паняцце нармальнай цаны. Калі казаць, што цана нармальная, калі нармальны прыбы-*

Адрозна ад Сміта Рыкарда трымаўся канцэпцыі, якая тлумачыла вартасць тавараў праз колькасць працы, неабходнай для іх вытворчасці, і сцвярджаў, што гэты закон належыць не толькі да першабытнай эпохі, пра што казаў Сміт, але і да сучаснай эпохі.

Аўтар дакладна адрозніваў багацце, гэта значыць тыя рэчы, якія з'яўляюцца "неабходнымі, карыснымі або прыемнымі", ад вартасці, якая "залежыць не ад наяўнасці ў вялікай колькасці, а ад цяжкасці ці лёгкасці вытворчасці"[1].

Каб даказаць факт залежнасці вартасці тавараў ад выдаткаў працы, Рыкарда прапанаваў разгледзець ваганні цаны рэчаў.

"Калі менавіта пэўная колькасць працы ў нейкай рэчы вызначае яе менавую вартасць, дык з гэтага вынікае, што ўсялякае павелічэнне колькасці такой працы абавязковым чынам павінна павялічыць вартасць рэчы, дзеля вытворчасці якой была выкарыстаная гэтая праца; гэтаксама і ўсялякае памяншэнне колькасці працы павінна змяншаць кошт рэчы"[2].

Між іншым, Рыкарда канстатаваў, што прааналізаваць ваганні цэнаў няпроста, бо цана тавару — гэта пэўная колькасць грошай, а ваганне вартасці саміх грошай можа, прыводзячы да змянення цэнаў, зрабіць немагчымым разгляд уздзеяння ваганняў на колькасць неабходнай дзеля вытворчасці тавараў працы.

Дык што, наагул адмовіцца ад пошуку доказаў таго, што вартасць нейкага тавару вызначаецца на падставе выдаткаў працы? Не, адказваў аўтар, бо вартасць саміх грошай вызначаецца праз колькасць працы, неабходнай дзеля вытворчасці металу, з якога ў сваю чаргу вырабляюцца манеты. Такім чынам, цана нейкага тавару А на практыцы выражае стасунак паміж колькасцю працы, неабходнай дзеля вытворчасці тавару А, і колькасцю працы, неабходнай дзеля вытворчасці грашовай адзінкі.

Калі мы пазначым праз P_A цану тавару А, Q_A — выдаткі

так, дык мы трапім у тупік, паколькі нармальны прыбытак — гэта розніца паміж нармальнай цаной і выдаткамі.

[1] *Op. cit., p. 218.*

[2] *Ibid., p. 15.*

працы, неабходнай для вытворчасці A, а Q_m — выдаткі працы па вытворчасці грошай, дык атрымаем:

$$P_A = Q_A/Q_m.$$

Калі вытворчасць аднаго франка вымагае 10 гадзінаў працы (Q_m=10), а на вытворчасць аднаго крэсла патрэбна 100 гадзінаў працы (Q_A=100), дык нармальная цана крэсла пры ўмове, што нішто не перашкодзіць дзеянню закону вартасці, будзе складаць 10 франкаў (Q_A/Q_m=10).

Абапіраючыся на формулу такога кшталту (якую сам Рыкарда не выкарыстоўваў, але яна вынікае з ягонага аналізу), можна ўдакладніць, што P_A павялічваецца, калі павялічваецца Q_A, пры ўмове, што Q_m застаецца нязменным. Калі Q_m мяняецца, дык змена P_A будзе прапарцыйная змене стасунку Q_A/Q_m.

Калі дапусціць, што грошы папяровыя і не канверсуюцца ў золата, дык выведзены закон будзе мець сілу, бо вартасць грошай памяншаецца прапарцыйна павелічэнню іх колькасці ў абарачэнні з прычыны, што вартасць папяровых грошай роўная вартасці той колькасці металу, якую гэтыя грошы замяняюць, і такая колькасць металу будзе тым меншай, чым больш будзе грошай у абарачэнні[1].

Такім чынам, Рыкарда лічыў, што ён заклаў прынцып тлумачэння глабальнай эвалюцыі цэнаў тавараў (а не іхных выпадковых і кароткатэрміновых ваганняў, якія залежаць ад тысячы разнастайных чыннікаў). У яго эпоху яшчэ не існавала дастаткова дакладных статыстычных дадзеных (індэксаў цэнаў), якія дазволілі б па-сапраўднаму выкарыстаць гэткім чынам адкрыты закон. Пазней, у першай палове XX ст., калі такія дадзеныя ўжо існавалі, эканамісты найчасцей адхілялі тэорыю вартасці Рыкарда. Яны тлумачылі агульную эвалюцыю цэнаў праз ваганні рытму здабычы каштоўных металаў

[1] *Cf. Principes, chap. XXVII. Само па сабе гэта не азначае, што прычынай росту цэнаў пры папяровых грошах з'яўляецца павелічэнне колькасці грошай у абарачэнні. Рыкарда абараняў гэты тэзіс у сваіх першых творах, падтрымліваючы, такім чынам, "колькасную тэорыю грошай"; але ў сапраўднасці меркаванне, якое мы зараз пераказваем, не залежыць ад гэтай тэорыі. Можна дапусціць: колькасць грошай павялічваецца таму, што папярэдне ўзняліся кошты; нягледзячы на гэта, можна канстатаваць, што вартасць неканверсаваных папяровых грошай адваротна прапарцыйная той колькасці грошай, якія знаходзяцца на руках насельніцтва.*

(што не адпавядае тэзісу Рыкарда)[1] або праз ваганні колькасці тэхнічных вынаходак[2], але, прынамсі, існаванне самога феномену не адмаўлялі[3]. Варта дадаць, што пачынаючы з 1914 г. канверсаванасць асноўных валютаў настолькі часта скасоўвалася, што ўплыў стасункаў паміж вартасцю тавараў і вартасцю каштоўных металаў на эвалюцыю цэнаў быў у значнай ступені замаскіраваны з прычыны ўздзеяння цэлага шэрагу іншых чыннікаў, якія спарадзілі значнае абясцэньванне асноўных сусветных валютаў.

Сапраўды, тлумачэнне Рыкарда выклікае пэўны інтарэс. Яно палягае ў тым, каб узгадніць доўгатэрміновую эвалюцыю цэнаў з ваганнямі прадукцыйнасці працы ў асобнай краіне (або ў асобнай галіне эканамічнай дзейнасці) стасоўна прадукцыйнасці працы ў золатаздабыўнай прамысловасці. Дарэчы, да вельмі блізкай высновы прыйшоў у нашы дні даследнік Жан Фураст'е ў выніку стараннага вывучэння эвалюцыі цэнаў ад пачатку XIX ст.[4]

Тэорыя вартасці, якую Рыкарда паклаў у аснову свайго тлумачэння глабальнай эвалюцыі цэнаў, не настолькі спрошчаная, як гэта часам сцвярджалася. Аўтар *"Прынцыпаў"* намагаўся абгрунтаваць значэнне свайго тэзіса і адказаць на крытыку.

Перш за ўсё, казаў ён, выдаткі працы не адпавядаюць вартасці, калі мы маем справу з таварамі, якія вырабляюцца людзьмі ў абмежаванай колькасці. Не тлумачыцца ж вартасць твора мастацтва праз выдаткі працы! Такім чынам, пры жаданні можна знайсці хібы ў Рыкардавай тэорыі вартасці. Падобная абмежаванасць не настолькі важная, бо ў рэчаіснасці праблемы, якія імкнецца развязаць палітычная эканомія, датычаць з'яваў, што знаходзяцца ў сферы вытворчасці і размеркавання тавараў, "выраб якіх можа ўзнаўляцца"[5].

---

[1] *Гл. Simiand. Le salaire, l'évolution sociale et la monnaie, Paris, 1932.*

[2] *Гл. J. Schumpeter, Business Cycles, New York, 1939.*

[3] *Гл. B. Nogaro, La monnaie et les phénomènes monétaires contemporains, Paris, 1935.*

[4] *Documents pour l'histoire et la théorie les prix, Paris, 1958–1961.*

[5] *"Існуюць рэчы, вартасць якіх залежыць толькі ад іхнае рэдкаснасці. Паколькі ніякая праца не можа павялічыць колькасці такіх рэчаў, іхная вартасць не можа паменшыцца ад таго, што іх будзе болей. Да такіх тавараў належаць карціны, статуі, рэдкія кнігі і медалі, віны выключнай якасці...* Зрэшты, яны складаюць толькі вельмі маленькую

Рыкарда яшчэ ўдакладняў, што праца, неабходная дзеля вытворчасці нейкага тавару, улучае таксама працу па вытворчасці неабходнага "абсталявання, машынаў і будынкаў".

Дарэчы, Рыкарда, як і Эдам Сміт, дапускаў, што да вызначэння вартасці тавару спрычыняецца таксама якасць працы работніка, а не толькі час, патрэбны на яго вытворчасць. На ягоную думку, праца рознай якасці аплочваецца па-рознаму, а створаная гэтай працай вартасць прапарцыйная аплаце:

"Калі працоўны дзень рабочага ў ювелірнай справе каштуе больш, чым звычайнага рабочага, дык гэтая здаўна прызнаная і вызначаная прапорцыя захоўвае сваё месца ў сістэме вартасцяў"[1].

Нарэшце, Рыкарда закрануў складанасць, якая змусіла Сміта практычна адмовіцца ад тлумачэння рэальных коштаў на тавары на падставе выдаткаў працы на іх вытворчасць. Прыбыткі з капіталу складаюць частку цаны тавараў, і, як паказаў Сміт, яны, як правіла, прапарцыйныя суме капіталаў, неабходных дзеля вытворчасці кожнага тавару (ровень прыбытку, або стасунак прыбытку да капіталу, мае тэндэнцыю быць аднолькавым ва ўсіх галінах). Такім чынам, калі не ўлічваць зямельнай рэнты, цана тавару складаецца, з аднаго боку, з заробкаў, прапарцыйных працоўным выдаткам, і, з другога боку, з прыбыткаў, прапарцыйных колькасці капіталу, неабходнага дзеля вытворчасці. У выніку нельга сказаць, што вартасць тавару прапарцыйная толькі выдаткам працы, неабходнай для яго вытворчасці.

Рыкарда разумеў гэта і пісаў:

"...розныя памеры сталага і абаротнага капіталу ў розных галінах вытворчасці істотна змяняюць правіла, якое мела сілу ў часы, калі вытворчасць патрабавала толькі працы"[2].

Аднак, нягледзячы на гэта, дадаваў ён, пры тлумачэнні

частку тавараў, *якія штодня бяруць удзел у абмене...; а калі мы вядзём гаворку аб таварах, аб іхнай менавай вартасці і прынцыпах, якія рэгулююць іхныя рэлятыўныя кошты, дык маем на ўвазе толькі тыя тавары, колькасць якіх можа павялічвацца ў выніку чалавечай дзейнасці" (Principes, op. cit., p. 14).*

[1] *Ibid., p. 21.*

[2] *Ibid., p. 34.*

сучасных з'яваў гэтае правіла захоўвае перавагу ў якасці першага, агульнага падыходу.

У раздзеле, прысвечаным вартасці, найвялікшым клопатам Рыкарда было паказаць, што эвалюцыя цэнаў залежыць ад ваганняў сабекошту тавараў, а не ад змены заробкаў найманых рабочых. Менавіта гэта здавалася яму асноўным, калі ён аналізаваў размеркаванне нацыянальнага даходу. Але калі ўлічваць уплыў на цану памеру капіталу, выкарыстанага ў вытворчасці кожнага тавару, дык прапанаваны тэзіс не абавязкова слушны. Далей Рыкарда абмяжоўваўся заўвагаю, што тлумачэнне менавай вартасці на падставе выдаткаў працы толькі *прыблізна* слушнае.

Напрыклад, ён заяўляў, што,

"пералічваючы чыннікі, якія ўплываюць на змену вартасці тавараў, было б, безумоўна, памылкаю не звяртаць увагі на ваганні заробкаў; але таксама было б памылкаю аддаваць ім занадта вялікую ўвагу. Менавіта таму я, улічваючы ў маім творы такі ўплыў, буду, аднак, разглядаць больш важкія змены, якія адбываюцца з адноснай вартасцю тавараў у выніку змянення колькасці працы, неабходнай дзеля іхнае вытворчасці"[1].

Пазіцыя аўтара *"Прынцыпаў"* вылучаецца шчырасцю, паколькі ён дапускае, што шматлікія з'явы могуць апынуцца ў супярэчнасці з тым, што ён разглядаў у якасці ўсеагульнага закону. Мы можам ухваліць гэтую шчырасць, але нельга не прызнаць, што спроба абумовіць вартасць памерамі прыбыткаў з капіталу, а не колькасцю ўкладзенае працы змяншае значэнне закону, сфармуляванага Рыкарда. Мы прасочым, якім чынам Маркс паспрабаваў развязаць гэтую супярэчнасць.

§ 3. Тэорыя размеркавання

Распрацоўка тэорыі вартасці прывяла Рыкарда да даследвання зямельнай рэнты. Паводле яго ўласных заяваў, ён абапіраўся на два творы: даследванне Мальтуса, якое апошні ў 1815 г. прысвяціў пытанню рэнты, і на ананімную працу, выдадзеную ў тым жа годзе і прысвечаную выкарыстанню капіталу ў сельскай гаспадарцы[2].

[1] *Ibid., p. 27.*
[2] *Ibid., p. 9*

Грунтуючыся на гэтых творах, Рыкарда дапускаў, што нармальная цана нейкага тавару (пераблытаная тут з менавай вартасцю) роўная гранічным выдаткам гэтага тавару.

"Менавая вартасць нейкага прадукту, — пісаў ён, — ці то прадукту мануфактуры, шахты або зямлі, ніколі не вызначаецца па мінімальна магчымай колькасці працы, неабходнай дзеля яго вытворчасці пры выключна спрыяльных абставінах, наадварот, гэтая вартасць вызначаецца па максімальнай колькасці працы, якую павінны прыкладаць тыя, хто працуе ў цяжкіх умовах, хто мусіць змагацца супраць самых неспрыяльных абставінаў"[1].

Рыкарда надаваў прынцыпу "продажу па гранічным сабекошце" вельмі агульнае значэнне. Яго пазіцыю цяжка абараняць, паколькі ў тым, што датычыць тавараў "мануфактураў", тэндэнцыя да раўнання роўняў прыбытку прыводзіць да таго, што няўдалыя прадпрыемствы паступова знікаюць; такім чынам, нельга разглядаць сабекошт іхнае прадукцыі ў якасці асновы вызначэння цэнаў. І наадварот, дадзены прынцып апраўданы для сельскагаспадарчых прадуктаў і прадукцыі здабыўнай прамысловасці. Дарэчы, менавіта для гэтых галінаў Рыкарда і прапанаваў свой прынцып.

Ягоны тэзіс блізкі да ідэі Мальтуса. Паколькі, казаў ён, на розных ці па-рознаму апрацаваных землях сабекошты збожжа ці нейкага іншага прадукту атрымліваюцца розныя і цана продажу тавару адпавядае самым высокім выдаткам працы, уласнікі зямлі, на апрацоўку якой трэба меншыя выдаткі, патрабуюць ад арандатараў, каб апошнія плацілі ім у якасці арэнднай платы суму, што адпавядае розніцы паміж сапраўдным і гранічным сабекоштам прадукцыі.

Рыкарда імкнуўся развіць свой аналіз і сцвярджаў, што рэнта, якая выплочваецца ўласніку, павінна быць такая, каб арандатар атрымліваў у якасці прыбытку толькі суму, неабходную дзеля аплаты ўкладзеных ім капіталаў па "нармальным" працэнце. Тут мы сапраўды маем дакладны пункт адліку для ўсялякага слушнага аналізу вызначэння арэнднай платы за зямлю.

[1] *Ibid., pp. 49–50.*

Тая частка нацыянальнага даходу, якая належыць зямельным уласнікам, галоўным чынам залежыць ад дыферэнцыяцыі ўмоваў сельскагаспадарчай вытворчасці па глебах, ці, як мы сказалі б сёння, ад тэхнічнай структуры сельскагаспадарчай вытворчасці. Пасля вылічэння гэтай першай часткі застаюцца дзве: заробкі найманых рабочых і прыбыткі ўладальнікаў капіталаў. Дзеля поўнага развязання праблемы размеркавання нацыянальнага даходу дастаткова паказаць, якім чынам вызначаецца памер адной ці другой з гэтых дзвюх частак. Рыкарда лічыў, што мэтазгодна прааналізаваць чыннікі вызначэння заробкаў.

Аўтар *"Прынцыпаў"* тлумачыў заробак найманых рабочых праз працу, якая разглядаецца ў якасці тавару, на падставе закладзенага Смітам адрознення паміж пабежнай цаной, якая вызначаецца попытам і прапановай, і натуральнай, або нармальнай, цаной, што вызначаецца больш істотнымі фактарамі.

"Натуральная цана працы, — пісаў ён, — гэта сума, якая ў асноўным забяспечвае рабочых сродкамі існавання і сродкамі, каб яны маглі забяспечыць працяг свайго роду, не павялічваючы яго і не памяншаючы"[1].

Такім чынам, гэта сума, неабходная дзеля падтрымання і аднаўлення наяўнага "запасу працоўнай сілы".

"Было б памылкаю лічыць, — разважаў Рыкарда, — што натуральная цана працы заўсёды аднолькавая і нязменная...; яна мяняецца ў розныя перыяды ў адной і той жа краіне і вельмі адрозніваецца ў розных краінах. Гэта галоўным чынам залежыць ад нораваў і звычаяў народа"[2].

Заклаўшы прынцып зменлівасці натуральнага заробку, Рыкарда коратка, але цвёрда зазначаў, што *натуральны* заробак мае тэндэнцыю да павелічэння, і прапаноўваў яе тлумачэнне.

"Шмат рэчаў, — пісаў ён, — складаюць сёння дабрабыт ангельскага селяніна, але гэтыя рэчы разглядаліся б як прадметы раскошы ў аддаленыя часы нашай гісторыі.

Паколькі прагрэс грамадства ўвесь час забяспечвае зніжэнне цэнаў на вырабы мануфактураў і павелічэнне цаны на сыравіну, дык з цягам часу ствараецца такая дыспрапорцыя ў іхнай адноснай вартасці, што работнік у заможных краінах можа, ахвяраваўшы невялікай колькасцю харчу, задаволіць іншыя свае патрэбы"[3].

[1] *Op. cit., p. 67.*
[2] *Ibid., p. 70.*
[3] *Ibid.*

Гэта вельмі дакладны аналіз, ён, без сумневу, дае ключ да разумення праблемы эвалюцыі заробкаў у заходнім свеце пачынаючы з сярэдзіны XIX ст. і да нашых дзён. Але Рыкарда не развіваў далей гэтую тэму. Фактычна ў *тагачасную эпоху* ў Ангельшчыне адбывалася не паляпшэнне становішча рабочых, а, наадварот, пагаршэнне. Менавіта гэтаму найперш трэба было даць тлумачэнне. Згодна з аўтарам *"Прынцыпаў"*, тлумачэнне можна знайсці, калі ўлічыць, што пабежны кошт працы можа адрознівацца ад натуральнага кошту: ён пераўзыходзіць натуральны, калі павелічэнне попыту на працу адбываецца хутчэй за павелічэнне прапановы; у адваротным выпадку ён адстае. На думку Рыкарда, мела месца менавіта другая сітуацыя.

"Пры натуральным развіцці грамадстваў заробкі будуць мець тэндэнцыю да зніжэння, калі вызначаць іх на падставе попыту і прапановы, бо колькасць рабочых будзе працягваць расці ў крыху большай прагрэсіі, чым павелічэнне попыту на іх"[1].

Тут прасочваецца ўплыў высноваў Мальтуса, з якімі Рыкарда цалкам пагаджаўся. Гэтаксама як яго папярэднік і па той самай прычыне, ён рашуча выказваўся супраць дапамогі беднякам.

"Бясспрэчна, — пісаў ён, — заможнасць і дабрабыт беднякоў могуць быць забяспечаныя толькі тады, калі яны самі будуць імкнуцца да таго або калі заканадаўства змусіць іх паменшыць колькасць шлюбаў паміж незаможнымі, беднымі маладымі людзьмі"[2].

Такое меркаванне (зрэшты, яно не прапаноўвала ніякага іншага сродку барацьбы супраць перанаселенасці, апрача позняга шлюбу) адпавядала поглядам Мальтуса. Тым не менш мы не знойдзем у Рыкарда Мальтусавых ідэяў пра абавязковую ролю галечы як сродку заахвоціць людзей да жыццёвай асцярожнасці. Зразумела, аналіз Рыкарда занадта абмежаваны, у ім не ўлічваецца ўся сукупнасць разнастайных (палітычных, рэлігійных) чыннікаў, якія кіруюць дэмаграфічным развіццём, аднак эканаміст, здаецца, не падзяляў змрочнага Мальтусава погляду на чалавецтва, частка якога змушаная жыць у зямным пекле.

Паколькі заробкі найманых рабочых вызначаюцца пэў-

[1] *Ibid., p. 72.*
[2] *Ibid., p. 78.*

нымі натуральнымі законамі, развязанае пытанне размеркавання даходаў. Сапраўды, прыбыткі — гэта тое, што застаецца ў капіталістаў пасля таго, як выплачаныя рэнты і заробкі. *Няма патрэбы вынаходзіць закон ці законы вызначэння памеру прыбыткаў*, можна абмежавацца сцверджаннем, што паколькі рэнта фіксуецца, дык прыбыткі будуць тым большыя, чым меншыя заробкі.

"Сукупная вартасць іх прадукцыі, — пісаў Рыкарда, ведучы гаворку пра прадукцыю арандатараў і мануфактуршчыкаў, — падзяляецца толькі на дзве часткі, адна складае прыбыткі з капіталу, а другая ідзе на аплату заробкаў найманых рабочых... Калі дапусціць, што збожжа і мануфактурныя вырабы заўсёды прадаюцца па адной і той жа цане, дык прыбыткі заўсёды будуць высокія або нізкія ў залежнасці ад павелічэння або памяншэння заробкаў"[1].

§ 4. Праблемы замежнага гандлю

Адзін з найбольш вядомых аспектаў творчасці Дэйвіда Рыкарда — ягоны ўнёсак у аналіз міжнароднага гандлю. Хоць у гэтым, як і ў іншых, аспекце сваёй працы аўтар *"Прынцыпаў"* абапіраўся на творы папярэднікаў[2], аднак відавочна, што тут ягоны геній дэдукцыі дастасаваўся вельмі плённа. Гэта не азначае, што высновы Рыкарда заўсёды слушныя. Наадварот, мы пабачым, што яны часцей за ўсё вельмі крытыкаваліся.

А) Тэорыя параўнальных перавагаў

Найперш аўтар сфармуляваў так званы закон "параўнальных перавагаў", згодна з якім кожная краіна прадае іншым краінам тавары, параўнальныя выдаткі якіх на радзіме ніжэйшыя, чым за мяжой, і набывае ў замежжы тавары, параўнальныя выдаткі якіх у сваёй краіне вышэйшыя. Для доказу прымаецца гіпотэза аб прапарцыйнасці цэнаў і колькасці працы, неабходнай дзеля вытворчасці адзінкі кожнага тавару. Калі ў дзвюх краінах *a* і *b* працоўныя выдаткі на прадукты 1 і 2 абазначыць праз c_{a1}, c_{a2}, c_{b1}, c_{b2}, дык гандаль магчымы толькі тады, калі, напрыклад,

[1] *Ibid., p. 81.*

[2] *Гл. J. Viner, Studies in the theory of international trade, New York, 1937, pp. 440—444.*

$$c_{a1}/c_{a2} < c_{b1}/c_{b2}.$$

Краіна *a* спецыялізуецца ў вытворчасці тавару 1, бо параўнальныя выдаткі на вытворчасць тавару 1 для яе меншыя, чым для краіны *b*; з тае прычыны краіна *b* спецыялізуецца на вытворчасці тавару 2, паколькі відавочна, што

$$c_{b2}/c_{b1} < c_{a2}/c_{a1}.$$

Каб зразумець, якім чынам спецыялізацыя здзейсніцца сама па сабе, трэба сістэматызаваць цэны тавараў і прасачыць, як яны зменяцца ў залежнасці ад курсаў валютаў. У кожнай краіне цэны выражаюцца ў нацыянальнай валюце, але паколькі кожная нацыянальная валюта ўяўляе па сабе пэўную колькасць металу, які і ёсць асновай грашовых сістэмаў (дзеля спрашчэння мы дапускаем, што метал адзіны і той самы ў абедзвюх краінах), дык цэны таксама можна выразіць у каштоўным метале, напрыклад у золаце.

Прыняўшы гэта, можна сказаць, што, калі не звяртаць увагі на транспартныя выдаткі, цэны абодвух тавараў (p_1 і p_2) натуральным чынам зафіксуюцца на тых роўнях, якія існуюць:

$$c_{a1}/c_{a2} < p_1/p_2 < c_{b1}/c_{b2}. \qquad (1)$$

Сапраўды, у кожнай краіне цэны прапарцыйныя сабекошту. У выніку мы маем:

$$p_{a1}/p_{a2} < p_{b1}/p_{b2}.$$

Дапусцім, што на абодва тавары цэны больш нізкія ў краіне *a*. З гэтага вынікае, што краіна *b* набывае абодва гэтыя тавары ў краіне *a*. Золата пакідае межы краіны *b*, паколькі яе разліковы баланс з'яўляецца дэфіцытным, а цэны ў краіне *b* зніжаюцца, тым часам яны ўздымаюцца ў краіне *a*, якая атрымлівае золата. У пэўны момант p_{a2} перавышае p_{b2}, а p_{a1} усё яшчэ меншая, чым p_{b1} (бо стасункі цэнаў застаюцца роўнымі стасункам выдаткаў). Разліковы баланс можа ўраўнаважыцца, бо краіна *b* набывае тавар 1 у краіне *a*, а краіна *a* набывае тавар 2 у краіне *b*. Тады міжнародная цана тавару 1(p_1) будзе роўная p_{a1}, а міжнародная цана тавару 2(p_2) будзе роўная p_{b2}. Мы толькі што бачылі, што $p_{a1}<p_{b1}$ і $p_{a2}>p_{b2}$. У выніку $p_{a2}>p_2$, што дазваляе напісаць:

$$p_{a1}/p_{a2} < p_1/p_2 \text{ або } c_{a1}/c_{a2} < p_1/p_2.$$

Гэтак жа, але зыходзячы з гіпотэзы, што абодва кошты больш нізкія ў краіне b_1, даказваецца, што $p_1/p_2 < c_{b1}/c_{b2}$.

Рыкарда сцвярджае, што дзякуючы гандлю кожная краіна атрымлівае карысць.

Сапраўды, з няроўнасці (1) можна вывесці:

$$c_{a2} > c_{a1} \cdot (p_2/p_1).$$

Паколькі разліковы баланс паміж дзвюма краінамі павінен быць ураўнаважаны, мы маем $p_2q_2=p_1q_1$ (q_2 і q_1 — колькасць тавараў на абмене). У выніку мы маем:

$$c_{a2} > c_{a1} \cdot (q_1/q_2).$$

Гэта азначае, што сабекошт тавару 2 у краіне *a* больш высокі, чым сабекошт той колькасці тавару 1, які накіроўваецца за мяжу з мэтай атрымання адзінкі тавару 2. Такім чынам, можна сказаць, што, набываючы за мяжой тавар 2, краіна *a* ашчаджае частку працы.

Гэткім жа чынам можна напісаць:

$$c_{b1} > c_{b2} \cdot (p_1/p_2)$$

і гэтая няроўнасць паказвае, што краіна *b* ашчаджае частку працы, набываючы за мяжой тавар 1.

На падставе аналізу Рыкарда робіць выснову: палітыка свабоднага гандлю заўсёды выгадная для краіны, якая яго практыкуе. Але гэта непрымальная ідэя, бо цалкам ігнаруе тое, што выдаткі на вытворчасць мяняюцца, калі эканамічная структура краіны трансфармуецца. Калі ў нейкай краіне няма прамысловасці, а сабекошт прамысловых тавараў, выпрацаваных у гэтай краіне, параўнальна высокі, дык яна мае выгаду ў абароне сваіх маладых галінаў прамысловасці, бо паступова сабекошт гэтых вырабаў паменшыцца і краіна зможа забяспечыць сваё развіццё.

Б) Тэорыя аўтаматычнай раўнавагі разліковага балансу

Замацаванае Рыкарда вучэнне пра ўзаемную выгаду ў міжнародным гандлі неўзабаве стала ў Англіі адным з найважнейшых аргументаў на карысць палітыкі свабоднага гандлю. І менавіта Рыкарда даў самую крайнюю фармулёўку вучэння пра "аўтаматычную раўнавагу разліковага балансу", якое мы ўжо сустракалі ў многіх меркантылістаў[1].

Адпаведна з гэтым вучэннем усялякі дэфіцыт разлікова-

[1] *У прыватнасці, яно прысутнічала пачынаючы з 1720 г. у Ісака Жэрвэза. Погляды вучонага разглядаюцца ў кнізе J.-M. Letiche, Balance of payments and economic growth, New York, 1959 (chap. II). Шматлікія і дакладныя звесткі па гэтым пытанні ёсць ва ўжо цытаваным творы J. Viner.*

га балансу мае тэндэнцыю да знікнення сам па сабе ў выніку вагання цэнаў, якое і ў краіне з дэфіцытам, і ў краіне або краінах са станоўчым сальда гандлёвага балансу спараджаецца самім гэтым дэфіцытам. Рыкарда, які абараняў самую крайнюю трактоўку гэтай тэорыі, сцвярджаў, што ваганні цэнаў пры існаванні канверсаванай валюты выклікаюцца выключна адтокам каштоўнага металу, які пачынаецца, як толькі вэксальны курс дасягае "кропкі адтоку золата". Даследнік далучаецца (прынамсі, у невялікіх творах, прысвечаных пытанню аб грошах) да "колькаснай тэорыі грошай". Рыкарда казаў: чым менш у краіне каштоўнага металу, тым менш будзе грошай у абарачэнні, і цэны тады мусяць паніжацца, а гэта стымулюе экспарт і запавольвае імпарт. У краінах жа, у якія ідзе прыток золата, назіраюцца супрацьлеглыя з'явы. Такім чынам, змены, якія адбываюцца з памерамі тавараў і паслугаў, што абменьваюцца, аўтаматычна ліквідуюць дэфіцыт разліковага балансу краіны[1].

Гэтае вучэнне таксама ёсць важным аргументам для прыхільнікаў палітыкі свабоднага гандлю, бо дазваляе сцвярджаць, што ніякая краіна не павінна клапаціцца пра "штучнае" скарачэнне свайго імпарту дзеля таго, каб унікнуць небяспекі, якую ўяўляе для функцыянавання ейнай грашовай сістэмы неабмежаваны адток каштоўных металаў.

Паколькі раўнавага плацежнага балансу мусіць заўжды ўсталёўвацца сама па сабе, прынцып "laissez-faire" ("не перашкаджаць") заставаўся для прыхільнікаў свабоды гандлю самай лепшай палітыкай у гэтай галіне.

Каб зразумець значэнне такога падыходу, трэба падкрэсліць, што эканамісты-класікі імкнуліся надаць сваім тэзісам абсалютную і ўсеагульную сілу. На іхную думку, выведзеныя імі законы кіравалі гандлёвымі дачыненнямі паміж *усімі* краінамі, якім бы ні быў ровень развіцця гэтых краінаў; у прыватнасці, яны (законы) абумоўлівалі стасункі паміж Вялікабрытаніяй і яе калоніямі.

Пасля 1815 г. менавіта такі кшталт вучэння быў блізкі

[1] *Рыкарда нават сцвярджаў, што раўнавага разліковага балансу аднаўляецца без зменаў курсу абмену і пры неканверсаванай валюце (J. Viner, op. cit., p. 139). Гэта настолькі відавочная памылка, што мала хто з наступнікаў браў да ўвагі падобныя высновы Рыкарда.*

ангельскім прамыславікам. На гэты час яны ўжо ўмацавалі свае прадпрыемствы дзякуючы прыбыткам, атрыманым ад рабавання калоніяў[1], а таксама мытным правілам, якія абаранялі іх ад замежных тавараў (у прыватнасці, ад індыйскіх баваўняных вырабаў). Аднак індустрыяльнае развіццё ангельскіх прадпрыемстваў дасягнула такога роўню, што паўстала неабходнасць у зусім іншай эканамічнай палітыцы: можна было разлічваць прадаваць па танным кошце ўсе тавары на самых аддаленых рынках; трэба было найперш забяспечыць бесперашкодны рух тавараў па ўсім свеце; ад гэтага прамысловасць атрымала б вялікую выгаду.

§ 5. Тэорыя эканамічнага развіцця

Як і Сміт, Рыкарда цікавіўся праблемай эканамічнага росту. Вытлумачыць яе хацеў такім жа катэгарычным чынам, як і праблему вартасці і размеркавання. Але ў дадзеным выпадку яму зашкодзіла менавіта магутная здольнасць да сінтэзу. Жадаючы спасцігнуць асноўнае, Рыкарда шукаў адзін агульны корань усіх чыннікаў росту, у выніку ягоная тэорыя атрымалася нежыццяздольнаю.

Для Рыкарда існавала адзіная неабходная і найлепшая ўмова эканамічнага росту: існаванне даволі высокага сярэдняга роўню прыбытку. Ён лічыў: калі капітал дае дастатковы прыбытак, дык адбудуцца вялікія ашчаджанні і эканамічнае развіццё будзе забяспечвацца павелічэннем працоўных месцаў і паляпшэннем тэхнікі вытворчасці.

Рыкарда, у прыватнасці, адмаўляў тое, што рост капіталістычнай эканомікі залежыць ад адкрыцця новых рынкаў збыту. Па гэтым пытанні ён пераняў погляды Жана Батыста Сэя.

"Аднак, — пісаў вучоны, — спадар Сэй грунтоўна даказаў, што не існуе капіталу, якім бы значным ён ні быў, які не знайшоў бы выкарыстання ў краіне, бо попыт на тавары абмяжоўваецца толькі вытворчасцю. Кожны выробляе толькі з намерам, каб спажываць або прадаваць вырабленыя рэчы, і заўсёды прадае толькі дзеля таго, каб набыць нейкі

[1] *Гл. на гэты конт звесткі, сабраныя ў творы F. Clairmonte, Le libéralisme économique et les pays sous-développés, Genève, 1958, pp. 87–92.*

іншы тавар, які можа задаволіць непасрэдную патрэбу або паспрыяе будучай вытворчасці"[1].

Рыкарда не бачыў наступнага: нават калі дапусціць, што павелічэнне вытворчасці ў адным сектары забяспечвае рынкі збыту для іншых сектараў, такое першапачатковае павелічэнне будзе мець месца толькі тады, калі будуць існаваць дадатковыя рынкі збыту для прадуктаў зыходнага сектара.

З гэтае прычыны ён таксама прыйшоў да адмаўлення таго, што замежныя рынкі збыту могуць адыгрываць асноўную ролю ў прамысловым развіцці краіны (раней гэта сцвярджаў Сміт).

Замежны гандаль, тлумачыў ён, карысны толькі тады, калі ён дазваляе атрымліваць большую колькасць тавараў, выдаткоўваючы адну і тую ж колькасць нацыянальнай працы. Такім чынам, замежны гандаль *выгадны* для краіны, але зусім не *абавязковы* для яе эканамічнага развіцця. З гэтага, у прыватнасці, вынікала, што экспарт капіталаў прыносіць шкоду, бо ў выніку прыводзіць да памяншэння магчымасцяў выкарыстання працоўнай сілы ўнутры краіны[2].

Рыкарда лічыў, што Сміт глыбока памыляўся, калі казаў, што замежныя рынкі збыту мелі вялікае значэнне для развіцця ангельскай прамысловасці і што практычна можна было ў мінулым, ды і зараз яшчэ, абысціся без замежнага гандлю.

"Мы вырабляем тавары, — пісаў ён, — і за гэтыя тавары мы набываем за мяжой іншыя, бо можам атрымаць іх танней, чым калі б мы іх выраблялі ў сябе. Калі б нас пазбавілі магчымасці гандляваць, адразу ж (*sic*) мы зноў пачалі б вырабляць гэтыя тавары для нашага выкарыстання. Дарэчы, меркаванне Эдама Сміта (пра спрыяльную ролю замежных рынкаў збыту) трапляе ў супярэчнасць з усім ягоным аснаватворным вучэннем па гэтым пытанні"[3].

Вучоны нагадаў тэзіс Сміта, згодна з якім развіццё прамысловасці залежыць ад памеру назапашанага капіталу. Нарэшце, ён зрабіў выснову:

"Такім чынам, з гэтых разважанняў вынікае, што не існуе межаў ні

[1] *Principes, op. cit., p. 230.*
[2] *Op. cit., p. 321.*
[3] *Ibid., pp. 234–235.*

для попыту, ні для выкарыстання капіталу пры адзінай умове, што капітал дае пэўныя прыбыткі..."[1]

У раздзеле пра каланіяльны гандаль (раздзел XV) Рыкарда падышоў да абмеркавання вынікаў дамовы, па якой метраполія мае прывілей на пэўным рынку. Ён прызнаў, што такая дамова можа прынесці карысць метраполіі, бо, на яго думку,

"было б немагчыма вырабляць тавары ў Ангельшчыне, калі б гэтая краіна не мела эксклюзіўнага прывілею на забеспячэнне таварамі дадзенага рынку"[2].

Але далей Рыкарда сцвярджаў, што выгада, пра якую гаворыцца, абмяжоўваецца тым, што продаж пэўнага тавару можа быць *больш прыбытковы*, чым продаж нейкага іншага. Такім чынам, ён працягваў адмаўляць, што развіццё ангельскай прамысловасці можа запаволіцца з-за недахопу замежных рынкаў збыту.

Такім чынам, праблема рынкаў збыту зусім не бярэцца пад увагу, а пытанне эканамічнага росту зводзіцца да праблемы эвалюцыі роўню "прыбытку". Пакуль ровень прыбытку застаецца дастаткова высокім, на думку Рыкарда, рост забяспечаны. Эвалюцыя роўню прыбытку звязаная з эвалюцыяй памеру той часткі нацыянальнага даходу, якая належыць уладальнікам капіталаў, а яна ў сваю чаргу залежыць ад долі нацыянальнага даходу, што дастаецца найманым рабочым і зямельным уласнікам.

Рыкарда, як бачым, не верыў у рост заробкаў. Ён лічыў, што, наадварот, яны будуць мець тэндэнцыю да зніжэння. Але не тут існуе пагроза для прыбыткаў капіталістаў. На думку вучонага, такая пагроза паўстае, калі расце зямельная рэнта. Сапраўды, павелічэнне колькасці насельніцтва вымушае апрацоўваць новыя, менш урадлівыя землі. З гэтага вынікае, што павялічваецца агульная сума рэнты, гэтаксама як і доля зямельнай рэнты ў нацыянальным даходзе. Калі дапусціць, што доля заробкаў найманых рабочых застаецца прыкладна адной і той жа, дык доля прыбыткаў паменшыцца. Тэндэнцыя да зніжэння роўню прыбыткаў —

[1] *Ibid., p. 235.*
[2] *Ibid., p. 275.*

асноватворны закон эканамічнага развіцця, і менавіта гэта ўяўляе пагрозу эканамічнаму росту.

"Не можа быць назапашвання без матыву... Арандатар і мануфактуршчык не могуць працаваць без прыбытку, як рабочы не можа існаваць без заробку. Матыў, які падштурхоўвае іх да назапашвання, будзе слабець з кожным памяншэннем роўню прыбыткаў і зусім знікне, калі прыбыткі зробяцца настолькі малыя, што арандатары і мануфактуршчыкі не будуць атрымліваць дастатковай кампенсацыі за сваю працу і рызыку пад час выкарыстання ўласных сродкаў у вытворчасці"[1].

Такім чынам, Рыкарда лічыў, што рана ці позна нацыянальны даход перастане расці і эканоміка дасягне свайго статычнага стану.

Праз 50 гадоў Маркс убачыў у тэндэнцыі да зніжэння роўню прыбытку адну з фундаментальных супярэчнасцяў капіталізму і зрабіў выснову — неабходна радыкальная змена эканамічнага жыцця.

Рыкарда ж, наадварот, ні хвіліны не сумняваўся ў справядлівасці і непахіснасці капіталістычнага грамадства. З аднаго боку, ён ад самага пачатку мірыцца з праявамі эканамічнага заняпаду. З другога — лічыў, што надыход эканамічнага рэгрэсу можна запаволіць дзякуючы развіццю машыннай вытворчасці, агранамічным адкрыццям, якія павялічаць урадлівасць земляў[2], і ў асаблівасці дзякуючы свабоднаму імпарту прадуктаў сельскай гаспадаркі.

На думку Рыкарда, існуе больш важная, чым прапанаваная Смітам, прычына, каб патрабаваць скасавання мытных абмежаванняў: гэта магутны сродак перашкодзіць росту цэнаў на збожжа, а значыць, і зніжэнню роўню прыбытку.

Моцна перакананы ў гэтым, Рыкарда ў апошнія гады свайго жыцця быў у парламенце адным з ініцыятараў вядзення палітыкі свабоднага гандлю. Ягоныя вучні таксама заўзята абаранялі такую палітыку і шчыра верылі, што скасаванне мытных абмежаванняў надоўга адкіне пагрозу эканамічнай стагнацыі.

Дзякуючы свабоднагандлёвай дактрыне вучэнне Рыкарда ў канчатковым рахунку набыло аптымістычны характар.

[1] *Ibid., p. 92.*
[2] *Ibid., p. 91.*

Яшчэ адзін тэзіс дапамог у стварэнні такога характару: тэзіс аб немагчымасці крызісаў перавытворчасці, які Рыкарда таксама выводзіць з "закону рынкаў збыту" Жана Батыста Сэя.

Аднак Рыкарда даследваў пытанне глыбей, чым ягоны папярэднік.

Спачатку ён зазначыў, што "нечаканыя змены на гандлёвых шляхах" могуць спарадзіць крызіс:

"Вайна, якая выбухае пасля доўгага міру, або мір, які прыходзіць на змену доўгай вайне, звычайна выклікаюць вялікі заняпад у гандлі. Гэтыя падзеі значна мяняюць структуру працоўных месцаў, на якія раней былі накіраваныя капіталы ў той ці іншай краіне; і пакуль адбываецца пераразмеркаванне, сталы капітал спіць, часам нават ліквідуецца, а рабочыя больш не маюць працы. Гэты крызіс будзе доўжыцца ў залежнасці ад ступені прыхільнасці людзей да тыпу эканамічнай дзейнасці, у які яны прызвычаіліся на працягу доўгага часу ўкладаць свой капітал"[1].

Магчымасць такой "рэканверсіі", як сказалі б мы сёння, Рыкарда разглядаў як вынятак. Апрача гэтага, ён аналізаваў іншую прычыну крызісу. Можа мець месца, заўважаў ён, "усеагульны збой", калі з прычыны нізкіх прыбыткаў кожны пачне адмаўляцца ад прадметаў раскошы. Тады будуць вырабляцца выключна рэчы першай неабходнасці, прычым у занадта вялікай колькасці. І дадаваў:

"... у такой краіне, як, напрыклад, Ангельшчына, бадай, не могуць з'явіцца падставы для таго, каб усе насельнікі ўкладалі свой капітал і сваю працу выключна ў вытворчасць тавараў першай неабходнасці"[2].

Пасля пэўных ваганняў Рыкарда абараняў ідэю, што звычайна на практыцы ўсеагульныя крызісы перавытворчасці немагчымыя. Яго цэнтральны тэзіс: у краіне не можа быць зашмат капіталу, і гэты тэзіс ёсць падмуркам аптымізму наконт *непасрэднай* будучыні ангельскай эканомікі.

Аднак аптымізму менее ў апошнім выданні *"Прынцыпаў"*, бо ў ім з'яўляецца новы раздзел, названы "Пра машыны". У ім аўтар прызнаў, што прагрэс машыннай вытворчасці можа спарадзіць беспрацоўе, паколькі "сродкі даходаў зямельных уласнікаў і капіталістаў могуць павялічвацца,

[1] *Ibid., pp. 211–212.*
[2] *Ibid., p. 233.*

тым часам як сродкі, прызначаныя дзеля падтрымання працоўнага класа, будуць памяншацца"[1].

Тым не менш Рыкарда меркаваў, што машынная вытворчасць будзе развівацца даволі марудна, і яна зможа запаволіць попыт на працоўную сілу, а не рэзка скараціць яго[2]. Потым сцвярджаў, што калі б чыніліся перашкоды на шляху выкарыстання машынаў, дык, з аднаго боку, капіталы б уцякалі за мяжу, у выніку памяншалася б колькасць працоўных рук[3], а, з другога боку, гэта адмоўна ўздзейнічала б на зніжэнне выдаткаў вытворчасці, змяншалася б карысць ад замежнага гандлю[4].

Усе гэтыя тлумачэнні не перашкаджаюць Рыкарда, які дапускаў магчымасць "беспрацоўя, выкліканага тэхнічным развіццём", вылучыць асноўны аспект супярэчнасцяў, якія могуць узнікнуць у сучаснай рынкавай эканоміцы, і ахарактарызаваць іх.

§ 6. Значэнне тэорыі Рыкарда

У практычным плане Рыкарда зрабіў значны ўплыў як ініцыятар эканамічнага лібералізму і, у прыватнасці, палітыкі свабоднага гандлю, якую Вялікабрытанія праводзіла з сярэдзіны XIX ст. да 1914 г. З гэтага гледзішча можна казаць, што, менавіта трымаючыся парадаў, дадзеных Рыкарда, Вялікабрытанія ў XIX ст. здолела ўсталяваць сваё эканамічнае панаванне ва ўсім свеце. Аднак перадусім трэба зазначыць, што палітыка свабоднага гандлю мела поспех у Англельшчыне, бо ў эпоху Рыкарда гэтая краіна на паўстагоддзя апярэджвала сваіх суседзяў па тэхналагічным роўні вытворчасці.

Уздым ангельскага капіталізму тлумачыцца не толькі палітыкай свабоднага гандлю. Ён адбыўся дзякуючы палітыцы каланіяльных захопаў і пошуку прывілеяваных рынкаў, якую Англельшчына працягвала ажыццяўляць, нягледзячы на ліберальныя погляды эканамістаў.

[1] *Ibid., p. 314.*
[2] *Ibid., p. 320.*
[3] *Ibid., p. 321.*
[4] *Ibid.*

Нарэшце, не варта забывацца, што росквіт ангельскага капіталізму ў XIX ст. не меў стабільнага характару і насупе-рак думцы Рыкарда перарываўся крызісамі перавытворчас-ці, якія перыядычна збяднялі насельніцтва краіны.

Але, нягледзячы на пэўныя хібы, палітычная эканомія Рыкарда была інтэграваная ва утылітарысцкую філасофію і ў першай палове XIX ст. сталася моцным апірышчам для апошняй.

Мы ўжо бачылі, што стваральнік утылітарнай школы Бэн-там паспрабаваў пабудаваць эканамічную навуку на глебе падліку задавальненняў і пакутаў. Калі ж Рыкарда выпусціў у свет свае *"Прынцыпы"*, Бэнтам канчаткова адмовіўся ад ранейшых поглядаў і пераняў сістэму думак Рыкарда, бо лічыў, што немагчыма лепей апісаць сацыяльныя з'явы, чым дэманстрацыяй таго, што яны, як і фізічныя з'явы, кіруюцца натуральнымі законамі[1].

Галоўным прадстаўніком утылітарнай філасофіі пасля Бэнтама быў Джэймз Міл. У 1821 г. Міл выдаў *"Асновы палітычнай эканоміі"*, у якіх паўтараў ідэі Рыкарда. А потым ён паспрабаваў даць канцэпцыю чалавечай дзейнасці ў сваім *"Аналізе феноменаў чалавечага розуму"* (1829).

Бэнтам пісаў: "без задавальнення і без пакутаў" няма ні дабра, ні ліха. Джэймз Міл прапанаваў мараль, падмуркам якой у канчатковым выніку ёсць толькі эгаізм. Міл імкнуўся даказаць, што ўчынкі, вонкава пазбаўленыя інтарэсу, у рэ-чаіснасці ў кожным разе грунтуюцца на пошуках асабістага задавальнення. "Выгляд жабрака, — пісаў ён, — выклікае ў мяне ідэю галечы; гэтая ідэя абуджае ідэю паменшыць ягоную галечу; ідэя паменшыць галечу прыемная, гэта зна-чыць гэтая ідэя ёсць жаданнем". Такім чынам, асабісты інтарэс, пра які гаварылі эканамісты, у канчатковым рахунку паўстае ў якасці адзінага рухача людскіх учынкаў, і, згодна з утылітарыстамі, уся навука аб грамадскім жыцці павінна зводзіцца да палітычнай эканоміі.

---

[1] *Бэнтам, першапачаткова прыхільнік манархіі, пазней стаў абаронцам прадстаўнічай формы кіравання. У 1817 г. ён выдаў "План парламенцкай рэформы", у якім патраба-ваў усеагульнага выбарчага права. Менавіта ў тыя часы Бэнтам зрабіўся лідэрам групы людзей, якіх пачалі называць радыкаламі. Гэтая група, у прыватнасці, адхіляла рэлігію і характарызавалася ваяўнічым антыклерыкалізмам.*

Аднак пазіцыя Джэймза Міла памылковая. Ці прыносіць назіранне за чалавекам, які прымае ежу, гэткую сама асалоду, як уласны сняданак? Відавочна, не. Значыць, эгаізм не можа быць апошнім словам маралі. А палітэканомія ў якасці ўсеагульнай навукі пра людскую дзейнасць, заснаваную на асабістым інтарэсе, не ўлучае ўсіх ведаў пра грамадства. Хоць утылітарызм яшчэ і сёння знаходзіць сваіх абаронцаў (напрыклад, з ангельскай школы "Эканоміка дабрабыту"), яго ўсё ж трэба разглядаць як цалкам састарэлую філасофію. А хібы палітычнай эканоміі Рыкарда тлумачацца праз яе залежнасць ад утылітарнай філасофіі[1].

Бібліяграфія

Месца Рыкарда ў эканамічнай навуцы бліскуча вызначанае, а ягоны ўплыў дакладна акрэслены ў працы Elie Halévy dans *La formation du radicalisme philosophique*, Paris, 1901—1904. З вялікім плёнам можа быць выкарыстанае нядаўняе выданне ягоных твораў і перапіскі, а таксама ўводзіны да гэтага выдання, напісаныя P. Sraffa (cf. *D. Ricardo works and correspondance*, 10 vol., Cambridge, 1951—1955).

Сярод твораў, у якіх вывучалася творчасць вялікага эканаміста, назавем:

M. Blaug, *Ricardian Economics*, New Haven (E. U.), 1958.

M. Bowley, *Studies in the History of Economic Theory before 1870*, London, 1973.

J. Cartelier, *Surproduit et Reproduction*, Grenoble, 1976.

A. W. Coats, *The classical economists and economic policy*, Cambridge, 1973.

M. Dobb, *Theories of value and distribution since Adam Smith*, Cambridge, 1973.

R. V. Eagly, *The structure of classical economic theory*, New York, 1974.

S. Hollander, *The economics of David Ricardo*.

D. P. O'Brien, *The classical economists*, Oxford, 1975.

— J. R. McCulloch, a study in classical economics, London, 1970.

[1] *Утылітарная мараль не выступае, дарэчы, мараллю лёгкасці і задавальнення. Тагачасныя радыкалы былі ў асноўным аскетычнымі людзьмі. Іхны аскетызм спалучаўся з упартым жаданнем узбагаціцца праз ашчаджанне і адмаўленне ад непасрэдных задавальненняў. Яны добра адлюстроўвалі той стан ідэяў, які на пачатку XIX ст. панаваў у буржуазным асяроддзі Заходняй Эўропы. Значэнне мела адзіная рэч: багацце індывіда. Духоўнае жыццё лічылася нечым залішнім, раскошаю, што датычыць кожнага індывіда і выяўляецца спантанна і аб якой не павінна дбаць навука аб грамадстве.*

J. Plamenatz, The english utilitarians, Oxford, 1958.

R. D. Collison Black (edit.), *Readings in the development of economic analysis, 1776–1848*, Newton Abbot, 1971.

A. C. Whitaker, *History and criticism of the labour theory in english political economy*, New York, 1904; réimpression, 1968.

Таксама можна выкарыстаць працу:

E. Cannan, *Histoire des théories de la production et de la distribution dans l'économie politique anglaise de 1776 à 1848*, traduit de l'anglais, Paris, 1910.

Па пытанні вартасці гл.:

R. L. Meek, *Studies in the labour theory of value*, London, 1956.

Раздзел V

МАЛЬТУСАВА ТЭОРЫЯ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

Аўтар *"Спробы стварэння закону аб народанаселенасці"*, які лічыў неабходным падтрымліваць пекла на зямлі, не мог не ўважаць погляды Рыкарда занадта аптымістычнымі. Натхнёны эканамічным крызісам 1817 г. і дыскусіямі, якія ён выклікаў, Мальтус паспрабаваў адказаць Рыкарда і ў 1820 г. у сваю чаргу выдаў *"Прынцыпы палітычнай эканоміі"*.

Па шматлікіх пытаннях аналіз Мальтуса быў нашмат слабейшы параўнальна з аналізам Рыкарда. Але калі ў другой частцы свайго твора, названай *"Аб павелічэнні багацця"*, Мальтус закрануў пытанне эканамічнага развіцця, дык зрабіў важнае навуковае адкрыццё, ацэненае Кейнсам, але, безумоўна, недастаткова[1].

Мальтус пытаўся, што неабходна, каб забяспечыць развіццё эканомікі. Бальшыня эканамістаў, паўтараючы Сміта і Рыкарда, сцвярджалі, што трэба зямля, праца і капітал[2]. Такім чынам, краіне, у якой вялікая колькасць зямлі і працоўнае сілы, неабходна і дастаткова таго, каб ашчаджанне забяспечвала імклівае назапашванне капіталу.

Мальтус не пагаджаўся з гэтым палажэннем і сцвярджаў, што ўздым вытворчасці патрабуе яшчэ і павелічэння попыту на прадукцыю:

"Першая рэч, якая неабходна..., якая папярэднічае ўсялякаму павелічэнню капіталу і насельніцтва, — гэта сапраўдны попыт на тавары, г. зн. попыт з боку тых, хто мае сродкі і жаданне плаціць за тавары дастатковую цану"[3].

---

[1] *Папраўдзе кажучы, сам Мальтус меў папярэднікаў у XVIII ст., у прыватнасці Бэркліі. У першай палове XIX ст. Лодэрдэйл развіваў погляды, блізкія да Мальтусавых (гл. на гэты конт Morton Paglin, Malthus and Lauderdale, the anti-ricardian tradition, New York, 1961. Аднак твор Мальтуса быў самым лепшым у класічную эпоху адказам на "закон рынкаў збыту" Жана Батыста Сэя.*

[2] *Прызнанне гэтага факта, зразумела, не азначала згоды з тэорыяй "трох крыніцаў вартасці".*

[3] *Principes, trad. franç., nouvelle édition, Paris, 1969, p. 267. Тут Мальтус пераймаў ідэю, уласцівую многім аўтарам XVIII ст. Мы з ёю сустракаліся ў Бўагійбэра. Яна прысутнічала таксама ў "Байцы аб пчолах" Бэрнарда дэ Мандэвіля (1705), у творы Бэркліі "The Querist" (1735), у Ст'юарта і г. д. Але Мальтус, ідучы па слядах Лодэрдэйла, зрабіў новыя высновы. Гл. на гэты конт T. W. Hutchison, A review of economic doctrines, 1870—1929, Oxford, 1953; réimpression, 1962, p. 346.*

Вялікая заслуга Мальтуса палягае ў акрэсленым адрозненні неплацежаздольных і плацежаздольных патрэбаў. Аднак ён не абмяжоўваўся заўвагаю, што толькі плацежаздольны попыт ёсць сапраўдным попытам. Ён таксама сцвярджаў, што ў капіталістычнай сістэме дадатковы попыт павінен існаваць яшчэ *да таго*, як будзе здзейсненая дадатковая вытворчасць.

"Дадатковая працоўная сіла, — пісаў вучоны, — ніколі не можа быць выкарыстаная ні ў адной галіне прамысловасці толькі дзеля таго, каб павялічыць попыт на вырабы гэтай прамысловасці з боку найманых рабочых. Ніводны арандатар не будзе браць на сябе клопат аб кіраўніцтве працай дзесяці дадатковых парабкаў толькі таму, што ягоны сукупны прадукт будзе прадавацца на рынку па больш высокай цане, якая, аднак, толькі дазволіць пакрыць выдаткі на іх працу. Каб павялічвалася колькасць занятых у вытворчасці, загадзя мусяць змяніцца попыт і прапанова на тавар або цана на яго, перш чым новыя работнікі створаць попыт і незалежна ад яго"[1].

Адна з ідэяў тэксту: немагчыма павялічваць вытворчасць выключна з надзеяй продажу дадатковага прадукту дадатковай працоўнай сіле, паколькі ў такім разе кіраўнік прадпрыемства не здолее атрымаць ніякага прыбытку ад пашырэння вытворчасці.

Тут Мальтус не ўлічваў таго, што павелічэнне вытворчасці прадугледжвае інвестыцыі, гэта значыць попыт на матэрыяльныя сродкі (дадатковыя сродкі вытворчасці). Падобнае няведанне практыкі праявілася яшчэ раз крыху далей, калі аўтар сцвярджаў, што капіталісты не могуць забяспечыць пакупную здольнасць, неабходную дзеля ажыццяўлення дадатковай вытворчасці.

"Але мы ўжо паказалі, — пісаў ён, — што спажыванне і попыт, створаныя асобамі, занятымі ў прадукцыйнай працы, ніколі не могуць быць дастатковым стымулам да назапашвання і выкарыстання капіталу. Што да саміх уладальнікаў капіталаў — зямельных уласнікаў і іншых заможных людзей, — дык яны, паводле гэтай тэорыі, робяцца ашчаднымі і адмаўляюцца ад уцехаў і сваёй звычайнай раскошы з мэтай дадаць даходы да капіталу. Цікава, як пры гэтым знойдзе сваіх пакупнікоў лішак тавараў, атрыманы ў выніку росту колькасці найманых працаўнікоў, калі цана не знізіцца і вартасць тавараў не ўпадзе ніжэй за выдаткі на іхную

[1] *Principles of Political Economy, nouv. éd., New York, 1951, p. 312.*

вытворчасць, або, інакш, не паменшыцца аб'ём ашчаджанняў ці жаданне ашчаджаць"[1].

Здаецца, у гэтым Мальтус пераймае ідэі Сісмандзі аб тэндэнцыі да недастатковага спажывання ў капіталістычнай эканоміцы[2] . Праз гэта падышоў да тлумачэння аднаго з асноўных момантаў сваёй тэорыі. Але ягоная думка, гэтаксама як і думка Сісмандзі, засталася вельмі неакрэсленай.

Каб разабрацца ў праблеме недастатковага спажывання, найперш трэба было б прызнаць, што ашчаджанні капіталістаў з наступным капіталаўкладаннем спараджаюць попыт на абсталяванне, які здольны нейкі час падтрымліваць апарат вытворчасці ў раўнавазе. Пасля гэтага — задаць ключавое пытанне: ці *падмацоўваецца* такая вытворчасць абсталявання дастатковым павелічэннем спажывання?

Сісмандзі і Мальтус не падыходзяць да праблемы такім чынам, бо не здольныя належна крытыкаваць тэзіс Сміта, *які запазычыў і Рыкарда* і адпаведна з якім штогадовы нацыянальны прадукт (валавы або чысты) улучае толькі спажывецкія тавары[3].

Немагчыма абмежавацца сцверджаннем, як гэта робяць

---

[1] *Principes, trad. franç., op. cit., p. 256.*

[2] *Гэты аўтар, супраціўнік лібералізму, выдаў у 1819 г. свае "Новыя прынцыпы палітычнай эканоміі", якія разгледзім, калі будзем весці гутарку аб сацыялістычнай думцы XIX ст.*

[3] *Глядзі вышэй, другая частка, раздзел IV, §7. У заўвазе наконт Мальтуса Рыкарда пісаў: "Спадар Мальтус, здаецца, ніколі не ўзгадвае, што ашчаджаць — гэта выдаткоўваць, прычым у той жа ступені, як і на выпадак, што ён называе чыстымі выдаткамі" (Notes on Malthus Principles of Political Economy by David Ricardo, Baltimore, 1928, p. 245). Рыкарда меў бы рацыю, калі б, па-першае, прадэманстраваў, што ўсялякае ашчаджанне цягне аўтаматычнае капіталаўкладанне, а па-другое, заўважыў бы, што капіталаўкладанні спараджаюць попыт на абсталяванне. Але, відавочна, ён гэтага не бачыць, пра што, напрыклад, сведчыць наступны ўрывак, узяты з чацвертага выдання "Прынцыпаў":*

"Кожны год наш капіталіст пачынае свае аперацыі з набыцця прадуктаў харчавання і спажывецкіх тавараў на суму 13000 фунтаў стэрлінгаў, якія ён прадасць на працягу года сваім рабочым. За гэты ж час ён дасць ім у выглядзе заробкаў такую самую суму грошай, а да канца года рабочыя адновяць капіталісту на 15000 фунтаў сродкаў існавання і рэчаў першай неабходнасці. З гэтых 15000 фунтаў 2000 ён можа спажываць сам або выкарыстоўваць іх як заўгодна. Такім чынам, валавы прадукт гэтага года павінен складаць 15000 фунтаў, а чысты прадукт — 2000 фунтаў стэрлінгаў. Дапусцім, што налета капіталіст будзе выкарыстоўваць адну палову сваіх рабочых на пабудове машыны, а другую, як і раней, — у вытворчасці прадуктаў харчавання і тавараў першай неабходнасці. На працягу гэтага года ён таксама выдаткуе 13000 фунтаў стэрлінгаў на заробкі і прадасць сваім рабочым такую самую колькасць

Сісмандзі і Мальтус, што ўсялякае ашчаджанне адразу ж выклікае недастатковасць спажывання. Гэта было б праўдаю толькі тады, калі б нацыянальны прадукт складаўся выключна са спажывецкіх тавараў, г. зн. калі б Сміт і Рыкарда мелі рацыю. Але памылка Сміта і Рыкарда відавочная, а Мальтус, як і Сісмандзі, няздольны выправіць яе. Менавіта таму ён не можа па-сапраўднаму даказаць, што ў капіталістычным грамадстве існуе тэндэнцыя да недастатковага спажывання (або залішняга забеспячэння абсталяваннем). Не меншая праўда і тое, што аўтар *заўважыў* існаванне гэтае тэндэнцыі. Неаспрэчная заслуга! Мальтус цалкам мае рацыю, калі кажа:

"Калі ператварэнне даходу ў капітал, якое выйшла за межы пэўнага роўню, прыводзіць праз памяншэнне рэальнага попыту на тавары да беспрацоўя, дык відавочна, што звычка да празмернага ашчаджання выкліча самыя згубныя наступствы"[1].

Зрэшты, на нашу думку, аўтар павёў бы даследванне больш плённым шляхам, калі б лепей распрацаваў ідэю, якая выказвалася ў другой частцы тэксту, які мы цытавалі крыху раней.

"Дзеля таго каб гарантавалася выкарыстанне дадатковай колькасці асобаў у вытворчасці, — пісаў Мальтус, — папярэдне павінна змяніцца нешта ў стасунку попыту і прапановы... яшчэ да попыту, які створаць новыя працаўнікі"[2].

Заўвага мае выключае значэнне, але, на жаль, палітычная эканомія нават і сёння не здолела зрабіць з яе належныя высновы.

Калі капіталістычнае прадпрыемства павялічвае свае выдаткі, дык яно размяркоўвае новыя даходы і стварае боль-

---

прадуктаў харчавання і іншых рэчаў..." (Principes, trad. franç., Paris, 1970, p. 315). Рыкарда мяркуе, што капіталіст вырабляе тую машыну на сваім уласным прадпрыемстве. У такім разе, відавочна, няма патрэбы яе набываць, і менавіта таму яе кошт не ўваходзіць у нацыянальны даход (які Рыкарда называе тут "валавым прадуктам", а "чысты прадукт" — гэта прыбытак). Але ў рэальнай эканоміцы новавырабленыя машыны прадаюцца і іхная вартасць — гэта частка нацыянальнага прадукту. Такім чынам, памылкова сцвярджаць, як гэта робіць Рыкарда, што капіталаўкладанні спараджаюць попыт на спажывецкія тавары. Але таксама было б памылкаю казаць, як гэта робіць Мальтус, што яны не спараджаюць ніякага попыту.

[1] *Principes, trad. franç., op. cit., p. 265.*

[2] *Principes, op. cit., p. 312; ужо цытаваны ўрывак: гл. вышэй, с. 334.*

шую пакупную здольнасць. Але гэтая пакупная здольнасць распаўсюджваецца на ўсю эканоміку; толькі вельмі нязначная частка створаных даходаў ідзе на набыццё прадукцыі *самога прадпрыемства*, выдаткі якога павялічыліся. Праз павелічэнне сваіх выдаткаў прадпрыемства не стварае *для самога сябе* рынку збыту. З гэтага вынікае, што яно ніякім чынам не можа апраўдаць павелічэнне сваёй вытворчасці праз павелічэнне попыту, які будзе вынікам павелічэння вытворчасці.

Паводле Мальтуса, павелічэнне вытворчасці ў капіталістычнай эканоміцы павінна грунтавацца на *папярэднім* павелічэнні попыту. Гэта, без сумневу, ёсць фундаментальным законам ліберальнага капіталізму[1].

Безумоўна, сам Мальтус не разумеў усяго значэння гэтага тэзіса. Менавіта таму ягоная тэорыя росту застаецца няскончанаю. Тым не менш на яе грунце ён зрабіў высновы, якія маюць велізарнае значэнне.

Крызісы перавытворчасці, на яго думку, цалкам магчымыя, а гэта супярэчыць сцверджанням Сэя і Рыкарда. У сваім творы Мальтус шмат месца адвёў разгляду прычынаў "велізарнай галечы, ад якой пачынаючы з 1815 г. пакутуюць працоўныя класы". Згодна з ягоным меркаваннем, гэткае згубнае становішча тлумачыцца не бракам капіталу, як сцвярджала бальшыня эканамістаў, а, наадварот, лішкам капіталу ў параўнанні з рынкамі збыту. Ён пісаў:

"Калі прыбыткі слабыя і няпэўныя, калі капіталісты не ведаюць, якім чынам бяспечна выкарыстаць свае капіталы, і калі з гэтых прычынаў грошы перамяшчаюцца за мяжу, адным словам, калі ўсе акалічнасці сведчаць, што ў краіне няма рэальнага попыту на капітал, дык ці з'яўляецца беспадстаўным і бясплённым парушэннем першага, самага важна-

[1] *Ідэя пра неабходнасць папярэдняга попыту прысутнічала ў "Новых прынцыпах палітычнай эканоміі" Сісмандзі, якія ўбачылі свет на некалькі месяцаў раней "Прынцыпаў" Мальтуса. "Павелічэнне вытворчасці, — пісаў Сісмандзі, — выгаднае, калі яно выклікана попытам і адпавядае павелічэнню спажывання" (nouv. éd., 1951—1953, t. I, p. 329).*

Ведучы гаворку пра часы, калі ўрад не ўмешваўся ў эканоміку дзеля спрыяння мануфактурам, Мальтус падкрэсліваў: "Новая галіна прамысловасці не магла ўзнікнуць без папярэдняга стабільнага попыту; рынак заўсёды ўтвараўся раней, чым паўставала мануфактура, якая мусіла яго насычаць" (Ibid., p. 329. Cf. également pp. 117 et 258, ainsi que t. II, p. 274).

га і універсальнага закону палітычнай эканоміі — закону попыту і прапановы парада ашчаджаць большую частку даходаў?"[1]

Менавіта да гэтай тэмы звернецца Кейнс праз 115 гадоў пасля вялікага крызісу 1929 г. У выніку тое, што ўжо выказаў Мальтус, будзе разглядацца ў якасці важнага адкрыцця. Дарэчы, сам Кейнс аддаваў належнае тэорыі Мальтуса.

Якім жа чынам можна змагацца супраць перавытворчасці? У якасці першага сродку Мальтус адстойваў арганізацыю буйнамаштабных грамадскіх працаў.

"Важна, — пісаў ён, — у нашых намогах, скіраваных на дзейсную дапамогу працоўным класам, пераканаць сябе, што пажадана, каб гэтыя людзі выкарыстоўваліся на такіх працах, вынікі якіх не прадаваліся б, напрыклад на рамонце гасцінцаў і на грамадскіх працах. Нельга запярэчыць такому выкарыстанню велізарнай сумы, атрыманай з дапамогаю падатку, маўляў, гэта вядзе да памяншэння ўкладання капіталу ў прадукцыйную працу; да пэўнага роўню менавіта ў гэтым мы маем патрэбу"[2].

Гаворка, аднак, тут ідзе толькі аб захадах часовага характару, якія здымаюць напругу, аб паліятыве. У пошуках сродкаў забеспячэння доўгатэрміновага ўздыму вытворчасці Мальтус настойвае на першачарговай ролі нутранога і замежнага гандлю.

Развіццё гандлю ўнутры краіны, на яго думку, створыць новыя рынкі збыту для капіталу, укладзенага ў буйныя прадпрыемствы[3]. Гэта цалкам справядліва. Мальтус толькі забыў сказаць, што адбываецца гэта за кошт традыцыйных дробных вытворцаў.

З другога боку, развіццё замежнага гандлю — важная крыніца стварэння новых рынкаў збыту. Гэтым Мальтус катэгарычна пярэчыць Рыкарда.

"Кожны, — пісаў ён, — пагодзіцца, што павелічэнне колькасці тавараў — гэта адзін з самых пажаданых вынікаў, якіх можна чакаць ад замежнага гандлю; але я засяроджваю асаблівую ўвагу чытача на яшчэ адным, надзвычай важным, які практычна заўжды прыносіць замежны гандаль і пра што маўчыць спадар Рыкарда; я маю на ўвазе павелічэнне менавай вартасці. Яно з'яўляецца неабходным, каб стварыць стымул да няспыннай прадукцыйнай дзейнасці і стабільнага забеспячэння тавара-

[1] *Principes, trad. franç., op. cit., p. 344.*
[2] *Ibid., p. 354.*
[3] *Ibid., p. 320.*

мі. Калі здараецца, што менавая вартасць не павялічваецца, тады зніжаецца попыт на працоўную сілу і спыняецца рост багацця"[1].

Аўтар абмінаў той факт, што Англельшчына завязвала гандлёвыя стасункі пераважна з рэгіёнамі менш развітымі і што менавіта гандаль мануфактурнымі вырабамі наўзамен сыравіны і прадуктаў харчавання, якія паступалі з-за мяжы, стымуляваў ангельскую прамысловасць. Сёння нам лёгка дапоўніць аргументы Мальтуса.

Нарэшце, Мальтус прапанаваў захоўваць і пры магчымасці павялічваць колькасць асобаў, не занятых у вытворчасці матэрыяльных дабротаў.

"У кожнай дзяржаве павінна існаваць катэгорыя людзей, прызначаных на выкананне рознага тыпу асабістых паслугаў: бо апрача слугаў патрэбныя таксама дзяржаўныя дзеячы, каб кіраваць; жаўнеры, каб абараняць краіну; суддзі і адвакаты, каб вяршыць правасуддзе і ахоўваць правы людзей; дактары і хірургі, каб лекаваць хваробы і загойваць раны; пастары, каб вучыць непісьменных і несці суцяшэнне"[2]. Усе гэтыя асобы спажываюць рэчы, вырабленыя на капіталістычных прадпрыемствах, але самі іх не ствараюць. Такім чынам, неабходна, каб яны былі дастаткова шматлікімі. "Карацей кажучы, карыснасць непрадукцыйных спажыўцоў паходзіць з таго, што яны забяспечваюць раўнавагу паміж таварнай масай і спажываннем..."[3]

Сучасны рост дзяржаўных выдаткаў ва ўсіх капіталістычных краінах, а гэтыя выдаткі з'яўляюцца асноўным стымулам эканамічнага росту, можа ў значнай ступені разглядацца як павелічэнне колькасці непрадукцыйных асобаў адпаведна пажаданням Мальтуса.

Дык як жа здарылася, што толькі адзін Мальтус з усіх вялікіх эканамістаў-лібералаў класічнай эпохі правільна зразумеў сутнасць праблемы рынкаў збыту, неабходных дзеля развіцця капіталістычнай эканомікі? Можа, ён проста запазычыў ідэі Сісмандзі, у чым яго абвінавачваў Маркс? Відавочна, не, бо пачынаючы з 1814 г. у сваіх лістах да Рыкарда Мальтус ужо ўздымаў праблему недастатковага попыту[4].

Безумоўна, на шлях адкрыцця ці, прынамсі, прызнання важных ісцінаў яго прывёў менавіта ягоны песімізм, тым

[1] *Ibid., pp. 323 et 324.*
[2] *Ibid., p. 335.*
[3] *Ibid., p. 340.*
[4] *Гл. на гэты конт Morton Paglin, Malthus and Lauderdale, op. cit., pp. 119–121.*

часам як іншыя эканамісты-лібералы былі аслепленыя ўласным аптымізмам. Зразумела, аўтар *"Спробы стварэння закону аб народанаселенасці"* ні на хвіліну не дапускаў, што апісаныя ім эканамічныя супярэчнасці могуць вымагаць трансфармацыі грамадства. Наадварот, ён шмат разоў сцвярджаў, што ўлада павінна заставацца ў руках землеўладальніцкай арыстакратыі[1]. Позірк Мальтуса скіраваны ў бок мінуўшчыны, а не будучыні. Але менавіта адсутнасць у Мальтуса энтузіязму ў дачыненні да індустрыяльнага капіталізму дазваляла яму больш аб'ектыўна ставіцца да гэтага ладу, а таксама лепей, чым іншыя эканамісты-лібералы, раскрыць ягоныя істотныя характарыстыкі.

Безумоўна, нельга не прызнаць даволі высокі ровень Мальтусава аналізу эканамічнага росту, але таксама нельга не адзначыць, што ў пэўнай ступені аўтар пярэчыць сам сабе. Сапраўды, у *"Спробе стварэння закону аб народанаселенасці"* ён сцвярджаў, што галеча ёсць выключна вынікам занадта хуткага павелічэння колькасці насельніцтва, а ў новай кніжцы паўтараў, што занятасць і вытворчасць могуць павялічыцца з дапамогаю мераў, скіраваных на пашырэнне рэальнага попыту. Можа падацца, што новы тэзіс неяк не стасуецца з папярэднім. Сам аўтар усведамляў гэта, паколькі ў даследванні, якое выйшла ў 1830 г. (*"Кароткі пераказ закону аб народанаселенасці"*), ён разглядаў палажэнне *"Спробы..."* у якасці слушнага толькі ў будучыні. Але калі гэта так, дык "неабходнасць" скасавання дапамогі беднякам губляе сваю тэрміновасць, і Мальтус мусіў бы змяніць высновы са свайго першага твора. Паколькі ён гэтага не зрабіў, а, наадварот, ажыццявіў у 1826 г. новае выданне *"Спробы..."*, высновы якога былі настолькі ж катэгарычныя, як і ў папярэдніх выданнях, дык гэта дае для асобных аўтараў падставы лічыць, што ў ягоных ідэях ёсць супярэчнасць[2].

---

[1] *Principes, op. cit., p. 338.*

[2] *Гл. на гэты конт Morton Paglin, Malthus and Lauderdale, op. cit., pp. 147–150.*

Бібліяграфія

Ідэі, якія адстойваў Мальтус у сваіх *"Прынцыпах палітычнай эканоміі"*, былі яшчэ адносна малавывучаныя, нягледзячы на ўсеагульную цікавасць, якую яны выклікаюць пасля трыумфу вучэння Кейнса. Працытуем, аднак, калектыўны твор, выдадзены D. V. Glass, *Introduction to Malthus*, London, 1953. Таксама зазначым, што ў нашым даследванні Le rôle des débouchés préalables dans la croissance économique de l'Europe occidentale et des Etats-Unis d'Amérique, *Cahiers de l'J.S.E.A.*, série P. n°5, 1961, прыводзяцца звесткі, якія, магчыма, дазволяць зразумець усю значнасць асобных ідэяў Мальтуса.

ЧАСТКА ПЯТАЯ



АСНОЎНЫЯ МЫСЛЯРЫ-САЦЫЯЛІСТЫ XIX СТ.

З вышыні пройдзенага часу хібы і памылкі класічнай палітычнай эканоміі ўяўляюцца нам даволі відавочнымі.

Як казаў Кейнс, погляды Рыкарда мелі велізарны поспех таму, што яны адпавядалі інтарэсам панавальнага класа[1]. Але ўсе тыя, хто не пагаджаўся разглядаць свабоду гандлю і эканамічнай дзейнасці ў якасці адзінага прынцыпу сацыяльнага ладу, выступілі супраць эканамістаў.

Па-першае, на пачатку XIX ст. у Францыі і Англіі расквітнеў натуралістычны сацыялізм, меней супярэчлівы, чым вучэнне Марэлі, паколькі яго адэпты выступалі за поўнае скасаванне дзяржавы, а грамадства разглядалася імі як спалучэнне свабодна створаных асацыяцыяў паміж невялічкімі групамі індывідаў. Гэта так званы асацыянісцкі сацыялізм Фур'е і Оўэна.

Адначасова граф дэ Сэн-Сімон развіваў погляды, якія атрымалі назву "тэхнакратычнага сацыялізму". Шматлікія аўтары будуць натхняцца ягонай творчасцю.

Трэці накірунак дамарксісцкай сацыялістычнай думкі ўлучаў аўтараў, якія апрацоўвалі ідэі эканамістаў з тым, каб з іх зрабіць высновы, спрыяльныя да пераўтварэння грамадства. Асноўнымі прадстаўнікамі гэтай плыні сталі: Сісмандзі ў Францыі, Томпсан, Грэй, Годскін, Брэй у Англіі, Радбэртус і Карл Марло ў Нямеччыне. Нарэшце, варта разгледзець погляды Прудона, уплыў якіх быў вельмі вялікі.

Усіх гэтых аўтараў можна ахарактарызаваць як прадстаўнікоў дамарксісцкага сацыялізму (хоць Прудон, Радбэртус і Марло былі сучаснікамі аўтара "*Капіталу*"), бо творчасць Карла Маркса пачынае новы перыяд у гісторыі сацыялістычнай думкі[2]. Дзеля тлумачэння навіны ідэяў Маркса трэба паказаць, якім чынам яны спалучаюцца з палітычнай філасофіяй, распрацаванай Гегелем у 1800—1820 гг.

---

[1] *Théorie générale de l'emploi, de l'intérêt et de la monnaie, trad. franç., Paris, 1942, p. 54.*

[2] *Маркс і Энгельс супрацьпастаўлялі ўласнаму вучэнню "утапічны сацыялізм" сваіх папярэднікаў. Аднак не яны ўпершыню ўжылі гэты тэрмін, паколькі ён ужо быў выкарыстаны ў 1839 г. Жэромам Блянкі ў ягонай "Гісторыі палітычнай эканоміі".*

Раздзел I

АСАЦЫЯНІСЦКІ САЦЫЯЛІЗМ

Спакон вякоў знаходзіліся людзі, якія арганізоўвалі маленькія групы індывідаў, аддзяляліся ад астатніх людзей, каб весці больш дасканалы лад жыцця.

У прыватнасці, такія спробы мелі месца ў Цэнтральнай Эўропе ў эпоху Адраджэння, і яны чыніліся ў імя ачышчанага, адноўленага хрысціянства (Мараўскія Браты, анабаптысты...).

Стары ідэал дасканалага жыцця ў межах дробных супольнасцяў адраджаецца на пачатку XIX ст., але ён прысутнічаў у мысляроў, якія ў асноўным выразна супрацьстаялі хрысціянству і адстойвалі падкрэслена натуралістычную канцэпцыю чалавека. Такім чынам, яны аддзялялі старыя канцэпцыі ад іхных рэлігійных каранёў. Гэтыя мысляры меркавалі выкарыстаць канцэпцыі такога кшталту дзеля развязання праблемаў, узнятых трыумфальным шэсцем капіталізму. Два асноўныя прадстаўнікі такога новага сацыялізму — Шарль Фур'е ў Францыі і Роберт Оўэн у Ангельшчыне.

§ 1. Шарль Фур'е

Шарль Фур'е нарадзіўся ў 1772 г., а памёр у 1837 г. Ён вёў сціплы лад жыцця, жыў сабе ціхенька ды памаленьку. Працаваў маклерам ды каміваяжорам у крамах Марсэля, Руана, Ліёна і Парыжа, атрымаў адукацыю дзякуючы наведванню чытальных залаў у часы адпачынку. Фур'е быў халасцяком і вёў аднастайны лад жыцця, што дазволіла яму напісаць шматлікія творы.

Сам Фур'е тлумачыў, што ў лютым 1798 г. ён, разважаючы пра кошт яблыка, усвядоміў, якое бязладдзе пануе ў эканоміцы. У 1803 г. у перыядычным выданні *"Бюлетэн дэ Ліён"* ён публікуе артыкул *"Сусветная гармонія"* з мэтай, як ён сцвярджаў, дапоўніць працу навукоўцаў. "Навукоўцы, — пісаў ён, — адкрылі законы матэрыяльнага руху; гэта цудоўна, але гэта не знішчае галечы. Трэба яшчэ адкрыць законы

сацыяльнага руху"[1]. Як і іншыя аўтары да і пасля яго, Фур'е параўноўваў сябе з Ньютанам і заяўляў, што дасць свету тэорыю, аналагічную тэорыі гэтага навукоўца, але якая будзе датычыць маральнага свету.

У 1808 г. Фур'е выдаў свой першы твор *"Тэорыя чатырох рухаў"*, *"Уводныя разважанні"* якога ўяўляюць бліскучую крытыку капіталістычнага ладу. У 1822 г. ён развівае свае практычныя прапановы ў *"Трактаце аб хатняй сельскагаспадарчай асацыяцыі"*. У 1827 г. выходзіць у свет *"Індустрыяльны Новы Свет"*, а ў 1835—1836 гг. — *"Фальшывая індустрыя"*. Ён памёр, пакінуўшы пасля сябе шматлікія рукапісы, асобныя з якіх ягоныя вучні выдалі ў часопісе *"Фаланга"*.

У аснову свайго вучэння Фур'е паклаў выразна натуралістычную канцэпцыю чалавека. Ён вучыў, што чалавечыя захапленні па сутнасці добрыя, што цалкам уся навука пра чалавека грунтуецца на "тэорыі прыцягнення і адштурхоўвання па захапленні" і, нарэшце, што "законы прыцягнення па захапленні" з'яўляюцца "па ўсіх момантах адпаведнымі законам матэрыяльнага прыцягнення, тлумачэнне якіх далі Ньютан і Ляйбніц", прычым ёсць "еднасць сістэмы руху як матэрыяльнага, так і духоўнага свету"[2].

Адсюль гісторыя чалавецтва падаецца толькі аспектам сусветнага руху, "які падзяляецца на чатыры асноўныя віды: сацыяльны, жывёльны, арганічны і матэрыяльны"[3].

Гаворка ідзе пра такі ж поўны натуралізм, як, напрыклад, у Марэлі. Але новае ў ідэях Фур'е — тое, што ён прызнае натуральнае чаргаванне розных фазаў у гісторыі, або натуральную сацыяльную эвалюцыю. Пасля першабытнага этапу, калі грамадства не існуе, надыходзяць стадыі дзікунства, барбарства і цывілізацыі. Зараз чалавецтва знаходзіцца на этапе цывілізацыі, які рыхтуе пераход да новай стадыі — стадыі гармоніі.

Прыкметы пераходу да гармоніі аўтар заўважаў у бяз-

[1] *Цыт. па творы: Henri Gouhier, La jeunesse d'Auguste Comte et la formation du positivisme, Paris, 1933—1941, t. II, p. 212.*

[2] *Théorie des quatre mouvements, in OEuvres complètes, t. I, 2e éd., 1841, p. 18.*

[3] *Ibid., p. 44.*

ладдзі, выкліканым панаваннем гандлю на свеце і перш за ўсё ангельскага гандлю.

"Няшчасныя нацыі, — усклікаў ён, — вы прысутнічаеце пры велізарным пераўтварэнні, якое, здаецца, пачынаецца з усеагульнага ўзрушэння. Менавіта сёння цяперашняе цяжарнае будучыняй і неверагодная колькасць пакутаў павінна прывесці да выратавальнага крызісу. Калі паглядзець на крайнасці і велізарныя памеры палітычных узрушэнняў, дык можна было б сказаць, што прырода прыкладае высілкі, каб скінуць цяжар, які яе прыгнятае: войны, рэвалюцыі няспынна палаюць у розных кутках зямлі; ледзь суняўшыся, навальніцы зноў паўстаюць з попелу, нібы галовы гідры паўстаюць з-пад удараў Геркулеса; спакой — гэта толькі ілюзія, хвіліннае трызненне; эканамічная дзейнасць зрабілася пакутай для народа з таго часу, як востраў піратаў перашкаджае гандлёвым дачыненням, адмоўна ўздзейнічае на сельскую гаспадарку абодвух кантынентаў і ператварае майстэрні ў расаднікі жабрацтва... Меркантыльнасць працерабіла новыя шляхі злачынству, з кожнай вайной прыходзяць новыя пакуты ў абодва паўшар'і; і нацыі, што знаходзяцца на стадыі дзікунства, заражаюцца распустаю цывілізаванай прагнасці... На зямлі пануе жахлівы палітычны хаос, яна чакае рукі новага Геркулеса, каб ачысціцца ад сацыяльных жахаў, ад сваёй ганьбы...

Ужо з'явіўся новы Геркулес...[1] Каб поўнасцю зганьбіць сучасных тытанаў, Бог пажадаў, каб яны былі зрынутыя вынаходнікам, далёкім ад навукаў, і каб на долю практычна непісьменнага чалавека выпала фармуляванне тэорыі сусветнага руху: менавіта "крамнік" змяшае багацце кнігаў па палітыцы і маралі, ганебны вынік антычных і навачасных шарлатанстваў. Не першы раз Бог выкарыстоўвае ціхмянага, каб прынізіць фанабэрыю бліскучага, і абірае самага непрыкметнага, каб той перадаў Сусвету самае важнае пасланне"[2].

Відовішча паслярэвалюцыйнага бязладдзя пераканала Фур'е ў тым, што ў свеце мусіць адбыцца "разбурэнне натуральнага парадку"; "цывілізацыя" расчаравала Фур'е настолькі ж моцна, наколькі яна расчаравала Марэлі або Маблі. Такім чынам, паўстае неабходнасць стварэння іншага сацыяльнага ладу, які, нарэшце, дазволіць усім нашым прыродным схільнасцям свабодна рэалізавацца; такі лад — гэта "гармонія", наканаванне чалавецтва.

"Гармонія" будзе характарызавацца існаваннем фаланстэра, які стане асновай сацыяльнага жыцця. Фаланстэр — гэта асацыяцыя для супольнай працы і жыцця, створаная

---

[1] *Гаворка ідзе пра самога Фур'е.*

[2] *Cité par E. Poisson, Fourier, Paris, 1932, pp. 44—45.*

дакладна вызначанай колькасцю індывідаў — мужчынаў і жанчынаў, якія складаюць "Фалангу".

У гэтым грамадстве перавага будзе аддавацца сельскагаспадарчай працы і галоўным чынам садаводству, паколькі Фур'е — зацяты вораг гарадоў, прамысловасці і буйнамаштабных праектаў. Ён хацеў зрабіць працу прывабнай, арганізуючы спецыялізаваныя "шэрагі" і групы, да якіх кожны зможа далучыцца ў залежнасці ад сваіх сімпатыяў і паміж якімі кожны зможа свабодна "пырхаць".

З юрыдычнага гледзішча фаланстэр будзе акцыянерным таварыствам, створаным з унёскаў ягоных сяброў, якія неабавязкова роўныя. Прыбыткі будуць падзяляцца наступным чынам: 4/12 — тым, хто ўкладвае капітал, 5/12 — працаўнікам, а астатняе прызначана на ўзнагароджанне "таленту". Як на роўні багацця, так і на роўні ладу жыцця Фур'е не хоча ўсталёўваць поўнай роўнасці паміж людзьмі. На яго думку, гэта можа зашкодзіць разнастайнасці, якая ва ўсіх галінах ёсць адной з умоваў гармоніі. Такім чынам, у фаланстэры будуць існаваць разнастайныя класы, становішча якіх адпавядае адрознаму роўню камфорту. Але тым не менш ніякая супярэчнасць не можа паўстаць паміж багатымі і беднымі, бо ўсе ў роўнай ступені будуць зацікаўленыя ў росквіце асацыяцыі. "Простая прагнасць" ператворыцца ў "складаную прагнасць", якая, не будучы прычынаю беспарадку, ёсць самая моцная з усіх сацыяльных сувязяў.

Каб дасягнуць стану гармоніі, Фур'е не выступаў за рэвалюцыю. Згодна з ягонымі асноватворнымі тэзісамі, пераход да новага этапу гісторыі абавязкова здзейсніцца, калі надыдзе належны момант, і не трэба імкнуцца наблізіць гэты момант. Фур'е абмежаваўся апісаннем сацыяльнага ладу будучыні. Затым цярпліва чакаў, пакуль нейкі мецэнат прапануе стварыць першы фаланстэр. Пры яго жыцці такога мецэната не знайшлося. Але шматлікія вучні Фур'е спрабавалі ствараць супольнасці накшталт прапанаванае Фур'е[1], перакананыя, што поспех такіх супольнасцяў

[1] *У прыватнасці, Віктор Кансідэран стварыў у 1855 г. фаланстэр у Тэхасе. У 1859 г. яшчэ адзін паслядоўнік Фур'е — Гадэн заснаваў Гізскі фамілістэр, які ў 1880 г. ператварыўся ў просты вытворчы кааператыў.*

абавязкова выкліча жаданне пераймаць і неўзабаве зменіць жыццё ўсіх народаў.

§ 2. Роберт Оўэн і кааператыўны рух

Тут гаворка — пра асноўнага прадстаўніка ангельскай сацыялістычнай думкі першай паловы XIX ст. Ягоны ўплыў быў вялікі, паколькі ідэі Маркса прасочваліся ў рабочы рух Вялікабрытаніі з цяжкасцю.

Оўэн (1771—1858) не вылучаў усеагульнай тэорыі грамадскай эвалюцыі. Чаргаваннем цывілізацыяў ён цікавіўся менш, чым паляпшэннем "характару" індывідаў. У гэтым ён заставаўся верным традыцыі "утылітарысцкіх" рэфарматараў XVIII ст., найбольш значным з якіх быў Годўін. Оўэн таксама абвясціў сябе вучнем больш ранняга аўтара — Джона Бэлэрза, які ў 1696 г. прапанаваў праект індустрыяльных калегіяў, прызначаных дзеля знішчэння галечы і ў той жа час дзеля маральнай і інтэлектуальнай адукацыі працоўных. Джон Бэлэрз, без сумневу, — першы, хто прапанаваў рэальную праграму карэннай перабудовы функцыянавання эканомікі. Тым не менш ён не патрабаваў гвалтоўнага разбурэння грамадства. Бэлэрз меркаваў, што багацеі ў сваіх жа інтарэсах павінны быць зацікаўленыя ў паляпшэнні лёсу беднякоў. Ён таксама прадугледжваў, што багатыя могуць разлічваць на частку даходаў, атрыманах у калегіях[1].

Оўэн цесна спалучаў маральную рэформу і пераўтварэнне эканамічнай сістэмы. Ягоныя галоўныя творы — *"Новае бачанне грамадства, або Досведы прынцыпу фармавання чалавечага характару"* (1813—1818) і *"Новы маральны свет"* (1836—1844).

Ён прапаведваў цалкам свецкую мараль, а ягоная бязбожнасць заўсёды выклікала скандал у пабожнай Ангельшчыне. Оўэн даходзіў да поўнага адмаўлення свабоды волі, але таму, што лічыў чалавека прадуктам асяроддзя. Ён сцвярджаў, што чалавек здольны ўспрыняць велізарны пра-

[1] *Cf. G. J. Holyoake, The History of cooperation, 1875; nouv. éd., London, 1906, t. I, pp. 19—22.*

грэс, які абавязкова прывядзе грамадства да стану дасканалай гармоніі.

"З усёй відавочнасцю вынікае, — пісаў ён, — што чалавечая прырода можа палепшыцца. Гэта адбудзецца толькі дзякуючы прыняццю разумных заканадаўчых крокаў з мэтай выхавання ў новага пакалення самых лепшых звычак, самых справядлівых і найбольш шчырых пачуццяў"[1].

Такім чынам, Оўэн адстойваў актыўную палітыку паляпшэння ўмоваў жыцця чалавека, палітыку, якая грунтуецца на навуцы пра мараль — "эталогіі". Асноватворным прынцыпам гэтай навукі было: усе людзі маюць інтарэс у яднанні ў працы, ва ўзаемнай кааперацыі.

"Калі існуе проціелеглая ісціне дактрына, — пісаў Оўэн, — дык гэта тая, якая вучыць, што прыватны інтарэс у нашым сённяшнім разуменні з'яўляецца больш слушным прынцыпам для стварэння грамадства ў агульных інтарэсах, чым прынцып яднання і ўзаемнай кааперацыі. А паколькі жыццё даказала, што ў яднанні, у хаўрусе людзі шматкроць павялічваюць сваю разбуральную сілу ў параўнанні з сілаю адасобленых індывідаў, раз'яднанага мноства, дык ці не будзе яднанне, спалучэнне мець гэткую ж эфектыўнасць у тым, што датычыць стварэння і захавання?"[2]

На што Рыкарда ў 1819 г. адказаў наступнымі радкамі:

"Ці можа разумны чалавек разам з Оўэнам лічыць, што прапанаваны ім тып грамадства зможа квітнець і вырабляць больш, чым вырабляецца да гэтага часу такой жа колькасцю людзей, калі стымулам будзе супольны інтарэс, а не асабістыя інтарэсы? Ці не паўстае супраць яго векавы досвед?"[3]

На працягу ўсяго свайго жыцця Оўэн імкнуўся адказаць на выклік эканаміста, бо быў не толькі мысляром, але й чалавекам дзеяння.

У 25 гадоў Оўэн дзякуючы сваім асабістым намаганням стаў уладальнікам адной з буйнейшых прадзільных фабрыкаў Ангельшчыны; ён пабраўся шлюбам з дачкой багатага прадпрымальніка з Нью-Ланарка і кіраваў прадпрыемствам, на якім працавала 2000 рабочых.

Як толькі Оўэн атрымаў пэўную ўладу, ён пачаў барацьбу за маральную рэформу; ён з поспехам змагаўся з п'ян-

[1] *Cité par Hector Denis, Histoire des systèmes économiques et socialistes, Paris, 1904–1907, t. II, p. 446.*
[2] *Ibid., p. 440.*
[3] *Ibid.*

ствам, а з мэтай абароны рабочых ад эксплуатацыі з боку дробных гандляроў арганізаваў продаж прадуктаў па гуртовых коштах. З дапамогай сістэмы грамадскага асуджэння Оўэн разгарнуў барацьбу супраць крадзяжоў. Нарэшце, дамогся даверу сваіх працоўных, захоўваючы іхныя заробкі на ранейшым роўні пад час спынення ў 1806 г. працы на фабрыцы на 4 месяцы ў выніку баваўнянага эмбарга, накладзенага Злучанымі Штатамі Амэрыкі.

Аднак кампаньёны Оўэна не былі ўпэўненыя, што ён дзейнічае ў інтарэсах справы, і кампанія была зліквідаваная. Тады Оўэн засноўвае новую фірму, каб стварыць узорны завод, на якім адбывалася б "перавыхаванне людзей". Адначасова ён далучыўся да кампаніі барацьбы за ахову працы дзяцей.

Пачынаючы з 1817 г. ягоныя планы пашыраюцца да ідэі рэарганізацыі ўсяго грамадства. Оўэн жадаў знішчыць дысбаланс паміж вытворчасцю і спажываннем, які заўсёды мае месца ў капіталістычнай эканоміцы. Дзеля гэтага, лічыў ён, трэба радыкальным чынам змяніць эканамічную структуру і арганізаваць кааператыўную вытворчасць на аснове супольнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

Ягоны план, які мусіў прывесці да скасавання прыватнай уласнасці, крыніцы эгаізму, прадугледжваў пэўны тэрмін, за які людзі павінны былі прасякнуцца камунітарным духам. Такім чынам, скарыстанне сістэмы пачыналася з незанятых працоўных, якія меліся яднацца ў кааператыўныя вёскі прыкладна па 1200 чалавек. У вёсках людзі мусілі б займацца не толькі сельскагаспадарчай, але і прамысловай працай.

Аднак у тагачаснай Ангельшчыне ніхто не пагаджаўся забяспечыць Оўэна сродкамі дзеля ажыццяўлення ягоных праектаў на практыцы; тады ў 1824 г. ён вырашыў заснаваць у Амэрыцы калонію, якая атрымала назоў "New Harmony" і налічвала 800 кааператараў; але пасля вяртання фундатара ў Эўропу калонія раздрабілася і скончыла сваё існаванне.

Сутыкнуўшыся з такім правалам, рэфарматар вырашыў падысці да праблемы з іншага боку. Звяртаючыся да пра-

цоўных капіталістычных заводаў, Оўэн прапанаваў ім ствараць спажывецкія кааператывы, трымацца пэўнага правіла: замест таго каб размяркоўваць дывідэнды сярод спажыўцоў, іх трэба капіталізаваць, а атрыманыя праз гэта сродкі павінны забяспечыць паступовы пераход да жыцця толькі камунаю.

Напачатку рух зазнаў магутны ўздым; у 1832 г. налічвалася 700 таварыстваў. Але неўзабаве ён распаўся, паколькі кааператары не здолелі ўзняцца да Оўэнава ідэалу і ахвяраваць у імя яго сваімі асабістымі інтарэсамі.

Далей энергія філантропа Оўэна рэалізоўвалася ў новай галіне. Упэўнены ў тым, што існаванне грошай абумоўлівае той факт, што ў перыяды крызісу працоўныя змушаныя галадаць, хоць усяго багата ў краіне, Оўэн у 1832 г. прапанаваў замяніць грошы на "працоўныя боны", якія размяркоўваліся б кожнаму ў залежнасці ад колькасці гадзінаў, прысвечаных працы.

З мэтай ажыццяўлення гэтага праекта ён стварыў у Лондане, потым і ў многіх іншых гарадах "крамы абмену працы", у якія кожны член асацыяцыі меўся прыносіць прадукты сваёй працы і набываць іншыя. Адразу ж паўстала цяжкасць вызначэння вартасці тавараў, а таксама замяшалася нядобрасумленнасць некаторых людзей; новая спроба таксама правалілася.

З няспыннай энергіяй Оўэн да скону нараджаў новыя і новыя праекты. У 1835 г. стварыў "асацыяцыю ўсіх класаў нацыі", якая ў перыяд з 1840 да 1844 г. намагалася ажыццявіць у Англельшчыне новую спробу ўсеагульнай кааперацыі. Ён быў таксама адным з ініцыятараў стварэння ў Вялікабрытаніі рабочых прафсаюзаў.

У галіне кааперацыі самым значным практычным плёнам высілкаў Оўэна быў эксперымент, здзейснены "рочдэйлскімі справядлівымі піянерамі", эксперымент, які стаў кропкай адліку для ангельскага кааператыўнага руху.

У 1844 г. 28 рабочых-ткачоў, расчараваных чартысцкім рухам і паразай страйка, сабраліся ў Рочдэйле і заснавалі кааператыўную краму дзеля набыцця спажывецкіх тавараў. З самага пачатку яны вызначылі ў якасці далейшай мэты

стварэнне мануфактуры і набыццё зямлі з тым, каб заснаваць калонію паводле апісанага Оўэнам узору.

Яны першыя заклалі прынцып размеркавання даходаў адпаведна з набыткам кожнага, прынцып, які застанецца асноватворным для ўсіх спажывецкіх кааператываў капіталістычнага свету.

Гэты рух даволі хутка прывёў да стварэння пэўнай колькасці спажывецкіх кааператываў (у 1851 г. у Ангельшчыне і Шатляндыі іх налічвалася 130), але дасягнуць істотных поспехаў у галіне вытворчасці не ўдалося, хоць гэта й было сапраўднай мэтай ягоных заснавальнікаў.

Сацыялізм Фур'е і Оўэна моцна адрозніваўся ад сацыялізму, які мы сустракалі ў Русо і асабліва ў Фіхтэ. Гаворка больш не ідзе пра тое, каб заснаваць новую дзяржаву, умяшанне якой забяспечыць панаванне справядлівасці. Сацыялісты-асацыяністы не прызнавалі дзяржаву. У іхным бачанні нацыя павінна складацца толькі са спалучэння пэўнай колькасці кааператыўных і самакіравальных фаланстэраў або калоніяў.

У выніку радыкальным чынам вырашаецца праблема захавання індывідуальнай свабоды ў сацыялістычным грамадстве. Паколькі сябры асацыяцыяў супольнай працы і жыцця маюць аднолькавыя мэты і бяруць непасрэдны ўдзел у здзяйсненні агульных справаў, дык індывід застаецца свабодным, а справядлівасць — рэалізаванай. Робіцца зразумелым, чаму такі сацыялізм выклікаў захапленне шматлікіх розумаў[1]. Аднак цалкам відавочна, што ён сутыкаецца з фундаментальнай цяжкасцю. У навачасным свеце эканамічнае жыццё грунтуецца на існаванні надзвычай складаных дачыненняў паміж усімі членамі асобнай нацыі і нават паміж членамі розных нацыяў, бо гандлёвыя стасункі, што вынікаюць з падзелу працы, звязваюць людзей, вельмі далёкіх у прасторы. Вытворчай адзінцы пастаўляюцца тавары з розных месцаў, часта далёкіх адно ад другога. Тавары вытворчай адзінкі знаходзяць збыт на шырокім рынку. Каардына-

[1] *Яшчэ і сёння такія аўтары, як Гэрбэрт Маркузэ, расчараваныя досведам сацыялізму ў краінах Усходняй Эўропы, развіваюць думкі, якія спадабаліся б Фур'е.*

цыя дзейнасці, калі яна не забяспечваецца законамі канкурэнцыі, павінна ажыццяўляцца дзякуючы планаванню.

Хоць Фіхтэ і не разглядаў асобна праблемаў, падкінутых развіццём буйной прамысловасці, ён прапанаваў праграму, якая закранала таксама гэтую галіну. Асацыянісцкі ж сацыялізм, наадварот, проста адмаўляў існаванне такіх праблемаў. Аднак відавочна, што сістэма "крамаў абмену працы" не з'яўляецца адэкватным развязаннем праблемаў грамадства. Скасаванне грошай, зусім не спрыяючы каардынацыі дзейнасці адзінак эканомікі, наадварот, ускладняе падобную каардынацыю.

Бібліяграфія

Дамаркісцкі сацыялізм стаў аб'ектам шматлікіх агульных даследванняў, з якіх мы працытуем толькі асноўныя:

M. Leroy, *Les précurseurs français du socialisme de Condorcet à Proudhon*, Paris, 1948.

P. Louis, *Histoire du socialisme en France: les faits, les idées, les partis ouvriers, de la révolution à nos jours*, Paris, 1950.

A. Cuvillier, *Hommes et idéologies de 1840*, Paris, 1956.

C. Bouglé, *Socialismes français: du "socialisme utopique" à la "démocratie industrielle"*, Paris, 1932.

G. et H. Bourgin, *Le socialisme français de 1789 à 1848*, Paris, 1912.

M. Beer, *A History of British Socialism*, London, 1940.

G. D. H. Cole, *A History of Socialist Thought*, t. I, London, 1953.

M.-M. Martin, *Les doctrines sociales en France et l'évolution de la société française du XVIIIe siècle à nos jours*, Paris, 1963.

J. Russ, *La pensée des précurseurs de Marx*, Paris, 1973.

Таксама можна знайсці карысную інфармацыю ў:

E. Faguet, *Politiques et moralistes au XIXe siècle*, Paris, 1891—1900.

H. Michel, *L'idée de l'Etat. Essai critique sur l'histoire des théories sociales et politiques en France depuis la Révolution*, Paris, 1896.

Пра Фур'е можна прачытаць:

E. Poisson, *Fourier*, Paris, 1932.

F. Armand et R. Maublanc, *Charles Fourier*, Paris, 1937.

Cahiers inédits de Fourier, publiés par E. Poulat, Paris, 1957.

Пра Оўэна можна даведацца:

E. Dolléans, *Robert Owen*, Paris, 1907.

G. D. H. Cole, *The life of Robert Owen*, London, 1930.

Раздзел II

ТЭХНАКРЫТЫЧНЫ САЦЫЯЛІЗМ. СЭН-СІМОН І ЯГОНЫЯ ВУЧНІ

§ 1. Жыццё і творы Сэн-Сімона

Клёд Анры дэ Рувруа, граф дэ Сэн-Сімон, які нарадзіўся ў 1760 г. у Парыжы, вёў надзвычай бурны лад жыцця. Ён належаў да аднаго з найбольш вядомых родаў французскай арыстакратыі і быў сваяком знакамітага мемуарыста. Напачатку паспрабаваў сябе ў вайсковай кар'еры і ў 1779 г. змагаўся ў Амэрыцы на баку паўстанцаў. Пасля вяртання ў Эўропу пакінуў войска і вандраваў. У 1789 г. ён адкрыта стаў на бок новых ідэяў, урачыста адмовіўшыся ад сваіх тытулаў і назваўшы сябе грамадзянінам Баномам.

Страціўшы ў выніку рэвалюцыі большую частку маёмасці (дакладней, сваіх спадзяванняў на спадчыну), Сэн-Сімон імкнуўся разбагацець на спекуляцыі нацыянальнай маёмасцю ў кампаніі з прускім амбасадорам у Ангельшчыне панам дэ Рэдэрнам. Але гэта прывяло да зменаў у ягоным жыцці, і ў 1793—1794 гг. ён мусіў правесці год у астрозе.

Застаўшыся без падтрымкі пана дэ Рэдэрна, Сэн-Сімон вырашыў прысвяціць сябе навуцы і філасофіі. Падтрымаўшы Банапарта, у якім бачыў чалавека, здольнага ажыццявіць ягоныя праекты, Сэн-Сімон пачаў публікаваць свае ідэі: у 1802 г. выходзяць "*Лісты жыхара Жэнэвы да сваіх сучаснікаў*" і "*Ліст да эўрапейцаў*"; у 1807—1808 гг. —"*Уводзіны ў навуковыя працы XIX ст.*", а ў 1813 г. — "*Памятка аб навуцы пра чалавека*".

У тыя часы ягоная думка грунтавалася на канцэпцыі гісторыі, у якой адначасова спалучаліся прагрэсіўныя ідэі Кандарсэ з кансерватыўнымі ідэямі віконта дэ Банальда.

З аднаго боку, Сэн-Сімон не верыў, што калісьці можа адбыцца вяртанне да старога грамадства, але, з другога боку, ён глыбока пераканаы ў неабходнасці аднаўлення належнага парадку.

"Чытаючы і абдумваючы творы пана дэ Банальда, — пісаў Сэн-Сімон, — я пераканаўся, што аўтар глыбока адчуў карыснасць сістэма-

тычнай еднасці... і на гэты конт я цалкам падзяляю погляды пана дэ Банальда"[1].

Сэн-Сімон лічыў, што рэвалюцыя распачала новы этап у жыцці чалавецтва, які, дарэчы, вядзе чалавецтва "да вяршыні ягонага існавання"; пры гэтым ён разам з традыцыяналістамі меркаваў, што парадак павінен абапірацца на эліту, надзеленую рэлігійнымі і палітычнымі функцыямі:

"Існаванне святарства і шляхты — арганічны стан чалавечага роду..., калі індывіды, якія належаць да гэтых класаў, згубілі свае лепшыя, цудоўныя якасці; трэба, каб склад гэтых класаў змяніўся, каб яны былі рэарганізаваныя і пераўтвораныя. Добрая рэарганізацыя святарства і шляхты можа ажыццявіцца толькі з дапамогай выключнага генія"[2].

Такім чынам, пераканаы ў тым, што "з-за ўсеагульных законаў свайго захавання" грамадства павінна грунтавацца на ўладзе пастараў і ўладароў, таксама ўпэўнены, што былая рэлігія і былая палітычная ўлада больш не адновяцца, Сэн-Сімон меў патрэбу ў тым, каб знайсці падмурак новай рэлігіі і новай улады.

Такім падмуркам, на ягоную думку, меліся стаць навука і прамысловасць. Новыя палітычныя лідэры будуць кіраўнікамі прамысловасці, улада якіх будзе апраўдвацца ў вачах людзей найвялікшай паслугай, зробленай імі народу, — забеспячэннем дабрабыту. Новымі пастарамі будуць навукоўцы, якія разгадаюць самыя вялікія сакрэты Сусвету.

Аднак падзенне імператара пазбавіла Сэн-Сімона надзеі на арганізацыю новага ладу. Філосаф усё больш і больш паварочваецца ў бок прамыслоўцаў і банкіраў. Менавіта тады ён узяўся за вывучэнне палітэканоміі па кнізе Жана Батыста Сэя. Думкі Сэя падмацоўвалі Сэн-Сімонава прадчуванне росту ролі прамысловасці, аднак не пераканалі яго ў неабходнасці "не перашкаджаць", супраць чаго паўставаў ягоны тэмперамент энтузіяста. Сэн-Сімон не мог пагадзіцца, што дзеля забеспячэння грамадскага парадку было дастаткова грунтавацца на эгаізме людзей. Ён, наадварот, жадаў ажыццявіць тое, што абяцалася хрысціянствам, — усеагульнае братэрства. Дзеля гэтага неабходна, каб усе індывіды ўзняліся да ўсведамлення ўзаемнай дапа-

[1] *Introduction aux travaux scientifiques du XIXe siècle, cité par Henri Gouhier, La jeunesse d'Auguste Comte et la formation du positivisme, Paris, 1933–1941, t. II, p. 338.*
[2] *Gouhier, op. cit., t. II, en exerque.*

могі ў працы. "Праз павелічэнне патрэбаў і разнастайных відаў працы, — казаў ён, — можна дасягнуць братэрства людзей"[1].

Сэн-Сімон узяў да сябе сакратаром Агюстэна Т'еры і ў 1814 г. у супрацоўніцтве з апошнім выдаў твор "Пра эўрапейскую рэарганізацыю". Затым звярнуўся да справавых людзей з заклікам аб фінансавай дапамозе, і ў 1816 г. яму ўдалося выдаць шэраг нататкаў пад агульным назовам "*Прамысловасць*".

У жніўні 1817 г. малады Агюст Конт стаў ягоным сакратаром і ў супрацоўніцтве з ім Сэн-Сімон выпусціў зборнікі "*Палітыка*" (1818—1819) і "*Арганізатар*" (1819—1820), менавіта апошні зборнік змяшчае славутую парабалу, у якой Сэн-Сімон даводзіць, што калі б Францыя ў кожнай навуцы, у кожнай галіне мастацтва, у кожнай галіне прамысловасці, у кожным рамястве згубіла "пяцьдзесят лепшых", яна стала б целам без душы; калі б яна мела няшчасце страціць у адзін дзень усіх блізкіх сваякоў караля, усіх міністраў, маршалаў і членаў Дзяржаўнай Рады, увесь высокі клір, усіх прэфектаў, намеснікаў прэфектаў і суддзяў, усіх чыноўнікаў міністэрстваў і дзесяць тысяч самых заможных уласнікаў, дык "гэтае няшчаснае здарэнне, безумоўна, засмуціла б французаў, бо яны людзі добрыя", але "нічога благога не здарылася б". За гэтыя радкі Сэн-Сімона пераследвалі. Хоць менавіта ў гэты момант па няшчасным супадзенні быў забіты герцаг дэ Бэры, Сэн-Сімону ўдалося зняць з сябе абвінавачванні і апраўдацца.

У перыяд 1820—1822 гг. выйшаў новы зборнік "*Індустрыяльная сістэма*". Але грашовыя цяжкасці аўтара ўсё раслі; на працягу некалькіх гадоў Сэн-Сімона ўтрымліваў ягоны былы слуга. Конт аддаляўся ад настаўніка і нават канкураваў з ім. У 1823 г. Сэн-Сімон спрабаваў скончыць жыццё самагубствам.

Тады шматлікія вучні атачылі яго сваім клопатам; Сэн-Сімон напісаў яшчэ "*Катэхізіс кіраўніка прамысловасці*" (1823), а потым "*Новае хрысціянства*" (1824). Пасля смерці ў 1825 г. з яго зрабілі сапраўднага месію.

[1] *Cité par Gouhier, op. cit., t. III, p. 135.*

§ 2. Сэн-Сімонаў сацыялізм

Як у Фур'е, мы маем справу з сацыялістычнай тэорыяй, дзе аўтар імкнецца зыходзіць з навуковага даследвання гісторыі. У другой палове свайго жыцця Сэн-Сімон сцвярджаў, што гісторыя павінна стаць пазітыўнай навукай — "сацыяльнай фізікай", якая дазваляла б прадбачыць будучыню. У сваіх творах ён паказваў, што ў аснове гісторыі ляжыць чаргаванне перыядаў, пад час якіх пануе пэўны парадак, з эпохамі крызісу, калі руйнуецца стары лад і будуецца новы. Антычнасць, сярэднявечча і абсалютызм былі перыядамі першага тыпу. Пасля Французскай рэвалюцыі пачынаецца новы перыяд — індустрыяльны. З гэтага часу мэтамі грамадства робяцца вытворчасць і арганізацыя працы, а не вайна ці заваёвы.

У 1824 г. Сэн-Сімон прыдумаў слова "індустрыялізм", каб называць сваю сістэму, якую прасіў адрозніваць ад лібералізму.

Безумоўна, ягоная сістэма зусім не была накіраваная супраць уласнікаў. Часам граф нават адкрыта ліслівіў перад імі, напрыклад заяўляў:

"Захаванне ўласнасці — вялікая справа палітыкі. Адзіны бар'ер, які ўласнікі могуць супрацьпаставіць пралетарыям, — гэта сістэма маралі"[1].

Тым не менш вышэй за ўсё Сэн-Сімон ставіў абавязак працаваць і арганізацыю працы; менавіта ў гэтым ён — сацыяліст.

Пачынаючы з 1802 г., з "*Лістоў жыхара Жэнэвы*", закладаецца наступны прынцып: "Усе людзі павінны працаваць; абавязак кожнага — увесь час накіроўваць свае высілкі на карысць грамадства". Пазней Сэн-Сімон будзе абвінавачваць бяздзейных уласнікаў — "трутняў". Зрэшты, і ў ягонай парабале ўласнікі належаць да непатрэбных.

Ён хацеў арганізаваць працу такім чынам, каб забяспечыць маральны і фізічны прагрэс слабейшага класа[2]. Але Сэн-Сімон падкрэсліваў, што эканамічную арганізацыю нельга блытаць з палітычнай арганізацыяй.

---

[1] *Ibid., p. 159.*

[2] *Cité par Georges Gurvitch, L'idée du droit social, Paris, 1931, p. 305.*

Гэта тлумачыць, чаму ён часам займаў пазіцыі ліберала ў; вось чаму Сэн-Сімон дазволіў Агюстэну Т'еры напісаць у "*Прамысловасці*" наступнае:

"Жаданне кіраваць усім, падпарадкаваць усё правілам і падлікам — гэта самая вялікая чалавечая аблуда. Гандаль развіваецца сам па сабе і на падставе нутраной сілы, як прыродныя аб'екты; паскорыць развіццё з дапамогай вонкавага ўздзеяння азначае спыніць яго, разбурыць аб'ект"[1]. Ён жа сцвярджаў: "Людзям, занятым у прамысловасці, патрэбна адно — свабода"[2].

Чаго ён сапраўды хацеў, дык таго, каб прамысловасць развівалася сама па сабе, без абавязкова недарэчных умяшанняў палітычных уладаў. Сэн-Сімон абвяшчае "індустрыяльную Канстытуцыю" з "гандлёвым і прамысловым судом", з "прамысловымі радамі"; ён жадаў, каб кожны індывід уваходзіў у адну або некалькі прамысловых асацыяцыяў, якія б утваралі "ўсеагульную сістэму", накіраваную да "вялікай індустрыяльнай мэты"[3].

Нарэшце, надыдзе момант, калі "ўлада рэчаў" зможа цалкам замяніць "урад асобаў". Сэн-Сімон казаў: каб падрыхтаваць гэты момант, трэба даверыць палітычную ўладу кіраўнікам прамысловасці:

"Крокі па перадачы асноўных рычагоў палітычнай улады кіраўнікам прамысловасці будуць самыя важныя ў справе завяршэння рэвалюцыі... Вокамгненная канцэнтрацыя ўсёй палітычнай улады ў адзінай руцэ — гэта крок, з дапамогай якога падобны пераход можа адбыцца з найбольшай лёгкасцю"[4].

У тэзісе пра замену ўрада асобаў на ўладу рэчаў можна ўбачыць ідэю аб адміранні дзяржавы, распрацаваную Фіхтэ, аднак погляды Сэн-Сімона на ўладкаванне эканомікі вельмі розняцца ад поглядаў нямецкага філосафа. Аўтар *"Катэхізіса кіраўніка прамысловасці"* перакананы, што ўсталяванне добрай сістэмы арганізацыі працы і абмену не створыць іншых праблемаў, апрача тых, з якімі звычайна сутыкаюцца кіраўнікі буйных прадпрыемстваў і банкіры. Менавіта таму ён лічыў, што грамадскія праблемы будуць развязаныя, калі практыкі капіталістычнай эканомікі атрымаюць уладу.

[1] *Cité par Gouhier, op. cit., t. III, p. 137.*
[2] *Ibid., p. 138.*
[3] *Cf. Gurvitch, op. cit., p. 304.*
[4] *Ibid., p. 310.*

Тэхнакратычны сацыялізм можа прывабіць іншага яшчэ й сёння. Тым не менш трэба адзначыць, што ён грунтуецца на неразуменні своеасаблівага характару палітычных праблемаў.

§ 3. Вучні Сэн-Сімона

Па смерці Сэн-Сімона ягоныя вучні працягвалі распаўсюджваць ідэі свайго настаўніка; найбольш вядомымі былі банкаўскія служачыя Аленд Радрыгес і Праспэр Анфантэн, а таксама вялікі змоўшчык у імя чыстай палітыкі Сэнт-Аман Базар. Яны заснавалі перыядычнае выданне *"Вытворца"*, у якім пад уплывам ідэяў Фур'е і Сісмандзі, які прадказаў эканамічны крызіс 1826 г., жорстка крытыкавалі лібералаў.

Вучні Сэн-Сімона даказвалі, што свабодная канкурэнцыя прыводзіць да прыгнёту класа працоўных, і адбываецца гэта двума шляхамі. Па-першае, несправядлівымі з'яўляюцца стасункі паміж уладальнікамі капіталу, які наймае паслугі працоўнага, і самім працоўным; капіталіст пануе над працоўным, бо можа абысціся без працоўнага, а адваротнае немагчыма; з гэтага вынікае, што заробак нашмат ніжэйшы за вартасць прадукту працы. Па-другое, канкурэнцыя паміж уладальнікамі прадпрыемстваў часцей за ўсё адбываецца за кошт працоўных, заробак якіх у выніку канкурэнцыі скарачаецца; яна прыводзіць да падзелу грамадства на два класы — клас бяздзейных і клас працоўных.

Аднак найбольш значная праца вучняў Сэн-Сімона — гэта *"Пераказ"* вучэння настаўніка, якое яны ў 1829 г. падавалі ў форме лекцыяў. Менавіта ў апошніх мы знаходзім іх тэорыю прагрэсу, якую можна разглядаць у якасці самай значнай дамарксавай спробы, растлумачыць праз рух гісторыі сацыяльныя пераўтварэнні, што меліся адбыцца ў XIX ст.

Сэн-Сімон адрозніваў эпохі парадку і перыяды бязладдзя; з гэтага ягоныя вучні вывелі больш сістэматычнае адрозненне паміж "арганічнымі" і "крытычнымі" эпохамі. Згодна з імі, такому адрозненню адпавядала процілегласць паміж двума асноватворнымі рухачамі чалавечае дзейнасці:

на іх думку, у арганічныя эпохі дамінуе альтруізм, а ва ўсе іншыя — эгаізм[1].

Каб пабудаваць тэорыю прагрэсу, яны хацелі таксама паказаць, што пры пераходзе ад аднаго арганічнага перыяду да другога "лёс" чалавецтва паляпшаецца. Чалавецтва, казалі яны, ёсць калектыўная істота, якая ў сваім развіцці падпарадкоўваецца наступнаму "фізіялагічнаму закону": асацыяцыі, утвораныя паміж людзьмі, маюць схільнасць да пашырэння, і гэта адбываецца такім чынам, што антаганізмы, якія падзяляюць грамадства, паступова змяншаюцца. Спачатку была сям'я, потым поліс, нацыя, царква. А па меры таго, як дробныя групы інтэгруюцца ў буйнейшыя, знікаюць супярэчнасці ці то паміж групамі, ці ўнутры групаў. Першапачаткова паўсюль панавала "ўлада фізічнай сілы і эксплуатацыі чалавека чалавекам. Але паступова розум усё больш і больш перамагаў над сілай"[2].

Вось чаму мы можам сказаць, што, без аніякага сумневу, чалавецтва крочыць да стану "сусветнай асацыяцыі", пры якой канчаткова знікнуць усялякія антаганізмы. Поруч з "фізіялагічным" прагрэсам будзе ісці духоўны прагрэс; пачуцці, сяброўства будуць развівацца далей (хрысціянства — толькі этап такога развіцця); адначасова са знікненнем усіх адвольных сацыяльных супярэчнасцяў паўстане сапраўднае братэрства.

Такі прагрэс, сцвярджалі вучні Сэн-Сімона, абавязкова адбудзецца[3]; тым не менш іхная тэорыя прагрэсу маларэалістычная: на іх думку, менавіта пачуццё сяброўства штурхае індывідаў да стварэння ўсё больш і больш шырокіх асацыяцыяў; яны цалкам ігнаруюць уплыў развіцця тэхнікі на развіццё грамадства, а ў канчатковым рахунку, каб падмацаваць сваю перакананасць, звяртаюцца да ідэі Боскай сілы[4].

Здаецца, яны даволі павярхоўна азнаёміліся з творамі Сэя, Сісмандзі і Рыкарда і зрабілі выснову, што асноўнай

---

[1] *Doctrine de Saint-Simon. Exposition 1re année, nouv. éd., Paris, 1924, première séance.*
[2] *Ibid., 4e séance.*
[3] *Ibid., 2e séance, in fine.*
[4] *Ibid., 7e séance, in fine.*

крыніцай антаганізму, якую трэба ліквідаваць, з'яўляецца спадчына. Сапраўды, толькі яна дазваляе існаванне класа бяздзейных.

Ці існуе антаганізм, з аднаго боку, паміж бяздзейнымі і, з другога боку, "прамыславікамі" — працоўнымі і прадпрымальнікамі?

Аптымізм вучняў Сэн-Сімона палягаў на ідэі, што натуральная эвалюцыя грамадства прыводзіць да негвалтоўнага скасавання прывілеяў бяздзейных: развіццё банкаў, арганізацыя крэдыту сапраўды выклікаюць няспыннае зніжэнне працэнтнай стаўкі; неўзабаве ўладальнікі капіталаў змогуць выжыць толькі, калі будуць працаваць.

Часам, аднак, вучні Сэн-Сімона ўсведамляюць неабходнасць абаперціся на дзяржаву дзеля забеспячэння грамадскага прагрэсу. Яны казалі: трэба "перадаць дзяржаве, якая стане асацыяцыяй працоўных, права спадчыны, якое на сённяшні дзень з'яўляецца правам сям'і".

Безумоўна, сярод ідэяў вучняў Сэн-Сімона былі й слушныя, прычым падаваліся яны ў больш прывабнай форме, чым, напрыклад, ідэі Фур'е, таму ў Сэн-Сімона з'явіўся шэраг выбітных паслядоўнікаў: інжынераў, выкладчыкаў і вядомых прадпрымальнікаў — браты д'Эйхталь, Мішэль Шэвалье, Ісак Пярэйра, Іпаліт Карно і г. д.

У 1831 г. сям'я сэн-сімонаўцаў налічвала 79 чалавек: 2 найвышэйшыя старшыны — Анфантэн і Базар, 16 старшынаў калегіі, 22 сябры другога роўню, 39 сяброў трэцяга роўню або неафітаў[1].

З гэтага моманту сэн-сіманізм пачаў ператварацца ў новую рэлігію. Успрыняўшы думку Сэн-Сімона пра неабходнасць новай рэлігіі, важнасць пачуццяў, любові ў справе сацыяльных пераўтварэнняў, а таксама пад уплывам Анфантэна, вучні Сэн-Сімона імкнуліся літаральна выконваць запаветы свайго настаўніка, і ў выніку выбухнуў скандал.

Дзеля стварэння рэлігіі патрабавалася дактрына. Анфантэн, які меўся быць новым папам, імкнуўся гэтую дактрыну сфармуляваць, займаючы пазіцыі, супрацьлеглыя

[1] *Charléty, Histoire du saint-simonisme, Paris, 1931.*

“мёртваму хрысціянству”. У прыватнасці, ён супрацьстаўляў хрысціянскаму аскетызму “рэабілітацыю плоці” і культ жанчыны. Вучыў, што неўзабаве павінна прыйсці жанчына — месія, каб канчаткова стварыць новую рэлігію.

Некаторыя з гэтых ідэяў былі запазычаныя ў Фур’е. Пэўны час, жывучы ў Менільмантане, сэн-сімонаўцы, падобна, на практыцы прытрымліваліся свайго прынцыпу супольнасці жанчынаў, і ў 1832 г. яны мусілі паўстаць перад судом прысяжных за знявагу грамадскай маралі і добрых нораваў, а таксама за арганізацыю незаконных сходаў. Многія сябры грамады былі асуджаныя да турэмнага зняволення.

Пасля скандалу школа распалася. Асобныя палічылі, што ўсход будзе найлепшым полем дзейнасці. Сам Анфантэн накіраваўся ў Эгіпет, але там займаўся найперш практычнымі праектамі, у прыватнасці праектам пабудовы Суэцкага канала.

Пасля вяртання з Эгіпта ён прыйшоў да думкі, што, нягледзячы на ўсе хібы, “феадальны індустрыяльны рэжым” — неабходны этап на шляху пераходу да новага ладу. Анфантэн не ажыццявіў свайго праекта Суэцкага канала, але адыграў пэўную ролю ў развіцці чыгунак, і ў 1864 г. памёр, будучы адміністратарам чыгункі Парыж—Ліён—Марсэль (не выракаючыся, дарэчы, сваіх філасофска-рэлігійных ідэяў).

Бібліяграфія

Пра Сэн-Сімона і ягоную школу можна прачытаць:

M. Leroy, *La vie véritable du comte Henri de Saint-Simon*, Paris, 1925.

— *Le socialisme des producteurs, Henri de Saint-Simon*, Paris, 1924.

G. Weill, *Saint-Simon et son oeuvre*, Paris, 1894.

G. Brunet, *Le mysticisme social de Saint-Simon*, Paris, 1925.

E. Durkheim, *Le socialisme, sa définition, ses débuts, la doctrine de Saint-Simon*, Paris, 1928.

E. Halévy, *L’ère des tyrannies*, Paris, 1934.

G. Dumas, *Psychologie de deux messies positivistes, Saint-Simon et Auguste Comte*, Paris, 1905.

S. Charlety, *Histoire du saint-simonisme (1825—1864)*, Paris, 1896.

H. R. d’Allemagne, *Les saints-simoniens*, Paris, 1930.

M. Dondo, *The french Faust, Henri de Saint-Simon*, New York, 1956.

F. E. Manuel, *The new world of Henri de Saint-Simon*, Cambridge (E. U.), 1956.

Шмат аўтараў, пра якіх мы не вялі гаворку, вартыя азнаямлення, калі ёсць жаданне глыбока вывучыць французскі сацыялізм першай паловы XIX ст. Карысныя звесткі можна знайсці ў наступных творах:

R. Picard, *Le romantisme social*, New York, 1944.

J.-B. Duroselle, *Les débuts du catholicisme social en France (1822–1870)*, Paris, 1951.

J. Prudhommeaux, *Icarie et son fondateur Etienne Cabet; contribution à l'étude du socialisme expérimental*, Paris, 1926.

A. Cuvillier, *P. J. Buchez et les origines du socialisme chrétien*, Paris, 1948.

— *Hommes et idéologies de 1840*, Paris, 1956.

— *Un journal d'ouvriers: L'Atelier (1840–1850)*, Paris, 1954.

D. O. Evans, *Le socialisme romantique, Pierre Leroux et ses contemporains*, Paris, 1948.

P. F. Thomas, *Pierre Leroux, sa vie, son oeuvre, sa doctrine*, Paris, 1904.

H. Mougin, *Pierre Leroux*, Paris, 1938.

M. Dommanget, *Victor Considérant, sa vie, son oeuvre*, Paris, 1929.

L. A. Loubère, *Louis Blanc*, Evanston (E. U.), 1961.

J. A. R. Marriott, *The French revolution of 1848 in its economic aspect, vol. I: Louis Blanc's organisation du travail*, Oxford, 1951.

F. Duine, *Lamennais, ses idées, ses ouvrages*, Paris, 1922.

L. de Villefosse, *Lamennais ou l'occasion manquée*, Paris, 1945.

M. Mourre, *Lamennais ou l'hérésie des temps modernes*, Paris, 1955.

M. Dommanget, *Les idées politiques et sociales de Blanqui*, Paris, 1957.

A. B. Spitzer, *The revolutionary theories of Louis Auguste Blanqui*, New York, 1957.

J.-L. Puech, *La vie et l'oeuvre de Flora Tristan*, Paris, 1925.

G. Duveau, *La vie ouvrière sous le Second Empire*, Paris, 1946.

— *La pensée ouvrière sur l'éducation pendant la Seconde République et le Second Empire*, Paris, 1947.

Раздзел III

АРЫЕНТАЦЫЯ НА "НАВУКОВЫ САЦЫЯЛІЗМ"

Аўтары-сацыялісты, погляды якіх мы разглядалі дагэтуль, нячаста займаліся эканамічнымі даследваннямі. І перш за ўсё былі заклапочаныя згубнасцю, як яны лічылі, свабоды гандлю. Тыя ж эканамісты-сацыялісты, якіх мы зараз будзем вывучаць, займалі іншую пазіцыю. Яны не аспрэчвалі самой ідэі існавання эканамічнае навукі, але імкнуліся паказаць, што асобныя разважанні эканамістаў памылковыя і прыводзяць да памылковых высноваў. Такую пазіцыю займаў, напрыклад, Сісмандзі, а таксама тыя, каго англасаксонскія аўтары называюць "рыкардавымі сацыялістамі", паколькі яны скарыстоўвалі з асобных ідэяў Рыкарда дзеля крытыкі ліберальнай дактрыны.

§ 1. Сісмандзі (1773—1842)

Сісмандзі нарадзіўся ў Жэнэве, шмат гадоў пражыў у Ангельшчыне, дзе мог назіраць за сацыяльнымі пераўтварэннямі, спароджанымі развіццём буйной прамысловасці.

Напачатку яго прываблівалі перспектывы прагрэсу, да якога, здавалася, вяло індустрыяльнае развіццё; у 1803 г. выдаў трактат пад назовам *"Пра гандлёвае багацце"*, своеасаблівы папулярызаваны варыянт ідэяў Сміта.

Але ў наступныя гады Сісмандзі бліжэй пабачыў галечу працоўнага народа, стаў сведкам вялікага крызісу перавытворчасці 1817 г. у Ангельшчыне, і тады яго погляды карэнным чынам змяніліся. У 1819 г. ён выпусціў свае *"Новыя прынцыпы палітычнай эканоміі"*, якія ўяўлялі перш за ўсё палымяную крытыку ангельскага капіталізму і лібералізму.

"Адзіная нацыя, — пісаў ён, — дзе існуе такі кантраст паміж вонкавым багаццем і жахлівай галечай людзей, зведзеных да існавання за кошт дабрачынных арганізацыяў. Але гэтая нацыя, у нечым настолькі вартая пераймання і бліскучая нават у сваіх памылках, здолела сваім прыкладам спакусіць усіх дзяржаўных дзеячаў кантынента. Калі мае разважанні не дапамогуць брытанскай нацыі, дык, прынамсі, я зраблю паслугу чалавецтву і маім суайчыннікам, паказваючы небяспекі шляху, па якім брытанская нацыя ідзе. На ангельскім досведзе я дакажу, што заснаваць усю палітычную эканомію на прынцыпе бязмежнай канкурэн-

цыі азначае даць дазвол на антыграмадскія дзеянні і ахвяраваць інтарэсамі чалавецтва дзеля прагнасці прамыслоўцаў"[1].

Такім чынам, Сісмандзі хоча абапірацца на досвед і прыйсці да практычных высноваў. Мы, заяўляў ён, знаходзімся перад новай формай меркантылізму, якое неабходна ўнікнуць: панаваннем класа капіталістаў, на чале якога знаходзяцца купцы і прамыслоўцы, над класам працоўных.

Сапраўды, заробак працоўных ніколі не падымаецца вышэй за суму, неабходную рабочаму, каб выжыць. Безумоўна, гэта не непазбежна, як лічыў Мальтус, але стала звыклаю з'явай.

Паміж аплатай працы рабочага і вартасцю таго, што ён вырабіў, існуе розніца, якую Сісмандзі часам называе звышвартасцю (la mieux-value), а часам — прыбытковай вартасцю (la plus-value): і менавіта яна вінная ў тым, што мае месца велізарная няроўнасць багаццяў, бо толькі прадпрымальнікі атрымліваюць прыбытак.

Больш таго, няроўнасць будзе паглыбляцца, паколькі, з аднаго боку, звышвартасць ёсць "тым большай, чым большы прагрэс адбыўся ў вытворчасці і навуках"[2], і, з другога боку, канкурэнцыя паміж прадпрымальнікамі прыводзіць да скарачэння іх колькасці, бо той, хто вынаходзіць нейкі новы метад, не дзеліцца ім, а, наадварот, пачынае ўжываць яго толькі на ўласным прадпрыемстве з тым, каб панізіць кошт сваіх тавараў і зруйнаваць канкурэнтаў. Перад намі славутыя тэзісы Маркса аб паўперызацыі пралетарыяту і росце канцэнтрацыі капіталу.

Такім чынам, нават калі б капіталістычны лад функцыянаваў без збояў, ён быў бы непрымальны. Аднак ён наскрозь заганны, бо няздольны ўнікнуць цяжкіх крызісаў, у якія перыядычна трапляе.

Крызісы непазбежныя, бо капіталізм функцыянуе з мэтай вытворчасці не спажывецкіх вартасцяў, а менавых вартасцяў: прадпрымальнік не клапоціцца пра тое, ці ёсць ягоны тавар карысным для грамадства. Адзіны яго клопат —

[1] *Nouveaux principes d'économie politique, nouv. éd., Genève—Paris, 1951—1953, t. II, p. 245.*

[2] *Cité par Hector Denis, Histoire des doctrines économiques et socialistes, Paris, 1902, t. II, p. 518.*

ці можна з выгадай прадаць тавар. Пакупнікі — гэта людзі; але калі людзі ўсё больш і больш бяднеюць, дык пакупная здольнасць увесь час змяншаецца, і перыядычна недастатковая пакупная здольнасць спажыўцоў спрычыняецца да эканамічных крызісаў. Крызісы з цягам часу робяцца ўсё больш і больш цяжкімі, нават калі капіталісты знаходзяць часовы сродак барацьбы з імі праз заваёву замежных рынкаў збыту; рана ці позна абсурднасць сістэмы стане відавочнай[1].

Пасля такой суровай крытыкі, якая, дарэчы (мы пакажам гэта ў дачыненні да Маркса), не з'яўляецца цалкам апраўданай, можна было б чакаць ад Сісмандзі радыкальнай праграмы пераўтварэння грамадства, аднак аўтар быў на працягу ўсяго свайго жыцця абаронцам палітычных свабодаў і адчуваў, наколькі з гэтага гледзішча небяспечна ўскладаць на дзяржаву клопат кіравання вытворчасцю і размеркаваннем. Ён абмяжоўваецца прапановай правесці разнастайныя рэформы, мэта якіх — паляпшэнне юрыдычнага і эканамічнага становішча працоўных. Пры гэтым не павінна адбыцца пашырэння паўнамоцтваў дзяржавы.

Што ж прапануе Сісмандзі? Па-першае, ліквідаваць антаганізм паміж класамі праз забеспячэнне працоўным доступу да ўласнасці; ён быў адным з палымяных змагароў за права рабочых на частку прыбыткаў, г. зн. за перадачу часткі акцыяў прадпрыемстваў рабочым.

Затым, усведамляючы немагчымасць ажыццяўлення ідэі,

---

[1] *Cf. Nouveaux principes d'économie politique, nouv. éd., Genève—Paris, 1951, t. I, pp. 271—273. У гэтым творы па пытанні неравытворчасці можна знайсці нашмат складаныя і цікавыя погляды. У VI раздзеле другой кнігі аўтар дае вельмі арыгінальнае тлумачэнне крызісаў, калі піша: "Менавіта леташні даход павінен аплочваць сёлетнюю вытворчасць... Памылка тых, хто заклікае да неабмежаванай вытворчасці, паходзіць з факта, што яны пераблыталі стары даход з будучым даходам... У рэшце, ніколі ўся сукупнасць вытворчасці папярэдняга года не бывае роўнай сукупнасці вытворчасці гэтага года. Калі паступова расце вытворчасць, дык гандаль штогод павінен прыносіць невялікія страты і ў той жа час будучы даход расце. Калі страты нязначныя, ніхто не звяртае на іх увагі... Але калі мае месца вялікая дыспрапорцыя паміж новай і папярэдняй вытворчасцю, дык капіталы скарачаюцца, а нацыя замест таго, каб рушыць наперад, сунецца назад" (op. cit., t. I, p. 113). Гэтая ідэя адлегласці ў часе паміж атрыманнем даходаў і іхным выдаткоўваннем, на нашу думку, мае велізарнае значэнне, прынамсі, у тым, што датычыць асобнай катэгорыі даходаў — прыбыткаў. Бадай, няправільна лічыць, што прыбыткі нейкага года ствараюць пакупную здольнасць, якая пакрые вытворчасць таго ж самага года.*

ён прапанаваў прыняць новае заканадаўства, якое абавязвала б уладальнікаў прадпрыемстваў забяспечваць працоўных, якіх яны выкарыстоўваюць на сваіх прадпрыемствах, увесь час, нават тады, калі працоўныя хворыя або калі няма працы. Гэта магло б прымірыць усе класы грамадства, паколькі ў інтарэсах патрона было б клапаціцца пра рабочых і забяспечваць іх працай; пасля, без сумневу, прадпрымальнікі прыйшлі б таксама да забеспячэння ўдзелу працоўных у прыбытках.

Аднак адразу ж паўстаюць пытанні. Сісмандзі сам жа іх фармулюе: калі ў выніку крызісу прадпрымальнікі банкрутуюць, што будзе з рабочымі? Калі змяняюцца рынкі збыту, дык ці можна прымушаць гаспадара прадпрыемства, які больш не атрымлівае замоваў, захоўваць тым не менш ранейшую колькасць рабочых? І ці не з'яўляецца прапанаваная сістэма шляхам вяртання да старой цэхавай арганізацыі з усімі яе заганамі?

У канчатковым рахунку аўтар *"Новых прынцыпаў"* распісваецца ў сваёй бездапаможнасці.

"Я вам прызнаюся, — пісаў ён, — што, зазначыўшы, на чым палягаюць мае прынцыпы і ў чым справядлівасць, я не бачу шляхоў да яе рэалізацыі. Размеркаванне вынікаў працы паміж тымі, хто бярэ ўдзел у вытворчасці, уяўляецца мне найлепшым варыянтам, але, мне здаецца, прыйсці да такой сістэмы ўласнасці, карэнным чынам адрознае ад сённяшняе, як сведчыць гістарычны досвед, практычна немагчыма"[1].

§ 2. Рыкардаў сацыялізм у Ангельшчыне

Раней мы бачылі, якім чынам Уільям Годўін прыйшоў да сацыялістычных высноваў, грунтуючыся на даследаваннях Эдама Сміта. Нешта падобнае прасочваецца ў творы Чарльза Гола *"Наступствы цывілізацыі"*, выдадзеным у 1805 г. і які застаўся амаль невядомы. Аўтар абвінавачваў тагачасны лад у несправядлівасці. Гол абапіраўся на ідэю, што заробак працоўнага ніжэйшы за створаную ім вартасць.

Аднак толькі пасля выхаду *"Прынцыпаў"* Рыкарда і "Новых прынцыпаў" Сісмандзі атака супраць капіталізму набыла маштабнасць.

Томас Годскін (1783—1869) выдаў у 1825 г. *"Забароненую працу супраць прэтэнзіяў капіталу"*, а ў 1827 г. — *"Папулярную палітычную эканомію"*. Ён даказваў непатрэбнасць зямельных уласнікаў і капіталіс-

[1] *Cité par Hector Denis, op. cit., II, p. 293.*

таў, якія скарачаюць заробкі найманых рабочых да самага нізкага роўню і прысвойваюць увесь лішак вартасці, створаны працай. Годскін сцвярджаў, што працоўныя павінны атрымліваць усю вартасць, якую яны ствараюць. Тым не менш ён не вораг прыватнай уласнасці і адхіляе магчымасць дзяржаўнага ўмяшання ў эканоміку. Прафсаюзы рабочых, на думку філосафа, павінны дабіцца спынення эксплуатацыі працы з боку капіталу.

Джон Грэй (1799—1850) развіў аналагічную крытыку капіталізму ў сваім *"Курсе пра чалавечае шчасце"* (1825) і ў кнізе *"Сацыяльная сістэма"* (1831).

У практычным плане ў якасці дзейных сродкаў ён прапанаваў спрыянне таннаму крэдыту з боку нацыянальнага банка, а таксама скасаванне залатога эталона, што забяспечыла б развіццё грашовага абарачэння.

Аднак найбольш характэрным творам Рыкардава сацыялізму з'яўляецца праца, якую ў 1824 г. напісаў Уільям Томпсан: *"Даследванне прынцыпаў самага дзейнага дзеля забеспячэння людскога шчасця размеркавання багацця ў"*. Ён таксама разглядаў зямельную рэнту і прыбыткі капіталістаў у якасці часткі вартасці, скрадзенай у працоўных. Пераймаючы ідэі Бэнтама і Годўіна, Томпсан заўважыў, што прынцып карыснасці (забяспечыць найвялікшае шчасце найбольшай колькасці людзей) вымагае перадачы залішніх даходаў ад багатых самым бедным, якія ад гэтага атрымаюць большае задавальненне.

Між іншага, зазначаў ён, пераразмеркаванне даходаў па эгалітарным прынцыпе пацягне за сабой значнае павелічэнне вытворчасці, бо яно забяспечыць прадпрыемствам шырокі і пэўны рынак збыту.

Пры гэтым Томпсан быў праціўнікам усялякіх гвалтоўных крокаў па змене грамадскага ладу. У якасці пераходнага этапу ён прапаноўваў абмежаваць працэнтную стаўку. У 1827 г. выдаў кнігу *"Узнагароджаная праца"*, у якой падтрымаў кааператыўны рух Оўэна.

І нарэшце, тэмы, якія распрацоўваліся вышэйпамянёнымі аўтарамі, былі закранутыя ў 1839 г. амэрыканцам Джонам Брэем, які на той час жыў у Англельшчыне. Назоў ягонага твора можна перакласці наступным чынам: *"Што дрэннае ў працы і што трэба зрабіць, каб пераадолець гэта"*[1]. Даследванні Брэя па сваёй дакладнасці часам пераўзыходзілі працы ягоных папярэднікаў.

Прыхільнік камунізму, ён адзначаў, што такі лад немагчымы ў непасрэднай будучыні, бо трэба прайсці праз "пэўны падрыхтоўчы сацыяльны перыяд, у якім неабходна будзе забяспечыць суіснаванне індывідуальнай уласнасці на тавары з грамадскай уласнасцю на сродкі вытворчасці"[2].

На гэтым этапе будуць існаваць крамы, дзе "будзе вызначацца колькасць неабходных дзеля спажывання рэчаў і вартасць кожнай рэчы

[1] *Labour's Wrongs and Labour's remedies.*

[2] *Cf. les passages cités par Marx dans Misère de la philosophie, nouv. éd., Paris, Editions Sociales, 1946, p. 62.*

(у гадзінах працы)"[1]. Аўтар сцвярджаў, што гэта дазволіць кожнаму індывіду заўсёды набываць рэчы, якія будуць каштаваць столькі ж працы, колькі ён сам выдаткаваў, і эксплуатацыя будзе знішчаная.

§ 3. Карл Радбэртус і Карл Марло

У XIX ст. з прычыны палітычнага і эканамічнага адставання Нямеччыны тэзісы эканамічнага лібералізму былі ў ёй менш папулярныя, чым у Англельшчыне ці Францыі. Наадварот, з эканамічных законаў Рыкарда скарысталіся прыхільнікі сацыялізму.

Самы значны прадстаўнік Рыкардава сацыялізму ў Нямеччыне — Карл Радбэртус (1805—1875), які ў 1848 г. непрацяглы час быў міністрам караля Прусіі.

У 1842 г. Радбэртус апублікаваў твор *"Аб веданні нашых палітычных умоваў"*, а ў 1850—1851 гг. — *"Сацыяльныя лісты"*.

Выпрацоўку свайго вучэння ён скончыў у творы *"Нармальны працоўны дзень"*, які выйшаў у 1871 г.

Радбэртус таксама развіваў ідэю пра тое, што даходы ўласнікаў і капіталістаў — гэта адлічэнні з прадукту працы. Ён тлумачыў крызісы перавытворчасці недастатковасцю пакупной здольнасці працоўных і зрабіў унёсак у распаўсюджванне "тэорыі недастатковага спажывання". Адным з найважнейшых момантаў ягонай дактрыны з'яўляецца вельмі цвёрдае адстойванне прынцыпу калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Радбэртус уважаў, што пераход да такой уласнасці ў дачыненні да зямлі і капіталу будзе зыходнай кропкай новай эры ў гісторыі чалавецтва, якую называў "хрысціянска-сацыяльнай" эрай[2].

Аднак Радбэртус не заклікаў працоўных да паўстання і лічыў немагчымым скасаванне манархіі. Згодна з ягоным меркаваннем, сацыялізм будзе вынікам павольнай эвалюцыі, якая можа доўжыцца сотні гадоў.

На блізкай пазіцыі стаяў таксама Георг Вінкельблех

---

[1] *Ibid.*

[2] *Consulter, à ce sujet, G. D. H. Cole, A History of Socialist Thought, vol. II: Marxism and Anarchism (1850–1890), London, 1954, p. 23. Cf. également Charles Andler, Les origines du socialisme d'Etat en Allemagne, Paris, 1897.*

(1810—1865), які ў 1850—1859 гг. выпусціў пад псеўданімам Карл Марло трохтомную працу *"Даследванні арганізацыі працы, або Сусветная эканамічная сістэма"*.

Каб здзейсніць паступовы пераход да калектыўнай уласнасці на буйныя сродкі вытворчасці, Карл Марло прапанаваў забараніць усялякае новае назапашванне капіталу ў руках прыватных асобаў. Асабліва настойваў на тым, што ажыццяўленне ягоных праектаў патрабуе стабілізацыі колькасці насельніцтва; ён уважаў, што такой стабілізацыі можна дасягнуць, калі патрабаваць ад тых, хто жадае пабрацца шлюбам, вялікіх адлічэнняў у фонд сацыяльнай падтрымкі.

Бібліяграфія

Самым грунтоўным даследваннем творчасці Сісмандзі з'яўляецца кніга

J.-R. de Salis, *Jean-Baptiste Sismondi, la vie et l'oeuvre d'un cosmopolite philosophe*, Paris, 1932.

Пра ангельскіх сацыялістаў першай паловы XIX ст. можна прачытаць:

G. D. H. Cole, *A History of Socialist Thought*, t. I, London, 1953.

E. Halévy, *Thomas Hodskin*, Paris, 1903.

E. Dolléans, *Le chartisme*, Paris, 1912—1915.

G. S. Gilkes, *Les socialistes chrétiens et la société anglaise au milieu du XIXe siècle*, Toulouse, 1945.

C. E. Raven, *Christian Socialism, 1848—1854*, London, 1920.

J. P. Osier, *Thomas Hodskin*, Paris, 1976.

Раздзел IV

П'ЕР ЖАЗЭФ ПРУДОН

У перыяд 1820—1848 гг. Францыя ўяўляла сабою больш спрыяльную глебу для сацыялізму, чым Вялікабрытанія. Гэта становіцца зразумелым, калі прыняць пад увагу тое, што працоўнае насельніцтва, у значнай сваёй частцы даведзенае да жахлівай галечы, канцэнтравалася ў Парыжы, які таксама быў цэнтрам інтэлектуальнага жыцця, і калі згадаць, што пад час рэвалюцыі 1789 г. менавіта гэтае насельніцтва адыграла вельмі актыўную ролю[1].

Пасля рэвалюцыі 1830 г. у Францыі атрымоўваюць развіццё сацыялістычныя ідэі хрысціянскай накіраванасці, асноўнымі прапагандыстамі якіх былі Фелісітэ дэ Ляманэ (*"Словы верніка"*, 1834) і Бюшэ, натхняльнік кааператыўнага руху. Ідэя змянення грамадства дзеля адпаведнасці яго хрысціянскаму прынцыпу братэрства не была новаю. З ёю мы сустракаліся і ў Томаса Мора і ў Тамаза Кампанэлы. Хрысціянскія сацыялісты пачатку XIX ст. адрозніваюцца ад сацыялістаў іншых эпохаў тым, што звяртаюцца якраз да гэтага старога ідэалу. Нельга сказаць, што іхнае гледзішча было занадта арыгінальным. Гэтыя людзі заўсёды заставаліся ізаляванымі нават у асяроддзі сваіх жа таварышаў па веры, а часам нават і адлучанымі ад царквы (як было з Ляманэ). Таму нам падаецца неапраўданым распачаць тут аналіз іхных нататкаў. Абмяжуемся тым, што ўзгадаем імёны Агюста Блянкі, змоўшчыка, які ў 1839 г. паспрабаваў захапіць уладу, і Люі Бляна, што ў сваім творы *"Арганізацыя працы"* (1839) выказваўся на карысць яднання рабочых кааператываў адной галіны ў агульную арганізацыю.

Бальшыня гэтых людзей адыгралі пэўную ролю ў рэвалюцыі 1848 г., пад час якой мела месца другая спроба (пасля спробы камітэта грамадскага выратавання ў 1793 г.) прывесці народ да ўлады. У наступныя гады пасля паразы

---

[1] *Надзвычай кансерватыўны Шатабрыян у "Revue des Deux Mondes" ад 15 красавіка 1834 г. пісаў: "Грамадства, у якім асобныя індывіды маюць даход у памерах 2 мільёны, у той час калі іншыя даведзены да таго, каб напіхваць свае вартыя жалю хаціны стосамі гнілля... ці можа сярод прагрэсу ідэяў заставацца статычным грамадства, якое абапіраецца на такі падмурак?" (Cité par Maxime Leroy, La politique de Sainte-Beuve, Paris, 1911, p. 276).*

Другой Рэспублікі найбольшы ўплыў на рабочы рух у Францыі зрабіў сацыяліст П'ер Жазэф Прудон.

§ 1. Біяграфічныя звесткі

П'ер Жазэф Прудон нарадзіўся ў 1802 г. у сям'і рамеснікаў, якой на нейкі перыяд удалося дасягнуць пэўнай заможнасці. Сям'я мела ўласную краму і нават здолела набыць невялікі надзел зямлі. У дзяцінстве Прудон мусіў пасвіць валоў, потым дзякуючы стыпендыі здолеў паступіць у Безансонскі каралеўскі калеж, дзе меў бліскучыя поспехі. З 1827 да 1833 г. Прудон вандраваў па гарадах у пошуках працы па сваёй прафесіі друкара. Адначасова самастойна вывучаў габрайскую мову і даследваў Біблію, каб мець магчымасць атакаваць рэлігію "ў тым выглядзе, які ёй надалі багасловы". Пасля таго як Прудон у 1837 г. напісаў і выдаў *"Нарыс агульнай граматыкі"*, а таксама абараніў ступень бакалаўра, ён атрымаў ад Безансонскай акадэміі пенсію Suard, якая ў будучым забяспечыла ягонае існаванне і дазволіла дапамагаць сям'і.

Потым Прудон перабраўся ў Парыж, дзе браў удзел у выданні *"Каталіцкай энцыклапедыі"*, вывучаў замежныя мовы і палітычную эканомію, а таксама напісаў даклад па вылучанай Безансонскай акадэміяй конкурснай тэме *"Пра карысць святкавання нядзелі ў тым, што датычыць гігіены, маралі, сямейных і грамадскіх дачыненняў"*.

Аднак сапраўдная пісьменніцкая кар'ера Прудона пачалася ў 1840 г. з выхадам у свет нашумелай брашуры пад назовам *"Што такое ўласнасць?"* За выдадзеную двума гадамі пазней працу *"Папярэджанне ўласнікам"* ён перасследваўся судом. У 1843 г. у Ліёне, дзе Прудон быў на той час камерцыйным агентам, выйшаў у свет ягоны першы значны твор — *"Пра ўладкаванне чалавецтва"*, дзе ён выклаў свае філасофскія канцэпцыі.

У Ліёне, гэтаксама як і ў Парыжы, Прудон адначасова наведваў суполкі рэвалюцыянераў і ліберапаў з "Таварыства эканамістаў", але іхныя ідэі яго не задавальнялі, і ў 1846 г. ён выклаў свае ўласныя погляды на сацыяльныя праблемы

ў творы *"Сістэма эканамічных супярэчнасцяў, або Філасофія галечы"*.

У 1848 г. Прудон быў абраны дэпутатам у французскі парламент, дзе неяк учыніў гучны скандал. Ён не быў прыхільнікам рэвалюцыйнага гвалту; у справе пераўтварэння грамадства разлічваў на свой "Банк народа", заснаваны ў лютым 1849 г. У красавіку таго ж года Прудон быў асуджаны на тры гады турэмнага зняволення за артыкулы, скіраваныя супраць Люі Напалеона Банапарта. Пад час знаходжання ў турме напісаў творы *"Споведзь рэвалюцыянера"* (1849) і *"Усеагульная ідэя рэвалюцыі ў XIX ст."*

Пасля вызвалення ў 1852 г. Прудон прымірыўся нарэшце з новым рэжымам і выпусціў працу *"Сацыяльная рэвалюцыя, спраўджаная праз дзяржаўны пераварот"*. За публікацыю асноўнага твора — *"Пра справядлівасць у рэвалюцыі і ў царкве"* (1858) — яго зноў засудзілі, гэтым разам за знявагу рэлігіі і маралі. Пазней Прудон пасяліўся ў Брусэлі. Там выйшла ягоная праца *"Вайна і мір"* (1861). У 1862 г. вярнуўся ў Парыж, дзе праз два гады памёр.

§ 2. Эканамічныя ідэі

Першыя развагі Прудона на тэму эканомікі ў памфлеце *"Што такое ўласнасць?"* закранаюць тэму натуральных правоў асобы. Гэта вельмі характэрны момант, бо аўтар заўсёды лічыў сябе спадкаемцам змагароў 1789 г.

Свабода і роўнасць для яго — абсалютныя і святыя правы. У тым, што датычыць уласна свабоды, Прудон нават не чыніць высілкаў, каб абгрунтаваць свае меркаванні. Але ў творы *"Пра ўладкаванне чалавецтва"* ён падрабязна выкладае сваю тэорыю роўнасці. Усе людзі, на яго думку, павінны ацэньвацца ў роўнай ступені, бо іх грамадскія функцыі моцна ўзаемазалежныя, і, значыць, немагчыма сказаць, што адна з іх пераважае другую[1]. Зрэшты, неаднолькавасць здольнасцяў у розных індывідаў мусіць знікнуць у значнай ступені дзякуючы сацыяльнаму прагрэсу; на

[1] *De la création de l'ordre dans l'humanité, nouv. éd., Paris, 1927, p. 343.*

тыя ж неаднолькавасці, якія застануцца, можна не звяртаць увагі[1].

Што да ўласнасці, дык Прудону ўяўлялася немагчымым узнесці яе да такога ж роўню і разглядаць як натуральнае права, бо гэта супярэчыла ягонай сістэме ерархіі правоў. Ён доўга разважаў пра тое, якім чынам уласнасць, калі не ўжыць захады да засцярогі, вядзе да знішчэння роўнасці і свабоды, дазваляючы некалькім індывідам захапіць усе багацці. Адсюль Прудон зрабіў выснову, што немагчыма знайсці для рэабілітацыі ўласнасці належнае абгрунтаванне, законны падмурак: "Уласнасць — гэта крадзеж".

Але ці азначае гэта, што варта знішчыць уласнасць? Зусім не, бо калі яе адасобіць ад шэрагу (сукупнасці) грамадскіх функцыяў, то відавочна, што ўласнасць ёсць у роўнай ступені прычына і ліха, і дабра. У прыватнасці, менавіта ўласнасць гарантуе свабоду індывіда супраць уплыву з боку грамадства, што надзвычай важна і неабходна. Інстытуцыя ўласнасці — супярэчлівая рэальнасць, якая адначасова і крыніца дэспатызму, і гарантыя свабоды.

Аўтар зноў звяртаўся да гэтай ідэі ў *"Эканамічных супярэчнасцях"*, дзе ўласнасці адводзіцца месца поруч з іншымі супярэчлівымі фактарамі: машына памяншае пакуты працаўніка, які бярэ ўдзел у стварэнні прадукту, але яна спрыяе развіццю згубнай сістэмы найманай працы; свабода гандлю мае як станоўчыя, так і адмоўныя бакі і г. д.

Аўтар лічыў, што такія супярэчнасці спрадвечныя: усялякая спроба іхнага знішчэння з дапамогаю прымусу прывядзе да страты найкаштоўнейшага багацця — свабоды індывіда. Менавіта з гэтае нагоды Прудон утрапёна крытыкаваў усе тагачасныя школы сацыялістычнага кірунку.

Асобныя мысляры, накшталт каталіка Бюшэ, мелі намер ажыццявіць хрысціянскі прынцып усеагульнага братэрства. Яны спрабавалі пераканаць кожнага індывіда ў тым, што ягоны найпершы абавязак — ахвяраваць сабою дзеля іншых і добраахвотна імкнуцца да беднасці. Прудон не згаджаўся з тым, што ахвяраванне дзеля іншых можа быць прынцы-

[1] *Ibid., p. 249.*

пам сацыяльных дачыненняў; на яго думку, гэта спрычыніцца да няўхільнага падпарадкавання адных індывідаў другім.

Выступаў ён таксама супраць праектаў эканамічнага ўладкавання накшталт праекта, прапанаванага Люі Блянам. "Усё, што калі-небудзь трызнілася сацыялізмам па гэтай важнай праблеме ўладкавання грамадства, — пісаў Прудон, — ёсць толькі лямант безнадзейнасці і немачы, калі не сказаць — шарлатанская дэкламацыя"[1].

Найбольш адмоўна Прудон ставіўся да рэжыму супольнай маёмасці, прапанаванага такімі аўтарамі, як Кабэ. З гэтае нагоды ён зазначаў, што супольнасць уласнасці мусіць прывесці да разбурэння сям'і і да аўтарытарнага ўладкавання эканомікі.

"Камунізм, — пісаў ён, — сінонім нігілізму, непадзельнасці, нерухомасці, цемры і немасці"[2].

З гэтага моманту Прудону больш нічога не заставалася, як паспрабаваць падпарадкаваць сацыяльныя дачыненні якому-кольвечы маральнаму прынцыпу, што цалкам паважаў бы незалежнасць індывіда; па ягоным меркаванні, гэта прынцып "уласцівай для чалавецтва" справядлівасці.

Дзеля абароны свабоды індывідаў неабходна, каб дачыненні ў грамадстве грунтаваліся на адзіным падмурку — кантракце. У гэтым аспекце Прудон цалкам пагаджаўся з лібераламі і заходзіў нават далей, чым сама пераканаыя з іх, бо, на яго думку, дзяржава ўвогуле павінна стаць непатрэбнай: пры сістэме кантрактных дачыненняў палітычная сістэма мусіць "сысці ў нябыт, растапіцца". Менавіта праз гэта аўтар прыйшоў да высновы: "Я — анархіст".

Але і пры такіх умовах найважнейшым застаецца фактар роўнасці, бо ўсе дачыненні ў грамадстве зводзяцца да кантрактаў, узнікае праблема "роўнасці ў абмене"[3]. Маецца на ўвазе абмен паміж рабочым і прадпрымальнікам, пакупніком і гандляром, пазычальнікам і крэдыторам.

Асабліва важна скасаваць усе адлічэнні ў бок капіталістаў, зямельных уласнікаў і прадпрымальнікаў, бо гэткія ад-

[1] *Système des contradictions économiques, nouv. éd., Paris, 1923, t. II, p. 287.*
[2] *Ibid., p. 301.*
[3] *De la justice dans la Révolution et dans l'Eglise, nouv. éd., Paris, 1930–1935, t. II, p. 78.*

лічэнні не адпавядаюць выдаткам на стымуляванне эфектыўнай працы з боку апошніх. Прыбытак патрона паходзіць з таго, што ён прысвойвае вынік дадатковай прадукцыйнасці, якая вынікае з спалучэння намаганняў работнікаў; але гэта супярэчыць справядлівасці. Працэнт, атрыманы банкамі, незаконны, калі ён перавышае выдаткі на функцыянаванне банкаў.

Такім чынам, дзеля забеспячэння справядлівасці варта цалкам змяніць права. Замест індывідуалісцкага права, якое гарантуе індывіду ягоныя заваёвы, справядлівыя і несправядлівыя, трэба, каб запанавала "эканамічнае права", ці, як мы сказалі б сёння, "сацыяльнае права". Гэтае права мусіць забяспечыць дасканалую справядлівасць у грамадскіх дачыненнях. І з мэтай неадкладнага ажыццяўлення на практыцы такога права Прудон у 1849 г. заснаваў банк абмену, які даваў у пазыку і не браў за гэта належныя працэнты. На думку Прудона, усялякі працоўны мог атрымаць сродкі, каб самастойна працаваць і пазбегнуць залежнасці ад патрона.

Але згаданая Прудонава сістэма мела занадта відавочныя супярэчнасці. Ды ейны аўтар і сам заўважаў гэта і па многіх пытаннях мусіў пагадзіцца на папраўкі, якія зусім не спрыялі таму, каб надаць ягонай ідэі пэўную паслядоўнасць. Перш за ўсё ў сваіх апошніх творах ён пагадзіўся з фактам існавання дзяржавы, бо яна неабходная як гарант дастасавання эканамічнага права. У гэтым выпадку ягоны "анархізм" абмяжоўваўся сцверджаннем пра зверхнасць права над самой дзяржавай[1]. Аўтару таксама трэба было ўлічваць фактар тагачаснай тэхнікі вытворчасці, якая вымагала шчыльнай канцэнтрацыі працоўнай сілы і каардынацыі дзейнасці шматстайных прадпрыемстваў. Напачатку Прудон варожа ставіўся да ідэі асацыяцыі; потым прыняў яе; разам з прынцыпам узаемнасці, што забяспечваў двухбаковасць паслугаў, ён вылучыў прынцып федэрацыі, які дазваляў каардынаваць намаганні. Тым не менш Прудон заўсёды дапускаў існаванне толькі свабодных груповак, такіх, дзе кожны асацыяваны супольнік — індывід ці прадпрыемства — захоўвае магчымасць у кожны момант выйсці з групы. Апісаны

[1] *Cf. Gurvitch, L'idée du droit social, Paris, 1931, p. 357.*

лад аўтар называў вельмі ўдалым тэрмінам — "індустрыяльная дэмакратыя".

Паколькі свабода і роўнасць забяспечваліся адначасна, дык больш не магло быць цяжкасцяў у дасягненні шчасця індывідаў. Але на шляху да шчасця перашкодаю былі ўмовы занадта спецыялізаванай працы; з гэтага часу трэба было адукоўваць індывідаў па-новаму і, у прыватнасці, навучыць іх многім рамёствам[1].

§ 3. Праблема сродкаў

Часцей за ўсё, на наш погляд, Прудон выступаў у якасці прарока далёкай будучыні; калі ж выказваў меркаванні наконт тагачаснай рэчаіснасці, дык яны выглядалі малапераканаўчымі — ці то гаворка ішла пра ягоныя спадзяванні наконт банка абмену, ці то пра давер, які ён у нейкі момант выяўляў да Люі Напалеона Банапарта.

Але не гэта больш за ўсё здзіўляе, здзіўляе тое, што Прудон не ішоў далей за канцэпцыю прагрэсу, сфармуляваную філосафамі XVIII ст.

"Толькі ідэі робяць гісторыю", — пісаў ён[2]. На яго думку, існуе толькі гісторыя ідэяў. Прудон занатаваў аднойчы на палях нейкага твора Маркса:

"У грамадстве ўсё, пра што б ні ішла размова, з'яўляецца сучасным; гэтаксама як у прыродзе ўсе атамы з'яўляюцца спрадвечнымі"[3].

Дарэчы, Прудон даў азначэнне прагрэсу зыходзячы найперш з юрыдычнага і маральнага аспектаў. На яго погляд, прагрэс — гэта паступовы трыумф справядлівасці, які забяспечваецца дзякуючы "юрыдычнаму прасоўванню". Ён пісаў:

"Калі дабро дадаецца да дабра ў залежнасці ад колькасці асобаў, якія бяруць удзел у дамове, і ад шматстайнасці інтарэсаў, якія рэгулююцца дамовай, а таксама калі няспынна пашыраецца ўлада справядлівасці, дык прагрэс абавязковым чынам запануе"[4].

І яшчэ Прудон дэкларава ў:

[1] *Cf. De la justice..., op. cit., t. III, 6e étude.*
[2] *Ibid., t. II, p. 471.*
[3] *Cf. Contraditions économiques, op. cit., t. II, p. 415.*
[4] *De la justice, t. III, p. 514.*

"Прагрэс — гэта найперш феномен маральнага парадку, які распаўсюджваецца або дзеля дабра, або дзеля ліха адпаведна ўсім здольнасцям чалавечай істоты, істоты калектыўнай і індывідуальнай"[1].

Адзіная, на думку Прудона, па-сапраўднаму важная і вялікая дата гісторыі — 1789 год; менавіта з яе пачынаецца панаванне права. Ён з дакладнасцю прызнаваў тую ролю, якую адыграла ў гісторыі сіла, прысвяціўшы ейнаму аналізу цэлую кнігу — *"Вайна і мір"*. Але, без сумневу, Прудон быў глыбока перакананы, што спроба выкарыстання сілы на той час сталася б бессэнсоўнай, бо чалавечыя дачыненні пачалі кіравацца правам, дык варта толькі яму і пакінуць магчымасць развівацца.

Зразумелая таксама сур'ёзная заклапочанасць вялікага памфлетыста пра лёс рабочага класа. Прудон застаецца прыхільным да гэтага класа; менавіта на карысць апошняга ён і працуе; але адмаўляецца абаперціся цалкам на сілу, якую гэты клас сабой уяўляе, бо гэтая сіла не здаецца яму дастаткова чыстай, дастаткова сведамай наконт маральных мэтаў, якія мусяць быць дасягнуты.

"Уявіце, — пісаў Прудон, — уючную жывёліну, якая не разважае, як у байцы, пра сваё становішча, а проста адчувае сваё становішча і са шчырай душою пагаджаецца на яго: гэта і ёсць плебей..., плебей, які нашмат ніжэйшы за барбара; ён не мае ні годнасці, ні гонару..."[2]

Адсюль зразумела, чаму ў Прудона заўсёды была пагарда да ўсеагульнага выбарчага права і чаму ён зусім не жадаў гвалтоўнай рэвалюцыі. Ён нават не баяўся любой цаною рабіць з сябе апостала парадку.

"Паколькі праца ніколі не здолее прымусіць прызнаваць сябе ў якасці суверэна, — пісаў Прудон у 1845 г., — дык яе неабходна разглядаць як прыгонную"[3].

Але аднаго разу з-пад яго пяра выйшла выказванне зусім іншага кшталту, калі ён у *"Вайне і міры"* сцвярджаў:

"У самім грамадскім ладзе права на сілу яшчэ далёка не сказала свайго апошняга слова. Толькі яно адно можа скончыць распачатую блізу 30 гадоў таму спрэчку так званага буржуазнага класа, які занепадае, з рабочым класам, які з кожным днём набірае моц. Не важна, як гэта адбудзецца — праз бойку ці праз узгодненую канстытуцыю".

[1] *De la justice, t. III, p. 512.*
[2] *Ibid., p. 462.*
[3] *Contradictions économiques, op. cit., t. I, p. VI.*

Гэтых радкоў дастаткова, каб цалкам зруйнаваць усю сістэму, пабудаваную Прудонам. Ён, аднак, і не настойваў на такім шляху: ягоны пасмяротна выдадзены твор *"Пра здольнасці рабочага класа"* — гэта доўгае разважанне пра тое, што не варта надзяляць працоўных правам на стварэнне хаўрусаў і на страйк, бо пры сучасным стане рэчаў менавіта свабодная канкурэнцыя па-ранейшаму падаецца найлепшай гарантыяй справядлівага заробку найманых працаўнікоў.

* * *

Нягледзячы на пэўную непаслядоўнасць пададзеных выказванняў, неабходна прызнаць за Прудонам заслугу ў тым, што ён надзвычай востра ўзняў праблему абавязковага прымірэння сацыяльнай справядлівасці з павагай свабоды індывідаў. Нельга сказаць, што прапанаваныя ім "рэцэпты" дакладныя і вычарпальныя. Прудон лічыў магчымым трансфармаваць грамадства пры дапамозе своеасаблівай юрыдычнай або фінансавай тэхнікі (напрыклад, бясплатнага крэдыту). Але ён не бачыў, што ўсялякае грамадства ў асноўным цэласнае і шматстайныя аспекты гэтай цэласнасці ўзаемазалежныя. Такая канцэпцыя сацыяльнай цэласнасці, напрыклад, на першым плане і ў дактрыне Гегеля, і ў дактрыне Маркса. Але ў гэтых двух аўтараў былі вельмі адрозныя погляды на тое, што можа ў вызначаную эпоху разглядацца ў якасці "суб'екта гісторыі".

Бібліяграфія

Пра Прудона існуе вялікая колькасць літаратуры, элементы якой маюць няроўную каштоўнасць. Мы ж абмяжуемся пералікам толькі сама значных твораў:

E. Dollèans, *Proudhon*, Paris, 1948.

G. Woocock, *Pierre-Joseph Proudhon*, London, 1956.

D. Halévy, *Proudhon d'après ses carnets inédits (1843—1847)*, Paris, 1944.

P. Haubtmann, *Marx et Proudhon, leurs rapports personnels (1844—1847)*, Paris, 1947.

H. de Lubac, *Proudhon et le christianisme*, Paris, 1945.

La Vie de Proudhon, de Sainte-Beuve, a été rééditée par Daniel Halévy, Paris, 1948.

Раздзел V

ПАЛІТЫЧНАЯ ФІЛАСОФІЯ ГЕГЕЛЯ

Аўтарам сацыялістычнай ідэі, якая ўзнікла пры канцы XVIII ст. у Нямеччыне, быў, як вядома, Ёган Готліб Фіхтэ. Амаль адразу адрэагаваў на яе "нараджэнне" вялікі нямецкі філосаф Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель (1770—1831). Гегель вельмі рана пачаў займацца праблемай выжывання чалавека, змушанага працаваць, каб забяспечыць сваё існаванне. Напачатку яму былі блізкія погляды Плятона і Арыстотэля, якія прапаноўвалі выключыць з палітычнага жыцця ўсіх, хто працуе ці займаецца гандлем. Але неўзабаве Гегель адмовіўся ад такога падыходу. Ён прыйшоў да высновы, што грамадства, якое пасля Вялікай французскай рэвалюцыі грунтуецца на свабодзе індывіда і асуджае ўсялякую форму рабства і прыгонніцтва, не можа пагадзіцца з поглядамі старажытных філосафаў. Калі ўсё ж прыняць іх, сцвярджаў Гегель, то немагчыма спалучаць пошук разумнага ладу жыцця ў інтэлектуальнай або палітычнай сферы з эканамічнай дзейнасцю. Значыць, неабходна прымірыць гэтыя два полюсы сацыяльнага жыцця.

Падобную пазіцыю за стагоддзе да Гегеля адстойваў Спіноза, і відавочна, што Гегель, які шмат у чым быў паслядоўнікам вялікага філосафа, і ў гэтым пытанні таксама чэрпаў натхненне ў Спінозы.

У *"Трактаце аб палітыцы"*, які быў апублікаваны неўзабаве пасля ягонай смерці, Спіноза выказаў меркаванне, што, нягледзячы на тое што пошук узбагачэння супярэчыць мудрасці[1], вельмі добра, калі дзяржава дазваляе свабодным індывідам узбагачацца.

"У дзяржаве, — пісаў Спіноза, — якая імкнецца кіраваць індывідамі выключна пры дапамозе страху, хутчэй адсутнічаюць заганы, чым пануе дабрадзейнасць. А весці людзей трэба такім чынам, каб яны не лічылі, што іх вядуць. Яны павінны быць перакананыя, што жывуць адпаведна з сваім вольным выбарам і згодна з уласным разуменнем; такім чынам, утрымліваць людзей на шляху дабрадзейнасці магчыма толькі праз любоў да свабоды, імкненне павялічыць свой дабрабыт і спадзяванне дасягнуць пашаны"[2].

---

[1] *Voir Spinoza, Ethique, 4, appendice au chap. 29.*

[2] *Traité politique, chap. 10, § 8.*

На гэткіх жа пастулатах грунтавалася і палітычная філасофія Гегеля, у якой сцвярджалася, што трэба паважаць свабоду выраблять і абменьваць, хоць гэта можа быць перашкодаю на шляху да разумнага існавання. Такім чынам, Гегель дапоўніў і развіў погляды Спінозы, інтэгруючы іх у межы філасофіі, якой даў назоў "дыялектычнай". "Дыялектычная філасофія" зыходзіць з таго, што ўсялякая рэчаіснасць змяшчае ў сабе два супрацьлеглыя аспекты, якія неабходна прымірыць. Гегель сцвярджаў, што рынкавая эканоміка — гэта аспект грамадскага жыцця, які трэба паважаць, нават калі ён і спараджае супярэчнасці ўнутры гэтага жыцця. Бо калі, паводле Фіхтэ, спрабаваць знішчыць усе супярэчнасці ў грамадстве, дык гэта будзе супярэчыць самому закону жыцця.

Да апошняга часу, зазначаў Гегель, панавала меркаванне, што чалавечая думка мусіць падпарадкоўвацца "прынцыпу супярэчнасці", адпаведна з якім кожная рэч валодае пэўнай якасцю, што выключае наяўнасць у ёй процілеглай якасці. Менавіта на гэтым элеменце традыцыйнай логікі грунтуюцца дакладныя навукі, але Кант слушна сцвярджаў, што гэтыя навукі спасцігаюць сутнасць рэчаў павярхоўна. Такім чынам, поўнае падпарадкаванне прынцыпу супярэчнасці не дазваляе па-сапраўднаму спазнаць ісціну.

Кант зрабіў выснову, што чалавечая думка не можа спазнаць "рэч у сабе". Гэтаксама як і Фіхтэ, Гегель не пагадзіўся з такім падыходам. Ён меркаваў, што чалавечая думка здольная пераадолець пэўныя супярэчнасці, пра што сведчаць дакладныя навукі і просты "здаровы сэнс". Але неабходна перастаць лічыць "прынцып супярэчнасці" найвышэйшым прынцыпам логікі. Наадварот, трэба прызнаць, што па сваёй сутнасці свет — гэта адзінства супрацьлегласцяў.

Да гэтага часу сцвярджалася, што свет складаецца з канцоўных рэаліяў і што таксама існуе найвышэйшая, бясконцая субстанцыя — Бог. Але і ў гэтым факце ёсць супярэчнасць, бо калі побач з Богам існуюць канцоўныя рэаліі, дык Бог не бясконцы. Такім чынам, сцвярджаў Гегель, варта прызнаць, што свет — гэта адзінства канцоўнага і бясконцага[1].

Першая рэалія для чалавека — ён сам. І той, хто імкнецца спазнаць самога сябе, адразу сутыкаецца з асноўнай супярэчнасцю: ён адначасова і звышнатуральная думка, і натуральнае цела.

Чалавек разумее, што ягоная думка не мае нічога агульнага з

[1] *Science de la logique, trad. franç., Paris, 1947, I, pp. 140–145.*

натуральнымі прадметамі, якія знаходзяцца ў прасторы, бо яна не падлягае вымярэнню. Але чалавек — гэта і цела, якое мае ўсе характарыстыкі натуральных аб'ектаў.

Дзеля вытлумачэння дваістасці чалавечай істоты філосафы яшчэ з часоў Антычнасці стваралі шматлікія сістэмы. У эпоху, калі пачынаў Гегель, найбліжэйшай па часе спробай такога кшталту была сістэма Фіхтэ, у якой прырода як "прадукт" "Я" была абсалютам.

Але, як сцвярджаў Гегель, калі існуе якая-небудзь рэч па-за межамі абсалюту, "вытворная" яна ці не "вытворная" ад яго, дык гэты абсалют абмежаваны, а значыць, ён больш не абсалют. У выніку нельга пагадзіцца з ідэалізмам Фіхтэ.

Між тым, калі адкінуць таксама і аксіёмы матэрыялізму, для якога і свядомасць — прадукт матэрыі і які праз гэта, як і ідэалізм, адмаўляе сябе, то ўяўляецца магчымым адзіны падыход, што забяспечвае "дыялектычную" канцэпцыю думкі. Згодна з ім, дзеля разумення рэчаіснасці не варта імкнуцца скасаваць супярэчнасці, якія ў ёй прысутнічаюць, а, наадварот, неабходна ўспрымаць іх як асноватворныя і заўсёдныя. Значыць, нельга зразумець чалавека праз усталяванне зверхнасці свядомасці над прыродай. Немагчыма пагадзіцца і з тым, што свядомасць існуе толькі тады, калі ейная процілегласць — цела, прырода — супрацьстаяць ёй. Інакш кажучы, няма чыстай свядомасці або чыстай думкі: ёсць толькі ўвасобленая свядомасць. Гэтаксама няма і чыстай матэрыі, бо матэрыя (прырода) не можа існаваць адрозна ад свядомасці (думкі).

Сутнасць адзінства процілегласцяў у свеце можна зразумець толькі тады, калі прызнаць, што свет — гэта працэс адзінства і барацьбы супрацьлегласцяў і ён не можа існаваць інертна.

На пачатку гэтага працэсу адбываецца адмаўленне духу прыродай, пачуццёвым светам; потым прырода адмаўляецца чалавечай свядомасцю, што руйнуе першае адмаўленне, а ў выніку аднаўляецца свет як дух. Пры такім бачанні свету, якое можна кваліфікаваць як *рэалістычнае*, факт разгляду свету як духоўнага працэсу не азначае, што па-за ўвагай застаецца прырода; наадварот, за ёй цалкам прызнаецца месца і роля ў межах самога духоўнага працэсу.

Уздзеянне гэтай новай канцэпцыі свету на эвалюцыю палітычнай і эканамічнай думкі велізарнае, што, на думку Гегеля, дазваляла яму развязаць праблему свабоды. З другога боку, Гегелева філасофія, без сумневу, дазваляе больш дакладна бачыць законна вызначаныя палітычным дзеяннем мэты.

§ 1. Праблема свабоды

У сваім першым апублікаваным творы — *"Адрозненне паміж філасофскімі сістэмамі Фіхтэ і Шэлінга"* (1801)[1] — Гегель рашуча выступіў супраць дзяржаўнага сацыялізму Фіхтэ, які, маючы на мэце забеспячэнне свабоды, у выніку прычыняецца да яе скасавання.

[1] *Traduction française in G. W. F. Hegel, Premières publications, Paris, 1952.*

"Свабода, — пісаў Гегель, — гэта тое, што характарызуе рацыянальнасць; свабода — гэта тое, што скасоўвае ўсялякае абмежаванне, якое ў сістэме Фіхтэ займае галоўнае месца. Але ад свабоды і іншых дабротаў варта *адмовіцца* дзеля таго, каб забяспечыць свабоду ўсіх разумных істотаў, якія жывуць у супольнасці, а супольнасць у сваю чаргу з'яўляецца ўмовай свабоды: свабода павінна сама сябе зліквідаваць, каб быць свабодай"[1].

Паводле Гегеля, Фіхтэ паўтарае памылку Русо і Канта. Яна палягае ў сцверджанні, што *індывідуальная* чалавечая істота з прычыны сваёй здольнасці свабодна выбіраць ("свабоднай волі") перастае належаць да прыроды і адразу ж пераносіцца на іншы ровень — ровень розуму.

Праўда, індывідуальная чалавечая істота, як даводзіць Гегель, адрозніваецца ад жывёлы сваёй здольнасцю разважаць і выбіраць перад тым, як саступіць таму або іншаму інстынктыўнаму імпульсу. Але гэтае адрозненне толькі фармальнае, бо калі чалавек нават і выбірае тое ці іншае задавальненне, ён усё адно застаецца на роўні прыроды. Я магу вагацца наконт таго, якую страву мне есці на абед, але ўвогуле без харчавання не магу абысціся, гэтаксама як і жывёла. Свабода волі, ці магчымасць роздуму перад тым, як выбіраць, не надае мне вызначальнай зверхнасці і не ўзносіць мяне над прыродай. Свабода волі толькі сведчыць пра тое, што ў чалавеку прысутнічае супярэчнасць паміж прыродай і воляй[2]. Але дзейнасць індывіда, на якую ўздзейнічае свабода волі, не перастае, аднак, быць натуральнай дзейнасцю.

Паколькі Русо і Фіхтэ памылкова вызначалі свабоду як магчымасць выбару індывідуальнай чалавечай істоты (што з'яўляецца вынікам *абсалютнай* супрацьлегласці, якую яны ўсталёўваюць паміж прыродай і свабодай), то яны ўваходзяць у супярэчнасць самі з сабою, як толькі пачынаюць разглядаць праблему грамадства.

Русо і Фіхтэ добра разумелі, што ідэал лібералаў — грамадства, якое дзякуючы дасканалым эканамічным законам можа функцыянаваць зусім без улады, — непрымальны. Сапраўды, як толькі паўстане неабходнасць нейкай улады, то індывіды адразу страцяць магчымасць рабіць тое, што яны захочуць. Калі існуе правіла, якое вымушае ехаць па правым баку дарогі, дык немагчыма будзе ехаць па левым.

Тады Русо і Фіхтэ звяртаюцца да іншай канцэпцыі свабоды (якую Русо называў "цывільнай свабодай"). Першабытнай свабоды ў грамадстве больш не існуе. Індывід павінны безумоўна падпарадкоўвацца закону, якім рэгламентуецца ўся сукупнасць грамадскага жыцця. Індывід разглядаўся напачатку як чысты дух, затым як простая рэч.

Каб выйсці з гэтага тупіка, варта першапачаткова і грунтоўна ўсведаміць свабоду як *супольную* справу людзей, што жывуць у грамадстве,

[1] *Op. cit., p. 130.*

[3] *"У сапраўднасці свабода волі — гэта зусім не воля, а хутчэй за ўсё воля як супярэчнасць". Hegel, Principes de la philosophie du droit, § 15; trad. franç., Paris, 1940, p. 47.*

а самастойнасць індывіда можа паважацца толькі тады, калі яна — частка ўмоваў ажыццяўлення гэтай агульнай справы.

Паводле Гегеля, чалавечая свабода ўсталёўваецца праз рацыянальныя сацыяльныя інстытуцыі і ўсведамленне чалавекам уласнага дачынення да факта іх стварэння. Чалавек вядзе ў рацыянальным грамадстве свабоднае палітычнае жыццё, бо дзяржава — гэта не што іншае, як чалавечы розум, які стаў "мэтай" і прызнаны ў якасці такога з боку чалавечага суб'екта. Тое, што Русо называў "цывільнай свабодай" і разглядаў як "адмысловы выкрутас", і ёсць на самой справе сапраўдная чалавечая свабода.

Такім чынам, задача чалавецтва, якое складаецца з мноства асобных індывідаў, — паступовае стварэнне рацыянальнай дзяржавы. Чалавек ёсць часткай прыроды, ён — натуральны тып, які ў сваіх учынках кіруецца асабістымі інтарэсамі. Чыннасць асабістых інтарэсаў стварае натуральную базу, на якой грунтуецца свабода. Аніякім чынам немагчыма зліквідаваць гэтую натуральную базу, а значыць, не можа знікнуць і свабода індывідаў, якую варта паважаць настолькі, наколькі яна неабходная для жыцця ў грамадстве. Калі гэтага не адбываецца, сцвярджаў Гегель, не згодны з канцэпцыяй Фіхтэ, то дзяржава паўстае не як арганізацыя, а як машына: народ з'яўляецца "не арганічным целам багатага і супольнага ладу жыцця, а мноствам нежывых атамаў..."[1] І далей удакладняў сваю думку: "Алагічныя тыя "звычайныя дзяржавы", якія, для таго каб пакараць за ўсялякія парушэнні..., выкарыстоўваюць свае вярхоўныя правы, але такая непаслядоўнасць — гэта адзін з самых дасканалых момантаў у недасканалых дзяржавах"[2].

Згодна з меркаваннем Гегеля, лібералізм эканамістаў, безумоўна, памылка, бо, адмаўляючы дзяржаву, ён зліквідоўвае сапраўдную свабоду і трактуе чалавека толькі як прыродную істоту. Русо і Фіхтэ трапілі ў супрацьлеглую крайнасць, калі дапускалі, што свабодная воля павінна цалкам адмаўляць натуральную сутнасць чалавека. Філосаф пісаў:

"Такая пачварная ганарлівасць, такая манія самазадаволенасці "Я", якая даходзіць да боязі, нават жаху і горычы ад думкі быць разам з універсумам, быць аб'ектам уздзеяння спрадвечнай прыроды... усё гэта ў суме выяўляе невуцтва і неразуменне прыроды і стасункаў, якія падтрымлівае з ёю асобная істота"[3].

На гэтай канцэпцыі дыялектычнага адзінства (адзінства супрацьлегласцяў) прыроды і волі чалавека грунтуецца ўся

---

[1] *Différence entre les philosophies de Fichte et de Schelling, in Premières publications, op. cit., p. 133.*

[2] *Id., ibid.*

[3] *Foi et savoir, trad. franç., in Premières publications, op. cit., p. 288.*

Гегелева філасофія палітыкі, якая галоўным чынам падаецца ў ягоных *"Прынцыпах філасофіі права"* (1821).

Паводле Гегеля, індывід імкнецца задаволіць свае патрэбы, бо падпарадкоўваецца натуральнай неабходнасці. Дзеля гэтага ён уступае ў дачыненні з іншымі індывідамі, адсюль вынікае

"сістэма ўзаемнай залежнасці, згодна з якой выжыванне, дабрабыт і юрыдычнае існаванне індывіда залежныя ад выжывання, дабрабыту і існавання ўсіх, што абапіраюцца на саміх сябе, і могуць быць рэальныя і забяспечаныя толькі дзякуючы такой сувязі"[1].

Філосаф удакладняў, што такія ўзаемныя дачыненні індывідаў і складаюць аб'ект палітычнай эканоміі, "адной з тых навук, якія нарадзіліся ў Новым часе". Гэтая навука, дадаваў ён, праз выкарыстанне ўласцівых дакладным навукам метадаў адкрывае "ў сферы спажывання той элемент рацыянальнасці, на якім грунтуецца прырода рэчаў"[2].

Палітычная эканомія, як і ўсе іншыя дакладныя навукі, прыводзіць да супярэчлівых высноваў, што толькі адлюстроўваюць уласна супярэчлівы характар рэчаіснасці.

Палітэканомія сцвярджае, што існуюць законы рынку, якія надаюць менавым дачыненням той "адбітак рацыянальнасці", пра які гаварылася вышэй. Яна даводзіць таксама, што "інтарэсы вытворцаў і спажыўцоў могуць перакрыжоўвацца"[3]. Гэтая навука тлумачыць, якім чынам дзякуючы ініцыятыве індывідаў адбываецца ўзбагачэнне нацыяў. Але, згодна з ёй, прагрэс сферы спажывання і тэхнікі павялічвае таксама "драбленне і абмежаванне прыватнай працы і ў выніку залежнасць і галечу класа, які займаецца гэтай працай"[4].

А яшчэ палітычная эканомія выяўляе, што,

"нягледзячы на лішак свайго багацця, цывільнае грамадства недастаткова заможнае, гэта значыць, што яно не валодае пэўнымі сродкамі, каб плаціць даніну празмернай галечы і плебеям, яе дзецям"[5].

---

[1] *Op. cit., § 183; Trad. franç., Paris, 1940, p. 153.*
[2] *Ibid., pp. 157–158 (§ 189).*
[3] *Ibid., p. 180 (§ 236).*
[4] *Ibid., p. 183 (§ 243).*
[5] *Ibid., p. 184 (§ 245).*

З прычыны гэтага багатыя грамадствы вымушаны заваёўваць калоніі з мэтай забеспячэння рынкаў збыту для нацыі.

Такая дыялектыка штурхае цывільнае грамадства за ўласныя межы; найперш яно мусіць шукаць па-за сваімі межамі спажыўцоў, а значыць, і сродкі існавання ў асяроддзі іншых народаў, што знаходзяцца на ніжэйшым, чым гэтае грамадства, роўні, шукаць магчымасць выкарыстання працоўных рэсурсаў, якіх у дадзеным грамадстве зашмат, ці часцей за ўсё, як рэалізаваць патэнцыял сваёй прамысловасці"[1].

Спантанныя эканамічныя дачыненні паміж людзьмі зусім не спрычыняюцца да цалкам гарманічных вынікаў, як гэта сцвярджалі эканамісты-лібералы. Але чалавек не толькі нейкая ізаляваная істота, якая мае на мэце толькі задавальненне сваіх натуральных патрэбаў, ён не толькі homo oeconomicus, ён таксама і грамадзянін дзяржавы, гэта значыць сябар духоўнай супольнасці, праз якую і выяўляецца воля грамадства. Сапраўдная свабода чалавека дасягаецца не праз эканамічныя дачыненні, а праз уплыў у межах дзяржавы волі, якую ўсе грамадзяне прызнаюць у якасці сваёй.

Паводле Гегеля, дзяржава заклікана стварыць інстытуцыі, якія дазволілі б пераадолець супярэчнасці, што абавязкова паўстаюць у "цывільным грамадстве".

Каб прымірыць інтарэсы вытворцаў і спажыўцоў, неабходна "свядомая рэгламентацыя, якая была б вышэйшай за гэтыя інтарэсы". Такая рэгламентацыя тым больш неабходная, чым больш развіваюцца буйная прамысловасць і гандаль з далёкім замежжам.

"Менавіта залежнасць, у якой знаходзяцца галіны буйной прамысловасці ад вонкавых акалічнасцяў і замежных умоваў, у дачыненні да якіх людзі, залежныя ад іх і звязаныя з імі, не могуць мець супольнага падыходу, робіць неабходнымі ўсеагульнае прадбачанне і кіраванне"[2].

Такім чынам, філосаф не лічыў магчымым пагадзіцца з неабмежаваным панаваннем прыватнага інтарэсу.

"Гэты інтарэс, — пісаў ён, — натхняе супраціў вярхоўнай рэгламентацыі, але чым больш ён па-сляпому зарыентаваны ў бок асабістай

[1] *Ibid., p. 184 (§ 246).*
[2] *Ibid., pp. 180–181 (§ 236).*

мэты, тым больш мае патрэбу ў такой рэгламентацыі, каб прыйсці да універсальнага і змякчыць небяспечныя сутыкненні, а таксама каб скараціць працягласць інтэрвалу, пад час якога неўсвядомленая неабходнасць прыстасавала б супрацьлеглыя бакі адзін да другога"[1].

Дзяржава таксама павінна знайсці сродкі супраць галечы, і ў гэтым пытанні немагчыма абмежавацца спадзяваннем на прыватную дабрачыннасць.

"Неабходна яшчэ ажыццяўляць і дабрачыннасць, — пісаў Гегель. — Памылковая тая дабрачыннасць, сродкі для якой мусіць выдаткоўваць прыватнік з няўстойлівасцю яго меркаванняў і выпадковасцю яго інфармацыі, бо часам здараецца так, што прыватнае пачуццё можа парушацца і зневажацца абавязковымі калектыўнымі рэгламентацыямі і ўсталяваннямі. Наадварот, грамадская справа будзе ажыццяўляцца тым больш паспяхова, чым менш будзе залежаць ад нейчага прыватнага меркавання, ад ініцыятывы індывідаў, чым больш будзе забяспечвацца агульнай воляй"[2].

Але Гегель усё ж не лічыў, што варта скасаваць спантаннае дзеянне эканамічных дачыненняў рынку і замест ягоных законаў абапірацца на волю дзяржавы, як гэта прапаноўваў Фіхтэ. На думку Гегеля, гэта азначала б адмаўляць натуральны бок чалавечага жыцця, а значыць, пайсці па тупіковым шляху.

Нягледзячы на сваё захапленне крокамі Французскай рэвалюцыі, Гегель неаднаразова даводзіў, што людзі, якія натхняліся рэвалюцыяй, паставілі сабе на мэце неразвязальную задачу пабудовы грамадства, дзе асабісты інтарэс не адыгрываў бы ніякай ролі. Яны меркавалі, што праз гэта будзе забяспечана панаванне чыстай маральнасці. Філосаф адзначаў, што такая спроба прывяла дый павінна была прывесці да тэрору, а значыць, да паразы. Бо з таго моманту, калі асобы, што знаходзяцца пры ўладзе, патрабуюць ад усіх грамадзянаў татальнага і выключнага падпарадкавання дзяржаве, яны пачынаюць падазраваць усялякага ініцыятыўнага індывіда і імкнуцца яго знішчыць. Такім чынам, панаванне чыстай маральнасці спараджае самую крывавую дыктатуру[3].

---

[1] *Ibid., p. 181 (§ 236).*

[2] *Ibid., p. 183 (§ 242). Апошняя фраза цытаты, безумоўна, датычыць толькі праблемы барацьбы супраць галечы.*

[3] *"Не існуе нічога пэўнага ці вонкавага, з дапамогаю чаго ўрад мог бы выявіць*

На думку Гегеля, варта, каб дзяржава, вярхоўная воля, пагадзілася быць абмежаванай прыватнымі інтарэсамі, бо чалавеку не дадзена стаць чыстым духам, які вольна лунае над прыродай.

"Дух становіцца рэальным толькі тады, калі сам сябе абмяжоўвае прыроднымі патрэбамі і пэўнай неабходнасцю, і калі ён такім чынам утвараецца, то, упісваючыся ў іх, пераўзыходзіць іх і дасягае свайго аб'ектыўнага існавання"[1].

§ 2. Праблема палітычнага дзеяння

Крытыка Фіхтавага сацыялізму (гэтаксама як і яго варожасць да ідэяў Русо аб дэмакратыі), здавалася б, дае падставы для меркавання, што Гегель надзвычай кансерватыўны. Узапраўды ягоны падыход далёка не адназначны, а часам цяжка паддаецца азначэнню.

У маладосці Гегель быў заўзяты прыхільнік Вялікай французскай рэвалюцыі, хоць і цалкам асуджаў часы тэрору.

У 1807 г. у *"Фенаменалогіі духу"* ён урачыста абвясціў надыход новага сацыяльнага ладу:

"Зрэшты, няцяжка заўважыць, што нашая эпоха — час зародкавага развіцця і пераходу да новага перыяду..., адыход гэтай эпохі яшчэ толькі пазначаецца праз спарадычныя сімптомы; мітусня і маркота, якія апаноўваюць усё, што яшчэ трымаецца, цьмянае прадчуванне чагосьці невядомага — усё гэта прыкметы-прадвесці надыходу нечага іншага. Гэткае безупыннае драбленне, якое вонкава не мяняе нічога, раптам перапыняецца ўзыходам сонца, якое адным промнем і адразу ж малюе форму новага свету"[2].

Але пасля падзення Напалеона ў Эўропе надыходзіць перыяд кансалідацыі старых манархіяў. Апошнюю частку свайго жыцця Гегель правёў у Прусіі, у Берліне, дзе быў накшталт афіцыйнага філосафа. Хоць ягоныя ідэі істотна не

памылку супрацьлеглай яму волі, бо супраць яго як усеагульнай эфектыўнай *волі існуе толькі чыстая неэфектыўная воля,* імкненне. *Быць* падазроным *замяняецца на быць* вінаватым, *а адсюль і адпаведныя наступствы. Відавочная рэакцыя на няўхільную эфектыўнасць усеагульнай волі, вонкавае праяўленне імкнення прыводзіць да гвалтоўнага зліквідавання нават такога няпэўнага "сябе" ў істоце, ад якой нельга нічога адабраць, апроч самога жыцця" ("Фенаменалогія духу", 1807), trad. franç., II, pp. 136–137.*

[1] *Principes de la philosophie du droit, op. cit., p. 156 (§ 187).*

[2] *Phénoménologie de l'esprit, trad. franç., op. cit., t. I, p. 12.*

змяніліся, ён даволі пэўна выказваў жаданне трымацца як мага далей ад палітычнай дзейнасці.

У *"Лекцыях па філасофіі гісторыі"*, якія выйшлі ў свет ужо па ягонай смерці, Гегель услаўляў Вялікую французскую рэвалюцыю, пад час якой упершыню была зробленая спроба стварэння сацыяльнага ладу на аснове ідэі свабоды. Ён пісаў:

"З таго часу, як сонца знаходзіцца на небасхіле і планеты круцяцца вакол яго, ніколі яшчэ чалавек не звяртаў свой позірк уніз, гэта значыць ён ніколі не спрабаваў абаперціся на ідэю і пабудаваць паводле яе рэчаіснасць... Такім чынам, гэта быў бліскучы ўзыход сонца. Усе свядомыя істоты ўслаўлялі гэтую эпоху. Узнёслыя пачуцці панавалі ў тыя часы, энтузіязм духу ўскалыхнуў свет, як быццам толькі ў гэты момант адбылося сапраўднае яднанне боскага пачатку і Сусвету"[1].

Філосаф не адмовіўся ад ацэнак, якія ён у сваёй маладосці даваў рэвалюцыі 1789 г. Але ён адрозна ад поглядаў, выказаных раней у "Фенаменалогіі", не чакаў болей сацыяльных узрушэнняў.

"Філосаф, — пісаў Гегель, — мае справу толькі з водбліскам Ідэі, якая адлюстроўваецца ва ўсеагульнай гісторыі. Стомленая ад узрушэнняў, выкліканых жорсткасцямі рэчаіснасці, філасофія адасабляецца ад іх, каб прысвяціць сябе сузіранню..."[2]

А ўжо ў *"Прынцыпах філасофіі права"* Гегель заявіў, што філасофія не павінна вучыць Сусвет.

"Калі гаварыць пра прэтэнзіі вучыць, якім павінны быць свет, — пісаў ён, — то можна адзначыць, што ва ўсіх выпадках філасофія прыходзіць занадта позна. Як сусветная думка яна паўстае толькі тады, калі рэчаіснасць здзейснілася, завяршыла працэс свайго ўтварэння... Толькі з надыходам цемры вылятае сава Мінервы"[3].

Напрыканцы жыцця лекцыі Гегеля і ягоныя нататкі трапляюць у Берліне пад больш жорсткія, чым раней, кантроль і цэнзуру[4]. А значыць, цяжка даведацца, ці сапраўды з узростам змяніліся погляды філосафа. Як бы там ні было, навіна сацыяльнай філасофіі Гегеля найперш у тым, што ён

[1] *Op. cit., trad. franç., Paris, 1946, p. 401.*

[2] *Ibid., p. 409.*

[3] *Op. cit., p. 32.*

[4] *У сваёй працы La philosophie politique de Hegel (Paris, 1964) Я. Фляйшман настойвае на факце суворасці прускай цэнзуры, што, на яго думку, часткова і тлумачыць "тэхнічны" характар шматлікіх разважанняў, якія прысутнічаюць у "Прынцыпах філасофіі права".*

пры дапамозе новых тэрмінаў узняў праблему мэты і сродкаў палітычнага дзеяння. Кант, на думку Гегеля, меркаваў забяспечыць свабоду індывіда праз пераўтварэнне маральнага закону ў чыста нутраны закон, "катэгарычны імператыў", які загадвае кожнаму дзейнічаць такім чынам, каб ягоны ўчынак мог служыць у якасці універсальнага закону. Але ў сапраўднасці гэты прынцып не можа кіраваць індывідам: бо апошні заўсёды мае перад сабой некалькі варыянтаў "дабра" або "абавязкаў", паміж якімі ён павінны выбіраць. А індывід заўжды будзе выбіраць зыходзячы са сваёй персанальнай ацэнкі. Калі ж дапусціць, што дабро мае універсальную каштоўнасць, дык варта сказаць, што індывідуальны выбар, які будзе, відавочна, прыватным, ніколі пасапраўднаму не адпавядае дабру. Пакінуты на волю лёсу індывід безвыходна вагаецца паміж дабром і ліхам, якія ўзаемадапаўняюць адно аднаго. Кожны раз, калі ён ставіць перад сабой "добрую" мэту, узнікае неабходнасць ахвяраваць мэтай "благой". Але іншы індывід, які апынецца ў такіх жа акалічнасцях, можа зрабіць супрацьлеглы выбар, ды такім чынам, што дабро зойме месца ліха і наадварот.

І Гегель робіць наступную выснову: праблема маральнасці будзе неразвязальнай, пакуль да яе падыходзяць з пазіцыі індывіда, пазіцыі суб'ектыўнай. Сапраўдная мараль — гэта сацыяльная аб'ектыўная мараль, ці сукупнасць прынцыпаў паводзінаў, прынятых у дадзеным грамадстве.

"Бо такая няпэўная і даволі пустая рэч, як дабро ў імя любові да дабра, — пісаў Гегель, — увогуле не мае месца ў жывой рэчаіснасці. Калі ў наяўнасці жаданне дзейнічаць, то недастаткова толькі жадаць дабра, варта таксама ведаць, што ёсць дабро. А што лічыць дабром ці ліхам, справядлівасцю ці несправядлівасцю — усё гэта ў асноўным, зыходзячы з маралі дзяржавы, пазначана ў законах. І не цяжка ведаць усё гэта. Для кожнага індывіда вызначана сваё месца ў грамадстве, і ён у прынцыпе ведае, як паводзіць сябе ў пэўных межах закону"[1].

Можа скласціся ўражанне, што перад намі надзвычай кансерватыўная філасофія. Аднак гэта зусім не так, бо калі Гегель і зацвярджаў зверхнасць сацыяльна прызнаных прынцыпаў паводзінаў над маральным індывідуальным мерка-

[1] *Leçons sur la philosophie de l'histoire, op. cit., p. 37.*

ваннем, то ён таксама быў і першым з усіх філосафаў, хто адвёў у сваёй сістэме асноватворнае месца пераўтварэнням грамадства і хто прызнаў ролю, якую адыгрывае ў гэтых пераўтварэннях сацыяльная барацьба. Ён пісаў:

"Усеагульная ідэя, катэгорыя, якая адразу ж становіцца відавочнай у няспынным працэсе змянення індывідаў і народаў, што пэўны час існуюць, а потым знікаюць, — гэта ў асноўным *пераўтварэнне*. Выгляд руінаў былой велічы дэманструе нам і негатыўны бок гэтага пераўтварэння. Які вандроўнік сярод руінаў Картагена, Пальміры, Персепаліса і Рыма не прыходзіў да разважанняў аб недаўгавечнасці імперыяў і людзей...? Але самы галоўны сэнс пераўтварэння іншы: пераўтварэнне, якое руйнуе, адначасна нараджае новае жыццё; калі смерць надыходзіць пасля жыцця, то і жыццё зыходзіць ад смерці... Паглынаючы абалонку свайго існавання, дух не толькі паўстае зноў адноўленым з попелу сваёй папярэдняй формы, але і робіцца вышэйшым, пераўтвораным і больш чыстым..."[1]

Зацверджанне гістарычнага характару чалавека атаясняецца ў Гегеля з зацверджаннем ягонай духоўнай сутнасці. Чалавек, лічыў філосаф, павінны ажыццявіць у гісторыі сваё пакліканне, якое зводзіцца да наступнага: стварыць такі сацыяльны лад, які зрабіў бы магчымым росквіт творчых здольнасцяў ягонага духу і пры якім цалкам прызнавалася б свабода духу. Варта падкрэсліць, што гэта не мае нічога агульнага з "трансфармісцкімі" канцэпцыямі, для якіх непрымальная ідэя прыроды чалавека. У Гегеля гаворка ідзе пра забеспячэнне паступовай рэалізацыі чалавекам якраз прыроднай сутнасці свабоднай істоты.

Гэта не перашкаджала філосафу прызнаць, што рух да свабоды — складаны рух, які не выключае гвалтоўнай барацьбы. Гегель казаў: гісторыя не зводзіцца да працэсу, які ажыццяўляецца вельмі паступова і амаль непрыкметна накшталт прыроднага працэсу выспявання зародка; гэта пераўтварэнне, якое адбываецца пад уплывам чалавечай волі і якое ў пэўныя моманты руйнуе сацыяльную рэчаіснасць. Такім чынам, гісторыя — гэта пераўтварэнне, умовы ажыццяўлення якога — супрацьлегласць і барацьба.

"Эвалюцыя, — сцвярджаў Гегель, — таксама пануе і ў арганічным свеце... арганічны індывід аднаўляецца сам па сабе і робіцца тым, што

[1] *Ibid., p. 72.*

ён з сябе ўяўляе... Ніштo не можа ўмяшацца ні ў задуму, ні ў яе ажыццяўленне, змяніць прыроду пэўнага зародка і належнае яму існаванне. З духам гэта адбываецца па-іншаму. Пераход ад ягонага вызначэння да ажыццяўлення адбываецца дзякуючы свядомасці і волі, якія найперш залежаць ад непасрэднага натуральнага жыцця: напачатку яны маюць у дачыненні да аб'екта і мэты натуральнае вызначэнне, а паколькі яно натхняецца духам, то з'яўляецца само па сабе бясконцым у тым, што датычыць ягоных прэтэнзіяў, магутнасці і багацця. Праз гэта дух супрацьпастаўляецца сам сабе; для самога сябе ён — сапраўдная варожая перашкода, якую неабходна пераадолець; эвалюцыя, спакойная вытворчасць прыроды, уяўляе для духу цяжкую і бясконцую барацьбу супраць самога сябе... Адсюль эвалюцыя — гэта не проста квітненне без пакутаў і без барацьбы, як у арганічным жыцці, але і цяжкая засяроджаная на сабе праца..."[1]

Гегель лічыў, што рэвалюцыі, як і войны, часам непазбежныя, але яны спараджаюць столькі ліха, што жадаць іх нельга. І ў найвышэйшай ступені неразумна, паводле яго меркавання, марыць пра нейкае "дасканалае" грамадства, у якім адчуванне супольнасці магло б пераважаць і над прыватнымі інтарэсамі, і над інтарэсамі дзяржавы. Тым не менш Гегель не лічыў, што варта пагадзіцца на пасіўнае стаўленне да грамадскіх праблемаў. "Розум, — пісаў ён, — не можа пагадзіцца з халоднай роспаччу ад таго, што паколькі ў гісторыі ўсё ідзе дрэнна або пасрэдна, то ў ёй дакладна не можа адбыцца нічога лепшага і што трэба змірыцца з рэчаіснасцю: сапраўднае спазнанне дае сапраўдны спакой"[2].

Такое стаўленне вялікага філосафа, натхнёнае самай высокай мудрасцю, не магло, безумоўна, адразу ж быць зразуметым сучаснікамі. Гегеля папракалі ў тым, што ён хоча праз думку, а не рэальна развязаць супярэчнасці сучаснага свету. Перш за ўсё гэта рабіў Маркс, які спрабаваў супрацьпаставіць ідэям Гегеля тэорыю руху да дасканаласці рэвалюцыйным шляхам.

Бібліяграфія

Безумоўна, філасофію Гегеля цяжка вывучаць. Аднак яна пануе ў сучаснай думцы, і нам уяўляецца, што яна дае ключ да разумення ўсёй інтэлектуальнай эвалюцыі XIX—XX стст.

[1] *Ibid., p. 57.*

[2] *Principes de la philosophie du droit, op. cit., p. 32.*

Чытачу, які не займаецца філасофіяй, напачатку будзе лягчэй працаваць з найбольш чытальнымі тэкстамі, напрыклад: *"Лекцыі па філасофіі і гісторыі"* ці цудоўная *"Прадмова"* да *"Фенаменалогіі духу"*.

Для эканаміста, безумоўна, найважнейшая частка творчасці Гегеля — *"Прынцыпы філасофіі права"*; але гэта твор, які па-сапраўднаму можна зразумець толькі азнаёміўшыся з папярэднімі працамі філосафа. Да таго, як пачаць вывучаць *"Прынцыпы філасофіі права"*, ці пад час вывучэння гэтага твора варта было б паспрабаваць "расшыфраваць" *"Фенаменалогію духу"* і *"Навуку логікі"*.

У такой працы вялікай дапамогай будзе азнаямленне з дысертацыяй: D'Herbert Marcuse, *L'ontologie de Hegel et la théorie de l'historicité*, 1932, trad. franç., Paris, 1972, а для завяршальнага сінтэзу надзвычай карысная праца J. Hyppolite, *Logique et existence, essai sur la logique de Hegel*, Paris, 1953. Аўтар дадзенай кнігі таксама займаўся разглядам палітычнай філасофіі Гегеля ў сваім творы Henris Denis *"Hegel, penseur politique"*, Lausanne, L'Age d'homme, 1989.

Раздзел VI

ІДЭІ КАРЛА МАРКСА

§ 1. Маладыя гады Карла Маркса. Далучэнне да камунізму (1818—1845)

А) Біяграфічныя звесткі

Карл Маркс нарадзіўся ў Трыры ў 1818 г. Яго бацька быў адвакатам габрайскага паходжання, але мусіў прыняць пратэстантызм, каб мець магчымасць працягваць прафесійную дзейнасць.

У 1815 г. па выніках Венскага кангрэса горад Трыр разам з Рэйнскай правінцыяй быў прызнаны за Прусіяй, дзе панаваў рэжым абсалютнай манархіі. Адміністрацыя Прусіі імкнулася распаўсюдзіць яго і на далучаную правінцыю.

У 1835 г. Маркс запісаўся ў Бонскі універсітэт, каб вывучаць права. Ён браў удзел у дзейнасці студэнцкіх арганізацый, якія пераследваліся за распаўсюджанне ліберальных ідэяў.

22 кастрычніка 1837 г. яго залічылі на факультэт права ў Берліне. Аднак яго ўжо значна менш цікавілі юрыдычныя навукі. На працягу першага семестра ён наведваў тры курсы: па антрапалогіі, рымскім праве, крымінальным праве. Апошні курс выкладаў Ганс (паслядоўнік Гегеля), прыхільнік сэн-сімонаўскага ідэалу вызвалення асобы. Ён быў адным з нешматлікіх прафесараў, хто асмельваўся адкрыта ўзгадваць і нават усхваляць Французскую рэвалюцыю.

Тым часам Маркса ўсё больш пачала вабіць філасофія. Улетку 1838 г. пад час хваробы ён чытаў працы Гегеля і захапляўся імі. Тады ж старанна наведваў Doctorklub, суполку інтэлектуалаў, з якой вылучылася плынь, схільная да прагрэсіўнага тлумачэння спадчыны Гегеля: моладагегельянцы, або левыя гегельянцы. Іх лідэрам быў Бруна Баўэр. Інтэлектуалы верылі, што вызваленне свядомасці людзей прывядзе да палітычнага вызвалення грамадства, таму надавалі вялікае значэнне дыскусіям па рэлігійных пытаннях. Сябры клуба ўсё больш схіляліся да атэізму, і Маркс падзяляў іх погляды.

Аднак рэпрэсіі рэжыму ў дачыненні да ліберальнага руху ўсё больш узмацняліся. Маркс, які спадзяваўся стаць выкладчыкам у Берлінскім універсітэце, быў вымушаны адмовіцца ад сваёй мары. Тым не менш ён у 1841 г. абараніў доктарскую дысертацыю па філасофіі.

Пасля вяртання ў Бон у 1842 г. пачаў супрацоўнічаць з ліберальнай *"Рэйнскай газетай"*, дзе крытыкаваў прускі ўрад. Ён цікавіўся сацыяльнымі праблемамі і, у прыватнасці, вывучаў працы французскіх сацыялістаў і камуністаў: Прудона, Кабэ, Леру, Кансідэрана і інш. Тым часам Маркс заставаўся перакананым, што змены павінны адбыцца найперш у мысленні, а ўжо потым у грамадскім ладзе. Паводле яго меркавання, задача прагрэсіўных людзей палягае ў тым, каб пераканаць уладу ў неабходнасці праводзіць грунтоўныя сацыяльныя рэформы.

У апошнія месяцы 1842 г. Маркс узначаліў *"Рэйнскую газету"*. Ён працягваў барацьбу з рэжымам, але ўсё больш адыходзіў ад поглядаў берлінскіх сяброў — моладагегельянцаў. Маркс імкнуўся да развязання канкрэтных практычных пытанняў, а не да бяссэнсавых абстрактных дыскусій.

Аднак 31 сакавіка 1843 г. *"Рэйнская газета"* мусіла спыніць сваю дзейнасць. Кароль Прусіі забараніў яе ў адказ на просьбу рускага цара, раскрытыкаванага газетай. Журналісцкая практыка, якая была бадай што адзіным полем дзейнасці для ліберадаў у Нямеччыне, з гэтага часу стала немагчымай. Моладагегельянцы практычна замкнуліся на саміх сабе. Яны абмяжоўваліся дэманстрацыяй сваёй варожасці да тагачаснага грамадскага ладу, што знаходзіла адлюстраванне, напрыклад, у працах анархіста Макса Штырнэра.

Маркс, наадварот, прыняў выклік уладаў. Ён намерыўся паехаць за мяжу, каб там працягваць палітычную барацьбу. У Францыі ён падпісаў кантракт на выданне новага часопіса, прызначанага французскаму і нямецкаму чытачу.

Неўзабаве Маркс пабраўся шлюбам з дзяўчынай з арыстакратычнай сям'і, з якой быў заручаны з 7 гадоў, — Джэні фон Вестфален.

Пасля жаніцьбы яму прапанавалі месца на ўрадавай

службе, але ён адмовіўся ад прапановы і ў кастрычніку 1843 г. прыехаў у Парыж.

У лютым 1844 г. Маркс выдаў першы нумар новага *"Нямецка-французскага штогодніка"*, дзе апублікаваў артыкул, у якім упершыню падаў асноўныя ідэі тэорыі сацыяльнай рэвалюцыі. Артыкул называўся *"Да крытыкі гегелеўскай філасофіі права. Уводзіны"*. Гэты артыкул быў пачаткам больш значнай працы, апублікаванай толькі ў 1931 г., — *"Крытыка гегелеўскай філасофіі права"*.

Артыкул Маркса меў значны рэзананс і не застаўся незаўважаным тымі, супраць каго быў скіраваны. Нямецкая паліцыя адразу зразумела небяспечны характар новага часопіса. Адзін з чыноўнікаў так ахарактарызаваў выданне: "Сваім скандальным і агідным характарам яно пераўзышло ўсю тую рэвалюцыйную прэсу, што існавала дагэтуль". Продаж часопіса ў Нямеччыне стаў практычна немагчымым, і другі нумар так і не выйшаў.

Тым не менш Маркс з вялікім імпэтам працягваў свае даследванні. Па сведчанні сучасніка, "ён заставаўся па трычатыры ночы без сну, зноў і зноў паглыбляючыся ў мора кніг".

У Парыжы ён супрацоўнічаў з нямецкай газетай *"Форвэртс"*. На яе старонках быў апублікаваны ягоны артыкул пра паўстанне сілезскіх ткачоў. Маркс верыў, што гэтае паўстанне — заранак рэвалюцыі, але паўстанне было задушанае. Ён зразумеў, што трэба паглыбіць свае тэарэтычныя напрацоўкі, і таму цалкам аддаўся вывучэнню палітычнай эканоміі і гісторыі.

Значны інтарэс уяўлялі для яго тагачасныя нелегальныя суполкі рабочых-камуністаў, але Маркс не стаў сябрам ніводнай з гэтых арганізацый, якія кіраваліся ідэямі утапічнага сацыялізму і настойвалі на аднаўленні ідэалаў першых хрысціян. Якраз тады, увосень 1844 г., Маркс сустрэў Фрыдрыха Энгельса, які стаў яго блізкім паплечнікам і з якім ён цесна супрацоўнічаў усё сваё жыццё. Сын аднаго з багатых нямецкіх прамыслоўцаў, уладальніка баваўняна-прадзільнай фабрыкі ў Манчэстэры (Ангельшчына), Энгельс стаў з 1842 г. прыхільнікам ідэяў камунізму, асабліва пасля таго, як блізка

пазнаёміўся з жабрацкім жыццём нямецкіх і ангельскіх рабочых. Ён падзяліўся з Марксам сваімі меркаваннямі пра эканамічнае і сацыяльнае становішча ангельскага пралетарыяту.

У 1844 г. Маркс напісаў *"Эканамічна-філасофскія рукапісы"* (якія ўбачылі свет толькі ў 1927 г. у СССР). У тым жа годзе ён завяршыў вялікую палемічную працу, скіраваную супраць сяброў-моладагегельянцаў, якая была апублікаваная ў Франкфурце ў лютым 1845 г. пад назовам "Святая сям'я". У гэтай працы, як і ў *"Крытыцы гегелеўскай філасофіі права"*, выкладзены першыя прынцыпы марксісцкай тэорыі.

Б) Тэорыя Маркса ў 1844 г.

На пачатку сваёй палітычнай дзейнасці, калі Маркс спадзяваўся разам з моладагегельянцамі пераканаць караля Прусіі ў неабходнасці правядзення рэформаў, ён лічыў сябе паслядоўнікам Гегеля. Пазней, калі гэтая надзея знікла, Маркс пачаў крытыку філасофіі Гегеля, дзе сцвярджаў, што шлях папярэдніка памылковы. У сваёй крытыцы ён выкарыстоўваў працы Людвіга Фоербаха, апублікаваныя на пачатку 1839 г. Фоербах сцвярджаў, што Гегель ігнараваў рэальнасці прыроды.

"Фенаменалогія і Логіка, — пісаў ён, — пачынаюцца з адной лагічнай памылкі... яны пачынаюцца не з няіснасці думкі, але з думкі пра няіснасць думкі. Дзякуючы гэтаму думка загадзя ўпэўненая ў перамозе над сваімі праціўнікамі... Філасофія — гэта навука пра рэчаіснасць у яе сапраўднасці і паўнаце, а сапраўдная рэчаіснасць — гэта ёсць прырода. У самых простых, натуральных рэчах ёсць найглыбейшыя таямніцы, да якіх летуценны метафізік ставіцца з пагардай, ягоны позірк скіраваны на незямное. Але збаўленне — толькі ў вяртанні да прыроды"[1].

Фоербах лічыў сябе "матэрыялістам", таму імкнуўся распрацаваць "гуманістычную" сацыяльную тэорыю. Ён пісаў, што чалавек павінны вызваліцца ад ілюзіяў, асабліва рэлігійных, якія перашкаджаюць яму і "адчужаюць" яго. Толькі тады кожны суб'ект зразумее, што ён існуе як прадстаўнік часткі прыроды, чалавечага роду. Толькі тады, калі гэты

[1] *Contribution à la critique de la philosophie de Hegel. Annales de Halle, août-sept. 1939; cité par A. Cornu, in Karl Marx et Frédéric Engels, Paris, 1955, I, pp. 150–151.*

суб'ект здолее ўлучыцца ў жыццё калектыву, ён спазнае шчасце[1].

Паміж "гуманізмам" Фоербаха і камуністычнай тэорыяй няма вялікай розніцы, нягледзячы на тое што гэты філосаф сам ніколі не крытыкаваў прыватнай уласнасці. Адзін з сяброў Маркса — Мозэс Гес — неўзабаве выкарыстаў тэорыю Фоербаха дзеля абароны сваіх камуністычных перакананняў.

Ён пісаў, што праблема "адчужэння" чалавека развяжацца не толькі са знікненнем рэлігіі, але і пасля знішчэння прыватнай уласнасці і дзяржавы[2].

Тым не менш Гес не заклікаў да гвалтоўнай рэвалюцыі, Маркс жа пачынаючы з 1844 г., наадварот, сцвярджаў, што трансфармаваць грамадства можна толькі сілай, і такая сіла — прыгнечаны рабочы клас. Такім чынам, Маркс падтрымаў ідэі Бабёфа і яго паслядоўнікаў, французскіх рэвалюцыянераў Барбэса, Блянкі, рускага рэвалюцыянера Бакуніна, які незадоўга да таго апынуўся ў Заходняй Эўропе, і, нарэшце, ідэі краўца Вайтлінга, які стаяў на чале нямецкіх рабочых-эмігрантаў у Францыі, Швайцарыі, Ангельшчыне. Менавіта яны стварылі нелегальную суполку "Хаўрус справядлівых".

У 1842 г. Вайтлінг апублікаваў у Швайцарыі сваю працу *"Гарантыі гармоніі і волі"*, у якой заклікаў рабочы клас знішчыць буржуазнае грамадства і замяніць яго на камуністычнае. Маркс прыхільна сустрэў кнігу, але ён бачыў і яе слабыя бакі.

Вайтлінг прываблівaў сваіх вучняў чароўнай карцінай будучага грамадства, дзе кожны здолее задаволіць усялякія свае жаданні дзякуючы абагуленню ўсёй маёмасці, у прыватнасці праз стварэнне жаночай супольнасці. У *"Эканамічна-філасофскіх рукапісах"* Маркс выкрыў гэты "вульгарны камунізм", які быў не чым іншым, як прымітыўным праяўленнем прагі індывіда да асалоды. Але, нягледзячы на значную дыстанцыю між поглядамі філосафа, бліскуча адукаванага чалавека, і поглядамі рабочых, часта грубых і неаду-

[1] *Cf. les textes cités par A. Cornu, op. cit., t. II, 1958, pp. 126–127 (notes).*
[2] *Article "Socialisme et communisme", mai 1843; A. Cornu, op. cit., II, p. 139.*

каваных, Маркс тым не менш сцвярджаў, што сацыяльныя змены павінны ажыццяўляцца намаганнямі рабочых, якія ўяўляюць сабою значную моц.

Гэты тэзіс карэнным чынам змяняе сацыялістычную ідэю; тут можна лёгка заўважыць уплыў гегелеўскай канцэпцыі, якая ўзвышае гісторыю над мараллю. Аднак Маркс не задаволіўся сцверджаннем, што часам рэвалюцыі непазбежныя. Ён выказаў жаданне прысвяціць сябе справе падрыхтоўкі і ажыццяўлення вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Эўропе. Ён цалкам адпрэчвае Гегелева бачанне мэты палітычнай дзейнасці, наўзамен яго выкарыстоўваючы ідэі Фоербаха.

У *"Фенаменалогіі духу"* Гегель выразна паказаў, што рэвалюцыі не могуць канчаткова развязаць праблемы грамадскага жыцця. Калі б рэвалюцыі былі здольныя дасягнуць гэтага, дык гісторыі не існавала б, паколькі не было б неразвязаных сацыяльных пытанняў. Спасылаючыся ў якасці прыкладу на перыяд пасля Французскай рэвалюцыі, ён сцвярджаў, што за рэвалюцыйнай эпохай, у час якой людзі спадзяюцца атрымаць поўную свабоду, непазбежна надыходзіць момант, калі які-небудзь валявы чалавек узурпуе ўладу з мэтай навязаць грамадству новы лад[1].

Згодна з Гегелем, неабходнасць сацыяльнай перабудовы пасля знішчэння былога ладу не выключае прагрэсу. Новыя формы развіцця стаяць вышэй за старыя, чалавецтва набліжаецца да свабоды. Тым не менш дарэмна думаць, лічыў ён, што грамадства можа дасягнуць такога стану, калі людзі будуць цалкам свабодныя, гэта значыць *адразу* ўсвядомяць, што, падпарадкоўваючыся звычаям і законам, яны падпарадкоўваюцца самім сабе. У рэальнасці гэта немагчыма таму, што свядомасць павінна адчужацца, каб вярнуцца ў сябе. Сацыяльныя інстытуцыі па сваіх функцыях заўсёды будуць адчужаць чалавека і заўсёды індывід павінны

[1] *Гэтую думку Гегель выказаў даволі спецыфічнай мовай. Ён пісаў: "...зноў ствараецца ўсеагульная свядомасць, з якой вылучаецца мноства адзінкавых свядомасцяў (гаворка ідзе пра новыя сацыяльныя катэгорыі). Менавіта адзінкавыя свядомасці адчуваюць і жорсткасць свайго ўладара, і яго неабмежаваную ўладу, і ягоную смерць. Але і ў чарговы раз яны схільныя да адмаўлення ўсяго і абыякавасці. Яны ўтвараюць натоўп і калі зноў назапашваюць патэнцыял для чарговага некіроўнага ўчынку і ажыццяўляюць яго, то адначасова выракаюцца свайго субстанцыяльнага патэнцыялу (La phénomenologie de l'esprit, trad. franç., Paris, 1941, II, pp. 137–138).*

будзе рабіць намаганні, каб усвядоміць сваю функцыю ў грамадстве і, такім чынам, стаць свабодным. Развіццё грамадскіх інстытуцый не адмаўляе неабходнасці гэтых намаганняў. Трэба толькі імкнуцца да таго, каб усвядоміць сваю функцыю змаглі як мага болей індывідаў.

Такое стаўленне да палітычнай дзейнасці і "ідэальнага грамадства" тлумачыць той факт, што Гегель у "Фенаменалогіі" прадстаўляе мастацтва, рэлігію і філасофію як формы рэалізацыі свядомасці, даступныя таму, хто жадае прымірыцца з рэчаіснасцю і хто не здолеў знайсці такога прымірэння ў дзейнасці.

Можа, Гегель хацеў сказаць гэтым, што палітычная актыўнасць не мае сэнсу? Невядома. Але малады Маркс, якому карцела дзейнічаць, менавіта так тлумачыў працу настаўніка. Маркс абвінаваціў Гегеля, што апошні падрыхтаваў апраўданне для тых, хто зразумеў, што такое сацыяльнае ліха, але ўхіляецца ад барацьбы. Спасылаючыся на крытыку Гегеля Фоербахам, Маркс пісаў, што Гегель цікавіўся толькі "нутраным", а не рэальным, гістарычным жыццём чалавека (што відавочна недакладна).

Але калі адпрэчваць пазіцыю Гегеля, то трэба паказаць, што адчужэнне чалавека можа і павінна канчаткова знікнуць, што ідэальнае грамадства павінна стаць рэальнасцю. Гэта якраз тое, што імкнуўся даказаць Маркс, развіваючы радыкальную крытыку прыватнай уласнасці. У выніку ён прыйшоў да высновы, што прыватную ўласнасць неабходна знішчыць.

У *"Філасофіі права"* Гегель (пасля Фіхтэ) вызначыў уласнасць як інстытуцыю, што дазваляе індывіду існаваць, забяспечваючы вонкавыя ўмовы для ажыццяўлення свабоды. Індывід адчувае сябе "кімсьці" ў той ступені, у якой ён здольны кіраваць рэчамі, што яму належаць. Менавіта гэта і ёсць працэс аб'ектывацыі свядомасці ці працэс адчужэння, які, паводле Гегеля, заўсёды неабходны. Магчыма, лічыў ён, прыватная ўласнасць сама па сабе і спрычыняецца да супярэчнасцяў, сутыкненняў паміж людзьмі, але гэтыя супярэчнасці могуць быць пераадоленыя ўнутры "грамадзянскай супольнасці" з дапамогай дзяржаўных інстытуцый.

Згодна з Марксам, наадварот, інстытуцыя прыватнай уласнасці разбурае чалавечую сутнасць, і гэты працэс павінны быць спынены як мага хутчэй. Сам рабочы не распараджаецца прадуктам сваёй працы. З прыбытку яму вылучаецца такі мінімум, які дазваляе яму і яго сям'і не памерці з голаду. Гэта азначае, паводле меркавання Маркса, што прыватная ўласнасць вядзе не да рэалізацыі чалавечай сутнасці, але, наадварот, да яе страты і адчужэння.

"Адчужэнне выяўляецца ў тым, — сцвярджаў Маркс, — што вытанчанасць патрэбаў для адных абарочваецца свінскім здзічэннем, татальным, вульгарным спрашчэннем патрэбаў для іншых... Нават патрэба свежага паветра перастае быць для рабочага патрэбай. Чалавек зноў перасяляецца ў пячоры, якія, аднак, сёння атручаныя смярдзючым чумным подыхам цывілізацыі і ў якіх ён толькі часовы жыхар... Ірляндзец ведае толькі адну патрэбу — патрэбу ў ежы, ягоны харч у асноўным бульба, харч жабракоў, прычым бульба найгоршай якасці. Дык у кожным прамысловым горадзе Ангельшчыны і Францыі ўжо існуе свая маленькая Ірляндыя"[1].

Аднак, на думку Маркса, адчужэнне чалавека праяўляецца не толькі ў жабрацтве працоўных. Вяртаючыся да тэмы, якую раней закраналі Русо, Фіхтэ, Гегель, ён паказаў, што капіталіст таксама адчужаецца, духоўна разбэшчваецца ў выніку панавання культу грошай.

Прыватная ўласнасць, пісаў ён, зрабіла нас настолькі неразумнымі і аднабаковымі, што пэўны прадмет становіцца *нашым* толькі тады, калі ён існуе як капітал ці калі мы ім непасрэдна валодаем — ядзім, п'ем, апранаемся, жывем у ім і г. д., — адным словам, калі мы яго *спажываем*... Таму ўсе фізічныя і духоўныя пачуцці пераважыла простае адчужэнне ўсіх гэтых пачуццяў — пачуццё валодання[2].

Маркс меркаваў таксама, нібыта яму ўдалося паказаць насуперак Гегелю, што прыватная ўласнасць не можа ніякім чынам разглядацца як абавязковая ўмова ажыццяўлення свабоды, як неабходная аб'ектывацыя чалавека. Маркс надаў тэрміну "адчужэнне" той жа сэнс, што і Фоербах, а гэта значыць, для Маркса ён непрымальны, памылковы, супраціўны прыродзе рэчаў.

Апрача таго, паводле Маркса, памылкова думаць, што

---

[1] *Economie politique et philosophie, trad. franç., in Karl Marx, OEuvres philosophiques, VI, Paris, 1937, pp. 51–52.*

[2] *Ibid., pp. 29–30 (пераклад з папраўкамі).*

сутыкненні, спароджаныя адчужэннем, могуць быць развязаныя ўмяшаннем дзяржавы, бо дзяржава сама — прадукт такога адчужэння.

Гэта яшчэ адно з палажэнняў, у якім Маркс супрацьстаіць Гегелю. Для Маркса дзяржава — толькі моц, арганізаваная ўласнікамі з мэтай абароны сваіх прывілеяў. Ён абвінавачвае Гегеля ў тым, што той наўмысна ўводзіць сваіх чытачоў у зман, выяўляючы дзяржаву як духоўную рэальнасць, дзе ўсе грамадзяне — супольнікі адной чалавечай еднасці[1].

Адсюль напрошваецца выснова: трэба скасаваць прыватную ўласнасць і дзяржаву, як гэтага вымагаюць камуністы і як мусілі б патрабаваць сацыялісты, Прудон напрыклад, калі б яны былі паслядоўныя ў сваёй палітыцы[2]. Аднак, удакладніў Маркс, камунізм сам па сабе — гэта толькі неабходнае адмаўленне ад мінулай гісторыі, але ён не з'яўляецца "мэтай чалавечага развіцця". Задача камунізму — адкрыць шлях да "прымірэння чалавека з прыродай", што паспрыяе ўзнікненню "пазітыўнага гуманізму". Немагчыма сказаць, якой будзе будучыня чалавецтва, а таму праекты аўтараў камуністычнага кірунку пакуль не выклікаюць інтарэсу. А калі нарэшце камуністычная рэвалюцыя завершыцца перамогай паўсюдна, то толькі тады "загадка гісторыі" будзе разгаданая, і мы даведаемся, у чым яна.

---

[1] *Гэтае сцверджанне Маркса таксама далёкае ад поўнай адпаведнасці рэчаіснасці. Можна, напрыклад, узгадаць, што Гегель у адным з урыўкаў "Лекцый па філасофіі гісторыі" крытыкаваў дзяржаву, якая кіруецца толькі сваімі ўласнымі інтарэсамі. Ён пісаў: "Мала прызнання неадлучных правоў, свабоды асобы і свабоды маёмасці..., лібералізм супрацьпастаўляе ўсяму гэтаму атамістычны прынцып індывідуальнай волі: усё павінна ажыццяўляцца дзякуючы яе сіле і ўхваленню. Такі фармалізм свабоды і такая абстрактнасць не пакідаюць нічога ўстойлівага для стварэння арганізацыі... Вось калізія, вузел, праблема гісторыі, якую яна павінна развязаць у бліжэйшым часе... (trad. franç., Paris, 1946, p. 405).*

[2] *"Жаданне Прудона, — пісаў Маркс, — зліквідаваць невалоданне і старую форму валодання сапраўды адпавядае ягонаму жаданню скасаваць такі стан, пры якім чалавек практычна адчужаны ад сваёй аб'ектыўнай існасці скасаваць эканамічнае выяўленне чалавечага самаадчужэння (La Sainte Famille, trad. franç., in Karl Marx, OEuvres philosophiques, t. II, Paris, 1927, p. 73).*

§ 2. Жыццё і погляды Карла Маркса ў 1845—1848 гадах. Гістарычны матэрыялізм

Дзейнасць Маркса ў Парыжы, водгук на яго пісьмовыя працы занепакоілі прускі ўрад, які дамогся ў 1845 г. таго, каб Маркса выслалі з Францыі. Маркс выехаў у Брусэль, дзе яго вымусілі адмовіцца ад публікавання ўсялякіх палітычных працаў. Якраз тады Маркс разам з Энгельсам пачалі пісаць філасофскую працу, якая мела назоў *"Нямецкая ідэалогія"* і не была апублікаваная па віне рэдактара. Яна выдадзеная толькі ў 1932 г. і ў спадчыне Маркса займае значнае месца, бо ў ёй упершыню сфармуляваны тэрмін "гістарычны матэрыялізм".

Тым жа часам Маркс імкнуўся данесці свае ідэі да суполак рабочых-камуністаў, з якімі ён меў сувязі, і ў тым ліку да самай значнай сярод іх — "Хаўрусу справядлівых" на чале з Вайтлінгам.

Лонданскія сябры "Хаўрусу" стварылі легальную асацыяцыю нямецкіх рабочых, якія групаваліся па 500 чалавек. Вельмі далёкія ад ідэяў Вайтлінга, гэтыя людзі верылі ў эфектыўнасць развіцця культуры. Кожны вечар праводзіліся лекцыі па ангельскай мове, геаграфіі, гісторыі, маляванні, спевах, танцах і, нарэшце, камуністычнай палітыцы.

Абапіраючыся на "Хаўрус справядлівых", Маркс узяўся стварыць "Каардынацыйны камітэт", цэнтрам якога меўся быць Брусэль. Задача камітэта палягала ў арганізацыі эпісталярнай дыскусіі паміж рознымі камуністычнымі і сацыялістычнымі групоўкамі. Маркс прапанаваў Прудону стаць карэспандэнтам у Парыжы, але той адмовіўся. Вайтлінг таксама не выказаў жадання супрацоўнічаць, бо баяўся канкурэнцыі інтэлігенцыі.

Сапраўды, пад час сустрэчы ў Брусэлі 30 сакавіка 1846 г. Маркс жорстка крытыкаваў погляды Вайтлінга, адзначаючы, што "няведанне нікому ніколі не ішло на карысць". Неўзабаве паміж Марксам і Вайтлінгам адбыўся разрыў. Восенню 1846 г. цэнтральны камітэт "Хаўрусу" аднавіўся, кіраўніцтва ўзялі на сябе лонданскія прадстаўнікі. Маркс далучыўся да

“Хаўрусу справядлівых”, які ў сакавіку 1847 г. атрымаў назоў “Хаўрус камуністаў”. Былы дэвіз “Усе людзі — браты” быў заменены на новы: “Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!” Маркс усё больш жорстка крытыкаваў тэзісы вядомых сацыялістаў, асабліва палажэнні Прудона. У ліпені 1847 г. ён апублікаваў на французскай мове *“Жабрацтва філасофіі”*. Гэтая праца была зняпраўджаннем працы Прудона *“Сістэма эканамічных супярэчнасцяў, або Філасофія жабрацтва”*.

Прэстыж Маркса як новага тэарэтыка сярод камуністаў хутка рос, яго сталі часта запрашаць на сустрэчы. Пад час прыезду ў Лондан, дзе ён браў удзел у кангрэсе, Маркс заявіў пра непазбежнасць рэвалюцыі. “Хаўрус” даручыў Марксу і Энгельсу скласці канчатковы тэкст праграмы, які атрымаў найменне *“Маніфест камуністычнай партыі”* і быў апублікаваны ў Лондане ў студзені 1848 г. на нямецкай мове. У лютым выбухнула рэвалюцыя ў Парыжы.

За перыяд, які скончыўся Французскай рэвалюцыяй, у поглядах Маркса адбыліся значныя змены. Ён паспрабаваў апраўдаць сваё далучэнне да камунізму з дапамогаю тэорыі гісторыі, якую цяпер звычайна называюць гістарычным матэрыялізмам.

Раней камунізм Маркса будаваўся на тэорыі адчужэння ўласнасці, а гісторыі адводзілася параўнальна невялікая роля. Вядома, Маркс аддаваў вельмі значную ўвагу сучасным падзеям, але ён не імкнуўся растлумачыць, які гістарычны шлях прывёў чалавецтва да стану адчужэння. Прыватная ўласнасць заставалася для яго ў той ці іншай ступені тым, чым яна была для Марэлі і яго паслядоўнікаў: катастрофай, якая ў загадкавых абставінах напаткала чалавецтва.

Маркс старанна шукаў тлумачэнне гістарычнага шляху развіцця, якое прывяло да сучаснага становішча. Ён меркаваў, што знайшоў яго ў падзеле працы, які “натуральна” развіваўся таму, што патрэбы чалавека “натуральна” павялічваліся і ў выніку чалавецтва “натуральна” імкнулася ўзняць ровень задавальнення сваіх патрэбаў.

Маркс пісаў: “Калі першая патрэба задаволеная, працэс задавальнення і ўжо набытае ўменне задавальняцца вядуць да новых патрэбаў, і

гэтае нараджэнне новых патрэбаў з'яўляецца першым гістарычным актам"[1].

Падзел працы робіць магчымым, больш за тое рэальным, становішча, калі духоўная і матэрыяльная дзейнасць, уцехі і праца, вытворчасць і спажыванне выпадаюць на долю розных індывідаў...[2]

Маркс лічыў, што ў гэтым выпадку можна абысціся без паняцця адчужэння. Ён падкрэсліваў, што яго цікавіць толькі аб'ектыўная рэальнасць, а не тое, што адбываецца ў свядомасці.

Перадумовы, з якіх мы пачынаем, — не адвольныя, яны — не догмы; гэта сапраўдныя перадумовы, ад якіх можна адхіліцца толькі ва ўяўленні. Гэта сапраўдныя індывіды, іх дзейнасць і матэрыяльныя ўмовы іх жыцця, як тыя, якія яны атрымліваюць у спадчыну, так і створаныя іх асабістай дзейнасцю. Такім чынам, гэтыя перадумовы выяўляюцца чыста эмпірычным шляхам[3].

Хтосьці запярэчыць, што свядомасць нельга адмаўляць. Безумоўна, пагаджаўся Маркс, але яе трэба разглядаць як вынік умоваў жыцця людзей:

"Мараль, рэлігія, метафізіка і іншыя віды ідэалогіі, як і адпаведныя ім формы свядомасці, страцілі вонкавую незалежнасць. Яны не маюць гісторыі, яны не маюць развіцця, але людзі, развіваючы матэрыяльную вытворчасць і матэрыяльныя дачыненні, мяняюць разам са сваёй рэчаіснасцю таксама свой склад мыслення. Не свядомасць вызначае жыццё, а менавіта жыццё вызначае свядомасць"[4].

Тлумачэнне гісторыі, згодна з Марксам, павінна грунтавацца на вывучэнні развіцця патрэбаў чалавека і яго прадукцыйных сілаў. Гэта дазваляе ўпершыню зразумець сутнасць сацыяльных рэвалюцыяў. Сацыяльныя рэвалюцыі не што іншае, як прадукт супярэчнасцяў, што непазбежна паўстаюць паміж сацыяльнымі інстытуцыямі і прадукцыйнымі сіламі, няспынны рост якіх у сваю чаргу — прычына супярэчнасцяў.

Пазней Маркс удакладніў сваё разуменне рэвалюцыяў, асабліва ва ўводзінах да працы *"Да крытыкі палітычнай эканоміі"* (1859), дзе пісаў:

[1] *Нямецкая ідэалогія (1-я ч.), франц. перакл., in Karl Marx, OEuvres philosophiques, VI, Paris, 1937, p. 166.*

[2] *Ibid., p. 171. Трэба адзначыць, што ідэя драбнення сацыяльнай супольнасці ў выніку падзелу працы сустракаецца яшчэ ў Гегеля. Cf. par exemple Esthétique, франц. перакл., Paris, 1944, t. 1, p. 222 et p. 303.*

[3] *Ibid., p. 154.*

[4] *Ibid., p. 158.*

"У працэсе грамадскай вытворчасці людзі ўступаюць у пэўныя, неабходныя, незалежныя ад іх волі дачыненні; вытворчыя дачыненні, якія адпавядаюць пэўнаму роўню развіцця іх матэрыяльных прадукцыйных сілаў. Сукупнасць гэтых вытворчых дачыненняў складае эканамічную структуру грамадства, сапраўдны базіс, на якім узвышаецца юрыдычная і палітычная надбудова і якой адпавядаюць пэўныя формы грамадскай свядомасці... На пэўнай стадыі свайго развіцця прадукцыйныя сілы грамадства ўступаюць у супярэчнасць з вытворчымі дачыненнямі ці з юрыдычным бокам апошніх — дачыненнямі ўласнасці, унутры якіх да гэтага часу развіваліся. Гэтыя формы развіцця прадукцыйных сілаў становяцца перашкодай для новага тыпу дачыненняў. Тады пачынаецца эпоха сацыяльнай рэвалюцыі"[1].

Гэты ўрывак — бадай што сама распрацаванае палажэнне з усіх дакляраваных Марксам у яго матэрыялістычнай канцэпцыі гісторыі. З 1845 г. ў *"Нямецкай ідэалогіі"* ён ужо суадносіць гэтае палажэнне з тагачасным грамадствам.

Маркс пісаў:

"У сваім развіцці прадукцыйныя сілы дасягаюць такой ступені, на якой узнікаюць вытворчыя сілы і сродкі зносінаў, якія прыносяць з сабой пры наяўных дачыненнях адны толькі бедствы, бо з'яўляюцца ўжо не прадукцыйнымі, а разбуральнымі сіламі (машыны і грошы). Разам з тым нараджаецца клас, змушаны несці на сабе ўвесь цяжар грамадства, не карыстаючыся яго дабротамі; гэты клас складае пераважную бальшыню ўсіх супольнікаў грамадства і ад яго зыходзіць разуменне неабходнасці карэннай рэвалюцыі"[2].

Маркс верыў, як ніколі раней, у вызначальную ролю пралетарыяту. Бачыў будучае грамадства як камуністычнае, дзе *добраахвотная* арганізацыя пераможа *натуральны* падзел працы. Пісаў:

"У камуністычным грамадстве, дзе ніхто не мае пэўнага кола абавязкаў, але можа самаўдасканальвацца ў кожнай галіне, грамадства рэгламентуе агульную вытворчасць і, такім чынам, дае мне магчымасць рабіць сёння адно, заўтра іншае: зранку паляваць, папаўдні лавіць рыбу, увечары займацца жывёлагадоўляй, а перад сном нават крытыкаваць і пры гэтым ніколі не рабіцца паляўнічым, рыбаком, пастухом ці крытыкам, бо выбіраць працу я буду на сваё жаданне"[3].

У гэтым выказванні беспасярэднім чынам праявіўся ўплыў тэорыі Фур'е, аднак Маркс ніколі не далучаўся да

[1] *Op. cit., trad. franç., Paris, Editions Sociales, 1957, p. 4.*
[2] *Op. cit., p. 182—183.*
[3] *Ibid, p. 175.*

асацыянізму. Несумненна, ён разглядаў арганізацыю вытворчасці ў шырэйшых рамках, чым фаланстэр. Ён верыў у распаўсюджанне машыннай працы, падтрымліваў яе. Але Маркс аспрэчваў Фур'е ў яго імкненні разбурыць тагачаснае грамадства. Сцвярджаў: рэвалюцыі неабходныя дзеля ўзрастання прадукцыйнасці працы, гэта дазволіць індывіду па сваёй волі змяняць род заняткаў. Паводле Маркса,

"значнае развіццё прадукцыйных сілаў з'яўляецца цалкам неабходнай практычнай перадумовай яшчэ і таму, што без такога развіцця галеча стане ўсеагульнай і зноў паўстане патрэба ў сама неабходных рэчах і, значыць... вернецца стары бруд..."[1]

У параўнанні з 1844 г. Маркс пачаў усведамляць, што простае знішчэнне прыватнай уласнасці не развяжа сацыяльных праблемаў. Ён прызнаваў, што патрэбна рэгуляванне вытворчасці, але меркаваў, што гэтае рэгуляванне не будзе мець нічога агульнага з прыгнётам індывіда і дазволіць яму дзейнічаць практычна свабодна, згодна з сваім жаданнем, пры ўмове, што развіццё прадукцыйных сілаў створыць дабрабыт.

Гэтую думку Маркс удакладніў ў *"Маніфесце"* 1848 г. "Уся гісторыя да гэтага часу была гісторыяй барацьбы класаў. Буржуазія разбурыла феадальныя дачыненні і адыграла тым самым сваю рэвалюцыйную ролю ў гісторыі". Але цяпер настаў час пралетарыяту, бо машынная вытворчасць, уведзеная буржуазіяй, увайшла ў супярэчнасць з сістэмай яе ўлады. Час ад часу ўзнікаюць крызісы, якія дэманструюць, што рэжым не можа поўнасцю і няспынна выкарыстоўваць наяўныя прадукцыйныя сілы. Адначасна растуць беспрацоўе і паўперызм. У выніку маса людзей нічым не займаецца, але яе трэба ўтрымліваць.

"Буржуазія не можа болей панаваць, бо не ў стане забяспечыць свайму нявольніку нават адпаведнага яго нявольніцтву існавання. У выніку буржуазія вымушаная карміць нявольніка замест таго, каб карміцца ад яго".

Падобная ідэя сустракаецца, у прыватнасці, у *"Філасофіі права"* Гегеля. Яна паслужыла Гегелю для абгрунтаван-

[1] *Ibid, p. 176.*

ня каланіяльнай палітыкі. Важна адзначыць, што ў гэтым плане Маркс не ідзе следам за Гегелем.

Праўда, у *"Маніфесце"* выказвалася думка, што "буйная прамысловасць стварыла сусветны рынак", што "сусветны рынак значна паскорыць развіццё гандлю...", аднак Маркс і Энгельс былі перакананыя ў непазбежнасці пралетарскай рэвалюцыі ў Эўропе. Яны нават не дапускалі такой верагоднасці, што пашырэнне рынкаў збыту за мяжой дазволіць эўрапейскаму капіталізму пераадолець, прынамсі часова, свае супярэчнасці. (А гэта якраз і адбылося.) Маркс і Энгельс кінулі заклік да неадкладнага паўстання ў найбольш развітых краінах Эўропы[1].

"Маніфест", між іншага, быў не проста заклікам да паўстання прыгнечаных працоўных, яго галоўнай задачай было вызначыць ягоныя дакладныя мэты. Якраз тады палітычная дактрына Маркса набыла свой завершаны выгляд.

Згодна з Марксам, каб арганізаваць рэвалюцыю, "трэба найперш разлічваць на групоўкі рабочых, якія самі сябе называюць "камуністамі", бо менавіта яны ўяўляюць сама радыкальную частку рабочых партыяў усіх краінаў". Мэтай, да якой яны павінны сапраўды імкнуцца, ёсць ліквідацыя прыватнай уласнасці на *сродкі вытворчасці*, а не прыватнай уласнасці *наагул*.

"Адметнай рысай камунізму з'яўляецца не адмена прыватнай уласнасці ўвогуле, але адмена буржуазнай уласнасці.

Камунізм ні ў кога не адбірае магчымасці прысваення грамадскага прадукту; ён касуе толькі магчымасць эксплуатаваць чужую працу з дапамогай такога прысваення".

---

[1] *У "Нямецкай ідэалогіі" Маркс прызнаваў, што супярэчнасці капіталізму могуць праяўляцца і ў такой параўнальна адсталай краіне, як Нямеччына: "Канкурэнцыя з краінамі больш высокага роўню развіцця прамысловасці, што назіраецца ў выніку пашырэння міжнароднага гандлю, выклікае ўнутры краінаў з менш развітой прамысловасцю, напрыклад у Нямеччыне, супярэчнасці, падобныя тым, якія існуюць у развітых краінах. Там непрыметны раней пралетарыят заявіў пра сябе ў поўны голас у выніку канкурэнцыі з ангельскай прамысловасцю" (op. cit, p. 221). У другім урыўку той самай працы Маркс выказаў меркаванне, што камунізм не можа быць пабудаваны ў адной краіне (слабаразвітой?), ён павінны ўсталёўвацца адначасна ўсюды; такім чынам, неабходна, каб найбольш развітыя краіны перабудоўваліся рэвалюцыйным шляхам: "Камунізм можа перамагчы адразу і адначасна толькі ў тым выпадку, калі яго будуць дабівацца вялікія народы" (op. cit., p. 177). "У іншым разе ўсялякае пашырэнне гандлёвых дачыненняў безумоўна знішчыла б лакальны камунізм" (Ibid.).*

Каб дасягнуць гэтае мэты, рабочым трэба захапіць палітычную ўладу, а потым істотна змяніць спосаб вытворчасці.

"Пралетарыят выкарыстае сваю палітычную ўладу для таго, каб паступова забраць у буржуазіі ўвесь капітал, каб перадаць усе сродкі вытворчасці пад кантроль дзяржавы, гэта значыць пад кантроль пралетарыяту, які стане панавальным класам, і каб як мага хутчэй павялічыць колькасць прадукцыйных сілаў. Натуральна, гэта можа адбыцца толькі шляхам гвалтоўнага парушэння маёмасных правоў і буржуазных вытворчых дачыненняў, г. зн. шляхам такіх мерапрыемстваў, якія, згодна з законамі буржуазнай эканомікі, непрымальныя, але якія з часам перарастаюць самі сябе і становяцца незаменнымі сродкамі пераваротy вытворчых дачыненняў у цэлым", — пісаў Маркс.

Такім чынам, удакладненая тэорыя Маркса займела больш рэалістычны, чым у ранніх творах, выгляд. Тым не менш ён, зразумела, працягваў верыць у пабудову ідэальнага грамадства. Маркс прызнаваў, праўда, што такое грамадства можа стаць рэчаіснасцю толькі на далейшым этапе. Гэты этап Маркс вызначыў у *"Маніфесце"* як "ліквідацыя палітычнай улады", ці "ўлады, арганізаванай адным класам для прыгнёту іншых". Зноў паўстае былы тэзіс адмірання дзяржавы, але ўжо напоўнены адмысловым зместам. Размова больш не ідзе пра скасаванне ўсялякай улады, а пра ліквідацыю манаполіі аднаго класа на ўладу.

"Калі развіццё сатрэ супярэчнасці між класамі, уся вытворчасць сканцэнтруецца ў руках супольнасці індывідаў, тады ж дзяржаўная ўлада страціць свой палітычны характар. Палітычная ўлада, больш канкрэтна, — гэта ўлада, арганізаваная адным класам для прыгнёту іншых...

Замест былога буржуазнага грамадства з яго класамі і класавымі супярэчнасцямі паўстае супольнасць, дзе свабоднае развіццё кожнага будзе ўмовай свабоднага развіцця ўсіх", — пісаў Маркс.

* * *

За перыяд паміж напісаннем *"Святой сям'і"* і пачаткам працы над *"Нямецкай ідэалогіяй"* погляды Маркса карэнным чынам змяніліся. Пад час публікацыі *"Нямецкай ідэалогіі"* Маркс пазбягаў гаварыць пра адчужэнне чалавека, бо гэта магло стварыць уражанне, што ён вылучае праблему чалавека на роўні свядомасці, а не рэчаіснасці (як, паводле сцверджання Маркса, рабіў Гегель). Маркс імкнуўся ства-

рыць тэорыю гісторыі, на якую, вядома, паўплывала эвалюцыйная тэорыя прыроды (хоць сам аўтар, відавочна, адразу гэтага не ўсведамляў), вылучаная біёлагам Лямаркам у 1800 г.

Лямарк даказаў, што віды жывёлаў і раслінаў змяняюцца пад уздзеяннем асяроддзя. Гегель катэгарычна адхіліў гэтую канцэпцыю, а Фоербах насуперак сцверджанням Фрыдрыха Энгельса стаў яе прыхільнікам[1].

Канцэпцыя Лямарка, з якой Маркс пазнаёміўся праз творы Фоербаха, магла пэўным чынам паўплываць на яго-ныя погляды. Пазней, калі з'явілася новае тлумачэнне эвалюцыі ў працы Чарльза Дарвіна *"Паходжанне відаў"* у 1859 г., Маркс сцвярджаў, што Дарвінава тэорыя эвалюцыі поўнасцю пацвярджае яго ўласную канцэпцыю эвалюцыі чалавека.

У гістарычным матэрыялізме барацьба, што вядзецца чалавечым родам за забеспячэнне сваіх патрэбаў, "барацьба за жыццё", вызначаецца як ключ да спазнання гісторыі. Марксава тэорыя атаясамлівала гістарычную эвалюцыю чалавека з біялагічнай эвалюцыяй. Маркс зыходзіў з таго, што эвалюцыя чалавека прывядзе да якасных зменаў, аналагічных тым, пра якія гавораць эвалюцыяністы: ніжэйшы від шляхам паступовай эвалюцыі спараджае вышэйшы від.

Каб надаць тэорыі цэльны выгляд, Маркс прадстаўляў дзейнасць свядомасці як "эпіфеномены" рэальнай эвалюцыі. Марксісты назавуць іх пазней простымі "адлюстраваннямі". Але гэтаму можна запярэчыць. І сам Маркс падкрэсліваў, што чалавек адрозніваецца ад жывёліны тым, што працуе, каб задаволіць свае патрэбы. А ў працэсе працы прысутнічае свядомасць; мы канстатуем гэта "эмпірычна", абапіраючыся толькі на нутраны, а не на пачуццёвы досвед. Нельга ставіцца да сферы свядомасці як да другаснай або вытворнай, бо яна сустракаецца нават у аснове працэсу, у выніку якога чалавек задавальняе свае патрэбы.

---

[1] *"Трэба разглядаць прыроду як сістэму ступеняў, дзе адна ступень непазбежна вынікае з другой...; аднак не ў сэнсе, што адна натуральным чынам стварае другую...* Метамарфоза *датычыць толькі свядомасці, змяненне якой і ёсць развіццё... Назіральны і разважлівы розум мусіць адкінуць цьмяныя ідэі, па сутнасці, ідэі эмпірычнага паходжання, як і, у прыватнасці, тэорыю, што выводзіць расліны і жывёлы, а потым і вышэйшыя арганізмы з ніжэйшых арганізмаў..." Précis de l'encyclopédie des sciences philosophiques, trad. franç., Paris, 1952, p. 139 (§ 249).*

Калі гэта сапраўды так, трэба пагадзіцца з Гегелем, які разглядаў адчужэнне свядомасці ў створаную рэч як першасную з'яву, што не зводзіцца ні да якай іншай. Гэта асабліва неабходна ўлічваць пры тлумачэнні эвалюцыі чалавека, бо з прычыны адчужэння свядомасці гэтая эвалюцыя істотна адрозніваецца ад простага натуральнага працэсу[1].

§ 3. Крытыка палітычнай эканоміі

А) Распрацоўка "Капіталу"

Рэвалюцыі 1848 г., падрыхтаваныя эканамічным крызісам 1847 г., быццам бы цалкам пацвердзілі тэорыю Маркса.

У канцы 1847 г. у Швайцарыі і Італіі ўспыхнулі народныя паўстанні.

Потым у лютым 1848 г. рэвалюцыя выбухнула ў Парыжы. Палітычная напруга нарастала ў Бэльгіі. Менавіта ў той момант, калі Маркса выслалі адтуль, адзін з ягоных сяброў — міністр часовага французскага ўрада — папрасіў яго прыехаць у Парыж.

Маркс выправіўся ў Францыю і сустрэўся там з нямецкімі эмігрантамі, якія займаліся стварэннем ваеннага легіёна, каб перанесці рэвалюцыю ў Нямеччыну. Маркс адмовіўся падтрымаць гэтыя планы, тым не менш легіён выступіў у паход, але быў знішчаны прускім войскам на берагах Рэйна.

Тым часам выбухнулі паўстанні ў Вене і некаторых нямецкіх гарадах. Утварыўся агульнагерманскі парламент. Маркс і іншыя сябры "Хаўрусу камуністаў" перабраліся ў Нямеччыну. Маркс спыніўся ў Кёльне. У сваіх выступах ён

[1] *Як мы ўжо бачылі, Гегель ніякім чынам не адмаўляў біялагічнага аспекту чалавечага жыцця. Прысвячаючы значную частку ўводзінаў у "Лекцыях па філасофіі гісторыі" дыскусіі аб "Геаграфічнай аснове усеагульнай гісторыі", ён пісаў наконт гэтага: "Абуджаная свядомасць спачатку знаходзіцца толькі ў прыродзе і кожны этап развіцця гэтай свядомасці ствараецца разваганнямі духам пра самога сябе насуперак натуральнай непасрэднасці; свядомасць стварае першы пункт гледжання, адкуль чалавек можа ў самім сабе здабыць свабоду, а гэтае вызваленне павінна стаць лёгкім з дапамогаю сілаў прыроды... Яшчэ Арыстотэль казаў: "Менавіта калі патрэбы задаволеныя, чалавек праяўляецца з боку ўсеагульнага і вышэйшага" (Op. cit., pp. 77—78).*

выказваўся за хаўрус рабочых-камуністаў з усімі дэмакратычнымі элементамі буржуазіі. Маркс прапанаваў тэрмінова стварыць "сацыяльную рэспубліку", дзе сяляне, рабочыя і дробная буржуазія атрымаюць максімальныя ўступкі без ліквідацыі капіталізму.

За кошт уласных сродкаў і тых, што яму ўдалося сабраць, Маркс стварыў *"Новую рэйнскую газету"*, якая неўзабаве стала сама значнай штодзённай газетай Нямеччыны.

Маркс нейкі час спадзяваўся на вайну паміж Прусіяй і Расеяй, апошнюю ён лічыў цытадэллю феадальнай рэакцыі ў Эўропе, што, на яго думку, магло падштурхнуць рэвалюцыйны працэс. Але вайна так і не пачалася, а нямецкая буржуазія трымцела перад каралём Прусіі і іншымі эўрапейскімі манархамі.

Вядома таксама, што Маркс адмовіўся ўзняць бяззбройных, не падтрыманых іншымі пластамі насельніцтва кёльнскіх рабочых на паўстанне супраць манархіі. За рэвалюцыйныя артыкулы і дзейнасць Маркса некалькі разоў прыцягвалі да суда прысяжных. Прысяжныя яго апраўдалі, але раслі фінансавыя цяжкасці, і Маркс вымушаны быў спыніць выданне сваёй газеты, якая на той час ужо паглынула і яго ўласныя сродкі, і маёмасць ягонай жонкі.

Бальшыня камуністаў далучылася да паўстанцаў у герцагстве Бадэн і ў Рэйланд-Пфальцы. Сярод іх, дарэчы, быў і Энгельс.

Маркс меркаваў, што рэвалюцыйны рух асуджаны на няўдачу, і ў траўні 1849 г. выправіўся ў Парыж. Крыху пазней апошнія асяродкі рэвалюцыі былі задушаныя ва ўсёй Цэнтральнай Эўропе і ў Нямеччыне. Энгельс разам за сваім вайсковым аддзелам перайшоў у Швайцарыю.

У жніўні 1849 г. Маркса зноў выслалі з Францыі. Ён перабраўся ў Ангельшчыну і яшчэ не траціў спадзявання, што ў найбліжэйшы час выбухне рэвалюцыя. Маркс быў так заклапочаны яе падрыхтоўкай і так прагнуў яе, што пагадзіўся далучыцца да сакрэтнай групоўкі "Сусветнае таварыства камуністаў-рэвалюцыянераў". Адначасна ён вярнуўся да сваіх даследванняў эканомікі і неўзабаве пераканаўся, што новая спроба ўзняць рэвалюцыю стане магчымай толькі пры ўмо-

ве эканамічнага крызісу, які яшчэ не надышоў. Свае думкі на гэты конт выказаў у працы, апублікаванай ягонымі сябрамі ў Гамбургу. Гэтая праца мела назоў *"Новая Рэйнская газета. Палітычна-эканамічны агляд, пад рэдакцыяй Карла Маркса"*. Ён таксама вельмі жорстка крытыкаваў прафесійных змоўшчыкаў. Яны, паводле Маркса, "алхімікі рэвалюцыі і пакутуюць ад псіхічных парушэнняў і неадчэпных думак, як і алхімікі мінулых часоў".

Маркс імкнуўся да таго, каб рэвалюцыйны рух грунтаваўся на навуковай падставе, а не на авантурах. 15 верасня 1850 г. ён адмежаваўся ад тых камуністаў, якія жадалі працягваць барацьбу канспіратыўнымі метадамі, выступіўшы са зваротам да іх:

"На месца крытычнага погляду меншыня ("Хаўрусу камуністаў") ставіць дагматычны, на месца матэрыялістычнага — ідэалістычны. Замест рэальных умоваў меншыня зрабіла рухальнай сілай рэвалюцыі проста волю. Калі мы гаворым рабочым: "Вам, магчыма, давядзецца перажыць яшчэ 15, 20, 50 гадоў грамадзянскіх і міждзяржаўных войнаў не толькі дзеля таго, каб змяніць гэты лад, але і для таго, каб змяніць самі сябе і зрабіць здольнымі да кіравання", вы сцвярджаеце зваротнае: "Трэба зараз жа захапіць уладу або можна класціся спаць". У той час як мы наўмысна звяртаем увагу нямецкіх рабочых на неразвітасць нямецкага пралетарыяту, вы грубым чынам цешыце нацыянальнае пачуццё і саслоўныя забабоны нямецкіх рамеснікаў, на чым, зразумела, лёгка зарабляць папулярнасць. Гэтак як і дэмакраты, што робяць са слова "народ" святыню, вы робіце святыню са слова "пралетарыят".

Чартысцкі рух у Англельшчыне паступова згасаў. Маркс апынуўся ў сапраўднай ізаляцыі. Разам з жонкай і чатырма дзецьмі ён жыў у вельмі цяжкіх матэрыяльных умовах.

Маркс супрацоўнічаў у розных газетах, але галоўным чынам у *"Нью-Ёрк Трыбюн"*, якою валодалі паслядоўнікі Фур'е. Газета карысталася вялікім попытам сярод шматлікіх нямецкіх эмігрантаў у Амэрыцы. Яна мела найбольшы наклад у свеце, але ганарары ў ёй былі вельмі малыя.

Каб дапамагчы сябру, Энгельс прыехаў у Англельшчыну і зноў заняў месца службоўца на фабрыцы свайго бацькі ў Манчэстэры. Ён адмовіўся ад распрацоўкі ўласных ідэяў, бо лічыў працу Маркса больш значнай. На працягу 20 гадоў ён рэгулярна дасылаў Марксу грошы.

У верасні 1862 г. Маркс спрабаваў атрымаць пасаду ў

чыгуначнай канторы, але яму адмовілі з прычыны дрэннага почырку.

З 1864 г. яго матэрыяльнае становішча палепшылася, бо ён атрымаў спадчыну маці, а потым сябра, але стабілізавалася яно толькі ў 1869 г., калі Энгельс прадаў сваю долю маёмасці на манчэстэрскай прадзільнай фабрыцы і атрымаў магчымасць штогод даваць свайму сябру дастатковую суму грошай.

У такіх умовах Маркс змог працягваць даследванні і рыхтаваць сваю асноўную працу — *"Капітал"*. Але цяжкасці ў рэалізацыі пастаўленай задачы, а таксама, безумоўна, ваганні аўтара затрымалі на доўгі тэрмін выданне твора.

У 1857 г. выбухнуў новы крызіс. Ён не спрычыніўся да рэвалюцыі, але схіліў Маркса да апублікавання часткі сваіх працаў пад назовам *"Да крытыкі палітычнай эканоміі"* (1859). Змест яе ўвайшоў у першы том *"Капіталу"*, апублікаваны ў 1867 г. Два астатнія тамы былі выдадзеныя Энгельсам пасля смерці Маркса: другі том у 1885 г., а трэці, складзены з урыўкавых рукапісаў, у 1894 г.

Б) Сутнасць капіталізму: эксплуатацыя працоўнай сілы капіталам

У сваім творы *"Капітал"* Маркс, абапіраючыся на працы класікаў ангельскай палітэканоміі і перш за ўсё на працы Рыкарда, паспрабаваў паказаць, што тагачасная эканоміка — гістарычны спосаб вытворчасці капіталістычнай сістэмы, якая грунтуецца на эксплуатацыі працоўнай сілы капіталам.

Гістарычны працэс прывёў да такога становішча, калі грамадства падзялілася на два вялікія класы: з аднаго боку — клас, які валодае сродкамі вытворчасці, а з другога — клас, які не валодае нічым, апрача ўласнай працоўнай сілы. Капіталісты набываюць рабочую сілу пралетарыяў і кіруюць працэсам вытворчасці тавараў. Прыбытак, атрыманы ад продажу тавараў, дазваляе ім павялічваць свой капітал і спажыванне. Таму яны імкнуцца развіваць прадукцыйнасць працы і павялічваць колькасць рабочых месцаў у буйной прамысловасці і ў капіталістычнай сельскай гаспадарцы. Ключ да разумення ўсёй сістэмы — закон вартасці, вылучаны класі-

камі ангельскай палітэканоміі. Паводле гэтага закону сутнасць капіталістычнай сістэмы — эксплуатацыя працоўнай сілы.

Навачасная эканоміка грунтуецца на абмене таварамі.

Тавар мае, па-першае, спажывецкую вартасць, карыснасць для таго, хто ім валодае, а па-другое, ён набывае менавую вартасць.

Абедзве вартасці звязаныя паміж сабой, бо рэч можна прадаць толькі тады, калі яна для кагосьці карысная. Тым не менш нельга зводзіць менавую вартасць толькі да карыснасці, бо нельга сцвярджаць, што чым карыснейшая рэч, тым большая яе вартасць. Значыць, трэба пагадзіцца з поглядам Рыкарда. Менавая вартасць адлюстроўвае колькасць працы, затрачанай у працэсе вытворчасці.

Як і Рыкарда, Маркс падкрэсліваў, што толькі рэчы, якія рэгулярна вырабляюцца для продажу на рынку (тавары ў звычайным сэнсе гэтага слова), маюць менавую вартасць. Мастацкі твор не мае сапраўднай менавай вартасці, яго цану вызначаюць з зусім іншых меркаванняў, чым цану якой-небудзь прылады. Зямля таксама не мае менавай вартасці, аднак яна прадаецца. Яе цана якраз і ёсць капіталізацыя (з улікам сярэдняй працэнтнай стаўкі) даходу, які яна прыносіць. Тэорыя зямельнай рэнты тлумачыць узаемасувязь паміж цаной зямлі, даходам з яе і працэнтнай стаўкай. Гектар зямлі, які звычайна здаецца ў арэнду за 100 франкаў, павінны прадавацца за 2000 франкаў, калі сярэдняя працэнтная стаўка складае 5 працэнтаў. Сапраўды, з капіталам 2000 франкаў можна атрымаць даход 100 франкаў. Адсюль вынікае, што за адзін гектар зямлі, які дае 100 франкаў даходу, трэба заплаціць 2000 франкаў. Прычым больш за яго ніхто не заплоціць, бо было б значна выгадней пазычыць свой капітал.

Маркс пацвердзіў думку Рыкарда, што праца, накіраваная на здабыванне і апрацоўку сыравіны і на вытворчасць сродкаў вытворчасці, складае частку вартасці канчатковага прадукту.

Ён дадаў, што праца, якая складае менавую вартасць, ёсць грамадска неабходнай працай у вытворчасці або ся-

рэднезатрачанай працай у пэўным грамадстве. Гэта не ёсць праца, затрачаная на тым ці іншым прадпрыемстве.

З другога боку, відавочна, што праца, выкананая пэўным індывідам у пэўнай галіне, не адпавядае такой жа працы іншага індывіда. Дзве гэтыя працы будуць адрознівацца адна ад другой. І якраз працэс стварэння менавай вартасці зводзіць усе вышэйазначаныя працы да "абстрактнай працы". Аднак гэта не значыць, што ўсе працаўнікі забяспечаць за адзін і той жа час аднолькавую велічыню абстрактнай працы. Грамадства ўлічвае іх кваліфікацыю, а таксама інтэнсіўнасць працы і не аднолькава плоціць розным працаўнікам. Колькасць "простай працы", якая выконваецца кваліфікаванай працоўнай сілай або індывідам, які працуе больш інтэнсіўна, прапарцыйная стасунку, які існуе паміж заробкам за гэтую працу і заробкам за "простую працу" сярэдняй інтэнсіўнасці.

Нарэшце, Маркс удакладняў: праца, прадстаўленая ў менавай вартасці тавараў, з'яўляецца "прадукцыйнай" працай. Як і Сміт, ён выкрэсліваў з ліку вытворцаў чыноўнікаў і слугаў, але насуперак Сміту разглядаў чыста гандлёвую дзейнасць як непрадукцыйную. Немагчыма, сцвярджаў Маркс, каб затрачаны гандляром час на павелічэнне кошту тавару павялічваў і вартасць тавару. І наадварот, Маркс прызнаваў, што працаўнік, заняты на прадпрыемстве, якое ажыццяўляе паслугі (напрыклад, транспартныя), з'яўляецца працаўніком-вытворцам[1].

Такім чынам, узятая Марксам за аснову тэорыя вартасці ангельскіх класікаў палітэканоміі набывае больш дакладны змест. Але, як вядома, Рыкарда не здолеў развязаць пытання непрапарцыйнасці капіталу, укладзенага ў розныя віды вытворчасці, у дачыненні да працы.

"Рынкавыя цэны" залежаць ад попыту і прапановы. "Нармальныя цэны" ўсталёўваюцца тады, калі ровень заробку ўраўнаважваецца роўнем прыбытку.

Рыкарда заўважыў, што нармальныя цэны не адлюстроўваюць дакладна вартасці, бо прыбытак залежыць ад памеру

[1] *Гэтае палажэнне вельмі ясна растлумачанае ў Le Capital au liv. (Editions Sociales, t. IV, p. 52). Тым не менш Марксу часта прыпісваюць супрацьлеглы тэзіс.*

ўкладзенага капіталу. З двух відаў тавараў, на якія затрацілі аднолькавую колькасць працы (*беспасярэдняй* або *спасярэдняй*), даражэй каштуе той, вытворчасць якога вымагае большых укладанняў капіталу.

Развязак гэтага пытання, прапанаваны Марксам, увайшоў у сучасныя слоўнікі па эканамічнай тэорыі і выглядае наступным чынам:

Калі падзяліць нацыянальны вытворчы капітал на вартасць яго вытворчасці, то атрымліваецца сярэдненацыянальная капіталаёмістасць.

Таму можна вылучыць тры катэгорыі вытворчасці:

а) вытворчасць, дзе капіталаёмістасць вышэйшая за сярэдненацыянальную;

б) вытворчасць, дзе капіталаёмістасць роўная сярэдненацыянальнай;

в) вытворчасць, дзе капіталаёмістасць ніжэйшая за сярэдненацыянальную.

Пры атрыманні двух тавараў з рознай капіталаёмістасцю іх нармальныя цэны не суадносяцца прапарцыйна вартасцям працы, затрачанай на іх вытворчасць, але з гледзішча эканамічнай сістэмы ў цэлым разыходжанні паміж цэнамі і вартасцю затрачанай працы ўзаемна кампенсуюцца.

Нармальныя цэны тавараў катэгорыі А вышэйшыя, чым яны былі б, калі б капіталаёмістасць была сярэдняя.

Але нармальныя цэны тавараў катэгорыі В ніжэйшыя, чым тыя, якія маглі б быць, калі б іх капіталаёмістасць была сярэдняя. Апошняе палажэнне *вынікае з папярэдняга*.

Такім чынам, усялякі кошт — выражэнне затрачанай працы і няма ніякай іншай крыніцы вызначэння менавай вартасці. Некаторыя тавары прадаюцца па цэнах, якія *на першы погляд* выражаюць штосьці іншае, чым працу. Але ў рэальнасці гэта магчыма толькі тады, калі іншыя тавары таксама прадаюцца па цэнах, якія не адлюстроўваюць цалкам працы, затрачанай на іх вытворчасць. Менавіта праца, якая не адлюстроўваецца ў цане адных тавараў, знаходзіць сваё выяўленне ў цане іншых тавараў.

Цікавы, але неперакананўчы аналіз. Сапраўды, можна

было б з тым жа поспехам сцвярджаць, што ўся вартасць тавараў вызначаецца капіталам і што непрапарцыйнасць цэнаў затрачанаму капіталу мае прычынаю розніцу ў працаёмістасці (стасунак праца—прадукт) у розных галінах вытворчасці.

У рэальнасці Маркс бачыў у тэорыі працоўнай вартасці яшчэ адзін сродак маральнага асуджэння капіталізму. Гэта асабліва заўважна, калі аўтар *"Капіталу"* спасылаецца на аўтарытэт Арыстотэля.

"Рух капіталу не мае межаў", — пісаў Маркс[1], — бо капіталіст заўсёды прагне павялічыць сваё багацце. Мы маем справу з тым, што яшчэ Арыстотэль называў "хрэматыстычнай" дзейнасцю, супрацьпастаўляючы яе "эканамічнай" дзейнасці. Таму можна сцвярджаць, што дзейнасць капіталіста супярэчыць прыродзе, а значыць, яна непрымальная.

Спасылаючыся на ідэю Арыстотэля, Маркс лічыў, што знайшоў аргумент для падтрымкі свайго асуджэння капіталізму. На самой справе ён хутчэй дэманстраваў няслушнасць свайго падыходу.

Арыстотэль не згаджаўся з тым, што грошы ствараюць грошы шляхам камерцыі ці ліхвярства, бо грошы паводле сваёй прыроды не з'яўляюцца чымсьці прадукцыйным[2], але капіталісты атрымліваюць пасля кожнага абарачэння капіталу больш сродкаў, чым укладалі. Маркс пісаў:

"Укладзеная вартасць не толькі захоўваецца ў абарачэнні [капіталу], але таксама змяняе ў ім свой памер, набывае прыбытковую вартасць і менавіта гэты рух ператварае яе ў капітал"[3].

Паколькі грошы не могуць ствараць грошы, робіць высноў аўтар, капіталіст несправядліва прысвойвае вартасць, створаную працай, у выглядзе дадаткова атрыманых грошай — прыбытку.

---

[1] *Le Capital, t. 1, p. 156, et n. 2 той жа самай старонкі.*

[2] *Найбольш вартая агіды менавіта практыка ліхвярства, бо прыбытак, які яно прыносіць, паходзіць ад саміх грошай. Грашовыя знакі больш не адпавядаюць мэце, дзеля якой ствараліся, бо грошы, як вядома, былі ўведзеныя, каб паспрыяць менаваму гандлю, тады як ліхвярства мае сваёю мэтаю павелічэнне колькасці саміх грошай (Politique, 1, 10).*

[3] *Le Capital, t. 1, p. 155.*

Разглядаючы гэты доказ, трэба спачатку адзначыць, што тэорыя Арыстотэля, паводле якой грамадскія дачыненні павінны заўсёды заставацца адпаведнымі прыродзе рэчаў, прадугледжвала адмаўленне ўсялякай сацыяльнай эвалюцыі, з чым Маркс ніколі б не пагадзіўся, але неабходна таксама адзначыць, што жаданне выкарыстаць Арыстотэлева палажэнне аб няздольнасці грошай ствараць грошы прывяло Маркса да відавочнай памылкі з гледзішча эканамічнага аналізу.

Правільны аналіз функцыянавання капіталістычнай сістэмы ў сапраўднасці сведчыць пра памылковасць сцвярджання, што капіталісты разам атрымліваюць у канцы вытворчага цыкла болей грошай, чым уклалі, з тае простае прычыны, што даходы капіталістычных прадпрыемстваў паходзяць менавіта з расходаў, якія яны ажыццявілі ў выглядзе ці то выплаты заробкаў, ці то куплі матэрыяльных сродкаў вытворчасці.

Адзначым, што ўся першая кніга *"Капіталу"* (адзіная, якую апублікаваў Маркс асабіста) грунтуецца на відавочна памылковым аналізе. Памылка Маркса ў тым, што ён не бачыў наступнага: прадпрыемствы плоцяць не толькі заробкі рабочым, але і працэнты па крэдытах. Апошнія складаюць адну з крыніцаў пакупной здольнасці, пры выкарыстанні якой вызначаецца сапраўдная вартасць выпрацаваных тавараў [1].

У адным з рукапісаў, апублікаваным пад назовам *"Кніга другая" "Капіталу"*, Маркс задаўся пытаннем: як магчыма, каб капіталісты рэалізоўвалі прыбытковую вартасць, гэта значыць ператваралі ў грашовы даход колькасць працы, якая, згодна з яго сістэмай, не выплочваецца найманым працаўнікам, і Маркс мусіў канстатаваць, што гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі капіталісты "ўкладваюць у абарачэнне" суму грошай, адпаведную даходу, які яны павінны атрымаць. Ён пісаў:

"Што да усяго класа капіталістаў, дык тэорыя, паводле якой гэты

[1] *Далей будзе адзначана (гл. с. 679 і далей), што* выплачаныя *прадпрыемствамі працэнты і прыбыткі — гэта крыніца прыбыткаў,* рэалізаваных *тымі сама прадпрыемствамі.*

клас вымушаны ўкладаць у абарачэнне неабходныя грошы для атрымання прыбытковай вартасці... нават зусім не парадаксальная; гэтая з'ява ёсць неабходная ўмова ўсяго механізму"[1].

Відавочна, калі Маркс пісаў гэтыя радкі, то не ўсведамляў, наколькі сам жа супярэчыць таму, што адстойваў у першай кнізе свайго твора: ён практычна зняпраўджвае тэорыю, паводле якой адбываецца стварэнне вартасці толькі за кошт працы, тэорыю, на якой грунтуецца ўсё яго тлумачэнне капіталістычнай эканомікі.

Ёсць і іншыя супярэчнасці, што пацвярджаюць няслушнасць Марксавай тэорыі вартасці. Можна звярнуцца, у прыватнасці, да тэкстаў, якія ён напісаў у 1857 і 1858 гг., тады, калі рыхтаваў да публікацыі свае асноўныя творы — *"Да крытыкі палітычнай эканоміі"* і *"Капітал"*.

Тэксты былі апублікаваныя ў Маскве ў 1939 і ў 1941 гг. пад назовам *"Асноўныя рысы крытыкі палітэканоміі" і "Першапачатковы варыянт да крытыкі палітычнай эканоміі"*. З прычыны пэўных абставінаў яны сталі вядомыя ў Заходняй Эўропе толькі ў пяцідзесятых гадах. У гэтых тэкстах сустракаюцца старонкі, змест якіх цалкам адрозніваецца ад зместу твораў, апублікаваных самім Марксам.

Праз нейкі час аўтар *"Асноўных рысаў"* выказаў відавочны сумнеў наконт слушнасці тэорыі вартасці. Ён пісаў:

"Ці не трэба разумець *вартасць* як еднасць спажывецкай і менавай вартасці? Ці не ўяўляе сама па сабе вартасць нешта агульнае ў дачыненні да спажывецкай і менавай вартасці, як да яе асаблівых формаў?"[2]

Пытанні могуць падацца цьмянымі для таго, хто не ведае дастаткова логікі Гегеля; і наадварот, яны становяцца цалкам зразумелымі, калі параўноўваць іх з асноўнымі ідэямі вялікага філосафа.

Адной з сама распрацаваных Гегелем катэгорый у *"Навуцы логікі"* з'яўляецца наступная: усялякая рэальнасць уяўляе сабой еднасць дзвюх супрацьлегласцяў. Якраз гэтым палажэннем Маркс кіраваўся, калі задаваў пытанне: ці не з'яўляецца "вартасць" "еднасцю спажывецкай і менавай вартасцяў"?

[1] *Le Capital, t. 5, pp. 72 et 73.*

[2] *Grundrisse, Berlin, 1953, p. 178; trad. franç., Paris, 1980, Editions Sociales, 1, p. 207.*

Сапраўды, з гэтае ідэі бярэ пачатак тэорыя вартасці і капіталу, якая атрымлівае развіццё ў шмат якіх месцах тэкстаў 1857 і 1858 гг. Маркс упарта настойваў на ёй, але канчаткова не фармуляваў. Асноўная думка гэтай тэорыі ў тым, што менавая вартасць ніякім чынам не ствараецца працай, што яна проста сацыяльны факт, які праяўляецца ў працэсе капіталістычнай вытворчасці і абарачэння як эфект адмаўлення спажывецкай вартасці і карыснасці тавараў.

Паводле канцэпцыі вартасці капіталізм уяўляецца як нейкі жывы суб'ект. Маркс сцвярджаў:

"Сукупнасць абарачэння палягае ў тым, што адна і тая ж менавая вартасць як суб'ект выступае то ў якасці тавару, то ў якасці грошай; менавая вартасць ёсць менавіта рух, які зводзіцца да выканання гэтага падвойнага прызначэння і захавання ў сабе кожнай з якасцяў як супрацьлегласцяў... Менавая вартасць, якая ўяўляецца як еднасць тавару і грошай, ёсць *Капітал*, а само ўяўленне гэтай еднасці выступае як абарачэнне капіталу"[1].

У гэтых радках Маркс вызначае капіталістычную эканоміку на аснове "сілагізму", у якім, паводле Гегеля, увабрана ўсё рэчаіснае. Усё тое, што жыве, кажа Гегель, ёсць істота, якая спалучае ўсеагульнае і адметнае. Жывёліна належыць да віду; від — яе ўсеагульная рыса. Разам з тым жывёліна — гэта цела, якое мае свае асаблівасці. Тое сама казаў Маркс у дачыненні да капіталу. Капітал — суб'ект, які яднае грошы, гэта значыць вартасць у яе ўсеагульнай форме і тавар, які з'яўляецца асабліваю формаю вартасці.

Пры фармуляванні канчатковага варыянта *"Капіталу"* Маркс практычна адмовіўся ад гэткага бачання капіталізму. Можна пашкадаваць пра гэта, бо такое гледзішча адчыняла новую шматабяцальную перспектыву комплекснага эканамічнага аналізу.

Але чаму Маркс пасля настойлівай спробы пабудаваць тэорыю капіталізму на аснове Гегелевай дыялектыкі ўрэшце палічыў за лепшае застацца верным тэорыі вартасці Рыкарда? Відавочна, ён працягваў верыць у канцэпцыю адчужэння чалавека ў рынкавай эканоміцы, атрыманую ў спадчыну ад Фоербаха, канцэпцыю, якая яўна супрацьстаіць Гегеле-

[1] *Ibid., p. 206.*

вай. Паводле Гегеля, рынак — "грамадзянская супольнасць" — выступае неабходным "пасярэднікам" паміж індывідам і дзяржавай.

Менавіта гэта выразна прасочваецца ў *"Капітале"*, калі Маркс развівае думку пра капіталістычную эканоміку, што грунтуецца на "фетышызме" — наданні таварам рынкавай вартасці, з якой трэба лічыцца пры ўсялякіх умовах. Але тэорыя "таварнага фетышызму" зноў зводзіць Маркса на утапічны шлях. Ён сцвярджае, што для таго, каб фетышызм знік, каб людзі нарэшце сталі здольнымі да рацыянальнага кіравання сваім эканамічным жыццём, дастаткова ліквідацыі прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

"Уявім сабе супольнасць свабодных людзей, якія працуюць паводле папярэдне ўзгодненага плана, выкарыстоўваюць супольныя сродкі вытворчасці і затрачваюць пры гэтым індывідуальныя сілы як адну-адзіную грамадскую сілу... У гэтым выпадку грамадскія дачыненні людзей у працэсе працы і з вынікамі працы застаюцца простымі і зразумелымі як у працэсе вытворчасці, так і ў працэсе размеркавання"[1].

Гэтая цытата выяўляе слабасць сістэмы Маркса. Ён глыбока пераканаы, што з планаваннем эканамічныя дачыненні паміж людзьмі стануць "простымі і яснымі". Сёння, аднак, шмат чаго можна сказаць пра планавую гаспадарку ў краінах Усходняй Эўропы, якая стваралася паводле тэорыі Маркса, акрамя толькі таго, што гэтая гаспадарка нібыта ўсталявала нескладаныя і празрыстыя дачыненні паміж людзьмі. Наадварот, трэба адзначыць, што ў гэтых краінах стасункі паміж эканамічнымі суб'ектамі былі настолькі складаныя і заблытаныя, што канчатковае развязанне эканамічных задач зрабілася немагчымым.

В) Развіццё супярэчнасцяў унутры капіталістычнай эканомікі

Нягледзячы на свой у асноўным утапічны характар, праца Маркса ўяўляе спробу вызначэння законаў функцыянавання капіталістычнай сістэмы і, паводле самога аўтара, яе асноўных "супярэчнасцяў".

Маркс меркаваў, што развіццё гэтых супярэчнасцяў у капіталістычных краінах у пэўны момант дасягне такой сту-

[1] *Ibid, p. 90.*

пені, калі захаванне прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці стане немагчымым.

1. ЗБЯДНЕННЕ РАБОЧАГА КЛАСА І АБВАСТРЭННЕ КЛАСАВАЙ БАРАЦЬБЫ. Калі ў 1867 г. была апублікаваная першая кніга *"Капіталу"*, Маркс яшчэ працягваў свае даследванні капіталістычнай сістэмы. Ён імкнуўся паказаць, што ўнутры гэтай сістэмы існуюць супярэчнасці, якія, на яго думку, могуць быць развязаныя толькі з пераходам да сістэмы, заснаванай на калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Асноўная супярэчнасць, якую ён часта вылучаў у гэтай частцы свайго твора, зводзілася да таго, што працаўнікі — стваральнікі багацця — апынаюцца ў жабрацкім стане. Маркс імкнуўся паказаць, што гэтая супярэчнасць з часам павінна абвастрыцца. Супрацьстаянне паміж багацем трымальнікаў капіталаў і галечай найманых працаўнікоў становіцца ўсё больш і больш напружаным. Гэтае становішча павінна прывесці пралетарыят да рэвалюцыі і заваёвы палітычнай улады, каб стварыць сацыялістычнае грамадства. Такі ў сціслым выглядзе сюжэт раздзела XXV першай кнігі *"Капіталу"*, якая называецца *"Агульны закон капіталістычнага назапашвання"*.

У пытанні вызначэння і падвышэння роўню заробкаў пазіцыя Маркса адрозніваецца ад пазіцыі Рыкарда тым, што ён надаваў вялікую ўвагу дзеянням арганізаваных працаўнікоў пры ўстанаўленні роўню прыбытковай вартасці, або вызначэнні стасунку паміж неаплачанай і аплачанай працай. Ціск найманых працаўнікоў на ўладу прывёў на той час да абмежавання працягласці працоўнага дня ў Англіі[1]. Менавіта такія дзеянні могуць даць значныя вынікі ў тым, што датычыць умоваў працы, а таксама заробкаў.

Але поспехі найманых працаўнікоў у няспыннай барацьбе залежаць ад абставін, якія вызначаюць эвалюцыю попыту і прапановы працоўнай сілы. Відавочна, калі прапанова ўзрастае хутчэй за попыт, складаюцца належныя ўмовы для скарачэння заробку, і наадварот, калі попыт павялічваецца хутчэй за прапанову, то гэта спрыяе росту заробку.

[1] *Cf. Capital, liv. I, chap. X.*

Прапанова працоўнай сілы залежыць ад дэмаграфічнага развіцця. Попыт на працоўную сілу залежыць ад колькасці ўкладзенага капіталу ў эканоміку і тэхніку вытворчасці. Насуперак Мальтусу і Рыкарда Маркс прызнаваў, што калі б было спыненае развіццё тэхнікі вытворчасці, то рост попыту на працоўную сілу быў бы большы, чым рост прапановы, і назіралася б паступовае падвышэнне заробку. Але, як лічыў Маркс, тэхнічны прагрэс неадлучны ад капіталістычнай сістэмы, бо ўладальнікі капіталаў зацікаўленыя ў стварэнні новых спосабаў вытворчасці, якія падвышаюць прыбытковасць іх капіталаўкладанняў. Адсюль — значнае запаволенне росту попыту на працоўную сілу. Урэшце павінен надысці момант, калі тэмпы росту попыту на працоўную сілу становяцца ніжэйшыя за тэмпы росту прапановы[1]. А такое становішча вельмі неспрыяльнае для найманых працаўнікоў.

Тым не менш Маркс адзначаў, што ў дадзенай сітуацыі сярэдні заробак не будзе ўвесь час паніжацца. Ён асабліва падкрэсліваў, што пэўная частка рабочага класа, пазбаўленая магчымасці працаваць, апынецца ў галечы. Сцвярджаў, што беспрацоўе з'яўляецца ўмовай пашырэння капіталістычнай эканомікі, бо, як толькі капіталісты адчуюць, што наспелі ўмовы для росту вытворчасці, яны заўсёды знойдуць "прамысловую рэзервовую армію".

Але па меры нарастання эканамічнага значэння пралетарыяту, задзейнічанага ў буйной прамысловасці, павялічваюцца памеры арміі беспрацоўных і, такім чынам, павялічваецца беднасць рабочага класа.

З другога боку, гаварыў Маркс, увядзенне новых машын робіць працу ў буйной прамысловасці ўсё больш інтэнсіўнай, а значыць, і больш стомнай.

Агульная выснова палягала ў тым, што, "якім бы ні быў ровень

---

[1] *Рэальны попыт на працу рэгулюецца не толькі колькасцю ўжо ўкладзенага зменнага капіталу (гаворка ідзе пра выдаткі на найманне працоўнай сілы), але і яго сярэднім тэмпам росту. Пры гэтым прапанова працы застаецца прымальнай да той пары, пакуль яно адпавядае такім тэмпам росту. Аднак калі зменны капітал скарачаецца да роўню, ніжэйшага за сярэднія тэмпы росту, прапанова працоўнай сілы, якая дагэтуль была дастатковай, становіцца непрымальнай, залішняй (Capital, liv. I, Editions Sociales, t. III, pp. 73–74).*

заробку — высокім ці нізкім, становішча рабочага пагаршаецца па меры назапашвання капіталу... Закон, які падтрымлівае параўнальную перанаселенасць, або рэзервовую армію беспрацоўных, у раўнавазе з памерамі і энергіяй назапашвання, прыкоўвае рабочага да капіталу мацней, чым молат Гефеста прыкаваў Праметэя да скалы. Гэты закон абумоўлівае павелічэнне галечы, якое адпавядае назапашванню капіталу. Такім чынам, назапашванне багацця на адным полюсе цягне за сабой тым жа часам рост галечы, пакуты працы, няволю, невуцтва, агрубленне і маральную дэградацыю на супрацьлеглым полюсе, гэта значыць на баку класа, які і стварае капітал"[1].

Але пры такой палярызацыі грамадства ў хуткім часе ствараецца невыноснае становішча. Маркс вельмі пэўна тлумачыў гэтае палажэнне ў раздзеле XXXII першай кнігі *"Капіталу"*, дзе, у прыватнасці, пісаў:

"Разам з тым як бесперапынна памяншаецца колькасць магнатаў, якія ўзурпуюць і манапалізуюць усе перавагі гэтага перыяду сацыяльнай эвалюцыі, узрастаюць галеча, прыгнёт, нявольніцтва, выраджэнне, эксплуатацыя, але разам з тым расце і абурэнне рабочага класа, які ўвесь час павялічваецца колькасна, які вучыцца, аб'ядноўваецца і арганізуецца самім механізмам капіталістычнай вытворчасці. Манаполія капіталу становіцца ланцугамі ёю ж створанага спосабу вытворчасці. Цэнтралізацыя сродкаў вытворчасці і сацыялізацыя працы дасягаюць такой мяжы, калі яны становяцца несумяшчальнымі з сваёй капіталістычнай абалонкай. Яна разбураецца. Надыходзіць час капіталістычнай прыватнай уласнасці. Экспрапрыятараў экспрапрыююць"[2].

Высновы, зробленыя Марксам, наконт збяднення рабочага класа, можна бясконца абмяркоўваць і аспрэчваць. Аспрэчваюцца яны да сённяшняга часу.

Звычайна гэтаму палажэнню супрацьпастаўляецца той факт, што ў развітых краінах Эўропы і ў Злучаных Штатах на працягу стагоддзя пакупная здольнасць найманых рабочых павялічвалася. Нельга не пагадзіцца і з тым, што іх рэальны заробак узняўся.

Дарэчы, трэба адзначыць, што Маркс ніколі не сцвярджаў, што зніжэнне рэальнага заробку — непазбежная з'ява ў капіталістычнай дзяржаве. Ён, відавочна, лічыў, што, нягледзячы на ўздым рэальнага заробку тых, хто працуе, збяднення беспрацоўных будзе працягвацца.

[1] *Op. cit., p. 88.*
[2] *Ibid., p. 205.*

У *"Рукапісах 1844 года"* Маркс прывёў цытату з працы нямецкага эканаміста В. Шульца *"Развіццё вытворчасці"* (апублікаванай у Цюрыху ў 1843 г.), дзе апошні адзначаў:

"Нават калі б сцверджанне, што сярэдні даход *усіх* класаў грамадства павялічыўся, было настолькі ж слушнае, наколькі яно ў сапраўднасці памылковае, усё ж такі адрозненні і параўнальнае адставанне адных даходаў ад другіх маглі б узрасці і ў выніку гэтага магла б рэзка ўзрасці супярэчнасць паміж багаццем і беднасцю. Менавіта *з прычыны таго*, што выпуск прадукцыі павялічваецца і адначасна растуць і патрэбы, прагнасць і прэтэнзіі, можа расці *параўнальная* беднасць, а *абсалютная* беднасць змяншаецца. Саам, які ўжывае цюленевы тлушч і прагорклую рыбу, не бедны, бо ў яго замкнёным грамадстве ўсе маюць аднолькавыя магчымасці і патрэбы. Але ў *прагрэсіўнай* дзяржаве, дзе за якінебудзь дзесятак гадоў выпуск прадукцыі павялічыўся на адну трэць прапарцыйна колькасці насельніцтва, працоўны, які зарабляе столькі ж, як і 10 гадоў таму, не застаўся на ранейшым роўні дабрабыту, ён збяднеў на адну трэць"[1].

На той час была распаўсюджана тэорыя параўнальнага збяднення. І Маркс яе ведаў. Магчыма, ён схіляўся да таго, каб яе прыняць[2]. Але тады Маркс мусіў бы карэнным чынам перагледзець свае ранейшыя высновы.

Трэба адзначыць, што далейшыя падзеі не пацвердзілі поглядаў Маркса. Ідэя рэвалюцыі не знайшла падтрымкі ў асяроддзі рабочага класа найбольш развітых капіталістычных краінаў таму, што гэты клас неўзабаве сам, па сутнасці, "абуржуазіўся".

Жахлівая галеча сапраўды пагражае сёння чалавецтву. Але яна распаўсюджваецца не там, дзе чакаў гэтага Маркс. Яна характэрная найперш для прамыслова неразвітых рэгіёнаў, дзе дзякуючы прагрэсу ў галіне медыцыны ўдалося скараціць ровень смяротнасці. Гэта паспрыяла значнаму дэмаграфічнаму росту, які ў сваю чаргу спрычыніўся да скарачэння наяўных матэрыяльных рэсурсаў.

2. НЕМАГЧЫМАСЦЬ СТАЛАГА ЗАХАВАННЯ РАЎНАВАГІ ПАМІЖ ДЗВЮМА БУЙНЫМІ ГРУПАМІ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ. Эканамічныя крызісы перавытворчасці. Непасрэдна кіруючыся палажэннямі Ф. Кенэ, Маркс імкнуўся прааналі-

[1] *Manuscrits de 1844, op. cit., p. 14.*

[2] *У тых жа "Рукапісах 1844 года" Маркс пісаў: "Падвышэнне заробку абуджае ў рабочага прагу да ўзбагачэння гэтакую ж, як і ў капіталіста, але ён можа задаволіць яе, толькі прыносячы ў ахвяру свае розум і цела" (Ibid., p. 9).*

заваць, якім чынам даходы, размеркаваныя ў працэсе вытворчага цыкла, выкарыстоўваюцца для набыцця гатовых тавараў.

Згодна з *Эканамічнай табліцай* Кенэ, прадукты заўсёды можна прадаць па нармальных цэнах. Уся ліберальная эканамічная школа трымалася такога гледзішча. Маркс лічыў, што гэта няправільна, бо насамрэч існуюць перыяды крызісу, калі немагчыма нармальна збыць усю прадукцыю.

Чаму так адбываецца? Маркс уважліва даследваў з'яву і выявіў, што Сміт і Рыкарда зрабілі фундаментальную памылку, калі разглядалі нацыянальны прадукт як прадукт, які складаецца толькі з тавараў спажывання. На самой справе нацыянальны прадукт улучае таксама вартасць сродкаў вытворчасці, якія ствараюцца на працягу года. Гэтыя сродкі вытворчасці прызначаюцца або для таго, каб павялічыць агульную колькасць абсталявання, або для замены таго, якое за год выпрацавала свой рэсурс.

У першым выпадку Сміт і Рыкарда істотна памыляліся, калі не ўлічвалі сродкі вытворчасці як частку валавога прадукту. Але пры эканамічным аналізе ў роўнай ступені памылкова не адрозніваць вытворчасць сродкаў вытворчасці, прызначаных для замены абсталявання, ад вытворчасці спажывецкіх тавараў.

Сапраўды, працэс замены выкарыстаных сродкаў вытворчасці не адбываецца аўтаматычна і непазбежна; для гэтага патрабуецца асобнае рашэнне; ён можа зацягнуцца; магчыма нават, што прадпрыемства канчаткова спыніць абнаўленне вытворчага абсталявання на пэўны перыяд часу. Таму трэба выразна адрозніваць у агульным нацыянальным прадукце тое, што прызначаецца для замены выкарыстаных сродкаў вытворчасці, і тое, што застанецца ў наяўнасці пасля неабходнай замены.

Калі правесці такую мяжу, то атрымаецца, з аднаго боку, *чысты* нацыянальны прадукт, які складаецца з вартасці спажывецкіх тавараў і дадатковага абсталявання, а з другога, *валавы* нацыянальны прадукт, што складаецца, апрача таго, і з кошту сродкаў вытворчасці, прызначаных для замены выкарыстанага абсталявання.

Гэтае адрозненне дакладна зафіксавана Марксам:

"Новая *гадавая вартасць*, вартасць, нанова створаная на працягу года ў таварнай форме, меншая, чым *вартасць прадукту*, чым уся вартасць таварнай масы, зробленай за ўвесь год"[1].

"Новая гадавая вартасць" — гэта не што іншае, як "чысты нацыянальны прадукт", а "вартасць прадукту" — "валавы нацыянальны прадукт".

Упершыню сфармуляваўшы асноўны тэзіс, Маркс даў апісанне новай схемы, якая дазволіла яму пацвердзіць асноўны закон, згодна з якім *нармальны збыт спажывецкіх тавараў магчымы толькі тады, калі адначасна ствараецца дастатковая колькасць сродкаў вытворчасці*.

Агульная таварная вартасць, пісаў Маркс, падзяляецца на тры складовыя часткі:

1. Вартасць капіталу, затрачанага на выкарыстанне абсталявання (а ў неабходным выпадку на сыравіну). Маркс азначаў яе як "сталы капітал". Абазначым яго літарай С.

2. Вартасць капіталу, які ідзе на выплату заробку. Маркс азначаў яе як "зменны капітал". Абазначым яго літарай V. Зменны капітал супрацьпастаўляецца сталаму капіталу. Паводле Маркса, менавіта сродкі на ўтрыманне працоўнай сілы (на выплату заробкаў) ляжаць у аснове стварэння прыбытковай вартасці, якая сама рэгулюе ўздым і іншыя змены капіталу, інвеставанага ў вытворчасць.

3. Прыбытковая вартасць. Пазначым яе літарай Р.

Акрамя таго, Маркс размяжоўваў увесь працэс вытворчасці тавару на дзве групы. Першая — галіны вытворчасці або прадпрыемствы, якія ствараюць сродкі вытворчасці[2]. Другая — галіны вытворчасці або прадпрыемствы, якія ствараюць прадметы спажывання.

Складальнікі таварнай вартасці кожнай з вытворчых груп аў адпавядаюць складовым элементам агульнай таварнай вартасці.

---

[1] *Capital, liv. II, chap. XX, § 10, Editions Sociales, V, p. 88.*

[2] *Маркс уключаў сыравіну ў сродкі вытворчасці. Гэта правільна. Аднак у штогадовую таварную вартасць першай групы, для таго каб пазбегнуць падвойнага ўжывання, не трэба ўключаць вартасць сыравіны, здабытай і выкарыстанай для вытворчасці іншых відаў прадукцыі (першай ці другой групы). З гэтага вынікае, што штогадовая таварная вартасць першай групы амаль роўная (калі запасы сыравіны не выкарыстоўваюцца ў вялікай колькасці) вартасці выпрабленага абсталявання.*

У першай групе таварная вартасць вызначаецца формулай $C_1+V_1+P_1$, у другой — $C_2+V_2+P_2$.

Для таго каб вартасць прадукту была поўнасцю рэалізаваная, трэба, каб усе сумы, затрачаныя прадпрыемствамі, былі выкарыстаныя спажыўцамі на набыццё тавараў. У такім разе сукупны попыт на тавары будзе роўны сукупнай прапанове (якая з'яўляецца таварнай вартасцю). Гэта магчыма пры ўмове адсутнасці назапашванняў як з боку прадпрыемстваў, якія ствараюць рэзервовы фонд з мэтаю замены свайго абсталявання, так і з боку капіталістаў, якія адкладваюць частку свайго даходу.

Калі выключыць назапашванне, то неабходна яшчэ, каб для *кожнай* з дзвюх вытворчых групаў попыт на прадукты адпавядаў прапанове.

Попыт на сродкі вытворчасці раўняецца суме рэзервовых фондаў, прызначаных для амартызацыі (C_1+C_2), плюс частка прыбытковай вартасці, якая захоўваецца капіталістамі, што можна выразіць $\alpha(P_1+P_2)$[1].

Адсюль раўнавага паміж попытам і прапановаю тавару ў першай групе вызначаецца раўнаннем

$$C_1+V_1+P_1 = C_1+C_2+\alpha(P_1+P_2).$$

Попыт на спажывецкія тавары роўны суме заробкаў (V_1+V_2) (пры ўмове змяншэння назапашванняў найманых працаўнікоў) плюс спажытая частка прыбытку, якая раўняецца $(1-\alpha)\cdot(P_1+P_2)$.

Адсюль роўнасць паміж попытам і прапановай тавару ў другой групе вызначаецца раўнаннем

$$C_2+V_2+P_2 = V_1+V_2+(1-\alpha)\cdot(P_1+P_2).$$

Адсюль можна зрабіць выснову: калі дапусціць, што сукупная прапанова раўняецца сукупнаму попыту, усталяванне раўнавагі паміж попытам і прапановаю ў адной групе забяспечвае ўсталяванне такой жа раўнавагі ў другой.

Сапраўды, можна сказаць, што

прапанова 1 + прапанова 2 = попыт 1 + попыт 2.

---

[1] *Маркс улічваў, што частка назапашванняў прызначаецца не толькі для набыцця матэрыяльных сродкаў вытворчасці, але і для павелічэння фондаў на выплату заробкаў. Аднак гэтая частка настолькі маленькая, што яе можна адкінуць пры скарочаным аналізе.*

Адсюль калі

прапанова 1 = попыт 1,

дык

прапанова 2 = попыт 2.

Адразу неабходна дадаць (тое, што будзе выкарыстоўвацца далей), што калі

прапанова 1 < попыт 1,

то абавязкова атрымліваецца, што

прапанова 2 > попыт 2

і наадварот.

Паколькі ўсталяванне раўнавагі ў адной групе забяспечвае (згодна з нашымі дапушчэннямі) усталяванне раўнавагі ў другой групе, то дастаткова дзеля вызначэння ўмовы *агульнай* раўнавагі даследваць, як вызначаецца раўнавага ў *адной або ў другой* групе.

Такім чынам, будзем зыходзіць з раўнання, якое вызначае раўнавагу першай групы:

$$C_1+V_1+P_1 = C_1+C_2+\alpha(P_1+P_2).$$

Левая частка раўнання абазначае валавыя інвестыцыі ў эканоміку (сукупная вартасць сродкаў вытворчасці, зробленых за адзін год).

Правая частка раўнання абазначае агульнае ашчаджанне (рэзервовы фонд на амартызацыю ў абедзвюх групах плюс назапашванні капіталістаў).

Такім чынам, дадзеная роўнасць пацвярджае, што агульная колькасць інвестыцый раўняецца агульнай суме ашчаджанняў.

Сам факт гэтай роўнасці сведчыць, што ў другой групе таксама існуе раўнавага, гэта значыць што попыт на спажывецкія тавары раўняецца іх прапанове. Згодна з нашым дапушчэннем, роўнасць агульных інвестыцый і агульных ашчаджанняў, такім чынам, неабходная і дастатковая ўмова раўнавагі на рынку спажывецкіх тавараў.

Але гэтая ўмова можа быць сфармуляваная і ў іншай форме. Сапраўды, неабходна зазначыць, што агульнае ашчаджанне — гэта вызначаная частка сукупнай вартасці тавару, бо C_1, C_2, P_1 і P_2 — велічыні, прапарцыйныя вартасці

спажывецкіх тавараў або вартасці сродкаў вытворчасці. Таму, каб агульная сума інвестыцый раўнялася агульнай суме ашчаджанняў, неабходна, каб гэтыя інвестыцыі складалі пэўную частку сукупнай вартасці тавараў.

Такая выснова была зробленая Марксам. Але, як мы толькі пераканаліся, такім чынам ён заклаў кейнсіянскую ўмову эканамічнай раўнавагі, роўнасці інвестыцый і назапашвання.

Даследванні Кейнса сёння — аснова тэорый, якія імкнуцца знайсці адказ на пытанне аб крызісах перавытворчасці. Яшчэ Маркс спрабаваў знайсці тлумачэнне крызісам, выкарыстоўваючы свае "схемы ўзнаўлення вытворчасці". Але гэтая частка ягонага твора (кніга II *"Капіталу"*) засталася нясканчанай. Тым не менш можна прасачыць, у якім кірунку вёў пошук аўтар.

Калі інвестыцыі меншыя за ашчаджанні, гэта значыць калі

$$C_1+V_1+P_1 < C_1+C_2+\alpha(P_1+P_2),$$

тады абавязкова будзе дэфіцыт попыту на спажывецкія тавары ў дачыненні да прапановы. Такім чынам наступае перавытворчасць тавараў.

Непасрэднай прычынай крызісаў у дадзеным выпадку становіцца недахоп інвестыцый. Маркс сцвярджаў, што крызісы павінны перыядычна аднаўляцца, бо інвестыцыі не могуць быць зафіксаваныя на патрэбным роўні. Інвестыцыі могуць быць ці занадта вялікімі, ці недастатковымі.

Сапраўды, інвестыцыі вызначаюцца жаданнем капіталістаў рэалізоўваць прыбыткі, удасканальваючы абсталяванне. Інвестыцыі робяцца не для таго, каб задаволіць патрэбы спажыўцоў, яны ўкладаюцца з мэтай атрымання прыбыткаў некалькімі асобамі.

Для эпохі, у якую працаваў Маркс, такія высновы былі нехарактэрнымі і цікавымі. Тым не менш аўтар *"Капіталу"* так і не здолеў дайсці да сапраўднага тлумачэння крызісаў. Ягоная схема грунтуецца на сцверджанні, што пры існаванні празмернай вытворчасці ў адной групе эканомікі непазбежна будзе існаваць дэфіцыт вытворчасці ў другой. Як

вынік, адбываецца перамяшчэнне капіталаў у другую групу эканомікі і, такім чынам, эканамічная раўнавага захоўваецца. Становіцца зразумелым, чаму Маркс, бясспрэчна не задаволены сваім даследваннем, не апублікаваў *другую* кнігу *"Капіталу"*.

3. ТЭНДЭНЦЫІ ЗНІЖЭННЯ НОРМЫ ПРЫБЫТКУ

а) *Прынцып вытлумачэння гэтай з'явы*

Пачынаючы з Эдама Сміта, эканамісты заўсёды засяроджвалі ўвагу на адной сапраўды значнай з'яве: тэндэнцыі зніжэння нормы прыбыткаў. Выснова эканамістаў, як мы ўжо бачылі, была наступная: раней ці пазней, але назапашванне капіталу спыніцца і надыдзе перыяд стабільнасці.

Маркс зацікавіўся гэтым феноменам. Ён у сваю чаргу, абапіраючыся на аналіз папярэднікаў, імкнуўся даць больш дакладнае тлумачэнне гэтай з'яве. У выніку прыйшоў да абсалютна іншае высновы. На яго думку, магчымасць стабілізацыі капіталістычнай эканомікі на доўгі час касуецца. Наадварот, паніжэнне роўню прыбытку павінна спараджаць у выніку няпоўнай занятасці прадукцыйных сілаў вельмі няўстойлівае і выбухованебяспечнае становішча, якое прывядзе да разбурэння сістэмы.

Даследванні Маркса па гэтым пытанні змяшчаюцца ў раздзелах XIII, XIV і XV трэцяй кнігі *"Капіталу"*. Фрыдрых Энгельс зазначыў, што думкі, якія сустракаюцца ў гэтых раздзелах, былі ўзятыя з асноўнага рукапісу і выкарыстаныя пры ўкладанні трэцяй кнігі. Большая частка рукапісу напісана Марксам у 1864 і 1865 гг., якраз перад апублікаваннем першай кнігі *"Капіталу"*[1]. Гэта сведчыць, што ўжо ў 1867 г. Маркс здолеў вельмі глыбока прааналізаваць капіталістычныя супярэчнасці. Аднак тыя ідэі, пра якія ідзе гаворка, не былі канчаткова распрацаваныя, бо іх асэнсаванне патрабавала асаблівай увагі.

На пачатку раздзела XIII сустракаецца першае сведчанне "закону паступовага зніжэння нормы прыбытку", якое можна тлумачыць наступным чынам.

Развіццё тэхнікі вытворчасці прыводзіць у выніку да

[1] *Глядзі ўводзіны да другога і трэцяга тамоў "Капіталу", напісаныя Фрыдрыхам Энгельсам.*

павелічэння стасунку паміж сталым і зменным капіталам або да "арганічнай будовы капіталу". Калі прыбытковая вартасць застаецца на тым жа роўні, то норма прыбытку непазбежна будзе зніжацца.

Маркс прыйшоў да такой высновы, абапіраючыся на шэраг прыкладаў з лічбавымі паказнікамі. Да гэтых жа вынікаў можна прыйсці шляхам нескладаных алгебрычных вылічэнняў. Дапусцім (як гэта робіць Маркс з мэтай спрашчэння), што хуткасць абарачэння ўсіх катэгорый капіталаў раўняецца 1, гэта значыць што ў кожнай катэгорыі колькасць капіталу, які штогод затрачваецца, будзе раўняцца колькасці авансаванага капіталу.

Калі P — прыбытковая вартасць; K — агульны капітал эканомікі; C — сталы капітал (авансаваны і затрачаны); V — зменны капітал (авансаваны і затрачаны), то норма прыбытку будзе:

$$\frac{P}{K} \quad \text{ці} \quad \frac{P}{C+V}.$$

Пазначым x як стасунак C/V (арганічная будова капіталу). Адсюль вынікае:

$$C=Vx.$$

Тады норма прыбытку вызначаецца як

$$\frac{P}{Vx+V}, \quad \text{ці} \quad \frac{P}{V\cdot(1+x)}, \quad \text{ці} \quad \frac{P}{V}\cdot\frac{1}{(1+x)}.$$

Паводле вызначэння, P/V не змяняецца. Але x павялічваецца. Такім чынам, выраз $1/(1+x)$ робіцца ўсё меншы, а значыць, і норма прыбытку $(P/V)/(1/(1+x))$ змяншаецца.

Аднак Маркс вельмі добра разумеў, што нязменная прыбытковая вартасць не можа быць захаваная на тым жа роўні, бо, як ён сам зазначыў, пры павелічэнні прадукцыйнасці працы капіталісты будуць імкнуцца панізіць намінальны заробак і, як вынік, выдаткі на заробкі ў канчатковым прадукце. У той жа час ён імкнуўся даказаць, што калі падвышаецца ровень прыбытковай вартасці, то рана ці позна норма прыбытку будзе зніжацца. Дадзеныя на гэты конт

тлумачэнні, што змяшчаюцца ў раздзеле XIII, ніякім чынам не пераконваюць. Наадварот, калі ў іншым раздзеле зноў паўстае гэтая праблема, то выклікае ў Маркса вельмі цікавыя разважанні, якія адлюстраваныя ў трох першых абзацах другога параграфа раздзела XV.

Зыходны пункт гэтых разважанняў — не рост арганічнай будовы капіталу. На першы план выступае памяншэнне колькасці занятых дадзеным капіталам рабочых. Здаецца, абодва дапушчэнні разглядаюцца Марксам як падобныя. Але гэта зусім не так. Тым не менш можна дапусціць, што тэхнічны прагрэс спрыяе рэалізацыі як аднаго, так і другога дапушчэння, прычым новае сведчанне можа разглядацца як працяг папярэдняга.

Дапусцім, коратка тлумачыў Маркс, што колькасць працоўных, якія выкарыстоўваюцца пэўным капіталам, значна скарачаецца. Для таго каб дасягнутая гэтым капіталам норма прыбытку заставалася на тым жа роўні, трэба, каб прыбытковая вартасць, атрыманая з гэтага капіталу, захоўвалася на тым жа роўні, нягледзячы на скарачэнне колькасці занятых рабочых. Такім чынам, трэба, каб прыбытковая вартасць, атрыманая з дапамогай *кожнага* працаўніка, павялічвалася. Аднак у росце прыбытковай вартасці ёсць мяжа, бо колькасць працоўнага часу, які можа забяспечыць рабочы, абмежаваная, і пэўная частка працоўнага часу павінна ісці на падтрыманне працоўнай сілы. Маркс сцвярджаў:

"Два рабочыя, што працуюць па дванаццаць гадзін у дзень, не здольныя забяспечыць такую ж колькасць прыбытковай вартасці, як дваццаць чатыры рабочыя, кожны з якіх працуе толькі па дзве гадзіны, нават калі б ім зусім не даводзілася працаваць на саміх сябе. Выходзіць, ёсць пэўныя межы для кампенсацыі скарачэння колькасці працоўных падвышэннем эксплуатацыі іх працы; таму эксплуатацыя можа, вядома, затрымаць паніжэнне нормы прыбытку, але не скасаваць яго[1]".

Гэтае разважанне, магчыма, было б прымальнае, калі б замест скарачэння колькасці занятых адзінкай дадзенага капіталу працоўных меркаваўся рост інвеставанага капіталу на аднаго працоўнага, занятага ў вытворчасці, што відавочна азначае адно і тое ж.

Калі павялічваецца капітал, інвеставаны на аднаго пра-

[1] *Capital, Editions Sociales, t. VI, p. 260.*

цоўнага, дык пры жаданні захаваць норму прыбытку трэба, каб прыбытковая вартасць, якая забяспечваецца рабочым, прапарцыйна ўзрастала. Аднак гэта не можа працягвацца бясконца, бо прыбытковая вартасць, якую стварае працоўны, аніяк не можа пераўзыходзіць пэўную максімальную вартасць, роўную колькасці максімальнай працы, якую можа забяспечыць працоўны. Прыбытковая вартасць павінна заўсёды заставацца ніжэйшай за колькасць максімальнай працы, бо на вытворчасць тавараў, якія спажываюцца рабочым, трэба выдаткоўваць працу. Калі ж прыбытковая вартасць перастане расці, а сума капіталу на аднаго працоўнага будзе павялічвацца, то ў нейкі момант стасунак прыбытковай вартасці да капіталу, які ёсць нормай прыбытку, абавязкова павінны скарацiцца.

Маркс, відавочна, разумеў, што чым больш набліжаешся да абсалютнай мяжы, гэта значыць чым больш сума прыбытковай вартасці, якой пазбаўляецца працоўны, набліжаецца да максімальнай, тым больш складаным робіцца яе павелічэнне. Практычна норма прыбытку будзе зніжана задоўга да таго, як ровень прыбытковай вартасці дасягне сваёй крайняй мяжы. Вынікам падвышэння гэтага роўню будзе паступовае зніжэнне нормы прыбытку.

Такім чынам, не варта лічыць, што адбудзецца няўхільнае і абавязкова хуткае скарачэнне сярэдняй нормы прыбытку. Ёсць яшчэ і іншыя чыннікі, здольныя запаволіць або нават часова спыніць гэтае зніжэнне.

Маркс лічыў, што развіццё гандлю з замежжам павінна прывесці да запаволення тэмпаў зніжэння нормы прыбытку. Такім чынам, ён пагадзіўся ў гэтым моманце з пазіцыяй Рыкарда. Але доказы, якія ён прыводзіць, цалкам адрозніваюцца ад доказаў класіка ангельскай палітэканомii. Той факт, што набыццё прадуктаў харчавання за мяжой спыняе тэмпы росту зямельнай рэнты, больш не турбуе Маркса. Ён засяроджвае ўвагу на тым, што замежны гандаль і, безумоўна, вытворчасць, зарыентаваная на вонкавы рынак, даюць магчымасці атрымання асабліва высокай нормы прыбытку. Бясспрэчна, Маркс меў рацыю, калі настойваў на гэтым, але відавочна, што яму варта б было ўважлівей

вывучыць ідэю Рыкарда. Сапраўды, імпарт танных прадуктаў харчавання з абедзвюх частак Амэрыкі адыграў значную ролю ў эканамічным развіцці Заходняй Эўропы ў другой палове XIX ст.

Хоць Маркс і прызнаваў, што тэндэнцыя да зніжэння нормы прыбытку можа стрымлівацца, ён усё ж быў перакананы, што гэтая тэндэнцыя ўжо спарадзіла працэсы, якія паставілі пад пытанне існаванне капіталізму. Ён заўважыў, што замежны гандаль, калі мець на ўвазе сапраўдную сутнасць капіталізму, паскорыў назапашванне капіталу, а значыць, і тэхнічны прагрэс, што, урэшце, узмацніла тэндэнцыю да паніжэння нормы прыбытку.

б) *Вынікі дадзенага закону:* у раздзеле XV трэцяй кнігі *"Капіталу"* аўтар імкнецца паказаць, якім чынам зніжэнне нормы прыбытку павінна прыводзіць не да стабілізацыі капіталізму, як гэта лічылі эканамісты, а да невыноснага становішча з прычыны няпоўнай занятасці прадукцыйных сілаў.

Эканамісты меркавалі, што адзіным наступствам зніжэння нормы прыбытку будзе паступовае абмежаванне ашчаджанняў. Маркс жа паказаў, што на практыцы асноўнае наступства такога зніжэння — стварэнне масы ашчаджанняў, якая пры пэўных умовах застаецца незапатрабаванай.

Хоць Маркс у сваіх працах па эканоміцы часта станавіўся на бок класічнай палітычнай эканоміі, якая імкнулася прызнаць, што інвеставанне ашчаджанняў адбываецца аўтаматычна, але гэтым разам ён рашуча адмежаваўся ад такога меркавання. Менавіта гэты момант і выклікаў цікавасць да тэксту, які мы разглядаем.

Маркс прызнаваў, што пры зніжэнні нормы прыбытку надыходзіць момант, калі ашчаджанні застаюцца яшчэ значнымі, але іх нельга ўжо інвеставаць аніякім чынам і тым самым "замяніць былы капітал"[1]. У выніку Маркс уздымае пытанне пра неабходнасць рынкаў збыту для новых капіталаў, якія шукаюць магчымасцяў для інвеставання. Яго ідэя наступная: пры нізкай сярэдняй норме прыбытку немагчыма ўкладваць новыя капіталы, мець здавальняльную рэнта-

[1] *Ibid., p. 265.*

бельнасць; тады гэтыя капіталы вымушаны ўступаць у барацьбу за ўжо занятыя іншымі капіталамі рынкі.

Варта адзначыць, што ў гэтым разе колькасць капіталу можа стаць празмернай. Вынікам гэтага лішку будзе абвастрэнне канкурэнцыі і спекуляцыі і павелічэнне адмоўнага ўплыву крызісаў вытворчасці.

Адрозна ад першых фазаў развіцця сярэдняя прыбытковасць капіталу становіцца настолькі нязначнай, што схільнасць капіталістаў да інвеставання як у адну, так і другую групу вытворчасці паслабляецца. У той жа час вытворчасць не здольная больш пераўзысці пэўны максімальны ровень.

Маркс сцвярджаў:

"Вытворчасць прыпыняецца не дзеля патрэбаў спажыўцоў, а тады, калі гэтага патрабуюць вытворчасць і рэалізацыя прыбытку"[1].

Крыху далей ён дадаваў:

"Калі б капіталаўтварэнне стала выключнай справай нешматлікіх буйных капіталаў..., то ўвогуле пагас бы агонь, які ажыўляе вытворчасць"[2].

Нягледзячы на тое што гэтая думка недастаткова распрацаваная, відавочна, ідэі Маркса пэўным чынам папярэднічалі "ўпадніцкім" ідэям, якія мелі распаўсюджанне ў Злучаных Штатах Амэрыкі з 1929 да 1939 года.

Паводле Маркса, для гэтага становішча характэрна існаванне ўвесь час вялікай колькасці беспрацоўных. Тым часам наступствы, выкліканыя паніжэннем нормы прыбытку, здольныя стварыць сур'ёзную падставу для крушэння капіталізму.

Такім чынам, капіталізм павінны знікнуць з прычыны сваіх супярэчнасцяў, асноўная з якіх у тым, што ў дадзенай сістэме вытворчасць ажыццяўляецца дзеля самой вытворчасці (гэта значыць дзеля прыбытку), а не дзеля задавальнення чалавечых патрэбаў.

"Мяжа капіталістычнай вытворчасці — гэта сам капітал; капітал і самаўзрастанне яго вартасці — зыходны і канчатковы пункт, матыў і мэта вытворчасці. Адсюль вытворчасць дзеля капіталу, а не наадварот: сродкі вытворчасці не ёсць сродкамі працэсу жыцця *супольнасці* вытворцаў...

[1] *Ibid., p. 271.*
[2] *Ibid.*

Сродак — бязмежнае развіццё грамадскіх прадукцыйных сілаў — уваходзіць у няспынны канфлікт з абмежаванай мэтай — павелічэннем вартасці капіталу. Таму калі капіталістычны спосаб вытворчасці — гістарычны сродак для развіцця матэрыяльнай прадукцыйнай сілы і для стварэння адпаведнага гэтай сіле сусветнага рынку, то ён у той жа час — заўсёдная супярэчнасць паміж сваёй гістарычнай функцыяй і ўласцівымі яму грамадскімі дачыненнямі вытворчасці"[1].

На думку Маркса,

"супярэчнасць капіталістычнага спосабу вытворчасці палягае менавіта ў яго тэндэнцыі да абсалютнага развіцця прадукцыйных *сілаў*, якая ўвесь час уваходзіць у канфлікт з тымі спецыфічнымі *ўмовамі* вытворчасці, у якіх толькі і можа рухацца капітал"[2].

Эканамічны аналіз Маркса, такім чынам, завяршаецца высновай, якая пацвярджае тэорыю гісторыі, распрацаваную ім, пачынаючы ад 1845 г. Капіталістычны лад, які грунтуецца на імкненні да ўзбагачэння з дапамогай ашчаджання і ўкладання капіталу, у асноўным з'яўляецца сістэмай, якая рухаецца ў кірунку развіцця вытворчай магутнасці грамадства. Але развіццё прадукцыйных сілаў непазбежна зніжае норму прыбытку. А вытворчыя дачыненні гэтай сістэмы такія, што паніжэнне нормы прыбытку стварае перашкоды ўкладанню капіталаў. Паміж развіццём прадукцыйных сілаў і сутнасцю вытворчых дачыненняў паўстае супярэчнасць. Гэтая супярэчнасць рана ці позна павінна прывесці да новага сацыяльнага ладу.

4. НЯСКОНЧАНАЯ ТЭОРЫЯ. *"Капітал"* — гэта твор, які не быў скончаны. Невядома, якім чынам скончыў бы аўтар свой аналіз капіталістычных супярэчнасцяў. Нягледзячы на тое што аналіз уяўляе сабою значную каштоўнасць, у ім ёсць сур'ёзныя недахопы.

Найперш трэба падкрэсліць: распрацоўка гэтага аналізу, па сутнасці, грунтуецца на думцы, што назапашванне капіталу будзе служыць перашкодай для няспыннага росту масы авансаванага ў вытворчасць капіталу параўнальна з колькасцю затрачанай працы. Сапраўды, у рэальнасці такога росту не адбываецца. Вядома, што абсталяванне, якое выкарыстоўваецца ў прамысловасці, становіцца ўсё скла-

[1] *Ibid., p. 263.*
[2] *Ibid., p. 270.*

данейшым. Але вартасць абсталявання не ўзрастае настолькі, наколькі гэта прадугледжвалася Марксам, бо рост прадукцыйнасці паўздзейнічаў на галіну вытворчасці сродкаў вытворчасці. Значыць, пры спыненні росту масы капіталаў параўнальна з колькасцю працы ўзнікае магчымасць захавання агульнай нормы прыбытку на высокім роўні без памяншэння долі заробкаў працоўных у нацыянальным даходзе. Паколькі тэхнічны прагрэс скарачае выдаткі на неабходныя для жыцця прадукты, то выдзяленне працоўным пэўнай часткі нацыянальнага даходу дазваляе ім значна падвышаць свой ровень жыцця. Менавіта з гэтае прычыны абвастрэнне супярэчнасцяў паміж працаўнікамі і капіталістамі гістарычна не спраўдзілася.

Трэба таксама адзначыць, што Марксаў аналіз уздыму капіталістычнай эканомікі мае значны недахоп у тым, што праблема заваёвы новых рынкаў збыту не набыла такога істотнага ўплыву, каб была неабходнасць да яе звяртацца.

Маркс вельмі моцна крытыкаваў "закон рынкаў збыту" Жана Батыста Сэя. Апошні, жадаючы даказаць, што "тавары абменьваюцца на тавары", цалкам ухіляўся ад вызначэння фундаментальнай ролі, якую адыгрываюць грошы пры абмене. Але гэтая крытыка ніколі не аспрэчвала неабходнасці, з якой сутыкнулася капіталістычная эканоміка, — неабходнасці адкрыцця новых рынкаў збыту дзеля развіцця капіталаўкладанняў і самой вытворчасці.

Зразумела, Маркс не мог не ведаць, што пашырэнне рынкаў — неадлучная рыса капіталістычнай эканомікі.

Ужо ў *Маніфесце* 1848 г. ён пісаў: "Буржуазія, якую ўвесь час падштурхоўваюць патрэбы новых рынкаў збыту, заваявала свет".

З другога боку, у артыкуле, напісаным у 1853 г. для *New York Daily Tribune,* Маркс адзначаў:

"Мы часта засяроджваем увагу нашых чытачоў на беспрэцэдэнтным росце ангельскай прамысловасці пачынаючы з 1850 г. Але нескладана ў гэтым дзіўным росквіце заўважыць відавочныя прыкметы будучага прамысловага крызісу. Нягледзячы на тое што адбываецца ў Каліфорніі і Аўстраліі, нягледзячы на велізарную і беспрэцэдэнтную эміграцыю, павінны надысці момант, нават без асаблівай падставы, калі пашырэнне рынкаў не зможа больш адпавядаць тэмпам павелічэння ангельскай

прамысловасці; і гэтая дыспрапорцыя абавязкова зноў спрычыніцца да такога ж крызісу, які адбываўся ў мінулым"[1].

Урэшце, Маркс не раз звяртаўся да гэтага пытання ў *"Капітале"*, дзе адзначаў, што глыбокае пранікненне на сусветны рынак — адна з прычын крызісаў.

Шырокае і нераўнамернае распаўсюджванне фабрычнай сістэмы, пісаў ён, да якой дапасуецца залежнасць ад сусветнага рынку, спрыяе хуткім тэмпам росту вытворчасці, што прыводзіць да насычэння рынкаў, скарачэнні якіх спрычыняюцца да паралічу эканомікі[2].

Рынак павінны ўвесь час павялічвацца такім чынам, сцвярджаў Маркс, каб яго нутраныя сувязі і ўмовы, якімі ён рэгулюецца, усё больш і больш адпавядалі закону незалежнай сутнасці вытворцаў і не падпадалі пад кантроль[3].

Якую ж *дакладную* ролю, ставіць пытанне Маркс, адыгрывае заваёва замежных рынкаў ва ўжо развітым капіталізме? Гэтая роля, на думку Маркса, палягае ў тым, каб *зняць напругу*, што дазваляе, пазбягаючы ціску таварнай перанасычанасці, захоўваць устойлівасць сістэмы.

Нутраная супярэчнасць, дадаваў Маркс, шукае выйсця ў павелічэнні вытворчасці для замежнага рынку. Такім чынам, *пры перавытворчасці* капіталізм імкнецца пазбаўляцца лішкаў тавараў[4].

Паводле Маркса,

буйная вытворчасць робіць у краіне знаходжання лішняй і не патрэбнай частку прадукцыйнага класа, а значыць, вымушае яе да эміграцыі і ў выніку да каланізацыі іншых тэрыторый, якія ператвараюцца ў сховішчы сыравіны, прызначанай для метраполіі[5].

Маркс яшчэ раз нагадаў пра неабходнасць пазбаўляцца ад лішкаў працоўнай сілы і схіляўся да думкі, што лішкі капіталаў, якія вядуць да паніжэння сярэдняй нормы прыбытку, неабходна пераводзіць за мяжу.

---

[1] *Цытата прыводзіцца Hélène Carrère d'Encausse і Stuart Schram, у іх працы Le Marxisme et l'Asie, Paris, 1965, p. 148.*

[2] *Capital, Edit. Sociales, t. II, p. 133.*

[3] *Ibid., t. VI, p. 258. Глядзі іншыя цытаты пра вонкавыя рынкі ў тым жа томе, pp. 263 і 269.*

[4] *Па гэтым пытанні Маркс дакладна вызначаецца ў крытыцы на адрас Рыкарда (які адмаўляў перавытворчасць) у l'Histoire des théories de la plus-value, што перакладзена на французскую мову пад назовам Histoire des doctrines économiques, t. 5, pp. 83 et s.*

[5] *Cf. Capital, Edit. Soc., t. 2, p. 131.*

Калі капіталы экспартуюцца, пісаў ён, гэта не што іншае, як поўная немагчымасць прымусіць іх працаваць у сваёй краіне. Рэч у тым, што капіталы за мяжой будуць даваць больш высокі прыбытак[1].

Якраз у гэтым і палягала роля *зняцця напругі*, якую Маркс надаваў вонкавай эканамічнай экспансіі. Такое сцвярджанне знаходзіць развіццё і ў іншых урыўках, дзе аўтар *"Капіталу"* гаварыў пра адрознасць ролі вонкавых рынкаў у сучаснай яму капіталістычнай эканоміцы ад ролі іх пад час узнікнення капіталізму.

Пашырэнне замежнага гандлю, якое з самага пачатку было асновай капіталістычнага ладу вытворчасці, прывяло (па меры развіцця капіталістычнай вытворчасці і дзеля ўласцівай для гэтага спосабу вытворчасці неабходнасці) да яшчэ большага пашырэння рынкаў збыту[2].

Гэты ўрывак вельмі выразна пацвердзіў, што пазіцыя Маркса супадае з поглядам Сміта і Сісмандзі: вонкавыя рынкі дазваляюць зліквідаваць перавытворчасць. Такое стаўленне да замежных рынкаў, безумоўна, больш слушнае, чым пазіцыя Рыкарда, які адмаўляў перавытворчасць, а значыць, і неабходнасць развіцця такіх рынкаў. Тым не менш трэба прызнаць, што Маркс у пэўнай ступені быў вязнем мадэлі Рыкарда, у якой праз аналіз назапашвання капіталаў сцвярджалася, што сума ашчаджанняў і інвестыцый залежыць выключна ад сярэдняй нормы прыбытку[3].

Асноўная памылка тэарэтычнай сістэмы Рыкарда ў тым, што ён выкарыстаў "закон рынкаў збыту" Жана Батыста Сэя. Калі дапусціць, што пры ўсіх акалічнасцях ашчаджанне можа і мусіць выступаць у ролі інвестыцый незалежна ад папярэдняга пашырэння рынкаў збыту, адкрытых для капі-

---

[1] *Ibid., t. 6, p. 268.*

[2] *Ibid., p. 250. Гл. тамсама p. 258 і t. 3, p. 196.*

[3] *Шчыра кажучы, у Маркса ёсць урывак, дзе, як здаецца, ён вельмі блізка падыходзіць да таго, каб прызнаць за вонкавымі рынкамі ролю рухавіка ў эканамічным развіцці: "...калі ствараюцца выключна спрыяльныя ўмовы, адчыняюцца новыя рынкі збыту, новыя нутраныя сферы дастасавання і г. д., то пагоня за прыбыткам прыводзіць да рэзкага перамяшчэння найбуйнейшых частак прыбытковага прадукту ў фонд узнаўлення з мэтай яшчэ большага іх пашырэння". (Capital, liv. 1, chap. XXV, § 1, Editions Sociales, t. 3, p. 55). Аднак, як вядома, гэтая ідэя не знайшла свайго развіцця ў працы Маркса. Больш за тое, трэба адзначыць, што аўтар разглядае тут уплыў "выключных умоваў" на* памер ашчаджання, *падзяляючы тым самым думку Рыкарда, які атаясамліваў ашчаджанне і інвестыцыі.*

талістычнай вытворчасці, то ў значнай ступені застаецца неразвязанаю праблема эканамічнага росту капіталістычнага ладу.

Сапраўдны адказ на пытанне аб "законе рынкаў збыту" знаходзім у *"Прынцыпах палітычнай эканоміі"* Мальтуса. Але гэтыя ідэі не прыцягвалі ў дастатковай ступені ўвагі Маркса. Відавочна, што аўтар *"Капіталу"* цалкам адхіляе палажэнні Сэя і Рыкарда, якія выключаюць магчымасці з'яўлення агульных крызісаў перавытворчасці. Але Маркс ніколі не закранаў праблемы "нагодаў дзеля інвеставання". Без гэтага ён, зразумела, не змог падкрэсліць значную ролю замежных рынкаў, найперш каланіяльных, у развіцці капіталістычнай эканомікі[1].

Калі прызнаць, што развіццё капіталістычнай эканомікі эўрапейскіх краінаў галоўным чынам *залежала* ад павелічэння рынкаў за мяжой, а менавіта каланіяльных, то неабходна адзначыць, што Маркс абышоў увагаю вельмі значную праблему.

Пазіцыя Маркса па пытанні вонкавых рынкаў, зафіксаваная ў шэрагу палажэнняў, якія ён, прынамсі, абараняў, значным чынам уплывала на яго аналіз тагачасных падзеяў. Аўтар *"Капіталу"* заставаўся перакананым, што эканамічныя супярэчнасці пры капіталізме павінны быць сама напружанымі ў *найбольш развітых* капіталістычных краінах. Ён лічыў, што заробкі не могуць быць істотна ўзнятыя, што перавытворчасць усё больш і больш становіцца пагражальнай, нягледзячы на заваёву замежных рынкаў збыту. Таму ў 1870 г. ён пісаў наступнае:

Ангельшчына — метраполія капіталу, дзяржава, якая дагэтуль застаецца панавальнай на сусветным рынку, — з'яўляецца ў сучасны момант сама прыдатнай для рэвалюцыі рабочых і *адзінай* краінай, дзе матэрыяльныя ўмовы рэвалюцыі дасягнулі пэўнай ступені спеласці. Міжнарод-

[1] *Роля вонкавых рынкаў з гледзішча эканамічнага развіцця была падкрэсленая Ўэйкфілдам (England and America, 1833; Art of Colonization, 1859), а яго пазіцыя, што палягала ў патрабаванні актыўнага ўмяшання дзяржавы ў пошук гэтых рынкаў, адстойвалася Торэнзам, Сэньёрам, Мэрывэйлам, Ўэйтлі і Дж. Ст'юартам Мілам (глядзі па гэтай праблеме D. N. Winch, Classical Economies and the case for colonization, Economica, november 1963, pp. 387–400, а таксама B. Semmel, The philosophic radicals and colonialism, Journal of Economic History, 1961, p. 513–525).*

нае Таварыства рабочых таксама перадусім ставіць за мэту паскарэнне сацыяльнай рэвалюцыі ў Ангельшчыне[1].

Нягледзячы на агаворку, якую зрабіў Маркс, калі пісаў "у сучасны момант", тут можна гаварыць толькі пра памылку ў прагназаванні. Але ёсць усе падставы лічыць, што больш глыбокі і складаны аналіз ролі рынкаў збыту дазволіў бы Марксу змяніць сваё меркаванне.

Сапраўды, калі прызнаць, што неабходнасць пошуку новых рынкаў збыту ёсць перадумова назапашвання капіталу, можна лічыць, што гэтая неабходнасць стварае ў капіталістычным грамадстве больш *глыбокую* супярэчнасць, чым тэндэнцыя да максімальнай эксплуатацыі працоўнай сілы; і можна дапусціць, што пры некаторых абставінах заваёва новых замежных рынкаў збыту можа спрычыніцца да значнага ўздыму роўню жыцця працоўных у найбольш развітых краінах. Адсюль застаецца прызнаць, што пагрозу самому капіталізму трэба чакаць не ад найбольш развітых краінаў у выніку паўперызацыі працоўных, а ад адсталых краінаў з прычыны галечы, якая распаўсюджваецца ў іх, адначасовага змянення спосабу вытворчасці і дэмаграфічнага выбуху, звязанага з паляпшэннем санітарных умоваў.

З пазіцыі сённяшняга дня няма ніякіх падставаў згаджацца з гэтым, бо факты сведчаць пра адваротнае. Тым не менш карысна прааналізаваць, чаму не спраўдзіліся прадбачанні Маркса, і на гэтым скончыць ягоны аналіз супярэчнасцяў капіталізму.

Гэта не значыць, што пэўныя, прааналізаваныя Марксам супярэчнасці і з'явы, што з іх вынікаюць, не адыгралі сваёй ролі ў развіцці чалавецтва. Крызісы перавытворчасці (асабліва буйны крызіс 1929 г.), зніжэнне сярэдняй нормы прыбытку адмоўна ўплывалі на развітыя краіны і спараджалі ўсялякага роду ўзрушэнні. Аднак рэальны ход гісторыі вельмі адрозніваецца ад таго, што прадугледжваў Маркс.

[1] *З ліста Зігфрыду Мэеру і Аўгусту Фогту, 9 красавіка 1870; цытуецца паводле Marx et Engels. Textes sur le colonialisme, Moscou, p. 355.*

§ 4. Апошнія ўдакладненні сутнасці рэвалюцыйнага працэсу і будучага грамадства

Нельга асэнсаваць магутнага ўплыву твораў Маркса на развіццё сацыялістычнай ідэі, калі не ведаць пра дачыненні Маркса напрыканцы яго жыцця да арганізацыі рабочага руху ў Заходняй Эўропе. Маркс стаў адным з заснавальнікаў створанага ў 1864 г. "Міжнароднага таварыства рабочых", вядомага ў гісторыі як I Інтэрнацыянал. Ён рэгулярна браў удзел у паседжаннях Таварыства ў Лондане, а таксама ў перыядычных кангрэсах у розных месцах Эўропы. Аўтар *"Капіталу"* вёў упартую барацьбу з поглядамі Прудона і анархіста Бакуніна, адстойваючы свае ідэі. Ён здолеў пераканаць паплечнікаў, што змена грамадства абавязкова патрабуе заваёвы дзяржаўнай улады пры дапамозе рабочых масаў, якія паўстануць супраць грамадскага ладу.

Пасля таго як Францыя пацярпела паразу ў 1870 г., Маркс напачатку раіў французскім рабочым падтрымліваць часовы ўрад. Але на наступны ж дзень пасля падзення Парыжскай Камуны ён у артыкуле *"Грамадзянская вайна ў Францыі"* (травень, 1871) вітаў яе як вялікі рэвалюцыйны эксперымент.

Маніфест 1848 г. заклікаў пралетарыят да выкарыстання "палітычнай перавагі, каб паступова крок за крокам вырваць у буржуазіі ўвесь капітал і засяродзіць усе сродкі вытворчасці ў руках дзяржавы". Такім чынам, у гэты перыяд Маркс і Энгельс лічылі, што дзяржава павінна адыгрываць значную ролю ў працэсе трансфармацыі грамадства. Відавочна, што ў аўтараў *Маніфеста* тая ж тэарэтычная супярэчнасць, як і ў Фіхтэ: з аднаго боку, жаданне знішчыць дзяржаву, а з другога — надаць ёй значную ролю. Калі ў 1871 г. святкавалася перамога Парыжскай Камуны, здавалася, што Маркс сапраўды клапаціўся пра тое, каб пазбегнуць гэтай супярэчнасці.

Парыжская Камуна, пісаў ён, даказала, што "рабочы клас не можа проста, завалодаўшы падрыхтаванай дзяржаўнай машынай, пусціць яе ў дзеянне для сваіх уласных мэ-

таў"[1]. Таму, паводле гэтага досведу, палітычныя інстытуцыі павінны быць істотна зменены ў сэнсе адмаўлення дзяржавы як "палітычнай улады", ці ўлады прымусу.

Паводле Маркса, дзяржаўнае пераўтварэнне, якое пачала праводзіць Парыжская Камуна, палягала перш за ўсё ў ліквідаванні чыноўніцтва як асобаў, што валодаюць пэўнымі адміністрацыйнымі навыкамі і выконваюць пэўныя абавязкі. Вайскоўцы павінны былі знішчацца таму, што планавалася замяніць рэгулярныя войскі на "ўзброены народ". Паліцэйскія, суддзі і ўсе тыя, хто "служыў народу", мусілі зрабіцца "службоўцамі Камуны", якія, на яго думку, павінны непасрэдна абірацца ўсімі грамадзянамі і ў кожным выпадку заставацца "адказнымі і зменнымі". Апрача таго, іх заробкі не маглі перавышаць заробкаў рабочых. Знішчэнне чынавенства здавалася Марксу сапраўды магчымым з прычыны хутка нарастальнага працэсу дэцэнтралізацыі грамадскай сістэмы. Ён пісаў: "Былы цэнтралізаваны ўрад (гэта таксама датычыць і правінцый) павінны саступіць месца самакіраванню вытворцаў... Сельскія грамады ў кожным рэгіёне мусяць кіраваць сваімі агульнымі справамі праз сваіх прадстаўнікоў у горадзе, а рэгіянальныя сходы ў сваю чаргу павінны пасылаць сваіх дэпутатаў у Нацыянальны сход у Парыжы. Кожны дэпутат, звязаны наказам сваіх выбаршчыкаў, можа быць заменены ва ўсялякі момант"[2].

Аўтар *"Капіталу"* зрабіў тут велізарныя ўступкі сваім працаўнікам: пруданістам і анархістам. Нават калі дапусціць, што тыя інстытуцыі, што разглядаюцца Марксам, пачалі сваю дзейнасць, то невядома, якім бы чынам яны стасаваліся з арганізацыяй, што павінна планаваць вытворчасць і замяніць, паводле яго меркаванняў, капіталістычны рынак. На гэтае пытанне Маркс не дае адказу. Прудон, які на працягу доўгага часу бачыў выйсце толькі ў захаванні рамесніцкай вытворчасці, прапанаваў больш верагоднае: разбурэнне дзяржавы. Маркса захапленне камунамі не спрыяла веры ў эфектыўнасць цэнтралізаванай планавай эканомікі.

[1] *Op. cit., Editions Sociales, 1946, p. 49.*
[2] *Ibid., p. 53.*

У сваіх апошніх працах Маркс-вучоны часта саступае месца Марксу-палітыку, што павінен быў даваць палітычныя дырэктывы, якіх ад яго чакалі. Ён, відаць, не меў магчымасці іх дасканала разгледзець і абмеркаваць. Менавіта такое адчуванне ўзнікае, калі чытаеш яшчэ адзін вядомы ягоны твор — *"Крытыка Гоцкай праграмы"*, напісаны ў 1875 г. і апублікаваны ў 1891 г.

У гэтай працы змяшчаецца аналіз праграмы, якую ў 1875 г. прыняла новая рабочая нямецкая партыя, што знаходзілася пад уплывам Фердынанда Лясаля. Маркс жорстка яе раскрытыкаваў і паспрабаваў даць сваё ўласнае бачанне сацыяльнай арганізацыі, якая прыйдзе на змену капіталістычнаму ладу.

Ён не лічыў, што можна адразу стварыць дасканалае грамадства. Таму гаварыў пра неабходнасць пераходнай стадыі, якую ён называў "першай фазай камуністычнага грамадства" і якую сённяшнія марксісты ў бальшыні выпадкаў вызначаюць як "сацыялістычнае грамадства".

На гэтай стадыі гістарычнага працэсу захоўваецца дзяржава, абавязковая праца, а спажывецкія прадукты размяркоўваюцца паміж індывідамі прапарцыйна ўкладзенай працы. Размеркаванне адбываецца наступным чынам: працоўным выдаюць квіткі, дзе адзначаецца аб'ём зробленай працы. Падлічваюць вартасць працы, затрачанай на выраб прадметаў спажывання. І дазваляюць працоўным набываць у грамадскіх крамах такую колькасць тавараў, якая адпавядае колькасці ўкладзенай працы. Паводле Маркса, такая сістэма вядзе да радыкальнай змены функцыянавання эканомікі, сутнасць якой, пра што гаварылася яшчэ ў *"Капітале"*, характарызуецца фармулёўкай — "знішчэнне паняцця вартасці".

"У грамадстве, заснаваным на асновах калектывізму, — пісаў ён пра першую стадыю камунізму, — на агульным валоданні сродкамі вытворчасці, вытворцы не абменьваюцца сваімі вырабамі; акрамя таго, у такім грамадстве праца, укладзеная ў вытворчасць прадуктаў, з'яўляецца не больш чым *вартасцю* гэтых прадуктаў, сапраўднай іх якасцю, бо з пэўнага часу насуперак таму, што адбываецца ў капіталіс-

тычным грамадстве, гэта ўжо не абыходны, а просты шлях да таго, каб праца індывіда стала непадзельнай часткай працы супольнасці"[1].

Адсюль відавочна, што насуперак распаўсюджанаму меркаванню Маркс да канца сваіх дзён заставаўся ў асноўным прыхільнікам канцэпцыі адчужэння чалавека, распрацаванай ім у 1844 г. Аднак цяпер ён далучыў да сваёй сістэмы тэорыю працоўнай вартасці, якая разглядалася толькі дзеля прызнання за працай, нават пры капіталістычным ладзе, сацыяльнага характару (праца, укладзеная ў тавары, — абстрактная праца, а значыць, сацыяльная). Якім жа чынам праца адчужанага чалавека можа быць сацыяльнай? Каб развязаць гэтую праблему, якая яго вельмі хвалявала, Маркс увёў адрозненне паміж *непасрэдна* сацыяльнай працай першабытнага грамадства і працай, што стала сацыяльнай у выніку абмену (якую можна назваць апасродкавана сацыяльнай працай). Аднак гэтае адрозненне яшчэ больш адхіляе ад пастаўленай праблемы. Безумоўна, паміж палажэннем пра адчужэнне і тэорыяй працоўнай вартасці ёсць неадольная супярэчнасць. Маркс ніколі не хацеў прызнаць гэтага, бо яму патрэбная была ідэя адчужэння, каб сфармуляваць сваё палажэнне аб знішчэнні паняцця вартасці ў будучым грамадстве. Той факт, што такога знішчэння не адбылося ў краінах, якія спрабавалі пабудаваць сацыялізм у XX ст., безумоўна, сведчыць пра адзін з самых сур'ёзных недахопаў сістэмы Маркса.

Сістэма пераразмеркавання ў залежнасці ад укладзенай працы здавалася аўтару *"Капіталу"* на момант крытыкі праграмы нямецкай рабочай партыі абсалютна недастатковай. У першую чаргу, сцвярджаў Маркс, гэта тая сістэма, якая "моўчкі прызнае няроўнасць здольнасцяў індывідаў". Па-другое, яна не ўлічвае асаблівасцяў індывідаў, а разглядае іх толькі як працаўнікоў. Такім чынам, неабходна пераадолець гэтую стадыю, каб увайсці ў "другую фазу камуністычнага грамадства", якая характарызуецца тым, што кожны будзе атрымліваць "па патрэбах".

[1] *Critique des programmes de Gotha et d'Erfurt, Editions Sociales, 1950, p. 23.*

Вядома, гэтая фармулёўка на той час, калі яе даваў Маркс, не была новай. Больш арыгінальным было палажэнне, дзе адзначалася: "Паміж капіталістычным і камуністычным грамадствам існуе рэвалюцыйны паводле характару пераходны перыяд, які адпавядае перыяду палітычных пераўтварэнняў, калі дзяржава будзе не чым іншым, як *рэвалюцыйнай дыктатурай пралетарыяту*"[1].

Гэтае палажэнне, якое нагадвае палажэнне Фіхтэ аб "часовым адмаўленні ад свабоды", цалкам не стасуецца з ідэяй неабходнасці захавання правоў індывіда пры ўсялякіх умовах.

Бібліяграфія

Вывучэнню творчасці Маркса надавалася такая ж вялікая ўвага, як і творчасці Гегеля. Складанасць яе разгляду вымагала вялікіх высілкаў.

Ёсць вялікая колькасць працаў, які аналізуюць творчасць Маркса. Ацэнкі, якія яны даюць, вельмі супярэчлівыя. Мы пададзім толькі тры творы, што з'явіліся на французскай мове:

M. Rubel, *Karl Marx, essai de biographie intellectuelle*, Paris, 1958.

R. Tucker, *Philosophie et mythe chez Karl Marx*, пераклад з ангельскай, Paris, 1963.

F. Mehring, *Karl Marx*, пераклад з нямецкай, Paris, 1983.

Шырокавядомы аналіз працаў маладога Маркса ёсць у:

J. A. Giannotti, *Origines de la dialectique du travail*, Paris, 1971.

Калі трэба пазнаёміцца з асобай Маркса ў агульных рысах, можна звярнуцца, напрыклад, да:

I. Berlin, *Karl Marx, sa vie, son oeuvre*, пераклад з ангельскай, Paris, 1962.

H. Lefebvre, *Marx, sa vie, son oeuvre*, Paris, 1964.

J. Delperrie de Bayac, *La vie de Karl Marx*, Paris, 1979.

Для азнаямлення з асноўнымі палажэннямі тэарэтычнага аналізу капіталізму, дадзенымі ў *"Капітале"*, можна звяртацца да наступных твораў:

R. L. Meek, *Studies in the labour theory of value*, London, 1956.

M. Morishima, *Marx's Economics*, Cambridge, 1973.

P. M. Sweezy, *The Theory of capitalist Development*, New York, 1942.

C. Napoleoni, *Smith, Ricardo, Marx*, Oxford, 1975.

[1] *Ibid., p. 34.*

G. Maarek, *Introduction au Capital de Karl Marx*, Paris, 1975.

Нагадаем і пра іншую працу, дзе крытыкуецца тэорыя Маркса:

L'Economie de Marx. Histoire d'un echec, Paris, P. U. F., 1980. Крытыка грунтуецца на супярэчнасцях паміж зместам рукапісаў Маркса 1857—1858 гг. і тэкстам "Капіталу".

Што да філасофскіх аспектаў творчасці Маркса, то значныя працы былі апублікаваны ў апошнія гады, а менавіта:

J.-L. Petit, *Du travail vivant au système des actions, une discussion de Marx*, Paris, 1980.

G. Haarscher, *L'ontologie de Marx*, Bruxelles, 1980.

На працягу ўсяго гэтага раздзела мы спасылаліся на пераклад *"Капіталу"*, які выйшаў у выдавецтве Editions Sociales. Што да першай кнігі, то яе пераклад у цяперашні час распаўсюджаны ў выглядзе кішэннай кнігі (Garnier-Flammarion). Апублікаваны вельмі якасны пераклад другой і трэцяй кніг пад рэдакцыяй Maximilien Rubel у серыі "Bibliotheque de la Pléiade" (N.R.F.).

ЧАСТКА ШОСТАЯ



НЕАКЛАСІЧНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ

Ідэі Карла Маркса дастаткова моцна паўплывалі не толькі на рабочы рух і прыхільнікаў сацыяльнай рэвалюцыі, але і на значную колькасць навукоўцаў, якія займаліся вывучэннем "гуманітарных" навук. Вядома, у прыватнасці, што пасля з'яўлення марксізму ў даследаваннях гісторыі адбыліся глыбокія змены. Некаторыя гісторыкі проста цалкам перанялі тэорыю гістарычнага матэрыялізму, але не выклікае сумневу тое, што калі б яны мусілі прааналізаваць гэтую тэорыю, то прыйшлі б да высновы: эканамічныя чыннікі ўсё больш уплываюць як на гісторыю, так і на развіццё спосабаў вытворчасці.

Зусім іншым да тэорыі Маркса было стаўленне эканамістаў. Калі не ўлічваць Расеі, дык дзесьці да 1930 г. эканамісты падзяліліся на два розныя лагеры. Некаторыя з іх далучыліся да марксізму і часам станавіліся сябрамі рабочага руху (такое ў асноўным сустракалася ў Нямеччыне). Большая ж частка, не прызнаючы сацыяльнай рэвалюцыі, катэгарычна адхіліла марксізм.

Тым часам у гісторыі палітэканоміі адбылася надзвычайная падзея: эканамісты, якія адхілілі марксізм, у знак адмежавання ад сацыялістычных ідэяў адмовіліся вывучаць спадчыну вялікіх класікаў ангельскай палітэканоміі.

У 1871 г. ангельскі эканаміст Уільям Стэнлі Джэванс апублікаваў *"Тэорыю палітычнай эканоміі"*, дзе імкнуўся цалкам аднавіць эканамічную навуку праз зварот да матэматыкі і апору на "маржынальны прынцып". У тым жа годзе аўстрыец Карл Мэнгер у працы *"Асновы палітычнай эканоміі"* прааналізаваў эканамічныя з'явы, кіруючыся такім жа прынцыпам. У 1874 г. тым сама шляхам пайшоў француз Леон Вальрас. Гэтыя тры аўтары — заснавальнікі так званай неакласічнай школы. Такое азначэнне апраўдана ў тым сэнсе, што неакласічная школа імкнулася пацвердзіць высновы класічнай школы ў дачыненні перавагаў эканамічнага лібе-

ралізму. Аднак гэтая школа кіравалася зусім іншымі палажэннямі.

Для таго каб зразумець прычыны зараджэння і даволі хуткага распаўсюджвання новага кірунку ў палітычнай эканоміі, неабходна найперш разгледзець спрэчкі, якія дагэтуль мелі месца наконт класічнай палітэканоміі.

Раздзел I

КЛАСІЧНАЯ ПАЛІТЭКАНОМІЯ ПАД ПЫТАННЕМ (1820—1870)

§ 1. Крытыка эканамістаў класічнай школы

А) Агюст Конт і палітэканомія

Агюст Конт (1798—1857), выкладчык матэматыкі, рэпетытар Політэхнічнай школы, быў заснавальнікам "пазітывізму" — вучэння, якое катэгарычна адмаўляла філасофію. Ён — аўтар славутага "закону трох стадыяў", паводле якога інтэлектуальная эвалюцыя чалавецтва паступова праходзіць тэалагічную, метафізічную і, нарэшце, пазітыўную стадыі. Падчас у апошняй чалавечы розум кіруецца толькі ісцінамі, якія вынікаюць з навуковага аналізу.

Але ў чым палягаюць гэтыя ісціны? Паводле Агюста Конта, навукі абмяжоўваюцца ўсталяваннем некаторых нязменных дачыненняў, што існуюць паміж з'явамі, даступнымі назіранню. Гэтыя дачыненні ёсць навуковымі законамі, адкрытымі пры дапамозе простага "супастаўлення фактаў".

Згодна з гэтай канцэпцыяй, чалавечы розум мусіць абмяжоўвацца ўспрыманнем рэчаіснасці і фіксацыяй яе заканамернасцяў. Розум не здольны за кошт уласных высілкаў дайсці да сутнасці, якая хаваецца ў рэчах. У дадзеным выпадку перад намі вельмі крытычнае стаўленне да дыялектыкі Гегеля.

"Усё тое, што называюць лагічным, метафізічным светапоглядам, ёсць хімерай і летуценнем, калі не абсалютным абсурдам", — пісаў Конт[1].

Філасофскія дыскусіі, працягваў Агюст Конт, ні да чаго не прыводзяць, бо кожны заўсёды застаецца пры сваёй думцы. І наадварот, навукі, якія грунтуюцца на даследаваннях, вядуць да прагрэсу: яны робяць сапраўдныя адкрыцці, якія прызнаюцца ўсімі навукоўцамі. Значыць, толькі навука можа дасягнуць ісціны, толькі яна мае права на развіццё.

---

[1] *Ліст Валату ад 24 верасня 1819 г. цытуецца Henri Gouhier, La jeunesse d'Auguste Comte et la fondation du positivisme, Paris, 1933—1941, t. III, p. 244.*

1. НЕАБХОДНАСЦЬ ЗАМЕНЫ ПАЛІТЫЧНАЙ ЭКАНОМІІ НА САЦЫЯЛОГІЮ. Конт быў праціўнікам палітэканоміі, бо лічыў яе вельмі блізкай да метафізікі. Шмат якія школы адмаўляюцца гэта прызнаць, што вядзе да бясконцых спрэчак, не характэрных для сапраўднай навукі.

"Калі аб'ектыўна паглядзець, — пісаў ён, — на бясплённыя спрэчкі эканамістаў, якія падзяляюць іх па такіх звычайных паняццях, як вартасць, карыснасць, вытворчасць і г. д., то ўзнікае думка, што перад намі дзіўныя дэбаты схаластаў Сярэднявечча наконт фундаментальных функцый чыстых метафізічных адзінак і што спрэчкі эканамістаў усё больш становяцца падобнымі на гэтыя дэбаты па меры таго, як робяцца больш дагматызаванымі і мудрагелістымі... Напрыклад, усе разумныя людзі адназначна разумелі выразы — *прадукт* і *вытворца*. Але, пасля таго як эканамічныя метафізікі ўзяліся вызначыць іх сэнс, ідэя вытворчасці ў выніку заганных абагульненняў стала настолькі цьмянай і невыразнай, што цвярозы розум, які імкнецца да дакладнасці і яснасці, вымушаны цяпер пазбягаць мудрагелістай мовы, каб пазбавіцца ад ужывання тэрмінаў, якія сталі двухсэнсоўнымі і вельмі неакрэсленымі"[1].

З другога боку, Конт катэгарычна адхіліў ідэю аднаўлення палітычнай эканоміі з дапамогай матэматыкі, хоць сам і быў выкладчыкам матэматыкі, але варожа ставіўся да сваіх калегаў (праз якіх у яго жыцці было шмат цяжкасцяў).

"Спекулятыўнае панаванне геаметраў, — пісаў ён, — прыгнятае з прычыны таго, што яно нічым не падмацоўваецца ў сілу поўнай абыякавасці іхных працаў да розуму і да ўмоваў усіх іншых пазітыўных даследванняў"[2].

Гаворка не ідзе пра спрэчку наконт прыроды чалавека. Конт меркаваў, што законы рацыянальнай механікі "механічна пацвярджаюць дастасоўнасць агульнага закону ў роўнай ступені да ўсіх магчымых з'яваў, і ў прыватнасці да палітычных"[3]. Такім чынам, Конт не меншы матэрыяліст, чым прыхільнікі матэматычнага метаду. Толькі ён лічыў, што "складанасць прадмета" замінае падысці да сацыялогіі такім жа чынам, як падыходзяць да фізікі[4].

"Усялякая думка пра эфектыўную колькасць і закон матэматыкі, — пісаў ён, — што ўжо цалкам забаронена ў біялогіі, ...павінна самым радыкальным чынам выключацца з яшчэ больш складаных высноваў у сацыялогіі.

Адзінае такога роду адхіленне, якое магло б заслугоўваць сур'ёзнага абмеркавання, калі б сам трактат раней усебакова не адпрэчыў гэтага, — дарэмнае жаданне шматлікіх геаметраў зрабіць пазітыўнымі

[1] *Cours de philosophie positive, t. IV, Paris, 1839, pp. 270–271.*
[2] *Système de philosophie positive, Préliminaires généraux et conclusions, Archives positivistes, Paris, 1942, p. 271.*
[3] *Ibid., p. 378.*
[4] *Ibid., p. 399.*

сацыяльныя даследванні згодна з хімерным падпарадкаваннем ілюзорнай матэматычнай тэорыі імавернасцяў"[1].

Такім чынам, цалкам адхіліўшы палітычную эканомію, Конт фармулюе прынцыпы сапраўднай навукі аб грамадстве — "сацыялогіі".

Найперш трэба высветліць сапраўдную прыроду грамадства на прыкладах стасункаў, якія існуюць паміж сацыяльнымі элементамі ў сучасным свеце, — "сацыяльную статыку". Потым трэба вылучыць законы развіцця чалавецтва — "сацыяльную дынаміку". Гэтыя два складнікі сацыялогіі будуюцца пры дапамозе трох метадаў: непасрэднае назіранне за фактамі, аналіз "паталагічных выпадкаў", якія пацвярджаюцца досведам, гістарычнае параўнанне[2].

2. САЦЫЯЛЬНАЕ ВУЧЭННЕ АГЮСТА КОНТА. Асноўная ідэя Конта фармулюецца наступным чынам: сацыяльны лад прадугледжвае існаванне свецкай улады, якая ахоўвае тых, хто павінен паслухмяна падпарадкоўвацца, і "духоўнай улады", якая вучыць падданых ахвотна мірыцца з сваім становішчам і любіць тых, хто імі кіруе. Ён лічыў, што свецкая ўлада мусіць належаць кіраўнікам прамысловасці і банкірам, якія на практыцы даказалі сваю кампетэнтнасць. Духоўная ўлада павінна належаць навукоўцам, асабліва сацыёлагам, якія ведаюць законы грамадскага развіцця і здольныя растлумачыць усім індывідам неабходнасць захавання парадку і павагі да яго, а ў выпадках узнікнення канфліктаў становяцца суддзямі.

Далей ён гаварыў, што трэба дапусціць як неабходнае наяўнасць адрозненняў паміж сацыяльнымі класамі.

"Што да актыўнага і практычнага класа, які складае большую частку грамадства, то ягонае няпростае і прыкметнае станаўленне павінна прывесці да яшчэ больш пэўнага вызначэння гэтых асноватворных падзелаў; і ў дачыненні гэтага ўсё адбывалася так, што мала была патрэбная тэорыі ерархіі, каб рацыянальна абгрунтаваць спантанна вылучаныя дагэтуль адрозненні"[3].

Безумоўна, Конт прызнаваў неабходнасць таго, каб кожны індывід мог дасягнуць такога сацыяльнага становішча, якое адпавядае яго здольнасцям. Але на самой справе неабходныя "змены" ў будучыні дзеля дасягнення такога становішча будуць вельмі нязначныя і ўвогуле прызнаецца пераемнасць функцыяў:

"Пасля таго як сучасная блытаніна прывядзе да досыць устойлівай класіфікацыі падобных зменаў, якія, нягледзячы на заўсёдную магчы-

---

[1] *Cours de philosophie positive, t. IV, op. cit., p. 512. Глядзі на гэты конт твор René Mauduit, Auguste Comte et la science economique, Paris, 1928, p. 92. Р. Модуї лічыў, што Конт пазнаёміўся з творам Курно "Матэматычныя прынцыпы тэорыі багацця" (апублікавана ў 1838 г.) і меў на ўвазе гэтыя прынцыпы, калі казаў пра "нуднае алгебрычнае пустаслоўе другарадных пераймальнікаў" або калі ён заяўляў: "Гэтае адхіленне, на маю думку, толькі міжволі сведчыць пра філасофскую бездапаможнасць" (Ibid., pp. 56–57).*

[2] *Cours de philosophie positive, t. IV, op. cit., 48e leçon.*

[3] *Cours de philosophie positive, t. VI, Paris, 1842, p. 585.*

масць свайго з'яўлення і нават рэальнага здзяйснення, затым павінны стаць у асноўным выняткамі, бо натуральная тэндэнцыя да спадчыннасці прафесіяў моцна іх абясцэньвае: бальшыня людзей у прынцыпе не здольная мець пэўнае прызначэнне і ў той жа час большая частка сацыяльных функцыяў гэтага і не вымагае"[1].

На гэтым грунце будзе пабудаванае грамадства, дзе працоўнае пытанне развяжацца дзякуючы ўступкам і добразычлівасці кіраўніцтва, забяспечанае духоўнай уладай. Менавіта гэта Конт называе "маральным развязкам" сацыяльнай праблемы.

"Пазітыўная філасофія, якая надае пераважнае значэнне духоўнаму пераўтварэнню, — пісаў ён, — і заўсёды раскрывае марнасць ілюзіяў наконт неабмежаванай эфектыўнасці інстытуцый ва ўласным сэнсе гэтага слова, паступова пойдзе ў самым спрыяльным кірунку нармальнага задавальнення жаданняў народа. Толькі дзякуючы гэтаму яна можа правільна ацаніць сапраўдную перавагу маральных чыннікаў над чыста палітычнымі. Такія захады, без усялякіх, дарэчы, элементаў анархізму, вырвуць... у авантурыстаў і утапістаў небяспечны сродак правакавання сацыяльных узрушэнняў... Пазітыўная філасофія павінна растлумачыць натуральныя законы, якія ў навачаснай сацыяльнай сістэме вызначаюць неабходнасць канцэнтрацыі багацця у руках прамысловых магнатаў, і паказаць, што для інтарэсаў народа не мае вялікага значэння, у чыіх руках звычайна знаходзяцца капіталы, пры ўмове, што іх нармальнае выкарыстанне абавязкова карыснае для грамадства"[2].

Б) Дастасаванне на практыцы класічнай тэорыі замежнага гандлю ў Вялікабрытаніі. Супраціў тэорыі

Дзеля выкарыстання на практыцы ліберальнай тэорыі ангельскія прамыславікі патрабавалі адмены манаполіі Ост-Індскай кампаніі на гандаль з Індыяй і дамагліся свайго ў 1813 г. На працягу пэўнай колькасці гадоў захоўваліся мытныя пошліны на індыйскія вырабы (у прыватнасці, на баваўняную тканіну), тым часам як з ангельскіх вырабаў, што прывозіліся ў калонію, пошліна не спаганялася або была нязначная. З часам па меры заняпаду індыйскага рамесніцтва і павелічэння колькасці ангельскага экспарту пратэкцыянісцкія пошліны на карысць ангельскай прамысловасці сталі скарачацца[3]. Гэта спрычынілася да сапраўднага свабоднага гандлю, але свабоднага гандлю, які быў навязаны калоніі.

Пачынаючы з 1842 г. тая ж палітыка атрымала свой працяг у Кітаі, калі Англельшчына вымусіла кітайскага імператара пасля паразы Кітая ў "опіумнай вайне" дазволіць увоз опіуму, які вырабляўся на ангельскіх прадпрыемствах з індыйскай сыравіны.

Ліберальныя эканамісты ў прынцыпе ўхвалялі вызваленне калоніяў. Але іх антыкаланіялізм у асноўным датычыў новых краінаў, якія засялялі-

[1] *Ibid., p. 397.*
[2] *Ibid., pp. 602–603.*
[3] *Гл. F. Clairmonte, op. cit., p. 103.*

ся брытанскімі імігрантамі[1]. Трыумф ліберальнай тэорыі назіраўся ў перыяд, калі Брытанская імперыя няспынна расла за кошт набыцця або заваёвы новых тэрыторыяў: Кейптаўн (1814), Сінгапур (1819), Бірма (1824), Цэйлон (1833), Адэн (1838), Афганістан (1839—1841), Новая Зеландыя (1840). У гэты ж перыяд была акупаваная ўся тэрыторыя Індыі; на карысць ангельскіх імігрантаў прыгняталіся і знішчаліся аўстралійскія абарыгены.

Якраз у такіх умовах пашыралася кампанія ў абарону фрытрэдэрства. Гэта прывяло да падпісання ліберальных па змесце гандлёвых дамоваў, у прыватнасці, з лацінаамерыканскімі рэспублікамі пачынаючы з 1824 г. У 1845 г. былі скасаваныя падаткі на збожжа і нарэшце ў 1849 і 1854 гг. адмененыя Навігацыйныя акты, скіраваныя на абарону ангельскіх суднаўладальнікаў ад замежнай канкурэнцыі. Пазней скасаванне мытных пошлінаў працягвалася. Колькасць артыкулаў, што складалі ангельскую тарыфную сістэму, паменшылася з 1150 у 1840 г. да 48 у 1860 г.

Паводле тэорыі Рыкарда, свабодны гандаль павінны быў прывесці да гарманічнага павелічэння багацця ва ўсіх рэгіёнах свету. Рэальнасць паказала, што гэтая дактрына была прынцыпова памылковай. У сапраўднасці прымусовы свабодны гандаль вёў да масавага збяднення насельніцтва ў выніку зруйнавання мясцовага рамесніцтва. З гэтага гледзішча найбольш сумным быў прыклад Індыі.

Папраўдзе кажучы, брытанскі ўрад клапаціўся пра ўвядзенне свабоднага гандлю з калоніямі толькі тады, калі перавага брытанскай прамысловасці станавілася абсалютнай, а значыць, нельга сцвярджаць, што ангельцы сапраўды "рабілі стаўку" на свабодны гандаль. Тым не менш масавае збядненне брытанскіх калоніяў у XIX ст. красамоўна пацвярджала памылковы характар дактрыны Рыкарда. Свабодны гандаль паміж заможнай прамыслова развітай краінай і беднай калоніяй, якая не мае сучаснай прамысловасці, вядзе да згубнай спецыялізацыі апошняй, бо яна губляе ўсялякую магчымасць развіваць або нават захаваць сваю прамысловасць і ператвараецца ў краіну-экспарцёра сыравіны і сельскагаспадарчых прадуктаў.

Без сумневу, разважанне Рыкарда наконт перавагі працоўнай спецыялізацыі слушнае. Але ён памыляўся, калі разглядаў толькі *непасрэдны* яе *вынік*, якім можна грэбаваць параўнальна са зменамі ва ўмовах вытворчасці, выкліканых развіццём гандлю.

Рыкарда разглядаў для прыкладу дзве краіны, якія ў *пэўны момант* вырабляюць розныя тавары з пэўнымі выдаткамі, і дапускаў, што *гандаль не змяняе выдаткаў вытворчасці*. Але гэтае дапушчэнне відавочна ўступае ў поўную супярэчнасць з рэчаіснасцю, калі ўзяць пад увагу крыху большы перыяд. У навачаснай мануфактурнай прамысловасці выдаткі хутка зніжаюцца, калі дзякуючы існаванню шырокага рынку ўзнікае магчымасць няспыннага выкарыстання новых тэхналогіяў. Але гэтага не назіралася ў сельскай гаспадарцы перанаселеных краінаў, дзе недахоп

[1] *Гл. на гэты конт заўвагі ў творы M. B. Brown "After imperialism", London, 1963, p. 54.*

зямлі і капіталаў перашкаджаў развіццю метадаў вытворчасці. "Свабодны" гандаль паміж багатай і беднай краінамі, які выклікае спецыялізацыю першай у перапрацоўчай прамысловасці, а другой — у здабыўной прамысловасці і сельскай гаспадарцы, вядзе да яшчэ большага ўзбагачэння багатай краіны і збяднення беднай.

Маецца на ўвазе якраз гандаль паміж метраполіямі і калоніямі, паколькі сапраўды ў XIX ст. гэта быў практычна адзіны выпадак, калі свабодны гандаль пратрымаўся на працягу доўгага перыяду (відавочна, з прычыны зацікаўленасці метраполіяў) і дзе ў выніку можна рэальна прааналізаваць наступствы Рыкардавай тэорыі. Дактрына неўзабаве запанавала ў Вялікабрытаніі, але гэтага не назіралася ў іншых месцах. У Злучаных Штатах і асабліва ў Нямеччыне ўзмацніліся галасы, якія аспрэчвалі абгрунтаванасць дактрыны свабоднага гандлю.

У канцы XVIII ст. амерыканскія дзяржаўныя дзеячы выступілі за неабходнасць абароны сваёй краіны ад брытанскіх тавараў дзеля развіцця нацыянальнай прамысловасці. Мноства амэрыканскіх эканамістаў на пачатку XIX ст. падтрымлівалі такі падыход.

У 1808 г. у лісце да прэзідэнта Джэферсана эканаміст Томас Купэр заяўляў:

"Спадзяюся, што Кангрэс прагаласуе на карысць захадаў, скіраваных на абарону нашай маладой прамысловасці. Уцягванне нашых грамадзянаў у справу ўзыходжання на вяршыню індустрыялізацыі, справу, насычаную пасткамі і перашкодамі, для таго каб пры першых промнях міру пакінуць іх у жорсткай канкурэнцыі з брытанцамі сам-насам на нашых нутраных рынках, было б жудасным падманам"[1].

Таксама можна працытаваць Мэт'ю Кэры, які ў аўтабіяграфіі (1848) сведчыў, што невыносная праблема беспрацоўя выклікана прытокам ангельскіх тавараў[2].

Аднак асноўным прыхільнікам пратэкцыянізму ў першай палове XIX ст. быў немец Фрыдрых Ліст. У перыяд 1825—1832 гг. ён жыў у Злучаных Штатах, дзе на яго зрабілі вялікі ўплыў ідэі амэрыканскай дэмакратыі. Па вяртанні ў Нямеччыну ён у 1833 г. узяў удзел у падрыхтоўцы мытнага хаўрусу (*Zollverein*) паміж нямецкімі землямі. Мэтай хаўрусу была абарона нямецкай прамысловасці. У 1841 г. Ф. Ліст выдаў свой асноўны твор *"Нацыянальная сістэма палітычнай эканоміі"*.

У сваіх працах Ліст паўстае як зацяты супраціўнік ангельскай дактрыны свабоднага гандлю, якую ён лічыў спрэс крывадушнай.

"Мы люта ненавідзім, — пісаў ён, — гандлёвае тыранства паводле Джона Була, якое хоча ўсё паглынуць, якое не дазваляе ніякай нацыі ўзняцца на больш высокі ровень або праявіць сябе і якое, звыш таго, яшчэ імкнецца прымусіць усіх глытаць пілюлі свайго эгаізму і сцвярджае, што гэты гвалт — чыста навуковае дасягненне і філантропія"[3].

---

[1] *Cité par F. Clairmonte, op. cit., p. 39.*

[2] *Id. ibid., p. 41.*

[3] *Id. ibid., p. 71.*

Фрыдрых Ліст даў апісанне сітуацыі ў Нямеччыне — слабаразвітай параўнальна з Ангельшчынай краіне ў стылі Фіхтэ, які пісаў пра тое ж сорак гадоў таму і, без сумневу, паўплываў на Ліста.

"Заняпад сельскай гаспадаркі, — пісаў Ліст, — звязаны з феноменам, калі пры адсутнасці актыўнай прамысловасці ці прамысловасці, якая знаходзіцца на шляху свайго паступовага развіцця, назіраецца дэмаграфічны рост у сельскай гаспадарцы, што вядзе да спажывання лішку вытворчасці. Калі гэты рост дасягае свайго крытычнага роўню, дык пачынаецца або працэс эміграцыі, або падзел незанятай зямлі з сялянамі, якія ўсталяваліся тут раней, да той ступені, пакуль сямейныя дамены не набываюць настолькі абмежаваныя памеры, што сем'і больш не здольныя вырабляць неабходны мінімум дзеля задавальнення патрэбаў у харчаванні і ў самым элементарным..."[1]

Такім чынам, Ліст лічыў, што толькі агульная індустрыялізацыя здольная вызваліць краіну ад галечы. І таму ён вельмі варожа ставіўся да Рыкардавай тэорыі натуральнай спецыялізацыі праз спантаннае дзеянне закону параўнальных выдаткаў. Да таго ж ён быў перакананы, што працэс індустрыялізацыі вымагае актыўнага ўмяшання дзяржавы, якая толькі адна можа каардынаваць гэты працэс. Ліст абвінавачваў ангельскую палітычную эканомію ў тым, што яна не заўважае нацыі, а аддае ўвагу толькі індывідам. Ён ганьбіў ангельскую палітэканомію, называючы яе "касмапалітычнай эканоміяй".

В) Нямецкая гістарычная школа

На пачатку XIX ст. палітычная эканомія ў Нямеччыне, таксама як і ў Францыі, мела нашмат меншую распаўсюджанасць, чым у Вялікабрытаніі. Да таго ж на Нямеччыну перадусім уплывалі французскія ідэі, гэта значыць ідэі Жана Батыста Сэя. Аднак трэба адзначыць: тэзісы меркантылістаў так лёгка не саступалі сваё месца ў Нямеччыне, як у Францыі.

Якраз недастатковым распаўсюджваннем класічнай палітычнай эканоміі ў Нямеччыне тлумачыцца імклівы ўздым у перыяд 1840—1860-х гг. новай плыні — гістарычнай школы.

Першымі прадстаўнікамі гэтай школы былі Вільгельм Рашэр (*"Кароткі нарыс курса палітычнай эканоміі паводле гістарычнага метаду"*, 1843), Бруна Гільдэнбранд (*"Сучасная і будучая палітычная эканомія"*, 1848) і Карл Кніз (*"Палітычная эканомія з гледзішча гісторыі"*, 1853).

Усе гэтыя аўтары імкнуліся пабудаваць эканамічную навуку на грунце вывучэння гістарычных падзеяў накшталт таго, як гэта першапачаткова хацеў зрабіць Агюст Конт. Аднак адрозна ад заснавальніка пазітывізму прадстаўнікі гістарычнай школы прызнавалі, што павінны распрацоўвацца законы развіцця інстытуцый (а не толькі менталітэту). Акрамя таго, яны схіляліся да сацыяльнага рэфармізму, хоць і вельмі варожа ставіліся да ідэі рэвалюцыі[2]. Пад іх уплывам быў зроблены вялікі прагрэс

[1] *Id. ibid., p. 54.*

[2] *Некаторых з іхных паслядоўнікаў, якія таксама былі выкладчыкамі, называлі "катэдрсацыялістамі".*

у вывучэнні гісторыі эканамічнага развіцця. Але, з другога боку, стала зразумелым, што ўсе больш дакладныя веды мінулага самі па сабе не даюць лепшага разумення праблемаў, узнятых эканамістамі-лібераламі і мыслярамі-сацыялістамі: праблемаў прычын узбагачэння або эканамічнага росту нацыяў, крызісаў перавытворчасці, праблемаў паляпшэння ўмоваў рабочага класа і ўвогуле праблемаў размеркавання даходаў паміж сацыяльнымі класамі, будучыні эканамічнага лібералізму і сістэмы вытворчасці, заснаванай на прыватным прадпрымальніцтве.

Прыхільнікі нямецкай гістарычнай школы лічылі, што існуе *абсалютная* супрацьлегласць паміж гістарычнай навукай і дакладнымі навукамі і што з гэтай прычыны не могуць мець *аніякай* абгрунтаванасці законы, якія выводзіліся палітычнай эканоміяй з дапамогай метаду, аналагічнага таму, што ўжываецца ў фізіцы. Такім чынам, іх падыход вельмі розніўся ад падыходу Маркса, які ўлучаў у агульны аналіз гістарычнага развіцця законы класічнай палітычнай эканоміі, выпрацаваныя як законы пэўнай эканамічнай сістэмы. Але праз гэтую радыкальную супярэчнасць паміж гістарычным метадам і метадам эканамістаў нямецкая гістарычная школа фактычна асудзіла сябе на бясплённасць. Яна рашуча адхіліла законы класічнае школы, але не здолела выпрацаваць іншых.

Гэта не азначае, што нямецкая гістарычная школа не мела ніякага ўплыву. У прыватнасці, трэба адзначыць, што нарыс Рашэра *"Тэорыя крызісаў"* (1849) быў у першай палове XIX ст. адной з асноўных працаў, прысвечаных праблеме перавытворчасці. У нарысе аўтар сувора і справядліва крытыкаваў "закон рынкаў збыту" Жана Батыста Сэя і ўсіх, хто, як і Рыкарда, пагадзіліся з гэтым законам. Трэба, казаў Рашэр, вярнуцца да ідэі лорда Лодэрдэйла (і Мальтуса), адпаведна якой ашчаджанне сапраўды плённае толькі тады, калі яно павялічваецца паралельна з попытам на тавары і паслугі[1]. Відавочна, што па гэтым пытанні заснавальнік нямецкай гістарычнай школы меў рацыю ў недаверы да абстрактных аргументаў большыні эканамістаў свайго часу.

§ 2. Абарона класічнай школы. Джон Ст'юарт Міл

Крытыка з боку Агюста Конта і гістарычнай школы не перашкодзіла панаванню класічнай палітычнай эканоміі на працягу шматлікіх гадоў. А яе асноўны прадстаўнік з 1848 г. — Джон Ст'юарт Міл[2] быў нават філосафам, які захапляўся пазітывізмам.

У працы *"Сістэма дэдукцыйнай і індукцыйнай логікі"* (1843) Джон Ст'юарт Міл прызнаваў, што фармуляваннем "законаў трох стадыяў" Конт заклаў сапраўдныя прынцыпы "Агульнай навукі пра грамадства", якая грунтуецца на назіранні за сацыяльнымі фактамі. Але побач з гэтай

[1] *Гл. T. W. Hutchison, A Review of Economic Doctrines (1870—1929), Oxford, 1953; réimpression, 1962, pp. 356—357.*

[2] *Ён быў сынам Джэймза Міла, блізкага сябра Рыкарда і Бэнтама. Пра эвалюцыю палітычнай эканоміі ў Англельшчыне ад Рыкарда да Міла гл. даследванне Ronald D. Meek, The decline of Ricardian Economics, Economica, février 1950.*

навукай, казаў ён, існуе дэдукцыйная сацыялогія, адна з галінаў якой — палітычная эканомія. Гэтая дысцыпліна складае асобную навуку, бо дзеля вывучэння "сацыяльных з'яваў, мэта якіх — набыццё багацця", трэба разгледзець "чалавечы род, які займаецца выключна набыццём і спажываннем багацця"[1].

Але ці не ёсць палітычная эканомія псеўданавукай, бо яна прэтэндуе на выпрацоўку законаў універсальнага значэння, тым часам як грамадства змяняецца? На гэта Міл дае адмоўны адказ, паколькі тэорыя эканомікі можа ўлічваць змены ў грамадстве ў кожным асобным выпадку.

"Як той, хто развязаў пэўную колькасць алгебрычных раўнанняў, можа без цяжкасцяў развязаць усе іншыя раўнанні падобнага кшталту, гэтак і той, хто ведае палітычную эканомію Ангельшчыны або нават Ёркшыра, будзе разбірацца ў сучаснай або якой іншай палітычнай эканоміі ўсіх нацыяў пры ўмове, што ён мае досыць здаровага сэнсу, каб не рабіць аднолькавых высноваў з разнастайных пасылаў"[2].

Фактычна Джон Ст'юарт Міл пераканаў ва *універсальнай* слушнасці класічнай палітэканоміі. Гэта выразна бачна ў ягоных *"Прынцыпах палітычнай эканоміі"*, што выйшлі ў свет у 1848 г. і дзе аўтар застаецца верны законам, выведзеным Смітам і Рыкарда[3].

Папраўдзе кажучы, філосаф намагаецца ўвесці адрозненне паміж вытворчасцю багацця, "законы і ўмовы якой... маюць характар фізічных ісцінаў"[4], і размеркаваннем багацця — "выключна чалавечай інстытуцыяй"[5].

Паводле Міла, існуе два тыпы размеркавання. Першы абапіраецца на прыватную ўласнасць — "першапачатковую і асноватворную інстытуцыю, на якой апрача некалькіх надзвычайных і вельмі нязначных абставінаў заўсёды грунтавалася эканамічная сістэма грамадства[6]. Другі ж абапіраецца на супольную ўласнасць.

Джон Ст'юарт Міл таксама сцвярджаў, што на працягу доўгага часу "эканаміст будзе ў асноўным займацца праблемамі ўмоваў існавання і прагрэсу, уласцівымі грамадству, заснаванаму на прыватнай уласнасці і канкурэнцыі паміж індывідамі"[7].

Значыць, вывучэнне размеркавання будзе адбывацца ў межах прыватнай уласнасці і на практыцы будуць вывучацца толькі з'явы, уласцівыя капіталістычнай эканоміцы.

Тым не менш у 1848 г. Джон Ст'юарт Міл ужо не мог цалкам не

---

[1] *Op. cit., trad. franç., Paris, 1889, t. II, pp. 496–497.*

[2] *Ibid., p. 500.*

[3] *Джон Ст'юарт Міл таксама паўтарыў відавочныя памылкі іх разважанняў; напрыклад, ён адмаўляў, што амартызацыя сталага капіталу ўваходзіць у кошт прадукту (Гл. Principes d'économie politique, trad. franç., 1873, t. I, p. 481.)*

[4] *Principes, op. cit., I, p. 233.*

[5] *Ibid., p. 234.*

[6] *Ibid., p. 235.*

[7] *Ibid., p. 252.*

зважаць на супярэчнасці капіталістычнай сістэмы. У часе, калі ён пісаў, у Ангельшчыне пачала праводзіцца ліберальная палітыка. У 1834 г. адменена сацыяльная дапамога бяздомным беднякам; у 1844 г. былі прыпыненыя хлебныя законы, а ў 1846 г. — скасаваныя канчаткова. Аднак перыядычныя крызісы перавытворчасці выклікалі страшэнныя бедствы. І зусім не была развязаная праблема паўперызацыі. Ангельскія рабочыя ядналіся дзеля барацьбы супраць тагачаснага ладу. Джон Ст'юарт Міл, які меў стасункі з мыслярамі-сацыялістамі, усведамляў такі стан рэчаў.

"Няма ўпэўненасці ў тым, — пісаў ён, — што механічныя вынаходкі, зробленыя да сённяшняга часу, паменшылі штодзённую знямогу асобнай чалавечай істоты. Яны дазволілі бальшыні ўладальнікаў мануфактураў павялічваць свае багацці, але для простых працаўнікоў абярнуліся ўсялякімі праблемамі і яшчэ больш невыноснымі ўмовамі працы; яны палепшылі дабрабыт сярэдніх класаў, але не паспрыялі ажыццяўленню вялікіх зменаў у лёсе чалавецтва, што было ў іхных сілах"[1].

Джон Ст'юарт Міл цалкам прызнаваў факт існавання "гандлёвых крызісаў" і намагаўся даць ім вытлумачэнне. Ён лічыў крызісы вынікам павелічэння крэдыту, што выклікае спекулятыўны рост коштаў, пасля чаго яны абавязкова павінны знізіцца[2]. Якое ж выйсце прапанаваў Джон Ст'юарт Міл у дачыненні супярэчнасцяў капіталізму? Найперш ён асцярожна, але досыць выразна зазначаў, што перадавыя краіны мусяць абмежаваць дэмаграфічны рост праз кантроль за нараджальнасцю, што дазволіць павялічыць агульны ровень жыцця[3]. Перад намі выйсце, якое прапаноўваў Мальтус, але ўжо пазбаўленае ўсялякага пурытанізму. З усёй дакладнасцю яму можна даць найменне неамальтузіянскага. Міл да гэтага дадаў патрабаванне сацыяльнай роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі[4].

Яшчэ адзін сродак супраць бедаў грамадства Міл меркаваў знайсці ў яднанні рабочых і прадпрымальнікаў (што сёння мы назвалі б яднаннем капіталу і працы) і ў вытворчых кааператывах[5]; у гэтым ён далучаецца да дамарксісцкага сацыялізму.

Вельмі тыповае для яго твора жаданне хуткага надыходу *статычнага стану* грамадства, гэта значыць такога стану, калі спыніцца рост колькасці капіталу[6].

Як і Рыкарда, Міл лічыў, што сярэдняя норма прыбытку мае тэндэнцыю да паніжэння з прычыны павелічэння колькасці насельніцтва і асвойвання новых земляў, што ўздымае кошты на прадукты харчавання[7]. Яшчэ больш настойліва, чым ягоныя папярэднікі, Міл падкрэсліваў, што імпарт замежных сельскагаспадарчых тавараў і экспарт капіталаў мо-

[1] *Ibid., t. II, pp. 307–308.*
[2] *Ibid., pp. 50–55.*
[3] *Ibid., I, pp. 180–186.*
[4] *Ibid., II, pp. 316–317.*
[5] *Ibid., pp. 320–349.*
[6] *Ibid., I, pp. 198–199.*
[7] *Ibid., II, p. 286.*

гуць запаволіць такое зніжэнне нормы прыбытку. Ён быў упэўнены, што паніжэнне нормы прыбытку тым не менш працягваецца і прывядзе заходнія краіны да спынення назапашвання капіталу з прычыны знікнення матыву да назапашвання.

Ці трэба пра гэта шкадаваць? Паводле Міла, у ніякім разе. Страх перад статычным станам у яго саступае месца абсалютна супрацьлегламу пачуццю.

"Я не магу адчуваць у дачыненні да статычнага стану капіталу і багацця той адкрытай агіды, — пісаў ён, — якая выяўляецца ў даследаваннях эканамістаў старой школы. Я ўвогуле схіляюся да думкі, што ў сучасных умовах гэта было б найлепшым выйсцем. Прызнаюся, я не ў захапленні ад жыццёвага ідэалу, які навязваюць нам тыя, хто лічыць, што нармальны стан чалавека — гэта бясконцая барацьба дзеля выйсця з цяжкага становішча, што гэткі вэрхал, дзе топчуць нагамі, вынішчаюць адзін аднаго, штурхаюцца локцямі, наступаюць адзін аднаму на пяткі, чым і з'яўляецца сучасны тып грамадства, — найбольш пажаданы лёс чалавецтва, а не адна з самых непрыемных фазаў індустрыяльнага прагрэсу... Найлепшы стан для чалавечай прыроды — калі ніхто не багаты, ніхто не можа стаць больш багатым і не баіцца быць адкінутым назад высілкамі ўсіх іншых, хто імкнецца наперад"[1].

Вельмі далёкія гэтыя думкі ад першапачатковага пераканання "утылітарыстаў", на думку якіх рост багацця павінен забяспечыць усеагульнае шчасце. Якраз заклік Джона Ст'юарта Міла, апошняга буйнога прадстаўніка класічнай палітэканоміі, да спынення назапашвання і выяўляў недахопы філасофскага падмурку гэтага кірунку ў палітычнай эканоміі.

Адно з самых арыгінальных даследаванняў Міла палягае ў тэорыі вызначэння ўмоваў гандлю паміж дзвюма краінамі.

У сваёй тэорыі параўнальных выдаткаў Рыкарда не выказаў дакладнай думкі наконт стасункаў, якія мусяць усталявацца паміж памерамі таваразваротаў розных краінаў, або, іншымі словамі, наконт стасункаў коштаў паміж экспартаванымі і імпартаванымі таварамі ў пэўнай краіне. Гэтыя стасункі, якія мы сёння называем "умовамі гандлю", маюць асноватворнае значэнне, бо вызначаюць важнасць непасрэднай перавагі, якую атрымлівае кожная краіна дзякуючы абранай спецыялізацыі.

Пасля Рыкарда шматлікія эканамісты, прыхільнікі ягонай тэорыі, без аніякіх доказаў заяўлялі, што "агульная выгада", якую атрымліваюць у выніку гандлю дзве краіны, мае натуральную тэндэнцыю да яе "роўнага" падзелу паміж імі. У прыватнасці, гэты тэзіс адстойвалі Уільям Эліс у 1825 г., Джэймз Міл у 1826 г., а потым Маккулах[2]. І наадварот, палкоўнік Торэнз, які ў 1815 г. (а значыць, раней за Рыкарда) выказаў прынцып параўнальных выдаткаў у навуковай спрэчцы, якая разгарнулася ў 40-х

[1] *Ibid., II, pp. 304—305. Наконт гэтага аўтар падкрэсліваў, што нават амэрыканскае грамадства, якое так спрыяе пагоні за багаццем, далёка не ўсіх задавальняе.*
[2] *Гл. J. Viner, Studies in the theory of international trade, op. cit., p. 446.*

гадах, сцвярджаў, што "ўмовы гандлю" кожнай краіны залежаць ад велічыні попыту на прадукцыю, набытую ў іншай краіне[1].

Ідэю падхапіў і распаўсюдзіў Джон Ст'юарт Міл спачатку ў 1844 г. у творы *"Нарысы аб некаторых неразвязаных пытаннях палітычнай эканоміі"*[2], а потым у XVIII раздзеле трэцяй кнігі *"Прынцыпаў"*. Паводле Міла, параўнальныя выдаткі толькі акрэсліваюць межы, паміж якімі абавязкова вагаюцца ўмовы гандлю. Але дакладнае вызначэнне гэтых межаў залежыць ад попыту, які існуе ў кожнай краіне на пэўную прадукцыю.

Нельга сказаць, што тэзіс сам па сабе "памылковы", але сфера яго дастасавання надзвычай абмежаваная.

Як зазначыў у 1923 г. амэрыканскі эканаміст Ф. Д. Грэхэм[3], калі розныя краіны могуць абменьвацца паміж сабой цэлай сукупнасцю тавараў (а не толькі двума), дык умовы гандлю могуць залежаць не ад працэсу вагання коштаў на тавары імпарту і экспарту, а проста ад таго, што ў выніку канкурэнцыі тавары пэўнага кшталту ўваходзяць у склад імпарту і экспарту асобнай краіны.

Гэтая заўвага сапраўды надзвычай звужае значэнне закону Міла ў дачыненні вызначэння ўмоваў гандлю паміж індустрыяльнымі краінамі. Але значэнне гэтага закону яшчэ больш абмежаванае, калі гаворка ідзе пра вытлумачэнне ўмоваў гандлю паміж індустрыяльнымі і слабаразвітымі краінамі. Бо, па сутнасці, разважанне аўтара абапіраецца на вельмі ўмоўныя гіпотэзы, якія трэба прыняць дзеля дапушчэння слушнасці закону параўнальных выдаткаў.

Каб закон Міла меў дакладнае значэнне, недастаткова толькі дапусціць, што выдаткі вытворчасці не залежаць ад здзейсненага абмену; трэба яшчэ дапусціць, што ў кожнай краіне попыт на тавары таксама не залежыць ад абмену. Відавочна, тут гаворка ідзе пра гіпотэзу, якая істотна звужае значэнне закону, бо нават калі нейкая краіна атрымлівае выгаду ад гандлю з замежжам, дык трэба проста прызнаць, што даходы індывідаў будуць павялічвацца і гэта не можа не паўплываць на змену попыту на шматстайныя тавары.

З прыгаданых прычынаў закон узаемнага попыту мае абмежаванае значэнне нават пры аналізе непасрэдных наступстваў усталявання гандлёвых стасункаў паміж рознымі краінамі. Але калі гаворка ідзе пра вытлумачэнне *доўгатэрміновай* эвалюцыі ўмоваў гандлю, дык можна сцвярджаць, што тэзіс Міла не мае ніякай каштоўнасці. Сапраўды, тут будзе слушнай нашая крытыка Рыкарда: на працягу доўгага часу выдаткі і попыт абавязкова змяняюцца ў выніку самога развіцця гандлю. А наконт гэтых зменаў Джон Ст'юарт Міл нічога нам не праясняе.

---

[1] *Id., ibid., pp. 442 et 446.*

[2] *Essays on some unsettled question of political economy.*

[3] *Гл. The theory of international values re-examined, The Quarterly Journal of economics, 1923, pp. 54—86.*

§ 3. Беспасярэднія папярэднікі класічнай школы: Цюнен, Гасэн, Курно

Класічная палітычная эканомія ў той форме, якую ёй надаў Джон Ст'юарт Мілл, у другой палове XIX ст. мела яшчэ вялікі ўплыў. Аднак трэба падкрэсліць, што да 1870 г. у шмат якіх працах, вельмі мала, папраўдзе кажучы, распаўсюджаных, ужо прысутнічала спроба пашырыць сферу выкарыстання маржынальнага (гранічнага) прынцыпу, на якім будзе грунтавацца неакласічная школа.

Як мы ўжо маглі адзначыць, розныя аўтары ў часы панавання класічнай школы звярталіся да маржынальнага прынцыпу. Бэнтам, у прыватнасці, надаваў найвялікшае значэнне факту, што задавальненні, атрыманыя індывідам ад паслядоўна нарастальнай колькасці аднаго і таго ж тавару, падаюць. Ён сцвярджаў: калі беднаму аддаецца апошняя адзінка, спажытая багатым, дык павялічваецца колькасць задавальненняў, атрыманых усімі індывідамі разам. Такім чынам, Бэнтам, не ўжываючы самога тэрміну, параўноўваў "маржынальную карыснасць" тавару для багатага і для беднага. Тое ж сама рабіў Годўін.

Тэорыя зямельнай рэнты Мальтуса і Рыкарда таксама абапіралася на маржынальны прынцып. Паводле гэтых эканамістаў, кошты сельскагаспадарчых прадуктаў залежаць ад выдаткаў вытворчасці на найменш урадлівых глебах. Сёння мы сказалі б, што кошты сельскагаспадарчых прадуктаў залежаць ад выдаткаў іхнай вытворчасці на збяднелых глебах, або ад іхных гранічных выдаткаў.

У сярэдзіне XIX ст. былі зробленыя шматлікія спробы надаць гэтаму тыпу развагаў большую дакладнасць і большае значэнне.

У сваёй працы *"Ізаляваная дзяржава"* (1824) нямецкі эканаміст Гайнрых фон Цюнен імкнуўся стварыць тэорыю лакалізацыі сельскагаспадарчых культураў, абапіраючыся на маржынальны прынцып. Другая частка яго працы, выдадзеная толькі ў 1850 г., змяшчала выклад таго, што мы сёння называем законам роўнасці коштаў на фактары вытворчасці і на маржынальныя (гранічныя) прадукты. Сапраўды, Цюнен пісаў: "Выкарыстанне ўсё большай колькасці працы на пэўным участку зямлі павінна працягвацца да таго моманту, пакуль дадатковая прадукцыйнасць, атрыманая дзякуючы апошняму найманаму працаўніку, не стане роўнай па вартасці заробку, які ён атрымлівае"[1]. Таксама ён заяўляў, што даход ад капіталу "вызначаецца прадукцыйнасцю апошняй ужытай адзінкі капіталу" [2].

У 1854 г. сціплы службовец Герман Гайнрых Гасэн у невядомым на працягу доўгага часу творы *"Выкладанне законаў гандлю"* сфармуляваў закон, згодна з якім спажыўцы імкнуцца выроўніваць задавальненні, якія

[1] *Der isolierte Staat, nouv. éd., 1930, p. 415.*

[2] *Ibid., p. 498 (cité par Hla Myint, Theories of welfare economics, London, 1948; réimpression, New York, 1962, p. 105.*

ім прыносяць маржынальныя грашовыя адзінкі, што былі выдаткаваныя на набыццё разнастайных тавараў.

Аднак найбольш значным з папярэднікаў неакласічнае школы быў Курно. Ён шмат зрабіў дзеля аднаўлення палітычнай эканоміі.

Агюстэн Курно (1801—1877) быў выкладчыкам матэматыкі, а потым інспектарам адукацыі. Напісаў шматлікія філасофскія творы, якія не атрымалі прызнання пры ягоным жыцці, але пазней прыцягнулі ўвагу гісторыкаў філасофіі. Яго асноўны твор, выдадзены ў 1861 г., мае назоў *"Трактат аб паслядоўным развіцці асноўных ідэяў у навуках і гісторыі"*. Крыху раней, у 1838 г., Курно выдаў *"Матэматычныя прынцыпы тэорыі багацця"*, якія лічацца зыходным пунктам усёй матэматычнай тэорыі эканомікі.

У справе дастасавання матэматыкі да палітычнай эканоміі Курно меў за папярэднікаў шмат якіх даследнікаў, у прыватнасці ангельца Ўільяма Гіўэла[1]. Апошні быў верным вучнем Рыкарда і шукаў сродак больш дакладнага выкладання палітычнай эканоміі. Курно ж у большай ступені знаходзіўся пад уплывам Жана Батыста Сэя, чым ангельскіх эканамістаў.

Асноўная частка *"Прынцыпаў"* Курно — гэта тэорыя манапольных коштаў. Аўтар імкнуўся дакладна вызначыць цану тавараў, якая будзе фіксавацца пэўным прадпрыемствам, у залежнасці ад попыту на яго. Спачатку ён разглядаў сама просты выпадак, пры якім можна грэбаваць выдаткамі на вытворчасць прадукту (мінеральная вада), і вызначыў, што гэтая цана будзе роўная максімальнаму гандлёваму абарачэнню прадпрыемства.

Калі вядомая залежнасць паміж попытам D і цаною p, гэта значыць калі вядомая функцыя $D=f(p)$, дык гандлёвае абарачэнне, роўнае $p \cdot f(p)$, будзе максімальным тады, калі вытворная гэтага выразу роўная нулю, гэта значыць калі

$$f(p) + p \cdot f'(p) = 0.$$

Сёння мы сказалі б, што даход, атрыманы за пэўную колькасць прададзенага тавару Q па цане p, будзе максімальным, калі вытворная ад $p \cdot Q$ роўная нулю. Гэтая вытворная, роўная абсалютнай вартасці $p \cdot dQ$ мінус абсалютная вартасць $Q \cdot dp$, мае назоў "гранічны даход прадпрыемства".

Затым Курно пераходзіць да больш складанага выпадку, калі прадукт мае сабекошт, а потым да выпадку, калі ёсць два прадаўцы пэўнага тавару. На гэты конт ён развівае тэорыю "дуаполіі", якая выклікала шмат дыскусіяў.

Курно зрабіў значны ўклад у адкрыццё новых эканамічных законаў. Аднак ягоныя развагі наконт метаду палітычнай эканоміі маюць важнейшае значэнне. Яны — спроба вытлумачэння эканамічных з'яваў з дапамогаю абстрактных разважанняў, што нейкім чынам нагадвае адказ на ідэі Конта і гістарычнай школы.

[1] *A mathematical exposition of some doctrines of Political Economy, 1829.*

Курно пазнаёміўся з пазітывізмам Конта толькі ў апошнія гады свайго жыцця, і пазітывізм выклікаў у яго бязлітасную крытыку. Ён сцвярджаў, што навука не можа стварацца на простым складанні фактаў, яна мусіць змяшчаць ідэі і тэорыі, якія вынікаюць з творчай дзейнасці мыслення.

"Ці не забываюцца "пазітывісты"-геаметры, — пісаў ён, — пра сутнасць матэматычнай філасофіі, наконт якой увесь час адбываюцца дыскусіі паміж геаметрамі... пра паходжанне і прыроду велічыняў, якія называюцца адмоўнымі, уяўнымі, бясконца малымі, пра адхіленне або дапушчэнне ідэі сілы і пра тое, якім чынам можна яе ўвесці і карыстацца ёю?"[1]

У спрэчцы з пазітывістамі Курно выкарыстоўваў спасылкі на меркаванні Канта. Філасофія існуе, на яго думку, дзеля таго, каб браць на "крытычнае выпрабаванне каштоўнасць асноўных ідэяў нашага розуму"[2]. Высновы гэтае крытыкі не будуць мець "характару пазітыўных фактаў". Яны будуць толькі "верагоднымі". Курно, які быў аўтарам *"Разгляду тэорыі імавернасцяў і верагоднасцяў"* (1843), лічыў, што такія "верагодныя" высновы не страцяць ад гэтага сваёй вялікай вартасці.

Як паслядоўнік Канта Курно пісаў пра незалежнасць маралі і рэлігіі ад рацыянальнага спазнання[3]. У Канта можна знайсці таксама падмурак канцэпцыі эканамічнае навукі Курно.

Здавалася б, выразны падзел паміж мараллю і навукай, на чым настойваў Кант, павінны быў прывесці Курно да думкі, што навука пра чалавека — маральную істоту — не можа быць пабудаваная на ўзор "прыродазнаўчых навукаў". А Кант, які быў вельмі эклектычным філосафам і з вялікаю павагаю ставіўся да дакладных навукаў, ніколі не аспрэчваў тых, хто імкнуўся (пачынаючы з Дэкарта) пабудаваць навуку пра чалавека на ўзор фізікі. У выніку Курно спрабуе зрабіць з палітэканоміі "практычны сродак", гэта значыць дапаможную навуку, якая хоць і займаецца феноменам чалавека, будзе ўжываць не прынцыпы маралі, сфармуляваныя "практычнай філасофіяй", а паняцці, што выкарыстоўваюцца ў дакладных навуках і якія аналізаваў Кант у сваёй "тэарытычнай філасофіі". Гэтая ідэя выказваецца ва ўводзінах да *"Крытыкі здольнасці меркаваць"*, пра што мы згадвалі раней.

"Наколькі мала, — пісаў Кант, — ...дробнае размежаванне заслугоўвае імя практычнай геаметрыі, адрознай ад чыстай геаметрыі, настолькі ж мала і нават яшчэ менш механічнае або хімічнае майстэрства даследаў і назіранняў павінна разглядацца як практычная частка тэорыі прыроды, а хатняя, сельская або палітычная эканомія, майстэрства сацыяльных стасункаў, рэкамендацыі дыяталогіі... як складнікі філасофіі... Паколькі яны змяшчаюць толькі правілы ўмельства, а значыць, адзіна

[1] *Considérations sur la marche des idées et des évènements dans les temps modernes, Paris, 1872, t. II, p. 224.*

[2] *Ibid., p. 226.*

[3] *Гл. F. Mentre, Cournot et la renaissance du probabilisme, Paris, 1908, p. 503.*

практычныя сродкі дзеля дасягнення пэўнага магчымага эфекту паводле натуральных прычынна-выніковых паняццяў, то гэтыя правілы — частка тэарэтычнай філасофіі..."[1]

Гэта азначае, што эканамічная дзейнасць хоць і ажыццяўляецца чалавекам, не ўлучае ў сябе мараль і свабоду. Курно таксама прымаў такі падыход.

Пры паслядоўным вывучэнні даступных нашаму назіранню з'яваў Курно лічыў магчымым сцвярджаць наступнае: нежывая прырода дае нам спазнавальныя з'явы, бо іх можна вымяраць і ставіць на матэматычны разгляд; жывая прырода, апрача чалавека, прапануе нам з'явы, якія нельга навукова спазнаць, бо яны не падлягаюць матэматычнаму разгляду; нарэшце, у сферы чалавечых з'яваў зноў мы маем магчымасць выкарыстання матэматычнага метаду, у прыватнасці дзеля падліку імавернасцяў, што зноў дае магчымасць навуковага спазнання. "Тое, што робіць чалавек, — пісаў Курно, — тое, што ён па неабходнасці бярэ за ўзор пры вывучэнні чыста фізічных з'яваў, а таксама тое, чаго не ведае і не хоча рабіць жывая прырода, — усё гэта ажыццяўляецца з дапамогаю логікі і метаду, геаметрыі і падліку, спалучэння і размежавання сумяшчальных элементаў..."[2]

Паводле Курно, такая характарыстыка з'яваў чалавечага жыцця залежыць "ад своеасаблівасці істоты, што належыць да жывой прыроды, істоты, якую прырода надзяліла здольнасцямі самаразвівацца ў асобных надзвычайных абставінах насуперак кірунку, прадвызначанаму прыродай для ўсіх жывых істотаў..."[3] Як бы там ні было, сцвярджаў Курно, падобная "анамальная" ўласцівасць чалавека — ключ да разумення эвалюцыі чалавечага грамадства, якое першапачаткова было *арганізмам*, а цяпер усё больш і больш робіцца падобным на *механізм*.

"Грамадства яшчэ ў большай ступені, чым індывіды, здольнае на бясконцы прагрэс... Але толькі фіксацыя прынцыпаў і правілаў, несумяшчальных з фазамі жыццёвага развіцця, можа вызваліць грамадства ад фатальнага закону часу. Такім чынам, усталёўваецца пэўны парадак у сацыяльных з'явах. Ён мае тэндэнцыю да вылучэння *omisso medio* — чыста рацыянальных прынцыпаў або ідэяў, якім была прысвечаная наша першая кніга і які вядзе нас да ўсталявання чалавечага грамадства на ўзор механікі або фізікі, а гэта падпарадкоўваецца метаду, логіцы і падліку"[4].

Да гэтай "сацыяльнай механікі" перадусім належыць палітычная эканомія, сукупнасць "навукаў; яны называюцца эканамічнымі і асноўная іх мэта — законы, паводле якіх утвараюцца і цыркулююць прадукты чалавечай дзейнасці ў шматлікіх супольнасцях, дзе губляецца індывідуальнасць і дзе няма нічога для разгляду, апрача нейкага механізму, вельмі

[1] *Critique du jugement, trad. franç., Paris, 1979, p. 22.*
[2] *Traité de l'enchaînement des idées fondamentale, nouv. éd., Paris, 1911, p. 372.*
[3] *Ibid., p. 373.*
[4] *Ibid., pp. 373–374.*

падобнага да таго, якому падпарадкоўваюцца буйныя з'явы фізічнага свету"[1].

Такім чынам, палітычная эканомія магчымая таму, што ў чалавеку ёсць нешта, "што можа вызваліць ад фатальнага закону часу". Дзеля гэтага неабходна таксама, каб існавалі такія формы чалавечай дзейнасці, якія можна было б разглядаць, абстрагуючыся ад маралі. Курно сцвярджаў, што такія формы ёсць, паколькі ў грамадстве "закон вялікіх колькасцяў" робіць нябачным маральны характар індывідуальных учынкаў[2].

Гэтаму вельмі выразна акрэсленаму падыходу да эканамічнае праблемы трэба адрасаваць крытыку Гегеля ў дачыненні да "дакладных навукаў" увогуле. Будзе памылковым лічыць, што нават пры вывучэнні нежывой прыроды дзякуючы матэматычным разважанням можна дасягнуць сутнасці рэчаіснасці. А калі адмаўляцца, як рабіў Кант, ад канцэпцыі, паводле якой чалавечы розум няздольны спазнаць сутнасць рэчаў, дык трэба дапусціць, што пры ўсялякім парадку спазнання матэматычныя разважанні могуць толькі падрыхтаваць глебу для спасціжэння сутнасці з дапамогаю дыялектычнага метаду.

Калі гэта так, дык зразумела, што нельга *супрацьпастаўляць*, як робіць Курно, палітэканомію з усімі іншымі навукамі, якія вывучаюць сацыяльныя з'явы. Трэба разглядаць спазнанне эканамічных законаў як першы этап у інтэрпрэтацыі рэчаіснасці, якая ў канчатковым рахунку можа быць зразумелай толькі з дапамогаю дыялектычнага метаду. Гэта яшчэ больш відавочна ў дачыненні чалавечай рэчаіснасці, чым нечалавечай, бо чалавек — *гістарычная* істота, а інтэрпрэтацыя гісторыі — прывілеяваная галіна дыялектыкі. Таксама як і эканамісты-класікі, Курно не прызнаваў гістарычнай сутнасці усялякай сацыяльнай рэчаіснасці.

Аўтар *"Матэматычных прынцыпаў тэорыі багацця"* паўстае як рашучы праціўнік сацыялізму. Асабліва выразна ён выказаў свае ідэі па гэтым пытанні ў *"Разважаннях аб руху ідэяў"*.

Каб падмацаваць аргументы эканамістаў-класікаў па дадзенай праблеме, Курно звяртаецца да Дарвінавай тэорыі натуральнага адбору і барацьбы за выжыванне. "Дадайце да гэтага, — пісаў ён, — што сацыялістычная салідарнасць, у якіх бы формах яна ні ажыццяўлялася, сама па сабе прычына паслаблення нацыянальных сілаў, бо ў выніку заўсёды будзе стаяць праблема, каб прымусіць найбольш моцных, найбольш актыўных і найбольш прадбачлівых грамадзянаў плаціць за ўтрыманне найбольш кволых, бяздзейных і бестурботных, якія найменей фізічна і маральна ўстойлівыя; плаціць за тых, якіх *натуральны адбор* праз сваю бесстароннюю суворасць ахвяраваў бы дзеля таго, каб раса цалкам рэалізавала ўласцівы ёй патэнцыял"[3].

Шчыра кажучы, гэтыя ідэі мы ўжо сустракалі ў Мальтуса, і не варта

[1] *Ibid., p. 383.*
[2] *Ibid., pp. 536–537.*
[3] *Op. cit., p. 260.*

здзіўляцца поўнаму далучэнню Курно да тэзіса гэтага аўтара, паводле якога неабходна захоўваць сацыяльную няроўнасць, каб абмежаваць дэмаграфічны ціск[1]. Тым не менш у апошніх радках таго ж раздзела, прысвечанага сацыялізму, вельмі акрэслена выказваецца ідэя, якая, відавочна, ёсць падмуркам сацыяльнай філасофіі Курно: паколькі навуковы метад — гэта матэматычны метад, дык неабходна, каб эканамічная свабода панавала ў будучыні, бо толькі пры такой умове зможа развівацца навука пра грамадства.

"Мы маем падставы лічыць, — пісаў Курно, — што ўмовы, пры якіх магчыма само існаванне навукі, гэта ўмовы, якія з гледзішча прыроды выклікаюць узнікненне феноменаў, якімі і займаецца навука; і менавіта гэта мы намагаліся вызначыць пры пераліку фактараў, што больш за ўсё спрыяюць надыходу эканамічнай свабоды.

Дзякуючы гэтаму мы пераканаемся, што сацыялізм мае толькі частковае выкарыстанне, якое заўсёды падтрымліваецца з дапамогаю вышэйшай сілы, тым часам як прынцып эканамічнай свабоды (які, калі яго добра разгледзець, — толькі прынцып эканамічнай фатальнасці і які з той жа прычыны пасуе ўмовам навукі) будзе асноваю для ўсіх цывілізаваных нацыяў як у іх нутраной арганізацыі, так і ў іх дачыненнях паміж сабой"[2].

---

[1] *Ibid., p. 252.*

[2] *Op. cit., II, p. 262. Пра першапачатковае значэнне гэтай канцэпцыі сацыяльнага ладу ў філасофіі Курно гл. Mentré, op. cit., p. 324, n. 3. Дарэчы, варта адзначыць, што ў справе абароны эканамічнага лібералізму Курно не заходзіць гэтак далёка, як ангельскія утылітарысты або (крыху пазней) такі аўтар, як Вальрас. Курно зазначае, што на практыцы нельга параўноўваць карысныя вынікі шматстайных тыпаў эканамічнай дзейнасці, бо "максімальны рынкавы кошт" не абавязкова адпавядае эканамічна найлепшаму становішчу (гл. op. cit., pp. 548–549). Дзеля вывучэння поглядаў Курно таксама можна выкарыстаць працу Claude Ménard, La formation d'une rationnalité économique: A.-A. Cournot, Paris, 1971.*

Раздзел II

НОВАЯ ТЭОРЫЯ ВАРТАСЦІ І РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДАЎ

§ 1. Ўільям Стэнлі Джэванс

А) Вызначэнне вартасці як "апошняй ступені карыснасці". Тэорыя аптымальных паводзінаў спажыўца

Ў. С. Джэванс (1835—1882) быў сынам ангельскага прамыслоўца, даведзенага да галечы ў выніку крызісу 1847 г. Напачатку Ў. С. Джэванс цікавіўся праблемамі метэаралогіі, а потым пераарыентаваўся на эканамічныя пытанні. Пры гэтым асаблівую ўвагу аддаваў праблемам усталявання чыгуначных тарыфаў. Джэванс лічыў, што ангельская тэорыя вартасці кепска стасуецца з гэтымі праблемамі, і імкнуўся выкарыстоўваць ідэі Бэнтама. У выніку ў сваім першым даследванні *"Тэорыя палітычнай эканоміі"*, напісаным ў 1860 г. і апублікаваным ў 1866 г., а ў 1871 г. выдадзеным асобнаю кнігай, Джэванс вылучыў новую тэорыю вартасці, пра якую ён сам, дарэчы, гаварыў, што невядома, ці сапраўды гэтая тэорыя мае практычнае значэнне[1].

Паводле Джэванса, праца не можа быць прычынаю вартасці тавараў, бо выдаткам працы папярэднічае момант, часам даволі працяглы, калі тавар спажываецца.

"Безумоўна, — пісаў ён, — адразу пасля выдаткоўвання працы яна не ўплывае на будучую вартасць рэчы: яна знікае і назаўсёды губляецца. У гандлі ж тое, што знікла, знікае назаўсёды; таму мы заўжды павінны зыходзіць з нуля і плаціць за вартасць рэчаў, улічваючы іхную будучую карыснасць. Прамысловасць — гэта галоўным чынам позірк у будучыню, а не ў мінулае; і рэдка бывае так, каб вынік нейкага прадпрыемства дакладна супадаў з пачатковымі намерамі ягоных ініцыятараў"[2].

Аўтар галоўным чынам абараняў прагматычны погляд, які адпавядаў погляду прадпрымальніка ў дачыненні да агульных праблемаў эканомікі. Джэванс не дапускаў думкі, што дзеля вытлумачэння нейкага феномена можна звяртацца да прычыны, аддаленай у часе; ён не згаджаўся ўводзіць ад-

---

[1] *"Карыснасць тэорыі, — пісаў ён, — пытанне, якое адрозніваецца ад пытання ейнай існасці, наконт чаго я таксама цалкам не ўпэўнены" (The Theory of Political Economy, 1re éd., p. 25.*

[2] *Op. cit., p. 159.*

розненне, як гэта рабілі эканамісты-класікі, паміж канкрэтна ўзятымі коштамі і сярэднімі коштамі за пэўны перыяд часу. Джэванс увогуле сцвярджаў, што тэорыя працоўнай вартасці памылковая, бо яна невядомая практыцы прадпрымальніцкай дзейнасці. З гэтага рабіў выснову пра несапраўднасць усіх законаў, што былі сфармуляваныя класічнай палітычнай эканоміяй; зыходзячы з гэтага зняпраўджання, Джэванс імкнуўся зрабіць новую інтэрпрэтацыю эканамічнага жыцця і абапіраўся на новую канцэпцыю менавай вартасці, пабудаваную на прынцыпе гранічнай карыснасці.

Найперш Джэванс вылучаў закон, адпаведна якому спажывец тавараў пры нармальным стане схільны набываць такую колькасць тавараў, каб стасунак паміж "апошнімі роўнямі карыснасці" быў роўны стасунку іхных цэнаў[1]. Дапусцім, што цана аднаго літра віна роўная 4 франкам, аднаго кілаграма хлеба — 1 франку. Джэванс гаворыць, што колькасць віна і хлеба, якую набудзе індывід, павінна быць такой, каб стасунак маржынальных карыснасцяў гэтых тавараў быў роўны лічбе 4, і гэта азначае, што гранічная карыснасць віна мае быць у 4 разы большай за маржынальную карыснасць хлеба.

Сёння гэты закон мае назоў *закону прапарцыйнасці паміж маржынальнымі карыснасцямі і цэнамі прадуктаў*.

Пры вызначэнні *ўраўнаважанай* гранічнай карыснасці нейкага тавару як дзелі ад дзялення ягонай гранічнай карыснасці на ягоную цану можна весці гаворку аб законе *роўнасці ўзважаных маржынальных, або гранічных, карыснасцяў тавараў*.

Сапраўды, калі мы маем роўнасць

$$\frac{\text{гранічная карыснасць A}}{\text{гранічная карыснасць B}} = \frac{\text{цана A}}{\text{цана B}},$$

дык можна таксама сказаць, што

$$\frac{\text{гранічная карыснасць A}}{\text{цана A}} = \frac{\text{гранічная карыснасць B}}{\text{цана B}}.$$

[1] *Ibid., p. 132.*

Гэты закон можна лічыць справядлівым, калі, прынамсі, мы маем справу з таварамі, якія дзеляцца на даволі дробныя адзінкі.

Пазначым праз U_A і U_B маржынальныя карыснасці двух тавараў A і B, p_A і p_B — іхныя цэны.

Калі

$$\frac{U_A}{U_B} < \frac{p_A}{p_B},$$

дык таксама

$$\frac{U_A}{p_A} < \frac{U_B}{p_B}$$

і гэта азначае, што карыснасць, атрыманая ад апошняга франка, выдаткаванага на A, меншая за карыснасць, атрыманую ад апошняга франка, выдаткаванага на набыццё B[1]. У такім выпадку індывід, відавочна, зацікаўлены, каб набыць больш тавару B і менш тавару A.

Калі ж, наадварот,

$$\frac{U_A}{U_B} > \frac{p_A}{p_B} \quad \text{ці} \quad \frac{U_A}{p_A} > \frac{U_B}{p_B},$$

дык індывід зацікаўлены ў тым, каб набываць больш тавару A і менш тавару B.

І толькі пры

$$\frac{U_A}{U_B} = \frac{p_A}{p_B}$$

індывіда больш не цікавяць змены ў тым, што ён набывае. Такім чынам, дадзеная роўнасць дае дэфініцыю закону, які кіруе вызначэннем попыту на розныя тавары.

---

[1] *Напрыклад, няхай U_A=100, U_B=400, p_A=10, p_B=20. Тады мы маем* $\frac{U_A}{p_A} = \frac{100}{10} = 10$, *значыцца, адзін дадатковы франк, што ідзе на A, прыносіць задавальненне на 10 адзінак. Таксама маем* $\frac{U_B}{p_B} = \frac{400}{20} = 20$, *такім чынам, адзін дадатковы франк, што ідзе на B, прыносіць задавальненне ў 20 адзінак. У выніку індывід зацікаўлены ў тым, каб набываць менш тавару A і больш тавару B.*

Дагэтуль рабілася дапушчэнне, што цэны — гэта дадзеная велічыня. Але далей Джэванс пераходзіць да аналізу іх утварэння. Ён абмяжоўваецца тым, каб зноў у крыху адрознай форме сфармуляваць той сама закон, які мы толькі што разгледзелі, і выводзіць з яго закон вызначэння цэнаў.

Безумоўна, няцяжка паказаць, што калі не ўсе індывіды выконваюць умову прапарцыйнасці паміж маржынальнымі карыснасцямі і цэнамі, дык асобныя з іх будуць мяняць свой попыт на тавары, а гэта павінна прывесці да зменаў у цэнах. Значыцца, робіць выснову Джэванс, нармальныя цэны тавараў — гэта цэны, якія адпавядаюць умове выроўнівання ўраўнаважаных гранічных карыснасцяў. Ён сцвярджаў, што не варта шукаць у іншым вытлумачэнне наяўных стасункаў, або цэнаў на тавары. Тлумачэнне ж, якое эканамісты класічнае школы шукалі ў выдатках, у сапраўднасці даецца законам прапарцыйнасці паміж маржынальнымі карыснасцямі і цэнамі тавараў.

Менавіта такія разважанні неакласічная школа хацела супрацьпаставіць Рыкардаву аналізу менавай вартасці. Відавочна, што новая тэорыя настолькі ж недасканалая, як і ранейшая.

Калі Рыкарда сцвярджаў, што вартасць залежыць ад выдаткаў працы на прадукты, дык гаворка ідзе пра тэзіс, які тлумачыць разнастайныя з'явы і, у прыватнасці, змены стасункаў паміж цэнамі двух тавараў або дзвюх катэгорыяў тавараў на працягу нейкага часу.

Напрыклад, канстатуецца памяншэнне стасункаў паміж цэнамі на прамысловыя тавары і цэнамі на сельскагаспадарчыя тавары. Класічная тэорыя тлумачыла б гэты факт праз сцверджанне, што сярэднія выдаткі працы на прамысловыя тавары зменшыліся больш, чым сярэднія выдаткі працы на сельскагаспадарчыя тавары, ці (а гэта тое ж самае) што прадукцыйнасць працы павялічылася хутчэй у прамысловасці, чым у сельскай гаспадарцы. Тут мы маем спробу каўзальнага *тлумачэння* гэтае з'явы, бо прадукцыйнасць працы ў тым або іншым сектары, з аднаго боку, факт, які можна хоць бы прыблізна вымераць, і з другога боку, факт, які можа ўспрымацца сам па сабе. Пры гэтым пад

увагу бяруцца разнастайныя і істотныя фактары: прагрэс навуковых ведаў, змена ролі абсталявання, што выкарыстоўваецца ў вытворчасці, і г. д.

Цяпер разгледзім у дачыненні з'явы параўнальнага памяншэння цэнаў на прамысловыя тавары тэзіс прадстаўнікоў неакласічнай школы. Паводле яго, на пачатку разгляданага перыяду існавалі пэўныя стасункі паміж маржынальнымі карыснасцямі прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў, і гэтыя стасункі былі роўныя стасункам паміж цэнамі тавараў; пры канцы разгляданага перыяду ўжо існуюць іншыя стасункі паміж маржынальнымі карыснасцямі, а таксама і іншыя стасункі паміж цэнамі, бо маржынальныя карыснасці павінны заставацца прапарцыйнымі цэнам. Але ці будзе сцвярджацца, што стасункі паміж цэнамі змяніліся *таму*, што змяніліся стасункі паміж маржынальнымі карыснасцямі? Відавочна, не, бо гэтыя стасункі і ў першым, і ў другім выпадках — *вынік* працэсу абмену.

Раней мы бачылі, што спроба тлумачыць вартасць праз выдаткі працы супярэчыць рэчаіснасці. Цяпер відавочная немагчымасць усталявання вызначальнай сувязі паміж карыснасцю і вартасцю. Такім чынам, і першая, і другая тэорыі вартасці, якія супрацьстаялі адна адной ад узнікнення палітычнай эканоміі, паўстаюць малаабгрунтаванымі. Нас не павінна здзіўляць ідэя, выказаная ў *"Grundrisse"* Марксам, адпаведна з якой менавая вартасць — гэта адмова ад спажывецкай вартасці[1].

Гэта, аднак, не азначае, што закон Джэванса памылковы. Наадварот, мы лічым, што ён слушны. І пры тлумачэнні асобных з'яваў (не тых, якія мы толькі што разглядалі) гэты закон можа мець вялікае значэнне. Тым не менш тое, пра што мы ўжо гаварылі, дазваляе зрабіць выснову пра немагчымасць выводзіць з закону Джэванса прынцып тлумачэння менавай вартасці.

Дарэчы, зробленая Джэвансам памылка выяўляецца пры чытанні ўрыўкаў, у якіх ён намагаецца даць сінтэтычную інтэрпрэтацыю ўмоваў утварэння цэнаў. Зрабіць гэта даволі

[1] *Гл. вышэй, с. 422.*

цяжка, бо трэба надаць пэўную функцыю выдаткам вытворчасці. Аўтар прапануе нам наступныя разважанні.

"Вартасць, — пісаў Джэванс, — залежыць выключна ад апошняй ступені карыснасці. Якім жа чынам мы зможам змяняць апошнюю ступень карыснасці? Праз большую ці меншую колькасць спажывецкіх тавараў. А як жа мы атрымаем большую ці меншую колькасць тавараў? Праз выдаткі большай ці меншай колькасці працы, каб стварыць прапанову тавару. З гэтага гледзішча існуюць дзве прамежкавыя кропкі паміж працаю і вартасцю. Праца вызначае прапанову і прапанова вызначае ступень карыснасці, якая кіруе вартасцю, або менавымі стасункамі"[1].

На думку аўтара, ён знайшоў адзіны сродак удакладнення ролі выдаткаў пры поўным захаванні тэзіса пра тое, што вартасць вызначаецца маржынальнай карыснасцю. Але ягонае разважанне падаецца праўдападобным толькі таму, што яно вельмі недакладнае. Што азначае фраза: "Праца вызначае прапанову?" Яна можа азначаць толькі наступнае: *колькасць* нейкага прапанаванага на рынку тавару залежыць выключна ад выдаткаў на яго; а гэта, безумоўна, памылкова, бо відавочна, што попыт грае асноватворную ролю ў вызначэнні гэтай колькасці.

Джэванс, аднак, пераканаўны, што наўзамен Рыкардава закону менавай вартасці ён вылучыў новы закон і праз гэта стварыў новы падмурак, безумоўна, больш высокага кшталту, для ліберальных ідэяў. Сапраўды, Джэванс лічыў: закон прапарцыйнасці паміж маржынальнымі карыснасцямі і коштамі даказвае, што павінна быць захавана неабмежаваная свабода гандлю.

Разважаў ён наступным чынам: калі ў сістэме свабоднага гандлю кожны індывід няспынна прыстасоўвае свае набыткі да коштаў такім чынам, каб атрыманыя ім задавальненні былі максімальныя, дык трэба прызнаць, што свабода гандлю дазваляе ўсяму грамадству атрымаць максімум задавальненняў.

Ён пісаў: "Наколькі гэта сумяшчальна з размеркаваннем багацця ў кожнай супольнасці, усе тавары размяркоўваюцца шляхам абмену такім чынам, каб быў атрыманы максімум задавальненняў", таму "дасканалая свабода гандлю павінна быць выгаднай для ўсіх"[2].

[1] *Ibid., p. 160.*
[2] *Ibid., p. 134.*

Калі ўлічваць заўвагу пра няроўнасць даходаў (якую не мог не зрабіць паслядоўнік Бэнтама), дык відавочна, што выснова Джэванса празмерная. У сапраўднасці ён проста прадэманстраваў, што *пры наяўных коштах* пажадана, каб кожны індывід мог атрымаць такую колькасць тавараў, якую ён хоча набыць. Было б вельмі карысна ўдакладніць гэтую думку. Але нельга ісці далей за гэта і сцвярджаць, як рабіў наш аўтар, што ў іншай сістэме цэнаў атрыманыя задавальненні будуць менш значныя.

Разгледзім, напрыклад, краіну, дзе насельнікі спажываюць вялікую колькасць віна. Дапусцім, што змяняюцца цэны, якія ўсталяваліся пад спантанным уздзеяннем рынку: напрыклад, шляхам падатку падвышаецца цана на віно і праз субсідыі паніжаюцца цэны на кнігі ці квіткі у кінатэатры. У спажыванні індывідаў таксама адбудуцца змены. Індывіды будуць набываць менш віна і больш кнігаў ці будуць часцей наведваць кіно. Верагодна, асобныя індывіды атрымаюць праз гэта болей задавальненняў, тым часам як іншыя атрымаюць іх меней. Чаму трэба дапусціць, што першае становішча мае больш перавагаў, чым другое?

У бальшыні выпадкаў выгадныя або нявыгадныя наступствы пэўных зменаў у цэнах на тавары могуць вызначацца толькі на падставе маральнага ці палітычнага меркавання, бо дакладна вымераць іх немагчыма. Менавіта гэтая выснова не дазваляе ўвогуле сцвярджаць, як рабіў Джэванс, што створанае свабодным гандлем становішча — найлепшае з усіх магчымых.

Мы лічым, што спроба Джэванса зрабіць новы доказ на карысць зверхнасці прынцыпу свабоднага гандлю не мае таго значэння, якое надаваў ёй аўтар. Тым не менш выкарыстаны тып аргументацыі ў хуткім часе будзе шырока распаўсюджаны. Таму трэба падкрэсліць, што ў дадзеным выпадку праблема перавагаў лібералізму знаходзіцца на роўні, цалкам адрозным ад таго, на які яе размяшчалі эканамісты-класікі. Яны перш за ўсё цікавіліся рытмам росту эканомікі і ў лібералізме бачылі сродак забеспячэння імклівага ўздыму. У Джэванса гаворка зусім не пра гэта. Ён разглядаў пэўны час і спрабаваў даказаць, што пры заха-

ванні свабоды гандлю даступныя ў *гэты момант* вытворчыя магутнасці будуць выкарыстоўвацца найлепшым чынам.

Без сумневу, падобныя змены поглядаў часткова тлумачацца тым, што эканамісты неакласічнае школы жылі ў высокаразвітых краінах, дзе значныя памеры набыло ашчаджанне. Яны пагаджаліся з панавальным у класічнай школе гледзішчам, паводле якога рост эканомікі залежыць галоўным чынам ад роўню ашчаджання. Таму неакласікі лічылі, што ім ужо не трэба больш клапаціцца аб праблеме росту.

Б) Тэорыя апошняга роўню прадукцыйнасці і аналіз размеркавання

Аўтар *"Тэорыі палітычнай эканоміі"* не абмяжоўваўся, аднак, прапановаю новай інтэрпрэтацыі вартасці тавараў. У апошніх раздзелах сваёй кнігі ён акрэсліў новую тэорыю размеркавання даходаў, абапіраючыся на азначэнне "апошні ровень прадукцыйнасці капіталу", якое ў хуткім часе стане азначэннем "маржынальнай прадукцыйнасці капіталу".

Джэванс, безумоўна, першы з эканамістаў сфармуляваў тэзіс, што стане вядомым і адпаведна з якім выкарыстанне капіталу прыбытковае, бо яно дазваляе адрозніць момант, калі атрымліваецца плён працы, выдаткаванай у вытворчасці.

"Мы можам, — пісаў Джэванс, — атрымаць агульны выраз працэнта, які прыносіць капітал пры ягоным якім-небудзь выкарыстанні, калі ўявім, што прадукт пэўнай колькасці працы — гэта няспынная ў часе функцыя, якая адбываецца паміж выдаткаваннем працы і атрыманнем ейнага выніку"[1].

Выказаная ідэя выклікае цікавасць: яна пэўным чынам асвятляе прыроду капіталу, які сапраўды існуе толькі тады, калі вытворчая дзейнасць вымагае часу. Аднак Джэванс перш за ўсё займаўся пошукам тлумачэння даходу ад капіталу, якое дазволіла б адхіліць усе сацыялістычныя тэорыі эксплуатацыі. У выніку ён сцвярджаў, што стасункі паміж павелічэннем прадукцыі, атрыманым праз падаўжэнне прамежку часу, растлумачанага вышэй, і павелічэннем інвестыцыяў, неабходных дзеля здзяйснення такога падаўжэння, "вызначаюць норму прыбытку"[2].

[1] *Ibid., p. 237.*
[2] *Ibid.*

Аўтар не даў аніякага зразумелага доказу гэтага закону. Аднак можна сказаць, што па сутнасці ягоная аргументацыя выглядае наступным чынам. Адзінкі капіталу, што паступова выкарыстоўваюцца на прадпрыемстве, маюць спадальную прадукцыйнасць. Калі нанесці на вось абсцысаў (гл. графік ніжэй) колькасць капіталу, а на вось ардынатаў — маржынальную (гранічную) прадукцыйнасць, дык атрымаецца крывая, схіленая ўправа.



Калі дапусціць, што прадпрыемства бярэ ў пазыку свой капітал па норме працэнта t, дык адзінкі паміж 0 і q будуць мець маржынальную прадукцыйнасць, большую за норму працэнта t. Значыцца, кожная адзінка капіталу прыносіць прадпрыемству прыбытку больш, чым яна каштуе, і такім чынам павялічваецца чысты прыбытак прадпрыемства, якое выкарыстоўвае гэтыя адзінкі. І наадварот, за межамі кропкі q кожная адзінка капіталу прыносіць прыбытку менш, чым яно каштуе, таму выкарыстоўваць яе нявыгадна. І Джэванс зрабіў выснову, што ў кожнай справе капітал будзе выкарыстоўвацца датуль, пакуль ягоная прадукцыйнасць не стане дакладна роўнай бягучай норме працэнта[1].

Калі гэта так, дык можна сцвярджаць, што маржынальная прадукцыйнасць капіталу ў нармальным стане паўсюль павінна быць роўнай норме працэнта. Адсюль, паводле Джэванса, вынікае, што норма працэнта вызначаецца маржы-

[1] *Ibid., p. 236.*

нальнай прадукцыйнасцю капіталу[1]. Фактычна адначасова з выказваннем значнай ідэі мы маем тут цалкам адвольную выснову на яе падставе.

Не выклікае сумневу, што калі б прадпрыемствы бралі ў пазыку сукупнасць іхных капіталаў, яны вымушаны былі б выроўніваць маржынальны прадукт пазычаных фондаў з нормаю працэнта. Але гэта зусім не дае права рабіць выснову (як гэта ўжо рабіў Цюнен), што маржынальная прадукцыйнасць капіталу *вызначае* норму працэнта.

Аднак выведзены прынцып можа мець вельмі адрозную інтэрпрэтацыю. Калі не зважаць на зямельныя рэнты, дык даход ад капіталу (тут ён мае назоў нормы працэнта) залежыць ад роўню заробкаў (бо сукупны прадукт падзяляецца між найманымі працаўнікамі і капіталістамі). А можна дапусціць, што памеры заробкаў залежаць ад большай ці меншай здольнасці найманых працаўнікоў весці перамовы наконт заробкаў. Гэта азначае, што прадпрыемствы прымаюць норму працэнта як *дадзеную* велічыню. У такім разе даследванне Джэванса паказвае, як пры пабежнай норме працэнта вызначаецца колькасць капіталу, што выкарыстоўваецца прадпрыемствамі, а не спосаб усталявання нормы працэнта.

Каб зрабіць праўдападобнай ідэю вызначэння даходаў на падставе маржынальных прадуктаў "фактараў вытворчасці", Вальрас крыху пазней развіў свой аналіз і пабудаваў больш складаную мадэль (якая, дарэчы, таксама сутыкнулася з непераадольнымі пярэчаннямі).

У дачыненні да Джэванса надзвычай паказальна канстатаваць, што ў сваім наступным больш дакладным творы *"Дзяржава ў стаўленні да працы"*[2] ён паўтарыў крытыку ранейшых тэорыяў размеркавання і падыходу сацыялістаў да гэтага пытання, але нават ні разу не ўзгадаў сваю ўласную тэорыю 1871 г.

"Можна з усёй упэўненасцю сцвярджаць, — пісаў Джэванс, — што не існуе натуральнага прынцыпу, ва ўсялякім разе адзінага і простага, на аснове якога можа ажыццяўляцца падзел (нацыянальнага даходу). Паколькі нельга дакладна вызначыць пэўную частку нацыянальнага дахо-

[1] *Ibid., p. 237.*

[2] *The State in relation to Labour, London, 1882.*

ду для кожнага, то ўсе павінны патрабаваць максімум таго, што яны маюць шанец атрымаць, і вымушаны абмяжоўвацца тым, што ім удаецца атрымаць"[1].

Прыгаданае выказванне, здаецца, ідзе цалкам у тым кірунку, што і сцверджанні сацыялістаў. Але ўзапраўды гэта зусім не так, бо аўтар гаварыў, што нельга дапускаць (як гэта рабіў Рыкарда), каб заробак мог павялічыцца толькі пры зніжэнні прыбытку. Працадавальнік, даводзіў Джэванс, можа, прынамсі, у многіх выпадках кампенсаваць павелічэнне заробку праз уздым кошту прадукцыі. Таму сапраўдны канфлікт, які пераважае ў пытанні размеркавання, — гэта канфлікт, што супрацьпастаўляе вытворцаў і спажыўцоў.

"Меркаваны канфлікт паміж працаю і капіталам — гэта ілюзія, — пісаў Джэванс. — Сапраўдны канфлікт існуе паміж вытворцамі і спажыўцамі"[2].

Кожны можа зразумець, што гэты тэзіс недакладны, бо ўзнятая праблема — гэта не праблема эвентуальных адбіткаў росту *намінальнага* заробку на кошты, а праблема размеркавання *рэальнага* нацыянальнага даходу паміж эканамічнымі суб'ектамі.

§ 2. Леон Вальрас

Мы не будзем пераказваць *"Асновы палітычнай эканоміі"* аўстрыйскага эканаміста Карла Мэнгера, бо давялося б паўтараць толькі што сказанае наконт Джэванса. Праца Мэнгера галоўным чынам змяшчае аналіз паводзінаў спажыўца, з чаго аўтар зрабіў выснову, што "для індывіда вартасць адной адзінкі даступнага запасу нейкага тавару роўная значнасці, якая надаецца найменшаму задавальненню, атрыманаму дзякуючы адной адзінцы сукупнай колькасці гэтага тавару"[3]. Значыць, вартасць роўная маржынальнай карыснасці тавару. З гэтым тэзісам можна пагадзіцца. Але, як і Джэванс, Мэнгер памылкова хацеў вывесці з яго, што тэорыя маржынальнай карыснасці *тлумачыць* вартасць та-

[1] *Op. cit., nouv. éd., London, 1887, p. 92.*
[2] *Op. cit., p. 98.*
[3] *Cité par T. W. Hutchison, A Review of economic doctrines (1870–1929), Oxford, 1953; réimpression, 1962, p. 141.*

вараў. Апрача таго, Мэнгер таксама развіваў ідэю, згодна з якой прадукцыйнасць капіталу залежыць ад падаўжэння працэсу вытворчасці. Ідэі былі выказаныя ў той самы год, калі выйшла ў свет асноўная праца Джэванса, таму можна сказаць, што яны складаюць адкрыццё, зробленае адначасова абодвума аўтарамі.

Асноўны твор Вальраса "*Элементы чыстай палітычнай эканоміі*", які змяшчае ідэнтычныя погляды на праблему вартасці, быў апублікаваны толькі ў 1874 г. Тым не менш наўрад ці пад час напісання свайго твора Вальрас быў знаёмы з працамі Джэванса і Мэнгера. Таму агульнапрызнана, што маржыналісцкая тэорыя вартасці мела трох заснавальнікаў.

Нягледзячы на падабенства вынікаў, атрыманых усімі трыма эканамістамі, вывучэнне поглядаў Вальраса неабходнае нават і пасля даследванняў поглядаў Джэванса, бо, на нашую думку, французскі эканаміст не ўнёс нічога сапраўды новага ў галіну *тлумачэння* эканамічных з'яваў. Наадварот, ён прапанаваў *фармалізацыю* эканамічнай праблемы, значэнне якой было вельмі вялікім.

А) Вальрасава канцэпцыя палітычнай эканоміі

Леон Вальрас (1834—1910) вучыўся ў Парыжскім горным інстытуце, потым стаў журналістам і, нарэшце, з 1870 г. — выкладчыкам палітычнай эканоміі ў Лазанскім універсітэце.

У 1860 г. Вальрас напісаў кнігу, накіраваную супраць Прудона[1], у якой выказаў сваё жаданне пабудаваць палітэканомію на новай глебе, каб зруйнаваць аргументы сацыялістаў. Вальрас абвясціў сябе прыхільнікам сацыяльнай справядлівасці, але адначасова непахісна верыў у станоўчыя бакі свабоднай канкурэнцыі.

Вучоны сцвярджаў, што трэба пабудаваць дактрыну, здольную прымірыць лібералізм, які забяспечвае рост вытворчасці, і сацыялізм, які хоча ажыццявіць справядлівасць. Гэта магчыма пры адрозненні ў чалавечай дзейнасці таго, што, з аднаго боку, датычыць навукі і, з другога — маралі.

[1] *L'économie politique et la justice, Paris, 1860.*

Эканамічная навука скажа, чаму канкурэнцыя — гэта адзіны сродак павелічэння багацця́ў, а мараль — калі і якім чынам варта ўмешвацца, каб справядліва размеркаваць багацці.

У гэтым бачыцца тыпова кантаўскі падыход[1]. У *"Элементах чыстай палітычнай эканоміі"* Вальрас спрабаваў дапусціць, што існуе пэўная катэгорыя чалавечых фактаў, якую цалкам трэба атаясамліваць з нечалавечымі фактамі.

Аўтар сцвярджаў, што існуюць дзве вялікія катэгорыі фактаў: "натуральныя" факты і "гуманітарныя". Але сярод апошніх трэба адрозніваць, з аднаго боку, факты як вынік волі, дзейнасці чалавека, што ажыццяўляецца ў дачыненні натуральных сілаў, інакш кажучы, дачыненні паміж людзьмі і рэчамі, і, з другога боку, факты як вынік волі, дзейнасці чалавека, што ажыццяўляецца ў дачыненні да волі, дзейнасці іншых людзей, інакш кажучы, стасункі людзей з людзьмі"[2]. Першая ж катэгорыя, якая ахоплівае сукупнасць эканамічных фактаў, — гэта галіна навукі, бо гаворка не ідзе пра *сапраўды* "гуманітарныя факты".

"Збожжа, — пісаў Вальрас, — каштуе 24 франкі за гекталітр. Адзначым спачатку, што гэты факт мае характар натуральнага факта. Такая грашовая вартасць збожжа, або такая цана збожжа, не залежыць ні ад волі гандляра, ні ад волі пакупніка, ні ад згоды паміж абодвума... Значыць, як толькі ён усталяваны, факт менавай вартасці набывае характар натуральнага факта, натуральнага па сваім паходжанні, натуральнага ў сваім выяўленні і манеры існавання"[3]. Але, працягвае аўтар, "менавая вартасць — гэта велічыня, якая належыць да матэматыкі. Значыцца, чыстая палітычная эканомія, або тэорыя менавай вартасці і абмену..., з'яўляецца, як механіка, як гідраўліка, фізічна-матэматычнаю навукай"[4].

Б) Асновы Вальрасава аналізу

Чыстая палітычная эканомія Вальраса палягае ў пабудове матэматычнай мадэлі, якая дазволіла б дакладна вызначыць становішча, да якога рухаецца эканоміка, што грунтуецца на свабодным абмене таварамі, на свабодным прода-

---

[1] *Вальрас спасылаецца на Канта як на неаспрэчны аўтарытэт. Гл. Etudes d'économie sociale, nouv. éd, Paris, 1936, pp. 88–89. Гл. таксама Etudes d'économie politique appliquée, Paris, 1898, p. 459.*

[2] *Eléments d'écomomie politique pure, 1re éd., Paris, 1874, p. 21.*

[3] *Ibid., p. 29.*

[4] *Ibid., pp. 31–32.*

жы працоўнай сілы, на свабодным руху капіталаў і на свабоднай арэндзе зямлі.

Значэнне даследванняў Вальраса ў тым, што ён першы паспрабаваў пабудаваць поўную мадэль агульнай раўнавагі цэнаў і абменаў пры дапамозе сістэмы раўнанняў. Агульная раўнавага вызначаецца як становішча, пры якім ні спажыўцы, ні вытворцы не маюць інтарэсу ў змяненні колькасцяў тавараў і паслугаў, якія яны патрабуюць ці прапануюць на ўсіх разнастайных рынках. Гэта дазваляе разглядаць такое становішча як "нармальнае", яно можа быць зменена толькі пры ўмяшанні прычынаў, "вонкавых" для сістэмы абменаў.

Для пабудовы сваёй мадэлі Вальрас выкарыстаў закон выроўнівання ўраўнаважаных гранічных карыснасцяў і цэнаў прадуктаў, які мы сустракалі ў Джэванса і Мэнгера. На падставе гэтага закону Вальрас змог сказаць, што пры раўнаважных цэнах попыт спажыўцоў залежыць ад гэтых цэнаў.

Для матэматычнага выражэння фактараў, ад якіх залежыць прапанова тавараў, Вальрас карыстаўся ранейшай тэорыяй "прадукцыйных паслугаў" Жана Батыста Сэя. Выхаваны на чытанні працаў французскае школы (і, у прыватнасці, на працах свайго бацькі Агюста Вальраса, які таксама быў эканамістам), наш аўтар лічыў, што на тэзіс ангельскай класічнай школы, згодна з якім усялякая менавая вартасць ствараецца працаю чалавека, можна не зважаць. У якасці "фактараў вытворчасці" Вальрас ставіў на адзін ровень працу, капітал і зямлю. З гэтых фактараў паходзяць паслугі, якія прадаюцца прадпрымальнікам. Адрозніваючы якасці, уласцівыя тым або іншым паслугам, Вальрас урэшце пабудаваў мадэль, у якую можна ўвесці бясконцую (і, без сумневу, вельмі вялікую) колькасць разнастайных паслугаў.

Паводле мадэлі, уладальнікі паслугаў (працоўныя, уласнікі капіталаў і зямлі) прапаноўваюць іх прадпрымальнікам. Вальрас лічыў, што ў раўнаважным становішчы колькасць прапанаваных паслугаў залежыць ад цэнаў на тавары і паслугі; тут ён абапіраўся на закон, адэкватны папярэдняму закону (выроўнівання ўраўнаважаных гранічных карыснасцяў і цэнаў прадуктаў. — *Заўвага перакладніка.*). Вальрас

гаварыў: продаж адной адзінкі нейкай паслугі вядзе ўладальніка паслугі да пазбаўлення карыснасці. Варта назваць гэта "антыкарыснасцю" (désutilité), хоць Вальрас і не ўжываў такога тэрміна (гэта зробяць ягоныя паслядоўнікі). Улічваючы тое, што кошт продажу паслугі дазваляе набыць разнастайныя тавары, цэны на якія ўжо вызначаныя, індывід прапаноўвае такую колькасць паслугаў, каб ураўнаважаныя маржынальныя антыкарыснасці гэтых паслугаў былі роўныя між сабой. Калі пазначыць праз D_a, D_b, D_c, ... маржынальныя антыкарыснасці паслугаў *a, b, c, d*, дык закон мае наступны выгляд:

$$\frac{D_a}{p_a} = \frac{D_b}{p_b} = \frac{D_c}{p_c} \dots$$

Доказ гэтага закону такі ж просты, як і доказ папярэдняга. Індывід валодае нейкай працоўнай здольнасцю і нейкім капіталам. Кожная гадзіна працы спараджае антыкарыснасць. Пакуль гэтая антыкарыснасць меншая за карыснасць, якую складае штогадзінны заробак, індывід павялічвае сваю прапанову працы. Значыць, у нармальным стане ён павінны прапанаваць такую колькасць працоўных гадзінаў, каб атрыманая ад апошняга штогадзіннага заробку карыснасць была роўная антыкарыснасці апошняй працоўнай гадзіны. Калі капітал — гэта паслуга *a*, а U_m — гэта маржынальная карыснасць грошай, дык вышэйпамянёнае можна напісаць наступным чынам:

$$D_a = p_a \cdot U_m.$$

Тым часам і з той самай прычыны пазначаны індывід павінен прапанаваць такую колькасць капіталу (*b*), каб

$$D_b = p_b \cdot U_m.$$

Значыцца, мы маем

$$\frac{D_a}{p_a} = U_m$$

і

$$\frac{D_b}{p_b} = U_m,$$

а гэта азначае, што

$$\frac{D_a}{p_a} = \frac{D_b}{p_b}.$$

Такім чынам, прапанова паслугаў залежыць ад іхных коштаў. Вальрас дапусціў, што колькасці "прадукцыйных паслугаў", неабходных для вытворчасці адной адзінкі кожнага тавару, — вызначаныя велічыні, якія ён назваў "каэфіцыентамі фабрыкацыі". Праз гэта Вальрас змог напісаць, што існуе дакладная залежнасць паміж раўнаважнымі коштамі ўсіх разнастайных тавараў і колькасцямі ўсіх разнастайных паслугаў, на якія існуе попыт.

Каб ужываць пазначэнні самога аўтара, пазначым праз

$$a_t,\ a_p,\ a_k,\ \ldots$$
$$b_t,\ b_p,\ b_k,\ \ldots$$
$$c_t,\ c_p,\ c_k,\ \ldots$$

каэфіцыенты фабрыкацыі, гэта значыць колькасць прадукцыйных паслугаў T, P, K, якія ўваходзяць у вытворчасць адзінкі прадуктаў A, B, C...

Можна напісаць наступныя раўнанні:

$$a_t p_t + a_p p_p + a_k p_k + \ldots = p_a,$$
$$b_t p_t + b_p p_p + b_k p_k + \ldots = p_b$$

і г. д.

Відавочна, што дадзеная мадэль вымагае цалкам "інтэграванай" вытворчасці, гэта значыць усе прадукты павінны быць спажывецкімі таварамі, выпушчанымі на тых прадпрыемствах, якія самі вырабляюць сваю сыравіну і сваё абсталяванне. Пры такой умове можна сказаць, што кошт кожнага тавару роўны грашовай вартасці "прадукцыйных паслугаў", якія ўваходзяць у яго вытворчасць.

Вальрас паказаў, што мадэль слушная, хоць у рэчаіснасці кожнае прадпрыемства набывае сыравіну і абсталяванне. Дастаткова, пісаў ён, замяніць цэны на сыравіну і абсталяванне на грашовыя вартасці "прадукцыйных паслугаў", выкарыстаных прадпрыемствамі, якія вырабляюць гэтыя тавары[1].

[1] *Eléments d'économie politique pure, nouv. éd., Paris, 1926, p. 213.*

У першым выданні свайго твора Вальрас дапускаў, што каэфіцыенты фабрыкацыі — нязменныя велічыні, незалежныя ад коштаў прадукцыйных паслугаў. У далейшым ён дапоўніў сваю мадэль ідэяй пра зменлівасць каэфіцыентаў фабрыкацыі. Вальрас гаварыў, што каэфіцыенты фабрыкацыі пэўным чынам залежаць ад цэнаў на фактары вытворчасці, бо кожнае прадпрыемства выкарыстоўвае такую колькасць кожнай паслугі, каб яе маржынальная прадукцыйнасць і кошт былі роўнымі. Такім чынам, закон, выказаны Цюненам і Джэвансам, паўстае і ў Вальраса: маржынальныя прадукцыйнасці фактараў вытворчасці павінны паўсюдна быць роўнымі іхным цэнам. Менавіта гэтым вызначаюцца колькасці ўсіх разнастайных паслугаў, выкарыстаных на разнастайных прадпрыемствах, а значыць, і каэфіцыенты фабрыкацыі.

В) Мадэль агульнай раўнавагі

На такой глебе Вальрас будуе сваё матэматычнае тлумачэнне ўтварэння рынкавых цэнаў на тавары і "прадукцыйныя паслугі", да якога, на яго погляд, зводзіцца ўся тэарэтычная палітэканомія. На падставе даследванняў паслядоўнікаў Вальраса мы можам даць даволі кароткую сукупную прэзентацыю ягонай мадэлі агульнае раўнавагі[1].

Па сутнасці, гаварыў Вальрас, існуе колькасць *m* выраблены і прададзеных тавараў і колькасць *n* "прадукцыйных паслугаў", выкарыстаных у вытворчасці ўсіх тавараў (кожны "тып" зямлі, працы і капіталу разглядаецца як адрозная паслуга). У першую чаргу трэба растлумачыць, як усталёўваюцца:

— усе *m* колькасці прададзеных тавараў;

— усе *m* цэны гэтых тавараў.

Аднак паколькі адзін з тавараў выконвае функцыю грошай, дык ягоная цана роўная 1. Значыць, невядомыя толькі цэны *m*-1 [2].

---

[1] *Мы абапіраемся на выснову, зробленую ў працы: F. Zeuthen, Economic theory and Method, пераклад з дацкай, London, 1955, chap. 11.*

[2] *Паводле Вальраса, прыхільніка колькаснай тэорыі грошай, вартасць грошай залежыць ад колькасці тавару, эфектыўна выкарыстанага ў якасці грошай. Ад чаго ж у сваю чаргу залежыць гэтая колькасць? Вальрас сцвярджаў, што яна "ўсталёўваецца*

Таксама трэба растлумачыць, якім чынам вызначаюцца ўсе *n* колькасці прададзеных прадукцыйных паслугаў і ўсе *n* кошты прадукцыйных паслугаў.

Нарэшце, варта растлумачыць ужытыя метады вытворчасці, гэта значыць колькасці ўсіх разнастайных паслугаў, выкарыстаных для вытворчасці ўсіх разнастайных тавараў. Гэтыя колькасці — каэфіцыенты фабрыкацыі, іхны агульны лік роўны *mn*.

Такім чынам, мы павінны развязаць задачу, якая змяшчае пэўную колькасць невядомых велічыняў, роўную $2m + 2n + mn - 1$.

Дзеля ейнага развязання варта зыходзіць з умоваў, якія патрабуюць, каб на ўсіх рынках была дасягнутая раўнавага, умоваў, выражаных раўнаннямі, у якіх паказаны невядомыя велічыні задачы.

Калі пазначыць праз x_1, x_2, x_3, ... , x_m колькасці *m* тавараў і праз 1, p_2, p_3, ... , p_m — іхныя цэны; праз y_1, y_2, y_3, ... , y_n — колькасці *n* прадукцыйных паслугаў, а праз Π_1, Π_2, Π_3, ... , Π_n — іхныя кошты; калі, нарэшце, каэфіцыенты вытворчасці пазначаюцца:

$$a_{1,1}, a_{1,2}, a_{1,3}, \ldots a_{1,n},$$
$$a_{2,1}, a_{2,2}, a_{2,3}, \ldots a_{2,n},$$

дык мы можам перадаць сістэму Вальраса сукупнасцю раўнанняў, якія падзяляюцца на пяць групаў.

Першая група *m*-1 *раўнанняў попыту на тавары, з выняткам грошай*:

$$x_2 = f_2(p_2, p_3, \ldots, p_m, \Pi_1, \Pi_2, \Pi_3, \ldots, \Pi_n)$$
$$\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots$$
$$x_m = f_m(p_m, p_2, \ldots, p_{m-1}, \Pi_1, \Pi_2, \Pi_3, \ldots, \Pi_n).$$

Гэтыя раўнанні адлюстроўваюць той факт, што ў раўнаважным становішчы выраблена і прапанаваная на рынку колькасць кожнага тавару роўная колькасці, на якую існуе попыт. Гэты попыт пэўным чынам залежыць ад цэнаў на

выпадкова". Пры зменах гэтае колькасці змяняюцца кошты на ўсе тавары і паслугі, з выняткам коштаў на тавар-грошы. Сучасным паслядоўнікам Вальраса такая канцэпцыя падалася непрыдатнай. Грошы ў іх становяцца простай разліковай адзінкаю, колькасць якой фіксуе дзяржава. Ва ўсялякім разе бачна, што Вальрасава тэорыя шмат у чым згаджаецца з колькаснай тэорыяй грошай.

тавары, а таксама ад коштаў паслугаў (бо апошнія вызначаюць даходы індывідаў).

Другая група *m раўнанняў выдаткаў*:

$$1 = a_{1,1} \cdot П_1 + a_{1,2} \cdot П_2 \ldots + a_{1,n} \cdot П_n,$$
$$p_2 = a_{2,1} \cdot П_1 + a_{2,2} \cdot П_2 \ldots + a_{2,n} \cdot П_n$$
$$\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots$$
$$p_m = a_{m,1} \cdot П_1 + a_{m,2} \cdot П_2 \ldots + a_{m,n} \cdot П_n.$$

Раўнанні азначаюць, што кошт продажу кожнага тавару роўны выдаткам яго вытворчасці, гэта значыць суме грашовых вартасцяў фактараў, якія ўваходзяць у выраб адзінкі гэтага тавару.

Трэцяя група *n раўнанняў колькасцяў прадукцыйных паслугаў*:

$$y_1 = a_{1,1} \cdot x_1 + a_{2,1} \cdot x_2 \ldots + a_{m,1} \cdot x_m,$$
$$y_2 = a_{1,2} \cdot x_1 + a_{2,2} \cdot x_2 \ldots + a_{m,2} \cdot x_m$$
$$\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots$$
$$y_n = a_{1,n} \cdot x_1 + a_{2,n} \cdot x_2 \ldots + a_{m,n} \cdot x_m.$$

Гэтыя раўнанні паказваюць, што колькасць кожнай прададзенай на рынку паслугі павінна быць роўнай колькасці паслугі, выкарыстанай у вытворчасці ўсіх разнастайных тавараў.

Чацвертая група *mn раўнанняў тэхнічнай субстытуцыі*:

$$a_{1,1} = f(П_1, П_2, \ldots, П_n),$$
$$a_{1,2} = f(П_1, П_2, \ldots, П_n)$$
$$\ldots\ldots\ldots\ldots$$
$$a_{mn} = f(П_1, П_2, \ldots, П_n).$$

Гэтыя раўнанні паказваюць, што каэфіцыенты фабрыкацыі пэўным чынам залежаць ад коштаў прадукцыйных паслугаў.

Пятая група *n раўнанняў прапановы прадукцыйных паслугаў*:

$$y_1 = f(П_1, П_2, \ldots, П_n, p_2, \ldots, p_m),$$
$$y_2 = f(П_1, П_2, \ldots, П_n, p_2, \ldots, p_m)$$
$$\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots$$
$$y_n = f(П_1, П_2, \ldots, П_n, p_2, \ldots, p_m).$$

Гэтыя раўнанні паказваюць, што прададзеныя колькасці

прадукцыйных паслугаў пэўным чынам залежаць ад цэнаў паслугаў і ад цэнаў на тавары (бо кожны ўладальнік паслугаў павінны выроўніваць маржынальныя карыснасці паслугаў, якія ён захоўвае, з коштамі гэтых паслугаў, а дадзеныя маржынальныя карыснасці залежаць ад таго, што ён можа спажыць, гэта значыць ад цэнаў на тавары).

У выніку мы маем пэўную колькасць раўнанняў, роўную $2m + 2n + mn - 1$, што дакладна адлюстроўвае колькасць невядомых. Значыцца, тэарэтычна задача можа быць развязаная як механічная. Трэба лічыць, гаварыў Вальрас, што калі была б вядомая прырода функцыяў, змешчаных у закладзеных раўнаннях, дык з гэтага можна было б вывесці вартасці, якія павінны атрымаць невядомыя велічыні. На яго думку, гэта азначае, што колькасці і цэны тавараў і паслугаў, як і метады вытворчасці, тлумачацца пэўнай колькасцю функцыйных залежнасцяў, што існуюць паміж попытам на тавары і цэнамі на тавары і паслугі, паміж прапановай паслугаў і цэнамі на тавары і паслугі, паміж каэфіцыентамі фабрыкацыі і цэнамі паслугаў.

Г) Тэарэма максімуму задавальненняў

Пры пабудове толькі што разгледжанай намі мадэлі Вальрас ішоў да мэты, якую ён вызначыў яшчэ ў 1860 г.: даказаць, што сістэма свабоднай канкурэнцыі паміж індывідамі і прыватныя прадпрыемствы даюць найлепшы магчымы вынік для грамадства, гэта значыць зняпраўдзіць крытыку сацыялістаў, накіраваную ў бок капіталістычнай сістэмы. Вальрас спадзяваўся дасягнуць гэтай мэты на падставе ідэі, якую мы ўжо сустракалі ў Джэванса і адпаведна з якой раўнаважнае становішча, дзе кожны ўдзельнік абмену атрымлівае максімум задавальненняў, найлепшае з усіх магчымых.

Аднак доказы Вальраса шырэйшыя, чым доказы Джэванса. З аднаго боку, Вальрас вылучыў ідэю, што індывід адначасова і прадавец паслугаў, і спажывец тавараў. А з другога боку, ён імкнуўся даказаць, што раўнаважнае становішча забяспечвае найлепшае выкарыстанне прадукцыйных паслугаў.

Згодна дапушчэнню Вальраса, індывіды атрымліваюць максімум задавальненняў не толькі таму, што выроўніваюць ураўнаважаныя маржынальныя карыснасці тавараў, якія яны спажываюць, але і таму, што выроўніваюць ураўнаважаныя маржынальныя антыкарыснасці паслугаў, якія яны прадаюць. Значыць, Вальрасаў аналіз паводзінаў індывіда больш абгрунтаваны, чым у Джэванса. І ўжо з гэтае прычыны Вальрас лічыў, што ягоны доказ перавагаў становішчаў, створаных свабоднай канкурэнцыяй, больш поўны, чым у брытанскага эканаміста.

Але Вальрас вылучыў яшчэ адну ідэю, калі сцвярджаў, што становішча, спароджанае свабоднай канкурэнцыяй, забяспечвае "максімум эфектыўнай карыснасці ад паслугаў новых капіталаў"[1].

Абсталяванне, гаварыў Вальрас, набываецца за кошт ашчаджання. А ашчаджанне заўсёды размяркоўваецца паміж разнастайнымі выкарыстаннямі такім чынам, каб быў атрыманы максімум карыснасці.

Аўтар робіць вельмі складаны доказ гэтае тэарэмы. Аднак урэшце падыходзіць да простай ідэі, сутнасць якой у тым, што варта дастасоўваць з зададзеным тыпам інвестыцыяў такія колькасці ашчаджання, каб маржынальная прадукцыйнасць гэтага ашчаджання была роўная рынкавай норме працэнта.

Аналіз Вальраса паказаў, што ў такой сітуацыі ўсялякія змены стасункаў ашчаджання вядуць да паніжэння створаных грашовых вартасцяў (а значыць, і створанай карыснасці), бо маржынальныя прадукцыйнасці спадальныя ва ўсіх галінах вытворчасці. Дапусцім, што 100 франкаў ашчаджання, выкарыстаных у галінах А і В, прыносяць 10 дадатковых франкаў. Калі перамясціць 100 франкаў з А ў В, дык у А губляюцца 10 франкаў, а ў В атрымліваецца сума, меншая за 10 франкаў, бо маржынальныя прадукцыйнасці спадальныя. Значыцца, перамяшчэнне нявыгаднае. Такая выснова, безумоўна, занадта паспешлівая. Тым не менш перад намі першы накід тэорыі, якая сёння займае значнае месца ў

[1] *Eléments d'économie politique pure, op. cit., p. 285.*

эканамічным аналізе і з якой мы сустрэнемся крыху далей — пры разглядзе тэорыі оптымуму Вільфрэда Парэта.

Д) Хібы тэорыі Вальраса

Даследванне Вальраса займае значнае месца ў найноўшай гісторыі эканамічнай думкі. Аднак яно мае істотны недахоп, бо прэтэндуе на тлумачэнне эканамічных з'яваў зыходзячы з прэферэнцыяў індывідаў, якія разглядаюцца ім як дадзеныя раўнавагі. На практыцы гэта вымагае, каб прэферэнцыі індывідаў разглядаліся як незалежныя ад абменаў, што, безумоўна, немагчыма.

Між іншага, можна таксама паказаць і прыватныя недахопы, якія паўстаюць пры разглядзе таго ці іншага аспекту вучэння Вальраса.

1. ВАЛЬРАСАВА ТЭОРЫЯ НЕ ДАЕ ТЛУМАЧЭННЯ МЕНАВЫХ СТАСУНКАЎ. Вальрас (як і Джэванс) лічыў, што ён канчаткова развязаў праблему паходжання вартасці, звярнуўшыся да паняцця маржынальнай карыснасці. Але сёння няцяжка паказаць, што ягоныя погляды на гэтае пытанне былі надзвычай наіўныя.

Аўтар *"Элементаў чыстай палітычнай эканоміі"* сцвярджаў, што спажыўцы выроўніваюць маржынальную карыснасць тавараў, якую ён назваў "рэдкаснасцю" тавараў, з коштамі на тавары. І, на жаль, пасля гэтага ён лічыў, што ў такіх умовах "рэдкаснасць" тлумачыць менавую вартасць.

"Калі слушна, — пісаў Вальрас, — што рэдкаснасць і вартасць — гэта дзве супадальныя і прапарцыйныя з'явы, дык таксама слушна, што рэдкаснасць — прычына менавай вартасці"[1].

Падзівімся логіцы аўтара! Калі прытрымлівацца яе, дык, напрыклад, можна было б сказаць: "Кожнае лета ў Францыі менш ападкаў, чым узімку, а дні ўлетку больш доўгія, чым зімой. Значыць, даўжыня дня — гэта прычына слабых ападкаў".

У прыкладзе з менавай вартасцю, як і ў прыкладзе з ападкамі, відавочна, што канстатацыя супадзення не дае тлумачэння, бо дзве супадальныя з'явы могуць залежаць ад нейкай трэцяй, якая тлумачыць і першую, і другую.

[1] *Eléments d'économie politique pure, op. cit., p. 102.*

Сказаць, што цэны, як і маржынальныя карыснасці, знаходзяцца ў аднолькавых стасунках, — гэта канстатаваць *вынік* працэсу абмену, які сам па сабе значны, але ён нічога не дадае нам для разумення стасункаў цэнаў на тавары. Напрыклад, мы *канстатуем*, што для спажыўца маржынальная карыснасць віна ў чатыры разы большая за маржынальную карыснасць хлеба, і *адначасова* заўважаем, што кошт віна ў чатыры разы большы. Але мы не заўсёды *разумеем*, якое значэнне гэтых стасункаў.

2. ВАЛЬРАС НЕ ДАЕ ТЛУМАЧЭННЯ РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДАЎ. Тэорыя агульнай раўнавагі сцвярджае, што ўсе тыпы аплаты прадукцыйных паслугаў — заробкі, працэнты за капітал, зямельная рэнта — вызначаюцца таксама, як і кошты на тавары (і адначасова з імі) на рынках, дзе канкурэнцыя заўсёды выроўнівае попыт і прапанову кожнага тыпу паслугаў. Звыш гэтага, у Вальрасавай тэорыі зазначаецца, што попыт на нейкую паслугу пэўнага кошту заўжды павінны быць такім, каб маржынальная карыснасць гэтае паслугі была роўная ейнаму кошту. Значыцца, перад намі спалучэнне даследванняў Жана Батыста Сэя і Джэванса (дарэчы, Вальрас нічога не ведаў пра апошняга пад час напісання свайго асноўнага твора).

Інтэрпрэтацыя праблемы размеркавання мела значны ўплыў на развіццё эканамічнай думкі. З шырокім распаўсюджваннем маржыналісцкіх ідэяў ранейшыя ліберальныя тэзісы ў дачыненні да размеркавання (заробак як пражытны мінімум, фонды заробкаў) былі замененыя тэзісам, паводле якога даходы залежаць ад прадукцыйнасці "фактараў вытворчасці". Аднак сёння досыць выразна бачна, што маржыналізм не дае нам слушнай тэорыі па гэтай праблеме.

Асноўная крытыка, якую трэба накіраваць у бок спробы Вальраса (крытыка, якая адпрэчвае ўсялякую іншую), палягае ў тым, што ў ягонай сістэме інтэрпрэтацыі робіцца выснова пра неабходнасць поўнага выкарыстання ўсіх прадукцыйных паслугаў, прапанаваных па раўнаважных коштах. Калі Вальрас мае рацыю, дык пры канкурэнтнай сістэме цалкам выключаецца магчымасць існавання індывідаў, якія хацелі б працаваць за цяперашнія заробкі і якія не могуць

гэта зрабіць, бо адна з умоваў агульнае раўнавагі — роўнасць попыту і прапановы працоўных паслугаў. Значыць, трэба прызнаць, што ў шматлікіх выпадках пры наяўных тэхналогіях вытворчасці, абраных прадпрыемствамі, немагчыма забяспечыць поўную занятасць працоўных сілаў разам і адначасова выкарыстанне ўсіх капіталаў і ўсіх ворных земляў. Існаванне такой магчымасці прызнана сёння эканамістамі, якія, аднак, застаюцца абаронцамі Вальрасавай сістэмы.

У сваёй ужо класічнай працы *"Лінейнае праграмаванне і эканамічнае кіраванне"*[1] Р. Дорфман, П. А. Сэмуэльсан і Р. М. Салоў справядліва зазначалі, што калі два тавары вырабляюцца з дапамогаю тэхналогіі, якая патрабуе выкарыстання двух рэсурсаў у стасунку 2/1, і калі даступныя рэсурсы маюць стасунак 10/1, дык будзе відавочна немагчыма дасягнуць раўнавагі, якая забяспечвала б поўнае выкарыстанне абодвух рэсурсаў. Калі нават і дапусціць, што прапорцыя паміж патрэбнымі колькасцямі рэсурсаў можа быць зменена ў залежнасці ад цэнаў на гэтыя рэсурсы, дык няма гарантыі, што можна знайсці *пазітыўныя* цэны на рэсурсы, якія забяспечвалі б поўнае выкарыстанне апошніх. І цалкам магчыма, што нельга максімальна рэалізаваць нейкі фактар, калі ягоны кошт блізкі да нуля.

Такі прыклад можа падацца занадта простым, але дастаткова ўявіць нейкую перанаселеную краіну з вельмі малым капіталам, каб зразумець, што калі ў ёй, дапусцім, створаны прадпрыемствы, якія выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі вытворчасці, дык немагчыма будзе дасягнуць поўнай занятасці працоўных сілаў.

У такіх умовах насуперак меркаванням названых аўтараў мы лічым неабходным адмовіцца ад ідэі вызначэння заробку на падставе роўнасці паміж попытам і прапановаю. Але нельга пагадзіцца і з атаясамленнем даходу ад капіталу з працэнтам, які таксама вызначаецца праз выроўніванне попыту і прапановы. Вальрас і ягоныя паслядоўнікі ўяўлялі, што капітал, які выкарыстоўваецца прадпрыемствамі, цал-

[1] *Traduction française, Paris, 1962, p. 382.*

кам узяты ў пазыку. Але гэтая гіпотэза вельмі далёкая ад рэчаіснасці, якая сведчыць, што ў першую чаргу прадпрыемствы ўжываюць свой уласны капітал. У Вальрасавай сістэме дапускаецца, што прадпрымальнікі імкнуцца зрабіць максімальным "чысты прыбытак", які застаецца пасля таго, як яны заплацілі за выдаткі вытворчасці, куды ўваходзяць працэнты за ўжытыя капіталы. У сапраўднасці ж трэба дапусціць, як рабілі ангельскія эканамісты-класікі, што прадпрыемствы выкарыстоўваюць выключна свой уласны капітал, а значыцца, не плоцяць працэнтаў. У такім выпадку варта заўважыць, што яны імкнуцца зрабіць максімальнай іхную норму прыбытку, або стасункі іхных даходаў да капіталу. Адсюль відавочна, што капітал — не проста "фактар вытворчасці", а цэнтральны суб'ект эканамічнай арганізацыі, бо менавіта яго ўласнікі проста ці ўскосна кіруюць працэсам вытворчасці. Паставіць капітал на адзін ровень з працаю і зямлёю ў якасці "фактару вытворчасці" азначае захінуць сапраўдную прыроду капіталістычнае сістэмы. А звядзенне даходу ад капіталу да працэнта не дазваляе акрэслена паставіць праблему размеркавання нацыянальнага даходу ў гэтай сістэме.

3. ГРЭБАВАННЕ ПРАБЛЕМАЙ ПЕРАВЫТВОРЧАСЦІ. Нарэшце, трэба коратка нагадаць, што Вальрас, як і Жан Батыст Сэй, адмаўляў магчымасць агульнага крызісу перавытворчасці. У ягонай сістэме ашчаджанне заўсёды цалкам інвестуецца, бо існуе механізм выроўнівання попыту і прапановы фондаў на рынку капіталу. Значыцца, на погляд Вальраса, нельга гаварыць пра перашкоды эканамічнаму росту, спароджаныя залішняй колькасцю ашчаджанняў або празмернай схільнасцю да ашчаджання.

Аўтар *"Элементаў чыстай палітычнай эканоміі"* пагаджаўся паставіць толькі адно пытанне наконт росту вытворчасці: ці не можа ўзнікнуць перашкода з прычыны недахопу ворных земляў? І даводзіў, што гэтую перашкоду заўсёды можна будзе пераадолець праз замену паслугаў зямлі паслугамі капіталу, гэта значыць праз удасканальванне тэхналогіяў вытворчасці ў сельскай гаспадарцы[1].

[1] *Eléments, op. cit., p. 314.*

Бібліяграфія

G. Pirou, *L'utilité marginale de K. Menger à J. B. Clark*, Paris, 1945.

— *Les théories de l'équilibre économique, Walras et Pareto*, Paris, 1936.

E. v. Böhm-Bawerk. *Histoire critique des théories de l'intérêt du capital, trad. franç.*, Paris, 1903.

G. J. Stigler, *Production and Distribution theories*, New York, 1941.

P. K. Rosser, *Economic Fictions. A critique of subjectivist economic theory*, New York, 1957.

J. Fradin, *Les fondements logiques de la théorie néo-classique*, Paris, 1976.

A. Matyas, *History of modern non-marxian economics*, Budapest, 1980.

W. Jaffe, *Histoire des doctrines walrasiennes*, Alger, 1955—1956.

J. R. Hicks and W. Weber, *Carl Menger and the Austrian School of Economics*, Oxford, 1973.

R. M. Fisher, *The logic of economic discovery*, Brighton, 1986.

R. Guerrien, *La théorie néo-classique*, Paris, 1985.

ЧАСТКА СЁМАЯ



ЭВАЛЮЦЫЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ Ў 1875–1939 гг.

Раздзел I

САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ

На працягу першых трох чвэрцяў XIX ст. эўрапейскі капіталізм, нягледзячы на перыядычныя крызісы перавытворчасці, характарызаваўся магутным дынамізмам. За кароткі час былі пераўтвораныя значныя рэгіёны Заходняй Эўропы. Адначасова ў Злучаных Штатах Амэрыкі адбывалася імклівае асвойванне земляў. Пасля франка-прускай вайны крызіс перавытворчасці выбухнуў у 1873 г. З яго пачаўся гістарычны перыяд, які мае пэўныя новыя характарыстыкі.

§ 1. "Вялікая дэпрэсія" ў Вялікабрытаніі ў 1873—1896 гг. і ўздым ангельскага імперыялізму

Тры апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. у Эўропе характарызуюцца ўстойлівай тэндэнцыяй да стагнацыі ў прамысловасці Вялікабрытаніі. Гэта добра відаць пры разглядзе наступных лічбаў сярэдняй вытворчасці асноўных відаў прадукцыі[1] на душу насельніцтва:

Гады	Вугаль (у тонах)	Неапрацаваная сталь (у тонах)	Спажыванне бавоўны (у тонах)
1855—1864	2,62	2,70	28,1
1865—1874	3,59	3,60	33,5
1875—1884	4,21	4,20	38,6
1885—1894	4,62	4	40,6

Адным з асноўных наступстваў такога запаволення індустрыяльнага росту стала павелічэнне беспрацоўных, колькасць якіх, нягледзячы на эміграцыю, у 1895 г., напрыклад, дасягнула 7 працэнтаў ад агульнай працоўнай сілы ў прамысловасці.

Тэндэнцыя да стагнацыі тлумачыцца пераважна тым, што ў гэты перыяд Вялікабрытанія не здолела пашырыць за мяжою свае рынкі збыту.

Перш за ўсё гэта было вынікам не такога імклівага, як у папярэднія гады, развіцця сусветнага гандлю прамысловымі вырабамі. Сярэдні паказнік памераў такога гандлю быў роўны 40 за перыяд 1881—1885 гг. (за аснову 100 узяты 1913 г.), не перасягаў 48 за перыяд 1896—1900 гг.[2] Практычна гаворка ідзе аб стагнацыі, бо выразна відавочны кантраст з тэндэнцыяй папярэдніх перыядаў.

Стагнацыя ў гандлі ў сваю чаргу тлумачыцца развіццём нацыянальнай прамысловасці ў многіх краінах, і перадусім у Нямеччыне і ЗША, чыя

---

[1] *Лічбы прыведзеныя ў працы Fritz Sternberg, Kapitalismus und Sozialismus vor dem Weltgericht, Hambourg, 1951; trad. franç., sous le titre Le conflit du siècle, Paris, 1958, p. 149.*

[2] *Лічбы ўзятыя з кнігі Industrialisation et commerce extérieur, S. D. N., Genève, 1945.*

прадукцыя прыходзіць наўзамен прадукцыі, імпартаванай з Вялікабрытаніі.

Але ангельскі гандаль і прамысловасць яшчэ больш цярпелі з таго, што новыя прамысловыя цэнтры таксама вывозілі сваю прадукцыю і канкурыравалі з Вялікабрытаніяй на сусветным рынку.

У 1906 г. у творы, прысвечаным бацьку, Ўінстан Чэрчыль апісваў гэтую эпоху наступным чынам:

"Гэта быў канец цэлай эпохі... Скончылася працяглае дамінаванне сярэдніх класаў, якое пачалося ў 1832 г., а разам з ім і панаванне лібералізму. Былі атрыманыя вялікія перамогі: вынішчаны ўсе тыпы тыраніі, разбурана ўлада сілы, вызвалены рабы. Свядомасць стала свабодная. Свабодны стаў і гандаль. Але голад, галеча і холад таксама сталі свабодныя, а народ патрабаваў яшчэ штосьці звыш свабоды"[1].

"Вялікая дэпрэсія", аднак, не прывяла да падзення брытанскага капіталізму, бо ў 1874 г. да ўлады прыйшла кансерватыўная партыя на чале з Бэнджаменам Дызраэлі, і Вялікабрытанія распачала больш актыўную палітыку каланіяльнай экспансіі. Раней Ангельшчына, ужо валодаючы велізарнай часткай Індыі, галоўным чынам імкнулася захапіць марскія базы, праз якія можна было забяспечыць ахову ейных гандлёвых караблёў. Цяпер прыкладала намаганні да заваёвы ўсёй тэрыторыі.

Апрача таго, новы перыяд адрозніваўся ад папярэдняга яшчэ і тым, што ангельскі ўрад адкрыта абвясціў пра свае намеры. У 1876 г. каралева Вікторыя прыняла тытул імператрыцы Індыі. Кожная новая заваёва падавалася як неабходны крок дзеля захавання і пашырэння Брытанскай імперыі. Замест перыяду, калі афіцыйна сцвярджалася, што свабода гандлю — галоўны сродак ангельскай гандлёвай экспансіі, надышоў перыяд *прызнанага імперыялізму.*

У 1876 г. ангельскі ўрад вымусіў Кітай згадзіцца на пабудову на ягонай тэрыторыі першай чыгункі і адчыніць шэсць новых партоў для ангельскага гандлю.

У 1887 г. Ангельшчына ўсталявала свой пратэктарат над Бірмай, захапіла частку Барнэа (1886), Новай Гвінеі (1888) і ўсю Малайзію (1874—1896).

Афрыка тым часам набыла першачарговае значэнне ў брытанскай палітыцы каланіяльнай экспансіі. Усталяваўся фактычны пратэктарат над Егіптам (1882), Суданам (1883) і Занзібарам (1890). Захоплена ўзбярэжжа Самалі (1884), Уганда (1890), а таксама шэраг тэрыторыяў на поўдні Афрыкі, у рэгіёне Нігера і на ўзбярэжжах.

Выціснутыя ангельцамі за межы Паўднёвай Афрыкі буры — насельнікі галяндскага паходжання — утварылі дзве незалежныя дзяржавы: Трансваальскую і Аранжавую рэспублікі. У 1884 г. у Трансваалі былі знойдзены паклады золата. А ў 1899 г. Ангельшчына аб'явіла вайну

[1] *Lord Randolph Churchill, London, 1906, vol. I, p. 269, cité par Hutcheson in The decline and fall of british capitalism, London, 1951, p. 15; cité aussi partiellement par F. Clairmonte in Le libéralisme et les pays sous-développés, Genève, 1958, p. 200.*

бурам і праз два гады абедзве дзяржавы ўвайшлі ў склад Брытанскай імперыі ў якасці "дамініёнаў".

Пашырыўся ангельскі ўплыў і ў Паўднёвай Амэрыцы. У Мэксіцы ў 1876 г. Дыас усталяваў сваю дыктатуру і атрымаў ад Лондана пазыку на суму 3 мільёны фунтаў стэрлінгаў. У краіне расло здабыванне мінералаў. Чыгуначная сетка, пабудаваная ангельскімі фірмамі, павялічылася ад 800 км у 1876 г. да 24000 км у 1910 г. Бразылія, якая стала рэспублікай, у 1897 г. пазычыла ў Лонданскім банку Ротшыльда 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў, заклала пры гэтым дзеля гарантыі сваю мытную службу. Аргенціна, якая таксама атрымлівала ангельскія капіталы, мусіла ў 1886 г. прызнаць акупацыю Фалклендскіх астравоў і брытанскі кантроль над Магеланавым пралівам.

Наступствы імперыялістычнай палітыкі пачалі вельмі выразна адчувацца ў першыя гады XX ст. Зноў набыў імклівае развіццё брытанскі экспарт. Яго памер (за аснову 100 узяты 1880 г.) дасягнуў 138 у 1900 г. і ўзняўся да 236,5 у 1913 г. Штогадовы ровень павелічэння вытворчасці жалеза, які ў сярэднім спаў на 0,2 у перыяд 1880—1890 гг., дасягнуў 1,3 у перыяды 1890—1900 гг. і 1900—1910 гг. Па-ранейшаму буйным быў вываз капіталу. З 54 працэнтаў нутранога ашчаджання ў перыяд 1870—1879 гг. вываз капіталу ўзняўся да 96 працэнтаў нутранога ашчаджання ў перыяд 1904—1913 гг. Зразумела, трэба адзначыць, што даходы ў перыяд 1904—1913 гг., атрыманыя ад папярэдне ўкладзеных капіталаў, уяўлялі суму, у два разы большую за суму зноў вывезеных капіталаў. Такім чынам, усё адбывалася так, быццам Вялікабрытанія рээкспартавала палову даходаў, якія яна атрымлівала з замежжа[1].

§ 2. Экспансія іншых капіталістычных дзяржаваў

А) Французская каланіяльная экспансія

У XIX ст. Францыя не мела, як Вялікабрытанія, лішку насельніцтва. Дэмаграфічны рост у Францыі быў намнога меншы, а зыход з вёсак — менш акрэслены, бо вялікая частка краіны заставалася па-за сферай капіталістычнай эканомікі.

Тым не менш сярод прадпрымальнікаў і палітычнага істэблішменту III Рэспублікі былі групы, якія жадалі ісці па шляху Вялікабрытаніі.

Жуль Фэры — прыхільнік прадпрымальніцтва і абаронца міжнародных кампаніяў — быў найвялікшым натхняльнікам французскага імперыялізму. Узначаліўшы ўрад, ён публічна заявіў, што развіццё прамысловасці патрабуе новых рынкаў збыту за мяжою[2].

---

[1] *Гл. на гэты конт Capital Formation and Economic Growth, National Bureau of Economic Research (E.-U.), 1955, p. 70.*

[2] *Часам, аднак, адмаўляецца, што французская палітыка каланіяльнай экспансіі пры канцы XIX ст. кіравалася эканамічнымі і фінансавымі разлікамі. У прыватнасці, такая выснова ёсць у творы Henri Brunschwig, Mythes et réalités de l'impérialisme colonial français (1871—1914), Paris, 1960. А вось што пісала ў сваім нядаўнім творы Jules Ferry (Paris, 1964) спадарыня Фрэнэт Пізані-Фэры, стрыечная пляменніца славутага*

Намаганнямі Фэры туніскі бэй у 1881 г. быў пазбаўлены ўсялякай незалежнасці. Францыя ўсталявала ў Тунісе свой пратэктарат, які быў сапраўдным захопам краіны. Гэта выклікала паўстанне тунісцаў і крывавую вайну. Жуль Фэры мусіў пайсці ў адстаўку.

У 1883 г. Фэры вярнуўся да ўлады і распачаў вайсковую кампанію супраць насельніцтва, якое жыло паабапал Нігера, ажыццявіў захоп Абока на ўзбярэжжы Чырвонага мора і Гамб'ерскіх астравоў у Ціхім акіяне, усталяваў пратэктарат Францыі над Мадагаскарам (1885) і нарэшце распачаў заваёву Танкіна, які абаранялі анамскія і кітайскія сілы.

У сакавіку 1885 г. частка французскага экспедыцыйнага корпусу была разбітая ля Ланг-Сону ў Паўночным Танкіне. Жуль Фэры зноў мусіў пайсці ў адстаўку. Але тады ж адбылася капітуляцыя Кітая, які прызнаў французскі пратэктарат над Анамскай імперыяй. Бальшынёю ў адзін голас французскі парламент вырашыў падтрымаць захоп Танкіна.

Адначасова пашыраўся захоп тэрыторыяў у Заходняй Афрыцы, і ў 1875 г. Браза ўсталяваў 26 умацаваных пунктаў на берагах ракі Конга. Жуль Фэры ажыццявіў акупацыю велізарнай тэрыторыі ў ніжнім цячэнні Конга.

Нарэшце у 1890 г. падпісанне канвенцыі з Ангельшчынай абмежавала зоны ўплыву абедзвюх дзяржаваў у цэнтры Афрыкі (раён возера Чад).

Б) Іншыя эўрапейскія дзяржавы

Вызначальныя факты: кароль Бэльгіі Леапольд стварыў "незалежную дзяржаву Конга"; Расея заняла велізарныя абшары ў Сібіры і Цэнтральнай Азіі; Італія "ахоўвала" рэгіён Самалі і спрабавала патрапіць у Абісінію. У Нямеччыне Бісмарк напачатку непрыхільна ставіўся да каланізацыі. Але ў 1882 г. пад ціскам прамыславікоў буйных гарадоў на захадзе краіны змяніў свой падыход. Нямеччына адыграла асабліва важную ролю ў падзеле і эксплуатацыі Афрыкі і атрымала значныя тэрыторыі (Тога, Камерун, Нямецкая ўсходняя Афрыка, Нямецкая паўднёва-заходняя Афрыка).

міністра: "Было шмат гаворкі пра эканамічныя і спекулятыўныя інтарэсы, якія быццам ляжалі ў аснове заваёвы Танкіна. Вялікая ўвага аддавалася ролі негацыянта Дзюпўі, які стаяў ля вытокаў першага захопу Ханоя і экспедыцыі Франсіса Гарнье. Фэры папракалі ў тым, што ён быў пад уплывам прамыславікоў з усходу (Францыі) і прадстаўнікоў фінансавых колаў. Яго нават абвінавачвалі, што ён праз свайго пляменніка Баўе-Шафура меў фінансавы інтарэс у гэтай справе... Бясспрэчна, эканамічныя фактары адыгралі пэўную ролю ў гісторыі танкінскай аперацыі. Танкін — заможная краіна... Тлумачэнні Дзюпўі даказалі магчымасць адкрыцця праз гэтую тэрыторыю гандлёвага рынку з багатымі правінцыямі на поўдні Кітая. Асобныя фірмы выказвалі цікавасць да лёгка эксплуатаваных заводаў Танкіна. Падавалася больш выгадным заваяваць "вугальны" Танкін, чым абмяжоўвацца толькі Танкінам "рысавым". І паўстае пытанне, ці трэба ў перыяд экспансіі праз нейкую няшчырую цнатлівасць не зважаць на эканамічныя дадзеныя і ці сапраўды заваёва заможнай тэрыторыі больш супярэчыць маралі, чым заваёва тэрыторыі беднай" (pp. 152–153).

В) Імперыялістычная палітыка ЗША

У Злучаных Штатах імперыялістычная партыя выйшла на арэну па сканчэнні збірання тэрыторыі, якая склала нацыянальную тэрыторыю ЗША.

На Кубе, што была гішпанскім уладаннем, ужо на працягу доўгага часу знаходзіліся шматлікія амэрыканскія плантатары. У 1898 г., пасля народнага паўстання, ЗША знайшлі зачэпку абвясціць вайну Гішпаніі і захапілі апошнія гішпанскія ўладанні: Кубу, Пуэрта-Рыка і Філіпінскія астравы ў Ціхім акіяне. Адначасова Злучаныя Штаты анексавалі Гавайскія астравы, якія, па сутнасці, ужо былі пад іх уплывам. Дзеля захавання вонкавай прыстойнасці амэрыканцы дазвалялі ўвод канстытуцыяў, якімі ў прынцыпе ствараліся незалежныя дзяржавы.

Апрача таго, ЗША павялічылі свой уплыў у Лацінскай Амэрыцы. Яны справакавалі паўстанне ў краі, дзе французская фірма распачала будаўніцтва Панамскага канала, стварылі Панамскую Рэспубліку і ў 1903 г. атрымалі сабе зону канала.

У 1904 г. ЗША захапілі Дамініканскую Рэспубліку, пасля ажыццявілі ўзброеную інтэрвенцыю ў Нікарагуа (1912), Гандурас (1911), Мексіку (1914).

Г) Японскі імперыялізм

Нарэшце трэба разгледзець японскі выпадак, што мае своеасаблівыя рысы.

З нябелых народаў японцы — адзіны народ, што ў XIX ст. здзейсніў палітычную рэвалюцыю і эканамічныя пераўтварэнні, дзякуючы якім Японія стала магутнай індустрыяльнай дзяржавай. Капіталізм у ёй развіваўся ў межах аднае нацыі, і гэта ў хуткім часе спарадзіла імперыялістычныя памкненні.

У 1858 г. ЗША запатрабавалі адкрыцця японскіх партоў. У 1864 г. ціск з боку Англельшчыны вымусіў Японію абмежаваць пяцю працэнтамі мытныя зборы з эўрапейскіх тавараў. Японія ішла па шляху каланіяльнай залежнасці, калі ў 1869 г. Мацу Хіта, які ў 1867 г. ва ўзросце 14 гадоў стаў імператарам, намерыўся пайсці па шляху Эўропы. Ён распачаў палітыку канфіскацыі сеньяральных даменаў і велізарнай маёмасці рэлігійных ордэнаў. У 1871 г. скасоўваюцца сеньяральныя правы. У 1872 г. сяляне атрымалі ва ўласнасць землі, якія самі апрацоўвалі. У 1889 г. была ўсталяваная канстытуцыйная манархія.

Адначасова адбыўся працэс стварэння нацыянальнай прамысловасці. Першая механічная прадзільная фабрыка запушчаная ў 1870 г. У 1893 г. у прамысловасці працавала 380000 рабочых. Законам ад 1890 г. забаранялася ўсялякая ўзгодненая дзейнасць найманых працаўнікоў. Падобнае імклівае развіццё прамысловасці адбылося галоўным чынам пры падтрымцы ангельскіх капіталаў.

Але японскі ўрад таксама пераняў і імперыялізм заходніх дзяржаваў. У 1894 г. 18000 японскіх жаўнераў высадзіліся ў Карэі і вымусілі караля гэтае краіны перайсці пад японскі пратэктарат. Кітай, васалам

якога да гэтага была Карэя, выступіў супраць японскага захопу, але атрымаў паразу і мусіў саступіць Японіі Тайвань, Пескадорскія астравы і паўвостраў Ляадунь. Разам з гэтым Японія атрымала ад Кітая права ўсталёўваць свае гандлёвыя дамы і мануфактуры ў многіх кітайскіх партах.

§ 3. Канфлікты паміж вядучымі дзяржавамі

Напружаная барацьба вядучых дзяржаваў за тэрыторыі, якімі яны яшчэ не валодалі, вельмі хутка спарадзіла паміж імі сур'ёзныя канфлікты.

Французы і ангельцы, якія амаль цалкам падзялілі афрыканскі кантынент, у 1898 г. сутыкнуліся ў Фашодзе, што ў вярхоўі Ніла. У выніку ледзь не выбухнула эўрапейская вайна.

Асноўная барацьба разгарнулася паміж Вялікабрытаніяй і Нямеччынай, бо пасля 1870 г. пад кіраўніцтвам прускага ўрада Нямеччына развівалася надзвычай імклівымі тэмпамі. У 1870 г. вытворчасць чыгуну ў Нямеччыне складала 1/5 ангельскай вытворчасці. У 1905 г. гэтыя паказнікі выроўніваюцца, а ў 1910 г. яны большыя ў Нямеччыне.

Гэткі імклівы рост адбываецца пад уплывам развіцця нутранога нямецкага рынку, а таксама дзякуючы экспарту. У перыяд 1880—1884 гг. штогадовы нямецкі экспарт жалеза і сталі складаў прыкладна 40 працэнтаў ангельскага. У перыяд 1909—1913 гг. ангельскі і нямецкі экспарт жалеза і сталі практычна выраўняліся.

У сваіх экспансіянісцкіх памкненнях Нямеччына, калі імкнулася забяспечыць сабе рынак Асманскай імперыі і атрымала права на пабудову Багдадскай чыгункі, сутыкалася галоўным чынам з Вялікабрытаніяй. Між іншага, Нямеччына мела сутычкі і з Францыяй, калі імператар Вільгельм II высадзіўся ў 1905 г. у Танжэры, тым часам як Марока ўжо знаходзілася пад французскім уплывам.

Нарэшце, Нямеччына пры пошуках шляхоў прасоўвання сваіх тавараў на Балканы з дапамогаю аўстрыйскага імператара ўваходзіць у супярэчнасці з расейскім царом. Усё гэта прыводзіць да складвання дзвюх кааліцыяў інтарэсаў: з аднаго боку, паміж Ангельшчынай, Францыяй і Расеяй (апошняя ў велізарнай колькасці атрымлівала французскія капіталы); з другога боку — паміж Нямеччынай і Аўстра-Вугоршчынай. Сутыкненне гэтых двух блокаў у 1914 г. прыводзіць да Першай сусветнай вайны.

§ 4. Ад Першай да Другой сусветных войнаў

Мы не будзем пераказваць усе падзеі, што адбыліся паміж 1914 і 1945 гг. Нагадаем толькі асноўныя факты.

У 1917 г. спароджаныя вайной бедствы і незадаволенасць у Расеі дасягнулі такога стану, што царскі рэжым мусіў саступіць месца рэспубліканскаму ўраду Керэнскага (Лютаўская рэвалюцыя), які ў хуткім часе таксама сышоў у нябыт, скінуты ў выніку кароткага ўзброенага паўстан-

ня на чале з Леніным, кіраўніком бальшавіцкай плыні Расейскай сацыял-дэмакратычнай партыі (Кастрычніцкая рэвалюцыя). Упершыню ў гісторыі да ўлады прыйшлі сацыялісты-марксісты, і ім удалося ўтрымаць яе, нягледзячы на дапамогу, якую накіроўвалі ўсе буйныя капіталістычныя дзяржавы контррэвалюцыйным сілам пад час грамадзянскай вайны, што доўжылася тры гады. Але ў 1922 г. эканамічнае становішча краіны было катастрафічнае. У межах "новай эканамічнай палітыкі" Ленін згадзіўся аднавіць прыватны гандаль, які да гэтага быў цалкам скасаваны, і часткова прыватную прамысловасць. Рашучы крок на шляху да сацыялізму зроблены пасля смерці Леніна. У 1928 г. Сталін намерыўся распачаць калектывізацыю сельскай гаспадаркі і перайсці да імклівай індустрыялізацыі ў межах пяцігадовых планаў.

У гэты час капіталістычныя краіны Заходняй Эўропы перажывалі няпэўныя і часта цяжкія гады. У асноўным ім не ўдавалася дасягнуць даваеннага рытму гандлёвай і прамысловай экспансіі: скончылася эпоха вялікіх каланіяльных заваёваў, бо не было новых земляў для захопу; ЗША, якія нечувана ўзбагаціліся дзякуючы вайне, зрабіліся галоўным канкурэнтам на сусветным рынку.

Ангельская эканоміка зноў была закранутая глыбокім крызісам. У экспартных галінах прамысловасці ўзнікла сталае беспрацоўе. Аднак самыя значныя палітычныя падзеі адразу ж пасля вайны адбыліся ў Італіі. Там у 1919 і 1920 гг. набываў сілу магутны рух пратэсту рабочых. Рабочыя захоплівалі металургічныя заводы і пачыналі абіраць свае "рады" накшталт расейскіх "саветаў". Але адначасова адбылося яднанне прадстаўнікоў сярэдніх класаў, закранутых інфляцыяй і варожых да пралетарскай рэвалюцыі, у fasci (літаральна: вязка пруткоў) — узброеныя антырабочыя аддзелы, якія ўзначальваў былы выкладчык-сацыяліст Беніта Мусаліні. У 1921 г. італьянскі ўрад на чале з Джыаліці вырашыў выкарыстаць фашыстаў у якасці супрацьвагі рабочаму руху. Ён паспрыяў абранню 31 дэпутата-фашыста і даў загад паліцыі нічога не рабіць дзеля абароны рабочых сходаў супраць нападаў узброеных бандаў фашыстаў. У 1922 г. праз пагрозу маршу на Рым Мусаліні ўдалося адправіць кабінет у адстаўку. Кароль даручыў яму сфармаваць новы ўрад, адным з першых актаў якога стаў роспуск рабочых прафсаюзаў. А ў 1925 г. Мусаліні ўсталяваў сваю дыктатуру.

У наступныя гады назіраўся пэўны эканамічны рост у Злучаных Штатах, а таксама (дзякуючы амэрыканскім капіталам) у Нямеччыне. Але гэты рост адбываўся галоўным чынам за кошт біржавых спекуляцый. У верасні 1929 г. на Нью-Ёркскай біржы тэндэнцыя стала адваротнай і выбухнуў эканамічны крызіс, які імкліва набыў сусветны характар.

Крызіс быў самы цяжкі з усіх, якія калі-небудзь зведаў капіталістычны свет. Калі індэксы прамысловай вытворчасці ў 1929 г. прыняць за 100, дык у 1932 г. яны былі наступныя:

ЗША	53,8
Нямеччына	53,5

Францыя 71,6
Вялікабрытанія 83,5

У той жа перыяд памеры сусветнага гандлю паменшыліся на 60 працэнтаў. Афіцыйная колькасць беспрацоўных ва ўсіх капіталістычных краінах у 1932 г. дасягнула 31 мільёна.

У адной Нямеччыне налічвалася 5,8 мільёна беспрацоўных. Менавіта ў гэтай краіне палітычныя наступствы сусветнага крызісу праявіліся больш за ўсё — у форме прыходу да ўлады нацыянал-сацыялістычнай партыі, заснаванай Гітлерам у 1920 г.

Эканамічны крызіс спарадзіў магутны ўздым патрабаванняў з боку рабочага класа, інтарэсы якога выказвалі і абаранялі дзве палітычныя партыі, што вялі паміж сабой зацятую вайну: камуністычная партыя, якая прыхільна ставілася да савецкага досведу, і варожая да яго сацыялістычная партыя.

Гітлер, як і Мусаліні ў Італіі, набіраў прыхільнікаў з сярэдніх класаў, якіх таксама закрануў крызіс. У 1929 г. ён стварыў "Штурмавыя аддзелы" (СА) і "Ахоўныя калоны" (СС) — узброеныя групы для нападаў на сходы рабочых. Дзякуючы грашам, атрыманым ад прамыславікоў, нацыянал-сацыялістычная партыя займела шмат месцаў у парламенце. 30 сакавіка 1933 г. прэзідэнт краіны Гіндэнбург прызначыў Гітлера на пасаду канцлера. 27 лютага 1934 г. новы кіраўнік нямецкага ўрада справакаваў пажар будынка рэйхстага, каб распачаць рэпрэсіі супраць рабочых партыяў і ўсталяваць сваю дыктатуру.

Маючы неабмежаваную ўладу, у хуткім часе Гітлер пры падтрымцы кіраўнікоў буйной прамысловасці распачаў палітыку заваёвы "жыццёвае прасторы", гэта значыць заваёвы замежных рынкаў. У 1937 г. ён далучыў Аўстрыю, у 1938 г. — Судэцкую вобласць Чэхаславакіі. А ў 1939 г. пасля нападу Нямеччыны на Польшчу выбухнула Другая сусветная вайна.

У гэтай вайне Нямеччына мела ў якасці хаўруснікаў дзве іншыя дзяржавы, якія таксама пайшлі па шляху ўзброенай заваёвы рынкаў збыту для іхнай прамысловасці: Італію, якая ў 1935 г. захапіла Эфіопію, і Японію, якая ў 1931 г. захапіла Манчжурыю, а ў 1937 г. заваявала Кітай.

Раздзел II

ЭВАЛЮЦЫЯ НЕАКЛАСІЧНАЙ СІСТЭМЫ

Неакласічная тэорыя — новы сродак абароны эканамічнага лібералізму — даволі хутка зведала вялікі поспех. Аднак галоўныя тэзісы гэтае тэорыі былі аспрэчаныя і мадыфікаваныя нават унутры самой ліберальнай плыні. Можна сказаць пра глыбокае пераўтварэнне сістэмы Вальраса з таго часу, як яна пачала шырока распаўсюджвацца, і да таго, як Кейнс выказаў сумнеў наконт яе слушнасці. Хоць гэта і не было выразна заўважным для сучаснікаў, але найбольш спрэчныя аспекты неакласічнай сістэмы былі пакрысе зруйнаваныя, а сапраўдныя навуковыя здабыткі маржыналізму сталі больш акрэсленыя: прынцып узаемазалежнасці ўсіх цэнаў; закон попыту на тавары (выроўніванне ўраўнаважаных маржынальных карыснасцяў); закон попыту на фактары вытворчасці (выроўніванне маржынальных прадуктаў фактараў вытворчасці і коштаў на іх). На апошнім законе грунтавалася тэорыя оптымуму, з якой Парэта хацеў зрабіць асноватворную частку эканамічнай навукі.

§ 1. Супярэчнасць паміж грамадскай карыснасцю і прыватным інтарэсам

А) "Натуральныя вартасці" Фрыдрыха фон Візэра

Непасрэдны паслядоўнік Мэнгера ў Аўстрыі — эканаміст і палітычны дзеяч Фрыдрых фон Візэр[1], які ў 1884 г. апублікаваў працу *"Пра паходжанне і пра законы вартасці"*, а ў 1889 г. — працу *"Натуральная вартасць"*.

Апантаны супраціўнік класічнай тэорыі вартасці, Візэр імкнуўся выкараніць з эканамічнага аналізу само паняцце выдаткаў вытворчасці і сцвярджаў, што выдаткі на нейкі тавар заўсёды зводзяцца да колькасці нейкага іншага тавару, якую можна было б вырабіць замест першага. Гэтае паняцце "альтэрнатыўных выдаткаў" (*opportunity-cost* у брытанскіх эканамістаў) само па сабе сталася плённым. Але Візэр памыляўся, калі лічыў, што гэтым можна абмежавацца.

---

[1] *Ён быў міністрам гандлю Аўстра-Вугоршчыны пад час Першай сусветнай вайны.*

Між іншым, ён намагаўся ўдакладніць неакласічную тэорыю размеркавання даходаў, якая ў яго стала пошукам развязання праблемы "залічэння" вызначаных часткаў вартасцяў, створаных усімі разнастайнымі фактарамі вытворчасці. Менавіта на гэты аспект ягоных даследванняў сёння часцей за ўсё звяртаецца ўвага. Аднак ён, на нашу думку, не сама значны. Сапраўдная арыгінальнасць Візэра ў яго сцверджанні, што ў эканоміцы побач з індывідам існуе і выконвае пэўную ролю дзяржава.

Дзяржава, гаварыў даследнік, не імкнецца забяспечыць максімум задавальненняў індывідам; яна шукае *грамадскую карыснасць*, якую Візэр даволі дзіўна назваў "натуральнай вартасцю". На ягоную думку, гэты пошук не ажыццяўляецца праз падлік; гаворка ідзе пра палітычную задачу. "У канчатковым рахунку, — пісаў Візэр, — палітыцы павінны быць пакінуты клопат вырашаць... Як бы адмоўна ні ўздзейнічала на славу нашае тэорыі прызнанне гэтага факта, яго нельга адмаўляць"[1].

Безумоўна, аналіз Візэра справядлівы. Ён наносіць вызначальны ўдар па чыстай ліберальнай дактрыне, бо калі дапускаецца, што дзяржава мусіць мець на мэце грамадскую карыснасць, дык немагчыма лічыць, што яна можа ўстрымлівацца ад змянення цэнаў і абменаў або ўстрымлівацца браць у свае рукі вытворчасць асобных тавараў нават пры дапушчэнні, што свабодная канкурэнцыя прыносіць "максімум задавальненняў" індывідам, узятым паасобку.

У наступных працах — *"Тэорыя сацыяльнай эканомікі"* (1913) і *"Закон магутнасці"* (1926) — Візэр сувора крытыкаваў ліберальны капіталізм. Ён падкрэсліваў тую значнасць, якую набылі манаполіі, і выступаў супраць няроўнасці даходаў, "заняпаду", выкліканага развіццём прамысловых гарадоў, супраць адсутнасці развязання праблемы дачыненняў паміж наймальнікамі і найманымі працаўнікамі, супраць росту беспрацоўя.

У сваім апошнім творы Візэр даходзіў да наступных словаў:

[1] *Cité par T. W. Hutchison, A Review of Economic Doctrines, 1870–1929, Oxford, 1953; réimpression, 1962, p. 159.*

"Якраз гэтак жа, як буржуазныя палітычныя філосафы патрабавалі павагі асноватворных грамадзянскіх правоў для буржуазіі, пралетарскія палітычныя філосафы патрабуюць павагі асноватворных эканамічных правоў. Пры адсутнасці павагі асноватворных эканамічных правоў абстрактны прынцып "роўнасці правоў для ўсіх" на практыцы вядзе да поўнай няроўнасці"[1].

Візэр, аднак, адхіляў сацыялізм з тае прычыны, што "ніякі эканамічны лад не можа тым або іншым чынам пазбавіцца найвышэйшай улады канкурэнцыі, не прыносячы пры гэтым вялікіх пакутаў"[2].

Б) "Чысты грамадскі маржынальны прадукт" А. К. Пігу

Прафесар Пігу — сама аўтарытэтны даследнік сярод эканамістаў Кембрыджа ў 1920—1930 гг. — сёння вядомы галоўным чынам праз бязлітасную крытыку, скіраваную ў ягоны бок Кейнсам. Крытыка датычыць тых тэзісаў Пігу, якія абапіраліся на ідэі Джэванса і Вальраса. Трэба, аднак, падкрэсліць, што і сам Пігу ўжо быў "ерэтыком" сярод эканамістаў-неакласікаў, бо пад уплывам Візэра ўводзіў у свой аналіз грамадскую карыснасць побач з карыснасцю індывідаў.

У сваёй сама вядомай працы *"Эканоміка дабрабыту"* (1920) Пігу намагаўся вылучыць крытэрыі палітычнай эканоміі, якія маглі б забяспечыць найлепшае становішча для ўсіх насельнікаў краіны.

На думку Пігу, немагчыма сцвярджаць, што ва ўсіх выпадках гэта павінна быць палітыка ўстрымання. Паводле яго, трэба прызнаць, што ўмяшанне дзяржавы, скіраванае на выроўніванне даходаў, можа павялічыць дабрабыт. Гэта, як мы ведаем, вельмі стары тэзіс, які Бэнтам ужо развіў у сваіх працах. Прафесар Пігу пайшоў крыху далей, чым лідэр "радыкальных філосафаў", у тым, што датычыць прапановаў наконт практычнага скарыстання закладзенага прынцыпу. Але, як гаварыў Пігу, варта перасцерагацца, каб трансферы значных даходаў не падштурхнулі атрымальнікаў гэтых трансфераў менш працаваць, што прывяло б да змяншэння нацыянальнага даходу, а значыць і ўсеагульнага дабра-

[1] *Cité par T. W. Hutchison, op. cit., p. 163.*
[2] *Id., ibid., p. 162.*

быту. Таму было б пажадана, каб трансферы спалучаліся "з пэўнай ступенню нагляду за людзьмі, на карысць якіх накіроўваюцца гэтыя трансферы"[1].

Аднак, на думку Пігу, іншы падыход вымагае ўмяшання дзяржавы. Палітычная эканомія даказала, што нейкі максімум задавальненняў[2] дасягаецца тады, калі маржынальныя прадукты ўсіх фактараў вытворчасці роўныя паміж сабой пры ўсіх формах іхнага выкарыстання. Але, працягваў Пігу, тут размова ідзе аб *прыватных* маржынальных прадуктах, гэта значыць аб даходах, атрыманых ад выкарыстання тых або іншых рэсурсаў прыватнымі асобамі, якія валодаюць гэтымі рэсурсамі.

А калі нейкі індывід ужывае рэсурсы дзеля пэўнай мэты, дык з гэтага таксама вынікаюць разнастайныя наступствы для іншых людзей. Напрыклад, той, хто будуе чыгунку, выклікае пажары ў лясах паабапал дарогі. Пры ўліку такіх "ускосных" наступстваў выкарыстання рэсурсаў разам з наўпроставымі наступствамі атрымліваюцца "чыстыя грамадскія маржынальныя прадукты" рэсурсаў. А ажыццяўленне максімуму дабрабыту ў грамадстве насамрэч залежыць ад выроўнівання чыстых грамадскіх маржынальных прадуктаў, якога ў прынцыпе можна дасягнуць толькі праз умяшанне дзяржавы.

Пігу лічыў, што чыстыя грамадскія маржынальныя прадукты можна вымяраць. Але гэта сумнеўны тэзіс. Практычна гледзішча Пігу дакладна супадае з тэзісам Візэра пра грамадскую карыснасць, але апошні паўстае больш рэалістычным, бо Візэр зазначаў, што ўлік грамадскай карыснасці — гэта задача, якая залежыць ад палітычнага рашэння.

Але, як і Візэр, Пігу заставаўся адданым прыхільнікам найбольш спрэчных аспектаў эканамічнага лібералізму. Так, ён браў на веру вучэнне неакласічнае школы і ў "*Эканоміцы дабрабыту*"[3] і ў шмат якіх іншых працах сцвярджаў, што

[1] *Economics of Welfare, 2e éd., London, 1924, p. 712.*

[2] *Пігу асабліва падкрэсліваў, што ён пісаў нейкі максімум задавальненняў, а не адзіны максімум задавальненняў. Значыць, ён прызнаваў азначэнне эканамічнага оптымуму, зробленае Вільфрэда Парэта колькі гадоў раней і пра якое мы будзем весці гаворку крыху далей.*

[3] *Гл., op. cit., p. 581.*

штучнае павелічэнне сярэдняга роўню заробкаў абавязкова прывяло б да стварэння беспрацоўя ці да пашырэння наяўнага беспрацоўя. Менавіта супраць гэтае тэорыі Пігу выступіць пазней Кейнс, і крытыка неакласічнае тэорыі занятасці будзе зыходнаю кропкаю Кейнсавай сістэмы[1].

§ 2. Час як фактар вытворчасці і тэорыя размеркавання ў Бём-Бавэрка

У У. С. Джэванса мы сустракалі цікавы аналіз, паводле якога дадатковы прадукт, атрыманы праз выкарыстанне капіталу, залежыць ад таго, што выкарыстанне капіталу патрабуе пэўнага інтэрвалу часу паміж момантам выдаткавання працы і момантам канчатковага вырабу тавару. Першыя адэпты неакласічнае школы не аддавалі ўвагі гэтаму аналізу, якога няма ў Мэнгера і Вальраса. Але яго значэнне было падкрэслена эканамістам і палітыкам[2] Эганам фон Бём-Бавэркам у працы *"Пазітыўная тэорыя капіталу"*, якая выйшла ў свет у 1889 г.

Як пісаў гэты аўтар, пры капіталістычнай сістэме вытворчасці дадатковая прадукцыя атрымліваецца не беспасярэдне, а "абыходным" чынам, гэта значыць спачатку вырабляюцца сродкі вытворчасці і толькі потым гэтымі сродкамі вытворчасці — спажывецкія тавары. Дадатковы прадукт будзе тым больш значны, чым даўжэйшы будзе "абыходны шлях вытворчасці". Гэтым тлумачыцца магчымасць атрымліваць даход, працэнт за сумы грошай, якія бяруцца ў пазыку і інвестуюцца ў вытворчасць. Аперацыя дазваляе адсунуць момант, калі ўзнікае попыт на пэўную колькасць спажывецкіх тавараў (бо пазначаныя сумы не выдаткоўваюцца на рынках гэтых тавараў), і праз гэта атрымаць дадатковыя тавары, а значыць, аплаціць дадатковыя даходы.

---

[1] *Пасля выхаду ў свет працы Пігу ангельскія эканамісты Н. Калдор і Дж. Р. Гікс спрабавалі вынайсці крытэр, які дазволіў бы "чыста аб'ектыўным" чынам вызначыць перавагу становішча адной эканомікі ў дачыненні да другой паводле роўню "дабрабыту". Гэтыя спробы не мелі поспеху. Агляд іх можна знайсці ў даследванні D. Braybrooke, Farewell to the New Welfare Economics, Review of Economic studies, vol. XXII, 1954—1955, pp. 180—193.*

[2] *Ён тройчы быў міністрам фінансаў Аўстра-Вугоршчыны.*

Але, з другога боку, пісаў Бём-Бавэрк, вядома, што індывіды аддаюць перавагу наяўным таварам, а не будучым, іншымі словамі, яны "не давяраюць будучыні". Для таго каб дасягнуць іхнай згоды адсунуць у часе спажыванне пэўнай колькасці тавараў, трэба паабяцаць ім большую колькасць гэтых тавараў у будучыні.

У выніку мы маем *магчымасць* атрымліваць працэнт за капітал, бо "абыходны" шлях вытворчасці павялічвае прадукцыйнасць працы і гэты працэнт *неабходны* з прычыны недаверу будучыні. Аўстрыйскі эканаміст даводзіў, што такі аналіз дазволіў яму вывесці сукупнасць натуральных законаў, на аснове якіх функцыянуе капіталістычная сістэма.

Наш аўтар крытыкаваў неакласічны тэзіс пра "тры фактары вытворчасці". Ён лічыў наіўнасцю разглядаць капітал як фактар вытворчасці. Тым не менш Бём-Бавэрк адхіляў тэорыю працоўнай вартасці, бо тавары вымагаюць "не толькі працы, але і часу"[1].

Урэшце Бём-Бавэрк таксама прыйшоў да сцверджання, што пры канкурэнтнай сістэме размеркаванне вызначаецца неабходнасцю выроўнівання попыту і прапановы і на рынку капіталу, і на рынку працы.

"Ровень заробку, — пісаў ён, — павінны быць такім, каб не існавала ні свабоднага капіталу для падвышэння заробкаў, ні свабоднай працы ў пошуках занятасці, што знізіла б заробкі"[2].

Цалкам відавочна, што перад намі паўтор тэорыі першых аўтараў-неакласікаў[3]. Безумоўна, Бём-Бавэрк намагаўся прэзентаваць менш "наіўную" канцэпцыю прагрэсу канкурэнцыі на рынку працы. Тым не менш ягоны аналіз размеркавання, як і аналіз ягоных папярэднікаў, дае прастору для крытыкі, якую мы ўжо сфармулявалі і якая палягае ў наступным сцверджанні: нішто не можа гарантаваць існаванне эфектыўнай магчымасці выроўнівання попыту і прапановы працы, калі няма зменаў у метадах вытворчасці.

---

[1] *Histoire critique des théories de l'intérêt du capital, trad. franç., Paris, 1903, t. II, p. 184.*

[2] *Théorie positive du capital, cité par T. W. Hutchison, op. cit., p. 176.*

[3] *Новую фармулёўку гэтае тэорыі зрабіў у 1899 г. амэрыканскі эканаміст Джон Бэйтс Кларк у працы "Размеркаванне багацця".*

§ 3. Новае азначэнне эканамічнага оптымуму ў Вільфрэда Парэта

Асноватворнае змяненне, уведзенае неакласічнай сістэмай, — гэта адмова ад тэзіса, адпаведна якому свабодная канкурэнцыя дазваляе забяспечыць усім індывідам "максімум задавальненняў". Хоць "утылітарнае" гледзішча, традыцыйнае для Вялікабрытаніі пасля Бэнтама, яшчэ мела сваіх абаронцаў у XX ст. (у прыватнасці, Пігу), сёння агульнапрызнана, што немагчыма падсумоўваць пачуцці карыснасці або задавальнення розных індывідаў такім чынам, каб тэрмін "максімум задавальненняў" быў пазбаўлены ўсялякага значэння ў грамадскім вымярэнні.

Аднак адэпты неакласічнае тэорыі не адмовіліся надаць пазітыўнага значэння сваім даследванням. У пошуках яго вызначальны крок быў зроблены італьянскім эканамістам Вільфрэда Парэта, які змяніў Вальраса на Лазанскай кафедры. Парэта распрацаваў дэфініцыю "эканамічнага оптымуму", якая мае вялікае значэнне.

У *"Курсе палітычнай эканоміі"* (выйшаў у свет у 1896 г.) Парэта яшчэ падзяляў погляды Вальраса. І наадварот, у *"Падручніку па палітычнай эканоміі"*, выдадзеным на італьянскай мове ў 1906 г., па асноўных пытаннях ён адыходзіць ад свайго папярэдніка.

Перш за ўсё Парэта сцвярджаў, што трэба адмовіцца ад разгляду карыснасці як вымернай велічыні. Аднак, дадаваў ён, гэта не перашкаджае сцвярджаць, што кожны спажывец пры набыцці тавараў рацыянальна выбірае іх колькасць. Сапраўды, спажывец ведае, што для яго адно спалучэнне тавараў выгаднейшае, чым нейкае другое, ці абодва гэтыя спалучэнні не задавальняюць яго. Значыць, можна сцвярджаць, што па дзейных цэнах ён набывае такую колькасць тавараў, якія складаюць для яго сама выгаднае спалучэнне. Гэта азначае, што калі пры замене колькасці q_A тавару А на колькасць q_B тавару В атрымліваецца спалучэнне, эквівалентнае першапачатковаму, прычым гэтая замена будзе магчымая, калі грашовая вартасць q_B будзе меншай за грашовую вартасць q_A, гэта значыць калі

$$p_B q_B < p_A q_A,$$

або таксама

$$\frac{q_B}{q_A} < \frac{p_A}{p_B}.$$

Калі абазначыць выраз q_B/q_A маржынальным каэфіцыентам замены А на В, дык можна сказаць, што спажывец будзе заменьваць тавар А на тавар В да таго часу, пакуль маржынальны каэфіцыент замены А на В будзе меншы за стасунак кошту А да кошту В. З гэтага можна зрабіць выснову, што выбранае спажыўцом спалучэнне тавараў будзе такім, каб маржынальны каэфіцыент замены паміж двума таварамі быў роўны стасунку коштаў абодвух тавараў[1].

Відавочна, што гэты закон не адрозніваецца ад закону, які фармулявалі Джэванс, Мэнгер і Вальрас, калі сцвярджалі, што спажывец выроўнівае стасункі маржынальных карыснасцяў з стасункамі коштаў тавараў. Бо ясна, што калі пры замене, напрыклад, дзвюх адзінак В на адну адзінку А атрымліваецца эквівалентнае спалучэнне тавараў, дык усё адбываецца так, нібыта маржынальная карыснасць В у два разы меншая за маржынальную карыснасць А: каэфіцыент замены А на В роўны стасунку маржынальных карыснасцяў абодвух тавараў. Перавага новай формы, нададзенай неакласічнаму закону раўнавагі спажыўца, у тым, што гэтая форма больш не закранае ідэі *вымярэння* індывідам маржынальных карыснасцяў тавараў, іншымі словамі, пазначэння іх *колькаснымі лічэбнікамі* 1, 2 і г. д. Новая форма толькі дапускае, што спажывец усталёўвае вызначаны *парадак* паміж усімі магчымымі разнастайнымі спалучэннямі тавараў у залежнасці ад таго, якія спалучэнні падаюцца яму большменш выгаднымі. Пэўнае спалучэнне тавараў будзе *першым*, іншае *другім* і г. д. Ужытая тут нумарацыя будзе *парадкавая*, а не колькасная.

Дарэчы, прасоўванне наперад у справе фармалізацыі неакласічнай сістэмы прывяло Парэта да больш значнага адкрыцця.

---

[1] *Гл. на гэты конт J. R. Hicks, Valeur et capital, London, 1939, trad. franç., Paris, 1956, chap. Ier.*

Дапусцім, гаварыў ён, што спантаннае ўздзеянне канкурэнцыі выклікала пэўнае размеркаванне тавараў паміж індывідамі. Уявім, што адбываюцца невялікія змены ў гэтым размеркаванні. Можна даказаць, што нейкія змены такога тыпу (гэта значыць змены з невялікай амплітудай) абавязкова будуць нявыгаднымі *сама меней для аднаго індывіда*. Або пры жаданні можна даказаць, што пры невялікіх зменах размеркавання тавараў, выкліканага свабоднай канкурэнцыяй, нельга забяспечыць роўныя ці большыя задавальненні адначасова для *ўсіх* індывідаў.

Парэта зазначаў, што менавіта гэтым павінна абмежавацца выснова эканамічнай тэорыі. І на гэтай глебе трэба вызначаць максімум карыснасці, або, ужываючы мову Парэта, максімум "карыснасці, што вызначылі для сябе індывіды". Ён пісаў:

"Мы скажам, што пры пэўным становішчы ўсе супольнікі атрымліваюць максімум вызначанай імі карыснасці, калі немагчыма знайсці сродак пазбегнуць становішча, калі карыснасць, якую атрымлівае кожны індывід дадзенай супольнасці, павялічвалася або памяншалася. Гэта значыць, усялякі невялічкі зрух з гэтага становішча абавязкова прыводзіць да павелічэння карыснасці, якую атрымліваюць адны індывіды, і да змяншэння карыснасці, якую атрымліваюць іншыя..."[1]

Строгі доказ гэтай фундаментальнай тэарэмы вымагае выкарыстання матэматычных сродкаў. Аднак пры ўжыванні Вальрасава паняцця маржынальнай карыснасці можна перадаць асноўныя ідэі тэарэмы звыклаю моваю.

Мы ўжо бачылі[2], што пры стане агульнай раўнавагі ў эканоміцы кожны спажывец набывае такую колькасць спажывецкіх тавараў, каб стасунак маржынальных карыснасцяў двух тавараў быў роўны стасунку іхных цэнаў. Ужо з гэтага вынікае, што калі нічога не змяняць у коштах тавараў і ў выраблеых колькасцях, дык немагчыма павялічыць задавальненні, атрыманыя адным спажыўцом, не змяншаючы пры гэтым задавальненняў, атрыманых іншым. Каб паставіць у выгаднае становішча аднаго спажыўца, трэба прапанаваць яму за адзінку тавару А колькасць тавару В, боль-

[1] *Manuel, trad. franç., 2e éd., Paris, 1963, t. II, p. 354.*

[2] *Гл. частку VI, раздзел II, § 1.*

шую за наяўныя стасункі паміж цаною А і цаною В. Але для здзяйснення гэтае замены трэба забраць жаданую колькасць В са спажывання іншага індывіда, які будзе абдзелены, калі ён не атрымае дадатковую колькасць А.

Апрача таго, можна паказаць, што прадпрыемства, якое выкарыстоўвае нейкі фактар вытворчасці, ужывае такую ягоную колькасць, каб маржынальны прадукт гэтага фактару вытворчасці быў роўны яго цане. Чысты прыбытак прадпрыемства будзе максімальны тады, калі маржынальныя прадукты будуць змяншацца пры павелічэнні ўжытай колькасці фактару вытворчасці.

Калі існуе толькі адзін кошт на пэўны фактар вытворчасці, дык будуць роўнымі маржынальныя прадукты таго самага фактару вытворчасці ў дзвюх адрозных галінах. Пазначым q_a і q_b дадатковыя колькасці двух тавараў, атрыманых праз дапасаванне адной адзінкі фактару вытворчасці, а p_a і p_b — гэта цэны дадзеных тавараў, тады

$$q_a p_a = q_b p_b, \quad \text{або} \quad q_b / q_a = p_a / p_b.$$

Выраз q_b / q_a — дадатковая колькасць тавару В, якую можна атрымаць за кошт адмовы ад вытворчасці адзінкі тавару А, гэта значыць маржынальны каэфіцыент замены В на А. Сапраўды, калі змяніць пазначаным чынам адзінку нейкага фактару вытворчасці і калі ў залежнасці ад зменаў, што адбыліся ў вытворчасці, змяніць колькасці тавараў, якія спажываюцца адным індывідам, дык спажывец траціць задавальненне, роўнае $u_a q_a$, і атрымлівае задавальненне, роўнае $u_b q_b$, дзе u_a і u_b — маржынальныя карыснасці абодвух тавараў. Калі мы маем

$$q_b / q_a = p_a / p_b \quad \text{і} \quad u_a / u_b = p_a / p_b,$$

дык мы таксама можам напісаць:

$$q_b / q_a = u_a / u_b, \quad \text{або} \quad u_b q_b = u_a q_a.$$

Гэта азначае, што нельга павялічыць задавальненні, атрыманыя адным спажыўцом, абмяжоўваючыся зменамі аднаго фактару вытворчасці і параўнальнымі зменамі колькасцяў тавараў, прызначаных спажыўцу.

Застаецца разгледзець апошняе пытанне. Ці нельга было

б пры адначасовых зменах двух фактараў вытворчасці (больш капіталу і менш працы ў тавары А, менш капіталу і больш працы ў тавары В) павялічыць выраблену колькасць аднаго тавару пры захаванні нязменнай выраблена колькасці другога? Калі б гэта было магчыма, можна было б павялічыць выгады аднаму спажыўцу, даючы яму дадатковы прадукт аднаго з тавараў і ніяк не шкодзячы пры гэтым іншаму індывіду. Але Парэта сцвярджаў, што гэта немагчыма.

Дзеля спрашчэння разгледзім два фактары вытворчасці, якія маюць аднолькавы кошт. Іхныя маржынальныя прадукты роўныя, а маржынальныя каэфіцыенты замены паміж абодвума таварамі ідэнтычныя, калі іх падлічваць у дачыненні да зменаў першага фактару вытворчасці і зменаў другога фактару.

Пры пераводзе адзінкі першага фактару вытворчасці з галіны А ў галіну В я трачу колькасць q_a тавару А і атрымліваю колькасць q_b тавару В. Каб вярнуць страчаную колькасць тавару А, дастаткова, каб я перавёў з В у А адзінку другога фактару вытворчасці. Але такі перавод вымушае мяне траціць колькасць q_b тавару В, роўную той, што я папярэдне атрымаў. У выніку я вяртаюся да сітуацыі, ідэнтычнай першапачатковай. Я не змог з нязменнымі рэсурсамі выраблять больш аднаго тавару, бо не пайшоў на змяншэнне выраблена колькасці другога.

Доказы Парэта распрацоўваліся ў межах неакласічнае сістэмы, у якой прызнавалася, што прадпрыемствы заўсёды бяруць у пазыку ўжываны капітал і што дасягаецца поўная занятасць даступных працоўных сілаў. Але, як ужо гаварылася наконт тэорыі Вальраса, гэтыя гіпотэзы непрымальныя. Для адлюстравання сапраўднага значэння тэорыі эканамічнага оптымуму трэба паказаць, што яна застаецца слушнай, але з асобным значэннем, нават пры адмове ад пазначаных гіпотэзаў.

Калі капітал прадпрыемстваў — іх уласны капітал, дык нельга сказаць, што прадпрымальнік павялічвае колькасць капіталу, якую ён ужывае, да таго моманту, пакуль маржынальная прадукцыйнасць гэтага капіталу не стане роўнай норме працэнта. Можна, аднак, паказаць, што маржыналь-

ная прадукцыйнасць капіталаў мае тэндэнцыю да выроўнівання ў маштабе ўсёй эканомікі пры ўмове, што прадпрыемствы імкнуцца атрымаць максімальную норму прыбытку, а канкурэнцыя вядзе да выроўнівання нормаў прыбытку прадпрыемстваў.

Калі прадпрыемства павялічвае на адзінку суму свайго ўласнага капіталу, дык яно павялічвае на пэўную суму свой прыбытак. Гэты дадатковы прыбытак можна назваць граніч-най прадукцыйнасцю капіталу прадпрыемства.

Пры той самай колькасці ўжытай працы (і магчыма, пры адной і той самай колькасці зямлі) маржынальная прадукцыйнасць капіталу прадпрыемства павялічваецца, даходзіць да максімуму, а потым змяншаецца, калі расце велічыня ўласнага капіталу прадпрыемства. А норма прыбытку прадпрыемства не можа адрозніваца ад сярэднеарытметычнага маржынальных прадукцыйнасцяў ужытых адзінак капіталу. Сярэднеарытметычнае павялічваецца або памяншаецца ў залежнасці ад таго, якая лічба, большая ці меншая за першапачатковую сярэднеарытметычную, дадаецца да сумы шматлікіх лічбаў. Значыць, норма прыбытку прадпрыемства павялічваецца пры павелічэнні колькасці капіталу тады, калі маржынальная прадукцыйнасць капіталу большая за норму прыбытку; у процілеглым выпадку норма прыбытку змяншаецца. Такім чынам, норма прыбытку прадпрыемства максімальная тады, калі маржынальная прадукцыйнасць становіцца роўнай норме прыбытку. Калі ўсе прадпрыемствы атрымліваюць максімальную норму прыбытку, дык маржынальная прадукцыйнасць капіталаў таксама будзе паўсюль выраўненай. А калі канкурэнцыяй выроўніваюцца нормы прыбытку, дык таксама выроўніваецца маржынальная прадукцыйнасць капіталаў. Значыць, у дачыненні да колькасцяў выкарыстаных капіталаў закладзены Парэта прынцып выконваецца, хоць прадпрыемствы імкнуцца дасягнуць максімальнага роўню не “чыстага прыбытку”, а нормы прыбытку іхнага ўласнага капіталу.

У дачыненні да колькасці выкарыстанай працы разам з Парэта можна дапусціць, што кожнае прадпрыемства выка-

рыстоўвае такую колькасць працы, каб яе маржынальная прадукцыйнасць была роўная заробку; у гэтым разе пры паўсюднай роўнасці заробкаў таксама роўная і маржынальная прадукцыйнасць працы. Тое ж сама ў дачыненні да зямлі або ўсялякага іншага рэдкага фактару вытворчасці, які можа быць ужыты.

Такім чынам, варта пагадзіцца з тэорыяй Парэта пра эканамічны оптымум. Але пры больш рэалістычных гіпотэзах, якія мы вылучаем, гэтая тэорыя набывае асаблівае значэнне. Калі насуперак меркаванню Парэта зусім не дасягаецца поўная занятасць наяўнай працоўнай сілы, дык трэба сказаць, што аптымальна ўжываюцца *эфектыўна выкарыстаныя*, а не даступныя рэсурсы.

Гэтак зведзеная да свайго сапраўднага сэнсу тэорыя Парэта па-ранейшаму мае велізарнае значэнне. Далей мы ўбачым, як у краінах Усходняй Эўропы пад час спробаў, скіраваных на дасягненне планавасці ў эканоміцы, многія эканамісты зразумелі, што сацыялістычная эканоміка гэтых краінаў была неэфектыўная, бо ў іх не існавала ніякага пэўнага прынцыпу выбару метадаў вытворчасці. І эканамісты паспрабавалі выправіць гэты недахоп, абапіраючыся на Парэтаву тэорыю эканамічнага оптымуму.

§ 4. Праблема манапалістычнай канкурэнцыі

З канца XIX ст. шмат працаў было прысвечана аналізу "раўнавагі фірмы", гэта значыць даследванню працэсу вызначэння прадпрыемствам той колькасці тавараў, якую яны прапануюць на рынку.

Вальрасава тэорыя дапускае, што на рынках пануе "дасканалая канкурэнцыя", гэта значыць гандляроў так многа, што кожны з іх паасобку прыкметна не ўплывае на цану. Значыцца, прадпрыемства абмяжоўваецца канстатаваннем рынкавай цаны і прапануе па гэтым кошце такую колькасць тавару, вытворчасць і продаж якой прыносіць прадпрыемству максімум "чыстага прадукту", які, як мы бачылі, падлічваецца пасля таго, як за сукупнасць капіталу быў заплочаны належны працэнт.

Каб зразумець, як у гэтых гіпотэзах вызначаецца прапанаваная прадпрыемствам колькасць тавараў, трэба дапусціць, што сярэднія выдаткі вытворчасці тавару растуць ад пэўнага моманту. У гэтым разе дадатковыя выдаткі, выкліканыя вытворчасцю апошняй адзінкі тавару, таксама растуць ад пэўнага роўню. Пры рынкавай цане Р прадпрыемства атрымлівае максімум "чыстага прыбытку", калі пазначаныя дадатковыя выдаткі, або маржынальныя выдаткі вытворчасці, роўныя рынкаваму кошту (гл. графік ніжэй).



Аднак, сцвярджаецца далей, калі існуюць "чыстыя прыбыткі", дык на рынку з'яўляюцца новыя прадпрыемствы, што выклікае паніжэнне цэнаў. Раўнавага дасягаецца, калі рынкавая цана роўная сярэднім выдаткам вытворчасці (лічыцца, што яны аднолькавыя на ўсіх прадпрыемствах), бо ў гэты момант прадпрыемствы, якія прапануюць колькасці тавараў, чые маржынальныя выдаткі роўныя сярэднім выдаткам, больш не атрымліваюць "чыстых прыбыткаў".

Гэты неакласічны аналіз стаў аб'ектам крытыкі. Справядліва заўважалася, што практыка не спраўджвае гіпотэзу, адпаведна якой прадпрыемствы маюць такія памеры вытворчасці, што сярэднія выдаткі вытворчасці павялічыліся б, калі б яны выраблялі больш.

Такая неадпаведнасць паміж неакласічнай тэорыяй і практыкай была, у прыватнасці, падкрэсленая амерыканскім эканамістам Джонам Морысам Кларкам у працы *"Эканоміка*

накладных выдаткаў"[1], а потым італьянскім эканамістам прафесарам Кембрыджа П'еро Срафа ў вядомым даследванні *"Законы рэнтабельнасці ва ўмовах канкурэнцыі"*[2]. На заўвагах гэтых аўтараў эканамісты Эдўард Чэмбэрлін і Джоан Робінсан[3] грунтоўна распрацавалі тэорыю "недасканалай", або "манапалістычнай канкурэнцыі".

Паводле аналізу двух апошніх аўтараў, у выніку лакалізацыі гандляроў па розных месцах і дыферэнцыяцыі тавараў, што ёсць у продажы, кожны гандляр мае перад сабой асаблівую крывую попыту накшталт крывой AB (гл. графік ніжэй). Вытворная гэтай функцыі попыту паказана крывой A'B', яна адлюстроўвае дадатковыя або маржынальныя даходы, якія адпавядаюць паслядоўным павелічэнням колькасці, што можа быць прададзенай, улічваючы абавязковае зніжэнне цаны, фіксаванай гандляром. Дэманструецца, што атрыманы прыбытак будзе максімальны тады, калі прадпрыемства прадае па цане P колькасць тавараў Q, для якой маржынальны даход роўны маржынальным выдаткам вытворчасці, які адлюстраваны крывой CC'. Як паказана на графіку, гэтае правіла вызначэння прапановы з боку аднаго гандляра справядлівае пры спадальных выдатках вытворчасці.



[1] *The Economics of Overhead Costs, New York, 1923.*

[2] *Economic Journal, 1926.*

[3] *Voir, Joan Robinson, The Economics of Imperfect Competition, London, 1933, et Edward Chamberlin, The Theory of Monopolistic Competition, New York, 1933.*

Увод у эканамічную тэорыю паняцця манапалістычнай канкурэнцыі паставіў сур'ёзныя праблемы перад эканамістамі неакласічнай школы. Сапраўды, падаецца, што калі пагадзіцца з новай схемай раўнавагі фірмы, дык больш немагчыма сцвярджаць, што ваганне попыту на нейкі тавар абавязкова прывядзе да вагання ў кірунку той цаны, па якой гэты тавар прадаецца. Усё залежыць ад формаў крывых попыту, якія маюць перад сабой гандляры. У такім разе даказаць існаванне агульнай раўнавагі, што імкнуліся зрабіць прыхільнікі неакласічнай тэорыі, — надзвычай няўдзячная справа. Дж. Р. Гікс першы адзначыў гэта і пісаў, што недасканаласць канкурэнцыі, калі дапусціць ейнае існаванне, справакавала б "крах практычна ўсёй тэорыі агульнай раўнавагі", і дадаваў:

"Думаецца, што ад гэтага ліха нельга будзе нічога выратаваць..., калі не дапусціць, што прадпрыемствы, з якімі мы будзем у асноўным мець справу, знаходзяцца на рынках, даволі мала адрозных ад рынкаў дасканалай канкурэнцыі"[1].

Ангельскі эканаміст, здаецца, лічыў, што выносіцца прысуд усёй эканамічнай тэорыі, калі ўвесці ў яе паняцце манапалістычнай канкурэнцыі. На практыцы ж гэта пагражае толькі неакласічнай сістэме. Далей (гл. с. 667 і наступныя) мы ўбачым, што, нават дапускаючы гіпотэзу аб дасканалай канкурэнцыі, нельга даказаць, быццам Вальрасава раўнавага — гэта стабільная раўнавага. Калі слушнасць тэорыі Вальраса мусіць быць аспрэчаная, увод паняцця манапалістычнай канкурэнцыі не вядзе да "ліха", пра якое гаварыў Дж. Р. Гікс. У рэчаіснасці трэба выпрацаваць іншае, чым Вальрасава, бачанне эканамічнай раўнавагі, бачанне, сумяшчальнае з манапалістычнай канкурэнцыяй.

§ 5. Праблемы замежнага гандлю

А) Неакласічная тэорыя міжнароднага гандлю

Варта адзначыць, што пасля распаўсюджвання неакласічнага вучэння ні ў якой іншай галіне эканамічнай тэорыі не захаваліся настолькі трывала ідэі класічнай школы.

[1] *Value and Capital, London, 1939, trad. franç., Paris, 1956, p. 74.*

Вальрас толькі ўрыўкам закранаў праблему міжнароднага гандлю. Парэта прысвяціў гэтай праблеме два першыя даследванні[1], але потым у сваіх асноўных працах не адводзіў ёй вялікага месца. З іншага боку, брытанскія эканамісты Альфрэд Маршал[2] і Ф. А. Эджўарт[3] паспрабавалі прааналізаваць праблему размеркавання даходаў у міжнародным гандлі на аснове паняцця "лішак спажыўца", гэта значыць разглядаючы прыбытак у міжнародным гандлі як прыбытак ад карыснасці. Аднак яны разгледзелі толькі асобны аспект праблемы, узнятай эканамістамі-класікамі, і прызналі слушнасць "закону параўнальных перавагаў".

Гэтым тлумачыцца той факт, што даследванні, якія на пачатку XX ст. лічыліся фундаментальнымі ў гэтай галіне, былі пабудаваныя на глебе класічных тэзісаў[4].

Аднак у 1933 г. шведскі эканаміст Бертыл Улін паспрабаваў ужыць неакласічны лад мыслення да ўсёй праблемы міжнароднага гандлю.

У працы пад назовам *"Міжрэгіянальны і міжнародны гандаль"* [5] даследнік імкнуўся даказаць, што закон параўнальных перавагаў з'яўляецца цалкам няслушным, бо ён абапіраецца на зусім састарэлую канцэпцыю вызначэння цэнаў. Улін сцвярджаў: не трэба імкнуцца тлумачыць цэны на падставе "рэальных" выдаткаў, ідзе гаворка пра выдаткі працы, як у Рыкарда, або пра ўсялякую іншую канцэпцыю гэткага кшталту. На яго думку, варта зыходзіць з неакласічнага тэзіса, паводле якога цэны тавараў — гэта сума грашовых вартасцяў прадукцыйных паслугаў, што ўваходзяць у выраб гэтых тавараў, і значыць, яны залежаць ад коштаў гэтых фактараў. Менавіта рэлятыўныя кошты фактараў вытворчасці павінны вызначаць якасць тавараў, якія экспартуюцца або імпартуюцца рознымі краінамі, а рэлятыўныя кошты ў сваю чаргу залежаць ад рэлятыўнай наяўнасці ўсіх разнастайных фактараў вытворчасці ў кожнай краіне.

---

[1] *Teoria matematica dei cambi forestieri et Teoria matematica del commercio internazionale*, Giornale degli Economisti, *février 1894 et avril 1895.*

[2] *The pure theory of foreign trade, London, 1879.*

[3] *Mathematical Psychics, London, 1881.*

[4] *Назавем працу: Taussig, International trade, New York, 1927.*

[5] *Interregional and international trade.*

Калі, напрыклад, нейкая краіна, што валодае вялікімі капіталамі параўнальна з колькасцю працоўных, знаходзіцца побач з іншай краінай, якая валодае намнога меншымі капіталамі, дык працэнт ад капіталу будзе меншы ў першай краіне, а заробак у ёй будзе вышэйшы. У такіх умовах тавары, вытворчасць якіх вымагае шмат працы і мала капіталу, будуць больш каштаваць у першай краіне, а тавары, якія патрабуюць мала працы і шмат капіталу, будуць там таннейшыя. Першая краіна павінна будзе спецыялізавацца на вытворчасці, якая вымагае шмат капіталу, і імпартаваць усе іншыя тавары.

Перад абмеркаваннем тэзіса Уліна трэба адзначыць, што В. Лявонцьеў паспрабаваў спраўдзіць гэты тэзіс на практыцы, але ў яго гэта не атрымалася[1].

Папраўдзе кажучы, іншыя аўтары сцвярджалі, што такі прысуд на аснове досведу неперакананучы. Таму карысна паказаць, чаму тэзіс Уліна лагічна памылковы.

Перш за ўсё трэба падкрэсліць, што ён цалкам абапіраўся на "тэорыю размеркавання" накшталт Вальрасавай, у якой "кошты фактараў" залежаць ад даступных колькасцяў фактараў. Мы ўжо зазначалі, што гэтая тэорыя, у якой фармулюецца пастулат аб заўсёднай поўнай занятасці фактараў вытворчасці, не можа быць прымальнай.

Але нават у тым выпадку, калі б дапускалася, што рэлятыўныя кошты фактараў вытворчасці залежаць ад параўнальнай наяўнасці гэтых фактараў, дык тэзіс Б. Уліна ўсё роўна не прымальны.

Сапраўды, відавочна, што рэлятыўныя цэны тавараў не залежаць выключна ад рэлятыўных коштаў "фактараў вытворчасці". Яны фармулююцца цэлым шэрагам прыродных і сацыяльных акалічнасцяў, якія зусім не ўлічваюцца ў тэорыі Уліна, ды яны і не могуць быць улічаныя. Напрыклад, у адным рэгіёне пры параўнальна спрыяльных умовах будзе вырабляцца воўна, бо клімат гэтага рэгіёна асабліва пры-

[1] *Cf. Domestic production and foreign trade: the american capital position re-examined,* Proceeding of the American Philosophical Society, *sept. 1953; ainsi que Factor proportions and the structure of American trade: Further theoretical and empirical analysis,* Review of Economics and Statistics, *novembre, 1956.*

датны да такой вытворчасці. Іншы рэгіён будзе пры даволі спрыяльных умовах вырабляць гадзіннікі, бо частка ягонага рабочага насельніцтва з пакалення ў пакаленне перадае асаблівыя рамесныя веды, якія спрыяюць гэтаму тыпу вытворчасці. Так можа быць, нягледзячы на тое, што абодва разгляданыя тавары вырабляюцца ва ўмовах, якія вымагаюць выкарыстання даволі вялікіх колькасцяў працы, і заробкі ў дадзеных рэгіёнах параўнальна высокія. Кліматычныя ўмовы ў першым выпадку і адмысловае ўменне работнікаў — у другім могуць пераадолець перашкоду, якую складаюць высокія заробкі[1].

У сапраўднасці ж спроба Б. Уліна добра паказвае карэнны недахоп неакласічнай тэорыі вызначэння цэнаў. Яна павінна была б даць "тлумачэнне" цэнаў на тавары праз кошты "фактараў вытворчасці". Але відавочна, што цэны тавараў *перш за ўсё* залежаць ад сукупнасці прыродных і сацыяльных умоваў, якія вызначаюць эфектыўнасць прадукцыйных сілаў у той або іншай галіне, і што гэтыя ўмовы не могуць быць адлюстраваныя ў аналізе накшталт Вальраса-ва, бо прадпрыемства *не плоціць* за перавагі, звязаныя з ягоным існаваннем[2].

Трэба сказаць, прыродныя ці сацыяльныя ўмовы, пра якія мы вядзем гаворку, складаюць сукупнасць чыннікаў, якімі вызначаецца *прадукцыйнасць працы* ў разгляданым рэгіёне, што набліжае нас да меркавання Рыкарда, паводле якога рэлятыўныя цэны на тавары ў нейкім рэгіёне хутчэй за ўсё залежаць ад рэлятыўных выдаткаў працы на гэтыя тавары.

---

[1] *Праўда, маючы на ўвазе фактары "аднолькавай эфектыўнасці", Б. Улін дапускае магчымасць адхілення акалічнасцяў, пра якія ішла размова ў гіпотэзе. Але ў такім разе тэорыя робіцца настолькі абстрактнай, што страчвае ўсялякае практычнае значэнне.*

[2] *Прыхільнікі маржыналізму лічаць, што яны ў стане інтэграваць дзейнасць прыродных сілаў у сваё "тлумачэнне" цэнаў, бо разглядаюць арэндную плату за карыстанне зямлёю як аплату "фактару прыроды". Але крытыка, якую мы толькі што скіравалі ў бок тэзіса Уліна, дае нам нагоду, каб падкрэсліць, наколькі мала абгрунтаванае гэтае сцвярджэнне. Эканаміст-неакласік скажа, што арэндная плата за зямлю высокая ў пэўным рэгіёне (у дачыненні да заробкаў і працэнта ад капіталу), бо ў дадзеным рэгіёне параўнальна вялікія колькасці ўрадлівых земляў. Але калі разам з Рыкарда дапусціць, што арэндная плата за нейкую зямлю залежыць ад наяўнага адрознення паміж урадлівасцю гэтае зямлі і ўрадлівасцю найгоршай зямлі, якая апрацоўваецца ў гэтым жа рэгіёне, дык робіцца зразумелым, што неакласічная тэорыя не мае пад сабой аніякага грунту.*

Падкрэсліваючы перавагу тэорыі Рыкарда над тэорыяй Уліна, мы зусім не збіраемся вяртацца да крытыкі "тэорыі параўнальных перавагаў". Але бясспрэчна, што на глебе навуковай логікі падыход Рыкарда намнога больш здавальняльны, чым падыход неакласікаў.

На гэты конт можна адзначыць, што асобныя аўтары, якія ў сённяшні час выказвалі крытыку тэорыі Б. Уліна (Таўсіг, Вайнер)[1], прыйшлі, магчыма, не ўсведамляючы гэтага, да сцверджання, што, як пісаў Рыкарда, змены колькасці працы, што патрабуецца для вытворчасці тавараў, — асабліва важны элемент, які трэба ўлічваць пры тлумачэнні стасункаў коштаў на тавары.

Б) Зняпраўджанне практыкай апошняга часу тэорыі аўтаматычнай раўнавагі разліковага балансу

Мы ведаем, што ў эканамістаў-класікаў да тэорыі параўнальных перавагаў і аналізу падзелу здабыткаў ад гандлю дапасоўвалася тэорыя аўтаматычнай раўнавагі разліковага балансу. Гэтая тэорыя, нязменная ў неакласічнай школе, ужо цэлае стагоддзе[2] з'яўляецца аб'ектам актыўных дыскусіяў, але нельга сказаць, што яны шмат высветлілі. Варта, безумоўна, адзначыць, што апошнім часам разам з усё большаю крытыкаю колькаснай тэорыі грошай усё часцей і часцей адхіляецца тэорыя аўтаматычнай раўнавагі разліковага балансу, якая шчыльна спалучаецца з першай. Кейнс і ягоныя вучні паўсталі супраціўнікамі як класічнай, так і неакласічнай школы. І з гэтага гледзішча іхныя даследванні былі слушнымі. Праўда, асобныя эканамісты-кейнсіянцы паспрабавалі аднавіць канцэпцыю аўтаматычнай раўнавагі разліковага балансу, абапіраючыся пры гэтым на новыя тыпы разважанняў. Сёння відаць: гэтыя спробы вядуць да паразы, бо існуе шмат доказаў, што ў бальшыні выпадкаў раўнавага разліковага балансу краіны ўзапраўды дасягаецца толькі дзякуючы разнастайным умяшанням дзяржавы: намаганні дзеля развіцця экспарту або скарачэнне імпарту, уздзеянне праз крэдыт на кошты і на вытворчасць і г. д. Праўда, сёння

[1] *Гл. J. Viner, Studies in the theory of international trade, op. cit., pp. 512–513.*
[2] *Гл. J. Viner, op. cit.*

гэтыя ўмяшанні сталі менш відавочнымі, чым у часы меркантылістаў. Але было б вялікаю памылкаю лічыць, што яны цалкам зніклі.

На гэты конт трэба не забыцца адзначыць, што ў XIX ст. у сусветным гандлі панавала Вялікабрытанія і што яна здолела забяспечыць раўнавагу свайго разліковага балансу праз кантроль, які чыніўся ейным урадам і банкамі, над рухам тавараў і капіталаў паміж Эўропай і слабаразвітымі краінамі. З усёй пэўнасцю можна сказаць, што гэта было адной з асноўных умоваў "стабільнасці" міжнародных эканамічных дачыненняў у тую эпоху.

А адсутнасць аўтаматычнага механізму вяртання да раўнавагі разліковага балансу выявілася ў XX ст. у перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі, гэта значыць менавіта тым часам, калі знікла панавальнае становішча Вялікабрытаніі. Тады пачалі ўзнікаць шматлікія валютныя крызісы, грашовыя войны, і многія краіны мусілі звяртацца да больш сістэматычных умяшанняў у гэтую галіну, што дало падставы для тэрміна "неамеркантылізм".

Праўда, пасля сканчэння Другой сусветнай вайны акрэсліўся значны рух на карысць "лібералізацыі" гандлю. Але фактычна рух адбываўся дзякуючы новай салідарнасці, якую ў гэтай галіне дэманстравалі вядучыя капіталістычныя дзяржавы, — салідарнасці, якая ў асобных выпадках дазваляе пазбегнуць надыходу "грашовых здарэнняў". Пакуль галоўныя краіны згодныя выдаваць значныя крэдыты адна адной у выпадку дэфіцыту іхных разліковых балансаў, дык удаецца пазбегнуць занадта частых валютных крызісаў і можна абмежаваць наступствы гэтых крызісаў, але такія вынікі зусім не залежаць ад "натуральных законаў", якія, на думку эканамістаў класічнай і неакласічнай школы, былі імі сфармуляваныя[1].

[1] *Глыбокую неадпаведнасць паміж тэорыямі аўтаматычнай раўнавагі разліковага балансу і гістарычным досведам паказаў J.-M. Letiche ва ўжо цытаванай працы: Balance of Payments and Economic Growth, New York, 1967.*

§ 6. Неакласічная школа і сацыялізм

На працягу перыяду, калі неакласічная палітэканомія паступова набывала шырокую распаўсюджанасць, ейныя прыхільнікі мелі магчымасць абгрунтаваць сваю варожасць у дачыненні да сацыялізму. Галоўным чынам развіваліся два аргументы: немагчымасць забяспечыць функцыянаванне эканомікі пры адсутнасці вартасці і немагчымасць у сацыялістычнай эканоміцы *a priori* вызначыць сама выгадныя метады вытворчасці. Крытыка, адрасаваная сацыялістычнай сістэме, выклікала асобныя пярэчанні з боку эканамістаў, якія (прынамсі, у разгляданую намі эпоху) належалі да неакласічнае школы. Менавіта тады ўзнікла схема, якой мы сёння даем найменне "рынкавага сацыялізму", або "дэцэнтралізаванага сацыялізму".

А) Немагчымасць знікнення вартасці

Маркс сцвярджаў, што разам з капіталізмам знікнуць вартасць і цэны. Ягоныя паслядоўнікі на працягу доўгага часу абаранялі гэты тэзіс. Каб паказаць, што сацыялізм немагчымы, галяндскі эканаміст Н. Дж. Пірсан у 1902 г. у артыкуле *"Праблема вартасці ў сацыялістычным грамадстве"*, надрукаваным у часопісе *"De Economist"*, вылучыў тэзіс, адпаведна з якім знікненне вартасці немагчымае[1].

Артыкул Пірсана пачынаецца са сцверджання, што заўсёды трэба звяртацца да вартасці, каб існаваў абмен тавамі паміж рознымі народамі. Ён зазначаў, што сацыялістычнае грамадства павінна будзе ацэньваць тавары, каб вызначыць ровень чыстага даходу, які яно можа спажываць, не змяншаючы пры гэтым сваіх вытворчых магутнасцяў. У выніку Пірсан прыйшоў да праблемы размеркавання тавараў паміж індывідамі.

На яго думку, калі няма вартасці, а значыць, няма ні цэнаў, ні грашовых даходаў, дык трэба дапускаць, што індывідам залежна ад катэгорыі, да якой яны належаць і якая вызначае іхныя патрэбы, будуць размяркоўвацца сер-

[1] *Артыкул перадрукаваны ў зборніку, выдадзеным Ф. А. Гаекам пад назовам Collectivist Economic planning, London, 1935; traduction française: L'économie dirigée en régime collectiviste, Paris, 1939.*

тыфікаты, а яны даюць права на вызначаныя колькасці вызначаных тавараў. Але становішча індывідаў няспынна змяняецца. Значыцца, трэба будзе ўводзіць папраўкі.

"Папраўкі, — пісаў Пірсан, — палягаюць у тым, што абмен сертыфікатамі будзе дазволены толькі ў дзяржаўных крамах. Чалавек, які, паводле ягонага ўласнага меркавання, будзе атрымліваць занадта мала сертыфікатаў на асобны тавар, зможа атрымаць большую колькасць гэтага тавару наўзамен сертыфікатаў на нейкі іншы тавар. Відавочна, паўстае праблема вартасці. Індывід, які жадае пазбавіцца нейкай рэчы, каб за яе атрымаць іншую рэч, больш цэніць другую, чым першую. Праблема вартасці зводзіцца да ўсталявання належнага тарыфу для гэткага законнага абмену"[1].

Аўтар дадаваў, што тарыф павінны часта змяняцца, каб улічваць фактары, якія выклікаюць змены ў даступных колькасцях тавараў (напрыклад, добрыя або кепскія ўраджаі). Але асабліва падкрэсліваў, што кожны індывід будзе мець сваю прыватную ацэнку значэння дадатковай колькасці нейкага тавару. Асобныя індывіды праз абмен сертыфікатаў на аснове ўсталяванага тарыфу будуць атрымліваць большую выгаду.

"У выніку на авансцэне — зноў гандлёвы прынцып, які грамадства дарэмна імкнулася скасаваць. Прыбыткі, што дзяржава магла б зарэзерваваць для самое сябе, трапляюць у рукі прыватных асобаў. Феномен вартасці можна зліквідаваць з такім жа поспехам, як і сілу цяжару. Усё, што ёсць рэдкае і карыснае, мае *вартасць*"[2].

Пасля разгляду самай распрацаванай формы камунізму Пірсан звяртаўся да таго, што ў марксісцкай дактрыне называецца першаю фазаю камунізму — ладу, у якім размеркаванне тавараў будзе ажыццяўляцца праз размеркаванне бонаў працы не адпаведна з патрэбамі, а залежна ад выдаткаванай працы.

"Неабавязкова, — пісаў Пірсан, — прыводзіць прыклады кепскіх ураджаяў, спынення паставак ды іншых прычынаў

[1] *L'économie dirigée en régime collectiviste, op. cit., p. 74.*
[2] *Ibid., p. 75.*

нармальнага павелічэння попыту на асобныя тавары, каб паказаць, што гэты метад вызначэння вартасці прывёў бы да феномена, пра ўзнікненне якога мы гаварылі раней, — да гандлю. Рэчы, якія з прычыны іхных нутраных або вонкавых якасцяў лепей прыстасаваныя да густаў публікі, мелі б большую вартасць, чым іншыя рэчы, якія каштавалі б столькі ж працы; і натуральна, што першых патрабуецца больш наўзамен бонаў працы"[1].

Гэткая аргументацыя падаецца цалкам слушнай. Ейная слушнасць была ў значнай ступені пацверджаная досведам СССР. Пасля кароткага перыяду пад час "ваеннага камунізму", калі паспрабавалі зліквідаваць грошы, а значыць, і абмен таварамі на аснове іхных вартасцяў, давялося рабіць задні ход. Далей мы пабачым, якія праблемы паўсталі ў сацыялістычнай эканоміцы разам з фактычным захаваннем вартасці.

Даследванне Пірсана на працягу доўгага часу заставалася невядомым для бальшыні эканамістаў, бо было напісанае на галяндскай мове і спатрэбілася шмат часу, каб перакласці яго на адну з асноўных эўрапейскіх моваў.

Але гэткія ж аргументы падае і вядомы аўстрыйскі аўтар Людвіг фон Мізез, які ў 1920 г. у часопісе *"Archiv fur Sozialwissenschaften"* апублікаваў артыкул пад назовам *"Эканамічны разлік у сацыялістычным грамадстве"*.

В) Немагчымасць вызначэння *a priori* сама выгадных метадаў вытворчасці ў сацыялістычнай эканоміцы

У сваім *"Падручніку па палітычнай эканоміі"* 1906 г. Вільфрэда Парэта ўзняў праблему ўмоваў функцыянавання сацыялістычнай эканомікі і выказаў на гэты конт цікавыя думкі.

"Цэны, чыстыя працэнты ад капіталаў, — пісаў ён, — могуць знікнуць як рэальныя адзінкі (калі, аднак, гэта магчыма), але застануцца як уліковыя адзінкі; без іх міністэрства вытворчасці працавала б з завязанымі вачыма і не ведала б, якім чынам арганізаваць вытворчасць"[2].

[1] *Ibid., p. 79.*
[2] *Op. cit., p. 362.*

Парэта дадаваў: калі вытворчасць арганізуецца дзяржаўнымі службоўцамі, дык выдаткі на кіраванне могуць быць большымі, чым у выпадку ліберальнай эканомікі.

Урэшце ён сцвярджаў: "Чыстая эканоміка не дае нам сапраўды вырашальнага крытэру, каб зрабіць выбар паміж арганізацыяй грамадства, заснаванай на прыватнай уласнасці, і ягонай сацыялістычнай арганізацыяй"[1].

Заява можа выклікаць здзіўленне, але яна знаходзіць тлумачэнне, калі ўлічваць, што Парэта быў супраціўнікам сацыялізму галоўным чынам з "маральных" прычынаў. У сацыялізме ён бачыў рэалізацыю эгалітарнага ідэалу, да якога ставіўся вельмі варожа.

Яшчэ адзін італьянскі эканаміст прафесар у Падуі Энрыка Баронэ распрацаваў далей пытанне, узнятае Парэта. У 1908 г. у *"Il Giornale degli economisti"* ён апублікаваў вядомы артыкул пад назовам *"Міністр вытворчасці ў калектывісцкай эканоміцы"*[2].

Свой артыкул Баронэ пачаў з доказу, што свабодная канкурэнцыя мае два асноўныя наступствы: 1) забяспечвае роўнасць цэнаў тавараў з выдаткамі вытворчасці; 2) зводзіць да мінімуму выдаткі вытворчасці. Праз гэта свабодная канкурэнцыя дазваляе дасягнуць становішча, у якім усялякая змена пацягне за сабой "разбурэнне багацця".

Гэтае становішча, якое аўтар называў "максімумам свабоднай канкурэнцыі", вызначалася ім гэтак: "Мы паўтараем, што максімум проста азначае наступнае: нельга палепшыць становішча *ўсіх* праз замену на іншыя ўмовы адной або некалькіх характэрных рысаў свабоднай канкурэнцыі (мінімальныя выдаткі вытворчасці, роўнасць коштаў і выдаткаў вытворчасці). Наадварот, калі б асобныя індывіды атрымлівалі выгады ад гэткае замены, дык іхны здабытак быў бы меншы за страты, якія цярпелі б усе іншыя"[3].

Канцэпцыя перавагаў канкурэнтнага становішча, вылучаная Баронэ, не мела вялікага поспеху, бо, як бачна, яна

[1] *Ibid., p. 364.*

[2] *Гэты артыкул быў перадрукаваны ва ўжо цытаваным зборніку Ф. А. Гаека і ў зборніку "Socialist Economics", Penguin Books, 1972.*

[3] *Гл. L'économie dirigée en régime collectiviste, op. cit., p. 257.*

яшчэ ўлічвала параўнанне задавальненняў, атрыманых індывідамі. Паняцце оптымуму, вылучанае ў 1906 г. Парэта, справядліва пераважыла. Дарэчы, умовы дасягнення "максімуму" Баронэ не адрозніваюцца ад умоваў дасягнення "оптымуму" Парэта. Абодва аўтары — вучні Вальраса, і яны працавалі зыходзячы з неакласічнай схемы эканомікі. І першы і другі дапускалі, што пры канкурэнтным становішчы маржынальныя карыснасці тавараў для ўсіх спажыўцоў знаходзяцца ў аднолькавых стасунках, як і кошты.

З другога боку, паводле Парэта, свабодная канкурэнцыя забяспечвае роўнасць маржынальных прадукцыйнасцяў фактараў вытворчасці з іхнімі коштамі і знішчае пры гэтым усе "чыстыя прыбыткі". Можна заўважыць, што гэтыя ўмовы зводзяцца да ўмоваў, сфармуляваных Баронэ.

Калі няма "чыстых прыбыткаў", дык гэта азначае, што кошты прадуктаў роўныя выдаткам іхнай вытворчасці. А калі маржынальныя прадукцыйнасці фактараў вытворчасці роўныя іхным коштам, то немагчыма праз змены ў выкарыстанні аднаго фактару вытворчасці атрымаць чысты прыбытак (знізіць выдаткі вытворчасці аднаго прадукту ніжэй за цану яго продажу). А гэта азначае, што выдаткі — мінімальныя.

Цяпер разгледзім сацыялістычную эканоміку. Як сцвярджаў Баронэ, міністр вытворчасці мусіў бы імкнуцца забяспечыць "максімум дабрабыту" для ўсіх грамадзянаў, зважаючы на абраныя крытэры справядлівага размеркавання гэтага дабрабыту. Дзеля гэтага варта было б з дапамогаю грошай, коштаў і грашовых даходаў рабіць тое сама, што робіць свабодная канкурэнцыя.

"З паказанага і даказанага вышэй, — пісаў Баронэ на заканчэнне свайго даследвання, — яскрава вынікае фантастычны характар падобных дактрынаў, у якіх уяўляецца, што арганізацыя вытворчасці ў калектывісцкай сістэме будзе істотна адрозніваца ад таго, што адбываецца ў "анархічнай" вытворчасці.

Калі міністр вытворчасці вызначае ў якасці мэты дасягненне калектыўнага максімуму (відавочна, гэта яно і мусіць рабіць, які б не быў абраны закон размеркавання), дык павінны зноў паўстаць усе эканамічныя катэгорыі Старога

Рэжыму, хоць, магчыма, і пад новымі назовамі: кошт, заробкі, працэнт, рэнта, прыбытак, ашчаджанне і г. д. І гэта яшчэ не ўсё. Паколькі ён заўсёды будзе жадаць калектыўнага дасягнення максімуму з выкарыстаннем паслугаў, якімі валодаюць індывіды і супольнасць, дык зноў паўстануць абедзве фундаментальныя ўмовы, якімі характарызуецца свабодная канкурэнцыя..."[1]

Але ці сапраўды зможа дасягнуць пазначанага "максімуму" міністр вытворчасці, нават калі ён пагодзіцца з аднаўленнем грошай, цэнаў і грашовых даходаў? На думку аўтара, для гэтага варта было б развязаць сістэму раўнанняў, ідэнтычную той, пра якую піша эканаміст, каб паказаць наступствы свабоднай канкурэнцыі. А гэта не можа быць зроблена.

Значыцца, сацыялізм немагчымы? Баронэ, здаецца, не рабіў такой высновы. Думаецца, ён прапаноўваў сродак дасягнення аптымальнага становішча.

"Вызначэнне эканамічна найбольш выгадных каэфіцыентаў, — пісаў ён, — можа ажыццяўляцца толькі *эксперыментальным шляхам*, і не ў абмежаваных памерах (дапусцім, у нейкай лабараторыі), а ў *вельмі шырокім маштабе*, бо часта выгады, атрыманыя ад пэўных зменаў, паходзяць менавіта з пашырэння дзейнасці прадпрыемства"[2].

Асобныя аўтары-сацыялісты, дадаваў Баронэ, адзначаюць, што канкурэнцыя вядзе да заўсёднага руйнавання асобных фірмаў, тых, выдаткі якіх найвышэйшыя, і на падставе гэтага мяркуюць, што дзякуючы сацыялізму можна было б пазбегнуць стратаў, якія выклікаюцца падобнымі "эксперыментамі". А якраз, наадварот, трэба гаварыць, што сацыялізм абавязкова павінен быў бы звяртацца да такіх эксперыментаў. Выснова, выразна не выказаная аўтарам, можа быць такая: нельга чакаць істотных перавагаў ад сацыялізму.

В) Ідэя рынкавага сацыялізму

Дыяметральна супрацьлеглае думкам Баронэ меркаванне выказаў эканаміст-неакласік Г. Д. Дыкінсан у артыкуле *"Ут-*

[1] *Ibid., p. 289.*
[2] *Ibid., p. 288.*

варэнне коштаў у сацыялістычным грамадстве", які быў апублікаваны ў брытанскім часопісе *"Economic Journal"* у чэрвені 1933 г. Ён лічыў, што на аснове статыстычных дадзеных можна пабудаваць крывыя попыту і прапановы для ўсіх тавараў і паслугаў, а таксама фіксаваць усе цэны на роўні, які адпавядае агульнай раўнавазе ў эканоміцы. Дыкінсан пісаў: "Бліскучыя сістэмы эканамічнай раўнавагі, апісаныя Бём-Бавэркам, Маршалам і Касэлем, не з'яўляюцца апісаннямі грамадства такім, якое яно ёсць; яны паўстаюць як прарочыя бачанні будучага сацыялістычнага грамадства"[1].

Досвед апошняга часу, здаецца, не спраўджвае высновы Дыкінсана. Аднак на пачатку свайго даследвання ён пазначыў іншы шлях пабудовы сацыялізму, які дазваляў бы прадпрыемствам удасканальваць іхную вытворчасць і попыт на фактары вытворчасці ў залежнасці ад кан'юнктуры і тэхнічных магчымасцяў. Гэткае развязанне прапануецца "рынкавым сацыялізмам".

Найбольш вядомае тлумачэнне гэтага развязання мы знойдзем у Оскара Лангэ ў артыкуле *"Пра эканамічную тэорыю сацыялізму"*, апублікаваным у брытанскім часопісе *"Review of economic studies"* за 1936/37 універсітэцкі год[2].

Лангэ — польскі эканаміст, у тыя часы выкладчык у ЗША; ён быў вядомы сваімі даследваннямі, якія грунтаваліся на неакласічнай сістэме. Пасля Другой сусветнай вайны Лангэ выкладаў у Польшчы і займаў там афіцыйныя пасады. Тады ён называў сябе марксістам і ўжо не абараняў ідэі, якія выказваў да вайны. Аднак перад цяжкасцямі функцыянавання, з якімі сутыкнуліся эканомікі савецкага тыпу, асобныя эканамісты як на Усходзе, так і на Захадзе паспрабавалі сцвярджаць, што для пабудовы сацыялізму варта было б абапірацца на ідэі, якія абараняў Лангэ напярэдадні Другой сусветнай вайны.

У 1936—1937 гг. Лангэ сцвярджаў, што павінны быць адкінутыя спрэчкі пра магчымасці стварэння і развязання вельмі складанай сістэмы раўнанняў з мэтай усталяваць рацыянальныя цэны ў сацыялістычнай эканоміцы.

---

[1] *Economic Journal, 1933, p. 247.*

[2] *Новае выданне ў зборніку Socialist Economics, Penguin Books, 1972.*

Ён пісаў: існуе вельмі просты сродак, каб знайсці раўнаважныя цэны, — напачатку фіксаваць якія-небудзь цэны (фактычна на аснове гістарычнага досведу), прасачыць — роўная, большая ці меншая за попыт прапанова, а потым мяняць цэны праз "пошукі навобмацак" да таго часу, пакуль не будзе дасягнутая раўнавага на ўсіх рынках.

Значыцца, трэба забяспечыць індывідам поўную свабоду ў прапанове іхных працоўных паслугаў там, дзе яны пажадаюць, але за фіксаваныя заробкі, а таксама за поўную свабоду ў попыце на тавары, якія яны захочуць, але па фіксаваных цэнах.

З іншага боку, трэба загадаць кіраўнікам прадпрыемстваў, якія будуць дзяржаўнымі службоўцамі, выбіраць такія метады вытворчасці, пры якіх сярэднія выдаткі вытворчасці, падлічаныя на аснове цэнаў, усталяваных Цэнтральным бюро планавання, будуць найменшыя. У выніку заўсёды будзе вядомы сукупны попыт на працу і на прамежкавыя тавары (Лангэ не гаварыў пра прыродныя фактары).

Для вызначэння прапановы тавараў Лангэ раіў усталяваць іншае правіла, якое для кіраўнікоў адзінак і галінаў вытворчасці палягала ў наступным: прапаноўваць такую колькасць тавараў, для якіх гранічныя выдаткі (прадпрыемства або галіны) былі роўныя фіксаваным цэнам. Калі дапусціць, як мы гэта рабілі раней, што выдаткі не залежаць ад вырабленых колькасцяў, дык ад гэтага правіла не будзе ніякай карысці, як гэта зазначаў Лангэ. Для кошту, роўнага сярэднім выдаткам вытворчасці, існуе прапанова неабмежаванай эластычнасці.

І на аснове такога попыту і прапановы можна распачаць аперацыі ўдасканальвання цэнаў, што дазваляюць дасягнуць агульнай раўнавагі ў эканоміцы.

Лангэ падкрэсліваў, што пры стане раўнавагі маржынальная прадукцыйнасць кожнага фактару пры ўсялякім яго выкарыстанні роўная кошту гэтага фактару, бо прадпрыемства ніякім чынам не можа знізіць выдаткі сваёй вытворчасці. Значыць, ён, па сутнасці, дапускаў, што аптымальнае становішча — гэта сённяшняя рэальнасць, і рабіў выснову: "Нашае даследванне вызначэння раўнаважных цэнаў у са-

цыялістычнай эканомікі паказала, што працэс вызначэння коштаў у ёй цалкам аналагічны працэсу вызначэння коштаў на канкурэнтным рынку... Цэнтральнае бюро планавання выконвае функцыі рынку... Замена на планаванне функцыяў, што выконваліся рынкам, цалкам магчымая і здзяйсняльная"[1].

Жадаючы прытрымлівацца вучэння неакласічнае школы, Лангэ настойваў на тым, што заробкі, якія выплочваюцца адзінкамі вытворчасці, павінны будуць адпавядаць "маржынальнай антыкарыснасці працы" ва ўсіх разнастайных занятках. Гэта значыць яны павінны будуць адпавядаць коштам, якія, паводле неакласічнае школы, вызначаюцца ў ліберальнай сістэме, калі рынак працы дасканала канкурэнтны. Норма працэнта таксама будзе фіксавацца на роўні, дзе забяспечваецца выроўніванне попыту і прапановы капіталу.

Дарэчы, калі Лангэ дапускаў, што пры сацыялізме можа быць прыняты прынцып вызначэння даходаў, які адрозніваецца ад таго, што пануе ў ліберальнай сістэме, дык ён прапаноўваў, каб дзяржава размяркоўвала індывідам "сацыяльныя дывідэнды", якія дапасоўваліся б да іхных заробкаў. Сацыяльныя дывідэнды павінны размяркоўвацца "так, каб яны ніяк не ўплывалі на выбар заняткаў"[2].

Такое імкненне дакладна адшукаць у сацыялізме Вальрасаву агульную раўнавагу надзвычай тыповае. Аўтар ніколі не ўздымаў пытання занятасці працоўнай сілы. Ён дапускаў, што для кожнай катэгорыі працоўнай сілы павінны фіксавацца такі заробак, які зробіць роўнымі попыт і прапанову на яе.

Не выключана, аднак, што гэты заробак можа быць вельмі нізкі ці нават адмоўны. Відаць, можна сказаць, што ў сістэме Лангэ "сацыяльныя дывідэнды" будуць у такім выпадку дастаткова высокія, каб усё ж забяспечыць найманаму працаўніку ягоны "адпаведны даход". Але гэта супярэчыла б прынцыпу размеркавання "сацыяльных дывідэндаў" незалежна ад характару заняткаў. На практыцы сацыяліс-

[1] *Socialist Economics, op. cit., p. 99.*
[2] *Ibid., p. 100.*

тычная дзяржава, бадай, не можа так пасіўна, як меркаваў Лангэ, ставіцца да вызначэння заробкаў.

Звыш гэтае прыватнае крытыкі ўся сістэма польскага эканаміста, здаецца, вельмі грашыць празмерным аптымізмам.

"Думаецца, — пісаў Лангэ, — што працэдура пошукаў навобмацак (у дачыненні да фіксавання коштаў і памераў вытворчасці) функцыянавала б ці, прынамсі, магла б функцыянаваць многа лепш у сацыялістычнай эканоміцы, чым яна цяпер функцыянуе пры канкурэнтным рынку. Калі Цэнтральнае бюро планавання значна лепей за прыватнага прадпрымальніка ведае, што адбываецца ва ўсёй эканамічнай сістэме, магчыма, яно здольнае дасягнуць сапраўдных раўнаважных коштаў дзякуючы шэрагу *намнога карацейшых* паслядоўных спробаў, чым гэта ўзапраўды адбываецца на канкурэнтным рынку"[1].

Лангэ дапускаў, што сацыялістычная дзяржава будзе мець паслухмяных і лаяльных кіраўнікоў прадпрыемстваў і галінаў. Яны прыкладуць усе намаганні, як і прадпрымальнікі-капіталісты, каб адшукаць сама нізкія выдаткі вытворчасці, і з поўнай аб'ектыўнасцю пададуць звесткі, што патрабуюцца для бюро планавання (якое не плануе, а фіксуе цэны), у дачыненні да роўню вытворчасці і попыту на прадукты іхнай вытворчасці.

Аднак жыццё паказала, што, для таго каб дырэктары сацыялістычных прадпрыемстваў прыкладалі вялікія намаганні ў справе паніжэння выдаткаў, яны павінны быць зацікаўленыя ў прыбытках прадпрыемстваў. Але зацікаўленасць у прыбытках сама па сабе, здаецца, не можа лёгка ўвайсці ў схему вызначэння даходаў, прадугледжаную Лангэ. Больш за тое, гэта стварае яшчэ адну праблему, развязаць якую не здолелі краіны Усходняй Эўропы: праблему аб'ектыўнасці інфармацыі, якую паведамлялі дырэктары.

Сапраўды, калі дырэктары даюць інфармацыю пра тое, што попыт на нейкі прадукт ніжэйшы за прапанову, дык яны павінны чакаць, што панізіцца кошт продажу гэтага прадукту, а значыць, паменшацца прыбыткі прадпрыемстваў і да-

[1] *Ibid., p. 104.*

ходы дырэктараў. Такім чынам, трэба баяцца, што ў прапанаванай сістэме дырэктары будуць часта перадаваць недакладную інфармацыю. Магчыма, бюро планавання і змажа знайсці сродкі, каб вызначыць яе праўдзівасць, але неабавязкова. І ў кожным разе будуць губляцца перавагі ў хуткасці атрымання інфармацыі, пра якія пісаў Лангэ.

На практыцы капіталістычная эканоміка ў большай ступені сведчыць пра надзвычайную хуткасць адаптацыі да зменаў умоваў попыту і прапановы. Хоць кожны асобны прадпрымальнік мае толькі абмежаванае бачанне эканомікі, ён няспынна сочыць за звесткамі, якія падкажуць, што, каб атрымаць прыбытак, трэба вырабляць раней за ўсіх тавар, на які будзе попыт з боку спажыўцоў, ці, каб пазбегнуць стратаў, трэба своечасова скараціць вытворчасць нейкага тавару, попыт на які будзе памяншацца. Перад намі спробы прадбачання ваганняў попыту і прапановы, але наўрад яны будуць лёгка выкарыстоўвацца ў цалкам адзяржаўленай эканоміцы. Даследванне Лангэ — даволі тыповы прыклад недаацэнкі перавагаў капіталізму (якія існуюць побач з ягонымі адмоўнымі бакамі) і крайняга аптымізму ў дачыненні да ўмоваў функцыянавання сацыялістычнай эканомікі.

Бібліяграфія

Каб мець уяўленне пра стан неакласічнай тэорыі ў нядаўнія часы, можна выкарыстаць наступныя кнігі:

J. R. Hicks, *Valeur et capital*, London, 1939, trad. française, Paris, 1956.

W. J. Baumol, *Théorie économique et recherche opérationnelle*, Englewood Cliffs (E.-U.), 1961, trad. franç., Paris, 1963.

B. Guerrien, *La théorie néo-classique*, Paris, 1989.

J. F. Henry, *The Making of Neo-classical Economics*, Boston, 1990.

J. M. Henderson and R. E. Quandt, *Micro-economic Theory*, New York, 1980; trad. franç., Paris, 1981.

Раздзел III

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ДАКТРЫНА: ВЫПРАБАВАННЕ НА ПРАКТЫЦЫ

Пад час перыяду, які мы зараз разгледзім, у 1917 г., нарадзілася першая сацыялістычная дзяржава. Яе стваральнік Ленін абвяшчаў сябе прыхільнікам вучэння Карла Маркса. Тое сама рабілі і паслядоўнікі Леніна. Але не варта лічыць, што рэвалюцыя 1917 г. і пабудова сацыялізму адбыліся адпаведна з прадбачаннямі Маркса. Наадварот, неабходна падкрэсліць, што Маркс не прадбачыў вялікага ўздыму каланіяльнай экспансіі пры канцы XIX ст. З другога боку, хоць на схіле свайго жыцця ён і дапускаў, што рэвалюцыя ў Расеі зможа стаць "сігналам" пралетарскай рэвалюцыі, аднак не ўяўляў, што першапачаткова сацыялізм усталюецца, дый яшчэ выключным чынам, у настолькі слабаразвітай краіне, якой была Расейская імперыя.

Маркс прадугледжваў, што пралетарызацыя масаў, пагаршэнне ўмоваў іх існавання, канцэнтрацыя ўлады над капіталам спрычыняцца да паступовага абвастрэння класавай барацьбы. Канцэнтрацыя капіталу сапраўды адбывалася ў працэсе стварэння трэстаў і картэляў, а таксама ў выніку павелічэння ўплыву банкаў на апарат капіталістычнай вытворчасці. Тэндэнцыя да пралетарызацыі і паўперызацыі масаў, наадварот, была ў значнай ступені зведзена на нішто.

На самой справе пласт сялянаў (якія ў разуменні Маркса не з'яўляюцца пралетарамі, бо маюць пэўныя сродкі вытворчасці) імкліва памяншаўся ў такіх краінах, як Англельшчына і Нямеччына.

А тым часам усё большую долю ў складзе насельніцтва займала сацыяльная катэгорыя, якой Маркс не надаваў вялікага значэння: катэгорыя службоўцаў і спецыялістаў у прамысловасці і гандлі. Гэта найманыя працаўнікі, але задачы, якія яны выконваюць, фізічна менш цяжкія і дазваляюць ім усталёўваць у сваім жыцці асобныя аспекты буржуазнага ладу: гэта работнікі "з белымі каўнерыкамі". Калі рабочы, які выконваў фізічную працу, у XIX ст. не меў практычна ніякага спадзявання ні на пераадоленне свайго ніжэйшага становішча, ні на пазбаўленне ад яго сваіх дзя-

цей, дык зусім не так гэта адбывалася ў службоўцаў і спецыялістаў. У самой "бюракратыі" існавала цэлая ерархія функцыяў, і просты службовец мог спадзявацца стаць адным з тых "дырэктараў", якія хоць і не валодалі капіталамі, але разглядаліся як частка кіраўнічага класа. Нарэшце, умовы жыцця службоўцаў дазвалялі ім даць вышэйшую адукацыю дзецям і праз гэта далучыць іх да шэрагаў буржуазіі. З гэтых прычынаў дадзены сацыяльны пласт не адчуваў сябе салідарным з працоўнымі і ў асноўным адмаўляўся прыняць рэвалюцыйныя погляды.

У Вялікабрытаніі доля працоўных, якім плацілі "штотыднёва" (гэта значыць практычна рабочых фізічнай працы) у сукупнасці занятага насельніцтва зменшылася з 84 працэнтаў у 1870 г. да 74 працэнтаў у 1913 г.[1] Адбывалася гэта таму, што колькасць службоўцаў, якім заробак выплочваўся "штомесяц", значна павялічылася.

У Нямеччыне доля найманых работнікаў фізічнай працы ў агульнай колькасці актыўнага насельніцтва ніколі не перавышала 50 працэнтаў; а з 1895 г. гэтая прапорцыя злёгку паменшылася[2].

Такім чынам, насуперак прадказанням Маркса не бачна, каб бясконца павялічвалася колькасць прадстаўнікоў класа, які, паводле ягонага меркавання, мусіць быць рэвалюцыйным класам. Але, дарэчы, можна заўважыць таксама, што ўмовы жыцця гэтага класа мелі тэндэнцыю да паляпшэння. У развітых краінах прадукцыйнасць працы працягвала павялічвацца. Хоць і не існуе ніякага эканамічнага закону, які звязваў бы заробак пры капіталістычным ладзе з прадукцыйнасцю працы, аднак відавочна, што рост прадукцыйнасці падвышае шансы найманых працаўнікоў на павелічэнне іхных даходаў.

Сапраўды, працадавальнікі з большай лёгкасцю пагодзяцца на выплату больш высокіх рэальных заробкаў, калі павелічэнне прадукцыйнасці дазваляе ім тым не менш рэалізоўваць высокія нормы прыбытку.

---

[1] *Cf. Phelps Brown et Hart, The share of wages in the national income*, Economic Journal, *juin 1952.*

[2] *Cf. Sternberg, Le conflit du siècle, Paris, 1958, p. 118.*

Найманыя працаўнікі атрымлівалі прыбаўку да заробкаў, бо цяпер яны перш за ўсё былі больш здольныя на барацьбу, чым на пачатку XIX ст. Рынак працы ў прамысловасці ўжо не браў у настолькі значнай ступені рэсурсы ад прытоку неадукаваных, зведзеных да самай крайняй галечы сялянаў. Апрача таго, паступова набывалі моц арганізацыі працаўнікоў і ўзнікалі рабочыя партыі.

Нарэшце, варта падкрэсліць, што павелічэнню заробкаў паспрыяла змена ў эвалюцыі стасункаў цэнаў на прамысловыя вырабы і цэнаў на сельскагаспадарчыя прадукты.

У першай палове XIX ст. у індустрыялізаваных рэгіёнах гэтыя стасункі імкліва зменшыліся. Праз паступовае памяншэнне рэлятыўнага кошту сваіх прадуктаў капіталістычная прамысловасць заваёўвала новыя рынкі. Гэта пацвярджалася становішчам як у самой капіталістычнай краіне, так і яе стасункамі з неіндустрыялізаванымі рэгіёнамі. Менавіта праз гэта "ўмовы гандлю" Вялікабрытаніі з замежжам (гэта значыць у тую эпоху практычна з неіндустрыялізаванымі рэгіёнамі) імкліва "пагоршыліся": цэны на экспарт паменшыліся ў параўнанні з цэнамі на імпарт. Дарэчы, такую эвалюцыю можна разглядаць як "нармальнае" наступства росту прадукцыйнасці працы ў буйной прамысловасці.

А вось рэальны заробак заставаўся ранейшы, пакуль не змянілася частка, якую займаў у кошце тавару заробак найманых працаўнікоў.

Калі, напрыклад, прадукцыйнасць працы ў прамысловасці падвойваецца і цэны на прамысловыя вырабы памяншаюцца на 50 працэнтаў, дык грашовая вартасць тавару на аднаго рабочага застаецца ранейшай. Калі намінальны заробак уяўляе сабой сталую частку ў грашовай вартасці тавару, дык ён, такім чынам, не мяняецца. А калі мы дапусцім, што цэны на прадукты харчавання не змяніліся, дык рэальны заробак таксама застаецца на ранейшым роўні.

У эпоху, да якой мы падышлі, становішча карэнным чынам мяняецца. Імклівае асвойванне новых земляў (Злучаныя Штаты Амэрыкі, Аўстралія, Новая Зеландыя, Канада) эмігрантамі, якія прыехалі з Эўропы, развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці ў іншых рэгіёнах (у прыватнасці, у

Лацінскай Амэрыцы), дзякуючы эўрапейскім капіталам, выклікалі тым часам зніжэнне цэнаў на сельскагаспадарчыя прадукты нават больш імклівае, чым на прамысловыя вырабы. Ва ўзаемадачыненнях з неіндустрыяльнымі краінамі "ўмовы гандлю" развітых краінаў перасталі пагаршацца, а часам нават паляпшаліся. Безумоўна, гэта спрыяла павелічэнню рэальных заробкаў[1].

Аднак такі тып эвалюцыі можна канстатаваць толькі ў найбольш перадавых краінах Заходняй Эўропы. Шырокія прасторы на ўсходзе, у цэнтры і на поўдні Эўропы заставаліся пераважна сельскагаспадарчымі і феадальнымі, хоць часам — гэта, у прыватнасці, выпадак Расеі — пачынала разгортвацца новая прамысловасць, якая фінансавалася замежнымі капіталамі. Нават у межах самой Эўропы ўсталяваўся кантраст паміж індустрыялізаванымі і слабаразвітымі рэгіёнамі; у апошніх звычайнай з'явай была галеча і нават голад.

Сукупнасць усіх гэтых акалічнасцяў непасрэдна ўплывала на вельмі разнастайнае развіццё ідэяў у межах сацыялістычнага руху. З аднаго боку, у ім па-ранейшаму канстатавалася існаванне розных формаў "утапічных" падыходаў, якія мы сустракалі ў першай палове XIX ст. Па-другое, пачаў развівацца, асабліва ў Англельшчыне, "рэфармісцкі" сацыялізм, прадстаўнікі якога лічылі, што пераўтварэння грамадства можна дасягнуць праз уздзеянне на дзяржаву, калі яна пакрысе будзе ажыццяўляць разнастайныя праекты сацыяльных рэформаў. У такіх краінах, як Нямеччына і Францыя, дзе шырока распаўсюдзіўся марксізм, сацыялісты, спакушаныя рэфармісцкім падыходам, распачалі перагляд ("рэвізію") творчасці Маркса і атрымалі найменне "рэвізіяністаў". Нарэшце, у краіне, роля якой у канчатковым рахунку будзе вызначальный, — Расеі — марксізм набыў своеасаблівы выгляд, якому мы мусім даць апісанне.

---

[1] *Пры жаданні зразумець, наколькі кіраўнічы, а таксама рабочы клас у Англельшчыне ўсведамлялі перавагі, атрыманыя дзякуючы імперыялізму, можна паглядзець вельмі цікавую працу Bernard Semmel, Imperialism and Social Reform, Cambridge (Massachusetts), 1960.*

§ 1. Утапічныя плыні ў сацыялістычным руху

На працягу ўсяго XIX ст. вялікія утапісты першай паловы XIX ст. працягвалі ўплываць на сацыялістычны рух. У французскіх утапістаў знайшлося шмат паслядоўнікаў у Злучаных Штатах. Ангельскі сацыялізм доўга абвяшчаў сябе прадаўжальнікам "кааператывізму" Робэрта Оўэна. Аднак у другой палове XIX ст. паўсталі новыя формы утапічнага сацыялізму. Спачатку гэта расейскае "народніцтва". Потым анархізм: ён распаўсюджваўся ў Заходняй Эўропе двума вядомымі расейскімі рэвалюцыянерамі, якія спалучылі свае ўласныя ідэі з асобнымі тэзісамі Прудона.

А) Расейскае народніцтва

Пачынальнік народніцтва — расейскі інтэлігент Аляксандр Герцэн (1812—1870), паходжаннем з дваран. З 1847 г., пасля выгнання, жыў у Заходняй Эўропе. Чалавек высокай культуры, ён лічыў сябе вучнем Гегеля, сама меней Гегеля першага перыяду — перыяду *"Фенаменалогіі духу"*.

"Філасофія Гегеля, — пісаў Герцэн, — гэта алгебра рэвалюцыі, яна надзвычайным чынам вызваляе чалавека і зверху да нізу разбурае хрысціянскі свет, свет састарэлых традыцыяў"[1].

Апрача таго, Герцэн пад уплывам Фоербаха прыняў матэрыялістычны падыход у філасофіі і, здаецца, быў гатовы пайсці па шляху, пракладзеным Марксам. Але ён бачыў пагрозу рэвалюцыйнаму руху 1848 г. у Еўропе і прыйшоў да высновы, што на Захадзе нічога не зможа адбыцца, бо капіталізм глыбока сапсаваў чалавека ва ўсіх грамадскіх класах. Ад гэтага часу Герцэн лічыў, што сацыяльная рэвалюцыя адбудзецца ў Расеі, чыстай ад заражэння капіталізмам. Расейскае сялянства, якое бязлітасна прыгнятаецца дваранствам, уздыме паўстанне і на аснове яшчэ наяўных у вёсцы абшчынных інстытуцый у прынцыпе арганізуе сістэму перыядычнага падзелу земляў залежна ад патрэбаў і працоўных магчымасцяў кожнай сям'і. Вельмі варожы да камунізму, Герцэн сцвярджаў, што неабходна ажыццявіць "суве-

[1] *"La Jeune Moscou", extrait de Mémoires et Pensées, publié en 1855, reproduit dans Herzen, Textes philosophiques choisis, 2e éd., Moscou, p. 555.*

рэннае права кожнага чалавека на індывідуальную ўласнасць"[1].

Відавочна, што такая дактрына брала натхненне ў асобных поглядах Гегеля, які разглядаў уласнасць як першасную рэалізацыю чалавечай асобы. Але таксама можна заўважыць, што прапанаванае Герцэнам тлумачэнне гісторыі, урэшце, з'яўляецца вельмі аддаленым ад таго, якое прапаноўваў Гегель. Сапраўды, Герцэн спрабаваў перанесці ў новы палітычны кантэкст старую сацыяльную інстытуцыю: гэта, безумоўна, ёсць адмаўленнем Гегелевай ідэі, згодна з якой усе формы сацыяльнага жыцця на пэўны момант утвараюць "цэласнасць", з яе немагчыма ізаляваць нейкі элемент, які лічыцца "добрым", у той час калі ўсё астатняе застанецца "дрэнным".

У 60-х гадах XIX ст. у Расеі самым вядомым з расейскіх сацыялістаў быў Нікалай Чарнышэўскі (1829—1889). Ён дадаў да тэзісаў Герцэна ідэі, пазычаныя галоўным чынам у Фур'е. У 1861 г. цар вызваліў сялянаў ад прыгону. Але яны мусілі плаціць такія кампенсацыйныя сумы землеўласнікам, што іхнае становішча зрабілася шмат у чым яшчэ горшым, чым раней. Тым не менш спантаннага паўстання сялянаў, якога чакалі народнікі, не адбылося. Тады народнікі, паранейшаму адкідаючы ідэі доўгатэрміновага палітычнага дзеяння паводле заходняга ўзору, у надзеі распачаць паўстанцкі рух у масах звярнуліся да тэрарыстычнай дзейнасці. У 1878 г. з мэтай арганізацыі замахаў на цара і высокіх чыноўнікаў стварылася сакрэтнае таварыства "Народная воля". Між іншага, народнікамі абвясцілі сябе шматлікія інтэлектуалы. Не беручы ўдзелу ў тэрарыстычнай дзейнасці, яны зрабілі пэўны ўклад у распрацоўку дактрыны руху. Асноўныя прадстаўнікі такой плыні — Нікалай Міхайлоўскі (1842—1904), Пётр Лаўроў (1823—1900), Нікалай Даніэльсан (1844—1918) і Васілій Варанцоў (1847—1918).

Два першыя з іх, Міхайлоўскі і Лаўроў, асабліва распрацоўвалі "сацыялагічныя" погляды. Яны адмаўлялі існаванне класаў у грамадстве і сцвярджалі, што рэвалюцыя можа

[1] *Cité par G. D. H. Cole, A history of socialist thought, vol. II, London, 1954, p. 46.*

быць здзейсненая, калі некалькі асобаў з эліты здолеюць абудзіць маральную энергію, затоеную ў сялянскіх масах.

Два апошнія з памянёных аўтараў — эканамісты. Даніэльсан (якога ўсе клікалі Нікалай-он) у 1872 г. выдаў расейскі пераклад *"Капіталу"*, а потым, у 1893 г., — *"Гісторыю эканамічнага развіцця Расеі пасля вызвалення прыгонных сялянаў"*. Варанцоў у 1882 г. выпусціў кнігу *"Шанцы капіталізму ў Расеі"*. У сваіх творах эканамісты-народнікі прызнавалі, што капіталізм прасочваецца ў Расею і распаўсюджваецца там, што ён паслабляе абшчынныя традыцыі ў вёсцы. Аднак сцвярджалі, што прамысловасць новага ўзору зможа развівацца толькі вельмі абмежавана, бо не знойдзе дастатковага рынку ў краіне (з прычыны збяднення сялянаў і банкруцтва рамеснікаў) і яшчэ таму, што не зможа паспяхова змагацца з прамысловасцю Захаду на сусветным рынку. Мы лічым, што ў аналізе ўтрымлівалася вялікая доля ісціны, бо ў ім падкрэслівалася роля замежных рынкаў збыту ў працэсе росту эканомікі капіталістычных краін. Тым не менш Даніэльсан і Варанцоў не здолелі выснаваць дакладнай тэорыі эканамічнага росту. Яны абмежаваліся сцверджаннем таго, што замежныя рынкі неабходныя, бо капіталісты толькі частку прыбытковай вартасці (або прыбыткаў) аддаюць на набыццё спажывецкіх тавараў. Тут можна ўбачыць ідэі, блізкія да поглядаў Сісмандзі, а яны — памылковыя, бо не ўлічваюць, што праз пераўтварэнне ашчаджання ў інвестыцыі ствараецца рынак збыту для капіталістычнай эканомікі.

Б) Анархізм

Яшчэ адна форма утапічнага сацыялізму пры канцы XIX ст. — анархізм — закладзена Міхаілам Бакуніным (1814—1876). Бакунін — сын расейскага арыстакрата. Ён браў удзел у рэвалюцыйных паўстаннях у 1849 г. у Нямеччыне, за што быў арыштаваны і перададзены царскаму ўраду. У 1861 г. уцёк з Сібіры і пераехаў у Заходнюю Эўропу.

Ягоная канцэпцыя чалавека, выпрацаваная пераважна пад уплывам твораў Фоербаха, можа разглядацца як працяг ідэяў натуралістычнага матэрыялізму Марэлі XVIII ст. Бакунін меркаваў, што ў дробных групах, такіх, як сельская

грамада (абшчына), ёсць салідарнасць, падобная да той, што існуе ў асобных відаў жывых істотаў, напрыклад у пчолаў. З гэтага вынікала, што задача, якую варта ажыццявіць у справе аднаўлення грамадства, — гэта выключна задача разбурэння наяўных інстытуцый. Калі яна здзейсніцца, будзе адноўлена само па сабе свабоднае грамадства без улады і без дзяржавы на аснове дробных натуральных супольнасцяў — "грамадаў".

Бакунін, аднак, не мог цалкам ігнараваць той факт, што жыццё ў навачасным грамадстве вымагае каардынацыі задачаў у шырэйшых межах. Ён узяў у Прудона тэрмін "федэрацыя", каб азначаць ім больш шырокія арганізацыі, якія б "свабодна" ўтвараліся на глебе дробных натуральных адзінак.

Дарэчы, Бакунін сцвярджаў, што чалавечы род мае наступную асаблівасць: на працягу сваёй эвалюцыі ён выпрацоўвае ідэальныя каштоўнасці, якія ўсё больш і больш уздзейнічаюць на сацыяльнае жыццё. Такім чынам, у прынцыпе ён не ставіўся варожа да ўсялякага маральнага правіла. Аднак нейкі час быў пад уплывам расейскага "нігіліста" Нячаева (1847—1882), якога сустрэў у 1869 г. у Швайцарыі і які выкладаў і практыкаваў самую радыкальную амаральнасць.

Ад 1864 г. Бакунін быў вялікім супраціўнікам Карла Маркса ў межах "Першага Інтэрнацыянала". Вучэнні гэтых дзвюх асобаў сутыкаліся, у прыватнасці, па пытанні рэвалюцыйнага руху, які разгарнуўся ў Францыі ў выніку вайны супраць Нямеччыны. Тым часам, калі прускія войскі пераможна захоплівалі французскую тэрыторыю, Маркс настойліва не раіў рабочым уздымаць паўстанне ў такіх умовах. У складзеным ім Маніфесце Інтэрнацыянала за 9 верасня 1870 г. абвяшчалася: "Усялякая спроба скінуць новы ўрад пры цяперашнім крызісе, калі вораг грукае ў дзверы Парыжа, была б безнадзейным вар'яцтвам". Бакунін жа, наадварот, лічыў, што надышоў момант ажыццяўлення ягоных праектаў. У верасні 1870 г. ён арганізаваў народнае паўстанне ў Ліёне, захапіў гарадскую ратушу, абвясціў "адмену дзяржавы", прадэкларавў, што варта "ратаваць Францыю праз

анархію" і што паўстанне ўсіх камунаў прымусіць нямецкае войска да капітуляцыі.

На практыцы ж рэвалюцыйны рух у Ліёне быў вельмі хутка задушаны, і Бакунін мусіў шукаць прытулку ў Швайцарыі. Што да парыжскага руху, дык ён разгортваўся насуперак парадаў Маркса і пад уплывам рабочых — прыхільнікаў ідэяў Блянкі і Прудона. Парыжская Камуна была ўсталяваная ў сакавіку 1871 г. як незалежная ад нацыянальнага ўрада ўлада рабочых. Аднак пратрымацца яна здолела толькі на працягу некалькіх месяцаў, а пасля ейнай паразы пачаліся масавыя рэпрэсіі, якія вынішчылі праз расстрэл або дэпартацыю бальшыню змагароў французскага рабочага руху.

Стаўленне Маркса і Бакуніна да гэтае паразы таксама вельмі рознілася. Першы, які высока ацэньваў дасягненні Камуны і ейнае гістарычнае значэнне (хоць яна і была створаная насуперак ягонай парадзе), меркаваў, што французскія рабочыя нарабілі памылак, бо ім бракавала палітычнага досведу, і таму, як ніколі, важна стварыць у Францыі палітычную рабочую партыю. Бакунін жа, наадварот, сцвярджаў, што Парыжская Камуна атрымала паразу, бо ў ёй празмерна выкарыстоўваўся прынцып улады. Напруга паміж імі павялічвалася штодзень, і ўрэшце ў 1872 г. Бакунін па патрабаванні Маркса быў выключаны з Інтэрнацыянала.

Пасля смерці Бакуніна ў 1876 г. лідэрам і галоўным ідэолагам руху стаў расейскі князь Пётр Крапоткін (1842—1921), які ў 1874 г. быў асуджаны на турэмнае зняволенне. Але ў 1876 г. здзейсніў удалыя ўцёкі і да 1917 г. жыў у Заходняй Эўропе. У сваіх творах, галоўны з якіх — *"Заваёва хлеба"* (1892), Крапоткін выклаў ідэі, вельмі блізкія да поглядаў Бакуніна. Аднак ягоная ўвага ў большай ступені засяроджвалася на праблемах прамысловасці. Сам ён быў навукоўцам-геолагам і сябрам такіх навукоўцаў, як Элізэ Рэклю. Крапоткін верыў у сілу навукі. Тым не менш лічыў, што вытворчасць на буйных прадпрыемствах у сапраўднасці не прыбытковая і што да яе пераходзяць толькі з прычыны нізкіх заробкаў. І прадказваў, што распаўсюджванне электрычнай энергіі пацягне за сабой вяртанне да дробных

адзінак вытворчасці. Такія даследванні дазволілі Крапоткіну дакладна трымацца вучэння свайго папярэдніка (разам з канцэпцыяй адраджальнай сілы "разбурэння"). Аднак, каб падкрэсліць сваю апазіцыю ў дачыненні да супраціўнікаў усялякай формы сацыяльнай арганізацыі (якія кіраваліся ідэямі, вылучанымі ў сярэдзіне XIX ст. нямецкім філосафам Максам Штырнэрам), Крапоткін сваё вучэнне называў "анархa-камунізмам".

З 1866 г. актывізавалася тэрарыстычная дзейнасць у Расеі. Пасля шматлікіх спробаў замаху ў 1881 г. быў забіты цар Аляксандр II. Многія буйныя чыноўнікі таксама былі застрэленыя, у прыватнасці ў 1878 г. шэф паліцыі Трэпаў. Выканаўцу апошняга тэрарыстычнага акта Веру Засуліч суд прысяжных апраўдаў.

Хоць лідэры анархісцкага руху, якія жылі ў выгнанні, не былі арганізатарамі гэтых тэрарыстычных актаў, яны ўхвалялі іх і для Заходняй Эўропы таксама абаранялі прынцып "прапаганды праз забойства". Сапраўды, у 1878 г. пачалося ўзмацненне тэрарыстычнай дзейнасці на Захадзе. У тым жа годзе замахі, якія, дарэчы, не мелі поспеху, былі прыкладна адначасова накіраваныя супраць імператара Нямеччыны Вільгельма I, караля Гішпаніі Альфонса XII і караля Італіі Умбэрта. Напэўна, тэрарыстычныя акты не былі непасрэдна справакаваны лідэрамі анархісцкага руху, але іхныя выканаўцы знаходзіліся пад уплывам анархізму.

У Расеі тэрарыстычная дзейнасць захавала свой рэвалюцыйны характар. Але ў Заходняй Эўропе становішча было іншае. У прыватнасці, у Францыі пасля 1890 г. адбыліся шматлікія тэрарыстычныя акты (напрыклад, забойства ў 1894 г. прэзідэнта рэспублікі Садзі Карно), якія часцей за ўсё здзяйсняліся або псіхічна неўраўнаважанымі людзьмі, або проста крымінальнымі злачынцамі, такімі, як Равашоль.

На працягу гэтага часу анархісты моцна ўплывалі на французскі рабочы рух. Сярод іх саміх адбыўся падзел па пытанні ролі прафсаюзаў у будучым грамадстве. Калі "чыстыя" анархісты адмаўляліся разглядаць пытанне захавання прафсаюзаў пасля рэвалюцыі, дык іншыя, наадварот, вылучалі ідэю кантролю прамысловасці з боку рабочых прафса-

юзаў. Яны атрымалі найменне "анарха-сіндыкалістаў" і ў французскім рабочым руху стварылі плынь "рэвалюцыйнага сіндыкалізму".

Дарэчы, анарха-сіндыкалісты гэтак жа варожа, як і "чыстыя" анархісты, ставіліся да ўдзелу рабочых у палітычнай дзейнасці. Яны былі прыхільнікамі "наўпроставага дзеяння" і абаранялі прынцып руйнавання капіталістычнага грамадства сродкамі ўсеагульнага страйку. У 1906 г. анарха-сіндыкалісты дамагліся ад Усеагульнай Канфедэрацыі працы (Confédération générale du Travail), створанай у 1902 г., прыняцця Ам'енскай хартыі, на якую яшчэ і сёння спасылаецца французскі прафсаюзны рух і якая ў прынцыпе забараняла ўсялякі хаўрус і ўсялякае пагадненне паміж рознымі палітычнымі партыямі і прафсаюзамі. Дзеячы-"рэфармісты", прыхільнікі чыста "эканамічных" дзеянняў прафсаюзаў, таксама прагаласавалі за падтрымку гэтай хартыі.

§ 2. Рэфармісцкі сацыялізм у Вялікабрытаніі

Сацыялістамі-рэфармістамі можна назваць аўтараў, якія лічылі, што пераўтварэнне грамадства паводле эгалітарнага прынцыпу можа паступова адбыцца з дапамогаю наяўнай палітычнай улады, гэта значыць дзякуючы "сацыяльным рэформам".

У першай палове XIX ст. француз Люі Блян рэкамендаваў стварэнне дзяржавай нацыянальных установаў, якія мусілі паступова прыйсці наўзамен прыватных прадпрыемстваў.

У 60-х гадах XIX ст. ідэі рэфармізму галоўным чынам выкарыстоўваў Фердынанд Лясаль (1825—1864), які быў на той час лідэрам нямецкага рабочага руху. Гэты інтэлектуал імкнуўся спалучыць філасофію Фіхтэ з Гегелевай філасофіяй.

У сваім галоўным творы *"Сістэма набытых правоў"* Лясаль, супрацьпастаўляючы нямецкае і раманскае паняцці спадчыны, хацеў даказаць, што разнастайныя юрыдычныя сістэмы змяняюць адна адну ў залежнасці ад асобных зменаў "духу народа". І з гэтага зрабіў выснову, што эўрапей-

скае грамадства павінна быць трансфармаванае паводле дэмакратычнага і сацыялістычнага прынцыпу, бо "дух народа" зноў змяніўся[1].

Лясаль выказваўся супраць тагачаснай сацыялістычнай тэорыі, з якой вынікала, што кааператыўны або прафсаюзны рух паляпшаюць лёс працоўных. У якасці аргумента ён прыводзіў закон, вылучаны эканамістамі-класікамі, згодна з якім дэмаграфічная напружанасць, што абавязкова надыходзіць пасля ўсялякага павелічэння заробкаў, робіць такое павелічэнне практычна немагчымым. Лясаль называў гэта "жалезным законам заробкаў".

Узяўшы прапанаваную Гегелем у *"Філасофіі права"* канцэпцыю дзяржавы як арбітра супрацьлеглых інтарэсаў у "цывільным грамадстве", ён гаварыў, што мэта рабочага класа — атрыманне ўсеагульнага выбарнага права. Гэта дазволіць яму патрабаваць ад дзяржавы, каб яна служыла на карысць інтарэсаў найбольшай часткі насельніцтва, дапамагала кааператыўнаму руху (які сам па сабе быў слабы) і ўрэшце прывяла да сацыялізму.

Пасля смерці ў 1864 г. Лясаля і асабліва пасля вайны 1870 г. сацыялістычны рух у Нямеччыне сістэматычна пераследваўся, адначасова ствараліся сацыяльныя законы, якія стрымлівалі патрабаванні рабочых. Нямецкія сацыялісты ўсё больш і больш траплялі пад уплыў марксізму. Тым не менш праграма, прынятая сацыялістычнай партыяй у 1875 г. у г. Гота, яшчэ ў значнай ступені выкарыстоўвала ідэі Лясаля, і, як вядома, Маркс яе дэталёва раскрытыкаваў.

Тым часам ангельскі сацыялізм, які практычна знік пасля сканчэння чартысцкага руху (1858), паўставаў з попелу і часам набываў рэвалюцыйную форму то ў межах анархісцкага руху, то ў межах "Сацыялістычнай лігі", заснаванай у 1884 г. Ўільямам Морысам.

---

[1] *Выраз "дух народа", Volksgeist, быў запазычаны ў Гегеля, але ў Лясаля ён азначаў зусім іншае. Сапраўды, у вялікага філосафа дух нейкага народа — гэта пэўны момант у гістарычным развіцці чалавечага духу, розум якога можа вызначаць сваё месца і ролю, бо развіццё, пра якое ідзе гаворка, з'яўляецца рацыянальным. У Лясаля ж, як, дарэчы, і ў шматлікіх нямецкіх філосафаў і сацыёлагаў другой паловы XIX ст., наадварот, дух народа — гэта проста ягоны адметны характар, вынік выпадковых акалічнасцяў.*

Прынамсі, у тым жа годзе група інтэлектуалаў стварыла Фабіянскае таварыства[1], якое выпрацавала дактрыну ангельскага рэфармісцкага сацыялізму. Сама вядомымі асобамі групы былі Сіднэй Ўэб, Бэатрыс Ўэб, а таксама будучы драматург 28-гадовы Джордж Бэрнард Шоў, які тады займаўся праблемамі палітычнай эканоміі.

Фабіянская школа грунтавала сваё вучэнне на дакладным эканамічным аналізе грамадства. Гэты аналіз варта ўважліва разгледзець, бо ён уяўляе сабой арыгінальную спробу прыстасаваць на карысць сацыялізму ліберальную палітычную эканомію.

Група фабіянцаў, куды ўваходзілі выкладчыкі універсітэтаў, ведала пра нядаўнія "адкрыцці" эканамістаў, у прыватнасці пра новую тэорыю вартасці, прапанаваную Джэвансам. Фабіянцы палічылі, што гэтае "адкрыццё" руйнуе вучэнне Карла Маркса, якое цалкам грунтавалася на тэорыях эканамістаў-класікаў (а яны на той час былі ўжо "пройдзеным этапам").

Аднак фабіянцы не былі ў захапленні ад лібералізму. На іх уплывалі галоўным чынам аўтары, якія ў папярэдні перыяд у Вялікабрытаніі і ЗША развівалі тэорыю абавязковай канфіскацыі зямельных рэнтаў як "незароблены здабытку".

У 1870 г. у Ангельшчыне пад уплывам Джона Ст'юарта Міла "радыкальныя" сіндыкалісты і інтэлектуалы стварылі "Асацыяцыю за зямельную рэформу"[2]. Асацыяцыя абараняла праекты нацыяналізацыі зямлі, якія былі сфармуляваныя яшчэ пры канцы XVIII ст. (у прыватнасці, Томасам Спэнсам). Сябры асацыяцыі абапіраліся на даследванне Рыкарда, дзе паказана, як простае павелічэнне асвойвання земляў прыводзіць да аўтаматычнага павелічэння даходаў уладальнікаў найбольш урадлівых земляў.

У ЗША таксама выяўляюцца такія настроі, напрыклад у Гэнры Джорджа, які, хоць і быў прыхільнікам захавання

[1] *Гэты назоў паходзіць ад імя Фабіюса Кунктатара (маруднага) і выбраны быў таму, што сябры таварыства хацелі спачатку прысвяціць нейкі час роздуму, перад тым як пачынаць дзейнічаць (cf. G. D. H. Cole, A history of Socialist thought, vol. III. Ire Partie, London, 1956, p. 106). Апрача таго, такі назоў вельмі добра характарызуе іх дзеянні.*

[2] *Cf. G. D. H. Cole, op. cit., vol. II, pp. 382 et s.*

прыватнага прадпрымальніцтва, прапаноўваў з дапамогай падатку пачынаць паступовую канфіскацыю зямельных рэнтаў. Менавіта гэта было тэмай ягонай вядомай працы *"Прагрэс і беднасць"* (1879).

У *"Фабіянскіх нарысах сацыялізму"* (1889) — калектыўным творы, адным з першых маніфестаў школы — Джордж Бэрнард Шоў, які рыхтаваў эканамічную частку, намагаўся абагульніць Рыкардава даследванне рэнты, каб на ягонай падставе прыйсці таксама і да жорсткай крытыкі даходаў ад капіталу і паказаць неабходнасць іх канфіскацыі. Згодна з аўтарам, усе даходы, апрача заробкаў найманых працаўнікоў, могуць быць зведзеныя да рэнтаў.

"Даходы, што паходзяць ад прыватнай уласнасці, — пісаў ён, — уяўляюць сабой часткова эканамічную рэнту; часткова адлічэнні, якія таксама называюцца рэнтамі і атрымліваюцца пры заняцці месца ўласніка; і часткова яшчэ адну форму рэнты, якая называецца працэнтам і атрымліваецца ад своеасаблівага скарыстання зямлі ў вытворчасці праз выкарыстанне капіталу"[1].

Фактычна аўтар, талент якога ў галіне літаратуры быў намнога большы за ягоныя здольнасці эканаміста, так і не паказаў, як працэнт ад капіталу сыходзіць да рэнты.

Аднак менавіта на гэтым грунтуецца ягоная рэфармісцкая дактрына. На думку Шоў, паколькі ўсе капіталістычныя даходы аналагічныя зямельнай рэнце, то павінна быць магчымай паступовая іх канфіскацыя, але не парушацца пры гэтым функцыянаванне эканомікі. Адначасова будуць ствараццa камунальныя або дзяржаўныя прадпрыемствы, якія адразу ж расквітнеюць, бо будуць вызваленыя ад падаткаў, што плоцяць капіталісты. Такім чынам можна будзе ажыццявіць паступовы пераход да сацыялізму.

Зводзячы нармальны даход ад капіталу да нормы працэнта і разглядаючы "чысты прыбытак" у якасці надзвычайнага даходу, які павінен быць знішчаны праз канкурэнцыю, неакласічная палітэканомія давала падставы для такога тлумачэння капіталізму і такіх высноваў. У мадэлі Джэванса, гэтаксама як і ў мадэлі Вальраса, эканоміка функцыянуе не толькі без чыстых прыбыткаў, але і з нормай працэнта

[1] *Fabian Essays on socialism, London, 1889, p. 26.*

нагэтулькі нізкай, наколькі гэта пажадана, бо, па сутнасці, прызнаецца, што капіталіст хутчэй за ўсё прадасць прадпрымальніку паслугі свайго капіталу, нават і па вельмі нізкім кошце, чым зусім не будзе атрымліваць ад яго ніякага даходу.

Мы бачым, што новая палітычная эканомія стварыла фундаментальную пастку, бязвіннымі ахвярамі якой, магчыма, сталі фабіянцы. Бо неакласічная палітычная эканомія, здаецца, была створаная дзеля таго, каб прыхаваць асноватворную ўмову функцыянавання капіталістычнай сістэмы: існаванне дастатковай рэнтабельнасці капіталу.

Калі адмовіцца ад адвольнага падзелу на прадпрымальніка і капіталіста, дык можна зразумець, што добрае функцыянаванне капіталістычнай эканомікі падпарадкавана рэгулярнаму інвеставанню капіталаў у вытворчасць, якое ў сваю чаргу залежыць у значнай ступені ад роўню сярэдняй нормы прыбытку. Але ў такім разе немагчыма больш лічыць, што паступовая канфіскацыя "незаробленых даходаў" так проста прывядзе да сацыялізму. Дакладней, сістэма падаткаабкладання, якая значна памяншае сярэднюю рэнтабельнасць капіталаў, павінна выклікаць вельмі адмоўную рэакцыю з боку капіталістаў і вельмі вялікія эканамічныя цяжкасці з прычыны запавольвання рытму інвеставання.

Бачна, што меркаванне сацыялістаў-рэфармістаў наконт магчымасці паступовага пераходу да калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці вельмі ілюзорнае. Гэта толькі адлюстраванне ілюзіяў у дачыненні да магчымасці лёгкага забеспячэння функцыянавання эканомікі пры адсутнасці прыватнага капіталу. Ілюзіі ляжаць у аснове тэзіса пра абавязковае прымірэнне ўсіх плыняў, якія існавалі ў тую эпоху ў Вялікабрытаніі.

У маленькім творы *"Сацыялізм у Ангельшчыне"*, які выйшаў у свет у 1890 г., Сіднэй Ўэб абвясціў, што з гэтага часу палітычная эканомія больш не супрацьпастаўляецца сацыялізму, яна хутчэй з'яўляецца асацыяванай часткай апошняга.

"Такая канвергенцыя, — пісаў ён, — была спрошчана тым фактам, што ангельскія сацыялісты — не сляпыя прыхільнікі Карла Маркса. Хоць яны і прызнаюць зроблены ім карысны ўнёсак у эканамічную гісторыю, а

таксама ягоную ролю як натхняльніка чалавечых розумаў, усё ж вялікая колькасць ангельскіх эканамістаў-сацыялістаў адкідваюць ягоны своеасаблівы ўклад у чыстую эканамічную навуку. Ягоная тэорыя вартасці таксама знаходзіць мала прыхільнікаў у ангельскіх эканамічных колах, дзе ўсё большую моц набірае тэорыя вартасці Джэванса. Хоць лідэры абедзвюх найбольш значных сацыялістычных арганізацыяў былі пад моцным уплывам Маркса, але маса прыхільнікаў сацыялістычнай партыі грунтуе свой сацыялізм не на вызначанай эканамічнай тэорыі, а на відавочных выніках прыватнай уласнасці, — тых выніках, якія паўстаюць, калі разглядаць значэнне рэнтаў і працэнтаў"[1].

Той сама заклік да задзіночання эканамістаў-неакласікаў і сацыялістаў ёсць і ў велізарным творы *"Індустрыяльная дэмакратыя"*, які Сіднэй і Беатрыс Ўэб прысвяцілі прафсаюзам[2].

У раздзеле, названым *"Вердыкт эканамістаў"*, аўтары сцвярджалі, што ўжо прайшлі тыя часы, калі ліберальная школа са сваім "жалезным законам" заробкаў або са сваёй настолькі ж безнадзейнай тэорыяй "фондаў заробкаў" не дазваляла ўявіць, што рабочы клас можа сам палепшыць свой лёс. Зараз эканамісты займаюць больш спрыяльныя пазіцыі ў дачыненні да дзейнасці прафсаюзаў. І ў падтрымку сваіх заяваў аўтары цытуюць разнастайныя тэксты Альфрэда Маршала.

Сапраўды, вучэнне Маршала менш варожае да прафсаюзаў і менш адмоўна ставіцца да іхнай дзейнасці, чым вучэнне Вальраса або Парэта. Але надыдзе момант, калі творчасць памянёных эканамістаў з кантынента, доўгі час невядомая ў англасаксонскіх краінах, нарэшце дойдзе да іх. Гэта дапаможа ўзмацніць лагер найбольш крайняга імперыялізму. Таму можна зразумець, чаму аж да Кейнса ў дыскусіях эканамістаў захавалася абсалютная мяжа паміж сацыялістычным і ліберальным падыходамі.

Аднак, каб скончыць характарыстыку прадстаўнікоў фабіянскай школы, важна падкрэсліць, што яны ў асноўным прыхільна ставіліся да брытанскага імперыялізму.

Пад час вайны супраць бураў Шоў напісаў памфлет, названы *"Фабіянства і імперыя"*, у якім абараняў паводзіны

[1] *Socialism in England, 3e éd., London, 1901, pp. 84–85.*
[2] *Sidney and Beatrice Webb, Industrial democracy, 2 vol., London, 1897.*

брытанскага ўрада, прыводзячы ў якасці аргумента той факт, што галяндскія каланісты былі "рэакцыйнымі" і што, як бы там ні было, падзел свету паміж супердзяржавамі — гэта рэальнасць, якой немагчыма супрацьстаяць. У імя тых сама прынцыпаў аўтар выказваўся за падзел Кітая, а пазней быў супраціўнікам незалежнасці Ірляндыі.

Гэткае стаўленне — узор "астраўнога" падыходу, які ў далейшым выкарыстае вялікая колькасць ангельскіх эканамістаў. Брытанскі сацыял-рэфармізм спазнаў буйныя поспехі на выбарах. "Рабочая", лейбарысцкая, партыя (Labour Party), заснаваная у 1892 г. і пераўтвораная ў 1906 г. пасля некалькі змрочных гадоў, неўзабаве накіравала ў парламент шматлікіх дэпутатаў, але ангельскі лейбарызм застаўся грунтоўна варожым у дачыненні да ідэі рэвалюцыі.

Безумоўна, брытанскі рэфармізм стасуецца з уздымам імперыялізму. Як мы ўжо бачылі, у гэты перыяд панаванне над усімі іншымі народамі перадавых нацыяў суправаджалася паляпшэннем умоваў жыцця рабочага класа ў метраполіі. Выкліканы каланіяльнымі заваёвамі энтузіязм часам спрыяў таму, каб рабочы клас забываўся пра сваё невыноснае становішча. Так узнік феномен "абуржуажвання" пралетарыяту, які аналізаваўся Фрыдрыхам Энгельсам у ягонай перапісцы, а потым у прадмове 1892 г. да другога выдання *"Становішча працоўных класаў у Ангельшчыне"*.

Той самы феномен выявіўся і ў ЗША, эканамічны рост якіх пры канцы XIX ст. быў надзвычай імклівы. З прычыны вялікай колькасці вольных земляў заробкі ў Злучаных Штатах заўсёды былі вышэйшыя, чым у Эўропе. Аднак не раз амэрыканскі рабочы клас моцна закранала беспрацоўе, якое ішло поруч з крызісамі перавытворчасці. У такія перыяды павялічваліся патрабаванні рабочых і ўзмацнялася варожасць да капіталізму.

У ЗША не было ніводнага па-сапраўднаму арыгінальнага мысляра-сацыяліста. На пачатку XIX ст. рабочыя-сацыялісты натхняліся ў асноўным творчасцю Фур'е; пазней перанялі анархічную думку, у прыватнасці ў 1884—1886 гг., калі ішла барацьба за 8-гадзінны працоўны дзень. Прынамсі, у 1886 г. Сэмуэль Гомпэрз стварыў "Амэрыканскую фе-

дэрацыю працы" (*American Federation of Labour*), якая неўзабаве стала наймагутнейшай прафсаюзнай арганізацыяй. Яна выразна адмяжоўвалася ад сацыялізму і дамагалася толькі паляпшэння ўмоваў працоўных у межах капіталізму. Хоць пазней у Злучаных Штатах барацьба паміж найманымі працаўнікамі і наймальнікамі была часам надзвычай вострай, сацыялізм, нават у сваёй рэфармісцкай форме, меў невялікую колькасць прыхільнікаў. У эвалюцыі рабочага руху ўсеагульнае паляпшэнне роўню жыцця прывяло ЗША да вынікаў, аналагічных брытанскім.

§ 3. Нямецкія сацыялісты і праблема інтэрпрэтацыі марксізму

У 1891 г. у Эрфурце нямецкая сацыял-дэмакратычная партыя прыняла новую праграму, у якой адкрыта абвясціла сябе марксісцкай і ўзапраўды пераняла бальшыню ідэяў Маркса. Аднак там не разглядалася пытанне сродкаў, з дапамогай якіх рабочы клас можа ўзяць уладу, а таксама не ўзгадваўся марксісцкі тэзіс пра "дыктатуру пралетарыяту". Ад гэтага часу нямецкія сацыялісты меркавалі, што заваёва ўлады павінна ажыццявіцца выключна парламенцкім шляхам. У хуткім часе з'явілася пацверджанне такога перакананння: у 1895 г., калі Фрыдрых Энгельс незадоўга да сваёй смерці даверыў партыі апублікаваць ягоныя доўгія ўводзіны да Марксава артыкула *"Класавая барацьба ў Францыі"*, рэдактары выкраслілі з ягонага тэксту ўрывак, дзе аўтар згадваў пра неабходнасць выкарыстання сілы, калі не ў пачатку рэвалюцыі, дык пад час яе[1].

А) Рэвізіянізм Бэрнштайна

Асноўным тэарэтыкам нямецкай сацыял-дэмакратычнай партыі быў у тыя часы Карл Каўцкі (1854—1938). У 1887 г. ён выдаў кнігу, названую *"Эканамічныя дактрыны Карла Маркса"*, у якой паслядоўна выклаў марксісцкі аналіз капіталізму. Але ва ўсіх сваіх публікацыях Каўцкі заўсёды настойваў на неабходнасці ахапіць ідэяй сацыялізму бальшы-

[1] *Гл. на гэты конт G. D. H. Cole, op. cit., vol. II, p. 435.*

ню насельнікаў перад тым, як захапіць уладу. Апрача таго, ён выказваў катэгарычнае непрыманне ўсялякіх праяваў гвалту.

Спачатку менавіта ў такой даволі своеасаблівай форме ў Нямеччыне выяўляецца паступовы пераход сацыялістаў да рэфармізму. Аднак неўзабаве ўжо ўся марксісцкая тэорыя была пастаўленая пад сумнеў рознымі аўтарамі, з якіх найбольш уплывовы — Эдуард Бэрнштайн (1850—1932). Ягоны галоўны твор *"Тэарэтычны сацыялізм і практыка сацыял-дэмакратыі"*[1] напісаны яшчэ тады, калі аўтар быў у выгнанні ў Лондане, і ўбачыў свет толькі ў 1899 г. Ён змяшчае, бясспрэчна, сама шырокую крытыку марксізму, якая калі-небудзь была выказана мысляром-сацыялістам.

Бэрнштайн без ваганняў звяртаўся да вытокаў і выразна пераносіў праблему ў філасофскі план. Ён пісаў, што варта адмовіцца ад "дагматызму", які Маркс атрымаў у спадчыну ад Гегеля, і прызнаць, што "пагарда да ідэалу, услаўленне матэрыяльных фактараў да такой ступені, калі яны разглядаюцца ў якасці ўсемагутных сілаў у эвалюцыі, спрычыняюцца да расчаравання"[2]. Трымаючыся філасофскай эвалюцыі свайго часу, Бэрнштайн гаварыў пра "вяртанне да Канта".

Па сутнасці, на Бэрнштайна паўплывалі ангельскія аўтары-фабіянцы. Ён адмовіўся ад усялякай ідэі рэвалюцыйнага пераўтварэння грамадства, абвясціў, што сацыял-дэмакратычная партыя мусіць быць "рэфармісцкай дэмакратычнай сацыялістычнай партыяй"[3], а таксама сцвярджаў, што нямецкая нацыя "дасягнула такога стану, калі правы ўладальніцкай меншыні перасталі быць перашкодай для грамадскага прагрэсу"[4].

Іншыя тагачасныя аўтары-сацыялісты таксама ставілі пад сумнеў асобныя аспекты даследванняў Маркса. Але яны ў асноўным намагаліся прыстасаваць ягоныя высновы да акалічнасцяў, уласцівых эпосе ўздыму імперыялізму. У прыватнасці, гэта зрабіла Роза Люксэмбург, пра якую мы будзем

[1] *Die Voraussetzungen des Sozialismus und die Aufgaben der Sozial-democratie.*
[2] *Cité par G. D. H. Cole, op. cit., vol. III, 1re Partie, p. 294.*
[3] *Id., ibid., p. 295.*
[4] *Id., ibid.*

весці гаворку далей. Падыход Бэрнштайна вельмі адрозніваўся, бо ён, наадварот, прымаў імперыялізм. Ён пісаў:

"Для нямецкай сацыял-дэмакратыі не можа быць абыякавым пытанне, ці атрымае нямецкая нацыя, якая ўзяла і бярэ пачэсны ўдзел у стварэнні сусветнай цывілізацыі, адведзенае ёй месца ў кансіліуме нацыяў"[1].

На думку Бэрнштайна,

"гіпотэза, адпаведна з якой каланіяльная экспансія перашкаджае ажыццяўленню сацыялізму, у аснове сваёй грунтуецца на цалкам аджылай ідэі пра тое, што ягонае ажыццяўленне залежыць ад рэгулярнага звужэння кола багатых і росту галечы бедных"[2].

Хоць Бэрнштайн пакуль не лічыў неабходным для Нямеччыны захоп калоній, але меркаваў, што гэта можа стаць пажаданым, каб яна змагла атрымліваць выгаду ад асабістых крыніцаў забеспячэння сыравінай. І сцвярджаў, што сама па сабе каланіяльная экспансія не вартая ганьбавання.

"Больш развітая цывілізацыя, — пісаў Бэрнштайн, — можа ў канчатковым рахунку забяспечыць існаванне найвышэйшага права. І не заваёва, а культура зямлі дае гістарычны тытул на карыстанне ім"[3].

Б) Тэорыя імперыялізму

У часы, калі Бэрнштайн пісаў свой твор пра эканамічныя дактрыны Маркса, усе сацыялістычныя партыі (і нават ангельская лейбарысцкая партыя) яшчэ вельмі варожа ставіліся да каланіялізму. З 1889 г. усе разнастайныя нацыянальныя партыі накіроўвалі сваіх дэлегатаў на міжнародныя кангрэсы працоўных, якія збіраліся практычна кожны год. З 1900 г. II Інтэрнацыянал займеў свой неадменны сакратарыят. На ягоных кангрэсах у асноўным панавалі марксісты і асаблівую ўвагу яны засяроджвалі на асуджэнні каланіяльнай палітыкі вялікіх дзяржаваў.

У перыяд 1898—1899 гг. Гайнрых Куноў у часопісе нямецкай сацыял-дэмакратыі *Die Neue Zeit* ("Новы час") апублікаваў даследванне *"Пра тэорыю распаду"*, дзе ў адказ Бэрнштайну напісаў, што капіталістычныя краіны не заўсё-

[1] *Cité par G. D. H. Cole, op. cit., p. 291.*
[2] *Id., ibid.*
[3] *Id., Ibid., p. 292.*

ды будуць знаходзіць новыя рынкі збыту і што ў выніку надыдзе момант, калі адбудзецца "распад" капіталізму, прадказаны Марксам[1]. Аднак асноўным супраціўнікам рэвізіянізму была актывістка польскай сацыялістычнай партыі, пазней вядомая нямецкая дзяячка Роза Люксэмбург (1870—1919).

У 1900 г. на Парыжскім кангрэсе сацыялістычнай партыі яна заявіла, што з прычыны імклівай экспансіі капіталізму больш немагчыма гаварыць пра рост галечы эўрапейскага пралетарыяту. Аднак, на яе думку, гэта зусім не далучае да поглядаў Бэрнштайна. Бо ў справе заваёвы рынкаў супердзяржавы сутыкаюцца адна з адной, што не праміне выклікаць паміж імі войны, якія прывядуць да знікнення капіталізму[2].

Роля пашырэння экспарту (а таксама і павелічэнне дзяржаўных выдаткаў) у працэсе росту капіталізму ў роўнай ступені была падкрэслена ў 1901 г. Конрадам Шмідтам[3]. Але ён зрабіў з гэтага рэфармісцкія высновы, сцвярджаючы, што павелічэнне пакупной здольнасці найманых працаўнікоў можа забяспечыць попыт на спажывецкія тавары, які робіць непатрэбнымі замежныя рынкі.

У 1902 г. выйшла ў свет славутая кніга ангельскага эканаміста Джона Э. Гобсана *"Імперыялізм"*. Аўтар абмежаваўся сцверджаннем, што ад імперыялізму варта адмовіцца, бо ён каштуе для Вялікабрытаніі больш, чым прыносіць. Гэта вельмі павярхоўны тэзіс. Бо калі заваёва каланіяльных рынкаў — рухавік капіталістычнае экспансіі, дык відавочна, што выдаткаваныя на гэтую мэту сродкі будуць вельмі рэнтабельныя.

Метад Гобсана памылковы яшчэ і таму, што ён параўноўвае дзяржаўныя расходы, выкліканыя каланіяльнымі заваёвамі, і прыватныя прыбыткі, атрыманыя капіталістамі на

---

[1] *Гл. на гэты конт твор Paul M. Sweezy, The theory of capitalist development, New York, 1942, p. 194.*

[2] *Гл. на гэты конт G. D. H. Cole, op. cit., vol. III. Ire Partie, p. 43.*

[3] *Zur theorie der Handelskrisen und der Uberproduktion,* Socialistische Monatshefte *1901; гл. на гэты конт P. M. Sweezy, op. cit., pp. 197—198. Шмідт адказваў расейскаму эканамісту Туган-Бараноўскаму, тэорыя крызісаў якога вяла да адмаўлення неабходнасці пашырэння вонкавых рынкаў.*

каланіяльных рынках. Але калі нават і дапусціць, што гэтыя прыбыткі ніжэйшыя за "выдаткі", відавочна, што гэта ніяк не турбуе капіталістаў: сапраўды, яны з радасцю ўхваляць дзяржаву, якая прымушала б плаціць усіх падаткаплатнікаў высокія падаткі, каб захаваць прыватныя здабыткі капіталістаў.

Твор Гобсана, нягледзячы на слабыя месцы, каштоўны як зборнік грунтоўных фактаў і лічбаў. І менавіта ў такой якасці ён будзе выкарыстоўвацца аўтарамі-марксістамі.

У прыватнасці, гэта рабіў лідэр аўстрыйскіх сацыялістаў Рудольф Гільфэрдынг, які ў 1910 г. выдаў вядомы твор *"Фінансавы капітал"*.

Гільфэрдынг быў супраціўнікам тлумачэння крызісаў праз недастатковае спажыванне, або, сама меней, такога тлумачэння, у якім недастатковае спажыванне разглядалася як асноўны фактар крызісаў. Тым не менш ён прызнаваў, што імперыялізм — характэрная рыса капіталізму пачатку XX ст. Для тлумачэння гэтага факта Гільфэрдынг звярнуўся да тэорыі, у якой імперыялізм разглядаецца як вынік развіцця манаполіяў, а яно ў сваю чаргу паходзіць ад панавання банкіраў, уладальнікаў "фінансавага капіталу".

Гэтая тэорыя мела вялікае значэнне, яе падзяляў Ленін. Аднак варта прызнаць яе павярхоўнасць, таму што яна не грунтавалася на паглыбленым даследванні праблемаў рынкаў збыту.

Між іншым, Гільфэрдынг сцвярджаў, што развіццё гіганцкіх прадпрыемстваў пацягне за сабой заключэнне пагадненняў паміж найбольш магутнымі капіталістамі па-над нацыянальнымі межамі, што прывядзе да паслаблення капіталістычных супярэчнасцяў. Працэс вытворчасці і размеркавання даходаў будзе ў пэўнай ступені кантралявацца і ўладкоўвацца. Прыбыткі самых буйных аб'яднанняў будуць гарантаваныя, тым часам заробкі ў індустрыяльных рэгіёнах будуць падтрымлівацца на высокім роўні дзякуючы росту эксплуатацыі неразвітых рэгіёнаў. Дарэчы, такі тып міжнароднага капіталістычнага планавання прывядзе да адмовы ад палітычнага лібералізму на карысць больш выразнага аўтарытарызму.

Гэтыя ідэі, паўтораныя ў 1914 г. Каўцкім, які з мэтай

вызначэння новага становішча гаварыў пра "ультраімперыялізм", выклікалі абурэнне Леніна — ён убачыў у іх праяву паразніцтва. І сапраўды, сёння мы ведаем, што супярэчнасці паміж інтарэсамі капіталістаў засталіся надзвычай моцнымі і спарадзілі дзве сусветныя вайны.

Шырокая дыскусія, якая разгарнулася тым часам паміж нямецкімі сацыялістамі, прывяла ўрэшце да публікацыі ў 1913 г. значнага твора Розы Люксэмбург *"Назапашванне капіталу"*[1].

Аўтар пабудавала сваё даследванне на схемах аднаўлення вытворчасці, прапанаваных Марксам. Але, на яе думку, гэтыя схемы няправільныя, бо, паводле іх, капіталістычнае развіццё можа бясконца працягвацца ў межах нутранога рынку.

Як пісала Роза Люксэмбург, у трэцяй кнізе "Капіталу" Маркс часам звяртаў увагу на супярэчнасці, якія паходзяць ад недастатковага пашырэння спажывання параўнальна з развіццём вытворчых магчымасцяў. У адным месцы ён нават сцвярджаў, што капіталізм мусіць шукаць рынкі за мяжой. Якім жа чынам можна спалучыць высновы трэцяй кнігі са схемамі другой кнігі?

Спрабуючы адказаць на гэтае пытанне, Роза Люксэмбург разважала, аднак, не заўсёды лагічна і зразумела. У прыватнасці, здаецца, што яна не здолела пазбавіцца ад элементарнай версіі тэорыі недастатковага спажывання. Гэта тэорыя сыходзіць да сцверджання, што ашчаджаная прыбытковая вартасць не можа быць "рэалізаванай", бо няма попыту на тую частку вытворчасці, якая адпавядае ёй: ні з боку працоўных, бо гаворка ідзе аб прыбытковай вартасці, ні з боку капіталістаў, бо гэта адпавядае даходу, які яны не накіроўваюць на набыццё спажывецкіх тавараў. Але калі прэзентаваць гэткім чынам праблему "рэалізацыі прыбытковай вартасці", дык гэта надуманая праблема. Бо дэфіцыт сукупнага попыту, выкліканы ашчаджаннем, можа быць ураўнаважаны попытам на сродкі вытворчасці, выкліканым інвеставаннем. Тым не менш у асобных месцах свайго твора

[1] *Die Akkumulation des Kapitals. Ein Beitrag zur ökonomischen Erklärung des imperialismus, Berlin, 1913.*

Роза Люксэмбург у больш слушных тэрмінах уздымала праблему рынкаў збыту для капіталістычнай вытворчасці.

На яе думку, Марксава схема паказвае, што прыбытковая вартасць можа быць рэалізаваная, бо капіталісты маюць патрэбу ў новых сродках вытворчасці і наймаюць новых працаўнікоў.

"Але *папярэдне*, — працягвала Роза Люксэмбург, — у капіталістаў павінна ўзнікнуць жаданне павялічыць вытворчасць; калі новыя працаўнікі надзяляюцца працай на новых сродках вытворчасці, дык папярэдне мусіў існаваць новы попыт на тавары, якія будуць вырабляцца"[1].

Вызначальны момант тут — слова "папярэдне", на якім, на жаль, Роза Люксэмбург не засяроджвала дастатковай увагі. Яно нагадвае тэрмін, якім карыстаўся Мальтус, калі пісаў, што *перад* павелічэннем вытворчасці павінны існаваць змены ў попыце.

Сапраўды, асноватворны момант тут — тое, што пры капіталістычным ладзе *павелічэнне попыту, выкліканае інвестыцыямі, не можа быць матывам для інвестыцыяў.*

Марксавы схемы паказваюць, што калі ажыццяўляецца інвеставанне, дык існуе раўнавага рынку, бо вытворчасць сродкаў вытворчасці вядзе да стварэння пакупной здольнасці. Аднак яны не тлумачаць *прычынаў інвеставання*. Тут варта паразважаць і зразумець, што ніякі капіталіст не можа інвеставаць з мэтай задавальнення попыту, створанага пакупной здольнасцю, якая спароджана ягонымі інвестыцыямі, бо ён не кантралюе выкарыстанне гэтай пакупной здольнасці.

Ці бачыла Роза Люксэмбург гэты асноватворны момант? Цяжка адказаць. Тым не менш высновы, якія яна зрабіла з сваіх даследванняў, вельмі выразныя і маюць найважнейшае значэнне.

Яна гаварыла, што Маркс памыляўся, калі дапускаў, што капіталізм з'яўляецца універсальным ладам. Наконт гэтага яна цытуе ўрывак з *"Капіталу"*, у якім Маркс пісаў:

"З мэтаю разгляду аб'екта нашага даследвання ва ўсёй ягонай

[1] *The accumulation of capital, traduction anglaise, London, 1951, p. 133. Адпаведны ўрывак французскага перакладу (Maspero, t. I, p. 120) даволі розніцца формаю, але не сэнсам.*

сукупнасці, пазбаўленай усялякіх дадатковых і адмысловых акалічнасцяў, мы будзем падыходзіць да ўсяго сусвету як да адзінай нацыі і будзем дапускаць, што капіталістычная вытворчасць усталявалася паўсюль і ахапіла ўсе галіны прамысловасці"[1].

Калі прыняць такі пункт адліку, дык немагчыма зразумець, дзе капіталісты знаходзяць *новыя* рынкі збыту, якія павінны апраўдаць *дадатковыя* інвестыцыі.

Як пісала Роза Люксэмбург, ісціна ў тым, што "капіталізм узнікае і развіваецца ў межах некапіталістычнага грамадства..."

"Існаванне і развіццё капіталізму патрабуе асяроддзя з некапіталістычнымі формамі вытворчасці...

Капіталізм мае патрэбу ў некапіталістычных сацыяльных пластах у якасці рынку для ягонай прыбытковай вартасці, у якасці крыніцы забеспячэння ягоных сродкаў вытворчасці і ў якасці рэзервуара працоўнай сілы для ягонай сістэмы наймання[2]".

У апошніх радках згадвалася не проста патрэба ў папярэдніх рынках збыту, але і іншыя матывы. Аднак, на думку аўтара, бясспрэчна, што пытанне рынкаў збыту — асноўнае.

Адрозна ад Гільфэрдынга Роза Люксэмбург не лічыла, што пошук рынкаў збыту за мяжой — *новы* факт у развіцці капіталізму ў XX ст. Яна меркавала, што ў гэтым — заўсёдная ўмова капіталістычнага развіцця.

Капіталізм, на яе думку, стварае сабе рынак праз зруйнаванне папярэдніх эканамічных сістэмаў, дзе ў значнай ступені ігнаравалася вытворчасць на рынак: першабытныя супольнасці, традыцыйная сялянская грамада, феадальны лад. Вялікія эўрапейскія нацыі здзейснілі такое руйнаванне на сваёй уласнай тэрыторыі на працягу пэўнага часу. Але з самага пачатку яны рабілі тое сама і ў аддаленых рэгіёнах, якія ўжо былі каланізаваныя або знаходзіліся пад іх уплывам. Уся гісторыя капіталізму — гэта толькі працэс увядзення рынкавай сістэмы ў новыя рэгіёны сусвету і манапалізацыі новых рынкаў на карысць індустрыяльных супердзяржаваў.

На думку Розы Люксэмбург, капіталізм павінны знікнуць не таму, што непераадольныя супярэчнасці развіваюцца ў

[1] *Ibid., p. 331.*
[2] *Ibid., p. 368.*

сферы, дзе ён цалкам усталяваў сваё панаванне, а таму, што ён не можа па-сапраўднаму ўсталяваць сваё панаванне ва ўсім свеце.

"Ён мусіць разваліцца, — пісала яна, — бо няздольны стаць назаўжды універсальнай формай вытворчасці"[1].

Гэтае сцверджанне ёсць беспасярэднім вынікам вылучанага аўтарам тэзіса пра замежныя рынкі збыту.

Твор Розы Люксэмбург, нягледзячы на ягонае велізарнае значэнне, пад час выхаду ў свет быў дрэнна прыняты бальшынёю марксістаў. З аднаго боку, на думку расейскіх марксістаў і, у прыватнасці, Леніна, галоўным недахопам ідэяў, якія сцвярджаліся ў творы, было вонкавае збліжэнне з тэзісамі народніцтва (мы яшчэ вернемся да гэтай тэмы). З другога боку, за 15 гадоў у Заходняй Эўропе значна змянілася стаўленне сацыялістычных партыяў да каланіяльнага пытання[2], бо ў шматлікіх краінах каланіяльныя захопы разглядаліся станоўча, нават у асяроддзі рабочага класа (напрыклад, у Нямеччыне). Яшчэ ў 1902 г. Каўцкі выразна падкрэсліваў, што капіталізм знікне ў выніку "хранічнай дэпрэсіі", якая паўстане з факта немагчымасці дастаткова імклівага пашырэння сусветнага рынку[3]... Але праз невялікі час Каўцкі перастаў надаваць гэтаму пытанню вялікае значэнне[4]. А ў 1927 г. ён наўмысна адмовіўся ад сваёй тэорыі 1902 г. і падтрымаў Гільфэрдынга, які абвінаваціў тэорыю Розы Люксэмбург у "бальшавізме"[5].

Яшчэ напярэдадні вайны 1914 г. нямецкія сацыялісты спрабавалі адхіліць тэорыю Розы Люксэмбург[6]. Адны з іх давалі тлумачэнне эканамічнай экспансіі праз рост насельніцтва; другія імкнуліся сцвярджаць, быццам, нягледзячы ні

---

[1] *Ibid., p. 467. Дарэчы, варта заўважыць, што Роза Люксэмбург тым не менш не лічыла, што сацыялізм можа быць пабудаваны спачатку ў адсталых краінах. Яна пісала: "Толькі з Эўропы, толькі з найбольш сталых капіталістычных краінаў можа зысці, калі надыдзе час, сігнал рэвалюцыі, якая вызваліць чалавека". ("Крызіс сацыял-дэмакратыі", 1916). Cité par Hélène d'Encausse et Stuart Scharm, in Le marxisme et l'Asie, Paris, 1965, p. 186.*

[2] *Cf. G. D. H. Cole, op. cit., vol. III, Ire partie, p. 43.*

[3] *Cf. P. M. Sweezy, op. cit., p. 198.*

[4] *Id., ibid., p. 202.*

[5] *Ibid., pp. 207–208.*

[6] *Cf. G. D. H. Cole, op. cit., pp. 515–516.*

на што, становішча працоўных пагаршаецца і цяпер трэба абараняць погляды Маркса аб праяве капіталістычных супярэчнасцяў; нарэшце, трэція без ваганняў далучаліся да рэфармісцкіх поглядаў.

* * *

Калі ў Нямеччыне разгортвалася спрэчка наконт "рэвізіянізму", французскі рабочы рух быў падзелены на супрацьлеглыя плыні больш, чым які іншы. Марксісты ядналіся вакол Жуля Геда, рэфармісты ("пасібілісты") — вакол Поля Бруса. У Францыі не было паглыбленай дыскусіі наконт эканамічных тэзісаў Маркса. Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў сацыялістычным руху панавалі ідэі рэфарміста Жана Жарэса. Хоць ён і пачынаў сваю кар'еру як выкладчык філасофіі, але не зрабіў значнага ўкладу ў развіццё сацыялістычнай думкі. Па пытанні нацыянальнай абароны Жарэс паспрабаваў выйсці з супярэчнасці, у якой знаходзіліся сацыялісты шматлікіх краінаў, прапаноўваючы план (крыху утапічны) стварэння "новай арміі", якая грунтавалася б на дэмакратычных прынцыпах набору і фармавання. Вядома, што напярэдадні сусветнага канфлікту ён яскрава дэманстраваў сваю варожасць да вайны, і гэта каштавала яму жыцця. Жарэс быў забіты фанатыкам, супраціўнікам пацыфісцкіх ідэяў.

§ 4. Марксізм у Расеі

У 1880 г. малады расейскі інтэлігент Георгій Пляханаў (1857—1918) мусіў уцячы за мяжу з прычыны пераследу за рэвалюцыйную дзейнасць. Яшчэ раней ён пакінуў групу народнікаў, бо не верыў у эфектыўнасць тэрарызму, і стварыў арганізацыю, праграма якой ставіла мэту размеркавання зямлі паміж сялянамі. Пераехаўшы ў Заходнюю Эўропу, Пляханаў, як і іншыя расейскія выгнанцы, неўзабаве захапіўся ідэямі Маркса. У 1883 г. ён выпусціў брашуру *"Сацыялізм і палітычная барацьба"*[1], скіраваную супраць народнікаў. Праз дзесяць гадоў у Санкт-Пецярбурзе ўжо існавала блізу 20

[1] *Гл. на гэты конт Richard Kindersley, The first Russian Revisionists ("Першыя расейскія рэвізіяністы"), Oxford, 1962, p. 25.*

марксісцкіх групаў. Якраз тады сюды прыехаў студэнт факультэта права Ленін, выгнаны з Казанскага універсітэта за палітычную дзейнасць.

Ленін (яго сапраўднае імя Уладзімір Ілліч Ульянаў) быў сынам чыноўніка. Ягоны брат быў павешаны ў 1887 г. за ўдзел у няўдалай спробе замаху на цара Аляксандра III.

У 1893—1895 гг. Ленін аб'яднаў марксісцкія гурткі Санкт-Пецярбурга ў "Хаўрус барацьбы за вызваленне рабочага класа". У 1896 г. кіраваў страйкам 30 тысячаў рабочых тэкстыльнай прамысловасці, у выніку чаго яны дамагліся абмежавання працоўнага дня да 11 з паловай гадзінаў. Аднак малады змагар быў арыштаваны, пратрыманы на працягу 14 месяцаў у турме, а потым высланы на тры гады ў Сібір. Пасля свайго вызвалення Ленін перабраўся за мяжу і пражыў галоўным чынам у Жэнэве да 1917 г. Сваімі шматлікімі артыкуламі і кнігамі глыбока паўплываў на расейскі сацыялістычны рух. Ён паставіў на мэце даказаць, што вучэнне Маркса дапасуецца да Расеі і што там можна нават здзейсніць пралетарскую рэвалюцыю накшталт той, якую прадбачыў Маркс.

Асноўнымі супраціўнікамі Леніна былі, з аднаго боку, народнікі, пра якіх мы ўжо вялі гаворку, а з другога — інтэлігенты сацыялістычнай накіраванасці, якіх у Расеі называлі "легальнымі марксістамі".

З Туган-Бараноўскім, адным з "легальных марксістаў", мы пазнаёмімся далей. Сярод іншых найбольш значнымі былі эканамісты Струве, Булгакаў, Франк і філосаф Нікалай Бердзяеў. Гэтыя мысляры былі ў большай ступені ліберамі, чым сацыялістамі, аднак выкарыстоўвалі асобныя даследванні Маркса, каб прадэманстраваць неабходнасць глыбокіх сацыяльных зменаў у Расеі. Але яны выказваліся хутчэй на карысць ідэі сацыяльнай эвалюцыі, чым рэвалюцыі. Яшчэ да Бэрнштайна яны зрабілі вельмі блізкую да ягонай крытыку ідэяў Маркса.

У палітычнай эканоміі погляды "легальных марксістаў" былі дыяметральна супрацьлеглыя поглядам народнікаў, і гэтым тлумачыцца тое, што часам яны пагаджаліся з рэвалюцыйнымі марксістамі. У прыватнасці, "легальныя марксіс-

ты" прызнавалі, што капіталізм у Расеі будзе развівацца. Аднак на іх погляды паўплываў уздым неакласічнай палітэканоміі ў Заходняй Эўропе, і яны хутка адмовіліся ад тэорыі працоўнай вартасці.

А) Праблема развіцця капіталізму ў Расеі: пытанне замежных рынкаў збыту

У барацьбе з народнікамі Ленін у сваіх шматлікіх даследваннях, з якіх найбольш ёмістае называецца *"Развіццё капіталізму ў Расеі"* (1899), сцвярджаў, што Расея не можа не пайсці тым шляхам, па якім ідуць заходнія краіны, і што ўжо можна канстатаваць, з аднаго боку, развіццё капіталістычнай прамысловасці, а з другога — імклівае прасочванне капіталізму ў сельскую гаспадарку.

Пры такім стаўленні да праблемы Ленін звёў да мінімуму ролю замежных рынкаў у росце капіталістычнай эканомікі.

Ленін не раз крытыкаваў тэзіс народнікаў, згодна з якім Расея не стане капіталістычнай краінай, бо не зможа завяваць замежных рынкаў збыту[1]. Ён цалкам справядліва паказваў, што тэзісы народнікаў пра "недастатковае спажыванне" нездавальняльныя. Але яму самому не ўдалося дакладна вызначыць ролю, якую выконваюць вонкавыя рынкі. Ленін увогуле быў схільны адмаўляць значэнне гэтага фактару, бо канстатаваў, што на практыцы капіталізм у Расеі развіваецца, хоць гэтая краіна і не валодае значнымі сусветнымі рынкамі.

Аднак выснова не мае пад сабой рэальнага грунту, бо варта заўважыць, што расейскі капіталізм быў у значнай ступені *"імпартаваным"* капіталізмам, аналагічным капіталізму, што развіваўся на каланізаваных тэрыторыях.

Рухавіком развіцця капіталізму стала буйнамаштабнае інвеставанне ў краіну замежных капіталаў (галоўным чынам французскіх). Замежнікі давалі ў пазыку свае ашчаджанні расейскаму ўраду, які праз гэта мог ажыццяўляць грамадскія працы, напрыклад будаваць чыгунку. Дарэчы, у асобныя рэнтабельныя сектары (горназдабыўная прамысловасць,

[1] *Гл., у прыватнасці, тэксты 1897 і 1899 гг., апублікаваныя ў другой кнізе "Капіталу" выдавецтвам "Editions Sociales" (Le Capital, vol. V, pp. 171—212).*

металургія) іншаземныя капіталісты інвеставалі свае капіталы і наўпрост. Гэтага было дастаткова, каб стварыць дадатковую пакупную здольнасць, якая ахоплівала ўсе рынкі і вяла да паступовага адмаўлення ад традыцыйнага ладу вытворчасці.

Той факт, што ў выніку імпарту замежных капіталаў магчыма пэўнае развіццё капіталізму ў адсталых краінах, зусім не супярэчыць тэзісу, згодна з якім у *краінах-метраполіях* капіталізм развіваецца на глебе заваёвы замежных рынкаў. Менавіта гэтага, на жаль, і не ўсведамлялі дастаткова добра марксісцкія тэарэтыкі на пачатку стагоддзя, і гэтым тлумачыцца, што ім не ўдалося зрабіць сапраўдны аналіз прычынаў і наступстваў імперыялізму.

У 1915 г. малады член бальшавіцкай партыі Нікалай Бухарын напісаў невялікі твор *"Сусветная эканоміка і імперыялізм"*, да якога Ленін зрабіў прадмову (яна, дарэчы, згубілася). Апублікаваны спачатку ў часопісе *"Камуніст"*, артыкул убачыў свет у Расеі ў 1917 г., неўзабаве пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У сваім даследванні аўтар выступіў катэгарычна супраць тэзіса пра неабходнасць вонкавых рынкаў для капіталістычнага развіцця. Ён сцвярджаў, што пошук замежных рынкаў вядзецца толькі таму, што пашырэнне рынку дазваляе арганізаваць вытворчасць у большым маштабе, а значыць, паменшыць сабекошт і павялічыць прыбыткі. Бухарын пісаў: "Не варта разумець гэты закон буйнамаштабнай вытворчасці ў тым сэнсе, што экспансія па-за нацыянальныя межы — гэта нешта накшталт абсалютнай неабходнасці"[1].

Між іншага, Бухарын прызнаваў, што ў перадавых краінах імперыялізм вядзе да павелічэння заробкаў "асобных катэгорыяў рабочага класа"[2]. Ён тлумачыў гэта тым, што капіталісты могуць павялічыць заробкі дзякуючы "звышпрыбыткам", якія яны атрымліваюць ад свайго гандлю з замежжам. Гэтая шырока распаўсюджаная сярод марксістаў выснова вельмі недастатковая. У сапраўднасці рост заробкаў тлумачыцца велізарным павелічэннем прадукцыйнасці працы і нацыянальнага даходу.

[1] *L'économie mondiale et l'impérialisme, trad. franç., Paris, 1928, p. 76.*
[2] *Ibid., p. 169.*

Нягледзячы на адмову ад марксісцкага тэзіса аб паўперызацыі ў ягонай першапачатковай форме, аўтар сцвярджаў, што капіталізм будзе знішчаны пралетарыятам найбольш развітых краінаў.

На думку Бухарына, імперыялізм, безумоўна, забяспечвае павелічэнне заробкаў найманых працаўнікоў у перадавых краінах. Але імперыялізм вядзе таксама да вайны паміж супердзяржавамі, а наступствы вайны павінны надаць пралетарыяту развітых краінаў рэвалюцыйныя перакананні.

"Сама вайна, — пісаў Бухарын, — якая можа адбыцца толькі дзякуючы маўклівай згодзе або недастатковым пратэстам пралетарыяту, паказа, што інтарэс, які ён знаходзіў у імперыялістычнай палітыцы, быў нішто ў параўнанні з бедамі, прынесенымі яму вайной"[1].

Жыццё паказала, што ягонае бачанне было памылковае. Пасля Першай і Другой сусветных войнаў вытворчыя магутнасці развітых краінаў былі хутка адноўленыя, і ровень жыцця дасягнуў даваеннага стану праз некалькі гадоў. Сусветныя войны не стварылі ў сукупнасці развітых краінаў рэвалюцыйных сітуацыяў.

Увосень 1916 г. Ленін напісаў сваю славутую працу *"Імперыялізм як вышэйшая стадыя капіталізму"*. Ён пераняў і развіў тэзіс Гільфэрдынга, адпаведна з якім імперыялізм звязаны з дзейнасцю манаполіяў і зверхнасцю банкаў над прамысловасцю. І Ленін асабліва падкрэсліваў, што "сучасны капіталізм характарызуецца... менавіта вывазам капіталаў"[2].

Тэарэтычная аснова ягонага даследвання, наколькі гэта можна вызначыць, наступная: у часы свабоднай канкурэнцыі інвеставанне капіталаў не стварае праблемаў, бо кожны капіталіст забяспечвае сабе месца на рынку за кошт сваіх суседзяў. Але ў часы манаполіяў і панавання банкаў гэты працэс разбураецца, узнікаюць велізарныя лішкі капіталаў, а гэта вядзе да імперыялізму.

Сам Ленін пісаў, што Англельшчына ў сярэдзіне XIX ст. прэтэндавала на ролю майстэрні свету[3], аднак ён не лічыў

[1] *Ibid., p. 178.*

[2] *L'impérialisme, stade suprême du capitalisme, trad. franç., Paris, Editions sociales, 1945, p. 56.*

[3] *Ibid.*

гэта асноўным з гледзішча развіцця ангельскага капіталізму. Палымяны супраціўнік народніцтва і ідэяў, якія маглі б паспрыяць гэтаму вучэнню, Ленін не пагаджаўся з высновамі Розы Люксэмбург. А ў далейшым ідэі Леніна так паўплывалі на развіццё марксісцкай дактрыны, што тлумачэнне Розы Люксэмбург наконт росту капіталізму мела зусім нязначнае ўздзеянне.

Менавіта гэткім чынам, лічым мы, барацьба Леніна супраць народніцтва спыніла развіццё эканамічных роздумаў у такім асноватворным кірунку да сённяшняга часу.

Б) Тэорыя захопу ўлады ў адсталай краіне

Дарэчы, супраць "легальных марксістаў" Ленін змагаўся з такой жа палымянасцю, як і супраць усіх іншых формаў рэфармізму і рэвізіянізму. Менавіта ў барацьбе з імі ён распрацаваў рэвалюцыйнае вучэнне, якое паспяхова ажыццявіў на практыцы ў 1917 г.

У 1903 г. "легальныя марксісты" пакінулі сацыял-дэмакратычную партыю і далучыліся да "ліберапаў". Але ў тым жа годзе ў самой сацыял-дэмакратычнай партыі адбыўся падзел паміж дзвюма плынямі. Першая, з Леніным, была ў "бальшыні", і таму ейныя прадстаўнікі атрымалі назоў "бальшавікоў". Другая была ў меншыні, і адпаведна ейныя прадстаўнікі — "меншавікі". Калі апошнія меркавалі, што ў Расеі спачатку адбудзецца "буржуазная рэвалюцыя" і яна прывядзе да прыняцця канстытуцыі і прадстаўнічага ўрада, у якім сацыялісты не павінны ўдзельнічаць, дык Ленін сцвярджаў, што варта адразу ж пераходзіць да пралетарскай рэвалюцыі. Ён пісаў:

"Як толькі будзе здзейснена дэмакратычная рэвалюцыя, мы адразу ж і з дакладным вымярэннем сілаў свядомага і арганізаванага пралетарыяту пойдзем па шляху сацыялістычнай рэвалюцыі. Мы за бесперапынную рэвалюцыю"[1].

Між іншага, Ленін меркаваў, што ў сацыялістычнай рэвалюцыі пралетарыят павінен стварыць хаўрус з сялянамі, размеркаваць паміж імі зямлю нават за кошт адкладвання

[1] *L'attitude de la social-démocratie à l'égard du mouvement paysan, Proletari, 1er septembre 1905 r, article reproduit dans Lenine, Oeuvres choisies, 2 vol., Moscou, t. I, p. 540.*

на будучае мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі. У прамысловасці варта прайсці праз этап "дзяржаўнага капіталізму", пры якім заводы застануцца ў руках капіталістаў, але пад сталым кантролем дзяржавы. Гэта стане магчыма, бо ўлада будзе цалкам належаць пралетарыяту, ён будзе здзяйсняць "дыктатуру", якую прадугледжваў Маркс. Нарэшце, Ленін не сумняваўся, што разгортванне пралетарскай рэвалюцыі ў Расеі вельмі хутка прывядзе да рэвалюцыі на Захадзе і гэта палегчыць пабудову сацыялізму ў Расеі.

Варта нагадаць, што дзеяч расейскай сацыял-дэмакратычнай партыі Леў Троцкі, які адыграе вялікую ролю ў 1917 г., не падзяляў поглядаў ні меншавікоў, ні Леніна.

У 1905 г., калі адбылася першая няўдалая расейская рэвалюцыя, Троцкі надрукаваў памфлет, скіраваны супраць ліберапаў, дзе сфармуляваў сваю тэорыю "перманентнай рэвалюцыі". Выкарыстоўваючы гэты выраз, Троцкі, гэтаксама як і Ленін ва ўрыўку, што мы цытавалі, звяртаўся да выказанай Марксам ідэі, але надаваў ёй новае гучанне. На думку Троцкага, немагчыма разлічваць на доўгатэрміновую падтрымку сялянства. Заваяваўшы ўладу, расейскі пралетарыят павінен абавязкова распачаць імклівую пабудову сацыялізму, гэта значыць нацыяналізацыю прамысловасці і перавод на сацыялістычныя рэйкі сельскай гаспадаркі. Ажыццяўляючы праграму, пралетарыят непазбежна сутыкнецца з сялянствам, а ў такой краіне, як Расея, сялянства абавязкова будзе мацнейшым, пакуль заходні пралетарыят, здзейсніўшы рэвалюцыю ў сваіх краінах, не прыйдзе на дапамогу расейскаму пралетарыяту.

"Без прамой урадавай дапамогі эўрапейскага пралетарыяту, — пісаў Троцкі, — расейскі рабочы клас не здолее ўтрымацца каля ўлады і ператварыць сваё часовае панаванне ў стабільную і доўгатэрміновую сацыялістычную дыктатуру"[1].

Такім чынам, на той момант погляды Троцкага і Леніна не супадалі. Троцкі адрозна ад Леніна не верыў у магчымасць усталявання і захавання ў Расеі на працягу пэўнага перыяду сістэмы дзяржаўнага капіталізму, кантроль за якой ажыццяўляе пралетарыят, маючы ў руках палітычную ўладу.

[1] *Cité par G. D. H. Cole, op. cit., vol. III, IIe Partie, p. 961.*

Ленін не надаваў, як Троцкі, такога вялікага значэння развіццю рэвалюцыйнага руху на Захадзе дзеля поспеху пралетарскай рэвалюцыі ў Расеі. Дарэчы, у асобных творах думкі Леніна ад гэтага часу паварочваюцца ў бок Усходу.

У артыкуле *"Гістарычныя лёсы вучэння Карла Маркса"*, які выйшаў у 1913 г., Ленін зазначаў, што з 1848 г. змяніліся тры гістарычныя перыяды: першы перыяд доўжыўся да 1872 г., пад час яго ў Эўропе адбыліся буржуазныя рэвалюцыі, якія пралетарыят не здолеў трансфармаваць у сацыялістычныя; другі — ад 1872 да 1905 г., пад час яго затухаў рэвалюцыйны рух і сярод сацыялістаў панаваў рэфармізм; нарэшце, пра трэці перыяд, у часе якога распачаўся новы рэвалюцыйны рух "у Азіі", Ленін пісаў:

"Пасля расейскай рэвалюцыі адбыліся турэцкая, персідская і кітайская рэвалюцыі. Сёння мы жывём менавіта ў эпоху такіх бураў і іхных адбіткаў у зваротным сэнсе ў Эўропе"[1].

Ленін лічыў, што эканамічна адсталыя рэгіёны мусяць адыграць важную ролю ў сусветнай рэвалюцыі. Прынамсі, заўвага пра "адбіткі ў зваротным сэнсе ў Эўропе" красамоўна сведчыць пра тое, што Ленін заставаўся верным ідэі пабудовы сацыялізму найперш у развітых краінах. Гэтаксама, калі ў 1915 г. ён пісаў, што перамога сацыялізму магчымая "ў некалькіх капіталістычных краінах або нават у адной асобна ўзятай капіталістычнай краіне"[2], дык ён меў на ўвазе развітую капіталістычную краіну. Але гэтая выснова не перашкаджала яму сцвярджаць, што партыя бальшавікоў павінна захапіць уладу ў Расеі, як толькі для гэтага надыдзе спрыяльны момант.

У красавіку 1917 г. у брашуры *"Задачы пралетарыяту ў цяперашняй рэвалюцыі"* Ленін напісаў наступнае:

"Звычайна пярэчаць, што расейскі народ яшчэ не падрыхтаваны да ўсталявання камуны. Гэта аргумент феадалаў, якія сцвярджалі, што іхныя сяляне не былі падрыхтаваныя да свабоды... Чым менш расейскі народ мае досведу ў галіне арганізацыі, тым больш варта рашуча распачынаць справу арганізацыі народа ім самім... Чым раней мы пазбавімся старых забабонаў псеўдамарксізму, марксізму, сапсаванага панамі Пля-

[1] *Cf. OEuvres choisies, op. cit., I, p. 71.*
[2] *Ibid., p. 775.*

ханавым, Каўцкім і да іх падобнымі, тым больш высілкаў мы накіруем на дапамогу народу..."[1]

Такім чынам, Ленін навязаў членам бальшавіцкай партыі пераход да ўзброенага паўстання, хоць яны і не былі прыхільнікамі такога падыходу. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі яму ўдалося перацягнуць на бок бальшавікоў масу расейскага народа, дамагаючыся прыняцця двух вызначальных крокаў: падпісання міру з Нямеччынай і падзелу паміж сялянамі земляў, якімі яны не валодалі.

На той момант Ленін яшчэ верыў, што неўзабаве рэвалюцыя адбудзецца і ў Заходняй Эўропе. Адпаведны заклік быў зроблены да сацыялістаў усяго свету. Сацыялісты, якія выказалі сваю салідарнасць з савецкім рэжымам, сталі называцца "камуністамі", а іхныя партыі аб'ядналіся ў межах III Інтэрнацыянала, створанага Леніным у 1919 г. Напісаны да гэтай падзеі *"Маніфест"* яшчэ абапіраўся на класічныя тэзісы марксізму: у ім пазначалася тэндэнцыя да паўперызацыі рабочага класа ў развітых краінах і дэкляравалася, што "вызваленне калоніяў зможа адбыцца толькі дзякуючы вызваленню працоўных у панавальных краінах"[2].

Аднак, паколькі ўсе спробы рэвалюцыйных паўстанняў на Захадзе атрымалі паразу, Ленін усё большую ролю пачаў адводзіць Усходу. Ён пісаў, што капіталістычныя краіны Захаду развіваюцца не так, як мы меркавалі раней. Развіццё адбываецца не праз паступовае выспяванне сацыялізму ў іх, а праз эксплуатацыю адных дзяржаваў другімі, а таксама праз эксплуатацыю Усходу..."[3], і дадаваў:

"Зыход барацьбы будзе ўрэшце залежаць ад таго, што Расея, Індыя, Кітай і г. д. складаюць пераважную бальшыню насельнікаў зямлі. І менавіта гэтая бальшыня была колькі гадоў таму з неймавернай хуткасцю прыведзеная да барацьбы за сваё вызваленне"[4].

В) Праблемы пабудовы сацыялізму

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расеі і сусветныя сацыялістычныя эксперыменты XX ст. ажыццяўляліся ад імя

[1] *Ibid., p. 28.*

[2] *Cité par G. D. H. Cole, op. cit., vol. IV, Ire Partie, p. 314.*

[3] *Ён меў на ўвазе пераможаных і пераможцаў вайны 1914 г.*

[4] *"Лепш меней, ды лепей", "Правда", 2 сакавіка 1923, in OEuvres choisies, t. II, pp. 1043—1044.*

марксісцкага вучэння, абвяшчалася, што эканамічная думка ў сацыялістычным свеце грунтуецца на ідэях Карла Маркса. Але ён вельмі мала гаварыў пра сацыялістычнае грамадства. Тым больш што жыццё часцей за ўсё не пацвярджала справядлівасці тэзісаў вучонага наконт прыроды сацыялізму. Менавіта гэтым можна вытлумачыць складанасць спрэчак, якія разгарнуліся ў Расеі ў перыяд пабудовы новага ладу.

1. ПАРАЗА БЕЗГРАШОВАЙ ЭКАНОМІКІ. Маркс вельмі выразна зазначаў, што вартасць знікне на "сама першай фазе камуністычнага грамадства"[1]. Гэта азначала, што знікне палітычная эканомія, бо ў яе не будзе аб'екта даследвання. Існаванне эканамічных законаў пры капіталізме было звязанае з адчужэннем індывідаў, з няведаннем сапраўднай прыроды іхных эканамічных дачыненняў. Пры капіталізме чалавек зведзены да стану прыроднага аб'екта, і сацыяльныя дачыненні падпарадкаваныя законам, адпаведным законам прыроднага свету. Але пры сацыялізме адчужэнне знікае, чалавек спазнае самога сябе, ён больш не прыродны аб'ект і больш не існуе эканамічных законаў.

Лідэры Кастрычніцкай рэвалюцыі цалкам прынялі гэтую канцэпцыю. Яны лічылі, што адразу ж пасля захопу ўлады пралетарыятам прынцып арганізацыі эканомікі павінны прыйсці наўзамен спантаннага дзеяння эканамічных законаў.

У Леніна такая канцэпцыя сацыялістычнай эканомікі шчыльна спалучылася з тэзісам пра паступовае адміранне дзяржавы, які ён таксама знайшоў у Маркса. У брашуры *"Дзяржава і рэвалюцыя"*, напісанай у жніўні — верасні 1917 г. і апублікаванай у 1918 г., Ленін сцвярджаў:

"Пры такіх эканамічных умовах пасля перамогі над капіталістамі і чыноўнікамі іх адразу ж з вялікім поспехам не сёння, дык заўтра можна замяніць — у тым, што датычыць кантролю за вытворчасцю і размеркаваннем, і ў тым, што датычыць уліку працы і тавараў, — на ўзброеных рабочых, на ўвесь узброены народ... Улік і кантроль — вось што з'яўляецца галоўным для арганізацыі і для рэгулярнага функцыянавання камуністычнага грамадства на ягонай першай фазе"[2].

Такім чынам, усе эканамічныя праблемы будуць ад гэта-

[1] *Гл. "Крытыку Гоцкай праграмы".*

[2] *L'Etat et la Révolution, trad. franç., Edit. Soc., 1946, p. 91.*

га часу развязвацца з дапамогай вельмі простых і відавочна неабходных арганізатарскіх крокаў, якія зыходзяць з волі ўсіх грамадзянаў без усялякай патрэбы ўмяшання спецыялізаваных функцыянераў. А гэта прывядзе да знікнення дзяржавы і ўсяго, што ідзе поруч з ёй.

У прыватнасці, больш не павінны існаваць грошы. Такое бачанне выказвалася ў падручніку *"Азбука камунізму"*, напісаным у 1919 г. Нікалаем Бухарыным і Яўгеніем Прэабражэнскім[1].

"Ад пачатку сацыялістычнай рэвалюцыі, — чытаем мы, — грошы паступова губляюць вартасць. Усе нацыяналізаваныя прадпрыемствы накшталт прадпрыемства аднаго буйнога патрона... будуць мець супольную касу і больш не будуць мець патрэбы ў ажыццяўленні аперацыяў куплі і продажу за грошы. Праз гэта паступова наладзіцца безграшовы абмен. У выніку грошы будуць выведзены з галінаў народнай гаспадаркі. Нават у дачыненні да сялянаў грошы будуць павольна губляць сваё значэнне і заменяцца натуральным абменам. Скасаванню грошай дапаможа таксама дзяржава, якая выпусціць велізарную колькасць папяровых грошай... Але канчатковы ўдар па грашах будзе зроблены праз увядзенне працоўных кніжак і праз натуральную аплату працоўным..."[2]

Гэтыя радкі былі напісаны ў разгар грамадзянскай вайны, калі абставіны вымусілі арганізаваць рэквізіцыю сельскагаспадарчых прадуктаў у вёсцы і натуральную аплату працы рабочых. Аўтары кнігі, паўтараючы шырока распаўсюджаныя на той час у савецкай Расеі ідэі[3], бачылі ў гэтым крок да камунізму.

У кнізе *"Эканоміка пераходнага перыяду"*, напісанай у часе ваеннага камунізму, Нікалай Бухарын сцвярджаў, што "канец капіталістычнай рынкавай эканомікі будзе таксама і канцом палітычнай эканоміі"[4].

Заставалася толькі вызначыць, на якой аснове будзе грунтавацца лад, які мусіць прыйсці наўзамен рынку.

У сакавіку 1920 г. на IX з'ездзе большавіцкай партыі Троцкі даводзіў: калі скасаваць абмен, дык яго варта замяніць планавым кіраваннем эканомікай. Стваральнік Чырво-

[1] *Новае французскае выданне, Paris, 1963.*

[2] *Op. cit., p. 314.*

[3] *Cf. E. H. Carr, The Bolshevik Revolution, t. II, New York, 1952, pp. 260—268.*

[4] *Cité par Czeslaw Bobrowski, Formation du système soviétique de planification, La Haye-Paris, 1956, p. 53.*

най Арміі, ён схіляўся да развязання эканамічных праблемаў з дапамогай вайсковых метадаў[1].

Але большыня палітычных лідэраў мела вельмі блытаныя ідэі па дадзенай праблеме. Ленін пісаў: "Камунізм — гэта ўлада Саветаў плюс электрыфікацыя ўсёй краіны". Ён горача падтрымліваў праграму развіцця электраэнергетыкі (План ГОЭЛРО), якая зусім не была ўсеагульным эканамічным планам. Аднак у красавіку 1921 г. была створана і пачала сваю працу Камісія па дзяржаўным плане, ці Дзяржплан. Але ў яе ўваходзілі толькі 34 функцыянеры[2].

На пачатку 1921 г. перад катастрафічнымі наступствамі "ваеннага камунізму" Ленін пастанавіў распачаць "новую эканамічную палітыку" (НЭП), якая, у прыватнасці, прадугледжвала аднаўленне прыватнага гандлю, а значыць, і вяртанне да грашовага абмену.

Такім чынам, Ленін у пэўнай ступені бачыў асноватворную памылку ў марксісцкай тэорыі, якая сыходзіла да сцвярджання, нібы абагульненне сродкаў вытворчасці зробіць эканамічныя дачыненні паміж людзьмі настолькі "простымі і празрыстымі"[3], што сацыялістычная эканоміка будзе арганізаваная лягчэй за ўсё на свеце.

Але выснова, якую пачаў абараняць Ленін, выразна сведчыла пра няслушнасць ідэі аб адміранні дзяржавы, ідэі, якую выказваў Маркс у *"Крытыцы Гоцкай праграмы"* і якую Ленін таксама спрабаваў развіваць у *"Дзяржаве і рэвалюцыі"*.

У 1917 г. Ленін урачыста абвясціў, што пралетарыят павінны "разбурыць дзяржаўную машыну". Але ў дакладзе ад 1922 г. выказаў шкадаванне наконт таго, што савецкая дзяржава вымушана выкарыстоўваць "сотні тысячаў чыноўнікаў, атрыманых у спадчыну ад цара і буржуазнага грамадства"[4], і ўсё, чаго ён жадае, дык гэта замены іх на добрых камуністаў. Сапраўды, замена адбудзецца, але "дыктатура пралетарыяту" набудзе тады форму дыктатуры камуністыч-

[1] *Cf. E. H. Carr, op. cit., p. 370.*
[2] *Id., ibid., p. 377.*
[3] *Le Capital, op. cit., t. I, p. 90.*
[4] *Пяць гадоў Рускай рэвалюцыі, in OEuvres choisies en deux volumes, édition en langue française, Moscou, 1946, t. 2, p. 1001.*

най партыі над насельніцтвам, дыктатуры, якая з гадамі ўсё больш і больш будзе набываць выгляд таталітарнага рэжыму.

У 1927 г. Сталін так тлумачыў творчасць Леніна: "Ён паказаў, што: а) партыя з'яўляецца найвышэйшай формай класавай арганізацыі пралетарыяту параўнальна з усімі іншымі формамі арганізацыі пралетарыяту (прафсаюзы, кааператывы, дзяржаўныя арганізацыі), дзейнасць якіх партыя заклікана каардынаваць і кіраваць; б) дыктатура пралетарыяту можа быць ажыццёўленая толькі партыяй, якая з'яўляецца кіравальнай сілай гэтай дыктатуры; в) дыктатура пралетарыяту можа быць поўнай толькі тады, калі ёю кіруе адзіная партыя, камуністычная партыя, якая не падзяляе і не павінна падзяляць уладу з іншымі партыямі; г) без жалезнай дысцыпліны ў партыі нельга ажыццявіць задачы дыктатуры пралетарыяту, якія палягаюць у знішчэнні эксплуататараў і пераўтварэнні грамадства, падзеленага на класы, у сацыялістычнае грамадства"[1].

Гэткае тлумачэнне ўкладу Леніна ў марксізм, якое падаецца цалкам дакладным, адсылае нас з усёй відавочнасцю даволі далёка ад думкі, выказанай заснавальнікам Савецкага Саюза ў 1917 г.: "Эксплуататары па сваёй прыродзе не ў стане прыгнятаць народ без вельмі разгалінаванай машыны, прызначанай для ажыццяўлення гэтай задачы, а народ можа прыгнятаць сваіх эсплуататараў нават з дапамогай вельмі простай "машыны", практычна без "машыны", без спецыяльнага апарату, з дапамогай простай *арганізацыі ўзброеных масаў*" (як сказалі б мы наперад, Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў)[2].

2. ПАБУДОВА ПЛАНАВАЙ ЭКАНОМІКІ З ГРАШОВЫМІ ДАЧЫНЕННЯМІ. НЭП працягваўся да снежня 1927 г. (XV з'езд партыі бальшавікоў). Гэта была фаза параўнальнага лібералізму ў палітычным і эканамічным плане. Шматлікія эканамісты-небальшавікі вярнуліся ў Расею і занялі важныя пасады. Гэта былі народнікі ці меншавікі.

Член Прэзідыума Дзяржплана меншавік Громан падрых-

[1] *"Сустрэча з першай дэлегацыяй амерыканскіх рабочых", 9 верасня 1927, reproduit dans Lénine, OEuvres choisies, op. cit., t. I, pp. 43—44.*

[2] *L'Etat et Revolution, op. cit., p. 83.*

таваў *"Паказнікі развіцця народнай гаспадаркі СССР у 1923—1924 гг."*, апублікаваныя ў Маскве ў 1926 г. На аснове гэтага дакумента В. Лявонцьеў напісаў у 1925 г. у Ленінградзе свой першы даклад пра сістэму міжпрамысловых абменаў[1]. У тыя часы Дзяржплан рабіў спробы планавання вынікаў вытворчасці, якія мелі найменне "кантрольных лічбаў".

НЭП дазволіў імкліва аднавіць расейскую эканоміку. У 1925 г. сельскагаспадарчая вытворчасць дасягнула 87 працэнтаў даваеннага роўню, а прамысловая вытворчасць — 75 працэнтаў роўню 1918 г.[2]

Аднак затым рост запаволіўся і меркавалася, што без змены палітыкі немагчыма забяспечыць імклівае развіццё вышэй за даваенны ровень.

Становішча зрабілася драматычным, бо сяляне захоўвалі для свайго асабістага спажывання намнога большую, чым раней, частку ўраджаю. У выніку харчовае забеспячэнне гарадоў стала недастатковым. Цэны на сельскагаспадарчыя прадукты былі высокія, а паколькі з прычыны паслаблення дысцыпліны працы сабекошт вырабаў нацыяналізаванай прамысловасці павялічыўся, дык прыбыткі ў прамысловым сектары сталі нізкія або зусім нулявыя.

А хуткае забеспячэнне эканамічнага развіцця было неабходнае, бо ўжо можна было прадбачыць Другую сусветную вайну. У 1925 г. Сталін у адной з прамоваў сказаў:

"Наспяваюць першапачатковыя ўмовы новай вайны. Вайна можа зрабіцца непазбежнай: безумоўна, не заўтра, не паслязаўтра, але праз некалькі гадоў... Калі выбухне вайна, мы ніяк не зможам застацца сядзець склаўшы рукі. Мы павінны будзем браць у ёй удзел, хоць мы павінны быць апошнія, хто будзе ў ёй удзельнічаць"[3].

Ваенная магутнасць краіны залежыць ад ейнай індустрыяльнай моцы. Значыцца, тэрмінова неабходна развіваць краіну. У такой справе можна разлічваць толькі на нацыянальныя рэсурсы. Замежныя крэдыты, якіх чакалі на пачатку НЭПа, былі надзвычай малыя.

---

[1] *Cf. Naum Jasny, Soviet Industrialization 1928—1952, Chicago, 1961, Appendice A, pp. 435—441.*

[2] *Bobrowski, op. cit., p. 43.*

[3] *Cité par Bobrowski, op. cit., p. 47 note (3).*

Перад такім становішчам і асабліва пасля смерці Леніна (студзень 1924 г.) асноўныя тэарэтыкі перыяду ваеннага камунізму выпрацавалі супрацьлеглыя падыходы.

Бухарын сцвярджаў, што эканамічны рост можна забяспечыць толькі праз росквіт сялянства. Варта пачакаць, пакуль іх падштурхне асабісты інтарэс, і тады яны павялічаць вытворчасць. У выніку можна будзе знайсці рэсурсы для індустрыялізацыі. Гэта пазіцыя так званых правых.

Насуперак гэтаму Прэабражэнскі сцвярджаў, што неабходна пайсці па шляху неадкладнай індустрыялізацыі і імклівага тэхнічнага прагрэсу. Для гэтага варта здзейсніць "першапачатковае сацыялістычнае назапашванне", збіраючы рэсурсы з сялянаў і прадаючы за мяжу частку нацыянальнай сельскагаспадарчай вытворчасці. На яго думку, гэта азначае, што адбудзецца адмаўленне ад закону вартасці. Сельскагаспадарчыя прадукты будуць прадавацца па ніжэйшым кошце, чым іхная сапраўдная вартасць, а прадукты сацыялістычнай прамысловасці — па кошце, намнога большым, чым іхная вартасць. З іншага боку, варта прадаваць сельскагаспадарчыя прадукты за мяжу па найвышэйшых коштах, каб забяспечыць краіну абсталяваннем.

Супраціўнікі падыходу "левых" адзначалі, што рэакцыяй сялянаў на такую палітыку стане захаванне яшчэ большай часткі іхнага ўраджаю і, апрача таго, яны паўстануць сапраўднымі ворагамі ўрада.

Такім чынам, панаванне дробнай індывідуальнай гаспадаркі ў вёсцы складала асноўную перашкоду на шляху эканамічнага развіцця. Яшчэ Ленін зазначаў, што пераход да буйной калектыўнай гаспадаркі ў вёсцы — умова ажыццяўлення сацыялізму ў Расеі. Але якім чынам забяспечыць імклівы пераход да сельскагаспадарчых калектываў? Для дасягнення такога выніку ніхто не прапанаваў па-сапраўднаму эфектыўнага метаду.

У такіх умовах сярод эканамістаў разгарнуліся тэарэтычныя дыскусіі. Галоўным пытаннем адноўленай эканамічнай тэорыі стала праблема эканамічнага росту ў СССР.

Эканамісты (Громан, Базараў) сцвярджалі, што рацыя-

нальнае арыентаванне інвестыцыяў неабходнае з прычыны нязначнасці капіталу.

Адны патрабавалі, каб інвестыцыі накіроўваліся ў сектары, дзе стасункі паміж дадатковай працай і дадатковым капіталам найвышэйшыя, а гэта дазволіла б паглынуць значную масу беспрацоўных. Іншыя прапаноўвалі прыняць у якасці крытэру павелічэнне вытворчасці на адзінку дадатковага капіталу.

Практычна ўсе пагаджаліся, што варта было прымусіць прадпрыемствы плаціць высокі працэнт за выкарыстанне капіталу. Адзін спецыяліст Народнага камісарыята фінансаў развіваў нават ідэю пра тое, што ў сацыялістычнай эканоміцы аптымальнае размеркаванне інвестыцыяў будзе забяспечана тады, калі маржынальная эфектыўнасць капіталу будзе аднолькавая ва ўсіх галінах[1].

Савецкія эканамісты ў прынцыпе пагаджаліся з неабходнасцю планавання і цэнтралізаванага кіравання інвестыцыямі. Аднак варта адзначыць, што да 1928 г. у СССР яшчэ не існавала сацыялістычнага плана і ніхто яшчэ не ведаў, якім ён можа быць.

На XV з'ездзе ВКП(б), які адбыўся ў снежні 1927 г., была прынята пастанова спыніць НЭП і ўвесці абавязковы для сацыялістычных прадпрыемстваў план развіцця. Гэты план суправаджаўся намаганнем скараціць капіталістычны сектар у гандлі і ў дробнай прамысловасці, а таксама імкненнем арганізаваць сялянаў у вытворчыя кааператывы.

Тым часам Сталін ужо забяспечыў сабе панавальнае становішча ў кіраўніцтве краіны. Пры падтрымцы "правых" ён мэтанакіравана працаваў над абмежаваннем уплыву лідэраў "левых" і перш за ўсё Троцкага. І яму гэта ўдалося. Вялікая колькасць левых апазіцыянераў была ўжо тады дэпартаваная. Потым Сталін выступіў супраць правых, забяспечыў прыняцце рашэнняў наконт фарсіраванай індустрыялізацыі і актыўнай барацьбы супраць заможных сялянаў. Без сумневу, Сталін на працягу доўгага часу быў прыхільнікам такой палітыкі. Ён усведамляў усю значнасць супраціву, які гэтая палітыка выкліча ў сялянства, але лічыў, што яна

[1] *Cf. J. M. Collette, Politique des investissements et calcul économique: l'expérience soviétique, Paris, Cujas, 1965, p. 68.*

можа быць паспяховай, калі партыя будзе пад ягоным кіраўніцтвам.

У Дзяржплане эканамістаў НЭПа замянілі на прадстаўнікоў супрацьлеглых поглядаў, з якіх найбольш вядомы быў Струмілін. Новыя эканамісты былі прыхільнікамі "мэтавай" канцэпцыі плана, якую яны супрацьпастаўлялі "генетычнай" канцэпцыі. Яны лічылі, што план павінны фіксаваць цалкам новыя мэты, якія не стасаваліся б з былымі тэндэнцыямі ў эканоміцы. На іх думку, рашэнні аб інвестыцыях павінны прымацца залежна ад мэтаў, якіх можна дасягнуць, а не залежна ад крытэраў, што вынікаюць з цяперашняга становішча.

Падрыхтаваны на такой глебе першы пяцігадовы план прадугледжваў велізарнае павелічэнне адначасова інвестыцыяў і спажывання. За пяць гадоў штогадовыя інвестыцыі павінны былі павялічыцца ў 5 разоў. Кожны год яны мусілі складаць ад 1/4 да 1/3 нацыянальнага даходу. Тым часам спажыванне на 1 чалавека меркавалася павялічыць на 58 працэнтаў у мінімальным варыянце і на 66 працэнтаў — у максімальным.

Ажыццяўленне гэтых мэтаў павінна было забяспечвацца імклівым ростам нацыянальнага даходу. І сапраўды, прадугледжвалася, што нацыянальны даход за пяць гадоў падвоіцца дзякуючы прамысловаму развіццю і павелічэнню сельскагаспадарчай вытворчасці (якая мусіла падвысіцца на 53 працэнты) адначасова. А ўсё гэта паспрыяе росту колькасці працоўных месцаў і асабліва велізарнаму павелічэнню прадукцыйнасці працы. Сапраўды, паказнік прадукцыйнасці працы на 1 рабочага ў прамысловасці павінен быў падвоіцца за пяць гадоў[1].

Такім чынам, здавалася, што будзе пераадолена дылема, якая выклікала супрацьстаянне правых і левых. Але ў рэчаіснасці ўсё было інакш. Бо на практыцы такое павелічэнне прадукцыйнасці немагчымае. Гэта пачалі ўсведамляць з 1928 г., нягледзячы на тое што ўжо былі зроблены значныя дасягненні ў павелічэнні інвестыцыяў і стварэнні працоўных месцаў у прамысловасці.

[1] *Cf. Bobrowski, op. cit., p. 70.*

Асноўная цяжкасць палягала ў тым, што вёска адставала ў продажы сельскагаспадарчых прадуктаў, бо заможныя сяляне хавалі вялікую колькасць збожжа.

У такім становішчы рабочым дазволілі выязджаць у вёскі для канфіскацыі збожжа. З кастрычніка 1929 г. Сталін намерыўся распачаць паскоранае стварэнне калгасаў, якое набыло форму прымусовай калектывізацыі і прывяло да высялення значнай колькасці заможнага і сярэдняга сялянства.

Дарэчы, фарсіраваная калектывізацыя пацягнула за сабой эканамічную катастрофу, бо 50 працэнтаў жывёлы было забіта. Тым не менш асноўная мэта была дасягнутая: сельская гаспадарка ўвайшла ў сацыялістычны сектар, пачала падпарадкоўвацца плану і абавязковым чынам пастаўляла дзяржаве частку ўраджаю. І толькі тады стала магчымым мінімальнае харчовае забеспячэнне гарадскіх жыхароў, колькасць якіх імкліва павялічвалася з развіццём прамысловасці. СССР пайшоў па шляху, які дазволіў яму стаць магутнай прамысловай дзяржавай.

Увесь гэты перыяд пазначаны катэгарычным непрыманнем палітычнымі лідэрамі і вядучымі эканамістамі крытэраў эканамічнай палітыкі, прапанаваных эканамістамі часоў НЭПа.

Рашуча адкідалася ідэя пра тое, што варта разглядаць капітал як капітал, які мае кошт, і патрабаваць, каб за ягонае выкарыстанне плаціўся пэўны працэнт.

Абвяшчалася, што паняцце працэнта ад капіталу ўласцівае толькі капіталізму і яно не можа быць прынятае марксістамі. Таксама сцвярджалася, што патрабаванне працэнта за капітал запавольвае тэхнічны прагрэс[1]. Савецкая практыка адмаўляла працэнт ад капіталу. Прадпрыемствы, якія валодалі фондамі, уведзенымі з боку дзяржавы ў вытворчасць, не плацілі працэнты за выкарыстанне гэтых фондаў.

Аднак усё больш і больш прыходзіла разуменне таго, што планаванне не выключае грашовага абмену, што ўлік выдаткаў вытворчасці павінны захоўвацца і што цэны працягваюць выконваць асноватворную ролю.

[1] *Cf. Collette, op. cit., p. 135.*

Безумоўна, савецкае планаванне грунтавалася на дадзеных прадпрыемствам дырэктывах наконт вытворчасці і на дазволах на набыткі, якія ім вызначаліся.

Але, між іншага, насельніцтва вымагала свабоднага выбару спажывання. Значыць, трэба было, каб існаваў рынак спажывецкіх тавараў і каб планавальнік узяў на сябе клопат фіксавання цэнаў на прадукты, попыт і прапанова якіх не вельмі адрозніваліся.

Таксама выказвалася патрабаванне свабоднага выбару працы, заробкі разнастайных катэгорыяў працоўных павінны былі фіксавацца з улікам неабходнасці прываблівання працоўнай сілы ў пэўны сектар вытворчасці і ў пэўны рэгіён.

З іншага боку, на ўсіх прадпрыемствах, нават на тых, якія выраблялі сродкі вытворчасці, вельмі відавочна паўстала неабходнасць вядзення бухгалтарскага ўліку, які дазваляў бы зрабіць грашовую ацэнку вынікаў кіравання. Кошты на сродкі вытворчасці фіксуюцца не толькі дзеля таго, каб служыць у якасці асновы вызначэння цэнаў на спажывецкія тавары, але і для таго, каб дазволіць "кантроль рублём" усіх прадпрыемстваў.

Паміж выдаткамі вытворчасці і цаной продажу паўставала розніца — прыбытак, велічыня якога была паказнікам добрага функцыянавання прадпрыемства. Хоць гэты паказнік і не разглядаўся ў якасці галоўнага (ён ішоў пасля роўню выканання плана), але быў не менш неабходны.

Нарэшце, прыбытак быў сродкам, які забяспечваў зацікаўленасць працоўных у добрым кіраванні і ў прадукцыйнасці. Адсюль стварэнне "дырэктарскага фонду", у які накіроўвалася частка прыбыткаў прадпрыемства і які служыў для фінансавання разнастайных неабходных для рабочых праграмаў (пабудова жылля, летніх лагераў).

Такім чынам, пабудаваны ў СССР тып эканомікі, які пасля Другой сусветнай вайны стаў узорам для краінаў народнай дэмакратыі — Кітая, Паўночнага В'етнама, Кубы і г. д., — гэта прыклад планавай эканомікі, але ў якой выкарыстоўваюцца грошы і дзе колазварот тавараў ажыццяўля-

ецца праз абмен. Набываюць не толькі індывіды; прадпрыемствы таксама набываюць усё неабходнае для сябе абсталяванне і заключаюць паміж сабой кантракты, якімі прадугледжваюцца ўмовы паставак. Карацей кажучы, такі тып эканомікі вельмі нагадвае той, якому ў 1800 г. даў апісанне Фіхтэ ў сваёй *"Замкнёнай гандлёвай дзяржаве"*.

Бібліяграфія

Па ўсіх пытаннях, закранутых у гэтым раздзеле, найлепшы гід і найлепшая крыніца інфармацыі — бліскучы твор

G. D. H. Cole, *A History of Socialist Thought*, t. II: *Marxism and anarchism 1850—1890*, London, 1954; t. III (2 vol.): *The second international 1889—1914*, London, 1956; t. IV: *Communism and social democracy 1914—1931*, London, 1958; t. V: *Socialism and fascism 1931—1939*, London, 1960.

Апрача таго, можна выкарыстоўваць шматлікія творы, прысвечаныя эвалюцыі сацыялістычнай дактрыны пасля Маркса. Сярод іх назавем

M. Drackovitch, *Les socialismes français et allemand et le problème de la guerre (1870—1914)*, Genève, 1953.

J. Droz, *Le socialisme democratique, 1864—1960*. Paris, 1966.

— *Socialisme et syndicalisme de 1914 à 1939*, Paris, 1972.

— *et autres auteurs, Histoire générale du socialisme*, Paris, 1972—1977.

M. Drackovitch, *De Karl Marx à Léon Blum, la crise de la social-démocratie*, Genève, 1954.

A. D. H. Kaplan, *Henry Charles Carey. A Study in American Economic Thought*, Baltimore, 1931.

L. Labedz et autres, *Revisionism, Essays on the history of marxist ideas*, London, 1962.

R. Schlesinger, *Marx, his time and ours*, London, 1950.

A. Spire, *Inventaire des socialismes français contemporains*, Paris, 1946.

G. Walter, *Lénine*, Paris, 1950.

A. Zevaes, *Jean Jaurès*, Paris, 1951.

A. Philip. *Henri de Man et la crise doctrinale du socialisme*, Paris, 1933.

R. Kindersley, *The first russian revisionists*, Oxford, 1962.

A. Erlich, *The soviet industrialization debate, 1924—1928*, Cambridge (E. U.), 1960.

M. Beaud, *Le socialisme à l'épreuve de l'histoire, 1800—1981*, Paris, 1982.

Раздзел IV

САЦЫЯЛОГІЯ І ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ

Мы бачылі, як з самага свайго ўзнікнення ў Агюста Конта сацыялогія грунтавалася на "пазітывісцкім" метадзе, дыяметральна супрацьлеглым метаду эканамістаў.

У другой палове XIX ст. уплыў пазітывізму ў Францыі быў вялікі. Вельмі характэрны ў гэтым дачыненні твор Эрнэста Рэнана *"Інтэлектуальная і маральная рэформа"* (1872). Аўтар прыйшоў да высновы пра неабходнасць захавання інтэлектуальнай эліты праз арганізацыю грамадства на арыстакратычнай глебе і падпарадкаванне масы насельніцтва праз дадзеныя навукі.

У далейшым французскія сацыёлагі, якія абвясцілі сябе паслядоўнікамі пазітывізму, былі, наадварот, прыхільнікамі дэмакратыі (Дзюркейм, Мос, Леві-Бруль, Альбвах, Сіміян). Але працы гэтых сацыёлагаў часцей за ўсё датычылі старажытных грамадстваў, калі ж яны і браліся за вывучэнне грамадстваў Новага часу, дык іхны метад быў малаплённы[1].

Аднак на працягу XIX ст. сама эвалюцыя навукаў усё больш і больш падштурхоўвала сацыёлагаў да адмаўлення ад пазітывізму. Надзвычайны поспех кнігі Дарвіна *"Паходжанне відаў"* (1859) ужо не дазваляў схіляцца да такога далёкага ад эвалюцыянізму кірунку, якога трымаўся Конт. Ангельскі інжынер, які стаў філосафам, Гэрбэрт Спэнсэр (1820—1903) у перыяд 1876—1896 гг. напісаў кнігу *"Прынцыпы сацыялогіі"*, дзе да вывучэння сацыяльных з'яваў імкнуўся дастасаваць здабыткі "трансфармісцкай" біялогіі. Вынікі былі надзвычай арыгінальныя. Кожная эканамічная інстытуцыя атаясамлівалася з нейкім органам чалавечага цела — банкі, напрыклад, з "нервова-судзінарухальным апаратам" грамадства і г. д.[2] Спэнсэр сцвярджаў, што чалавецтва эвалюцыянуе да "індустрыяльнага тыпу" грамадства — найвышэйшай формы сацыяльнага жыцця, якая дае індывіду максімум незалежнасці. У сувязі з гэтым ён спрабаваў замяніць палітычную эканомію сацыялогіяй.

---

[1] *Перш за ўсё мы маем на ўвазе манументальны і ў канчатковым выніку такі ж малазначны твор Франсуа Сіміяна "Заробак, сацыяльная эвалюцыя і грошы" (F. Simiand. Le salaire, l'évolution sociale et la monnaie, Paris, 1931).*

[2] *Principes de sociologie. Trad. franç., Paris, 1882, pp. 129—131.*

У гэтую ж эпоху вялікія змены адбыліся і ў фізіцы, у выніку чаго перад навукоўцамі і філосафамі паўсталі значныя праблемы. Станавілася ўсё больш і больш відавочна (у значна большай ступені, чым у часы Гегеля), што ніякая навуковая тэорыя, аніякі закон не здольныя ўсебакова вытлумачыць катэгорыю феноменаў[1]. Супрацьлеглыя тэорыі могуць суіснаваць побач, бо наш досвед не дазваляе выбраць адну ці другую.

Паводле Гегеля, такія супярэчнасці ўласцівыя прыродазнаўчым навукам і гэтая з'ява азначае, што іхнімі метадамі немагчыма спасцігнуць усю сутнасць рэчаіснасці. Але выснова, да якой схіляліся вучоныя пачынаючы з канца XIX ст., была супрацьлеглай: сцвярджалася, быццам нельга наагул дапускаць, што чалавечы розум можа спасцігнуць абсалютную ісціну; усялякія веды — гэта практычныя веды, якія дазваляюць дасягнуць пэўнага канкрэтнага выніку, але не маюць сілы, калі іх аддзяляць ад гэтага выніку.

Такое стаўленне да спазнання выказваў амэрыканскі навуковец, а пазней філосаф Чарльз Пірс, які ў 1878 г. пісаў:

"Паглядзіце на эфекты, якія маюць практычнае значэнне і якія, як мы мяркуем, можа стварыць аб'ект нашай канцэпцыі: канцэпцыя, якая існуе ў дачыненні да гэтых эфектаў, — адзінае цэлае нашай канцэпцыі аб'екта"[2].

Такім чынам, гаворка ідзе пра далучэнне да канцэпцыі розуму як выключна утылітарнай функцыі, якую абараняў яшчэ Шапэнгаўэр, калі пісаў, што розум — гэта "сродак захавання індывіда і роду, зусім такі, як і ўсялякі іншы орган цела"[3].

Пры канцы XIX ст. такое азначэнне розуму знаходзілася ў цэнтры "прагматычнай" філасофіі, якую распаўсюджваў галоўным чынам амэрыканскі філосаф Уільям Джэймз (1842—1930). Паводле яго, сказ сапраўдны, калі значэнне, якое

[1] *У прыватнасці, такія ідэі прапагандаваў Эміль Бутру ў сваім творы "Пра выпадковасць законаў прыроды" (1874). Пазней матэматык Анры Пуанкарэ ў кнізе "Навука і гіпотэза" (1902) сказаў, што механічнае вытлумачэнне феномена — цалкам умоўнае.*

[2] *How to make our ideas clear, trad. franç., in Revue philosophique, 1878; cité par. E. BRÉHIER. Histoire de la philosophie, t. II, vol. IV, pp. 1039—1040.*

[3] *Cité: LUKACS G. in La destruction de la raison: Trad. franç., Paris, 1958, I, p. 192.*

яму надаецца, выклікае ў чалавека задавальненне. Значыцца, як кажа Джэймз, няма патрэбы пытацца, ці існуе Бог, — варта толькі ведаць, ці выклікае вера ў Бога станоўчыя эмоцыі. У такім выпадку рэлігію можна лічыць праўдзівай.

Тэорыі Джэймза мелі велізарны водгук у ЗША. У XX ст. іх падзяляў вельмі вядомы філосаф Джон Дыўі, які, дарэчы, удакладняў, што крытэр ісціны — гэта хутчэй поспех, чым карыснасць[1].

1. ВЭБЛЕН. Асаблівую нашу ўвагу наконт прагматызму павінны выклікаць той факт, што гэтая плынь вылучыла новую канцэпцыю сацыяльнай навукі. Першапачаткова канцэпцыя распрацоўвалася ў працах Тарстэйна Вэблена (1857—1929).

Гэты аўтар патрабаваў, каб сацыяльнае даследванне праводзілася з дапамогаю "навачаснага навуковага метаду", гэта значыць, паводле яго думкі, на глебе дарвінскага эвалюцыянізму. Але адначасова Вэблен сцвярджаў, што сацыяльная навука заўсёды будзе мець толькі рэлятыўную каштоўнасць і цалкам няздольная паказаць нам шлях, якім мусіць пайсці чалавецтва, і абсалютныя каштоўнасці, якія яно павінна мець на мэце, бо навуковец сам па сабе залежыць ад "звычак мыслення" і ягоныя высновы паходзяць ад гэтых звычак. Вэблен пісаў:

"Навуковае гледзішча — гэта *кансэнсус* наяўных у супольнасці звычак мыслення, і навуковец вымушаны лічыць, што гэты кансэнсус ствараецца ў адказ на больш-менш устойлівую дысцыпліну звычак, якой падпарадкавана дадзеная супольнасць"[2].

На такой метадалагічнай аснове Вэблен намагаўся даць сваё тлумачэнне эканамічнага ладу Новага часу, тлумачэнне, у якім ён пераняў асобныя элементы марксізму, але высновы якога вельмі адрозніваліся ад высноваў Маркса.

Вэблен даў знішчальную характарыстыку амэрыканскай маржыналісцкай школы — у прыватнасці, працаў Джона Бэйтса Кларка, на той час галоўнага прадстаўніка гэтай школы ў ЗША. Ён казаў, што маржыналісцкая палітычная

[1] *Battle J. The metaphysical presuppositions of the philosophy of John Dewey. Fribourg, 1951.*

[2] *Veblen T. The place of Science in modern civilization and other essays. New York, 1932, pp. 38—39.*

эканомія, як і класічная, грунтуецца на геданісцкай і утылітарнай канцэпцыі чалавека, які шукае задавальнення і пазбягае пакутаў. Але ў сапраўднасці рэальная псіхалогія чалавека больш складаная і зменлівая. Маржыналісты са сваімі натуральнымі законамі, якія дастасоўваюцца толькі да статычнага стану рэчаў, гэтак жа сама як і эканамісты-класікі, няздольныя вытлумачыць рэальнае эканамічнае жыццё.

Маржыналісты, у прыватнасці, трызнілі, быццам яны адкрылі натуральны закон размеркавання даходаў, бо паказалі, што заробак і працэнт з капіталу прыраўноўваюцца да маржынальнай прадукцыйнасці фактару працы і фактару капіталу. Але што "натуральнага" ва ўсім гэтым, калі акрамя маржынальнай адзінкі працы і капіталу ніякая іншая адзінка не атрымлівае даходу, які адпавядае таму, што яна вырабляе?[1]

Што да Вэблена, дык ён лічыў, што сіла набывае вызначальную ролю ў стварэнні даходаў. А адзін з ягоных вучняў напісаў:

"У канчатковым выніку даходы ва ўсёй іхнай сукупнасці паходзяць ад валодання ўласнасцю або ад асабістых паслугаў і зусім не з'яўляюцца "прадуктамі", створанымі тымі, хто атрымлівае гэтыя даходы; яны ўяўляюць сабой адлічэнні, атрыманыя з рэшты супольнасці праз уціск таго або іншага віду"[2].

Увогуле Вэблен патрабаваў, каб быў цалкам прызнаны чалавечы характар эканамічных з'яваў. На яго думку, гэтыя з'явы павінны тлумачыцца праз "звычкі мыслення", што сустракаюцца ў індывідаў, якія прысвячаюць сябе эканамічнай дзейнасці. Гэтыя "звычкі мыслення" ён даволі дзіўна называе "інстытуцыямі". Паколькі гэтыя "інстытуцыі" няспынна змяняюцца, эканамічная навука павінна быць навукай аб эвалюцыі.

У імя эвалюцыі Вэблен вельмі катэгарычна крытыкаваў амэрыканскія сацыяльныя інстытуцыі. У 1899 г. у *"Тэорыі бяздзейнага класа"* ён выкрываў "эксплуатацыю" ўласнікамі

---

[1] *Professor Clark's Economics* // The Quarterly Journal of Economics, *February, 1908; даследванне, перадрукаванае ў кн.: "The place of Science in modern civilization". Op. cit., p. 208–209.*

[2] *Hale R. The trend of Economics, édité: R. G. Tugwell. New York, 1924, pp. 216–217; cité: Gambs J. S. Beyond Supply and Demand. New York, 1946, p. 12.*

ўсіх астатніх людзей. У 1904 г. у *"Тэорыі прадпрымальніцкай справы"* Вэблен сцвярджаў, што ўсе беды грамадства, у прыватнасці эканамічныя крызісы, паходзяць ад таго, што прадпрымальнікі імкнуцца рэалізаваць "грашовыя вартасці", а не вырабляць тавары, карысныя для грамадства. У 1919 г. у працы *"Інтарэсы ў капіталаўкладанні"* ён заявіў, што патрэбны новы лад з прычыны перашкодаў, якія чыняць гэтыя інтарэсы сацыяльнай адаптацыі, і росту галечы простага чалавека.

Які будзе новы лад? Паводле меркавання Вэблена, гэта не будзе сацыялізм, які прадбачылі марксісты. Сапраўды, на ягоную думку, няма падставаў лічыць, што супярэчнасць паміж рабочым класам і ўласнікамі будзе павялічвацца. Цалкам магчыма пераканаць рабочых у слушнасці сістэмы залежнасці, у якой яны знаходзяцца, а таксама паспрабаваць "разбіць іхную сілу аб камяні патрыятызму".

У такіх умовах могуць разглядацца дзве магчымасці. Па-першае, можа адбыцца так, што "ўласнікі-абсантэісты" павялічаць свае прывілеі, звярнуўшыся па дапамогу да дзяржавы. У такім разе яны ў сваю чаргу будуць падначаленыя дзяржаве, якая патрапіць у рукі ваеннага класа. І адбудзецца вяртанне да "барбарскай формы" культуры. Аднак трэба разгледзець і другую магчымасць. Прыгнечаны клас адмовіцца ад свайго паважлівага стаўлення да прадпрымальнікаў і паспрабуе пабудаваць новы сацыяльны лад. Але гэты сацыяльны лад не будзе сацыялізмам, бо абавязкова сярод індывідаў будзе адбывацца працэс адбору, які прывядзе да ўлады эканамістаў і інжынераў. Вэблен дае апісанне эвалюцыі ў бок тэхнакрытычнага ладу ў асобнай працы, створанай у 1921 г., — *"Інжынеры і сістэма коштаў"*.

Сярод вучняў Вэблена былі і такія даследнікі, як Д. Р. Каманз, якія абвяшчалі сябе прыхільнікамі "разумнага капіталізму", гэта значыць далучаліся да шыхтоў сацыялістаў-рэфармістаў[1]. Але іншыя вучні Вэблена выказваліся акрэслена варожа наконт свабоды індывіда і адстойвалі ідэю трыумфу рэжымаў фашысцкага тыпу, якімі кіруюць тэхнак-

[1] *Commons J. R. Institutional Economics. New York, 1934.*

раты. Такое стаўленне, у прыватнасці, адзначаецца ў Джэйм-за Бэрнхэма[1].

2. САРЭЛЬ. Аднак у Эўропе паўстала іншая плынь прагматычнай сацыялогіі, асноўнымі прадстаўнікамі якой былі Жорж Сарэль і Вільфрэда Парэта, якія знаходзіліся пад моцным уплывам творчасці Фрыдрыха Ніцшэ, а таксама французскага філосафа Анры Бэргсана. Апошні, дарэчы, не быў сапраўдным прагматыкам, бо дапускаў наяўнасць у чалавека здольнасці да "інтуіцыі", якая дазваляе яму спасцігнуць сутнасць рэчаіснасці. Аднак у Бэргсана інтуіцыя супрацьпастаўляецца розуму, які разглядаецца ў якасці здольнасці другога — ніжэйшага парадку.

Для названага аўтара розум — гэта здольнасць, якая дазваляе чалавеку будаваць прылады працы і машыны, каб лепей прызвычаіцца да матэрыяльнага свету. Але роля розуму не ідзе далей за гэтую яго ўласцівасць. У прыватнасці, розум не дазваляе чалавеку — духоўнай істоце спазнаць самога сябе. Такім чынам, у дачыненні да Бэргсана можна казаць аб прагматычнай (і нават вельмі вузкапрагматычнай) канцэпцыі розуму.

Менавіта гэтую ідэю падхапіў Жорж Сарэль (1847—1922). Свой галоўны і вельмі вядомы твор *"Разважанні пра гвалт"* (1908) ён пачаў са сцверджання, што розум па сваёй прыродзе няздольны асвятліць рух падзеяў у гісторыі чалавецтва. Аднак, як казаў Сарэль, чалавек шукае збаўлення. І ён больш не можа яго знайсці, як раней, у рэлігіі. Менавіта з гэтае прычыны чалавек Новага часу — рэвалюцыянер. Ён спадзяецца на гераічнае і бліскучае жыццё, якога ад гэтага часу можна дасягнуць толькі праз сацыяльную рэвалюцыю. Але нельга рацыянальна прадбачыць ход рэвалюцыі і ведаць наперад, якое будзе грамадства. Рэвалюцыйны чалавек падпарадкоўваецца сваім уласным міфам, якія ён будуе адвольна. Галоўны з іх — міф аб "усеагульным страйку".

"Рэлігія, — пісаў Сарэль, — не адна займае галіну глыбокай сведамасці; рэвалюцыйныя міфы займаюць там такое ж месца, як і рэлігія..."[2]

[1] *Burnham J. La révolution directoriale. New York, 1941; Pour la domination mondiale. New York, 1945.*

[2] *Réflexions sur la violence, 10e éd., Paris, 1946, Introduction.*

Сарэль выступіў катэгарычна супраць марксісцкай інтэрпрэтацыі гісторыі. На яго думку, гаворка ідзе не пра тое, каб падрыхтаваць палітычную заваёву пралетарыятам улады ў дзяржаве. Паводле Сарэля, марксісцкая ідэя дыктатуры пралетарыяту абсалютна няслушная. Працоўныя не могуць удзельнічаць у палітычнай гульні: яны толькі павінны захоўваць у сваіх прафсаюзах дух барацьбы і міф аб усеагульным страйку. І трэба, каб капіталістычны клас са свайго боку таксама захоўваў усю сваю палымянасць у барацьбе супраць патрабаванняў рабочых. Чым больш гвалтоўнае супрацьстаянне абодвух класаў, тым больш плённая будзе рэвалюцыя. Сарэль пісаў:

"Моцна арганізаваны рабочы клас, колькасць якога ўвесь час павялічваецца, можа прымусіць капіталістычны клас заставацца рашучым у барацьбе паміж імі; калі перад тварам прагнай да заваёваў і багатай буржуазіі паўстане аб'яднаны і рэвалюцыйны рабочы клас, дык капіталістычнае грамадства дасягне сваёй гістарычнай дасканаласці"[1].

Вонкава высновы Сарэля далучаюцца да высноваў анархізму, бо ён уяўляў сабе, што пасля раптоўнага зруйнавання капіталізму надыдзе новае грамадства — без дзяржавы, заснаванае на свабоднай кааперацыі працоўных. Але надыход гэтага грамадства, на яго думку, не заўсёды абавязковы, бо развіццё грамадства спазнаць немагчыма. Такім чынам, галоўнае, што варта адзначыць у ягонай дактрыне, — гэта ўслаўленне фізічнага гвалту як інструмента абнаўлення грамадства і заклік да кіраўнічых класаў, каб яны цвёрда супрацьстаялі патрабаванням рабочых. Гэтыя выказванні дазваляюць зразумець, як Сарэль, напачатку звязаны з асобнымі элементамі французскага прафсаюзнага рабочага руху, пазней ператварыўся ў хаўрусніка і натхняльніка крайне правай арганізацыі "Французскае дзеянне" ("Action française"), галоўным дзеячам якой тады быў Шарль Мара.

Шарль Мара выступаў за вяртанне Францыі да старога рэжыму і да манархіі як сродку барацьбы супраць уздыму пралетарыяту. Прыхільнік Ніцшэ і Агюста Конта, ён пайшоў далей за іх у адмаўленні ўсялякага прагрэсу ў гісторыі чалавецтва.

[1] *Ibid., p. 120. Сарэль асабліва ўслаўляў жорсткасць амэрыканскіх капіталістаў.*

"Ці здолеў хто-небудзь, — пісаў ён, — сфармуляваць адзіны дынамічны закон чалавека, які разглядаецца ў якасці адзінай істоты, што ўвесь час колькасна павялічваецца. Паколькі гульня падобных адна да адной прычынаў, выклікаючы падобныя адзін да аднаго вынікі, дазваляе нам прадбачыць шматлікія выпадкі і падрыхтавацца да іх, дык неабходна сказаць, што законы гісторыі існуюць, але няма такога адзінага закону гісторыі, які б увабраў вярхі і нізы чалавецтва, а тое, што нам прапануюць пад гэткім назовам, не вытрымлівае выпрабавання. Сама прыгожыя з такіх філасофскіх раманаў — магчыма, сама памылковыя: адвечнае вяртанне Ніцшэ — трызненне вясновай ночы, тры станы Конта — адвольная ілюзія. Ідзе ён па коле або па квадраце, па спіралі або па нечым накшталт шруба ці пакідае нейкую траекторыю без усялякага закону — сукупны рух Сусвету можа здзівіць сваёй мітуснёй толькі бяздзейных лайдакоў, якія чакаюць ад яго выратавання"[1].

Гэтае адмаўленне прагрэсу чалавецтва суседнічае яшчэ і з заклікам чыніць перашкоды ўсялякай рэвалюцыі. Мара пісаў:

"Няма нічога лягчэйшага, чым рэвалюцыі; гісторыя перапоўненая імі гэтаксама, як вогнішчамі і магіламі. Гэта прыгожая і цяжкая справа — пазбегнуць узрушэнняў, прадухіліць разбурэнні і аддаць перавагу тым засцерагальным крокам, якія выкарыстала нават сама прырода, каб супрацьстаяць ворагу жыцця... Мысленне, мастацтва, цывілізацыя — усё пачынаецца з акта веры ў непарушную існасць рэчаў. Хоць іхны хаос і вэрхал узнікаюць у сама простых і сама верагодных выпадках, але да гэтага часу цуд парадку перамагаў: вера ў яго, якая сутыкалася з нягодамі жыцця, спазнала толькі бліскучыя пацверджанні"[2].

Хаўрус, які склаўся паміж бескампрамісным сацыяльным кансерватызмам Мара і нібыта антыкапіталістычным вучэннем Сарэля, надзвычай тыповы і папярэднічае высновам, закладзеным у дактрыну фашызму. Сапраўды, прадстаўнікі крайне правых колаў таксама вызнавалі, што капіталізм — гэта благі лад, бо ён мае тэндэнцыю да знішчэння былых сацыяльна-маральных нормаў. Але, зразумела, пытанне аб сапраўдным вяртанні да мінулага не можа нават і паўставаць, і "традыцыяналісты" працуюць выключна дзеля таго, каб перашкодзіць перамозе сацыялізму. Урэшце, яны з радасцю прымаюць такога чалавека, як Сарэль, што вельмі варожа ставіўся да марксізму. Менавіта з гэтае прычыны ягоны антыкапіталізм быў выкарыстаны на практыцы не

[1] *Le chemin de Paradis. Paris, 1894; postface (1920); nouv. éd., Paris, 1928, p. 272.*
[2] *Ibid.*

толькі Мара, але і такім сацыёлагам кансерватыўнага кірунку, як Вільфрэда Парэта.

3. САЦЫЯЛЬНАЯ ФІЛАСОФІЯ ПАРЭТА. Вільфрэда Парэта (1848—1923) — сын італьянскага маркіза і французанкі. Як інжынер меў пасаду ў кіраўніцтве італьянскай чыгункі, а затым стаў дырэктарам металургічнага завода. З прычыны свайго надзвычай варожага стаўлення да інтэрвенцыянісцкай і пратэкцыянісцкай палітыкі італьянскага ўрада Парэта не здолеў атрымаць пасаду ва універсітэце, на якую разлічваў. У 1893 г. ён пакінуў Італію і на кафедры палітычнай эканоміі ў Лазанскім універсітэце змяніў Вальраса. Парэта палымяна выступаў супраць "гуманітарных", гэта значыць дэмакратычных, ідэяў. У 1921 г. ён вітаў надыход фашызму ў Італіі як пацверджанне ягонага вучэння. Праз нейкі час пасля свайго прыходу да ўлады Мусаліні прызнаў Парэта сенатарам.

Мы ў асноўным ужо ведаем змест палітычнай эканоміі Парэта. Гэта перапрацаваная і мадыфікаваная палітычная эканомія Вальраса, з выняткам ідэі вымярэння карыснасці, і новае азначэнне эканамічнага оптымуму. Парэта хацеў ператварыць палітэканомію ў цалкам аб'ектыўную навуку. Яшчэ імкнуўся паказаць, што палітэканомія — гэта толькі частка навукі аб грамадстве — сацыялогіі. Такі падыход ён ужо абараняў у *"Падручніку па палітычнай эканоміі"* (1906). У далейшым Парэта выдаў ёмісты *"Трактат усеагульнай сацыялогіі"* (1916).

Як эканаміст Парэта прэтэндаваў на безумоўную палітычную нейтральнасць і папракаў Вальраса за тое, што з "чыстай палітычнай эканоміі" гэты даследнік хацеў зрабіць практычныя высновы. Але ў якасці сацыёлага ён палымяна змагаўся за надзвычай антыдэмакратычную канцэпцыю грамадства.

Чалавечыя ўчынкі, казаў Парэта, падзяляюцца на дзве катэгорыі: лагічныя і нелагічныя. Ён сцвярджаў, што апошнія параўнальна з першымі вельмі шматлікія і значныя.

Чыстая палітычная эканомія — гэта гіпатэтычная пабудова, якая адпавядае выпадку (нерэальнаму), калі індывіды маюць дасканала лагічныя паводзіны. Вызнаванне гэтай гіпотэзы дазваляе вывесці асобныя карысныя законы. Але

палітычная эканомія — толькі частка ўсеагульнай сацыяльнай навукі — сацыялогіі. Сацыялогія ж, дарэчы, таксама будуецца на дастасаванні да нелагічных учынкаў таго ж "лагічна-эксперыментальнага метаду".

У *"Трактаце ўсеагульнай сацыялогіі"* Парэта намагаўся яшчэ раз даказаць, што навуку аб грамадстве варта будаваць на ўзор эксперыментальных навукаў, але сам зусім не трымаўся гэтае высновы. Замест таго каб прааналізаваць канкрэтную гісторыю чалавецтва, ён прапанаваў усеагульную тэорыю сацыяльнага руху, якая, на яго думку, прыдатная да скарыстання ва ўсе часы і ва ўсіх краінах.

Парэта пісаў, што чалавечыя грамадствы ніколі не былі аднароднымі. Яны складаюцца з ніжэйшых слаёў і эліты. У эліту ж уваходзяць індывіды з вышэйшымі здольнасцямі, не зважаючы на тое, дзеля чаго гэтыя здольнасці выкарыстоўваюцца (тут перад намі, як казаў аўтар, "навуковая" глеба, куды не павінна прыкладвацца мараль):

"Таму, хто здолеў зарабіць мільёны, добра або блага, мы дадзім 10 адзінак. Таму, хто зарабляе тысячы франкаў, мы дадзім 6. А таму, які толькі што не памірае з голаду, мы дадзім 1... Спрытнаму махляру, які ўмее абдурваць людзей і які здолеў пазбегнуць пакарання паводле Крымінальнага кодэксу, мы нададзім 8, 9 ці 10 у залежнасці ад колькасці дурняў, якіх ён прынадзіў у свае сеткі, і колькасці грошай, якія ён выцягнуў у іх"[1].

Далей аўтар сцвярджаў, што ва ўсялякім грамадстве адзначаецца пэўная "цыркуляцыя элітаў" у тым сэнсе, што некаторыя індывіды, надзеленыя высокімі якасцямі, але паходжаннем з ніжэйшых станаў, здолелі далучыцца да вышэйшага грамадства. Менавіта гэта дазваляе кіраўнічаму класу захоўваць уладу, а грамадству існаваць у нязменным стане.

Аднак у перыяд пэўных гістарычных этапаў "цыркуляцыя элітаў" недастатковая. Яна ўжо не можа забяспечыць стабільнасць у грамадстве. "Элементы ніжэйшай якасці" назапашваюцца ў вышэйшых слаях, а "элементы вышэйшай якасці" — у ніжэйшых слаях. Тады патрэбна, каб выбухнула

[1] *Traité de sociologie générale, trad. franç., Paris, 1917–1919, t. II, p. 1296.*

рэвалюцыя і прывяла да ўлады новыя эліты, якія ўтварыліся ў ніжэйшых слаях і паўсталі супраць наканаванага ім лёсу.

4. "ІНТЭРПРЭТАЦЫЙНАЯ САЦЫЯЛОГІЯ" Ў НЯМЕЧЧЫНЕ. Развіццё дакладных навукаў, якое абумовіла ўзнікненне "прагматызму" ў Злучаных Штатах, вельмі паўплывала таксама на існаванне "ірацыянальнай" плыні, якую мы сустракаем сярод нямецкіх філосафаў другой паловы XIX ст. У гэтую эпоху ў Нямеччыне шмат гаварылі пра "вяртанне да Канта" і пра "неакантыянскую філасофію". Варожыя да пазітывізму філосафы сапраўды імкнуліся насуперак яму развіваць новую крытыку разумення чалавека. Але гэтая крытыка больш не можа быць падобная да крытыкі Канта. Апошні сцвярджаў абсалютную супрацьлегласць "чыстага розуму", які выкарыстоўваецца пры вывучэнні прыроды, і "практычнага розуму", які накіроўвае паводзіны чалавека. Цяпер, праз стагоддзе, ужо нельга больш захоўваць гэтае супрацьпастаўленне, бо адбыўся значны прагрэс у навуках пра чалавека (гісторыі, псіхалогіі, палітычнай эканоміі, сацыялогіі). Зараз абмяжоўваюцца толькі канстатацыяй таго, што існуе асноватворнае адрозненне паміж гэтымі дысцыплінамі і дакладнымі навукамі, бо немагчыма вызначыць сапраўдныя *прычыны* чалавечых феноменаў; можна толькі *зразумець* гэтыя феномены і вызначыць іхныя характэрныя *каштоўнасці*.

Напачатку такое стаўленне да праблемы абараняў нямецкі філосаф Вільгельм Дыльтэй (1833—1911), аўтар *"Уводзін у навукі аб духу"* (1883). Ён, у прыватнасці, сцвярджаў, што дзеля вытлумачэння гісторыі чалавецтва нельга ўжываць такія абстракцыі, як сіла ці маса, або вызначаць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі; неабходна спасцігнуць матывы тых ці іншых паводзін людзей, ставіць сябе на іхнае месца, "разумець" іх. Дыльтэй пісаў:

"Мы вытлумачваем прыроду, а ментальнае жыццё мы разумеем"[1].

Крыху пазней два філосафы-неакантыянцы — Віндэльбанд і Рыкерт — сцвярджалі, што, каб зразумець гісторыю, трэба вызначыць "каштоўнасці", у якія верылі людзі пэўнай

[1] *Cité: Lucacs G. La destruction de la raison: Trad. franç., Paris, 1958, I, p. 28.*

эпохі, бо толькі ў гэтым палягае аб'ектыўнасць, або ісціна, грамадства.

Асноўны вынік такога падыходу, на думку аўтараў, у тым, што больш не можа ісці гаворкі, каб на падставе аналізу мінулага хоць як-небудзь прадбачыць будучыню. Немагчыма сказаць, што павінны або могуць рабіць людзі сёння; можна толькі "зразумець" тое, што яны рабілі даўней. Веды з гісторыі выключна "рэтраспектыўныя"[1].

Віндэльбанд і Рыкерт сцвярджалі, што розныя рысы чалавека як прыроднай істоты, аб'екта не застаюцца нязменнымі і вызначанымі назаўжды: у розныя моманты гісторыі чалавек, ствараючы пэўныя "каштоўнасці", стварае і сам сябе[2].

Ад самага пачатку тут паўстае згубная памылка, якая пашырылася сярод заходнееўрапейскіх навукоўцаў. Зразумела, у названых аўтараў мы назіраем вяртанне да Канта. Але гэтае вяртанне сведчыць найперш пра адмаўленне імі намагання наступнікаў Канта, галоўным чынам Гегеля, даказаць, што чалавецтва ў сваёй гісторыі крочыць рацыянальным шляхам. Так, напрыклад, Дыльтэй сцвярджаў: "Немагчыма весці жыццё перад судом Розуму"[3]. Ён лічыў, што жыццё ірацыянальнае. І перш за ўсё гэта датычыць жыцця чалавека і грамадства. Перад тварам гісторыі філосафы, пра якіх мы гаворым, ужо *апрыёры* ўсведамляюць сваю безабароннасць. Яны яшчэ ідуць на пэўны кампраміс, калі лічаць, што сама большае, чаго можна дасягнуць, даследуючы матывы паводзінаў людзей мінуўшчыны або разважаючы пра іх каштоўнасці, — гэта спасцігнуць толькі асобныя зернейкі ісціны.

Высновы "інтэрпрэтацыйнай" сацыялогіі ў пэўным сэнсе паходзяць з вучэння школы "эканамістаў-гістарыстаў", пра якіх мы гаварылі раней, аднак прыхільнікі такога разумення грамадства імкнуцца пераадолець "пазітывісцкае" стаўленне гэтых даследнікаў.

---

[1] *Гл. Aron R. La philosophie critique de l'histoire. Paris, 1935; nouv. éd., Paris, 1964, p. 77.*

[2] *Bréhier E. Histoire de la philosophie, t. II, vol. IV, pp. 1082—1085.*

[3] *Cité: Lucacs G., op. cit., p. 28.*

Пераходнае звяно паміж былой і новай школамі — творчасць Густава Шмолера (1838—1917). Ён выступіў супраць аўстрыйскіх маржыналістаў, сцвярджаючы, што лагічнае разважанне не можа быць прыдатным інструментам у даследванні чалавечых учынкаў[1]. Сярод аўтараў таго ж кірунку самымі значнымі былі Адольф Вагнэр (1835—1917) і Г. Ф. Кнап (1842—1926), аўтар *"Дзяржаўніцкай тэорыі грошай"* (1895).

З усіх прадстаўнікоў "інтэрпрэтацыйнай" сацыялогіі сама значны, безумоўна, Макс Вэбэр (1864—1920), аўтар сусветна вядомага твора *"Пратэстанцкая этыка і дух капіталізму"*[2]. Для Вэбэра "інтэрпрэтацыя" гісторыі грунтуецца на магчымасці пабудаваць "ідэальны тып" асобнай гістарычнай эпохі, або, іншымі словамі, мадэль, якая ўвасабляе ўсё сапраўды арыгінальнае, што характэрна для гэтай эпохі. Можна было б палічыць, што гэтае азначэнне блізкае да азначэння сацыяльна-эканамічнай фармацыі, зробленага Марксам. Але гэта не зусім так, бо Вэбэр перш-наперш цікавіцца феноменамі псіхалагічнага характару, а не вытворчымі дачыненнямі, якія існуюць паміж людзьмі. У навачасным свеце, на яго думку, у чалавека развіваецца схільнасць падсумоўваць наступствы сваіх учынкаў, іншымі словамі — тэндэнцыя да "рацыяналізацыі". Праз гэта наш аўтар не бачыў асноватворнага адрознення паміж капіталізмам і сацыялізмам. Ён сцвярджаў, што сацыялізм не здолее стварыць аніякага іншага эфекту, акрамя пашырэння "бюракратызацыі" эканамічнага жыцця[3].

Бібліяграфія

На французскай мове можна пачытаць:

G. Pirou, *Les nouveaux courants de la théorie économique aux Etats-Unis*, Paris, 1939.

P. T. Homan, *Essai sur la pensée économique des anglo-américains, traduit de l'anglais*, Paris, 1933.

[1] *Гл. Seligman B. B. Main Currents in Modern Economics; Economic thought since 1870. New York, 1962, p. 12.*

[2] *Французскі пераклад быў выдадзены ў 1964 г.*

[3] *B. B. Seligman, op. cit., p. 26.*

Сярод шматлікіх твораў на ангельскай мове назавем:

J. Doreman, *The economic mind in american civilization*, 5 vol., New York, 1946—1959.

J. Doreman, *Thorstein Veblen and his America*, New York, 1961.

J. S. Gambs, *Beyond Supply and Demand*, New York, 1946.

A. L. Gruchy, *Modern Economic Thought: the american contribution*, New York, 1947.

R. Hofstadter, *Social Darwinism in American Thought*, Philadelphie, 1944.

Раздзел V

ВУЧЭННЕ КЕЙНСА

Тым часам калі ў СССР будавалася першая сацыялістычная эканоміка, капіталістычны свет, як мы ўжо гаварылі, перажываў у 1929 г. найбольшы ва ўсёй яго гісторыі крызіс перавытворчасці. Мы бачылі, што гэта абумовіла часовы трыумф нацыянал-сацыялістычнай дактрыны ў Нямеччыне. У ангельскасаксонскіх краінах крызіс выклікаў значную эвалюцыю эканамічнай думкі: гэта ў асноўным барацьба, распачатая Кейнсам і ягонымі вучнямі, супраць асобных аспектаў неакласічнай палітычнай эканоміі, у выніку чаго перамаглі новыя ідэі. Тут адзначаецца ўжо не толькі сутыкненне абстрактных тэзісаў, бо ўздым Кейнсавай палітэканоміі шчыльна звязаны з істотнымі зменамі эканамічнае палітыкі ў капіталістычных краінах.

Мы ўжо ведаем, што пачынаючы з 1933 г. у Нямеччыне праводзілася палітыка барацьбы з беспрацоўем, якая грунтавалася на ўмяшанні дзяржавы ў галіну інвестыцыяў і крэдыту. У тым жа годзе прэзідэнт ЗША Рузвельт, які змяніў на гэтай пасадзе Гувэра, таксама наважыўся развітацца з традыцыйнай пасіўнасцю ўрада ў перыяды эканамічных крызісаў, пасіўнасцю, што абапіралася на прынцыпы класічнага і неакласічнага лібералізму. Урад Злучаных Штатаў павялічыў выдаткі (замест таго каб іх памяншаць) для захавання бюджэтнага балансу ўсялякімі сродкамі, патрабаваў ад прадпрыемстваў, каб яны павялічвалі заробкі з мэтай павелічэння размеркаванай пакупной здольнасці. Ён здзейсніў дэвальвацыю даляра для стварэння тэндэнцыі на падвышэнне цэнаў, больш спрыяльнай да аднаўлення прадпрымальніцкай актыўнасці. Вынікі такой палітыкі да 1939 г. былі даволі пасрэдныя. Неўзабаве ўсе даследнікі зразумелі, што былая палітыка неўмяшання дзяржавы ў сферу эканомікі — пройдзены этап.

Кейнс — эканаміст, які ўжо ў сваіх першых працах напярэдадні крызісу патрабаваў трансфармацыі эканамічнай палітыкі. Яго буйныя працы, апублікаваныя пасля 1929 г., забяспечылі абгрунтаванне зменаў у эканоміцы несацыялістычных дзяржаваў. Ён быў вестуном новага эканамічнага

лібералізму, які цалкам справядліва назваць Кейнсавым лібералізмам. Такі вызначальны момант у гісторыі эканамічнай думкі быў падрыхтаваны сукупнасцю ўсіх дыскусіяў наконт эканамічнай раўнавагі, эканамічнага росту, эканамічных цыклаў — дыскусіяў, якія мы павінны ўлічыць, перад тым як закранаць тэорыю Кейнса[1].

§ 1. Падрыхтоўка глебы для адкрыццяў Кейнса

А) Нестабільнасць сістэмы коштаў і вяртанне да макраэканамічнага гледзішча ў тэорыі Віксэля

Неакласічная палітычная эканомія паказвала капіталізм як сістэму, у якой цэны на тавары і паслугі заўсёды раўнаважныя іх вартасці і ў якой дасягаецца поўная занятасць. Такое ўспрыманне капіталізму занадта відавочна супярэчыла рэчаіснасці, каб цалкам укараніцца нават у асяроддзі эканамістаў-лібералаў.

Сапраўды, у другой палове XIX ст., як і ў першай, у перадавых краінах канстатаваліся няспынныя ваганні сярэдняга роўню цэнаў. Шведскі эканаміст Кнут Віксэль у творы *"Працэнт і кошты"*, выдадзеным у 1898 г., асаблівую ўвагу аддаў вытлумачэнню гэтага феномена. Для разумення ягонай спробы варта падкрэсліць, што даследнік разглядаў ваганне коштаў як з'яву, незалежную ад чаргавання фазаў уздыму, крызісу і дэпрэсіі, якімі характарызуецца капіталізм[2]. Сёння гэта падаецца нам дзіўным. Але трэба памятаць, што ў неакласічнай сістэме няма нават месца для катэгорыі эканамічных ваганняў. Такім чынам, Віксэль, займаючыся ваганнямі цэнаў, ужо зрабіў значны крок на шляху да больш рэалістычнага вывучэння эканомікі. І сапраўды, ягоныя даследванні неўзабаве былі выкарыстаныя аўтарамі, якія пачалі распрацоўваць праблему "эканамічнага цыкла".

Сярэдні ровень коштаў — гэта вартасць грошай. Вытлумачэнне гэтай вартасці для неакласічнай палітэканоміі

[1] *Сам Кейнс (гл. Traité de la monnaie, t. I, p. 170 n) вызначае ў якасці сваіх непасрэдных папярэднікаў Шумпэтэра, Л. фон Мізеса (Theorie des Geldes, 1912), Абаці (The final Buyer, 1928), Робэртсана (Banking Policy and the Price Level, 1926).*

[2] *Гл. на гэты конт T. W. Hutchison, op. cit., p. 243.*

заўсёды было "каменем спатыкнення". Вальрас спрабаваў часткова растлумачыць вартасць з псіхалагічнага гледзішча, кажучы, што грошы робяць індывідам "паслугу ў забеспячэнні таварамі", і распавядаючы пра "пажаданую колькасць наяўных сродкаў" чалавека. Аднак у ягонай сістэме галоўнае значэнне надавалася занадта старой "колькаснай тэорыі грошай", згодна з якой вартасць грошай вызначаецца той іх колькасцю, што знаходзіцца ў абарачэнні[1].

У дачыненні да гэтага пытання высновы Вальраса не вельмі адрозніваліся ад падыходу Рыкарда, бо апошні выкарыстоўваў колькасную тэорыю грошай для вытлумачэння ваганняў агульнага роўню цэнаў у перыяды неканвертоўнасці грошай. Аднак, крытыкуючы Рыкарда, Томас Тук у супрацоўніцтве з Уільямам Ньюмарчам напісаў *"Гісторыю коштаў"* (што выйшла ў свет у перыяд 1838—1857 гг.), дзе абараняў ідэю, адпаведна з якой менавіта змены ў сукупным попыце на спажывецкія тавары вызначаюць ваганні цэнаў на іх, а сукупны попыт залежыць ад роўню даходаў індывідаў.

Віксэль пагадзіўся з гэтай думкай, але ўзняў пытанне, чаму ў асобныя моманты сукупны попыт на спажывецкія тавары павялічваецца. Ён сцвярджаў, што такі попыт залежыць ад павелічэння інвеставання капіталаў, якое ў сваю чаргу абумоўлена існаваннем дадатнай розніцы паміж тым, што ён называе "натуральнай нормай працэнта", ці сярэдняй нормай прыбытку, і наяўнай нормай працэнта, якую атрымліваюць крэдыторы.

Выкарыстанне такой дзіўнай тэрміналогіі тлумачыцца тым, што неакласічная школа пераняла гіпотэзу Жана Батыста Сэя, згодна з якой усе інвеставаныя фонды "прадпрымальнікі" бяруць у пазыку ў "капіталістаў". Такім чынам, эканамісты-неакласікі называлі пазыковым працэнтам аплату за выкарыстанне ўсёй сукупнасці капіталаў. Сапраўды, Віксэль без усялякіх ваганняў успрымаў адрозненне, зробленае класічнай школай, якое цалкам адлюстроўвала рэча-

[1] *У 1912 г. гэтая тэорыя выкладзена амэрыканскім эканамістам Ірвінгам Фішэрам у творы "Пакупная здольнасць грошай".*

існасць, паміж прыбыткам — даходам ад капіталу, непасрэдна інвеставанага ягоным уласнікам, і працэнтам — даходам ад пазычанага капіталу.

Такім чынам, Віксэль сцвярджаў, што інвеставанне капіталу павялічваецца, калі норма прыбытку перабольшвае норму працэнта. Калі ўдакладніць, што розніца паміж імі павінна быць большая, чым "прэмія за рызыку", пра якую гаварыў яшчэ Эдам Сміт, тады гэты тэзіс цалкам слушны. Шведскі эканаміст абмяжоўваўся наступнай высновай: у такой сітуацыі размеркаваныя даходы павялічацца, і гэта абумовіць павелічэнне цэнаў на спажывецкія тавары. Адзін з найбольш важных момантаў у даследваннях Віксэля — гэта ідэя, адпаведна якой раўнавага коштаў заўсёды нестабільная: павелічэнне "натуральнай нормы працэнта" выклікае "кумулятыўны працэс" павелічэння цэнаў, бо кожнае рэалізаванае павелічэнне стварае спрыяльную глебу новаму павелічэнню.

Відавочна, што гэты аналіз цалкам выключае цэнтральнае звяно ў тэорыі агульнай раўнавагі Вальраса. Віксэль, аднак, не аспрэчваў слушнасці неакласічнай тэорыі вызначэння цэнаў на кожным рынку і іх узаемазалежнасці, але падышоў да праблемы з іншага боку. Як мы сказалі б сёння, Віксэль пераадолеў "мікраэканамічны" падыход Вальраса, адпаведна з якім агульная эканамічная раўнавага — канчатковы вынік вельмі шматлікіх працэсаў, што адбываюцца на розных рынках. Шведскі эканаміст разглядаў праблему ў "макраэканамічнай" перспектыве, калі эканамічныя раўнавага і нераўнавага — вынік усеагульнага працэсу, на які ўплываюць такія паказнікі, як сума даходаў або сума інвестыцыяў.

Б) Аднаўленне тэорыі эканамічнага росту ў Ёзэфа Шумпэтэра

Асобныя тэзісы Віксэля былі добра ўспрынятыя рознымі даследнікамі, якія імкнуліся спасцігнуць заканамернасць узнікнення крызісаў у грашовай сферы. Аднак найбольшае развіццё даследванні Віксэля атрымалі ў працах аўстрыйскага эканаміста Ёзэфа Шумпэтэра. Шумпэтэр узяў ідэю

Віксэля наконт актыўнай ролі інвеставання, адасобіў яе ад грашовых феноменаў і на падставе яе паспрабаваў даць своеасаблівае вытлумачэнне эканамічнага развіцця. Гэта быў асабліва важны момант у гісторыі эканамічнай думкі, бо заснавальнікі неакласічнай школы і іхныя непасрэдныя вучні цалкам ігнаравалі праблему эканамічнага росту, якая была асноўным клопатам эканамістаў з часоў Кенэ і Сміта. Больш таго, Шумпэтэр напоўніў гэтую тэорыю па-сапраўднаму новымі тэрмінамі, і ягонае вучэнне неўзабаве прывяло б да значнага прагрэсу ў эканамічным аналізе. Але, з аднаго боку, на яе прынцыпова не звяртала ўвагі бальшыня тагачасных эканамістаў, а з другога — сам аўтар тэорыі адмовіўся зрабіць на яе падставе больш важкія высновы.

Новую канцэпцыю эканамічнага росту Шумпэтэр распрацаваў у 1912 г. і выклаў яе ў кнізе *"Тэорыя эканамічнай эвалюцыі"*[1]. Каб зразумець працэс эканамічнага росту, сцвярджаў аўтар, варта спачатку разгледзець выпадак, калі такога росту няма. Эканоміка ў гэтакім разе не мадыфікуецца ад аднаго перыяду да другога; не існуе ні чыстага ашчаджання, ні чыстага інвеставання; норма працэнта роўная нулю. Такую сітуацыю ён называў "эканамічным колазваротам" і, зыходзячы з гэтага, імкнуўся зразумець эканамічны рост, якому ён даў найменне "эвалюцыя". Ён хацеў высветліць, які асноватворны чыннік можа выклікаць пераход ад "колазвароту" да "эвалюцыі".

Хоць Шумпэтэр гэтага не адзначаў, але лёгка прасачыць, у каго быў пазычаны такі спосаб вызначэння праблемы. Ён проста паходзіць ад Маркса, якога Шумпэтэр напачатку доўга вывучаў, а потым адкінуў[2]. "Колазварот" Шумпэтэра — гэта Марксава "простае ўзнаўленне", а "эвалюцыя" — гэта "пашыранае ўзнаўленне вытворчасці".

Арыгінальнасць Шумпэтэра параўнальна з Марксам у тым, што на першы план ён вынес ідэю, згодна з якой пераход ад колазвароту да эканамічнай эвалюцыі тлумачыцца на падставе "інавацыяў".

У 1912 г. пад тэрмінам "інавацыі" Шумпэтэр аб'ядноў-

[1] *Trad. franç., Paris, 1935.*

[2] *Voir Capitalisme, socialisme et démocratie, trad. franç., Paris, 1951.*

ваў пяць катэгорыяў з'яваў: выраб новага тавару; укараненне новага метаду вытворчасці; адкрыццё новага рынку збыту, гэта значыць факт пранікнення прамысловасці на рынак, дзе яе вырабы дагэтуль не прадаваліся; заваёва новай крыніцы сыравіны або паўфабрыкатаў; "новая арганізацыя", напрыклад, дасягненне манаполіі на рынку.

Падаючы такое азначэнне "інавацыі", Шумпэтэр насамрэч імкнуўся скласці спіс "нагодаў для інвеставання", бо, на ягоную думку, у аснове эканамічнага росту палягае менавіта інвеставанне, а не ашчаджанне, як пра гэта сцвярджалася на працягу доўгага перыяду часу. Актыўны і прадбачлівы бізнесмен, якога Шумпэтэр называе прадпрымальнікам, — гэта той, хто ажыццяўляе чыстыя інвестыцыі.

Падыход быў празмерны, бо нельга так катэгарычна адмаўляць актыўную ролю ашчаджання ў эканамічным развіцці. Аднак нават пры такім перабольшванні тэорыя Шумпэтэра вельмі цікавая.

Са спісу "інавацыяў" Шумпэтэра відаць, што ўсе яго "нагоды для інвеставання" абумоўленыя ў асноўным, з аднаго боку, тэхнічным прагрэсам, а з другога — пашырэннем рынкаў збыту, адкрытых для вытворцаў. Такім чынам, вялікае значэнне тэорыі Шумпэтэра ў тым, што яна радыкальна разыходзіцца з "законам Сэя" і ў ёй, сама меней на зыходным этапе, падкрэсліваецца роля павелічэння рынкаў збыту.

Цалкам верагодна, што, выкарыстоўваючы ідэі Віксэля і Шумпэтэра ў якасці дадатку да працаў Маркса, можна было б стварыць тэорыю, якая на першае месца вылучала б заваёву новых рынкаў збыту як рухавіка эканамічнага росту пры капіталізме. Але вельмі дзіўна канстатаваць, што, стварыўшы глебу для гэтай тэорыі, Шумпэтэр неўзабаве адмовіўся ад яе. У *"Тэорыі эканамічнай эвалюцыі"* і ва ўсіх наступных творах даследніка засталіся практычна толькі тэхнічныя інавацыі; ролі ж новых рынкаў збыту зусім не аддавалася ўвагі.

Пытанне пра ролю замежнага гандлю ў прамысловым росце эўрапейскіх краінаў, узнятае Смітам і Мальтусам, было ўжо каторы раз адсунута на апошні план, і менавіта тым вучоным, чые даследванні маглі б даць на гэтае пытан-

не адказ, якога эканамісты шукалі ажно 150 гадоў. Шумпэтэр жа намагаўся выпрацаваць вытлумачэнне эканамічных ваганняў, заснаванае на ўрыўкавым характары тэхнічнага прагрэсу. Але ягоная спроба была непераканаўчая. Тым не менш мы павінны разглядаць Шумпэтэра як аднаго з сама значных эканамістаў нашага стагоддзя. Дарэчы, даследнік меў вялікі поспех са сваім знакамітым творам *"Капіталізм, сацыялізм і дэмакратыя"* (1942), у якім ён — той, хто варожа ставіўся да сацыялізму, — выказваў меркаванне, што сацыялізм усталюецца ва ўсім свеце. Арыгінальнасць даследванняў Шумпэтэра, у прыватнасці, і ў тым, што ён не надаваў вялікага значэння таму, што скончылася эпоха каланіяльных заваёваў[1].

"Беспадстаўна дапускаць, — сцвярджаў Шумпэтэр, — быццам захады, здольныя замяніць каланізатарскую палітыку, непазбежна будуць менш важкія, якім бы ні быў сэнс, што надаецца гэтаму прыметніку. Наадварот, цалкам магчыма, што асвойванне паветранай прасторы больш

[1] *Перад Другой сусветнай вайной важкасць гэтага факта падкрэслівалася эканамістамі розных кірункаў. Найбольш адметны сярод іх Э. Г. Гэнсэн, аўтар кнігі Full recovery or Stagnation, New York, 1938.*

Абапіраючыся на даследванні Кейнса, гэты аўтар адзначаў, што эканоміка перадавых капіталістычных краінаў увайшла ў такі перыяд, калі вельмі выразна выяўляецца тэндэнцыя да спынення развіцця вытворчасці. Сапраўды, інвестыцыі значна памяншаліся (асабліва ў будаўніцтва і ў грамадскую працу), што тлумачылася трыма фактарамі.

Па-першае, як казаў Гэнсэн, у свеце больш няма багатых незаселеных земляў. Па-другое, рост насельніцтва ў індустрыяльных краінах мае тэндэнцыю да спынення. Патрэцяе, для выкарыстання на практыцы дасягненняў тэхнічнага прагрэсу больш не трэба такой вялікай колькасці дадатковых капіталаў, як гэта было раней.

Тлумачэнне тэндэнцыі да стагнацыі змяшчае надзвычай цікавую тэорыю эканамічнага росту. Сапраўды, хоць уздзеянне асобных фактараў, вылучаных аўтарам (у прыватнасці, дэмаграфічнага ціску), вельмі спрэчнае, але варта адзначыць фактар капіталістычнай экспансіі ў прасторы (засяленне і асвойванне новых земляў), якая, безумоўна, адыграла значную ролю — у прыватнасці ў дачыненні да ЗША.

З другога боку, варта падкрэсліць, што Гэнсэн не падзяляў аптымістычнага погляду Кейнса, згодна з якім дзяржаўныя інвестыцыі маглі б бясконца кампенсаваць недастатковасць прыватных інвестыцыяў.

Гаворачы аб прапановах Кейнса, накіраваных на "грамадскі кантроль інвестыцыяў", Гэнсэн сцвярджаў, што гэта "ідзе вельмі далёка ў кірунку да планавай эканомікі і магло б, сапраўды, беспасярэдне прывесці да поўнага сацыялізму" (op. cit., p. 30). Такім чынам, калі капіталізм хоча выжыць, трэба, каб ён знайшоў новыя нагоды дзеля інвеставання. Даследнік адзначаў: "Падзеі могуць разгарнуцца такім чынам, што ў будучыні мы вымушаны будзем шукаць новыя крыніцы прыбытковага ўзбагачэння, новыя тэхнічныя вынаходкі, новыя шляхі выкарыстання прыродных рэсурсаў, новыя тавары і новыя галіны індустрыі, калі хочам, каб наша эканамічная сістэма выжыла" (ibid., p. 31).

паказальнае, чым заваёва Індыі: мы не маем права блытаць геаграфічныя межы з эканамічнымі"[1].

І хоць няма падставаў непакоіцца пра знікненне нагодаў дзеля інвеставання, капіталізм мусіць знікнуць. Прыведзеныя ў падтрымку тэзіса аргументы часам беспасярэдне запазычаны з сацыялогіі Парэта: нам тлумачаць, што буржуазія ступае на шлях "распаду" і "вымірання"[2]. Тым не менш Шумпэтэр-эканаміст, які стаў сацыёлагам, яшчэ не зусім забыўся, што раней ён займаўся тэарэтычным аналізам функцыянавання капіталістычнай сістэмы. Калі добра пашукаць, дык у ягоных аквітных развагах можна знайсці і ўласна эканамічны аргумент.

У *"Тэорыі эканамічнай эвалюцыі"* аўтар сцвярджаў, што аплата капіталу (працэнт або прыбытак) — гэта галоўным чынам аплата інавацыяў "дынамічных" прадпрымальнікаў. У 1942 г. Шумпэтэр зноў звярнуўся да сваёй тэорыі прыбытку, але на гэты раз дзеля таго, каб вельмі нечакана выказаць новую версію закону наконт тэндэнцыі да паніжэння нормы прыбытку.

На думку Шумпэтэра, асноўны факт у эканамічным развіцці — тое, што "тэхнічны прагрэс усё больш і больш залежыць ад групы падрыхтаваных спецыялістаў, якія працуюць па замове"[3], у сувязі з чым даходы буржуазіі павінны паступова скарачацца.

"Эканамічная падтрымка прамысловай буржуазіі, — сцвярджаў ён, — у канчатковым рахунку будзе зведзена да атрымання заробкаў, аналагічных заробкам кіраўнікоў"[4].

Але ўлада буржуазіі будзе памяншацца ў такой жа ступені, як і ейныя даходы, і гэта будзе канец капіталізму.

Аднак гэтая псіхалагічна-сацыялагічная аргументацыя зусім неперакананчая. Варта заўважыць, між іншага, што Шумпэтэр пісаў свой твор у той момант, калі пад уплывам альянсу заходніх краінаў з СССР супраць гітлераўскай Германіі асобныя аўтары прыходзілі да перакананння пра магчымасць рэфармавання савецкага рэжыму. Пазней аўстрыйс-

[1] *Op. cit., trad. franç. Paris, 1954, p. 209.*
[2] *Ibid., p. 260.*
[3] *Ibid., p. 229.*
[4] *Ibid., p. 231.*

кі эканаміст, здаецца, крыху шкадаваў пра свой такі песімістычны паказ будучыні капіталізму і асабліва пра сваю ўпэўненасць у магчымасці дасягнення згоды з сацыялізмам пры ўмове захавання палітычнага ладу дэмакратычнага тыпу. Гэта пацвярджаецца фактам, што ў 1946 г. у прадмове да другога выдання сваёй кнігі Шумпэтэр рашуча адбіваўся ад тых, хто абвінавачваў яго ў здрадзе ідэалам эканамічнага лібералізму. Не губляючы пераканання ў абавязковым знікненні капіталізму, Шумпэтэр тым не менш быў, паводле яго ж сцверджання, схільны да абароны капіталістычнага ладу. Пры гэтым Шумпэтэр адмаўляў тут існаванне нейкай супярэчнасці, бо

"які ж нармальны чалавек адмовіцца абараняць сваё жыццё, хоць ён абсалютна і ўпэўнены, што рана ці позна яму так ці іначай наканавана памерці"[1].

В) Першыя працы па тэорыі эканамічнага цыкла

У перыяд 1860—1890 гг., калі эканамісты выпрацоўвалі маржыналісцкую тэорыю, пытанню перавытворчасці і эканамічных крызісаў яны аддавалі мала ўвагі. Але ўсё ж такі даследванні па гэтай праблеме існавалі. У артыкуле Джона Мілза (1867) *"Цыклы крэдытавання і паходжанне гандлёвай панікі"* падаецца тлумачэнне крызісаў на падставе псіхалагічных фактараў[2]. У славутым творы Ўолтэра Бэйджхота *"Lombard Street"* (1873) узнікненне крызісаў тлумачыцца дрэннымі ўраджаямі. Менавіта ў пазначаны перыяд (у 1862 г.) выйшаў у свет першы твор, дзе давалася дэталёвае апісанне эканамічнага цыкла і падкрэслівалася параўнальная рэгулярнасць чарговага надыходу крызісаў. Гаворка ідзе пра кнігу парыжскага лекара Клемана Жугляра *"Аб гандлёвых крызісах і іхным перыядычным надыходзе ў Францыі, Англельшчыне і ЗША"*[3]. Тут, аднак, нам асабліва важна назваць імёны даследнікаў тэорыі недастатковага спажывання, тэорыі "звышкапіталізацыі" і, нарэшце, тэорыі "акселерацыі",

[1] *Ibid., p. 63.*

[2] *Credit cycles and the origins of commercial Panics // Transactions of the Manchester Statistical Society, 1867.*

[3] *Дарэчы, даследванне рэгулярнага надыходу крызісаў дазволіла Жугляру нажыць праз спекуляцыю велізарнае багацце.*

або паскарэння, праз якія надалей стала магчыма аналізаваць эканамічныя крызісы.

У названую эпоху тэзіс аб недастатковым спажыванні па-ранейшаму заставаўся распаўсюджаны сярод аўтараўсацыялістаў. Але яго можна было сустрэць і ў асобных ліберальных, у прыватнасці ў кнізе Ф. Б. Гоўлі *"Капітал і насельніцтва"* (1882)[1], а таксама ў шэрагу артыкулаў У. Г. Крокера, апублікаваных у 1877—1895 гг.[2] Гэтыя аўтары не выказвалі асабліва арыгінальных ідэяў, але іхныя працы былі важным звяном у распрацоўцы азначанай тэорыі.

Вельмі супрацьлеглыя ідэі параўнальна з папярэднімі даследнікамі мы знаходзім у іншых аўтараў, якія былі такімі заўзятымі прыхільнікамі "закону рынкаў збыту", што нават спрабавалі на ягонай падставе вытлумачыць крызісы праз "звышспажыванне". Гэта датычыць, у прыватнасці, ангельскага прафесара Банамі Прайса, якога часта прызначалі экспертам урадавых камісіяў, і французскага палітыка-ліберала Іва Гіё. Першы, напрыклад, у шэрагу артыкулаў, апублікаваных у 1877 г., сцвярджаў: крызіс выбухае тады, калі вытворчасць спажывецкіх тавараў недастатковая для задавальнення попыту на іх. Гэта адбываецца пры значным павелічэнні заробкаў або ўрадавых выдаткаў. Немагчыма было зайсці далей у адмаўленні самых відавочных фактаў. Але Прайс з упартай логікай выкарыстоўваў у сваіх тэзісах прынцып Сэя: асобныя вытворцы не могуць прадаць сваіх прадуктаў, таму што ў іншых вытворцаў занадта мала тавараў для продажу[3].

Гэтую "тэорыю" не варта было б нават узгадваць, калі б яе высновы не паспрыялі выспяванню ў Прайса ідэі, пра якую пойдзе гаворка далей, — ідэі "звышкапіталізацыі". Ён сцвярджаў, што ў пэўны момант занадта шмат выдаткаў ідзе на будаўніцтва шматлікага нерухомага абсталявання, — напрыклад чыгуначных шляхоў. Такая ж думка ўзнікла і ў Іва Гіё, які надыход крызісаў абумоўліваў недахопам свабоднага абаротнага капіталу параўнальна са сталым капіталам[4].

[1] *Cf. à ce sujet T. W. Hutchison, op. cit., pp. 358–359.*
[2] *Ibid., pp. 360–361.*
[3] *Ibid., p. 361.*
[4] *Ibid., p. 364.*

Ён лічыў, што дэпрэсіі станоўча ўздзейнічаюць на ўрад, бо прымушаюць яго скараціць свае выдаткі. Параўнанне гэтых ідэяў з распаўсюджанымі сёння ў асяроддзі эканамістаў-лібералаў тэорыямі паказвае ўсю глыбіню трансфармацыі, якую спазнала ліберальная палітычная эканомія за пэўны перыяд часу.

Нарэшце, у вельмі дакладным *"Аглядзе эканамічных вучэнняў"* (1870—1929) Т. У. Гачысана, які мы тут выкарыстоўваем, у гэты пераходны перыяд адзначаецца асаблівая навуковая вартасць артыкула нямецкага эканаміста Насэ, апублікаванага ў 1879 г. У названым артыкуле крызісы тлумачацца тым, што калі колькасць тавараў немагчыма імклі-ва павялічыць, усялякае павелічэнне попыту "адкрывае поле дзейнасці для спекуляцыі". Гэта ўжо была першая спроба выкарыстання, як мы сёння сказалі б, "прынцыпу паскарэння" (акселерацыі).

Разнастайныя ідэі, толькі злёгку акрэсленыя памянёнымі вышэй аўтарамі, былі грунтоўна распрацаваныя ў апошніх гадах XIX і першых гадах XX ст.

1. ДЖ. А. ГОБСАН І ТЭОРЫЯ НЕДАСТАТКОВАГА СПАЖЫВАННЯ. Часцей за ўсё ангельскага эканаміста Джона Эткінсана Гобсана (1858—1940) разглядаюць як прадстаўніка сацыялістычнага кірунку. Сапраўды, у 1914 г. ён уступіў у лейбарысцкую партыю, і з гэтага моманту ягоныя ідэі шмат у чым спрыялі эвалюцыі эканамічнай дактрыны гэтай партыі. Аднак асноўныя працы Гобсана ўбачылі свет крыху раней — тады, калі ён належаў да "ліберальнай" партыі і абараняў прынцып абмежаванага ўздзеяння дзяржавы на эканоміку.

Ужо на самым пачатку сваёй кар'еры ў асяроддзі эканамістаў Гобсан набыў рэпутацыю своеасаблівага ерэтыка. Ён вельмі рашуча крытыкаваў "артадаксальную" маржыналісцкую тэорыю і спрабаваў прапанаваць замест яе новы аналіз размеркавання даходаў. Аднак асноўныя яго набыткі — гэта, з аднаго боку, знакаміты аналіз імперыялізму, да якога мы звернемся крышку пазней, з другога — новая фармулёўка ў тлумачэнні крызісаў праз недастатковае спажыванне, якую ён распрацоўваў даволі доўга.

Напачатку такое тлумачэнне было змешчанае ў кнізе *"Фізіялогія прамысловасці"* (1889), напісанай Гобсанам супольна з А. Ф. Мамэры. Аўтары сцвярджалі: усялякае эканамічнае даследванне грунтуецца на ідэі Сміта пра залежнасць памераў вытворчасці ад колькасці даступных сродкаў вытворчасці. Але наадварот — гэтыя памеры могуць застацца значна ніжэйшымі за свой максімум з прычыны празмернага ашчаджання.

Такім чынам, прапанаваныя тэзісы ўжо адрозніваюцца ад першапачатковай тэорыі недастаковага спажывання, вылучанай Сісмандзі. Іх аўтары не ігнаруюць таго, што калі ашчаджаныя сродкі інвестуюцца, узнікае попыт на тавары. Яны лічылі нават, што ашчаджанне мае сталую тэндэнцыю да інвеставання, і гэта перашкаджала ім зрабіць вызначальны крок у эканамічнай тэорыі, крок, які быў зроблены Кейнсам. Гобсан і Мамэры проста сцвярджалі, што капітал інвестуецца са стратамі, бо існуе яго максімум, які кожны працоўны можа выкарыстаць[1]. У канчатковым рахунку менавіта таму, што частка капіталу растрачана, само ашчаджанне залішняе, і тады выбухае крызіс.

У наступным творы — *"Праблема беспрацоўя"* (1895) Гобсан дапоўніў свой тэзіс. Ён сцвярджаў, што неаднолькавае размеркаванне даходаў — адзін з фактараў, якія выклікаюць залішняе ашчаджанне і недастатковае спажыванне. Нарэшце, у шматлікіх нататках даследнік адзначае, што сродак супраць дэпрэсіі палягае ў грамадскай працы, якая фінансуецца праз пазыку[2].

2. ТЭОРЫЯ НЕДАСТАТКОВАГА АШЧАДЖАННЯ. Калі пакінуць убаку сапраўды даволі своеасаблівы выпадак Гобсана,

---

[1] *Cf. T. W. Hutchison, op. cit., p. 121.*

[2] *Адзін урывак з працы Гобсана "Індустрыяльная сістэма", працытаваны ў творы Гачысана (op. cit., p. 123), сведчыць, што аўтар, здаецца, пераадольваў свой першапачатковы погляд на стасунак ашчаджанне—інвеставанне і ўжо ўспрымаў Кейнсавы тэзісы, згодна з якімі ровень занятасці залежыць ад рытму выдаткавання даходаў. Сапраўды, гаворачы пра фінансаванне грамадскай працы праз падаткі, ён пісаў: "Калі дапусціць, што падаткаплатнік пераўтворыць свае грошы ў попыт таксама хутка, як дзяржава заплоціць яму за празмерную працу, дык падатак не выклікае ніякага павелічэння роўню занятасці. Калі ж, наадварот, вынік падаткаабкладання — больш хуткае, чым раней, пераўтварэнне грошай у попыт на працу, дык сукупны ровень занятасці ў дадзены перыяд павялічыцца з прычыны такога паскарэння попыту".*

дык варта пагадзіцца, што вызначальную ролю ў дачыненні да тэарэтычных даследванняў наконт прыроды крызісаў выканаў твор расейскага эканаміста Туган-Бараноўскага *"Прамысловыя крызісы ў Англельшчыне"*, першае расейскае выданне якога з'явілася ў 1894 г., нямецкае — у 1901 і французскае — у 1913 г.

Аўтар абвясціў сябе марксістам і ўвесь аналіз названай праблемы пабудаваў на базе тых паняццяў і той мадэлі, якія выкарыстаны Марксам у *"Капітале"*. Але высновы Туган-Бараноўскага аб прыродзе крызісаў вельмі далёкія ад Марксавых: яны падобныя да поглядаў ліберала ў і менавіта праз гэта даследванні Туган-Бараноўскага так паўплывалі на заходніх эканамістаў. Можна нават без сумневу сказаць, што кніга Туган-Бараноўскага была каналам, праз які асобныя даследванні Маркса ўздзейнічалі на ліберальную эканамічную думку (ідэі Шумпэтэра і Кейнса ўлучна). У некаторых выпадках такое ўздзеянне магло ажыццяўляцца нават без выразнага ўсведамлення гэтага з боку ягоных аб'ектаў. Чытаючы *"Прамысловыя крызісы ў Англельшчыне"*, заходнія эканамісты адкідвалі Марксаву мадэль, якая ім не пасавала, але ўспрымалі асобныя ідэі, вылучаныя ў другой кнізе *"Капіталу"*.

Сам аўтар у сваіх меркаваннях зыходзіў са зробленага Марксам падзелу вытворчасці на дзве буйныя групы і пазычыў у яго ўжо вядомую нам адзіную ўмову ўсеагульнай раўнавагі: такая раўнавага існуе тады, калі вытворчасць першай групы пэўным чынам стасуецца з вытворчасцю другой групы (або, што тое ж самае, калі валавыя інвестыцыі — гэта пэўная частка вартасці валавога нацыянальнага прадукту).

І з гэтага Туган-Бараноўскі зрабіў наступную выснову: перавытворчасць спажывецкіх тавараў ніколі не можа быць вынікам недастатковага попыту на гэтыя тавары. Даследнік сцвярджаў: які б нізкі ні быў попыт на тавары, заўсёды існуе магчымасць дасягнуць раўнавагі: для гэтага неабходны толькі вялікі аб'ём вытворчасці сродкаў вытворчасці. Туган-Бараноўскі нават пераканаць ў тым, што калі б у выніку тэхнічнага прагрэсу былі зліквідаваныя ўсе рабочыя, з выняткам аднаго, то перавытворчасці можна было б пазбегнуць, бо

попыт на дадатковыя сродкі вытворчасці яшчэ некаторы час замяняў бы попыт на спажывецкія тавары[1]. Але такое сцвярджанне сведчыць толькі пра недастатковасць аналізу, бо відавочна, што немагчыма бясконца вырабляць усё больш і больш сродкаў вытворчасці, калі памяншаецца спажыванне.

Туган-Бараноўскі хацеў таксама "занадта лёгка выкруціцца", калі спрабаваў даказаць, што крызісы адбываюцца не ад лішку *ашчаджанняў*, а ад іх *недастатковасці*. Ён пісаў:

"Назапашванне пазыковага грашовага капіталу павінна адбывацца з большай рэгулярнасцю, чым ягонае пераўтварэнне ў прадукцыйны капітал; пазыковы капітал няспынна назапашваецца. Ён пераўтвараецца ў прадукцыйны капітал толькі ўрыўкава".

Развіваючы названую ідэю, Туган-Бараноўскі тлумачыў: росквіт існуе тады, калі капітал хутка інвестуецца, бо ён "тым або іншым чынам" знаходзіць сабе месца. Але калі на працягу доўгага перыяду адзначаўся росквіт, дык рэзервы капіталу вычэрпваюцца. Пры адсутнасці пазыковага капіталу інвестыцыі больш не могуць быць дастаткова значныя. Тады вытворчасць абсталявання падае ніжэй за прапорцыю, неабходную для раўнавагі. У сукупным жа прадукце прысутнічае *параўнальна* шмат спажывецкіх тавараў, у выніку чаго і адбываецца перавытворчасць. Абараняючы гэты тэзіс, аўтар на практыцы адхіляў гіпотэзу Марксавых схемаў, згодна з якой менавіта праз ашчаджанне за пэўны перыяд і фінансуюцца інвестыцыі дадзенага перыяду.

Туган-Бараноўскі лічыў, што капітал назапашваецца на працягу пэўнай колькасці перыядаў, а потым інвестуецца такім чынам, што вытворчасць сродкаў вытворчасці павялічваецца больш значна, чым гэта падмацоўвалася б ашчаджаннем. Калі ж рэзерв ашчаджання вычарпаны, дык немагчымасць працягваць будаваць абсталяванне ў тым жа рытме выклікае крызіс. Але з гэтай высновай пагадзіцца нельга, бо, як мы пабачым далей, развіццё аналізу эканамічных цыклаў спрыяла ўсё лепшаму і лепшаму асвятленню таго факта, што інвестыцыямі кіруюць зусім не тыя асобы, якія ашчаджаюць капітал: хутчэй за ўсё існуюць адваротныя стасункі. Прадпрыемствы прымаюць пастановы наконт ін-

[1] *Op. cit., trad. franç., p. 216, n. 1.*

вестыцыяў і накіроўваюць замовы на абсталяванне. Ажыццяўленне гэтых замоваў прыносіць даходы, частка якіх ашчаджаецца. Менавіта факт павелічэння такога ашчаджання праз інвестыцыі дае магчымасць заплаціць за абсталяванне, калі ягоная вытворчасць завершаная. Такім чынам, перашкоды пашырэнню вытворчасці чыніць недастатковасць інвестыцыяў, а не ашчаджання. Аднак справядлівасць тэзіса была прызнаная толькі зусім нядаўна, і падыходы да назвай праблемы, блізкія да падыходу Туган-Бараноўскага, абараняліся яшчэ і пасля яго.

У 1902 г., праз год пасля выхаду ў свет нямецкага выдання працы Туган-Бараноўскага, Артур Спітоф, які на той час быў асістэнтам "гістарыста" Шмолера, выпусціў сваё першае даследванне крызісаў. Аднак уплыў рускага эканаміста на Спітофа асабліва адчуваецца ў шэрагу артыкулаў, апублікаваных у 1909 г. у *"Schmollers Jahrbuch"*. Сапраўды, Спітоф сцвярджаў, што перавытворчасць, якая спараджае крызіс, — гэта перавытворчасць сродкаў вытворчасці. Такая перавытворчасць існуе таму, што бракуе "свабоднага капіталу" для набыцця пазначаных сродкаў вытворчасці. Але, як дадаваў ён, ёсць таксама ўсе падставы гаварыць пра недастатковасць вытворчасці "дадатковых тавараў", гэта значыць спажывецкіх тавараў[1]. Названы тэзіс быў бы даволі незразумелы, калі б не было відаць, што гэта толькі пераўтвораная Марксава схема аднаўлення вытворчасці.

Маркс сцвярджаў, што агульная раўнавага залежыць ад стасунку вытворчасці абедзвюх групаў. Калі ж "механічна" скарыстоўваць ягоную мадэль, дык можна сказаць, што лішак вытворчасці ў першай групе (сродкі вытворчасці) абумоўлівае тым часам недастатковасць вытворчасці ў другой групе (спажывецкія тавары). Тым не менш сам аўтар *"Капіталу"* перасцерагаўся адкрыта рабіць гэтую выснову, якая зруйнавала б ягоны нязменны тэзіс пра непазбежны характар крызісаў перавытворчасці ў межах капіталістычнай сістэмы.

У 1918 г. шведскі эканаміст Густаў Касэль у сваім творы

[1] *Cf. le texte cité par T. W. Hutchison, op. cit., p. 382.*

"Тэорыя сацыяльнай эканомікі" прапанаваў тлумачэнне крызісаў, блізкае да тлумачэння Спітофа. Аднак тэорыя недастатковага ашчаджання найбольш поўна была выкладзеная ў 1928 г. у працы аўстрыйскага эканаміста Ф. А. Гаека *"Тэорыя грошай і эканамічны цыкл"*.

Пад час перыяду росквіту, як тлумачыць названы аўтар, стасунак сумаў, выдаткаваных на набыццё сродкаў вытворчасці, і сумаў, выдаткаваных на набыццё спажывецкіх тавараў, "штучна" павялічваецца — у прыватнасці ад таго, што банкі практыкуюць занадта нізкую норму працэнта. Але праз пэўны час індывіды спантанна імкнуцца аднавіць "звычайную прапорцыю" паміж абедзвюма катэгорыямі попыту. У выніку змяншаецца попыт на сродкі вытворчасці, што і выклікае крызіс. А з прычыны таго, што попыт на сродкі вытворчасці паходзіць ад ашчаджання, дык непасрэдны чыннік крызісу — гэта менавіта недастатковасць ашчаджання.

Тут ізноў праз маржыналісцкую лексіку і разважанне прасочваецца Марксава схема. Але такое яе дастасаванне не больш пераканаўчае, чым папярэднія. У прыватнасці, Гаек не ўлічваў аднаго асноватворнага моманту ў тэорыі Кейнса: звычайна сродкі вытворчасці вырабляюцца па "замове", і такім чынам, наконт іх аніяк нельга казаць пра нейкую "перавытворчасць". Безумоўна, трэба было б сканцэнтраваць увагу на стварэнні лішку вытворчых магутнасцяў у першай групе, але, здаецца, не будзе адпавядаць рэчаіснасці дапушчэнне, што такі лішак сам па сабе можа выклікаць крызіс.

3. ТЭОРЫІ "ПАСКАРЭННЯ". *а) Альбэр Афтальён*. Сваімі артыкуламі, апублікаванымі ў 1908—1909 гг.[1], а потым і кнігай *"Перыядычныя крызісы перавытворчасці"* (1913) французскі эканаміст Альбэр Афтальён шмат у чым паглыбіў аналіз эканамічных цыклаў. У асноўным ён грунтаваўся на ідэі, што вытворчасць сродкаў вытворчасці вымагае пэўнага часу. Калі попыт на спажывецкія тавары пашыраецца, дык вытворчыя магутнасці краіны адразу ж павялічыцца не могуць. Значыцца, попыт патрабуе замоваў на абсталяван-

[1] *Aftalion A. La réalité des surproductions générales, Revue d'économie politique, 1908 et 1909.*

не, бо яго не стае. Праз пэўны час новае абсталяванне пачынае працаваць і вытворчыя магутнасці павялічваюцца хутчэй, чым попыт на спажывецкія тавары. Тады і назіраецца перавытворчасць, а рост інвестыцыяў спыняецца. Новыя інвестыцыі будуць зроблены толькі тады, калі вытворчыя магутнасці праз паступовы знос матэрыялу паменшацца.

Пасля зноў разгортваецца папярэдні цыкл. Эканамічнае жыццё, як кажа Афтальён, нагадвае пакой, дзе ёсць печ на вугалі. Адчуваючы холад, чалавек запальвае печ і кладзе ў яе вугаль да таго часу, пакуль яму не будзе параўнальна цёпла. Тады ён перастае падкідваць вугаль у печ, пакуль зноў не змерзне. Але ў такім разе на працягу пэўнага часу яму будзе холадна і г. д.

Безумоўна, у гэтым аналізе прысутнічае надзвычай слушная ідэя. Аднак аўтар не тлумачыць нам, ні чаму першапачаткова назіраецца павелічэнне попыту на спажывецкія тавары, ні чаму гэты попыт не можа ўзрасці дастаткова хутка, каб нават пачынаючы з моманту павелічэння вытворчых магутнасцяў перавытворчасці можна было б пазбегнуць.

б) Джон Морыс Кларк. Афтальён сфармуляваў сваю тэорыю праз назіранне надзвычай важнай з'явы: цыклічныя ваганні вытворчасці заўсёды значна большыя ў тых галінах прамысловасці, якія вырабляюць сродкі вытворчасці. І з гэтага ён зрабіў выснову, што часам замовы на сродкі вытворчасці занадта вялікія параўнальна са спажываннем, а іншым разам яны недастатковыя.

У 1917 г. яшчэ адно тлумачэнне пазначанай з'явы было прапанавана амэрыканскім эканамістам Джонам Морысам Кларкам у артыкуле *"Паскарэнне руху прадпрымальніцкай дзейнасці і закон попыту: тэхнічны фактар эканамічных цыклаў"*[1].

"Змяненне штогод роўню спажывання, — пісаў даследнік, — часова ўздзейнічае на попыт на прамежкавы прадукт, — попыт, які большы, чым ягонае заўсёднае ўздзеянне, дакладна на такую велічыню, на якую агульная сума інвестыцыяў у прамежкавую вытворчасць перасягае суму, якая штогод выдаткоўваецца для падтрымання абсталявання ў належным стане".

[1] *The Journal of Political Economy, mars 1917, pp. 217—235.*

Злёгку змяніўшы выраз аўтара, можна сказаць, што калі пазначыць праз c спажыванне і праз k капітал, неабходны для вытворчасці адзінкі спажывецкага тавару, дык грашовая вартасць абсталявання, неабходнага для вытворчасці c, складзе $c \cdot k$.

З другога боку, калі праз L пазначыць сярэдні тэрмін існавання абсталявання, дык вартасць абсталявання, якое штогод выкарыстоўваецца для падтрымання папярэдняга абсталявання ў належным стане, складзе

$$\frac{c \cdot k}{L}.$$

Калі спажыванне павялічыцца на Δc, дык вытворчасць абсталявання варта павялічыць на суму $\Delta c \cdot k$. Тады параўнальнае павелічэнне вытворчасці абсталявання складзе

$$\Delta c \cdot k : \frac{c \cdot k}{L} \quad \text{ці} \quad \frac{\Delta c}{c} \cdot L.$$

Такім чынам, адзначанае павелічэнне адпавядае L-разоваму параўнальнаму павелічэнню спажывання. Праз гэта нам даказваецца, што ваганні ў прадукцыі будуць значна большыя ў тых галінах, якія займаюцца вытворчасцю сродкаў вытворчасці, і ні ў чым іншым не варта шукаць прычыну эканамічных ваганняў.

У гэтай тэорыі, таксама як і ў тэорыі Афтальёна, падкрэсліваецца, што названае параўнальнае павелічэнне попыту на спажывецкія тавары выклікае значна большае параўнальнае павелічэнне попыту на сродкі вытворчасці, або, як звычайна кажуць, назіраецца "паскарэнне" попыту на сродкі вытворчасці. Аднак гэтае "паскарэнне" ў названых аўтараў тлумачыцца неаднолькава: у Афтальёна — праз *час вырабу* абсталявання, у Дж. М. Кларка — праз *тэрмін* яго *існавання*. Без сумневу, абодва вытлумачэнні варта спалучыць, але ў кожным разе нельга сказаць, што яны даюць нам поўнае разуменне разгортвання эканамічнага цыкла.

4. ІНШЫЯ ТЭОРЫІ: МАНЕТАРНЫЯ ВЫТЛУМАЧЭННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЦЫКЛА. ТЭОРЫІ Н. ЁХАНСЭНА. Нарэшце, да

чацвертай катэгорыі даследванняў належаць шматлікія працы, надрукаваныя ў перыяд 1900—1929 гг., дзе вучоныя намагаюцца растлумачыць крызісы праз недастатковасць грашовага крэдыту, дадзенага банкамі пры канцы перыяду пашырэння вытворчасці. Відавочна, што гэтыя даследнікі — амэрыканскі эканаміст Ірвінг Фішэр[1], аўстрыйскі эканаміст Людвіг фон Мізес[2] і ангельскі эканаміст Д. Х. Робэртсан[3] — трымаліся ў асноўным тэзісаў Віксэля. Апошнія два асаблі-ва падкрэслівалі, што ў перыяд пашырэння вытворчасці павелічэнне цэнаў вымушае індывідаў скарачаць сваё спажыванне, гэта значыць мае месца "прымусовае ашчаджанне", якое забяспечвае рух наперад.

Найбольш тыповы прадстаўнік манетарнага вытлумачэння эканамічнага цыкла — брытанскі эканаміст Р. Дж. Гоўтры. У кнізе *"Добрыя і кепскія справы"*[4] (1913), а потым і шмат у якіх іншых працах (найбольш вядомая *"Грашовае абарачэнне і крэдыт"* (1919))[5] Гоўтры паказвае, што пры сістэме залатога стандарту цэнтральныя банкі праз пэўны адрэзак часу не могуць не запавольваць развіцця крэдыту, бо іхны каэфіцыент ліквіднасці памяншаецца. Але ў такім выпадку прадпрымальнікі не могуць працягваць развіваць свае справы і пашырэнне эканамічнай дзейнасці мусіць спыніцца.

Безумоўна, гэтакі аналіз часткова слушны, і застаецца толькі пашкадаваць, што аўтар імкнецца супрацьпаставіць сваё даследванне ўсім іншым спробам вытлумачэння эканамічнага цыкла, тым часам як асобныя з іх таксама неблагія. Ва ўсялякім разе варта падкрэсліць, што менавіта праз спробу сфармуляваць тэорыю грашовай эмісіі Кейнс у 1930 г. распачаў новую эру ў гісторыі заходняй эканамічнай думкі.

Аднак у аўтара *"Агульнай тэорыі занятасці, працэнта і грошай"* быў своеасаблівы папярэднік у асобе амэрыканскага эканаміста Н. Ёхансэна (1844—1928). Гэты аўтар, які меў нямецкае паходжанне і быў службоўцам гандлёвага

[1] *The purchasing power of money, 1912.*
[2] *Theorie des Geldes und der Umlaufsmittel, 1912.*
[3] *Banking policy and the price level, 1926.*
[4] *Good and bad trade.*
[5] *Currency and credit.*

дома ў Нью-Ёрку, свае асноўныя працы выдаваў пад рознымі псеўданімамі: у 1903 г. дзве напісаныя па-нямецку працы *"Грашовае абарачэнне"*[1] і *"Перыяды дэпрэсіі і іхная адзіная прычына"*[2]; у 1908 г. — кнігу на ангельскай мове *"Адзін момант у дачыненні да крызісаў, якому не аддавалася ўвага"*[3].

У гэтых даследваннях упершыню ў эканамічнай літаратуры — ліберальнай або сацыялістычнай выразна зацвярджаецца наступны прынцып: адрозныя акты ашчаджання і інвеставання, паколькі няроўнасць паміж сумай ашчаджанняў і сумай інвестыцыяў, якія індывіды *хочуць* ажыццявіць, — ключавы момант у вытлумачэнні эканамічных ваганняў. Ёхансэн пісаў:

"Тое, што апісваецца проста як працэс ашчаджання, у сапраўднасці складаецца з двух адрозных элементаў: з аднаго боку, з таго, што сапраўды ўяўляе сабой працэс ашчаджання, гэта значыць з адкладвання грошай, і з другога — з працэсу інвеставання, пры дапамозе якога ствараецца новае абсталяванне... Шмат хто з сённяшніх эканамістаў мяркуе наступным чынам: дзеля таго што ашчаджанне і інвеставанне ідуць поруч і нават у пэўнай ступені складаюць адзіны працэс, а вынік такой дзейнасці надзвычай выгадны для грамадства, дык працэс ашчаджання павінен сам па сабе разглядацца як сацыяльна карысны... Такая гіпотэза не адпавядае рэчаіснасці"[4].

У іншым творы Ёхансэн яшчэ лепш выказаў сваю думку:

"На першай стадыі працэс ашчаджання заўсёды суправаджаецца згубнай тэндэнцыяй, бо той, хто ашчаджае, увесь час імкнецца набыць у грамадства менш тавараў і паслугаў, чым сам яму прадае, і праз гэта руйнуе раўнавагу попыту і прапановы. Гэтая раўнавага аднаўляецца толькі праз інвеставанне..."[5]

Для ўсведамлення надзвычайнай навіны прыведзеных тэкстаў неабходна ўзгадаць наступны факт. У названы перыяд — першую трэць XX ст. і даволі шмат часу пасля яго нават тыя эканамісты-ліберады, якія спецыяльна засяроджвалі сваю ўвагу на вывучэнні крызісаў, былі яшчэ доўга перакананыя ў слушнасці сцверджання Жана Батыста Сэя і

[1] *Der Kreislauf des Geldes.*
[2] *Depressionsperioden und ihre einheitliche Ursache.*
[3] *A neglected point in connection with crises.*
[4] *Der Kreislauf des Geldes, p. 178, cité par T. W. Hutchison, op. cit., p. 392.*
[5] *A neglected point, p. 78, cité par T. W. Hutchison, op. cit., p. 392.*

Рыкарда, што ўсялякая вытворчасць стварае рынак збыту для іншай вытворчасці на суму, адпаведную яе вартасці. У прыватнасці, менавіта гэтую думку абараняў Альбэр Афтальён у сваім першым артыкуле *"Рэчаіснасць усеагульных крызісаў перавытворчасці"*[1]. Дзеля гэтага ён лічыў сябе абавязаным распачаць свой даволі цьмяны аналіз зыходзячы з паказніка памяншэння маржынальнай карыснасці, каб тым не менш прыйсці да высновы, што перавытворчасць — гэта ўсё ж такі магчымая з'ява.

Ёхансэн жа, наадварот, сцвярджаў, што частка даходаў, размеркаваных з нагоды вытворчасці нейкага аб'екта, першапачаткова выводзіцца з эканамічнага абарачэння праз акт ашчаджання і ў выніку гэтага раўнавага паміж прапановай і сукупным попытам парушаецца, калі ў той самы момант прадпрымальнік не замовіць дастатковай сумы на сродкі вытворчасці.

Ёхансэн адрозніваў тры формы ашчаджання — "капіталізацыю", калі яно выклікае эквівалентнае інвеставанне; "тэзаўрызацыю", пры якой яно цалкам выводзіцца з абарачэння, і, нарэшце, "заганную" (няцотную) форму, калі ашчаджанне спрычыняецца да набыцця ўжо створаных матэрыяльных каштоўнасцяў. Пры гэтым ён сцвярджаў, што дзве апошнія формы ашчаджання выклікаюць дэфіцыт сукупнага попыту.

Відаць, можна было б аспрэчыць тую значнасць, якая надаецца даследнікам набыццю прадметаў раскошы, нерухомай маёмасці і твораў мастацтва, заўважыўшы, што даходы, атрыманыя гандлярамі гэтых тавараў, зноў робяцца даступнымі. Аднак, без сумневу, такія аперацыі сама меней *запавольваюць* надыход таго моманту, калі ашчаджаныя сумы будуць выкарыстаныя ў інвеставанні. Такім чынам, нераўнавага паміж ашчаджаннем і інвеставаннем усё ж такі ўзнікае, і тэзіс Ёхансэна пацвярджаецца.

Ва ўсялякім разе аўтар вельмі выразна бачыў яшчэ адзін момант, які сёння ўяўляецца нам асноватворным у тлумачэнні эканамічных ваганняў: менавіта скарачэнне даходаў адной катэгорыі індывідаў памяншае даходы тых індывідаў, якія вырабляюць тавары, што звычайна набываюц-

[1] *Revue d'économie politique, 1908.*

ца першымі з іх, і г. д.[1] Гэты працэс Ёхансэн вызначаў як *"прынцып мультыплікатара"*. Названы выраз быў вельмі ўдалы, бо цалкам адпавядаў рэальнай з'яве, якая гэтым разам стасавалася з ідэяй, што змяшчалася ў "законе рынкаў збыту". Зусім справядліва, што павелічэнне або памяншэнне даходаў, якія размяркоўваюцца ў адным сектары, абумоўлівае іх павелічэнне або памяншэнне ў іншых сектарах. Гэты факт варта ўлічваць, калі імкнешся зразумець, якім чынам у эканоміцы адбываецца пашырэнне вытворчасці або ўзнікае дэпрэсія. Неабходна толькі ўстрымацца ад памылковай высновы, згодна з якой усе даходы, якія размяркоўваюцца ў нейкім сектары, заўсёды будуць імгненна пераўтварацца ў попыт на тавары.

Кейнс, які, безумоўна, запазычыў у Ёхансэна асноўныя ідэі свайго вучэння, не пагаджаўся, аднак, аддаць належнае гэтаму амэрыканскаму эканамісту. Як адзначаў Т. У. Гачысан[2], Кейнс узгадаў свайго папярэдніка толькі аднаго разу — праз спасылку ў сваім *"Трактаце пра грошы"*[3]. Гэта яшчэ больш варта шкадавання, калі заўважыць, што найвялікшы эканаміст нашага часу прысвяціў шматлікія старонкі шанаванню такіх надта другасных аўтараў, як "маёр Даглас" або Сільвія Гезэл.

§ 2. "Трактат пра грошы"

Джон Мэйнард Кейнс (1883—1946) быў сынам прафесара логікі і палітычнай эканоміі Кембрыджскага універсітэта. Атрымаўшы адукацыю ў Ітанскім каледжы сярод дзяцей брытанскай арыстакратыі, Кейнс спачатку паступіў у *Civil Service* — установу вышэйшых ангельскіх функцыянераў, а потым стаў прафесарам палітэканоміі. Аднак ён заўсёды вельмі цікавіўся бізнесам і грамадскімі справамі.

Як і Рыкарда, Кейнс разбагацеў праз удалыя спекуляцыі на біржы і пазней пачаў кіраваць страхавой кампаніяй. Яго

[1] *Cf. le passage cité par T. W. Hutchison, op. cit., pp. 393—394.*
[2] *A review of economic doctrines, op. cit., p. 395.*
[3] *Cf. A treatise on money (1930), t. II, p. 100. Sur Johannsen, consulter L. R. Klein, The keynesian Revolution, New York, 1947, pp. 143—147.*

шмат разоў прызначалі дарадцам урада, і нарэшце ён атрымаў пасаду кіраўніка Ангельскага банка. У 1942 г. ён атрымаў шляхоцкі тытул і стаў лордам Кейнсам, баронам Тылтанійскім.

Асноўныя ідэі Кейнса выкладзены ў *"Эканамічных наступствах міру"* (1929), *"Трактаце пра грошы"* (1930) і *"Агульнай тэорыі занятасці, працэнта і грошай"* (1936). Яго падыход да эканомікі — гэта падыход адукаванага буржуа, які жадае выратаваць сістэму прыватнага прадпрымальніцтва праз адмаўленне ад суцэльнага "laissez-faire".

Палітыку кансерватыўнага ўрада Кейнс лічыў абсурднай. У лісце ад 24 снежня 1917 г. ён пісаў: "Нашыя кіраўнікі такія ж некампетэнтныя, як і бязглуздыя, і настолькі разбэшчаныя, што пэўная эра цывілізацыі пэўнага кшталту вельмі нават можа быць зрынутая"[1]. З другога боку, ён вельмі выразна выступаў і супраць сацыялізму. 1 студзеня 1935 г. Кейнс з нагоды сваёй будучай кнігі *"Агульная тэорыя занятасці..."* напісаў Бэрнарду Шоў:

"Прынамсі для разумення стану майго духу вы павінны ведаць, што я знаходжуся ў самым разгары напісання кнігі па эканамічнай тэорыі, якая ў значнай ступені зробіць рэвалюцыю — не адразу, я мяркую, але на працягу дзесяці будучых гадоў — у падыходзе свету да эканамічных праблемаў... Будуць назірацца вялікія змены і, у прыватнасці, будзе зруйнаваны рыкардаўскі падмурак марксізму"[2].

Палітыка Ангельшчыны пасля Першай сусветнай вайны ўяўлялася Кейнсу вельмі небяспечнай, бо праз яе стваралася беспрацоўе. У 1924 г. колькасць беспрацоўных дасягнула мільёна. Асобныя палітычныя дзеячы (у прыватнасці, Лойд Джордж) вылучалі ідэю стварэння праграмы грамадскай працы, і Кейнс падтрымаў гэтую ініцыятыву.

Прыватнае прадпрыемства, пісаў Кейнс, больш не мае бясспрэчнага панавання (ён ужо ўлічваў савецкі досвед) — значыцца, яму трэба дапамагаць. З другога боку, даследнік сцвярджаў, што трэба паменшыць вартасць фунта стэрлінгаў для стымулявання экспарту і перасцерагацца ад жадан-

[1] *Voir R. F. Harrod, La vie de John Maynard Keynes, London, 1951, p. 224.*
[2] *Id., ibid., p. 462.*

ня ўсялякім коштам аднавіць канвертоўнасць фунта ў золата на той аснове, якая існавала перад вайной. Нарэшце, ён лічыў, што ўкладанні за мяжу занадта вялікія параўнальна з нутранымі інвестыцыямі, якіх вельмі мала.

Ужо тут перад намі паўстаюць усе галоўныя ідэі Кейнсавай палітыкі, хоць яны яшчэ і не былі заснаваныя на дакладным тэарэтычным аналізе. У 1926 г. Кейнс пісаў:

"Я лічу, што патрэбны пэўны скаардынаваны акт разважнага розуму з тым, каб вызначыць ровень, на якім мусіць зафіксавацца ашчаджанне ўсёй супольнасці, і памеры, у якіх гэтае ашчаджанне павінна зыходзіць за мяжу ў форме вонкавых інвестыцыяў, а таксама каб адказаць на пытанне, наколькі сучасная арганізацыя рынку інвестыцыяў забяспечвае размеркаванне ашчаджанняў у сама прадукцыйныя з нацыянальнага гледзішча каналы"[1].

Аднак у наступныя гады ў эканоміцы запанавала меркаванне, супрацьлеглае думцы Кейнса. У 1925 г. была адноўленая канвертоўнасць фунта стэрлінгаў на перадваеннай аснове. І з прычыны таго, што па-ранейшаму лютавала беспрацоўе, у прыватнасці ў вугальных шахтах, было пастаноўлена скараціць заробкі з мэтай паніжэння сабекошту вугалю, прызначанага на экспарт. Кейнс рэзка крытыкаваў гэтую палітыку, якой кіраваў Ўінстан Чэрчыль. Кейнс сцвярджаў, што паніжэнне заробкаў паменшыць пакупную здольнасць спажыўцоў і паглыбіць эканамічную нераўнавагу.

Сапраўды, асноўным наступствам паніжэння заробкаў стаў вялікі страйк шахцёраў, які выклікаў усеагульны страйк. Кейнс быў больш чым калі перакананы ў памылковасці палітыкі кансерватараў. Тым часам у верасні 1929 г. у Злучаных Штатах выбухнуў крызіс. Тады Кейнс пастанавіў тэрмінова закончыць свае першыя буйныя тэарэтычныя даследванні і пры канцы 1930 г. выдаў *"Трактат пра грошы"*.

У памянёнай працы асвятлялася галоўным чынам праблема эканамічных дэпрэсіяў. Кейнс падышоў да гэтага пытання з манетарнага боку таму, што ў Ангельшчыне на дадзеным этапе эканамічны цыкл часцей за ўсё прапаноўвалася тлумачыць на падставе грашовых фактараў. Аднак у канчатковым рахунку Кейнс не так інтэрпрэтаваў перавыт-

[1] *Id., ibid., pp. 355–356.*

ворчасць: ён пачаў абараняць ідэю недастатковасці інвестыцыяў.

Звяртаючыся да фундаментальнага адрознення, уведзенага Марксам, Кейнс адасабляў групу вытворчасці сродкаў вытворчасці ад групы вытворчасці спажывецкіх тавараў. Аднак ён змяніў марксісцкую схему і пагадзіўся, што няма патрэбы разглядаць нераўнавагу паміж прапановай і попытам на сродкі вытворчасці, бо яны вырабляюцца па замове. Ён сцвярджаў, што трэба толькі прасачыць, якім чынам ажыццяўляецца раўнавага паміж попытам і прапановай у вытворчасці спажывецкіх тавараў.

Кейнс зыходзіў з паняцця "выдаткаў вытворчасці тавараў, выраблены на працягу года". Ён гаварыў, што выдаткі вытворчасці складаюцца з заробкаў, выплачаных у працэсе вытворчасці, і *нармальных прыбыткаў*[1].

Калі мы прасочым доказы Кейнса, дык, спрошчваючы іх, атрымаем наступнае: "выдаткі вытворчасці" нацыянальнага прадукту R падзяляюцца на "выдаткі вытворчасці" сродкаў вытворчасці R_1 і "выдаткі вытворчасці" сродкаў спажывання R_2.

Усялякі атрыманы даход падзяляецца на выдаткі на набыццё спажывецкіх тавараў і на ашчаджанне. Калі "нармальныя расходы" — гэта сумы, выдаткаваныя на набыццё спажывецкіх тавараў пры сярэдніх даходах, а "нармальныя ашчаджанні" — ашчаджанні, якія ўтвараюцца пры сярэдніх даходах, дык

$$R_1 + R_2 = \text{расходы} + \text{ашчаджанне}.$$

Калі ашчаджанне (якое залежыць ад $R_1 + R_2$) складае R_1, дык расходы адпавядаюць R_2. Тады *рэалізаваная* вартасць спажывецкіх тавараў адпавядае іхным "выдаткам вытворчасці", а цэны і прыбыткі ў групе вытворчасці спажывецкіх тавараў будуць нармальныя.

Калі нармальнае ашчаджанне большае за R_1, дык нармальны даход меншы за выдаткі вытворчасці спажывецкіх

[1] *Нармальныя прыбыткі змяшчаюць у сабе "нармальную аплату працы прадпрымальніка, працэнт за выкарыстанне капіталу, звычайныя выгады, якія паходзяць ад манаполіі на рынку, рэнты і даходы такога ж кшталту" (A treatise on money. London, 1930, p. 123).*

тавараў. *Рэалізаваная* ж вартасць спажывецкіх тавараў будзе меншая за іхныя выдаткі, і тады назіраецца паніжэнне цэнаў. Праз гэта ровень прыбыткаў будзе ніжэйшы за нармальны, а эканоміка пераходзіць у стан дэпрэсіі.

Такім чынам, на думку Кейнса, эканамічная дэпрэсія тлумачыцца тым, што нармальнае ашчаджанне перавышае інвестыцыі, а гэта стварае нераўнавагу на рынку спажывецкіх тавараў, прымушаючы вытворцаў названых тавараў прадаваць іх па цэнах, меншых за сабекошт.

Цалкам новая тут параўнальна з Марксавымі схемамі аднаўлення вытворчасці гіпотэза наконт вытворчасці "па замове" сродкаў вытворчасці. З другога боку, Кейнс, выкарыстоўваючы тэзісы Шумпэтэра, надаў інвеставанню такую актыўную ролю, якой яно нават не мела ў даследаваннях Маркса.

"Карацей кажучы, — пісаў Кейнс, — павелічэнне або памяншэнне капіталу залежыць ад сумы інвестыцыяў, а не ад сумы ашчаджанняў"[1].

Такім чынам, адзіным фактарам дэпрэсіі ён бачыў недастатковасць інвестыцыяў. І наадварот: пашырэнне эканамічнай дзейнасці аўтар *"Трактата пра грошы"* тлумачыць існаваннем лішку інвестыцыяў, які абумоўлівае атрыманне надзвычайных прыбыткаў у групе вытворчасці спажывецкіх тавараў і стымулюе прадпрыемствы павялічваць сваю вытворчасць.

Застаюцца наступныя пытанні: чаму існуе лішак інвестыцыяў і чаму пашырэнне вытворчасці не адбываецца ўвесь час? На першае пытанне Кейнс адказаў вельмі хутка:

"Адбываецца нейкая з'ява неграшовага характару, што павялічвае прыцягальны характар інвеставання. Гэта можа быць новая вынаходка або развіццё новай краіны, або вайна, або вяртанне да стану "даверу ў эканамічнай дзейнасці", які стаўся вынікам шматлікіх дробных уплываў у адным кірунку"[2].

Яшчэ раз закранаецца пытанне замежных рынкаў збыту (бо гаворка ідзе аб "развіцці новай краіны"), але Кейнс не засяроджваўся на гэтай праблеме і ніколі не разглядаў яе як асноватворную.

[1] *Ibid., p. 173.*
[2] *Ibid., p. 302.*

Спыненне ж пашырэння вытворчасці Кейнс вытлумачвае на падставе ідэі Афтальёна, адпаведна якой крызісы паходзяць з наступнага факта: у перыяд эканамічнага росту замаўляецца занадта шмат сродкаў вытворчасці, бо для іхнай вытворчасці патрэбны пэўны час, і на працягу гэтага часу недахоп канчатковых прадуктаў выклікае попыт на абсталяванне.

§ 3. Тэорыя занятасці

Калі пры канцы 1930 г. Кейнсам быў выдадзены *"Трактат пра грошы"*, у ЗША ўжо больш за год лютаваў крызіс; у Эўропе таксама пачыналі адчувацца ягоныя наступствы.

Перад пагрозай крызісу ў Вялікабрытаніі карэнным чынам была зменена эканамічная палітыка, як і прапаноўваў Кейнс: у 1931 г. там ажыццявілі дэвальвацыю валюты, і праз гэта крызіс у ангельцаў характарызаваўся не такімі цяжкімі, як у бальшыні іншых капіталістычных краінаў, наступствамі. Аднак у выніку гэтай дэвальвацыі, якая стымулявала ангельскі экспарт, увесь цяжар крызісу абрынуўся на астатнія краіны-экспарцёры. Надзвычай моцна закрануў ён Нямеччыну — галоўнага канкурэнта Вялікабрытаніі на сусветным рынку.

У Нямеччыне ў 1932 г. беспрацоўнымі засталіся прыкладна 50 працэнтаў работнікаў прамысловасці. Гэтае невыноснае становішча не выклікала сацыялістычнай рэвалюцыі. Ягоным вынікам стаў прыход да ўлады Адольфа Гітлера, які, маючы дарадцамі бліскучых фінансістаў, распачаў барацьбу супраць беспрацоўя, накіроўваючы ў прамысловасць замовы, аплочаныя дзяржавай. Менавіта гэты метад з 1924 г. прапаноўвалі Лойд Джордж і Кейнс, але ж, на думку нямецкіх прамыслоўцаў, грамадская праца была толькі паліятывам — простым і неабходным у дадзеным становішчы крокам. Паводле іхнага меркавання, канчаткова развязаць праблему магла толькі заваёва замежных рынкаў збыту. Гітлер выказваў глыбокае патаемнае жаданне прамыславікоў, калі сцвярджаў, што Нямеччына павінна заваяваць сабе "жыццёвую прастору". І ў далейшым ён "бліскуча" ўвасобіў фан-

тастычныя іх мары, калі распачаў усталёўваць сваё панаванне над Эўропай, а праз гэта, як ён лічыў, і над вялікай часткай народаў свету.

Да гэтага часу бальшыня заходніх эканамістаў усё яшчэ адмаўляла ролю замежных рынкаў збыту як стымулаў росту капіталістычнай эканомікі. Аднак яны ўсё часцей і часцей усведамлялі, што былыя тэзісы наконт эканамічнай раўнавагі мусяць быць перагледжаныя — у прыватнасці, належала больш глыбока даследваць праблему беспрацоўя.

У чэрвені 1931 г. у брытанскім часопісе *"Economic Journal"* было надрукаванае даследванне, значэнне якога ў далейшай эвалюцыі заходняй эканамічнай думкі велізарнае. Гэта кніга *"Стасункі нацыянальных інвестыцыяў да беспрацоўя"*, аўтар якой — прафесар Кембрыджскага універсітэта Рычард Фердынанд Кан намагаўся паказаць, што інвестыцыі ў такую грамадскую працу, як пабудова шляхоў зносін, — надзвычай эфектыўны сродак ад беспрацоўя. Для гэтага ён стварыў славуты інструмент эканамічнага аналізу — *"мультыплікатар* (памнажальнік) *інвестыцыяў"*. Як сцвярджаў Кан, калі ў будаўніцтве шляхоў зносін выкарыстоўваецца яшчэ адзін дадатковы чалавек, дык адначасова павялічваюцца і размеркаваныя даходы — заробкі і прыбыткі (бо прадпрыемства, якое будуе дарогу, атрымлівае прыбыткі). Пэўная частка даходаў выдаткоўваецца на набыццё спажывецкіх тавараў. Гэтыя ж тавары павінны быць выраблены, для чаго наймаецца колькасць K дадатковай працоўнай сілы (K меншае за 1). Праз гэта ствараюцца новыя даходы, з чаго ў сваю чаргу вынікае новае выкарыстанне працоўнай сілы — K памножыць на K, ці K^2... і г. д. У канчатковым рахунку на кожнага дадатковага працоўнага, які задзейнічаны ў пабудове дарог, узнікае дадатковае выкарыстанне працоўнай сілы ва ўсіх іншых сектарах, што складае

$$K + K^2 + K^3 + K^4 \ldots, \quad \text{гэта значыць} \quad \frac{K}{1 - K}.$$

Такім чынам, калі дзяржаўныя інвестыцыі забяспечва-

юць выкарыстанне колькасці *N* працоўных, дык агульная колькасць працоўных, набраных на працу, складае

$$N\left(1 + \frac{K}{1 - K}\right) = \frac{N}{1 - K}.$$

Літара *K* азначае стасунак паміж дадатковым спажываннем і дадатковымі размеркаванымі даходамі, які пазней атрымаў найменне гранічнай схільнасці да спажывання, тым часам як выраз (1 - *K*) — гранічнай схільнасці да ашчаджання (бо даходы, якія не ідуць на спажыванне, ашчаджаюцца). Гэтым Кан паказаў, што пры пэўных умовах (а галоўная з іх — магчымасць пазбягаць павелічэння цэнаў) колькасць зноў набраных на працу рабочых дзякуючы дзяржаўным інвестыцыям, якія выклікаюць *беспасярэдні* набор *N* працоўных, будзе складаць дзель ад дзялення *N* на гранічную схільнасць да ашчаджання (гэта значыць адпавядае лічбе, большай за *N*, бо гранічная схільнасць да ашчаджання меншая за адзінку). Напрыклад, калі грамадства мае тэндэнцыю да ашчаджання 1/4 дадатковага даходу, уведзенага ў абарачэнне, дык гранічная схільнасць да ашчаджання складзе 0,25, а на *N* беспасярэдне набраных працоўных колькасць зноў набраных працоўных складзе

$$\frac{N}{0{,}25} = 4N.$$

Лічба 4, якая адпавядае 1/0,25, гэта значыць адваротна прапарцыйная ашчаджанню, пазней атрымала назоў "мультыплікатара".

Перад намі аналіз, дзе відавочна адмаўляецца натуральная тэндэнцыя да ўсталявання "раўнавагі" на рынку працы.

Аднак неакласічная школа яшчэ не склала зброі. У 1933 г. брытанскі эканаміст Пігу выдаў кнігу *"Тэорыя беспрацоўя"*, дзе абараняе тэзіс пра натуральную раўнавагу. Можна сказаць, што крытыка гэтай кнігі — зыходны пункт працы Кейнса *"Агульная тэорыя занятасці, працэнта і грошай"*. Адначасова Кейнс накіраваў сваю крытыку супраць канцэпцыі (якую

ён называў "класічнай") рынку працы Вальраса і супраць "закону рынкаў збыту" Сэя, які лічыў, што крызісы перавытворчасці не існуюць. Але Сэй адмаўляў таксама і магчымасць заўсёднага няпоўнага выкарыстання вытворчага патэнцыялу. Кейнс жа паказаў, што такое няпоўнае выкарыстанне адбываецца пры недастатковасці "рэальнага попыту", выкліканай выдаткамі прадпрыемстваў, калі яны нармальна выкарыстоўваюць свае вытворчыя магутнасці[1]. Кейнс задае пытанне: калі занятасць не вызначаецца на падставе попыту і прапановы працы, дык як жа можна растлумачыць той факт, што яна фіксуецца на тым або іншым роўні? І сам жа адказвае: ровень занятасці залежыць ад сумы інвестыцыяў, гэта значыць ад сумы набыткаў дадатковых сродкаў вытворчасці, рэалізаваных прадпрыемствамі.

Гэтая выснова грунтуецца на разважанні, развітым у *"Трактаце пра грошы"*, але ў *"Агульнай тэорыі занятасці..."* яно паўстае крышку ў іншым аспекце. Ашчаджанне, паводле Кейнса, абавязкова адпавядае інвеставанню і залежыць ад сумы агульнага даходу. Значыцца, пры пэўным інвеставанні нацыянальны даход павінны фіксавацца на такім роўні, каб ашчаджанне адпавядала інвеставанню. Але паколькі нацыянальны даход абумоўлены занятасцю працоўнай сілы, дык ровень занятасці вызначаецца праз той жа самы працэс. Ён залежыць ад інвеставання і неабавязкова адпавядае поўнай занятасці.

У гэтым творы Кейнса назіраецца пэўная цьмянасць, бо аўтар адкідвае зробленае ім жа раней адрозненне паміж нармальным і эфектыўным ашчаджаннем. Сапраўды, каб зразумець *"Агульную тэорыю занятасці..."*, варта насуперак меркаванню самога Кейнса аднавіць убачанае ім адрозненне.

Калі не зважаць на ваганні колькасці грошай у абарачэнні, гэта значыць тэзаўрацыю або дэтэзаўрацыю, дык *эфектыўнае* ашчаджанне заўсёды будзе адпавядаць інвес-

[1] *Варта адзначыць, што праблема, якую разглядаў Кейнс, — гэта праблема беспрацоўя, выкліканага неаднолькавым выкарыстаннем вытворчых магутнасцяў, а не беспрацоўя, выкліканага недастатковасцю даступнага капіталу.*

таванню[1]. Сапраўдная ж раўнавага назіраецца толькі ў той момант, калі і *нармальнае* ашчаджанне будзе роўнае інвеставанню. Тады назіраецца пэўны ровень вытворчасці і занятасці. Але нішто не гарантуе, што дадзены ровень занятасці будзе цалкам адпавядаць поўнаму выкарыстанню вытворчых магутнасцяў прадпрыемстваў або поўнаму выкарыстанню працоўнай сілы. Калі інвеставанне параўнальна са схільнасцю да ашчаджання недастатковае, тады рэальная занятасць ніжэйшая за поўную. Праз гэта і ўзнікае беспрацоўе.

Такім чынам, недастатковасцю інвестыцыяў тлумачыцца ўжо не эканамічная дэпрэсія, а беспрацоўе[2]. Безумоўна, дэпрэсія выклікае беспрацоўе і наадварот. Тут Кейнс хацеў вытлумачыць *заўсёднае* беспрацоўе — феномен, які існуе нават і ў перыяды эканамічнага ўздыму: напрыклад у Англельшчыне — у 1921—1929 гг. і ў Амэрыцы — у 1933—1939 гг.

Калі заўсёднае беспрацоўе паходзіць ад недастатковага інвеставання, нават у перыяд эканамічнага ўздыму, дык адкуль жа тады паходзіць недастатковае інвеставанне? Пры адказе на гэтае пытанне Кейнс намагаўся выпрацаваць тэорыю вызначэння інвестыцыяў. Прадпрыемствы, на яго думку, інвестуюць грошы ў нейкія справы, як толькі гранічная прадукцыйнасць капіталу перавышае норму працэнта. Перад намі аналіз, блізкі да аналізу Вальраса. У прыватнасці, Кейнс дапускаў, што прадпрымальнікі бяруць у пазыку ўсю сукупнасць капіталу, які яны інвестуюць.

Тым не менш Кейнс не мог цалкам пагадзіцца з неакласічным аналізам вызначэння інвестыцыяў, паводле якога норма працэнта — гэта адзіны рэгулятар, што забяспечвае поўнае інвеставанне ашчаджанняў, аналізам, які паказвае, што ніколі не можа быць занадта шмат ашчаджанняў. Кейнс, які ўсю сваю тэорыю занятасці пабудаваў на адмаўленні гэтага рэгуляцыйнага механізму, і цяпер ніяк не мог звярнуцца да яго. Тады ён палічыў неабходным сцвярджаць, што норма працэнта залежыць ад колькасці грошай у абарачэнні, а не ад сумы ашчаджанняў.

---

[1] *У сапраўднасці ж Кейнс улічваў і ваганне колькасці грошай, якое трактаваў як інвеставанне або неінвеставанне.*

[2] *У "Агульнай тэорыі занятасці..." ёсць раздзел пра эканамічны цыкл.*

Такім чынам, мы маем тэорыю, паводле якой інвестыцыі залежаць ад двух розных фактараў: ад гранічнай прадукцыйнасці капіталу, гэта значыць рэнтабельнасці ад дадатковых капіталаў, інвеставаных на працягу пэўнага перыяду часу, і ад нормы працэнта — па сутнасці грашовага феномену. Інвестыцыі вельмі слабыя, а беспрацоўе значнае найперш таму, што прыбытковасць дадатковых капіталаў меншая, чым раней. Кейнс прызнаваў гэта і сцвярджаў:

"На працягу XIX ст. павелічэння колькасці насельніцтва і вынаходак, ступені асваення новых краінаў, пэўнага стану даверу і часціні войнаў (калі разглядаць сярэдні вынік дзесяцігоддзяў), здаецца, было дастаткова, каб у спалучэнні з тагачаснай схільнасцю да спажывання падтрымліваць такі графік гранічнай эфектыўнасці капіталу, які больш-менш прымальнаму роўню занятасці дазваляў быць сумяшчальным з нормай працэнта, даволі высокай, каб псіхалагічна задавальняць трымальнікаў багацця... Цяпер жа (і, без сумневу, гэтак жа сама будзе ў будучыні) крывая маржынальнай эфектыўнасці капіталу з многіх прычынаў ніжэйшая, чым у XIX ст."[1]

Зноў мы трапляем на глебу аналізу канкрэтных гістарычных акалічнасцяў, якія забяспечылі ўздым капіталістычнай эканомікі. Адчуваецца нават, што даследнік даволі павярхоўна, але ўсё ж такі падкрэсліваў ролю замежных рынкаў у гэтым працэсе. Аднак гэтаксама, як і ў *"Трактаце пра грошы"*, Кейнс устрымліваўся ад далейшага развіцця сваёй тэорыі.

Калі ж даследнік пераходзіць да пытання пра норму працэнта, то тут ужо назіраецца адваротнае. Аўтар *"Агульнай тэорыі занятасці..."* прысвячае цэлы раздзел паказу таго, чаму "перавага на карысць ліквіднасці", або жаданне мець наяўныя грошы, падтрымлівае занадта высокую норму працэнта. Тут ужо нам вельмі далёка да канкрэтнай гісторыі капіталізму. Папраўдзе кажучы, Кейнсава тэорыя працэнта дала яму ў канчатковым выніку падставу адмаўляць той відавочны факт, што для капіталізму характэрна асноватворная патрэба ў заваёве вонкавых рынкаў.

Да 1914 г. норма працэнта, паводле Кейнса, залежала ад запасу золата ў кожнай краіне, а прыток золата залежаў ад развіцця экспарту. Такім чынам, буйныя індустрыяльныя

[1] *Ibid., pp. 323–324.*

дзяржавы жадалі заваёвы вонкавых рынкаў менавіта для павелічэння грашовага запасу і паніжэння нормы працэнта. Кейнс пісаў:

"Пры эканоміцы, падпарадкаванай грашовым кантрактам і большменш стабільным звычкам, калі нутраныя запасы грошай і норма працэнта залежаць галоўным чынам ад плацежнага балансу, як гэта было да вайны, дзяржаўныя органы ўлады маюць у сваім распараджэнні толькі адзін агульнапрыняты сродак барацьбы з беспрацоўем — гэта стварэнне лішку экспарту і імпарт каштоўнага металу за кошт суседніх народаў. Ніколі яшчэ на працягу гісторыі не вынаходзілі больш эфектыўнай сістэмы для сутыкнення інтарэсаў разнастайных народаў, чым сістэма залатога стандарту або (раней) сістэма сярэбранага міжнароднага стандарту. Сапраўды, у гэтай сістэме нутраны дабрабыт кожнай краіны наўпрост залежыць ад выніку змагання за валоданне рынкамі і задавальненне патрэбаў у каштоўных металах"[1].

Выснова, якую Кейнс неўзабаве сфармуляваў больш выразна[2], была наступная: скасаванне залатога стандарту спыніць барацьбу за рынкі збыту, а значыцца, і эканамічныя прычыны войнаў. Гэта вельмі арыгінальны спосаб развязання разгляданай праблемы. Але, на жаль, тэзіс Кейнса цалкам памылковы. Нават павярхоўнае вывучэнне фактаў паказвае, што крыніца спаборніцтва паміж буйнымі індустрыяльнымі дзяржавамі — гэта не жаданне забяспечыць сябе золатам, а патрэба знайсці рынкі, дзе можна было б прадаць прамысловыя тавары і ўкласці капіталы. У канчатковым выніку ў *"Агульнай тэорыі занятасці..."* няма дакладнага пераліку фактараў, якія выклікалі масавае беспрацоўе ў капіталістычным свеце ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі.

І вось менавіта на глебе такога недакладнага аналізу беспрацоўя Кейнс распачынае фармуляваць практычныя прапановы, накіраваныя на забеспячэнне поўнай занятасці. Перш за ўсё ён патрабаваў ажыццявіць, наколькі гэта магчыма, паніжэнне нормы працэнта. Ён лічыў, што такога паніжэння можна дасягнуць праз больш ліберальную палітыку ў галіне грашовай эмісіі. Аднак, на яго думку, адным гэтым спосабам нельга забяспечыць дастатковы ровень

[1] *Ibid., p. 362. Варта адзначыць, што ідэя Кейнса вельмі блізкая да тэзісаў меркантылістаў былых часоў.*

[2] *Ibid., p. 395.*

прыватнага інвеставання. Трэба, каб дзяржава пашырала свае інвестыцыі. Каб паказаць, якім чынам дзяржаўныя інвестыцыі могуць хутка павялічыць занятасць, Кейнс звяртаецца да тэорыі Кана наконт мультыплікатара[1].

Але як ажыццявіць фінансаванне гэтых інвестыцыяў без небяспечнага паглыблення дэфіцыту дзяржаўных фінансаў? Безумоўна, Кейнс бачыў, што тут існуе вялікая праблема, і тым не менш устрымаўся ад сапраўднага яе аналізу. Пры канцы свайго даследвання ён аптымістычна заявіў:

"Што да прытоку інвестыцыяў, дык малаверагодна, што ўплыву банкаўскай палітыкі на норму працэнта дастаткова, каб давесці яе (норму) да аптымальнага роўню. Мы лічым таксама, што даволі шырокая сацыялізацыя інвестыцыяў — адзіны сродак прыблізнага забеспячэння поўнай занятасці. Аднак гэта не азначае, што неабходна выключыць усялякія кампрамісы і формулы, якія дазваляюць дзяржаве супрацоўнічаць з прыватнай ініцыятывай. Акрамя таго, няма ніякай відавочнай нагоды, якая апраўдвала б дзяржаўны сацыялізм, што ахоплівае найвялікшую частку эканамічнага жыцця грамадства. Калі дзяржава здольная вызначыць агульны ровень рэсурсаў, прысвечаных павелічэнню гэтых сродкаў, і базавы працэнт аплаты, прызначанай іхным трымальнікам, тады яна здзейсніць усё неабходнае"[2].

Вось такім чынам праблему беспрацоўя можна развязаць без прымусовага пераходу да калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

З другога боку, Кейнс сцвярджаў, што паніжэнне нормы працэнта дазволіць правесці глыбокую трансфармацыю эканамічнага ладу, зліквідаваўшы клас ранцье[3], што, на ягоную думку, знішчыць празмерную няроўнасць даходаў, якую ён разглядаў як адну з "дзвюх істотных заганаў эканамічнага ладу" (другая загана — існаванне беспрацоўя). Такое далучэнне да вельмі "старой" тэорыі пераўтварэння эканамічна-

---

[1] *Роўні занятасці і нацыянальнага даходу залежаць ад сумы інвестыцыяў. Кейнс пісаў, што ўсялякае павелічэнне інвеставання стварае дадатковы нацыянальны даход, сума якога складае дзель ад дзялення інвестыцыяў на гранічную схільнасць да ашчаджання. Сапраўды, калі інвеставанне павялічваецца на ΔI, дык нармальнае ашчаджанне мусіць павялічыцца на суму ΔE. Але калі ашчаджаецца частка α дадатковых даходаў, дык ашчаджанне павялічыцца на ΔE, тым часам як нацыянальны даход павялічыцца на $\Delta E/\alpha$. Такім чынам, дадатковае інвеставанне ΔI выкліча ўзнікненне дадатковага нацыянальнага даходу $\Delta I/\alpha$ або $\Delta I \cdot 1/\alpha$, дзе выраз $1/\alpha$ — "мультыплікатар інвестыцыяў".*

[2] *Ibid., pp. 391–392.*

[3] *Ibid., p. 390.*

га і сацыяльнага ладу праз "бясплатны крэдыт" і абумовіла часам маларэалістычны характар асобных высноваў Кейнса. Ва ўсялякім разе варта адзначыць, што распаўсюджванне ягоных ідэяў у заходніх краінах актывізавала стаўленне іх урадаў да эканамічных праблемаў. У выніку гэтага на Захадзе вельмі шырока пачалі развівацца статыстычныя, уліковыя і імавернасныя метады эканамічнага аналізу[1].

Бібліяграфія

Дзеля таго што асноўныя творы Кейнса, асабліва *"Агульная тэорыя занятасці..."*, не зусім даступныя для разумення, надзвычай карысна пры іх вывучэнні карыстацца якім-небудзь каментаром. З тых каментароў, якія былі выдадзеныя ў Вялікабрытаніі і ЗША — і часта непасрэднымі вучнямі Кейнса, — мы прапануем наступныя:

L. R. Klein, *The keynesian Revolution*, New York, 1949.

A. H. Hansen, *A guide to Keynes*, New York, 1953.

D. Dillard, *The economics of John Maynard Keynes*, New York, 1948.

J. Robinson, *Introduction à la théorie de l'emploi*, trad. franç., Paris, 1948.

S. E. Harris, *The new economics*, New York, 1948.

H. S. Ellis, *Survey of contemporary economics*, Philadelphie, 1949.

Shackle, *Ten years of high theory*, Cambridge, 1967.

Кніга ж R. F. Harrod, *The life of John Maynard Keynes* (New York, 1951) — адначасова вартае ўвагі даследванне і біяграфічны нарыс.

[1] *Імпульс да распрацоўкі дэталёвага "нацыянальнага ўліку" ў эканоміцы быў нададзены ў 1938 г. брытанскім эканамістам Рычардам Стоўнам.*

ЧАСТКА ВОСЬМАЯ



СУЧАСНЫЯ КІРУНКІ Ў ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМЦЫ

Падзеі, якія мы перажылі пачынаючы з канца Другой сусветнай вайны, занадта вядомыя, каб пераказваць іх. Дастаткова коратка прапанаваць вынік — безумоўна, вельмі часовы — нядаўняй эканамічнай эвалюцыі ва ўсіх рэгіёнах свету.

Перш за ўсё ў перыяд 1945—1974 гг. у індустрыяльных краінах Захаду надзіва раўнамерна пашыралася вытворчасць. І хоць пазней гэты працэс значна запаволіўся, тым не менш перыядаў масавай перавытворчасці, якімі раней была пазначаная гісторыя капіталізму, больш не назіралася. Гэта тлумачыцца тым, што пад уплывам ідэяў Кейнса паводзіны ўрадаў заходніх краінаў карэнным чынам змяніліся. Калі ёсць пагроза рэцэсіі, урады больш не імкнуцца скарачаць свае выдаткі: каб "захаваць кан'юнктуру", яны хутчэй павялічваюць іх.

Найвялікшая падзея сучаснай эпохі — разбурэнне сістэмы планавай эканомікі ў краінах Усходняй Эўропы. За колькі месяцаў пасля паўстання грамадзянаў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якое прывяло да знішчэння "берлінскае сцяны" (лістапад 1989 г.), зруйнаваліся цэнтральнаэўрапейскія рэжымы народнай дэмакратыі, а палітыкі, якія прыйшлі замест былых кіраўнікоў, наважыліся вярнуцца да рынкавай эканомікі. Нават самі кіраўнікі Савецкага Саюза вуснамі М. Гарбачова мусілі сцвярджаць, што яны імкнуцца глыбока трансфармаваць эканамічную сістэму сваёй краіны, каб значнае месца ў ёй належала рынку. І сёння, здаецца, глыбокі крызіс, які распачаўся ў СССР, можа быць пераадолены не іначай, як праз адмову ад калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці ва ўсіх краінах Усходняй Эўропы.

Адно з найбольш значных наступстваў паразы практыкі сацыялістычнага планавання — новая арыентацыя, якую абралі краіны "трэцяга свету". Для гэтых краінаў, якія часта

бяднеюць ад занадта імклівага павелічэння колькасці насельніцтва, савецкая сістэма ўжо не ўяўляецца панацэяй у развязанні іншых праблемаў. У слабаразвітых рэгіёнах Зямлі кіраўнікі ўрадаў, якія яшчэ ўчора абвяшчалі сябе прыхільнікамі марксізму, усё часцей і часцей саступаюць месца тым людзям, якія выказваюць рашучасць ісці па шляху развіцця эканомікі капіталістычнага тыпу. Зразумела, нельга сцвярджаць, што ў выніку краіны "трэцяга свету" хутка пазбавяцца ад праблемаў масавай галечы. Індустрыялізацыя гэтых краінаў абавязкова запатрабуе шмат часу, і з другога боку, аніякага істотнага паляпшэння дабрабыту насельніцтва там не адбудзецца, пакуль значна не паменшыцца ровень нараджальнасці.

Перад пагрозай узрушэнняў, якія адбываюцца сёння ў сусветным маштабе, спрэчкі, што разгарнуліся ў апошнія пяцьдзесят гадоў паміж эканамістамі, падаюцца часам даволі дробязнымі. Аднак паспрабуем даць тут кароткі агляд гэтых дыскусіяў.

Раздзел I

ЭКАНАМІЧНЫ АНАЛІЗ У ЗАХОДНІХ КРАІНАХ

Без сумневу, найбольш трапная характарыстыка эканамічных даследванняў у заходніх краінах пасля Другой сусветнай вайны — досыць усеагульная і, прынамсі, звонку бачная тэндэнцыя да "палітычнай незаангажаванасці". Дыскусіі ўсё больш і больш набываюць выключна тэхнічны характар. Часткова гэта адбываецца праз пашырэнне жадання дастасоўваць да эканамічнага аналізу ўсё больш і больш вытанчаныя матэматычныя метады. Адным словам, існуе тэндэнцыя да знікнення ўсялякіх "дактрынаў" на карысць "чыстай тэорыі".

Аднак такая "чыстая тэорыя" змяшчае ў сабе ў пэўнай ступені абарону эканамічнага лібералізму, паколькі імкнецца з найбольшай дакладнасцю паказаць, што "натуральныя эканамічныя законы" існуюць. Але няма ўпэўненасці, што такія спробы, накіраваныя на набліжэнне эканамічнага аналізу да дакладных навук — найлепшы сродак аспрэчваць ідэю, што адзяржаўленне эканомікі прывядзе да росквіту і дабрабыту ўсе народы. З гэтага гледзішча гістарычны досвед сучаснай планавай эканомікі відавочна найбольш красамоўны. Такім чынам, трэба перасцерагацца таго, каб эканамісты, усё часцей і часцей аддаляючыся ад вывучэння фактаў, не звузілі значэння сваёй дысцыпліны замест таго, каб пашыраць яго.

§ 1. Развіццё Кейнсава аналізу

Шмат нядаўніх спробаў у галіне развіцця эканамічнай тэорыі грунтаваліся на "макраэканамічным" метадзе Кейнса. Агульнапрызнаная слушнасць тэорыі роўнасці паміж інвеставаннем і нармальным ашчаджаннем (або *ex ante*) дае падставу развіваць яе па двух асноўных кірунках. Па-першае, існуюць спробы падрабязна разглядзець і ўлічыць развіццё "эканамічнага цыкла"; па-другое, робяцца намаганні вытлумачыць хаду капіталістычнай эканомікі на працягу доўгага перыяду часу, гэта значыць яе "доўгатэрміновы рост".

А) Матэматычныя мадэлі эканамічнага цыкла

Вышэй мы бачылі, што ў "агульнай тэорыі" Кейнса праблема эканамічнага цыкла закраналася толькі як дапаможны сродак. Але пасля выхаду ў свет ягонай кнігі з'явілася шмат даследванняў, дзе аўтары імкнуліся выкарыстоўваць аналітычныя падыходы Кейнса для таго, каб пабудаваць "мадэль" эвалюцыі рынкавай эканомікі — мадэль, у якой дакладна маглі б быць вызначаны прычыны перыядычных крызісаў перавытворчасці (або "рэцэсіі", як прынята гаварыць сёння). Лічыцца, што праз гэта магчыма было б умешвацца ў эканоміку не толькі з мэтай пошуку лекаў ад крызісаў, але і для таго, каб перашкодзіць іхнаму ўзнікненню.

1. МАДЭЛІ М. КАЛЕЦКАГА. Адна з першых матэматычных мадэляў, пабудаваных з мэтай вытлумачэння эканамічнага цыкла, — мадэль польскага эканаміста Міхала Калецкага. Упершыню яна была апублікаваная ў 1933 г. у польскім часопісе[1], потым у 1935 г. у французскім *"Revue d'économie politique"*, а таксама ў амэрыканскім часопісе *"Econometrica"*. Тая ж мадэль (толькі з пэўнымі мадыфікацыямі) і ў пазнейшых творах аўтара: *"Даследванні тэорыі эканамічных ваганняў"*[2], *"Даследванні эканамічнай дынамікі"*[3], *"Тэорыя эканамічнай дынамікі"*[4].

Калецкі сцвярджаў, што інвеставанне залежыць ад чаканай нормы прыбытку, а тая ў сваю чаргу — ад пабежнай нормы прыбытку. Ён пісаў: "Чым большы P (прыбытак) і чым менш наяўнага капітальнага абсталявання, тым большая будзе чаканая норма прыбыткаў ад новых інвестыцыяў"[5].

Калецкі, грунтуючыся на тэорыі мультыплікатара, паказаў, што прыбыткі залежаць ад інвестыцыяў, бо ашчаджанне капіталістаў павінна быць роўнае інвеставанню і патрэбен пэўны ровень прыбыткаў, каб забяспечыць адпаведныя ашчаджанні[6].

[1] *Часопіс "Proba Teorij Konjunctury", які выдаваўся ў Варшаве.*
[2] *Studies in the theory of economic fluctuations, London, 1939.*
[3] *Studies in economic dynamics, London, 1943.*
[4] *Theory of economic dynamics, London, 1954; Traduction française. Paris, 1966.*
[5] *Studies in economic dynamics, op. cit., p. 63.*
[6] *Аўтар, называючы B прыбыткам, C — капіталістычным спажываннем, I — чыстымі*

Нарэшце, Калецкі сцвярджаў, што капітальнае абсталяванне залежыць ад інвестыцыяў, зробленых у папярэдні перыяд часу. У залежнасці ад таго, ці ровень валавых інвестыцыяў ніжэйшы, аднолькавы або большы за ровень, неабходны для аднаўлення абсталявання (аўтар дапускаў, што гэтая велічыня можа лічыцца нязменнай на працягу разгортвання аднаго цыкла), вартасць абсталявання паменшыцца, застанецца ранейшая або павялічыцца.

На такой глебе будуецца наступнае раўнанне, дзе I — чыстыя інвестыцыі, ε, ϵ і κ — пэўныя прамежкі часу, а a, b, c і λ — зададзеныя велічыні:

$$\frac{dI_{t+\varepsilon+\kappa}}{dt} = \frac{a}{2\epsilon(1-\lambda)} \cdot \frac{dI_t}{dt} - \frac{b+c}{2\epsilon} I_{t+\kappa}.$$

"Гэтае раўнанне, — пісаў аўтар, — паказвае, што дзеля дадзенай вартасці a цяперашнія змены ў інвестыцыях выклікаюць прапарцыйныя змены (у інвестыцыях) пасля пэўнага прамежку часу $\epsilon+\kappa$, змены, якія, аднак, будуць запаволеныя пазітыўным роўнем (чыстых) інвестыцыяў I у прамежкавы перыяд... У той жа час гэтыя змены будуць больш акрэсленыя, калі пазначаныя інвестыцыі адмоўныя"[1].

У падмурак дадзенага вытлумачэння закладзена ідэя Альбэра Афтальёна наконт ролі часу, неабходнага для пабудовы абсталявання. Калецкі спалучаў яе з класічнай ідэяй

інвестыцыямі, дапускае, што капіталістычнае спажыванне складаецца з нязменнага спажывання C_1 і зменлівага спажывання λB. Такім чынам, мы маем

$$B = C_1 + \lambda B + I$$

ці

$$B = \frac{C_1 + I}{1 - \lambda}.$$

У пазнейшыя рэдакцыі мадэлі даследнік увёў азначэнне "прамежак часу", і прыбыткі, такім чынам, сталі залежаць ад інвестыцыяў, зробленых у папярэдні перыяд. Тут мы маем аналіз, блізкі да аналізу "мультыплікатара інвестыцыяў", зробленага Канам, а потым і вучнямі Кейнса. Але насуперак ім Калецкі сцвярджаў, што ашчаджаюць толькі капіталісты. І наагул, паводле яго думкі, схільнасць да ашчаджання — гэта стасунак паміж ашчаджаннем і прыбыткам. Акрамя таго, паколькі Калецкі дапускаў, што капіталістычнае спажыванне падзяляецца на сталую яго частку і частку, прапарцыйную прыбытку, дык атрымаў формулу, больш складаную, чым звычайная формула мультыплікатара.

Калі дапускаць, што $B = \lambda B + I$, дык атрымаем $B = I/(1 - \lambda)$. Такім чынам, прыбытак складае дзель ад дзялення інвестыцыяў на схільнасць да спажывання $(1 - \lambda)$, што адпавядае тэорыі мультыплікатара.

[1] *Studies in Economic Dynamics, op. cit., p. 69.*

пра ўплыў нормы прыбытку на інвеставанне і з тэорыяй мультыплікатара інвестыцыяў. Дарэчы, аўтар выкладваў усё гэта вельмі дакладна.

2. МАДЭЛІ ГЭНСЭНА І СЭМУЭЛЬСАНА. Неўзабаве пасля публікацыі першых працаў Калецкага амэрыканскі эканаміст Элвін Г. Гэнсэн выказаў думку, якая ў справе тлумачэння эканамічнага цыкла спалучала ў сабе дзеянне мультыплікатара Кана і прынцыпу паскарэння Дж. М. Кларка, пакідаючы ўбаку тэзіс наконт часу пабудовы капітальнага абсталявання[1].

Гэнсэн, таксама як і Калецкі, выкарыстоўваў тэорыю мультыплікатара, уводзячы пэўны прамежак часу паміж момантам, калі ствараецца даход, і момантам, калі павялічваецца спажыванне. Інвестыцыі, на яго думку, набываюць тэндэнцыю выклікаць павелічэнне нацыянальнага даходу, роўнае n разоў іхнай сумы. Але гэтае павелічэнне адбываецца паступова і толькі тады, калі інвеставанне няспынна аднаўляецца ў кожны прамежак часу. На працягу часу, неабходнага для ажыццяўлення названага працэсу, спажыванне ў кожным перыядзе залежыць ад даходу папярэдняга перыяду[2].

Прапановы былі перанятыя амэрыканскім эканамістам Полам А. Сэмуэльсанам. Ён у кароткім артыкуле *"Узаемадачыненні паміж аналізам на падставе мультыплікатара і прынцыпам паскарэння"*[3] вылучыў новае раўнанне, якое, на яго думку, можа забяспечыць тлумачэнне эканамічнага цыкла:

$$Y_n = \alpha Y_{n-1} + \beta(Y_{n-1} - Y_{n-2}) + An,$$

дзе Y — нацыянальны даход у перыяды n-2, n-1 або n; A — "аўтаномныя" інвестыцыі; $\beta(Y_{n-1} - Y_{n-2})$ — інвестыцыі, "уведзеныя" ў перыяд n, гэта значыць інвестыцыі, выкліканыя павелічэннем нацыянальнага даходу, якое адбылося ад перыяду n-2 да перыяду n-1; αY_{n-1} — спажыванне на працягу перыяду n.

---

[1] *Гл. Harrod on the trade cycle // Quarterly Journal of Economics, pp. 509–531, t. 51; 1936–1937; даследванне было паўторана ў кнізе дадзенага аўтара "Full Recovery or stagnation", New York, 1938.*

[2] *Гл. на гэты конт вельмі падрабязнае даследванне Гэнсэна. Business cycles and National Income, New York, 1951, pp. 156–160.*

[3] *Гл. The Review of Economie Statistics, mai 1939, pp. 75–78.*

Такім чынам, раўнанне азначае, што нацыянальны даход перыяду *n* — гэта спажыванне у перыяд *n* плюс сукупныя інвестыцыі. Яны вызначаюцца на падставе папярэдняга роўню і зменаў нацыянальнага даходу.

Калі пазначыць, што спажыванне перыяду *n* складае αY_{n-1}, дык паўстае ідэя "дынамічнага" паказу мультыплікатара, выказаная Гэнсэнам: спажыванне кожнага перыяду залежыць ад даходу папярэдняга перыяду. Дарэчы, відаць, што інвестыцыі перыяду *n* складаюцца з дзвюх частак: нязменнай часткі *An* і часткі, якая залежыць ад роўню павелічэння нацыянальнага даходу ад перыяду *n*-2 да перыяду *n*-1. Перад намі скарыстанне на практыцы ідэі паскарэння (акселерацыі) Кларка.

Развязанне раўнання паказвае, што для вызначаных вартасцяў α і β стабільныя ўрадавыя выдаткі абумоўліваюць існаванне такой часткі нацыянальнага даходу, сума якога заўсёды вагаецца.

Згодна з дадзеным аналізам, нацыянальны даход павялічваецца пад час перыяду росквіту, бо інвестыцыі стымулююцца папярэднім павелічэннем нацыянальнага даходу. Але паколькі рытм павелічэння не захоўваецца, інвестыцыі памяншаюцца, што спачатку выклікае спыненне гэтага павелічэння, а потым і памяншэнне нацыянальнага даходу.

Мадэль Сэмуэльсана была выкарыстаная ангельскім эканамістам Дж. Р. Гіксам у ягонай кнізе *"Уклад у тэорыю эканамічнага цыкла"*[1]. Гікс вылучыў яшчэ такую ідэю: амплітуда ваганняў у эканоміцы абмяжоўваецца існаваннем "бар'еру", які стварае поўная занятасць працоўнай сілы. Нарэшце, ён звярнуўся да ранейшага — манетарнага вытлумачэння эканамічнага цыкла (мы ўжо сустракалі яго ў Гоўтры)[2].

Матэматычныя мадэлі, на думку Гікса, ніколі не адлюстроўваюць такой характэрнай з'явы эканамічнага цыкла, як ваганні цэнаў на тавары. Каб зразумець гэты факт, выказваецца наступнае меркаванне: у перыяд росквіту з прычы-

[1] *A contribution to the theory of the trade cycle, Oxford, 1950.*
[2] *Гл. вышэй, с. 621.*

ны банкаўскага капіталаўтварэння інвестыцыі перавышаюць ашчаджанні, што і выклікае павелічэнне цэнаў. Аднак праз пэўны час скарачэнне каэфіцыентаў ліквіднасці банкаў вымушае іх падвышаць працэнтную стаўку, што адмоўна ўздзейнічае на інвеставанне, ровень якога падае ніжэй за ровень ашчаджання. Праз гэта вытворчасць звужаецца і цэны паніжаюцца[1].

3. АБМЕЖАВАНАСЦЬ РАЗГЛЯДАНАГА МЕТАДУ. Працы, якія мы толькі што сцісла рэзюмавалі, забяспечылі вызначальны прагрэс у нашым веданні законаў капіталістычнай эканомікі. У гэтых даследваннях эканамічныя ваганні і крызісы тлумачацца тым, што інвестыцыі выклікаюць павелічэнне даходаў і попыту на тавары, а павелічэнне ў сваю чаргу выклікае інвестыцыі. І абодва працэсы для свайго ажыццяўлення вымагаюць пэўнага часу. Наяўнасць гэтага часу садзейнічае таму, што рух эканомікі наперад, які на працягу пэўнага перыяду падтрымліваецца сам па сабе, выклікае змены ў кан'юнктуры.

Можа, гэты важны навуковы здабытак быў атрыманы і занадта позна, бо цяпер змены ў кан'юнктуры вельмі адрозніваліся ад тых, якія назіраліся ў XIX ст. Але такі падыход да названых даследванняў апраўданы толькі ў пэўнай ступені, бо чыннікі, якія выклікалі эканамічныя цыклы раней, яшчэ не зніклі. Проста іхнае ўздзеянне прыпыняецца праз вельмі эфектыўнае ўмяшанне органаў дзяржаўнай улады.

Такім чынам, яшчэ і сёння ёсць падставы развіваць тэорыю эканамічных цыклаў. Тыя, хто прысвяціў сябе развязанню гэтай праблемы, жадаюць забяспечыць больш дасканалае веданне эканамічнай кан'юнктуры. Але амаль няма ўпэўненасці ў тым, што ў іх гэта атрымаецца. Ці здолеюць яны прапанаваць належныя сродкі зліквідавання адначасова з крызісамі і тэндэнцыі да інфляцыі, якая самым небяспечным чынам праўляецца ва ўсіх заходніх краінах?

Без сумневу, значэнне сучаснай тэорыі эканамічных цыклаў даволі абмежаванае. Па сваёй прыродзе выкарыстаныя

[1] *Op. cit., chap. XI. Гэты аналіз абапіраецца на тэзіс Кейнса (пазней аспрэчваўся), адпаведна якому ровень інвестыцыяў шчыльна звязаны з працэнтнай стаўкай, бо ён залежыць ад розніцы паміж гэтай нормай і гранічнай прадукцыйнасцю капіталу.*

ёю матэматычныя мадэлі прапаноўваюць выключна "эндагенныя" тлумачэнні эканамічнай эвалюцыі, якія кожную фазу эвалюцыі разглядаюць на падставе папярэдняй фазы і так да бясконцасці, не зважаючы пры гэтым на ніякі "вонкавы" фактар[1].

Крытыкуючы мадэль Калецкага, Ёзэф Шумпэтэр іранічна казаў, што, згодна з гэтай мадэллю, феномен эканамічнага цыкла патрабуе першапачатковага імпульсу — нейкага ўзрушэння, якое, напрыклад, адбылося б "у вытворчасці яблыкаў пад час знаходжання Адама і Евы ў раі"[2]. Безумоўна, гэтая крытыка скіраваная супраць тых тэарэтыкаў, якія забыліся пра тое, што эканамічныя з'явы — частка гісторыі народаў і матэматычны метад не забяспечвае ўсеагульнага вытлумачэння гісторыі.

Б) Тэорыя доўгатэрміновага эканамічнага росту

Прадстаўнікі сучаснай эканамічнай думкі шчыльна спалучаюць пагрозу рэцэсіяў з пагрозай, якую ўяўляе павольны сярэдні рытм эканамічнага ўздыму на працягу доўгага перыяду. Гэтая праблема была паказана яшчэ да Другой сусветнай вайны амэрыканскім эканамістам Элвінам Гарві Гэнсэнам, даследванні якога мы коратка разглядалі раней[3]. Гэты эканаміст у 1938 г. выявіў пагрозу эканамічнай стагнацыі, якая, паводле ягонага меркавання, абавязкова выкліча масавае беспрацоўе. Прадказанне Гэнсэна не пацвердзілася адразу ж, бо пачынаючы з канца Другой сусветнай вайны і да сярэдзіны 70-х гадоў у Эўропе была забяспечана поўная занятасць насельніцтва. Аднак з сярэдзіны 70-х гадоў праблема беспрацоўя паўстала зноў. Праблема рытму

---

[1] *Крыху іншае стаўленне да гэтых праблемаў у вядомым даследванні шведскага эканаміста Рагнара Фрыша "Propagation problems and impulse in Dynamic Economics" // Economic Essays in honour of Gustav Cassel, London, 1933, pp. 171–205). Зацвердзіўшы на падставе матэматычнай мадэлі, што амплітуда паслядоўных эканамічных цыклаў набывае тэндэнцыю да паніжэння, аўтар даказваў: у выніку "перамежных шокаў", нададзеных эканамічнай сістэме, гэтыя цыклы будуць захоўвацца і надалей.*

Ангельскі ж эканаміст Дж. Р. Гікс, наадварот, лічыў, што матэматычная мадэль дазваляе прадбачыць нарастальную амплітуду эканамічных цыклаў, але гэтыя цыклы адбываюцца толькі ў пэўных межах, бо запасы працоўнай сілы абмежаваныя (Cf. A contribution to the theory of the trade cycle, op. cit., pp. 91–107).

[2] *Business cycles, New York, 1939, t. I, p. 187.*

[3] *Гл. вышэй, с. 609 (спасылка).*

доўгатэрміновага эканамічнага ўздыму застаецца і сёння надзённай. З гэтага часу забеспячэнне паспяховага развіцця эканомікі патрабуе няспыннага павелічэння дзяржаўных выдаткаў. Паўстае пытанне, як доўга гэты працэс будзе працягвацца.

1. РАЎНАННЕ ГЭРАДА. Пачынаючы з 1939 г.[1] ангельскі эканаміст Р. Ф. Гэрад на глебе аналізаў Кейнса выпрацоўваў тэорыю, скіраваную на фармуляванне ўмоваў "гарманічнага" росту капіталістычнай эканомікі. Гэтую тэорыю ён распрацаваў у кнізе *"На шляху да дынамічнай палітычнай эканоміі"*[2] (1948).

Гэрад праводзіў аналіз зыходзячы з наступнай формулы:

$$GC = s,$$

дзе G — ровень штогадовага павелічэння нацыянальнага даходу; C — стасунак чыстага штогадовага інвеставання да штогадовага павелічэння нацыянальнага даходу; s — нармальны ровень ашчаджання.

Нам, як і шматлікім каментатарам тэорыі Гэрада, падаецца карысным увесці ў гэты выраз тэрміны, якія адлюстроўваюць больш вядомыя велічыні. Калі праз R пазначыць нацыянальны даход, праз ΔR — ягонае штогадовае павелічэнне, праз I — штогадовыя інвестыцыі і праз E — штогадовае *нармальнае* ашчаджанне, дык атрымаецца наступнае раўнанне:

$$\frac{\Delta R}{R} \cdot \frac{I}{\Delta R} = \frac{E}{R}.$$

Разгледзеўшы раўнанне, адразу ж заўважаем, што калі яно праўдзівае, дык такое ж праўдзівае і раўнанне $I = E$. Такім чынам, Гэрад, як і Кейнс, сцвярджаў, што эканамічная раўнавага існуе толькі тады, калі паказнік інвеставання цалкам адпавядае паказніку ашчаджання. Але ў дадзеным выпадку даследнік выказаў меркаванне, што інвеставанне абумоўліваецца павелічэннем нацыянальнага даходу, тым ча-

[1] *Гл. An essay in dynamic theory // Economic Journal, 1939.*
[2] *Towards a dynamic economy. London, 1948.*

сам як ашчаджанне залежыць ад сумы нацыянальнага даходу. Затым аўтар адзначаў, што пры зададзеных велічынях $I/\Delta R$ і E/R эканамічная раўнавага патрабуе пэўнага роўню павелічэння нацыянальнага даходу.

Паводле Гэрада (наколькі можна інтэрпрэтаваць ягоную думку, якая не заўсёды цалкам зразумелая), ровень павелічэння нацыянальнага даходу вызначаецца кіраўнікамі прадпрыемстваў, і іхныя пастановы наконт гэтага не залежаць ад пастановаў у дачыненні да інвеставання і ашчаджання. Значыцца, трэба, каб рост эканомікі адбываўся паводле пэўнага рытму, але забеспячэнне пажаданага роўню гэтага ўздыму ў рынкавай эканоміцы, пакінутай сам-насам са сваімі праблемамі, вельмі нетрывалае.

2. МАДЭЛЬ ДОМАРА — ФЭЛНЭРА. У кнізе *"Тэндэнцыі і цыклы ў эканамічнай дзейнасці"* (1956)[1] амэрыканскі эканаміст Ўільям Фэлнэр прапанаваў такі аналіз эканамічнага росту, дзе выкарыстоўваецца тое ж раўнанне, што і ў аналізе Гэрада, але асабліва прыхільна ён ставіцца да даследванняў іншага амэрыканскага эканаміста Я. Д. Домара[2]. У аналізе Фэлнэра параўнальна з тэорыяй Гэрада стасунак паміж I і ΔR зменены. Інвестыцыі больш не вызначаюцца праз павелічэнне нацыянальнага даходу, але павелічэнне нацыянальнага даходу вызначаецца праз інвестыцыі. Сцвярджаецца, што раўнаважны эканамічны рост дасягаецца толькі тады, калі эфектыўна выкарыстоўваюцца наяўныя вытворчыя магутнасці. У гэтай гіпотэзе дадатак I да вытворчых магутнасцяў адпавядае пэўным дадатковым памерам эфектыўнай вытворчасці. Стасунак паміж абедзвюма гэтымі велічынямі залежыць выключна ад выкарыстання ў эканоміцы сучасных вытворчых метадаў. Велічыня $I/\Delta R$ адпавядае велічыні K/R, гэта значыць стасунку сукупнага капіталу да нацыянальнага даходу — інакш кажучы, "сярэдняму каэфіцыенту капіталу". Удакладніўшы гэта, з раўнання

[1] *Trends and cycles in economic activity. New York, 1956.*

[2] *Тэзісы Домара спачатку былі выкладзеныя ў двух наступных артыкулах: Capital expansion, rate of growth and employment // Econometrica, 1946; Expansion and employment // American Economic Review, mars, 1947. Потым яго тэорыя была распрацавана далей у працы Essays in the theory of Economic Growth, Oxford, 1957.*

$$\frac{\Delta R}{R} \cdot \frac{I}{\Delta R} = \frac{E}{R}$$

атрымаем іншае раўнанне наступнага выгляду:

$$\frac{\Delta R}{R} = \frac{E}{R} \Big/ \frac{I}{\Delta R}.$$

Згодна з гэтай формулай, калі існуе жаданне захаваць эканамічную раўнавагу, дык варта, каб кожны год нацыянальны даход павялічваўся на адзін і той жа працэнт. Калі ж каэфіцыент капіталу застаецца на адным і тым жа роўні, дык сума інвеставанага капіталу павялічваецца ў такім жа рытме, як і нацыянальны даход; і дарэчы, у нашай мадэлі павелічэнне нацыянальнага даходу — гэта толькі вынік павелічэння інвестыцыяў. Такім чынам, для Фэлнэра ў канчатковым рахунку адзіная ўмова захавання эканамічнай раўнавагі — павелічэнне інвестыцыяў па сталаму працэнту.

Гэтым сцверджаннем Фэлнэр вельмі выразна паказаў, што пазбегнуць няпоўнай занятасці вытворчых магутнасцяў у эканоміцы можна толькі тады, калі інвестыцыі і нацыянальны даход павялічваюцца ў адным пэўным рытме. Тут на глебе асноватворных ідэяў Кейнса назіраецца адхіленне ягонага тэзісу наконт магчымасці захавання капіталістычнай эканомікі ў статычным стане. Калі існуюць тыя, хто ашчаджае, павінны існаваць і інвестыцыі, а калі праз інвестыцыі павялічваюцца вытворчыя магутнасці, то павінны павялічвацца і нацыянальны даход. Капіталістычная эканоміка проста асуджана на ўздым, калі яна хоча пазбегнуць краху.

Выклаўшы такую думку, Фэлнэр не пагаджаўся наконт магчымасці захавання тэмпаў эканамічнага росту праз дзяржаўныя інвестыцыі. І ён выказваўся *супраць* Кейнса:

"Мы не падзяляем канцэпцыі, распрацаванай Кейнсам і Э. Г. Гэнсэнам, адпаведна якой эканамічныя нераўнавагі, выкліканыя хранічным істотным недахопам праектаваных інвестыцыяў, маглі б быць зліквідаваныя ў межах сістэмы прыватнага прадпрымальніцтва дзякуючы фінансаванню праз дэфіцыт бюджэту. Мы не падзяляем гэтай канцэпцыі з той прычыны, што інстытуцыі эканомікі, заснаванай на прыбытку, трацяць

сваю асноватворную функцыю, калі працэс эканамічнага росту падтрымліваецца галоўным чынам за кошт дзяржаўных інвестыцыяў"[1].

Такім чынам, Фэлнэр сцвярджаў, што раўнаважнае развіццё эканомікі залежыць ад павелічэння прыватных інвестыцыяў. Але прыватныя інвестыцыі, на яго думку, залежаць ад "гранічнай эфектыўнасці капіталу", гэта значыць ад прыбыткаў, атрыманых праз дадатковыя інвестыцыі. Гранічная эфектыўнасць капіталу імкліва паменшылася б і павелічэнне інвестыцыяў спынілася б, калі б тэхнічныя інавацыі і прагрэс у арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці няспынна не аднаўлялі і яе. Значыцца, "дынамічная раўнавага" ў канчатковым рахунку залежыць "ад здольнасці сістэмы забяспечыць дастатковую колькасць тэхнічных і арганізацыйных удасканаленняў"[2].

3. "НЕАКЛАСІЧНЫ СІНТЭЗ". У 1937 г., неўзабаве пасля выхаду ў свет *"Агульнай тэорыі занятасці..."* Кейнса, ангельскі эканаміст Дж. Р. Гікс апублікаваў даследванне *"Mr. Keynes and the classics"*[3], якое мела надзвычайны поспех. Тэарэтычныя высновы, змешчаныя ў гэтай працы, Поль А. Сэмуэльсан вызначаў у сваім падручніку як "неакласічны сінтэз", выказаўшы пры гэтым вельмі спрэчную ідэю наконт таго, што ўклад Кейнса ў эканамічную тэорыю лёгка можа інтэграваць у неакласічную сістэму"[4].

У прапанаваным аналізе Гікс заклаў дзве адрозныя залежнасці паміж працэнтнай стаўкай і нацыянальным даходам, а потым сцвердзіў, што нацыянальны даход эфектыўны тады, калі яго велічыня задавальняе абедзве гэтыя залежнасці. З аднаго боку, адзначаў аўтар, калі памяншаецца норма працэнта, дык павялічваюцца сукупныя інвестыцыі ў эканоміку, што і было паказана Кейнсам. Аднак калі павялічваюцца інвестыцыі, дык павінны таксама павялічыцца і ашчаджанні, бо трэба, каб абедзве гэтыя велічыні былі аднолькавыя. А каб павялічылася ашчаджанне, трэба, каб павялічыўся нацыянальны даход. Такім чынам, пры паніжэн-

[1] *Op. cit., p. 137.*
[2] *Ibid., p. 118.*
[3] *Econometrica, 1937.*
[4] *Economics, 7e éd., pp. 330 à 334.*

ні нормы працэнта павінны павялічыцца нацыянальны даход. Гэтая залежнасць перадаецца крывой *IS*, якая грунтуецца на адзінстве ашчаджання (*S*) і інвеставання (*I*) на прыведзеным ніжэй графіку.



З другога боку, сцвярджаў Гікс, пры павелічэнні нацыянальнага даходу павялічваецца таксама і попыт на грошы для забеспячэння пабежных аперацыяў. Значыцца, трэба, каб павялічылася колькасць наяўных грошай. А пры пэўнай сукупнай колькасці грошай гэтага можна дасягнуць толькі тады, калі памяншаецца тая іх частка, якая тэзаўруецца індывідамі. Для атрымання такога выніку дастаткова павялічыць норму працэнта, бо высокі яе паказнік штурхае індывідаў аддаваць свае грошы ў пазыку, а не захоўваць іх бяздзейнымі.

Такім чынам, пры павелічэнні нацыянальнага даходу павінна павялічыцца і норма працэнта. Новая залежнасць паміж нормай працэнта і нацыянальным даходам, адваротная першай залежнасці, на нашым графіку перадаецца крывой *LM* (*L* — ліквіднасць, а *M* — грошы).

Са сказанага вышэй зразумела, што для адначасовага задавальнення абедзвюх пазначаных залежнасцяў нацыянальны даход павінны знаходзіцца на роўні перакрыжавання абедзвюх крывых.

З дапамогай схемы Гікса, як сцвярджаў Сэмуэльсан, можна паказаць, што нацыянальны даход лёгка ўзняць да роўню, які адпавядае поўнай занятасці. Сапраўды, калі дзве нашыя залежнасці перакрыжоўваюцца ў пункце, які адпавя-

дае занадта малому, каб забяспечыць поўную занятасць працоўнай сілы, нацыянальнаму даходу, дык цэнтральны банк мусіць стварыць дадатковую колькасць грошай. Калі колькасць грошай павялічваецца, дык крывая *LM* зрушваецца ўправа, бо пры адной і той жа норме працэнта наяўных грошай для забеспячэння аперацыяў існуе больш, што адпавядае большаму нацыянальнаму даходу. Такім чынам, неакласічнай раўнавагі, якая забяспечвае поўную занятасць працоўнай сілы, можна дасягнуць, нягледзячы на тое, што норма працэнта вызначаецца паводле ўзору, пазначанага Кейнсам, а не на падставе выраўноўвання попыту і прапановы капіталу, як пра гэта сцвярджаецца ў неакласічнай тэорыі.

Мы ўзгадваем тэорыю Гікса — Сэмуэльсана таму, што і зараз яна прысутнічае бадай што ва ўсіх падручніках па "макраэканоміцы". Аднак, на нашую думку, яна ўяўляе сабой тыповы прыклад спалучэнняў такіх каўзальных залежнасцяў, якія, паходзячы з механістычнага бачання эканамічнай рэчаіснасці, памылкова тлумачаць тое, што адбываецца ў сапраўднасці. У згаданай тэорыі выкарыстоўваецца Кейнсава азначэнне нормы працэнта, з якім, як мы казалі раней, пагадзіцца немагчыма (гл. вышэй, с. 633). Тэорыя Гікса — Сэмуэльсана цалкам заснавана на ідэі пра тое, што колькасць грошай — адна са складовых частак эканамічнай раўнавагі. Такім чынам, даследнікі пагаджаюцца з колькаснай тэорыяй грошай — без сумневу, адной з самых згубных памылак у гісторыі палітычнай эканоміі. Замест таго каб сцвярджаць, што колькасць грошай вызначае ровень цэнаў (а значыцца, і колькасць аперацыяў), правільней было б гаварыць пра адваротную залежнасць: менавіта павелічэнне колькасці аперацыяў вымагае ад банкаў ствараць большую колькасць грошай.

§ 2. Тэорыі грашовай раўнавагі

Дагэтуль у нашай кнізе мала ўвагі аддавалася дыскусіям паміж эканамістамі па праблеме грошай[1]. Калі мы наў-

[1] *Чытач, які выкажа цікавасць да гэтых дыскусіяў, можа звярнуцца да кнігі: Rist*

мысна пазбягалі разгляду гэтых дыскусіяў, дык толькі таму, што, на нашую думку, яны бадай што цалкам няплённыя.

Ірвінг Фішэр паспрабаваў распрацаваць больш прымальны варыянт колькаснай тэорыі грошай, адрозніваючы два тыпы грашовых адзінак: з аднаго боку, металічныя грошы і банкаўскія білеты, а з другога — банкаўскія ўклады. Гэта спрычынілася да вылучэння ім славутага раўнання $MV + M'V' = PT$, дзе M — "легальная" грашовая маса ў абарачэнні, V — хуткасць абарачэння гэтых грошай, M' — маса "крэдытных грошай", V' — хуткасць абарачэння гэтых грошай, P — агульны ровень цэнаў, T — паказнік колькасці аперацыяў, здзейсненых эканамічнымі суб'ектамі за адзінку часу[1].

З другога боку, эканамісты Кембрыджа, ідучы па шляху свайго настаўніка Альфрэда Маршала, атрымалі раўнанне $MP = KR$, дзе M — грашовая маса, P — ровень коштаў, R — сума даходаў за адзінку часу, K — хуткасць ператварэння грошай у даход[2].

Гэтая, так званая "кембрыджская", формула можа падацца больш рэалістычнай, бо праз яе выказваецца відавочная дакладная ідэя пра тое, што суб'екты эканомікі набываюць тавары за грашовыя адзінкі, узятыя з іхных даходаў. Прынамсі, карыстальнікі гэтай формулы таксама пагаджаюцца бачыць у грашовай масе каўзальны фактар, ваганні якога змяняюць ровень цэнаў, гэта значыць вартасць грошай. Але, на жаль, працяглы час гэты тэзіс, выказаны Рыкарда, пераможна адкідваўся. У 1840 г. ангельскі эканаміст Тук у сваёй кнізе *"Гісторыя коштаў"* паказаў, што менавіта ваганні цэнаў выклікаюць змены грашовай масы ў абарачэнні, а не наадварот.

Пад час уздыму неакласічнай школы памылковы характар колькаснай тэорыі грошай быў заўважаны шведам Кнутам Віксэлем, пра што сведчыць ягоная кніга *"Працэнт і*

Charles. Histoire des doctrines relatives à la monnaie et au crédit depuis John Law jusqu'à nos jours. Paris, 1938.

[1] *The purchasing power of money. New York, 1907.*

[2] *Гл. A. Pigou, The value of money. Quarterly Journal of Economics, 1917–1918, p. 38.*

кошты", якая выйшла ў свет у 1898 г.[1] У гэтай працы адначасова са спробай асэнсавання эканамічнага цыкла прысутнічае і яшчэ адна ідэя. Віксэль адзначаў, што рух коштаў можа тлумачыцца праз ваганне нормы працэнта, якое фіксуецца банкамі, бо, напрыклад, паніжэнне гэтай нормы выклікае інвестыцыі і праз іх павялічваецца сукупны попыт на тавары.

Дадзены аналіз — зыходная кропка для эканамістаў так званай школы "грашовай раўнавагі", што яшчэ і сёння, нягледзячы на крытыку з боку кейнсіянцаў, імкнуцца ў норме працэнта бачыць адзіны фактар, змены ў якім могуць забяспечыць аднолькавыя велічыні нармальнага ашчаджання і інвеставання, гэта значыць стварыць стан раўнавагі, цалкам выключаючы пры гэтым як перавытворчасць, так і недастатковую вытворчасць. Асноўныя прадстаўнікі гэтай школы — шведы Э. Ліндаль[2] і Г. Мірдаль[3], а таксама ангельцы Р. Дж. Гоўтры[4] і Д. Г. Робэртсан[5]. Апошнім часам назіраліся таксама пэўныя спробы адрадзіць колькасную тэорыю грошай. Найбольшая з іх была зробленая амэрыканскім эканамістам Донам Пэйтынкінам у кнізе *"Грошы, працэнт і кошты"*[6].

Такая колькасць разнастайных даследванняў пра стасункі паміж грашыма і раўнавагай у эканоміцы адлюстроўвае жаданне эканамістаў захаваць, нягледзячы на трыумф Кейнсавай тэорыі, як мага больш тэзісаў неакласічнай школы. У цэнтры гэтага "контрнаступу" мы знаходзім вялікага апанента Кейнса А. С. Пігу. Ён сцвярджаў, што паніжэнне

---

[1] *Гл. Geldzins und Gunterpreise. Jéna, 1898.*

[2] *Гл. Etudes sur la theorie de la monnaie et du capital, Stockholm, 1929, trad. française, Paris, 1950.*

[3] *Гл. Myrdal G. Om Penningteoretisk Jämvikt, Economisk. Tidskrift, Stockholm, 1931, trad. anglaise, Monetary equilibrium, London, 1939; trad. française, L'équilibre monétaire, Paris, 1950.*

[4] *Currency and credit (La circulation monétaire et le crédit), London, 1919, trad. française, Paris, Sirey, 1935.*

[5] *Essays in monetary theory, London, 1940.*

[6] *D. Money, interest and prices. Evanston (U.S.A.), 1950. Цяперашнія эканамісты гэтай школы больш вытанчаныя ў сваім тэарэтычным аналізе, але, на нашу думку, яны не дасягаюць тых вынікаў, якія можна выкарыстаць лягчэй, чым вынікі іх папярэднікаў. Гл., напрыклад, наконт гэтага пытання працу: Horwich G. Money, Capital and prices. Homewood (Illinois), 1964.*

цэнаў у выпадку першапачатковага недахопу інвестыцыяў выклікае павелічэнне "рэальнай вартасці" наяўных грашовых сродкаў у распараджэнні эканамічных суб'ектаў. А гэта павінна падштурхнуць іх да павелічэння сваіх укладанняў па наяўнай на пэўны момант норме працэнта. Насуперак Кейнсу, які сцвярджаў, што даволі часта ніякае паніжэнне нормы працэнта не здольнае выклікаць дастатковы ровень інвестыцыяў, Пігу заяўляў, як гэта і сцвярджала неакласічная тэорыя, што заўсёды існуе пэўная норма працэнта, калі ашчаджанні, створаныя з даходаў, якія адпавядаюць поўнай занятасці, і інвестыцыі выраўноўваюцца. Да думкі Пігу пра тое, што паніжэнне цэнаў уплывае на вартасць наяўных грашовых сродкаў, часта звярталіся даследнікі. На гэты конт існуе нават выраз "эфект Пігу".

Лёгка заўважыць, што названая канцэпцыя ўсё яшчэ грунтуецца на колькаснай тэорыі грошай. Сапраўды, Пігу дапускаў, што паніжэнне цэнаў аніякім чынам не ўздзейнічае на скарачэнне запасу грошай, якія знаходзяцца ў распараджэнні эканамічных суб'ектаў. Такім чынам, ён таксама разглядаў грашовую масу ў абарачэнні як "незалежную зменную велічыню". Калі ж лічыць, што, наадварот, грашовая маса пры паніжэнні коштаў мае тэндэнцыю да спантаннага скарачэння, дык тады — цалкам відавочна — "эфекта Пігу" больш не існуе.

Увогуле сучасныя тэарэтыкі "грашовай раўнавагі" схільныя сцвярджаць, што заўсёды можна панізіць норму працэнта, выпускаючы ў абарачэнне больш грошай, і гэтае паніжэнне мусіць быць магутным стымулам для інвестыцыяў. Яны папракаюць Кейнса і ягоных вучняў, што тыя не надавалі дастатковага значэння ваганням нормы працэнта. У гэтым плане вельмі характэрнае нядаўняе даследванне амэрыканскага эканаміста Пола Сэмуэльсана. Даследнік пісаў: "У прыватнасці, у працах такіх амэрыканскіх эканамістаў, як Салоў, Тоўбін, дый у мяне самога ўвага засяроджваецца на кіроўнай (managed) эканоміцы, якая з дапамогай адмысловага выкарыстання фіскальнай і грашовай палітыкі прымушае Кейнсавы фактары эфектыўнага попыту паводзіць сябе так, як гэта прасочваецца ў неакласічнай мадэлі...

[Гэта]... азначае адмаўленне ад "уласцівага перад дэпрэсіяй" варыянту Кейнсавай сістэмы, калі факт забеспячэння таннага і лёгкага ў атрыманні крэдыту не можа мець аніякага істотнага эфекту на выдаткі ў мэтах інвеставання..."[1]

Насуперак гэтаму меркаванню мы прапануем дыяметральна супрацьлеглую думку, якая падаецца нам больш справядлівай. Яна выказаная ангельскім даследнікам Я. Эшэгам у ягонай кнізе *"Ад Маршала да Кейнса"*[2]. Паводле думкі Эшэга, Кейнс надаваў занадта вялікае значэнне паказніку нормы працэнта, усё яшчэ знаходзячыся пад уплывам неакласічнай тэорыі, у прыватнасці Альфрэда Маршала.

Цалкам справядліва Эшэг абараняў тэзіс, што сума інвестыцыяў залежыць галоўным чынам ад высокіх прыбыткаў, атрыманых у выніку рэалізацыі таго ці іншага прамысловага праекта. Ён пісаў: "Вялікая ступень няўпэўненасці наконт прыбытку, атрыманага ад інвестыцыяў, асабліва пасля сканчэння аднаго ці двух гадоў, уздзейнічае так, што спадзяванне на вельмі значную прыбытковасць параўнальна з наяўнымі нормамі працэнта менавіта і ёсць адна з папярэдніх умоваў пры ажыццяўленні ўсялякага праекта інвестыцыяў"[3].

Як нам падаецца, гэтая простая заўвага паказвае слабасць і няплённасць большай часткі даследванняў "грашовай раўнавагі". Сапраўды, названыя даследванні ў значнай ступені застаюцца пад уплывам схемы Вальраса, дзе норма працэнта — гэта "кошт" выкарыстання кожнай адзінкі інвеставанага капіталу, бо ў гэтай схеме дапускаецца гіпотэза, паводле якой усе капіталы — гэта капіталы, узятыя ў пазыку. Калі пазбавіцца ад гэтай прыкрай гіпотэзы[4], дык становіцца зразумела, што змены ў норме працэнта могуць уплываць толькі на інвестыцыйныя аперацыі, якія датычаць пазыкаў (у прыватнасці, у банках). Акрамя таго, гэты ўплыў даволі абмежаваны, бо *ўзятыя ў пазыку* сумы складаюць толькі частку інвеставаных сумаў.

---

[1] *A brief survey of post-keynesians developments in R. Lekachman, Keynes general theory, reports of three decades. New York, 1964, p. 341.*

[2] *From Marshall to Keynes, Oxford, 1963.*

[3] *Op. cit., p. 68—70.*

[4] *І дзеля гэтага варта ісці далей за самога Кейнса.*

З такой нагоды неабходна прызнаць, што асноватворная залежнасць, якая дэтэрмінуе ўсю праблему росту ў капіталістычнай эканоміцы, — гэта залежнасць паміж інвестыцыямі і нормай прыбытку, а не тая, якую спрабуюць усталяваць паміж інвестыцыямі і працэнтнай стаўкай.

Безумоўна, нельга адмаўляць, што з гледзішча, якое нас цікавіць, ваганні нормы працэнта часам набываюць пэўнае значэнне. Значыцца, эканамічная тэорыя павінна ўзняць праблему вызначэння гэтага паказніка. Сёння мала ўвагі аддаецца старому тэзісу Сміта, паводле якога ў доўгатэрміновы перыяд норма працэнта залежыць ад нормы прыбытку[1], але да яго зноў звяртаюцца, калі жадаюць вытлумачыць *сукупныя* ваганні нормы працэнта праз ваганні грашовай масы ў абарачэнні. Зразумела, варта зазначыць, што ваганні грашовай масы ў абарачэнні часам уплываюць на вызначэнне сукупнай нормы працэнта на кароткі тэрмін. Але ў дачыненні да доўгатэрміновай сукупнай нормы працэнта такая залежнасць вызначаецца з цяжкасцю.

Аднак тэорыю Кейнса ў дачыненні да грошай яшчэ больш востра крытыкуюць эканамісты так званай чыкагскай школы (лідэр — Мільтан Фрыдман). Паводле гэтага даследніка, ваганні ў эканамічнай дзейнасці трэба тлумачыць не ваганнямі інвестыцыяў, а ваганнямі прапановы грошай, улічваючы тое, што попыт на грошы залежыць ад "сталага даходу" эканамічных суб'ектаў, гэта значыць ад даходу, які спадзяюцца атрымаць у нармальным стане рэчаў пры пэўных актывах эканамічнага суб'екта, улучаючы "людскія актывы" (працоўную здольнасць)[2]. Перад намі новая спроба адраджэння колькаснай тэорыі грошай, якая, нягледзячы на складанасць аналізу, не больш пераканаўчая, чым усе папярэднія[3]. Даследванні чыкагскай школы набылі аўтарытэт галоўным чынам таму, што паўстаюць як своеасаблівая заслона супраць распаўсюджвання "дырыжысцкіх" ці нават "плані-

[1] *Гл. вышэй, с. 202.*

[2] *Гл. Essays in Positive Economics, Chicago, 1953; et en collaboration avec A. J. Schwartz, A Monetary history of the United States (1867—1960). Princeton, 1964.*

[3] *Гл., у прыватнасці, D. Blondel, J. P. Dalloz, C. Jessua, Essais sur la nouvelle théorie quantitative de la monnaie, Paris, 1970.*

фікатарскіх" поглядаў, якія чэрпаюць натхненне ў працах Кейнса.

Сапраўды, эканамісты чыкагскай школы сцвярджаюць, што не толькі не трэба, але і надзвычай шкодна патрабаваць ад дзяржавы падтрымліваць эканамічны рост праз павелічэнне ёю сваіх выдаткаў, гэта значыць праз разнастайныя формы яе ўмяшання ў эканамічнае жыццё. Дастаткова, каб дзяржава навучылася ажыццяўляць навуковае кіраванне грашовай масай у абарачэнні.

Безумоўна, вывучэнне грашовай палітыкі ўрадаў і паводзінаў банкаў само па сабе вельмі каштоўнае, бо грашовая маса — зусім не пасіўны фактар у эканоміцы[1], і было б надзвычай памылкова лічыць, што ў гэтай галіне можна цалкам даверыцца дзейнасці "механізму рынку". Прынамсі, варта прызнаць, што "грашовае рэгуляванне" застаецца майстэрствам, валоданне якім не можа абмяжоўвацца толькі выкарыстаннем некалькіх простых прынцыпаў, выведзеных з агульных законаў. Тут, як і ў іншых галінах навукі, памылкай было б чакаць ад эканамічнай тэорыі таго, чаго яна не можа даць. Лепей прызнаць усё тое станоўчае, што грашовая палітыка абавязкова набывае ад эмпірычнага, чым імкнуцца ўводзіць занадта амбіцыйныя тэарэтычныя мадэлі, строгая лагічнасць якіх непапраўна аддаляе іх ад рэчаіснасці.

§ 3. Узнікненне новага метаду эканамічнага аналізу: табліца выдаткі—выпуск В. Лявонцьева

У 1941 г. амэрыканскі эканаміст расейскага паходжання Васіль Лявонцьеў выдаў працу *"Структура амэрыканскай эканомікі, 1919—1939"*, дзе адзін з раздзелаў меў назоў *"Эмпірычнае выкарыстанне аналізу раўнавагі"*[2]. Аўтар сціпла прэзентаваў сваю працу як спробу дастасаваць на практыцы канцэпцыю эканамічнай раўнавагі Леона Вальраса. У

[1] *Гл. на гэты конт працу André Chaineau, La demande d'encaisses monétaires. Paris, Cujas, 1964.*

[2] *The Structure of American Economy, 1919—1939. New York, 1941; trad. franç., Paris, 1958. Першы накід гэтае тэорыі быў прапанаваны аўтарам у 1936 г. Гл. "Quantitative input and output relations in the economic system of the United States" // Review of Economics and Statistics, août 1936.*

сапраўднасці ж стаўленне Лявонцьева да Вальраса нагадвае дачыненні паміж Жанам Батыстам Сэем і Эдамам Смітам: вучань выступае супраць настаўніка па такіх асноватворных пытаннях, што на справе ягоная праца паўстае як крытыка працы папярэдніка.

У значна большай ступені, чым прадаўжальнік тэорыі Вальраса, Лявонцьеў выступаў як наступнік Кенэ і Маркса. Сапраўды, у табліцы выдаткі—выпуск (*input—output*) падавалася апісанне эканомікі на падставе ведаў пра колькасць разнастайных прадуктаў, набытых вытворцамі кожнага асобнага прадукту, бо менавіта Кенэ ўжо паказваў, як у сельскагаспадарчай вытворчасці выкарыстоўваецца частка прадукцыі "бясплённага класа" і якім чынам апошні набывае гэтую частку. Маркс таксама праз свае "схемы аднаўлення вытворчасці", спасылаючыся непасрэдна на Кенэ, адлюстроўваў тое, як група, дзе вырабляюцца спажывецкія тавары, выкарыстоўвае частку тавараў, што вырабляецца групай вытворчасці сродкаў вытворчасці, і наадварот.

Каштоўнасць тэорыі Лявонцьева ў тым, што насуперак Кенэ, які імкнуўся адначасова разглядаць шматлікія праблемы, ён строга ізалюе названую праблему ад узаемных унёскаў розных сектараў у вытворчасць. Узнятае пытанне Лявонцьеў разглядаў абагульнена, і табліца выдаткі—выпуск можа мець столькі гарызантальных ліній і вертыкальных слупкоў, колькі пажадана.

Напачатку мадэль Лявонцьева была "замкнёная", бо аўтар меркаваў, што ўсё спажыванне індывідаў стварае сукупнасць выдаткаў, якія забяспечваюць вытворчасць своеасаблівага тавару — "прадукцыйных паслугаў" (у гэтым уплыў Вальраса ўсё ж такі відавочны). Калі, напрыклад, у эканомікі ёсць тры вырабленыя тавары, дык тады табліца Лявонцьева паўстае наступным чынам (гл. табліцу).

У кожную графу табліцы ўпісана вартасць унёску адной групы (адпавядае гарызантальнай лініі) у другую групу (адпавядае вертыкальнай калонцы). Графа "разам" пры канцы кожнай гарызантальнай лініі пазначае суму кожнага тавару, прададзенага ва ўсе іншыя сектары і спажыўцам, гэта значыць вартасць сукупнай колькасці тавару, вырабленай на

	Тавар 1	Тавар 2	Тавар 3	Спажыўцы	Разам
Тавар 1					
Тавар 2					
Тавар 3					
Паслугі					
Разам					

працягу разгляданага перыяду. Графа "разам" унізе кожнай вертыкальнай калонкі пазначае суму выдаткаў вытворчасці кожнага тавару, у тым ліку выдаткі на выкарыстанне прадукцыйных паслугаў (якія ўключаюць у сябе паслугі капіталу). Такім чынам, паказнік гэтай графы "разам" павінны быць роўны паказніку папярэдняй графы "разам".

Пабудаваўшы дадзеную табліцу, Лявонцьеў перш-наперш паказваў, што калі колькасць кожнага артыкула, выкарыстаная для вытворчасці пэўнай адзінкі ўсіх іншых артыкулаў (Вальрасавы каэфіцыенты фабрыкацыі), вядомая, дык можна даведацца, якія стасункі, з аднаго боку, паміж коштамі ўсіх разнастайных артыкулаў і, з другога, паміж выраблена і прададзена колькасцю гэтых артыкулаў.

Калі праз a_{ij} пазначыць выдаткі на пэўны артыкул, праз j — адзінку артыкула і праз А — матрыцу ў квадраце, якую ўтварае сукупнасць каэфіцыентаў a_{ij}, тады ўзапраўды можна запісаць наступны выраз:

$$pA = p,$$

дзе p — вектарная лінія, якая ўлучае кошты на ўсе артыкулы. З гэтага атрымаем раўнанне

$$p(A-1) = 0,$$

якое развязваецца толькі тады, калі вызначальнік матрыцы (A-1) роўны нулю.

Лявонцьеў дапускае, што вядомыя: з аднаго боку, выдаткі на тавары ў вузкім сэнсе гэтага слова (з выняткам выдаткаў, неабходных для вытворчасці паслугаў) і, з другога, стасункі паміж колькасцю тавараў, спажытых індывідамі (склад "спажывецкага кошыка"). Такім чынам, у табліцы прысутнічае адзіная невядомая велічыня — колькасць аднаго з тавараў, спажытых адзінкай выраблены паслугаў. Гэтая колькасць вызначаецца праз развязанне раўнання

$$|A-1| = 0.$$

З гэтага моманту ўсе элементы матрыцы A вядомыя, і становіцца магчыма вызначыць стасункі, якія павінны існаваць паміж цэнамі на прадукты, праз раўнанне

$$p(A-1) = 0.$$

У аднолькавай ступені можна напісаць

$$Aq = q,$$

дзе q — вектар, які ўлучае выраблену і прададзеную колькасць усіх артыкулаў.

Такім чынам, атрымаем наступны выраз:

$$(A-1)q = 0.$$

Улічваючы, што ўсе элементы матрыцы A вядомыя, вызначаем стасункі, якія павінны існаваць паміж выраблена колькасцю разнастайных артыкулаў.

Для Лявонцьева развязанне праблемы вызначэння цэнаў і прададзена колькасці тавараў — толькі ўступная аперацыя. Ён зацікаўлены, каб паказаць, што з дапамогай табліцы можна прадбачыць шматлікія эфекты ад змены якога-небудзь тэхнічнага каэфіцыента, якую ён называе "першапачатковай тэхнічнай зменай". Калі які каэфіцыент табліцы змяняецца, тады варта канстатаваць пэўныя змены шмат якіх цэнаў і колькасці выраблены тавараў (рэакцыя цэнаў і рэакцыя вытворчасці). Аўтар сам выкарыстоўвае сваю табліцу, каб растлумачыць змены, што адбыліся ў "структуры амэрыканскай эканомікі" ў 1919—1929 гг., а потым у пер-

яд 1929—1939 гг. І цяпер шмат у якіх краінах праведзены значныя даследванні, скіраваныя на забеспячэнне сістэматычнага выкарыстання табліцы выдаткі—выпуск як інструменту эканамічнага прадбачання[1].

Застаючыся на грунце эканамічнай тэорыі, неабходна падкрэсліць, што "замкнёная" мадэль Лявонцьева ўздымае праблему яе інтэрпрэтацыі, бо аўтар увесь час гаворыць пра паслугі (у множным ліку) і разглядае так, нібыта іх можна абагульніць; але існуе *адна* колькасць *усіх* паслугаў і *адзін* кошт за *ўсе* паслугі. Відавочна, праводзіць аналіз з дапамогай гэтых тэрмінаў непрымальна. Але замкнёная мадэль Лявонцьева набывае іншы сэнс, калі цалкам адмовіцца ад яго тэзісаў (што і робяць Сэй і Вальрас) пра мноства прадукцыйных паслугаў і пагадзіцца з яго думкай, што прадпрыемствы ажыццяўляюць вытворчасць, спалучаючы людскую працу з ужо выраблены мі сродкамі вытворчасці. У такім разе апошняя гарызантальная лінія табліцы выдаткі—выпуск змяшчае колькасць беспасярэдняй працы, неабходнай для вытворчасці разнастайных тавараў. Што да апошняй калонкі справа, дык яна паказвае канчатковае спажыванне ўсёй сукупнасці індывідаў на адзінку выдаткаванай у вытворчасці працы. Нарэшце, апошні паказнік у вектары коштаў — дадатковая вартасць на адзінку працы.

Пачынаючы з 1944 г. Лявонцьеў сам пачаў выкарыстоўваць табліцы з каэфіцыентамі выдаткаў працы, спадзеючыся стварыць інструмент, які б дазваляў прадбачыць змены ў выкарыстанні працы, выкліканыя тым ці іншым крокам у эканамічнай палітыцы[2]. Тады спажыванне або канчатковы попыт разглядаюцца як зададзеныя велічыні, незалежныя ад колькасці выкарыстаных паслугаў. Мадэль Лявонцьева становіцца "адкрытай" мадэллю, якая дазваляе вызначыць, колькі працаўнікоў трэба выкарыстоўваць для атрымання чыстага прадукту, які змяшчае пэўную колькасць разнастайных тавараў.

Лявонцьеў увёў таксама ў сваю тэорыю матрыцу запа-

[1] *Гл. пра гэта працу J. Bénard. Comptabilité nationale et modèles de politique économique, coll. "Thémis", 1972.*

[2] *Гл. La structure de l'économie américaine, trad. franç., IVe partie.*

саў тавараў, неабходных для вытворчасці (інвеставаныя тавары-капіталы). Гэта дазволіла яму пайсці па шляху "дынамічнага" даследвання пад час аналізу ўмоваў эканамічнага росту на падставе павелічэння адзначаных запасаў, якое адбылося праз адлічэнні ад вынікаў вытворчасці. Тут Лявонцьеў наблізіўся да матэматыка Джона фон Ноймана — аўтара, даследванні якога набылі такое вялікае значэнне, што варта ўзгадаць ягоныя працы, хоць іх і цяжка зразумець.

Развязаўшы ў 1926 г. адну з фундаментальных матэматычных праблемаў тэорыі гульняў, Нойман паспрабаваў скарыстаць свой метад для аналізу эканамічных паводзін буйных прадпрыемстваў[1]. Але асноўны яго ўклад у нашую дыскыпліну (які, дарэчы, шчыльна спалучаецца з ягоным укладам у матэматыку з прычыны выкарыстання той жа матэматычнай базы) палягае ў прапанове "мадэлі агульнай раўнавагі" ў 1932 г.[2] Мадэль заснаваная на гіпотэзе пра "вытворчасць" працоўнай сілы праз спажыванне пэўнай колькасці тавару адначасова з паступовым павелічэннем запасу тавараў-капіталаў. На гэтай падставе аўтар даў азначэнне "раўнаважнага росту", пры якім усе характэрныя велічыні эканомікі штогод памнажаюцца на адну і тую ж лічбу. Ён паказаў, што гэты рост будзе найхутчэйшы, калі пазначаная лічба роўная "працэнтнай стаўцы", гэта значыць роўню, на падставе якога аплочваюцца капіталы пры выкарыстанні прадукту, які застаецца даступным нават тады, калі са штогадовага даходу адлічваюцца сродкі на неабходнае спажыванне працоўных. Такі прынцып роўнасці паміж максімальным роўнем эканамічнага росту і працэнтнай стаўкай у асяроддзі эканамістаў вядомы пад назовам "залатога правіла росту".

---

[1] *Гл. ягоны твор, напісаны ў супрацоўніцтве з Оскарам Маргенштэрнам: Oskar Morgenstern. Theory of games and economic behavior. Princeton, 1944.*

[2] *Фундаментальнае даследванне фон Ноймана выдадзенае ў 1938 г. на нямецкай мове ў матэрыялах матэматычнага семінара Карла Мэнгера ў Вене, а потым на ангельскай мове ў "Review of Economics Studies".*

§ 4. Сучаснае развіццё неакласічнай тэорыі

Адпаведна з агульнапрызнаным меркаваннем сучасная палітычная эканомія ў заходніх краінах знаходзіцца пад моцным уплывам тэорыі Кейнса. Сапраўды, бальшыня даследнікаў падзяляе ідэі вядомага ангельскага эканаміста[1], і гэта толькі што было пацверджана пры аналізе сучаснай тэорыі эканамічнага росту.

Аднак памылкова было б сцвярджаць, што неакласічная сістэма, супраць якой змагаўся Кейнс, адышла ў нябыт. Наадварот, заходняя палітычная эканомія ў значнай ступені застаецца адданая ёй, што, праўда, уздымае праблему нутраной паслядоўнасці сярод яе даследнікаў.

Апошнімі гадамі пры выкарыстанні ўсіх магчымых метадаў матэматычнага аналізу было напісана шмат працаў, накіраваных на дапаўненне і ўдакладненне метаду Вальраса, праз які ён імкнуўся растлумачыць асноватворны эканамічны феномен параўнальнага парадку, што пануе ў сучаснай рынкавай эканоміцы. Сапраўды, у эканоміцы заходніх краінаў забяспечваецца пэўная каардынацыя эканамічнай дзейнасці, хоць аніякая сіла не абавязвае індывідаў дзейнічаць тым ці іншым чынам. Прадпрыемствам удаецца па прымальных цэнах прадаць прыкладна ўсё, што яны вырабляюць (з выняткам вельмі цяжкіх крызісаў перавытворчасці). Найманыя працаўнікі і трымальнікі капіталаў атрымліваюць рэгулярныя даходы, і гэта дазваляе ім набываць тое, што яны прызвычаіліся спажываць, і паступова паляпшаць свой ровень жыцця.

Кожны ведае, што такая каардынацыя эканамічнай дзейнасці забяспечваецца праз канкурэнцыю на рынку. Вытворцы памяншаюць або павялічваюць памеры сваёй вытворчасці ў залежнасці ад павелічэння або памяншэння цэнаў на іхную прадукцыю. Спажыўцы памяншаюць або павялічваюць колькасць набываных імі тавараў у залежнасці ад павелічэння або памяншэння цэнаў. Аднак эканамісты не зада-

[1] *У творы не надта вядомага аўтара, ідэі якога не маюць вялікага поспеху, — Жана Дэнізэ змяшчаецца сама глыбокая і, як нам здаецца, сама змястоўная крытыка, хоць калі-небудзь адрасаваная Кейнсу і кейнсіянцам. Гл. Monnaie et financement, Dunod, 1967.*

вальняюцца гэтай вельмі абагульненай спасылкай на ўздзеянне рынку. Ад самага ўзнікнення палітычнай эканоміі яны намагаюцца больш дакладна асвятліць працэс, на падставе якога кошт і колькасць абмяняных тавараў фіксуюцца на пэўным роўні.

Прыкладна на працягу цэлага стагоддзя — ад *"Багацця народаў"* Сміта да *"Капіталу"* Маркса — панавала тлумачэнне гэтага феномена, заснаванае на тэорыі працоўнай вартасці. Затым эканамісты неакласічнай школы паспрабавалі разгледзець яго інакш. Кошт і колькасць тавараў успрымаліся імі як развязанне сістэмы раўнанняў, якая перадае неабходнасць выраўноўвання попыту і прапановы тавараў і паслугаў.

На папярэдніх старонках мы бачылі, якім шляхам развівалася неакласічная тэорыя да Другой сусветнай вайны. Зараз трэба зрабіць кароткі агляд сучаснага стану развіцця гэтай тэорыі. Варта было б разгледзець даследванні шмат якіх аўтараў — Ароў, Дэбро, Гана, Гікса, Сэмуэльсана, Салоў і інш. Вялікая колькасць публікацыяў памянёных аўтараў вымушае нас адмовіцца ад поглядаў кожнага з іх. Паспрабуем толькі акрэсліць агульны кірунак іхных даследванняў і больш-менш дакладна паказаць тыя высновы, да якіх можна прыйсці, скарыстоўваючы вынікі гэтых даследванняў.

Як мы бачылі, Вальрас дапускаў, што функцыянаванне рынкавай эканомікі абумоўлена пошукамі індывідаў *адзінага* сродку развязання ягонай сістэмы раўнанняў. Дзеля таго, што кошты, як ён казаў, "выкрыкнутыя выпадкова", дык індывіды (спажыўцы, пастаўшчыкі паслугаў, прадпрымальнікі) прапаноўваюць прадаць або набыць пэўную колькасць тавараў і паслугаў менавіта па гэтых коштах. Напачатку попыт і прапанова па выпадкова выкрыкнутых коштах неаднолькавыя. Тады для кожнага тавару або паслугі выкрыкваецца новы кошт — меншы за першы, калі прапанова пераўзыходзіла попыт, і большы за першы — у адваротным выпадку. Новыя попыт і прапанова, як сцвярджаў Вальрас, будуць усё больш і больш набліжацца да раўнавагі паміж сабой. Пасля пэўнай колькасці такіх "пошукаў навобмацак" становіцца магчыма дасягнуць стану агульнай раўнавагі,

гэта значыць выраўнаваць попыт і прапанову адначасова на ўсіх рынках.

Выказваючы думку пра "выпадкова выкрыкнутыя" кошты, Вальрас браў пад увагу становішча на фондавых біржах. Але відавочна, што канкрэтныя рынкі вельмі адрозніваюцца ад "арганізаваных" рынкаў — біржаў[1]. Тады паслядоўнікі Вальраса прыйшлі да ўсведамлення гіпотэзы, што кошты выкрыкваюцца "аўкцыяністам", да якога даводзяцца попыт і прапанова на ўсе тавары і паслугі, і ніводны эфектыўны абмен не адбываецца да таго часу, пакуль гэты чалавек не пацвердзіць ягонай магчымасці пасля канстатацыі факта дасягнення раўнавагі на ўсіх рынках. Лёгка заўважыць, што такая спроба ўдакладніць незразумелыя гіпотэзы Вальрасавай мадэлі толькі аддаляе нас ад рэчаіснасці. Што яшчэ так супярэчыць рэчаіснасці капіталістычнага свету, як гіпотэза наконт цэнтральнага органа, згоду якога павінны атрымаць індывіды перад тым, як заняцца аперацыяй куплі-продажу?

Аднак менавіта на аснове перагледжанай і папраўленай Вальрасавай мадэлі і разгарнулася мноства нядаўніх дыскусіяў вакол агульнай раўнавагі ў эканоміцы. І што ж? Дыскусіі зусім не пацвердзілі эксплікацыйнай (тлумачальнай) каштоўнасці неакласічнае сістэмы.

У дачыненні да Вальрасавай сістэмы раўнанняў неабходна ўзняць наступныя пытанні: 1) ці магчыма гэтую сістэму развязаць? 2) можа, існуе шмат спосабаў яе развязання? 3) ці адпавядае адзін (калі ён існуе) або кожны са спосабаў развязання (калі іх шмат) *стабільнай* раўнавазе, гэта значыць такому становішчу, калі пры адыходзе эканомікі ад гэтай раўнавагі пачынаюць дзейнічаць нейкія сілы, якія забяспечваюць яе вяртанне да першапачатковага стану? У залежнасці ад адказаў на зададзеныя тры пытанні эксплікацыйная каштоўнасць Вальрасавай мадэлі будзе вельмі адрозніваца.

Калі сістэма раўнанняў аніяк не можа быць развязаная, даводзіцца рабіць выснову пра нядзейснасць метаду, з дапамогай якога эканамісты неакласічнай школы імкнуцца

[1] *Дарэчы, на біржы насуперак таму, што сцвярджаў Вальрас, кошты не "выкрыкваюцца выпадкова", а заўсёды вынікаюць з курсу папярэдняга гандлю на біржы.*

растлумачыць феномен утварэння цэнаў. У такім выпадку магчыма дапушчэнне, што цэны могуць фіксавацца на нейкіх роўнях у кожны час, а значыцца, і змяняцца яны могуць кожны момант. Але такое меркаванне супярэчыць рэчаіснасці.

Калі ж у сістэмы раўнанняў існуе шмат спосабаў развязання, якія не адпавядаюць стабільным раўнавагам, дык і тады сітуацыя, у якой апынуліся неакласічныя тэарэтыкі, не палепшыцца. Насамрэч, у такім разе пераход ад адной сістэмы коштаў да другой можа выклікацца нейкім шокам, а гэта азначае таксама, што кошты імгненна могуць быць зменены ў кожны момант.

Такім чынам, пры сучасным стане эканамічных даследванняў на тры папярэдне ўзнятыя пытанні (існаванне раўнавагі, адна або шмат раўнавагаў, іх стабільнасць) магчыма адказаць наступным чынам[1]. Перш-наперш з працаў Ароў і Дэбро вынікае, што развязаць сістэму раўнанняў можна толькі тады, калі прыбытковасць на прадпрыемствах спадальная, гэта значыць калі пры павелічэнні выраблена колькасці тавараў сабекошт іх вытворчасці павялічваецца. Перад намі гіпотэза, якая не спраўдзілася рэчаіснасцю. Калі спытацца ў кіраўнікоў прадпрыемстваў, дык яны часта адказваюць, што сабекошт прадукцыі паменшыўся б, калі б яе выраблялася больш. Прыхільнікі неакласічнай школы часам сцвярджаюць, што менавіта з такой прычыны іхнае вытлумачэнне коштаў не выклікае вялікага даверу. Вось, у прыватнасці, пра што пісаў у 1981 г. Ган:

"Дзеля таго каб быў сэнс у размове аб прадпрыемствах, мы, сама меней, павінны дапусціць існаванне факта нарастальнай рэнтабельнасці ў асобных выпадках. Больш за тое, адмаўляючы апошняе, тэорыя рызыкуе ператварыцца ў няслушную"[2].

Аднак калі выказаць гіпотэзу, што прыбытковасць на прадпрыемствах заўсёды спадальная (а таксама некалькі

[2] *Гл. на гэты конт Bernard Guerrien, La théorie néo-classique. Paris, 1989, Аўтар дае выразнае рэзюме вынікаў даследванняў у галіне, якая нас цікавіць. Такое ж рэзюме можна знайсці ў працы Fisher Franklin. La formation des grandeurs économiques: déséquilibre et instabilité, in La formation des grandeurs économiques, ouvrage publié sous la direction de Jean Cartelier, Paris, 1990.*

[2] *General equilibrium theory, in The crisis in economic theory, New York, 1981; cité par B. Guerrien, op. cit., p. 415.*

іншых, менш значных гіпотэзаў), дык варта адзначыць, што не так ужо і цяжка развязаць Вальрасаву сістэму раўнанняў. Але спосаб развязання праблемы быў бы толькі адзін (калі ён існуе), і такое развязанне магчымае толькі ў тым выпадку, калі б тавары былі поўнымі субстытутамі[1]. А гэта не адпавядае рэчаіснасці, бо шматлікія тавары камплементарныя. Такім чынам, пры наяўнасці ўмоваў для існавання спосабу развязання нашай сістэмы трэба чакаць існавання і вялікай колькасці магчымых спосабаў гэтага развязання.

Ці адпавядаюць гэтыя шматлікія спосабы (калі яны існуюць) стабільнай раўнавазе коштаў? Менавіта ў дачыненні да названага пытання ў даследваннях апошняга часу было здзейсненае сама яскравае зняпраўджванне поглядаў Вальраса. Цяпер эканамісты ўжо прызнаюць, што стабільнасць раўнавагі на кожным рынку, пра якую ідзе размова, не можа быць гарантаваная на падставе існавання ўзаемакамплементарных тавараў[2]. Праз гэта даследнікі выказваюць меркаванне, што метад, прапанаваны Вальрасам для вытлумачэння параўнальнай стабільнасці цэнаў, павінен быць адкінуты.

Вальрас і ягоныя паслядоўнікі былі занадта амбітныя ў жаданні даказаць, што эканоміка павінна зноў вярнуцца да стану раўнавагі, знаходзячыся ў становішчы *нейкай* нераўнавагі. Гэта, па сутнасці, азначае сітуацыю, калі існуюць усе ўласцівыя для капіталістычнай сістэмы інстытуцыі (сістэма найманай працы, капіталістычныя прадпрыемствы, пазыка і крэдыт капіталу), але ў індывідаў няма ніякай ідэі наконт цэнаў на тавары, якія павінны ўсталявацца, заробкаў, якія павінны быць выплачаныя, і сярэдняга працэнта ад капіталу. Іншымі словамі, тэарэтыкі неакласічнай школы дапускаюць, што суб'екты эканомікі, хоць яны і дзейнічаюць у асяроддзі ўжо дакладна вызначаных інстытуцыяў, с*устракаюцца ўпершыню*. І нельга здзіўляцца, што пры такім аналізе праблемы раўнавагі станоўча развязаць яе немагчыма.

Рынкі ўзаемазалежныя. Усялякая змена кошту на адзін тавар уплывае на ўсе іншыя кошты. Калі немагчыма лічыць,

[1] *Voir B. Guerrien, op. cit., p. 164.*
[2] *Voir B. Guerrien, op. cit., pp. 192 à 195.*

што суб'екты эканомікі адначасова прысутнічаюць на ўсіх рынках, дык варта прызнаць, што Вальрасава раўнавага (калі яна мусіць усталявацца) — вынік шэрагу дзеянняў і рэакцыяў, якія па часе ідуць адны за аднымі. Нават калі і дапусціць наяўнасць умоваў існавання і стабільнасці раўнавагаў, доказы Вальраса можна было б здзейсніць толькі рухаючыся крок за крокам па ланцужку гэтых дзеянняў і рэакцыяў. Але гэта немагчыма, бо парадак іх разгортвання нельга зафіксаваць наперад.

Такім чынам, калі раўнавага коштаў існуе (у чым можна не сумнявацца), дык варта прызнаць, што яна не ўтвараецца кожны момант, як сцвярджаюць прыхільнікі неакласічнай тэорыі. Пры жаданні можна сказаць, што першая такая раўнавага гістарычна склалася адначасова з фармаваннем капіталістычных інстытуцыяў і затым змянілася пад уздзеяннем пэўных фактараў. Але раўнавага ў пэўны гістарычны момант заўжды залежыць ад папярэдніх раўнавагаў. Неакласічная ж тэорыя раўнавагі не задавальняе рэчаіснасць, бо ўздымае штучную праблему.

Дарэчы, феномен, які патрабуе асаблівага вытлумачэння, — гэта менавіта стабільнасць *стасункаў* паміж цэнамі на тавары. Вядома, што сукупнасць коштаў можа імгненна і значна змяняцца, асабліва ў перыяды інфляцыі. Але і ў такім разе стасункі паміж коштамі параўнальна стабільныя. Менавіта для гэтага і трэба значна больш увагі аддаць вучэнню класічнай палітычнай эканоміі, чым даследванням у межах неакласічнай тэорыі.

Насамрэч, цэны на тавары залежаць галоўным чынам ад выдаткаў вытворчасці, а таксама ад прыбыткаў, што атрымліваюць прадпрыемствы ад вытворчасці і продажу гэтых тавараў. А выдаткі ж вытворчасці залежаць ад заробкаў, што выплочваюцца за вытворчасць саміх тавараў або матэрыяльных сродкаў (сыравіна, паліва, машыны), выкарыстаных у працэсе вытворчасці. Калі ж стасункі паміж коштамі параўнальна стабільныя, гэта сведчыць пра тое, што, з аднаго боку, метады вытворчасці змяняюцца вельмі паступова і, з другога, параўнальна стабільнымі застаюцца рэальныя заробкі і нормы прыбытку.

Цікава, безумоўна, чаму рэальныя заробкі і нормы прыбытку знаходзяцца на тым ці іншым роўні і чаму выкарыстоўваюцца тыя або іншыя метады вытворчасці? Адказаць на гэтыя пытанні можна толькі праз аналіз гістарычнага развіцця эканомікі кожнай краіны, што дазволіць вызначыць шматлікія фактары — геаграфічныя, кліматычныя, палітычныя, якія паспрыялі ўсталяванню пэўных нормаў заробкаў і прыбытку, а таксама выкарыстанню пэўных метадаў вытворчасці. Аднак нельга прэтэндаваць на колькаснае вымярэнне ўздзеяння ўсіх гэтых разнастайных фактараў і пабудаваць матэматычную мадэль коштаў як вынік усіх "зададзеных велічыняў", ад якіх яны залежаць.

Што можна зрабіць, дык гэта паказаць, якім чынам у эканоміцы, дзе існуюць пэўныя метады вытворчасці і пэўная норма аплаты працы, у бальшыні выпадкаў павінны існаваць пэўныя стасункі паміж цэнамі на тавары. Менавіта такі тып вытлумачэння коштаў прапанаваў П'еро Срафа ў сваёй кнізе *"Вытворчасць тавараў з дапамогай тавараў"* (1960)[1]. У гэтай вельмі абстрактнай і адначасова вельмі рэалістычнай працы даследнік паспрабаваў пабудаваць тэорыю ўтварэння цэнаў і адначасова аднавіць вывучэнне стасункаў паміж цэнамі і даходамі. У ёй на першы погляд не відаць аніякай палемікі з неакласічнай тэорыяй. Тым не менш кніга Срафы цалкам заслугоўвае падзагалоўка, дадзенага самім аўтарам: *"Уводзіны ў крытыку эканамічнай тэорыі"*.

Срафа выказаў думку, што вытворчасць ажыццяўляецца не на падставе працы і капіталу, а на падставе працы і папярэдніх прадуктаў, інакш кажучы, — сродкаў вытворчасці. Праз гэта сістэма раўнанняў, з дапамогай якой аўтар уздымае праблему ўтварэння цэнаў, не мае ніякай велічыні, якая паказвала б памер капіталу. У сістэме змяшчаюцца толькі велічыні, якія паказваюць колькасць усіх выраблены тавараў (і сродкі вытворчасці ўключна) — A, B, ..., K; выдаткаваную колькасць працы ў кожнай галіне — L_a, L_b, ..., L_k і, нарэшце, колькасць кожнага тавару, які (эвентуальна) выка-

[1] *Production of commodities by means of commodities, Cambridge, 1960. Trad. française, Dunod, 1970.*

рыстоўваецца для вырабу ўсіх разнастайных тавараў: A_a, B_a, ..., K_a — колькасці тавараў для вырабу тавару А; A_b, B_b, ..., K_b — колькасць тавараў для вырабу тавару В і г. д.

Калі A_a, B_a, ..., K_a і A_b, B_b, ..., K_b памножыць на цану тавараў p_a, p_b, ..., p_k, атрымаем велічыні, якія пазначаюць эксплуатацыйныя выдаткі прадпрыемстваў, выкліканыя выкарыстаннем разнастайных сродкаў вытворчасці. Пры памнажэнні колькасці працы L_a, L_b, ..., L_k на стаўку заробку w атрымліваюцца выдаткі прадпрыемстваў на заробкі. Так вызначаюцца выдаткі вытворчасці ўсіх тавараў.

Схіляючыся да класічнага закону выраўноўвання нормаў прыбытку і мяркуючы спачатку, што прадпрыемствы на працягу года спажываюць сродкі вытворчасці, даступныя на пачатку года і выраблены ў папярэднім годзе, Срафа выказаў наступную думку: у бальшыні выпадкаў рэалізаваныя прыбыткі прапарцыйныя выдаткам, выкліканым праз выкарыстанне іншых, чым праца, сродкаў вытворчасці.

Пазначыўшы праз r норму прыбытку, атрымліваем наступную сістэму раўнанняў:

$$
\begin{aligned}
&(A_a p_a + B_a p_b + \ldots + K_a p_k)(1 + r) + L_a w = A p_a,\\
&(A_b p_a + B_b p_b + \ldots + K_b p_k)(1 + r) + L_b w = B p_b,\\
&\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\ldots\\
&(A_k p_a + B_k p_b + \ldots + K_k p_k)(1 + r) + L_k w = K p_k.
\end{aligned}
$$

Лёгка заўважыць: пры зададзенай колькасці выраблены х і спажытых тавараў, а таксама пры зададзенай стаўцы заробку цэны на тавары, як і норму прыбытку, можна вызначыць пры ўмове, што за адзінку вымярэння коштаў і даходаў будзе ўзяты які-небудзь адзін тавар. Але сродкі вытворчасці таксама павінны быць выраблены я. Значыцца, іх можна замяніць на сродкі, якія былі выдаткаваныя для вытворчасці гэтых сродкаў вытворчасці — працу і іншыя сродкі вытворчасці. Паколькі гэтыя сродкі вытворчасці ў сваю чаргу таксама зменлівыя, дык сукупны сабекошт тавараў палягае ў выдатках працы.

Выдаткі працы, лічыў Срафа, адбываюцца ў розныя моманты, і з прычыны таго што прыбыткі прапарцыйныя выдаткам на сродкі вытворчасці, сума прыбыткаў, якія ўвахо-

дзяць у кошт, залежыць ад моманту выдаткоўвання гэтай колькасці працы.

Калі праз L_{a1} пазначыць неабходную для вытворчасці тавару А працу папярэдняга года, праз L_{a2} — працу двухгадовай даўніны і г. д., дык можна напісаць наступнае раўнанне:

$$L_a w + L_{a1} w(1+r) + \ldots + L_{an} w(1 + r)^n = A p_a.$$

Дадзенае раўнанне азначае, што менавая вартасць нейкай прадукцыі роўная суме заробкаў, выплачаных у розныя перыяды, плюс атрыманыя ад гэтых заробкаў працэнты, якія вылічваюцца на падставе сярэдняй нормы прыбытку, вызначанай праз норму заробку. Тады мы па-новаму развязваем праблему ўтварэння цэнаў, якая так доўга хвалявала эканамістаў і падзяляла іх.

Сістэма Срафы фундаментальна адрозніваецца ад неакласічнай тэорыі агульнай раўнавагі з прычыны яго адмовы атаясамліваць даходы ад працы і капіталу з некаторымі коштамі, утворанымі такім жа чынам, як і цэны на тавары, якія ў сваю чаргу залежаць ад умовы роўнасці паміж попытам і прапановай "паслугаў" гэтых "фактараў вытворчасці" на адпаведных рынках. Сістэма, пра якую мы вядзем гаворку, прэтэндуе толькі на тлумачэнне ўтварэння цэнаў на тавары праз ровень заробкаў як зададзеную велічыню. Адначасова вытлумачваецца і норма прыбытку, пры тым што адзіная ўмова эканамічнай раўнавагі — аднолькавая велічыня гэтай нормы ва ўсіх галінах вытворчасці. Такім чынам, параўнальна з неакласічнай гэта больш абмежаваная, але адначасова і больш грунтоўная сістэма.

Сапраўды, Срафа вяртае нас да класічнай умовы раўнавагі: аднолькавай велічыні нормы прыбытку. З гэтага моманту пры вытлумачэнні ўтварэння цэнаў гіпотэза пра дасканалую канкурэнцыю зусім не такая ўжо і неабходная. З другога боку, несупадзенне праблемы ўтварэння даходаў з праблемай утварэння цэнаў азначае несупадзенне апошняй з праблемай занятасці. У сістэме Срафы занятасць — гэта зададзеная велічыня, калі колькасць працы L_a, L_b,..., L_k — вядомая.

Паўстае пытанне наконт існавання сувязі паміж аналізам Срафы і тэорыяй працоўнай вартасці. У кнізе аўтар не

дае адказу на гэтае пытанне. На практыцы пры разглядзе заробкаў, якія ўваходзяць у кошт прадукту як аплата колькасці працы, затрачанай пад час паслядоўных перыядаў часу, Срафа пацвярджае пэўную сваю прыхільнасць да Рыкарда і Маркса. Аднак у гэтым няма ніякай неабходнасці. Насамрэч, заробкі, выплачаныя за выраб пэўнага сродку вытворчасці, выкарыстанага ў вытворчасці пэўнага тавару, — гэта заробкі, выплачаныя ў той жа разгляданы перыяд, бо прадпрыемства, якое выкарыстоўвае нейкі сродак вытворчасці, дадае да выдаткаў вытворчасці кошт гэтага сродку вытворчасці, які залежыць ад выплачаных заробкаў з боку вытворцы сродкаў вытворчасці. Калі, паводле сістэмы Срафы, выплачаныя за вытворчасць аднаго сродку вытворчасці заробкі памножаныя, напрыклад, на $(1 + r)$, дык гэта не таму, што яны былі выплачаныя ў папярэднім годзе, а таму, што вытворца сродку вытворчасці аплочвае свой капітал і гэтая аплата ўваходзіць у выдаткі вытворчасці канчатковага прадукту.

Вельмі цікавы ў сістэме Срафы ягоны падыход да вытлумачэння цэнаў. Перш за ўсё ён разглядае эканоміку як галіну, дзе "вырабляецца дакладна столькі, каб забяспечыць яе саму". Але пры жаданні грамадства "забяспечваць самога сябе" неабходны дакладна вызначаны абмен прадуктамі ва ўсіх "галінах эканамічнай дзейнасці". Ідэя набывае велізарнае значэнне дзеля таго, што вартасць тавараў ужо вызначаецца не на падставе нейкай прычыны (карыснасць або праца), а праз *канчатковую мэту*.

Пры досыць высокай грамадскай прадукцыйнасці пэўная цана тавараў вызначаецца для забеспячэння пэўнага роўню жыцця насельніцтва і адначасова для падтрымання пэўнага роўню чыстых інвестыцыяў. Менавіта праз гэта тавары і набываюць пэўную вартасць. Калі б тэзіс Срафы наконт вартасці тавараў (завуалявана выказаны ім у навуковых працах) практычна скарыстаць у даследваннях гэтага асноватворнага пытання палітычнай эканоміі, дык яны пайшлі б у больш плённым кірунку.

§ 5. Спробы сфармуляваць закон размеркавання даходаў

У сучасны перыяд неакласічная тэорыя размеркавання даходаў ператварылася ў аб'ект настойлівай крытыкі з боку эканамістаў, якія, аднак, зусім не прыхільнікі Марксавай сістэмы. Нагадаем, у прыватнасці, вядомы артыкул Нікаласа Калдора *"Альтэрнатыўныя тэорыі размеркавання"*[1]. Зняпраўджванне гэтай тэорыі назіралася і ў працы Срафы, пра якую мы ўжо гаварылі.

Мы бачылі, што вартасць вытворчасці Ap_a залежыць ад колькасці працы, неабходнай для гэтай вытворчасці, заробку і нормы прыбытку наступным чынам:

$$L_a w + L_{a1} w(1 + r) + \ldots + L_{an} w(1 + r)^n = Ap_a.$$

Пры паніжэнні заробку і павелічэнні нормы прыбытку (абедзве з'явы ўзаемазвязаныя) велічыня першых складнікаў левай часткі гэтага раўнання памяншаецца і наадварот — велічыня апошніх складнікаў спачатку павялічваецца, а потым паніжаецца (пры ўмове, што n дастаткова вялікае). Калі норма прыбытку сапраўды павялічваецца, дадатковы прыбытак, неабходны для ўскосных выдаткаў працы, павінны быць большы (пры дастаткова вялікім n) за зэканомленыя сродкі, атрыманыя праз адпаведнае памяншэнне стаўкі заробку. Аднак немагчыма, каб гэта адбывалася бясконца, бо надыходзіць момант, калі праз павелічэнне нормы прыбытку заробак набліжаецца да 0. Тады неабходна, каб выраз $L_{an} w(1 + r)^n$ таксама памяншаўся, набліжаючыся да 0.

Разгледзім два метады, якія дазваляюць вырабіць тавар пры розных выдатках працы, па-рознаму размеркаваных у часе. Напрыклад, пры норме прыбытку 0 — 4% першы метад горшы за другі, бо патрабуе параўнальна вялікай прапорцыі "набліжаных" да нуля выдаткаў на заробкі. Пры норме прыбытку 4 — 12% першы метад лепшы, бо павялічваецца вага "аддаленых" ад нуля выдаткаў на заробкі праз павелічэнне прыбыткаў, неабходных для гэтых выдаткаў.

[1] *Alternative theories of distribution // Review of Economic Studies. 1955–1956.*

Нарэшце, калі норма прыбытку перавышае 12%, дык першы метад зноў становіцца горшы, бо вага аддаленых выдаткаў зноў памяншаецца.

Такім чынам, адна з асноўных высноваў кнігі Срафы наступная: калі пэўнае павелічэнне нормы прыбытку можа выклікаць пераход ад другога метаду да першага, дык новае павелічэнне гэтай нормы тым больш выклікае вяртанне да першага метаду. Але гэта цалкам супярэчыць неакласічнай гіпотэзе, згодна з якой павелічэнне даходаў ад капіталу ўсё больш і больш адпрэчвае "капіталістычныя" метады вытворчасці. Пры гэтым ніколі не назіраецца вяртання да ўжо адкінутых метадаў.

На жаль, мы не маем шмат чаго сказаць пра высновы з даследвання Срафы. Часткова гэтыя высновы ўжо зроблены шмат якімі эканамістамі, асабліва італьянскімі, пад час навуковых спрэчак, дзе яны супрацьстаялі Полу Сэмуэльсану і аднаму з ягоных вучняў Д. Левары.

П. Сэмуэльсан і Д. Левары ў адказ на заўвагу Джоан Робінсан сцвярджалі, што калі нейкая тэхналогія вытворчасці была пакінутая ў выніку паніжэння нормы працэнта, дык немагчыма, каб адбылося вяртанне да яе зноў пры яшчэ большым паніжэнні гэтай нормы[1]. Аднак Луіджы Л. Пазінэці і шмат іншых аўтараў нядаўна даказалі, што Срафа меў рацыю ў сваёй спрэчцы з Сэмуэльсанам. Апошні, дарэчы, у кароткім артыкуле прызнаў сваю памылку[2].

У заўвазе да апошняга выдання сваёй *"Эканомікі"* Сэмуэльсан разглядаў феномен вяртання да ўжо адкінутага метаду як "адмысловасць" аналізу, якая "ў самых перадавых трактатах" дазваляе крыху ўдакладніць закон спадальнай прыбытковасці капіталу[3]. Але ягоныя супраціўнікі лічылі наадварот: для іх адзначанае пытанне асноватворнае. "Наконт гэтага пытання, — пісаў Пазінэці ў заканчэнні аднаго

[1] *P. A. Samuelson. "A new theorem of non substitution" in Money, growth and Methodology and other essays in Economics in Honor of Johan Akerman. Lund, 1961; D. Levhari. A non substitution theorem and surtching of techniques // Quarterly Journal of Economics, 1965, p. 98—105.*

[2] *"The non switching theorem is false", Quarterly Journal of Economics, nov. 1966, pp. 518—519.*

[3] *Economics, 7e éd., p. 588, n. 5.*

са сваіх артыкулаў, — паўстае вельмі простая выснова: здаецца, што тэорыя капіталу ўся цалкам трапіла ў пастку старога ладу мыслення. Без усялякіх доказаў (ці не было гэта ў былыя часы ладам мыслення, да якога прызвычаіліся эканамісты?) лічылася пэўным, што пры кожным стане тэхнічных ведаў выкарыстанне асноўнага капіталу (які становіцца выгадны) пры больш высокай норме прыбытку заўсёды мае на ўвазе выкарыстанне меншай "колькасці капіталу" на чалавека. Зроблены вышэй аналіз паказвае, што гэта не абавязкова так; увогуле, нельга чакаць нейкай сувязі паміж кірункам зменаў у норме прыбытку і кірункам зменаў у "колькасці капіталу" на чалавека"[1].

П. Гарэньяні са свайго боку на заканчэнне крытыкі памылковай тэарэмы Сэмуэльсана і Левары сцвярджаў: "Магчымасць... "вяртання" сістэмы супярэчыць асноватворнай ідэі тэорыі вытворчасці і размеркавання, якая дамінавала на працягу сямі або васьмі апошніх дзесяцігоддзяў... Наступствы гэтага былі вялікія, бо на грунце такога прынцыпу ўзведзена панавальная тэорыя размеркавання. За павелічэннем у эканоміцы стасункаў капіталу і працы былі выведзены "функцыі попыту" на "капітал" (гэта значыць на "ашчаджанне") і на працу і разам з тым ідэя размеркавання праз тэндэнцыю да выраўноўвання попыту і прапановы на гэтыя "фактары вытворчасці". Ад гэтага, у прыватнасці, пазыковы працэнт (прыбыткі) вытлумачваўся праз "рэдкаснасць капіталу" і як аплата "чаканняў". Цяжка прасачыць, у якой ступені лагічная гэтая складаная пабудова, калі ейны падмурак такі хісткі"[2].

Калі адхіліць неакласічную тэорыю размеркавання даходаў, дык чым яе можна замяніць? Шматлікія спробы адказаць на гэтае пытанне, як мы ўбачым, пакуль што нездавальняльныя.

А) Тэорыя размеркавання Калецкага

Побач з мадэллю тлумачэння эканамічнага цыкла Міхал

[1] *Quarterly Journal of Economics, nov. 1966, pp. 516–517.*

[2] *Quarterly Journal of Economics, nov. 1966, pp. 561–565. Рэзюме дыскусіі і поўная бібліяграфія прыведзеныя ў даследванні: G. C. Harcourt. Some Cambridge Controversies in the theory of Capital // The Journal of Economic Literature, juin 1969, pp. 369–406.*

Калецкі прапанаваў шматлікія тэзісы наконт размеркавання нацыянальнага даходу, асобныя з якіх набылі вялікае значэнне[1], у прыватнасці надзвычай дакладная ягоная думка пра паходжанне прыбытку ад капіталу. У сваіх разважаннях Калецкі зыходзіць з паняцця "валавога прыбытку", гэта значыць з прыбытку (у звычайным сэнсе) і сумы чыстых інвестыцыяў, неабходнай для замены ўжо "спажытых" матэрыяльных сродкаў вытворчасці. З прычыны нязвыкласці гэтага азначэння карысна крыху змяніць ход разважанняў аўтара, каб яны былі больш зразумелыя.

Нацыянальны даход краіны, сцвярджаў аўтар, складаецца з сумы чыстых інвестыцыяў і штогадовага спажывання. Але ён роўны таксама і суме заробкаў і прыбыткаў (у звычайным сэнсе гэтага тэрміна). Калі R — нацыянальны даход, S — заробкі, P — прыбыткі, I — інвестыцыі, C*c* — спажыванне капіталістаў і C*w* — спажыванне найманых працаўнікоў, дык

$$R = I + Cc + Cw,$$

$$R = S + P,$$

або

$$I + Cc + Cw = S + P.$$

Дапускаючы разам з Калецкім, што ашчаджанне найманых працоўных — велічыня нязначная, атрымаем

$$Cw = S.$$

Тады раўнанне набывае наступны выгляд:

$$I + Cc = P.$$

Гэта азначае, што прыбыткі роўныя суме інвестыцыяў і спажывання капіталістаў.

Каб падкрэсліць значнасць атрыманага выніку, трэба яшчэ крыху змяніць прапанаваную аўтарам канцэпцыю прыбытку. Для Калецкага прыбыткі (у звычайным сэнсе) падлічваюцца складаннем "чыстых неразмеркаваных прыбыткаў, дывідэндаў, працэнтаў ад капіталу, рэнтаў"[2]. Але нельга

[1] *Гл. A theory of profits // Economic Journal, juin–septembre 1942.*

[2] *Гл. названы артыкул, надрукаваны ў: M. Kalecki // Studies in economic dynamics, p. 47.*

складваць дывідэнды і працэнты, *што выплочваюцца* на працягу пэўнага перыяду часу, з "неразмеркаванымі прыбыткамі", якія знаходзяцца толькі на рахунках прадпрыемстваў і для выплаты не скарыстоўваюцца. Значыцца, у нашым аналізе неабходна адрозніваць *выплачаныя* прыбыткі, пазначаныя як P*p*, і *рэалізаваныя* — P*r*. Цяпер атрыманае намі раўнанне павінна мець наступны выгляд:

$$I + Cc = Pr.$$

Спажыванне ж капіталістаў C*c* роўнае прыбыткам, якія ім выплочваюцца, з выняткам сумаў E, якія яны ашчаджаюць. Тады атрымаем выраз

$$I + Pp - E = Pr$$

або

$$Pr = Pp + (I - E).$$

Такім чынам, рэалізаваныя прадпрыемствамі прыбыткі роўныя прыбыткам, якія яны выплочваюць, з выняткамі розніцы паміж інвестыцыямі, што ажыццяўляюць прадпрыемствы, і ашчаджаннем капіталістаў. Гэтая розніца адлюстроўвае інвестыцыі, якія прадпрыемствы фінансуюць са сваіх даходаў (самафінансаванне) і праз банкаўскія крэдыты. Значыцца, рэалізаваныя ў эканоміцы прыбыткі роўныя суме выплачаных прыбыткаў і інвестыцыяў, фінансаваных не праз ашчаджанне. Перад намі формула, якая, безумоўна, вельмі дакладна паказвае працэс утварэння прыбыткаў прадпрыемстваў.

Урэшце праз нязначныя змены ў аналізе Калецкага ўзнікла магчымасць асвятліць асноватворны аспект капіталістычнай эканомікі. Капіталісты, на думку Калецкага, вызначаюць суму прыбыткаў на падставе свайго спажывання і інвестыцыяў: яны зарабляюць тое, што трацяць, тым часам як найманыя працаўнікі трацяць тое, што зарабляюць. Удакладніўшы, што размова ідзе аб прыбытках, *рэалізаваных* прадпрыемствамі, выведзены закон, такім чынам, можна лічыць цалкам слушным.

Са сказанага вышэй не варта, дарэчы, рабіць выснову, што капіталісты зарабляюць "тое, што яны хочуць". Гэты

закон слушны толькі ў маштабе ўсёй эканомікі. Ніводнае асобнае прадпрыемства не можа прэтэндаваць на павелічэнне ўласных прыбыткаў праз размеркаванне большай колькасці дывідэндаў або павелічэнне самафінансавання.

Акрамя таго, Калецкі выказаў меркаванне, што доля прыбыткаў у нацыянальным даходзе краіны залежыць ад сярэдняга "роўню манаполіі на рынку" ўсіх прадпрыемстваў. Але пагадзіцца з гэтай ідэяй немагчыма. Сапраўды, пры аналізе дзейнасці ўсіх прадпрыемстваў відаць, што сума іхных прыбыткаў залежыць ад выплачаных заробкаў і, такім чынам, пры ўсіх іншых аднолькавых умовах прадпрыемствы могуць павялічыць свае прыбыткі, толькі паніжаючы заробкі. Размеркаванне ж нацыянальнага даходу залежыць ад стасункаў паміж найманымі працоўнымі і капіталістамі, якім бы пры гэтым ні быў "ровень манаполіі" прадпрыемстваў на рынку.

Б) Эканамічны рост і размеркаванне даходаў: тэорыя Джоан Робінсан і Нікаласа Калдора

Даследванні Гэрада і Домара наконт эканамічнага росту працягвалі два ангельскія эканамісты — Нікалас Калдор і Джоан Робінсан. Яны распрацавалі таксама надзвычай цікавую тэорыю размеркавання даходаў, кароткі агляд якой мы хацелі б зрабіць.

Абодва — і Робінсан, і Калдор — вучні Кейнса, на якіх у пэўны момант іхнай кар'еры таксама паўплывала марксісцкая эканамічная тэорыя[1]. У Маркса, а таксама ў Рыкарда Робінсан і Калдор знайшлі ідэю наконт залежнасці інвестыцыяў ад сярэдняй нормы прыбытку і выкарысталі яе для далейшай распрацоўкі даследванняў Гэрада і Домара.

1. ДЖОАН РОБІНСАН. У 1956 г. Джоан Робінсан выдала значную працу пад назовам *"Назапашванне капіталу"*[2], асноўныя тэзісы якой былі паўтораны ў больш ёмістым яе творы *"Нарысы па тэорыі эканамічнага росту"*[3].

---

[1] *Гл., у прыватнасці, кнігу: I. Robinson. An essay on marxian economics. London, 1942. У гэтай працы часта падаюцца вельмі спрэчныя інтэрпрэтацыі марксісцкай тэорыі.*

[2] *The accumulation of capital, London, 1956.*

[3] *Essays in the theory of economic growth, London, 1962.*

Мы спынімся на галоўным дасягненні Дж. Робінсан — яе сапраўды арыгінальнай спробе вызначыць сувязь паміж роўнем эканамічнага росту і размеркаваннем нацыянальнага даходу. Перш за ўсё, на яе думку, норму прыбытку вызначае ровень інвестыцыяў. Сума прыбыткаў павінна быць такой, каб нармальнае ашчаджанне цалкам адпавядала інвестыцыям. Значыцца, прыбыткі павінны дасягнуць пэўнай сумы пры ажыццяўленні інвестыцыяў на гэтую ж суму.

З другога боку, ровень назапашвання (або інвеставання) залежыць ад нормы прыбытку з прычынаў, ужо асветленых Рыкарда.

З гэтай падвойнай залежнасці вынікае такая з'ява, калі абумоўленая пэўным роўнем інвестыцыяў норма прыбытку дакладна адпавядае той яе велічыні, якая мае тэндэнцыю выклікаць такі ж ровень інвестыцыяў.



На малюнку крывая A паказвае норму прыбытку пры розных роўнях інвеставання, а крывая I — ровень інвестыцыяў пры розных нормах прыбытку. Калі ў пэўны момант ровень інвестыцыяў складае 0*n*, дык норма прыбытку адпавядае 0*m*. Пры норме прыбытку 0*m* інвестыцыі павялічваюцца да 0*n'*. Тады да 0*m'* павялічваецца норма прыбытку і г. д., пакуль, нарэшце, не будзе дасягнуты пункт D, дзе ровень назапашвання і норма прыбытку адпавядаюць адно аднаму. З гэтага моманту рытм эканамічнага росту нязменны, як і размеркаванне нацыянальнага даходу.

2. НІКАЛАС КАЛДОР. У гэты ж перыяд Нікалас Калдор сфармуляваў тэорыю размеркавання даходаў, таксама заснаваную на тэорыі Кейнса[1]. Другі яе варыянт, больш распрацаваны і спалучаны з аналізам эканамічнага ўздыму, быў выказаны даследнікам у 1957 г.

У спрошчаным выглядзе тэорыю размеркавання Калдора можна выказаць наступным чынам (калі дапусціць, што ў найманых працоўных няма ашчаджанняў): R — нацыянальны даход; S — сума заробкаў; P — сума прыбыткаў; E — нармальнае ашчаджанне; I — інвестыцыі. Відавочна, што

$$R = S + P.$$

З другога боку, дзеля спрашчэння дапускаем, што ашчаджанне ўяўляе сабой нязменную прапорцыю прыбыткаў, і тады

$$E = \alpha P.$$

Падзяліўшы кожны з абодвух складнікаў гэтага выразу на R, атрымаем

$$\frac{E}{R} = \alpha \frac{P}{R}.$$

Але ў стане раўнавагі нармальнае ашчаджанне павінна цалкам адпавядаць інвестыцыям. Значыцца, у папярэднім раўнанні E замяняем на I і атрымліваем наступны выраз:

$$\frac{I}{R} = \alpha \frac{P}{R}$$

або

$$\frac{P}{R} = \frac{1}{\alpha} \cdot \frac{I}{R}.$$

І тут аўтар сцвярджае, што P/R — доля прыбыткаў у нацыянальным даходзе залежыць ад I/R — роўню інвестыцыяў і ад α — схільнасці капіталістаў да ашчаджання. Дзеля таго што доля найманых працоўных у нацыянальным даходзе складае (R - P)/R або (1 - P)/R, вызначаецца яна адначасова з P/R.

[1] *Alternative theories of distribution // Review of Economic Studies, 1955–1956, vol. XXIII, pp. 83–101.*

Такое вытлумачэнне размеркавання нацыянальнага даходу выглядае спакуслівым. Тым не менш яно грунтуецца на вельмі спрэчнай інтэрпрэтацыі прычынна-выніковых залежнасцяў паміж велічынямі атрыманага раўнання.

Калі P/R залежыць ад I/R, дык норма прыбыткаў P/K (K — сукупны капітал) у сваю чаргу таксама залежыць ад роўню інвестыцыяў. Сапраўды, калі дапусціць, што R/K (стасунак прадукту і капіталу) — гэта нейкая зададзеная велічыня, дык P/K, якое адпавядае (P/R)·(R/K), змяняецца так, як і P/R. А залежнасць, якую ўжо даўно спраўдзілі шматлікія эканамісты, супрацьлеглая: ровень інвестыцыяў залежыць ад нормы прыбыткаў.

Дарэчы, Калдор і сам заўважыў сваю памылку, і менавіта гэтая акалічнасць садзейнічала таму, што ён пабудаваў мадэль, дзе аналіз размеркавання даходаў спалучаецца з аналізам эканамічнага росту.

У даследванні, названым *"Мадэль эканамічнага росту"*[1], Нікалас Калдор сцвярджаў, што ровень інвестыцыяў I/R і ровень ашчаджанняў E/R залежаць ад долі прыбыткаў у нацыянальным даходзе P/R. Гэтыя залежнасці пазначаюцца адпаведна праз дзве лініі — II' (інвестыцыі) і EE' (ашчаджанне). Абедзве лініі перакрыжоўваюцца ў пункце A, і лінія EE' больш нахіленая, чым II', як паказана на наступным графіку.



Калдор імкнуўся даказаць, што каардынаты пункта A адначасова паказваюць і ровень інвестыцыяў у эканоміку, гэта значыць ровень яе росту, і эфектыўную долю прыбыткаў у нацыянальным даходзе, гэта значыць размеркаванне нацыянальнага даходу. Калі на момант уявіць, што P/R перавышае ардынату кропкі A, дык у такім разе E/R большае за I/R. Як сцвярджаў Калдор, гэта

[1] *A model of economic growth, The Economic Journal, décembre 1957.*

павінна выклікаць агульнае паніжэнне цэнаў, бо тады, як паказваецца ў Кейнсавай тэорыі, сукупны попыт на тавары меншы за сукупную іх прапанову. Такое паніжэнне скарачае суму прыбыткаў, а значыцца, і долю прыбыткаў у нацыянальным даходзе. Паколькі стасунак P/R памяншаецца, адбываецца набліжэнне да пункта A. Даследнік імкнуўся даказаць, што пры P/R, меншым за ардынату пункта A, назіраецца павелічэнне цэнаў і P/R. Такім чынам, гэтая мадэль дазваляла б растлумачыць, чаму эканамічнае становішча пэўнай краіны паляпшаецца ў пэўным тэмпе і як у яе нацыянальным даходзе размяркоўваюцца прыбыткі і заробкі.

У дачыненні да функцыі, паказанай праз крывую II', схема Калдора ідэнтычная схеме Джоан Робінсан: у абодвух выпадках адлюстроўваюцца ваганні роўню інвестыцыяў у залежнасці ад нормы прыбыткаў. У Калдора доля прыбыткаў у нацыянальным даходзе (P/R) размешчана на восі ардынатаў. Ён, між іншым, дапускаў, што стасунак сукупных інвестыцыяў і нацыянальнага даходу (K/R) — гэта пэўная велічыня. Калі $P/R=P/K \cdot K/R$, дык атрымаем залежнасць

$$\frac{I}{R}=f\left(\frac{P}{R}\right).$$

Наконт крывой EE' схемы Калдора і Джоан Робінсан адрозніваюцца. Паводле Калдора, ровень ашчаджанняў E/R залежыць ад долі прыбыткаў у нацыянальным даходзе P/R. Джоан Робінсан, наадварот, сцвярджала, што ровень інвестыцыяў вызначае норму прыбытку і (калі каэфіцыент капіталу — велічыня зададзеная) долю прыбыткаў у нацыянальным даходзе. Інакш кажучы, у Калдора паўстае наступная залежнасць:

$$\frac{E}{R}=f\left(\frac{P}{R}\right),$$

тым часам як у Джоан Робінсан яна набывае выгляд

$$\frac{P}{R}=f\left(\frac{I}{R}\right).$$

Паколькі I/R заўсёды павінна адпавядаць E/R, дык апошняя залежнасць можа выглядаць таксама, як

$$\frac{P}{R} = f\left(\frac{E}{R}\right).$$

Абодва аўтары выкарыстоўваюць адну і тую ж залежнасць, але адзін з іх незалежнай зменнай велічынёй выбірае тую, якая ў другога залежная. Гэтым і адрозніваюцца два падыходы да працэсу, які абумоўлівае існаванне эканамічнай раўнавагі. Калдор зыходзіць з пэўнага размеркавання нацыянальнага даходу і канстатуе, што пры такім размеркаванні паказнікі інвестыцыяў і ашчаджання разыходзяцца. Джоан Робінсан разглядае таксама пэўны ровень інвестыцыяў і сцвярджае, што размеркаванне даходу, неабходнага для фінансавання разгляданых інвестыцыяў, выклікае іншы ровень інвестыцыяў.

Нягледзячы на такое адрозненне, абедзве тэорыі дастаткова падобныя і крытыкаваць іх можна разам. У абодвух выпадках адна з высноваў аналізу даследнікаў — сцвярджанне пра існаванне простай прычынна-выніковай залежнасці паміж нормай прыбытку і роўнем інвестыцыяў. Інвестыцыі вызначаюцца праз норму прыбытку. Перад намі вельмі вузкамеханістычны погляд на эканамічную рэчаіснасць, які, між іншага, адлюстроўвае пэўную безабароннасць Кейнсава аналізу.

Не адпавядае рэальнасці і меркаванне, што ў эканоміцы пры пэўным роўні сярэдняй нормы прыбытку капіталісты жадаюць "любым коштам" здзейсніць дакладна вызначаны памер інвестыцыяў. Насамрэч, калі праўда, што з кароткатэрміновага гледзішча інвестыцыі, фінансаваныя праз крэдыт, адыгрываюць вызначальную ролю, дык сума інвестыцыяў на доўгатэрміновы перыяд вельмі значна залежыць ад памераў ашчаджанняў, якія штогод вызваляюцца.

Тут кейнсіянцы сталі ахвярамі абсалютнага падзелу інвестыцыяў і ашчаджанняў, уведзенага іхным настаўнікам. Але калі класічны і неакласічны падыход, дзе дапускалася існаванне заўсёды дасканалага выраўноўвання ашчаджан-

няў і інвестыцыяў праз уплыў нормы працэнта, недакладны, дык дыяметральна супрацьлеглы тэзіс Кейнса, безумоўна, занадта празмерны. Трэба сказаць, што шмат у якіх выпадках недахоп ашчаджанняў прымушае адмовіцца ад некаторых магчымых інвестыцыяў, не выклікаючы пры гэтым напругі ў эканоміцы, якая б абумовіла глыбокія змены ў размеркаванні нацыянальнага даходу.

Больш за тое, зусім неверагодна, што атрыманае ў эканоміцы павелічэнне нормы прыбытку заўсёды падштурхоўвае капіталістаў да павелічэння інвестыцыяў. Рыкарда і Маркс сцвярджалі (і гэта выдатна спраўдзілася), што для развіцця інвестыцыяў неабходна *мінімальная* норма прыбытку. Але гэта не азначае, што сума інвестыцыяў абавязкова павялічыцца пры павелічэнні нормы прыбытку. Ажыццяўленне інвестыцыяў залежыць ад шматлікіх фактараў, у прыватнасці ад тэхнічных інавацыяў, і ў першую чаргу, на нашую думку, ад пашырэння рынкаў збыту. Джоан Робінсан і Нікалас Калдор улічваюць гэты фактар, але жаданне, якое падзяляюць шмат эканамістаў, знайсці механічнае і "эндагеннае" тлумачэнне эканамічных працэсаў, абумоўлівае ўзнікненне ў іх ідэі пра дадатковую каўзальнасць. Аднак існаванне гэтай з'явы вельмі спрэчнае.

Посткейнсава тэорыя размеркавання прываблівае тым, што праз яе, здаецца, можна вытлумачыць агульную эвалюцыю капіталізму. Лічыцца, што ў першыя гады індустрыялізацыі доля прыбыткаў у нацыянальным даходзе была вялікая з прычынаў моцнай схільнасці суб'ектаў эканомікі да інвеставання. Потым жа ў ім павялічваецца доля заробкаў, бо гэтая схільнасць памяншаецца.

Такое тлумачэнне часткова праўдзівае, аднак даволі празмернае, каб пры вызначэнні названых феноменаў можна было дапусціць, што праз нейкі механізм яны з'яўляюцца аўтаматычна. У такім аспекце гаварыць пра эканамічны закон размеркавання немагчыма. Калі б у адвечным руху капіталізму наперад (пры рэгулярным павелічэнні прадукцыйнасці працы) не павялічваўся рэальны заробак, дык доля прыбыткаў, а значыцца, і доля ашчаджанняў у нацыянальным даходзе сталіся б такія значныя, што перашкаджа-

лі б далейшаму пашырэнню вытворчасці. Зразумела таксама, што калі б доля прыбыткаў была занадта малая, дык і норма прыбытку надзвычай панізілася б і больш не існавала б магчымасці развіваць інвестыцыі. Але якім чынам доля прыбыткаў знаходзілася ў толькі што акрэсленых намі межах? Гэта дасягалася галоўным чынам праз дзеянні рабочых арганізацыяў, якія вымушалі капіталістаў павышаць заробкі.

Безумоўна, можна сцвярджаць, што пры павелічэнні прадукцыйнасці працы павінны павялічыцца і заробкі. Але гэта не азначае, што павелічэнне заробкаў — працэс натуральны, незалежны ад волі людзей. Ён дасягаецца праз сацыяльную барацьбу, разгортванне якой не мае нічога агульнага з працэсам забеспячэння раўнавагі паміж інвестыцыямі і ашчаджаннямі.

Бібліяграфія

Выдатны крытычны выклад сучаснага стану эканамічнай тэорыі змешчаны ў наступным творы: Poulon E. Macroéconomie approfondie. Paris, Edition Cujas, 1982.

Таксама можна звярнуцца да пададзеных ніжэй працаў:

M. Blaugh, *Economic Theories, true or false*, Aldershot, 1990.

A. S. Eichner, *Toward a new economics*, London, 1985.

P. Garegnani, *Le capital dans les théories de la répartition,* 1960, trad. franç., Grenoble, 1980.

C. Napoleoni, *Economic thought of the twentieth century*, London, 1972.

J. W. Baumol and S. A. Blinder, *Economics, Principles and Policy*, New York, 1979.

Раздзел II

УРОКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ У КРАІНАХ УСХОДНЯЙ ЭЎРОПЫ

Даволі часта сцвярджаюць, што ў палітычнай эканоміі, як і ў гуманітарных навуках, адкрыцці немагчыма пацвердзіць эксперыментам. Аднак гэта не зусім так. Буйнамаштабны сацыяльна-эканамічны эксперымент адбываўся ў краінах Усходняй Эўропы з 1917 да 1989 г. Там спрабавалі эканоміку навачаснага тыпу прымусіць функцыянаваць, замяніўшы прыватныя прадпрыемствы на дзяржаўныя, а рынак — планам. І хоць названы эксперымент ажыццяўляўся ва ўмовах абсалютнай дыктатуры кіраўнікоў адзінае партыі, усё ж такі ён выклікаў пэўныя дэбаты нават у саміх гэтых краінах. Аднак перад тым, як прапанаваць нашыя развагі наконт наступстваў такога досведу, варта зрабіць кароткі агляд тых дыскусіяў.

§ 1. Праблема захавання закону вартасці

Як мы бачылі, у савецкай планавай эканоміцы насуперак поглядам самога Маркса захаваліся грошы і грашовы абмен. У выніку гэтага паўстае наступнае пытанне: у якой ступені ў такой эканоміцы ўсё залежыць ад волі планавіка ці, наадварот, існуюць "эканамічныя законы", вышэйшыя за яго?

Перш-наперш паўстала праблема наконт коштаў[1]. Відавочна, што ў Савецкім Саюзе кошты вельмі часта фіксаваліся ў залежнасці ад асобных мэтаў, якіх імкнуліся дасягнуць у той ці іншы момант. Так, напрыклад, каб спрыяць масаваму выкарыстанню найноўшых машынаў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, на іх былі ўсталяваныя цэны, вельмі часта ніжэйшыя за іхны сабекошт. З другога боку, дзеля таго што практычна ўсе сяляне былі аб'яднаныя ў кааператывы (калгасы) і таму атрымлівалі заробкі ў залежнасці ад даходаў сваіх калгасаў, дык і даходы іх вызначаў фіксаваны ровень цэнаў на сельскагаспадарчыя прадукты. На працягу

[1] *Гл. пра гэта твор аўтара гэтай кнігі (Henri Denis), напісаны ў супрацоўніцтве са сп. Marie Lavigne: Le problème des prix en Union soviétique. Paris, 1965.*

доўгага часу цэны на сельскагаспадарчыя прадукты вызначаліся такім чынам, што сярэдні даход сялянаў заставаўся значна ніжэйшы за сярэдні заробак у прамысловасці і гандлі, што спрыяла набору новых рабочых і службоўцаў у вёсцы і, акрамя таго, дазваляла ствараць фонды інвестыцыяў.

Аднак вельмі хутка стала відавочна, што немагчыма абысціся без агульнай нормы коштаў. Больш за тое, трэба было высветліць, што ў нармальным стане ўяўляе сабой цану асобнага прадукту. Па сутнасці, павелічэнне або памяншэнне гэтай цаны можна спрабаваць вытлумачыць праз тую ці іншую канкрэтную неабходнасць. Але па-сапраўднаму задавальняць патрабаванням эканомікі гэта будзе толькі тады, калі можна сказаць: цана на пэўны тавар у нармальных абставінах павінна фіксавацца на пэўным роўні; мы яе павышаем або паніжаем у *дачыненні да нармальнага роўню* згодна з той ці іншай мэтай.

У выніку неўзабаве зацвердзілася ідэя, што ў савецкай планавай эканоміцы сярэдні кошт нейкага тавару павінен адлюстроўваць *вартасць* гэтага тавару, гэта значыць колькасць грамадска неабходнай для ягонай вытворчасці працы. Такім чынам, было прызнана, што "закон вартасці" ў савецкай эканоміцы існуе. Але мы бачылі, што, паводле Маркса, у сацыялістычнай эканоміцы вартасць мусіла знікнуць[1]. Трэба было пагадзіцца, што або савецкая планавая эканоміка не цалкам сацыялістычная, або тэзіс Маркса няслушны. Апошняе, па сутнасці, было выказана дырэктарам Дзяржплана[2] Вазнясенскім у ягонай працы *"Ваенная эканоміка ў СССР"*, выдадзенай у 1948 г. Ён заўважаў, што ў Савецкім Саюзе абмен адбываецца паводле закону, які знаходзіцца па-над планавіком.

"Закон вартасці, — пісаў Вазнясенскі, — кіруе не толькі размеркаваннем тавараў, але і размеркаваннем рэсурсаў паміж усімі галінамі народнай гаспадаркі... Планавік абавязаны паважаць пэўныя прапорцыі паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, паміж вытворчасцю спа-

[1] *Гл. вышэй, с. 452.*

[2] *Орган, закліканы распрацоўваць эканамічныя планы і кантраляваць іх выкананне.*

жывецкіх тавараў і сродкаў вытворчасці, паміж развіццём вытворчасці і транспарту, паміж інвестыцыямі і спажываннем"[1].

Неўзабаве паводле загаду Сталіна Вазнясенскі быў ліквідаваны. Аднак праблема эканамічных законаў не магла заставацца неразвязаная. У 1953 г. сам Сталін паспрабаваў высветліць яе ў сваім невялікім творы *"Эканамічныя праблемы сацыялізму ў СССР"*. У гэтай працы аўтар імкнуўся знайсці кампраміс паміж прыхільнікамі і супраціўнікамі эканамічных законаў. Ён прызнаў, што закон вартасці ў СССР існуе, бо надзённыя патрэбы вымусілі захаваць у сельскай гаспадарцы не зусім сацыялістычную форму вытворчасці — *калгас*. "Сяляне, — пісаў Сталін, — распараджаюцца сваёй вытворчасцю як уласным таварам"[2]. Яны не жадаюць збываць сваю прадукцыю, пакуль ім за яе не будуць прапанаваныя прымальныя для іх цэны. Менавіта таму і захаваўся закон вартасці. Трэба, напрыклад, як казаў Сталін, на бавоўну фіксаваць больш высокую цану, чым на збожжа, бо бавоўна, "як сведчаць сусветныя цэны", даражэйшая. "Калі б мы не ўсталявалі вышэйшага кошту на бавоўну, — дадаваў ён, — дык зруйнавалі б земляробаў і засталіся б без бавоўны"[3].

Між іншага, Сталін не пагаджаўся, што закон вартасці — гэта ўвогуле "рэгулятар" вытворчасці. Асабліва адмоўна ставіўся ён да таго, што рашэнні наконт інвестыцыяў могуць залежаць ад разважанняў пра вартасць выпрацаваных тавараў, гэта значыць пра рэнтабельнасць капіталу. Сталін сцвярджаў, што можна цудоўна прымаць пастановы наконт развіцця галінаў вытворчасці, якія не прыносяць аніякага прыбытку.

Такім чынам, паводле канцэпцыі Сталіна, уздзеянне закону вартасці ў эканоміцы СССР было абмежаванае. Ён зазначаў, што "на другой фазе камуністычнага грамадства" знікнуць і абмен, і вартасць[4]. Погляды Сталіна маглі б разглядацца як намаганне ўсталяваць кампраміс паміж ідэямі Маркса і савецкай практыкай. Але ў хуткім часе стала віда-

[1] *Op. cit., trad. franç. Paris, 1948, pp. 108—109.*
[2] *Op. cit., in Derniers écrits. Paris, 1953, p. 106.*
[3] *Ibid., p. 111.*
[4] *Ibid., p. 113.*

вочна, што гэты кампраміс не задавальняе патрабаванням часу. Аднак захаванне катэгорыі вартасці ў савецкім грамадстве абумоўлена зусім не такім характарам гэтага грамадства, якое Сталін вызначае як "не зусім сацыялістычнае". Гэта тлумачыцца неабходнасцю (каб пазбегнуць марнатраўства прадукцыйных сілаў) ва ўсіх аперацыях па планаванні ўлічваць эфектыўны сабекошт тавараў і сродкаў вытворчасці, а практычны сродак такой мэты — вызначаць цэны на прадукты.

§ 2. Пытанне рэнтабельнасці інвестыцыяў

Пасля смерці Сталіна ў 1953 г. адбыліся асобныя рэформы, накіраваныя на забеспячэнне большай аўтаноміі суб'ектаў гаспадарання, напрыклад, былі скасаваныя машынна-трактарныя станцыі, а сельскагаспадарчыя машыны прададзеныя *калгасам*. У сувязі з гэтымі зменамі шматлікія дыскусіі паміж савецкімі эканамістамі былі засяроджаныя на двух асноўных пытаннях — крытэрах укладання інвестыцыяў і прынцыпах вызначэння коштаў. Дарэчы, абодва пытанні шчыльна ўзаемазвязаныя, бо асноўнай праблемай, узнятай у дыскусіях пра кошты, была наступная: ці варта ўводзіць у савецкую эканоміку пазыковы працэнт ад капіталу?

Даводзілася нават сцвярджаць, што савецкая ўлада зрабіла вялікія памылкі ў галіне эканомікі. Амаль татальная адмова ад падліку рэнтабельнасці інвестыцыяў садзейнічала разгортванню гіганцкай працы па "пераўтварэнні прыроды" або на "вялікіх будоўлях камунізму" ў засушлівых рэгіёнах поўдня Расеі, якія прынеслі страшэнныя пакуты насельніцтву. Калі пасля Другой сусветнай вайны сістэма савецкага планавання была ўведзеная ў краінах народнай дэмакратыі, дык і там адзначаліся такія ж памылкі: напрыклад, у Будапешце распачалося будаўніцтва лініі метро, а потым на некалькі гадоў гэтую працу мусілі спыніць.

Аднак ужо ў 1958 г. ва ўрачыстай прамове на адкрыцці гіганцкай Куйбышаўскай электрастанцыі на Волзе М. Хрушчоў пакрытыкаваў аўтараў яе праекта за тое, што яны бралі ў разлік толькі сабекошт вырабленай энергіі (падлічаны без

уліку працэнта за інвеставаныя капіталы), не зважаючы пры гэтым ні на неабходны тэрмін будаўніцтва, ні на рэнтабельнасць укладзеных інвестыцыяў[1]. Насамрэч, нават у сталінскую эпоху ў некалькіх сектарах працягвалася праца па разліку рэнтабельнасці інвестыцыяў, накіраваная на распрацоўку лепшых метадаў вытворчасці. Тут ужывалася паняцце, якое таксама выкарыстоўваецца эканамістамі-практыкамі ў капіталістычным свеце: "тэрмін вяртання інвестыцыяў".

Тэхніка выкарыстання гэтага крытэру была, напрыклад, выкладзеная ў працы выкладчыка Маскоўскага энергетычнага інстытута Кукеля Краеўскага, выдадзенай у 1938 г.[2] На думку аўтара, трэба штогод падлічваць зэканомленыя дзякуючы інвестыцыям сродкі з эксплуатацыйных выдаткаў прадпрыемства. Калі штогадовыя зэканомленыя сродкі складаюць 10% інвестыцыяў, дык сцвярджаецца, што "тэрмін вяртання інвестыцыяў" — 10 гадоў. У такіх умовах выбар інвестыцыяў з найкарацейшым тэрмінам вяртання азначае іх найвышэйшую штогадовую рэнтабельнасць.

Паўстае наступнае пытанне: ці не варта абавязаць прадпрыемствы плаціць дзяржаве працэнты за выдзеленыя ім капіталы, каб у прынцыпе прымусіць іх клапаціцца пра рэнтабельнасць інвестыцыяў? Такія прапановы выказвалі эканамісты Малышаў, Вааг, Захараў[3]. Даследнікі сцвярджалі, што мала выкараніць толькі тое марнатраўства, якое вынікае з недастатковых падлікаў рэнтабельнасці пры буйных укладаннях. Трэба таксама пазбавіцца ад *усеагульнага* марнатраўства, калі прадпрыемствы не могуць плаціць працэнты за выдзеленыя ім капіталы. Дзеля таго што капітал "бясплатны", прадпрыемствы не зацікаўленыя ў скарачэнні да мінімуму свайго парку машынаў, як і запасаў сыравіны і канчатковай прадукцыі. Эканамісты сцвярджалі, што праз гэта адбываюцца значныя страты ў маштабе ўсёй краіны. Калі, напрыклад, нейкае прадпрыемства выкарыстоўвае ў два разы больш машынаў і будынкаў, чым яму трэба, дык

[1] *Гл. J.-M. Collete, Politique des investissements et calcul économique: l'expérience soviétique, Paris, 1965, p. 458.*

[2] *Collette, op. cit., p. 313.*

[3] *Кароткі агляд спрэчкі гл. у працы: Немчинов В. Стоимость и цена при социализме // Вопросы экономики. 1960. N 12.*

штогод губляецца прадукцыя, роўная сукупнай прадукцыі разгляданага прадпрыемства (калі, прынамсі, дапусціць, што магчыма знайсці — напрыклад у сельскагаспадарчым сектары — працоўную сілу, неабходную для функцыянавання новага прадпрыемства, створанага на базе "зэканомленага" абсталявання).

Калі б, наадварот, прадпрыемствы мусілі плаціць працэнты, прапарцыйныя фондам, якія ёсць у іхным распараджэнні, і гэтыя працэнты дадаваліся б да выдаткаў вытворчасці і скарачалі б іх прыбыткі, дык з мэтай захавання прыбыткаў яны былі б зацікаўленыя скарачаць суму сваіх інвестыцыяў да неабходнага мінімуму.

Паводле меркавання асобных эканамістаў новай школы, трэба ўсталяваць вельмі высокую норму працэнта, бо яна павінна цалкам адпавядаць стасунку сукупнай сумы атрыманых у эканоміцы прыбыткаў і сукупнай вартасці капіталу, гэта значыць сярэдняй рэнтабельнасці інвестыцыяў, якая, сцвярджалі Вааг і Захараў, мусіць складаць 20%[1].

Калі б гэтую прапанову прынялі, дык была б усталяваная сістэма коштаў, якія адпавядалі б нармальным цэнам у капіталістычнай эканоміцы, згодна з Марксавым слоўнікам, — "коштам вытворчасці". У капіталістычнай эканоміцы пры аднолькавых паказніках нормаў прыбытку прадпрыемстваў цэны на тавары адпавядаюць выдаткам вытворчасці плюс чыстыя прыбыткі, прапарцыйныя сумам інвестыцыяў на штогадовую адзінку выраблена прадукцыі[2]. Гэтаксама было б і ў сацыялістычнай эканоміцы, калі б прадпрыемствы плацілі працэнты, роўныя сярэдняй норме прыбытку.

Эканамісты — прыхільнікі сістэмы "коштаў вытворчасці" ў значнай ступені далучаліся да высноваў двух савецкіх інжынераў, якія задоўга да гэтага ўзнялі праблему пошуку аптымальнага выкарыстання ў сацыялістычнай эканоміцы даступных сродкаў вытворчасці, — Л. Кантаровіча і В. Наважылава. Свае першыя высновы Л. Кантаровіч апублікаваў у

[1] *Платность производственных фондов и прибыль предприятия // Вопросы экономики. 1963. N 4. С. 88—100.*

[2] *Тут мы маем на ўвазе дзель ад дзялення інвестыцыяў на колькасць адзінак выраблены за год тавараў.*

1939 г. у працы *"Матэматычныя метады арганізацыі і планавання вытворчасці"* — адным з першых даследванняў у галіне "лінейнага праграмавання". У 1960 г. Л. Кантаровіч выдаў больш ёмісты твор пад назовам *"Эканамічны разлік найлепшага выкарыстання рэсурсаў"*[1].

Пачынаючы з 1939 г. В. Наважылаў напісаў шматлікія працы такога ж кірунку, у прыватнасці даследванне *"Вымярэнне выдаткаў і іхных вынікаў у сацыялістычнай эканоміцы"*, апублікаванае ў зборніку працаў *"Канферэнцыі па скарыстанні матэматычных метадаў у эканамічных даследваннях"*, якая адбылася ў Маскве ў 1960 г.[2] Кантаровіч разглядае шэраг работ, якія могуць быць выкананыя або рукамі, або з дапамогай машынаў. Існуе, сцвярджаў ён, пэўны тып размеркавання даступных машынаў, які зводзіць да мінімуму сукупныя выдаткі працы, і можна дасягнуць таго, каб прадпрыемствы, абавязаныя выконваць пэўныя віды працы, спантанна выбіралі аптымальныя метады вытворчасці. Дастаткова толькі прымусіць іх плаціць за выкарыстанне кожнай машыны "пракатную ацэнку" (арэндную плату), якая адпавядае зэканомленым на заробках дзякуючы гэтай машыне сродкам пры такіх працэсах, калі эканомія іх мінімальная.

Пры аналізе блізкіх праблемаў Наважылаў сцвярджаў, што варта прымусіць плаціць за выкарыстанне нейкага сродку вытворчасці суму, якая адпавядае "выдаткам адваротнай сувязі", выкліканым праз выкарыстанне гэтага сродку вытворчасці, гэта значыць суму, якая адпавядае дадатковым выдаткам, абумоўленым адмаўленнем ад выкарыстання гэтага ж сродку вытворчасці ў якой-небудзь іншай галіне.

Пад тэрмінамі "пракатная ацэнка" і "выдаткі адваротнай сувязі" без цяжкасці пазнаецца паняцце гранічнай эфектыўнасці сродкаў вытворчасці, гранічнай прадукцыйнасці інвестыцыяў, што насамрэч азначае сродкі вытворчасці.

---

[1] *Москва, 1960; trad. franç. Paris, 1963.*

[2] *Французскі пераклад даследвання Наважылава быў надрукаваны ў Cahiers de l'I.S.E.A., série G, 19, n° 146, février 1964, pp. 43—292. Найбольш поўны выклад тэзісаў аўтара знаходзіцца ў ягонай працы "Проблемы измерения затрат и результатов при оптимальном планировании". М., 1967; ангельскі пераклад у Mathematical Studies, Economics and Statics, in the U.S.S.R. and Eastern Europe, vol. V, n° 2, 3, 4. New York, 1968—1969.*

Калі прымусіць прадпрыемствы плаціць "арэндную плату", роўную гранічнай прадукцыйнасці, дык яны ў бальшыні выпадкаў перастануць патрабаваць новае абсталяванне, калі чысты прыбытак, які яны атрымліваюць, выкарыстоўваючы дадатковае абсталяванне, становіцца роўны нулю, гэта значыць калі гранічная прадукцыйнасць абсталявання *на прадпрыемстве* становіцца роўная гранічнай прадукцыйнасці абсталявання *ва ўсёй эканоміцы*.

Пры абагульненні атрыманых Кантаровічам і Наважылавым вынікаў акрэсліваецца наступная выснова: для дасягнення аптымальнага размеркавання інвестыцыяў ва ўсёй эканоміцы трэба прымусіць прадпрыемствы плаціць працэнты за выдзеленыя ім фонды на падставе такога паказніка нормы, які адпавядае гранічнай прадукцыйнасці капіталу ў эканоміцы.

Такім чынам, для скарыстання ў сацыялістычнай эканоміцы адбываецца паўторнае адкрыццё асноватворнага закону выраўноўвання гранічнай прадукцыйнасці інвестыцыяў у разнастайныя галіны — закону, выведзенага ў папярэднім стагоддзі стваральнікамі неакласічнай школы.

Варта падкрэсліць, што гэты закон, па сутнасці, прысутнічаў у аналізе коштаў, зробленым ангельскімі эканамістамі-класікамі і Марксам. Сапраўды, для атрымання максімальнай прыбытковасці капіталу капіталістычныя прадпрыемствы павялічваюць свае інвестыцыі да роўню, калі гранічная іх рэнтабельнасць адпавядае сярэдняй прыбытковасці капіталу на прадпрыемстве (менавіта тады сярэдняя прыбытковасць максімальная).

Але калі канкурэнцыя выраўноўвае сярэднюю прыбытковасць капіталаў, дык выраўноўваецца і гранічная рэнтабельнасць інвестыцыяў (бо яна адпавядае сярэдняй прыбытковасці). У сувязі з гэтым савецкія даследнікі, якія патрабавалі вызначэння цэнаў на аснове "коштаў вытворчасці", практычна пагаджаліся з так званымі "савецкімі маржыналістамі" Кантаровічам і Наважылавым.

Падобныя прапановы выклікалі вельмі моцную крытыку. Паасобныя апаненты тэзіса "коштаў вытворчасці", у пры-

ватнасці Струмілін[1], не аспрэчвалі неабходнасці спарадкавання сістэмы цэнаў. Але яны сцвярджалі, што абранай нормай павінна быць вартасць прадуктаў, гэта значыць выдаткі працы.

Пагадзіцца з прынцыпам чыстага прыбытку, прапарцыйнага капіталу, як сцвярджалі эканамісты на чале са Струміліным, азначае пагадзіцца, што капітал стварае вартасць. Акрамя таго, гэта азначае яшчэ і пайсці супраць асноваў марксісцкай эканамічнай тэорыі. На іхную думку, чысты прыбытак павінны быць прапарцыйны заробкам, заплочаным за вытворчасць кожнага тавару.

Нарэшце, яшчэ адна група эканамістаў, такіх, як Турэцкі[2] і Майзенберг[3], крытыкавала скарыстанне ўсялякага сістэматычнага прынцыпу ўтварэння цэнаў. Гэтыя даследнікі сцвярджалі, што цэны — інструмент эканамічнае палітыкі і планавік не мусіць быць абмежаваны ў сваіх ініцыятывах нейкімі імператыўнымі правіламі.

§ 3. Самастойнасць прадпрыемстваў і роля рынку пры сацыялістычным ладзе

Аднак чаканыя перавагі сістэмы "коштаў вытворчасці" безумоўна залежаць ад намаганняў, фактычна прыкладзеных прадпрыемствамі для скарачэння сумы іхных выдаткаў (выдаткі вытворчасці і працэнты па інвестыцыях). Але такія намаганні будуць дзейсныя толькі тады, калі прадпрыемства ставіць мэту скараціць выдаткі, а кіраўнікі і работнікі асабіста зацікаўленыя ў ажыццяўленні гэтай мэты.

Да 1965 г. у Савецкім Саюзе ад прадпрыемстваў патрабавалася галоўным чынам выканаць і (па магчымасці) перавыканаць вытворчы план, гэта значыць тое, што было вызначана распрацоўшчыкамі гэтага плана. У дадатак да сваіх

[1] *Напрыклад, ягонае даследванне "Закон стоимости и планирования" // Вопросы экономики. 1959. N 7; пераклад на ангельскую мову ў Problems of Economics, novembre 1960.*

[2] *Гл. ягоны артыкул "Проблемы распределения и ценообразования" // Вопросы экономики. 1961. N 4; пераклад на ангельскую мову ў Problems of Economics, septembre 1961.*

[3] *Пересмотр оптовых цен в тяжелой промышленности и некоторые проблемы ценообразования в СССР // Вопросы экономики. 1961. N 11; пераклад на ангельскую мову ў Problems of Economics, juin 1962.*

акладаў дырэктары і інжынеры атрымлівалі вельмі значныя прэміі — галоўным чынам у залежнасці ад роўню выканання або перавыканання іхным прадпрыемствам плана. У такіх умовах яны не надта імкнуліся скарачаць выдаткі вытворчасці. У шмат якіх выпадках план выконваўся або перавыконваўся з павелічэннем прадугледжаных выдаткаў. Выдаткі вытворчасці маглі нават перавышаць даходы прадпрыемстваў, бо розніца пакрывалася дзяржаваю. У выніку гэтага пошук прыбытку ў савецкай эканоміцы набываў другаснае значэнне. Асобныя галіны прамысловасці (і даволі часта найбольш важныя, як цяжкая прамысловасць) увесь час былі стратныя, бо цэны на іхную прадукцыю былі меншыя за сабекошт.

Шматлікія савецкія эканамісты на працягу доўгага часу разглядалі гэткі стан рэчаў як згубны. Пачынаючы ад 1949 г. З. Атлас патрабаваў, каб для ацэнкі вынікаў працы прадпрыемстваў у якасці "паказніка" быў выбраны "ровень рэнтабельнасці", — яго даследнік вызначаў як стасунак чыстага прыбытку да сумы інвестыцыяў[1]. З 1956 г. гэтую думку абараняў эканаміст Я. Ліберман. Яна стала асноўнай тэмай дыскусіі паміж эканамістамі-практыкамі (была апублікаваная ў "Правде" за 9 верасня 1962 г. у артыкуле "План, прыбытак і прэмія").

Тым не менш, для таго каб прадпрыемства па-сапраўднаму імкнулася павялічыць ровень рэнтабельнасці, трэба таксама, каб яно мела пэўную свабоду выбару ў тым, што датычыць метадаў вытворчасці, пастаўшчыкоў і кліентаў. Вось чаму пытанне наконт паляпшэння эфектыўнасці прадпрыемстваў абумоўлена беспасярэдне *роўнем іх самастойнасці*.

Хоць у Савецкім Саюзе прадпрыемствы і былі надзеленыя "фінансавай самастойнасцю", гэта значыць мелі права самі весці ўлік сваіх выдаткаў і даходаў, іхная свабода выбару заўсёды была вельмі абмежаваная. Прадпрыемства мусіла не толькі вырабляць вызначаную колькасць тых ці іншых тавараў, але і забяспечваць сябе ўсім неабходным ад

[1] *Гл. "Бюллетень Академии наук СССР". Сер. "Экономика и право". 1949. N 5.*

вызначаных пастаўшчыкоў. Яно магло таксама прадаваць сваю прадукцыю толькі вызначаным пакупнікам. І нарэшце, цэны на тавары вызначаліся распрацоўшчыкамі плана і органамі дзяржаўнай улады.

Паўстае пытанне: ці не варта было б пашырыць свабоду выбару прадпрыемстваў? Неабходнасць руху ў гэтым кірунку была, у прыватнасці, падкрэсленая ў артыкуле акадэміка Трапезнікава "За больш гнуткае кіраванне эканомікай", апублікаваным у *"Правде"* 17 жніўня 1964 г. У тыя ж часы асобным прадпрыемствам ужо дазвалялася самім выбіраць пастаўшчыкоў. Пры гэтым план забеспячэння прымаўся толькі *апастэрыёры* — для таго каб зацвердзіць (і па магчымасці ўзгадніць) падпісаныя паміж прадпрыемствамі пагадненні.

У 1965 г. у СССР распачалася "эканамічная рэформа", што ў пэўнай ступені адлюстроўвала перамогу прыхільнікаў "паслаблення" сацыялістычнай сістэмы арганізацыі эканомікі. Аднак бальшыня прапановаў, прынятых у 1965 г., не атрымала ніякага распаўсюджання на практыцы. Эканамічнае становішча сацыялістычных краінаў няспынна пагаршалася. У 1985 г. новы Генеральны сакратар Камуністычнай партыі Савецкага Саюза М. Гарбачоў абвясціў "перабудову" эканамічнае сістэмы, якая на гэты раз па-сапраўднаму мусіла даць прадпрыемствам даўно абяцаную самастойнасць. Але неўзабаве давялося канстатаваць, што вынікам прынятых у гэтым кірунку крокаў з'явіўся разлад дачыненняў паміж прадпрыемствамі, чым і абумоўлена скарачэнне вытворчасці і павелічэнне дэфіцыту асноўных спажывецкіх тавараў. А гэта выклікала вялікую незадаволенасць насельніцтва.

Краіны "народнай дэмакратыі" з такой жа сістэмай кіравання, як і ў Савецкім Саюзе, таксама спрабавалі палепшыць становішча гэтакім чынам. Але якраз там незадаволенасць спажыўцоў спрычынілася да радыкальных зменаў. У Польшчы і Вугоршчыне разгарнуўся магутны апазіцыйны рух, які прывёў да падзення ў 1989 г. дыктатуры камуністычных партыяў. Пры канцы гэтага ж года знік "берлінскі мур", а потым былі пазбаўленыя ўлады камуністычныя партыі ў Чэхаславакіі і Усходняй Нямеччыне. Усе іншыя эўра-

пейскія краіны народнай дэмакратыі ў хуткім часе пайшлі па тым жа шляху. Нарэшце, у жніўні 1991 г. у Маскве была распушчана Камуністычная партыя Савецкага Саюза. На тыя часы СССР фактычна ўжо больш не існаваў, бо рэспублікі, якія ўваходзілі ў яго склад, у 1989—1991 гг. абвясцілі сваю незалежнасць.

У эканамічным плане аб канцы камуністычнага эксперыменту паўсюль сведчыць сцверджанне пра неабходнасць вяртання да рынкавай эканомікі і прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Пачалася "прыватызацыя" прадпрыемстваў. У канчатковым выніку гэта цяжкі і дарагі працэс, які вымагае ад насельніцтва вялікіх ахвяраў.

§ 4. Чаму сацыялістычныя эксперыменты атрымалі паразу?

Адзначыўшы падзеі, што адбываліся ва Усходняй Эўропе, варта ўзняць наступнае пытанне: чаму так атрымалася, што да парадаў эканамістаў — прыхільнікаў рэфармавання савецкай эканамічнай сістэмы прыслухаліся гэтак позна і чаму ўрэшце зробленыя па іх парадах захады прывялі да падзення сістэмы?

Адзін з галоўных фактаў, прадэманстраваны крахам сістэмы, — немагчымасць дасягнуць эфектыўнага выкарыстання прадукцыйных сілаў у сістэме планавай эканомікі, заснаванай на дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Найбольш прадбачлівыя савецкія эканамісты даўно зразумелі: каб сістэма вытворчасці, якая грунтуецца на падзеле працы паміж вялікай колькасцю прадпрыемстваў, была эфектыўнай, трэба асноватворныя фактары вытворчасці — зямлю, працу, капітал — выкарыстоўваць адпаведна з прынцыпам, выведзеным Вільфрэда Парэта: роўнасць маржынальных прадуктаў кожнага з гэтых фактараў на прадпрыемствах, якія іх выкарыстоўваюць (гл. вышэй — с. 517 і далей). Але гэтыя эканамісты не зразумелі, што памянёны прынцып існуе на практыцы толькі пры актыўнай канкурэнцыі паміж прыватнымі прадпрыемствамі.

Каб даказаць слушнасць прынцыпу Парэта, палітычная эканомія вымушаная звяртацца да простых схемаў, дзе ў

кожнага прыватнага прадпрымальніка ўжо быццам бы існуе ўся сукупнасць магчымых праграмаў вытворчасці з пазначэннем для кожнай праграмы дадатковага даходу, атрыманага праз выкарыстанне апошняй ужытай адзінкі кожнага з рэсурсаў. Але гіпотэза вельмі далёкая ад рэчаіснасці. Кіраўнік прадпрыемства абмяжоўваецца параўнаннем невялікай колькасці праграмаў, у асноўным падобных да тых, якія выконваліся папярэдне. З другога боку, ён дакладна не ведае маржынальных прадуктаў выкарыстаных рэсурсаў у разгляданых праграмах.

Фактары, якія вызначаюць прадукцыйнасць пэўнага рэсурсу, як і ягоны сабекошт, часцей за ўсё маюць высокі каэфіцыент няпэўнасці. Дакладна не вядомыя кошты, па якіх можна набыць рэсурсы і прадаць прадукцыю. Нават чаканая рэнтабельнасць нейкага рэсурсу таксама няпэўная. У такіх умовах падлік дадатковага прыбытку, які можна было б атрымаць праз выкарыстанне апошняй адзінкі гэтага рэсурсу, такі няпэўны, што няма патрэбы яго рабіць. Прадпрымальнікі абмяжоўваюцца прыкладнай ацэнкай сукупнай сумы прыбыткаў, якіх можна чакаць ад выкарыстання пэўных праграмаў вытворчасці, суадносяць сумы прыбыткаў з неабходнай колькасцю капіталу і потым ужо выбіраюць праграму, дзе стасунак сумы прыбытку да сумы капіталу найвышэйшы.

Тым не менш прынцыпу Парэта ў капіталістычнай эканоміцы прыкладна прытрымліваюцца, але ажыццяўляецца гэта дзякуючы канкурэнцыі, якая разгортваецца паміж прадпрыемствамі. Кожны прадпрымальнік незалежна ад іншых разглядае пэўную колькасць метадаў вытворчасці. Калі ў адным і тым жа сектары шмат прадпрыемстваў, дык параўноўваецца сапраўды значная колькасць метадаў. Паколькі кожны прадпрымальнік больш-менш дакладна ведае вынікі, атрыманыя ягонымі канкурэнтамі, выбраныя ім метады вытворчасці сапраўды набліжаюцца да тых, якія прыносяць найбольшую норму прыбытку і для якіх гранічная прадукцыйнасць аднаго і таго ж рэсурсу аднолькавая ва ўсіх сектарах эканомікі. Такім чынам, прынцып Парэта захоўваецца, прычым на практыцы *ніхто дакладна не падлічвае* мар-

жынальнай прадукцыйнасці рэсурсаў пры магчымым іх разнастайным выкарыстанні.

У планавай эканоміцы няма сапраўднай канкурэнцыі паміж прадпрыемствамі, што забяспечваюць сваімі таварамі адзін і той жа рынак, а значыцца, няма і досведу, які метад вытворчасці сама рэнтабельны для вытворчасці пэўнага тавару. Для дасягнення оптымуму Парэта трэба было б, каб органы планавання самі вызначалі найбольш рэнтабельныя метады вытворчасці для мільёнаў разнастайных тавараў. Аднак гэта немагчыма. "Савецкія маржыналісты" здолелі на прыкладзе адной задачы, якая магла быць здзейсненая з дапамогай невялікай колькасці разнастайных метадаў, паказаць карыснасць прынцыпу Парэта. Але ажыццяўленне падлікаў, неабходных для выкарыстання гэтага прынцыпу ў маштабе ўсёй эканомікі, на практыцы немагчымае.

Такім чынам, немагчымасць у планавай эканоміцы аптымальна выкарыстоўваць наяўныя рэсурсы — адна з прычынаў няздольнасці ўрадаў краінаў Усходняй Эўропы дасягнуць дастатковага павелічэння вытворчасці тавараў, патрэбных для насельніцтва. Варта таксама ўзгадаць і мноства іншых фактараў, што абумовілі паразу разгляданых эксперыментаў. Перш за ўсё гэта, безумоўна, дрэнная якасць працы. Нягледзячы на палітычны кантроль, які чынілі над прадпрыемствамі органы адзінай партыі, нягледзячы на матэрыяльныя перавагі лепшых працоўных, якасць працы ў краінах Усходняй Эўропы няспынна пагаршалася. Тлумачэнне такой з'явы мы бачылі ў тым, што з гэтага гледзішча нішто не можа замяніць кантролю з боку кіраўнікоў прадпрыемства, непасрэдна зацікаўленых у добрым выкананні задачаў, ускладзеных на працоўных. Акрамя таго, калі сістэма планавай эканомікі не здолела эфектыўна арганізаваць вытворчасць, дык яна не забяспечыла таксама і належнага размеркавання вырабленых тавараў.

Сапраўды, недастаткова нешта вырабляць. Трэба яшчэ, каб тое, што вырабляецца, кожнае хвіліны адпавядала таму, што спажыўцы жадаюць набыць. А менавіта гэта не здолела забяспечыць планавая эканоміка. Планы абавязкова павінны былі складацца на падставе аб'яднання падобных пра-

дуктаў. Напрыклад, усе тыпы сталі рознай якасці або ўсе катэгорыі лядоўняў павінны былі ўтвараць адну групу прадуктаў. У выніку ад прадпрыемстваў патрабавалі выканаць вельмі няпэўна вызначаныя мэты. І прадпрыемствы значна больш клапаціліся пра выкананне гэтых агульных мэтаў, чым пра якасную вытворчасць таго, што жадалі спажыўцы. На складах назапашвалася непатрэбная прадукцыя, тым часам як насельніцтва пакутавала ад велізарнага дэфіцыту.

Усё гэта і было прычынай таго, што незадаволенасць насельніцтва краінаў Усходняй Эўропы пакрысе ўзрастала, нягледзячы на пазбаўленне людзей элементарных палітычных правоў і няспыннае ўздзеянне прапаганды, якая ўсхваляла каштоўнасці рэжыму. Сёння ў Кітаі і ў некалькіх іншых азіяцкіх краінах, а таксама на Кубе сістэма планавай эканомікі па-ранейшаму існуе, хоць часам і робяцца пэўныя крокі да рынку (асабліва ў Кітаі). Аднак відавочна, што прычыны, якія выклікалі паразу планавай сістэмы ва Усходняй Эўропе, рана ці позна ўсюды прывядуць да такіх жа вынікаў.

Такім чынам, нашая эпоха атрымала досвед, які, здаецца, развязаў адну з найбольшых спрэчак, што на працягу двух стагоддзяў падзялялі эканамістаў, сутыкаючы прыхільнікаў рынкавай эканомікі з абаронцамі ідэі суцэльнага эканамічнага планавання. І ёсць шмат падставаў сказаць, што досвед выказаўся на карысць захавання рынкавай сістэмы.

Бібліяграфія

Праблемы, якія мы закранулі ў гэтым раздзеле, узгадваюцца, прынамсі, у бальшыні сучасных даследванняў, прысвечаных савецкай эканоміцы. Сярод іх мы назавем:

C. Bobrowski, *Formation du système soviétique de planification*, Paris, 1956.

M. Lavigne, *Les économies socialistes soviétique et européennes*, Paris, 1970.

A. Nove, *L'économie soviétique, traduit de l'anglais*, Paris, 1963.

A. Bergson, *The economies of Soviet planning*, New Haven (E. U.), 1964.

J. S. Berliner, *Factory and manager in the U.S.S.R.*, Cambridge (E. U.), 1957.

M. Ellman, *Planning Problem in the USSR*, Cambridge, 1973.

H. Hirsch, *Quantity planning and price planning in the Soviet Union*, Philadelphie, 1961.

J.-C. Asselain, *Plan et profit en économie socialiste*, Paris, 1981.

W. Brus, *Problémes généraux du fonctionnement de l'économie socialiste*, trad. franç., Paris, 1968.

— *The economics and politics of socialism*, London, 1973.

B. Csikos-Nagy, *Socialist price theory and price policy*, Budapest, 1975.

G. Rolland, *Economie politique du système soviétique*, Paris, 1989.

M. Lavigne, *L'Europe de l'Est du plan au marché*, Paris, 1992.

Раздзел III

ДА НОВАГА АСЭНСАВАННЯ ЭКАНОМІКІ

Пры апісанні гісторыі эканамічнай думкі ў заходнім свеце мы адзначылі асноватворную мяжу, якую складае ўзнікненне ў другой палове XVIII ст. асобнай навукі, накіраванай на вывучэнне эканамічнага жыцця. З таго часу і лічылася магчымым, каб такая навука існавала, і было нармальна, каб існаваў падзел паміж, з аднаго боку, пошукам умоваў функцыянавання эканомікі і, з другога, роздумам наконт належных нормаў кіравання маральным і палітычным жыццём людзей. Вывучэнне эканомікі павінна было аддаліцца ад філасофіі, з якой яно да гэтага часу было шчыльна звязанае.

Такое размежаванне было неабходнае. Але мы бачылі, што першыя эканамісты так далёка зайшлі ў сваім перакананні пра каштоўнасць іхнае дысцыпліны, што, без сумневу, уважалі: з гэтага часу даволі падпарадкавання законам эканомікі, каб гарантаваць народам гарманічнае жыццё. Найбольш крайняе выяўленне такой перакананасці знаходзім у асобных вучняў Кенэ. Нагадаем, напрыклад, што ў 1767 г. пісаў Лё Мерсье дэ Ля Рыўер:

"І не трэба клапаціцца ні пра мараль, ні пра норавы... Сацыяльна немагчыма, каб людзі, якія жывуць па такіх простых законах (законах эканомікі)... не былі сапраўды сама дабрадзейнымі людзьмі"[1].

Эдам Сміт і ягоныя ангельскасаксонскія паслядоўнікі ніколі не заходзілі гэтак далёка і не лічылі эканамічную свабоду абавязковай перадумовай дабрадзейнасці людзей. Аднак яны, як і французскія фізіякраты, меркавалі, што гэтай свабоды дастаткова, каб найлепшым чынам развязаць бальшыню праблемаў, якія жыццё ставіць перад грамадствам, а сфера дзейнасці дзяржавы пры гэтым павінна быць вузкаабмежаваная. Да нашага часу даследванні эканамістаў часцей за ўсё характарызаваліся вельмі выразнай тэндэнцыяй да ўсведамлення таго, што эканамічнае жыццё з яго ўласнымі законамі знаходзіцца па-за абсягам маральнасці і мусіць развівацца без патрэбы ў дзяржаўным умяшанні.

---

[1] *Працытаваны вышэй урывак, с. 178.*

Ад часу ўзнікнення палітычнай эканоміі шматлікія мысляры ўспрымалі такі падыход як празмерны. Насуперак поглядам эканамістаў развівалася дыяметральна супрацьлеглая ідэя, што толькі радыкальнае пераўтварэнне грамадскіх дачыненняў дазволіць усталяваць панаванне маральнасці. Абаронцы гэтае ідэі пайшлі па шляху утопіі. У XVIII і першай палове XIX ст. квітнелі сацыялістычныя і камуністычныя ідэі. І цяпер ёсць усе падставы пагадзіцца, што на погляды Маркса, які лічыў сябе вялікім рэалістам, у велізарнай ступені паўплывала утапічная канцэпцыя будучыні чалавецтва.

Яшчэ колькі гадоў таму эканаміст, які не паважаў амаралізму сучаснай палітычнай эканоміі, меў вялікія шанцы далучыцца да марксізму, бо здавалася, што думка Маркса пераносіць на навуковую глебу ідэі класічнай палітэканоміі, пераконваючы нас у будучым панаванні сацыяльнай справядлівасці. Тады яшчэ не надта зважалі на тое, што рэвалюцыйныя перакананні Маркса грунтаваліся на вельмі маларэалістычнай ідэі пра абавязковы ўздым чалавека на вышэйшы ровень маральнасці праз звычайнае скасаванне прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

Сёння ж нам нялёгка абраць належнае стаўленне да эканомікі. Сапраўды, параза сацыялістычных эксперыментаў у краінах Усходняй Эўропы не перашкаджае нам разглядаць капіталістычную рынкавую эканоміку як сістэму, якая відавочна далёкая ад спрыяння маральнаму і духоўнаму росквіту людзей. Цяперашняя нявызначанасць прымушае нас імкнуцца да таго, каб вызначыць, што з бачання рацыянальнага грамадства, прапанаванага на пачатку XIX ст. Гегелем, можа скарыстаць сучасны эканаміст для развязання дылемы, якая складае супрацьстаянне эканамічнага лібералізму і сацыялізму. Індывід, як лічыць філосаф, дзейнічае толькі тады, калі ён зацікаўлены ў выніках сваіх учынкаў. Аднак жыццё сацыяльнай групы складваецца так, што даволі часта агульны інтарэс пераважае над інтарэсамі тых або іншых людзей. Перад намі супярэчнасць, развязаць якую можа сучасная рынкавая эканоміка. Вось чаму, паводле Гегеля, трэба, каб побач з дзяржаваю існавала і "грамадзянская супольнасць", заснаваная на спантанным уздзе-

янні рынку. Размова, аднак, не ідзе пра адмаўленне выпраўляць непажаданыя наступствы канкурэнцыі на рынку.

Ва ўсіх папярэдніх цывілізацыях чалавек цалкам падпарадкоўваўся правілам, вызначаным уладаю, якая займалася арганізацыяй усяго жыцця. Рэгламентавалася, як працаваць, якім чынам карыстацца рэчамі; вызначаліся і ўсе іншыя формы дзейнасці, напрыклад узнаўленне роду; і індывід быў несвабодны.

Праблема свабоды чалавека ўнутры сацыяльнай групы па-сапраўднаму пачала ўздымацца ў полісах антычнай Грэцыі. Але там уважалася, што грамадзянін можа быць свабодны толькі тады, калі ён вызвалены ад эканамічных задачаў, якія, аднак, павінны выконваць іншыя. У выніку гэтага антычны поліс дапускаў рабства як неабходную інстытуцыю.

Ідэя свабоды кожнага чалавека паступова церабіла сабе шлях у часы рымскага панавання, а потым і ў Сярэднявечны. Але толькі пры канцы XVIII ст. прынцып свабоды перамагае — адначасова з разгортваннем прамысловае рэвалюцыі, якая значна павялічыла прадукцыйнасць працы чалавека. У Заходняй Эўропе знікаюць усе формы феадальнай залежнасці і ўсталёўваецца капіталістычны лад вытворчасці, заснаваны на сістэме найманай працы і спантанным уздзеянні рынку. Відавочна, што дзве гэтыя падзеі ўзаемазвязаныя. Менавіта капіталізм забяспечвае паступовы доступ усіх супольнікаў грамадства да палітычнага жыцця.

У рынкавай эканоміцы людзі ў эканамічным плане адмежаваныя адзін ад аднаго, бо кожны дзейнічае ў залежнасці ад таго, чым валодае на правах уласнасці (ці не ёсць гэта ягоная працоўная здольнасць). Але, паводле Гегеля, менавіта такі падзел дазваляе чалавеку ўсвядоміць сябе і, такім чынам, па-сапраўднаму стаць "суб'ектам", здольным у межах дзяржавы весці "этычнае" жыццё.

У грамадствах, дзе ёсць рабства ці прыгон, рабы і прыгонныя сяляне лічацца няздольнымі мысліць, а значыцца, браць удзел у палітычным жыцці. Але індывіды, якія здзейснілі рэвалюцыю 1789 г., сцвярджалі, што менавіта рабскае становішча і перашкаджала рабам і прыгонным

сялянам мысліць. І яны прапанавалі, каб існаванне грамадства было заснаванае адначасова на свабоднай працы і на доступе ўсіх яго супольнікаў да палітычнага жыцця. Ад гэтага часу жыццё ў грамадстве і пачало падзяляцца на два адрозныя: эканамічнае, калі чалавек абараняе асабісты інтарэс, і палітычнае, калі чалавек сапраўды свабодны пры ўмове падпарадкавання законам, якія яны самі сабе складаюць.

Гегель лічыў, што ў эканамічным жыцці, якое грунтуецца на рынку, індывід — гэта не простая спружына нейкага механізму. Ён пакліканы разважаць наконт прыроды "грамадзянскай супольнасці", у якой бярэ ўдзел. Рынкавая эканоміка кіруецца бадай што натуральнымі законамі, якія індывід можа і павінны ведаць. Менавіта ў гэтым значэнне палітычнай эканоміі, якую Гегель называў навукаю Новага часу[1]. Праз спазнанне функцыянавання рынкавай эканомікі сучасны чалавек вучыцца пераадольваць сваё звычайнае імкненне да пошуку асабістага інтарэсу: так ён рыхтуе сябе да таго, каб у межах дзяржавы спрычыніцца да сапраўднага "этычнага жыцця", заснаванага на прысвячэнні сябе грамадству.

Такім чынам, на думку Гегеля, менавіта супрацьстаянне грамадзянскай супольнасці і дзяржавы дазваляе дасягнуць свабоды. І з гэтае прычыны Гегель адхіляў погляды Фіхтэ, якія вялі да скасавання прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і замены спантаннай канкурэнцыі на рынку планаваннем вытворчасці і размеркаваннем тавараў. Тым не менш Гегель не далучаўся і да поглядаў эканамістаў-лібералаў. Нам уяўляецца, што менавіта Гегелева палітычная філасофія дазваляе пераадолець супрацьстаянне паміж сацыялізмам і эканамічным лібералізмам. Адначасова гэтая філасофія павінна была б надаць навуцы пра эканоміку лепшы кірунак, чым той, па якім яна развівалася на працягу двух стагоддзяў.

Як мы бачылі, палітычную эканомію стварылі і развівалі мысляры, якіх беспасярэдне натхняла адна з "дакладных"

[1] *Principes de la philosophie du droit, § 189, Remarque.*

навукаў — механіка, што атрымала ў XVIII ст. бліскучае развіццё. Палітычная эканомія напачатку спрабавала вытлумачыць феномены рынкавай эканомікі праз аб'яднанне вартасці тавараў з пэўным фактарам — або з неабходнай для вытворчасці працай, або з карыснасцю гэтых тавараў для спажыўцоў. Аднак неакласічная школа адхіліла такое гледзішча і вылучыла канцэпцыю, адпаведна з якой сістэма коштаў і колькасць абмененых тавараў і паслугаў — гэта развязанне сістэмы раўнанняў, якую можна было б скласці праз веданне прэфэрэнцыяў індывідаў і ўжытых тэхналогіяў вытворчасці. Такая змена арыентацыі спрычынілася да значных вынікаў, бо дзякуючы ёй мы набылі фармулёўку тэорыі Парэта пра эканамічны оптымум. Тым не менш мы канстатавалі, што неакласічная эканамічная тэорыя атрымала паразу ў спробе даказаць існаванне адзінай і стабільнай раўнавагі коштаў. Як нам уяўляецца, менавіта ў гэтым палягае дастатковы доказ таго, што рынкавая эканоміка не можа атаясамлівацца з механічнаю сістэмай. Рынкавая эканоміка, на нашу думку, значна больш нагадвае жывы арганізм. Калі б распаўсюдзілася такое перакананне (што вельмі пажадана), дык тэарэтычныя даследванні па эканоміцы зноў змянілі б свой кірунак.

У 1857—1858 гг. — пры напісанні рукапісаў, вядомых пад назовам *"Асновы крытыкі палітычнай эканоміі"*, Маркс, як мы бачылі (гл. вышэй — с. 422—424), прапаноўваў бачанне капіталізму як жывога суб'екта. Тут ён беспасярэдне схіляўся да філасофіі Гегеля, які карэнным чынам адрозніваў жыццё ад інертнай матэрыі. Згодна з Гегелевай філасофіяй, усялякая праўдзівая рэальнасць — гэта рэальнасць жывая. Як нам здаецца, менавіта да такога ўсведамлення рынкавай эканомікі, заўважанага аднойчы Марксам, варта было б зноў вярнуцца і пачаць яго развіваць[1]. Тады можна было б зразумець, што раўнавага рынкавай эканомікі — гэта не вынік матэматычна перададзенага працэсу. Яна гістарычна склалася і аднаўляецца такім жа чынам, як і

[1] *Для большага ўдакладнення гэтага пытання, якое здаецца нам важным, дазволім сабе накіраваць вас да нашых кніг: Henri Denis, L' "Economie" de Marx. Histoire d'un échec, P.U.F., 1980; Logique hégélienne et systèmes économiques, P.U.F., 1984; Hegel, penseur politique, L'Age d'Homme, 1989.*

жывая істота аднаўляе дачыненні, уласцівыя таму роду, да якога яна належыць.

Сучасны біёлаг Францыя Жакоб асабліва падкрэсліваў гістарычную натуру жывой істоты. Ён піша: "Такой рудыментарнай, якой падаецца бактэрыяльная клетка сярод усіх жывых істотаў, спатрэбіліся значныя перыяды часу, каб арганізавалася сістэма [якую яна складае]. Калі бактэрыя функцыянуе з такой хуткасцю, дык гэта таму, што на працягу двух мільярдаў гадоў яе продкі спрабавалі свае высілкі ў гэтай хіміі, скрупулёзна пазначаючы шлях да такога выніку. Вось дзе палягае разрыў паміж жывым і нежывым светам, паміж біялогіяй і фізікай: нежывыя целы не залежаць ад часу, жывыя — непарыўна звязаны з ім. У іх аніякая структура не можа быць адасобленая ад гісторыі"[1].

Здаецца, што зараз эканамістам варта было б звярнуць асаблівую ўвагу на думку біёлага. Яны зразумелі б, што існаванне рынкавай эканомікі і яе стабільнасць не могуць быць "спраўджаныя", як быццам гаворка ідзе пра нейкую механічную раўнавагу; а яшчэ яны зразумелі б, што з дапамогаю матэматычных мадэляў надзвычай цяжка прасачыць эвалюцыю канкрэтнай рынкавай эканомікі. Змена арыентацыі палітычнай эканоміі зусім не азначала б, што гэтая дысцыпліна страціла б цікавасць і практычнае значэнне. Наадварот, атрыманыя ў нашай навуцы веды ўсё больш патрэбныя для дзяржаўных дзеячоў; дзейнасць жа апошніх тым больш эфектыўная, чым лепш прадстаўнікі грамадскай думкі дасведчаныя ў той галіне, якой мы займаемся.

Пад уплывам прагрэсу ў эканамічнай думцы, якая выкарыстоўвае навуковыя высновы больш з біялогіі, чым з механікі, будзе, без сумневу, яшчэ больш цяжка ўявіць, як такі арганізм, як навачасная рынкавая эканоміка, быў цалкам падпарадкаваны загадам дзяржавы-планавіка. Гэта, аднак, не азначае, што ўсе сучасныя формы рынкавай эканомікі варта лічыць непарушнымі. Сапраўды, відавочна, што капіталізм, які пераможна крочыць на нашых вачах, мусіць сутыкнуцца з супярэчнасцямі, што ў будучыні можа выклікаць стварэнне новых эканамічных інстытуцыяў.

[1] *La logique du vivant. Paris, 1970, pp. 316–317.*

Дарэчы, асноўная супярэчнасць у эканоміцы перадавых краінаў "заходняга свету" — гэта, без сумневу, не тая, што выклікала да сябе ўвагу з боку Маркса і ягоных артадаксальных паслядоўнікаў, а хутчэй за ўсё супярэчнасць, якую мы неаднаразова падкрэслівалі, асвятляючы ролю "вонкавых рынкаў збыту" ў развіцці капіталізму. Менавіта для паспяховага аналізу гэтай супярэчнасці і прадказання яе наступстваў палітычная эканомія атрымала б большую карысць ад свайго звароту да дасягненняў у галіне біялогіі.

Мы бачылі (гл. вышэй — с. 306, 307), як Жан Батыст Сэй сцвярджаў, што не варта надаваць замежнаму гандлю галоўнага значэння ў эканамічным уздыме, бо ён здаваўся даследніку недастаткова важкім у колькасным вымярэнні. У сваіх разважаннях Сэй зыходзіў з таго пастулату, што прычына і наступства павінны быць велічынямі аднолькавага парадку. Сапраўды, гэта спраўджваецца ў выпадку механічнае сістэмы, але не ў выпадку арганізма, які рэагуе на раздражненне. Магчыма, як заўважаў Мальтус, што вонкавы гандаль "забяспечвае існаванне стымулу, які няспынна заахвочвае да прадукцыйнай дзейнасці" (гл. вышэй — с. 338, 339).

Пасля Другой сусветнай вайны перадавыя краіны заходняга свету на працягу трыццаці гадоў спазналі надзвычайны росквіт. Напэўна, у значнай ступені гэта было наступствам "дэкаланізацыі", якая выклікала ў краінах, што набылі незалежнасць, вялікія патрэбы ў сродках вытворчасці. Прыкладна з 1974 г. гэты перыяд імклівага эканамічнага росту спыніўся, і эканоміка заходніх краінаў пакутуе ад значнага беспрацоўя. Безумоўна, такі стан рэчаў залежыць і ад празмернай запазычанасці слабаразвітых краінаў і асабліва ад канкурэнцыі на рынках з боку новых індустрыяльных дзяржаваў.

Такім чынам, абмежаванасць рынкаў збыту паўстае як галоўная праблема, з якой сутыкнулася цяпер эканоміка капіталістычных краінаў. Праблема можа ўсё больш і больш абвастрацца з разгортваннем індустрыялізацыі нашай планеты, і цалкам верагодна, што ў найбольш перадавых краінах для аднаўлення і захавання ў будучым поўнае занятасці

працоўных умяшанне дзяржавы будзе неабходнае, але ўжо ў новых формах. Такое ўмяшанне можа нарадзіць новыя інстытуцыі або змяніць сацыяльныя дачыненні, якія спрычыняцца да эвалюцыі капіталістычнай сістэмы.

АГУЛЬНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ

Хацелася б падкрэсліць, што ў вывучэнні гісторыі эканамічнай думкі нішто не здолее замяніць чытання твораў аўтараў, ідэі якіх хочаш ведаць.

Таму падаем спіс кніг па агульнай гісторыі эканамічнай думкі, якія ўбачылі свет на французскай мове.

A. Barrère, *Histoire de la pensée économique et analyse contemporaine*, Paris, 1973.

M. Baslé et autres, *Histoire des pensées économiques*, 2 vol., Paris, 1988.

M. Blaugh, *La pensée économique: origine et développement*, traduit de l'anglais, Paris, 1981.

G.-H. Bousquet, *Essai sur l'évolution de la pensée économique*, Paris, 1927.

J. K. Galbraith, *L'économie en perspective*, traduit de l'anglais, Paris, 1989.

C. Gide et C. Rist, *Histoire des doctrines économiques depuis les physiocrates jusqu'à nos jours*, 7e éd., Paris, 1959.

R. Gonnard, *Histoire des doctrines économiques*, nouv. éd., Paris, 1949.

R. L. Heilbroner, *Les grands penseurs de la révolution économique*, trad. franç., Paris, 1957.

E. James, *Histoire sommaire de la pensée économique*, 4e éd., Paris, 1969.

E. James, *Histoire de la pensée économique au XXe siècle*, Paris, 1955.

A. Piettre, *Pensée économique et théories contemporaines*, 3e éd., Paris, 1965.

A. Samuelson, *Les grands courants de la pensée économique*, 3e éd., Paris, 1988.

J. Schumpeter, *Histoire de l'analyse économique*, trad. franç., 3 vol., Paris, 1983.

P. Vidonne, *La formarion de la pensée économique*, Paris, 1986.

D. Villey, *Petite histoire des grandes doctrines économiques*, 7e éd., Paris, 1979.

J. Wolff, *Les grandes oeuvres économiques*, Paris, 1973.

Заўвага. Працы, пазначаныя ў спасылках, не абавязкова паўтараюцца ў бібліяграфіі.

Велізарная колькасць працаў, прысвечаных нашай тэме, выдадзена на ангельскай мове. Назавем толькі асобныя з іх.

R. Bachouse, *A new history of modern economic analysis*, New York, 1985.

J. R. Davis, *The new economics and the old economists*, Ames (Iowa), 1971.

P. Deane, *The evolution of economic ideas*, Cambridge, 1978.

M. Dobb, *Theories of value and distribution since Adam Smith*, Cambridge, 1973.

J. Finkelstein et A. Thimin, *Economists and Society*, New York, 1973.

S. A. Gherity, *Economic Thought. A historical anthology*, New York, 1965.

A. Gray, *The development of economic doctrine*, London, 1980.

L. H. Haney, *History of Economic Thought*, 4e éd., New York, 1949.

E. K. Hunt, *Economics. An Introduction to traditional and radical views*, New York, 1972.

T. W. Hutchison, *A Review of Economic Doctrines, 1870—1929*, Oxford, 1953.

H. Myint, *Theories of Welfare Economics*, New York, 1962.

J. Oser, *The evolution of Economic Thought*, New York, 1963.

P. J. Reynolds, *Political economy*, Brighton, 1987.

L. Rogin, *The meaning and validity of economic theory, a historical approach*, New York, 1956.

B. B. Seligman, *Main currents in modern economies. Economic Thought since 1870*, New York, 1962.

G. L. S. Shackle, *Epistemics and Economics. A critique of economic doctrines*, Cambridge, 1972.

Зразумела, што вывучэнне эвалюцыі эканамічнай думкі вымагае шматлікіх спасылак на агульную гісторыю і гісторыю эканомікі. На пачатку бальшыні частак нашае кнігі пададзены раздзелы са сціслым пералікам гістарычных фактаў. Гэты матэрыял павінны быць дапоўнены падручнікамі і шматтомнымі выданнямі з агульнай гісторыі, напрыклад кнігамі серыі "Peuples et civilisations", падрыхтаванай пад рэдакцыяй Halphen і Sagnac, або працай J. Pirenne *"Le grands courants de l'histoire universelle"* (1945—1956, т. 1—7). Апошняе з названых выданняў падаецца асабліва цікавым, бо ў ім шмат увагі звяртаецца на з'явы эканомікі.

Мы таксама карысталіся працамі:

J.-C. Asselain, *Histoire économique*, Paris, 1985.

H. Sée, *Histoire économique de la France*, nouv. éd., Paris, 1942.

H. Heaton, *Histoire économique de l'Europe*, traduit de l'anglais, Paris, 1950.

J. Imbert, *Histoire économique, dès origines à 1789*, Paris, 1965.

A. Philip, *Histoire des faits économiques et sociaux de 1800 à nos jours*, Paris, 1964.

Нарэшце, мы мяркуем, што паглыбленае вывучэнне эвалюцыі эканамічнай думкі вымагае дастатковага ведання гісторыі філасофіі, у сувязі з гэтым мы адзначым дзве працы, што шырока выкарыстоўваюцца ў Францыі.

E. Bréhier, *Histoire de la philosophie*, Paris, 1926—1932; 8e éd., 1963.
A. Rivaud, *Histoire de la philosophie*, Paris, 1948.

ПАКАЗАЛЬНІК ІМЁНАЎ

А

Абаці *(Abbati)* 604
Альбвах Марыс *(Halbwachs Maurice)* 589
Амос *(Amos)* 69
Андэрсан Джэймз *(Anderson James)* 297
Анфантэн Праспэр (*Enfantin Prosper*) 361, 363, 364
Ароў *(Arrow)* 668, 670
Арыген (*Origène*) 70
Арыстафан *(Aristophane)* 13
Арыстотэль *(Aristote)* 5, 15, 39—58, 74—83, 85—87, 89, 90, 96, 99, 101, 106, 108, 128, 129, 137, 138, 139, 141, 158, 257, 295, 382, 413, 420, 421
Арэм Нікаля (*Oresme Nicolas*) 113
Атлас З. *(Атлас З.)* 699
Аўгустын (святы) *(Augustin) (saint)* 71—73, 75, 78, 90
Афтальён Альбэр *(Aftalion Albert)* 618—620, 629, 645

Б

Бабёф Гракхус *(Babeuf Gracchus)* 226, 231, 278, 400
Бадэн Жан *(Bodin Jean)* 106, 113, 114, 119
Базар Сэн Аман *(Bazard Saint-Amand)* 361, 363
Базараў *(Базаров)* 583
Бакстэр Рычард *(Baxter Richard)* 98
Бакунін Міхаіл *(Бакунин Михаил)* 400, 446, 549—551
Барбэс *(Barbès)* 400
Баронэ *(Barone)* 535—537
Баст'я Фрэдэрык *(Bastiat Frédéric)* 307
Басюэ *(Bossuet)* 226
Батэра *(Botero)* 103, 104
Баўэр Бруна *(Bauer Bruno)* 396
Бердзяеў Нікалай *(Бердяев Николай)* 570
Бём-Бавэрк Эган фон *(Böhm-Bawerk Eugen von)* 515, 516, 538
Блян Люі *(Blanc Louis)* 373, 377, 553
Блянкі Агюст *(Blanqui Auguste)* 373, 377, 400, 551
Блянкі Жэром *(Blanqui Jérôme)* 345
Бол Джон *(Ball John)* 97
Бруна Джардана *(Bruno Giordano)* 121, 128
Брус Поль *(Brousse Paul)* 569
Брэй Джон-Фрэнсіс *(Bray John-Francis)* 345, 370
Бўагійбэр *(Boisguillebert)* 142, 144, 145, 147, 148, 153, 156, 162, 170, 174, 333
Булгакаў *(Булгаков)* 570
Буртум'ё Шарль *(Bourthoumieux Charles)* 236
Бурыдан Жан *(Buridan Jean)* 138
Бутру Эміль *(Boutroux Emile)* 590
Бухарын Нікалай *(Бухарин Николай)* 572, 573, 579, 583
Бюшэ *(Buchez)* 373, 376
Бэз Тэадор дэ *(Bèze Théodore de)* 101
Бэйджхот Ўолтэр *(Bagehot Walter)* 611
Бэлэрз Джон *(Bellers John)* 350
Бэнтам Джэрэмі *(Bentham Jeremy)* 218—222, 330, 370, 463, 468, 474, 480, 513, 517

Бэргсан Анры *(Bergson Henri)* 594
Бэрклі *(Berkeley)* 253, 333
Бэрнхэм Джэймз *(Burnham James)* 594
Бэрнштайн Эдуард *(Bernstein Edouard)* 228, 560—562, 570

В

Вааг *(Baar)* 694, 695
Вагнэр Адольф *(Wagner Adolf)* 601
Вазнясенскі *(Вознесенский)* 692
Вайтлінг (*Weitling*) 400, 405
Вальрас Агюст *(Walras Auguste)* 487
Вальрас Леон *(Walras Léon)* 455, 473, 483, 484—498, 511, 513, 515, 517—519, 521, 523, 526—529, 536, 556, 558, 597, 605, 606, 632, 659, 661, 662, 665, 667—669, 671, 672
Вальтэр *(Voltaire)* 251
Варанцоў Васілій *(Воронцов Василий)* 548, 549
Васіль (святы) *(Basile) (saint)* 69
Візэр Фрыдрых фон *(Wieser Friedrich von)* 511, 512, 514
Віко Франчэска *(Vico Francesco)* 251
Віксэль Кнут *(Wicksell Knut)* 604—606, 608, 656, 657
Віндэльбанд (*Windelband*) 599, 600
Вінкельблех Георг *(Winkelblech Georg)* 372
Вобан *(Vauban)* 144
Вэблен Тарстэйн *(Veblen Thorstein)* 591—593
Вэбэр Макс *(Weber Max)* 98, 99, 132, 601

Г

Гадэн Андрэ *(Godin André)* 349
Гаек Ф. А. *(Hayek F. A.)* 532, 535, 618
Галілей *(Galilée)* 128, 138
Гальяні *(Galiani)* 215
Ганс Эдуард *(Gans Edouard)* 396
Гарэньяні П. *(Garegnani P.)* 679
Гасэн Герман Гайнрых *(Gossen Hermann Heinrich)* 468
Гачысан *(Hutcheson)* 184, 192
Гачысан Т. У. (*Hutchison T. W.*) 220, 333, 612—614, 622, 624
Гегель Г. В. Ф. *(Hegel G. W. F.)* 36, 57, 79, 128, 259, 260, 261, 281, 345, 381, 382—387, 389—396, 399, 401—404, 407, 409, 411—413, 422, 450, 456, 472, 547, 548, 553, 554, 561, 590, 709
Гед Жуль (*Guesde Jules*) 569
Гезэл Сільвія *(Gesell Silvio)* 624
Герцэн Аляксандр (*Герцен Александр*) 547, 548
Гес Мозэс (*Hess Moses*) 400
Гіё Іў *(Guyot Yves)* 612
Гікс Дж. Р. (*Hicks J. R.*) 515, 526, 647, 649, 653—655, 668
Гільдэбранд (*Hildebrand*) 462
Гільфэрдынг Рудольф (*Hilferding Rudolf*) 564, 567, 573
Гіўэл Ўільям (*Whewell William*) 469
Гобс Томас (*Hobbes Thomas*) 140, 150, 159, 160, 177, 184
Гобсан Джон Эткінсан (*Hobson John Atkinson*) 563, 564, 613, 614
Годвіль Нікаля *(Gueudeville Nicolas)* 228
Годскін Томас (*Hogdskin Thomas*) 345, 369, 370
Годўін Ўільям *(Godwin William)* 226, 246—249, 275, 287, 288, 350, 369, 370, 468
Гол Чарльз (*Hall Charles*) 369
Гомпэрз Сэмуэль *(Gompers Samuel)* 559
Гоўлі Ф. Б. *(Hawley F. B.)* 612
Гоўтры Р. Дж. *(Hawtrey R. G.)* 621, 647, 657
Громан *(Громан)* 583
Грэй Джон *(Gray John)* 345, 370
Грэхэм Ф. Д. *(Graham F. D.)* 467
Грэшэм Томас *(Gresham Thomas)* 113

Гурнэ Вэнсан дэ *(Gournay Vincent de)* 176
Гус Ян *(Huss Jean)* 97
Гэйлз Джон *(Hales John)* 102—105, 112, 116—119
Гэльвэцыюс *(Helvétius)* 218, 227
Гэнсэн Элвін Г. *(Hansen Alvin H.)* 609, 646, 649, 652
Гэрад Р. Ф. *(Harrod R. F.)* 650, 651, 682
Гэракліт *(Héraclite)* 14
Гэрдэр *(Herder)* 252, 253, 256, 279, 281
Гэрынгтан *(Harrington)* 228

Д

Даглас *(Douglas)* 624
Даніэльсан Нікалай *(Даниэльсон Николай)* 548, 549
Дантэ Аліг'еры *(Dante Alighieri)* 98
Дарвін *(Darvin)* 412, 472, 589
Джордж Гэнры *(George Henri)* 555
Джордж Лойд (*George Lloyd*) 625, 629
Джэванс У. С. *(Jevons W. S.)* 455, 474, 475, 477—485, 487, 490, 493—496, 513, 515, 518, 555, 556, 558
Джэймз Уільям *(James William)* 590, 591
Дзідро *(Diderot)* 189, 231, 233, 235
Дзюпон дэ Нэмур *(Dupont de Nemours)* 174—178
Дзюркейм Эміль *(Durkheim Emile)* 589
Домар Е. Д. *(Domar E. D.)* 651, 682
Дорфман Р. *(Dorfman R.)* 497
Дыкінсан Г. Д. *(Dickinson H. D.)* 537, 538
Дыльтэй Вільгельм *(Dilthey Wilhelm)* 599, 600
Дыўі Джон *(Dewey John)* 591
Дэбро Жэрар *(Debreu Gérard)* 668, 670
Дэкарт *(Descartes)* 139, 143, 144, 253, 258, 470
Дэмакрыт *(Démocrite)* 137
Дэнізэ Жан *(Denizet Jean)* 667

Е

Езэкііль *(Ezéchiel)* 70

Ё

Ёхансэн Н. *(Johannsen N.)* 620—624

Ж

Жакоб Франсўа (*Jacob François*) 711
Жарэс Жан *(Jaurès Jean)* 569
Жугляр Клеман *(Juglar Clément)* 611
Жэрвэз Ісак *(Gervaise Isaac)* 322

З

Захараў (*Захаров*) 694, 695
Зянон (*Zénon*) 63, 64

І

Ібн Халдун *(Ibn Khaldoun)* 141
Ёль *(Joël)* 69
Іпаліт (святы) *(Hippolyte) (saint)* 70
Ірэней (святы) *(Irénée) (saint)* 70
Ісая *(Isaie)* 69

К

Кабэ *(Cabet)* 231, 377, 397
Калдор Нікалас *(Kaldor Nicolas)* 515, 682, 684, 685
Калецкі Міхал (*Kalecki Michal*) 644—646, 649, 679—682
Калпэпэр Томас *(Culpeper Thomas)* 115
Кальвін Жан *(Calvin Jean)* 98
Каманз Дж. Р. *(Commons J. R.)* 593
Кампанэла Тамаза *(Campanella Thomasso)* 120, 121, 127—131, 251, 373
Кан Р. Ф. *(Kahn R. F.)* 630, 631, 636, 645, 646
Кандарсэ *(Condorcet)* 251, 356
Кандыльяк *(Condillac)* 214—218, 243
Кансідэран Віктор *(Considérant Victor)* 349, 397

Кант Іммануіл *(Kant Immanuel)* 251, 253—257, 259—262, 281, 383, 385, 392, 470, 472, 486, 561
Кантаровіч Л. (*Канторович Л.*) 695—697
Кантыльён Рычард *(Cantillon Richard)* 148—150, 154, 165, 193
Капернік *(Copernic)* 138
Карно Іпаліт *(Carnot Hippolyte)* 363
Касэль Густаў *(Cassel Gustav)* 538, 617
Каўцкі Карл (*Kautsky Karl*) 560, 564, 568, 577
Кейнс Джон Мэйнард (*Keynes John Maynard*) 116, 155, 333, 338, 341, 345, 433, 511, 513, 515, 530, 609, 615, 624—629, 631—637, 643—645, 648, 650, 651, 653, 657—660, 667, 682, 684, 686, 688
Кенэ (*Quesnay*) 117, 158—176, 178, 180, 183, 184, 211, 214, 220, 429, 607, 662, 706
Кіпрыян (святы) *(Cyprien) (saint)* 68
Кларк Джон Бэйтс *(Clark John Bates)* 591, 646, 647
Кларк Джон Морыс *(Clark John-Maurice)* 524, 619, 620, 646, 647
Кнап Г. Ф. (*Knapp G. F.*) 601
Кніз Карл (*Knies Charles*) 462
Конт Агюст *(Comte Auguste)* 357, 358, 456—459, 462, 463, 470, 589, 596
Краеўскі Кукель (*Краевский Кукель*) 694
Крапоткін Пётр (*Кропоткин Петр*) 551, 552
Крокер У. Г. *(Crocker V. H.)* 612
Ксэнафан (*Xénophane*) 14
Ксэнафон (*Xénophon*) 46, 54, 108
Кузанскі Мікола (*Cues Nicolas de*) 128
Куноў Гайнрых *(Cunow Henrich)* 562
Купэр Томас *(Cooper Thomas)* 461
Курно Агюстэн *(Cournot Augustin)* 458, 468—473
Кэплер (*Kepler*) 138
Кэры (*Carey*) 307, 461

Л

Лангэ Оскар (*Lange Oscar*) 177, 538—542
Лаўроў Пётр (*Лавров Петр*) 548
Лафма Бартэлемі (*Laffemas Barthélemy*) 102, 112
Левары Д. (*Levahri D.*) 678, 679
Леві-Бруль Люсьен (*Lévy-Bruhl Lucien*) 589
Ленгленд Ўільям (*Langland Guillaume*) 97
Ленін (*Ленин*) 275, 509, 543, 564, 565, 568, 570—578, 580, 583
Лесінг (*Lessing*) 275
Лё Мерсье дэ Ля Рыўер (*Le Mercier de la Rivière*) 174, 175, 178, 179, 706
Лёру П'ер (*Leroux Pierre*) 397
Лё Трон (*Le Trosne*) 165, 175
Ліберман Я. (*Либерман Е.*) 699
Ліндаль Э. (*Lindahl E.*) 657
Ліст Фрыдрых (*List Friedrich*) 461, 462
Ло Джон (*Law John*) 135, 136
Лодэрдэйл (*Lauderdale*) 333, 463
Лок Джон (*Locke John*) 140—142, 150, 151, 155, 160, 161, 165, 184, 192, 214
Лукрэцый (*Lucrèce*) 100, 250
Люксэмбург Роза (*Luxemburg Rosa*) 561, 563, 565—568, 574
Лютэр (*Luther*) 97, 98, 100, 122
Ля Баэсі (*La Boétie*) 101
Ля Бруер (*La Bruyère*) 225
Лявонцьеў Васілій (*Леонтьев Василий*) 528, 582, 661—666
Ляйбніц (*Leibniz*) 347
Ляманэ Фелісітэ дэ (*Lamennais Félicité de*) 373
Лямарк (*Lamark*) 252, 412
Ля Мэтры (*La Mettrie*) 227
Лясаль Фердынанд (*Lassalle Ferdinand*) 448, 553, 554

М

Маблі (*Mably*) 226, 243—245, 251, 348
Майзенберг (*Майзенберг*) 698
Маккулах (*McCullogh*) 466
Мак'явэлі (*Machiavelli*) 99, 100, 101, 106, 122
Малышаў (*Малышев*) 694
Мальбранш (*Malebranche*) 158, 159
Мальтус Т. Р. (*Malthus T. R.*) 104, 140, 249, 287—299, 301, 307, 309, 316, 317, 319, 333—341, 367, 426, 444, 463, 465, 468, 472, 608, 712
Мамэры А. Ф. (*Mummery A. F.*) 614
Ман Томас (*Mun Thomas*) 103, 118
Мандэвіль Бэрнард дэ (*Mandeville Bernard de*) 112, 333
Манкрэцьен Антўан дэ (*Montchrestien Antoine de*) 102, 105—108, 112, 117, 119, 120
Мантэнь (*Montaigne*) 96
Мантэск'ё (*Montesquieu*) 177, 225, 226
Мара Шарль (*Maurras Charles*) 595, 596
Маркс Карл (*Marx Karl*) 171, 275, 327, 339, 345, 350, 367, 368, 379, 381, 394, 396—431, 433—451, 455, 463, 479, 543, 544, 546, 547, 550, 551, 555, 557, 560—563, 565, 566, 569, 570, 575, 576, 578, 580, 591, 601, 607, 615, 616, 618, 627, 628, 662, 668, 676, 690, 691, 695, 697, 707
Маркузэ Гэрбэрт (*Marcuse Herbert*) 354
Марло Карл (*Marlo Karl*) 345, 371, 372
Маршал Альфрэд (*Marshall Alfred*) 527, 538, 558, 656, 659
Марэлі (*Morelly*) 226, 229—232, 264, 345, 347, 348, 406, 549
Мемон маркіз дэ (*Mesmon marquis de*) 168
Мізез (*Mises*) 534, 604, 621
Міл Джон Ст'юарт (*Mill John Stuart*) 444, 463—468, 555
Міл Джэймз (*Mill James*) 330, 331, 463, 466
Мілз Джон (*Mills John*) 611
Мірабо (*Mirabeau*) 165, 176, 177
Мірдаль Дж. (*Myrdal G.*) 657
Міхайлоўскі Нікалай (*Михайловский Николай*) 548
Мор Томас (*More Thomas*) 96, 120—124, 126—128, 130, 131, 228, 231, 264, 374
Морыс Ўільям (*Morris William*) 554
Мос Марсэль (*Mauss Marcel*) 589
Мэлін Джэрард (*Malynes Gerrard*) 114, 116
Мэнгер Карл (*Menger Carl*) 455, 484, 485, 487, 511, 515, 518, 666
Мэрывэйл (*Merivale*) 444
Мюнцэр Томас (*Munzer Thomas*) 97

Н

Наважылаў У. (*Новожилов В.*) 695—697
Насэ (*Nasse*) 613
Ніцшэ Фрыдрых (*Nietzsche Friedrich*) 595, 596
Нойман Е. фон (*Neumann J. von*) 666
Норт Дадлі (*North Dudley*) 142
Ньютан (*Newton*) 347
Нямчынаў У. (*Немчинов В.*) 694
Нячаеў (*Нечаев*) 550

О

Окам Ўільям (*Ockham William*) 99
Ортыс (*Ortiz*) 102
Оўэн Робэрт (*Owen Robert*) 345, 346, 350—355, 370, 547

П

Пазінэці Луіджы Л. (*Pasinetti Luigi L.*) 678
Паліб (*Polybe*) 66

Пампанацы (*Pomponazzi*) 96, 128
Парменід (*Parménide*) 18
Парэта Вільфрэда (*Pareto Vilfredo*) 495, 511, 514, 517—519, 521—523, 527, 534—536, 558, 597, 598, 610, 701—703
Паскаль Блез (*Pascal Blaise*) 139, 140, 226, 250
Паўла (святы) (*Paul*) (*saint*) 67, 68
Пігу А. К. (*Pigou A. C.*) 513—515, 517, 631, 657, 658
Пізані-Фэры Фрэнэт (*Pisani-Ferry Fresnette*) 505
Пірс Чарльз (*Pierce Charles*) 590
Пірсан Н. Дж. (*Pierson N. G.*) 532—534
Пітагор (*Pythagore*) 14, 138
Плятон (*Platon*) 5, 15—27, 29, 30, 32—37, 39—44, 47, 48, 55, 57, 58, 64, 70, 74, 75, 78, 96, 121, 123, 124, 126, 128, 131, 137, 158, 226, 236, 240, 244, 257, 277, 295, 382
Пляханаў Георгій (*Плеханов Георгий*) 569, 577
Прайс Банамі (*Price Bonamy*) 612
Пратагор (*Protagoras*) 14, 15
Прудон П'ер Жазэф (*Proudhon Pierre-Joseph*) 345, 374—381, 397, 404—406, 446, 447, 547, 551
Прэабражэнскі Яўгеній (*Преображенский Евгений*) 579, 583
Пўанкарэ Анры (*Poincaré*) 590
Пэйтынкін Дон (*Patinkin Don*) 657
Пэтрарка (*Pétrarque*) 95
Пэты Ўільям (*Petty William*) 112, 114, 116, 141, 148, 153, 160, 165, 192
Пярэйра Ісак (*Pereire Isaac*) 363

Р

Радбэртус Карл (*Rodbertus Karl*) 345, 371
Радрыгес Аленд (*Rodrigues Olindes*) 361
Рашэр Вільгельм (*Roscher Guillaume*) 462, 463
Робінсан Джоан (*Robinson Joan*) 525, 682, 683, 686—688
Робэртсан Д. Г. (*Robertson D. H.*) 604, 621, 657
Русо Жан Жак (*Rousseau Jean-Jacques*) 226, 233—237, 239—241, 244, 245, 248, 256, 261, 262, 264, 274, 354, 385, 386, 390, 403
Рыкарда Дэйвід (*Ricardo David*) 140, 155, 221, 299, 309—331, 333, 335—338, 345, 351, 362, 366, 369—371, 417, 418, 425, 426, 429, 437, 438, 442, 443, 444, 460—469, 477, 479, 484, 527, 529, 530, 556, 605, 623, 624, 656, 676, 682, 683, 688
Рэклю Элізэ (*Reclus Elisée*) 551
Рэнан Эрнэст (*Renan Ernest*) 589

С

Сакрат (*Socrate*) 15, 16, 18, 22, 28, 29, 36
Салён (*Solon*) 10
Салоў (*Solow*) 497, 658, 668
Сарэль Жорж (*Sorel Georges*) 594—596
Сафокл (*Sophocle*) 13
Сіміян Франсўа (*Simiand François*) 589
Сісмандзі (*Sismondi*) 335, 336, 337, 339, 345, 362, 366—369, 372, 443, 549, 614
Сміт Эдам (*Smith Adam*) 140, 150, 155, 183—217, 220, 221, 246, 247, 285, 287, 288, 293, 297, 300, 306, 307, 310, 311, 312, 315, 318, 324, 325, 327, 333, 335, 336, 369, 418, 429, 434, 443, 464, 606—608, 660, 662, 706
Спіноза (*Spinoza*) 382, 383
Спітоф Артур (*Spiethoff Arthur*) 617, 618
Спэнс Томас (*Spence Thomas*) 555
Спэнсэр Гэрбэрт (*Spencer Herbert*) 589

Срафа П'еро (*Sraffa Piero*) 525, 673—678
Сталін (*Сталин*) 509, 581, 582, 584, 586, 692, 693
Стоўн Рычард (*Stone Richard*) 637
Струве (*Струве*) 570
Струмілін (*Струмилин*) 585, 697, 698
Ст'юарт Джэймз (*Steuart James*) 149, 150, 173, 333
Сэй Жан Батыст (*Say Jean-Baptiste*) 147, 299—307, 324, 328, 333, 337, 362, 441, 443, 444, 462, 469, 487, 496, 498, 605, 608, 612, 614, 623, 632, 662, 665, 712
Сэмуэльсан Пол (*Samuelson Paul*) 497, 646, 647, 653—655, 658, 678, 679
Сэн-Сімон (*Saint-Simon*) 345, 356—364
Сэньёр (*Senior*) 293, 294, 444
Сэнэка (*Sénèque*) 66
Сэра (*Serra*) 102

Т

Талес (*Thalès*) 14
Талес Халкедонскі (*Phaléas de Chalcédoine*) 41
Тамаш Аквінскі (святы) (*Thomas d'Aquin*) (*saint*) 77—90, 96, 98, 122
Таўсіг (*Taussig*) 530
Т'еры Агюстэн (*Thierry Augustin*) 358, 360
Томпсан Ўільям (*Thompson William*) 345, 370
Торэнз (*Torrens*) 444, 466
Тоўбін (*Tobin*) 658
Трапезнікаў (*Трапезников*) 700
Троцкі Леў (*Троцкий Лев*) 575, 576, 579
Туган-Бараноўскі (*Туган-Барановский*) 563, 570, 615—617
Тук (*Tooke*) 605, 656
Турэцкі (*Турецкий*) 698
Тушар Жан (*Touchard Jean*) 182
Тэаген (*Théagène*) 12
Тэлезіа (*Telesio*) 128
Тэмпл Ўільям (*Temple William*) 193
Тэяр дэ Шардэн (*Teilhard de Chardin*) 131

У

Улін Бертыл (*Ohlin Bertil*) 527—530

Ў

Ўікліф (*Wiclef*) 95
Ўінстэнлі Джэрард (*Winstanley Gerrard*) 228
Ўолес (*Wallace*) 249, 287
Ўэб Сіднэй і Бэатрыс (*Webb Sidney et Béatrice*) 555, 557, 558
Ўэйкфілд (*Wakefield*) 444
Ўэйтлі (*Whateley*) 444
Ўэст Эдўард (*West Edward*) 297

Ф

Фіхтэ Ёган Готліб *(Fichte Johan Gottlieb)* 226, 250, 257, 259—266, 268, 270—281, 354, 355, 382—386, 389, 390, 402, 403, 446, 450, 553, 588, 709
Фішэр Ірвінг *(Fischer Irving)* 605, 621, 656
Фоербах Людвіг *(Feuerbach Ludwig)* 399, 400, 402, 403, 412, 549
Фортры *(Fortrey)* 114
Франк *(Frank)* 570
Фрыдман Мільтан *(Friedman Milton)* 660
Фрыш Рагнар *(Frisch Ragnar)* 649
Фураст'е Жан *(Fourastié Jean)* 314
Фур'е Шарль *(Fourier Charles)* 345, 346—349, 354, 355, 359, 363, 364, 408, 409, 415, 548, 559
Фэлнэр Ўільям *(Fellner William)* 651—653
Фэнэлён *(Fénelon)* 228

Х

Х'юм Дэйвід *(Hume David)* 150—156, 184, 185, 209

Ц

Цыцэрон *(Cicéron)* 64, 65, 72, 95
Цюнен Гайнрых (*Thünen Heinrich von*) 468, 483, 490
Цюрго (*Turgot*) 165, 181, 251

Ч

Чайльд Джошуа *(Child Josiah)* 112, 114, 115
Чарнышэўскі Нікалай *(Чернышевский Николай)* 548
Чэмбэрлен П. *(Chamberlen P.)* 228
Чэмбэрлін Эдўард *(Chamberlin Edward)* 525
Чэрчыль Ўінстан (*Churchill Winston*) 504

Ш

Шапэнгаўэр (*Schopenhauer*) 590
Шастэлюкс Жан дэ *(Chastellux Jean de)* 251
Шатабрыян Рэнэ дэ *(Chateaubriand René de)* 373
Шмідт Конрад (*Schmidt Conrad*) 563
Шмолер Густаў (*Schmoller Gustav*) 601, 617
Штырнэр Макс (*Stirner Max*) 397, 552
Шульц (*Schultz*) 428
Шумпэтэр Ёзэф (*Schumpeter Joseph*) 604, 606—611, 615, 628, 649
Шўазёль (*Choiseul*) 180
Шэвалье Мішэль *(Chevalier Michel)* 363
Шэлінг Ф. В. Ё. фон (*Schelling F. W. J. von*) 253, 281, 384

Э

Эджўарт Ф. І. *(Edgeworth F. Y.)* 527
Эйхталь *(Eichthal)* 363
Экхарт *(Eckhart)* 79, 128
Эліс Ўільям *(Ellis William)* 466
Энгельс Фрыдрых *(Engels Friedrich)* 345, 398, 406, 410, 412, 414—416, 434, 446, 559, 560
Эпікур *(Epicure)* 62, 63, 99—101, 126, 127, 250
Эразм Ратэрдамскі *(Erasme)* 94, 121
Эсхіл *(Eschyle)* 13
Эшэг І. *(Eshag E.)* 659

Ю

Юстын (святы) *(Justin) (saint)* 70

Я

Ямбул *(Iambulos)* 64
Ян (святы) *(Jean) (saint)* 70, 71
Ян Ляйдэнскі *(Jean de Leyde)* 98
Ян Хрызастом (святы) *(Jean Chrysostome) (saint)* 69
Ярэмі *(Jérémie)* 70

Змест

Прадмова 5

Частка першая

ПАЛІТЫЧНЫ І ЭКАНАМІЧНЫ ІДЭАЛІЗМ У ГРЭЦКАЙ ФІЛАСОФІІ І ЯГО ЗАНЯПАД 7

Раздзел I
ПЛЯТОН: ЭКАНАМІЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ — СРОДАК ВЫРАТАВАННЯ ЧАЛАВЕЧЫХ ДУШАЎ 10
§ 1. Сацыяльны і інтэлектуальны крызіс у Афінах у IV ст. да н. э. . . . 10
§ 2. Эканамічная дактрына Плятона 15
§ 3. Значэнне Плятонава ідэалізму 36

Раздзел II
АРЫСТОТЭЛЬ: ЭКАНАМІЧНЫ ЛАД МЭТАНАКІРАВАНЫ І ПРЫСТАСАВАНЫ ДА ПАТРЭБАЎ ЛЮДЗЕЙ 39
§ 1. Насуперак Плятону 39
§ 2. Арыстотэлева канцэпцыя навукі пра чалавека 44
§ 3. Арганізацыя эканамічнага жыцця 48
§ 4. Справядлівасць у грамадстве 54
§ 5. Выснова: Межы Арыстотэлева падыходу. Адмаўленне гісторыі 57

Раздзел III
ЗАНЯПАД ПАЛІТЫЧНАЙ І ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ Ў РЫМСКУЮ ЭПОХУ І Ў СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ 59
§ 1. Панаванне Рыма і яго інтэлектуальны след 59
§ 2. Першапачатковае хрысціянства і эканамічныя інстытуцыі 67
§ 3. Сярэднявечча 73
Бібліяграфія 90

Частка другая

НАРАДЖЭННЕ ПАЛІТЫЧНАЙ ЭКАНОМІІ І СЦВЕРДЖАННЕ ЛІБЕРАЛЬНАЙ ДАКТРЫНЫ 91

Раздзел I
МЕРКАНТЫЛІЗМ І УТАПІЗМ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ 93
§ 1. Развіццё капіталізму. Сацыяльны крызіс XV–XVI стст. 93
§ 2. Агульны рух ідэяў. Адраджэнне і Рэфармацыя 95
§ 3. Меркантылісцкая дактрына 99
§ 4. Камунізм Мора і Кампанэлы 120
Бібліяграфія 132

Раздзел II
КРЫТЫКА МЕРКАНТЫЛІЗМУ 133
§ 1. Сацыяльны аспект: прагрэс капіталістычнай эканомікі 133
§ 2. Інтэлектуальнае жыццё: трыумф картэзіянскага метаду 137
§ 3. Лібералізм Бўагійбэра 142
§ 4. Межы ўзбагачэння праз гандаль. Рычард Кантыльён 148
§ 5. Паміж меркантылізмам і лібералізмам: Тэзісы Дэйвіда Х'юма 150
Бібліяграфія 156

Раздзел III
КЕНЭ І ФІЗІЯКРАТЫ 158
§ 1. Франсўа Кенэ 158
§ 2. Натуральныя правы. Уласнасць 158
§ 3. Крытыка меркантылізму. Першыя эканамічныя адкрыцці 162
§ 4. "Эканамічная табліца" 165
§ 5. Канцэпцыя натуральнага грамадскага парадку 174
§ 6. Сацыяльны натуралізм — асноўная загана фізіякратычнае сістэмы 179
Бібліяграфія 181

Раздзел IV
ЭДАМ СМІТ 183
§ 1. Біяграфічныя звесткі 183
§ 2. Тэорыя маральных пачуццяў 184
§ 3. Першыя эканамічныя развагі ў лекцыях у Глазга 189
§ 4. "Багацце народаў". Тэорыя менавай вартасці 192
§ 5. Тэорыя даходаў 196
§ 6. Супярэчнасці інтарэсаў унутры грамадства 201
§ 7. Эканамічны прагрэс паводле тэорыі і паводле гісторыі 206
Бібліяграфія 213

Раздзел V
ДЗВЕ СПРОБЫ СТВАРЭННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ НАВУКІ НА ПРЫНЦЫПЕ КАРЫСНАСЦІ. КАНДЫЛЬЯК І БЭНТАМ . . . 214
§ 1. Кандыльяк 214
§ 2. Палітычная эканомія Бэнтама 218

Частка трэцяя

ПЕРШЫЯ СТВАРАЛЬНІКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ДАКТРЫНЫ 223

Раздзел I
ФРАНЦУЗСКІ НАТУРАЛІСТЫЧНЫ КАМУНІЗМ XVIII ст . . 227
Бібліяграфія 232

Раздзел II
АДНАЎЛЕННЕ САЦЫЯЛЬНАГА ІДЭАЛІЗМУ. ЖАН ЖАК РУСО 233
§ 1. Біяграфічныя звесткі 233
§ 2. Крытыка сацыяльнага натуралізму і лібералізму 234
§ 3. Сцверджанне сацыялізму 236
§ 4. Супярэчлівы характар вучэння Русо 240
Бібліяграфія 241

Раздзел III
КРЫТЫКА ФІЗІЯКРАТАЎ У ТВОРЧАСЦІ АБАТА МАБЛІ . . 243

Раздзел IV
САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ УТЫЛІТАРЫЗМ ЎІЛЬЯМА ГОДЎІНА . 246

Раздзел V
САЦЫЯЛІЗМ ФІХТЭ 250
§ 1. Ідэя грамадскай эвалюцыі 250
§ 2. Крытыцызм Канта і сацыяльная праблема 253
§ 3. Тэорыя рацыянальнага грамадства ў Фіхтэ 257
Бібліяграфія 281

Частка чацвертая

ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ І НАСТУПСТВЫ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 283

Раздзел I
УЗДЗЕЯННЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ НА СТАНОВІШЧА АНГЕЛЬСКІХ РАБОЧЫХ ПАД КАНЕЦ XVIII ст. . . 285

Раздзел II
МАЛЬТУСАВА АБГРУНТАВАННЕ КАРЫСНАСЦІ ГАЛЕЧЫ 287

§ 1. Асноўныя палажэнні "Спробы стварэння закону аб народанаселенасці" 288
§ 2. Сацыяльны натуралізм Мальтуса 291
§ 3. Тэорыя зямельнай рэнты 296
Бібліяграфія 299

Раздзел III
АПТЫМІЗМ ЖАНА БАТЫСТА СЭЯ 300
§ 1. Тэорыя размеркавання 300
§ 2. Адмаўленне ад паняцця прадукцыйнай працы 304
§ 3. Закон рынкаў збыту 305
Бібліяграфія 307

Раздзел IV
ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ РЫКАРДА 309
§ 1. Першыя эканамічныя працы 309
§ 2. Тэорыя вартасці і размеркавання 311
§ 3. Тэорыя размеркавання 316
§ 4. Праблемы замежнага гандлю 320
§ 5. Тэорыя эканамічнага развіцця 324
§ 6. Значэнне тэорыі Рыкарда 329
Бібліяграфія 331

Раздзел V
МАЛЬТУСАВА ТЭОРЫЯ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ 333
Бібліяграфія 341

Частка пятая

АСНОЎНЫЯ МЫСЛЯРЫ-САЦЫЯЛІСТЫ XIX ст. 343

Раздзел I
АСАЦЫЯНІСЦКІ САЦЫЯЛІЗМ 346
§ 1. Шарль Фур'е 346
§ 2. Роберт Оўэн і кааператыўны рух 350
Бібліяграфія 355

Раздзел II
ТЭХНАКРЫТЫЧНЫ САЦЫЯЛІЗМ.
СЭН-СІМОН І ЯГОНЫЯ ВУЧНІ 356
§ 1. Жыццё і творы Сэн-Сімона 356
§ 2. Сэн-Сімонаў сацыялізм 359
§ 3. Вучні Сэн-Сімона 361
Бібліяграфія 364

Раздзел III
АРЫЕНТАЦЫЯ НА "НАВУКОВЫ САЦЫЯЛІЗМ" 366

§ 1. Сісмандзі (1773—1842) 366
§ 2. Рыкардаў сацыялізм у Англельшчыне 369
§ 3. Карл Радбэртус і Карл Марло 371
Бібліяграфія 372

Раздзел IV
П'ЕР ЖАЗЭФ ПРУДОН 373

§ 1. Біяграфічныя звесткі 374
§ 2. Эканамічныя ідэі 375
§ 3. Праблема сродкаў 379
Бібліяграфія 381

Раздзел V
ПАЛІТЫЧНАЯ ФІЛАСОФІЯ ГЕГЕЛЯ 382

§ 1. Праблема свабоды 384
§ 2. Праблема палітычнага дзеяння 390
Бібліяграфія 394

Раздзел VI
ІДЭІ КАРЛА МАРКСА 396

§ 1. Маладыя гады Карла Маркса. Далучэнне да камунізму (1818—1845) 396
§ 2. Жыццё і погляды Карла Маркса ў 1845—1848 гадах. Гістарычны матэрыялізм 405
§ 3. Крытыка палітычнай эканоміі 413
§ 4. Апошнія ўдакладненні сутнасці рэвалюцыйнага працэсу і будучага грамадства 446
Бібліяграфія 450

Частка шостая

НЕАКЛАСІЧНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ 453

Раздзел I
КЛАСІЧНАЯ ПАЛІТЭКАНОМІЯ ПАД ПЫТАННЕМ (1820—1870) 456

§ 1. Крытыка эканамістаў класічнай школы 456
§ 2. Абарона класічнай школы. Джон Ст'юарт Міл 463
§ 3. Беспасярэднія папярэднікі класічнай школы: Цюнен, Гасэн, Курно 468

Раздзел II
НОВАЯ ТЭОРЫЯ ВАРТАСЦІ І РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДАЎ 474
§ 1. Ўільям Стэнлі Джэванс 474
§ 2. Леон Вальрас 484
Бібліяграфія 499

Частка сёмая

ЭВАЛЮЦЫЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ Ў 1875—1939 гг. 501

Раздзел I
САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ 503
§ 1. "Вялікая дэпрэсія" ў Вялікабрытаніі ў 1873—1896 гг. і ўздым ангельскага імперыялізму 503
§ 2. Экспансія іншых капіталістычных дзяржаваў 505
§ 3. Канфлікты паміж вядучымі дзяржавамі 508
§ 4. Ад Першай да Другой сусветных войнаў 508

Раздзел II
ЭВАЛЮЦЫЯ НЕАКЛАСІЧНАЙ СІСТЭМЫ 511
§ 1. Супярэчнасць паміж грамадскай карыснасцю і прыватным інтарэсам 511
§ 2. Час як фактар вытворчасці і тэорыя размеркавання ў Бём-Бавэрка 515
§ 3. Новае азначэнне эканамічнага оптымуму ў Вільфрэда Парэта 517
§ 4. Праблема манапалістычнай канкурэнцыі 523
§ 5. Праблемы замежнага гандлю 526
§ 6. Неакласічная школа і сацыялізм 532
Бібліяграфія 542

Раздзел III
САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ДАКТРЫНА: ВЫПРАБАВАННЕ НА ПРАКТЫЦЫ 543
§ 1. Утапічныя плыні ў сацыялістычным руху 547
§ 2. Рэфармісцкі сацыялізм у Вялікабрытаніі 553
§ 3. Нямецкія сацыялісты і праблема інтэрпрэтацыі марксізму . . . 560
§ 4. Марксізм у Расеі 569
Бібліяграфія 588

Раздзел IV
САЦЫЯЛОГІЯ І ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ 589
Бібліяграфія 601

Раздзел V
ВУЧЭННЕ КЕЙНСА 603
§ 1. Падрыхтоўка глебы для адкрыццяў Кейнса 604
§ 2. "Трактат пра грошы" 624
§ 3. Тэорыя занятасці 629
Бібліяграфія 637

Частка восьмая

СУЧАСНЫЯ КІРУНКІ
Ў ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМЦЫ 639

Раздзел I
ЭКАНАМІЧНЫ АНАЛІЗ У ЗАХОДНІХ КРАІНАХ 643
§ 1. Развіццё Кейнсава аналізу 643
§ 2. Тэорыі грашовай раўнавагі 655
§ 3. Узнікненне новага метаду эканамічнага аналізу: табліца выдаткі—выпуск В. Лявонцьева 661
§ 4. Сучаснае развіццё неакласічнай тэорыі 667
§ 5. Спробы сфармуляваць закон размеркавання даходаў 677
Бібліяграфія 689

Раздзел II
УРОКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ
У КРАІНАХ УСХОДНЯЙ ЭЎРОПЫ 690
§ 1. Праблема захавання закону вартасці 690
§ 2. Пытанне рэнтабельнасці інвестыцыяў 693
§ 3. Самастойнасць прадпрыемстваў і роля рынку пры сацыялістычным ладзе 698
§ 4. Чаму сацыялістычныя эксперыменты атрымалі паразу? 701
Бібліяграфія 704

Раздзел III
ДА НОВАГА АСЭНСАВАННЯ ЭКАНОМІКІ 706

Агульная бібліяграфія 715

Паказальнік імёнаў 719

АДКРЫТАЕ ГРАМАДСТВА
Серыя Беларускага Фонду Сораса

Навучальнае выданне

Дэні Анры
ГІСТОРЫЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ
Дапаможнік для студэнтаў

Рэдактары
Алена Трусава, Андрэй Дынько, Неаніла Баранава, Алесь Гібкоўскі, Ларыса Сагановіч

Карэктар
Яніна Марціновіч

Тэхнічны рэдактар
Лідзія Масцерава

Малодшы рэдактар
Наталя Баранава

Вокладка
Вадзім Масцераў

Набор
Алена Лобач

Макетаванне
Андрэй Трусаў

Падпісана да друку 05.12.96. Фармат 60×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура гельветыка. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 46,0. Ул.-выд. арк. 47,3. Наклад 1500 паасобнікаў. Замова № 2009.

Незалежная выдавецкая кампанія "Тэхналогія". ЛВ № 439. 220007, Мінск, вул. Магілеўская, 43. Беларускі Фонд Сораса. ЛВ № 636. 220027, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 65, корп. 11А.

Надрукавана з арыгінал-макета замоўцы ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79.

Дэні А.

Д 94 Гісторыя эканамічнай думкі: Дапаможнік для студэнтаў / Пер. з фр. А. Лагвінца, К. Акопава; Пад рэд. Т. Паваліхінай. — Мн.: Тэхналогія; Беларускі Фонд Сораса, 1996. — 733 с. — (Адкрытае грамадства).

ISBN 985-6022-18-5

Кніга прысвечаная пытанням і праблемам палітэканоміі, яе сувязям з філасофскімі вучэннямі, тлумачэнню сацыяльнай арганізацыі вытворчасці і яе эвалюцыі на працягу гісторыі — ад часоў Старажытнай Грэцыі да нашых дзён. Разглядаюцца асобныя значныя філасофскія і эканамічныя вучэнні, што паўплывалі на развіццё заходняй думкі ў розных яе аспектах, а таксама сучасныя спрэчкі эканамістаў.

Для студэнтаў і аспірантаў вышэйшых навучальных устаноў эканамічнага кірунку, а таксама ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй, сучасным станам і праблемамі эканамічнай навукі.

Д 3300800000 ББК 65.02

ВЫДАВЕЦТВА «ТЭХНАЛОГІЯ»
Ў СЕРЫІ "АДКРЫТАЕ ГРАМАДСТВА" ВЫПУСЦІЛА
НАСТУПНЫЯ КНІГІ:

Лоўзі Джон. **Гістарычныя ўводзіны ў філасофію навукі** / Пер. з анг. 1995. — 328 с.

Дапаможнік для журналістаў Цэнтральнай і Усходняй Эўропы / Пер. з анг. 1995. — 176 с.

Брэтон Філіп, Сэрж Пру. **Выбух камунікацыі**: Нараджэнне новай ідэалогіі / Пер. з фр. 1995. — 336 с.

Говард Майкл. **Сучасная культурная антрапалогія** / Пер. з анг. 1996. — 478 с.

Бэрдшоў Джон (пры ўдзеле *Энды Роса*). **Эканоміка**: Дапаможнік для студэнтаў. Ч.1: Уводзіны. Мікраэканоміка / Пер. з анг. 1996. — 528 с.

Дэні Анры. **Гісторыя эканамічнай думкі**: Дапаможнік для студэнтаў / Пер. з фр. 1996. — 734 с.

РЫХТУЮЦЦА ДА ВЫДАННЯ:

Бэрдшоў Джон (пры ўдзеле *Энды Роса*). **Эканоміка**: Дапаможнік для студэнтаў. Ч. 2: Макраэканоміка / Пер. з анг.

Сўінгвуд Алан. **Сціслая гісторыя сацыялагічных вучэнняў** / Пер. з анг.

Дворнік Фрэнсіс. **Славяне ў эўрапейскай гісторыі і цывілізацыі** / Пер. з анг.

Бэрк Пітэр. **Народная культура на світанку сучаснай Эўропы** / Пер. з анг.

Говард Майкл. **Вайна ў эўрапейскай гісторыі** / Пер. з анг.

Выдавецтва

«Тэхналогія»

займаецца выданнем навуковай, навучальнай,
навукова-папулярнай, даведкавай
ды іншай грамадска-значнай літаратуры.



Анры Дэні

ГІСТОРЫЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМКІ

Кніга прысвечаная праблемам станаўлення і развіцця тэорыі эканомікі. Чытачу прапануецца арыгінальны аналіз эканамічных вучэнняў, якія разглядаюцца тут праз прызму эвалюцыі філасофскай думкі і зменаў сацыяльнай арганізацыі вытворчасці на працягу гісторыі — ад часоў Старажытнай Грэцыі да нашых дзён.

Напісаная бліскучай моваю, гэтая кніга вось ужо трыццаць гадоў з'яўляецца найбольш папулярным на Захадзе падручнікам па гісторыі эканамічнай думкі. Толькі на мове арыгінала яна вытрымала ўжо дзесяць выданняў.